БАБРУЙСКІ РАЁН

МІНСК
«БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ»
1998

Прыбярэзінскія краявіды

1387 г. Першае пісьмовае ўпамінанне пра Бабруйск

1540 г. Бабруйск упершыню пазначаны на геаграфічнай карце, выдадзенай у Базелі (Швейцарыя)

Плошча Леніна ў раённым цэнтры Бабруйск

1584 г., 14 красавіка.	Паводле Уставы Жыгімонта III Бабруйск атрымаў статус мястэчка
1793 г.	Тэрыторыя раёна ўвайшла ў склад Расійскай імперыі

Праваслаўная Свята-Мікольская царква ў вёсцы Цялуша

1793 г., 22 студзеня. Бабруйску нададзены герб

1793 г., 5 мая. Утвораны Бабруйскі павет

1795 г., 8 кастрычніка. Абраны першы прадвадзіцель дваранства Бабруйскага павета

1808 г., 4 лютага. У фальварку Панюшкавічы нарадзіўся В.Дунін-Марцінкевіч

Праваслаўная царква Раства Іаана Прадцечы ў вёсцы Малыя Бортнікі

1830 г.	Пабудавана Свята-Троіцкая драўляная царква ў Цялушы
1851 г.	Завершана будаўніцтва паштовага тракту Мінск—Бабруйск
1863 г.	Адкрыты народныя вучылішчы ў Бортніках і Цялушы

Будынак раённай бібліятэкі ў Бабруйску. 1912 г.

1887 г.	Заснавана гута ў Глушы
1904 г.	Створана Бабруйская арганізацыя РСДРП
1913 г.	Адкрыта першая на Бабруйшчыне паштова-тэлеграфная кантора ў Глушы
1918 г., пачатак лютага.	Тэрыторыю Бабруйшчыны акупіравалі польскія войскі

Мемарыяльны комплекс у гонар воінаў 1-га Беларускага фронту і партызан у вёсцы Сычкава

1918 г., май.	Паўстанне сялян вёсак Вялікія і Малыя Бортнікі супраць польскіх акупантаў
1919 г.	Створаны першы ў раёне саўгас «Дурынічы»
1919 г.	Створана сельскагаспадарчая камуна ў Панюшкавічах

Помнік савецкім воінам, якія загінулі ў чэрвені 1944 г. пры пераправе цераз Бярэзіну (вёска Шчаткава)

1920 г., 10 ліпеня.	Чырвоная Армія вызваліла Бабруйск ад белапалякаў
1924 г., 17 ліпеня.	Утворана Бабруйская акруга
1927 г., 4 жніўня	Утвораны Бабруйскі раён

Музей пад адкрытым небам з цэнтрам мастацкіх рамёстваў у пасёлку Глуша

1932 г.	Створана Цялушская МТС
1941 г., ліпень.	Пачатак дзейнасці Бабруйскага патрыятычнага падполля
1942 г., 2 верасня.	Створаны Бабруйскі падпольны райком КП(б)Б

Творчасць народных умельцаў

1943 г., люты. Створана 1-я Бабруйская партызанская брыгада

1943 г., кастрычнік. Гітлераўскія акупанты знішчылі вёску Прудзішча, якая пасля вайны не аднавілася

Народны хор вёскі Варатынь

1944 г., 24—29 чэрвеня.	Праведзена Бабруйская наступальная аперацыя
1944 г. 29 чэрвеня.	Чырвоная Армія вызваліла Бабруйск ад нямецка-фашысцкіх акупантаў
1944 г., 20 верасня.	Утворана Бабруйская вобласць

Фальклорны калектыў вёскі Стасеўка

1963 г. Варатынскі хор даярак першы ў раёне ўдастоены звання народнага

1983 г. Калгас імя Дзяржынскага ўзнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга



БАБРУЙСКІ РАЁН, размешчаны ў паўднёва-заходняй частцы Магілёўскай вобласці. Утвораны 4.8.1927 г. Плошча 1,6 тыс. км^2. Насельніцтва (разам з Бабруйскам) 256,6 тыс. чалавек, у т.л. 29,3 тыс. сельскага (на 1.1.1998 г.), сярэдняя шчыльнасць 160 чалавек на 1 км^2. Цэнтр раёна — г. Бабруйск. У раёне 225 сельскіх населеных пунктаў і рабочы пасёлак Глуша. На яго тэрыторыі 12 сельсаветаў: Бортнікаўскі, Брожскі, Варатынскі, Вішнёўскі, Гарбацэвіцкі, Гарохаўскі, Кавалёўскі, Осаўскі, Слабодкаўскі, Сычкаўскі, Хімоўскі, Цялушскі; Глушанскі пасялковы Савет.

Большая частка раёна размешчана ў межах Цэнтральнабярэзінскай раўніны. Пераважаюць вышыні 150—170 м над узроўнем мора, самы высокі пункт 183,5 м (каля Глушы). Карысныя выкапні: торф, гліна, будаўнічыя і сілікатныя пяскі; ёсць мінеральныя крыніцы. Сярэдняя тэмпература студзеня -6,7, ліпеня +18,2 °С. Ападкаў 586 мм за год. Вегетацыйны перыяд 193 дні. Найбольшая рака Бярэзіна з прытокамі Ала, Бабруйка, Беліца, Брожка, Ваўчанка, ёсць возера Вяхва. Глебы пераважна дзярнова-падзолістыя (46,1%), дзярнова-падзолістыя забалочаныя (26,9%) і тарфяна-балотныя (15,6%). Лясы займаюць 38% тэрыторыі раёна (пераважна хваёвыя, бярозавыя і чорнаальховыя). Пад балотамі 19,2 тыс. га (часткова асушаныя), з іх 17,8 тыс. га пад нізіннымі (балотныя масівы Рэдкі Рог, Ваўчанскае балота, Юрзаўка).

Буйная прамысловасць сканцэнтравана ў Бабруйску; у раёне дзейнічаюць прадпрыемствы будаўнічых матэрыялаў, шкляной, харчовай і мясцовай прамысловасці. Пад сельскагаспадарчымі ўгоддзямі 87 тыс. га. На 1.1.1998 г. было 8 саўгасаў, 13 калгасаў, 18 фермерскіх гаспадарак. Асноўныя галіны сельскай гаспадаркі — малочна-мясная жывёлагадоўля, льнаводства, бульбаводства, агародніцтва. Развіваецца птушкагадоўля. Вырошчваюць збожжавыя, кармавыя культуры, агародніну. Па тэрыторыі раёна праходзяць чыгункі Мінск—Бабруйск—Гомель, Бабруйск—гарадскі пасёлак Акцябрскі, аўтамабільныя дарогі Мінск—Бабруйск—Гомель, Слуцк—Бабруйск—Рагачоў, Крычаў—Бабруйск—Іванцэвічы, Магілёў—Бабруйск—Рагачоў, Магілёў—Бабруйск—Мазыр. Па р. Бярэзіне ажыццяўляецца суднаходства, рачны порт — Бабруйск. У в. Сычкава мемарыяльны комплекс у гонар воінаў 1-га Беларускага фронту і партызан. Выдаецца грамадска-палітычная газета «Трыбуна працы».

Населеныя пункты Бабруйскага раёна (на 1.1.1997 г.)

Бортнікаўскі сельсавет: Азёры, Барак, Бірча, Бірча 1-я, Бірча 2-я, Воўчая Гара, Вялікія Бортнікі, Жаўранкі, Іванаўка, Койміна, Красная Дуброва, Крупічы, Лебядзёўка, Лейчыцы, Ліпнякі, Малінаўка, в. Малыя Бортнікі, пас. Малыя Бортнікі, Мартынаўка, Міхалёва 1-е, Міхалёва 2-е, Міхалёва 3-е, Пустошка, Рыня, Узнога.

Брожскі сельсавет: в. Брожа, пас. Брожа, Ласі, Макаравічы, Орсічы, Рэдкі Рог.

Варатынскі сельсавет: Амяленская Слабада, Аўсімавічы, Варатынь, Вілы, Вялікая Кантора, Данілаў Мост, Доўгі Клін, Лясішча, Міронава, Осава, Парасля, Пасекі, Стары Двор, Труд, Туркі, Туркоўская Слабада.

Вішнёўскі сельсавет: Баравая, Вішнёўка, Вуглы, Глебава Рудня, в. Даманова, пас. Даманова, Казакова, Красны Брод, Ламы, Перасова, Продзвіна, Стасеўка, Сяліба.

Гарбацэвіцкі сельсавет: Атрошкавічы, Багуслаўка, Багушоўка, Банёўка, Барок, Барсукі, Брожка, Буда, Гарбацэвічы, Двор-Гарбацэвічы, Емяльянаў Мост, Заглыбокае, Калінаўка, Крушынка, Леніна, Маяк, Міхайлаўка, Обча, Пабокавічы, Рагалі, Слабада-Багушоўка, Станы.

Гарохаўскі сельсавет: Аколіца, Астравы, Гародчына, Гарохаўка, Двор-Глуша, Дворышча, Каменка, Кіслаўшчына, Кліны, Красная Зара, Красновічы, Красны Агарод, Круглонія, Лагадаўка, Ленінцы, Лужанец, Ляды, Макараўка, Мартынаўка, Масты, Мачулкі, Палошкава, Пасека, Пятровічы, Рагаселле, Рымаўцы, Спорнае, Трусаўшчына, Фартуны, Харошае, Ясёны.

Глушанскі пасялковы Савет: Глуша, Дачнае, Карабоўшчына.

Кавалёўскі сельсавет: Акцябр, Кавалі, Ламбава, Малева, Мікулічы, Навікі, Палянкі, Панкратавічы, Постраш, Прагрэс, Тажылавічы, Юр'ева.

Осаўскі сельсавет: Бабоўе, Банёўка, Баранавічы 1-я, Баранавічы 2-я, Баранавічы 3-я, Баркі, Віктараўка, Глуша, Дойнічава, Забудзькі, Зарэчча, Міхайлаўшчына, Навасёлкі, Осава, Пакроўка, Прагрэс, Слабада, Старынкі, Яленаўка, Ясень-Каменка.

Слабодкаўскі сельсавет: Арэхава, Бярэзавічы, Варановічы, Грабава, Дуброва, Залессе, Каменка, Канчаны, Красны Лес, Лекерта, Новая Беларусь, Слабодка, Туголіца, Убалоцце, Юбілейны.

Сычкаўскі сельсавет: Антонаўка, Барбарова, Баяры, Бібкаўшчына, Вербкі, Вінаградаўка, Ізюмава, Калініна, Красная, Леніна, Лысая Гара, Мірадзіна, Міраціна, Падсобнае, Пад'ясенка, Панюшкавічы, Раксалянка, Саломенка, Сасновая, Сычкава, в. Такары, х. Такары, Тапаркі, Цюўнавічы, Чарніца, Шчаткава.

Хімоўскі сельсавет: Бабіна 1-е, Бабіна 2-е, Баршчоўка, Вялічкава, Ганчароўка, Гарохава, Думаноўшчына, Крапіўка, Машкі, Новая Шараёўшчына, Слабада, Старая Шараёўшчына, Сялібка, Хімы, Цярэшкава, Ясны Лес.

Цялушскі сельсавет: Дубаўка, Забалоцце, Звязда, Малінкі, Плёсы, Пралетарскі, Савічы, Сімгаравічы, Ступяні, Усход, Цялуша.

Населеныя пункты Бабруйскага раёна, якія не існуюць

Бортнікаўскі сельсавет: Баршчова, Беларусь, Бірча 3-я, Бірча 4-я, Грыя, Дзесяты, Доўгая, Іванаўскі, Кастрычнік, Культура, Кухенька, Лужанец, Новы Агарод, Новы Гарадок, пас. Торфаарцелі.

Брожскі сельсавет: Акцябр, Брожа, Мельнікі, Надзеева, Падліпкі, Прудзішча, Роскачы, Слабодка, Смаласкіп, Станічын.

Варатынскі сельсавет: Бяляціна, Будчын, Глухія Ляды, Доўгі Клін, Дулева, Малая Кантора, Падляддзе, Рудня, Савецкі, Шчагельскі.

Вішнёўскі сельсавет: Падчэрня.

Гарбацэвіцкі сельсавет: Палянка, Рэпішча, Селішча, Старцы, Стары Двор.

Гарохаўскі сельсавет: Барбаўшчына, Воўчая Яма, Дзяўчын, Заруччага, Карчма, Красная Ніва, Крутавіна, Лужанец, Падгор'е, Рубяжы, Слабада, Сулева, Сцяфанаполь, Трудзяшчыхся, Церабеж, Ясны.

Кавалёўскі сельсавет: Берацін, Гай, Дубкі, Жылянцы, Зара, Засошша, Красная Горка, Новішча 1-е, Новішча 2-е, Новы Быт, Падліп'е, Перасова, Рыгі, Селянін, Слабада.

Осаўскі сельсавет: Аляксандраўка, Баяршчына, Ваўкоўня, Доўгі Вугал, Канстанцінавае, Кінаўка, Юзафін, х. Юзафін, Ясень.

Слабодкаўскі сельсавет: Зацішша, Ляды, Малая Каменка, Пішчакі, Чарапічны Завод, Чарнаполле.

Сычкаўскі сельсавет: Ваўчанка, Крухмальны, Лукі, Лучкі, Рыбкі.

Хімоўскі сельсавет: Бошава, Зарэчча, Новае Вялічкава, Новая Дзярэўня, Рэкорд, Старое Вялічкава.

Цялушскі сельсавет: Красны.

У межы г. Бабруйска ўвайшлі в. Дзеднава, пас. Дзеднава, пас. Зялёнка, в. Кісялевічы, пас. Кісялевічы, пас. Крывы Крук, пас. Цітаўка, в. Яловікі.

АД ЧАСОЎ ПЕРШАБЫТНЫХ

1917

НА ЗЯМЛІ ПРОДКАЎ

З чаго пачынаецца Радзіма? З задуменначыстай плыні Бярэзіны? Са старажытных пятровіцкіх паселішчаў і гарадзішча ці старынкаўскіх курганоў? Або з непаўторных па прыгажосці панюшкавіцкіх краявідаў?

Вядома, кожны згадае свой, самы дарагі яго сэрцу куточак, дзе адвеку шчыравалі яго продкі, дзе ён нарадзіўся і вырас, дзе спазнаў цеплыню бацькоўскае ласкі, радасць працы, сяброўства і кахання, дзе не раз выстаяў супраць нягод і выпрабаванняў. Менавіта пра гэта святое пачуццё так афарыстычна пісаў знакаміты сын Беларусі Ф. Скарына: «Понеже от прирожения звери, ходящие в пустыни, знают ямы своя; птицы, летающие по возъдуху, ведають гнезда своя; рибы, плывающие по морю и в реках, чують виры своя; пчелы и тым подобная боронять ульев своих, — тако ж и люди, игде зродилися и ускормлены суть по бозе, к тому месту великую ласку имеють».

Сапраўды, дзе б ні былі, мы заўжды сэрцам і думкамі ў нашай мілай вёсачцы ці пасёлку з іх непаўторнымі выявамі і фарбамі прыроды. Гэта наша святыня, наша малая радзіма, да якой мы «прыкіпелі» душой і сэрцам.

Умоўна існуюць і шырэйшыя межы нашай малой радзімы — найперш межы раёна. Часцей за ўсё менавіта па ім пазнаюць землякоў. Гэта ж так: усе, хто нарадзіўся на Бабруйшчыне, — людзі адной зямлі: землякі-бабруйчане! Усе яны адной еднасці, адной святой прыналежнасці да гэтага цудоўнага краю, адных самых трапяткіх сыноўніх да яго пачуццяў. Адкуль жа яна пайшла і якой была наша Бабруйшчына?

З гісторыі адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу

Тэрыторыя раёна заселена чалавекам з эпохі мезаліту (9—5-е тысячагоддзі да н.э.). Тут жылі розныя плямёны, у тым ліку з 8 ст.— славянскія плямёны дрыгавічоў (гл. раздзел «Маўклівыя сведкі мінулага»). З 9 ст. частка тэрыторыі раёна ўваходзіла ў Полацкае, частка — у Тураўскае княствы; апошняе з 2-й паловы 10 ст. ўвайшло ў склад Кіеўскай Русі..

У 14 ст. Полацкае і Тураўскае княствы далучаны да Вялікага княства Літоўскага. З тае пары гісторыя Бабруйшчыны доўгі час непарыўна звязана з гісторыяй гэтай некалі вялікай і магутнай дзяржавы. Бабруйск як буйны горад нязменна заставаўся цэнтрам адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, пра якія расказваецца далей.

БАБРУЙСК. Першае пісьмовае ўпамінанне пра яго адносіцца да 1387 г. Назва паходзіць ад р. Бабруйкі, на якой некалі сяліліся бабры. У 6—7 і 11—13 ст. пры ўпадзенні гэтай рэчкі ў Бярэзіну існавала паселішча дрыгавічоў, жыхары якога займаліся земляробствам, рыбнай лоўляй і бабровым промыслам. Паводле даўняй славянскай традыцыі яно названа па меншай рэчцы, што ўпадала ў



Герб Бабруйска. 1796 г.

большую. У летапісах сустракаюцца таксама назвы Бобровск, Бобрусск, Бобрусек. У 12—13 ст. Бабруйск, верагодна, уваходзіў у склад Мінскага княства. У 14 ст. ён быў цэнтрам Бабруйскай воласці (гл. адпаведны артыкул), якая на мяжы 1330—1340-х гадоў трапіла ва ўладанне вялікага князя Вялікага княства Літоўскага Альгерда і яго брата Кейстута. У 1502—1503 гадах Бабруйск спусташалі крымскія татары. У 1508 г. ён быў штурмам узяты атрадамі князя М.Глінскага, які перайшоў на бок Расіі. Новае спусташэнне Бабруйск перажыў у час чарговай маскоўска-літоўскай вайны 1534—1537 гадоў, калі ў 1535 г. ім авалодалі рускія войскі. У 1540 г. Бабруйск упершыню пазначаны на геаграфічнай карце Еўропы, выдадзенай у Базелі.

У 1565 г. як цэнтр Бабруйскага староства ўвайшоў у склад Рэчыцкага павета, быў уладаннем вялікага князя, потым Радзівілаў, Гаштольдаў, Трызнаў. 14 красавіка 1584 г. паводле Уставы Жыгімонта III Бабруйск атрымаў статус мястэчка. У 16—17 ст. ён разрасся і разбагацеў ад прыёму купцоў і збору падаткаў на тутэйшай мытні. Паводле інвентара 1620 г. тут было 15 вуліц, 2 завулкі, 409 двароў, 75 крам, млын, царква, касцёл. Цэнтрам абароны мястэчка ў 14—18 ст. быў Бабруйскі замак. Увесь горад быў абнесены драўляна-земляными ўмацаваннямі ў выглядзе абарончага вала, драўляных сцен, паркана і каля 10 вежаў. Уезд і выезд з горада ажыццяўляўся праз 4 брамы: Падольскую (вяла да паромнай пераправы і далей на Магілёў), Свіслацкую (на Свіслач), Кісялёўскую (у паўднёва-заходняй частцы Бабруйска) і Прудовую (адкрывала дарогу цераз плаціну на рацэ Бабруйка да зарэчных гарадскіх валок з агародамі, сенажацямі і садамі). Гараджане разам з выбранымі ад воласці сялянамі неслі ў брамах начную варту ад «свавольных людзей». У 1630 г. ўзнікла рэзідэнцыя езуітаў.

У 1648 г. горад заняў казацкі атрад гетмана Паддубскага. А ў 1649 г. гетман Я.Радзівіл выбіў з горада казакоў-паўстанцаў на чале з Паддубскім і гараджан, што далучыліся да іх. У 1655 г. Бабруйск занялі казакі наказнога гетмана І.Залатарэнкі. У 1665 г. горад зноў штурмавалі ўкраінскія казакі, якія разбурылі замак і гарадскія ўмацаванні, але яны былі хутка адбудаваны. Бабруйск зазнаў вялікія разбурэнні ў час руска-польскай (сярэдзіна 17 ст.) і Паўночнай (1700—1721) войнаў, якія прывялі горад і яго акругу ў заняпад.

У 1793 г. Бабруйск у складзе Расійскай імперыі. 3 мая 1795 г. Кацярына II выдала Указ аб прызначэнні казённага мястэчка Бабруйск павятовым горадам. 22 студзеня 1796 г. Бабруйску нададзены герб — у сярэбраным полі выява карабельнай мачты і два перакрыжаваныя бярвёны. У 1800 г. складзены першы план Бабруйска, паводле якога ён забудоўваўся да 1810 г. 10 ліпеня 1810 г. Аляксандр I зацвердзіў каштарыс і план будаўніцтва Бабруйскай крэпасці (на месцы замка), якая адыграла важную ролю ў далейшым развіцці горада і яго абароне ад ворагаў. Гарнізон крэпасці вытрымаў 4-месячную асаду напалеонаўскіх полчышчаў у 1812 г. У крэпасці служылі многія афіцэры-дзекабрысты. Тут у 1823 г. быў распрацаваны Бабруйскі план дзекабрыстаў, які прадугледжваў арышт цара і яго світы ў час агляду войск. Тут жа, у крэпасці, адбывалі пакаранне некаторыя з асуджаных дзекабрыстаў.

У 1829 г. ў Бабруйску было 6,8 тыс. жыхароў, 601 дом. Развіццю горада садзейнічала пракладка шашы Масква—Варшава (1848) і Лібава-Роменскай чыгункі (1873). Дзякуючы ім, а таксама воднаму шляху па Бярэзіне, хутка развіваліся гандаль, дрэваапрацоўчыя і іншыя рамёствы і промыслы. У сярэдзіне 19

ст. ў Бабруйску было больш за 1300 дамоў (у тым ліку 23 мураваныя), 19 тыс. жыхароў, 4 заводы (40 рабочых), 173 рамесныя майстэрні (больш за 300 рамеснікаў), 193 крамы, 4 царквы, 3 пачатковыя школы. Паводле перапісу 1897 г.,. у горадзе было 34,3 тыс. жыхароў. У 1904 г. іх колькасць павялічылася да 37,5 тыс. чалавек. На гэты час тут былі 52 вуліцы і завулкі, адна плошча, 3050 пабудоў (з іх 172 мураваныя), 19 фабрык і заводаў (582 рабочыя), 191 рамесная майстэрня (1077 рамеснікаў), 2 банкі, 13 пачатковых школ (1755 вучняў, 38 настаўнікаў), гімназія, 2 бальніцы, 5 аптэк, 3 друкарні, бібліятэка-чытальня, гасцініца, 19 корчмаў. Сярод галін прамысловасці найбольш развіты былі дрэваапрацоўчая, цагельная, вінакурная, тытунёвая, маслабойная, мукамольная, крупадзёрная, чыгуналіцейная, пашыраны таксама керамічныя і ткацкія промыслы, гандаль.

Жыхары Бабруйска прымалі ўдзел у рэвалюцыйным руху. У 1898 г. тут надрукаваны маніфест I з'езда РСДРП. У горадзе дзейнічалі сацыял-дэмакратычны камітэт Бунда, група прыхільнікаў ленінскай «Искры», з 1904 г. — Бабруйская арганізацыя РСДРП. З лістапада 1905 г. да кастрычніка 1906 г. вяла работу ваенна-рэвалюцыйная арганізацыя РСДРП. У час рэвалюцыі 1905—1907 гадоў

Вуліца Мураўёўская ў Бабруйску. Канец 19 ст.

бабруйчане ўдзельнічалі ў студзеньскай стачцы пратэсту супраць расстрэлу царызмам рабочых Пецярбурга, у кастрычніцкай Усерасійскай палітычнай стачцы 1905 г., у снежаньскіх выступленнях таго ж 1905 г. У 1905 г. і 1907 г. тут адбыліся выступленні салдат. У дарэвалюцыйным Бабруйску выходзілі газеты «Бобруйские отклики» (1911—1912), «Бобруйская жизнь» (1913—1914), «Последние новости» (1914), «Бобруйский курьер» (1914—16). У 1914 г. ў Бабруйску налічвалася 41,3 тыс. жыхароў, на пачатак 1914 г. дзейнічала 27 прамысловых прадпрыемстваў

Агульны выгляд Бабруйска. Малюнак 19 ст.

(720 рабочых). У жніўні 1915 г. адбылося антываеннае выступленне салдат гарнізона.

Асноўныя крыніцы

Россия: Полное географическое описание нашего Отечества. Т. 9. СПб., 1905; Города России в 1904 г. СПб., 1906; Бобруйск: Историко-экономический очерк. 2 изд. Мн., 1970; Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі: Магілёўская вобласць. Мн., 1986. С. 96—114; Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Мн., 1993. Т. 1. С. 249—265.

БАБРУЙСКАЯ ВОЛАСЦЬ, Бабруйскае староства. Гэта назва дзяржаўнага ўладання ў Вялікім княстве Літоўскім. Першыя звесткі пра яе адносяцца да 14 ст. Займала большасць тэрыторыі сучасных Бабруйскага, Кіраўскага і прылеглых да іх частак Жлобінскага і Светлагорскага раёнаў (гл. карту). Ёсць меркаванне, што напачатку Бабруйская воласць уваходзіла ў склад Свіслацкага княства — удзельнага княства ў нізоўі р. Свіслач, якое аформілася, пэўна, у 12—13 ст. З сярэдзіны 14 ст. воласць, як і Свіслацкае княства, далучана да Вялікага княства Літоўскага і падзелена на 2 часткі (2 княствы) — паміж вялікім князем літоўскім Альгердам (рэзідэнцыя ў Вільні) і яго братам Кейстутам (рэзідэнцыя ў Троках). Сам горад Бабруйск таксама падзяляўся на дзве «палавіцы» — большую, Віленскую, і меншую, Трокскую. Браты падзялілі тэрыторыю такім чынам, каб кожны з іх меў і беларускія і літоўскія землі — дзеля трываласці дзяржавы. У судова-адміністрацыйных ваенна-палітычных адносінах Бабруйск і Бабруйская воласць былі падначалены віленскаму і трокскаму князям. Воласцю кіраваў намеснік, якога прызначаў вялікі князь звычайна з ліку буйных баяр (Глябовічаў, Давойнаў, Пацаў, Тышкевічаў і інш.).



Аўтар В.Л.Насевіч

скай імперыі (1793) староства перастала існаваць, як і само Вялікае княства Літоўскае.

Акты Виленской археографической комиссии. Вильна, 1898. Т. 25. С. 114—330.

БАБРУЙСКІ ПАВЕТ. Паводле другога падзелу Рэчы Паспалітай, у студзені 1793 г. тэрыторыя цэнтральнай Беларусі была ўключана ў склад Расійскай імперыі. 3.4.1793 г. на гэтай тэрыторыі ўтворана новая расійская губерня — Мінская, у складзе якой 5.5.1793 г. ўтворацы Бабруйскі павет з цэнтрам у Бабруйску. У 1890 г. ў ім было 22 воласці: Азарыцкая, Асавецкая, Бацэвіцкая, Бортнікаўская, Брожская, Гарадоцкая, Гарбацэвіцкая, Глуская, Горкаўская, Жыцінская, Забалоцкая (Любанская), Замошская (у 1924 г. перайменавана ў Чычэрынскую), Качэрыцкая (цэнтр у вёсцы Старцы), Любоніцкая, Лясковіцкая (цэнтр у вёсцы Забалоцце), Новадарожская, Парыцкая, Рудабельская (з 1920 г. Акцябрская), Свіслацкая, Стэпская, Тураўская, Чэрнінская. Плошча павета 12,2 тыс. км^2 (гл. карту). У 1897 г. тут жыло 318,8 тыс. чалавек (з улікам г. Бабруйска), з іх 67,4% беларусаў, 19,4% яўрэяў, 10% рускіх. У 1908 г. у павеце было 327 тыс. жыхароў. З 29.8.1919 г. да 10.8.1920 г. павет уваходзіў у склад Гомельскай губерні (акрамя Замашскай воласці, акупіраванай войскамі буржуазнай Польшчы). 17.7.1924 г. Бабруйскі павет ліквідаваны. Большая частка яго тэрыторыі ўвайшла ў склад Бабруйскай акругі. Горкаўская воласць, часткі Асавецкай, Жыцінскай і Новадарожскай валасцей перададзены Слуцкай акрузе, Азарыцкая, Лясковіцкая і частка Акцябрскай воласці — Мазырскай акрузе. *Л.Р.Казлоў.*

БАБРУЙСКАЯ АКРУГА. 17.7.1924 г. 2-я сесія ЦВК БССР 6-га склікання скасавала стары і ўвяла новы адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел — акругі, раёны, сельсаветы. Усяго ў БССР было 10 акруг. Бабруйская акруга ўтворана 17.7.1924 г. з цэнтрам у Бабруйску. У яе склад увайшла большая частка тэрыторыі былога Бабруйскага павета. У 1924—1927 гадах акруга уключала 12 раёнаў: Асіповіцкі, Бабруйскі 1-ы, Бабруйскі 2-і, Буда-Кашалёўскі, Гарадзецкі, Глускі, Жлобінскі, Клічаўскі, Парыцкі, Рагачоўскі, Свіслацкі, Стрэшынскі. У склад акругі ўваходзілі 3 гарады (Бабруйск, Жлобін, Рагачоў) і 4 мястэчкі (Асіповічы, Глуск, Парычы і Стрэшын). У чэрвені 1927 г. ў сувязі са скасаваннем Слуцкай акругі ў склад Бабруйскай акругі перададзены Любанскі, Слуцкі, Старадарожскі, Старобінскі і Чырвонаслабодскі раёны, Слуцк і мястэчка Любань, Старыя Дарогі і Старобін. Бабруйскі раён 1-ы ўтвораны 17.7.1924 г.; плошча 1453 км^2, 196 населеных пунктаў, 46,9 тыс. жыхароў (на 1.1.1925, без Бабруйска). Падзяляўся на 13, пасля на 14 сельсаветаў: Багушоўскі (з верасня 1926 нацыянальны рускі сельсавет), Брожскі, Варатынскі, Гарбацэвіцкі, Кавалёўскі, Каменскі, Малеўскі, Осаўскі, Продзвінскі, Рымаўцоўскі, Сычкаўскі, Туркоўскі, Цялушскі, Бортнікаўскі (са жніўня 1925). Бабруйскі раён 2-і ўтвораны 17.7.1924 г.; плошча 1072 км^2, 311 населеных пунктаў, 42,3 тыс. жыхароў (на 1.1.1925, без Бабруйска). Падзяляўся на 14 сельсаветаў: Баранавіцкі, Бераснёўскі, Гарадзецкі, Казуліцкі, Капусцінскі (з верасня 1926 нацыянальны рускі сельсавет), Лешчанскі, Любоніцкі, Міхалёўскі, Мышкавіцкі, Падрэцкі, Паўлавіцкі, Старцоўскі, Харлапавіцкі, Хімоўскі 4.8.1927 г. ў сувязі з узбуйненнем раёнаў Бабруйскі раён 1-ы і Бабруйскі раён 2-і аб'яднаны ў адзіны Бабруйскі раён. У жніўні 1927 г. Бабруйскія раёны 1-ы і 2-і аб'яднаны ў адзіны Бабруйскі раён, а Гарадзецкі і Стрэшынскі раёны скасаваны, у кастрычніку 1927 г. Буда-Кашалёўскі раён перададзены ў склад Гомельскай акругі. Выдавалася акруговая газета «Камуніст». 26.7.1930 г. Бабруйская акруга скасавана; на гэты час у яе складзе было 13 раёнаў і 204 сельсаветы.

БАБРУЙСКАЯ ВОБЛАСЦЬ. 15.1.1938 г. ў БССР замест акруг утвораны вобласці. Бабруйская вобласць утворана 20.9.1944 г. з раёнаў Магілёўскай, Мінскай і Палескай абласцей з цэнтрам у Бабруйску. Плошча 19,7 тыс. км^2, насельніцтва 654,9 тыс. чалавек (1953). Уключала 14 раёнаў: Акцябрскі, Асіповіцкі, Бабруйскі, Глускі, Грэскі, Капыльскі, Кіраўскі, Клічаўскі, Любанскі, Парыцкі, Слуцкі, Старадарожскі, Старобінскі, Чырвонаслабодскі; гарады абласнога падпарадкавання Бабруйск і Слуцк, гарады раённага падпарадкавання Асіповічы і Старыя Дарогі, гарадскія пасёлкі Глуск, Капыль, Клічаў, Любань, Старобін, Парычы, Урэчча, Чырвоная Слабада, рабочыя пасёлкі Глуша, Градзянка, Ялізава, Ясень. 14.5.1949 г. вёска Татарка пераўтворана ў рабочы пасёлак. Выдавалася абласная газета «Савецкая Радзіма». Скасавана 8.1.1954 г. Акцябрскі і Парыцкі раёны перададзены ў Гомельскую, Глускі, Грэскі, Капыльскі, Любанскі, Слуцкі, Старадарожскі, Старобінскі і Чырвонаслабодскі — у Мінскую, Асіповіцкі, Бабруйскі, Кіраўскі і Клічаўскі раёны — у Магілёўскую вобласць.

Маўклівыя сведкі мінуўшчыны

Большую частку свайго існавання чалавецтва было непісьменным. А як даведацца, калі ўпершыню з'явіліся старажытныя людзі ў тым ці іншым рэгіёне, у прыватнасці на Бабруйшчыне? Пра гэта расказваюць знойдзеныя каменныя прылады працы і інш. старажытныя вырабы. Кожная старажытная рэч зроблена рукамі чалавека і таму захоўвае пэўную інфармацыю аб уменні і майстэрстве яе творцы. Каштоўныя звесткі з дапісьменнага часу нясуць да нас не толькі асобныя рэчы, але і, што вельмі важна, тыя мясціны, дзе жыў чалавек, выраблялі прылады працы, займаўся паляваннем, гаспадаркай, рамяством і хаваў памерлых.



Крамянёвы інвентар са стаянкі Стасеўка: 1 — наканечнік стралы; 2,3 — разцы; 4, 14—16, 19 — скоблі; 5—6 — скрабкі; 7 — праколка; 8 — трапецыя; 9—11 — сячэнні пласцін; 12 — вастрыё; 13 — пласціна-ўкладыш; 17, 22 — рэтушыраваныя адшчэпы; 18, 20, 21 — нуклеусы.

Усё гэта ўваходзіць у паняцце «помнікі археалогіі». Існуе некалькі іх відаў: стаянкі, гарадзішчы, селішчы, грунтовыя і курганныя могільнікі, рэшткі гарадоў і сярэднявечных сельскіх паселішчаў і г.д. Кожны з іх адпавядае пэўнаму часу, а ўсе яны ахопліваюць перыяд ад каменнага веку да раннефеадальнага часу (9 тысячагоддзе да н.э. — 13 ст. н.э.). На тэрыторыі Бабруйскага раёна археалагічныя помнікі вядомы паблізу 35 вёсак. У іх налічваецца 565 старажытных аб'ектаў розных часоў (гл. табліцу).

На аснове археалагічных і іншых навуковых звестак даследчыкі вызначылі, што прыкладна 15 тыс. гадоў таму пачалося адступленне ледавіка з тэрыторыі паўночнай Беларусі. У 10—9 тысячагоддзях да н.э. клімат стаў больш цёплы. У гэты час завяршалася фарміраванне рэльефу і рачной сеткі. Тэрыторыя рэспублікі пакрывалася сасновашыракалістым лесам з падлескам і хмызняком. У даліне ракі Бярэзіны вылучаліся поплаў і дзве надпоплаўныя тэрасы. Раслінны і жывёльны свет набыў у той час рысы, блізкія да сучасных. Геаграфічнае асяроддзе стала той натуральнай базай, ва ўзаемадзеянні з якой набіралі сілу першабытныя калектывы людзей.

Засяленне тэрыторыі Бабруйскага раёна пачалося ў эпоху мезаліту — сярэднім каменным веку. У пачатку 7 тысячагоддзя да н.э. старажытныя людзі з'явіліся на другой надпоплаўнай тэрасе правага берага ракі Бярэзіны недалёка ад сучаснай вёскі Стасеўка (750 м на захад ад яе). Гэта паселішча даследаваў навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі Акадэміі навук Беларусі У.П.Ксянзоў. Тут было знойдзена вогнішча дыяметрам каля 2 м і глыбінёй 0,35 м. З паўднёвага боку ад яго зафіксаваны рэшткі наземнага жытла — пабудова дыяметрам каля 5 м. Яна мела выгляд, хутчэй за ўсё, юрты. Калекцыя крамянёвых вырабаў налічвала 82 прадметы. Атрыманыя ў час раскопак матэрыялы даюць магчымасць скласці ўяўленне аб таямнічых першапасяленцах. Прылады працы яны выраблялі з высакаякаснага мелавога цёмна-шэрага крэменю, які на Бярэзіне не выяўлены і, відаць, дастаўляўся з іншых мясцін, хутчэй за ўсё, з Панямоння. У рукі майстроў трапляла і менш якасная сыравіна — невялікія жаўлакі і валуны жоўтага і шэрага колераў, якія вымываліся ракой з марэнных адкладаў.

Археалагічныя помнікі Бабруйскага раёна (па стане на канец 1990-х гадоў)

Назвы вёсак	Каменны век		Бронзавы век	Жалезны век		Кіеўская Русь		
	мезаліт 9—5 тыс. да н.э.	неаліт 4—3 тыс. да н.э.	2 тыс. — IX ст. да н.э.	VIII ст. да н.э. — VIII ст. н.э.		IX—XIII ст.		
	Віды археалагічных помнікаў							
	Стаянкі	Паселішчы	Паселішчы	Гарадзішчы	Селішчы	Селішчы	Курганы	
							групы	адзіночныя
Аколіца							40	
Банеўка							31	1
Баранавічы 3-я							55	
Баяры							3	
Вербкі		3						
Вуглы		1			1	1		
Вяхава (возера)		1	1		1	1		
Гародчына							6	
Даманова		1	1					
Дзеднава					1	1		
Каменка								1
Крамяні (урочышча)						1		
Красная Дуброва							38	
Красны Агарод							46	
Лекерта							4	1
Макаравічы				1			14	
Маліннікі							27	1
Маяк							2	
Міхалёва 2-е		1	1	1		1		1
Обча							8	
Перасова							56	
Постраш				1				
Продзвін							73	
Пятровічы	1			1	1			
Рагалі							7	
Рагаселле							5	
Сімгаравічы				1				
Ст. Шараёўшчына				1	1			
Старынкі							6	
Стасеўка	1						14	
Сулева							22	
Сычкава							19	
Сяліба		1	1		1		30	
Хутарок	1	1						
Шчаткава				1	3			
Усяго	3	9	4	6	8	5	524	6
							22 гр.	565

Асартымент вырабаў быў даволі разнастайны: нуклеусы, адшчэпы, ножападобныя пласціны, разцы, скрабкі, праколкі, сячэнні пласцін, наканечнікі стралы і скрэблы. Набор крамянёвага інвентару дазваляе адносіць жыхароў паселішча да днепра-дзясніпскай культуры, насельніцтва якой жыло ў верхнім Падняпроўі 11—7 тыс. гадоў таму.

Археалагічная культура — умоўнае паняцце, пад якім трэба разумець рэшткі пабудоў (жылых і нежылых), прылады працы, зброю, бытавыя рэчы і розныя прыстасаванні — у сукупнасці ўсё, чым карысталіся людзі на абмежаванай тэрыторыі ў пэўны гістарычны час.

Другі помнік носьбітаў днепра-дзясніпскай культуры ў Бабруйскім раёне знаходзіцца на ўзвышшы правага берага р. Брожкі ва ўрочышчы Гарадок ці Падкаленца, што каля в. Пятровічы. На паселішчы ранняга жалезнага часу — гарадзішчы — знойдзены тыпова мезалітычны набор прылад працы: чарашковы наканечнік стралы, разцы, скрабкі, праколка, скрэбла (усяго каля 15 адзінак). Гэта сведчыць аб тым, што ў 7—6 тысячагоддзях да н.э. рассяленне старажытных людзей на тэрыторыі Бабруйскага раёна адбывалася не толькі з поўдня ўздоўж Бярэзіны да яе вытокаў, але і абапал невялікіх рэчак, такіх, як Брожка. Шчыльнасць насельніцтва ў гэты час была нізкая. Асноўнымі заняткамі людзей у мезаліце былі паляванне, рыбалоўства і збіральніцтва.

Менавіта ў мезаліце з'явіліся такія дасканалыя прылады палявання, як лук і стрэлы. Калі ад лука нічога не захавалася да нашага часу, то ад стрэл дайшлі вострыя крамянёвыя наканечнікі. Яны, як і шматлікія іншыя вырабы, добра апрацаваны рэтушшу, што сведчыць аб удасканаленні тэхнікі апрацоўкі крэменю ў сярэднекаменным веку. Знойдзеныя ў час археалагічных раскопак прадметы мелі да таго ж і рознае функцыянальнае прызначэнне, аб чым сведчаць самі іх назвы: праколкі, скрабкі, ножападобныя пласціны і г.д.

На падставе вывучэння археалагічных помнікаў днепра-дзясніпскай мезалітычнай культуры можна прыйсці да высновы, што на стаянках сярэднекаменнага веку каля вёсак Стасеўка і Пятровічы жылі радавыя абшчыны. Некалькі такіх абшчын утваралі племя. Плямёны днепра-дзясніпскай мезалітычнай культуры займалі значную частку тэрыторыі басейна сярэдняга і ніжняга цячэння Бярэзіны.

У канцы 5 — пачатку 4-га тысячагоддзя да н.э. на тэрыторыі раёна, як і ўвогуле на Беларусі, на змену мезаліту прыйшоў новы каменны век — неаліт, які працягваўся да канца 3-га тысячагоддзя да н.э. Жыхары вялікай тэрыторыі басейнаў рэк Бярэзіны, Друці, Дняпра былі носьбітамі днепра-данецкай неалітычнай культуры. Сляды бытавання гэтага насельніцтва ёсць і на тэрыторыі Бабруйскага р-на.

Адзін з помнікаў гэтага часу (адкрыты У.П.Ксянзовым у 1974 г.) знаходзіцца непадалёку ад в. Даманова, каля вясковых могілак, на высокім правым беразе Бярэзіны. На выдмах знойдзены вырабы з крэменю — два наканечнікі стрэл трохвугольнай формы, тры скрабкі на адшчэпах, сякера клінападобная, два сячэнні пласцін, нуклеус, пласціны без рэтушы і адшчэпы. Акрамя таго, трапіліся дробныя абломкі глінянага посуду неалітычнага часу і бронзавага веку. Матэрыялы знаходак захоўваюцца ў Камінтэрнаўскай сярэдняй школе ў пас. Глуша і ў Інстытуце гісторыі Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі.

Стаянка неаліту знойдзена і ў цэнтры вёскі Сяліба (таксама адкрыта Ксянзовым). Плошча яе каля 50 м^2. У культурным пласце сустракаюцца крамянёвыя прылады працы і ляпная кераміка. На паўднёвым усходзе ад гэтай вёскі знаходзіцца яшчэ адзін помнік, размешчаны, як і папярэдні, на правым беразе Бярэзіны на ўзроўні першай надпоплаўнай тэрасы (даследаваў І.М.Язэпенка ў 1990 г.). На паверхні паселішча знойдзены дзве ножападобныя пласціны з рэтушшу, два скрабкі, трохвугольны наканечнік стралы, адшчэпы і сколы. Кавалкі неалітычнага посуду аздоблены ўцісканнямі гарызантальна-елачнага ўзору і нахіленай дробназубчастай грабёнкай. Сярод керамікі эпохі неаліту ў невялікай колькасці прысутнічаюць абломкі посуду бронзавага веку.

Паколькі помнікі новакаменнага веку ў Бабруйскім раёне не даследаваліся, то для агульнай характарыстыкі гэтага часу выкарыстаны матэрыял добра вывучаных паселішчаў з суседніх тэрыторый. Рассяленне першабытных калектываў у неаліце ішло куды больш інтэнсіўна, чым у мезаліце, аб чым сведчыць у шмат разоў большая колькасць неалітычных помнікаў. Паселішчы размяшчаліся на ўзвышшах у поплавах рэк і на берагах азёр на ўзроўні першай надпоплаўнай тэрасы, дзе былі зручныя мясціны для рыбалоўства. Як і раней, мясцовае насельніцтва займалася яшчэ паляваннем і збіральніцтвам. Жытлы людзей неалітычнага часу ў плане акруглыя і

прамавугольныя, плошчай 10—12 м². Большасць з іх заглыблена на 0,5—0,9 м у зямлю. У памяшканнях — адкрытыя вогнішчы. Каркас жытлаў складаўся з жэрдак, якія потым пакрываліся скурамі жывёл.

Асновай першабытнай эканомікі ў неаліце па-ранейшаму заставалася прысвойвальная форма гаспадарання, але ўжо ў канцы 3-га тысячагоддзя да н.э. намеціўся пераход да новай формы гаспадарання — вытворчай, якая грунтавалася на прымітыўных жывёлагадоўлі і земляробстве.

У новым каменным веку побач з вядомымі спосабамі апрацоўкі крэменю з'явіліся і новыя — двухбаковая апрацоўка ляза ці краю прылады. Сталі шліфаваць лязо прылад, якімі секлі. Выпрацаваны і новыя віды рэтушы: прытупляючая, завастраючая, крутая, плоская, пільчатая. Для вытворчасці прылад працы людзі пачалі выкарыстоўваць і іншыя пароды каменя: біятытавы граніт, пясчанік, кварц, сланец. Гэта стала магчымым дзякуючы з'яўленню такога віду апрацоўкі, як шліфаванне. Менавіта з дапамогай гэтай тэхнікі ў познім неаліце сталі вырабляць шліфаваныя клінападобныя сякеры. Пэўным дасягненнем было і свідраванне адтулін у сякерах для замацавання на драўляных ручках. Больш разнастайным стаў і набор каменных вырабаў. З'явіліся сякеры, серпападобныя нажы, долата, зерняцёркі, наканечнікі коп'яў. Складаныя, ці састаўныя, прылады мелі ў гэты час двайное прызначэнне: скрабкі-разцы, нажы-скоблі, наканечнікі-свярдзёлкі.

Надзвычай важкім для эпохі неаліту было вынаходства глінянага посуду. Многія даследчыкі лічаць кераміку галоўнай прыкметай новакаменнага веку. Майстры ўручную ляпілі вастрадонныя пасудзіны з выпуклым тулавам, крыху звужанай шыйкай і адагнутым вонкі верхнім краем вянца. Верх збаноў да таго ж аздабляўся. Адмысловыя кампазіцыі складаліся з ямачных уціскванняў, адбіткаў грэбеня, гарызантальных і касых ліній, елачных узораў, зігзагаў, трохкутнікаў і г.д. Некаторыя з такіх узораў ёсць і на керамічы з помнікаў Бабруйскага раёна — Даманова, Сяліба, Міхалёва, Вяхава, Вуглы.

Усе навацыі, якія з'явіліся ў неаліце, спрыялі і росту насельніцтва ў той час. З пераходам да вытворчай гаспадаркі пачаўся працэс распаду радавых адносін. З абшчын пачалі вылучацца асобныя сем'і, якія па-ранейшаму мелі кроўныя сувязі, але станавіліся ўжо ў нейкай ступені эканамічна самастойнымі. На думку вучоных, днепра-данецкая неалітычная культура ўтварылася на мясцовай мезалітычнай аснове.

У межах Бабруйскага раёна ёсць яшчэ 4 месцазнаходжанні людзей каменнага веку: побач з населенымі пунктамі Вярбкі і Хутарок. Два помнікі каля в. Вярбкі адкрыты ў 1982 г. Ксянзовым: першы — праз 0,3 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, на левым беразе рэчкі Ваўчанкі; другі — у тым жа кірунку ад вёскі, але далей — за 0,5 км на левым беразе р. Ваўчанкі. Трэці помнік адкрыты ў 1985 г. тым жа даследчыкам, што і папярэднія. Размешчаны ён за 1,3 км на паўднёвы ўсход ад в. Вярбкі на правым беразе Бярэзіны. Чацвёртае месцазнаходжанне людзей каменнага веку — каля в. Хутарок у кірунку да Даманова. Размяшчаецца на другой надпоплаўнай тэрасе р. Бярэзіны (таксама адкрыта У.П.Ксянзовым).

У канцы 1990-х гадоў у Бабруйскім раёне захавалася 11 археалагічных помнікаў каменнага веку. Большасць з іх — на правым высокім беразе Бярэзіны. Месцазнаходжанні паселішчаў таго часу сведчаць, што людзьмі была заселена пераважна цэнтральная паласа раёна ўздоўж вялікай ракі. Паляўнічыя калектывы вандравалі на значныя адлегласці, аб чым гавораць рэшткі іх стаянкі каля в. Пятровічы. Рассяленне ішло і па невялікіх прытоках Бярэзіны — рэчках Брожцы, Ваўчанцы, Ала, Вір.

У 1996—1997 гадах неалітычныя паселішчы раскопваліся на левабярэжжы Бярэзіны. Адно з іх — на правым беразе р. Вір, пры ўпадзенні яе ў воз. Вяхава. І.М.Язэпенка вывучыў 40 м², атрымана калекцыя крамянёвага інвентару (скрабкі, наканечнікі стрэл, разец, нож, праколкі) і абломкаў глінянага посуду. Кераміка арнаментавана насечкамі, разрэджанымі наколамі і грабеньчатым штампам. Другі помнік — каля в. Вуглы, ва ўрочышчы Колбіна Гара (Язэпенка). На ім знойдзены рамбічныя і трохвугольныя наканечнікі стрэл, а таксама шмат іншых крамянёвых прылад і рэшткі посуду. Посуд аздаблялі пераважна гарызантальнымі радамі наколаў і грабеньчатага штампа. Выходзячы з матэрыялаў устаноўлена, што першапасяленцы сталі тут жыць у канцы 3-га тысячагоддзя да н.э. Гэта былі плямёны днепра-данецкай археалагічнай культуры. На неалітычным паселішчы каля Вуглоў, як і на беразе воз. Вяхава, людзі жылі і пазней: у 1-м тысячагоддзі н.э. насельніцтва культур жалезнага веку, а ў пачатку 2-га тысячагоддзя — славяне-дрыгавічы.



Каменныя сякеры з Бабруйскага краязнаўчага музея: 1 — вёска Зарэчча Светлагорскага раёна; 2 — г. Бабруйск; 3 — з тэрыторыі Бабруйскага раёна.

Трэцяе паселішча людзей менавіта днепра-данецкай культуры неалітычнага часу адкрыў і даследаваў М.І.Лашанкоў на левым узвышаным беразе р. Ала, на паўднёва-заходняй ускраіне в. Міхалёва 2-е. Усе тры помнікі датуюцца апошняй чвэрцю 3-га тысячагоддзя да н.э. — пачаткам 2-га тысячагоддзя да н.э.

Бронзавы век пачаўся ў 2-м тысячагоддзі і працягваўся да першай чвэрці 1-га тысячагоддзя да н.э. Яскравай адметнасцю новага часу было выкарыстанне старажытнымі людзьмі бронзавых вырабаў разам з каменнымі. Неалітычны ўклад жыцця мяняўся паступова. І на новай ступені грамадскага развіцця панавалі каменныя прылады працы. Увогуле апрацоўка каменя дасягнула росквіту ў гэты час. Майстры навучыліся рабіць струменьчатую рэтуш — як доўгую, так і вузкую. Змены адбываліся не толькі ў тэхніцы апрацоўкі крэменю і іншых парод каменя, але і ў саміх формах вырабаў. Калі крамянёвыя наканечнікі стрэл у каменным веку выраблялiся пераважна для палявання, то ў бронзавым яны пачалі прымяняцца і ў зброі. Гэта сведчыць аб зменах у грамадстве: паміж людзьмі здараліся сутычкі за лепшую тэрыторыю, а то і грабежніцкія набегі на суседзяў ці іншапляменнікаў. З'яўлялася разнастайная зброя: акрамя наканечнікаў да стрэл і коп'яў рабілі яшчэ наканечнікі да дроцікаў і баявыя сякеры. З прылад працы можна вызначыць крамянёвыя сярпы і каменныя сякеры. Яны былі выкліканы да жыцця новай галіной гаспадарання — земляробствам.

Менавіта яно і прывяло да шырокага распаўсюджвання каменных сякер, якія даволі часта трапляюцца ў Бабруйскім раёне. Паводле «Археалагічнай карты Беларусі» І.Ф.Ісаенкі, іх знаходзілі як цэлыя, так і ў выглядзе абломкаў каля вёсак Аўсімавічы, Зялёнка, Каменка, Лясішча, Плёсы, Сяліба, Хімы і ў Бабруйску. Калекцыя гэтых прылад працы экспануецца ў краязнаўчым музеі Бабруйска.

Вядома, што ў бронзавым веку тэрыторыя Бабруйскага раёна, як і ўсёй Беларусі, была пакрыта лесам. Каб падрыхтаваць поле, расчысціць яго ад хмызняку і лесу, патрэбны былі сякеры розных формаў. Гэтым і тлумачыцца вялікая іх колькасць у той час.

Земляробства было вельмі працаёмкай справай і патрабавала ад чалавека шмат фізічных сіл. Таму займаліся ім мужчыны, ды і то калектыўна. Можна меркаваць, што палі былі невялікіх памераў. Збажыну ўбіралі крамянёвымі сярпамі. Зерне малолі ручнымі зерняцёркамі. Чалавека цікавіла не столькі рэчка са зручнымі мясцінамі для рыбнай лоўлі, колькі лугі і ўрадлівая глеба. Людзі пачалі займаць тэрыторыі воддаль ад вялікай ракі. Рассяленне першабытных калектываў у бронзавым веку было густейшым, аб чым сведчыць і паходжанне каменных сякер з розных мясцін раёна. У значнай ступені гэтаму спрыяла і жывёлагадоўля, якая стала адным з галоўных заняткаў. У сувязі з гэтым рыбалоўства і паляванне адышлі на другі план. Перавага жывёлагадоўлі і земляробства прывяла да паступовай змены матрыярхату на патрыярхат.

Жывёлагадоўча-земляробчыя плямёны сярэднедняпроўскай культуры ў эпоху бронзы займалі паўднёва-ўсходнюю частку Беларусі, у якую цалкам уваходзіць і сучасная тэрыторыя Бабруйскага раёна. Вучоныя заўважылі, што сярэднедняпроўцы жылі пераважна на старых неалітычных паселішчах. Таму невыпадкова на помніках новакаменнага веку сустракаецца кераміка эпохі бронзы (Даманова, Сяліба, Міхалёва).

Сярэднедняпроўская культура праіснавала ўсю першую палову 2-га тысячагоддзя да н.э., а ў сярэдзіне 2-га тысячагоддзя яе змяніла сосніцкая культура, насельніцтва якой ўтварылася ад зліцця сярэднедняпроўскіх і неалітычных плямёнаў. Носьбіты новай культуры жылі ў паўзямляначных будынках з двухпакатымі дахамі і глінабітнымі вогнішчамі. Рэшткі паселішча эпохі позняй бронзы (канца 2 — пачатку 1-га тысячагоддзя да н.э.) ёсць каля вёскі Пятровічы — ва ўрочышчы Падкаленца знойдзены абломкі посуду.

Старажытныя ганчары ляпілі посуд высокай якасці і старанна апрацоўвалі яго паверхню, частка вырабаў аздаблялася. Па прызначэнні гэта былі гаршкі, міскі, кубкі, слоікі.

Самая, бадай, распаўсюджаная форма гаршкоў у сярэднедняпроўцаў — з акруглым тулавам, прыплюснутым ці закругленым дном і з высокай прамой лейкападобнай гарлавінай. Звычайна такія збаны мелі арнамент толькі на верхняй палове. Яны аздабляліся наразнымі лініямі і адбіткамі шнура. Насельніцтва сосніцкай культуры карысталася пераважна пласкадонным посудам. Апошні быў канічнай формы: пашыраўся да верху і звужаўся да дна, у верхняй частцы меў злёгку пазначаны венчык, крыху адагнуты вонкі. Арнаментам упрыгожвалася ўся паверхня гаршкоў. Узоры складаліся з перавернутых уніз вяршынямі трохвугольнікаў, якія ўтваралі пояс, шэраг зігзагаў, гарызантальных наразных палос і адбіткаў прамавугольнага штампа.

Апорнымі помнікамі для характарыстыкі бронзавага веку на Бабруйшчыне з'яўляюцца паселішчы сярэднедняпроўскай культуры каля вёскі Лучын, сосніцкай — каля Гадзівілавічаў у Рагачоўскім раёне. Помнік гэтай эпохі прадстаўлены ў адрозненне ад папярэдніх часоў не толькі паселішчамі, але і могільнікамі, што вельмі істотна для ўсебаковага ўяўлення аб чалавеку ў глыбокай старажытнасці. У першай палове 2-га тысячагоддзя да н.э. памерлых хавалі недалёка ад паселішчаў. Сародзічы ці сапляменнікі выкопвалі не вельмі глыбокую ямку прамавугольнай формы з закругленымі вугламі. У яе клалі нябожчыка галавой на захад, на правы альбо на левы бок у скурчаным становішчы і адпаведны набор рэчаў пры ім: каменныя свідраваныя сякеры, наканечнікі стрэл і коп'яў, нажы, скрабкі з крэменю, бронзавыя падвескі, дыядэмы, падвескі з янтару, посуд. Над пахаваным насыпалі курган вышынёй 3 м і дыяметрам да 30 м. Сярод добра вывучаных пахавальных помнікаў — могільнік паблізу вёскі Ходасавічы ў Рагачоўскім раёне. Ужо ў другой палове 2-га тысячагоддзя да н.э. насельніцтва сосніцкай культуры хавала памерлых як у курганах, так і без іх. Пераважаў звычай спальваць памерлых на вогнішчы, а затым хаваць рэшткі перапаленых касцей разам з посудам і некаторымі прадметамі. Асобныя пахаванні носьбітаў сосніцкай супольнасці даследаваны археолагамі каля вёсак Лучын і Ходасавічы ў Рагачоўскім раёне. Усё сказанае цалкам адносіцца да тагачаснага насельніцтва, якое жыло на тэрыторыі Бабруйскага раёна.

Самая галоўная адметнасць 2-га тысячагоддзя да н.э. — карыстанне вырабамі з бронзы. Менавіта ад гэтага і паходзіць назва — бронзавы век. Нельга сказаць, каб вырабаў з бронзы было надта многа. Яны прадстаўлены прыладамі працы — нажамі, шыламі, сякерамі (пальштабамі, віслаабуховымі з адтулінамі на канцы і кельтамі), зброяй — наканечнікамі коп'яў і ўпрыгожаннямі — вочкападобнымі падвескамі, скроневымі кольцамі, бранзалетамі, дыядэмамі, грыўнамі, бляхамі. Трэба зазначыць, што ў межах Беларусі няма сыравіны для выплаўкі бронзы. У час раскопак на паселішчах не знойдзена спецыяльных прыстасаванняў: гліняных тыгляў і льячак, якія б сведчылі аб мясцовай бронзаліцейнай справе. Таму ўсе бронзавыя рэчы траплялі да старажытнага насельніцтва ў гатовым выглядзе, як і янтар, шляхам абмену. Сярод знаходак з бронзы ў пахаваннях пераважаюць упрыгожанні, а прылад працы з гэтага каляровага металу вельмі мала. Можна лічыць, што не кожны радавы абшчыннік меў прыгожыя вырабы з бронзы. Усё гэта сведчыць аб няроўнасці сярод членаў тагачасных калектываў. Аддаленасць Беларусі ад металургічных цэнтраў не дазволіла выцесніць большасць каменных прылад працы ў бронзавым веку, з чым і звязана іх працяглае выкарыстанне аж да эпохі жалеза.

Пачатак эпохі жалеза звязаны з авалоданнем старажытнымі майстрамі спосабам атрымання жалеза з прыроднай сыравіны. Вучоныя лічаць, што гэты працэс пайшоў з поўдня Беларусі ўжо ў 7 ст. да н.э. Авалоданне металургіяй было справай складанай і марудная. Вось прыклад. Працягласць Беларусі з поўдня на поўнач каля 500 км. Першабытныя плямёны на поўдні рэспублікі пачалі атрымліваць жалеза ў 7—6 ст., а на поўначы — толькі ў 2—1 ст. да н.э. Для выплаўкі жалеза было дастаткова мясцовай балотнай руды, што садзейнічала пашырэнню гэтага рамяства.

Жалеза здабывалася прымітыўным спосабам у печах-домніцах, якія мелі звонападобную форму. Іх ляпілі з гліны. Каля падэшвы печы рабілі адтуліну-паддувала, а верх яе быў адкрыты. Праз верх у домніцу закладваліся ўперамешку дровы альбо вугаль і балотная руда. Печ запальвалі праз паддувала, а затым, каб падняць тэмпературу ў ёй, спецыяльнымі прыстасаваннямі ў выглядзе мяхоў удзімалі паветра. Пры высокай тэмпературы адноўленыя кропелькі жалеза сцякалі на дно печы. Калі домніца астывала, з яе даставалі шлакі і кавалкі жалеза. У час раскопак умацаваных паселішчаў каля вёсак Пятровічы і Шчаткава археолагамі знойдзены адходы металургіі — шлакі. На Шчаткаўскім гарадзі-

Прарэзка абарончых збудаванняў на гарадзішчы Пятровічы. 1988 г.

шчы іх сабрана 71 кавалак, а на Пятровіцкім — 313. Сярод шлакаў з гарадзішча Пятровічы трапіліся і два кавалкі жалеза невялікіх памераў. Такія знаходкі — з'ява вельмі рэдкая.

Атрыманне жалеза мела велізарнае значэнне для ўсяго грамадства. Яно паскорыла развіццё рамяства, земляробства і жывёлагадоўлі, што прывяло да павелічэння вытворчасці прадуктаў харчавання (збажыны, мяса), накаплення матэрыяльных каштоўнасцей. Паявілася маёмасная няроўнасць, што прывяло да абвастрэння супярэчнасцей паміж радавымі калектывамі. І каб прадухіліць небяспеку нападу, старажытныя людзі пачалі ўмацоўваць свае паселішчы. Так заканамерна ўзніклі гарадзішчы.

Яны не былі выключэннем у ранні жалезны век і на тэрыторыі Бабруйскага раёна. Старажытныя гарадзішчы ёсць каля вёсак Макаравічы, Міхалёва 2-е, Перасова, Продзвіна, Пятровічы, Шчаткава. З шасці гарадкоў, што захаваліся, вывучаны тры. Адзін, каля в. Шчаткава, даследаваны ў 1959 г. Я.Г.Краскоўскай і ў 1963 г. Л.Д.Побалем; другі (Пятровіцкае гарадзішча) раскопваў у 1987, 1988, 1990—93 гадах М.І.Лашанкоў. Атрыманыя матэрыялы даюць магчымасць рэканструяваць жыццё насельніцтва ранняга жалезнага веку недзе ў адрэзку паміж сярэдзінай 1-га тысячагоддзя да н.э. і пачаткам новай эры. Гарадзішчы функцыяніравалі ў другой палове, а то і ў апошняй чвэрці 1-га тысячагоддзя да н.э. Шчаткаўскае пабудавана на мысе высокага правага берага Бярэзіны, Пятровіцкае — на пясчаным невысокім узвышшы сярод правабярэжнага поплава рэчкі Брожкі. Першае мае пляцоўку каля 9 тыс. м^2, другое — каля 4,5 тыс. м^2. У час раскопак зафіксаваны рэшткі наземных жытлаў: паўзямлянкавае (Шчаткава) і слупавой канструкцыі (Пятровічы). На абодвух помніках знойдзены разбураныя вогнішчы. Частка заглыбленых у пясок ямак выкарыстоўвалася жыхарамі паселішчаў як скляпы. Акрамя жытлаў і гаспадарчых ям на пляцоўках захаваліся слупавыя ямкі ад розных гаспадарчых пабудоў. Раскопкі паказалі, што ўвесь гэты складаны жыццёвы комплекс размяшчаўся звычайна ўздоўж абарончых умацаванняў і ўтвараў замкнёны агульны двор. Менавіта тут, на пляцоўцы паселішча, нашы продкі захоўвалі прадукты харчавання і ўсё сваё багацце: лішкі зерня, статак жывёлы і розныя вырабы майстроў-рамеснікаў.

А вось як выглядалі ўмацаванні паселішчаў. Да нашага часу захаваліся земляныя валы шырынёй у падэшве каля 10—12 м і вышынёй да 1,5—2,5 м. Іх апаясвалі равы шырынёй 1,5—3 м і глыбінёй 0,5—1 м. Пляцоўка гарадзішча Шчаткава амаль цалкам абнесена валам. З напольнага боку ёсць дадатковыя ўмацаванні: другі вал шырынёй да 5 м і вышынёй 1,5 м. Адзін роў ідзе паміж унутраным і знешнім валамі, другі — са знешняга боку дадатковага вала. Глыбіня равоў каля 1 м. Земляныя збудаванні спалучаліся з узвядзеннем на іх яшчэ драўляных агароджаў: плота альбо тыну. Устаноўлена, што ўмацаванні паселішчаў неаднаразова перабудоўваліся, дапаўняліся новымі абарончымі элементамі.

Культурны пласт паселішчаў насычаны рознымі старадаўнімі рэчамі, сярод якіх ёсць вырабы з крэменю і іншых парод каменя, бронзы, жалеза, гліны, шкла. Усімі гэтымі прадметамі карысталася мясцовае насельніцтва. Аб занятках насельнікаў гарадзішчаў земляробствам сведчаць зерняцёркі, таўкачы, сярпы, серпавідныя нажы, сякеры. Зазначым, што ва ўмовах лясной паласы, Бабруйскага раёна ў прыватнасці, яно было падсечна-агнявое альбо ляднае. Жалезнымі сякерамі і агнём людзі адваёўвалі ў прыроды новыя палі, якія на працягу 4—5 гадоў давалі добрыя ўраджаі ячменю, проса, гароху, конскага бобу, вікі. Прадуктаў земляробства хапала не толькі для чалавека, але і для падтрымання жывёлы. Калі ж урадлівасць глебы зніжалася, а разам з ёю і ўраджаі, людзі распрацоўвалі новыя ляды.

Таму першабытныя калектывы пачалі жыць аседла, на адным месцы, па некалькі дзесяткаў, а то і сотняў гадоў. Жыхары гара-

дзішчаў валодалі прылеглай да іх паселішчаў пэўнай тэрыторыяй, на якой не толькі займаліся земляробствам, але і пасвілі статкі жывёлы. Яны гадавалі коней, буйную рагатую жывёлу, свіней, авечак, коз. На іншых паселішчах трымалі нават курэй.

Акрамя галоўных галін гаспадаркі насельніцтва гарадзішчаў займалася паляваннем, рыбалоўствам і збіральніцтвам (птушыныя яйкі, мёд дзікіх пчол, грыбы, ягады).

Ва ўмовах натуральнай гаспадаркі жыхары гарадзішчаў усё неабходнае выраблялі самі: выкоўвалі прылады працы, зброю, прадметы хатняга ўжытку. На паселішчах ранняга жалезнага веку сустракаюцца прадметы, звязаныя з ліццём бронзы. На гарадзішчах Шчаткава і Пятровічы знойдзены абломкі тыгляў — гліняных пасудзін накшталт чарачак, у якіх расплаўлялі бронзу. Усе вырабы з бронзы адносяцца да ўпрыгожанняў.

Мяркуючы па знаходках, у той час людзі займаліся апрацоўкай каменя і дрэва, лепкай посуду, прадзеннем, ткацтвам, пляценнем, шавецкай справай, вырабам скуры. жывёлы. З крэменю рабілі пераважна скрэблападобныя прылады для зняцця тлушчу са скур. Іншыя пароды каменя выкарыстоўваліся на зерняцёркі, таўкачы, тачыльныя брускі. З гліны ляпілі не толькі посуд, але і праселкі, пацеркі, прылады для бронзаліцейнай справы. Дрэва ішло пераважна на будаўніцтва жытлаў, абарончых агароджаў і для насадаў розных прылад працы. Знойдзеныя на Шчаткаўскім гарадзішчы дзве шкляныя караліны з'яўляюцца антычным імпартам. Такія знаходкі паказваюць, што яшчэ ў глыбокай старажытнасці насельніцтва, якое жыло ў межах сучаснага Бабруйскага раёна, падтрымлівала сувязі з антычным светам. Невядома, былі гэта прамыя кантакты або праз якіх-небудзь пасрэднікаў.

Вучоныя спрачаюцца: да якой археалагічнай культуры належала насельніцтва, што жыло на гарадзішчах Пятровічы, Халопенічы, Шчаткава і іншых? Адны лічаць, што ўсходнебеларускі варыянт культуры штрыхаванай керамікі (А.Р.Мітрафанаў). Другія знаходкі гэтага часу адносяць да сярэднебеларускага варыянта мілаградскай культуры (А.А.Егарэйчанка). Трэція выказваюць думку, што тут у змешаным стане ёсць матэрыялы трох археалагічных культур: мілаградскай, зарубінецкай і штрыхаванай керамікі (Побаль). Бясспрэчна адно, што на пачатак 1-га тысячагоддзя н.э. жыццё на гарадзішчах замірала, таму што людзі пачалі рассяляцца на селішчы. Пэўныя зрухі адбыліся і ў грамадскіх адносінах. Радавыя абшчыны на гарадзішчах складаліся з адной або некалькіх вялікіх патрыярхальных сем'яў. Узмацнілася маёмасная няроўнасць. Пачалі вылучацца малыя сем'і. Першабытнае грамадства дасягнула такога ўзроўню развіцця, калі стала магчымым самастойнае існаванне малой сям'і. Жыццё ў радавой абшчыне на гарадзішчы стала перашкодай для эканамічнай самастойнасці малых сем'яў, якія імкнуліся да адасаблення. Ініцыятыўныя і моцныя невялікія сем'і пакідалі гарадзішчы і сяліліся на неўмацаваных мясцінах — селішчах. Магчыма, у першых стагоддзях н.э. асобныя гарадзішчы працягвалі функцыяніраваць, бо змены ў грамадстве адбываліся не імгненна, а паступова.

Трэцяе гарадзішча, якое вывучалася шляхам раскопак — Міхалёўскі Гарадок, што на паўднёва-заходняй ускраіне в. Міхалёва 2-е. У 1996—1997 гадах М.І.Лашанкоў ускрыў на ім 178 м^2 пры таўшчыні культурнага пласта звыш 1 м. Устаноўлена, што помнік гэты шматслойны. Яму папярэднічала паселішча



Археалагічныя знаходкі з гарадзішча Пятровічы: 1 — бронзавае скроневае кольца 1-га ст. да н.э.; 2 — жалезная сякера-кельт; 3 — серп; 4 — гліняныя праселкі і загатоўкі іх з абломкаў сценак посуду.

позняга неаліту і ранняй бронзы (ніжні гарызонт). На ім — адкладанні жалезнага веку. Кераміка, праселкі, жалезныя прадметы эпохі жалеза — у сярэднім пласце гарадзішча. Прадметы верхняга слою адпавядаюць летапісным славянам-дрыгавічам (набор рэчаў з бронзы, жалеза, шкла, гліны, каменя). На Міхалёўскім умацаваным паселішчы знойдзены таксама дзве манеты: рымскі сярэбраны дэнарый і літоўскі бронзавы солід. Манета Рымскай імперыі вагой 2,43 г і дыяметрам 17,8 мм. На аверсе выява імператара Дэкарыя (?) або Адрыяна (?). Літоўскі солід вагой 1,13 г, дыяметрам 16 мм. Паводле заключэння У.М.Мілюціна гэта манета Рэчы Паспалітай, на ёй выява Яна II Казіміра Вазы (1649—68). Матэрыялы гэтага гарадзішча адносяцца да 1-га і пачатку 2-га тысячагоддзяў н.э.

Селішчы 1-га тысячагоддзя н.э. ёсць і ў Бабруйскім раёне. На жаль, іх да пачатку

Ахоўная дошка Міністэрства культуры Беларусі на гарадзішчы Міхалёва 2-е.



Рымскі дэнарый з гарадзішча Міхалёва 2-е.

1990-х гадоў было вядома толькі тры, і ўсе паблізу в. Шчаткава. Адно з іх раскопваў Побаль у 1963 г., а два астатнія ён толькі абследаваў. У 1990-я гады такія селішчы былі адкрыты каля населеных пунктаў Вуглы, Дзеднава, Міхалёва і на беразе воз. Вяхава.

Першае селішча знаходзіцца побач з гарадзішчам, на ўсход ад яго. Яно абмежавана з поўначы поплавам Бярэзіны, а з поўдня — забалочанай мясцовасцю. Тут былі знойдзены два жытлы — паўзямлянкі. Першая — прамавугольная ў плане, памерам 3,7 × 3,3 м, мела арыентацыю з паўночнага ўсходу на паўднёвы захад. Падлога — на глыбіні 0,79 м ад сучаснай паверхні. Ва ўсходнім кутку яе была разбураная печ-каменка. Падэшва печы — падковападобнай формы. Вусцем яна скіравана ў цэнтр жылля. Пры расчыстцы пабудовы знойдзены два нажы. У запаўненні паўзямлянкі трапляліся абломкі ад ляпных гаршкоў слабапрафіляванай формы.

Другая паўзямлянка, як і першая, таксама прамавугольнай формы з закругленымі вуглами, мела такую ж арыентацыю. Яна знаходзілася за 13 км на паўднёвы захад ад першай. Яе памер 3,55 × 3,2 м. Жытло заглыблена на 0,5 м у пясок. Сценкі звужаліся да падлогі. На ўзроўні падлогі памер памяшкання складаў 3 × 3 м. Рэшткі вогнішча зафіксаваны каля паўночна-заходняй сценкі, бліжэй да сярэдзіны быў уваход, ад якога захаваліся дзве прыступкі у заглыбленай частцы пабудовы. У межах памяшкання знойдзены кавалкі ляпной керамікі. Побач з другім жытлом была яма-склеп, авальная ў плане, плошчай каля 1 м^2 і глыбінёй 0,65 м. Увесь матэрыял раскопак дазваляе датаваць першае селішча каля вёскі Шчаткава 3—7 ст. н.э. Тут былі

сабраны таксама кавалкі керамікі эпохі бронзы, крамянёвыя прылады працы і частка каменнай сякеры. Відаць, гэтыя мясціны цікавілі людзей і ў бронзавым веку, магчыма, недзе тут было іх паселішча.

Другое селішча знаходзіцца за 0,5—0,8 км на паўднёвы захад ад гарадзішча, на правым беразе ручая, каля яго ўпадзення ў Бярэзіну. Трэцяе — за 1,2 км на захад ад гарадзішча, побач з піянерлагерам. Яно цягнецца на 0,15 км уздоўж правага нізкага берага Бярэзіны. На абодвух помніках сабрана грубаляпная кераміка. Пад'ёмны матэрыял і даследаванні раскопак даюць падставу меркаваць, што ўсе тры селішчы ўзніклі адначасова недзе пасля 2 ст. н.э. і праіснавалі, як і Тайманаўскае ў Быхаўскім раёне, амаль да 9 ст. н.э. Матэрыялы селішчаў адпавядаюць пераважна другой і трэцяй чвэрцям 1-га тысячагоддзя і добра суадносяцца са старажытнасцямі калочынскай і кіеўскай культур. Менавіта ў гэтых культурах даследчыкі знаходзяць шэраг элементаў, уласцівых ранняму славянскаму сярэднявеччу. Большасць вучоных не аспрэчвае ўсходнеславянскую прыналежнасць такіх помнікаў, як Шчаткаўскія селішчы. У час функцыяніравання селішчаў познезарубінецкай культуры, як іх называе Л.Д.Побаль, гарадзішчы іншы раз выконвалі ролю часовых сховішчаў пры небяспецы. Гэту думку пацвярджаюць знаходкі керамікі разглядаемага перыяду на гарадзішчы каля в. Міхалёва 2-е.

А.У.Ільюцік у 1996—1997 гадах раскопвала селішча Дзеднава, што на паўднёва-заходняй ускраіне Бабруйска. Помнік размяшчаецца на левым беразе р. Бабруйкі і займае тэрыторыю прыкладна 100 × 300 м. На даследаванай плошчы (400 м^2) раскопак — два вогнішчы, шмат ям гаспадарчага прызначэння і слупавых. Большасць керамічнага матэрыялу абмяжоўваецца 2—5 ст. н.э. Невялікую колькасць абмломкаў посуду можна звязваць з трэцяй ці чацвёртай чвэрцямі 1-га тысячагоддзя н.э. Старажытныя прадметы зроблены з гліны, жалеза, бронзы, шкла. Дзве жалезныя фібулы і манета вызначаюць ранні час узнікнення селішча Дзеднава (на рубяжы 2-га і 3-га ст.). Знойдзена бронзавая манета дыяметрам 3,3 см, вагой 21,3 г. На яе аверсе — выява рымскага імператара Антонія Пія, які памёр у 161-м г. н.э. А выпушчана гэта манета ў перыяд праўлення Марка Аўрэлія (161—180 н.э.). На гэтым паселішчы ёсць матэрыялы перыяду Кіеўскай Русі. Пазней на ім жылі і дрыгавічы. Тут знойдзены адмыслёўловы жалезны лучнік для мацавання лучыны. Старажытнасці дрыгавічоў датуюцца 10—13 ст.

Галоўны занятак жыхароў паселішчаў — земляробства, жывёлагадоўля і рамяство. Большасць вучоных сыходзіцца на думцы, што ў апошняй чвэрці 1-га тысячагоддзя н.э. на змену падсечна-агнявому ці ляднаму земляробству прыходзіла ворнае. Форма сярпоў стала больш дасканалай, павялічыліся іх памеры. Селішчы гэтага часу размяшчаліся каля найбольш урадлівых мясцін. Вядомы быў



Бронзавыя ўпрыгожанні і рэчы з помнікаў дрыгавічоў: 1, 5—9 — зярнёныя пацеркі; 2—4, 10 — трохпацеркавыя скроневыя кольцы, 11—19 — пярсцёнкападобныя скроневыя кольцы з заходзячымі канцамі і завіткамі на канцах (14—16); 20 — падвеска-конік; 21—26 — манетападобныя падвескі; 27 — якарападобная падвеска; 28, 29 — падковападобныя зашпількі; 30 — бразготка; 31 — бранзалет; 32—34 — пярсцёнкі вітыя; 35, 36 — спражкі прамавугольная (35) і ліраподобная (36); 37 — месяцападобная падвеска; 38 — праселка (глінянае); 1, 5, 21—24 — рэчы з гарадзішча Міхалёва Бабруйскага р-на, 30 — гарадзішча Паліцкае Асіповіцкага р-на (раскопкі М.І.Лашанкова), 2—4, 6—20, 25—29, 31—38 — з курганоў, раскапаных У.З.Завітневічам.

ужо і плуг: яго рабочыя часткі (наральнік і чарэсла) знойдзены ў культурным слоі гарадзішча Хатомель, што ў Столінскім раёне Брэсцкай воблаці. Далейшае развіццё атрымалі металургія, кавальская справа. Палепшылася тэхналогія, а разам з ёю і якасць вырабаў з жалеза і сталі.

У другой палове 1-га тысячагоддзя н.э. адбываўся паступовы пераход ад першабытнаабшчыннага ладу да феадалізму. Кроўныя сувязі паміж членамі патрыярхальна-радавой абшчыны паступова страчвалі сваё значэнне. На змену ім прыходзілі суседска-тэрытарыяльныя сувязі. Патрыярхальная вялікасямейная абшчына змянялася на сельскую, у якой перавага была за індывідуальнай сям'ёй. Эканамічныя і тэрытарыяльныя сувязі сельскіх абшчыннікаў садзейнічалі росту прыватнай уласнасці і развіццю класавага грамадства. Сельскія абшчыны з манагамнымі сем'ямі спрыялі стварэнню новай грамадскай арганізацыі — саюзу плямёнаў, галоўная мэта якога зводзілася да ўзброенай абароны агульных інтарэсаў. У гэты час сваю ўладу над абшчынамі ўзмацняла племянная знаць, што было адной з перадумоў утварэння дзяржавы.

Летапіс «Аповесць мінулых часоў» называе сярод этнічных груповак славян Усходняй Еўропы саюз плямён дрыгавічоў, якія мелі нават сваё княства напярэдадні ўтварэння старажытнарускай дзяржавы. Жылі яны ў басейне ракі Прыпяць і займалі вялікую тэрыторыю паўднёвай і цэнтральнай Беларусі. На ўсходзе яны межавалі з радзімічамі на Дняпры. На поўначы граніца з крывічамі ўмоўна праходзіла недзе па лініі Новы Быхаў—Барысаў—Заслаўе. Басейн сярэдняй і ніжняй Бярэзіны разам з Бабруйскім раёнам у 9—8 ст. быў дрыгавіцкай тэрыторыяй.

Помнікі летапісных дрыгавічоў прадстаўлены на Бабруйшчыне селішчамі, адзіночнымі курганамі і курганнымі могільнікамі. Вельмі добрае і пакуль што адзінае ў раёне паселішча дрыгавічоў ёсць на левым узвышаным беразе рэчкі Ала, побач з гарадзішчам у вёсцы Міхалёва 2-е. Цяпер на ім праклалі вуліцу, пабудавалі дамы і сеюць агароды. Адзіночныя курганы ёсць каля вёсак Банёўка, Каменка, Макаравічы, Сулева, Красны Агарод. Усяго каля 18 населеных пунктаў размешчаны 22 курганныя групы, у якіх прыкладна 565 курганоў.

Дрыгавіцкія старажытнасці ў рэспубліцы вывучаны добра. Вядома, што гэтым плямёнам быў уласцівы спачатку абрад пахавання трупаспаленне, а пазней — трупапалажэнне. У 9 — першай палове 10 ст. панаваў звычай спальваць нябожчыка двума шляхамі: убаку ад пахавальнага кургана (а ў насып змяшчаліся толькі рэшткі перапаленых касцей з вугалькамі) і непасрэдна ў кургане. Звычай хаваць памерлых без спальвання з'явіўся толькі ў канцы 10 ст. У дрыгавічоў існавала некалькі варыянтаў або спосабаў хаваць памерлых у курганных насыпах: на гарызонце (на ўзроўні глебы), на падсыпцы ў насыпе кургана і ў магільнай яме пад курганом. У 9 курганах паблізу вёскі Старая Шараёўшчына, раскапаных яшчэ У.З.Завітневічам у 1893 г., нябожчыкі ляжалі на гарызонце, галавой на захад. Каля іх былі гаршкі, пацеркі, скроневыя кольцы, завушніцы, пярсцёнкі. У 1989 г. Т.М.Каробушкіна раскапала 5 з 18 курганоў у могільніку, што за 2 км на паўднёвы захад ад вёскі Сычкава, ва ўрочышчы Прыстань, на ўскрайку лесу. У чатырох насыпах знойдзены рэшткі нябожчыкаў, пахаваных па абраду трупапалажэння. Адзін з курганоў быў без пахавання. У трох курганах нябожчыкі ляжалі галавой на захад, а ў чацвёртым — на ўсход. Гэта быў мужчына ва ўзросце 25—30 гадоў. Ён трымаў у правай руцэ нож даўжынёй 16 см, на грудзях у яго ляжалі крэсіва і кавалак крэменю, а з левага боку — жалезны прадмет, які дрэнна захаваўся. Каля ног спачылага стаяла драўлянае вядзерца, ад якога захаваліся жалезныя абручы, дужка і вушкі.

На цемені чэрапа была адтуліна, зробленая вострым прадметам. Магчыма, як лічыць Т.М.Каробушкіна, тут пахаваны воін. У адным з раскапаных курганоў знойдзены рэшткі трох пахаванняў: двух дарослых і дзіцяці. Антрапалагічнае вызначэнне паказала, што жанчына мела ўзрост каля 60 гадоў, а дзіця — каля 2—3 гадоў. На адным з пальцаў левай рукі жанчыны быў сярэбраны пярсцёнак, зроблены з чатырох пераплеценых дроцінак. Каля ног нябожчыцы стаяла драўлянае вядро. Жанчына пахавана ў труне, абпаленай з унутранага боку. Атрыманыя ў час раскопак матэрыялы дазваляюць датаваць Сычкаўскі могільнік 11 ст. Знаходкі рэчаў і рысы пахавальнага абраду пераканаўча сведчаць, што тут хавалі ўсходніх славян — летапісных дрыгавічоў, якія жылі на селішчы недзе паблізу ад могільніка.

Надзвычай яскравая этнавызначальная рыса дрыгавічоў — зярнёныя пацеркі з бронзы. Гэтыя ўпрыгожанні ў раскапаных курганах каля Сычкава не знойдзены. Але бронзавыя зярнёныя пацеркі дрыгавічоў знаходзіў

Н.Мышанкоў у 1888 г. ў час раскопак курганоў каля вёскі Макаравічы.

Сельскія паселішчы носьбітаў дрыгавіцкай супольнасці вывучаны слаба. Асновай іх гаспадаркі ў канцы 1-га тысячагоддзя н.э. былі ворнае земляробства ў форме двух- і трохполля і жывёлагадоўля. Жыхары паселішчаў займаліся дадатковымі промысламі: паляваннем, рыбалоўствам, бортніцтвам. У гэты час гаспадарка малой сям'і існавала самастойна. Укараняліся гандлёвыя сувязі як паміж сапляменнікамі, так і з насельніцтвам іншых плямён. Далейшае развіццё атрымала і рамяство. Паступовае аддзяленне яго ад сельскай гаспадаркі спрыяла ўзнікненню гарадоў. Калі сельскія паселішчы дрыгавічоў у межах Бабруйскага раёна вядомы, то старажытных гарадоў на гэтай тэрыторыі няма. Амаль усе яны на поўдні Беларусі: Тураў, Пінск, Брэст, Слуцк, Клецк, Мазыр, Капыль, Рагачоў.

У другой палове 9—10 ст. землі дрыгавічоў увайшлі ў склад старажытнарускай дзяржавы — Кіеўскай Русі. А на тэрыторыі рассялення дрыгавічоў у канцы 1-га тысячагоддзя ўтварылася Тураўскае княства, якое выдзелілася са складу Кіеўскай Русі і дасягнула найбольшай магутнасці ў 11 ст. Затым Яраслаў Мудры яго зноў уключыў у склад Кіеўскай Русі. У той час у славянскіх плямён, што насялялі тэрыторыю Беларусі, завяршыўся пераход ад першабытнаабшчыннага ладу да феадалізму. У межах старажытнарускай дзяржавы ўсходнеславянскія плямёны складваліся ў адзіную старажытнарускую народнасць, якая была абумоўлена эканамічнымі сувязямі, тэрытарыяльнай, этнічнай, моўнай, культурнай і палітычнай супольнасцю.

Нельга выключаць наяўнасці паселішчаў дрыгавічоў у эпоху Кіеўскай Русі на месцы сучаснага Бабруйска. Рэшткі селішча таго часу тут былі зафіксаваны Л.Д.Побалем. Сам Бабруйск разросся і пасля неаднаразовай перапланіроўкі густа забудаваны. І месца той вёскі, якая папярэднічала гораду, цяпер цяжка вызначыць, як і аднавіць далетапісную гісторыю горада.

Ёсць на бабруйскай зямлі не толькі ранне-, але і познесярэдневяковыя археалагічныя помнікі — каля вёскі Даманова. У 16—17 ст. людзі жылі тут на невысокім узвышшы ў поплаве каля ракі. Цяпер жа гэты помнік разбураецца ракой, якая падмывае правы бераг побач з сучаснымі могілкамі. У супеску цёмна-шэрага, а месцамі і чорнага колеру — рэшткі драўляных пабудоў, абломкі посуду, шкла, косці жывёлы, камяні. Час паселішча вызначаны па рэштках глінянага посуду.

Асноўныя крыніцы

Артеменко И.И. Племена Верхнего и Среднего Поднепровья в эпоху бронзы. М., 1967; Бронзовый век // Очерки по археологии Белоруссии. Мн., 1970. Ч. 1; Завитневич В.З. Археологические разыскания в бассейне р. Березины, произведенные летом 1893 г. // Чтения в историческом обществе Нестора-летописца. Киев, 1894. Кн. 8; Исаенко В.Ф. Археологическая карта Белоруссии. Вып. 1, 3. Мн., 1968, 1976; Калечиц Е.Г. Памятники каменного и бронзового веков Восточной Белоруссии. Мн., 1987; Каробушкіна Т. Аб чым расказалі курганы // Трыбуна працы. 1989. 3 і 5 кастрычніка; Ксянзоў У.П. Помнікі каменнага веку ў сярэднім цячэнні ракі Бярэзіна // Помнікі культуры: Новыя адкрыцці. Мн., 1985; Яго ж. Палеолит и мезолит Белорусского Поднепровья. Мн., 1988; Лашанкоў М. Дрэмле памятка дзён // Звязда. 1988. 9 снежня; Яго ж. Часоў жалезнага веку... // Магілёўская праўда. 1989. 13 кастрычніка; Яго ж. Маўклівыя сведкі нашай гісторыі // Трыбуна працы. 1988. 15 снежня; Яго ж. Выпадковыя знаходкі // Там жа. 1991. 10 кастрычніка; Яго ж. Раскопкі на гарадзішчы Пятровічы // Там жа. 1992. 27 мая; Яго ж. Гарадок каля Пятровічаў // Там жа. 1993. 14 красавіка; Яго ж. Раскопкі ў Пятровічах // Там жа. 1994. 31 жніўня; Яго ж. Археалагічны нарыс Бабруйскага раёна // Там жа. 1994. 9, 16, 23 лістапада, 14, 21 снежня; Яго ж. Аб чым маўчыць Міхалёўскі Гарадок // Там жа. 1997. 22 кастрычніка; Яго ж. Культурная прыналежнасць гарадзішча Міхалёва Бабруйскага раёна // Гісторыя Беларусі: жалезны век і сярэднявечча: Да 70-годдзя з дня нараджэння Г.В.Штыхава: [Тэз. дакл. навук. канф.]. Мн., 1997; Лысенко П.Ф. Дреговичи. Мн., 1991; Мышенков Н. Курганы Бобруйского уезда Минской губернии: (Исследования 1888 г.) // Вестник археологии и истории. СПб., 1892. Вып. 9; Поболь Л.Д. Поселения железного века около д. Щатково Бобруйского района // Белорусские древности. Мн., 1967; Яго ж. Славянские древности Белоруссии. Мн., 1974; Яго ж. Археологические памятники Белоруссии. Железный век. Мн., 1983; Штыхов Г.В. Археологическая карта Белоруссии. Вып. 2. Мн., 1971.

М.І.Лашанкоў, кандыдат гістарычных навук.

У СКЛАДЗЕ ПОЛАЦКАГА І ТУРАЎСКАГА КНЯСТВАЎ

З 10 ст. паўночная частка сучаснай тэрыторыі Бабруйскага раёна ўваходзіла ў Полацкае, паўднёвая — у Тураўскае княствы. Полацкае княства існавала ў 10—13 ст., належала прадстаўнікам князёў Рагвалодавічаў. Пры полацкім князю Усяславе Брачыславічу (Чараўніку, 1044—1101) Полацк дасягнуў найбольшага росквіту. Полацкае баярства, баючыся актыўнасці гараджан і агрэсіі крыжакоў, пайшло на кампраміс з літоўскімі фе-



Адзенне старажытных часоў на Беларусі: 1—княжацкае 11—12 ст.; 2 — баярскае 12— 13 ст.; 3 — гараджан 12—13 ст.; 4—5 — воінаў 11—12 ст.; 6 — літоўскага воіна 14 ст.; 7—10 — военачальнікаў Вялікага княства Літоўскага; 11—12 — магнатаў 16—17 ст.; 13 — сялян 15 ст.

адаламі і ў 2-й палове 13 ст. запрасіла іх на княжанне ў горад. З 1387 г. Полацкае княства — у складзе Вялікага княства Літоўскага. Тураўскае княства знаходзілася ў паўднёвай Беларусі (басейн Прыпяці). У 988 г. вялікі кіеўскі князь Уладзімір Святаслававіч аддаў Тураў і яго землі свайму сыну Святаполку (988—1015). Пасля смерці Уладзіміра Святаслававіча ў 1015 г. Святаполк перайшоў на вялікае княжанне ў Кіеў, застаўшыся адначасова і тураўскім князем. У 20-я гады 12 ст. Тураўская зямля пазбавілася палітычнай самастойнасці, аднак і ў складзе Кіеўскай Русі заставалася цэльным княствам. З канца 50-х гадоў 12 ст. Тураўскае княства канчаткова вылучылася з Кіеўскай зямлі. Пазней яно падзялілася на асобныя ўдзельныя княствы — Тураўскае, Клецкае, Пінскае, Слуцкае і інш. Тураў перайшоў ва ўладанне князя кіеўскага. У 1158 г. князь Юрый Яраславіч дамогся незалежнасці Тураўскага княства і аднавіў тут дынастыю Ізяславічаў. Але пры яго сынах у 1180-х гадах княства страціла самастойнасць. З яго вылучыліся іншыя княствы. У канцы 13 — пачатку 14 ст. Тураўскае княства ўвайшло ў склад Вялікага княства Літоўскага.

У СКЛАДЗЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

Гэта была магутная феадальная дзяржава на тэрыторыі Беларусі і Літвы, Украіны, часткі Расіі. Узнікла пры князі Міндоўгу (1230—1263), які ў 1253 г. прыняў тытул караля (каранаваўся ў Новагародку, цяперашнім Навагрудку). Гэты старажытны горад быў сталіцай новай дзяржавы, з 1323 г. сталіцу перанеслі ў Вільню. У 1659 г. Вялікае княства Літоўскае і Польшча аб'ядналіся, утварыўшы федэратыўную дзяржаву Рэч Паспалітую. Вялікае княства Літоўскае вызначалася высокім на той час узроўнем развіцця эканомікі, адукацыі, культуры, прагрэсіўнымі прынцыпамі дзяржаўнасці.







Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г. Раздзел 10, артыкулы 8, 9, 10.

Тытульны ліст Статута Вялікага княства Літоўскага 1588 г.

Выдатным помнікам прававой культуры і юрыдычнай думкі таго часу з'яўляецца Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г. Гэты звод законаў займае пачэснае месца сярод такіх сусветна вядомых помнікаў права, як законы Хамурапі, законы Ману, Законы дванаццаці табліц, кодэкс Юсцініяна, Руская праўда і інш. На працягу 250 гадоў Статут быў дзеючым законам, складаў аснову ўсёй прававой сістэмы Вялікага княства Літоўскага. Мы змяшчаем фотакопію тытульнага ліста, а таксама выгрымкі са Статута. Звярніце ўвагу, як дэталёва ў ім рэгламентаваны жыццядзейнасць тагачаснага грамадства: не засталіся без увагі сакаліныя і лебядзіныя гнёзды, бабровыя гоны, хмелішчы, што спрыяла ахове прыродных багаццяў і Бабруйшчыны. У кнізе змяшчаюцца таксама партрэты вялікіх князёў Вялікага княства Літоўскага, подпісы якіх стаяць пад дакументамі (гл. ў раздзеле «Дакументы сведчаць»), што непасрэдна адрасаваліся ўладам і жыхарам Бабруйскай воласці (староства).

Бабруйская воласць (пазней Бабруйскае староства) была дзяржаўным уладаннем у гэтым княстве (гл. артыкул Бабруйская воласць у раздзеле «З гісторыі адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу»). Яна была падзелена на дзве часткі («палавіцы»): паміж вялікім князем Вялікага княства Літоўскага Альгердам і яго суправіцелем Кейстутам. Адна «палавіца» называлася віленскай (па рэзідэнцыі Альгерда ў Вільні), другая — троцкай (па рэзідэнцыі Кейстута ў Троках). Кіравалі воласцю два намеснікі, якіх прызначаў вялікі князь звычайна з ліку буйных баяр, а таксама два старцы, якія выбіраліся з ліку сялян. Кожны старац у сваёй палавіне канцэнтраваў збор падаткаў і выкананне ўсіх павіннасцей. Старац меў права пасадзіць вінаватага ў астрог (турму). За сваю службу ён меў дзве валокі зямлі, якія вызваляліся ад усіх падаткаў і павінностей, атрымліваў іншыя пабочныя даходы за выкананне судовых і адміністрацыйных спраў.

Старац меў памочнікаў, якія называліся заказнікамі. Яны выбіраліся з ліку надзейных асоб жыхарамі сяла. У абавязкі заказнікаў уваходзілі разбор скаргаў насельніцтва, падтрыманне парадку ў сяле. За сваю службу заказнік карыстаўся адной валокай зямлі, якая была вызвалена ад падаткаў і павінностей. За раскрыццё патраў ці іншых парушэнняў заказнік атрымліваў ад вінаватага на сваю карысць 1 грош.

Старац выступаў пасрэднікам паміж воласцю і ўладаю, пры дапамозе заказнікаў размяркоўваў павіннасці, збіраў падаткі з прыгонных сялян.

Асноўнай адзінкай падаткаабкладання сялян на той час быў дым — назва сялянскай гаспадаркі, якая звычайна вялася адной сям'ёй. Гэты прынцып не ўлічваў колькасці і якасці зямлі ў адным дыме і таму быў малаэфектыўны для феадалаў. Каб павысіць свае даходы, яны імкнуліся ўдасканаліць сістэму землекарыстання і абкладання сялян павіннасцямі. З гэтай мэтай у Вялікім княстве Літоўскім у 2-й палове 16 — 1-й палове 17 ст. праводзілася аграрная рэформа, якая ўвайшла ў гісторыю як валочная памера. У красавіку 1557 г. вялікі князь Жыгімонт II Аўгуст

зацвердзіў «Уставу на валокі» — закон аб правядзенні валочнай памеры. У яго аснове ляжаў абмер зямель на стандартныя зямельныя ўчасткі — валокі (21,36 га).

Пры гэтым валочная памера ажыццяўлялася і ў велікакняжацкіх і прыватнаўласніцкіх маёнтках. Справа ў тым, што з развіццём таварна-грашовых адносін збор натуральных і грашовых падаткаў не задавальняў землеўладальнікаў. Яны разумелі, што калі стварыць свой двор і фальварак, то можна істотна павялічыць даходы. Таму адной з важных задач валочнай памеры было пашырэнне фальваркаў, забеспячэнне іх рабочай сілай. У кожным маёнтку (двары) быў свой землямер (каморнік), які падпарадкоўваўся старцу воласці. За сваю работу ён меў 1 валоку зямлі і вызваляўся ад усіх павіннасцей, акрамя падатку.

У Бабруйскай воласці валочная памера праводзілася ў 1598—1639 гадах рэвізорамі, прызначанымі каралём. Вядома, што ў маёнтку Любонічы і навакольных вёсках памеру ажыццяўлялі каралеўскія рэвізоры П.Кавецкі, М.Палюбінскі, Я.Корсак і іншыя. З 1626 г. яе праводзіў пісар Рэчыцкага староства С.Рагаза. А завяршыў валочную памеру і склаў падрабязны спіс Бабруйскага староства каралеўскі рэвізор Яўстафій Кердзей, гродзенскі падсудак. Частка гэтых вопісаў-інвентароў Бабруйскага староства (воласці) змешчана ў 1-м томе зборніка «Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах». У нашым раздзеле выкарыстаны многія дакументы, таблічныя матэрыялы і іншыя звесткі з гэтага зборніка.

Як жа рэальна праводзілася і што дала гэта аграрная рэформа? Каралеўскія рэвізоры «поровняли грунты», гэта значыць звялі сялянскія землі ў адзіны кавалак (абруб) і падзялілі на валокі. Тым самым была ліквідавана цераспалосіца і адначасова вызначана якасць кожнага зямельнага надзела. Валока павінна была мець чатырохвугольную форму і дзяліцца на 3 полі — для замацавання трохпольнай сістэмы. Сялянскія сялібы рэкамендавалася пераносіць на сярэднія палі, хаты размяшчаць па адзін бок вуліцы, гаспадарчыя пабудовы — па другі. У якасці асноўнай адзінкі абкладання была ўведзена служба — надзел ворнай зямлі ў адну валоку, якой карысталіся ў сярэднім дзве сям'і.

Паводле архіўных звестак, да рэформы ў кожнай з «палавіцаў» Бабруйскай воласці было больш за 100 службаў, асобнае дзяржаўнае ўладанне ўтвараў маёнтак Любонічы з прылеглымі сёламі. У выніку валочнай памеры замест службаў намерана 475 аселых валок, на якіх размяшчалася каля 1 тыс. сялянскіх двароў.

У цэлым валочная памера забяспечыла пашырэнне фальваркаў, павялічыла даходы землеўладальнікаў і запрыгоніла сялян. Пра гэта сведчаць звесткі з вопісаў-інвентароў Бабруйскага староства 1611—1639 гг. З табліцы 1 можна меркаваць пра стан панскіх двароў у вёсках Брожа, Ольса, Мішкава (Ясналессе) і Парычы.

У час правядзення валочнай памеры і пасля яе вёскі Бабруйскага староства, як і раней, належалі асобным дварам. А ўсё Бабруйскае староства ў 1630-х гг. знаходзілася ва ўладанні Пятра Трызны і яго жонкі Ганны Масальскай, якія ў свой час унеслі папярэдні водкуп (аванс) у каралеўскую казну, што дало ім магчымасць пажыццёвага карыстання ўсімі правамі на ўладанне Бабруйскім староствам. Трызне і Масальскай належаў Брожскі двор з вёскамі Брожа, Гарбацовічы, Зелянковічы, Кабылічы, Коўчыцы, Кузьмічы, Казловічы Старыя і Новыя, Макаравічы, Панкратавічы, Пятровічы, Тажылавічы. Шмат якія з гэтых

Табліца 1

Панскія двары Бабруйскага староства ў першую трэць 17 стагоддзя

№№	Двор	Ворыва		Валокі, вымераныя па сёлах	Валок заселеных	У сярэднім на дворную валоку сялянскіх	На адну дворную заселеных валок сялянскіх	З вымеран. валок паншчыны на тыдзень	Фактычны лік паншчыны на тыдзень
		Валокі	Маргоў						
1	Ольса	4	14	88	34	19,5	7,5	176	68
2	Брожа	14	32	344	104	22,26	6,95	688	208
3	Мішкава	13	—	365	155	28,07	11,5	730	318
4	Парычы	9	—	257,5	127,5	28,6	14,1	515	255
Усяго		41	46	1054,5	420,5	24,6	10,2	2109	841

вёсак цяпер уваходзяць у Бабруйскі р-н. Асабіста ж П.Трызне ў Віленскай «палавіцы» належалі вёскі Дзямідавічы і Кольчыцы, у трокскай — двор Яснаполле (Мішкавічы), Аўсімовічы, Варатынь, Вітлін, Глыбокавічы, Дваранінавічы, Кавалёва, Качэрычы, Міхалёва, Паўлавічы, Плёсы, Полькавічы, Хомічы, Цейкавічы.

Пэўнае ўяўленне аб стане сялянскіх гаспадарак дае табліца 2.

Як відаць з табліцы 2, усяго ў старостве было 536 сялянскіх гаспадарак. Яны апрацоўвалі 382 валокі зямлі. У іх было 709 коней і 1501 вол. Усе сяляне жылі ў 50 вёсках і сёлах Бабруйскага староства. Паводле нацыя-

Табліца 2

Сялянская гаспадарка ў Бабруйскім старостве ў першай трэці 17 ст.(групоўкі па колькасці рабочай жывёлы)

№№	Групы	Гаспадар		Сем'і		Дзеці		Зямля		Валы		Коні	
		Колькасць у групе	± % ад усіх	Колькасць сямей	± % ад усіх	Колькасць у групе	± % ад усіх	Валок у групе	± % ад усіх	Колькасць у групе	± % ад усіх	Колькасць у групе	± % ад усіх
1	Без рабочай жывёлы	25	4,7	31	3,8	5	0,4	14,91	3,9	—	—	—	—
2	Па 1/2 галавы	30	5,6	34	4,1	45	3,4	12,91	3,4	30	2	—	—
3	Па 1 галаве	58	10,8	73	8,8	107	8,2	29,75	7,8	100	6,6	26	3,7
4	Па 2 галавы	195	36,4	253	30,5	366	28,1	119,48	31,2	386	25,7	160	22,6
5	Па 3—4 галавы	163	30,4	285	34,4	521	40	137,98	36,1	603	40,2	291	41
6	Па 5 і больш галоў	65	12,1	153	18,4	259	19,9	67,41	17,6	382	25,5	232	32,7
Усяго		536	100	829	100	1303	100	382,44	100	501	100	709	100

Табліца 3

Сялянскія і індывідуальныя гаспадаркі Брожскага ключа Бабруйскага староства ў першай трэці 17 стагоддзя

№№	Група	Гаспадарка	% да групы ўсіх	% да ўсіх гаспадарак	Сыноў	% да ўсіх у групе	% да ўсіх гаспадарак	Валок	% да групы	% да ўсіх гасп. вёсак	Коней	% да групы	% да ўсіх вёсак	Валоў	% да групы	% да ўсіх
1	Без рабочай жывёлы	10	14,2	—	8	5,2	—	3,83	9,5	—	—	—	—	—	—	—
2	Па 1—2 галавы	37	52,1	—	75	48,1	—	18,83	47,2	—	26	34,7	—	70	43,2	—
3	Па 3—4 галавы	19	26,7	—	57	36,5	—	12,33	30,8	—	30	43,5	—	64	39,5	—
4	Па 5 і больш галоў	5	7	—	16	10,2	—	5	12,5	—	13	18,8	—	28	17,3	—
Усяго		71	100	49,3	156	100	36,4	39,99	100	38,2	69	100	32,4	162	100	33,9

нальнага складу тут жылі беларусы, палякі, немцы, латышы, рускія (стараверцы).

Звесткі табліцы 2 сведчаць і аб расслаенні сялянства. Да гэтага варта нагадаць, што ў сялянскім асяродку існавалі таксама чыншавыя (194), індывідуальныя (312), сябрынна-сваяцкія (157) сябрынна-чужацкія (67) гаспадаркі, якія ў сваю чаргу падзяляліся на багатыя і бедныя. Прыкладна такое ж становішча было і ў сялян Брожскага ключа Бабруйскага староства (гл. табліцу 3).

Паводле «Уставы на валокі» прыгонныя сяляне выплачвалі натуральныя і грашовыя падаткі. У Бабруйскім старостве, згодна з інвентаром 17 ст., гэты падатак складаў: 2 капы грошай, 1 бочку аўса, 1 бочку жыта, 2 курыцы, 1 гусака, 12 яек, 1 воз сена, 10 вазоў дроў. Акрамя таго, у якасці падатку аддаваўся і мёд (у залежнасці ад колькасці бортных дрэў). Кожны ўтрымальнік валокі быў абавязаны два разы ў тыдзень працаваць на гаспадарскім двары са сваімі харчамі, 12 дзён у год выконваць работы паводле распараджэння валасной адміністрацыі і 4 дні ў год рамантаваць ваенныя ўмацаванні ў Бабруйскім замку. Акрамя таго, сяляне неслі варту («старажоўшчыну») Бабруйскага замка, якую ў кожным канкрэтным выпадку вызначаў старац воласці.

Сяляне Бабруйскага староства, як і паўсюдна на Беларусі, супраціўляліся новаму землеўпарадкаванню, ухіляліся ад выканання закону, які рэгламентаваў адміністрацыйнае кіраванне. Яны адмаўляліся выконваць павіннасці, на працягу 1611—1613 гадоў знішчылі ўсе межавыя знакі.

Польскі каралъ і вялікі князь Вялікага княства Літоўскага Жыгімонт III Ваза абавязаў рэвізораў неадкладна аднавіць гэтыя знакі і сурова пакараць вінаватых. Старцам і заказнікам было дадзена права жорстка распраўляцца з непаслухмянымі сялянамі, якія адмаўляліся браць валокі для свайго землекарыстання. Таму пасля заканчэння зямельнай рэформы каля 70% сялян Бабруйскага староства апрацоўвалі каля паловы валок, падрыхтаваных для іх карыстання. У той жа час звыш паловы зямельных плошчаў пуставала.

Супраціўленне сялян было настолькі моцным, што ў 1611 г. вялікі князь Вялікага

Табліца 4

Становішча прыгоннага сялянства Брожскага ключа Бабруйскага староства ў 1765 г.

№№	Група	Дымы		% да ўсяго сял. ключа	Сям'я		% да ўсяго сял. ключа	Коні		% да ўсіх коней сялян. ключа	Валы		% да ўсіх валоў сялян. ключа
		Ліх дымаў	% да груп		Душ на групу	% да групы		галоў	% да груп		галоў	% да груп	
1	Без рабочай жывёлы	18	11,1	—	56	5,7	—	—	—	—	—	—	—
2	Па 1/2 галаве —1 галаве	19	11,7	—	82	8,4	—	—	—	—	19	4,5	—
3	Па 1 галаве рабочай жывёлы	47	28,8	—	239	24,4	—	1	3,3	—	92	21,5	—
4	Па 2 галавы	54	33,1	—	365	37,3	—	5	16,7	—	200	46,7	—
5	Па 3—4 галавы рабочай жывёлы	23	14,1	—	210	21,5	—	20	66,7	—	105	24,5	—
6	Па 5 і больш галоў	2	1,2	—	26	2,7	—	4	13,3	—	12	2,8	—
Усяго		**163**	100	**83,2**	**978**	**100**	**83,6**	**30**	100	61,2	428	100	83,8

Вялікі князь Вялікага княства Літоўскага Жыгімонт I Стары.

княства Літоўскага і кароль Рэчы Паспалітай Жыгімонт III Ваза звярнуўся з лістом да адміністрацыі і сялян Бабруйскай воласці. Ён нагадваў аб неабходнасці валочнай памеры, прызначаў новых рэвізораў, патрабаваў пакараць тых, хто супраціўляецца рэформам. У 1613 г. Жыгімонт III Ваза ў лісце да рэвізораў выказаў занепакоенасць станам валочнай памеры ў Бабруйскай воласці і патрабаваў навесці парадак. Поўны тэкст гэтых каралеўскіх лістоў разам з іншымі матэрыяламі змешчаны ў раздзеле «Дакументы сведчаць».

Нягледзячы на супраціўленне сялян, аграрная рэформа прадаўжалася. Разам з ёй адбываліся істотныя сацыяльныя зрухі на вёсцы, аб чым можна меркаваць па інвентары Бабруйскага староства за 1765 г. Колькасць прыгонных сялян павялічылася да 978 душ, але адбылося збяднение іх асноўнай масы. Гэты працэс можна прасачыць і на прыкладзе сялянства Брожскага ключа ў 1765 г., параўнаўшы звесткі табліц 3 і 4.

Факты пераканаўча сведчаць аб далейшым расслаенні сялянства і ўсталяванні эры прыгонніцтва ў выніку пашырэння грашова-тавараных адносін. Актыўнымі правадніками новых эканамічных адносін былі паны-прыгоннікі. Яны імкнуліся браць пазыкі, але вярталі іх за кошт сялян, ствараючы на гэтай аснове гандлёвы капітал. За кошт свабодных грошай яны пашыралі землеўладанні, будавалі двары і фальваркі, якія трымаліся на сялянскай працы. Тым самым валочная памера канчаткова замацоўвала прыгон, павышала падаткі, падпарадкоўвала сялянскую гаспадарку панскай.

Храналагічна і ў час правядзення валочнай памеры, і пасля яе на Бабруйшчыне адбываліся і іншыя значныя гістарычныя падзеі.



Асада Бабруйска войскамі Я.Радзівіла. З гравюры 17 ст.

Вялікі князь Вялікага княства Літоўскага Жыгімонт II Аўгуст.

З 2-й паловы 16 стагоддзя у Беларусі пачала ўмацоўвацца ўлада каталіцкай царквы і асабліва каталіцкага манаскага ордэна езуітаў. У Бабруйску езуіты замацаваліся ў 1618 г., а ў 1630 г. тут узнікла іх рэзідэнцыя. Бабруйскі староста П.Трызна перадаў езуітам маёнткі Гарбацэвічы, Рыня, Устайла, пабудаваў для іх дом у Бабруйску, ахвяраваў сродкі, атрыманыя пад заклад маёнтка Кісялевічы. У 1638 г. нашчадкі П.Трызны перадалі езуітам вёску Дваранінавічы разам з уніяцкай царквой, пабудавалі касцёлы ў вёсках Гарбацэвічы і Шацілкі. У гады народна-вызваленчай і антыфеадальнай вайны 1648—1654 гадоў езуіцкая рэзідэнцыя ў Бабруйску прыйшла ў заняпад. Але яна аднаўляла сваю дзейнасць. І толькі ў 1730 г. Бабруйская езуіцкая рэзідэнцыя перастала існаваць.

У перыяд вызваленчай вайны 1648—1654 гадоў тэрыторыя Бабруйшчыны трапіла ў паласу актыўных ваенных дзеянняў паўстанцаў. Гэта была не традыцыйная барацьба супраць феадальнага прыгнёту, а бітва паміж буйнымі супрацьлеглымі сіламі — казацка-сялянскімі атрадамі, ніжэйшымі слаямі мяшчан, з аднаго боку, і войскам Вялікага княства Літоўскага, якое складалася з наёмнікаў і шляхецкіх апалчэнцаў, — з другога. Важную ролю ва ўздыме антыфеадальнага і народна-вызваленчага руху на Беларусі адыграла паўстанне на Украіне пад кіраўніцтвам Багдана Хмяльніцкага, які не толькі заклікаў беларусаў смялей брацца за зброю і выступаць супраць магнатаў і шляхты, а і прысылаў у беларускія паветы добра ўзброеныя і арганізаваныя казацкія фарміраванні.

Жыхары Бабруйска і навакольных вёсак актыўна ўдзельнічалі ў паўстанні, аказвалі падтрымку казацкім атрадам. Разам з казацкім атрадам атамана Паддубскага яны ў 1648 г. захапілі Бабруйск. Для падаўлення мяцежнікаў да Бабруйска быў накіраваны атрад наёмнікаў шляхты на чале з Валовічам. Пазней паводле загаду польскага караля пачалі фарміравацца новыя шляхецкія апалчэнні. Аб'яднаўшы вялікія сілы, гетман Януш Радзівіл рушыў ад Брэста на Тураў, Петрыкаў, Мазыр. У лютым 1649 г. ён авалодаў Бабруйскам, жорстка расправіўшыся з казакамі і паўстанцамі. Войскі Радзівіла ўзялі пад кан-

Вялікі князь Вялікага княства Літоўскага Жыгімонт III Ваза.

троль поўдзень Беларусі, у тым ліку і Бабруйшчыну. Аднак поўнасцю задушыць барацьбу народных мас Радзівіл не здолеў. Яна была падаўлена пад восень 1651 г. пасля паражэння войска Б.Хмяльніцкага пад Берастэчкам. Праўда, яшчэ на працягу 1652—1654 гадоў у асобных рэгіёнах Беларусі ўспыхвалі ўзброеныя выступленні, аднак шляхта хутка душыла іх ваеннай сілай.

Вялікія спусташэнні прычыніла Бабруйшчыне вайна Расіі з Рэччу Паспалітай у 1654—1667 гадах. Армія рускага князя А.М.Трубяцкога дзейнічала на тэрыторыі Беларусі аўтаномна, далёка ад іншых войск Расіі. Пасля месячнай аблогі Старога Быхава яна рушыла на Слуцк, спусташаючы вёскі Бабруйшчыны. Гэта армія злучылася з 5-тысячным казацкім войскам гетмана І.Залатарэнкі, якое ў сакавіку 1655 г. захапіла Бабруйск і яго прадмесце — Каралеўскую Слабаду. Пра гэту перамогу гетман Залатарэнка паведамляў у спецыяльнай грамаце рускаму цару (тэкст яе гл. ў раздзеле «Дакументы сведчаць»).

За гады вайны абязлюдзелі многія гарады і вёскі, прыйшлі у заняпад рамёствы, сельская гаспадарка. Не паспелі загаіцца яе раны, як Паўночная вайна 1700—1721 гадоў прынесла на беларускую зямлю новыя выпрабаванні, новыя разбурэнні і страты.

У выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай (у 1772, 1793 і 1795) паміж Расіяй, Аўстрыяй і Прусіяй гэта федэратыўная дзяржава і абедзве краіны ў яе складзе — Польшча і Вялікае княства Літоўскае — перасталі існаваць.

ЛІТАРАТУРА

Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыкл. Мн., 1993.

Белоруссия в эпоху феодализма: Сб. док. и материалов. Т. 1. Мн., 1959.

Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах. Т. 1. Мн., 1936.

Гісторыя Беларускай ССР. Т. 1. Мн., 1972.

Грицкевич А.П. Частновладельческие города Белоруссии в XVI—XVIII вв.: (соц.-экон. исслед. истории городов). Мн., 1975.

Доўнар-Запольскі М.В. Гісторыя Беларусі. Мн., 1994.

Живописная Россия: Отечество наше в его зем., ист., плем., экон. и быт. значении. 2 изд. Мн., 1994.

Жучкевич В.А., Малышев А.Я., Рогозин И.Е. Города и села Белорусской ССР: Ист.-геогр. очерки. Мн., 1959.

Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі: Магілёўская вобл. Мн., 1986.

Ігнатоўскі У.М. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. 5 выд. Мн., 1991.

Ілюстраваная храналогія гісторыі Беларусі: Ад старажытнасці да пачатку XX ст. Мн., 1995.

Козловский П.Г. Магнатское хозяйство Белоруссии во второй половине XVIII в. Мн., 1974.

Копысский З.Ю. Экономическое развитие городов Белоруссии в XVI — первой половине XVII в. Мн., 1966.

Ластоўскі В.Ю. Кароткая гісторыя Беларусі: Факс. выд. Мн., 1993.

Найдзюк Я., Касяк І. Беларусь учора і сяньня: Папул. нарыс з гісторыі Беларусі. Мн., 1993.

Подокшин С.А. Реформация и общественная мысль Белоруссии и Литвы: (Вторая половина XVI — начало XVII в.). Мн., 1970.

Россия: Полное геогр. описание нашего Отечества. Т. 9. СПб., 1905.

Статут Вялікага княства Літоўскага 1588: Тэксты. Даведн. Камент. Мн., 1989.

Ткачоў М.А. Замкі і людзі. Мн., 1991.

А.І.Валахановіч.

Дакументы сведчаць...

УСТАВА ПРА ЎПЛАТУ ПАДАТКАЎ ДАННІКАМІ ПАДНЯПРОЎСКІХ І ІНШЫХ ВАЛАСЦЕЙ

чэрвень 1500 г.

Намесником нашим и старцом и всим мужом Поднепрским и волостем нашим Свислоцким, Любошанским, Бобруйским обема половицам — Виленское половицы и Троцкое, — Кричевским, Пропойским, Чечерским, Горвольским, Речицким, Брагинским, Мозырским, Бчицким.

Што есте дани нашое грошовое, бобров и куниц не отнесли до скарбу нашого и меду пресного не отвезли до ключов наших до Вилни, до Троков, а которые з вас хотя будуть и дань нашу до скарбу нашого грошовую и бобры и куницы отнесли и мед пресный до ключов наших привезли не сполна, где ся што будеть у волостех наших остало и мы для всих тых дел послали там до вас, на волости нашы, пнсары нашого, намесника Перелайского, Богуша Боговитиновича, и казали есмо ему тую дань нашу на вас сполна справити грошовую и бобры, и куницы, и мед пресный, подлуг давного обычая: за рубль грошей по две копе грошей, а за бобра чорного по копе грошей, а за карого бобра по сороку грошей, а за куницу по шести грошей, — где не будеть шерстью; а за встав меду пресного по чотыри рубли грошей, а за

колоду по две копе грошей. И вы бы все сполна и з его доходом выдали конечно, по тому как перед тым бывало. А которые у вас будуть земли пустовские або люди голтяйные, абы по себе роскинули, на болшого большей, а на меньшого меньшей, так здавна бывало, абы ни один грош дани нашое у вас не остал. Такеж, которые промеж вас дела обидные будут кому о чем... мы казали емуж о том промежы вас досмотрети и справедливость тому вчинити.

Писан в Менску іюнь... день, индикт 3 (1500 г.) (Л.М.КЗ.V, 329) [56, дад. XII—XIII].

Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах. Мн., 1936. Т. 1. С. 137.

ЛІСТ КАРАЛЯ ПОЛЬСКАГА І ВЯЛІКАГА КНЯЗЯ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА ЖЫГІМОНТА І СТАРОГА АБ ГРАБЯЖАХ ВОЙСКАМ І ПІСАРАМІ ДАННІКАЎ ПАДНЯПРОЎСКІХ І ЗАДЗВІНСКІХ ВАЛАСЦЕЙ

2 кастрычніка 1511 г.

Жикгимонт.

Чиним знаменито сим нашим листом, што перво сего многокроть жалобы приходили к нам з волостей наших Поднепрских и Задвиньских, то есть, с Кричова, с Пропойска, с Чечерска, с Горволя, с Речицы, с Брягина, с Мозыра, с Бчича, с Бабруйска, с Свислочи, с Любашан, с Усвята, с Озерищ, и тыми разы били нам чолом вси тых волостей наших данники, иж им тяжкость великая ся дает, не только в нынешние валечные часы, от тых, которых жо коли посылаем на службу нашу, штож кладучыся промежку их волостей войском, их ницують и грабять, а наболей отяжают собе от писарей наших, которых жо посылаем по тым волостем нашим недополнков даней наших правити, иж слуги их, от году до году, не выезжаючы на тых волостех мешкають, корчмы сытят для своего пожитку, а волости наши мусят им на каждую неделю страву давати грошми и стацеею, и по некольку сторожов, и к тому судят их и рядят, и вины великии на них беруть; а и сами писари наши вз'ехавши на волости непомерные вз'езды и стацеи на них жо беруть, и для своих присудов и вин на каждой волости мешкають по кольку недель, а они их стравовати мусят.

А так, с того великого драпежства и грабежу, многие данники наши с тых волостей наших розошлися, а тые, которые ся еще остали, не только сполна дани нашое, але и половицы от колька лет вжо, в каждый год не могуть заплатити. И били нам чолом вси тых волостей наших данники наши, абыхо их при старине зоставили, как бывало за предков наших, за великого князя Витовта и Жикгимонта иж они сами собравши дань грошовую, и бобры и куницы, отношивали до скарбу нашого, а мед пресный до ключа. И подвязалися нам тым обычаем, штож тую дань нашу, грошовую и медовую и бобровую и куничиую, мають относити до скарбу и до ключа нашого всю сполна, подле стародавного обычая, на роки звычайныи, а то есть: первый рок божье нароженье, другий середопостье, третий великдень, а подвязалися нам тым обычаем: естли бы на тые вышейписаные роки всее сполна дани нашое грошовое и медовое, и бобровое, и куничное до скарбу и до ключа нашого не отнесли, тогды мает подскарбий наш нынешний пан Аврам Езофович и по нем будучие подскарбии, после великодня, ничого не мешкаючи, послати децких своих и тую дань нашу на них справити, з винами нашими и з децкованьем их.

Мы с паны радами нашими помысливши о том и бачучи их слушиую прозьбу, которая ж есть з нашим пожитком, тым есмо их пожаловали: от тых часов вжо писари наши не мають к ним для недополнков дани нашое в'езжати и тую дань правити, а ни слуги их; мають они сами, на тые вышейписаныя роки, дань нашу грошовую и медовую и бобровую и куиичную до скарбу и до ключа нашого относити; а естли бы на тые вышейписаные роки не отнесли, тогды мает подскарбий наш слуг своих на вси волости, послати, и они, ехавши, мають дань нашу и недополики на волостех справити з децкованьем, и теж доход канцлерский; а мы особно маем их за то винами нашими карати. Так же и доход писарский, то есть вз'езд их и тивунщиу, то все мають до скарбу нашого сами относити: занеж вжо от тых часов, и тивунове по свой доход не мають к ним в'езжати.

Также што перед тым по тым волостем нашим писари або державцы, то есть наместники и тивунове тых волостей корчмы на себе сычивали, по та места вжо, как державцы так и писари наши и тивуны корчом сытити не мають; мы берем тые корчмы к нашой руце: где ся нам на которой волости увидит корчмы мети, без шкоды данников наших, там кажем корчмы сытити, а плат их до скарбу нашого носити.

Сталося и дано на великом сойме Берестейском, лета божего 1511, месяца октября 2 дня, индикта 15 (Л.М.КЗ. VIII. 497). [21, 99—100].

Гісторыя Беларусі ў дакумéнтах і матэрыялах. Мн., 1936. Т. 1. С. 138—139.

ПАСТАНОВА КАРАЛЯ ЖЫГІМОНТА І ПАДДАНЫМ БАБРУЙСКАЙ ВІЛЕНСКАЙ ПАЛАВІНЫ АБ СУМЕСНЫМ АДБЫВАННІ НАТУРАЛЬНЫХ ПАВІННАСЦЕЙ

1 верасня 1529 г.

Жикгимон.

Смотрели есьмо того дела с панами радами нашими. Стояли перед нами очевисто, жаловали нам люди наши Бобруяне старцы Кузма Вошка, А.Губар от всих людей Бобруйское волости Виленское половины и поведили перед нами, иж которые люди подчашого нашого державцы марковского и василиского паиа Яновы Мик. Радивил а маршалка нашого пана Вацлавовы Костевича Зубаревичи и Колчичане; здавна за отца нашого Казимира короля его милости, недели с подводами посполу с ними стерегивали и городы и мосты робливали и в подачкох и во всяких розметех им помагивали, а теперь им в том ни в чом помагать не хотят, а в том им крывды и тяжкости великии деють. И тыи люди пана подчашого и пана Венцлавовы Зуборовичи и Колчичане перед нами мовили, иж они з давних часов, как у подводах, так в роботах замковых и в мостовых и в подачкох, ани в которых розметах им николи не помогивали. Ино тыи люди наши Бобруяне слалися о том до поплечников своих до людей нашых Бобруйское ж волости Троцкое половины и теж до Свислочан и до Горвличан и до Пчичан, которые здавна с ними подводы менивали. И люди пана подчашого и пана Венцлавовы Зубаревичи и Колчичане до тых волостей ся не слали. Ино мы с паны радами нашыми, того выслухавши, и виделося нам и паном радам нашым: кгды ж тыи люди Зубаревичи и Колчичане здавна за отца нашого короля его милость Казимера посполу с тыми людьми нашими Бобруяны недели с подводами стерегивали и в роботах замковых и мостовых и в подачках и розметех им помагивали, а к тому их тыи Зубаревичи и Колчичане до тых волостей о том с ними ся не послали, мы в том тых людей нашых Бобруян Виленьское половицы правых знашли, иж тые люди пана подчашого нашого пана Яновы з маршалка нашого пана Венцлавовы Зубаревичи и Колчичане мають посполу з ними недели с подводами стеречь и городы и мосты с ними робити и в подачкох городовых и во всяких розметах им помогати, потому, как з давных часов за отца нашого Казимира короля его милости бывало. Нижли только тые люди мають своим паном дань давати, што на них придеть. И на то есьмо людем нашым Бобруяном дали сесь наш лист судовый з нашою печатью. Писан у Вильни, под лето Бож.. Нарож. 1529, месяца сен. 1 дня.

Акты Литовско-Русского государства. М., 1899. Вып. 1. С. 228—229.

ЛІСТ КАРАЛЯ ПОЛЬСКАГА І ВЯЛІКАГА КНЯЗЯ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА ЖЫГІМОНТА І СТАРОГА АБ ГРАБЯЖЫ НАСЕЛЬНІЦТВА БАБРУЙСКАЙ ВОЛАСЦІ ПІСАРАМІ ПРЫ СПАГНАННІ ПАДАТКАЎ

12 кастрычніка 1533 г.

Жыкгимонт и далей. Воеводе Виленскому, канцлерю нашому старосте Белскому и Мозырскому, пану Олбрахту Мартиновичу Кгаштолту.

Прыходили к нам старцы и люди волости Бобруйское жалуючы и велико отежаючы о тяжкости тыи, которыи им ся деють от писарей и от ииых в'ездчых нашых, которых есьмо посылали на волости нашы даней нашых выправовати, иж они за стацеи и за вымыслы свои и к тому уезду немалую суму пенязей на себе и на слуг своих бирали не подле давного обычая, для чого-ж и дань наша от них уменьшала; и били нам чолом, абыхмо от таковое тяжкости их вызволили и писарей быхмо и иных никого к ним по дань нашу не всылали, а поднимаючыся нам сами сполна дань нашу выдавати.

А так мы, хотячи то мети, иж быхмо в дани нашой не шкодовали, на том зоставили, иж писары наши не мають до них уеждчати даней братн, нижли они с старцы сами поспол з вижом врадника твоей милости, под сведомом его, мають сполна вси дани нашы як грошы, так и мед и бобры и куницы выбрати и меду поспол с тым вижом отвозити до ключа нашого на рок на божье нароженье а пенязи на запусты великии до скарбу нашого; а за працу вижу тому, которого к ним приставить врадник твое милости, мають дати з данника по грошу.

К тому доведали есьмо о том, иж люди по волостям нашым таковыи хитрыи обычаи взяли, иж коли час приходить дани нашы выдавати, тогды они, опустивши отчызны свои, а через год вжывавшы, на тот час отходять по иншым волостем нашым, князьским и паньским. А как тот час оминеть, они зася к своим домом прыходять. А иншыи таки, там по иншым волостем мешкаючы, отчызны держуть и земли пашуть и борти лазять, а даней нашых нигде не дабть. А в том нам шкода а тяжкости подданым нашым деють, иж они за тых сами дань нашу платять.

А так мы то уставуем, иж ваша милость, державцы нашы, кождый в держаньи своем маете то с пильностью стеречы, иж жадного чоловека з иншых волостей нашых не маете прыймовати; который чоловек с твоей милости держанья, з волости нашое Бобруйское, до иншое волости нашое отойдеть, а с чыего села, тогды суседи его мають то об'явити враднику твоей милости и доведатися, куда пойдеть, а врадник твоей милости маеть его оттоль вывести и на отчызне его посадити; а естли бы суседове его враднику твоей милости не объявили, тогды сами повинни будуть данину нашу за то заплатити: естли бы они его враднику твоей милости обявили, а он не вывел, тогды он повинен будеть за того чоловека дань нашу сам платити; естли ж бы таковых людей з иншых волостей нашых або князьскнх и паньских за обсыланьем врадника твоей милости не выдано, тогды тын державцы нашы и князи и панове, або наместники их, которыи не выдають, повинни будуть за то нам платити закладу сто коп грошей.

К тому, которын земли пустовскии лежат впусте, а их нихто не держить, на таковых повинни будете, ваша милость, отчычов отыскавшы и посадити; а которыи земли пустовскин як пашныи, так и бортныи, будеть хто держати, тогды повинни будуть сполна с тых пустовщин дань нашу платити; естли ж бы хто з них держал которое пустовщыны борти, а не пахал пашни, тогды повинен будеть только дань медовую платити; естли бы хто не держал бортей, а держал землю пашную, тогды будеть повинен дань грошовую платити и иншыи доходы, што за грошовую дань идеть; а бортное дерево, што лежыть в пусте, тогды твоя милость маешь казати на нас подлажывати, обравшы в селе по чоловеку. Зася о тын пустовщины маешь ся твоя милость доведати в кождом селе от старшых мужей, хто их держыть, а они мають их твоей милости поведати под прысягою, а не втаити; а естли бы который з них утаил, а опосли бы то на него переведено, тогды на таковом маеть на нас быти вины дванадцать рублев грошей.

К тому поведили перед нами всн люди наши волости Бобруйское, иж они тых пустовщыи об'ежчають, а межы себе не разбирають для того, иж врадники дей твоей милости от тых пустовщын на них беруть доходы свои, которыи идуть на них как от жывого, так и от пустого; а так, естли быхмо от тых пустовщын не казали врадником твоей милости доходов на себе братн, поднимаючы ся нам всн пустовщыны межы себе разобрати и дань нашу сполна выдавати. А так мы узнали то, иж то будеть с пожытком нашым, на том есьмо зоставили, иж врадники твоей милости жадных доходов от тых пустовщын не мають на них брати, а они мають их всих межы себе розобрати и сполна нам з них дани нашы давати.

Так подле тое уставы нашое о тын дани наши маешь ся твоя милость заховати и с пильностью того смотрети и доведывати, як быхмо в том не шкодовали.

И к тому всн люди Бобруйскии жаловали нам, иж старцы частыи меты мечуть на волость, и тын пенязи беручы, на свои потребы оборочають. А так мы на том зоставили, иж старцы тых розметов сами вжо не мають на волости метати, нижли, коли на их потребу волостную пенязей потреба вкажеть, тогды они мають, зволившыся вся волость и весполок с старцы, объявити по враднику твоей милости, а врадник маеть им прыдати вижа, перед которым они вижом мають на всю волость розмет кинути так, як бы сума не перевышала, одно только, колько бы им на тую потребу пенязей вказывало, и тын пенязи вжо старец маеть з них выбирати и на тыи потребы их давати.

Писан у Вильни под леты б.н. 1533 месеца октября 12 день. индыкт 7. (Л.М.КЗ. XV. 172—174) [56, прил. LIV—LVI].

Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах. Мн., 1936. Т. 1. С. 157—158.

ЛІСТ КАРАЛЯ ПОЛЬСКАГА І ВЯЛІКАГА КНЯЗЯ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА ЖЫГІМОНТА III ВАЗЫ ДА ЖЫХАРОЎ БАБРУЙСКАЙ ВОЛАСЦІ АБ БАРАЦЬБЕ СЯЛЯН СУПРАЦЬ ПРАВЯДЗЕННЯ ВАЛОЧНАЙ ПАМЕРЫ

19 жніўня 1611 г.

Жыгімонт III. Земянам, баярам, войтам і ўсім мяшчанам Бабруйскім, а таксама старцам, войтам, падвойтам і ўсім падданым у воласці нашай дзяржавы Бабруйскай.

Абвяшчаем, што мы, для павелічэння прыбыткаў нашага скарбу і для палепшання кіраўніцтва ў гэтай нашай дзяржаве і каб зраўняць яе з усімі іншымі дзяржавамі В.К.Літоўскага, жадаем зрабіць валочную памеру ў Бабруйскай воласці і знесці вас на валокі.

Ужо перад гэтым да вас мы вызначалі і пасылалі нашых рэвізораў. Але пакольк для пэўных прычын гэта не магло прыйсці да свайго выканання, таму мы цяпер зноў назначылі і вызначаем нашых рэвізораў: Яна Корсака, скарбовага сакратара В.К.Літоўскага, пісара земскага Ашмянскага павета і Мікалая Мархач-Пужалеўскага, інстытатара В.К.Літоўскага. Да той дзяржавы нашай Бабруйскай яны павінны выехаць як найхутчэй, вызначыўшы на то час

і спосаб і ўзгодиіўшы з тамашнім нашым дзяржаўцай і абвясціўшы, як дзяржаўцы, таксама вам аб сваім прыездзе, там размерыць валокі ва ўсёй Бабруйскай воласці, знесці вас на іх і зрабіць добры парадак, па прыкладу іншых дзяржаў. А за тым яны выдадуць вам уставу з павелічэннем прыбыткаў нашага скарбу, але без абцяжэння воласці, і ўсё ўпарадкуюць грунтоўна. Калі трапілася б заняць чые грунты, або іншых нашых дзяржаў, або панскія, князскія, шляхецкія і якія колечы, зараз жа дадуць адмену і размеркаванне ў розніцах і ў спрэчках паміж нашымі і шляхецкімі грунтамі. Калі б былі якія скаргі ад назвавага дзяржаўцы на вас, таксама і вашы на дзяржаўцу, то яны ж, рэвізоры і камісары нашы, разгледзіўшы крыўды па гэтых скаргах, павінны пакараць вінаватых і супакоіць вас. А бунтаўшчыкоў, якія валочнай памеры для прыбытку нашага скарбу і ў чым колечы іншым супраціўляліся і мелі повад да непаслухмянства, тыя ж нашы рэвізоры павінны пакараць.

Ведаючы аб гэтым, вы, ні ў чым не змагаючыся, павінны перамерыць грунты на валокі, сябе саміх знесці на валокі, зравізаваць усё грунтоўна і парадкам зрабіць для пажытка нашага скарбу і дазволіць усё устанавіць, будучы ва ўсём паслушнымі тым памянёным рэвізорам і камісарам нашым.

Пісана ў Вільне 1611 г., жніўня 19 дня. (Інв. Бабр. староства ў Віл. Ц. Арх. № 19267 [14, 116—117 Пер. с польск.].

Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах. Мн., 1936. Т. 1. С. 583.

ЛІСТ КАРАЛЯ ПОЛЬСКАГА І ВЯЛІКАГА КНЯЗЯ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА ЖЫГІМОНТА III ВАЗЫ АБ ПРАВЯДЗЕННІ ВАЛОЧНАЙ ПАМЕРЫ Ў БАБРУЙСКІМ СТАРОСТВЕ

21 студзеня 1613 г.

Жыгімонт III.

Пачэсным: Яну Корсаку, Ашмянскаму земскаму судзе і Мікалаю Мархачу, інстыгатару В.К.Літоўскага.

Перад гэтым мы даручылі вашай вернасці нашым лістом, каб вы, з'ехаўшы ў воласць Бабруйскую, учынілі памеру валок і ўсіх грунтаў і, вымерыўшы іх, раздалі падданым. Хаця вы ўсё гэта ў большай частцы зрабілі, аднак, як мы маем ведама, да канца яшчэ ўсе грунты не вымераны, чаму падданыя тамашнія да гэтых часоў сваіх падаткаў Бабруйскаму старасце і іншым тамашнім дзяржаўцам не хочуць аддаваць. З гэтай прычыны мы загадваем вам, каб вы, вызначыўшы выгадны для таго час, згодна нашага першага ліста, выехалі да той Бабруйскай воласці і дакончылі памеры яе грунтаў і, вымерыўшы, раздалі падданым.

А паколькі да нас даведзена справа, што тыя падданыя Бабруйскія папсавалі грунты і тыя валокі, якія вамі ўжо памераны і ім разданы, і не жадаюць трымаць іх паводле вашай памеры, таму вы павіны дагледзіць таго, і калі б было так, то за гэта іх пакараць. А каб яны трымалі грунты паводле гэтай памеры, зробленай вамі, і не адважваліся іх псаваць, вы сурова ім забараніце.

Дан у Варшаве, 1613 г., студзеня 21 дня (Інв. Бабруйск, вол. у Віл. Ц. Арх. № 19267 [14, 118—119 Пер. с польск.].

Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах. Мн., 1936 . Т. 1. С. 583—584.

ГРАМАТА НАКАЗНОГА ГЕТМАНА ІВАНА ЗАЛАТАРЭНКІ ЦАРУ АЛЯКСЕЮ МІХАЙЛАВІЧУ АБ ЗАХОПЕ КАЗАКАМІ БАБРУЙСКА І КАРАЛЕЎСКАЙ СЛАБАДЫ

9 сакавіка 1655 г.

В другом в ево Иванове листу напісано:

По отпущению послов наших до в.ц. вел. на другой день вернулся наш подъезд счастливо, который посылали есмя до Бобруйска и до Королевской слободы, где, за милостию бога всемогущаго и помощию пресвятые богородицы и счастьем в.ц. вел. благоверного царевича и вел. кн. Алексея Алексеевича, государя нашего милостивого, товарство наше, пришедше до тех городов, оных взяли, в которых много врагов и недругов в.ц. вел пребывало, и тех всех, что было служилого люду, поляков и немец, под мечь пустили, а городы обадва без остатку попалили, чтоб вперед не было при чом держатися врагом и недругом в.ц. вел. и которые языки 3 на том подъезде взяты, на имя Доменика Пацу да Станислава Щуку и третьяго товарыша; а что их не отсылаем до в.ц. вел., государя нашего милостивого, изволь, в.ц. вел., милостивым быти, а именно в том, что послали есмя несколко послов наших с листами до в.ц. вел. уже боле 10 недель, которых и до сего дня не дождемся, и мы чаем, что попалися в неволю врагом и недругом в.ц. вел.; и для того тех вязней у себя держали, чтоб могли товар-

ство наше из неволи свободити. А естли, в.ц. вел., изволишь их к себе прислати, и тогда безо всякого мотчанья до в.ц. вел. с послами нашими прислати не омешкаем. А впредь какие вести у нас будут, и мы, не омешкав, к в.ц. вел., государю нашему милостивому, известно чинити.

Дан с табору Быхова Нового лета от рождества христова 1655 месяца марта в 9 день.

В. ц. вел. верный и желателный слуга и подданный Иван Никифорович, гетман наказной Войска в.ц. вел. Запарожского.

Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах. Мн., 1936. Т. 1. С. 497—498.

СТАТУТ ЖЫХАРОЎ БАБРУЙСКАЙ ВОЛАСЦІ АБ ПАРАДКУ ВЯДЗЕННЯ ГАНДЛЮ

7 снежня 1671 г.

Устав, выданный жителям всей Бобруйской вол., о том, как они должны себя держать.

Доныне существовал обычай, согласно которому свои бобруйские, как городские, так и сельские купчики и особенно посторонние купцы, разъезжая по деревням этой волости, занимаются торговлей, а крестьяне все изготовленное ими для продажи или сверх своих потребностей тайком им продают.

Кроме того, под предлогом продажи других вещей некоторые бобруйские крестьяне продают зверя, которого никому не разрешается ловить, кроме людей, назначенных для этого властями. Если крестьянин продает тайком даже свою собственную вещь, то получает за нее полцены, т.к. нет никого, кто мог бы набить цену, сказать правду или предупредить перед обманом и тем расстроить сделку.

Королевская казна не может иметь сведений о количестве этих купчиков, а крестьяне несут от этого большой убыток. Крестьяне, продавшие свой товар на стороне, не имеют с чем ехать в город, а купцу, имеющему в деревне больший доход, ехать в город незачем.

В результате мещане и крестьяне занимаются только незаконной, тайной торговлей.

С целью предотвращения этого и на основании общего закона, запрещающего тайную торговлю, постановляем, чтобы никто не осмеливался продавать или покупать что-либо в деревне под угрозой 5 коп. [литовских гр.] штрафа и утраты в пользу казны купленного товара за каждый случай доказанного нарушения.

Крестьяне свои приготовленные для продажи товары должны в торговые дни привозить в гор. Бобруйск. А купцы, как и в других владениях, должны там же открыто продавать на деньги свой товар. В деревне же первые продавать, а вторые покупать чтобы не осмеливались.

При продаже измерять обычной городоской мерой, т.е. бочкой. Вес также должен быть не менее обычного: 6 безменов составляют 1 камень; в безмене 8 фунтов. Локоть применяется точный, виленскнй, а также гарнцы и кварты.

В случае обнаружения у кого-либо неправильной меры на него налагается штраф в размере 5 коп. [литовских гр.].

Белоруссия в эпоху феодализма. Мн., 1960. Т. 2. С. 341—342.

Дакументы падабраў да друку А.І.Валаховіч.

У СКЛАДЗЕ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ

Пасля другога падзелу Рэчы Паспалітай ў 1793 г. тэрыторыя сучаснага Бабруйскага раёна ўвайшла ў склад Мінскай губерні Расійскай імперыі. Яна падзялялася на паветы, кожны прыкладна па 20—30 тыс. чалавек падатковага, або рэвізскага, насельніцтва. Тады быў створаны і Бабруйскі павет у складзе Мінскай губерні (сучасны Бабруйскі раён займае прыблізна чацвёртую частку павета). 27 верасня 1795 г. (па старым стылі) «в восьмом часе при оповещении посредством труб и музыки» сабраліся дваране Мінскай губерні і абралі павятовых прадвадзіцелей дваранства. Першым прадвадзіцелем дваранства Бабруйскага павета быў А.Аскерка. У кастрычніку 1795 г. Мінская губерня і ў яе складзе Бабруйскі павет афіцыйна прызнаны часткай Расійскай імперыі.

Мясцовае самакіраванне ажыццяўлялася наступным чынам. Кожны павет падзяляўся на 6 ключоў на чале з войтамі, абранымі «из людей средних лет, но честных и зажиточных» з асяроддзя землеўладальнікаў ці іх аканомаў. Войтам падпарадкоўваліся сотнікі і дзесятнікі, якія выбіраліся сялянскай грамадой «из добрых и незазорных селян». Сотнікі



Селянін з Бабруйскага павета на сваім полі. Пачатак 19 ст.

выбіраліся ад 100—200 двароў, дзесятнікі — ад 1—25. Войт павінен быў насіць знак арла, выбіты на жоўтай медзі і прышыты на правым баку грудзей. Сотнік атрымліваў доўгі кій з меднай круглай булавой на канцы, а дзесятнік — такі ж, але кароткі. Названыя асобы прызначаліся паліцэйска-выканаўчай уладай. Камісары падбіраліся з рускіх афіцэраў і зацвярджаліся ў сенаце. Павятовыя камісары займаліся раскватараваннем войск на пастой у сялянскіх хатах, утрыманнем і рамонтам дарог, мастоў, перапраў. Яны наглядалі за тым, каб сяляне асушвалі вуліцы, масцілі іх або насыпалі пяском. Забаранялася забруджваць рэкі, раскладваць вогнішчы паблізу вёсак і г.д.

Галоўным абавязкам павятовай паліцыі быў нагляд за недапушчэннем самавольных перамяшчэнняў. Для гэтага ўводзілася пашпартная сістэма. Пашпарты выдаваліся са згоды памешчыкаў у правінцыяльных канцылярыях, а пазней — павятовымі земскімі судамі, якім забаранялася трымаць праціцеляў больш як 4 гадзіны. «Без паспартов в уезде промышлять» не дазвалялася. Загадвалася «бродяг притворяющихся нищетою отнюдь не терпеть в народе» або даваць ім прытулак і начлег. Для жабракоў будаваліся багадзельні. Міласціну дазвалялася прасіць толькі пры цэрквах, на патрэбы састарэлых і калек збіралі дровы і па адным чацвераку мукі. Яўрэі не падлягалі суду павятовай паліцыі і земскім нарадам, а кіраваліся праз свае нарады.

Да 1830-х гадоў павет заставаўся ніжэйшай (непадзельнай) адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкай. Але павелічэнне колькасці насельніцтва ў паветах і рост сялянскіх хваляванняў выклікалі неабходнасць падзяліць іх на больш дробныя паліцэйскія адзінкі — станы. Бабруйскі павет быў падзелены на 4 станы. Станавая кватэра першага з іх знаходзілася ў Міхалёве, астатніх трох — у Парычах, Глуску, Свіслачы. Станавое праўленне складалася з прыстава, якога прызначаў губернатар, пісьмавода і чыноўнікаў канцылярыі. Пры станах знаходзіліся і земскія суды (спраўнік, засядацелі, а таксама чыноўнікі канцылярыі). Станавы прыстаў апіраўся на сельскую выбарную паліцыю — соцкіх і дзесяцкіх (сярод дзяржаўных і ўдзельных сялян), а таксама на вотчынную паліцыю памешчыкаў.

У 19 ст. ўсё грамадства было падзелена на саслоўі: дваране, духавенства, гарадскія і сельскія абывацелі. Усе яны мелі свае органы самакіравання, за выключэннем прыгонных, якія цалкам падпарадкоўваліся ўладальніку і вотчыннай паліцыі.

Большасць сялянства да адмены прыгону належала дваранскаму саслоўю (80% у пачатку і 76% у сярэдзіне 19 ст.), астатняя частка — дзяржаве і царкве. Ніжэйшым звяном кіравання дзяржаўнымі сялянамі былі воласці. З 1797 г. зацвярджаліся валасныя праўленні, якія складаліся з валаснога галавы, выбарнага старасты і пісара. Яны займаліся зборам падаткаў, сачылі за выкананнем сялянскіх павіннасцей і інш. З асяроддзя дзяржаўных і ўдзельных сялян выбіралі паліцэйскіх службовых асоб — па адным чалавеку на 10 двароў.

У 1861 г. для сялян, якія вызваліліся ад прыгону, былі створаны органы саслоўнага кіравання па ўзору валаснога кіравання дзяржаўнымі сялянамі. Бабруйскі павет быў падзелены на 22 воласці і 136 сельскіх абшчын. Сучасны Бабруйскі раён займаў прыкладна тэрыторыю (поўнасцю ці часткова) прыгарадных Туркаўскай, Бортнікаўскай, Брожскай, Гарбацэвіцкай, Качэрынскай, Свіслацкай, Гарадкоўскай і Парыцкай воласцей. У воласці дзейнічала адміністрацыйная інстанцыя саслоўнага сялянскага кіравання — так званая «сельская грамада», якая ўяўляла сабой сельскую абшчыну — гаспадарчы саюз сялян на агульнай зямлі. Сялянская абшчына была распарадчыкам усёй надзельнай зямлі, толькі яна, а не асобныя сяляне, мелі права выкупу зямлі. Сялянскія двары маглі часова індывідуальна карыстацца ворнымі землямі і сенажацямі: выганы былі ўласнасцю абшчыны, а сядзіба магла быць індывідуальнай спадчыннай уласнасцю.

У сялянскай абшчыне (грамадзе) перыядычна паўтараліся перадзелы зямлі паводле

патрабавання $^2/_3$ яе членаў. Кожная сельская абшчына ўключала 2—3 паселішчы, 40—50 двароў, 400—500 чалавек, мела сельскі сход, які выбіраў мясцовых службовых асоб (сельскага старасту, зборшчыка падаткаў, соцкіх, дзесяцкіх). На гэтым узроўні вырашаліся такія справы, як перадзел абшчынных зямель, раскладка падаткаў, дробныя паліцэйскія справы, дабрачынныя справы (агульныя талокі, падтрымка хлебазапасных магазінаў).

Больш важнымі былі валасны сход, валасное праўленне і валасны суд. У склад валаснога сходу ўваходзілі сельскія і валасныя службовыя асобы, а таксама так званыя «дзесяцідворнікі» — выбраныя ад кожных дзесяці двароў. Валасны сход выбіраў валаснога старшыню, усіх старастаў, зборшчыкаў падаткаў, 1—2 засядацеляў і пісара, якія складалі валасное праўленне — выканаўчы орган сялянскага саслоўнага кіравання. Але фактычна валасныя справы вялі толькі валасны старшыня і пісар. Выбіраўся валасны старшыня на тры гады; ён не меў права адмовіцца ад пасады (акрамя выпадкаў хваробы і поўнага тэрміну папярэдняй службы ў якасці валаснога старшыні). Ён выконваў агульнапаліцэйскія (аб'яўленне распараджэнняў урада, нагляд за парадкам) і саслоўна-сялянскія абавязкі (скліканне валаснога сходу, нагляд за выкананнем павіннасцей).

Сялянскі сход акрамя валаснога праўлення кожны год выбіраў судовую валасную калегію з 12—14 суддзяў. Гэты суд разглядаў спрэчкі паміж сялянамі, калі сума іску не перавышала 100 рублёў, і дробныя крымінальныя правіннасці сялян. Урад падкрэсліваў саслоўнасць валасных судоў, прадпісваючы ім пры вырашэнні спраў кіравацца мясцовымі звычаямі і правіламі ў сялянскім быце.

Павет падзяляўся не толькі на воласці, але і на земскія пастарункі (участкі). На тэрыторыі сучаснай Бабруйшчыны было два земскія пастарункі: у склад аднаго ўваходзілі Туркоўская, Парыцкая і Брожская воласці, у склад другога — Бортнікаўская, Гарбацэвіцкая, Гарадкоўская, Качэрынская, Свіслацкая. Судова-адміністрацыйнымі справамі пастарунка займаліся спачатку міравыя пасрэднікі, а потым — земскія пастарункавыя начальнікі. Апошніх прызначалі з мясцовага патомнага дваранства. Яны зацвярджалі валасных старшынь, выбраных валаснымі сходамі, маглі іх аштрафаваць і нават арыштаваць. Пастановы валасных сходаў земскія начальнікі падавалі на зацвярджэнне павятовага з'езда земскіх начальнікаў.

Пасля рэформы 1861 г. засталіся ў паветах толькі дробныя паліцэйска-тарытарыяльныя адзінкі — станы. Станавыя прыставы ў выкананні сваіх функцый абапіраліся на валасных і сельскіх службовых асоб. У 1878 г. была ўведзена пасада бліжэйшага памочніка станавога прыстава — паліцэйскага ўрадніка, які павінен быў «охранять общественное спокойствие и следить за проявлением каких бы то ни было действий и толков, направленных против правительства: чтоб не распространялись среди народа злонамеренные суждения и слухи, чтобы не распространялись запрещенные листки, книги, издания» (Ерошкин Н.П., Куликов Ю.В., Чернов А.В. История государственных учреждений России до Великой Октябрьской социалистической революции. М. 1965. С. 265). Абавязкі ўрадніка вельмі шырокія — ад нагляду за «благочинием» у час набажэнства да нагляду за продажам віна. Таму і ўлада яго над сялянствам была амаль бязмежная. У 1903 г. пры станавых прыставах і паліцэйскіх ураднікаў была створана павятовая паліцэйская стража — узброеная апора станавых прыставаў і ўраднікаў (замест ненадзейных валасных і сельскіх службовых асоб з сялян).

Такім чынам, мясцовае кіраванне было пад кантролем дваран. Усе службовыя асобы прызначаліся з ліку дваран, а саслоўныя органы сялянскага кіравання ім падначальваліся.

Як вядома, многія вёскі з жыхарамі ў час прыгону належалі памешчыку. Паселішча, якое прымыкала да маёнтка феадала-прыгонніка, лічылася цэнтрам уладання. Яшчэ з часоў Кіеўскай Русі такія цэнтры называліся пагостамі. Тут звычайна будавалася царква, сюды паступала і даніна князю, тут знаходзіліся абшчынныя могілкі, цэнтральныя капішчы, месцы для сходаў, судоў, гульбішчаў, свят, трызнаў. З цягам часу цэнтры абшчыны альбо маёнтка пачалі называць сялом, але і назва «пагост» захоўвалася аж да пачатку 20 ст. Так, валасны цэнтр Гарбацэвічы лічыўся пагостам да 1908 г., пагостам былі і Панюшкавічы.

Міхалёва, Вялікія Бортнікі, Туркі, Брожа, Цялуша (а з пачатку 20 ст. Гарбацэвічы і Панюшкавічы) лічыліся сёламі. З іх Брожа, Туркі, Гарбацэвічы, Вялікія Бортнікі былі на той час цэнтрамі воласці, дзе знаходзілася валасное праўленне. Валасное кіраўніцтва засядала ў спецыяльным будынку — валасной

управе, ці гміне. Яна адрознівалася ад звычайнай хаты большымі памерамі, шырокім ганкам, высокай страхой, вялікімі вокнамі, мела шырокі двор, на якім стаялі брычкі і павозкі, а ўнутры быў доўгі калідор з пакоямі на два бакі — кабінетамі чыноўнікаў. У валасных цэнтрах размяшчаліся таксама царква, асветныя і медыцынскія ўстановы, лаўкі, вытворчыя будынкі, хлебазапасныя магазіны і інш.

Хлебазапасныя магазіны былі не толькі ў сёлах. Амаль у кожнай буйной вёсцы з 18 ст. існавалі будынкі для захоўвання запасаў прадуктаў «на выпадак дапамогі людзям у бядзе». Абшчынныя свірны і атрымалі ў народзе назву магазінаў. Кожны жыхар абшчыны павінен быў засыпаць у засекі такога магазіна гарнец жыта, ячменю, гароху ці іншых збожжавых. Для вызначэння меры звычайна служылі спецыяльныя рэйкі з меткамі. Асновай магазінаў быў скразны праезд, па абодва бакі якога размяшчаліся засекі. Над праездам уздоўж засекаў рабіўся памост — галерэя, на якую падаваліся мяхі са збожжам. Хлебазапасныя магазіны былі ў Пятровічах, Рымаўцах, Бярозавічах, Сычкаве, Атрашковічах, Пабокавічах, Брожы, Мікулічах, Турках, Узнозе, Малых Бортніках, Бірчы, Ясным Лесе.

Феадал, каб зацікавіць сялян у асваенні неўрадлівых зямель, вызваляў ад падаткаў і чыншу тых, хто сяліўся на новых месцах. Гэтыя пасяленні сталі называцца слабодамі. Такое паходжанне маюць назвы Слабада-Багушоўка, Туркоўская Слабада, Амяленская Слабада і інш. Тут у 19 ст. жылі яўрэі і старааабрадцы.

Усё дваранства падзялялася на патомнае (спадчыннае) і асабістае (пажыццёвае). Патомнае мела 6 разрадаў: «дворянство жалованное или действительное, дворянство военное, дворянство, полученное путем выслуги определенного чина на гражданской службе или в результате награждения российским орденом, иностранные дворянские роды, титулованное дворянство, древние благородные роды». Асабістыя дваране, як і патомныя, былі свабодныя ад цялесных пакаранняў, асабістых падаткаў і рэкрутчыны, мелі пэўныя прывілеі пры замяшчэнні пасад на дзяржаўнай службе. Але яны не маглі актыўна ўдзельнічаць у жыцці дваранскай карпарацыі, не мелі права валодаць прыгоннымі сялянамі, іх не заносілі ў дваранскія радаслоўныя кнігі. Дваранскі тытул у іх мог пераходзіць толькі ад мужа да жонкі, а дзеці асабістых дваран не лічыліся дваранамі. Мясцовая знаць заходніх губерняў (у асноўным палякі) дзялілася на вышэйшы слой (магнатаў) і шматлікую шляхту, якая была на дзяржаўнай службе ці на службе ў магнатаў. Цікава, што на пачатку 19 ст. кожны з сямі жыхароў Бабруйскага павета лічыўся дваранінам.

Усе дваране губерні складалі губернскае дваранскае грамадства. Саслоўнымі дваранскімі органамі былі губернскія і павятовыя сходы. Павятовыя дваранскія сходы збіраліся раз у тры гады з дазволу мясцовага губернатара і з ведама Міністэрства ўнутраных спраў. На іх выбіралі прадвадзіцеляў дваранства. Прысутнічаць на сходах маглі ўсе паўналетнія патомныя дваране мужчынскага полу, унесеныя ў радаслоўныя кнігі, а права голасу мелі толькі тыя, хто валодаў нерухомай маёмасцю, меў класны чын ці ордэн, або атэстат аб заканчэнні навучальнай установы ці праслужыў тры гады на дваранскіх выбарных пасадах. Павятовыя дваранскія сходы правяралі спісы дваран, кантралявалі права на ўдзел у дваранскіх выбарах і праводзілі папярэдняе абмеркаванне пытанняў, якія выносіліся на губернскія дваранскія сходы. Павятовыя дваранскія органы не падначальваліся губернскім, маглі мець самастойныя стасункі з уладамі.

Як ужо адзначалася, першым прадвадзіцелем бабруйскага дваранства быў Анатоль Аскерка (1795—1797). Да паўстання 1863 г. прадвадзіцелямі бабруйскага павятовага дваранства выбіраліся Іван Келчэўскі (1797—1805), Іосіф Прушаноўскі (1805—1808), Сцяпан Дашкевіч (1820—1823). Асаблівай папулярнасцю карысталіся ў бабруйскіх дваран буйныя землеўладальнікі з роду Булгакаў. Так, Ігнацій Булгак выбіраўся на пасаду прадвадзіцеля двойчы (у 1808—1820 і ў 1823—1829) і прабыў на ёй 18 гадоў; Іосіф Булгак быў прадвадзіцелем 12 гадоў (1832—1844). Адам Ратынскі (1859—1866) займаў пасаду прадвадзіцеля дваранства Бабруйскага павета ў складаны час адмены прыгону і паўстання 1863 г. Пасля паўстання царскі ўрад пачаў прызначаць прадвадзіцеляў дваранства з рускіх чыноўнікаў: штабс-капітан Аркадзь Варанцоў-Вельямінаў (1867—1887), сапраўдны стацкі саветнік Пётр Занцэвіч (1887—1889), калежскі саветнік Канстанцін Стэфановіч (1889—1896), калежскі саветнік Мікалай Вяроўкін (1896—1901), калежскі сакратар Юрый Калагрываў (1901—1903), з

1903 г. — калежскі сакратар Барыс Ахматаў.

Да 1863 г. землеўладанне ў Мінскай губерні было ў асноўным польскае (94%), а пасля 1863 г. — 49,7% складала польскае і 41% — рускае. Але і ў другой палове 19 ст. буйныя маёнткі належалі патомным дваранам рымска-каталіцкага веравызнання. Так, маёнтак Шараёўшчына (1809 дзесяцін) належаў патомнаму двараніну, паручніку С.Ф.Келчэўскаму. Маёнткам Туркі валодалі таксама патомныя дваране рымска-каталіцкага веравызнання Булгакі. У 1876 г. частка маёнтка (1897 дзесяцін) была прададзена Ф.Булчэўскаму, калежскаму саветніку, гаспадарку якога вёў упраўляючы. Маёнтак Зарэчча (3190 дзесяцін) у канцы 1870-х гадоў перайшоў па спадчыне каталіку С.В.Нерэзіушу. Маёнткі Забудзькі і Данічаў (2842 дзесяціны) таксама належалі памешчыкам-каталікам Э.Рагульскім. Ф.К.Машневіч, каталічка, валодала маёнткам Бортнікі (1537 дзесяцін). Маёнтак Бірча належаў А.І.Месцеру, Дуброва — Л.А.Русецкаму (абодва рымска-каталіцкага веравызнання).

У другой палове 19 ст. вялікія маёнткі пачалі купляць праваслаўныя памешчыкі. Так, у 1875 г. Л.М.Мышанцава набыла маёнтак Пятровічы (4672 дзесяціны). Маёнтак Аўсімовічы (1277 дзесяцін) належаў М.А.Мерлінай, жонцы калежскага саветніка. Тытулярны саветнік Дз.У.Захараў у 1875 г. набыў маёнтак Коўрын (5725 дзесяцін). А маёнтак і хутар Бабін (1196 дзесяцін) купіў ганаровы грамадзянін (гэта значыць, сын асабістага дваранiна) П.І.Мельнікаў. У 1869 г. калежскі асэсар В.Ф.Сакініч купіў маёнтак Панюшкавічы, а І.А.Постнікаў — Брожу.

Рускія землеўладальнікі, якія набылі маёнткі на Бабруйшчыне, самі гаспадаркай не займаліся, а даручалі гэта ўпраўляючым ці здавалі іх ў арэнду. Напрыклад, маёнткамі Пятровічы, Аўсімовічы, Туркі (частка Булчэўскага) кіравалі ўпраўляючыя, а маёнткі Бабін, Панюшкавічы, Коўрын, Пятровічы здавалі арандатарам. А вось маёнткі Зарэчча, Шараёўшчына, Туркі, Дуброва, Бортнікі ніколі не заставаліся без нагляду сваіх уладальнікаў.

Паколькі ўрадлівых зямель у павеце было няшмат, то для падтрымання гаспадаркі памешчыкі прадавалі лес. Некаторыя з іх адкрывалі «заводы». У прыватнасці, у «Топографическом описании Минской губернии» пачатку 19 ст. ёсць наступныя звесткі:

«Владения помещика Михайлы Пруша-



Пастаялы двор у пас. Барак. Пабудова канца 19 ст.

новского в деревне Викторине — стеклянный завод. Владения помещика Ивана Кельчевского между деревней Химы и Ширяевщизна — стеклянный. Староства Бобруйского во владениях принцессы Демонако в деревне Глебовой Рудне — железный. Владения помещика Викентия Быковского в деревне Богушовске — поташный. Сверх сего находятся рудни, на которых делают сошники. На всех заводах и руднях выделанные вещи употребляют для домашнего обихода, частью и на продажу, на коих производят работу мастера посторонние по договорным ценам и крестьяне сих помещиков» (РДГА, ф. 1350, воп. 1312, с. 90, а. 12, 13, 34, 36, 46, 57.)

У маёнтку Быкоўскіх працаваў медны «завод», на якім у 1823 г. выраблена 20 катлоў, 12 вінакурных труб, 25 каструль. Усе вырабы былі прададзены. У маёнтку Булгакаў існаваў цукровы завод, які ў 1850 г. выпусціў прадукцыі на 1800 рублёў.

Трэба сказаць, што мець сваю «фабрыку» — прыгонную мануфактуру — імкнуліся многія феадалы. Але шмат з гэтых пачынанняў заканчвалася правалам. Вось, напрыклад, што пісаў І.Зеленскі пра шклозавод ў маёнтку Качэрычы: «На этом заводе выделывается от 300 до 500 ящиков листового стекла и небольшое количество простой стеклянной посуды на сумму от 6 до 10 тысяч рублей. При нем состоит 1 мастер, 6 подмастерьев и около 25 чернорабочих. Стекло сбывается на месте прежним купцам от 15 до 20 рублей за ящик. Впрочем, кочеричский завод действует не постоянно и, по всей вероятности, в скором времени будет закрыт, если не увеличит своего производства до размеров большого промышленного заведения» (З е л е н с к и й И. Материалы для географии и статистики

России... Минская губерния. СПб., 1864. С. 260). Справа ў тым, што прыгонных на «фабрыках» жорстка эксплуатавалі, а таму і прадукцыйнасць працы была тут вельмі нізкая.

Памешчыкі выкарыстоўвалі і тое, што праз Бабруйскі павет праходзілі бойкія шляхі: ваенна-камунікацыйная дарога з Мінска ў Бабруйск, шаша з Бабруйска ў Слуцк, Маскоўска-Варшаўская шаша, паштовы тракт з Бабруйска ў мястэчка Парычы. У многіх маёнтках будавалі корчмы і пастаялыя двары. Карчма была ў Зарэччы, Бабіне, Пятровічах, Брожы, Коўрыне, Турках, дзве — у маёнтку Бірча, чатыры — у Шараёўшчыне. Спачатку карчмой служылі адзін ці два пакоі ў хаце гаспадара, але з цягам часу склаўся спецыфічны тып пабудовы з дрэва з гонтавым ці саломенным дахам, рэдка — з каменю ці цэглы. Карчма стала і харчэўняй, і пастаялым дваром, і месцам грамадскіх сходаў, тут нават адзначалі розныя святы. Корчмы і пастаялыя двары будаваліся не толькі ў маёнтках, а і ў цэнтрах вёсак і на хутарах, якія знаходзіліся на скрыжаванні дарог, — у Кавалях, Мікулічах, Юр'еве, Вялікіх Бортніках, Міхалёве, Пустошцы, Рымаўцах, Варатыні.

Арандатары і ўпраўляючыя жылі звычайна ў фальварках. Раней фальваркам называлі феадальную гаспадарку, якая вырабляла хлеб на продаж, пазней — пасяленне непадалёку ад маёнтка ці побач з вёскай. Часта і назвы яны мелі аднолькавыя. Так, побач з маёнткамі былі аднайменныя фальваркі Маліннікі, Іванаўка, Крупічы, Данічава, Баяршчына, Вербкі, Бібкаўшчына; побач з вёскамі — Шараёўшчына, Раксалянка, Банеўка, Пятровічы, Рагаселле, Коўрын.

Пабудовы фальваркаў знаходзіліся ў зеляніне парку, акружанага плотам з брамай і высокімі варотамі, над якімі ўзвышалася дашчаная вежа. За брамай, перад маёнткам, была плошча з кветнікам, дзе спыняліся брычкі і гаспадар сустракаў гасцей. Іншы раз насупраць панскага дома стаяў сонечны гадзіннік на дубовым слупе. У дом гаспадара вёў ганак з прыступкамі і дзвюма—чатырма калонамі. Далей ішлі сені, паабапал іх — жылыя пакоі, гасціная, святліца і г.д. Сені мелі скразны праход, які вёў у двор. Дом быў крыты высокім дахам з драніц, а нярэдка і саломай. Побач з домам стаялі пабудовы для захоўвання маёмасці: хлявы, гумны, канюшні, злева ці справа ад брамы — двух'ярусны свіран (лямус) з кругавой галерэяй, лесвіцай, чатырохсхільным дахам. За лямусам стаяла пабудова для сушкі сыроў — сырніца, за ёй — агароднінасховішча накшталт сялянскай істопкі. Далей — капцільня, ляднік, на беразе сажалкі — скрыня для рыбы. Крыху воддаль, звычайна з другога боку маёнтка, было збудаванне, у якім жылі батракі, прыслуга. Асобна стаяў жывёльны двор, вялізны «вянок» з двароm пасярэдзіне; нярэдка двор быў крыты.

У некаторых фальварках былі свае прадпрыемствы: у фальварку Малінаўка яшчэ з 1897 г. — дзягцярны завод, а ў фальварку Коўрын — ветраны млын.

Як адзначалася, дваран на пачатку 19 ст. было вельмі шмат. А ў 1857 г. ў Мінскай губерні адзін дваранін прыпадаў на 18 чалавек агульнага насельніцтва. Справа ў тым, што ў час першага падзелу Рэчы Паспалітай акрамя буйных феадалаў існавала шматлікая дробная шляхта: аколічная, чыншавая (што карысталася правамі дваранства на казённых ці ўладальніцкіх землях і плаціла аброк), служылая шляхта (без зямлі, займала розныя пасады пры дварах буйных феадалаў). З далучэннем да Расіі буйныя землеўласнікі пачалі зганяць з двара дробную шляхту. Быў праведзены так званы «разбор шляхты»: усе асобы «так называемой шляхты» да пэўнага часу павінны былі пацвердзіць сваё дваранства, а імперская герольдыя зацвердзіць яго. А ў 1831 г. была прынята пастанова: «Все лица бывшей шляхты, проживающие в селениях, возвращенных от Польши губерний, неутвержденные в дворянстве и не пропустившие установленных для избрания рода жизни сроков, составляют свободных сельских обывателей, под названием однодворцев западных губерний». (Свод законов Российской империи. 1902. Т. 9. С. 677.) Цяпер былая шляхта павінна была, як і сяляне, плаціць падушны падатак, адбываць земскую і рэкруцкую павіннасці.

Месцы, дзе сялілася дробная шляхта (а пазней аднадворцы), называлі засценкамі ці ваколіцамі. Ваколіцы будавалі непадалёку ад вёскі і абносілі плотам. Сялілася тут шляхта, якая імкнулася выдзеліцца ад сялян, падкрэсліць сваё высакароднае паходжанне, хоць часта шляхціцы былі не багацейшыя за сялян. Калі селянін памылкова называў ваколіцу сялом, шляхціц успрымаў гэта як абразу.

Засценкі ўзніклі як прамое параджэнне валочнай рэформы: паміж палеткамі трохпольнага севазвароту заставаліся адрэзкі, засценкі, якія звычайна здаваліся ў арэнду дробнай шляхце, дзе яна сялілася сваімі дварамі. У засценках ці ваколіцах звычайна было 2—3

дзесяткі двароў, якія належалі асобам з адным прозвішчам. Гэта было як бы адно сямейства. Такіх паселішчаў на Бабруйшчыне вядома няшмат: Осава, Краснае, Міхайлаўшчызна (цяпер Міхайлаўшчына), Ясены, Дуброва, Фартуны, Пятровічы.

Хатні быт, адукацыя і адзенне аднадворцаў нічым амаль не адрозніваліся ад вольнага чалавека ці простага селяніна. Сярод іх былі людзі пісьменныя, але непісьменных было больш. Падпалкоўнік генеральнага штаба І.Зеленскі, які склаў апісанне Мінскай губерні, характарызаваў іх так: «Они трудолюбивы, расчетливы и гордятся своим шляхетским происхождением, для подтверждения которого, если еще не разорились, то готовы пожертвовать и последний грош; непринесшие пользы усилия доказать свое дворянство стоили им немало денег, и только по истощении всех своих средств они отказались от бесполезного ходатайства о шляхетских правах... говорят преимущественно по-польски и исповедуют римско-католическую религию, за исключением весьма немногих». (Зеленский И. Материалы... С. 511.) Аднадворцы былі дбайнымі гаспадарамі, добра даглядалі жывёлу, і яна заўжды была ў іх лепшай, чым у сялян. Праўда, беззямельная шляхта жыла крыху горш.

Вайна 1812 г. ператварыла Бабруйшчыну ў арэну пастаянных перадыслакацый рускіх і французскіх войск, якія патрабавалі ад насельніцтва рэкрутаў, коней, правіянт, фураж, вупраж. Насельніцтва пакутавала ад грабяжоў і марадзёрства французскіх салдат. Вось што пісаў адзін з бабруйскіх памешчыкаў аб паводзінах французскага афіцэра: «Сложенное в большом сарае сено, до двух тысяч пудов, частью скормил, частью на подстилку употребили, а остальное с собою забрал; то же самое сделал и у крестьян... нескольких крестьян немилосердно избили, а одного вешали, всех из домов выгнали; кожухи, свитки, белые и темные, забрали, ... 15 гарнцев водки, молоко, масло и яйца забрали, дверь во флигеле изрубили. У крестьян взяли трое лошадей, меня самого и солдата, стоявшего на охране, чуть штыками не зарубили. Вследствие постоянного прохода войск трудно нам, живущим при дороге, удержаться в своих домах от постоянных опасностей и угроз не только имуществу, но и жизни. Сено, которое было накошено наемными рабочими, все забрано, а не убранное еще сено нет надежды убрать, потому что зима близко, а люди все



Інтэр'ер сялянскай хаты даўніх часоў. З экспазіцыі школьнага музея ў вёсцы Туркі.

разбежались. Рожь и яровое до сих пор еще не убраны, а крестьяне мало что посеяли для будущего года. При таком положении ничего не остается как бросить дом и с женой и тремя детьми нищенствовать». (Акты, издаваемые Виленской комиссией для разборки древних актов. Документы и материалы, относящиеся к истории Отечественной войны 1812 года. Вильна, 1912. Т. 37. С. XL.)

Многія сяляне, ратуючыся ад грабяжу і гвалту, з такім-сякім набыткам і жывёлай хаваліся ў лясах і балотах. Камендант бабруйскай крэпасці Ігнацьеў, адрэзаны ад рускай арміі атрадамі французаў, прыняў на сябе абавязкі бабруйскага ваеннага губернатара і загадаў памешчыкам і сялянам вярнуцца ў свае дамы. Як сцвярджаюць дакументы, «благодаря энергичным мероприятиям Игнатьева, население бобруйского уезда осталось верным своей присяге, и потому бобруйский уезд менее всего пострадал от неприятеля». (Там жа.) Тым не менш становішча было вельмі цяжкім. Сяляне не спяшаліся вярнуцца ў свае дамы, таму ўборку ўраджаю ў жніўні арганізоўвалі ваенныя атрады.

Усё гэта прывяло да заняпаду сельскай гаспадаркі, а неўраджаі пасля вайны — да жудаснага збяднення сялян. У 1822 г. бабруйскі павятовы прадвадзіцель дваранства С.І.Дашкевіч атрымаў з Міністэрства ўнутраных спраў брашуру аптэкара Бранцэнбурта «Средство печь хлеб с примесью исландского мха». У цыркуляры графа Качубея, які суправаджаў гэтую брашуру, гаварылася, што такі хлеб прызнаны не толькі не шкодным, але і выгадным як дапаможны сродак у выпадку неўраджаяў. Каментарый, як гаворыцца, не патрэбны.

Адмена прыгону і паўстанне 1863 г.

Як вядома, у сярэдзіне 19 ст. ў прыгоннай сістэме вядзення гаспадаркі настаў крызіс — знізілася ўраджайнайсць, зменшылася пагалоўе жывёлы, упала даходнасць маёнткаў. Наспела неабходнасць рэформы. У 1861 г. былі выдадзены «Палажэнні» аб умовах вызвалення сялян. На іх падставе ў Мінскай губерні за большасцю сялянскіх гаспадарак прызнаваўся дарэформенны надзел. Аднак мясцовыя палажэнні абмежавалі права сялян карыстацца лясамі і пашай. Выкупная плата за сядзібы і надзелы была завышана — плацілі грашыма 6% гадавых з душавога надзелу, каб выкупіць і зямлю і волю; дваровыя сяляне павінны былі яшчэ два гады працаваць на памешчыка пасля адмены прыгоннага права. А затым ні сядзібы, ні надзелу яны не атрымлівалі. Сяляне, якія працавалі на вотчынных прадпрыемствах і не мелі сядзібы, прыраўноўваліся да дваровых. Пасесіённыя рабочыя атрымлівалі зямельны надзел за павіннасць на фабрыцы, але ён не пераходзіў у іх уласнасць. Былыя стараверы, «панцырныя баяры», чыншавікі, аднадворцы і іншыя саслоўі «вольных людзей» станавіліся арандатарамі, многія з іх ішлі ў заробкі. Былыя агароднікі, бабылі, дваровая і дробная шляхта пасля рэформы ў большасці аказваліся без зямлі і папаўнялі рады сельскіх пралетарыяў.

На такую «рэформу» сяляне адказалі паўсюднымі хваляваннямі. Гэту сітуацыю імкнуўся выкарыстаць польскі рух за аднаўленне былой Рэчы Паспалітай. У 1863 г. пачалося польскае нацыянальнае паўстанне. Яно сапраўды ўскалыхнула Беларусь: маніфестацыі і спевы польскіх гімнаў у гарадах і мястэчках хутка змяніліся арганізацыяй паўстанцкіх атрадаў. Варшаўскі рэвалюцыйны камітэт прызначыў у губерні і паветы ваяводаў, якія мелі тут грамадзянскую і ваенную ўладу, фарміравалі атрады, выбіралі іх начальнікаў. Не абмінула паўстанне і Бабруйшчыну. Камітэт паўстанцаў прызначыў начальнікам Бабруйскага павета памешчыка Чарніхоўскага.

9 лютага 1863 г. мінскі жандарскі штабс-афіцэр Б.Рэйхарт даносіў В.А.Даўгарукаву: «Про настоящий мятеж в Царстве Польском злонамеренные люди распускали нелепые слухи в пользу поляков; по местечкам и деревням, более между католиками, показываются агенты для возмущения жителей; везде заметно брожение. Участие в беспорядках принимают: католическое духовенство, незначительное число помещиков, большая часть мелких чиновников, остальные чиновники, молодые люди, не кончившие курса университетов и гимназий, городские жители, мастеровые, шляхта и, наконец, ученики...»

Сяляне па-свойму рэагавалі на падзеі. Аб гэтым даносіў В.Назімаву мінскі губернскі прадвадзіцель дваранства: «Крестьяне объявили неповиновение экономиям: повинности не отбывают, оброка не платят, рубят лес как свою собственность и в довершении всего этого врываются в помещичьи дворы, производят обыски, вяжут и хватают официантов (служащих) и истязаются над ними под предлогом, что так официанты, как и помещики, подозреваются ими в злонамеренных стремлениях» (ДГА Літвы, ф. 378, воп. 19, спр. 98, л. 9—10.) Сяляне бачылі ў паўстанцах паноў, сваіх прыгнятальнікаў. Гэта і стала адной з галоўных прычын паражэння паўстання: да восені 1863 г. яно ў Беларусі было ліквідавана.

Эканоміка перабудоўвалася на капіталістычны лад. Паўстанне вымусіла царскі ўрад пайсці на некаторыя ўступкі сялянам заходніх губерняў: былі павялічаны надзелы, паменшаны плацяжы, захаваны сервітуты. Аднак і пасля гэтага каля 40% былых памешчыцкіх сялян мелі недастатковыя надзелы і вымушаны былі за адработкі арандаваць зямлю памешчыкаў — пашу, сенажаці і інш. Да гэтага трэба дадаць шматлікія плацяжы і павіннасці сялян: выкупныя плацяжы, мірскія зборы, дарожная, падводная, паліцэйская, кватэрная і іншыя натуральныя павіннасці. Усё гэта прывяло да расслаення вёскі. У 19 ст. бяднейшыя сялянскія гаспадаркі на Беларусі складалі 60—61% усіх двароў, серадняцкія — 30, а кулацкія — 10—13%.

Пасля адмены прыгону асобныя гаспадары, звычайна заможныя сяляне, пачалі выходзіць з сельскай абшчыны і сяліцца на хутарах. Ніякіх планаў хутароў не складалі, не было таксама і мірскіх (абшчынных) прыгавораў аб пераходзе да хутарскога землеўладання, не пыталіся на гэта і дазволу ўлад. Паводле перапісу 1897 г. іх было 17: Сялібка Ясна-Леская (зараз Сяліба), Баравая, Токары, Барсукі, Заглубокае, Крушнякі, Бабові-

шча (цяпер Бабоўе), Боркі 2-я (Боркі 1-я былі вёскай), Віктараўка, Лагодаўка, Лужанец, Харошае (ён жа Чатырыўвалокі), Макараўка, Осава, Бібкаўшчына (ён жа Гарадок), Банёўка 2-я. Некаторыя з іх да 1917 г. разрасліся і сталі вёскамі (Макараўка, Заглубокае, Барсукі, Бабін, Сялібка Ясна-Леская, Лагодаўка), вёска Боркі 1-я і хутар Боркі 2-я зліліся ў адну вёску.

У лістападзе 1906 г. быў выдадзены закон, паводле якога селянін атрымаў магчымасць браць у асабістую ўласнасць абшчынную надзельную зямлю, на якой ён гаспадарыў. Таму ў пачатку 20 ст. ўзніклі новыя хутары — Лесішча, Сулева, Масты, Барак, Пастраш, Спорнае, Маяк, Барок, Мошкі, Палянкі. Хутарская форма давала магчымасць заможнаму сялянству захапіць больш зямлі, пазбавіцца ад абмежаванняў, звязаных з абшчыннай формай землеўладання (перадзелы, цераспалосіца), адкрывала прастор гаспадарчай ініцыятыве. Так, на хутары Баравая (ён жа Лубная Дубрава), які знаходзіўся каля паштовай дарогі з г. Бабруйск у мястэчка Парычы, была карчма. Карчма была і каля хутара Лагодаўка. У хутары Осава пабудаваны вадзяны млын.

Але ж новыя сяляне-ўласнікі часта бяднелі. «Печальные факты продажи земель, купленных крестьянами при содействии крестьянского поземельного банка, начинают повторяться все чаще и чаще... Несчастные покупщики, часто бросив свои надельные участки и лишившись приобретенной земли за невзнос следуемых банку платежей (которых они вследствие малодоходности участков аккуратно вносить не в состоянии), отрываются от земли, — как это ни странно, — переходят в разряд безземельного пролетариата», — пісаў «Минский листок» у 1888 г.

Вось чаму памешчыкі мелі магчымасць весці сваю гаспадарку, шырока выкарыстоўваючы наёмных работнікаў. Газета «Минский листок» у 1886 г. пісала: «Число батраков теперь очень увеличилось, и их можно найти по нескольку семейств в каждой деревне, живущих где-нибудь в убогой и ветхой лачужке или группирующихся около помещиков, от которых они получают отдельную хату, огород и «ординарию». За это батрак с семейством своим обязан работать безвыходно у помещика. В некоторых местах у нас сохранилась даже так называемая «панщина» — особая форма отработа за хату и занимаемый клочок земли. Отбывающий «панщину» должен являться на работу по первому требованию землевладельца или же в определенные дни, за что и пользуется предоставленными ему угодьями. На таких условиях у нас живет немало безземельных рабочих, к числу которых принадлежит также и часть здешней шляхты, не имеющей своей земли и не принадлежащей к числу чиншевиков...»

Наём гадавых і часовых батракоў быў ліхвярскі. Рабілася гэта загадзя, зімою ці нават восенню, з выдачай батракам задаткаў ад $^1/_3$ да $^1/_2$ будучага заробку. Многія памешчыкі на перыяд уборкі збожжа наймалі здзельных і падзённых рабочых, у большасці ім яшчэ зімой выдаваўся задатак збожжам, дровамі, лесаматэрыяламі і г.д. Тыя сяляне, якія працавалі на надзельнай зямлі, бяднелі з-за высокіх казённых і мірскіх падаткаў.

Сяляне Бабруйшчыны хадзілі на чыгуначныя работы, высечку і сплаў лесу па Дняпры, Бярэзіне і Заходняй Дзвіне, займаліся рамізніцтвам. Вельмі распаўсюджаны былі лесанарыхтоўкі, на якія наймаліся цэлымі вёскамі. У Бабруйскім павеце лесанарыхтоўкамі ў 1897 г. займаліся 2,7 тыс. чалавек. Лесарубы карысталіся ў асноўным сякерамі. Пілы з'явіліся толькі ў другой палове 19 ст. і сустракаліся даволі рэдка. Секлі лес у снежні, лютым, а ў сакавіку вывозілі яго да прыстані. Улетку сяляне здзіралі кару з ліпы, альхі і дуба як на продаж, так і дзеля ўласнай патрэбы. Сяляне Бабруйшчыны таксама «тянули на юг» — у руднікі, выязджалі на поўнач — на фабрыкі і заводы Пецярбурга і іншых гарадоў. Заробкі сялян-адходнікаў былі невялікія, але яны давалі магчымасць «перабівацца з хлеба на квас» і неяк існаваць да «новага хлеба».

Памешчыкі імкнуліся перабудаваць сваю гаспадарку на капіталістычны лад і адкрывалі ў маёнтках невялікія прадпрыемствы; такія прадпрыемствы працавалі і ў сёлах, але належалі яны пераважна яўрэям-мяшчанам. Даволі актыўна, напрыклад, разгарнулі прадпрымальніцкую дзейнасць памешчыкі Рагульскія (вёскі Забудзькі, Дойнічава). У 1904 г. Г.Рагульскі заснаваў у Дойнічаве лесапільны завод, на якім працавалі 30 дарослых і 2 падлеткі. А ў 1907 г. яго сын Л.Г.Рагульскі заснаваў вінакурны завод, дзе перад пачаткам першай сусветнай вайны працавалі 10 чалавек. У маёнтках Пятровічы і Брожа акрамя млыноў былі сукнавальні, у маёнтку Аўсімавічы — вадзяны млын, крупадзёрка і сукнавальня. Вадзяныя млыны былі ў Зарэччы, Бірчы; у маёнтку Міхалёва — два вадзяныя і адзін ветраны млын, а ў Дурынічах (зараз

Ізюмава) — нават паравы. Лесапільныя заводы дзейнічалі ў Брожы, Глушы. У Глушы былі таксама смалакурны завод і шклозавод (апошні заснаваны ў 1869 г.). У 1900 г. на шклозаводзе працавалі 32 рабочыя, на лесапільным быў паравы рухавік магутнасцю 30 конскіх сіл. У 1891 г. ў вёсцы Кавалі пачалі дзейнічаць мукамольнае і сукнавальнае прадпрыемствы. Крупадзёркі былі ў Мікулічах, Варатыні, Вялікіх Бортніках; у Будзе працаваў смалакурны завод.

Недахоп зямлі прымушаў сялян шукаць пабочныя заробкі. Наймаліся на работу да землеўласніка азначала працаваць на яго амаль за нішто. Таму частка сялян кінулася ў горад, але там слабаразвітая прамысловасць не магла заняць усе свабодныя рукі. Заставаліся мясцовыя рамёствы і саматужныя промыслы. Найбольш старажытныя з іх — смалакурэнне, выганка дзёгцю і выраб драўнянага вугалю. Сяляне Бабруйшчыны, акрамя таго, пралі лён і пяньку, выраблялі з іх прадметы хатняга і гаспадарчага ўжытку. Тут было шмат краўцоў, шырока распаўсюджана мукамольная вытворчасць. Вадзяныя млыны былі ў вёсках Міхалёва і Осава, ветраныя — у Мікулічах, Пустошцы, Варатыні, Савічах, Коўрыне, Слабадзе, Ступенях, Будзе, Шчаткаве, па два ветраныя млыны — у Турках і Цялушы. Тысячы сялян Бабруйшчыны займаліся рамонтна-будаўнічымі работамі.

Але промыслы нават у сукупнасці з сельскагаспадарчай дзейнасцю не задавальнялі патрэбы сялян. Таму яны вымушаны былі шукаць іншыя крыніцы папаўнення даходаў — адыходныя промыслы, якімі сяляне Бабруйшчыны актыўна займаліся яшчэ да рэформы. Пасля рэформы пашырыліся высечка і сплаў лесу (за мяжу і на поўдзень), дарожнае будаўніцтва, рамізніцтва, што абумовіла істотнае павелічэнне адыходнікаў. Так называлі катэгорыю сялян, якія дзеля заробку (на адыходзе) пакідалі сваю гаспадарку на тэрмін ад аднаго тыдня да года і атрымлівалі да 100 рублёў у год.

Развіццё вінакурнай (броварнай) прамысловасці прывяло да стварэння плантацый хмелю ў Бабруйскім павеце, разам з гэтым пачалі ўзнікаць піўныя лаўкі — у Пабокавічах, Гарбацовічах, Багушоўцы. Пашыраўся рознічны гандаль. Вядома, што 1 кастрычніка кожны год праводзіліся таржкі ў Бірчы, 23 снежня — у Панкратавічах, 24 чэрвеня і 26 кастрычніка — у Малых Бортніках, 9 мая — у Цялушы, 30 жніўня — у Кавалях. Звычайна на таржкі і кірмашы сяляне прывозілі збожжа, жывёлу, драўляны ці гліняны посуд, гародніну, дровы, каб за атрыманыя грошы потым заплаціць падаткі ці купіць прамысловыя тавары ў мяшчан.

З 1880-х гадоў пачаў развівацца сталы лавачны гандаль. Так, колькасць выдадзеных на права гандлю дакументаў у Мінскай губерні ўзрасла з 1879 па 1896 г. ад 4656 да 15 837. Дробныя лаўкі былі ў Малых Бортніках, Міхалёве, Турках, Кавалях, Навіках; у Вялікіх Бортніках і Дуброве — нават па дзве.

«Вызваленне» сялянства ў цэлым не палепшыла іх становішча. Незадаволеная вёска глуха наракала на ўлады, сталі з'яўляцца звесткі аб «беспорядках». Незадавальненне сялян выклікала тое, што ўвесь лес належаў памешчыкам ці казне; вяскоўцы не маглі нават насячы сабе дроў у навакольных лясах. У 1867 г. сяляне вёсак Ціўновічы і Панюшкавічы вырашылі самавольна секчы казённы лес. У маі 1886 г. сяляне вёскі Мальева самавольна пасвілі жывёлу ў памешчыцкім лесе, пакуль іх не выгнала лясная варта. У чэрвені 1886 г. «Минский листок» пісаў пра падзеі ў вёсцы Кавалі. Сяляне гэтай вёскі пасвілі сваю жывёлу (200 галоў) на зямлі мясцовага памешчыка, з-за чаго адбылася сутычка паміж імі і работнікамі памешчыка. У маі і кастрычніку 1905 г. сяляне зрабілі патравы ў маёнтку Рыня. У чэрвені 1905 г. адбылася забастоўка сялян у маёнтку Міхалёва. У студзені 1914 г. 10 сялян сяла Цялуша забілі лесніка эканоміі.

Народная асвета да сярэдзіны 19 ст. грунтавалася на школах граматы, якія звычайна знаходзіліся ў дамах дзячкоў, святароў ці сялян. Выкладчыкамі былі святары ці сяляне, найчасцей адстаўныя салдаты, якія ўмелі пісаць. Грашовай падтрымкі ад казны школы не мелі, і існавалі субсідыі на добраахвотныя ахвяраванні бацькоў вучняў. У такіх умовах пытанне было не ў тым, чаму і як вучыць, а ў тым, каб было каму і дзе вучыць. Таму дзяцей вучылі хто як умеў. Вядома, што ў такіх школах малым часам цяжка было спасцігаць грамату.

Але развіццё эканомікі, змены ў грамадскім жыцці ўнеслі карэктывы і ў сістэму пачатковага навучання. Па-першае, увагу на выхаванне дзяцей звярнула праваслаўная царква. Польскія паўстанні 1830—1831 і 1863 гадоў паказалі сілу каталіцкай царквы ў Беларусі, таму трэба было прымаць меры, каб падарваць гэтую моц і павялічыць уплыў праваслаўя на насельніцтва. Ужо ў 1840-х гадах архіепіскап мінскі Міхаіл «лелеял мысль

о крестьянских при православных церквах училищах». Спачатку праваслаўныя святары засноўвалі такія школы толькі па сваім жаданні, добраахвотна. Пазней пры магчымасці адкрываць іх былі абавязаны ўсе свяшчэннікі. «В них, под руководством священников, дьячки, а где есть и диаконы, должны обучать церковному чтению, пению и гражданской грамоте; священники же — катехизису, молитвам, да беседовать с детьми. На приобретение учебных пособий разрешено употреблять церковные средства.

Семинаристы, рукополагаемые в священники, дают письменное обязательство в том, что при вверенным им церквам непременно заведут училища, при какой-либо к тому возможности». (Труды Киевской Духовной Академии. 1860. Кн. 1. С. 193—195.)

Менавіта таму, што ў царкоўнапрыходскіх школах выкладчыкамі былі святары — выпускнікі семінарый, навучанне тут было лепшае, чым у школах граматы. Такія школы мелі больш сродкаў, бо святары атрымлівалі пэўныя субсідыі ад епархіі на іх падтрыманне. Царкоўнапрыходская школа звычайна стаяла побач з царкоўным дваром, а то і наогул дзеці прыходзілі ў царкву; школа мела адно-два класныя памяшканні, камору і кладоўку для рознага школьнага скарбу. Часта школы мясціліся ў хатах святароў ці дзячкоў і нават у сялянскіх хатах па чарзе (па тыдні). Царкоўнапрыходскія школы былі ў Панюшкавічах, Панкратавічах, Міхалёве. У Панкратавічах школа заснавана ў 1887 г., а ў пачатку 20 ст. яна пераўтворана ў аднакласнае народнае вучылішча; школа ў Міхалёве заснавана ў 1884 г., у 1890—1891 гадах тут вучыліся 34 хлопчыкі і 3 дзяўчынкі.

Акрамя царкоўнапрыходскіх школ існавалі так званыя школы граматы. Іх на Бабруйшчыне было 8: у Гародчыне, Пустошшы, Жарабцах (цяпер Юр'ева), Варатыні, Аўсімовічах, Фартунах, Коўрыне, Пятровічах. У пачатку 19 ст. школам граматы нададзены статус аднакласных народных вучылішчаў. Былі распрацаваны агульныя праграмы для аднагадовых народных вучылішчаў (так пачалі называцца школы граматы), а таксама створаны дырэкцыі народных вучылішчаў, якія займаліся пытаннямі пачатковай адукацыі. У 1863 г. былі адкрыты Бортнікаўскае і Цялушскае народныя вучылішчы, у 1865 г. — Брожскае, у 1869 г. — Гарбацэвіцкае, у 1871 г. — Туркаўскае.

Асноўнымі прадметамі ў такіх школах былі: закон Божы (кароткі катэхізіс і свяшчэнная гісторыя); руская мова, чытанне і пісьмо па кнігах грамадзянскай і царкоўнай граматы; першыя 4 дзеянні арыфметыкі; царкоўныя спевы. Усе прадметы павінны былі выкладацца па падручніках, зацверджаных Міністэрствам народнай асветы ці Духоўным ведамствам. Дзецям рымска-каталіцкага набажэнства закон Божы павінен быў выкладацца «на местном наречии». Народныя вучылішчы таксама размяшчаліся ў дамах святароў, дзячкоў ці сялян. Вучні часта займаліся, не скідаючы верхняй вопраткі, часам стоячы, таму што партаў на ўсіх не хапала. Вучэбных дапаможнікаў не хапала таксама — часта на ўвесь клас была адна кніга. Сшыткаў вучні не мелі, пісьмовыя работы яны выконвалі грыфелем на дошцы.

Відавочна, што такія школы не вырашалі праблему пачатковай сялянскай адукацыі. Да гэтага трэба дадаць, што ўладкаванне народных вучылішчаў ішло вельмі марудна, нягледзячы на імкненне ўлад павысіць узровень пісьменнасці сялян. Справа ў тым, што сяляне неахвотна аддавалі дзяцей у навучанне, бо былі ўпэўнены: усіх хлопчыкаў, якія вывучаць грамату, потым абавязкова забяруць у салдаты. Галоўная ж перашкода заключалася ў тым, што самі сяляне павінны былі даваць асноўныя сродкі для ўтрымання школ. У выніку ўзровень народнай асветы заставаўся нізкім. Тым не менш справа гэта не стаяла на месцы, развівалася. Шмат народных вучылішчаў былі створаны на Бабруйшчыне ў пачатку 20 ст. — у вёсках Обча, Осава, Забудзькі, Мікулічы, Продзвіна, Стасеўка, Орсічы, Малыя Бортнікі, Рымаўцы, Барбарова.

Рэлігія таксама зазнавала пэўныя змены. Вось як апісваецца рэлігійная сітуацыя ў Беларусі пасля далучэння яе зямель да Расіі: «В Белоруссии по ея присоединении духовное управление находилось в следующем положении: большая часть дворян-хлебопашцев (то есть шляхты) и крестьяне... были униаты, имели своего епископа Сморгожевского жившего в Полоцке или в 6-ти верстах от него в селе Струне... Католическое духовенство с прихожанами (состоявшими большею частью из вельмож, дворян и малой части крестьян) находились в заведывании Виленской епархии управляемой в то время епископом князем Масальским. Всех православных монастырей и церквей в Белоруссии... едва ли было 50. Униатских же приходских церквей 500. В католической епархии костелов деканских 6... приходских костелов 15...». (Без - Корнилович М. Исторические сведе-

ния о примечательнейших местах в Белоруссии с присовокуплением и других сведений к ней же относящихся. СПб., 1855. С. 273—281.)

Больш за $^3/_5$ насельніцтва Бабруйшчыны таксама былі уніятамі. Уніяцкая царква пачала існаваць тут з 16 ст., калі ў 1596 г. на саборы ў Брэсце было абвешчана аб'яднанне каталіцкай царквы з праваслаўнай на тэрыторыі Беларусі і Украіны на ўмовах падначалення праваслаўнай царквы папе рымскаму і прыняцця каталіцкай дагматыкі (чысцілішча, дадатак да сімвала веры, што святы дух сыходзіць не толькі ад бога-бацькі, але і ад бога-сына), пры захаванні праваслаўнай царквой сваіх абрадаў і набажэнства на роднай мове і дапушчэння шлюбаў белага духавенства.

«Мудрая и попечительная о благе своих новых подданных Императрица Екатерина II, предоставя им свободу богослужения, оставила Полоцкого Униатского Епископа Сморгожевского при его пастве и всех доходах, получаемых с имений, принадлежавших униатской церкви; обратила свое внимание и на католиков, чтобы и они в Империи не оставались без верховного духовного пастыря. По этому случаю повелено учредить особую Католическую епархию... и ей подчинить все существовавшие в то время в России католические костелы...

Жители многих селений Минской губернии объявили Минскому Архиепископу Виктору свое желание присоединиться к православию, от которого насильно были отторгнуты при польском правительстве. Высочайшим Указам, последовавшим в 1794 г. повелено: чтобы никто из помещиков, арендаторов и духовных лиц католического и униатского закона не осмелился делать ни малейшего притеснения и обид желающим обратиться в благочестие: всякое покушение к препятствию (как против господствующей веры обращаемое) будет принято за ослушание высочайшей воли, а имение обвиненного секвеструется до тех пор, пока не кончится дело...

... Государыня императрица признала за благо в губерниях Минской, Волынской, Подольской, Брацлавской, униатские епископии упразднить, а вместо их в тех губерниях учредить православные епархии. Оставшиеся же по тем губерниям униатские монастыри и церкви приписать к белорусской униатской епархии, поруча их униатскому епископу Лисовскому. По уничтожении таким образом униатских епархий, их епископов, оставшихся без управления, а священникам без приходов, определено жалование; столовые же имения, от епископов отобраны в казну». (Там жа.)

Пасля паўстання 1830—1831 гадоў праваслаўныя епіскапы імкнуліся вярнуць уніяцкую царкву і уніятаў да «истинного благочестия». Адным з актыўных дзеячаў у гэтым напрамку быў полацкі архіепіскап В.Лужынскі. (Дарэчы, памешчык Келчаўскі, маёнткі якога былі на Бабруйшчыне, быў дзядзькам гэтага архіепіскапа.) У другой палавіне 1830-х гадоў Лужынскі аб'ехаў амаль усе паветы Беларусі, каб прымусіць уніяцкіх святароў даць падпіску, што яны далучаюцца да праваслаўнай царквы. У 1837 г. архіепіскап пабываў і на Бабруйшчыне. Вось яго ўспаміны аб гэтым наведванні: «С приездом моим в уездный город Бобруйск Минской губернии встретил меня бобруйский благочинный священник местечковой Лисковской церкви Викентий Оржешкевич и вице-благочинный священник Михалевской церкви Антоний Глыбовский, самый благонадежный, который и представил мне от пяти приходских священников подписи на мое имя.

Господин бобруйский земский исправник сам лично сопровождал меня до тех церквей, которые были исправлены по греко-римскому обряду, именно: в Михалеве помещика Келчевского, родственника моего по матери и в селе Степах.., которые и были освящены... Затем бобруйским благочинным назначил протиерея Глыбовского, а вице-благочинным священника Бацевичской церкви Ст. Олешкевича.

По пути в имение помещиков Прушановских я освятил третью новоисправленную этими помещиками церковь и совершил в ней божественную литургию, а потом молебствие на площади перед нею и преподал пастырское благословение каждому порознь из молившихся, которых было до тысячи душ, трех ближайших приходов...

Многие из священников одни выдали теперь же надлежащие записки, а другие обещались дать оныя, так что ни одного священника не осталось в этой стране ненадежного». (Записки Василия Лужинского, архиепископа Полоцкого. Казань, 1885. С. 144—146.)

Да сярэдзіны 19 ст. ў Мінскай губерні было 535 праваслаўных прыходаў (з іх 322 — былыя уніяцкія). Але многія сяляне былі абыякавымі да спраў веры: «В первую, 1848 г., поездку по епархии, меня ужаснуло крайнее повсеместное сельских прихожан неве-

жество в религии. Двенадцатилетние дети, на вопрос: кто их сотворил? Отвечали: бацько; кто такой Иисус Христос? — не знаю; почему называешься христианином — не знаю. Только старые крестились по-польски и знали, конечно, с ошибками и без смысла, польские повседневные молитвы, а более ничего. Да и то влекло их уже более к костелам, нежели к церквам, где они ничего не понимали, где при отсутствии благолепия, им нечем было прельщаться, а священники обращались не к уму и сердцу, а к карманам за требы. От того русские церкви, смежные с костелами, оставались пусты. Поселяне не понимали, что они русские, православные, а веру считали чем-то прибавочным к повинностям и налогам. Подобное незнание русского и православного было и в семействах духовных; жены и дочери священников и причетников знали только польские молитвы и начальные правила веры. Церковная и русская грамота была им неизвестна». (Труды Киевской Духовной Академии. 1860. Кн. 1. С. 191—193.)

У другой палавіне 19 ст. праваслаўнае веравызнанне стала пануючым на Бабруйшчыне. У Бабруйскім павеце было 59 прыходаў, 7 з іх — на тэрыторыі сучаснай Бабруйшчыны. Вось якія звесткі прыводзяцца пра іх: «Телуша — Церковь Свято-Троицкая, деревянная, построена в 1830 г.; приписная к ней церковь в деревне Панкратовичах. Приход состоит из 11 селений; прихожан 2185 м., 2249 ж. Церковной земли 67 десятин. Причтовые постройки деревянные. Село Турки — Церковь Свято-Троицкая, деревянная, построена в 1898 году; приписная к ней церковь в деревне Бирче. Приход состоит з 11 селений: прихожан 2360 м., 2272 ж. Церковной земли 46 дес. Причтовые постройки деревянные, новые. Село Брожа — Церковь Покровская, деревянная, построена в 1849 году. Приход состоит из 18 селений; прихожан 1356 м., 1347 ж. Церковной земли 80 дес. Причтовые постройки деревянные. Село Дуброва — Церковь Свято-Николаевская, деревянная, построена в 1898 году. Приход состоит из 11 селений. Причтовые постройки деревянные, холодные постройки священника и все псаломщика ветхие. Церковноприходская школа в с. Дуброва. Село Бортники — Иоанно-Предтеченская деревянная церковь построена в 1884 году, приписная к ней церковь в Пархимковичах; в сей церкви имеется местночтимая чудотворная икона Богоматери. Приход состоит из 9 селений; прихожан 1775 м., 1725 ж. Церковной земли 36 дес. Причтовые постройки деревянные; дом псаломщика и надворные строения ветхи. Село Михалево — Церковь Иоанно-Богословская, деревянная, построена в 1784 году; к ней принадлежит 1 приписная и 1 кладбищенская церковь. Приход состоит из 6 селений, прихожан 1909 м., 1829 ж. Церковной земли 89 дес. Причтовые постройки деревянные; дом священника требует ремонта; у псаломщика постройки ветхия. Церковноприходская школа в селе Михалево. Село Понюшковичи — Церковь Рождество-Богородичная, деревянная, построена в 1897 году. Приход состоит из 9 селений, прихожан 797 м., 801 ж. Церковной земли 70 дес., причтовые постройки деревянные, ветхие. Церковноприходская школа в с. Понюшковичи». (Товаров А.В. Историко-статистическая справочная книжка Минской епархии. Мн., 1903. С. 31—34.)

Акрамя таго, існавалі цэрквы ў Малых Бортніках (пабудавана ў 1884), Панкратавічах, Шараёўшчыне, Пабокавічах, Бірчы, Ясным Лесе, Кавалях.

Сродкі для існавання цэркваў у 19 ст. давалі маёнткі з рознымі льготамі, штогадовая дзесяціна, штогадовы грашовы ўзнос ад кожнага двара, грошы ад продажу мёду ў храмавыя святы, дабрачынная міласціна, скарбоначны збор, збор грошай у час кірмашоў і крыжовых паходаў, штатнае жалаванне. Так, у першай палове 19 ст. пры кожнай царкве было 33 дзесяціны зямлі, якая размяркоўвалася паміж святаром і прычтам. Святар меў 10 дзесяцін, якія апрацоўвалі прыхаджане (ці плацілі грашыма), а прычт апрацоўваў пастарунак за ўласны кошт. Дамы будавалі і рамантавалі таксама прыхаджане.

У вёсках Багушоўка (цяпер Слабада-Багушоўка), Туркоўская Слабада, Амяленская Слабада жылі стараверы. Упершыню яны з'явіліся ў Беларусі ў другой палове 17 ст. Калі сабор ў 1667 г. ў Маскве абвясціў анафему раскольнікам, то маскоўскі поп Касьма з 12 сем'ямі самых адданых прыхаджан уцёк «на рубеж літоўскі». Тут у яго быў прыяцель, адзін з сотнікаў старадубскага палка, які даў для жыцця мястэчка Панураўка. Сюды пазней прыязджалі стараверы і адсюль рассяляліся па Беларусі. Часткова яны сяліліся на землях, арандаваных у памешчыкаў; некаторыя купілялі ў памешчыкаў зямлю ў лясах, а памешчыкі ахвотна прадавалі гэтыя пустэчы. Стараверы не зліваліся з мясцовым беларускім насельніцтвам. Галоўнымі іх заняткамі былі гандаль, промыслы і агародніцтва. У

Тэрыторыя Бабруйшчыны на спецыяльнай карце Еўрапейскай Расіі. 1868 г.



Багушоўцы і Амялянскай Слабадзе, напрыклад, былі пастаялыя двары і пiўная лаўка.

Раскольнікі Бабруйшчыны належалі да беспапоўшчынскай секты філіпаўскага напрамку. Яны прызнавалі толькі адно таінства хрышчэння; лічылі, што кожны можа адпраўляць набажэнства з умовай, што ён павінен быць халасты ці ўдовы. Вось чаму стараверы не прызнавалі духавенства і самі выбіралі паважаных людзей-духоўнікаў ці настаўнікаў. Усяго ў Мінскай губерні было 4 суполкі старавераў (па колькасці малельняў), дзве з іх на Бабруйшчыне — у Багушоўцы і ў Туркоўскай Слабадзе.

Існавалі на Бабруйшчыне і два яўрэйскія малітоўныя дамы — у Даманове 2-м і ў Дуброве (цяпер Красная Дуброва). Час заснавання першых яўрэйскіх паселішчаў невядомы, але першы царскі ўказ, які дазваляў яўрэям пераходзіць у земляробскае саслоўе, выйшаў у 1835 г., а ў 1844 г. выйшла палажэнне аб яўрэях-земляробах, якое давала ім ільготы і нават матэрыяльную дапамогу ад казны. Магчыма, у гэты час і была заснавана яўрэйская калонія Даманова 2-е, а ў вёсцы Дуброва з'явіліся яўрэі-земляробы. Спачатку ў яўрэяў было так званае «кагальнае ўпраўленне». Паводле палажэння 1835 г., кагалы складаліся з 3—5 чалавек, выбраных на 3 гады. У 1844 г. яўрэйскія грамадскія ўпраўленні (кагалы) былі ліквідаваны, але на самай справе яны па-ранейшаму, толькі тайна, дзейнічалі і складаліся з равіна і яўрэяў, якія карысталіся найбольшай павагай.

Дарогі і паштовая служба з развіццём эканомікі набывалі ўсё большае значэнне. І тут адбываліся відавочныя змены. Вось што пісаў аб гэтым М.Без-Карніловіч: «Форменную одежду белорусских почтальонов составляли: кафтан красного сукна с зелеными обшлагами; на голове зеленый картуз; на груди Государственный медный герб, и через правое плечо на гарусном черно-желтом снурке медный почтовый рожок. Для содержания почт каждую голову или душу первоначально обложили податью по семь копеек с четвертью...

Генерал-аншеф граф Захарий Григорьевич Чернышев, приняв в свое управление Белоруссию, прежде нежели приступил до установления в ней постоянных почт занялся устройством для них дорог, которых оказалось весьма мало, да и те были узки, извилисты и не везде удобны для проезда. По его распоряжению, землемеры вехами обозначили направление и ширину новых почтовых дорог: мерою определили их длину, указали места, где быть почтовым домам, и на каждых 700 саженях поставили верстовые столбы: там же, где оканчивались семь верст, складывали на известке каменную из кирпича пирамиду.., означавшую милю. Распоряжением гражданского начальства, на новопроложенных дорогах построены деревянные почтовые станции; через реки проделаны мосты; через болота насыпаны плотины, гати; все дороги по бокам обсажены в два ряда березами, составившими впоследствии прекрасную густую, длинную зеленую аллею». (Без-Корнилович М. Исторические сведения... С. 265—267.)

У першай палавіне 19 ст. пачалося актыўнае будаўніцтва дарог на тэрыторыі сучаснай Бабруйшчыны: у 1848 г. была здадзена ў эксплуатацыю дарога Брэст—Бабруйск, у 1851 г. — Брэст—Магілёў; акрамя таго, пабудаваны паштовы тракт Мінск—Бабруйск (называўся маскоўскай дарогай, бо злучаў Бабруйск з Маскоўска-Варшаўскай шашой), шаша ад Магілёва да Бабруйска. Усе дарогі ў 19 ст. падзяляліся на два разрады. Да першага адносілі тыя, што сыходзіліся ў Мінску. Сярод іх вылучаліся, у сваю чаргу, ваенна-камунікацыйныя ці паштовыя дарогі (шырынёй ад 3 да 6 сажняў для руху войска). Будаўніцтва і добраўпарадкаванне шашэйных дарог ажыццяўлялася па спецыяльных планах і чарцяжах і строга кантралявалася. Так, у Мінскім дзяржаўным архіве захавалася «Дело о сносе корчем и постоялых дворов, самовольно построенных помещиками без планов по Бобруйскому шоссе».

Пры дарозе будаваліся так званыя застаўныя дамы, дзе размяшчаліся заставы, вартоўні, дзе правяралі дакументы. Такія застаўныя дамы былі ў Глушы, Саломенцы, Баравой. «Узорны» план такіх дамоў быў зацверджаны ў 1842 г.: над уваходам невялікія франтоны, вуглы будынка і вокны ўпрыгожаны ўступчатай рустаўкай, карнізы мелі выразную прафіліроўку, будаваліся дамы з цэглы і тынкаваліся, таўшчыня сцен была да 1 м; дах крылі ліставым жалезам; гаспадарчыя памяшканні будаваліся таксама з цэглы, але крылі іх гонтай; да варот вялі пад'ёзды, а да галоўнага ўваходу — пешаходная дарожка; па абодва бакі агароджы ў два рады высаджвалі клёны, бярозы, ліпы або ясені.

У першай палавіне 19 ст. ўздоўж ваенна-камунікацыйных ці паштовых дарог Бабруйшчыны была арганізавана паштовая служба з сістэмай змены коней, месцамі адпачынку ў спецыяльных будынках — паштовых станцы-

ях. Тут, у паштовым доме (станцыі), жыў «смотритель», які ажыццяўляў кантроль за рухам па дарозе (коней змянялі толькі пасля прад'яўлення спецыяльнага дакумента — «подорожной» ці «прогонной», якую выдавалі дзяржаўныя ўлады). У комплекс паштовай станцыі ўваходзілі: цэнтральны будынак з памяшканнямі для праязджых, хата для ямшчыкоў і кладоўка, хлявы і канюшні. На паштовай станцыі павінны былі трымаць не менш як 15 коней. Прыкладна так выглядалі паштовыя станцыі ў Глушы, Баравой і Багушоўцы. Самай вялікай з іх, напэўна, была Багушоўка, дзе паводле перапісу 1897 г. жыло 18 чалавек.

Але ж дарогі былі не вельмі добрыя. Зімой «даже на почтовых трактах линия проезда делается до такой степени узкою, что более двух лошадей в ряд никогда не запрягают... На проселочных же дорогах ездят не иначе как поставив лошадей гуськом... По узкости дорог, встреча двух экипажей или нагруженных саней сопровождается всегда затруднениями, продолжительными остановками, а иногда и ссорами... Только государственные крестьяне некоторых имений Бобруйского уезда, да раскольники подряжаются в зимнее время перевозить лен или пеньку... развозом же и поставкою фабрично производимых и колониальных товаров на места занимаются евреи». (Там жа. С. 293—301.)

З пабудовай Лібава-Роменскай чыгункі на Бабруйшчыне з'явіліся і чыгуначныя станцыі — у Брожы і Кавалях. У пачатку 20 ст. ў Глушы было адкрыта першае на Бабруйшчыне паштова-тэлеграфнае аддзяленне.

Словам, нястрымная плынь грамадскага жыцця напорыста прабівала сабе новае рэчышча: рушыліся векавыя асновы феадалізму, яму на змену ўладарна крочыў капіталізм.

Літаратура:

Алфавитный список дворянских родов Минской губернии. Мн., 1903; Болбас М.Ф. Промышленность Белоруссии, 1860—1900. Мн., 1978; Вестник Могилевского земства. 1915. № 3; Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. Т. 2. Мн., 1940; Отчет о церковноприходских школах и школах грамоты Минской епархии за 1890—1891 год. Мн., 1892. С. 144; Памятная книжка Минской губернии на 1913 год. Мн., 1913; Смородский А.П. Столетие Минской губернии. 2 изд. Мн., 1893; Список фабрик и заводов Европейской России. СПб., 1914.

М.А.Сакалова.

Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч

Беларускі пісьменнік, драматург і тэатральны дзеяч Вікенцій Іванавіч Дунін-Марцінкевіч (псеўданім Навум Прыгаворка) нарадзіўся 4.2.1808 г. ў былым фальварку Панюшкавічы Бабруйскага раёна. У 1824 г. скончыў павятовае вучылішча ў Бабруйску. Вучыўся ў Пецярбургскім універсітэце. З 1828 г. працаваў каморнікам Мінскага павятовага межавога суда, у палаце крымінальнага суда, перакладчыкам каталіцкай духоўнай кансісторыі. У 1840 г. пакінуў службу, набыў маёнтак Люцынка каля Івянца, дзе і пасяліўся. Сям'я Дуніна-Марцінкевіча ўдзельнічала ў паўстанні 1863—64 гадоў, за што з кастрычніка 1864 г. да снежня 1865 г. пісьменнік быў зняволены ў мінскую турму, потым знаходзіўся пад наглядам паліцыі; яго дачка Каміла адбывала ссылку.

Мемарыяльная дошка В.І.Дуніну-Марцінкевічу ў вёсцы Сычкава.

Літаратурную дзейнасць пачаў у 1840-я гады. Талент В.І.Дуніна-Марцінкевіча быў разнабаковы: пісаў (на беларускай і польскай мовах) драмы, вершаваныя аповесці, апавяданні, вершы. Пачаў з лібрэта аперэт «Рэкруцкі яўрэйскі набор», «Спаборніцтва музыкаў», «Чарадзейная вада», якія, на жаль, не захаваліся. Першы друкаваны твор — камічная опера «Сялянка» («Ідылія»). Для пастаноўкі сваіх твораў пісьменнік арганізаваў трупу, у якой удзельнічала больш за 20 чалавек, у тым ліку члены яго сям'і, К.Кжыжаноўскі, суседзі, знаёмыя, а таксама аркестр, хор сялян з вёскі Люцынка. На аматарскай

сцэне ў Мінску былі пастаўлены аперэты і опера «Сялянка» на яго лібрэта (музыка С.Манюшкі і К.Кжыжаноўскага). В.І.Дунін-Марцінкевіч быў пастаноўшчыкам спектакля «Сялянка» і выканаўцам ролі Навума Прыгаворкі, ён паказаў і яркі акцёрскі талент. Аўтар асуджаў прыгонныя права, паноў, глыбока спачуваў сялянам, але лічыў, што праблему трэба вырашаць шляхам класавага міру, праз маральнае ўдасканаленне перш за ўсё паноў. Многія арыі аперэт і опер напісаны ў фальклорным стылі. Тэатр В.І.Дуніна-Марцінкевіча — гэта першы беларускі нацыянальны тэатр сучаснага тыпу, які вызначаўся дэмакратызмам, абуджаў нацыянальную свядомасць гледачоў. Пасля прэм'еры «Сялянкі» дзейнасць трупы была забаронена ўладамі, і да 1856 г. тэатр працаваў фактычна нелегальна.

У 1850-я гады пісьменнік распрацоўваў новыя жанравыя формы — вершаванае апавяданне і аповесць, баладу, да ліку якіх адносяцца «Вечарніцы», «Гапон», «Купала», «Шчароўскія дажынкі», «Травіца брат-сястрыца» і «Быліцы, расказы Навума». У іх спалучаюцца рамантычнае ўспрыманне народных звычаяў, традыцый і рэалістычнае імкненне перанесці на грунт рэальнага жыцця вобразы народных легенд, казак, паданняў. Пісьменнік паэтызуе земляробчую працу, узвышае чалавека з народа, што сведчыць пра дэмакратызм яго эстэтычных поглядаў. Яго пяру належаць творы «Благаславёная сям'я», «Славяне ў XIX стагоддзі» (абодва напісаны ў 1856), «Халімон на каранацыі» (1857), «Люцынка, альбо Шведы на Літве» (1861). У камедыі «Пінская шляхта» (напісана ў 1866) выкрываў паразітычную сутнасць царскага чыноўніцтва, востра высмейваў каставую абмежаванасць шляхты. Сатырычная камедыя «Залёты» прысвечана праблеме парэфоменнай вёскі. У 1859 г. пераклаў на беларускую мову «Пана Тадэвуша» А.Міцкевіча (забаронена царскай цэнзурай).



В.Дунін-Марцінкевіч.

Адметная роля В.І.Дуніна-Марцінкевіча ў тым, што гэта першы прафесійны беларускі пісьменнік, які свядома прысвяціў сваю творчасць беларускаму народу, назваўшы сябе «дударом беларускім». Ён быў шчырым другам народа, арыгінальным мысліцелем і майстаком, які многа зрабіў для развіцця беларускай літаратурнай мовы! Памёр 29.12.1884 г. ў Люцынцы, там і пахаваны. Яго імя прысвоена Магілёўскаму абласному тэатру драмы і камедыі ў Бабруйску; у 1997 г. каля будынка тэатра ўстаноўлены бюст пісьменніка; у в. Сычкава ёсць мемарыяльная дошка.

Бабруйскія сокі «дудара беларускага»

Калі мінеш Сычкава, цяжка стрымаць трапяткое хваляванне: недзе кіламетры за тры адсюль — Панюшкавічы, радзіма Вікенція Дуніна-Марцінкевіча, «дудара беларускага». Міжволі ловіш сябе на думцы, што, можа ж, вось гэтую дарогу ў дзяцінстве ці пазней, калі вучыўся ў Бабруйскім павятовым вучылішчы, пешкі і на падводзе шмат разоў прамяраў будучы знакаміты творца. І заўжды душа яго поўнілася хараством гэтых казачных краявідаў з ціхім шэптам аксамітных траў, пера-

лівамі жаўрукоў у блакіце неба, бялявымі грывамі маладога бярэзніку.

А вось і Панюшкавічы — невялікая вёсачка на маляўнічым узгорку, дзе пад зялёнымі шатамі дрэў хаваецца няпоўны дзесятак сялянскіх хат. Тут ён, відаць, сябраваў з мясцовай дзятвой, бываў на сялянскіх вяселлях, сэрцам лавіў мілагучнасць роднага слова. Тут спазнаваў жыццё і побыт беларускіх сялян, жахі прыгону, пакуты простых людзей.

Каля вёскі — невялікі пагорак у полі. Тут колісь і быў фальварак, дзе ў двухпавярховым драўляным доме з'явіўся на свет маленькі Вікенцій. Сваёй зямлі ў бацькоў не было — яе арандавалі ў сваяка мітрапаліта Сестранжэвіча. У доме часта збіраліся і сваякі, і чужы люд. Былі і дзелавыя размовы, і святкі-гулянкі. А колькі цікавага можна было пачуць ад прыслугі ў фальварку!

Воддаль праз зараснікі вярбы і вольхі бойка імчыць да Бярэзіны невялікая рачулка Калінаўка. У тым месцы, дзе цяпер праз яе перакінуўся бетонны масток, было аж два вадзяныя млыны. Каля іх амаль заўсёды стаялі падводы з мяшкамі, якія то ў млын, то назад валаклі на плячах перапэцканыя ў муку дзецюкі. А ў саміх млынах жылі вадзянікі і дамавікі, якія (калі іх задобрыць) памагалі круціць вялізныя камяні-жорны. Ды чаго толькі яшчэ не распавядалі дапытліваму хлапчуку мясцовыя млынары!

А вось і сінь прыгажуні Бярэзіны. Тут Вікенцій несумненна бываў. Купаўся. Хадзіў па пясчаным беразе. А ў юнацкія гады, магчыма, прыносіў сюды свае думы і трывогі перапоўненага маладымі пачуццямі сэрца. І хоць фантан яго творчасці забурліў не на Бабруйшчыне, але бясспрэчна, што карані яго музы — на нашай зямлі: яе жыватворныя сокі далі натхненне і моц яго паэтычнай дудцы.

Ці не ад тых хлапчуковых назіранняў многія творы Дуніна-Марцінкевіча напісаны на «языку беларускага люду», галоўны герой якіх — «селянін падданы»:

Мову сэрца майго ўчула
Беларусь, о край гасцінны,
І да сэрца прыгарнула
Дудара, як свайго сына...

Альбо згадаем радкі са славутай оперы «Сялянка»:

О, край мой любы, мой родны!
Ты знаеш думак прычыны.
Тут, як у раі, аздобна
Ціснуцца дзецтва ўспаміны.

Гэта пачуцці галоўнай гераіні оперы — Юліі. Але ў іх пазнаюцца пачуцці самога аўтара — яго ўспамін пра мілы сэрцу куточак Бабруйшчыны, дзе прайшло яго дзяцінства.

Несумненна, што некаторыя людзі, якія ў дзяцінстве ці юнацтве асабліва ўразілі будучага паэта і драматурга, маглі стаць прататыпамі яго герояў, маглі быць выкарыстаны іх прозвішчы, рысы характару, аблічча. Напрыклад, у «Пінскай шляхце» ёсць персанаж Кабылянскі. А ў Бабруйску быў гараднічы Кабылінскі, якога пісьменнік мог ведаць, калі яшчэ вучыўся тут у павятовай школе, а мог і пазней, калі служыў у Мінскім судзе, а гараднічы Кабылінскі праходзіў па судовай справе 1831 г. як адзін са змоўшчыкаў па захопе Бабруйскай крэпасці.

Пра Бабруйшчыну Дунін-Марцінкевіч пастаянна помніў. У 1852 г. ў Бабруйску ён паказаў оперу «Сялянка». Сюды не раз наведваўся. Пад адным з яго вершаў пазначана: Бабруйск, 6 снежня 1854 г. Пэўна, верш гэты — светлы смутак-успамін пра родны кут, пра незабыўную «зорку-галубку» яго юнацтва.

СМУТАК НА ЧУЖЫНЕ

О, любая хатка!
Ты — родная матка,
Якою нудотаю поўніцца сэрца.
І слёзна я плачу,
Здаецца, што бачу
Выгнаннікаў любых на тым бедным свеце.
Яшчэ калі б зранку
Дзяўчыны-каханкі
Усмешку адчуць і пагляду праменні, —
Была б асалода,
А то, божа, шкода
Глядзець навакола, дзе нудныя цені.
Загляну ў аконца —
З-за хмары, як сонца,
Святло воч дзявочых зычліва прывеціць.
То зорка малая
З аконца заззяе,
Блакітныя вочкі гарэзна засвецяць.
О, зорка-галубка,
Скажы, мая любка,
Ці сплюшчыў анёлак мой вочы?
Калі ёй да ранку
Пяе калыханку
Марфей, — пажадай добрай ночы.
Калі ж яна ўстане,
Навокал пагляне
І ранак самотна сустрэне за звычай,
Згані ты хмурынкі,

Прывабнасць дзяўчынкі
Няхай расквітнее на любым абліччы.
О, зорачка-любка,
Скажы мне, галубка,
Куды яна марамі, сэрцам імкнецца.
О, божа, мой божа,
А як было б гожа
Пазнаць яе думкі ўсхвалёваным сэрцам.

А.М.Нянадавец.

Нашчадкі А.С.Пушкіна на Бабруйшчыне

У цэнтры вёскі Цялуша, непадалёку ад Свята-Троіцкай царквы, узвышаецца старанна дагледжаная магіла. На шэрым мармуры надмагільны надпіс: «Наталья Александровна Пушкина. По мужу Воронцова-Вельяминова. 3 декабря 1912 г. 53 лет».

Так, гэта ўнучка вялікага рускага паэта, дачка яго старэйшага сына Аляксандра Аляксандравіча Пушкіна. Хто яна? Як апынулася на Бабруйшчыне? Чаму тутэйшыя людзі так свята захоўваюць пра яе памяць?

З дзяцей Аляксандра Аляксандравіча Пушкіна Наталля Аляксандраўна была першай. Расла яна жыццярадаснай, ветлівай і гаварлівай. Вучылася ў Віленскай гімназіі, але не скончыла яе. Атрымала добрую хатнюю адукацыю.

Бацька Наталлі Аляксандраўны быў камандзірам палка, і ў іх доме бываў адзін з лепшых афіцэраў гэтага палка Павел Аркадзевіч Варанцоў-Вельямінаў, якога А.А.Пушкін цаніў за мужнасць, за сумленны і прамы характар. Прыйшоўся ён па душы і Наталлі Аляксандраўне. Вяселле згулялі ў Разані. Спачатку жылі ў Казлове (Мічурынску). А праз некаторы час П.А.Варанцоў-Вельямінаў падаў у адстаўку і пераехаў з жонкай у памесце Вавулічы (цяпер вёска Дубаўка), якое належала яго маці. Гэта было вялікае памесце: 250 дзесяцін ворнай зямлі, астатняе — няўдобіца, балота. Тут ён фактычна быў упраўляючым у маці, а пасля яе смерці частку даходаў з памесця аддаваў сёстрам.

Старажылы, якія ведалі Наталлю Аляксандраўну, з цеплынёй і сардэчнасцю ўспаміналі пра яе. Яна ўважліва ўслухоўвалася ў беларускую гаворку і хутка пачала разумець сэнс беларускіх слоў. Цікавілася мясцовымі паданнямі, любіла слухаць беларускія народныя песні. Наталля Аляксандраўна была разумнай і валявой жанчынай. Усе ставіліся да яе з павагай, цанілі яе як высакароднага чалавека з незвычайным характарам. Расказваюць, што і муж любіў яе моцна і беззапаветна.

Ад прыроды Наталля Аляксандраўна была вельмі адораным чалавекам. Добра малявала (гэта адзін з любімых яе заняткаў). Валодала французскай, англійскай і нямецкай мовамі, добра ведала гісторыю, любіла літаратуру і, вядома, цікавілася даследаваннямі жыцця і творчасці свайго дзеда. Сама пісала вершы, але не друкавала іх. Захаплялася кветкаводствам. Вельмі любіла фіялкі. Яе сядзіба славілася ў акрузе прыгажосцю кветнікаў і алей.

Акрамя сядзібы ў Вавулічах Варанцовы-Вельямінавы мелі яшчэ і дом у Бабруйску, які славіўся гасціннасцю. Да ўнучкі паэта часта прыязджала радня і часам праводзіла ў Бабруйску ўсё лета. Тут жа, у Бабруйску, сям'я Варанцовых-Вельямінавых прымала ўдзел у стварэнні гарадской бібліятэкі імя А.С.Пушкіна, якая адчыніла свае дзверы для

А.А.Пушкін, старэйшы сын паэта.

Н.А.Варанцова-Вельямінава.

наведвальнікаў у лютым 1901 г. — да 64-й гадавіны смерці паэта.

Паводле ўспамінаў сялян, Наталля Аляксандраўна была сардэчнай і чулай жанчынай. Ніхто не мог прыгадаць выпадку, каб яна павысіла голас, накрычала на каго-небудзь ці пакрыўдзіла, наадварот, заступалася, калі каго несправядліва крыўдзіў упраўляючы. Яна дапамагала сялянам збожжам, насеннем, лекамі, лесам на будоўлю дамоў, пазычала грошы, каб тыя маглі купіць жывёлу. Адукаваныя сяляне бралі ў яе кнігі для чытання, знаёміліся з творчасцю А.С.Пушкіна.

Але найлепш ставілася Наталля Аляксандраўна да сельскай дзетвары. Калі ўбачыць, што хто-небудзь з мальцоў парэжа руку ці параніць нагу, — тут жа прамые рану, перавяжа, супакоіць. Іншы раз і парваную кашулю зашые, каб дома менш дасталося гарэзу. А то і падорыць што-небудзь з адзення сваіх дзяцей.

Пра Паўла Аркадзевіча ўспаміналі як пра «нервовага» чалавека, але дадавалі, што ён пакрычыць-пакрычыць, ды хутка адходзіць. У сялян ён, як і яго жонка, цаніў чалавечую годнасць. Расказвалі пра такі выпадак. Упраўляючы за шгосьці ўшчуваў сялян, не выбіраючы слоў. Павел Аркадзевіч выйшаў на ганак, падазваў яго і запытаў: «Ты думаеш, у іх менш розуму, чым у цябе?.. Хіба можна так размаўляць з людзьмі?..» Не любіў ён высакамерных людзей, здольных рабіць кар'еру наперакор уласнаму сумленню. Такіх людзей ён называў «дажджавымі пухірамі» — за іх душэўную пустату і нікчэмнасць.

Наталля Аляксандраўна з мужам клапаціліся аб тым, каб сялянскія дзеці авалодалі граматай, таму садзейнічалі будаўніцтву школы ў Цялушы. Тут яны наладжвалі ёлкі, на каляды дарылі цацкі, цукеркі і іншыя ласункі, загорнутыя ў вышытыя хусткі. Для сельскай дзятвы на той час гэта было вялікім шчасцем. А яшчэ большым — магчымасць вучыцца.

Маці беларускага паэта Міколы Аўрамчыка маленькай дзяўчынкай прысутнічала на адкрыцці Цялушскай школы. Праўда, вучыцца ў гэтай школе ёй давялося ўсяго два гады. Але і за гэты час яна паспела пазнаёміцца з пушкінскім словам. І хто ведае, можа, яно, гэта слова, паэтычнай іскрай успыхнула ў сэрцы яе сына.

Сам М.Аўрамчык пра гэта ўспамінае: «Мяне... маці прычасціла паэзіяй вялікага рускага генія. Помню, пасярод нашай прасторнай хаты паліцца бляшаная печка. Манатонна паскрыпвае самапрадка, на якой маці прадзе кудзелю. Мы, малыя, сама што раздурэліся на падлозе.

Раптам маці спыняе самапрадку і кажа:

«Супакойцеся... Не апячыцеся аб печку. Чуеце, што робіцца на дварэ...» І яна расказвае, як там бура то вые, як звер, то плача, як

Сям'я Варанцовых-Вельямінавых.

дзіця, то стукае ў акно, як запознены падарожнік...

Мы сціхаем і прыслухоўваемся. Чуваць, як у печцы час ад часу страляюць дровы, а на дварэ сапраўды хтосьці то вые, як звер, то плача, як дзіця. Здаецца, што запознены падарожнік нясмела стукае ў шыбу. Я ўглядаюся ў акно, але нічога не магу разгледзець, бо на шыбах мароз намаляваў дзівосныя дрэвы і кусты. Гэта было акно ў нейкі казачны свет.

Маці вельмі складна расказвала казкі. То пра зялёны дуб, каля якога на залатым ланцугу ўдзень і ўночы ходзіць вучоны кот, а побач блукае лясун, а на галлі сядзіць русалка. То пра князя, што сустрэў сваю смерць, наступіўшы на конскі чэрап, з якога выпаўзла змяя. То пра мужыка, які, дазнаўшыся ад дзяцей, што іх сеці «прыцягнулі мерцвяка», пайшоў і адпіхнуў вяслом у раку тапельца...

Колькі таямнічасці і загадкавасці было ў гэтых казках!..»

Некаторым сялянскім дзяўчынкам Наталля Аляксандраўна і Павел Аркадзевіч дапамагалі атрымаць не толькі пачатковую адукацыю, але і працягваць вучобу, стаць настаўніцамі, акушэркамі-фельчарыцамі. Наталля Аляксандраўна як член дабрачыннага таварыства аказвала дапамогу многадзетным сем'ям. Але гэта не задавальняла яе кіпучую натуру. Яна марыла пра вялікую справу — арганізаваць прытулак для старых жанчын, стварыць нешта накшталт садка для сялянскіх дзяцей. Але ў тых умовах ажыццявіць свае планы не змагла.

Памерла Наталля Аляксандраўна ў 1912 г. ад запалення лёгкіх. Смерць узрушыла, ашаламіла яе мужа. Пасля гэтага ён пражыў яшчэ 8 гадоў. Вымушаны быў пакінуць Бабруйшчыну з-за суровых рэвалюцыйных падзей. Памёр ад інфаркту ў 1920 г. ў Кіеве.

Час трывог і спадзяванняў

Пачатак новага стагоддзя азнаменаваўся ростам сацыяльна-эканамічных супярэчнасцей у грамадстве. Прывід камунізму, які ўжо шмат часу блукаў па Еўропе, цяпер перасягнуў межы Расіі і ўпэўнена крочыў па яе абшарах, у тым ліку і па Беларусі. На гарызонце ўсё ярчэй успыхвалі сполахі рэвалюцыйнай навальніцы. На сцэну палітычнай барацьбы заступала новая рэвалюцыйная сіла — пралетарыят і яго партыя.

Масавы рэвалюцыйны рух, які ахапіў Беларусь вясной і летам 1905 г., спрыяў далейшаму росту і ўмацаванню яе сацыял-дэмакратычных арганізацый. У час склікання 3-га з'езда РСДРП у Паўночна-Заходнім краі было больш за 30 партыйных груп і арганізацый. Паўночна-Заходні камітэт афіцыйна аб'ядноўваў 6 буйных партарганізацый: Дзвінскую, Мінскую, Віцебскую, Бабруйскую, Смаргонскую і Віленскую. Бабруйская арганізацыя РСДРП створана ў пачатку 1904 г. з мясцовых іскраўцаў. Першым яе арганізатарам і кіраўніком быў Р.Л.Шклоўскі. У ліку арганізатараў былі таксама Ф.В.Сімончык і Л.С.Гальпінскі. Да верасня 1905 г. арганізацыя аб'ядноўвала каля 80, а да снежня 1905 г. — 150 членаў і 300 спачуваючых. Яна



Магіла Н.А.Варанцовай-Вельямінавай.

У сям'і Варанцовых-Вельямінавых было 5 дзяцей — Марыя, Соф'я, Міхаіл, Фядосій, Вера. Іх жыццё і дзейнасць былі звязаны з Бабруйскам. На жаль, некаторых з іх, як і некаторых з іх дзяцей, напаткаў горкі лёс ахвяр рэпрэсій.

Толькі народ Бабруйшчыны помніць той светлы парастачак пушкінскага племя, што так прыжыўся на гэтай зямлі. Магіла ўнучкі паэта заўжды з любоўю дагледжана. Тут заўжды цвітуць кветкі. Глядзі таксама артыкул «Свята пушкінскай паэзіі» ў апошнім раздзеле кнігі.

Друкуецца паводле кн.: Лиокумович Т.Б. Потомки А.С.Пушкина в Белоруссии. Мн., 1991.

Цар Мікалай II на вайсковых манеўрах пад Бабруйскам. 1916 г.

мела друкарню і бібліятэку нелегальнай літаратуры. Для разгортвання палітычнай работы сярод салдат гарнізона Бабруйскай крэпасці ўвосень 1950 г. была створана Бабруйская ваенна-рэвалюцыйная арганізацыя РСДРП.

Хоць Бабруйская арганізацыя РСДРП аб'ядноўвала ў сваіх радах бальшавікоў, меншавікоў і прымірэнцаў, аднак яе актыўная дзейнасць, сувязі з Загранічным бальшавіцкім цэнтрам, Пецярбургскім камітэтам і Мінскай арганізацыяй РСДРП дазволілі ёй па асноўных пытаннях займаць бальшавіцкія пазіцыі. Пад яе кіраўніцтвам адбыліся многія выступленні працоўных і салдат Бабруйска.

Вясной і летам 1905 г. разгарнуўся і сялянскі рух. У маёнтках Жамчужнікава і Кутаева Бабруйскага павета сяляне аб'явілі забастоўку, не дапусцілі да работы наёмных рабочых.

Пад непасрэдным кіраўніцтвам Бабруйскай групы РСДРП восенню 1905 г. баставалі батракі маёнткаў Міхалёва, Бортнікі, Яннікі, Вавулічы. У некаторых маёнтках сялянепадзёншчыкі і батракі арганізоўвалі грашовыя фонды для аказання дапамогі ўдзельнікам стачак. Рабочы рух зліваўся з сялянскім. Так, з-за жорсткай эксплуатацыі і мізэрнай платы за сваю працу рабочыя Глушанскага шклозавода, а за імі і батракі маёнтка Дойнічава выступілі супраць свавольства арандатараў, прадпрымальнікаў, за размеркаванне памешчыцкай зямлі сярод беднаты суседніх вёсак. У забастоўцы прымалі ўдзел каля 400 рабочых і ўсе батракі маёнтка. Выступленне было падаўлена атрадамі жандармерыі з Бабруйска. Яго ініцыятараў саслалі ў Сібір на пастаяннае пасяленне, частка рабочых і батракоў была кінута ў турмы.

Пад уплывам рабочага руху і рэвалюцыйнай агітацыі ў 1905—1906 гадах у Бабруйскім павеце адбылося 25 сялянскіх выступленняў, у тым ліку самавольныя высечкі лесу і патравы памешчыцкіх угоддзяў, забастоўкі парабкаў і падзёншчыкаў.

Пасля падаўлення рэвалюцыі 1905—1907 гадоў царскі ўрад імкнуўся расправіцца з рэвалюцыйнымі сіламі ў краіне. Адначасова ўрад хацеў прадэманстраваць хаця б нейкую бачнасць дэмакратыі. Былі назначаны выбары ў 3-ю Дзяржаўную думу. У Бабруйскім павеце яны праводзіліся ў чэрвені 1907 г. Выбары былі двухступеньчатыя. Спачатку на з'ездах па саслоўях выбіралі выбаршчыкаў, а потым яны выбіралі членаў Дзяржаўнай думы. У склад выбаршчыкаў ад Бабруйскага павета трапілі тры буйныя і два дробныя землеўладальнікі, 5 свяшчэннікаў. Ніхто з рабочых, сялян, мяшчан — гарадскіх жыхароў у склад выбаршчыкаў не трапіў.

Царскі ўрад, напалоханы масавымі пратэстамі сялян, пайшоў на аграрную рэформу, якая атрымала назву стальпінскай. Паводле гэтай рэформы сяляне, якія жадалі выдзеліцца з абшчыны, маглі рассяляцца па хутарах. Ім адводзіліся ўрадлівыя землі ў лепшых месцах. Таму вакол насаджэння хутарской сістэмы ў многіх вёсках таксама ішла барацьба.

Тым часам і ў свеце складвалася неспакойная абстаноўка. Еўрапейскія дзяржавы рыхтаваліся да вайны. У 1912 г. з гэтай прычыны праводзіўся Усерасійскі ваенна-конны перапіс. Вось што ён паказаў па Бабруйскім павеце: тут налічвалася 157 сельскіх абшчын, 1 горад, 1360 пасяленняў, 28 843 двароў, або гаспадарак, з іх 23 199 мелі коней, 19,6% двароў не мелі коней; усяго ў павеце было 34 368 коней.

У 1914 г. пачалася 1-я сусветная вайна. 1 жніўня 1914 г. Германія абвясціла вайну Расіі. Перад гэтым і ў Бабруйскім павеце была аб'яўлена ўсеагульная мабілізацыя. Пры наступленні нямецкай арміі ваеннае камандаванне разам з бежанцамі прымусова высяляла людзей у тыл дзеючай арміі. Колькасць бежанцаў расла з кожным днём, стан іх быў жудасны. Як паведамляў 18 лістапада 1916 г. камітэт Бабруйскага аддзела Літоўскага таварыства па аказанні дапамогі пацярпеўшым ад вайны, «у выніку скучанасці ў цесных памяшканнях, дрэннага харчавання і наогул неспрыяльных умоў, у якіх знаходзяцца бежанцы, маюць месца заразныя хваробы, назіраецца вялізны працэнт смяротнасці як сярод дзяцей, так і дарослых».

Для абслугоўвання фронту у Беларусі была сканцэнтравана вялікая колькасць кадравых рабочых з Петраграда, Масквы, Урала, Данбаса і іншых прамысловых цэнтраў. Мно-

гія з іх прайшлі школу рэвалюцыйнай барацьбы і, вядома, негатыўна ставіліся да ваеннай палітыкі расійскіх улад. Толькі ў ваенных майстэрнях у Бабруйску было занята каля 1400 рабочых.

Для будаўніцтва ваенных умацаванняў ва ўсе воласці павета былі разасланы разнарадкі на пастаўку рабочых і падвод. Але гэтыя патрабаванні не заўсёды выконваліся. Так, спраўнік павета Д.Буракоў 28 лістапада 1915 г. даносіў мінскаму губернатару, што ім напісаны і разасланы з коннымі стражнікамі загады валасным старшынам Гарбацэвіцкай, Бортнікаўскай, Туркоўскай і іншых валасцей выдзеліць 400 рабочых і 200 падвод інжынеру, які вёў у Бабруйску будаўніцтва моста цераз Бярэзіну і пад'яздных шляхоў да яго. Загады дадзены пад асобыя распіскі з папярэджаннем аб адказнасці па законах ваеннага часу за іх невыкананне. Толькі Бортнікаўская воласць прыслала 56 рабочых і 97 падвод, астатнія амаль нічога не накіравалі, абмежаваўшыся складаннем спісаў.

У 1915 г. на тэрыторыі павета з'явілася значная колькасць скупшчыкаў жывёлы для паставак мяса інтэнданцкай службе арміі. Як правіла, скупшчыкі плацілі ад 3 рублёў 25 капеек да 3 рублёў 60 капеек за адзін пуд жывой вагі жывёлы, а збывалі купленае інтэндантам у 1,5—2 разы даражэй. На гэтым за кошт казны нажываліся адны і другія.

Што і казаць, час быў надзвычай трывожны і складаны. Але людзі жылі спадзяваннямі на лепшае. І перамены былі не за гарамі — набліжаліся рэвалюцыйныя падзеі 1917 года.

Ф.Сідарэнка.

Дакументы сведчаць...

ТЭЛЕГРАМА ЛЕСАПРАМЫСЛОЎЦА МАГІДСОНА МІНСКАМУ ГУБЕРНАТАРУ П.Г.КУРЛОВУ З ПРОСЬБАЙ АБ ДАПАМОЗЕ Ў АХОВЕ ЯГО ЛЕСУ Ў БАБРУЙСКІМ ПАВЕЦЕ, ЯКІ РАСКРАДАЮЦЬ СЯЛЯНЕ.

2 лютага 1905 г.

Крестьяне Турковской и Степской вол. Бобруйского уезда уже 6-й день большими толпами и сотнями подвод грабят лес из купленного мной леса при имении Плессы Бобруйского уезда, нападая на приказчиков и лесников, которые лишены возможности охранять лес из-за угрозы убийства. Вынужден и осмеливаюсь покорнейше просить ваше Высокопревосходительство о помощи.

Лесопромышленник Магидсон

Дзяржаўны архіў Мінскай вобл., ф. 295, воп. 1, спр. 9022, л. 5—6.

ПРАШЭННЕ ПАМЕШЧЫКА РАГАЧОЎСКАГА ПАВЕТА Э.І.БУЛГАКА МІНСКАМУ ГУБЕРНАТАРУ П.Г.КУРЛОВУ АБ ПРЫНЯЦЦІ МЕР СУПРАЦЬ ВЫСЕЧКІ ЛЕСУ СЯЛЯНАМІ Ў ЯГО МАЁНТКУ.

1 сакавіка 1905 г.

В имении моем Добосне, расположенном в Бобруйском уезде Минской губ. и Рогачевском уезде Могилевской губ., жители дер. Скрипица Качеричской вол., староверы, с половины февраля месяца стали производить массовые порубки принадлежащего мне леса — уже в пределах Могилевской губ.

Толпой в 30—40 человек они наезжают в лес, рубят, что им угодно и где угодно, и уезжают в дер. Скрипица, расположенную в Минской губ., увозя с собой все похищенное. Лесная стража имения справиться с рассвирепевшей, вооруженной топорами и дубинами толпой, угрожающей избиениями и убийствами, конечно, не в силах. Я обращался к содействию местной полиции, но увещевания станового пристава делу не помогли и немедленно после его отъезда массовые порубки повторились и продолжаются ежедневно, и мой лес остается без защиты, в распоряжении грабителей.

Ввиду изложенного честь имею покорнейше просить Вас принять самые энергичные меры для прекращения сего наглого произвола и ограждения моей собственности.

Эдгар Игнатьевич Булгак.

Дзяржаўны архіў Мінскай вобл., ф. 295, воп. 1, спр. 9053, л. 66.

З ДАНЯСЕННЯ СТАРШАГА ФАБРЫЧНАГА ІНСПЕКТАРА МІНСКАЙ ГУБЕРНІ Ў МІНІСТЭРСТВА ГАНДЛЮ І ПРАМЫСЛОВАСЦІ АБ УВЯДЗЕННІ 8-ГАДЗІННАГА РАБОЧАГА ДНЯ НА ФАБРЫЧНА-ЗАВОДСКІХ ПРАДПРЫЕМСТВАХ ГУБЕРНІ

2 чэрвеня 1917 г.

... В конце мая остановлен, как заявляет владелец, для ремонта стеклоплавильной печи стекольный завод «Глуша» (Бобруйского у.), причем все рабочие и мастера в числе 150 чел. получили расчет.

О вышеизложенном имею честь донести отделу промышленности.

Ст. фабричный инспектор

Делопроизводитель (подпісы адсутнічаюць)

Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці, ф. 311, спр. 263, л. 49.

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ АБ РАШЭННІ БАБРУЙСКАГА ПАВЯТОВАГА СЯЛЯНСКАГА З'ЕЗДА МІНСКАЙ ГУБЕРНІ ВЫКАЗАЦЬ НЕДАВЕР ПАВЯТОВАМУ КАМІСАРУ ЧАСОВАГА ЎРАДА

3 ліпеня 1917 года

Уездный крестьянский съезд Бобруйского у. из выборных всех волостей уезда, состоявшийся 24 и 25 июня, постановил выразить недоверие уездному комиссару Воронцову-Вельяминову. Избран комиссаром окончивший Киевский университет Павел Николаевич Ефрем. Съезд просит об утверждении последнего. Постановление крестьянского съезда сообщено отделом губернскому комиссару для сведения и соответствующего представления Министерству внутренних дел.

Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі, ф. 406, воп. 2, спр. 21, л. 17.

ПАВЕДАМЛЕННЕ «МИНСКОЙ ГАЗЕТЫ» АБ РАЗДЗЕЛЕ ЗЯМЛІ ПАМЕШЧЫКА СЯЛЯНАМІ ВЁСКІ САВІЧЫ ТУРКОЎСКАЙ ВОЛАСЦІ БАБРУЙСКАГА ПАВЕТА МІНСКАЙ ГУБЕРНІ

Крестьяне дер. Савичи Турковской вол. скопом отправились в имение Вавуличи, принадлежащее П.А.Воронцову-Вельяминову, и самоуправно разделили между собою заготовленную под озимый посев землю, отметив колышками границы участков для каждого домохозяина. Дело передано судебным властям для возбуждения преследования по 269 ст. Аналогичные аграрные правонарушения поступают и с других мест Бобруйского у.

Минская газета. 1917. 15 августа.

1917

1941

НА КРУТЫМ ПАВАРОЦЕ ГІСТОРЫІ

Для перамогі Кастрычніка на Бабруйшчыне была добра падрыхтавана глеба. Лютаўская рэвалюцыя 1917 г. ўскалыхнула тут не толькі рабочых, але і шматлікае сялянства, барацьба якога з часам набывала палітычны характар. Сяляне разганялі мясцовую ўладу — земскіх начальнікаў і валасныя ўпраўленні і стваралі новыя органы — сялянскія камітэты. Так, жыхар вёскі Атрошкавічы, балтыйскі матрос П.С.Балтарчук, накіраваны бальшавіцкім камітэтам флоту на радзіму для арганізацыі прапагандысцкай работы, пасля падзення царскага рэжыму стварыў першы ў воласці зямельны камітэт. Пазней камітэты пачалі стварацца і ў іншых месцах.

З 20 па 28 красавіка 1917 г. ў Мінску праходзіў сялянскі губернскі з'езд. Дэлегаты з Бабруйска ехалі на яго з цвёрдым наказам падтрымліваць палітыку бальшавікоў, пад кіраўніцтвам якіх і праходзіў з'езд (старшынстваваў М.В.Фрунзе). Вярнуўшыся дамоў, дэлегаты павялі рашучую агітацыю за выкананне пастаноў з'езда.

Павятовы сялянскі з'езд скінуў з пасады павятовага камісара памешчыка П.Варанцова-Вельямінава і абраў на гэтае месца П.Яфрэма. Тады ж павятовы выканком санкцыяніраваў бясплатны выпас сялянскай жывёлы ў казённых, уласных лясах і на лугах. А 26 ліпеня зямельны камітэт павета канфіскаваў 88 дзесяцін панскай зямлі ў маёнтку Плёсы і перадаў яе Туркоўскаму зямельнаму камітэту для перадзелу паміж беднякамі. Самастойна сяляне захапілі сенакосныя лугі памешчыкаў у в. Лінкевічы, у маёнтках Іванаўка, Крываносы, а ў в. Савічы вяскоўцы падзялілі паміж сабою ўзараную пад пасеў зямлю П.Варанцова-Вельямінава.

Таму рэвалюцыю на Бабруйшчыне чакалі і перамогу Кастрычніка шчыра віталі. Ужо 8 лістапада 1917 г. ўся ўлада ў Бабруйску перайшла ў рукі Саветаў. Рабочыя і сяляне павета сталі чакаць істотных перамен у грамадскім і сваім уласным жыцці. І новая ўлада шмат чаго рабіла для гэтага.

Але ўжо ў пачатку студзеня 1918 г. Бабруйск і павет былі акупіраваны польскімі войскамі корпуса Доўбар-Мусніцкага. Акупанты разагналі вясковыя і валасныя зямельныя камітэты, а замест іх стварылі новыя органы ўлады: у вёсках — старостваў, у валасцях — земскія ўправы. Практычна гэта былі органы па забеспячэнні акупантаў прадуктамі харчавання і фуражом. З тымі, хто выступаў супраць рабаўніцтва, жорстка распраўляліся. Камандзір легіянераў у Бабруйску абвясціў: «Кожная вёска, адкуль будзе зроблены хоць адзін стрэл, будзе знішчана...» Натуральна, гэта выклікала незадавальненне і супраціўленне сялян. Сталі ўзнікаць разрозненыя ўзброеныя групы мясцовых жыхароў, якія ноччу нападалі на палякаў і на іх паслугачоў. Пакрысе фарміраваліся партызанскія атрады, завязваліся адкрытыя зацяжныя баі паміж палякамі і партызанамі. Першымі рашучы ўзброены адпор легіянерам далі жыхары вёсак Малыя і Вялікія Бортнікі. (Пра гэта гл. асобны нарыс Міхася Зарэцкага «Цені мінуўшчыны».)

Польская акупацыя была нядоўгай. Ужо ў дваццатых чыслах лютага 1918 г. Бабруйшчыну акупіравалі нямецкія войскі. Сяляне, навучаныя горкім вопытам, хавалі ад іх апошняе, каб хоць неяк выжыць. Разам з тым працягвалася канцэнтрацыя груп і партызанскіх атрадаў, якія дзейнічалі яшчэ пры паляках. Насельніцтва ўзбройвалася і гуртавалася з адзінай мэтай — даць адпор акупантам. Так, у в. Віктараўка быў сфарміраваны новы партызанскі атрад пад камандаваннем К.Арлоўскага. 20 кастрычніка 1918 г. адбылася канферэнцыя Бабруйскай міжраённай партыйнай арганізацыі, на якой прысутнічалі прадстаўнікі ад 10 гарадскіх і местачковых

арганізацый і ад 150 вясковых ячэек. У той жа час у Гарбацэвічах быў створаны партызанскі атрад, адноўлена савецкая ўлада, пачаў дзейнічаць рэўком воласці. 23 лістапада ён пачаў працаваць у Туркоўскай воласці. Рэўкомы былі створаны ў 19 валасцях павета.

Дзесяць месяцаў працоўныя Бабруйшчыны вялі ўпартую барацьбу з захопнікамі. Аб размаху і сіле народнага руху гаворыць такі факт. Перад выгнаннем немцаў з Бабруйска падпольны партыйны камітэт прад'явіў нямецкаму камандаванню ультыматум, у якім патрабаваў не рабаваць гарадскую маёмасць, вызваліць усіх палітычных вязняў. І гэтыя патрабаванні былі выкананы.

У лістападзе настаў рашаючы момант барацьбы. Вечарам 26 лістапада падпольны партыйны камітэт сабраўся на чарговае пасяджэнне і зацвердзіў склад рэвалюцыйнага камітэта горада і павета. Раніцай 27 лістапада адбылося другое пасяджэнне, на якім быў зацверджаны загад № 1 аб пераходзе ўсёй паўнаты ўлады ў рукі рэўкома, а таксама распрацаваны парадак сустрэчы Чырвонай Арміі. Былі зацверджаны дырэктывы членам рэўкома і яго камісіі. Гэтыя дакументы былі перададзены рэдакцыйнай калегіі для апублікавання ў газеце і расклейкі на вуліцах. 28 лістапада выйшаў першы нумар газеты «Известия Бобруйского революционного комитета». У той жа дзень з-за Бярэзіны ўступілі часці Чырвонай Арміі. На станцыі Бярэзіна працоўныя з радасцю сустракалі сваіх вызваліцеляў-чырвонаармейцаў і камандзіраў 153-га палка 17-й стралковай дывізіі.

Нарэшце прыйшла доўгачаканая перадышка, і ва ўсіх валасцях павета пачалі працаваць створаныя яшчэ ў час акупацыі рэвалюцыйныя камітэты. Клопатаў у іх было шмат. У Туркоўскай воласці, напрыклад, пад кіраўніцтвам рэўкома былі створаны камітэты беднаты, якія прадстаўлялі савецкую ўладу. Каб папярэдзіць выступленні кулакоў, былі арганізаваны ўзброеныя атрады з мясцовай моладзі. На ўлік узята маёмасць памешчыцкіх маёнткаў і перададзена на захаванне рабочаму камітэту, які складаўся з былых батракоў. Для Чырвонай Арміі і хворых збіралі прадукты харчавання. Рэўком клапаціўся пра беднякоў — забяспечваў іх хлебам, які адбіралі ў кулакоў.

Усе праваахоўныя пытанні таксама вырашаў рэўком. Вось адзін з такіх прыкладаў. Дваццацігадовая дзяўчына прыйшла ў рэўком са скаргай на кулака, які падмануў яе, а потым пакінуў адну з дзіцем на руках. На месца выехалі старшыня з прадстаўніком рэўкома. Атрымаўшы ад мясцовых жыхароў поўнае пацвярджэнне скаргі, яны канфіскавалі ў кулака адну з 16 яго кароў, 10 пудоў жыта і перадалі ўсё маладой жанчыне. Гэта рашэнне было аформлена актам і зацверджана рэўкомам.

22—23 снежня 1918 г. прайшла другая канферэнцыя РКП(б). У гэты ж час у Палацы працы адбыўся сход моладзі горада, на якім была створана арганізацыя РКСМ, за ёй сталі ўзнікаць камсамольскія ячэйкі ва ўсім павеце.

1 студзеня 1919 г. надрукаваны Маніфест урада Беларусі, які абвяшчаў стварэнне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Праз некалькі дзён урад пераехаў са Смаленска ў Мінск, дзе было прынята рашэнне склікаць ў лютым I з'езд Саветаў БССР. Пачалася напружаная падрыхтоўка да гэтай важнай падзеі.

На працягу студзеня была праведзена вялікая работа па арганізацыі выбараў у мясцовыя Саветы. 10 студзеня рэўком Бабруйска стварыў камісію і намеціў тэрмін іх правядзення. 14—15 студзеня прайшлі валасныя сходы, на якіх былі выбраны сельскія выбарчыя камісіі. Адначасова праводзіліся выбары ў мясцовыя Саветы з прадстаўніцтвам аднаго дэлегата на 100 чалавек. У выніку ў кожнай вёсцы быў арганізаваны Савет і выканком з трох чалавек. Праз месяц (16 лютага) адбыўся Бабруйскі павятовы з'езд Саветаў. Яго дэлегаты пасля абмеркавання надзённых пытанняў выбралі выканком Бабруйскага Савета рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў.

Новая ўлада ўзялася за рэарганізацыю сельскай гаспадаркі. На сходзе беднякоў вёсак Панюшкавічы, Сычкава, Ціўнавічы была створана камуна — адна з першых на Бабруйшчыне (гл. асобны артыкул «Панюшкавіцкія камунары»).

Крыху пазней пачалі актыўна ўзнікаць саўгасы, пераважна на базе былых панскіх маёнткаў. Да сярэдзіны лета іх было аж 90. Аб тым, што яны сабой уяўлялі, гаварылася на нарадзе кіраўнікоў саўгасаў, якая праходзіла 3 ліпеня ў Бабруйску. У прыватнасці, адзначалася, што саўгасы мелі 17 461 дзесяціну зямлі і 833 кані (на аднаго каня прыпадала 21 дзесяціна зямлі), 3 трактары, 24 млыны, з іх 13 — паравыя.

Але мірную працу людзей спынілa чарговае нашэсце чужынцаў: да 29 жніўня 1919 г. большая частка Бабруйскага павета зноў бы-

ла акупіравана белапалякамі. Размежавальная лінія праходзіла па Бярэзіне.

На захопленай польскімі войскамі тэрыторыі быў устаноўлены жорсткі тэрор, разагнаны Саветы, адноўлена ўлада памешчыкаў і капіталістаў. У многіх маёнтках увялі прыгон. Палітычнае бяспраўе, беспрацоўе, голад і насілле над мірным насельніцтвам дапаўняліся жорсткім нацыянальным прыгнётам. Тэрыторыя Беларусі была аб'яўлена «ўсходнімі крэсамі»: тут забаранялася беларуская мова, былі зачынены школы і клубы, а іх будынкі пераабсталяваны пад салдацкія казармы і турмы. Акупанты эшалонамі вывозілі ўсё, што можна было вывезці (пераважна збожжа і лес). Крывавы тэрор яны накіравалі найперш супраць актывістаў савецкай улады: іх расстрэльвалі ці кідалі ў турмы.

Змагарам за волю і незалежнасць зноў было наканавана ісці ў падполле і ў партызаны. Маючы сувязі падпольшчыкаў з масамі, іх друкаванае слова знаходзіла гарачы водгук у сэрцах людзей. Абураныя рабаваннем і разбоем белапалякаў, вяскоўцы падтрымлівалі любую спробу бальшавікоў у барацьбе супраць акупантаў. Адна з лістовак прама заклікала да гэтага: «Таварышы сяляне! Аб'яднайцеся вакол улады Саветаў. Праганяйце ў шыю польскую сволач! Праганяйце прэч народных гвалтаўнікоў і катаў! Няхай жывуць нашы сябры на тым беразе Бярэзіны! Няхай жыве савецкая ўлада!»

Актыўная агітацыя прыносіла плён. Неўзабаве на акупіраванай частцы Бабруйшчыны з'явіліся баяздольныя, мабільныя партызанскія атрады. У в. Бортнікі ў хаце камандзіра мясцовых партызан В.Вяроўкіна, які за адзін з жорсткіх баёў супраць польскіх захопнікаў быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, знаходзіўся штаб, якому падначальваўся не толькі тутэйшы атрад мсціўцаў, але і ўсе самастойныя групы з навакольных вёсак Хімы, Дваранінавічы, Полькавічы, Шпілеўшчына.

Непакорлівасць мясцовага насельніцтва, яго адкрытае супраціўленне выклікалі люцасць у палякаў. Яны сталі праводзіць шырокія карныя аперацыі. У час адной з іх цудам уцалелі жыхары в. Кісялевічы: на карнікаў напалі тутэйшыя партызаны і адбілі ні ў чым не вінаватых людзей, якіх ужо рыхтаваліся спаліць. А вось у Казіміраве атрымалася інакш. Там белапалякі знянацку, ноччу, напалі на Бабруйскі павятовы ваенкамат, які на той момант знаходзіўся ў вёсцы. З усяго штата ваенкамата ўцалела толькі 6 чалавек, якія перабраліся на другі бераг Бярэзіны, астатніх расстралялі.

А ва ўсходняй частцы Бабруйскага павета, на левым беразе Бярэзіны падчас белапольс-

Камандуючы фронтам М.М.Тухачэўскі з групай дэлегатаў дывізіённай партканферэнцыі 8-й Мінскай стралковай дывізіі. Бабруйск, 1923 г.

кай акупацыі быў створаны рэўком, сумесна з якім 27 лістапада пачаў дзейнічаць штаб партызанскага руху (начальнік С.Л.Вілюга), быў скамплектаваны асобы партызанскі батальён з 600 чалавек. Апрача таго, у прыфрантавой паласе дзейнічалі яшчэ 10 дробных партызанскіх атрадаў. Спачатку ў батальёне было тры роты, а ў снежні 1920 г. ў яго ўліўся адазваны з Рудабелкі на лінію фронту партызанскі атрад з 150 чалавек. У Рудабельскім атрадзе дзейнічалі такія славутыя важакі, як А.Салавей («беларускі Чапаеў»), М.Ляўкоў, М.Ус.

Сяляне масава ішлі ў партызаны. Вёскі дапамагалі атрадам, найперш прадуктамі харчавання. Асабліва значную дапамогу 72-му стралковаму палку Чырвонай Арміі і партызанам аказвалі жыхары вёсак Цялуша, Савічы, Вавулічы, Плёсы. Партызаны праводзілі дзёрзкія рэйды па тылах акупантаў, нападалі на гарнізоны, у тым ліку і на даволі буйныя. Так народныя мсціўцы захапілі Парычы, Ратміравічы, Мошны, Стасеўку.

10 ліпеня 1920 г. Чырвоная Армія з баямі ўступіла ў Бабруйск. Уцякаючы з бабруйскай зямлі, белапалякі бязлітасна знішчалі ўсё на сваім шляху. Вось што гаварылася на сходзе пагаралыцаў в. Осава: «10 ліпеня 1920 г. польскія паны пры адступленні спалілі нашу вёску, якая складалася з 70 двароў. З будынін і ўвогуле нерухомай маёмасці нічога не засталося. Забрана многа жывёлы і 14 коней. Забіта 19 грамадзян, мужчын і жанчын, засталося многа сірот і ўдоў». Усяго белапалякамі, паводле звестак камісіі па расследаванні іх злачынстваў, у Бабруйскім павеце нанесена страт больш чым на мільён рублёў (у залатой даваеннай валюце).

Зноў жыхарам Бабруйшчыны трэба было аднаўляць разбуранае, спаленае, залечваць раны, прычыненыя вайной. З першых дзён пасля вызвалення ва ўсіх валасцях пачалі стварацца валасныя камітэты працы, уведзена абавязковая працоўная павіннасць. Другі павятовы з'езд, які адбыўся 9 снежня 1920 г., намеціў арыенціры ў аднаўленні сельскай гаспадаркі: «...Толькі паскораны пераход ад дробнага неэфектыўнага землекарыстання да больш буйнога культурнага землекарыстання шляхам аб'яднання дасць магчымасць палепшыць прымяненне машыннага спосабу апрацоўкі зямлі і поўнага выкарыстання вытворчасці пасяўной плошчы і паляпшэння сельскай гаспадаркі». Ужо ў 1921 г. ў павеце ўзніклі новыя саўгасы. Але эканамічнае становішча вёскі заставалася цяжкім. Падчас заканчэння грамадзянскай вайны плошча пасеваў зменшылася на 30% у параўнанні з 1916 г., а збор збожжа — напалавіну.

Каб аблегчыць працу, сяляне аб'ядноўваліся ў добраахвотныя сельскагаспадарчыя таварыствы па сумеснай апрацоўцы зямлі. У канцы 1924 г. іх у павеце налічвалася каля сямі дзесяткаў. Існавалі і многія іншыя формы кааперацыі. Дзейнічалі даволі моцныя камуны ў Панюшкавічах, Дурынічах, Цялушы, Дойнічаве. А ў пачатку 1925 г. 10 сялянскіх гаспадарак в. Варатынь аб'ядналіся ў калгас,

Дэлегаты 1-га з'езда Саветаў 2-га Бабруйскага райвыканкома. 1924 г.

які апрацоўваў 120 дзесяцін зямлі; вядучай галіной гаспадаркі была свінагадоўля. Па развіцці гэтай галіны Бабруйскі раён займаў адно з першых месц у рэспубліцы: тут ужо ў 1925 г. быў дасягнуты ўзровень 1913 г., калі на кожны сялянскі двор у сярэднім прыпадала па 3 свінні.

Усяго на 1 кастрычніка 1928 г. ў раёне было 13 калгасаў, якія аб'ядноўвалі 114 сем'яў, 1609 га зямлі. У ліку гэтых калгасаў былі: «1 Мая» (в. Коўрын), «Пралетарый» (в. Шараёўшчына), «Зара рэвалюцыі» (в. Кавалі), «Чырвоная Варатынь № 1» і «Чырвоная Варатынь № 2» (в. Варатынь), «Муравей» (в. Гарбацэвічы) і інш.

Дзяржава давала беднякам ільготныя крэдыты, дапамагала набываць жывёлу, насенне, сельгасінвентар. Толькі ў 1926 г. сялянскія камітэты выдалі бядняцкім сем'ям 12 364 пуды насення з фондаў дзяржавы і мясцовай кааперацыі. Для крэдытавання найбольш бедных гаспадарак быў створаны спецыяльны фонд у 11 тыс. рублёў. Такія гаспадаркі вызваляліся ад падаткаў. Затое сераднякі і кулакі плацілі іх ўдвая і ўтрая большыя.

У другой палове 1929 г. пачалася масавая калектывізацыя. Вёска бурліла. То быў самы круты пералом у гісторыі сацыялістычнай перабудовы жыцця. У тым імклівым водавароце было ўсё: і добрая воля сялян на калектыўную працу, і пагрозы, прымус з боку цэнтральных і мясцовых улад. Беднякі, вядома, ішлі ў калгас самі, спадзеючыся на лепшае. Многіх сераднякоў запалохвалі, а багатых абкладвалі непамерным падаткам, абдзіралі як ліпку, а то і пагражалі зброяй. Адсюль і бандыцкія выступленні ў абарону свайго набытку, свайго гонару.

Сёння мы ведаем, што на Салаўкі і ў Сібір сапраўды саслалі лепшых гаспадароў. Як ведаем і тое, што быў зроблены паўны аналіз дапушчаных перагібаў, некаторы перагляд метадаў калектывізацыі. У сакавіку 1930 г. быў зацверджаны выпраўлены Прыкладны Статут сельгасарцелі. Адначасова ў газетах змешчаны артыкул І.В.Сталіна «Галавакружэнне ад поспехаў». Праўда, у гэтым артыкуле, з аднаго боку, адзначаліся перагібы ў калектывізацыі і шляхі іх выпраўлення, а з другога, пралікі поўнасцю перакладаліся на мясцовыя ўлады.

Але стратэгія перабудовы сялянскага жыцця заставалася нязменнай. У вёсках працягвалася фарміраванне калектыўных гаспадарак, далучэнне да калектыўнай працы. Праблем хапала. Яны часам узнікалі нават



Механізаваная пасадка бульбы пад Бабруйскам. 1928 г.

з-за назвы калгаса. Так, паводле ўспамінаў старажылаў, першымі аб'ядналіся ў калгас вяскоўцы Вялікіх Бортнікаў, а неўзабаве і іх суседзі з Малых Бортнікаў. І тыя, і другія хацелі назваць калгас «Чырвоны партызан». Справа ў тым, што ў час грамадзянскай вайны, калі Бабруйшчыну акупіравалі белапалякі, жыхары абедзвюх вёсак узнялі паўстанне супраць захопнікаў, арганізавалі партызанскую барацьбу. Першымі выступілі велікабортнікаўцы, але ў малабортнікаўцаў быў свой аргумент: Даніла Бурак, былы матрос, кіраўнік паўстання, — з іх вёскі. Пасля спрэчак вырашылі: калгас у Вялікіх Бортніках назваць «Чырвоны партызан № 1», а ў Малых — «Чырвоны партызан № 2». Старшынёй першага калгаса выбралі прысланага сюды партыяй прадстаўніка рабочага класа Сямашку, а старшынёй другога — земляка Мікалая Хурсана. У 1930 г. сюды прыслалі трактар, а затым і першую аўтамашыну-паўтаратонку. Героямі тых дзён у вёсцы былі мясцовыя хлопцы — трактарыст Іосіф Дайнека і шафёр Аляксей Канавальчык.

Ужо ў канцы 1931 г. калектывізацыя была амаль што завершана. На той час у раёне налічвалася 136 калгасаў і 3 саўгасы, сіламі якіх апрацоўвалася больш за 34 тыс. га зямлі. У гаспадарках дзейнічалі 32 жывёлагадоўчыя фермы, дзе ўтрымлівалася 2065 кароў.

Дзяржава аказвала калгасам і саўгасам дапамогу кіруючымі кадрамі, спецыялістамі, насеннем, племянной жывёлай і самае галоўнае — тэхнікай. Трактар і аўтамашына на той час былі не толькі вялікай тэхнічнай сілай, а і наглядным дэманстрацыяй магутнасці нашай дзяржавы, яе клопату пра механізацыю сельскай гаспадаркі. Спачатку трактары

размяркоўвалі па калгасах, але ж там не было ні запчастак, ні спецыялістаў па тэхнічным абслугоўванні. Тады ў сакавіку 1932 г. арганізавалі Цялушскую МТС. Тут было 50 трактароў, пераважна «фардзонаў», некалькі ХТЗ, а пазней прыбылі два больш магутныя трактары С-80. Меліся паўскладаныя і складаныя малатарні, плугі, сеялкі, жняяркі, снопавязалкі. Але зона абслугоўвання была вельмі вялікая, і тэхнікі, вядома, не хапала. Таму ў 1934 г. арганізавалі Гарбацевіцкую і Міхалёўскую МТС.

Поспехі калгасаў і саўгасаў былі відавочныя ва ўсіх галінах. У канцы 1930-х гадоў вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі ў параўнанні з 1929 г. павялічылася ўтрая. Бабруйскі раён па гэтым паказчыку выйшаў у лік самых моцных раёнаў Беларусі. Раённыя хлебаробы і жывёлаводы атрымалі ўсесаюзнае прызнанне. Садавод-агароднік калгаса «Чырвоны партызан № 1» І.Г.Голуб быў удзельнікам першай даваеннай Усесаюзнай сельскагаспадарчай выставы, дзе атрымаў Ганаровую грамату і грашовую прэмію. У 1939 г. дыплома 1-й ступені УСГВ, прэміі 10 тысяч рублёў і легкавой машыны быў удастоены калгас імя Куйбышава. У 1937—1938 гадах ён атрымаў па 160 ц бульбы, 269 ц сталовай морквы, 363,3 ц кармавых караняплодаў з гектара і па 1925 літраў малака ад каровы.

Былі ўзнагароджаны і асобныя калгаснікі. Вялікі залаты медаль атрымала Я.Г.Чарнецкая, даярка калгаса імя Куйбышава; вялікі сярэбраны медаль — Я.В.Бялуга, аўчар з калгаса імя Стасавай; малымі сярэбранымі медалямі ўзнагародзілі Г.В.Борбута, брыгадзіра калгаса імя Калініна, А.У.Гаеўскага, землеўпарадчыка Бабруйскага земаддзела, П.А.Галеева, даяра калгаса імя Леніна, Л.В.Герыловіч, цялятніцу з таго ж калгаса, М.Б.Гершэнгорна, бухгалтара калгаса імя Куйбышава, А.С.Мароз, свінарку калгаса імя Калініна, У.Я.Петрусенку, загадчыка малочнатаварнай фермы калгаса імя Куйбышава, А.М.Юрганава, загадчыка Бабруйскага насенневыпрабавальнага ўчастка.

У 1940 г. ва Усесаюзнай сельскагаспадарчай выставе ўдзельнічалі калгасы імя Будзённага, імя Варашылава, «Зара рэвалюцыі», імя Калініна, «Чырвоны лётчык», «Чырвоны партызан», імя Сталіна, імя Чапаева, «Шлях да сацыялізму», пасека калгаса «Пралетарый № 1», малочнатаварныя фермы калгасаў імя Куйбышава, «Шлях да сацыялізму», «XVIII партз'езд», свінагадоўчая ферма калгаса імя Калініна, авечкагадоўчыя

Калгаснікі яўрэйскага калгаса «Эрстэ май» перад выездам на палявыя работы. 1932 г.

фермы калгасаў імя Будзённага, «Палітаддзелец», «Чырвоны барацьбіт».

У 1940 г. ў раёне налічвалася 135 калгасаў і 4 саўгасы, у якіх было 937 галоў буйной рагатай жывёлы (у т.л. 3624 каровы), 3038 свіней, 6969 коней, 34,3 тыс. га пасяўных плошчаў. Працавала 100 трактароў, камбайнаў. Шчодрай аддачай вызначаліся і калгасныя палеткі, і грамадскія фермы.

Самае вялікае з прамысловых прадпрыемстваў раёна (шклозавод «Камінтэрн» у Глушы) аднавіла работу адразу ж пасля выгнання белапалякаў. Тут працавала больш за 200 рабочых. Ужо ў першай палове снежня 1920 г. было выпушчана 5,7 тыс. лістоў шкла, больш за 44 тыс. адзінак аптэкарскага посуду, 3,6 тыс. леек, больш за 4 тыс. прадметаў гаспадарчага і медыцынскага ўжытку. У 1925 г. па выпуску асноўнай прадукцыі завод дасягнуў узроўню 1913 г. і ўпэўнена нарошчваў тэмпы вытворчасці.

З іншых прамысловых прадпрыемстваў на тэрыторыі раёна працавалі торфазавод «Бальшавік» (в. Кісялевічы, пабудаваны ў 1928—1929), бульбаперапрацоўчыя заводы-бровары ў вёсках Дойнічава і Дурынічы. Дзейнічалі мукамольны завод, 11 млыноў з механічнымі рухавікамі, адзін з нафтавым, адзін з вадзяным, 88 ветраных млыноў, на якіх было занята каля 300 рабочых. Дэкрэтам урада ад 7 красавіка 1921 г. паўсюдна ў сельскай мясцовасці ствараліся таварыствы спажывецкай кааперацыі. 15 ліпеня 1924 г. быў створаны райсаюз у Бабруйску. Да кастрычніка 1924 г. ў Бабруйскім павеце дзейнічалі 24 спажывецкія таварыствы, пайшчыкамі якіх з'яўляліся 12 583 чалавекі.

Асновай транспартнай сеткі была Лібава-Роменская чыгунка. З заканчэннем будаўніцтва чыгункі Бабруйск—Старушкі ў 1931 г. значна палепшыліся эканамічныя сувязі цэнтральных раёнаў Беларусі з Палессем. Ад горада Бабруйска ў розныя бакі адыходзілі шэсць шашэйных дарог. Не страціла свайго транспартнага значэння і Бабруйская прыстань на р. Бярэзіне. Усе грузы, у тым ліку і для спажывецкай кааперацыі, дастаўляліся пераважна па чыгунцы. Большасць іх з вагонаў і ў вагоны перавальваліся на Бабруйскай прыстані, якая па аб'ёму грузааабароту і перавозак займала другое месца ў рэспубліцы (пасля Гомельскай).

Ва ўмовах разрухі і нястачы людзі шмат хварэлі на дызентэрыю, брушны і сыпны тыф, малярыю, адзёр, дыфтэрыю, карасту. На тысячу насельніцтва ў павеце паміраў 291 чалавек. Асабліва вялікая смяротнасць была сярод дзяцей (кожнае трэцяе дзіця не дажывала і да года), а таксама сярод жанчын-парадзіх з-за адсутнасці акушэрскай дапамогі. Таму адразу ж пасля вызвалення Бабруйшчыны ад белапалякаў органы савецкай улады звярнулі ўвагу на медыцынскае абслугоўванне насельніцтва. Аддзелам сацыяльнага забеспячэння былі ўзяты на ўлік усе сем'і чырвонаармейцаў, ім аказвалася грашовая дапамога.

Паводле пастановы аддзела аховы здароўя ад 15 верасня 1920 г. пачалася нацыяналізацыя ўсіх аптэк горада і павета. У 1920 г. ў Глушы адкрыўся фельчарскі пункт, праз 4 гады рэарганізаваны ва ўрачэбную амбулаторыю. Сельскай бальніцай у 1924 г. стала і Туркоўская ўрачэбная амбулаторыя. У 1923 г. ў Цялушы адкрыты фельчарскі пункт, які праз 3 гады стаў бальніцай на 15 ложкаў, а ў 1926 г. пры ёй адкрыта радзільнае аддзяленне. Бальніца на 15 ложкаў была адкрыта ў пасёлку Глуша. У 1933 г. ў в. Цялушы з'явілася першая ў раёне аптэка, а ў 1938 г. аптэка пачала дзейнічаць і ў в. Брожа. Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны ў раёне працавалі дзве бальніцы з амбулаторыямі, 4 урачэбна-амбулаторныя ўчасткі, 10 фельчарска-акушэрскіх пунктаў, было 11 урачоў, 20 фельчараў, 16 акушэрак і столькі ж медсясцёр.

Шмат увагі ўдзялялася барацьбе з непісьменнасцю. У лістападзе 1920 г. ў друку паведамлялася, што толькі ў г. Бабруйску адкрыта 12 школ 1-й і 2-й ступені, 6 школ пісьменнасці, народны і дзіцячы дамы, цэнтральная бібліятэка, народны універсітэт. Акрамя таго, у павеце адкрыта 50 школ, 25 хатаў-чытальняў, 11 раённых бібліятэк.

Асаблівая ўвага звярталася на ліквідацыю непісьменнасці сярод дарослых. Паводле загаду Бабруйскага павятовага выканкома ўсё непісьменнае і малапісьменнае насельніцтва ва ўзросце 14—50 гадоў аб'яўлялася мабілізаваным для навучання ў школах граматы. Вялікую работу праводзіла таварыства «Далоў непісьменнасць!». У канцы 1928 г. яно арганізавала месячнік «За пісьменнасць», у час якога праведзена звыш 1 тысячы сходаў, пераважна ў вёсках, створана шмат новых ячэек таварыства і школ для малапісьменных.

Павялічвалася колькасць агульнаадукацыйных школ, асабліва пачатковых і сямігадовых. У 1930 г. было 5 школ-сямігодак, 112 пачатковых. У 1932 г. ў вясковых школах працавала каля 300 настаўнікаў. Усё гэта давала добры плён. У 1926 г. узровень пісьмен-

насці насельніцтва дасягнуў 56,6% супраць 26,3% у 1897 г., а ў 1939 г. гэты паказчык узрос да 89,1%. У 1940 г. ў раёне (акрамя Бабруйска) было 86 школ, у тым ліку 9 сярэдніх, 20 сямігадовых, 57 пачатковых, у іх працавала 527 настаўнікаў, займалася 13248 вучняў.

Пад неаслабным кантролем партыйных арганізацый было развіццё культуры. Ужо ў пачатку 1920-х гадоў у раёне працавалі 9 хат-чытальняў, 42 бібліятэкі-перасоўкі.

Асабліва паспяхова вялася культурна-асветная работа ў Гарбацэвіцкай воласці. У 1920 г. тут праведзена 20 мітынгаў і 25 субяседаванняў па розных палітычных пытаннях, адкрыта некалькі хат-чытальняў. Камсамольцы воласці стварылі сваю песню, у 1920 г. арганізавалі першы ў раёне калектыў мастацкай самадзейнасці, лекторый, лікбез, пачалі выпускаць насценную газету, адкрылі ў школе народны клуб, арганізавалі першы ў раёне піянерскі атрад.

Па прыкладу энтузіястаў з Гарбацэвічаў ва ўсіх валасцях павета пашыралася сетка устаноў культуры. Ужо ў 1922 г. працавала каля 100 хат-чытальняў, 15 бібліятэк, 3 самадзейныя тэатры.

Атэістычную прапаганду актыўна вялі шматлікія філіі «Саюза ваяўнічых бязбожнікаў». Для гэтай мэты прыстасавалі нават самалёт, які атэісты раёна набылі на сабраныя сродкі і далі яму назву «Бязбожнік».

Пазней умацаванне эканомікі дало магчымасць ад хат-чытальняў, чырвоных куткоў і бібліятэчак-перасовак пераходзіць да больш грунтоўных устаноў культуры — клубаў, стацыянарных бібліятэк. Усё шырэй выкарыстоўваліся перасоўныя кінаўстаноўкі і радыёпрыёмныя сродкі. У 1940 г. ў сельскай мясцовасці раёна было 36 клубаў і хат-чытальняў, 5 кінаўстановак, 13 бібліятэк, кніжны фонд якіх складаў 116,4 тыс. экземпляраў. Дзейнічала 747 радыётрансляцыйных кропак.

Пераўтварэнні ў эканоміцы і культуры

Ячэйка КСМБ пры райсаўпартшколе. 1923 г.

абумоўлівалі змены і ў сацыяльнай структуры насельніцтва раёна. Яшчэ не так даўно гэта была суцэльная сялянская маса, пераважна непісьменная. За якіх два дзесяцігоддзі савецкай улады тут з'явілася значная праслойка сельскай інтэлігенцыі (настаўнікі, медработнікі, спецыялісты сельскай гаспадаркі), сельскі атрад рабочага класа (рабочыя прамысловых прадпрыемстваў, МТС, арганізацый будаўніцтва, транспарту, сувязі, саўгасаў). Праца сялян, хоць яшчэ і заставалася пераважна ручной, пад уздзеяннем тэхнікі набывала акрэсленыя рысы індустрыяльнай.

Завадатарамі ў наладжванні новага жыцця на вёсцы былі камуністы і камсамольцы. Партыйныя ячэйкі пастаянна дбалі пра ўмацаванне сувязі з масамі, настойліва змагаліся за павышэнне аўтарытэту кожнага камуніста. Гэтаму спрыяла генеральная чыстка партыі, праведзеная ў другой палове 1921 г., за час якой з радоў Бабруйскай павятова-гарадской арганізацыі было выключана 240 чалавек, ці амаль 20% усяго саставу. Свежы струмень у партыйную работу ўнеслі камуністы-«дваццацітысячнікі», накіраваныя з горада ў вёску, каб дапамагчы ў ажыццяўленні калектывізацыі. У 1929 г. ў раёне было 317 членаў і кандыдатаў у члены партыі, 17 партячэек; 35 камсамольскіх ячэек аб'ядноўвалі 936 членаў камсамола. У 1939 г. выбраны Бабруйскі раённы камітэт партыі — асобна ад г. Бабруйска. Гэта значыць, што пачала дзейнічаць Бабруйская раённая партыйная арганізацыя.

Бадай, самай адметнай рысай тагачаснага жыцця была вера большасці насельніцтва ў «светлае будучае», гэта вера нараджала масавы энтузіязм. Кіпела сацыялістычнае спаборніцтва. Бясконцым патокам ішлі рапарты працоўных перамог. Грымелі аркестры на камуністычных суботніках, ушанаваннях наватараў і перадавікоў працы, на ўрачыстых святочных шэсцях.

«Высокапатрыятычнай» справай была тады і барацьба з «ворагамі народа». Пад знакам класавай пільнасці яна набыла масавы характар. Здраднікаў, шпіёнаў, шкоднікаў і іншых «варожых элементаў» шукалі, дзе толькі маглі. Часам аднаго лжывага даносу было дастаткова, каб сумна вядомая «тройка» магла асудзіць чалавека на смерць альбо на пакуты ў спецыяльных лагерах. Далей мы змяшчаем спіс «Вернутыя імёны». Гэта імёны тых, хто быў беспадстаўна ашальмаваны, рэпрэсіраваны і пазбаўлены жыцця. Ні адно з іх не павінна застацца ў забыцці.

Вось так у кіпучых працоўных буднях, часам з памылкамі і перагібамі, але з відавочнымі поспехамі на ўсіх накірунках ажыццяўляўся вялікі пералом у сацыяльна-эканамічным жыцці грамадства, які ўвайшоў у гісторыю як перыяд усталявання савецкай улады і сацыялістычнага будаўніцтва.

А.Нянадавец.

Незабыўны 1917

Вестку аб перамозе Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Петраградзе бабруйскія бальшавікі атрымалі 26 кастрычніка. Адразу ж на гарадской плошчы, у раёне казармаў, адбыўся шматлюдны мітынг. Бальшавікі правялі яго пад лозунгамі: «Уся ўлада — Саветам!», «Мір хацінам — вайна палацам!» Удзельнікі мітынгу віталі петраградскіх рабочых і сялян, якія зверглі Часовы ўрад. Рэвалюцыйны Бабруйск выказаў сваю рашучасць усімі сіламі падтрымліваць савецкі ўрад на чале з У.І.Леніным.

Рэвалюцыйныя падзеі набывалі шырокі размах у горадзе і павеце. Бабруйскія бальшавікі, партыйны камітэт РСДРП чакалі гэтага моманту і рыхтаваліся да рашучай бітвы. Было прынята рашэнне аб стварэнні баявых дружын па ахове рэвалюцыі. Неўзабаве яны з'явіліся ў горадзе і павеце. Першы арганізаваў такую дружыну Ф.І.Грамыка.

Крыху пазней, выконваючы рашэнне 2-й Паўночна-Заходняй канферэнцыі бальшавікоў (яна праходзіла ў Мінску) па падрыхтоўцы да ўзброенага паўстання, партыйны камітэт РСДРП стварыў чырвонагвардзейскую камендатуру. Потым арганізавалі ўдарны атрад. Ім камандаваў Любашэўскі. У кастрычніку атрад налічваў у сваіх радах 200 чалавек. Зброю бабруйчанам дапамаглі набыць мінскія бальшавікі.

Як толькі была атрымана радыёграма, што ў Петраградзе адбылася рэвалюцыя, байцы Чырвонай гвардыі захапілі ў горадзе тэлеграф, тэлефонную станцыю, электрастанцыю, іншыя важнейшыя аб'екты і ўстанавілі сваю ахову.

У той час у бабруйскім ваенным гарнізоне налічвалася 8 тысяч салдат. Вялікая сіла! Разумеючы гэта, бальшавікі разгарнулі дзейсную арганізацыйна-прапагандысцкую работу сярод салдат па стварэнні рэвалюцыйнай арміі. Неўзабаве на бок бальшавікоў перайшла

большасць часцей гарнізона. Рэвалюцыйна настроеныя салдаты ўзялі пад свой кантроль Бабруйскую крэпасць, склады з узбраеннем і боепрыпасамі, наладзілі ахову ўстаноў, патруляванне.

У тыя трывожныя дні 1917 г. Бабруйск наведаў А.Ф.Мяснікоў. Тэрмінова быў скліканы мітынг, на якім ён выступіў з прамовай, даў рашучы адпор меншавікам і эсэрам, расказаў аб рэвалюцыйных падзеях у Мінску і даў канкрэтныя парады бальшавікам Бабруйска.

Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў стаў баявым штабам партыйнай арганізацыі, адыграў вялікую ролю ў згуртаванасці і палітычным выхаванні народных мас. Тут выдаваліся загады, рашэнні і пастановы, першыя дэкрэты аб зямлі, чыталіся лекцыі, даклады, праводзіліся палітычныя мерапрыемствы.

Бальшавікі, рабочыя, сяляне разгарнулі шырокую барацьбу са спекуляцыяй і разрухай. Паўсюдна ўзнікалі маладзёжныя саюзы і гурткі. Вялікія рэвалюцыйныя пераўтварэнні адбываліся і ў вёсках павета. Тут арганізоўваліся першыя органы савецкай улады, канфіскоўваліся памешчыцкія землі. Бабруйчане пачалі рэгулярна атрымліваць газеты «Правда», «Известия», «Звязда». На іх старонках расказвалася пра першыя дэкрэты савецкай улады, рэвалюцыйныя пераўтварэнні ў Беларусі.

Настаў час, калі на Бабруйшчыне ўсталяваўся рэвалюцыйны парадак. Уся ўлада перайшла ў рукі бальшавікоў, людзі пачалі рыхтавацца да першых выбараў у гарадскі і павятовы Саветы рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў. І хаця не было ў іх вопыту гаспадарчага будаўніцтва, навыкаў арганізатарскай работы, яны дзейнічалі актыўна, з вялікім уздымам вырашалі надзённыя задачы, ператваралі ў практычныя справы ленінскія дэкрэты.

С.Коласаў.

І разгарэлася полымя

З успамінаў М.Балдзенкі, удзельніка Кастрычніцкай рэвалюцыі

Першая сусветная вайна губіла на сваіх франтах тысячы жыццяў. Надышоў час і мне ісці на фронт. Мой год, 1898-ы, аказаўся апошнім годам набору ў царскую армію. З 4 лютага 1917 г. я служыў у Віцебску і лічыўся байцом запаснога артылерыйскага дывізіёна. Што гэта была за служба? Нас з дня ў дзень ганялі па пляцы, патрабавалася ведаць назубок усіх членаў сям'і яго імператарскай вялікасці...

Але нядоўга ўсё гэта працягвалася. Лютаўская рэвалюцыя, здавалася, назаўсёды вызваліла гаротнага чалавека ад усіх ягоных пакут. Аб гэтым можна было меркаваць хоць бы па тых парадках, якія ўсталёўваліся ў арміі. Не стала «вашага высакароддзя», «шаноўнага пана...» Часам салдаты зрывалі з афіцэраў пагоны, не аддавалі ім чэсць... Увогуле адчувалі сябе адносна вольнымі. А адной чы да нас у казармы завітаў камандзір дывізіёна, якога мы і ў вочы дагэтуль не бачылі. Ён аказаўся немцам. Вось дык дзіва! І не столькі слухалі, што ён плёў, колькі разважалі над тым, што будзе далей? Цара няма, улада перайшла да Часовага ўрада. Як ён будзе паводзіць сябе? Ці дасць зямлю сялянам? Ці скончыць вайну з Германіяй? Словам, пытанняў было процьма, і ніхто з нашых камандзіраў не мог нам адказаць на іх дакладна.

І вось неяк пад вечар на пляцы пачалі збірацца салдаты. Падышоў да натоўпу і я. Што здарылася, пытаюся. Бальшавікі выступаць будуць, адказаў нехта. Каб паслухаць, аб чым пойдзе гамонка, стаў прабівацца праз натоўп. Высокі чалавек ужо нешта крычаў з тумбы:

— На вайне нажываюцца памешчыкі ды заводчыкі. Ім усё грошай мала. А нам за што ваяваць? Не, шаноўныя панове, — махнуў некуды ўбок бальшавік, — на нас не разлічвайце. Хопіць, наваяваліся. Цара скінулі і будзем цяпер заводзіць новыя парадкі без прыгнятальнікаў...

— Праўду кажаш, браток, праўду... Далоў вайну! — неслася з усіх бакоў.

Мы тады не спалі ўсю ноч. Мітынгавалі. Радаваліся, што хутка вернемся дадому. Але не так усё проста, як здавалася... У канцы сакавіка нас адправілі на фронт у распараджэнне дзесятай арміі, штаб якой размяшчаўся ў Мінску. У час адпраўкі мы гаварылі, што не ўмеем страляць з гармат і што ісці на немца ніяк нельга. Але нас ніхто і слухаць не хацеў. Маўляў, вайна ўсяму навучыць... І вайна вучыла. І, вядома, не толькі страляць па праціўніку, але і разбірацца ў тых падзеях, што разгортваліся ў 17-м годзе ажно да Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, вестка аб якой прыйшла да нас на фронт.

Што рабілася ў тыя дні! Кудысьці знікалі нашы нядаўнія камандзіры. Пакідалі акопы салдаты і разыходзіліся па дамах. А літаральна

на па пятах ішлі немцы. Яны займалі нашы вёскі, рабавалі насельніцтва...

Мы пачулі, што за Дняпром фарміраваліся чырвонагвардзейскія атрады бальшавікоў, і рушылі туды. Лаўрэнцій Дзергачоў, Ніканор Асіпёнак, Павел Малашонак, Апанас Півуноў і я пайшлі да ракі. Праз некаторы час апынуліся ў раёне вёскі Прыбор. Нас залічылі ў атрад Чырвонай гвардыі. Потым я трапіў у асобы батальён пры ВЧК. Пачалася служба больш строгая і напружаная. Давялося змагацца супраць контрэвалюцыянераў, спекулянтаў, бандытаў.

Неўзабаве я пабываў дома, а потым з Бабруйска быў накіраваны ў Мінскае губчэка, дзе фарміраваліся часці для Петраграда, таму што «зашавялілася» контрэвалюцыя і патрэбны былі спецыяльныя сілы, каб задушыць яе ў самым зародку.

У мірны час удзельнічаў у калектывізацыі, загадваў сельскім клубам, працаваў фінансавым агентам, доўгі час быў дэпутатам Хімоўскага сельсавета. У гады ваеннага ліхалецця чым мог дапамагаў партызанам. А потым працаваў старшынёй калгаса...

Мабілізаваныя рэвалюцыяй

РАВІНСКІ ПЛАТОН ФЁДАРАВІЧ

Партыйны і дзяржаўны дзеяч БССР, удзельнік барацьбы за савецкую ўладу на Беларусі. Нарадзіўся 23.11.1892 г. ў в. Краглі былога Навагрудскага павета. З сялян. Чл. КПСС з 1917 г. Скончыў Камуністычны універсітэт імя Свярдлова ў Маскве (1930). З 1909 г. ў ЗША. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. ў Расіі. З красавіка 1918 г. на падпольнай рабоце ў Бабруйску — старшыня камітэта РКП(б), член краявога камітэта камуністычных арганізацый Беларусі і Літвы. З лістапада 1918 г. старшыня Бабруйскага павятовага рэўкома, потым выканкома, член павятовага камітэта партыі. З ліпеня 1919 г. член Мінскага губернскага ВРК, з жніўня 1919 г. ў РВС 16-й арміі, з чэрвеня 1920 г. старшыня Барысаўскага павятовага рэўкома, Бабруйскага павятовага камітэта партыі. У 1921—1925 гг. начальнік упраўлення і член калегіі Наркамзема БССР, у 1930—1933 гг. загадчык аргаддзела ЦКК-НК РСІ БССР. З 1933 г. сакратар Магілёўскага РК КП(б)Б, з 1936 г. ў Наркамаце лясной прамысловасці БССР. Памёр 19.11.1940 г.

П.Ф.Равінскі.

П.М.Серабракоў.

СЕРАБРАКОЎ ПЁТР МІХАЙЛАВІЧ

Удзельнік барацьбы за савецкую ўладу на Беларусі. Нарадзіўся 24.6.1894 г. ў г. Кіршач, Расія. З рабочых. Член КПСС з 1917 г. Скончыў Маскоўскае вышэйшае тэхнічнае вучылішча (1923). З 1915 г. ў арміі. Удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Бабруйску (член прэзідыума Савета), баёў з легіянерамі Доўбар-Мусніцкага. У нямецкую акупацыю 1918 г. член падпольнага краявога камітэта камуністычнай арганізацыі Беларусі і Літвы і намеснік старшыні Бабруйскага камітэта РКП(б). З канца 1918 г. старшыня Надзвычайнай камісіі ў Бабруйску. З лютага 1919 г. старшыня Мазырскага павятовага камітэта партыі, Надзвычайнай камісіі, інструктар Гомельскага губкома РКП(б). З ліпеня 1920 г. старшыня Бабруйскага павятовага рэўкома, потым выканкома. З 1921 г. ў РСФСР і Узбекістане, з 1933 г. на адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце. Пасля Вялікай Айчыннай вайны жыў у Маскве. Аўтар успамінаў «Барацьба за ўладу Саветаў у Бабруйску» (у кн. «У барацьбе за Кастрычнік у Беларусі і на Заходнім фронце», 1957 г.).

СІМОНЧЫК ФЁДАР ВАСІЛЕВІЧ

Прафесійны рэвалюцыянер, удзельнік трох рэвалюцый. Нарадзіўся 27.2.1885 г. ў в. Плесавіцкая Слабодка былога Бабруйскага павета. З сялян. Член КПСС з 1904 г. Адзін з заснавальнікаў Бабруйскай арганізацыі



Ф.В.Сімончык.

РСДРП (1904 г.). Вёў палітычную агітацыю сярод рабочых, рамеснікаў і салдат. Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў рэвалюцыйных выступленняў пралетарыяту Бабруйска, забастовак батракоў у навакольных маёнтках у 1905 г. У лютым 1906 г. разам з іншымі арганізаваў уцёкі 10 удзельнікаў паўстання Бабруйскага батальёна, асуджаны на пакаранне смерцю. З вясны 1906 г. ў Мінску, член камітэтаў Мінскай арганізацыі РСДРП, Мінскай акруговай сялянскай арганізацыі пры РСДРП, арганізатар масавых выступленняў сялян Навагрудскага і Слуцкага паветаў. З 1909 г. ў арміі, удзельнік 1-й сусветнай вайны. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. член салдацкага камітэта палка, дывізіі 6-й арміі. У 1902—1904, 1906, 1907—1909, 1917 гг. у турмах і ссылках. Удзельнік усталявання савецкай улады на Бабруйшчыне. У 1919—1920 гг. у Смаленскім губернскім земаддзеле, пасля старшыня Парыцкага валвыканкома, загадчык аддзела ў Бабруйскім акруговым выканкоме і інш. Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, медалямі. Памёр 9.4.1966 г.

Цені мінуўшчыны

Вялікія і Малыя Бортнікі — дзве вёскі, на вярсту адлеглыя адна ад адной, былі раскінуты на шашы, што ідзе з Бабруйска на Рагачоў. Поплеч з імі, амаль што на роўнай адлегласці ад адной і другой, стаяў маёнтак памешчыцы Кутаевай. У Вялікіх Бортніках жыў польскі камендант. Яны ў той час былі пры кожнай воласці. А ў маёнтку жыў другі камендант, іншага парадку, які спецыяльна займаўся рэквізіцыямі, зганяў коней, кароў, свіней і г.д.

Пад уплывам цяжкіх пабораў, пад уплывам пастаянных здзекаў у Бортніках няспынна расло абурэнне, якое да вясны 1918 года гатова было прыняць арганізаваныя формы. Моладзь усё больш і часцей думала аб арганізацыі партызанскага атрада, ужо спрабавала нават цішком збірацца, каб стала абгаварыць гэтае пытанне. На чале моладзі стаялі некалькі матросаў, якія ў гэты час былі ў вёсцы. Палякам, безумоўна, было вядома аб гэтых намерах, і яны шукалі толькі зручнага моманту, каб расправіцца з неспакойнымі вёскамі.

Пачалося з таго, што памешчыца звярнулася да каменданта з просьбай дапамагчы ёй ачысціць лес. Камендант аддаў загад сялянам ісці на гэту работу. Сяляне прасілі, каб ім далі тое галлё, якое яны выберуць пры ачыстцы, але ім у гэтым адмовілі. Тады яны зусім адмовіліся ісці на ачыстку. Камендант наклаў штраф — па чатыры рублі з кожнага коміна. Штраф заплацілі толькі трое сялян. Тады ён штраф павялічыў да дзесяці рублёў з коміна. І — не заплаціў ніхто. Камендант звярнуўся ў штаб, у Ціхінічы, каб прыслалі салдат.

30 мая а другой гадзіне з паўдня ў Вялікія Бортнікі прыйшоў атрад з 12 чалавек легіянераў і пачаў шукаць матросаў і зброю. Характэрна, што па заяве людзей, якія працавалі ў той час у воласці, камендант адначасова з тым як запрошваў са штаба гэтых 12 чалавек на другую гадзіну, запрасіў на пятую гадзіну яшчэ 150 чалавек...

Перш-наперш легіянеры кінуліся да хаты, у якой жыў селянін Васіль Кот. Ён быў даўно прыкмечаны імі, як неспакойны, небяспечны для іх чалавек. Васіля, аднак, не было ў хаце. Яны знайшлі там яго брата Антона і накінуліся на яго:

— Ты Васіль Кот?..

— Не, не я. Гэта мой брат...

Пайшлі тады ў хату, пачалі пароць усё чыста, узламваць падлогу, столь — усё шукалі зброю. А ў гэты час на вуліцы збіраўся народ — абураны, гнеўны, раздражнёны самаўпраўствам палякаў. Супраць хаты, дзе «працавалі» палякі, хутка вырас натоўп людзей, з якога ўсё часцей і мацней чуліся крыкі абурэння.

У самы разгар трасяніны ў хату раптам з'явіўся Васіль. Але палякі яго не пазналі, а адзін хлопец са сваіх цішком перадаў яму запіску, у якой раіў уцякаць, пакуль не позна. Скарыстаўшы зручны выпадак, Васіль прашмыгнуў міма варты і знік у натоўпе. Там ён пачаў яшчэ больш падбухторваць ужо і так

узрушаных сялян. Калі з хаты выйшаў камендант, з натоўпу вылецеў смелы голас:

— Чаго вам трэба? Чаго шукаеце?

— Разыдзісь!

— А гавары, чаго шукаеш?

— Разыдзісь, а то страляць буду...

А народ настойліва патрабаваў адказу. І вось раздалася каманда:

— Салдаты! Да мяне! Тры крокі назад!.. Страляй!..

Салдаты стралялі ў паветра. Камендант вырваў у аднаго з іх стрэльбу і сам зрабіў некалькі стрэлаў у натоўп. Паднялася паніка. На зямлі хрыпелі ў крыві два забітыя селяніны. Да аднаго з іх кінуўся хлапец:

— Татачка! Родненькі!

— Э, пся крэў!..

І камендант нацэліўся ў хлапчука. Але не трапіў — куля ўпілася ў грудзі акрываўленага бацькі.

І вось тады ўжо не стрымалі маладыя сяляне. З пагрозамі і крыкамі кінуліся па хатах за зброяй. Палякі, пачуўшы небяспеку, кінуліся ўсцяж па вуліцы. А хлопцы ўжо гналіся за імі, стралялі. Тады храбрыя ваякі, каб схавацца ад куль, сіганулі цераз агароды ў поле і паўцякалі.

А камендант неяк знік раптам з вачэй. Яго доўга шукалі, але нідзе не знайшлі. Потым нехта казаў, нібы дабег ён быў да шашы і ўскочыў у бежанскую калымажку, якая якраз у гэты момант праязджала.

Узнялася тады на вёсцы страшэнная трывога. Ведалі, што не даруюць палякі, што вернуцца з вялікай сілай і пакараюць за непаслухмянства.

— Пераб'юць усіх... Спаляць!..

І нібы па нечым маўклівым загадзе пачалі выбірацца з вёскі ўстрывожаныя жыхары. Запрагалі коней, накладвалі на вазы найбольш каштоўнае дабро, выязджалі сем'ямі, хто куды. Толькі некаторыя старыя дзядулькі не хацелі ўцякаць — не хапіла ў іх сілы пакінуць родныя хаты, у якіх выраслі, узгадаваліся, у якіх прыждалі глыбокай старасці і спадзяваліся памерці.

Вёска пусцела. А ў гэты час моладзь рыхтавалася даваць адпор. Паведамілі ў Малыя Бортнікі, там таксама ўзняліся хлопцы, пабралі зброю, пачалі рыхтавацца. Там стаяў на чале паўстанцаў матрос Бурак — народны герой, які знайшоў сабе ў гэтым паўстанні трагічную, але слаўную смерць. Як пачуў ён пра здарэнні ў Вялікіх Бортніках, схапіў у абедзве рукі наганы і крыкнуў:

— Памру лепш, а не здамся...

Д.І.Бурак.

І ўся моладзь за ім:

— Усё роўна паб'юць, усё роўна памерці!.. За зброю!

А пятай гадзіне ўвечары паказаліся легіянеры. Іх было чалавек 100—150. Наступалі яны чамусьці галоўнай масай сваёй на Малыя Бортнікі. Там іх сустрэлі дружным залпам. А Вялікія Бортнікі ўдарылі па іх з флангу. Завязалася перастрэлка, у выніку якой удвая, а мо ўтрая большы атрад легіянераў (паўстанцаў было чалавек 50—60) вымушаны быў адступіць, забраўшы з сабой некалькі забітых і параненых.

Асмялеўшыя паўстанцы рашылі перайсці да наступальнай тактыкі. Яны згаварыліся і ўдарылі з двух бакоў па маёнтку, у якім сядзеў «свіны» камендант (што загадваў рэквізіцыямі). Спалоханы камендант уцёк аж за 20 вёрст у Азяраны, а паўстанцы забралі маёнтак і спалілі яго.

Пасля гэтага, па словах аднаго з удзельнікаў гэтай справы, паўстанцы наладзілі ўсё «па-ваеннаму»: паставілі варту, увялі пропускі, апавясцілі суседнія вёскі і сталі чакаць ад іх дапамогі. Пасля высветлілася, што з аднае вёскі ішлі ўжо на дапамогу, але спазніліся.

А ўвечары падышла новая сіла легіянераў. Ішлі яны цяпер адначасова з абодвух бакоў: адны са станцыі Цялуша, а другія з Азяран. Такім чынам, Бортнікі апынуліся сярод двух агнёў.

Зноў пачаўся бой. Зноў заляскалі стрэлы, з боку палякаў затарахцелі яшчэ і кулямёты. Малыя Бортнікі не вытрымалі — іх задушылі непамерна вялікія сілы ворага. А Вялікія Бортнікі пад надзейнай сховай цемры ўсё яшчэ вялі барацьбу. Цэлую ноч адстрэльваліся адважныя партызаны. Каб ашукаць ворага, яны ўсю ноч перабягалі па вёсцы з аднаго месца ў другое, і такім парадкам у палякаў

рабілася ўражанне, што тут уся вёска поўная паўстанцаў.

Да раніцы паўстанцы, якіх засталося ўсяго чалавек 20, змарыліся. Некаторыя нават паснулі, балазе не чапалі палякі, рашылі, як відаць, да раніцы не пачынаць наступленне. Таму і не заўважылі хлопцы, як падышла да самае вёскі польская разведка. Але тым часам схамянуліся, ухапіліся за зброю і абстралялі палякаў. Тыя замітусіліся, відаць, не чакалі яны, што ў вёсцы застаўся яшчэ з паўстанцаў хто-небудзь.

І вось тады выскачыў з-за вугла стары паўстанец, крыкнуў як сілы хапала:

— Хлопцы! На гура!..

Збянтэжыліся палякі, якіх было не менш за 40 чалавек, далі дзёру.

Але гэта была ўжо апошняя патуга паўстанцаў. Палякі павялі наступленне ўсімі сваімі сіламі. Чатыры ланцугі, адзін за адным прасоўваліся на вёску. Працавала каля 8 кулямётаў.

Тады разбегліся хлопцы. Палякі занялі вёску. І пачалася расправа...

Уварваўшыся ў вёску, палякі перш-наперш пачалі рабаваць. Тут ім была поўная раскоша. Сяляне пакінулі бадай што ўсю сваю маёмасць — забралі з сабой толькі зусім неабходнае. А ў Малых Бортніках шмат уцяклі проста так, як стаялі — засталося ўсё чыста на месцы.

Умомант на вуліцах з'явіліся вялікія гарбы. У іх накладалі ўсё, што мела якую каштоўнасць. Забіралі розныя хатнія рэчы — адзенне, падушкі, забіралі скаціну, якая засталася ў вёсцы. Свіней тут жа калолі або засякалі, накладвалі цэлыя гарбы свіных туш і ўсё гэта вывозілі ў горад. Потым пачалі адшукваць збожжа — яно было ў сялян пахавана ў патайных ямах. Тут прыйшлі на дапамогу бежанцы, што жылі на вёсцы. За час жыцця ў сялян яны выведалі ўсе гаспадарскія сакрэты і цяпер паказвалі салдатам, дзе захавана сялянскае збожжа. За гэта ім дазвалялі прымаць удзел у рабунку. І адзін за адным пацягнуліся ў горад поўныя, цяжкія вазы сялянскага дабра.

А як галоўнае вывозілі, пачыналі падпальваць. Падпальвалі ўпарта, настойліва, каб згарэла ўсё да апошняй трэсачкі, каб і знаку не засталося ад вёскі. Адзін стары селянін з Вялікіх Бортнікаў, успамінаючы аб гэтым, горка жаліўся са слязамі на вачах:

— Ну, няхай бы раз падпалілі — згарыць дык згарыць, а не дык не, — якое выпадзе шчасце... А то ж хадзілі, кожную хату падпальвалі, кожны будынак...

Не хацела гарэць наша вёска, зусім не хацела... Вецер быў збоку, дык не перадаваўся агонь... Усё роўна спалілі... Ні аднае хаткі не пакінулі.

Агонь пажараў, як відаць, распаліў звярыныя інстынкты пераможцаў. Пачалася страшэнная крывавая оргія. Кепска прыйшлося тым, хто застаўся на вёсцы, хто не захацеў пакінуць роднага гнязда. Іх лавілі, як нейкую жывёліну, стралялі, паролі шаблямі, кідалі жывых у агонь, у калодзежы...

А ў гэты час у лесе, у разлогах туліліся бяздомныя вяскоўцы. 320 сямей засталося без прытулку, без хлеба. 320 сямей павінны былі або жыць пад адкрытым небам — з малымі дзецьмі, з хворымі, — або уцякаць некуды далёка, дзе б не дастаў жорсткі бізун ахмеленага пахам крыві, азвярэлага панства. Па ўсіх бліжэйшых вёсках аддадзены быў строгі загад — хто прыме да сябе бортнікаўцаў, той будзе разглядацца як злачынца і будзе жорстка пакараны.

Па ваколіцах раз'язджалі атрады ўзброеных легіянераў, нікалі па лясах, па балотах — палявалі на бортнікаўцаў. Бліжэйшы да Бортнікаў лес нават прайшлі ланцугом — лавілі ўсё маладых. І калі траплялася злавіць — тут жа на месцы або застрэльвалі, або білі да паўсмерці.

Але мала каго ўдалося злавіць з маладых паўстанцаў. Не чакалі яны ўжо для сябе нічога добрага, падаліся, як сіл хапала, туды далёка, за Дняпро, да чырвоных. Загінулі некалькі чалавек, сярод іх матрос Бурак, адзін з правадыроў паўстанцаў. Паранены ў бойцы, ён на кані ўцёк быў разам з братам сваім у вёску Леўкавічы, але там яго выдалі. Нейкім дзівам ён справіўся яшчэ ўцячы і адтуль. Злавілі яго ў Пархімкавічах і там запаролі шашкамі.

Каб лягчэй расправіцца з бортнікаўцамі, польскі камендант, які абсталяваўся цяпер у Міхалёве, прыдумаў ганебнае ашуканства. Ён абвясціў, што, хто хоча атрымаць пропуск на вольны рух па ўсіх дарогах, а таксама на тое, каб зноў пасяліцца на папялішчы згарэўшых вёсак, павінен звярнуцца да яго ў Міхалёва. Даверлівыя сяляне пацягнуліся да яго цэлымі гуртамі. У першы дзень ён сапраўды выдаў з 15 прапускоў, мабыць, для таго, каб заслужыць давер. А на другі дзень ужо адкрыўся яго сапраўдны намер. Ён затрымаў каля 50 сялян і здзейсніў над імі страшэнную экзеку-

цыю. Некаторым дасталося па 140 шампалоў, шмат хто не пражыў доўга пасля гэтага...

Друкуецца са скарачэннямі па кн.: Зарэцкі М. Збор твораў. Мн., 1992. Т. 4. С. 315—328.

Лагер «Бальшавік»

Мы з дзедам Апанасам сядзім на беразе былога рэчышча Бярэзіны, у адным з самых маляўнічых куткоў. Урочышча гэтае здаўна завецца Белым Берагам. Побач з намі над невялікім вогнішчам кіпіць у турысцкім кацялку духмяная юшка. Далёка ад нас на поўдзень цяперашняе рэчышча Бярэзіны, а далей за ім раскінуў будынкі горад.

Дзед — і сведка, і ўдзельнік падзей, якія адбыліся на Бабруйшчыне ў першыя гады савецкай улады. Нават у міліцыі тады служыў. Таму багата розных гісторый аб тых незабыўных днях ведае. Вось адна з іх:

— Калі ў жніўні 1919 г. палякі акупіравалі наш горад, — пачынае дзед Апанас, — чырвонаармейцы якраз на гэтым левым беразе абарону трымалі. Далейшае наступленне белапалякаў спынілі. А стаялі тут воіны 8-й Мінскай стралковай дывізіі, камісарам якой быў ураджэнец Бабруйска І.С.Кузьміч.

У гэты час друкар Аляксандр Цімафеевіч Непагодзін па загаду бальшавіцкага падполля ўладкаваўся працаваць у друкарню штаба фронту белапольскай арміі. Размешчана была друкарня ў доме па вуліцы Скобелеўскай (цяпер вуліца Карла Маркса). Кожны загад, кожны найважнейшы дакумент, якія тут друкаваліся, Непагодзін праз свайго сябра, сувязнога і члена падпольнага камітэта Герасіма Прохаравіча Адзярыху, а пазней праз свайго брата перадаваў Бабруйскаму падпольнаму камітэту. Затым каштоўныя даныя перапраўляліся ў штаб нашай арміі.

Непагодзін праз сваю нявесту перадаў падпольшчыкам шрыфт, выкрадзены ў белапалякаў. Хутка ў падполлі пачалі друкаваць і нашы лістоўкі, адну з якіх камсамольцам удалося перакінуць у кватэру генерала — камандуючага польскім гарнізонам.

Але неўзабаве ў рады падпольшчыкаў пранік правакатар. У Бабруйскім павеце на той час былі 22 камуністычныя ячэйкі. Камітэт РКП(б) вырашыў правесці павятовую канферэнцыю. У час яе работы ў кватэру падпольшчыцы Марыі Бабровай уварваліся жандары. Былі арыштаваны члены падпольнага камітэта Каменскі, Фёдараў і Баброва. Праз некалькі дзён раніцай усе канспіратыўныя кватэры ў горадзе былі акружаны жандарамі.

З вялікім болем сустрэў гэтыя весткі Непагодзін. Сувязь з камітэтам і з Чырвонай Арміяй парушылася. У пачатку мая 1920 г. друкарні даручылі зрабіць некалькі экземпляраў дакумента, у якім змяшчаліся звесткі аб дыслакацыі польскіх войскаў. З велізарнай рызыкай, на вачах дэфензівы — белапольскай ахранкі выкраў Непагодзін і гэты звышсакрэтны дакумент. Але як перадаць яго камандаванню нашай арміі? І прыняў рашэнне.

Вясна ў той год была запозненая, у пачатку мая толькі прайшоў крыгаход. Таму і вада ў рацэ была як у ледніку. Аднак Непагодзін вось дзесьці тут пераплыў Бярэзіну...

Дзед Апанас перапыніў свой расказ, каб закурыць люльку.

— Ну, далей было ўсё, як трэба, — працягваў дзед Апанас. — Тут, ля Белага Берага, Непагодзіна затрымаў чырвонаармейскі сакрэт, у штаб даставілі. Доўга смяяліся потым чырвонаармейцы, успамінаючы, як у штабе «перабежчык» з іх камісарам абдымаўся. Сябрамі аказаліся. Вось тады Непагодзіна і назваў Кузьміч сапраўдным бальшавіком. Кажуць людзі, што нібыта з таго часу мясцовасць, дзе штаб чырвоных стаяў, лагерам «Бальшавік» называюць.

Раніцай наступнага дня Непагодзін зноў быў на сваёй рабоце ў акупіраваным горадзе. Тут і арыштавалі мужнага падпольшчыка. Прыгавор ваеннага суда быў кароткі: «Расстраляць». Так і не дачакаліся героі сваіх вызваліцеляў. А на наступны дзень у горад увайшла Чырвонай Армія. *У.Пераверзеў.*

Іван Гудзей — салдат і сейбіт

Кастрычнік 1917 г. салдаты 52-й стралковай дывізіі, дзе служыў Іван Гудзей, сустрэлі з радасцю і хваляваннем. Імперыялістычная вайна ішла на скон, усё больш спраўджваліся словы бальшавікоў. Пра гэта ўсё часцей чуў Іван ад аднапалчаніна-земляка Пракопа Малаковіча. Разам яны абменьваліся думкамі, успаміналі Бабруйшчыну, разам і хадзілі па ротах, пераконвалі сваіх таварышаў падтрымаць рэвалюцыю. Невыпадкова ў палкавы камітэт іх абралі разам, прычым П.Малаковіча — старшынёй. Неўзабаве полк, а потым і ўся дывізія апынуліся на баку бальшавікоў.

І.С.Гудзей.

Першы на радзіму вярнуўся Іван. Ды толькі шыняля зняць не давялося. Ужо ў снежні 1917 г. ўзначаліў каравульную каманду атрада Чырвонай гвардыі ў Бабруйску. Новы ж год прынёс бяду — войскі Доўбар-Мусніцкага занялі горад і павет. Але супраць мяцежнікаў збіраліся мужныя людзі — партызаны. Адным з такіх атрадаў камандаваў Пракоп Малаковіч. Ды бяда не ходзіць адна. Не паспелі апошнія рэшткі белапольскага корпуса схавацца ў крэпасці над Бярозай-ракой, як Бабруйшчыну акупіравалі германцы.

Са зброяй у руках працягвалі барацьбу супраць чужынцаў Іван і Пракоп. У маі 1918 г. бальшавікі стварылі Бабруйскі падпольны камітэт РКП(б). Увайшоў у яго П.Малаковіч. Неяк восенню ён паклікаў сябра:

— Ёсць баявое заданне, Іван. Немцаў хутка прагонім, шукай надзейных людзей, будзем уладу Саветаў усталёўваць.

Дзе ж іх шукаць? Зразумела, сярод сваіх — салдат і сялян. Накіраваўся ў родныя Ціўнавічы, пабыў у Сычкаве, іншыя вёскі Гарбацэвіцкай воласці наведаў. Усюды зразумелі землякі салдата. А тут якраз і германца пагналі. Напрадзімку ўзрушаныя збіраліся сябры і таварышы Івана Гудзея. Як-ніяк свой рэўком пачынае дзейнічаць. У яго ўвайшлі Павел Гудзей, Павел Грыняк, Павел Кактыш, Фёдар Пінчук, Марк Шавель. Старшынёй камітэта прызначылі Івана.

З прагнасцю ўзяўся старшыня за мірныя справы. Не хапала хлеба, не было солі, газы, запалак. Узялі на ўлік усе памешчыцкія маёнткі, іх маёмасць. Людзі чакалі дапамогі. Зямля ёсць, а працаваць нельга — ні каня, ні плуга. Як жыць?

Зноў Іван пайшоў да Малаковіча. Той ужо быў павятовым ваенным камісарам. Ён выслухаў сябра, зразумеў яго заклапочанасць. А потым расказаў аб падзеях у Расіі. Сяляне там аб'ядноўваюцца, хочуць разам з галечы ў новае жыццё крочыць. І Пракоп паказаў статут сельскагаспадарчай камуны, прывезены з Масквы.

Доўга яшчэ гутарылі таварышы. Іван прымерваў усё пачутае да воласці, да сваёй вёскі, да сябе. Нарэшце рашылі, што трэба паспрабаваць працаваць гуртам, камунай.

Гэту размову Іван перадаў у рэўкоме. Зачытаў статут, заўважыў, што ў воласці ёсць неблагія маёнткі, пакінутыя панамі. У словах старшыні рэўкома было чутна жаданне самому ўзяцца за новую справу.

Ідэю калектыўнага гаспадарання заўзята падхапіў Марк Шавель з Сычкава. Ён паведаміў, што з хлопцамі нагледзеў у Панюшкавічах і пабудовы, і які-ніякі інвентар. Зноў жа, хутка сеяцца трэба...

— Май і мяне на ўвазе, — не ўтрымаўся Гудзей, — я ж ціўнавіцкі...

Летам 1919 г. камунары Панюшкавіцкай арцелі рыхтаваліся да першага калектыўнага жніва. Іван Гудзей адчуваў сапраўдную асалоду ад работы на зямлі. Сялянскія карані напаўнялі яго вялікай сілай... Але зноў давялося накіраваць яе на барацьбу з ворагам. У канцы жніўня на Бабруйшчыне гаспадарылі ўжо белапольскія захопнікі.

З Чырвонай Арміяй Іван Гудзей прайшоў цяжкімі дарогамі Кахоўкі, Перакопа, Сіваша, Тамбоўшчыны. І зноў вярнуўся ў родны Прыбярэзінскі край. У верасні 1921 г. быў выбраны старшынёй Гарбацэвіцкага валаснога выканкома. Умацоўваў савецкую ўладу. Але цягнула жытнёвае поле. З 1922 г. Іван Стэфанавіч Гудзей вырошчваў збажыну. Ствараў калгас. І зноў шчыраваў на хлебадайнай ніве. Аж пакуль не грымнула Вялікая Айчынная, калі сейбіт Іван Гудзей зноў стаў салдатам.

А.Бяляеў.

І стала Бабруйшчына партызанкай

Ужо два месяцы польскія жаўнеры тапталі зямлю Беларусі. Памешчыкі, што не так даўно збеглі ад савецкай улады, вярталіся ў маёнткі. Пакрыўджаныя, раз'юшаныя, секлі яны сялянскія спіны.

Беларускі селянін не мог з гэтым мірыцца,

што акупанты адчулі з першых восеньскіх дзён 1919 г. Ужо 11 лістапада пачаў арганізоўвацца першы партызанскі атрад, у якім праз два тыдні было 60 чалавек. Цікава, што загад № 12 начальніка тылу Заходняга фронту, які прадпісваў губернскім, павятовым і мясцовым рэўкомам як мага хутчэй правесці мабілізацыю ў партызанскія атрады, быў выдадзены 14 лістапада. У першых жа рэйдах партызаны здабылі каштоўныя разведданыя.

На тэрыторыі павета пачаў дзейнічаць таксама «Атрад Раскольнікава». Каля 100 чалавек змагаліся ў яго радах. Шмат разоў разбівалі яны шляхецкія войскі. Неаднойчы атрад выходзіў у тыл ворага, наносіў шкоду і сеяў паніку сярод захопнікаў. Арганізаваў землякоў у грозную сілу і кіраваў ёй ураджэнец вёскі Кавалі бальшавік Максім Ляўкоў.

Многа рабілі для набліжэння перамогі мсціўцы з атрада Пятра Фёдарава, або таварыша Дняпроўскага, як яго звалі ў партарганізацыі. Ён быў накіраваны партыяй на Бабруйшчыну з Пінска.

Вялікім атрадам імя III Інтэрнацыянала, які налічваў да 500 чалавек, камандаваў у барацьбе супраць польскіх інтэрвентаў камуніст Васіль Аляшкевіч, накіраваны з Ляхавіцкага павета. Яшчэ большы партызанскі атрад, колькасцю 750 чалавек, у прыфрантавой паласе ўзначальваў член партыі Сямён Вілюга, ураджэнец Глушчыны.

Усяго ў Бабруйскім павеце супраць акупантаў дзейнічалі 80 партызанскіх атрадаў і груп. Яны ўчынялі дыверсіі, здабывалі для Чырвонай Арміі звесткі аб праціўніку. У снежні 1919 г. народныя мсціўцы захапілі станцыю Ратміравічы, разграмілі варожы гарнізон у вёсцы Стасеўка, правялі паспяховыя аперацыі ў Брожскай і Рудабельскай валасцях.

Накіроўвалі дзейнасць чырвоных партызан створаны пры Бабруйскім камітэце паўстанцкі цэнтр на чале з М.А.Ляўковым, а таксама начальнік партызанскіх атрадаў, член Бабруйскага рэўкома С.Л.Вілюга.

А.Бяляеў.

Мабілізаваныя рэвалюцыяй

БАБРОВА МАРЫЯ

Гэта партыйны псеўданім Марыі Аляксандраўны Бронінай, аднаго з кіраўнікоў партыйнага падполля ў Бабруйску ў гады грамадзянскай вайны і замежнай ваеннай інтэрвенцыі. Нарадзілася ў 1897 г. ў в. Локшы былой Віцебскай губерні. У пачатку 1920 г. ЦК КП(б) Літвы і Беларусі паслаў яе на ўмацаванне Бабруйскага падпольнага партыйнага камітэта. Пад яе кіраўніцтвам быў створаны Ясеньскі падпольны раённы камітэт, які аб'ядноўваў 15 партыйных ячэек у Багушоўцы, Пабокавічах, Каменцы, Кісялевічах, Саломенцы, Осаве і іншых вёсках Бабруйскага павета. Па ініцыятыве Бабруйскага падпольнага парткамітэта арганізаваны партызанскія атрады ў в. Сычкава, Любовічы, Бортнікі, Рымаўцы, Харлапавічы, Каменка, Падрэчча. 25.4.1920 г. польскія акупанты арыштавалі М.Баброву на павятовай падпольнай партканферэнцыі ў Бабруйску на яе кватэры. Пасля катаванняў 28.4.1920 г. расстраляна. Імем Бабровай названа вуліца ў Бабруйску.

ВІЛЮГА СЯМЁН ЛАЗАРАВІЧ

Адзін з арганізатараў партызанскага руху на Беларусі ў грамадзянскую вайну. Нарадзіўся 14.7.1891 г. ў в. Усцярхі былога Бабруйскага павета. З сялян. Член КПСС з 1917 г. З 1915 г. ў арміі. У 1917 г. вёў рэвалюцыйную работу сярод салдат, членаў палкавога камітэта. У час Кастрычніцкай рэвалюцыі ўсталёўваў савецкую ўладу ў Глускай і Ляскавіцкай валасцях Бабруйскага павета. У студзені—лютым 1918 г. арганізоўваў атрады Чырвонай гвардыі для барацьбы з корпусам Доўбар-Мусніцкага. У 1919 г. старшыня Глускага рэўкома, начальнік партызанскіх атрадаў у Бабруйскім і Рагачоўскім паветах, узначальваў асобы батальён імя Бабруйскага рэўкома. З мая 1920 г. ўпаўнаважаны Рэў-

С.Л.Вілюга.

ваенсавета Заходняга фронту па дэзарганізацыі тылу белапольскай арміі. З 1924 г. на гаспадарчай рабоце.

ЛЯЎКОЎ МАКСІМ АРХІПАВІЧ

Дзяржаўны дзеяч БССР, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў камуністычнага падполля і партызанскага руху на Беларусі ў грамадзянскую вайну. Нарадзіўся 28.4.1894 г. ў в. Кавалі былога Бабруйскага павета. З сялян. Член КПСС з 1918 г. Удзельнік 1-й сусветнай вайны. У пачатку 1918 г. ваенны камісар Рудабельскай воласці Бабруйскага павета, потым кіраўнік партызанскага руху супраць польскіх войскаў Доўбар-Мусніцкага і нямецкіх акупантаў у Бабруйскім павеце. У 1920 г. адзін з арганізатараў камуністычнага падполля і партызанскіх атрадаў у Бабруйскім павеце. З ліпеня 1920 г. ў Бабруйскім павятовым аддзеле РСІ, ваенны камісар павета, старшыня Замошскага валвыканкома. З 1929 г. ў ЦКК КП(б)Б. З 1931 г. нарком юстыцыі і пракурор БССР, старшыня Цэнтральнай камісіі па справах былых чырвонагвардзейцаў і чырвоных партызан. З 1933 г. сакратар ЦВК БССР. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга БССР. Памёр 16.10.1941 г.

МАЛАКОВІЧ ПРАКОП ДЗЯНІСАВІЧ

Дзяржаўны дзеяч БССР, адзін з арганізатараў разгрому мяцяжу Доўбар-Мусніцкага і барацьбы з нямецкімі акупантамі на Бабруйшчыне. Нарадзіўся 20.7.1895 г. ў в. Зубарэвічы былога Бабруйскага павета. З сялян. Член КПСС з 1917 г. Удзельнік 1-й сусветнай вайны. Вёў рэвалюцыйную работу сярод салдат Асобай і 11-й армій Паўднёва-Заходняга фронту, у 1917 г. старшыня палкавога камітэта. У 1918—1920 гг. ваенны камісар Бабруйскага, Дарагабушскага паветаў, ваенны камісар сувязі Заходняга фронту. З 1920 г. старшыня Бабруйскага павятовага выканкома, з 1922 г. нарком унутраных спраў БССР, з 1923 г. старшыня Амурскага губрэўкома, выканкома. З 1927 г. старшыня Гомельскага акружнога выканкома, з 1928 г. сакратар Гомельскага акружнога камітэта КП(б)Б. З 1931 г. ў Наркамаце сувязі СССР. У 1937 г. рэпрэсіраваны і расстраляны. Рэабілітаваны 25.5.1957 г.

М.А.Ляўкоў.



П.Дз.Малаковіч.

Уперад ішлі браневікі

Рэўваенсавет рэспублікі сваім загадам № 46 ад 10 лютага 1921 г. на падставе загада РВСР 1919 г. за № 511 Рэўваенсавета 16-й арміі зацвярджаў прысуджэнне ордэна Чырвонага Сцяга байцам 35-га аўтабранявога атрада:

«Загінуўшаму ў баі з ворагамі сацыялістычнай Айчыны камандзіру бранявой машыны тав. Усаву Васілю Міхайлавічу і шафёру тав. Філатаву Івану Мікалаевічу...

Кулямётчыкам тав. Міхайлаву Аляксею Васільевічу, Кулагіну Пятру Мікалаевічу...

Шафёру тав. Альбаву Льву Іванавічу...

Намеснік старшыні Рэвалюцыйнага Ваеннага Савета Рэспублікі Э.Склянскі

Галоўнакамандуючы ўсімі ўзброенымі сіламі Рэспублікі С.Каменеў».

За гэтымі кароткімі радкамі з дакумента — яркія эпізоды барацьбы з інтэрвентамі на Заходнім фронце, у прыватнасці на Бабруйшчыне.

Пачатак лета 1920 г. быў адзначаны ўпартымі баямі на Бярэзіне. Актыўны ўдзел у наступленні войскаў 16-й арміі прымаў пад Бабруйскам і 35-ы аўтабронеатрад. Ён меў задачу прарвацца ў горад з паўночнага захаду, па мосце цераз раку каля Шчаткава.

Уперад пайшлі браневікі. Першымі праз ланцуг абароны палякаў накіравалі сваю машыну В.М.Усаў і І.М.Філатаў. Яны ўжо прарываліся ў тыл праціўніка, як раптам заглух матор і бранявік спыніўся. Каб даць магчымасць шафёру ліквідаваць няспраўнасць, камандзір Усаў выскачыў з яго і пачаў кідаць бомбы ў легіянераў. Ворагі залягглі. Гэтых хвілін хапіла, каб Філатаў завёў рухавік. Васіль Міхайлавіч аддаў загад рухацца наперад, але сам быў смяротна паранены.

У гэты ж дзень, 4 чэрвеня, нягледзячы на раненні, да апошняга патрона забяспечвалі праход браневікоў на плацдарме кулямётчыкі

А.В.Міхайлаў і П.М.Кулагін. Яны далі магчымасць браніраваным машынам весці бой да канца.

Апошняй кропкай у гераічнай схватцы з ворагам на беразе ракі можна лічыць подзвіг Льва Іванавіча Альбава. Яго бранявік наводзіў жах у баявых парадках праціўніка, аж пакуль паліва не аказалася на зыходзе. Л.І.Альбаў скіраваў машыну, каб вярнуцца на свой бераг. Але палякі падпалілі мост. Сам адважны чырвонаармеец быў паранены ў руку. У такім становішчы, пад ураганным агнём кулямётаў і ручных гранат, ён рашыў лепш загінуць у Бярэзіне, чым пакінуць тэхніку ворагам. І Альбаў накіраваў бранявік на палаючую пераправу. Ён паспеў праскочыць на другі бок. І тут жа мост рухнуў. Машына была выратавана. *А.Бяляеў, І.Я.Краўцоў.*

Бярэзінская флатылія

У тэлеграме Галоўнакамандуючага Узброенымі сіламі Савецкай Рэспублікі С.С.Каменева камандаванню Заходнім фронтам і 12-й арміяй ад 27 жніўня 1919 г. паведамлялася: «Прыпяцкая і Бярэзінская флатыліі цалкам пераходзяць у склад Дняпроўскай флатыліі». Фактычна наконт Бярэзінскай флатыліі тут крыху перабольшана. Але тое, што Галоўнакамандуючы групу суднаў на Бярэзіне назваў флатыліяй, сведчыць, што ёй надавалася выключна важнае значэнне.

Было гэта ўлетку 1919 г., у крытычны час імклівага наступлення нямецкіх войскаў. Паводле дырэктывы рэўваенсавета Заходняга фронту ў Бабруйску і на Бярэзіне ствараўся моцны вузел абароны. З гэтай мэтай фарміраваўся бярэзінскі атрад суднаў. Важную ролю ў гэтым адыграў рэвалюцыйны матрос з Петраграда Р.А.Муклевіч, які быў ваенкомам штаба 16-й арміі і членам Ваеннага Савета Бабруйскага ўмацаванага вузла. Для абследавання суднаў і іх узбраення сюды накіравалі інжынер-механіка ваеннага марака А.Ф.Нордквіста. 23 жніўня ён паведаміў у марскую частку Заходняга фронту, што на Бярэзіне ёсць 7 спраўных таварна-пасажырскіх параходаў і буксіраў, 3 паравыя барказы і 3 маторныя лодкі. Буксіры і параходы «Лёс», «Усход-1», «Усход-2», «Пераможац», «Бесядзь», «Ганна» і «Магілёў» могуць браць на борт па 300—350 чалавек і да 3 тысяч пудоў грузу. Умяшчальнымі аказаліся і барказы «Воін», «Пашэнны» і «Пяты». Фронт на той час знаходзіўся ўсяго за 12 вёрст на паўночны захад ад Бабруйска.

Невялічкі рачны атрад мужна нёс сваю нялёгкую службу. Нават у час адступлення 28 жніўня ён забяспечыў пераправу чырвонаармейскіх часцей і агнём прыкрываў іх адыход. Адна рота 67-га палка пад прыкрыццём і пры падтрымцы суднаў атрада з баямі адышла па правым беразе Бярэзіны аж да Парычаў, утрымліваючы дарогу Бабруйск—Рэчыца. Праўда, белапалякам удалося захапіць параход «Лёс». Але вясной 1920 г. ў час баёў за станцыю Шацілкі гэты параход быў адбіты і вернуты ў строй. Так што невялікі бярэзінскі рачны атрад сапраўды ваяваў, як флатылія.

І.Я.Краўцоў, Санкт-Пецярбург.

Я хацеў вам шчасця, землякі

З успамінаў былога старшыні Гарбацэвіцкага валаснога рэўкома І.М.Лемяшонка

Лютаўскую рэвалюцыю я сустрэў на Заходнім фронце каля Маладзечна, дзе служыў камандзірам гарматы ў 3-м лёгкім артдывізіёне 1-й грэнадзёрскай дывізіі Каўказскага корпуса 10-й арміі. Па сваім палітычным складзе артдывізіён быў разнародны: у яго ўваходзілі і бальшавікі, і меншавікі, і эсэры. Для нас, салдат, найбольш зразумелымі і блізкімі былі лозунгі бальшавікоў аб міры, зямлі, рабочым кантролі на фабрыках і заводах. Хутка амаль увесь наш дывізіён, за выключэннем афіцэраў, падтрымліваў бальшавікоў.

У перыяд двоеўладдзя ва ўсіх вайсковых часцях былі выбраны салдацкія камітэты, якія адыгрывалі вялікую ролю ў жыцці арміі. Ішоў хуткі працэс яе дэмакратызацыі. Мяне абралі спачатку старшынёй салдацкага камітэта батарэі, а перад Кастрычніцкай рэвалюцыяй — старшынёй дывізіённага камітэта. У якасці дэлегата з правам рашаючага голасу ад 1-й дывізіі 2-га Каўказскага корпуса прымаў удзел у рабоце II з'езда салдацкіх дэпутатаў армій Заходняга фронту, які праходзіў у Мінску 20—25 лістапада 1917 г.

Пасля зрыву перагавораў у Брэсце наконт заключэння міру з Германіяй папаўзлі чуткі аб наступленні немцаў. Было зразумела, што стрымаць яго наша армія не здолее: салдаты стаміліся ад вайны, не было афіцэрскіх кадраў. У нашым артдывізіёне з афіцэраў застаўся толькі адзін прапаршчык Крукаў, член

партыі бальшавікоў, які выконваў абавязкі камандзіра дывізіёна.

Мне, як старшыні дывізіённага салдацкага камітэта, карпусны камітэт загадаў адабраць добраахвотнікаў, узяць лепшыя гарматы, коней, дастатковую колькасць снарадаў, патронаў, харчавання, сфарміраваць батарэю і неадкладна рухацца праз Мінск у Оршу, дзе фарміраваліся атрады Чырвонай гвардыі.

Добраахвотнікаў набралася каля 180 чалавек. Мы адабралі 6 гармат, 2 кулямёты «максім», загрузілі тры фурманкі патронаў, амуніцыі і накіраваліся ў дарогу. Праз 7 дзён прыбылі ў Оршу, дзе нас сустрэлі прадстаўнікі Аршанскага рэвалюцыйнага камітэта, і размясціліся ў вайсковай казарме.

Прыкладна ў канцы лютага 1918 г. нашу батарэю перайменавалі ў чырвонагвардзейскі атрад № 29. Яго камісарам быў прызначаны

Старшыня Гарбацэвіцкага валаснога рэўкома І.М.Лемяшонак (стаіць) і ваенком А.Р.Галавач. 1920 г.

Г.П.Смольскі, камандзірам застаўся Крукаў. Салдацкія камітэты ў атрадах былі ліквідаваны. Я застаўся камандзірам гарматы.

У Оршы мы знаходзіліся да фарміравання 17-й стралковай дывізіі Чырвонай Арміі ў канцы лютага 1918 г. З нашага атрада быў сфарміраваны асобны 3-і артылерыйскі дывізіён у складзе трох батарэй. Кожная батарэя складалася з чатырох гармат і кулямётнага ўзвода (аднаго кулямёта «максім»). Камандзірам дывізіёна быў прызначаны былы капітан царскай арміі, які прыбыў з нямецкага палону, Франц Нольe, а яго намеснікам — Крукаў. Камандзірам нашай 2-й батарэі стаў Фадзей Купцоў. 17-я стралковая дывізія была сфарміравана ў складзе трох палкоў — 151-га, 152-га і 153-га. Кожнаму палку быў прыдадзены артдывізіён. Наш артдывізіён быў прыдадзены 153-му палку, камандзірам якога быў член партыі бальшавікоў латыш Родзе.

У час адступлення немцаў наша 17-я стралковая дывізія ў поўным складзе была перакінута да Гомеля, дзе вяла баі за горад і павет. Цяжкія баі мы вялі пад Корастанем і за яго вызваленне. Сур'ёзную дапамогу нам аказвалі ўкраінскія партызаны і мясцовае насельніцтва. Пазней удзельнічалі ў вызваленні Кіева, дзе наш полк адпачываў увесь сакавік 1919 г.

У пачатку красавіка 1919 г. полк быў перакінуты ў Бабруйск, дзе мы размясціліся ў крэпасці. Тут я ўступіў у Камуністычную партыю.

Прыкладна ў канцы жніўня 1919 г. мяне выклікалі ў палітаддзел 8-й стралковай дывізіі і сказалі, што адклікаюць у Смаленск у распараджэнне Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі. З'явіцца туды было загадана неадкладна. У Смаленску нас сабралі каля 40 камуністаў, у тым ліку 12 чалавек з Бабруйскага павета (Снегін, ён жа Паўлоўскі, Юркевіч з Глускай воласці, Ешчык, Чабан з Гарадоцкай воласці, Іван Гарбузаў са станцыі Ясень і інш.). У ЦК КП(б)Б усю групу прыняў сакратар ЦК В.Г.Кнорын. Ён правёў з намі гутарку і сказаў, што партыя накіроўвае нас у тыл праціўніка для разгортвання падпольнай работы і арганізацыі партызанскіх атрадаў для барацьбы з польскімі акупантамі.

У Смаленску мы прабылі больш за 10 дзён, на працягу якіх нас вучылі формам і метадам падпольнай работы, спосабам пераходу цераз лінію фронту, прыёмам партызанскай барацьбы. Пасля гэтага ўсіх нас, 12 чалавек родам з Бабруйскага павета, накіравалі

ў распараджэнне Бабруйскага падпольнага камітэта партыі, забяспечылі дакументамі ваеннапалонных першай сусветнай вайны, якія нібыта вяртаюцца з нямецкага палону дадому. Пароль і яўкі кожны павінны быў добра запомніць. Мне была названа яўка ў г. Бабруйску па вуліцы Школьнай, 43, дзе пад выглядам мужа і жонкі жылі ў адной бабулі падпольшчыкі Дняпроўскі (мянушка Пятроў) і Баброва.

Да фронту, які праходзіў па Бярэзіне, нас суправаджаў прадстаўнік ЦК КП(б)Б. На мосце каля Бабруйска ўсіх затрымаў польскі вартавы і выклікаў афіцэра, які добра валодаў рускай мовай. Ён уважліва праверыў нашы дакументы і пад аховай накіраваў да каменданта горада (павятовага старасты). Камендант таксама праверыў нашы дакументы і выдаў пропускі.

Так у канцы кастрычніка 1919 г. я прыбыў у сваю родную в. Баранавічы. У першыя ж дні ў нашым доме пабывалі амаль усе аднавяскоўцы, кожнаму хацелася пачуць навіны ад франтавіка. Людзі выказвалі незадаволенасць польскай акупацыяй, вяртаннем памешчыкаў.

Праз два тыдні, як і было дамоўлена, я накіраваўся ў Бабруйск для наладжвання сувязі з павятовым падпольным камітэтам партыі, дзе атрымаў заданне стварыць у Гарбацэвіцкай воласці падпольную партыйную ячэйку і разгарнуць барацьбу супраць польскіх акупантаў.

Стварэнне ячэйкі я пачаў з таго, што звязаўся з жыхаром в. Пабокавічы Андрэем Раманавічам Галавачом, якога добра ведаў. Мы абмеркавалі, што будзем рабіць у бліжэйшы час. Я сказаў Галавачу, з якой мэтай мяне накіравалі ў родныя мясціны, што маю сувязь з Бабруйскім павятовым падпольным камітэтам партыі, і папрасіў яго падабраць надзейных людзей для падпольнай работы.

Праз некаторы час Галавач паведаміў, што ён перагаварыў з Пятром Іванавічам Шаўчуком з в. Багушоўкі, які згадзіўся ўдзельнічаць у падпольнай рабоце. Неўзабаве мы ўтрох сабраліся ў хаце Шаўчука і арганізацыйна аформілі нашу падпольную ячэйку. Тут жа правялі першае пасяджэнне з размеркаваннем абавязкаў. Я стаў старшынёй, А.Р.Галавач — сакратаром, П.І.Шаўчук — намеснікам старшыні ячэйкі. Тут жа вызначылі нашы задачы, разбілі вёскі і пасёлкі воласці на тры ўчасткі і замацавалі іх за кожным з нас. Актыўны ўдзел у рабоце падпольнай арганізацыі прыняў жыхар вёскі Гарбацэвічы Сяргей Савельевіч Астаповіч. Пратакол пасяджэння нашай ячэйкі і план работы я перадаў Бабруйскаму падпольнаму павятоваму камітэту партыі.

Прыблізна праз тыдзень да мяне ў в. Баранавічы прыйшоў прадстаўнік падпольнага павятовага камітэта партыі Снегін (Паўлоўскі), з якім я быў знаёмы па Смаленскім зборы ў ЦК КП(б)Б. Ён пажадаў асабіста пазнаёміцца з членамі нашай ячэйкі. На кватэры Шаўчука ў в. Багушоўцы Снегін правёў з намі гутарку і сказаў, што павятовы падпольны камітэт ухваляе нашу дзейнасць. Затым ён прапанаваў пашукаць у воласці зручнае месца, дзе ён змог бы пажыць некаторы час. Пасля ўсебаковага абмеркавання мы аднадушна вырашылі, што самым зручным месцам будзе хутар Пастаянка: ён знаходзіўся ў глухой мясцовасці і жылі там надзейныя людзі — Драздовы (імён не памятаю). Дом ператварыўся ў нашу явачную кватэру, дзе часцей за ўсё збіраліся члены нашай падпольнай ячэйкі. Шмат у чым нам дапамагала жонка Драздова, асабліва ў распаўсюджванні нелегальнай літаратуры.

Паўлоўскі звязаў нашу ячэйку з Гарадоцкай, Глускай і Ясеньскай падпольнымі арганізацыямі. Гэта быў куст, які ён курыраваў ад Бабруйскага падпольнага павятовага камітэта партыі.

Неўзабаве да мяне ў в. Баранавічы прыйшоў арганізатар Бабруйскага падпольнага павятовага камітэта партыі Максім Ляўкоў. Два тыдні ён жыў у маіх бацькоў пад выглядам майго старэйшага брата. На ўсякі выпадак пра гэта я папярэдзіў старасту нашай вёскі Фёдара Савасцянавіча Кагоцьку — таксама надзейнага чалавека. І, як высветлілася, недарэмна. Аднойчы на вёску наляцелі польскія жандары, зайшлі ў нашу хату, калі там знаходзіўся Ляўкоў, і запыталі, хто гэта. Маці сказала, што гэта яе старэйшы сын. Але, мусіць, знешнасць Ляўкова выклікала ў жандараў падазронасць, і яны арыштавалі яго. У гэты час мая сястра Каця пабегла да старасты Кагоцькі і паведаміла, што дзядзьку Максіма арыштавалі жандары. Кагоцька тут жа з'явіўся і пацвердзіў, што гэта старэйшы сын маёй маці, і жандары адпусцілі яго.

Я адвёў Ляўкова на станцыю Ясень, дзе ён правёў нараду падпольнай арганізацыі, а затым быў перапраўлены ў в. Касьё, а адтуль за лінію фронту.

Наша ячэйка апіралася на шырокі актыў, які быў створаны ў вёсках і пасёлках воласці. Актыўна ўключыліся ў падпольную работу

Якаў Васілевіч Гарадзецкі і Іван Сяргеевіч Хадасевіч з в. Осава. Вялікую дапамогу нам аказвала моладзь. Часта Іван Галотка, Федзя Галотка, Грыша Галавач, Платон Галавач, Пеця Пячонка, Іван Касцючык і іншыя юнакі атрымоўвалі ад нас лістоўкі і нелегальную літаратуру і з вялікім энтузіязмам распаўсюджвалі сярод насельніцтва. Асабліва эфектыўна яны праводзілі гэту работу ў святочныя дні ў царкве, куды з'язджаліся жыхары навакольных вёсак.

У хуткім часе ў нашым «кусце» быў арганізаваны партызанскі атрад, якім камандаваў Ілля Чэшка, былы афіцэр царскай арміі, бацькі якога жылі на станцыі Ясень. Атрад налічваў каля 180 чалавек і на ўзбраенні меў тры ручныя кулямёты, вінтоўкі і гранаты. У час адступлення палякаў з г. Бабруйска наш атрад у раёне в. Бабоўе Осаўскага сельсавета ўступіў з імі ў бой. Каб адпомсціць за гэта, палякі спалілі вёску Осава і забілі 19 яе жыхароў.

Пасля выгнання польскіх акупантаў мяне прызначылі старшынёй Гарбацэвіцкага валаснога рэвалюцыйнага камітэта. Мне было даручана стварыць апарат валаснога рэўкома з членаў нашай падпольнай ячэйкі. А.Р.Галавач стаў ваенным камісарам рэўкома, П.І.Шаўчук — загадчыкам зямельнага аддзела, загадчыкам народнай адукацыі быў прызначаны былы сакратар Осаўскай падпольнай арганізацыі І.С.Хадасевіч, сакратаром рэўкома — былы валасны пісар І.М.Іскрыцкі, загадчыкам харчовага аддзела быў прысланы ўпаўнаважаны павятовага аддзела харчавання Л.Пагаржэльскі. Перад рэўкомам стаяла першачарговая задача — усталяванне і замацаванне савецкай улады на месцах. Трэба было аднавіць сельскія Саветы ў кожнай вёсцы, дзе яны былі выбраны да белапольскай акупацыі, а там, дзе члены іх выбылі па розных прычынах, трэба было правесці новыя выбары.

Адной з галоўных задач рэўкома ў час вайны з белапалякамі была агітацыя насельніцтва на выкананне паставак збожжа, мяса і фуражу для Чырвонай Арміі. Бабруйскі павятовы камітэт давёў для нашай воласці план харчовай развёрсткі. План быў даволі вялікі, а тэрміны крайне сціслыя. На пасяджэнні рэўкома мы стварылі камісію, якая павінна была за два дні давесці план харчразвёрсткі да кожнага сельсавета. Камісія празасядала шэсць дзён, але падрыхтаваны ёю план аказаўся нездавальняючы, таму што ўключаў у развёрстку і беднякоў, якія складалі апору савецкай улады на вёсцы і не мелі лішкаў хлеба.

Для карэкціроўкі плана я склікаў камуністаў нашай партарганізацыі, і мы ўважліва прааналізавалі магчымасці кожнай вёскі і хутара. Пасля таго падліку прыйшлі да высновы, што план харчразвёрсткі зможам асіліць за кошт толькі заможных сялян. Мы вырашылі перавыканаць план і даць Чырвонай Арміі збожжа звыш плана. За кожным сельсаветам замацавалі па члену партарганізацыі і рэўкома, якія на працягу тыдня павінны былі забяспечыць выкананне плана. Вялікую дапамогу нам аказалі актывісты з беднаты і сераднякоў. За перавыкананне плана харчразвёрсткі наша воласць была занесена на павятовую чырвоную дошку.

Вялікую работу рэўком праводзіў і па забеспячэнні Чырвонай Арміі транспартам. Нарад на падводы для арміі мы поўнасцю выканалі. З воласці было мабілізавана 1200 падвод.

Былі ў рэўкома і іншыя неадкладныя клопаты, сярод якіх арганізацыя вучобы дзяцей. У тых умовах гэта было няпроста. Дзе ўзяць настаўнікаў, памяшканні? На ўсю воласць толькі ў трох вёсках меліся хоць і цесныя, але ўсё ж школьныя будынкі. Настаўнікаў можна было запрасіць з Бабруйска: з-за цяжкага матэрыяльнага становішча на работу ў вёску яны ішлі ахвотна. Але ім дадаткова неабходна было выдзеліць харчовую дапамогу, таму што па картачках атрымоўвалі ў той час мала, а грошы былі зусім абясцэнены. Пагаварылі з жыхарамі вёсак. На добраахвотных асновах амаль усе згадзіліся дапамагчы настаўнікам харчаваннем і плаціць за наём для школ прыдатных сялянскіх дамоў. Дамовіліся, што настаўнікаў будуць карміць па чарзе бацькі, за выключэннем беднякоў.

У нашай воласці не было школы 2-й ступені, павятовы аддзел народнай адукацыі не мог дапамагчы нам у яе стварэнні. А мець такую школу трэба было абавязкова, каб найбольш здольныя дзеці з усіх вёсак змаглі працягваць навучанне пасля пачатковага курсу. Але тут зноў паўстала пытанне: што рабіць з настаўнікамі? Харчавацца па чарзе ў бацькоў — гэта было часовае выйсце для пачатковых школ. Мы разумелі, што такі метад не паспрыяе ўмацаванню аўтарытэту настаўніка; ён не падыходзіў яшчэ і таму, што ў школу 2-й ступені збіраліся вучні з усёй воласці. Тады рэўком вырашыў склікаць валасны з'езд і паставіць на ім пытанне аб матэрыяльнай дапамозе настаўнікам і асабліва настаўнікам

школы 2-й ступені, якая была створана ў Гарбацэвічах.

На з'ездзе аднагалосна прынялі рашэнне: даручыць рэўкому распрацаваць нормы выдачы харчавання настаўнікам і развярстаць патрэбную колькасць прадуктаў па сельсаветах з улікам эканамічнага становішча кожнага. Такія нормы мы распрацавалі, і іх зацвердзілі на валасным з'ездзе. На месяц настаўніку выдавалася 3 пуды жытняй мукі, паўпуда пшанічнай мукі ці круп, 10 пудоў бульбы, 10 фунтаў сала, 5 фунтаў масла. Трэба адзначыць, што гэта дало добры плён: мы змаглі запрасіць з Бабруйска кваліфікаваных настаўнікаў.

Нашы мерапрыемствы па адукацыі былі ўхвалены Бабруйскім павятовым камітэтам партыі, павятовым рэўкомам і яго старшынёй П.М.Серабраковым. Набыты намі вопыт быў рэкамендаваны ўсім валасцям павета.

З першых дзён пасля вызвалення трэба было займацца размеркаваннем памешчыцкіх, а таксама царкоўных зямель і лугоў сярод батракоў і беднаты. У нашай воласці было пяць памешчыцкіх маёнткаў: у Осаве, Баранавічах, Шчаткаве, Панюшкавічах і Кісялевічах. Самы буйны з іх — у Кісялевічах (першага разраду). Там мы і вырашылі стварыць саўгас. Каб захаваць маёмасць, былі прызначаны загадчыкі маёнткаў з былых падпольшчыкаў. Ураджай на памешчыцкіх землях быў поўнасцю ўбраны, захаваны і здадзены дзяржаве. Батракам раздалі сельскагаспадарчы інвентар, далі па аднаму каню і карове.

Перад валасной партыйнай арганізацыяй паўстала задача арганізаваць камсамол з ліку перадавой моладзі. Я паставіў гэта пытанне на партыйным сходзе ў канцы ліпеня ці пачатку жніўня 1920 г. Прапанову падтрымалі ўсе камуністы. Настаўніку Гарбацэвіцкай школы члену партыі Юшчанку было даручана правесці работу сярод юнакоў і дзяўчат. Неўзабаве адбыўся агульны сход моладзі, на якім было прапанавана стварыць камсамольскую ячэйку ў Гарбацэвічах. Трэба было бачыць, з якім натхненнем успрынялі юнакі і дзяўчаты гэта паведамленне. Але ў нас не было статута камсамола. Я паехаў у Бабруйск да сакратара павятовага камітэта партыі Пінчука, расказаў пра рашэнне нашай партыйнай арганізацыі, стварэнне камсамольскай ячэйкі, пра тое, якая цудоўная, актыўная ў нас моладзь, як дапамагала яна падпольнай партыйнай арганізацыі ў час польскай акупацыі. Пінчук ухваліў наша рашэнне, даў статут і папрасіў паведаміць, калі адбудзецца арганізацыйны сход моладзі, на які ён абяцаў прыслаць прадстаўніка павятовага камітэта партыі дзеля практычнай дапамогі ў стварэнні камсамольскай ячэйкі.

Мы склікалі агульны сход моладзі, на якім я выступіў з дакладам аб задачах камсамола як бліжэйшага памочніка партыі. Тут жа, на гэтым сходзе, было выбрана кіраўнічае ядро ячэйкі. Яе сакратаром стаў Андрэй Агеевіч Бародзіч.

Гарбацэвіцкаму рэўкому давялося весці сур'ёзную барацьбу з бандытамі, якія ў 1921 г. дзейнічалі ў нашай, а таксама ў Гарадоцкай і Глускай валасцях. Узначальваў банду былы царскі і польскі капітан Караткевіч. У складзе банды былі і кулацкія сынкі з нашай воласці, асабліва шмат з вёскі Баркі, жыхар якой Іван Булгак быў ад'ютантам у яе верхавода. Наш атрад па барацьбе з бандытызмам,



Помнік на магіле І.Сінкаўца і М.Патоцкага.

які ўзначальваў Павел Бародзіч, высачыў Булгака. У перастрэлцы той быў забіты.

Нам стала вядома, што верхавод банды Караткевіч збіраецца адпомсціць Гарбацэвіцкаму рэўкому за смерць свайго ад'ютанта. Былі прыняты меры перасцярогі. І вось на досвітку 11 верасня 1921 г. (я ў той час быў пераведзены старшынёй Бацэвіцкага валаснога выканкома) бандыты (больш за 100 чалавек) зрабілі налёт на Гарбацэвічы. Камуністы і камсамольцы мужна ўступілі ў няроўны бой, забілі варожага завадатара. Страціўшы свайго кіраўніка, бандыты ў паніцы разбеглiся. Пасля гэтага банда распалася.

Цяжкімі былі і нашы страты. У тым баі па-геройску загінулі два камсамольцы, члены рэўкома Ілля Сінкавец і Міша Патоцкі.

З Бацэвіцкага выканкома мяне перавялі ў Бабруйскі павятовы зямельны аддзел загадчыкам пададдзела сельскай гаспадаркі, дзе я працаваў да скасавання паветаў і валасцей. У 1923—1925 гадах працаваў старшынёй судовай зямельнай камісіі. А ў 1926 г. пасля аб'яднання 1-га і 2-га Бабруйскіх раёнаў я арганізаваў у в. Осава малочную арцель на паявых асновах і стаў яе старшынёй. У 1929 г. ў пасёлку Віктараўка, дзе я ў той час жыў, стварыў з беднякоў калгас імя Будзённага і быў абраны яго першым старшынёй. Неўзабаве ў калгас уліліся вёскі Міхалаўшчына і Зарэчча, ён даволі хутка ўмацаваўся і стаў адным з перадавых у Бабруйскім раёне.

У 1931 г. райком партыі накіраваў мяне на вучобу ў двухгадовую вышэйшую рэспубліканскую сельскагаспадарчую школу. Пасля яе заканчэння быў пасланы на арганізацыю калгаса «Новае жыццё» ў в. Баранавічы Осаўскага сельсавета. У 1935 г. пераведзены на пасаду старшыні Осаўскага сельсавета, а ў 1938 г. паводле рашэння Бабруйскага райкома партыі стаў намеснікам дырэктара Цялушскай МТС. У 1939 г. прызначаны загадчыкам Бабруйскага райземаддзела, дзе працаваў да пачатку Вялікай Айчыннай вайны.

З 1941 г. да дэмабілізацыі быў у Чырвонай Арміі — старшым лейтэнантам, камісарам батарэі, прымаў удзел у баях пад Сталінградам, дзе атрымаў кантузію.

Пасля дэмабілізацыі прызначаны дырэктарам Бабруйскага зеленгаса, затым у красавіку 1947 г. накіраваны дырэктарам Бабруйскага плодагадавальніка, які пазней вырас у плодсаўгас. Тут я працаваў да выхаду на пенсію ў 1960 г. За ўкараненне новых сартоў пладовых дрэў, за высокія ўраджаі гародніны і збажыны тройчы быў удзельнікам ВДНГ у Маскве, узнагароджаны сярэбраным і двума бронзавымі медалямі.

Усё, што мне даручалі, я рабіў шчыра, сумленна і з вялікай адказнасцю, бо свята верыў у новае жыццё. Я хацеў вам шчасця, дарагія землякі.

Уся ўлада Саветам!

Пасля выгнання нямецкіх акупантаў уся паўната дзяржаўнай улады ў павеце перайшла да Бабруйскага рэвалюцыйнага камітэта. Ва ўсіх валасцях таксама дзейнічалі рэўкомы. Як органы надзвычайнай улады яны праводзілі вялікую работу па ўсталяванні і ўмацаванні савецкай улады на месцах. Настаў час ствараць пастаянныя органы дзяржаўнай улады — Саветы.

Выбары павінны былі праводзіцца ў адпаведнасці з рашэннямі VI з'езда Саветаў аб перавыбарах Саветаў і іх зліцці з камітэтамі беднаты. Яны супадалі з падрыхтоўкай да І Усебеларускага з'езда Саветаў. Выбары былі закліканы ўмацаваць законную ўладу, ачысціць савецкія органы ад непрыхільных элементаў.

Бабруйскі партыйны камітэт і рэўком паўсядзённа займаліся падрыхтоўкай да першых выбараў. На пасяджэнні 10 студзеня 1919 г. рэўком абмеркаваў парадак і тэрмін іх правядзення, стварыў выбарчую камісію. Справа была новая, таму для азнаямлення з працэдурай выбараў у Мінск паслалі прадстаўнікоў рэўкома. Для кіраўніцтва выбарчай кампаніяй партыйны камітэт і рэўком накіравалі ў вёскі сваіх упаўнаважаных.

На падставе ўказанняў цэнтра была распрацавана спецыяльныя «Інструкцыя аб выбарах у сельскія і валасныя Саветы», якую зацвердзіў старшыня павятовага рэўкома П.Ф.Равінскі. Яна, як афіцыйны выбарчы дакумент, была размножана і разаслана ў валасныя рэўкомы. У інструкцыі адзначалася, што правам выбіраць і быць выбранымі карыстаюцца грамадзяне РСФСР абодвух палоў, незалежна ад іх веравызнання, нацыянальнасці, якім да дня выбараў споўнілася 18 год. Пазбаўляліся выбарчых правоў асобы, якія карысталіся наёмнай працай, жылі на непрацоўныя даходы, пазбаўленыя правоў па судзе, а таксама служыцелі рэлігійных культаў, былыя служачыя паліцыі, асобага корпуса жандараў, ахоўных аддзяленняў і інш.

Парадак выбараў быў наступны. На вясковых сходах на кожныя 100 чалавек насель-

ніцтва выбіраўся адзін прадстаўнік у сельскі Савет. Гэты Савет са свайго саставу выбіраў прэзідыум з трох чалавек. На кожныя 10 прадстаўнікоў у сельскім Савеце выбіраўся адзін прадстаўнік у валасны Савет. Перад выбарамі на сходах намячаліся кандыдаты ў Саветы з ліку надзейных людзей, адкрытым галасаваннем ствараліся выбарчыя камісіі з трох чалавек. Выбары праводзіліся тайным галасаваннем. Кожны выбаршчык атрымліваў квіток з пячаткай выбарчай камісіі і на ім пісаў прозвішчы кандыдатаў, якіх ён згодны мець прадстаўнікамі ў Савеце ў колькасці, устаноўленай нормай прадстаўніцтва. Па выніках выбараў складаўся пратакол у двух экземплярах і неадкладна адпраўляўся ў валасны і павятовы рэўкомы для зацвярджэння, а рэўком склікаў усіх прадстаўнікоў, выбраных у валасны Савет, на валасны з'езд Саветаў.

Выбарчая кампанія пачалася ў пачатку 1919 г. 14—15 студзеня прайшлі валасныя сходы, на якіх былі створаны выбарчыя камісіі, вылучаны кандыдаты ў Саветы. Адначасова праводзіліся і выбары прадстаўнікоў у Саветы. На 2 лютага 1919 г. былі прызначаны з'езды Саветаў у большасці валасцей. На іх прысутнічалі па аднаму дэлегату ад кожнага вясковага Савета. На працягу 2—9 лютага з'езды Саветаў прайшлі ва ўсіх 22 валасцях павета. З дакладамі на іх выступілі прадстаўнікі павятовага партыйнага камітэта і рэўкома.

На валасных з'ездах выбралі дэлегатаў на павятовы з'езд Саветаў, які адбыўся 16 лютага 1919 г. Напярэдадні было прынята рашэнне выпусціць адозву да сялян, зацверджана мандатная камісія ў саставе Малаковіча, Ляўкова і Вілюгі.

Павятовы з'езд Саветаў абмеркаваў пытанні аб бягучым моманце, харчовае і зямельнае. Затым адбыліся выбары павятовага выканаўчага камітэта Бабруйскага Савета рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў. Дэлегаты аднадушна выбралі ў састаў выканкома 20 камуністаў. Сярод іх былі вядомыя на Бабруйшчыне бальшавікі: Равінскі, Сімончык, Гарнастай і іншыя. Старшынёй выканкома стаў П.Ф.Равінскі.

Такім чынам, першы састаў Бабруйскага выканкома пачаў дзейнічаць 16 лютага 1919 г. 20 лютага 1919 г. на яго пасяджэнні былі прыняты пастановы аб скасаванні павятовага рэўкома і перадачы ўлады Бабруйскаму выканкому, аб зацвярджэнні загадчыкаў аддзелаў і парадку перадачы спраў.

У далейшым павятовыя з'езды Саветаў склікаліся рэгулярна. Трэба сказаць, што ў Канстытуцыі БССР, прынятай I Усебеларускім з'ездам Саветаў, нічога не было сказана аб функцыях мясцовых Саветаў, іх правах і абавязках. У практычнай рабоце такія Саветы кіраваліся заканадаўствам РСФСР. Раз у тры месяцы ў губернях і паветах і штомесяц у валасцях склікаліся з'езды Саветаў. На сваёй тэрыторыі яны былі вышэйшай дзяржаўнай уладай. У перыяд паміж з'ездамі такой уладай з'яўляўся выканком.

Першыя выбары на Бабруйшчыне прайшлі арганізавана, пры высокай актыўнасці насельніцтва. Гэта было свята працоўнага народа горада і вёскі, які ўсямерна падтрымліваў савецкую ўладу, не шкадаваў сіл для яе ўмацавання. Аб гэтым сведчаць архіўныя дакументы.

Так, напрыклад, у лютым 1919 г. ў Бабруйску знаходзіўся літаратурна-інструктарскі поезд імя У.І.Леніна. Яго інструктар Ю.Рыжкоў дасканала знаёміўся з арганізацыяй савецкай улады ў горадзе і павеце. У сваім дакладзе ён пісаў: «Кідаецца ў вочы вельмі радасная з'ява — арганічная сувязь Бабруйскай савецкай улады з мясцовым гарадскім пралетарыятам і паўпралетарыятам вёскі. Трэба адзначыць, што такая з'ява мной за ўвесь час паездкі рэдка дзе назіралася».

В.Маслаў, Т.Манёнак.

Дзеці садзіліся за парты

У фондах Магілёўскага губернскага аддзела народнай адукацыі захаваліся матэрыялы школ Бабруйскага павета першых год савецкай улады. Якой жа была школа таго часу?

З 1 кастрычніка 1918 г. сярэднія навучальныя ўстановы павета, як і ўсёй губерні, перайшлі ў падпарадкаванне Народнага камісарыята па асвеце. Яны называліся «Адзіная працоўная школа» і падзяляліся на дзве ступені: першая — для дзяцей ад 8 да 13 гадоў (пяцігадовы курс) і другая — ад 13 да 17 гадоў (чатырохгадовы курс).

Асновай школьнага жыцця была прадукцыйная праца, арганічна звязаная з навучаннем. Педагогі стараліся, каб праца была творчай, свабоднай ад насілля над вучнямі, мела сацыяльны характар. Пры гэтым фізічнай і эстэтычнай адукацыі адводзілася значнае месца.

Школы працавалі цэлымі тыднямі. Два дні (але не запар) выдзяляліся з агульнай

колькасці вучэбных дзён. Адзін з іх быў зусім свабодны ад заняткаў і выкарыстоўваўся для чытання, экскурсій, спектакляў і іншых самастойных карысных спраў. Другі дзень лічыўся паўрабочым. Адводзіўся ён для клубных і лабараторных заняткаў, вучнёўскіх сходаў, напісання рэфератаў. Работы і заданні вучням на дом, як і школьныя пакаранні, адсутнічалі. Паўсюдна ў школах былі бясплатныя гарачыя снеданні, дзеці знаходзіліся пад рэгулярным наглядам урача.

Органам самакіравання служыў савет, у які ўваходзілі прадстаўнікі школы, грамадскасці і работнікі аддзела народнай адукацыі.

Заслугоўвае ўвагі арганізацыя святаў у школах. 1 Мая і дзень заканчэння навучальнага года надоўга заставаўся ў памяці. Чэрвеньскія дні надта радавалі дзятву. У госці да вучняў прыходзілі родныя, блізкія, прадстаўнікі савецкіх органаў. Усім было весела і цікава: дзеці чыталі вершы, пелі, танцавалі, наладжвалі гульні...

У тыя гады (паводле пратаколаў, справаздач і іншых дакументаў) амаль не было выпадкаў парушэння вучнямі працоўнай і вучнёўскай дысцыпліны і ўнутранага распарадку. Мабыць, не заставалася часу для кепскіх спраў і ўчынкаў. Дзеці былі заняты ўвесь дзень, і ўсё гэта ім прыносіла радасць.

Настаўнікі Бабруйскага павета, як сведчаць справаздачы, усімі сродкамі стараліся выхоўваць дзяцей ўдумлівымі, свядомымі, жыццярадаснымі. Навучэнцам прывіваліся пачуцці патрыятызму, інтэрнацыянальнай салідарнасці, выхоўваліся высокія эстэтычныя якасці і любоў да культурнай спадчыны.

В.Ігнацьеў.

Панюшкавіцкія камунары

Раніцай 28 лістапада 1918 г. бабруйчане горача віталі чырвонаармейцаў 153-га палка 3-й брыгады 17-й стралковай дывізіі, якія першымі ўвайшлі ў горад, пакінуты германцамі. 4 снежня было аб'яўлена аб аднаўленні савецкай улады ў Бабруйску. Органы ўлады звярнуліся да бяднейшага сялянства з заклікам аб'ядноўвацца ў камуны і арцелі, якія, на іх погляд, маглі стаць ядром сацыялізму ў земляробстве, школай узорнай арганізацыі сельскай гаспадаркі. Заклікі па-рознаму ўспрымаліся вяскоўцамі. Аднак, з'яднаныя агульным горам і агульнаю нястачаю, яны ўсё больш схіляліся да думкі, што пераадолець іх

Мемарыяльная дошка камунарам у вёсцы Сычкава.

можна толькі разам. Тым больш што савецкая ўлада абяцала арцельшчыкам падтрымку.

Вось так і рашылі працаваць разам маладыя сяляне з Сычкава і Ціўнавічаў Гарбацэвіцкай воласці. Для ажыццяўлення задуманага абралі былы панскі маёнтак у Панюшкавічах. Не без сумненняў вечарамі прыкідвалі магчымасці, спрачаліся і пераконвалі адзін аднаго. А 25 лютага 1919 г. Марк і Міхаіл Шавелі, Павел і Іван Гудзеі, Фёдар, Аляксандр і Міхаіл Пінчукі, Ігнат Хрушчынскі, Пётр Прыбыльскі, Марк Крысцінін і Пракоп Салановіч сабраліся разам, каб замацаваць свае намеры арганізацыйна. На той момант якраз паступіла і адпаведная інструкцыя павятовага зямельнага аддзела. Грунтоўна абмеркаваўшы гэту інструкцыю, аднагалосна абралі ўпаўнаважаных — Марка Шавеля, Фёдара і Аляксандра Пінчукоў, якім даручылі арганізацыйную работу па стварэнні камуны. Подпісы пад дакументам паставілі ўсе ўдзельнікі першага сходу. За непісьменнага Пракопа Салановіча распісаўся Марк Шавель.

Чым жа тлумачылася імкненне вяскоўцаў працаваць калектыўна? Бясспрэчна, надзеяй на лепшую долю. Усе яны былі бяднейшымі хлебаробамі. Нямногія маглі здабыць сродкі для існавання іншым рамяством. Іван Гудзей быў шаўцом, Аляксандр Пінчук — цесляром, Марк Крысцінін — кавалём. Астатнія — хлебаробы.

Прывабнымі для іх былі прынцыпы, абвешчаныя Дэкрэтам аб зямлі. Ён даваў права апрацоўваць у таварыстве адчужаную бязвыплатна ўласнаўладальніцкую зямлю, размяркоўваць яе па працоўнай або спажывец-

кай норме, разлічваць на дзяржаўнае забеспячэнне і пенсію.

Не варта скідваць з рахунку і прагу да новага, неўтаймоўную энергію, бо першыя камунары — гэта пераважна маладыя людзі, халасцякі. Сем'і мелі толькі трыццацівасьмігадовы Міхаіл Шавель і дваццацівасьмігадовы Марк Крысцінін.

Прыкладна праз месяц камунары выбралі Савет камуны: старшыню Марка Шавеля і членаў Аляксандра Пінчука і Лаўрэна Агінскага. На гэтым сходзе ў камуну прымалі і навічкоў. Акрамя Лаўрэна Агінскага, які быў выбраны адразу і ў Савет, камунарам стаў Лаўрэн Бізун з сям'ёй з 5 чалавек. Пазней былі прыняты Міхаіл Рудзяк-Курмаз і Агей Мельнік з Сычкава, Барыс Гудзей і Фёдар Курмаз з Ціўнавічаў.

Першыя дакументы камуны — гэта просьбы аб дапамозе ў забеспячэнні насеннем, інвентаром, прыладамі. Яны змацоўваліся пячаткай «сельскагаспадарчай прадукцыйнай камуны». А дапамога маладой гаспадарцы сапраўды была вельмі патрэбна. Абагуліўшы свой скарб, камунары мелі ўсяго 5 коней, 6 кароў, 6 павозак, некалькі плугоў і барон. На вялікую прадукцыйнасць працы разлічваць было цяжка. Улада перадала камуне з уласнасці памешчыка Мысліцкага 120 дзесяцін ворнай зямлі, 100 дзесяцін лесу, 95 дзесяцін лугоў. Маёнтак Панюшкавічы з усімі пабудовамі, нерухомым інвентаром, запасам фуражу і збожжа пад ахову і распараджэнне прыняў Фёдар Пінчук, упаўнаважаны на гэта Саветам камуны.

Камунары рыхтаваліся да сваёй першай сяўбы і прымалі шмат пастаноў, рэзалюцый па гаспадарчых пытаннях. Толькі амаль усе яны заканчваліся гучнымі лозунгамі і прывітаннямі правадыру рэвалюцыі.

Але ўстрымаемся ад асуджэння панюшкавіцкіх камунараў. Так, ім не хапала пісьменнасці. У многім яны былі наіўныя. Але яны шчыра верылі ў справядлівасць сваёй справы. І былі верныя ёй. Не паспеўшы паспытаць каравая са свайго першага ўраджаю, камунары пайшлі абараняць рэспубліку. Старшыня Панюшкавіцкай камуны Марк Шавель не вярнуўся з грамадзянскай вайны. *А.Казак.*

Першы саўгас

Да цэнтра саўгаса імя Леніна не больш чым паўгадзіны язды на рэйсавым аўтобусе, які некалькі разоў у дзень адпраўляецца з Бабруйска. Як і ўсякая прамая асфальтавая стужка, дарога гэта карацейшая, чым той блукасты шлях, якім карысталіся сяляне навакольных вёсак да рэвалюцыі. Нязмерна доўгімі былі 22 вярсты з маёнтка Дурынічы да горада на Бярэзіне для вяскоўцаў, якія ішлі па соль, цукар, запалкі, атрымаўшы рубель-другі за работу ў пана. Ішлі і баяліся ступіць на каляіну калымажкі графа Забелы.

Сёння працаўнікі саўгаса імя Леніна ганарацца тым, што адной з першых савецкіх гаспадарак на Бабруйшчыне была іхняя. Сапраўды, з 15 студзеня па 15 сакавіка 1919 г. Бабруйскім павятовым упраўленнем нацыяналізацыі маёнткаў у Свіслацкай воласці быў прыняты сярод іншых і маёнтак Дурынічы з фальваркамі Рыдлё і Сафіеўка. Упраўляючым народнага маёнтка 24 студзеня стаў К.С.Плаўскі, «без адукацыі і стажу», як запісана ў архіўным дакументе.

Вось так былы панскі маёнтак стаў народным. А 3 ліпеня 1919 г. ў Бабруйску адбылася нарада павятовых упраўляючых такіх маёнткаў, на якой адзначалася, што «... да 15 сакавіка было прынята 63 маёнткі першай катэгорыі і 51 — другой. У павеце было 17 461 дзесяціна зямлі і 1833 кані. На аднаго каня прыпадала 21 дзесяціна. Было 3 трактары. Адзін трактар узараў 40 дзесяцін папарнага палетку. Было 24 млыны, з якіх 13 — паравыя...»

З такой спадчыны пачынала сваё жыццё сучасная высокаразвітая сельская гаспадарка Бабруйскага раёна. Былі і цяжкасці ў дзейнасці першых рабочых саўгаса імя Леніна. Хоць у той час у Дурынічах і працавалі паравы млын, крухмальны завод, было 20 жылых дамоў, 17 жывёльных двароў, 9 леднікоў, кузні і інш., але не хапала насення, фуражу і, зразумела, тэхнікі. У 1919 г. ў Дурынічах было пасеяна толькі 29 дзесяцін азімага жыта, 8 ячменю, 18 — аўса, 18 — бульбы, 9 — вікі і 9 дзесяцін гароху. Небагатай была і жывёлагадоўля: усяго 53 каровы, 2 быкі, 18 цялят, 8 свіней, 5 парасят, 23 рабочыя коні, 3 жарэбчыкі і 16 птушак.

У так званым мёртвым інвентары лічыліся 14 плугоў, 16 барон, 3 сеялкі, 2 сенакасілкі, 1 жняярка, 2 снопавязалкі, 1 малатарня, 2 лакамабілі, двое конных грабель.

На 576 дзесяцінах пачаў сваю дзейнасць саўгас. Крыху больш за 40 чалавек працавала летам 1919 г. на землях савецкага народнага маёнтка, новая назва якога — саўгас — не адразу прыжылася. Ад старога часу засталіся

таксама і назвы пасад. У ведамасці на выплату заработнай платы ў маі 1919 г. чытаем: «Бышко Аляксандр — прыказчык, Лаўрык Мартын — эканом, Літовін Яўграф — канторшчык...» Людзі працавалі таксама «пры садоўніку, пры жывёле, пры малатарні, па абсемяненні агародаў». Атрымлівалі па 300—400 рублёў, а ў графе, дзе трэба распісацца, часта значылася: «Трыста рублёў атрымала спаўна, а з-за непісьменнасці па просьбе маёй распісаліся...» Аб заробках можна меркаваць таксама па дакументах таго часу: гусь каштаваў 15 рублёў, пуд агуркоў — 20, пуд бульбы — 6, а фунт масла — 20 рублёў.

І ўсё ж былыя батракі працавалі добра. Ды і нельга было інакш — працавалі ж на сябе. Неўзабаве пасля стварэння саўгаса павятовае ўпраўленне нацыяналізацыі маёнткаў назвала дурыніцкую гаспадарку ўзорнай малочнай гаспадаркай з племянной жывёлай. Шмат сіл уклалі ў гэты поспех упраўляючы Канстанцін Плаўскі, старшыня батрацкага камітэта і яго члены Антон Бурачэўскі, Іван Лук'янаў, Барыс Дубінчык і многія іншыя працаўнікі...

— У 1924 г. Ленін памёр... Ох і плакалі ж мы. Толькі жыццё пачало наладжвацца... Баяліся, што зноў пан вернецца, — выціраючы слёзы, прыгадвае маладыя гады ветэран саўгаса Аляксандра Нічыпараўна Забенька. — Тады камсамольцы першымі прапанавалі назваць саўгас імем Леніна, — Аляксандра Нічыпараўна зноў падносіць хусцінку да вачэй. — А якія гэта былі хлопцы і дзяўчаты: Іван Машко, Аляксандра Фіцук, Наталля Машко! Мой брат Іван таксама быў камсамольцам. У 1925 г. яго кулакі забілі...

Сведкаў цяжкіх і гераічных даваенных часоў у саўгасе, бадай, не засталося. Не ўсё помніла і А.Н.Забенька — старэйшая з рабочых гаспадаркі. Але даведаліся мы з яе расказу, як працавала яна, чатырнаццацігадовая дзяўчына, у полі, палола, вязала снапы; як вялікае дзіва сустрэлі ў 1926 г. першы трактар у саўгасе; як радаваліся багатым ураджаям...

Не так хутка, як хацелася, але адрадзілася гаспадарка пасля Вялікай Айчыннай вайны. Дзякуючы магутнай волі, працоўнаму энтузіязму людзей, якія з поўным правам называлі сябе ленінцамі, саўгас імя Леніна набіраў моцы.

А.Казак.

М.І.Калінін у Гарбацэвічах

Усерасійскі староста наведаў Бабруйшчыну ў час другога рэйса агітпоезда «Кастрычніцкая рэвалюцыя» на Заходні фронт. Гэты рэйс працягваўся з 6 па 26 чэрвеня 1919 г. На Бабруйшчыне агітпоезд знаходзіўся 18 і 19 чэрвеня.

Вельмі цёпла сустрэлі яго працоўныя горада Бабруйска і Гарбацэвіцкай воласці. Бабруйскі камітэт партыі напярэдадні выдаў спецыяльную адозву. Яна пачыналася словамі: «Таварышы сяляне! На гэтым тыдні чакае нас вялікая радасць. У чацвер, 19 чэрвеня, праездам спыніцца ў нас у горадзе Старшыня Усерасійскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта тав. Калінін...»

На мітынгу ў Бабруйску 19 чэрвеня М.І.Калінін так ахарактарызаваў становішча таго часу: «Гэты фронт... заўтра можа мець велізарнае значэнне, і калі мы зараз, у дадзены момант, не дадзім жорсткага ўдару зарваўшымся польскім бандытам, то гэты фронт нам можа нарабіць шмат і шмат непрыемнасцей. Калі мы супраць яго не прымем своечасова меры, то пасля некалькіх тыдняў і месяцаў на ліквідацыю гэтага фронту спатрэбяцца не дзесяткі, а сотні, можа быць, і тысячы ахвяр... Таму цалкам натуральнае тое значэнне, якое мы надаём Заходняму фронту ў барацьбе, што зараз разгортваецца».

На сустрэчы з сялянамі Гарбацэвіцкай воласці М.І.Калінін шмат увагі ўдзяліў сялянскаму пытанню і адозве Бабруйскага камітэта Камуністычнай партыі.

На сходку, каб сустрэцца з прадстаўніком новай народнай улады, сышліся і старыя, і малыя з усіх вёсак воласці. Сяляне сабраліся ля валаснога выканкома. У той час яны жылі бедна, не ўсе мелі коней ці кароў, самае неабходнае хоць для якой гаспадаркі. Таму вяскоўцы ўважліва слухалі ўсерасійскага старасту, як яго з павагай тады называлі.

М.І.Калінін проста і шчыра расказаў аб становішчы на франтах, аб першых поспехах у мірным будаўніцтве, аб адносінах савецкай улады да сялян. Сваё выступленне ў Гарбацэвічах Міхаіл Іванавіч закончыў выказваннем веры ў перамогу народнай справы, у тое, што «царства сацыялізму безумоўна будзе ўмацавана і наша пакаленне ўжо будзе карыстацца ўсімі выгодамі сацыялізму».

А.Гарэлік.

Дакументы сведчаць...

З ДАНЯСЕННЯ КАМАНДЗІРА 2-й БРЫГАДЫ 17-й СТРАЛКОВАЙ ДЫВІЗІІ ВАСІЛЬЕВА Ў ШТАБЫ ЗАХОДНЯЙ АРМІІ І ДЫВІЗІІ АБ УСТУПЛЕННІ ЧАСЦЕЙ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ Ў г. БАБРУЙСК

№ 925, стн. Жлобін

29 лістапада 1918 г.

Вчера, 28 ноября, в 3 час. я прибыл с Советом и штабом бригады в г. Бобруйск. В 13 час. 30 мин. прибыл первый эшелон 153-го полка. С разъездов были подтянуты остальные части полка и батареи. В это же время двигалась по шоссе Могилев—Бобруйск 9-я рота 153-го полка, стоящего в дер. Белановке. Встреча гражданами Бобруйска красноармейцев была самая восторженная... В 22 час. были получены сведения, что немцы в числе около 50 человек в 30 вер. от Бобруйска забрались в деревню около сти. Ясень, где начали реквизицию продовольствия и скота. Крестьяне обратились за помощью, выслана рота, к ней выехал командир полка Розе для недопущения грабежа и улаживания инцидента мирным путем...

Комбриг *Васильев*

Член совета *Морозов*

Борьба за советскую власть в Белоруссии, 1918—1920 гг.: Сб. документов и материалов. Мн., 1968. Т. 1. С. 331.

З ДАКЛАДА ВАЕНКОМА 17-й СТРАЛКОВАЙ ДЫВІЗІІ А.Я.РЭДАРА Ў ПАЛІТАДДЗЕЛ ЗАХОДНЯЙ АРМІІ АБ АГІТАЦЫЙНА-ПАЛІТЫЧНАЙ РАБОЦЕ Ў ДЫВІЗІІ І СЯРОД НАСЕЛЬНІЦТВА

30 лістапада 1918 г.

3-я бригада, г. Жлобин

Население встречает советские войска с большим востогом. В окрестностях Бобруйска созданы комбеды и устроен ряд митингов, сопровождающихся бурными аплодисментами. Повсюду и везде беднота говорит, что не допустит задушить Октябрьскую революцию. Молодежь требует, чтобы их призывали в Красную Армию и отправляли против англо-французов для окончательного подавления буржуазных банд. Настроение красноармейцев 3-й бригады бодрое. Нет теплого обмундирования, литературы. Газеты получают несвоевременно ввиду того, что части все время в движении. Коммунистические ячейки организуются. Население встречает всюду войска с большим энтузиазмом, но еще чувствуется боязнь, внушенная уходившей буржуазией. Всеобщее обучение до создания военных комиссариатов не предвидится. В имении Ясная организован сейчас, после занятия нами, батрацкий комитет, и имущество взято на учет...

Военный комиссар 17-й стрелковой дивизии *Редер.*

Борьба за Советскую власть в Белоруссии, 1918—1920 гг.: Сб. документов и материалов. Мн., 1968. Т. 1. С. 333—335.

З ДАКЛАДА ВАЕНКОМА 3-й БРЫГАДЫ 17-й СТРАЛКОВАЙ ДЫВІЗІІ А. САЗОНАВА Ў ПАЛІТАДДЗЕЛ ДЫВІЗІІ АБ АГІТАЦЫЙНА-ПАЛІТЫЧНАЙ РАБОЦЕ СЯРОД НАСЕЛЬНІЦТВА БАБРУЙСКАГА ПАВЕТА

№ 109, стн. Жлобін

2 снежня 1918 г.

...Сеть коммунистических ячеек покрывает Бобруйский у., комитеты бедноты избираются населением охотно. Так, например, мною был устроен ряд митингов в Турковской вол. Бобруйского у., причем избран батрацкий комитет имения Ямино, таковое взято на учет, а также комитет бедноты в дер. Ступени. Жители просят литературу, в которой чувствуется недостаток, и на митингах засыпают рядом вопросов...

Военный комиссар *Сазонов.*

Борьба за Советскую власть в Белоруссии, 1918—1920 гг.: Сб. документов и материалов. Мн., 1968. Т. 1. С. 343—346.

СА ЗВОДКІ ПАЛІТАДДЗЕЛА ЗАХОДНЯЙ АРМІІ АБ АРГАНІЗАЦЫЙНАЙ І КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКАЙ РАБОЦЕ Ў ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ЧАСЦЯХ І СЯРОД НАСЕЛЬНІЦТВА БАБРУЙСКАГА І ДЗІСНЕНСКАГА ПАВЕТАЎ

6 снежня 1918 г.

... 25 ноября по прибытии эшелонов и штаба 3-й бригады на стн. Жлобин совместно с Бобруйским Военным Советом был устроен митинг красноармейцев 151-го, 153-го полков и 7-й батареи на тему «Красная Армия и Советская власть», а также текущего момента. На митинге присутствовало много жителей, слова каждого оратора покрывались бурными аплодисментами. Сеть коммунистических ячеек покрывает Бобруйский у. Населением охотно избираются комитеты бедноты...

Завполитотдел *Ахманов*.
Завинформполитотдел *Виноградов*.

Борьба за Советскую власть в Белоруссии, 1918—1920 гг.: Сб. документов и материалов. Мн., 1968. Т. 1. С. 355—357.

З ПРАТАКОЛА ІІ КАНФЕРЭНЦЫІ РКП(б) БАБРУЙСКАГА ПАДРАЁНА

22 снежня 1918 г.

... Доклад о деятельности подрайонного комитета. Тов. Серебряков докладывает о работе подпольной организации, ведшейся со времени 1-й подпольной конференции. За это время партия подготовила уже почву для того момента, когда пролетариату и беднейшему крестьянству с революцией в Германии пришлось бы выйти на свет.

К отходу немцев, в конце ноября, партия уже успела организовать 13 волостных ревкомов. Большая работа была проведена и в профсоюзах, где мы получили значительное большинство в ЦБПС. С уходом немецких войск партия должна была все лучшее, все силы отдать для работы революционного комитета. Деятельность комитета проходит с этого времени совместно с организациями ревкома.

Доклад т. Серебрякова принимается без прений.

Заслушаны доклады представителей 17 волостных организаций, из которых видно, что везде работа начинает налаживаться. Во многих местах готовятся к открытию клубы. Чувствуется большой недостаток в агитаторских силах, литературе и газетах...

Председатель *Ревинский*.
Секретарь *Наймон*.

Борьба за Советскую власть в Белоруссии, 1918—1920 гг.: Сб. документов и материалов. Мн., 1968. Т. 1. С. 404—407.

Першынец прамысловасці раёна

Гучная назва Глушанскага шклозавода — «Камінтэрн» — з'явілася пасля вызвалення Бабруйшчыны ад белапалякаў. А сам завод пачаў дзейнічаць яшчэ да рэвалюцыі. Дазвол на яго пабудову ў сваім маёнтку Глуша падпалкоўнік С.М.Грыцэнка атрымаў 19 лістапада 1896 г. Прадпрымальніцкі разлік быў просты і дакладны: ва ўмовах увядзення дзяржаўнай манаполіі на вытворчасць гарэлкі звычайная бутэлька абяцала неблагі прыбытак. Тым больш што наўкол маёнтка хапала і лесу для паліва, і пяску для варкі шкла. І ў канцы таго ж года з адзінай невялікай печы яно пайшло вогненным патокам, ператвараючыся ў хадавыя «соткі», «дваццаткі», «саракоўкі».

З цягам часу мяняліся ўладальнікі завода, развівалася і ўдасканальвалася вытворчасць. У 1908 г. Глушанскі завод выпускаў ужо не толькі бутэлькі, а і аконнае, лямпавае шкло. Працаваў даволі ўстойліва, пакуль не пачалася імперыялістычная вайна. Па мабілізацыі ў армію пайшлі дзесяткі кадравых рабочых. Сярод іх І.І.Іваноўскі, А.І.Вайцяховіч, В.Р.Пагоцкі, С.І.Амер, Н.С.Трухановіч, П.А.Альшэўскі, П.Шэйбак, В.І.Сандак і іншыя.

Гаспадары завода ў пагоні за прыбыткам не звярталі ўвагі на ўмовы працы і жыцця рабочых. Цяжкая, шкодная работа працягвалася больш за 12 гадзін у суткі. Зарплата была невялікая. Жылі рабочыя ў пяці бараках з гарбылю, сцены якіх былі засыпаны пілавіннем. На дапаможных участках вытворчасці

шырока выкарыстоўвалася праца 12—14-гадовых падлеткаў.

Доўга так не магло працягвацца. Тым больш што рэвалюцыйныя ідэі ўжо «блукалі» ў рабочым асяроддзі. Іх распаўсюджвалі патомны шкловыдзімальшчык Вацлаў Расахоцкі і яго малады памочнік Пятро Ключнік. 1 мая 1917 г. на плошчы ў пасёлку ўпершыню легальна адбыўся мітынг, у якім удзельнічалі рабочыя, мясцовыя жыхары, салдаты этапнай роты. З прамовамі выступалі В.Расахоцкі, А.Сандак, вайскоўцы. Усе патрабаванні зводзіліся да паляпшэння ўмоў працы і жыцця. У кастрычніку таго ж года глушанцы з чырвонымі сцягамі ў руках віталі звяржэнне Часовага ўрада. А хутка заводскім рабочым зноў давялося збірацца на фронт. Добраахвотнікамі пайшлі ў Чырвоную Армію Рыгор Анціхановіч, Павел Сандак, Аляксандр Тацяржыцкі і інш.

І вось — нэп, трэба было гаспадарыць самім. З чаго пачаць? Не хапала сыравіны, не было на чым дастаўляць паліва. Многія не вярнуліся з вайны, іншыя прыйшлі інвалідамі. Давялося звяртацца да былых спецаў. У 1920 г. дырэктарам завода прызначылі сына былога яго гаспадара. А ў 1923 г. Белсаўнаргас прыслаў на прадпрыемства свайго ўпаўнаважанага.

Нямала сіл давялося прыкласці, каб не дапусціць спынення завода. Некалькі месяцаў уручную нарыхтоўвалі дровы вакол Глушы, на тачках і павозках звозілі іх да газагенератараў, не даючы патухнуць агню ў плавільнай печы. З чыгуначнай станцыі Бярэзіна як маглі дастаўлялі сыравіну. І прадпрыемства дзейнічала, выпускала прадукцыю.

У 1924 г. змантіравалі першы лакамабіль, які даў электрычнасць вытворчасці і пасёлку. Здадзена ў эксплуатацыю помпавая станцыя. Галоўнай праблемай заставалася паліва, бо за гады работы завода лясы ў радыусе 15 кіламетраў ад Глушы былі высечаны. Таму тэрмінова шукалі магчымасці пераходу на тарфяное паліва. Да завода пракладвалася чыгуначная вузкакалейка ад торфапрадпрыемства «Чырвоная зорка», за 18 кіламетраў ад пасёлка.

Рабілася многае, але даваеннага ўзроўню вытворчасці яшчэ трэба было дасягнуць. Тым не менш прадукцыйнасць працы расла, расла і зарплата: у 1926 г. яна складала 44 рублі ў месяц. Спрыяла таму ўпершыню праведзеная рэканструкцыя завода. У выніку тут была ўстаноўлена новая печ замежнай вытворчасці, узведзены новы драўляны будынак прадпрыемства, з'явіўся артэзіянскі калодзеж. Для людзей здадзены дом на шэсць кватэр, пушчаны ў эксплуатацыю водаправод.

У 1927 г. завод «Камінтэрн» набыў першую аўтамашыну-паўтаратонку. Увогуле яго тэхнічная аснашчанасць істотна палепшылася. Калектыў працаваў зладжана, з энтузіязмам. Усе імкнуліся забяспечыць выкананне першага пяцігадовага плана. Было шырока разгорнута сацыялістычнае спаборніцтва: сапернічалі змена са зменай, вярстак з верстаком. З'явіліся свае перадавікі — У.В.Зінкевіч, В.М.Бабкоў, іншыя майстры шкляной справы.

У 1933 г. камінтэрнаўцы выпусцілі валавой прадукцыі на 928 тысяч рублёў, кошт асноўных фондаў склаў каля паўмільёна рублёў. На заводзе працавала ўжо 400 чалавек, 340 з іх былі рабочыя. У канцы другой пяцігодкі на прадпрыемстве нарадзіўся стахановскі рух, які вельмі спрыяў датэрміноваму выкананню яе заданняў. Аб'ём і асартымент прадукцыі пашыраліся, укаранялася новая тэхніка, калектыў «Камінтэрна» вырас да 600 чалавек. Адбываліся змены да лепшага і ў пасёлку. У другой палове 1930-х гадоў тут адчынілі дзверы школа і бальніца, дзіцячыя яслі і садок, клуб і магазін, былі адбудаваны новыя дамы для завадчан.

Праўда, радасць стваральнай працы і мірнага жыцця нярэдка азмрочвалася наездамі чорнага «варанка»: рэпрэсіі не абмінулі і камінтэрнаўцаў. Але за даваенныя гады старая дарэвалюцыйная гута ў Глушы ператварылася ў тэхнічна аснашчанае на той час прадпрыемства. Вайна спыніла развіццё шклозавода. Яго праз гады чакала новае адраджэнне.

А.Казак.

Лёс зямлі

У 1927 г. на месцы былога маёнтка памешчыка Кільчэўскага і яго ўладанняў сяляне стварылі таварыства па сумеснай апрацоўцы зямлі. Яго першымі членамі сталі сем'і Аўрама Балыкі, Антона Цэдзіка, Аляксея Цэдзіка, Адама Марчыка, Еўдакіма і Паўла Ціханчукоў. Была абагулена жывёла, створана агульная ферма. Малако, якое атрымлівалі на гэтай ферме, а таксама збожжа, бульбу і іншыя прадукты дзялілі пароўну. Кіраўнікоў таварыства мянялі кожны месяц, выбіраючы іх са сваёй суполкі.

Так жылі і працавалі два гады. А ў 1929 г.

на месцы таварыства ўзнік першы ў гэтых мясцінах калгас «Пралетарый». У гаспадарку ўвайшлі сем'і з суседняй вёскі Кавалі — Фёдара Цікавага, Васіля Цэдзіка, Пятра Вадаевіча, Івана Цікавага, Сямёна Цыганкова. Было створана праўленне калгаса, гаспадарка атрымала сваю пячатку. За кожны выхад на работу калгаснік атрымліваў адзін працадзень. Аплата на першым часе была натуральная: на працадні атрымлівалі збожжа, бульбу, малако, мёд.

Цяжка працавалася першым калгаснікам: амаль усё даводзілася рабіць уручную. Ураджаі на малаўгноеных палях збіралі нізкія — ад 6 і не больш як 18 цэнтнераў збожжа з гектара. Асабліва цяжка жылося даяркам. У іх групах было па 16 кароў, якіх кармілі, паілі і даілі ўручную. Акрамя таго, тыя ж даяркі па чарзе даглядалі свіней ды яшчэ дапамагалі ўбіраць ураджай. Людзей у калгасе было мала, і на іх плечы клаўся ўвесь цяжар грамадскай працы. Але яны не адчайваліся, стараліся як маглі.

У перыяд масавай калектывізацыі па вёсках хадзілі агітатары, якіх сяляне вобразна празвалі «чырвонымі сватамі». Яны расказвалі людзям аб калектыўным жыцці, тлумачылі палітыку партыі. І большасць сем'яў у вёсцы Кавалі ўступіла ў калгас, які называлі «Зара рэвалюцыі». З абагуленай жывёлы стварылі ферму, якую ўзначаліла Ганна Макараўна Цэдзік. Першымі калгаснымі даяркамі былі Вольга Сцяпанаўна і Вольга Іванаўна Цэдзік. З'явіўся ў сяле і першы трактар. Але, як і да гэтага, большасць спраў даводзілася рабіць уручную.

Лепшае стала культурнае жыццё вяскоўцаў. З'явіліся хаты-чытальні, ствараліся дзіцячыя яслі, моладзь ішла вучыцца на механізатараў. Сярод першых на трактарыстаў вывучыліся Надзея Капусціна, Міхаіл Капусцін, Даніла Анісімаў. Нялёгкай была іх праца. Але цяжкасці не палохалі першых калгаснікаў. Яны верылі ў перавагі калектыўнай гаспадаркі, не шкадавалі сіл дзеля таго, каб квітнела калектыўнае жыццё. *Л.Бабкова.*

Так пачыналі

Зямлю пасля ленінскага дэкрэта атрымалі ўсе. А беднасць усё роўна заставалася нашым спадарожнікам. Кожны жыў сам сабе, сваёй сям'ёй. Наша сям'я, напрыклад, складалася з 20 чалавек. І, зразумела, разбагацець мы не маглі.

Помню, як аднойчы да нас, сялян, прыехаў камуніст з Бабруйскага павета і на сялянскай сходцы сказаў:

— Трэба вам аб'яднацца ў адну сям'ю, каб і ў горы, і ў радасці быць разам.

Многія беднякі разумелі гэта, але не ўсе: моцнай была тады яшчэ ў сялян жылка аднаасобніка, вера ў тое, што была б свая зямелька, а астатняе будзе. Але камуністы не раз збіралі беднякоў, растлумачвалі перавагі калектыўнай працы. І ў 1929 г. многія сяляне аб'ядналіся ў калгас, які назвалі «Чырвоны партызан № 1». Мы з мужам таксама адны з першых уступілі ў калектыўную гаспадарку. Хацелася даказаць тым, хто вагаўся, што калгас — вялікая і надзейная сіла.

Калектыўная праца хутка дала плён. Людзі падабраліся працавітыя, дружныя. Яны верылі ў правільнасць выбранага шляху і не шкадавалі сіл. Не палохалі нас і кулакі, якія сваімі пагрозамі, стрэламі з-за вугла імкнуліся супыніць сялян, перашкодзіць іх аб'яднанню ў калгас.

На першым часе нам дапамагла дзяржава: інвентаром, гатунковым насеннем. Часта з Бабруйска прыязджаў аграном, дапамагаў па агратэхніцы. Праз некалькі гадоў калгаснікі далёка абышлі аднаасобнікаў і па ўраджайнасці, і па прадуктыўнасці жывёлы. Вось тады сумненні зніклі нават у самых недаверлівых — у калгас пайшла ўся вёска.

Гаспадарка год ад году расла. З кожнага цяжкага выпрабавання мы выходзілі яшчэ мацнейшымі, адданымі ідэі калектыўнай працы. Менавіта ў калгасе сяляне-бортнікаўцы знайшлі сваё шчасце. Цяпер наша гаспадарка — перадавая ў раёне і па вытворчасці збожжа, і па прадукцыі жывёлагадоўлі.

Акуліна Дайнека, першая калгасніца.

Чырвоны абоз

Жнівень 1934 года. У вясковай школе людна. Ідзе ўрачысты сход калгаснікаў. Стасеўцы адзначаюць сваё традыцыйнае свята сярпа і коласа, дзень заканчэння ўборкі ўраджаю. На сходзе выступае калгасны старшыня Пётр Рыгоравіч Мігуцкі. Ён з захапленнем расказвае аб шчодрай калгаснай ніве, аб высокіх намалотах жыта, пераконвае ў перавагах калектыўнай гаспадаркі. Старшыня віншуе ўсіх з паспяховым заканчэннем уборкі збожжа, называе прозвішчы лепшых калгаснікаў — касцоў і жней. За ўдарную працу пе-

радавікам тут жа, на сходзе, уручаюцца падарункі: адрэзы тканін, хусткі, патэфоны і іншыя каштоўныя рэчы.

На гэтым жа сходзе аднагалосна прымаецца пастанова аб неадкладнай здачы хлеба дзяржаве.

Назаўтра яшчэ на досвітку Мігуцкі разам з калгасным актывам ужо на нагах. Яны рыхтуюць чырвоны абоз. Насыпаюць у мяшкі, адважваюць адборнае зерне, запрагаюць лепшых калгасных коней. Ездавыя ўпрыгожваюць чырвонымі стужкамі дугі, конскія грывы. Упарадзе вывешваюць чырвоны сцяг і плакат з надпісам: «Першы сноп — дзяржаве».

Праводзіць чырвоны абоз з хлебам выйшлі ўсе жыхары Стасеўкі. Тут школьнікі, піянеры і камсамольцы. Грае гармонік, гучаць песні. Вясковы гарманіст Лявон выводзіць старадаўні вальс «Дунайскія хвалі».

Хутка чырвоны абоз рушыў да райцэнтра. Упарадзе — сам калгасны старшыня Пётр Рыгоравіч Мігуцкі. Калі праязджалі вёску Продзвіна, чырвоны абоз сустрэла п'яная чарада хуліганаў, у руках у якіх былі калы і каменне. Чуліся дзікія п'яныя выкрыкі. Стала зразумела, што гэта варожая вылазка была падрыхтавана мясцовымі кулакамі і падкулачнікамі — ворагамі калгаснага ладу. П'яныя бандыты накінуліся на ездавых, пачалі скідаць з вазоў збожжа, распрагаць коней. Старшыня Мігуцкі спрабаваў спыніць бандытаў, але адзін з іх ударыў яго нечым вострым. Твар старшыні заліўся крывёю. Смяротна параненага Пятра Рыгоравіча даставілі ў бальніцу, дзе ён хутка памёр. Злачынцы былі арыштаваны і сурова пакараны.

Прайшло шмат гадоў з часу трагічнай гібелі Пятра Рыгоравіча Мігуцкага, але ветэраны калгаса імя Фрунзе памятаюць свайго старшыню, адданага барацьбіта за новае жыццё. Старажылы ўспамінаюць: Пятро Рыгоравіч быў нетаропкі на слова чалавек, на рэдкасць гаспадарлівы, разважлівы кіраўнік з рабочага асяроддзя, вылучэнец дрэваапрацоўчага камбіната горада Бабруйска. *Я.Кабік.*

Балада пра камсорга

Некалі тут быў маёнтак Дурынічы графа Забелы. Стаяла 8—10 дамоў, з іх два — шыкоўныя, таспадарскія. У хацінах з глінабітнымі падлогамі жылі сяляне, якім толькі Кастрычнік дазволіў распрастаць плечы, адчуць, што і яны могуць «людзьмі звацца». Але на маладую рэспубліку зграяй наляцелі інтэрвенты. У час белапольскай акупацыі ў Дурынічы зноў прыехаў пан Забела. Тут жа ўсыпалі розгаў і шампалоў усім «непакорным» і «незалежным».

Калі Чырвоная Армія выгнала захопнікаў, на месцы маёнтка арганізаваўся саўгас. Была створана і камсамольская ячэйка. Першымі яе членамі сталі Васіль Капылоў, які прыехаў з Масквы, мясцовая дзяўчына, навучэнка Бабруйскай гімназіі Наташа Мошка, яе брат Іван. Ішоў 1922 год. Пачатак быў цяжкім. Вяскоўцы з недаверам аднесліся да камсамольцаў. Але паступова пераканаліся, што гэта добрыя, чулыя падлеткі. Да іх пацягнуліся мясцовыя юнакі і дзяўчаты. Сярод тых, хто ўступіў у камсамол, быў і Іван Забенька.

Праз год ячэйка аб'ядноўвала ўжо 15 членаў (сакратар І.С.Дрозд). Камсамольцы праводзілі агітацыйную работу сярод насельніцтва. У графскім доме абсталявалі клуб, школу, хату-чытальню. Запрасілі настаўніка з Бабруйска. За кнігі селі і малыя, і старыя.

Ваня Забенька жыў у беднай сям'і. Бацька памёр, а ў маці на руках засталося шасцёра дзяцей. З малых гадоў зазнаў Іван і цяжкую працу, і здзекі сваіх гаспадароў. Не да вучобы было, таму з прагнасцю накінуўся на кнігі ў адкрытай школе. Палюбіў творы Купалы, Горкага. Удзельнічаў у пастаноўцы спектакляў. Вясёлы, кемлівы, сумленны хлопец быў душой моладзі. Невыпадкова ў 1924 г. сакратаром камсамольскай арганізацыі выбралі яго. Ён у той час працаваў на лесазаводзе ў нэпманаў, у летнія дні шчыраваў на ўборцы ўраджаю.

Кулакі не маглі спакойна глядзець на калгасы. Яны знішчалі сцірты збожжа, падпальвалі гумны. Але і тут ім перашкаджалі камсамольцы, якія ўзялі народнае дабро пад сваю ахову. Нават у той трывожны час юнакі і дзяўчаты знаходзілі хвіліну, каб адпачыць разам. Сабраўшыся ў якой-небудзь хаце, яны спявалі, чыталі газеты, абмяркоўвалі навіны. Нярэдка на вечарынцы з'яўляліся сынкі кулакоў на падпітку, абражалі камсамольцаў, пагражалі расправай. Рослага і плячыстага Івана Забеньку чапаць не адважваліся.

Вясной 1925 г. было прынята рашэнне аб нацыяналізацыі лясоў. У саўгасе стварылі камісію, у якую ўвайшоў і камсамольскі сакратар Забенька. Самым заможным вяскоўцам трэба было перадаць саўгасу больш за сто гектараў лесу. А лесніком прызначылі Івана. Раніцай 20 мая пайшоў ён на першы свой аб-

ход. Толькі не паспеў завяршыць яго дзевятнаццацігадовы юнак. Рабочыя-паляводы пачулі стрэлы ў бары, але не надалі ім значэння, бо ў той час стрэлы грымелі часта. А ўвечары маці не дачакалася сына. Назаўтра паднялiся на пошукі Івана аднавяскоўцы. Прачасалі ўвесь лес і не знайшлі. Толькі праз тры дні пастух Тараховіч натрапіў на камсорга. Грудзі, бок, плечы Івана былі прастрэлены буйным шротам. Праз яго вісок прайшла куля з паляўнічага ружжа. Але і гэтага было мала ворагам. У шаленстве яны тапталі знявечанае юначае цела нагамі...

На пахаванне Івана Забенькі сабралася шмат камсамольцаў з усяго раёна. Упрадзе працэсіі з чырвоным сцягам крочылі яго сябры. На магіле сакратар раённага камітэта камсамола і іншыя камсамольцы паклялiся працягваць справу свайго таварыша. Пад ружэйны салют, як байца, пахавалі Івана Забеньку ў вёсцы Буда. А праз некалькі месяцаў ад кулацкай рукі загінулі камсамольцы Мікалай Лебедзеў і Пётр Літвінка... Толькі гэта не запалохала моладзь. Дзесяткі юнакоў і дзяўчат з саўгаса імя Леніна звязалі свой лёс з камсамолам. Імя камсорга Івана Забенькі жыве ў справах яго землякоў. *А.Карнееў.*

Важак і запявала

Ішоў 1925 год. Вуліца ў вёсцы Варатынь нагадвала бурлівую раку. Адно за адным сяляне спяшаліся да сельсавета. Выйшаў са сваёй падслепаватай хаты і Фядос Парахневіч з сынам Сяргеем. Па дарозе іх дагналі суседзі Сцяпан Піменаў і Іван Пракопчык.

— Што здарылася? — спытаў Піменаў.

— Кажуць, з раёна землямер прыехаў, беднякам зямлю наразаць будзе, — растлумачыў Сяргей, высокі статны юнак.

Ля сельсавета тым часам сабралася ўся вёска. Неўзабаве адбыўся мітынг. Перад прысутнымі выступіў землямер Забелаў. Ён расказаў аб планах бальшавіцкай партыі па аграрным пытанні, аб тым, што наразаць зямлю будуць у залежнасці ад колькасці членаў сям'і. Пасля мітынгу адразу ж пачалі адмяраць участкі.

Чарга да Фядоса Парахневіча яшчэ не дайшла, і ён у думках перабіраў урочышчы, палі, мяркуючы, дзе ўзяць сабе зямлю. Раптам ён паклікаў сына:

— Слухай, Сярожа, а што, калі папрасіць за чыгункай?

— Я таксама пра гэта думаў.

Калі сказалі аб сваім жаданні землямеру, той нават разгубіўся. Ён часта бываў у Варатыні і добра ведаў сям'ю Фядоса Парахневіча. Яна вялікая — пяцёра сыноў і чатыры дачкі. А зямлю бярэ чамусьці самую горшую, нікім не апрацаваную.

— Таварыш землямер, нам таксама адмерайце побач з Фядосам, — падышлі Сцяпан Піменаў і Іван Пракопчык. — Гуртам апрацоўваць зямлю будзе лягчэй, адзін аднаму дапаможам.

Так за шэсць кіламетраў ад Варатыні дзесяць бядняцкіх сем'яў пачалі апрацоўваць 120 дзесяцін зямлі. Гэты невялічкі калектыў нельга было назваць камунай, якія ў той час ужо існавалі на Бабруйшчыне. Кожная сям'я апрацоўвала свой надзел і дапамагала суседзям. І ў той жа час гэта быў першы парастак калектыўнага гаспадарання. Сяргея Парахневіча ў вёсцы ведалі як самага адукаванага юнака. Ён чытаў газеты і быў у курсе ўсіх падзей, што адбываліся ў маладой савецкай краіне. Хлопец паступова стаў важаком бядняцкай моладзі. Потым усёй вёскай праводзі-

Помнік на магіле С.Ф.Парахневіча.

лі яго ў Чырвоную Армію. Але і там ён не забываў сваіх землякоў, часта слаў пісьмы, цікавіўся іх жыццём. У пісьме даў цвёрды наказ бацьку абавязкова ўступаць у калгас. І той першы на сходзе падаў заяву.

У той дзень у калгас уступіла каля ста сем'яў. Сяляне звезлі ў агульнае месца фурманкі, плугі, бароны, прыгналі коней і кароў. Але спачатку не ладзілася справа ў арцелі. Кожны стараўся па звычцы мець справу толькі са сваёй жывёлай, сваім інвентаром. А тут яшчэ амаль на кожным кроку шкодзілі кулакі.

Аднойчы на досвітку ў акно Парахневічу пастукалі:

— Уставай, Фядос; каровы здохлі!

Прыбег ён на калгасны двор і першае, што ўбачыў, — людзі ліхаманкава грузілі на фурманкі бароны і плугі, цягнулі на вяроўках сваіх кароў, гналі авечак.

— Хопіць, наеліся калгаснага хлеба! — са злосцю крыкнуў нехта.

Сапраўды, пяць кароў давялося дарэзаць. Як высветлілася пазней, у сечку ім насыпалі дробнага шкла. І зрабілі гэта варатынскія кулакі, каб падарваць у людзей веру ў калгас. І гэта ім, на жаль, удалося. Толькі сем'і Фядоса Парахневіча, Івана Пракопчыка і Сцяпана Піменава тады засталіся ў арцелі.

Праз некалькі дзён вярнуўся з арміі Сяргей Парахневіч. Камсамолец стаў першым агітатарам за калектыўнае жыццё. Разам з сябрамі ён ішоў з хаты ў хату і даказваў аднавяскоўцам, што заможна людзі зажывуць, калі аб'яднаюцца, што прыйдзе такі час, калі на шырокіх калгасных гонях загудуць магутныя трактары. Тыя сяляне, якія ўжо былі ў калгасе, зразумелі, што яны сталі ахвярай дывер сій кулакоў, і вярнуліся ў арцель. Падавалі заявы і іншыя вяскоўцы. Паступова межы, якія дзялілі палі на дробныя кавалачкі, былі зараны. Зямля стала калектыўнай.

Сяргей Парахневіч быў адзіным камсамольцам у вёсцы. Неяк яго выклікаў старшыня сельскага Савета і сказаў:

— Трэба ствараць камсамольскую ячэйку. Моладзь табе давярае, слухае, мы таксама дапаможам.

І неўзабаве ячэйка была арганізавана. У камсамол уступала ўсё больш моладзі. Камсамольцы ўдарна працавалі на самых адказных участках, ва ўсім паказвалі прыклад. Рос аўтарытэт важака моладзі. Яго выбралі членам выканкома Варатынскага сельсавета. Сяргей вёў бязлітасную барацьбу з кулакамі, выкрываў іх падрыўную дзейнасць, крыгыкаваў у насценным друку.

Кулакі затаілі на калгаснага камсорга злосць. Аднойчы, вяртаючыся з камсамольскага сходу, Сяргей заўважыў у цемры дзве постаці. Адна з іх загарадзіла дарогу. Гэта быў сын кулака Андрэй Парахневіч.

— Слухай, камсорг, калі ты не кінеш сваю бальшавіцкую агітацыю, апынешся на тым свеце, — прыгразіў ён і знік у начной цемны.

Але гэта не спалохала Сяргея. Наадварот, ён паставіў перад камсамольцамі задачу — усю вясковую моладзь перацягнуць на свой бок. Для гэтага камсамольцы стварылі гурток палітасветы, арганізавалі мастацкую самадзейнасць, праводзілі вечары адпачынку, іншыя мерапрыемствы. Радасна сустракала вёска Варатынь чатырнаццатую гадавіну савецкай улады. Вялікаму святу калгаснікі прысвяцілі здачу хлеба дзяржаве. Чырвоны абоз, упрыгожаны сцягамі і транспарантамі, пасля мітынгу рушыў у райцэнтр. Адказным за абоз назначылі Сяргея Парахневіча. У камсамольскага важака быў прыўзняты настрой. Ён усю дарогу жартаваў.

Варатынскія кулакі рашылі расправіцца з сакратаром камсамольскай ячэйкі. Гэтую чорную справу яны даручылі Андрэю Парахневічу. У дзень кастрычніцкага свята Сяргей разам са сваім сябрам камсамольцам Мікалаем Пракопчыкам прыйшоў на вечарынку. Моладзь весялілася. І раптам дзынкнула і пагасла лямпа. У цемры Сяргея стукнулі па галаве бутэлькай. Ён упаў на падлогу. Мікалай Пракопчык кінуўся сябру на дапамогу, але і яго таксама звалілі з ног. Раз'юшаныя бандыты білі Сяргея ботамі, палкамі, білі і тады, калі ён быў ужо мёртвы. Гэтых здзекаў ім здалося мала. Яны схапілі труп і кінулі ў стары калодзеж.

На наступны дзень злачынцы былі арыштаваны. А камсамольцы перад пахаваннем Сяргея Парахневіча сталі пад чырвоны сцяг і з песняй прайшлі па вясковай вуліцы. Юнакі і дзяўчаты спявалі пра свайго таварыша. Гэта была песня пра першага камсорга, пра іх мужнага важака і запявалу.

С. Кобля.

Што пісала газета «Камуніст»

КОНЮХ ШЫРОКІ ЯКУБ ЕДЗЕ НА УСЕБЕЛАРУСКІ З'ЕЗД

19 сакавіка 1933 г.

Калгаснікі калгаса імя Дзяржынскага вылучылі на з'езд конюха Шырокага Я., які выпрацаваў 609 працадзён разам з жонкай і атрымаў 80 пудоў жыта, 30 — ячменю, 27 — пшаніцы, 438 — бульбы і 1800 р. грошай.

СТАРШЫНЯ-АРДЭНАНОСЕЦ

15 кастрычніка 1935 г.

Васіль Рыгоравіч Вяроўкін, камуніст-ардэнаносец, у 1918—20 гадах у партызанскім атрадзе не на жыццё, а на смерць змагаўся з нямецкімі акупантамі, легіянерамі генерала Доўбар-Мусніцкага і белапольскімі акупантамі. У мінулым пастух з 13-гадовым стажам застаў у адсталым становішчы калгас імя Дзяржынскага. Новы кіраўнік пачаў з барацьбы за працоўную дысцыпліну і правільнай расстаноўкі людзей. У 1930 г., у снежні выканком адрэзаў 40 га зямлі. Было 6 коней, 6 барон і 6 плугоў, 7 гаспадарак. У 1935 г. калгас дабіўся поспехаў у росце і ўмацаванні: меў 112 гаспадарак з плошчай 468 га ворнай зямлі, 82 кані, 13 жарабят, 80 галоў буйной рагатай жывёлы, 60 галоў свіней, 12 цэнтнераў жыта з гектара, па 13 — аўса і пшаніцы, 10 — ячменю, 800 пудоў бульбы.

ВЕСЕЛА РАБОТАЦЬ І РАДАСНА ЖЫЦЬ

8 сакавіка 1936 г.

Жданкова Аляксандра — адна з першых жанчын-старшынь калгаса «Прамень Саветаў» (1931 г.). Працавала тры з палавінай гады, і ўвесь час калгас быў першым у раёне. З 1932 г. — камуніст. З 1934 г. абрана старшынёй Міхалеўскага сельсавета.

ЧАТЫРОХТЫСЯЧНІЦА ЧАРНЕЦКАЯ

30 жніўня 1936 г.

Ефрасіння Герасімаўна Чарнецкая — удзельніца нарады ў Маскве — калгаснікаўударнікаў, у Крамлі — майстроў сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Яна выканала наказ і дабілася 4000 літраў малака ад кожнай каровы за год. Яна — першая ўдзельніца ад раёна Усесаюзнай выстаўкі народнай гаспадаркі. Яе карова-рэкардыстка пакарыла жывёлаводаў усёй краіны — давала 48 літраў малака ў дзень.

Калгас «Чырвоная Бярэзіна».

Ордэн піянера

Мікалай Паўлавіч Бань амаль трыццаць гадоў працаваў у Туголіцкай сярэдняй школе. Бацька траіх дзяцей. Паважаны на Бабруйшчыне чалавек. Ардэнаносец. Першы свой ордэн атрымаў яшчэ ў піянерскім узросце. Было гэта ў Крамлі, у адзін з восеньскіх дзён 1939 г., калі ўсесаюзны староста М.І.Калінін уручаў вялікай групе ўзнагароджаных ордэны і медалі. Першы высокую ўзнагароду — ордэн «Знак Пашаны» атрымаў юны піянер дванаццацігадовы Коля Бань з вёскі Шубіна тады Чырвонаслабодскага (цяпер Салігорскага) раёна. Пра той дзень яму напамінае фотакартка, на якой ён зняты сярод землякоў-беларусаў і пагранічнікаў адразу пасля ўручэння ўзнагароды.

...Коля бег пад праліўным дажджом. Галлё хвастала па голых руках, пакідаючы балючыя драпіны, але хлопчык нічога не заўважаў. Адна думка валодала ім — толькі паспець папярэдзіць пагранічнікаў. Коля мінуў кусты, выскачыў у поле. Наперадзе замаячыў агеньчык — там застава. Калі падбег бліжэй, насустрач яму выйшаў знаёмы — лейтэнант Шумскі.

— Коля?! — пазнаў ён хлопчыка. — Што здарылася?

— Тату схапілі бандыты, — цяжка дыхаючы, адказаў той. — Скруцілі яго, павялі з сабой.

— Калі?

— Зусім нядаўна. Калі яны выйшлі ў двор, я шыбануў у акно — і да вас.

Застава была ўзнята па трывозе — пачаўся пошук парушальнікаў. Першым іх заўважыў нарад у складзе старшыны Вінаградава і чырвонаармейца Недавесава: у пятай гадзіне раніцы яны ўбачылі трох невядомых, якія прабіраліся сярод кустоў. Вінаградаў напаўголаса падаў каманду:

— За мной!

Пагранічнікі кінуліся напярэймы. Бандыты іх заўважылі, пачалі адстрэльвацца. Туман, што напоўз з балота, дапамог парушаль-

нікам уцячы. Зрабіўшы ў тумане некалькі крокаў, нарад натыкнуўся на цела чалавека. Старшына Вінаградаў пазнаў у забітым Паўла Іосіфавіча Баня, Колевага бацьку... Але і бандыты не змаглі схавацца ад пільнага вока пагранічнікаў, былі схоплены.

27 жніўня 1939 г. Коля Бань з таварышамі пайшоў у лес. Непадалёку ад вёскі іх сустрэў начальнік заставы лейтэнант Шумскі.

— Я да цябе, Коля, з навіной, — заўсміхаўся пагранічнік, працягваючы піянеру «Правду». — Чытай, — і паказаў на Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, надрукаваны на першай старонцы. Не адразу Коля зразумеў, што Бань Мікалай Паўлавіч, вучань Чырвонаслабодскай сярэдняй школы Мінскай вобласці, — гэта і ёсць ён сам.

— Збірайся, Коля, паедзеш у Маскву атрымліваць ордэн, — сказаў на развітанне начальнік заставы.

Пазней некалькі дзён Коля Бань правёў у Маскве, пабываў на Краснай плошчы, наведаў Маўзалей У.І.Леніна, а потым з рук М.І.Калініна прыняў высокую ўзнагароду. Хлопчыка запрасілі ў кабінет Міхаіла Іванавіча. Ён доўга распытваў яго аб сям'і, цікавіўся, ці ўдзельнічае ў калгасных справах. На развітанне Калінін працягнуў піянеру скрутак:

— Перадай, калі ласка, маці ад мяне падарунак. Табе дару кнігі, сшыткі, ручкі, партфель. Вучыся добра. Нашай краіне патрэбны людзі пісьменныя, адукаваныя.

Наказ М.І.Калініна Коля Бань стараўся свята выконваць. Але пачалася Вялікая Айчынная вайна. У няпоўных чатырнаццаць гадоў Коля Бань стаў партызанам атрада, якому пазней далі назву «25 год Кастрычніка». Хадзіў у разведку, прымаў удзел у дыверсіях на чыгункі, у разгроме варожых гарнізонаў, паліцэйскіх участкаў. У час выканання заданняў даводзілася перапраўляцца праз рэчкі. На Нёмане адна такая пераправа ледзь не закончылася трагічна. Пад моцным артылерый-

М.І.Калінін уручае ордэн Мікалаю Баню.

скім абстрэлам ворага Мікалаю цудам удалося дабрацца да супрацьлеглага берага, схавацца ў лесе. Але куртка з дакументамі і ордэнам «Знак Пашаны» засталася пасярэдзіне ракі, на яе дне...

...Прайшло нямала гадоў пасля вайны. Мікалай Паўлавіч Бань прымірыўся са стратай ордэна. Але не захацелі з гэтым мірыцца пагранічнікі. Спачатку яны знайшлі Мікалая Паўлавіча ў Туголіцкай сярэдняй школе Бабруйскага раёна. Камандаванне пагранічных войскаў увайшло з хадайніцтвам у Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР, і Мікалаю Паўлавічу Баню быў уручаны новы ордэн «Знак Пашаны» — узамен страчанага пры пераправе цераз Нёман у час выканання баявога задання.

Мікалай Паўлавіч Бань жыве ў вёсцы Туголіца. Часта сустракаецца з піянерамі, успамінае тую чэрвеньскую ноч трыццаць дзевятага года, калі ён бег на заставу, каб папярэдзіць пагранічнікаў аб з'яўленні парушальнікаў. Тыя падзеі незабыўныя. *М.Салаўёў.*

Дакументы сведчаць...

З КАРОТКАГА АГЛЯДУ БАБРУЙСКАГА ГАРАДСКОГА АДДЗЕЛА НКУС ПАЛІТЫКА-ЭКАНАМІЧНАГА СТАНУ БАБРУЙСКАГА РАЁНА

1931 г.

6. Революционные факты района

Парторганизация. П/организация... в своих рядах на 1 октября 1931 года насчитывает 1957 чел., из коих: рабочих — 1168, колх. — 91, служащих — 569, крестьян-единоличников — 2, прочих — 127. П/ячеек — 25.

С 1930 года до 1 августа 1931 года Бобруйская п/о во главе со своим партруководством имели ряд глубоких прорывов по реализации директив ЦК ВКП(б) и ЦК КП(б)Б... Коллективизация осуществлена всего на 20%, план весенней посевкампанни был выполнен лишь на 83%, большой прорыв в укомплектовании молочных и свинно-откормочных ферм и обеспечения кормовой базой.

К этим вопросам отдельные партийные сельские ячейки относились оппортуннстическн (Сычковская и Любоннчская, где коллективизация колебалась между 5—10%)...

Все эти факты говорят о том, что прошлое партруководство не сумело перестроить свою работу...

Старое партруководство... было снято с работы и заменено новым, которое сумело мобилизовать партийно-комс. актив на решение задач.

...районный план централизованных заготовок по мясу, картофелю, плодоовощам и сену на 1.10. с.г. перевыполнен, рост коллективизации — свыше 27%, ежедневные поступления в Бобруйск многочисленных красных обозов...

Комсомольская организация. В своих рядах насчитывает 4901 чел. По сельским местностям комс. яч. расположены в большинстве своем при парт. ячейках, крупных колхозах, совхозах, при сельсоветских центрах и насчитывается всего в них до 400 чел., каковые объединяются 53 ячейками.

Выполнение директив партии и проведение их в жизнь комс. орг. характеризуется так же, как и п/о района.

Численность милиции и отрядов ВОХР. Числ. состав милиции Бобр. района составляет 242 чел., кот. подразделяется на общегосударственную и дивизионную ведомственную милицию. Кроме этого имеется отряд милиции на стеклозаводе «Коминтерн»...

Общественные организации. Работу общественных организаций можно охарактеризовать следующим образом: кое-какая работа проходит в городе и почти совершенно отсутствует в районе. В данный момент крепким добровольным обществом является ОСОАВИАХИМ, который насч. на 1.7.31 17 882 чел., в кружках его занимается около 2000 чел., через лагерь пропущено 120 чел.; МОПР имеет 800 членов, никаких кружков нет н в последнее время работа значительно ослабла. Приблизительно в таком же положении находится организация АВТОДОРа, кот. по спискам имеет около 3000 членов. Остальные добровольные общества: Красный Крест, «Безбожннк» почти числятся только на бумаге.

Партизанское движение. В сельских местностях района имеется 55 чел. красных партизан. Они проживают почти в каждом с/с по одному—три человека. Часть нз них работает в колхозах.

Религиозный вопрос. По сост. на 1.8.31 г. в районе насчитывается 34 церкви, синагог — 30, молитвенных домов — 3. Из сект в районе насчитывается — 2, кон расположены: в Телушском с/с — 9 чел., Харлаповичском — 10 чел., Воротынском — 24 чел., Любоннчском — 2 чел., Михалевском — 3 чел., — община евангельских христиан. Кроме того, на тер. района имеются группы ионистов с числ. сост. — 90 чел...

Сеть культурных учреждений. По сельским местностям: школ-семилеток — 5, 1-3 концентр. — 112, клубов — 2, изб-читален — 10, кинопередвижек Белгоскино — 3, клубных киноустановок — 1 («Коминтерн»), радиоустановок — 37...

10. *Контрреволюционные факторы района*

К данному времени по району имеется учтенных антисоветских элементов в деревне 796 чел., кон делятся на нижеследующие разновидности: бывш. помещиков, их родственников и ближних прислужников — 11 чел.; бывш. торговцев и предпринимателей — 9 чел.; духовенства — 30 чел.; офицерства — 21 чел.; бывш. бандитов и добровольцев белополяков — 120 чел.; бывш. жандармов, полицейских чиновников и проч. — 143 чел.; кулаков в прошлом и теперь — 316 чел.; прочего антисоветского элемента — 146 чел.

Из наиболее пораженных антисоветскими элементами являются: Рымовецкнй, Осовскнй, Сычковский, Мальевскнй, Продвннскнй, Капустннскнй, Воротынский с/с...

За последние 1927—30 гг. отмечено 4 случая массовых выступленнй, кон имели место в 1930 г. в момент выселения кулачества... Такое явление имело место в Капустннском, Мальевском с/с — д. Панкратовичи, Боровичском и Брожском с/с. Участие в массовых выст. принимали 150—300 чел.

Кроме этого, весной 1931 г. имело место массовое выст. крестьян в д. Стасевка Продвннского с/с — на почве отвода земли колхозу. Подкулачники и кулаки не пускали колхозников поехать запахать отведенную землю. В данном выступлении участвовало 100 чел., преимущ. женщины.

...За период 1930—31 гг. нз пределов Бобруйского района выселено кулачества 241 хозяйство, с г. Бобруйском — 265 хозяйств, нз них: белорусов — 215, поляков — 27, великорусов-старообрядцев — 22, евреев — 1. Всего же лишенцев насчитывается: по сельским местностям — 295 хозяйств, 1225 чел., по г. Бобруйску — 2475 чел.

II. **Выводы**

Активность бедноты значительно повысилась..., бедняцко-середняцкий бок вместе с колхозниками дает надлежащий отпор вылазкам классового врага.

Сельская интеллигенция в преобл. большинстве поддерж. мероприят. Соввласти, особенно активно участвуют в общ. работе учителя и агрономы, слабее — врачи, лесничие, землемеры.

Прошлое Бобруйского района говорит за то, что осн. массы населения всецело на стороне Советской власти и в случае нападения на нашу страну будут активно бороться совместно с Красной Армией...

Занальны Дзяржаўны архіў у г. Бабруйску. Ф. 395. Воп. 2. Спр. 5—8.

ВЕРНУТЫЯ ІМЁНЫ

Ахвяры беспадстаўных палітычных рэпрэсій

Складаная сітуацыя была ў Беларусі, у тым ліку і на Бабруйшчыне, у 1930-я гады. З аднаго боку — упартая, самаадданая праца па наладжванні новага жыцця, з другога — трагічны лёс несправядліва абвінавачаных людзей. Вядомы тэзіс Сталіна аб абвастрэнні класавай барацьбы па меры руху да сацыялізму стварыў атмасферу падазронасці, неабгрунтаваных рэпрэсій. У Бабруйскім раёне, па няпоўных звестках, толькі расстраляна было каля 250 чалавек. І толькі праз гады стала вядомая праўда пра тых, хто бязвінна загінуў у турмах і лагерах, быў высланы на Поўнач, Урал і Сібір.

Многія з рэпрэсіраваных былі рэабілітаваны яшчэ ў 1950—1960 гады, іншыя пазней. Людзям вяртаюцца іх сумленныя імёны. У працэсе работы над кнігай «Памяць» сталі вядомы прозвішчы рэабілітаваных, якія друкуюцца ў спісе.

БОРТНІКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

АБРАМАЎ Канстанцін Дзянісавіч, н. ў 1883 на Бабруйшчыне, святар Міхалёўскай царквы. Рэпрэсіраваны 26.5.1933, асуджаны на 5 гадоў. Рэабілітаваны 30.9.1966.

АЛФЁРЧЫК Аляксандра Мікалаеўна, н. ў 1907 на Бабруйшчыне, настаўніца Міхалёўскай школы. Рэпрэсіравана 10.3.1951, асуджана на 10 гадоў. Рэабілітавана 26.9.1960.

АРЭШКА Мікіта Яўгенавіч, н. ў 1892 у в. Узнога, жыў у в. Крупічы, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 8.8.1935. Рэабілітаваны 8.8.1990.

АРЭШКА Мірон Яўгенавіч, н. ў 1900 у в. Узнога, жыў у в. Крупічы, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 5.7.1935. Рэабілітаваны 8.8.1990.

БАЛЫКА Іван Мацвеевіч, н. ў 1888 у в. Бортнікі, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 8.2.1933. Рэабілітаваны 22.8.1989.

БЯРОЗКІН Максім Іванавіч, н. ў 1890 у в. Узнога, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 7.3.1933. Рэабілітаваны 16.1.1989.

БЯРОЗКІН Сямён Данілавіч, н. ў 1890 у в. Узнога, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 7.3.1933. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ГАЛЯС Восіп Андрэевіч, н. ў 1886 на хутары Іванаўскі, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 12.8.1930. Расстраляны ў 1930. Рэабілітаваны 16.1.1989.



Камень на месцы будаўніцтва помніка ахвярам рэпрэсій г. Бабруйска і Бабруйскага раёна.

ГАЛЯС Пётр Іванавіч, н. ў 1907 на хутары Іванаўскі, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 12.8.1930. Расстраляны ў 1930. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ГРАХОЎСКАЯ Станіслава Стафанаўна, н. ў 1918, жыла ў в. Рыня. Рэпрэсіравана ў 1932. Рэабілітавана 1.12.1994.

ГРАХОЎСКАЯ Эмілія Аляксандраўна, н. ў 1890, жыла ў в. Рыня. Раскулачана ў 1932. Рэабілітавана 1.12.1994.

ГРАХОЎСКІ Стафан Адольфавіч, н. ў 1887, жыў у в. Рыня. Раскулачаны ў 1932. Рэабілітаваны 1.12.1994.

ГРЫНЕВІЧ Аляксандр Сямёнавіч, н. ў 1902 у в. Бірча, жыў у в. Туркі, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 29.8.1944. Рэабілітаваны 20.2.1992.

ДАНЦЭВІЧ Міхаіл Сцяпанавіч, н. ў 1884 у в. Кухенка, жыў на ст. Заполле, майстар 12-й дыстанцыі пуці. Рэпрэсіраваны 8.12.1936, асуджаны 18.2.1937. Рэабілітаваны 18.10.1991.

ДЗЯРЭЎКІН Пётр Сяргеевіч, н. ў 1891 у в. Узнога, жыў у в. Крупічы, працаваў у калгасе. Рэпрэсіраваны 27.2.1938. Расстраляны 26.3.1938. Рэабілітаваны 22.9.1989.

ІВАШКЕВІЧ Сцяпан Іосіфавіч, н. ў 1909 у с. Калкуны, Латвія, жыў у в. Бортнікі, загадчык сепаратпункта. Рэпрэсіраваны 16.6.1938, асуджаны 17.10.1938 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 8.4.1955.

КАМІНСКІ Адам Адамавіч, н. ў 1907, на хутары Навікі, дзесятнік торфазавода «Новая Беларусь». Рэпрэсіраваны 10.10.1937. Расстраляны 14.11.1937. Рэабілітаваны 2.9.1988.

КОТ Фёдар Аляксандравіч, н. ў 1890 у в. Бортнікі, працаваў у калгасе. Рэпрэсіраваны 8.2.1933, асуджаны 21.4.1933 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 22.8.1989.

КРАЎЦОЎ Пётр Паўлавіч, н. ў 1922 у в. Бірча, вучань Старасельскай школы Кіраўскага р-на. Рэпрэсіраваны 8.6.1938, асуджаны 3.2.1940 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 16.1.1989.

КУКАБАКА Ігнат Піліпавіч, н. ў 1895 у в. Міхалёва, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 19.12.1937, асуджаны 27.2.1938 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ЛАПЦЕВА Фаіна Якаўлеўна, н. ў 1916 у в. Пустошка, хатняя гаспадыня. Рэпрэсіравана 4.7.1945, асуджана на 5 гадоў. Рэабілітавана 30.1.1992.

ЛІС Макар Марцінавіч, н. ў 1880 у в. Узнога, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 26.3.1933, асуджаны на 3 гады з высылкай у Казахстан. Рэабілітаваны 16.1.1989.

МАЗУРОНАК Радзівон Сямёнавіч, н. ў 1895, жыў у в. Узнога, наладчык паравознага дэпо ст. Цялуша. Рэпрэсіраваны 19.3.1938. Рэабілітаваны пасмяротна 20.4.1957.

МАЗУРЭНКА Канстанцін Міхайлавіч, н. ў 1884 у в. Узнога, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 13.3.1933, асуджаны на 3 гады з высылкай у Казахстан. Рэабілітаваны 16.1.1989.

МАЗУРЭНКА Кузьма Рыгоравіч, н. ў 1879 у в. Узнога. Рэпрэсіраваны 20.8.1935, асуджаны 21.11.1935 на 3 гады. Рэабілітаваны 8.8.1990.

МАЗУРЭНКА Піліп Рыгоравіч, н. ў 1875 у в. Узнога, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 7.3.1933, асуджаны 9.5.1933 на 3 гады. Рэабілітаваны 16.1.1989.

МАЗУРЭНКА Фёдар Рыгоравіч, н. ў 1880 у в. Узнога. Рэпрэсіраваны ў 1935, асуджаны на 8 гадоў. Рэабілітаваны ў 1962.

МАРЧАНКА Васіль Хрыстафоравіч, н. ў 1888 у в. Міхалёва. Рэпрэсіраваны 27.11.1935, асуджаны 1.3.1936 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 23.8.1990.

МАРЧАНКА Любоў Васілеўна, н. ў 1917 у в. Міхалёва, аднаасобніца. Рэпрэсіравана 23.12.1937, асуджана на 10 гадоў. Рэабілітавана 16.1.1989.

МАЦВЕЕНКА Алена Якаўлеўна, жыла ў в. Пустошка. Раскулачана ў 1931, выслана ў Пермскую вобл. Рэабілітавана 27.11.1992.

МАЦВЕЕНКА Варвара Якаўлеўна, жыла ў в. Пустошка. Раскулачана ў 1931, выслана ў Пермскую вобл. Рэабілітавана 27.11.1992.

МАЦВЕЕНКА Іван Якаўлевіч, н. ў 1906 у в. Пустошка, чырвонаармеец 2-га корпуснага палка. Рэпрэсіраваны 28.11.1929, асуджаны 13.2.1930 на 3 гады. Рэабілітаваны 25.7.1989.

МАЦВЕЕНКА Павел Якаўлевіч, жыў у в. Пустошка. Раскулачаны ў 1931, высланы ў Пермскую вобл. Рэабілітаваны 27.11.1992.

МАЦВЕЕНКА Прохар Якаўлевіч, жыў у в. Пустошка. Раскулачаны ў 1931, высланы ў Пермскую вобл. Рэабілітаваны 27.11.1992.

МАЦВЕЕНКА Софія Якаўлеўна, жыла ў в. Пустошка. Раскулачана ў 1931, выслана ў Пермскую вобл. Рэабілітавана 27.11.1992.

МАЦВЕЕНКА Ульяна Фёдараўна, н. ў 1889 у в. Пустошка. Раскулачана ў 1931, выслана ў Пермскую вобл. Рэабілітавана 27.11.1992.

МАЦВЕЕНКА Якаў Тарасавіч, н. ў 1884 у в. Пустошка. Раскулачаны ў 1931, высланы ў Пермскую вобл. Рэабілітаваны 27.11.1992.

ПАДШЫВАЙЛАЎ Піліп Іосіфавіч, н. ў 1903 у в. Баршчова, жыў у в. Красная Дуброва, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 28.5.1930, асуджаны 16.6.1930. Рэабілітаваны 12.9.1989.

ПЛЫВАЧЭЎСКІ Іосіф Лукіч, н. ў 1880 у в. Брожа, садавод калгаса «Красны партызан». Рэпрэсіраваны 9.2.1938, асуджаны 30.9.1938. Расстраляны. Рэабілітаваны 28.5.1957.

РАГУЦКІ Мікалай Міхайлавіч, н. ў 1902 у в. Лейчыцы, стралок. Рэпрэсіраваны ў 1944. Рэабілітаваны ў 1945.

САРОКА Фёдар Апанасавіч, н. ў 1908 у в. Бортнікі. Рэпрэсіраваны 28.3.1930, асуджаны 15.4.1930. Рэабілітаваны 5.11.1991.

СІТУН Раман Іванавіч, н. ў 1885 у в. Узнога, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 7.3.1933, асуджаны 9.5.1933 на 3 гады. Рэабілітаваны 16.1.1989.

СКВАРЦОЎ Антон Сяргеевіч, н. ў 1878 у в. Міхалёва. Рэпрэсіраваны 7.3.1933, асуджаны

26.5.1933 на 3 гады з высылкай у Башкірыю. Рэабілітаваны 30.9.1968.

СМЫКАЎ Захар Іванавіч, н. ў 1884 у в. Бірча-2, рахункавод калгаса «Перамога». Рэпрэсіраваны 7.8.1937, асуджаны 17.9.1937. Расстраляны 27.9.1937. Рэабілітаваны 12.8.1960.

СТУПЕНЬ Рыгор Яўстратавіч, жыў у в. Красная Дуброва. Раскулачаны ў 1930, высланы ў Сібір. Рэабілітаваны 23.3.1992.

СТУПЕНЬ Фёдар Рыгоравіч, жыў у в. Красная Дуброва. Раскулачаны ў 1930, высланы ў Сібір. Рэабілітаваны 23.3.1992.

ФІЛІМОНАЎ Георгій Піліпавіч, н. ў 1913 у в. Бірча, памочнік начальніка штаба 25-й арміі. Рэпрэсіраваны 22.12.1942, асуджаны 24.2.1943 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 20.6.1990.

ХАВАНСКІ Адам Паўлавіч, н. ў 1897 у в. Рыня. Рэпрэсіраваны 13.12.1937, асуджаны 8.10.1938 на 8 гадоў. Рэабілітаваны 19.4.1966.

ХАЛАДКОЎ Міхаіл Трафімавіч, н. ў 1900 у в. Пустошка, селянін. Рэпрэсіраваны ў 1937, асуджаны на 10 гадоў з высылкай у Комі АССР. Рэабілітаваны ў 1963.

ХУРСАН Андрэй Парфёнавіч, н. ў 1897 у в. Бортнікі, рабочы. Рэпрэсіраваны 9.4.1938. Расстраляны 10.10.1938. Рэабілітаваны 4.8.1958.

ХУРСАН Парфён Іванавіч, н. ў 1860 у в. Бортнікі, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 8.2.1933, асуджаны 21.4.1933 на 5 гадоў з высылкай у Башкірыю. Рэабілітаваны 22.8.1989.

ХУРСАН Рыгор Арсенцьевіч, н. ў 1910 у в. Бортнікі, настаўнік. Рэпрэсіраваны 12.1.1937. Расстраляны 29.11.1938. Рэабілітаваны 12.9.1989.

ХУРСАН Тарас Кірылавіч, н. ў 1877 у в. Бортнікі, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 8.2.1933, асуджаны 21.4.1933 на 5 гадоў з высылкай у Башкірыю. Рэабілітаваны 22.8.1989.

ШАПЯЛЕВІЧ Марк Валянцінавіч, н. ў 1878 у в. Бортнікі, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 18.2.1933, асуджаны 21.4.1933 на 5 гадоў з высылкай у Башкірыю. Рэабілітаваны 22.8.1989.

ШЧАГЛОЎ Сямён Сямёнавіч, н. ў 1926 у в. Бортнікі, чырвонаармеец. Рэпрэсіраваны 17.12.1944, асуджаны 29.12.1944 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 16.9.1992.

ШЫНКАРЭНКА Валянціна Мікалаеўна, н. ў 1931 у в. Іванаўка. Раскулачана ў 1931, выслана ў Пермскую вобл. Рэабілітавана 28.2.1992.

ШЫНКАРЭНКА Мікалай Мікалаевіч, н. ў 1929 у в. Іванаўка. Раскулачаны ў 1931, высланы ў Пермскую вобл. Рэабілітаваны 28.2.1992.

ШЫНКАРЭНКА Мікалай Акімавіч, жыў у в. Іванаўка. Раскулачаны ў 1931, высланы ў Пермскую вобл. Рэабілітаваны 28.2.1992.

ШЫНКАРЭНКА Настасся Сцяпанаўна, н. ў 1908 у в. Іванаўка. Рэпрэсіравана ў 1931, выслана ў Пермскую вобл. Рэабілітавана 28.2.1992.

ШЫРОКІ Сяргей Цітавіч, н. ў 1878 у в. Міхалёва. Рэпрэсіраваны 7.3.1933, асуджаны 26.5.1933 на 3 гады з высылкай у Башкірыю. Рэабілітаваны 30.9.1966.

ШЫРОКІ Феафан Сяргеевіч, н. ў 1894 у в. Міхалёва, палкоўнік, камандзір авіябрыгады ў Прыморскім краі. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1940.

ЮШКЕВІЧ Дзмітрый Сяргеевіч, н. ў 1896 у в. Міхалёва, працаваў у калгасе «3-і рашаючы». Рэпрэсіраваны 6.8.1937. Расстраляны 5.9.1937. Рэабілітаваны 23.11.1959.

ЮШКЕВІЧ Іван Сяргеевіч, н. ў 1888 у в. Міхалёва, аднаасобнік, каваль. Рэпрэсіраваны 31.5.1930, асуджаны 16.6.1930. Рэабілітаваны 30.8.1989.

ЮШКЕВІЧ Ігнат Рыгоравіч, н. ў 1883 у в. Міхалёва. Рэпрэсіраваны 21.9.1929, асуджаны 9.12.1929 на 3 гады. Рэабілітаваны 19.11.1992.

ЮШКЕВІЧ Наталля Аляксееўна, н. ў 1899 у в. Савічы, жыла ў в. Міхалёва, аднаасобніца. Рэпрэсіравана 22.12.1937. Расстраляна 26.3.1938. Рэабілітавана 16.1.1989.

ЮШКЕВІЧ Пётр Мікалаевіч, н. ў 1888 у в. Міхалёва, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 13.12.1937. Расстраляны 26.3.1938. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ЮШКЕВІЧ Сямён Мікітавіч, н. ў 1878 у в. Міхалёва, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 13.12.1937, асуджаны 27.2.1938. Расстраляны 26.3.1938. Рэабілітаваны 16.1.1989.

БРОЖСКІ СЕЛЬСАВЕТ

АЛЯКСЕЙЧЫКАЎ Канстанцін Лявонцьевіч, н. ў 1897 у в. Лазавое Свіслацкага р-на, жыў у в. Брожа, працаваў памочнікам начальніка ст. Брожа. Рэпрэсіраваны 2.12.1930, асуджаны 26.1.1931 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 16.1.1989.

АСЕЦКІ Аляксандр Іванавіч, н. ў 1895 у в. Прудзішча, старшыня калгаса «Ударнік». Рэпрэсіраваны 6.7.1938. Расстраляны 19.11.1938. Рэабілітаваны 4.6.1957.

БАРАДЗІН Міхаіл Іларыёнавіч, н. ў 1909 у в. Раскачы, радавы 54-га батальёна аховы штаба 34-й арміі. Рэпрэсіраваны 5.3.1942, асуджаны на 10 гадоў. Рэабілітаваны ў 1962.

БАРАНОЎСКІ Сцяпан Пятровіч, н. ў 1882 у в. Прудзішча, працаваў у калгасе «Ударнік». Рэпрэсіраваны 4.7.1938, асуджаны 30.9.1938. Расстраляны 30.10.1938. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ДЗЕМСКАЯ Таццяна Сцяпанаўна, н. ў 1922 у в. Прудзішча, рабочая абозабудаўнічага завода. Рэпрэсіравана 25.12.1944, асуджана 3.10.1945. Рэабілітавана 13.8.1990.

ІВАНОЎСКІ Браніслаў Іосіфавіч, н. ў 1901 у в. Прудзішча, працаваў у калгасе «Ударнік». Рэпрэсіраваны 6.8.1937. Расстраляны 26.8.1937. Рэабілітаваны 26.8.1939.

ІВАНОЎСКІ Іван Іосіфавіч, н. ў 1882 у в. Прудзішча, працаваў у калгасе «Ударнік». Рэпрэсіраваны 6.8.1937, асуджаны 29.9.1937. Расстраляны 11.10.1937. Рэабілітаваны 5.11.1987.

ІВАНОЎСКІ Іосіф Іосіфавіч, н. ў 1890 у в. Прудзішча, працаваў у калгасе. Рэпрэсіраваны 21.7.1938, асуджаны 30.9.1938. Расстраляны. Рэабілітаваны 24.12.1957.

КОРЗУН Віктар Іосіфавіч, н. ў 1904, грузчык леспрамгаса. Рэпрэсіраваны 16.12.1937, асуджаны 23.4.1938. Расстраляны. Рэабілітаваны 24.5.1961.

ЛАНДЗЮК Фадот Іосіфавіч, н. ў 1909 у в. Макаравічы, грузчык лесаўчастка. Рэпрэсіраваны 23.2.1938, асуджаны 15.11.1938 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 28.11.1957.

ЛОСЬ Аляксей Яўхімавіч, н. ў 1896 у в. Ласі, майстар Слаўкавіцкага лесаўчастка. Рэпрэсіраваны ў 1937. Расстраляны 6.12.1937. Рэабілітаваны ў 1959.

ЛОСЬ Кацярына Фёдараўна, н. ў 1924 у в. Ласі, рабочая чыгункі. Рэпрэсіравана 8.1.1945, асуджана 15.5.1946 на 5 гадоў. Рэабілітавана 29.4.1992.

ЛОСЬ Фёдар Мікалаевіч, н. ў 1878 у в. Ласі, працаваў у калгасе імя Кірава. Рэпрэсіраваны 29.12.1944, асуджаны 22.4.1946 на 5 гадоў турмы. Рэабілітаваны 10.4.1992.

МАЦВЯЁНАК Васіль Іванавіч, н. ў 1903 у в. Прудзішча, працаваў у калгасе «Ударнік». Рэпрэсіраваны ў 1937, асуджаны на 10 гадоў турмы. Рэабілітаваны ў 1963.

НІКІТКА Аляксей Паўлавіч, н. ў в. Орсічы. Раскулачаны ў 1931, высланы на Урал. Рэабілітаваны 16.6.1992.

НІКІТКА Аркадзь Мяфодзьевіч, н. ў в. Орсічы. Раскулачаны ў 1931, высланы на Урал. Рэабілітаваны 16.6.1992.

НІКІТКА Васіль Паўлавіч, н. ў в. Орсічы. Раскулачаны ў 1931, высланы на Урал. Рэабілітаваны 16.6.1992.

НІКІТКА Макар Харытонавіч, н. ў 1913 у в. Орсічы, дзяжурны ст. Ратміравічы. Рэпрэсіраваны 3.2.1938, асуджаны 16.2.1938. Расстраляны 28.2.1938. Рэабілітаваны 2.4.1959.

НІКІТКА Матрона Андрэеўна, н. ў в. Орсічы. Раскулачана ў 1931, выслана на Урал. Рэабілітавана 16.6.1992.

НІКІТКА Мяфодзій Паўлавіч, н. ў в. Орсічы. Раскулачаны ў 1931, высланы на Урал. Рэабілітаваны 16.6.1992.

НІКІТКА Павел Паўлавіч, н. ў в. Орсічы. Раскулачаны ў 1931, высланы на Урал. Рэабілітаваны 16.6.1992.

НІКІТКА Рыгор Фёдаравіч, н. ў 1900 у в. Орсічы, працаваў у калгасе «Праўда». Рэпрэсіраваны 6.7.1938, асуджаны 11.10.1938. Расстраляны 29.10.1938. Рэабілітаваны 26.10.1960.

НІКІТКА Фёдар Ціханавіч, н. ў в. Орсічы. Раскулачаны ў 1931, высланы на Урал. Рэабілітаваны 16.6.1992.

РАСОХА Сяргей Дамітрыевіч, н. ў 1909 у в. Брожа, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 12.2.1944, асуджаны 28.7.1945. Рэабілітаваны 21.7.1992.

РУДЗЬКО Іван Міхайлавіч, жыў у в. Орсічы. Раскулачаны ў 1930. Рэабілітаваны 16.3.1992.

РУДЗЬКО Міхаіл Севасцьянавіч, жыў у в. Орсічы. Раскулачаны ў 1930. Рэабілітаваны 16.3.1992.

СЕВЕРНЫ Рыгор Усцінавіч, н. ў 1903, лесаруб Брожскага леспрамгаса. Рэпрэсіраваны 18.7.1937, асуджаны 7.8.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 19.11.1965.

СЕРАДА Андрэй Макаравіч, н. ў 1912 у в. Макаравічы, рабочы Брожскага мехпункта. Рэпрэсіраваны 26.7.1937, асуджаны 26.8.1937 на 8 гадоў. Рэабілітаваны 16.5.1959.

ТАРАХОВІЧ Мікалай Казіміравіч, н. ў 1891 у в. Прудзішча, селянін. Рэпрэсіраваны 6.7.1937. Рэабілітаваны 11.9.1938.

ТОЎСЦІК Фёдар Паўлавіч, н. ў 1896 у в. Чыкілі, жыў у в. Орсічы, старшыня калгаса «Праўда». Рэпрэсіраваны 29.3.1945, асуджаны 24.8.1945 на 8 гадоў турмы. Рэабілітаваны 16.12.1991.

УРУБЛЕЎСКІ Сцяпан Якаўлевіч, н. ў 1903 у в. Орсічы, брыгадзір 12-й дыстанцыі пуці. Рэпрэсіраваны 22.8.1937, асуджаны 26.1.1938. Расстраляны 13.8.1938. Рэабілітаваны 25.2.1960.

ХАНЕНЯ Іван Міхайлавіч, н. ў 1914 у в. Макаравічы. Рэпрэсіраваны 20.7.1937, асуджаны 26.8.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 16.5.1959.

ХАНЕНЯ Іван Сцяпанавіч, н. ў 1914 у в. Макаравічы, грузчык лесаўчастка. Рэпрэсіраваны 29.4.1938, асуджаны 15.11.1938 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 28.11.1957.

ХАНЕНЯ Канстанцін Міхайланіч, жыў у в. Макаравічы, рабочы Брожскага лесапункта. Рэпрэсіраваны 26.7.1937, асуджаны 26.8.1937 на 8 гадоў. Рэабілітаваны 16.5.1959.

ЧЭРНІК Міхаіл Ціханавіч, н. ў 1902 у в. Мазуры Кобрынскага р-на, Брэсцкай вобл., жыў у в. Ласі, старшыня калгаса імя Кірава. Рэпрэсіраваны 26.5.1938. Расстраляны 31.7.1938. Рэабілітаваны 5.11.1957.

ШУШКЕВІЧ Вікенцій Вікенцьевіч, н. ў 1889 у в. Орсічы, старшыня калгаса. Рэпрэсіраваны 23.1.1936, асуджаны 13.8.1936 на 3 гады. Рэабілітаваны 31.5.1989.

ШЧЫГЕЛЬСКІ Іван Казіміравіч, н. ў 1896 у в. Орсічы, дарожны майстар ст. Брожа. Рэпрэсіраваны 30.7.1944, вызвалены 22.11.1944. Рэабілітаваны 27.10.1944.

ВАРАТЫНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

АБРАМАЎ Ціхан Іванавіч, н. ў 1893 у в. Слабада Гагарынскага раёна Смаленскай вобл., жыў у в. Вілы, конюх калгаса «Шлях Леніна». Рэпрэсіраваны 14.3.1938. Расстраляны 10.4.1938. Рэабілітаваны 30.10.1957.

АРХІПЕНКА Серафім Міхайлавіч, н. ў 1903 у в. Аўсімавічы, працаваў у калгасе «Бальшавік». Рэпрэсіраваны 27.2.1938. Расстраляны 26.3.1938. Рэабілітаваны 16.1.1989.

Ц.І.Абрамаў.

БАГДАНОВІЧ Іван Фёдаравіч, н. ў 1905 у в. Туркі, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 4.4.1930, асуджаны 15.4.1930. Рэабілітаваны 5.11.1991.

БАСЬКО Мікалай Піліпавіч, н. ў 1901 у в. Туркі, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 28.3.1930, асуджаны 15.4.1930. Рэабілітаваны 5.11.1991.

БЕЛЯКОЎ Аркадзь Сямёнавіч, н. на хутары Шчыгельскі, жыў на ст. Ясень Асіповіцкага р-на, дарожны рабочы ст. Ясень. Рэпрэсіраваны ў 1945. Рэабілітаваны ў 1945.

БІТУС Канстанцін Раманавіч, н. ў 1912 у в. Туркі, рахункавод. Рэпрэсіраваны 2.9.1944, асуджаны 8.2.1945. Рэабілітаваны 18.2.1994.

БЭЧЫК Фёдар Аляксандравіч, жыў у в. Туркі. Раскулачаны ў 1930. Рэабілітаваны 3.5.1993.

ГАЛАВАНАЎ Нічыпар Макаравіч, жыў у в. Туркоўская Слабада. Раскулачаны ў 1930. Рэабілітаваны 30.8.1993.

ГРЫНЕВІЧ Аляксандр Сямёнавіч, н. ў 1902 у в. Бірча, жыў у в. Туркі, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 29.8.1944, асуджаны 30.12.1944. Рэабілітаваны 20.2.1992.

ДАШКОЎСКІ Апанас Іванавіч, н. ў 1900 у в. Коўрын. Раскулачаны ў 1932. Рэабілітаваны 20.5.1993.

ДАШКОЎСКІ Давыд Максімавіч, н. ў 1883 у в. Коўрын, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 17.3.1933. Расстраляны ў 1933. Рэабілітаваны 21.11.1959.

ДРАЗДОЎ Іван Піліпавіч, н. ў 1907 у в. Коўрын, працаваў у калгасе «1 Мая», сакратар сельсавета. Рэпрэсіраваны 27.12.1932, асуджаны 17.3.1933 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 21.11.1959.

КАРАНЬКОЎ Якаў Піліпавіч, н. ў 1892 у в. Туркі. Раскулачаны ў 1932. Рэабілітаваны 18.5.1993.

КОРСАК Антон Віктаравіч, н. ў 1899 у в. Туркі. Рэпрэсіраваны ў 1920. Рэабілітаваны ў 1920.

КУЛАЕЎ (КУЛАЙ) Мікалай Іванавіч, н. ў 1891 на Гродзеншчыне, жыў у в. Варатынь, ветфельчар. Рэпрэсіраваны 26.5.1938. Расстраляны 5.7.1938. Рэабілітаваны 3.11.1958.

ЛУК'ЯНАЎ Іларыён Акімавіч, жыў у в. Туркоўская Слабада. Раскулачаны ў 1932. Рэабілітаваны 16.7.1992.

ЛУК'ЯНАЎ Максім Ермалаевіч, жыў у в. Туркоўская Слабада. Раскулачаны ў 1929. Рэабілітаваны 9.11.1992.

ЛУШЧАКОЎ Мікалай Давыдавіч, жыў у в. Коўрын. Раскулачаны ў 1930. Рэабілітаваны 9.11.1993.

МІХАЛАП Антон Іванавіч, н. ў 1893 у в. Вілы. Рэпрэсіраваны 30.8.1932, асуджаны 15.10.1932 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ПАРАХНЕВІЧ Іван Ігнатавіч, н. ў 1908 у в. Аўсімавічы, працаваў у калгасе «Бальшавік». Рэпрэсіраваны 27.2.1938. Расстраляны 26.3.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ПАРАХНЕВІЧ Канстанцін Пятровіч, жыў у в. Кантора. Раскулачаны ў 1930. Рэабілітаваны 13.2.1992.

ПАРАХНЕВІЧ Матрона Васілеўна, жыла ў в. Кантора. Раскулачана ў 1930. Рэабілітавана 13.2.1992.

ПАРАХНЕВІЧ Павел Пятровіч, жыў у в. Кантора. Раскулачаны ў 1930. Рэабілітаваны 13.2.1992.

ПАРАХНЕВІЧ Панфіл Фёдаравіч, н. ў 1886 у в. Дулёва, працаваў у калгасе «Чырвоная ніва». Рэпрэсіраваны 17.9.1937. Расстраляны 28.9.1937. Рэабілітаваны 12.8.1960.

ПАРАХНЕВІЧ Пётр Колеевіч, жыў у в. Кантора. Раскулачаны ў 1930. Рэабілітаваны 13.2.1992.

ПАРАХНЕВІЧ Сава Васілевіч, н. ў 1877, жыў у пас. Міронава. Рэпрэсіраваны 17.9.1937 асуджаны на 10 гадоў. Рэабілітаваны 12.8.1960.

ПАРАХНЕВІЧ Сцяпан Макаравіч, н. ў 1878 у в. Аўсімавічы, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 30.9.1937. Расстраляны 8.10.1937. Рэабілітаваны 25.5.1989.

ПАРАХНЕВІЧ Уладзімір Максімавіч, н. ў 1888 у в. Варатынь, рабочы мармеладнай фабрыкі. Рэпрэсіраваны 27.2.1938. Расстраляны 26.3.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 22.5.1965.

ПРАКОПЧЫК Аляксандра Кузьмінічна, н. ў 1924 у в. Варатынь. Раскулачана ў 1936. Рэабілітавана 8.11.1994.

ПРАКОПЧЫК Вольга Лаўрынаўна, н. ў 1910 у в. Варатынь. Раскулачана ў 1931. Рэабілітавана 8.11.1994.

ПРАКОПЧЫК Дзмітрый Аляксандравіч, н. ў 1901 у в. Варатынь, бухгалтар Цялушскай МТС, жыў на ст. Цялуша. Рэпрэсіраваны 27.2.1938. Расстраляны 26.3.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 25.5.1965.

ПРАКОПЧЫК Дзмітрый Лаўрынавіч, н. ў 1905, жыў у в. Варатынь. Раскулачаны ў 1931. Рэабілітаваны 8.11.1994.

ПРАКОПЧЫК Кузьма Лаўрынавіч, н. ў 1897, жыў у в. Варатынь. Раскулачаны ў 1931. Рэабілітаваны 8.11.1994.

ПРАКОПЧЫК Лаўрын Кузьміч, н. ў 1876, жыў у в. Варатынь. Раскулачаны ў 1931. Рэабілітаваны 8.11.1994.

ПРАКОПЧЫК Лізавета Рыгораўна, н. ў 1899 у в. Варатынь. Раскулачана ў 1936. Рэабілітавана 8.11.1994.

ПРАКОПЧЫК Мацвей Малахавіч, н. ў 1876 у в. Варатынь, працаваў у калгасе імя Блюхера. Рэпрэсіраваны 27.2.1938. Расстраляны 26.3.1938. Рэабілітаваны 22.5.1965.

ПРАКОПЧЫК Надзея Кузьмінічна, н. ў 1930 у в. Варатынь. Раскулачана ў 1931. Рэабілітавана 8.11.1994.

ПРАКОПЧЫК Надзея Якаўлеўна, н. ў 1910, жыла ў в. Варатынь. Раскулачана ў 1931. Рэабілітавана 8.11.1994.

ПРАКОПЧЫК Павел Данілавіч, н. ў 1897 у в. Варатынь, старшыня калгаса імя Кірава. Рэпрэсіраваны 10.8.1938, асуджаны 15.11.1938 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 19.12.1939.

ПРАКОПЧЫК Павел Кузьміч, н. ў 1928 у в. Варатынь. Раскулачаны ў 1936. Рэабілітаваны 8.11.1994.

ПРАКОПЧЫК Софія Лаўрынаўна, н. ў 1914, жыла ў в. Варатынь. Раскулачана ў 1931. Рэабілітавана 8.11.1994.

ПРАКОПЧЫК Уладзімір Кузьміч, н. ў 1921 у в. Варатынь. Раскулачаны ў 1936. Рэабілітаваны 8.11.1994.

САНЮК Стафан Васілевіч, н. ў 1887 у в. Будча Слуцкага р-на, жыў у в. Туркі, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 27.12.1932, асуджаны 28.2.1933 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 23.11.1989.

СЕЛІВОНЧЫК Нічыпар Тарасавіч, н. ў 1894 у в. Панкратавічы. Рэпрэсіраваны 7.8.1932, асуджаны 9.5.1933 на 3 гады. Памёр у ссылцы. Рэабілітаваны 5.8.1961.

СЦЯПАНАВА Еўдакія Ільінічна, н. ў 1902 у в. Туркоўская Слабада, аднаасобніца. Рэпрэсіравана 13.10.1938. Рэабілітавана 10.6.1939.

ФАМІН Раман Фёдаравіч, н. ў 1872 у в. Туркоўская Слабада. Рэпрэсіраваны 30.9.1937. Расстраляны 8.10.1937. Рэабілітаваны 5.5.1989.

ФІСЮК Герасім Іванавіч, жыў у в. Коўрын. Раскулачаны ў 1933. Рэабілітаваны 24.6.1992.

ФІСЮК Сямён Васілевіч, н. ў 1905 у в. Коўрын, працаваў у калгасе. Рэпрэсіраваны 27.12.1932, асуджаны 17.3.1933 на 3 гады. Рэабілітаваны 21.11.1959.

ФІСЮК Сяргей Карпавіч, н. ў 1902 у в. Коўрын, старшыня калгаса «1 Мая». Рэпрэсіраваны 11.9.1936, асуджаны 20.12.1936 на 3 гады. Рэабілітаваны 20.3.1990.

ХАРАНЕВІЧ Мітрафан Сідаравіч, н. ў 1906 у в. Коўрын. Рэпрэсіраваны 27.2.1938. Расстраляны 26.3.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ХАРАНЕВІЧ Сямён Мітрафанавіч, н. ў 1902 у в. Коўрын, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 27.12.1932, асуджаны 22.3.1933 на 3 гады. Рэабілітаваны 21.11.1959.

ХАРАНЕВІЧ Фёдар Мікалаевіч, н. ў 1875 у в. Коўрын, цясляр ст. Красны Бераг. Рэпрэсіраваны 27.2.1938. Расстраляны 26.3.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ЧАПЛІН Карл Іванавіч, н. ў 1888 у в. Туркі, бухгалтар торфаарцелі. Рэпрэсіраваны 23.7.1938, асуджаны 11.10.1938 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 11.9.1958.

ШАЎЦОЎ Марцін Іванавіч, жыў у в. Коўрын. Раскулачаны ў 1929. Рэабілітаваны 9.4.1993.

ШЫНКАРЭНКА Аркадзь Піліпавіч, н. ў 1916 на хутары Лясішча, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 9.10.1936, асуджаны 25.12.1936 на 3 гады турмы. Рэабілітаваны 15.11.1991.

ШЧЭРБІЧ Юлія Пятроўна, жыла ў в. Канторa. Рэпрэсіравана ў 1930. Рэабілітавана 13.2.1992.

ВІШНЁЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

АДАМОВІЧ Франц Вікенцьевіч, н. ў 1897, намеснік загадчыка мельніцы ў в. Глебава Рудня. Рэпрэсіраваны 2.8.1938. Рэабілітаваны.

АСЕЦКІ Вікенцій Сільвестравіч, н. ў 1891 у в. Продзвіна, працаваў у калгасе. Рэпрэсіраваны 5.1.1938. Расстраляны 21.2.1938. Рэабілітаваны 16.4.1959.

АСЕЦКІ Іван Венядзіктавіч, н. ў 1890 у в. Глебава Рудня, старшыня калгаса «17-ы партз'езд». Рэпрэсіраваны 25.5.1938. Расстраляны 31.7.1938 у Магілёве. Рэабілітаваны 17.9.1958.

АСЕЦКІ Эдуард Фаміч, н. ў 1898 у в. Продзвіна, жыў у в. Глебава Рудня, працаваў у калгасе «17-ы партз'езд». Рэпрэсіраваны 16.1.1933, асуджаны 10.5.1938 на 3 гады. Рэпрэсіраваны 21.9.1938. Расстраляны 28.9.1938. Рэабілітаваны 16.1.1989.

АСІПОВІЧ Віктар Канстанцінавіч, н. ў 1888 у в. Даманова, аднаасобнік, жыў у в. Емяльянаў Мост. Рэпрэсіраваны 30.9.1937. Расстраляны 8.10.1937. Рэабілітаваны 10.9.1957.

АСІПОВІЧ Іосіф Канстанцінавіч, н. ў 1899 у в. Даманова, рабочы жывёлагадоўчай гаспадаркі. Рэпрэсіраваны 26.5.1936, асуджаны 20.10.1936 на 2 гады турмы. Рэабілітаваны 2.4.1993.

АСІПОВІЧ Пётр Канстанцінавіч, н. ў 1888 у в. Даманова. Рэпрэсіраваны 28.3.1936, асуджаны 31.7.1936 на 7 гадоў. Рэабілітаваны 11.2.1959.

АСІПОВІЧ Сцяпан Канстанцінавіч, н. ў 1886 у в. Даманова. Рэпрэсіраваны 5.4.1936, асуджаны 31.7.1936 на 7 гадоў. Рэабілітаваны 11.2.1959.

АСІПОВІЧ Фелікс Паўлавіч, н. ў 1899 у в. Даманова, працаваў у калгасе. Рэпрэсіраваны 23.8.1937. Расстраляны 8.10.1938. Рэабілітаваны 9.4.1982.

АСІПОВІЧ Фларыян Дамінікавіч, н. ў 1908 у в. Даманова, працаваў у калгасе. Рэпрэсіраваны 25.3.1938. Расстраляны 27.4.1938. Рэабілітаваны 18.6.1982.

АСІПОВІЧ Фларыян Канстанцінавіч, н. ў 1876, цясляр. Рэпрэсіраваны 8.4.1936, асуджаны 30(31).6.1936 на 7 гадоў. Рэабілітаваны 11.2.1959.

АСІПОВІЧ Фларыян Паўлавіч, н. ў 1885 у в.

Даманова, працаваў у калгасе. Рэпрэсіраваны 21.9.1938. Расстраляны 28.9.1938. Рэабілітаваны 27.11.1989.

БАРЫСЕВІЧ Альберт Іосіфавіч, н. ў 1888 у в. Глебава Рудня, прыёмшчык леспрамгаса. Рэпрэсіраваны 30.9.1937. Расстраляны 8.10.1937. Рэабілітаваны 30.11.1989.

БОКІ Аляксандр Іванавіч, н. ў 1899 у в. Продзвіна. Рэпрэсіраваны 30.9.1938. Расстраляны ў 1938. Рэабілітаваны 24.12.1957.

БОКІ Аляксандр Восіпавіч, н. ў 1893 у в. Продзвіна, працаваў у калгасе. Рэпрэсіраваны 21.1.1938. Расстраляны 28.2.1938. Рэабілітаваны 18.2.1958.

БОКІ Ігнат Сцяпанавіч, н. ў 1880 у в. Глебава Рудня. Рэпрэсіраваны 12.1.1933, асуджаны 10.5.1933 на 3 гады з высылкай у Казахстан. Рэабілітаваны 21.11.1989.

БОКІ Ілья Сцяпанавіч, н. ў 1886 у в. Глебава Рудня, працаваў у калгасе «17-ы партз'езд». Рэпрэсіраваны 25.5.1938. Расстраляны 31.7.1938. Рэабілітаваны 17.9.1958.

БОКІ Іосіф Міхайлавіч, н. ў 1888 у в. Продзвіна, працаваў у калгасе. Рэпрэсіраваны 30.9.1938. Расстраляны ў 1938. Рэабілітаваны 24.12.1957.

БОКІ Марцін Восіпавіч, н. ў 1868 у в. Продзвіна, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 8.1.1938. Расстраляны 5.2.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 16.1.1989.

БОКІ Нікадаім Іванавіч, н. ў 1877 у в. Продзвіна, працаваў у калгасе. Рэпрэсіраваны 3.11.1938. Расстраляны 19.11.1938. Рэабілітаваны 15.2.1960.

БОКІ Фларыян Марцінавіч, н. ў 1903 у в. Продзвіна. Рэпрэсіраваны 27.8.1937, асуджаны 20.11.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 19.9.1958.

БОКІ Франц Іванавіч, н. ў 1890 у в. Глебава Рудня, працаваў у калгасе «17-ы партз'езд». Рэпрэсіраваны 21.1.1938. Расстраляны ў 1938. Рэабілітаваны 20.9.1961.

БОЛБАС Емяльян Міхайлавіч, н. ў 1883 у в. Казакова, працаваў у калгасе. Рэпрэсіраваны 30.9.1938. Расстраляны ў 1938. Рэабілітаваны 24.12.1957.

БОЛБАС Раман Яўхімавіч, н. ў 1900 у в. Баравая, працаваў у калгасе. Рэпрэсіраваны 30.9.1937. Расстраляны 8.10.1937. Рэабілітаваны 5.5.1989.

ВЫШМІРСКІ Даніла Іосіфавіч, н. ў 1878 у в. Глебава Рудня, працаваў у калгасе «17-ы партз'езд». Рэпрэсіраваны 21.9.1938. Расстраляны 28.9.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ГАВАРОЎСКІ Альберт Канстанцінавіч, н. ў 1898 у в. Продзвіна, плытагон Парыцкага сплаўучастка. Рэпрэсіраваны 11.11.1938. Расстраляны 29.11.1938. Рэабілітаваны 25.8.1989.

ГАРДЗЕЙЧЫК Раман Сцяпанавіч, н. ў 1899 у в. Глебава Рудня. Рэпрэсіраваны 12.1.1933, асуджаны 10.5.1933 на 3 гады. Рэабілітаваны 22.11.1989.

ГАЦКО Севасцьян Канстанцінавіч, н. ў 1895 у в. Цялуша, рабочы цагельнага завода, жыў у в. Ламы. Рэпрэсіраваны 20.11.1937. Расстраляны 6.12.1937. Рэабілітаваны 21.2.1959.

ЗІНОВІЧ Антон Францавіч, н. ў 1878 у Глускім р-не, жыў у в. Глебава Рудня, працаваў у калгасе «17-ы партз'езд». Рэпрэсіраваны 21.9.1938. Расстраляны 28.9.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 16.1.1989.

КАРАТКЕВІЧ Мікалай Ігнатавіч, н. ў 1899 у в. Глебава Рудня. Рэпрэсіраваны 12.1.1933, асуджаны 10.5.1933 на 3 гады. Рэабілітаваны 21.11.1989.

КАРАТКЕВІЧ Пётр Васілевіч, н. ў 1898 у в. Продзвіна, працаваў у калгасе. Рэпрэсіраваны 30.9.1938. Расстраляны ў 1938. Рэабілітаваны 24.12.1957.

КАРАТКЕВІЧ Яўген Міхайлавіч, н. ў 1862 у в. Глебава Рудня. Рэпрэсіраваны 12.1.1933, асуджаны 10.5.1933 на 3 гады. Рэабілітаваны 22.11.1989.

КОРСАК Рыгор Піліпавіч, н. ў 1910 у в. Вішнёўка, каваль калгаса «Савецкая Беларусь». Рэпрэсіраваны 7.6.1938, асуджаны 2.11.1938 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 21.1.1958.

КОТАВА-ВІШНЕЎСКАЯ Ксенія Сцяпанаўна, н. ў 1883 у в. Глебава Рудня. Рэпрэсіравана 17.1.1933, асуджана 10.5.1933 на 3 гады з высылкай у Казахстан. Рэабілітавана 21.11.1989.

КУЛІК Іван Герасімавіч, жыў у в. Стасеўка. Рэпрэсіраваны ў 1932. Рэабілітаваны 24.2.1993.

КУЛІК Яўхімія Іванаўна, жыла ў в. Стасеўка. Рэпрэсіравана ў 1932. Рэабілітавана 24.2.1993.

ЛАПЕЙ Карп Пятровіч, н. ў 1896 у в. Стасеўка, працаваў у калгасе імя Стасевай. Рэпрэсіраваны 16.7.1938. Рэабілітаваны 19.11.1939.

ЛУКАНСКАЯ Алена Ільінічна, н. ў 1887 у в. Глебава Рудня. Рэпрэсіравана 13.1.1933, асуджана 10.5.1933 на 3 гады ў Казахстан. Рэабілітавана 21.11.1989.

ПАГАРЖЭЛЬСКІ Іван Міхайлавіч, н. ў 1885 у в. Глебава Рудня. Рэпрэсіраваны 16.1.1933, асуджаны 10.5.1933 на 3 гады. Рэабілітаваны 21.8.1989.

ПАТАПЧЫК Фёдар Аляксандравіч, н. ў 1893 у в. Стасеўка, настаўнік. Рэпрэсіраваны 30.9.1938. Расстраляны ў 1938. Рэабілітаваны 3.12.1956.

ПАЦКЕВІЧ Браніслаў Вікенцьевіч, н. ў 1884 у в. Даманова, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 23.8.1937, асуджаны 20.11.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 15.4.1940.

ПАЦКЕВІЧ Віктар Вікенцьевіч, н. ў 1888 у в. Даманова, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 23.8.1937, асуджаны 20.11.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 15.4.1940.

ПАЦКЕВІЧ Іосіф Вікенцьевіч, н. ў 1902 у в. Даманова, бакеншчык Бабруйскага ўчастка абслу-

гоўвання рэк. Рэпрэсіраваны 23.8.1937, асуджаны 20.11.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 15.4.1940.

ПАЦКЕВІЧ Фелікс Вікенцьевіч, н. ў 1896 у в. Даманова, рабочы леспрамгаса. Рэпрэсіраваны 23.8.1937, асуджаны 20.11.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 15.4.1940.

ПАЦКЕВІЧ Франц Вікенцьевіч, н. ў 1892 у в. Даманова, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 23.8.1937, асуджаны 20.11.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 15.4.1940.

РАСОХА Іван Цімафеевіч, н. ў 1917 у в. Вішнёўка, радавы 54-га батальёна аховы штаба 34-й арміі. Рэпрэсіраваны ў лютым 1942. Расстраляны 8.3.1942. Рэабілітаваны ў 1962.

САВІЦКІ Адольф Адамавіч, н. ў 1870 у в. Глебава Рудня. Рэпрэсіраваны 16.1.1933, асуджаны 10.5.1933 на 3 гады. Рэабілітаваны 21.11.1989.

СВЕРЖ Валянцін Адольфавіч, н. ў 1884 у в. Продзвіна. Рэпрэсіраваны 23.8.1937, асуджаны 20.11.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 19.9.1958.

СВЕРЖ Ілья Віктаравіч, н. ў 1904 у в. Баравая, шэф-повар сталовай ваенгандлю ў Бабруйску. Рэпрэсіраваны ў 1948, асуджаны на 25 гадоў. Рэабілітаваны ў 1957.

СВЕРЖ Казімір Маркавіч, н. ў 1893 у в. Продзвіна, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Расстраляны 5.9.1937. Рэабілітаваны ў 1957.

СВЕРЖ Мікалай Віктаравіч, н. ў 1897 у в. Баравая, працаваў у калгасе «Ударнік». Рэпрэсіраваны 16.11.1937. Расстраляны ў 1937. Рэабілітаваны 4.3.1957.

СВЕРЖ Уладзімір Віктаравіч, н. ў 1902 у в. Баравая, працаваў у калгасе «Ударнік». Рэпрэсіраваны 17.8.1937, асуджаны 16.11.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 4.3.1957.

СВЕРЖ Фелікс Адольфавіч, н. ў 1898 у в. Продзвіна. Рэпрэсіраваны 23.8.1937, асуджаны 20.11.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 19.9.1958.

СВЕРЖ Фелікс Рафаілавіч, н. ў 1896 у в. Продзвіна, працаваў у калгасе. Рэпрэсіраваны 30.9.1938. Расстраляны ў 1938. Рэабілітаваны 24.12.1957.

СВЕРЖ Фелікс Станіслававіч, н. ў 1896 у в. Баравая, цясляр. Рэпрэсіраваны 23.8.1937, асуджаны 30.9.1937. Расстраляны 8.10.1937. Рэабілітаваны 24.11.1989.

СВЕРЖ Франц Віктаравіч, н. ў 1893 у в. Баравая, працаваў у калгасе «Ударнік». Рэпрэсіраваны 10.11.1937. Расстраляны ў 1937. Рэабілітаваны 4.3.1957.

СВЕРЖ Франц Маркавіч, н. ў 1896 у в. Продзвіна, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Расстраляны 5.9.1937. Рэабілітаваны ў 1957.

СВЕРЖ Эдуард Апалінаравіч, н. ў 1862 у в. Баравая, земляроб. Рэпрэсіраваны ў 1932. Рэабілітаваны ў 1957.

Трагедыя братоў Свержаў

Ніхто не чуў, каб браты Свержы гаварылі што-небудзь дрэннае пра савецкую ўладу. Наадварот, былі вельмі задаволены тым, што мелі і чым жылі. Хаця, калі па праўдзе казаць, то і яны нярэдка задумваліся пра тое, як няпроста жывецца сялянам. Хацелася нечага больш прыстойнага. Але яны разумелі, што толькі ў казцы ўсё хутка робіцца. А ў жыцці...

Жылі яны «кучна». Уладзімір з жонкай, двума дзецьмі і братам Мікалаем месціліся ў адной хаціне. Хата, праўда, была вялікая, але яшчэ не дабудаваная. Ці то часу не хапала, ці то браты не вельмі спяшаліся. Хоць і не лайдачылі. У калгасе работы было нямала, і ад кожнага члена сельгасарцелі патрабавалася шмат сіл. Старэйшы Франц з жонкай і іх пяцёра дзяцей жылі ў невялічкім доміку насупраць хаты, якую займалі браты Мікалай і Уладзімір. Паміж імі ніколі не было ніякіх спрэчак, недарэчнасцей. Наадварот, імкнуліся адзін аднаму дапамагчы, адзін аднаго падтрымаць, падзяліцца апошнім. Дружна жылі і іх жонкі. Францаву звалі ў Баравой Франціхай (у той час было модна клікаць гаспадынь па мужавым імені). Дзеці ж, а іх у братоў было аж дзесяць, таксама сябравалі. А калі часам і петушыліся, то нядоўга. Словам, жылі Свержы як людзі, як добрыя і шчырыя працаўнікі.

Але і да Баравой пачалі даходзіць чуткі пра так званых «ворагаў народа». Пра іх нярэдка пісалі ў газетах, гаварылі па радыё... «Ворагі народа» на прадпрыемствах, ва ўстановах, у партыйных і савецкіх органах... І вось дайшло і да вясковых жыхароў. Аказваецца, і сяляне — цёмныя і забітыя людзі — маглі аб'ядноўвацца ў нейкія фракцыі, выступаць супраць Саветаў, шпіёніць на карысць варожых дзяржаў. Часцей за ўсіх траплялі пад падазрэнне так званыя «іншаземцы». А Франц, Мікалай і Уладзімір лічыліся па дакументах палякамі (бо ў свой час многіх беларусаў імкнуліся апалячыць, далучыць да рымска-каталіцкай веры), хаця кроў у іх была беларуская. А калі так, то і аднеслі іх да людзей ненадзейных, якія гатовы былі здрадзіць радзіме пры першай жа магчымасці.

У ноч 17 ліпеня 1937 г. ў Баравую прыехаў «чорны варанок». Спынiўся каля хаціны Мікалая і Уладзіміра. Людзі ўварваліся ў дом бесцырымонна. Пачалі абрываць шпалеры, пераварочваць ложкі, абражаць гаспадароў. Вось як расказваў пра тую жудасную ноч Стэфан Мікалаевіч Сверж: «Мы ўжо спалі, як у дзверы моцна пастукалі. Аб арыштах ужо чулі, а таму адразу ж здагадаліся, што прыехалі па бацьку... Напалоханыя, залезлі на печ і пачалі ціхенька плакаць. Бацька стаяў моўчкі каля сцяны і толькі цяжка ўздыхаў. Маці плакала. Перавярнуўшы дом, начныя візіцёры забралі бацьку, а таксама дзядзьку Уладзіміра і дзядзьку Франца. Потым мы хадзілі ў Бабруйск і спрабавалі адшукаць іх ці даведацца што-небудзь пра блізкіх і дарагіх нам людзей... Але дарэмна. Нас нават да турмы не падпусцілі. А потым мы сталі дзецьмі «ворагаў народа». Мяне нават у лесатэхнікум не прынялі, хаця экзамены здаў добра. Як цяпер памятаю выкладчыка, які, кінуўшы паперы на стол, выкрыкнуў: «Дзяцей здраднікаў на вучобу не прымаем».

У афіцыйных паперах, пра якія неўзабаве стала вядома сем'ям братоў Свержаў, паведамлялася, што Мікалай і Франц прыгавораны да вышэйшай меры пакарання — расстрэлу, а Уладзімір — да дзесяці гадоў зняволення. І за што? За сувязь з бандафарміраваннямі, за крадзяжы, хуліганства і за збіванне старшыні калгаса... Усё гэта, вядома, лухта, выдумкі. А вось глядзі — аднялі ў сумленных людзей жыццё.

Нялёгка было жонкам братоў Свержаў жыць і гадаваць дзяцей. Ды толькі яны не разгубіліся, не адчаяліся. Вядома, кожнае іх дзіця нямала перажыло, кожнага ўвесь гэты час гняло адно пытанне: няўжо яны і на самой справе дзеці «ворагаў народа»? Пісалі ў розныя інстанцыі, спрабавалі даведацца праўду пра бацькоў. Ды не так аказалася ўсё проста. Толькі дзякуючы перабудове, як выказаўся Стэфан Мікалаевіч, давялося расставіць кропкі над «і». Аб рэабілітацыі стала вядома аж у канцы 1989 года. Нібы камень з сэрца зваліўся. Хоць ніхто са Свержаў малодшых ні на міг не сумняваўся ў тым, што бацькі іх былі шчырымі і сумленнымі людзьмі.

Па ініцыятыве Стэфана Мікалаевіча і яго братоў у Баравой, з дазволу мясцовых улад, на асабістыя зберажэнні ўстаноўлены мемарыяльны помнік-камень загінуўшым у гады рэпрэсій Францу, Мікалаю і Уладзіміру Свержам. І няхай ён нагадвае ўсім, што самае жудаснае, самае страшнае і недарэчнае — калі брат страляе ў брата, калі льецца кроў ні ў чым не вінаватых людзей, калі пакутуюць дзеці. Няхай трагедыя братоў Свержаў больш ніколі не паўторыцца. *Яр.Сідорын.*

СІТУЛАЎ Пётр Іванавіч, н. ў 1895 у в. Даманова, працаваў у калгасе. Рэпрэсіраваны 26.2.1938. Расстраляны 25.3.1938. Рэабілітаваны 9.4.1963.

ТРАЦЭЎСКІ Адольф Антонавіч, н. ў 1904 у в. Глебава Рудня. Рэпрэсіраваны 12.1.1933, асуджаны 10.5.1933 на 3 гады. Рэабілітаваны 22.11.1989.

ТРАЦЭЎСКІ Фелікс Людвігавіч, н. ў 1885 у в. Продзвіна, працаваў у калгасе. Рэпрэсіраваны 30.9.1938. Расстраляны ў 1938. Рэабілітаваны 24.12.1957.

ФЕЙБЕРГ Лейзер Давыдавіч, н. ў 1903 у в. Даманова, начальнік аддзялення Белдзяржзаб у Бабруйску. Рэпрэсіраваны ў 1936, асуджаны на 5 гадоў. Рэабілітаваны ў 1957.

ХАРЧАНКА Софія Аляксандраўна, н. ў 1912 у в. Продзвіна, працавала ў калгасе. Рэпрэсіравана 27.10.1945, асуджана на 5 гадоў з высылкай у Краснаярскі край. Рэабілітавана 13.8.1990.

ХЛАНЬ Мікалай Мікалаевіч, н. ў 1893 у в. Глебава Рудня. Рэпрэсіраваны 12.1.1933, асуджаны 10.5.1933 на 3 гады. Рэабілітаваны 21.11.1989.

ШУСТАВА Сцепаніда Міхайлаўна, н. ў 1879 у в. Глебава Рудня. Рэпрэсіравана 12.1.1933, асуджана 10.5.1933 на 3 гады. Рэабілітавана 22.11.1989.

ШУСТАЎ Сяргей Канстанцінавіч, н. ў 1895 у в. Глебава Рудня. Рэпрэсіраваны 12.1.1933, асуджаны 10.5.1933 на 3 гады з высылкай у Казахстан. Рэабілітаваны 22.11.1989.

ЯНКОЎСКІ Аляксандр Рыгоравіч, н. ў 1884 у в. Продзвіна. Рэпрэсіраваны 20.1.1938. Расстраляны 8.3.1938. Рэабілітаваны 17.12.1957.

ЯНКОЎСКІ Фёдар Сцяпанавіч, н. ў 1898 у в. Продзвіна, дзесятнік дарбуда 702 у Бабруйскім р-не. Рэпрэсіраваны 20.1.1938. Расстраляны ў 1938. Рэабілітаваны 10.12.1957.

ГАРБАЦЭВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

АНДРЫЕЎСКІ Якаў Пракоф'евіч, н. ў 1896 на хутары Астравы, калгаснік. Рэпрэсіраваны 21.5.1936, асуджаны 31.7.1936 на 1 год. Рэабілітаваны 11.2.1959.

АНДРЭЕЎ Аркадзь Паўлавіч, н. ў 1909 у в. Заглыбокае, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 26.11.1930, асуджаны 26.12.1930 на 3 гады. Рэабілітаваны 16.1.1989.

АНДРЭЕЎ Павел Рыгоравіч, н. ў 1867 у в. Гай Віленскай губерні, аднаасобнік, жыў у в. Заглыбокае. Рэпрэсіраваны 26.11.1930, асуджаны 26.12.1930 на 3 гады. Рэабілітаваны 16.1.1989.

АНДРЭЕЎ Пётр Паўлавіч, н. ў 1897, працаваў у калгасе «Заглыбокае». Рэпрэсіраваны 6.8.1937, асуджаны 17.9.1937. Расстраляны ў 1937. Рэабілітаваны 1.6.1962.

АНДРЭЕЎ Савацей Ягоравіч, н. ў 1914 у р

Заглыбокае, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 26.12. 1930 на тры гады. Рэабілітаваны 16.1.1989.

АНТАНІКОЎСКАЯ-БУХЦІЯРАВА Фамаіда Пятроўна, н. ў 1892 у в. Гарбацэвічы, настаўніца. Рэпрэсіравана 24.4.1921, асуджана 7.6.1921 на 5 гадоў. Рэабілітавана 6.6.1991.

АРЦЁМЧЫК Ганна Ігнатаўна, жыла ў в. Атрошкавічы. Рэпрэсіравана ў 1930. Рэабілітавана 22.12.1992.

АРЦЁМЧЫК Ігнат Аляксеевіч, жыў у в. Атрошкавічы. Рэпрэсіраваны ў 1930. Рэабілітаваны 22.12.1992.

АРЦЁМЧЫК Софія Максімаўна, жыла ў в. Атрошкавічы. Рэпрэсіравана ў 1930. Рэабілітавана 22.12.1992.

АСІПОВІЧ Вячаслаў Фёдаравіч, н. ў 1908 у в. Емяльянаў Мост, працаваў у калгасе «Ленінскі шлях». Рэпрэсіраваны 1.4.1936, асуджаны 31.7. 1936 на 4 гады. Рэабілітаваны 11.2.1959.

АСТРОЎСКІ Іосіф Мікалаевіч, н. ў 1894 у в. Емяльянаў Мост, працаваў у калгасе «Ленінскі шлях». Рэпрэсіраваны 13.4.1936, асуджаны 31.8. 1936 на 7 гадоў. Рэабілітаваны 11.2.1959.

БАРОДЗІЧ Захар Дамітрыевіч, н. ў 1874 у в. Пабокавічы, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 28.11. 1930, асуджаны 28.12.1930, высланы ў Сібір. Рэабілітаваны 16.1.1989.

БАРОДЗІЧ Рыгор Мацвеевіч, н. ў 1873 у в. Пабокавічы, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 22.2.1931, асуджаны 26.2.1931, высланы ў Сібір. Рэабілітаваны 16.1.1989.

БАРОДЗЬКА Фёкла Іванаўна, н. ў 1867 у в. Рагалі, жыла ў в. Пабокавічы. Рэпрэсіравана 26.11. 1930, асуджана 26.12.1930. Рэабілітавана 16.1. 1989.

БАЦЮТА Фадзей Апанасавіч, н. ў 1894 у в. Барсукі, рабочы райдарадздзела. Рэпрэсіраваны 10.12.1937, асуджаны 16.2.1938. Расстраляны ў 1938. Рэабілітаваны 23.4.1960.

БУДНІК Сцяпан Андрэевіч, н. ў 1895 у в. Пабокавічы, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 20.5.1930, асуджаны 13.7.1930 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 17.11.1989.

БУЛГАК Іосіф Ігнатавіч, н. ў 1887 у в. Пабокавічы. Рэпрэсіраваны 31.3.1929, асуджаны 19.6.1929 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 4.8.1958.

ВАЛОДЗЬКА Міхаіл Кірылавіч, н. ў 1858 у в. Пабокавічы, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 26.11. 1930, асуджаны 26.12.1930. Рэабілітаваны 16.1. 1989.

ВАЛОДЗЬКА Фёдар Кірэевіч, н. ў 1879 у в. Пабокавічы. Раскулачаны ў 1930. Рэабілітаваны 22.1.1992.

ВАРАБ'ЁЎ Давыд Дарафеевіч, н. ў 1888 у в. Багушоўка. Рэпрэсіраваны 10.12.1937, асуджаны 16.2.1938. Расстраляны ў 1938. Рэабілітаваны 23.4.1960.

ВЯРБІЦКІ Пётр Якаўлевіч, н. ў 1898 у в. Пабокавічы. Рэпрэсіраваны 10.12.1937. Расстраляны 28.2.1938. Рэабілітаваны 7.9.1971.

ГАЛАВАЧ Антаніна Фёдараўна, н. ў 1926 у в. Пабокавічы. Рэпрэсіравана 1.4.1946 на 3 гады. Рэабілітавана 20.8.1991.

ГАЛАВАЧ Галіна Мацвееўна. Рэпрэсіравана ў 1929, выслана ў Свярдлоўскую вобл. Рэабілітавана 4.3.1992.

ГАЛАВАЧ Клаўдзія Дамітрыеўна, н. ў 1918 у в. Пабокавічы, рабочая цагельнага завода ў Бабруйску. Рэспрэсіравана ў 1946, асуджана на 6 гадоў. Рэабілітавана ў 1962.

ГАЛАВАЧ Лізавета Пятроўна, н. ў 1893 у в. Пабокавічы. Рэпрэсіравана 1.4.1946, асуджана 1.4.1946 на 3 гады. Рэабілітавана 20.8.1991.

ГАЛАВАЧ Фёдар Мацвеевіч, н. ў 1890 у в. Пабокавічы, працаваў у калгасе. Рэпрэсіраваны 1.4.1946, асуджаны 1.4.1946 на 3 гады. Рэабілітаваны 20.8.1991.

ГАРДЗІЕВІЧ Віктар Якаўлевіч, н. ў 1880 у в. Язвіна Капыльскага р-на, жыў у в. Крушынка. Рэпрэсіраваны 21.7.1938, асуджаны 15.10.1938. Расстраляны 6.11.1938. Рэабілітаваны 9.5.1989.

ГНІДЭНКА Рыгор Дамітрыевіч, н. ў 1898 у с. Тарнава Манастыршчынскага р-на Смаленскай вобл., святар, жыў у в. Гарбацэвічы. Рэпрэсіраваны 17.12.1949, асуджаны 20.4.1950. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ГРУЗДАВА Ангеліна Трафімаўна, н. ў 1916 у в. Крушынка, механізатар у калгасе. Рэпрэсіравана 18.1.1945, асуджана 5.2.1945 на 6 гадоў. Рэабілітавана 5.3.1947.

ГРЫНЬ Сяргей Фёдаравіч, н. ў 1874, аднаасобнік, жыў у в. Брожка. Рэпрэсіраваны 8.6.1938. Расстраляны. Рэабілітаваны 28.12.1959.

ГУДКОЎСКІ Вацлаў Андрэевіч, н. ў 1884 у в. Уюнішча Глускага р-на, працаваў у калгасе «Энергія камунізма», жыў у в. Міхайлаўка. Рэпрэсіраваны 11.7.1938, асуджаны 15.11.1938. Расстраляны 20.11.1938. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ГУРСКІ Яўген Аляксандравіч, н. ў 1920 у в. Гарбацэвічы. Студэнт 5-га курса аграфака БСГА (Горкі). Рэпрэсіраваны ў 1950, асуджаны на 25 гадоў. Рэабілітаваны ў 1956.

ДЗЕЙКА Фядосій (Фадзей) Ціханавіч, н. ў 1903 у в. Барсукі. Рэпрэсіраваны 16.2.1938. Расстраляны ў 1938. Рэабілітаваны 1.8.1992.

ДЗЫГУН Андрэй Кірэевіч, н. ў 1879 у в. Пабокавічы, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 20.10.1928, асуджаны. Рэабілітаваны 6.6.1991.

ДРОБАЎ Рыгор Захаравіч, н. ў 1890 у в. Багушоўка, працаваў у калгасе. Рэпрэсіраваны 22.11.1937. Расстраляны ў 1937. Рэабілітаваны 8.11.1958.

ЕМЯЛЬЯНАВА Антаніна Пятроўна, н. ў 1897 у в. Буда. Рэпрэсіравана ў 1930. Рэабілітавана 11.1.1993.

ЕМЯЛЬЯНАВА-КІХЦЯ Феціпія Тарасаўна, н. ў 1924 у в. Буда. Рэпрэсіравана ў 1930. Рэабілітавана 11.1.1993.

ЕМЯЛЬЯНАЎ Мялецій Тарасавіч, н. ў 1929 у в. Буда. Рэпрэсіраваны ў 1930. Рэабілітаваны 11.1.1993.

ЕМЯЛЬЯНАЎ Сямён Тарасавіч, н. ў 1916 у в. Буда. Рэпрэсіраваны ў 1930. Рэабілітаваны 11.1.1993.

ЕМЯЛЬЯНАЎ Тарас Сямёнавіч, н. ў 1880 у в. Буда, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 15.2.1930, асуджаны 6.3.1930. Рэабілітаваны 21.11.1989.

ЕРМАКОЎ Рыгор Іванавіч, н. ў 1888 у в. Пабокавічы. Рэпрэсіраваны 21.7.1936, асуджаны 14.10.1936 на 1,5 гадоў. Рэабілітаваны 15.2.1961.

ЖУКАЎ Рыгор Мікітавіч, н. ў 1893 у в. Заглыбокае, працаваў у калгасе «Заглыбокае». Рэпрэсіраваны 6.8.1937, асуджаны 17.9.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 1.6.1962.

ЗУБОВІЧ Антон Фіяфілавіч, н. ў в. Багуслаўка. Рэпрэсіраваны ў 1932. Рэабілітаваны 3.1.1992.

ЗЯЛЕНСКАЯ Антаніна Феліксаўна, жыла ў в. Емяльянаў Мост. Раскулачана ў 1929. Рэабілітавана 17.8.1993.

ЗЯЛЕНСКАЯ Мальвіна Восіпаўна, жыла ў в. Емяльянаў Мост. Раскулачана ў 1929. Рэабілітавана 17.8.1993.

ЗЯЛЕНСКАЯ Яніна Феліксаўна, жыла ў в. Емяльянаў Мост. Раскулачана. Рэабілітавана 17.8.1993.

ЗЯЛЕНСКІ Фелікс Іванавіч, жыў у в. Емяльянаў Мост. Раскулачаны ў 1929. Рэабілітаваны 17.8.1993.

КАВАЛЕНКА Апанас Іванавіч, н. ў 1884 у в. Буда, жыў у в. Барсукі, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 15.2.1930, асуджаны 6.3.1930. Рэабілітаваны 21.11.1989.

КАВАЛЕНКА Іван Архіпавіч, н. ў 1904 у в. Буда. Рэпрэсіраваны. Расстраляны. Рэабілітаваны 18.10.1958.

КАЛЕСНІКАЎ Іосіф Пятровіч, н. ў 1877, жыў у в. Барсукі. Рэпрэсіраваны 16.2.1938. Расстраляны ў 1938. Рэабілітаваны 1.8.1958.

КАЛЕСНІКАЎ Сямён Іванавіч, н. ў 1910 у в. Барсукі. Рэпрэсіраваны 16.2.1938. Расстраляны ў 1938. Рэабілітаваны 1.8.1958.

КАЛЕСНІКАЎ Ціхан Пятровіч, н. ў 1884 у в. Слабодка Глускага р-на, жыў у в. Барсукі, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 15.2.1930, асуджаны 6.3.1930. Рэабілітаваны 21.11.1989.

КЛЮЙКО Аляксандр Сямёнавіч, жыў у в. Багуслаўка. Раскулачаны ў 1930. Рэабілітаваны 26.5.1993.

КОРЗУН Ігнат Баляслававіч, н. ў 1901 у в. Мачулкі, рабочы лесапільнага завода. Рэпрэсіраваны 23.8.1937. Расстраляны 6.12.1937. Рэабілітаваны 25.2.1958.

КОРЗУН Іосіф Баляслававіч, н. ў 1888 у в. Мачулкі, работнік магазіна калгаса «Зара». Рэпрэсіраваны 23.8.1937. Расстраляны 16.12.1937. Рэабілітаваны 25.2.1958.

КОРСАК Пётр Іванавіч, н. ў 1901 у Віленскай губерні, жыў у в. Маяк, працаваў у калгасе. Рэпрэсіраваны 31.8.1938. Расстраляны 5.10.1938. Рэабілітаваны 25.7.1989.

КУРЫЛЬНІК Іван Рыгоравіч, н. ў 1912 у в. Гарбацэвічы. Рэпрэсіраваны 27.3.1934, асуджаны 8.4.1934 на 8 гадоў. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ЛАБАНАЎ Рыгор Аляксандравіч, н. ў 1856 у в. Гай Віленскай губерні, жыў у в. Барсукі, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 15.2.1930, асуджаны 6.3.1930. Рэабілітаваны 21.11.1989.

ЛІСНЕЎСКАЯ Петранэля Мікалаеўна, н. ў 1919 у в. Емяльянаў Мост, рабочая торфазавода «Туголіца». Рэпрэсіравана 18.12.1946 на 5 гадоў з высылкай у Краснадарскі край. Рэабілітавана 13.8.1990.

ЛІСНЕЎСКІ Яўген Георгіевіч, жыў у в. Емяльянаў Мост. Раскулачаны ў 1930. Рэабілітаваны 6.7.1992.

ЛІСОЎСКІ Патап Фёдаравіч, н. ў 1850 у в. Нова-Мікалаеўка Віленскай губерні, жыў у в. Слабодка, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 15.2.1930, асуджаны 6.3.1930. Рэабілітаваны 21.11.1989.

ЛУКАШЭВІЧ Мікалай Фёдаравіч, н. ў 1912 у в. Пабокавічы, жыў на хутары Бярэзавічы, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 2.9.1937, асуджаны 17.12.1937. Расстраляны 13.1.1938 у Бабруйску. Рэабілітаваны 3.1.1984.

МАЛІШЭЎСКАЯ Софія Людвігаўна, н. ў 1883 у в. Барок. Рэпрэсіравана 3.11.1929, асуджана 15.12.1929 на 3 гады з высылкай у Сібір. Рэабілітавана 14.1.1962.

МАЛІШЭЎСКІ Люцыян Адамавіч, н. ў 1873 у в. Барок. Рэпрэсіраваны 11.9.1929, асуджаны 15.12.1929 на 3 гады з высылкай у Сібір. Рэабілітаваны 14.1.1962.

МІКЛУШ Віктар Вікенцьевіч, н. ў 1876, жыў у в. Селішча, святар. Рэпрэсіраваны 23.2.1933. Расстраляны у 1933. Рэабілітаваны 17.6.1961.

МІХНЕВІЧ Фелікс Феліксавіч, н. ў 1928 у в. Гарбацэвічы, шафёр. Рэпрэсіраваны 7.1.1937, асуджаны 31.1.1947 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 13.8.1959.

МУРАЎЁЎ Іван Васілевіч, н. ў 1910 у в. Заглыбокае, працаваў у калгасе «Заглыбокае». Рэпрэсіраваны 6.8.1937. Расстраляны 28.9.1937. Рэабілітаваны 1.6.1962.

НАВІЦКІ Анфіл Сяргеевіч, н. ў 1903 у в. Буда, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 15.2.1930, асуджаны 6.3.1930. Рэабілітаваны 21.11.1989.

НАЙДУН Мікалай Ігнатавіч, н. ў 1883 у в. Пабокавічы. Рэпрэсіраваны ў 1933, зняволены. Памёр у 1962. Рэабілітаваны 14.1.1992.

НОВІКАЎ Міхаіл Канстанцінавіч, н. ў 1883 у в. Брожка. Раскулачаны ў 1930. Рэабілітаваны 8.6.1993.

ОКРУТ Мікалай Сцяпанавіч, н. ў 1903 на хутары Папялянка. Рэпрэсіраваны 20.6.1938. Расстраляны 20.11.1938. Рэабілітаваны 15.3.1961.

РАМАНОВІЧ Радзівон Гардзеевіч, н. ў 1902 у в. Макаравічы, грузчык лесаўчастка. Рэпрэсіраваны 29.4.1938. Расстраляны 20.11.1938. Рэабілітаваны 28.11.1957.

РАНЦАЎ Пётр Ліпатавіч, н. ў 1910 у в. Буда, грузчык завода імя Войтава, жыў у пасёлку завода. Рэпрэсіраваны 17.9.1937. Расстраляны 2.10.1937 у Бабруйску. Рэабілітаваны 16.1.1989.

РАНЦАЎ-РАНЦОЎ Ліпацій Ермалаевіч, н. ў 1870 у в. Мураўёўка Ашмянскага р-на Гродзенскай вобл., жыў у в. Буда, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 15.2.1930, асуджаны 6.3.1930. Рэабілітаваны 21.11.1989.

РОСЛІК Алена Васілеўна, н. ў 1902 у в. Атрошкавічы. Раскулачана ў 1930. Рэабілітавана 5.5. 1993.

РОСЛІК Васіль Міронавіч, н. ў 1898 у в. Атрошкавічы. Раскулачаны ў 1930. Рэабілітаваны 5.5. 1993.

САСІЦКІ Сцяпан Сцяпанавіч, н. ў 1891 у в. Буда. Рэпрэсіраваны 17.12.1920, асуджаны 12.9. 1922 на 2 гады. Рэабілітаваны 23.9.1992.

СЕЎБА Павел Мікалаевіч, н. ў 1883 у в. Харошае, рэлігійны служка. Рэпрэсіраваны 10.12.1937. Расстраляны 14.3.1938. Рэабілітаваны 23.4.1960.

СІДАРОВІЧ Пётр Парфёнавіч, жыў у в. Пабокавічы. Раскулачаны ў 1930. Рэабілітаваны 22.12. 1992.

СІДАРЭНКА Марыя Палікарпаўна, н. ў 1900 у в. Брожа, жыла ў в. Емяльянаў Мост, працавала ў калгасе. Рэпрэсіравана 24.11.1945, асуджана 24.11.1945 на 3 гады. Рэабілітавана 14.10.1991.

СІМАНОВІЧ Лідзія Нікадзімаўна, н. ў 1926 у в. Багушоўка, афіцыянтка в/ч 01377. Рэпрэсіравана 7.2.1946, асуджана 26.3.1946 на 3 гады. Рэабілітавана 24.2.1993.

СКАРАХОД Канстанцін Васілевіч, н. ў 1895 у в. Багуслаўка, жыў у в. Дубралева Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 19.11.1937, асуджаны 23.11. 1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 20.11.1989.

СТАНКЕВІЧ Раіса Уладзіміраўна, н. ў 1920 у в. Емяльянаў Мост. Раскулачана ў 1931. Рэабілітавана 12.1.1993.

СТАНКЕВІЧ Уладзіслаў Адамавіч, н. ў 1873 у в. Емяльянаў Мост. Раскулачаны ў 1931. Рэабілітаваны 12.1.1993.

СТАНКЕВІЧ Францішка Ігнатаўна, н. ў 1882 у в. Емяльянаў Мост. Раскулачана ў 1931. Рэабілітавана 12.1.1993.

СЦЕПАНОВІЧ Фёдар Андрэевіч, н. ў 1864 у в. Пакроўка, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 12.2. 1930. Расстраляны ў 1930. Рэабілітаваны 16.1.1989.

СЯЛІЦКІ Іосіф Францавіч, н. ў 1893 у в. Пабокавічы, рабочы леспрамгаса Мірадзінскага ўчастка. Рэпрэсіраваны 21.7.1936, асуджаны 14.10.1936 на 3 гады. Рэабілітаваны 15.2.1961.

СЯНЮК Пётр Рыгоравіч, н. ў 1890 у в. Макаравічы, грузчык лесаўчастка. Рэпрэсіраваны 29.4. 1938. Расстраляны 20.11.1938. Рэабілітаваны 28.11.1957.

ТАНЕНЯ Карней Яўстратавіч, н. ў 1893 у в. Макаравічы, грузчык Брожскага медпункта. Рэпрэсіраваны 25.7.1937. Расстраляны 9.9.1937. Рэабілітаваны 16.5.1959.

ЦЫЯЛКОЎСКІ Станіслаў Ільіч, н. ў 1883 у в. Гарбацэвічы. Рэпрэсіраваны 28.3.1933. Расстраляны ў 1933. Рэабілітаваны 5.8.1960.

ЦЯРЭНЦЬЕЎ Канстанцін Трафімавіч, н. ў 1898 у в. Заглыбокае, працаваў у калгасе «Заглыбокае». Рэпрэсіраваны 6.8.1937, асуджаны 17.9.1937. Расстраляны. Рэабілітаваны 1.6.1962.

ЦЯРЭНЦЬЕЎ Карп Яўхімавіч, н. ў 1906 у в. Заглыбокае, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 1.12.1930, асуджаны 26.12.1930 на 3 гады. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ШАРСНЁЎ Аляксандр Іванавіч, н. ў 1892 у в. Обча, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 15.2.1930, асуджаны 6.3.1930 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 24.11.1958.

ШЧЫГЕЛЬСКІ Міхаіл Ціханавіч, н. ў 1886 у в. Обча, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 16.2.1930, асуджаны 6.3.1930. Памёр у 1954. Рэабілітаваны 24.11.1958.

ШЧЭРБІЧ Фёдар Дзмітрыевіч, н. ў 1886 у в. Селішча, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 10.2.1930. Расстраляны ў 1930. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ЮШКЕВІЧ Антон Яфімавіч, н. ў 1907 у в. Брожка, жыў у пас. Надзеева, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 26.8.1937. Расстраляны 5.9.1937. Рэабілітаваны 23.11.1959.

ЯБЛОНСКІ Міхаіл Васілевіч, н. ў 1899 у в. Брожка, бухгалтар райспажыўсаюза. Рэпрэсіраваны 30.9.1938. Расстраляны 10.10.1938. Рэабілітаваны 24.12.1957.

ЯЦКЕВІЧ Сцяпан Карпавіч, н. ў 1892 у в. Емяльянаў Мост, працаваў у калгасе. Рэпрэсіраваны 13.4.1936, асуджаны 31.7.1936 на 4 гады. Рэабілітаваны 11.2.1959.

ГАРОХАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

БАРАДЗІН Міхаіл Мікалаевіч, н. ў 1904 у в. Мачулкі, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 28.3.1930, асуджаны 15.4.1930. Рэабілітаваны 12.4.1989.

БУЛАЦКІ Нічыпар Дзмітрыевіч, н. ў 1905 у в. Мачулкі, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 28.3.1930, асуджаны 15.4.1930. Рэабілітаваны 12.4.1989.

БЯРАСНЕВІЧ Ефрасіння Захараўна, жыла ў в. Макараўка. Раскулачана ў 1931. Рэабілітавана 23.3.1993.

ГАРДЗІЕВІЧ Альбін Адамавіч, н. ў 1905 у в. Фартуны, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 6.8.1937. Расстраляны 7.9.1937. Рэабілітаваны 11.5.1989.

ГЛІНСКІ Іосіф Сцяпанавіч, н. ў 1886 у в. Карытнае, жыў у в. Малая Каменка. Рэпрэсіраваны 8.7.1938. Расстраляны 19.11.1938. Рэабілітаваны 11.6.1957.

ГОРБЕЛЬ Настасся Піліпаўна, н. ў 1909 у в.

Рымаўцы, жыла ў пас. Масты, хатняя гаспадыня. Рэпрэсіравана 17.2.1950, асуджана 6.9.1950 на 5 гадоў. Рэабілітавана 28.11.1964.

ГУРЫН Міхаіл Ільіч, жыў у в. Лагадаўка. Раскулачаны ў 1932. Рэабілітаваны 22.4.1993.

ГУРЫНОВІЧ Іван Міхайлавіч, н. ў 1918 у в. Аколіца, чырвонаармеец 36-га артдывізіёна. Рэпрэсіраваны 26.7.1935, асуджаны 31.8.1935 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 25.7.1977.

ГУРЫНОВІЧ Міхаіл Міхайлавіч, н. ў 1910 у в. Аколіца, працаваў у калгасе «16 год Кастрычніка». Рэпрэсіраваны 18.6.1938, асуджаны 30.9.1938. Расстраляны ў 1938. Рэабілітаваны 24.12.1957.

ДЗІВАК Антон Усцінавіч, н. ў 1888 у в. Ляды, працаваў у калгасе. Рэпрэсіраваны 7.7.1938. Расстраляны 6.11.1938. Рэабілітаваны 17.8.1959.

ЗАМБРЖЫЦКІ Іван Міхайлавіч, н. ў 1880 у в. Фартуны. Рэпрэсіраваны 20.1.1938. Расстраляны 8.3.1938. Рэабілітаваны 3.8.1989.

КАРАТКЕВІЧ Віктар Сцяпанавіч, н. ў 1906 у в. Аколіца, працаваў у калгасе. Рэпрэсіраваны 2.7.1938. Расстраляны ў 1938. Рэабілітаваны 24.12. 1957.

КАРАТКЕВІЧ Франц Сцяпанавіч, н. ў 1897 у в. Аколіца, працаваў у калгасе. Рэпрэсіраваны ў чэрвені 1938. Расстраляны ў 1938. Рэабілітаваны 24.12.1957.

КОЖЫН Іван Максімавіч, н. ў 1901 у в. Круглоніва, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 3.2.1933, асуджаны 10.5.1933, высланы на 3 гады ў Казахстан. Рэабілітаваны 16.1.1989.

КРУК Адам Емяльянавіч, н. ў 1909 у в. Макараўка, ваеннаслужачы 54-га батальёна аховы штаба 34-й арміі. Рэпрэсіраваны ў студзені 1942. Расстраляны 8.3.1942. Рэабілітаваны ў 1962.

ЛАПКО Іван Іванавіч, н. ў 1870 у в. Круглоніва. Рэпрэсіраваны 6.8.1937. Расстраляны 5.9.1937. Рэабілітаваны 15.5.1989.

ЛЕВАНОВІЧ Канстанцін Іосіфавіч, н. ў 1877 у в. Круглоніва, працаваў у калгасе. Рэпрэсіраваны 3.2.1933, асуджаны 10.5.1933 на 3 гады. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ЛІПІНСКІ Віктар Фларыянавіч, н. ў 1885 у в. Аколіца, працаваў у калгасе. Рэпрэсіраваны 18.6.1938. Расстраляны ў 1938. Рэабілітаваны 24.12.1957.

ЛІПІНСКІ Віталь (Вітольд) Казіміравіч, н. ў 1902 у в. Пятровічы, жыў у в. Аколіца, рахункавод калгаса. Рэпрэсіраваны 16.11.1937. Расстраляны 28.2.1938. Рэабілітаваны 28.1.1958.

МІРОНЧЫК Максім Піліпавіч, н. ў 1886 у в. Макараўка. Працаваў у калгасе «Рассвет». Рэпрэсіраваны ў 1945. Рэабілітаваны ў 1945.

ПАЛАШАВЕЦ Аляксандр Саўкавіч, н. ў 1901 у в. Рагаселле, працаваў у калгасе. Рэпрэсіраваны 21.5.1936, асуджаны 31.7.1936 на 1 год. Рэабілітаваны 11.2.1959.

ПАПРУГА Макар Аляксеевіч, жыў у в. Пятровічы. Раскулачаны ў 1933. Рэабілітаваны 9.3.1993.

ПУХАЛЬСКІ Станіслаў Іосіфавіч, н. ў 1907 у в. Ясень. Рэпрэсіраваны 2.3.1938, асуджаны 14.3. 1938. Расстраляны 31.3.1938. Рэабілітаваны 1.6. 1962.

РАЖНОЎСКІ Сцяпан Казіміравіч, н. ў 1885 у в. Малая Каменка, працаваў у калгасе. Рэпрэсіраваны 1.5.1936, асуджаны 28.7.1936 на 3 гады. Рэабілітаваны 18.4.1990.

РАТКЕВІЧ Людвіг Ігнатавіч, н. ў 1905 у в. Аколіца, працаваў у калгасе. Рэпрэсіраваны 17.7.1938, асуджаны 30.9.1938 на 10 гадоў. Памёр 15.11.1941. Рэабілітаваны 24.12.1957.

РУДЗЬКО Дзям'ян Піліпавіч, н. ў 1905 у в. Мачулкі, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 28.3.1930, асуджаны 15.4.1930. Рэабілітаваны 12.4.1989.

РЭКІШ Іван Майсеевіч, н. ў 1897 у в. Рымаўцы. Рэпрэсіраваны ў 1932. Рэабілітаваны 31.8. 1992.

САКАЛОЎСКІ Іван Аляксандравіч, н. ў 1892 у в. Аколіца, працаваў у калгасе. Рэпрэсіраваны ў сакавіку 1938, асуджаны 30.9.1938. Расстраляны ў 1938. Рэабілітаваны 24.12.1957.

САКАЛОЎСКІ Канстанцін Адамавіч, н. ў 1902 у в. Пятровічы, працаваў у калгасе «16 год Кастрычніка». Рэпрэсіраваны 10.2.1938, асуджаны 16.2.1938. Расстраляны 14.3.1938. Рэабілітаваны 27.6.1960.

САЛАВЕЙ Сцяпан Паўлавіч, н. ў 1900 у в. Аколіца. Рэпрэсіраваны ў 1938. Расстраляны ў 1938. Рэабілітаваны 24.12.1957.

СЦЕПАНОВІЧ Якаў Фёдаравіч, н. ў 1890 у в. Пакроўка. Рэпрэсіраваны 19.2.1930, асуджаны 12.8.1930. Расстраляны. Рэабілітаваны 16.1.1989.

СЦЯПУРА Адальфіна Напалеонаўна, н. ў 1906 у в. Ясень. Рэпрэсіравана ў 1931, выслана ў Пермскую вобл. Рэабілітавана 9.4.1992.

СЦЯПУРА Дзям'ян Юльянавіч, н. ў 1906 у в. Ясень, жыў у в. Фартуны, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 6.9.1937, асуджаны 17.9.1937. Расстраляны 28.9.1937 у Бабруйску. Рэабілітаваны 5.11.1989.

ТУРКО Іван Антонавіч, н. ў 1883 у в. Стаўбцы Мінскай вобл., жыў у в. Круглоніва, працаваў у калгасе «Круглоніва». Рэпрэсіраваны 8.2.1933, асуджаны 10.5.1933 з высылкай на 3 гады ў Казахстан. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ТУРКО Канстанцін Антонавіч, н. ў 1879 у в. Стаўбцы Мінскай вобл., жыў у в. Круглоніва, працаваў у калгасе «Крутглоніва». Рэпрэсіраваны 3.2.1933, асуджаны 10.5.1933 з высылкай на 3 гады ў Казахстан. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ТУРКО Сямён Антонавіч, н. ў 1890 у в. Круглоніва, працаваў у калгасе «Зара». Рэпрэсіраваны 3.2.1933, асуджаны 10.5.1933 з высылкай на 3 гады ў Казахстан. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ШАРДЫКА Васіль Дарафеевіч, н. ў 1885 у в. Рымаўцы, жыў у пас. Глуша. Рэпрэсіраваны 30.9.1939, асуджаны 25.1.1940 на 8 гадоў турмы. Рэабілітаваны 3.7.1990.

ЭСМАНТОВІЧ Антон Адольфавіч, н. ў 1897 у в. Ясень. Рэпрэсіраваны 16.12.1937. Расстраляны ў 1938. Рэабілітаваны 3.12.1956.

ГЛУШАНСКІ ПАСЯЛКОВЫ САВЕТ

АЛЬШЭЎСКІ Рыгор Іванавіч, н. ў 1891 у в. Новая Гута Віленскай губерні, рабочы шклозавода «Камінтэрн». Рэпрэсіраваны 26.4.1932, асуджаны 8.10.1932. Рэабілітаваны 16.1.1989.

АНЦІХАНОВІЧ Георгій Сцяпанавіч, н. ў 1900 у пас. Глуша, камандзір берагавой базы Находка. Рэпрэсіраваны ў 1938, асуджаны на 5 гадоў. Рэабілітаваны ў 1939.

АСТРОЎСКІ Адам Юр'евіч, н. ў 1871 у с. Душава Капыльскага р-на, рабочы шклозавода «Камінтэрн», жыў у пас. Глуша. Рэпрэсіраваны 8.4.1938. Рэабілітаваны 22.4.1938.

БІСКУНКЕВІЧ Франц Валянцінавіч, н. ў 1896 у в. Руда Холмскага ўезда, жыў у пас. Глуша, майстар шклозавода «Камінтэрн». Рэпрэсіраваны 8.4.1932, асуджаны 8.10.1932. Рэабілітаваны 16.1.1989.

БЫЧКОЎСКІ Іван Пятровіч, н. ў 1895 у пас. Глуша, начальнік змены шклозавода «Камінтэрн». Рэпрэсіраваны 20.3.1938. Расстраляны ў 1938. Рэабілітаваны 3.12.1956.

ВІЛЬЧЫНСКАЯ Леакадзія Людвігаўна, н. ў 1903 у мяст. Ракаў Мінскай вобл., жыла ў пас. Глуша, выхавальніца дзіцячых ясляў шклозавода «Камінтэрн». Рэпрэсіравана 23.8.1937. Расстраляна 15.11.1937 у Мінску. Рэабілітавана 16.1.1989.

ВІЛЬЧЫНСКІ Іосіф Людвігавіч, н. ў 1890 у пас. Глуша, шкловыдзімальшчык завода «Камінтэрн». Рэпрэсіраваны 9.11.1937. Расстраляны ў 1937. Рэабілітаваны 20.1.1958.

ВІЛЬЧЫНСКІ Сігізмунд Людвігавіч, н. ў 1908 у пас. Глуша, рабочы шклозавода «Камінтэрн». Рэпрэсіраваны 24.12.1937. Расстраляны ў 1938. Рэабілітаваны 25.2.1958.

ВІЛЬЧЫНСКІ Станіслаў Людвігавіч, н. ў 1904 у пас. Глуша, шкловар завода «Камінтэрн». Рэпрэсіраваны 21.1.1938. Расстраляны ў 1938. Рэабілітаваны 4.2.1958.

ВІТКОЎСКІ Аляксандр Аляксандравіч, н. ў 1883 у пас. Глуша, майстар шклозавода «Камінтэрн». Рэпрэсіраваны 16.12.1937. Расстраляны ў 1938. Рэабілітаваны 4.2.1958.

ВІТКОЎСКІ Франц Іосіфавіч, н. ў 1896 у пас. Глуша, майстар шклозавода «Камінтэрн». Рэпрэсіраваны ў 1937. Расстраляны ў 1938. Рэабілітаваны 4.2.1958.

ГІНТАЎТ Іосіф Аляксандравіч, н. ў 1903, жыў у пас. Глуша, майстар шклозавода «Камінтэрн». Рэпрэсіраваны 16.11.1937. Расстраляны 6.12.1937 у Мінску. Рэабілітаваны 31.3.1958.

ГРАБОЎСКІ Антон Антонавіч, н. ў 1890 у Польшчы, жыў у пас. Глуша, рабочы шклозавода «Камінтэрн». Рэпрэсіраваны 23.6.1938. Расстраляны 5.10.1938. Рэабілітаваны 7.4.1958.

ГРАБОЎСКІ Іосіф Антонавіч, н. ў 1887 у пас. Глуша, шкловыдзімальшчык завода «Камінтэрн». Рэпрэсіраваны ў 1938. Расстраляны 30.9.1938. Рэабілітаваны 3.12.1956.

ДАЛЕВІЧ Станіслаў Іванавіч, н. ў пас. Глуша, рабочы шклозавода «Камінтэрн». Рэпрэсіраваны 21.1.1938. Рэабілітаваны 4.2.1958.

ДРАГУН Фёдар Мікалаевіч, н. ў 1899 у пас. Глуша, шкловыдзімальшчык завода «Камінтэрн». Рэпрэсіраваны 1.11.1937. Расстраляны 13.1.1938. Рэабілітаваны 3.3.1958.

ДРАГУН Фёдар Мікалаевіч, н. ў 1899 у пас. Глуша, шкловыдзімальшчык завода «Камінтэрн». Рэпрэсіраваны 1.11.1937. Расстраляны 13.1.1938. Рэабілітаваны 3.3.1958.

З успамінаў Любові Фёдараўны Драгун, дачкі Драгуна Фёдара Мікалаевіча, унучкі Міхалёнка Канстанціна Іосіфавіча, пляменніцы Міхалёнка Івана Канстанцінавіча, рэпрэсіраваных у 1937 годзе.

У той дзень яшчэ звечара нешта расплакаўся мой малодшы брат Жэня. Яму тады ішоў адзінаццаты месяц. Ні бацька, ні маці не маглі яго супакоіць. Ён кідаўся, плакаў, крычаў. Таму доўга мы не маглі заснуць. Урэшце Жэня сцішыўся на матчыных руках, быццам прыслухоўваючыся. Бацька, адпрацаваўшы дзве змены, стомлены, заснуў. Я пачала драмаць на матуліным плячы. Раптам — страшэнны стук у дзверы. Здзіўленая мама адчыніла дзверы, і ў хату ўвайшлі незнаёмыя людзі з камендантам пасёлка. Загадалі бацьку збірацца. Мама закрычала, залілася слязьмі, а я стаяла акамянелая, нічога не разумеючы. Незнаёмцы агледзелі хату, нечага шукалі. Але нічога не знайшлі, і адзін з іх сказаў: «Не плач, маладзіца, смаж яешню. На досвітку гаспадар будзе дома». І тут жа апошнія словы таты: «Беражы дзяцей».

Мой тата меў сярэднюю адукацыю, патомны шкловыдзімальшчык. Вучыўся гэтаму



Ф.М.Драгун.

майстэрству ў майго дзеда і за кароткі час стаў адным з лепшых працаўнікоў, лічыўся ўдарнікам. Узнагароджваўся Ганаровымі граматамі, каштоўнымі падарункамі, грашовымі прэміямі, пуцёўкамі ў дамы адпачынку. Маці доўга хавала тыя граматы. У гонар перамогі ў сацыялістычным спаборніцтве прафсаюзны камітэт сумесна з адміністрацыяй шклозавода прэміравалі бацьку і Алішэўскага Івана зрубам для хаты. Для нас гэта быў вялікі падарунак, бо ў той час мы не мелі сваёй хаты і жылі ў вялікай сям'і майго дзеда. Бацька быў здатны да ўсяго. Ён з дзядзькам Іванам хутка змайстраваў дах, падлогу, печ, вокны, дзверы, столь. Я добра памятаю (хоць было мне ўсяго шэсць гадкоў), як бацька на санях вёз мяне са скарбам у новую хату. Не толькі родныя і блізкія, але ўсе жыхары пасёлка лічылі майго бацьку вясёлым, добрым, працавітым і таму часта ішлі да яго па дапамогу. Хоць ён шмат працаваў на заводзе, часта па дзве змены, але ніколі нікому не адмовіў.

СЕКЕРЖЫЦКІ Станіслаў Людвігавіч, н. ў 1880 у в. Слаўкавічы Глускага р-на, жыў на ст. Мірадзіна, цясляр лесазавода імя Войкава. Рэпрэсіраваны 11.2.1936, асуджаны 13—14.4.1936. Рэабілітаваны 14.4.1936.

СІНЯЎСКІ Валянцін Уладзіміравіч, н. ў 1896 у в. Пад'ясенка, працаваў у калгасе. Рэпрэсіраваны 19.12.1937. Расстраляны 8.3.1938. Рэабілітаваны 25.5.1959.

СТАНКЕВІЧ Уладзімір Міронавіч, н. ў 1893 у в. Яловік, працаваў у калгасе. Рэпрэсіраваны 11.7.1938, асуджаны 15.11.1938, асуджаны на 10 гадоў. Рэабілітаваны 22.6.1989.

ТОЛАК Міхаіл Міхайлавіч, н. ў 1917 у в. Такары, стрэлачнік ст. Мірадзіна. Рэпрэсіраваны ў 1938, асуджаны на 10 гадоў. Рэабілітаваны ў 1958.

ТУРЧЭНЯ Сава Раманавіч, н. ў 1896 у в. Сінягова Старадарожскага р-на, жыў на ст. Мірадзіна, цясляр лесазавода імя Войкава. Рэпрэсіраваны 3.1.1936, асуджаны 13—14.4.1936 на 6 гадоў. Рэабілітаваны 19.8.1964.

УРБАНОВІЧ Франц Сямёнавіч, н. ў 1908 на ст. Нова-Вілейск (Польшча), жыў на ст. Мірадзіна, дыспетчар чыгункі. Рэпрэсіраваны 3.5.1938, асуджаны 18.6.1941. Рэабілітаваны 18.6.1941.

ЧАРНАВУСАЎ Іван Маркавіч, н. ў 1888 у в. Чурылава Уздзенскага р-на, жыў на ст. Мірадзіна, рабочы лесазавода імя Войкава. Рэпрэсіраваны 27.12.1935, асуджаны 13—14.4.1936 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 19.8.1964.

ЧАМБРОВІЧ Іван Іванавіч, н. ў 1898 у в. Вінаградаўка, старшыня калгаса. Рэпрэсіраваны 11.7.1938. Расстраляны 29.10.1938. Рэабілітаваны 4.8.1958.

ЧУРАК Антон Гаўрылавіч, н. ў 1877 у в. Сычкава, працаваў у калгасе. Рэпрэсіраваны 12.9.1936, асуджаны 19.12.1936 на 3 гады. Рэабілітаваны 22.1.1992.

ШАБУНЯ Станіслаў Вікенцьевіч, н. ў 1906 у в. Пад'ясенка, абходчык 13-й дыстанцыі ст. Асіповічы. Рэпрэсіраваны 5.8.1938. Расстраляны 19.10.1938. Рэабілітаваны 22.5.1958.

ШУРКО Міхаіл Рыгоравіч, н. ў 1875 на ст. Мірадзіна, рабочы леспрамгаса на ст. Мірадзіна. Рэпрэсіраваны 21.7.1936, асуджаны 14.10.1936 на 3 гады. Рэабілітаваны 15.2.1961.

ШЫКУЦЬ Спірыдон Фадзеевіч, н. ў 1882 у в. Шчаткава, вартаўнік райдараддзела. Рэпрэсіраваны 9.8.1938. Расстраляны 19.11.1938. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ШЫШКЕВІЧ Аляксей Аўрамавіч, н. ў 1905 у в. Такары, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 28.3.1930, асуджаны 15.4.1930. Рэабілітаваны 15.4.1939.

ЮРКОЎ Мікалай Іванавіч, н. ў 1902 у в. Каларыя (Літва), жыў у в. Сычкава, дырэктар школы. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны 22.3.1939.

ХІМОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

АЛЯКСЕЕЎ Фёдар Прохаравіч, н. ў 1921 у в. Думаноўшчына, радыст 102-га батальёна войск НКУС. Рэпрэсіраваны і асуджаны ваенным трыбуналам на 10 гадоў. Пакаранне адбываў у Охскай турме Сахалінскай вобл. Рэабілітаваны ў 1942.

БАГАМОЛАЎ Архіп Еўдакімавіч, н. ў 1867 у в. Новая Шараёўшчына. Рэпрэсіраваны 10.10.1938. Рэабілітаваны 31.3.1939.

ВІНАКУРАЎ Рыгор Анісімавіч, н. ў 1900 у в. Шараёўшчына, працаваў у калгасе. Рэпрэсіраваны ў лістападзе 1920. Рэабілітаваны 3.4.1921.

ВОЎК-ЛЕАНОВІЧ Аляксандр Станіслававіч, н. ў 1908 у в. Ясны Лес. Рэпрэсіраваны 21.5.1930, асуджаны 16.6.1930 на 3 гады. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ВОЎК-ЛЕАНОВІЧ Іосіф Фадзеевіч, н. ў 1877 у в. Ясны Лес. Рэпрэсіраваны 15.10.1931, асуджаны 2.9.1932. Рэабілітаваны 17.11.1989.

КАЛОДЗІНСКІ Венядзікт Антонавіч, н. ў 1891 на хутары Цітаўка, селянін. Рэпрэсіраваны 2.9.1937, асуджаны 10.10.1937 на 10 гадоў. Памёр у лагеры. Рэабілітаваны 11.7.1959.

КІРЭЕЎ Ціт Пятровіч, н. ў 1901 у в. Шараёўшчына, селянін. Рэпрэсіраваны 17.12.1920. Рэабілітаваны 5.5.1921.

КУРСАКОЎ Аркадзь Яўхімавіч, н. ў 1909 у в. Ясны Лес, жыў у Бабруйску, ваенфельчар в/ч 4843. Рэпрэсіраваны ў 1938, асуджаны на 10 гадоў. Рэабілітаваны ў 1940.

МАРХЕЛЬ Марыя Фёдараўна, н. ў 1900 у в. Цітаўка. Рэпрэсіравана ў 1945, асуджана на 3 гады з высылкай у Краснаярскі край. Рэабілітавана 13.8.1990.

МІКОША Іван Людвігавіч, н. ў 1900 на хутары Цагельня Пухавіцкага р-на, жыў у пас. Цітаўка, фельчар амбулаторыі. Рэпрэсіраваны 23.11.1937. Расстраляны 15.1.1938. Рэабілітаваны 16.1.1989.

НАВІЦКІ Аляксандр Антонавіч, н. ў 1888 у в. Зялёнка, жыў у Бабруйску, начальнік аддзела тэхзабеспячэння лесакамбіната. Рэпрэсіраваны 29.8.1933, асуджаны 19.1.1936 на 3 гады. Рэабілітаваны 30.7.1990.

САМУСЁВА Ганна Мікалаеўна, н. ў 1922 у в. Слабада. Рэпрэсіравана 3.1.1945, асуджана 21.11.1945 на 5 гадоў. Рэабілітавана 30.4.1992.

СТАРАВОЙТАВА Ганна Фядотаўна, жыла ў в. Шараёўшчына. Рэпрэсіравана ў 1929, выслана ў Свярдлоўскую вобл. Рэабілітавана 28.4.1993.

ТАНЕНЯ Лявонцій Яўстафіевіч, н. ў 1890 на

хутары Цітаўка. Рэпрэсіраваны 11.2.1936, асуджаны 14.6.1936 на 6 гадоў. Рэабілітаваны 7.5.1968.

ТРАЯНАЎ Адам Пятровіч, н. ў 1900 у в. Старая Шараёўшчына, селянін. Рэпрэсіраваны 18.12.1920, асуджаны 5.4.1921 на 3 гады. Рэабілітаваны 20.10.1992.

ЧАЙКО Аляксандр Данілавіч, н. ў 1899 у в. Вялічкава, ляснік Бабруйскага лясгаса. Рэпрэсіраваны 11.7.1938. Расстраляны 5.10.1938. Рэабілітаваны 15.9.1989.

ЧАРНОЎ Сямён Аркадзевіч, н. ў 1891 у в. Вялічкава, жыў у Бабруйску, вартаўнік клуба Бабруйскага райаддзела НКУС. Рэпрэсіраваны ў 1937. Расстраляны 14.3.1938. Рэабілітаваны ў 1962.

ШАПАТКОЎСКІ Андрэй Сямёнавіч, н. ў 1882 у в. Думаноўшчына, пажарнік завода імя Варашылава ў Бабруйску. Рэпрэсіраваны ў 1937. Расстраляны 13.1.1938. Рэабілітаваны ў 1962.

ШЛЫК Сцяпан Рыгоравіч, н. ў 1886 у в. Слабада. Рэпрэсіраваны 10.2.1936, асуджаны 14.6.1936 на 3 гады. Рэабілітаваны 7.5.1968.

ЦЯЛУШСКІ СЕЛЬСАВЕТ

АДАМОВІЧ Канстанцін Сцяпанавіч, дзяк Цялушскай царквы. Рэпрэсіраваны 29.12.1932. Расстраляны ў 1938. Рэабілітаваны 27.5.1960.

АЛЯХНО Андрэй Сяргеевіч, н. ў 1912, рабочы торфазавода «Звязда». Рэпрэсіраваны 29.5.1937, асуджаны 7.8.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 31.8.1989.

АНТОНЕНКА Апанас Пятровіч, н. ў 1873 у в. Лазоркі Палтаўскай вобл, жыў на ст. Цялуша, начальнік чыгуначнай ст. Цялуша. Рэпрэсіраваны 28.8.1929, асуджаны 13.2.1930 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 6.6.1991.

АРЦІХОВІЧ Іван Кандратавіч, н. ў 1903 на ст. Цялуша, аграном Цялушскай МТС. Рэпрэсіраваны 6.1.1945, асуджаны 1.9.1945 на 9 месяцаў. Рэабілітаваны 14.3.1975.

БАНДАРЧУК Дзмітрый Фёдаравіч, н. ў 1891 у в. Плёсы. Рэпрэсіраваны 6.1.1945, асуджаны 24.11.1945. Рэабілітаваны 7.4.1992.

БАНДАРЧУК Міхаіл Несцеравіч, н. ў 1906 у в. Савічы. Рэпрэсіраваны 29.12.1932, асуджаны 9.6.1933 на 3 гады. Рэабілітаваны 8.8.1989.

БУРЫ Іосіф Адамавіч, н. ў 1895 у.в. Цялуша. Рэпрэсіраваны 29.12.1932, асуджаны 5.3.1938 на 3 гады. Рэабілітаваны 3.8.1959.

ВАВУЛА Андрэй Іосіфавіч, н. ў 1889 у в. Савічы, дарожны майстар ст. «Бярэзіна». Рэпрэсіраваны 30.7.1938, асуджаны 10.10.1938 на 8 гадоў. Рэабілітаваны 1.9.1954.

ВАВУЛА Афанасій Мацвеевіч, н. ў 1900 у в. Савічы. Рэпрэсіраваны 29.12.1932, асуджаны 9.6.1933 на 3 гады. Рэабілітаваны 8.8.1989.

ВАВУЛА Ісак Сямёнавіч, н. ў 1880 у в. Савічы. Рэпрэсіраваны 29.12.1932, асуджаны 9.6.1933. Рэабілітаваны 8.8.1989.

ВАВУЛА Міхаіл Емяльянавіч, н. ў 1914 у в. Савічы, шафёр торфаарцелі. Рэпрэсіраваны 1.7.1950, асуджаны 26.8.1950. Рэабілітаваны 31.1.1992.

ВАВУЛА Павел Іванавіч, н. ў 1903 у в. Савічы. Рэпрэсіраваны 29.12.1932, асуджаны 9.6.1933 на 3 гады. Рэабілітаваны 8.8.1989.

ГАРБАЧЭЎСКІ Міхаіл Раманавіч, н. ў 1922 у в. Цялуша, вучань Цялушскай школы. Рэпрэсіраваны 6.11.1940, асуджаны 29.1.1941 на 6 гадоў. Рэабілітаваны 23.8.1990.

ДУДАЛЬ Аксён Піліпавіч, н. ў 1870 у в. Савічы. Рэпрэсіраваны 29.12.1932, асуджаны 9.6.1933 на 3 гады. Рэабілітаваны 8.6.1989.

ДУДАЛЬ Мікалай Іванавіч, н. ў 1891 у в. Цялуша. Рэпрэсіраваны 29.12.1932, асуджаны 5.1.1938 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 3.8.1959.

ДУДАЛЬ Софія Васілеўна, н. ў в. Сімгаравічы. Раскулачана ў 1930, выслана ў Свярдлоўскую вобл. Рэабілітавана 14.2.1992.

ДУДАЛЬ Сяргей Герасімавіч, н. ў 1891 у в. Цялуша. Рэпрэсіраваны 2.12.1938, асуджаны 5.8.1938 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 3.8.1959.

ІГНАЦЮК Надзея Макараўна, н. ў 1916 у в. Вялікая Дубраўка, настаўніца Цялушскай школы. Рэпрэсіравана ў 1945. Рэабілітавана ў 1945.

КРЫЧКО Іван Апанасавіч, н. ў 1906 у в. Ступяні, працаваў у калгасе. Рэпрэсіраваны 29.5.1939. Рэабілітаваны 28.7.1939.

ЛАЎРЫНОВІЧ Андрэй Міхайлавіч, н. ў 1875 у в. Цялуша, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 24.1.1929, асуджаны 1.12.1929 на 3 гады. Рэабілітаваны 26.1.1990.

ЛАЎРЫНОВІЧ Сямён Ерасавіч, н. ў 1881 у в. Ступяні, працаваў у калгасе. Рэпрэсіраваны 29.5.1939, асуджаны 26.10.1939 на 6 гадоў. Рэабілітаваны 22.11.1991.

ЛАЎРЫНОВІЧ Тарас Яўхімавіч, н. ў 1896 у в. Цялуша. Рэпрэсіраваны 29.12.1938, асуджаны 5.3.1938 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 3.8.1959.

МАЗУРОНАК Еўдакім Еўдакімавіч, н. ў 1918 у в. Ступяні, салдат. Рэпрэсіраваны 11.9.1943. Рэабілітаваны 12.10.1943.

НЯМШЭВІЧ Яраслаў Пятровіч, н. ў 1874 у в. Бадынь Барысаўскага павета, жыў у в. Цялуша, служыцель царквы. Рэпрэсіраваны ў 1936, асуджаны на 5 гадоў. Рэабілітаваны 15.11.1991.

ПАНКОЎСКІ Генрых Варфаламеевіч, н. ў 1895 у м. Гродыск Варшаўскай губ., жыў у в. Ступяні, працаваў у калгасе. Рэпрэсіраваны 17.11.1937. Расстраляны 6.12.1937. Рэабілітаваны 16.6.1990.

ПУХАЛЬСКІ Аляксандр Ермалаевіч, н. ў 1897 у в. Сімгаравічы, працаваў у калгасе «3-ці рашаючы». Рэпрэсіраваны 18.7.1937, асуджаны 26.8.1937. Расстраляны 5.9.1937. Рэабілітаваны 23.11.1959.

ПУХАЛЬСКІ Васіль Ермалаевіч, н. ў 1893 у в. Сімгаравічы, працаваў у калгасе «3-ці рашаю-

чы». Рэпрэсіраваны 6.8.1937, асуджаны 26.8.1937. Расстраляны 5.9.1937. Рэабілітаваны 23.11.1959.

ПУХАЛЬСКІ Раман Ермалаевіч, н. ў 1906 у в. Сімгаравічы, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 6.8.1937, асуджаны 26.8.1937. Расстраляны 5.9.1937. Рэабілітаваны 23.11.1959.

ПУШКІН Сяргей Уладзіміравіч, н. ў 1892 у с. Чачэвічы Мазырскага павета, жыў у в. Цялуша, святар царквы. Рэпрэсіраваны 27.10.1929, асуджаны 1.11.1929 на 3 гады. Рэабілітаваны 26.1.1990.

САКУН Лука Іванавіч, н. ў 1891 у в. Плёсы, старшыня калгаса. Рэпрэсіраваны 10.8.1938. Расстраляны 10.10.1938. Рэабілітаваны 20.8.1959.

СТУПЕНЬ Аляксандр Аляксеевіч, н. ў 1927 у в. Ступяні, механік в/ч 30010. Рэпрэсіраваны ў 1949, асуджаны на 10 гадоў. Рэабілітаваны.

СТУПЕНЬ Арцём Трафімавіч, н. ў 1896 у в. Цялуша, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 16.2.1935, асуджаны 25.5.1935 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 16.3.1990.

СТУПЕНЬ Арцём Трафімавіч, н. ў 1896 у в. Цялуша, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 29.10.1929, асуджаны 1.12.1929 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 26.1.1990.

СТУПЕНЬ Георгій Яўхімавіч, н. ў 1900 у в. Цялуша. Рэпрэсіраваны 12.8.1943, асуджаны 24.8.1943 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 4.12.1969.

СТУПЕНЬ Сяргей Фаміч, н. ў 1915 у в. Цялуша, чырвонаармеец 1166-га стралковага палка 346-й стралковай дывізіі. Рэпрэсіраваны 20.5.1942. Забіты пры ўцёках з КПЗ 30.5.1942. Рэабілітаваны 1.6.1942.

СТУПЕНЬ Яўхім Фёдаравіч, н. ў 1882 у в. Цялуша, рабочы леспрамгаса. Рэпрэсіраваны 29.12.1938. Расстраляны ў 1938. Рэабілітаваны 27.5.1960.

СТУПЕНЬ Яўхім Фёдаравіч, н. ў 1883 у в. Цялуша, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 29.10.1929, асуджаны 1.12.1929 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 26.1.1990.

СЯЛІЦКІ Аляксей Мікалаевіч, н. ў 1890 у в. Цялуша, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 15.6.1939. Рэабілітаваны 21.2.1940.

ТКАЧ Рыгор Сямёнавіч, н. ў 1872 у в. Савічы. Рэпрэсіраваны 29.12.1932, асуджаны 9.6.1933 на 3 гады. Рэабілітаваны 8.7.1989.

Спіс падрыхтавала да друку З.А.Валеева.

Хіба ж «правадыр» не ведаў?

Перад вайной, хоць і не дужа шпарка, а справы ў нашай вёсцы Прудзішча ішлі на лад. Стараліся, працавалі, багацелі. Толькі нечакана-негадана шчырыя, добрыя прудчане адзін за адным пайшлі па этапах, па сібірскіх зімніках, бы і на самай справе былі заклятымі ворагамі народа. А якія з іх ворагі? Многія мужыкі далей сваёй роднай вёсачкі свету не бачылі. Што яны маглі натварыць, якую шкоду Радзіме нанесці? У той час ніхто асабліва не разбіраўся ў гэтым. Ды і паспрабуй пярэчыць — цябе тут жа паставяць да сценкі... Людзі баяліся не толькі гаварыць «крамолу», але і думаць, разважаць не так, як заклікала сталінская прапаганда. Колькі лепшых сваіх мужыкоў страціў наш калгас! А многім з іх не было і пяцідзесяці гадоў. У 1937 г. былі арыштаваны Янка Іваноўскі, яго браты Браніслаў, Іосіф, Антон і Франак. Пяць чалавек забралі, лічы, з адной хаты, адарвалі ад маці і бацькі. І ўсіх аб'явілі шпіёнамі, якія быццам працавалі на карысць Германіі і Польшчы.

Член раённай камісіі па стварэнні кнігі «Памяць» З.А.Валеева гутарыць з Д.Тараховічам.

Не, я зусім не хачу сказаць, што ўсё, чым мы жылі ў той даваенны час, было чорным. Было і нямала светлых, па-сапраўднаму шчаслівых дзён. І ўсё ж адбітак той мінуўшчыны і цяпер не дае спакою. З пяці братоў Іваноўскіх выжыў толькі Франак, які вярнуўся дамоў у 1954 г. А колькі б мог ён (ды і ці толькі ён) прынесці карысці грамадству, людзям, з якімі жыў душа ў душу.

У 1938 г. арыштавалі Аляксандра Асецкага. Зноў жа выдалі за «ворага народа». Услед за Асецкім адчуў сілу НКУС і мой бацька —

Мікалай Казіміравіч, а таксама Сцяпан Бараноўскі, Васіль Мацвяёнак, Адам Асецкі.

Майго бацьку ажно чатыры месяцы трымалі ў засценках. Цяжка было нам без яго. Потым даведаліся, што ад бацькі дабіваліся прызнання: быццам ён шпік замежны і стараецца ўладу савецкую падарваць. Але, нягледзячы на пагрозы і шантаж, ён увесь час гаварыў-паўтараў: «Хоць застрэльце, хоць зарэжце, а я нічога не скажу. Бо ні ў чым не вінаваты... Ніякіх папер не падпішу, ад абвінавачвання адмаўляюся. Яно сфабрыкаванае і лжывае...»

Нарэшце бацьку выпусцілі і ўзялі падпіску, што ён нічога нікому не скажа аб тым, як здзекаваліся з яго. І ўсё ж бацька не вытрымаў, расказаў. Вось тут і я не стрымаўся. Напісаў пісьмо на імя Сталіна. А неўзабаве і адказ атрымаў. Маўляў, нічым «правадыр» дапамагчы не можа. Бо ўсё, што робіцца па барацьбе з «ворагамі народа», правільна. Магчымасці выехаць у Бабруйск і праверыць работу органаў НКУС не мае...

З тых, каго бралі ў 1938 г., застаўся жывы толькі Васіль Мацвяёнак. Яму далі дзесяць гадоў. Вытрымаў пакуты, бо быў маладзейшы за тых, каго ўзялі ў той памятны год. Астатніх жа расстралялі. Ды толькі імёны іх прудчане не забылі. Яны засталіся ў памяці кожнага. Помню іх і я. Праўда, у пяцідзесятыя гады расстраляных і незаконна закатаваных людзей рэабілітавалі. Ды толькі боль застаўся ў сэрцах і крыўда на «правадыра» народаў.

Д.Тараховіч, былы жыхар былой вёскі Прудзішча.

Платон Галавач

Беларускі пісьменнік і грамадскі дзеяч Платон Раманавіч Галавач нарадзіўся 18.4.1903 г. ў в. Пабокавічы. Скончыў камуністычны універсітэт Беларусі (1926). З 1928 г. — першы сакратар ЦК камсамола Беларусі. З лістапада 1929 г. да сакавіка 1930 г. — намеснік наркома асветы Беларусі. Быў рэдактарам газеты «Чырвоная змена», часопісаў «Маладняк», «Полымя». Член Саюза пісьменнікаў СССР з 1934 г. У 1937 г. рэпрэсіраваны і расстраляны. Рэабілітаваны 25.7.1956 г.

Пачаў друкавацца з 1921 г. Аўтар зборнікаў «Дробязі жыцця» (1927), «Хочацца жыць» (1930), «Апавяданні» (1934). Пісаў пра грамадзянскую вайну, класавую барацьбу на вёсцы, выкрываў ворагаў савецкай улады, паказваў заганы старога вясковага жыцця. У аповесцях ставіў праблему даверу да чалавека («Вінаваты», напісана ў 1929 г.), адлюстроўваў калектывізацыю беларускай вёскі («Спалох на загонах», 1930), падпольную і партызанскую барацьбу супраць польскіх акупантаў («Носьбіты нянавісці», 1936; «Яны не пройдуць», 1937). У рамане «Праз гады» (1934) на фоне падзей ад пярэдадня першай сусветнай вайны і да калектывізацыі паказаў працэс ломкі ранейшага жыццёвага ўкладу, паэтызаваў вясковую працу, сялянскую любоў да зямлі. Перакладаўся на рускую, украінскую і польскую мовы.

Ён пражыў зусім мала, наш знакаміты

П.Р.Галавач.

зямляк з Пабокавічаў. Усяго 34 гады. А як многа паспеў зрабіць! Пра яго як пра літаратара сказана шмат. Мне ж хочацца распавесці пра тое, які гэта быў валявы чалавек, таленавіты важак моладзі, самабытны і палымяны публіцыст.

Цяжкі і даволі складаны быў яго жыццёвы і творчы шлях. Сыну бедных сялян давялося з дзяцінства нямала зазнаць гора. Калі яму было паўтара года, ад хваробы памерла маці. Васьмігадовая сястра Вера даглядала хлопчыка, а бацька гнуў спіну ў полі, каб зарабіць на кавалак хлеба. З сямі гадоў ён і сам наймаўся за пастуха.

У Гарбацэвічах мне пашчасціла сустракацца з вяскоўцамі, якія добра памяталі Платона Галавача. Яны адзначалі, што яшчэ ў Гарбацэвіцкай школе, дзе хлапчук вучыўся з 1911

г., ён захапляўся мастацкай літаратурай і меў вялікую схільнасць да малявання. Чатырнаццаць гадоў споўнілася П.Галавачу, калі залпы «Аўроры» абвясцілі аб пачатку новай эры. У лістападзе 1917 г. Кастрычнік перамог і ў нашай рэспубліцы. Савецкая ўлада выклікала ў працоўнага народа прагу да актыўнай дзейнасці. Ва ўсе сферы жыцця горада і вёскі жыватворным струменем уліваліся новыя маладыя сілы. Быў сярод іх і Платон Галавач.

У 1920 г. ён і яго сябар Андрэй Бародзіч арганізавалі камсамольскую ячэйку ў Гарбацэвіцкай школе. Гэта было ў верасні, пасля вызвалення Бабруйскага павета ад белапалякаў. Старшынёй ячэйкі выбралі Андрэя Бародзіча, яго намеснікам — Платона Галавача, а сакратаром — Івана Галодку. Камсамольцы хадзілі ў Бабруйск па газеты, арганізавалі клуб і хату-чытальню; праводзілі сходы, дапамагалі ліквідоўваць непісьменнасць, складалі розныя прыпеўкі, у якіх высмейвалі заганы жыцця. А калі пачалася агрэсія панскай Польшчы, усе члены ячэйкі, у тым ліку і П.Галавач, уступілі ў часці асобага назначэння і са зброяй у руках баранілі маладую савецкую рэспубліку. Аб першых крокаў камсамольскай ячэйкі П.Галавач паведамляў у павятовую газету «Камуніст», а 26 студзеня 1923 г. аб рабоце гарбацэвіцкіх камсамольцаў расказаў у артыкуле «Шлях вясковай моладзі» ў газеце «Юный пахарь».

Здольнага камсамольскага арганізатара прыкмеціла Вера Харужая, якая ў той час працавала ў павятовым аддзеле палітасветы і не раз прыязджала ў Гарбацэвічы. Дарэчы, па яе прапанове П.Галавач у 1922 г. быў накіраваны на вучобу ў Мінск.

Пасля заканчэння аднагадовай партыйнасавецкай школы першага склікання яго накіравалі ў Барысаў інструктарам па рабоце сярод сялянскай моладзі пры павятовым камітэце камсамола. Тут ён зарэкамендаваў сябе не толькі вельмі здольным камсамольскім работнікам, а і актыўным маладым журналістам.

Потым былі вучоба ў Мінску, плённая праца ў рэспубліканскім друку; на трэцім Пленуме ЦК камсамола Беларусі (чэрвень 1926) яго зацвердзілі загадчыкам арганізацыйнага аддзела ЦК ЛКСМБ. А на IX Усебеларускім з'ездзе камсамола ён выступіў з дакладам аб рабоце камсамола на вёсцы. На гэтым жа з'ездзе яго выбралі першым сакратаром ЦК ЛКСМБ і зацвердзілі адказным рэдактарам рэспубліканскай маладзёжнай газеты «Чырвоная змена».

Значнай падзеяй у жыцці беларускага юнака з Пабокавічаў быў восьмы з'езд ВЛКСМ, які праходзіў у Маскве з 5 па 16 мая 1926 г. П.Галавач сядзеў у яго прэзідыуме разам з Н.К.Крупскай, С.В.Касіорам, А.В.Луначарскім, Я.М.Яраслаўскім, іншымі дзеячамі партыі і савецкай дзяржавы, слухаў прамовы М.І.Калініна, Н.К.Крупскай, І.В.Сталіна, а таксама сам выступаў з трыбуны. На гэтым з'ездзе П.Галавача абралі членам ЦК ВЛКСМ.

Прадоўжылася вялікая і плённая работа ў камсамоле, у газетах і часопісах. Ён многа сіл аддаваў шэфскай сувязі моладзі з воінамі арміі і флоту. У час наведвання маракоў падшэфнага крэйсера «Парыжская камуна» (1929) яго абралі ганаровым матросам з правам нашэння формы.

Вельмі натхнёна працаваў Платон Раманавіч як публіцыст і пісьменнік. Ён сустракаўся і гутарыў з Максімам Горкім, Рамэнам Раланам, Луі Арагонам, Леанідам Лявонавым, Валянцінам Катаевым... І, вядома, працаваў разам з Янкам Купалам, Якубам Коласам, Міхасём Лыньковым, Міхасём Клімковічам і многімі іншымі беларускімі літаратарамі, дзеячамі навукі, культуры.

Пісаў ён даволі многа. Пісаў у многія газеты і часопісы. Пісаў пра ўсё новае, што нараджалася ў рэвалюцыйнай вікуры сацыяльных пераўтварэнняў, і пра ўсё заскарузлае, што замінала гэтаму новаму. Але заўжды пісаў пранікнёна, шчыра, усё прапускаючы праз сваё сэрца. Так, ён быў бясстрашным рыцарам новага ладу жыцця. І як балюча ўсведамляць, што новая ўлада, якой ён служыў верай і праўдай, ашальмавала яго, рэпрэсіравала і загубіла.

Землякі свята ўшаноўваюць памяць пра свайго знакамітага сына. У Гарбацэвіцкай школе ўстаноўлена мемарыяльная дошка. Пра жыццёвы шлях Платона Галавача — пісьменніка і грамадзяніна — распавядаюць многія экспанаты школьнага музея.

А.Гарэлік.

Воіны-землякі, якія загінулі ці прапалі без вестак у савецка-фінляндскую вайну 1939—1940 гг.

БОРТНІКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

БАБКОЎ Аляксандр Даям'янавіч, н. ў в. Бірча, загінуў у 1940.

КОТАЎ Якім Архіпавіч, н. ў 1914 у в. Вялікія Бортнікі, загінуў у 1940.

ЛАЙКОЎСКІ Уладзімір Аляксандравіч, н. ў 1905 у в. Міхалёва, старш. 151-га сп 8-й сд, загінуў 3.3.1940.

САМОНЧЫК Піліп Мікалаевіч, н. ў 1906 у в. Лейчыцы, загінуў 13.2.1940.

ШЫРОКІ Мікалай Мікітавіч, н. ў 1908 у в. Міхалёва, прапаў без вестак у лютым 1940.

БРОЖСКІ СЕЛЬСАВЕТ

БОЛБАС Іван Малафеевіч, н. ў 1910 у в. Слабодка, ст. лейт., пам. нач. штаба 237-га гап 71-й сд, загінуў 9.7.1940, пахаваны ў м. Шыцсокі.

БОЛБАС Іван Сафронавіч, н. ў 1916 у в. Слабодка, рад.сапёр, прызваны ў Чырв. Армію ў 1936, загінуў 3.3.1940.

РУДЗЬКО Рыгор Дарафеевіч, н. ў 1916 у в.Орсічы, ст. сярж., танкіст, пам. кам. ўзв., загінуў 9.3.1940.

І.С.Болбас (злева) і Р.Д.Рудзько.

ВАРАТЫНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ЖУРАЎЛЁЎ Аляксандр Пятровіч, н. ў 1919 у в. Туркі, рад., загінуў у маі 1940.

ВІШНЁЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

КАПЦЕЛАЎ Васіль Іванавіч, н. ў 1905 у в. Сяліба, рад., загінуў 7.8.1940.

ГАРБАЦЭВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

СІМАНЕНКА Барыс Іосіфавіч, н. ў 1913 у в. Багушоўка, рад., загінуў 23.1.1940.

ГАРОХАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

БАЧКАРОЎ Васіль Фёдаравіч, н. ў 1912 у в. Гарохаўка, старш., загінуў у 1939.

КАЖЭЎНІКАЎ Пётр Міхайлавіч, н. ў 1908 у в. Двор-Глуша, рад., прапаў без вестак у 1940.

ЦІМКОВІЧ Мікалай Фёдаравіч, н. ў 1917 у в. Фартуны, рад. 310-га сп, загінуў 23.3.1940, пахаваны каля р. Куусы.

ГЛУШАНСКІ ПАСЯЛКОВЫ САВЕТ

ГІНТОЎТ Аляксандр Эдуардавіч, н. ў 1907 у пас. Глуша, рад., загінуў 10.12.1939.

КАВАЛЕЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ЛЫСЕНКА Сцяпан Якаўлевіч, н. ў 1913 у в. Навікі, рад., прапаў без вестак.

ОСАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ГАРНАСТАЙ Ульян Рыгоравіч, н. ў 1916 у в. Глуша, рад., прапаў без вестак у 1940.

ГОЛУБ Уладзімір Сямёнавіч, н. ў 1916 у в. Навасёлкі, рад., загінуў у лютым 1940.

ІОТКА Канстанцін Селівестравіч, н. ў 1915 у в. Баркі, рад., загінуў у 1940.

КРУГЛІК Міхаіл Рыгоравіч, н. ў 1902 у в. Глуша, рад., загінуў у 1940.

ХІМОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

КУРЛЯНЧЫК Гур'ян Іванавіч, н. ў 1907 у в. Баршчоўка, лейт., загінуў у жніўні 1940.

ПШАНІЧНІКАЎ Аляксей Яўгенавіч, н. ў 1917 у в. Думаноўшчына, рад., загінуў 3.9.1941.

ЦЯЛУШСКІ СЕЛЬСАВЕТ

СІЛІЧ Павел Максімавіч, н. ў 1911 у в. Плёсы, рад., загінуў 29.2.1940.

ШЫНКАРЭНКА Андрэй Аляксандравіч, н. ў 1908 у в. Забалацце, рад., загінуў у 1940.

Спіс падрыхтавала да друку З.А.Валеева.

1941

1945

ІШЛА ВАЙНА НАРОДНАЯ

У гады ваеннага ліхалецця

Вайна... Яна па-рознаму ўварвалася ў жыццё кожнага чалавека. Але агульнымі для ўсіх былі неймаверныя людскія пакуты і мільёны заўчасна абарваных чалавечых жыццяў, незлічоныя матэрыяльныя страты, палаючыя гарады і вёскі... Разам з тым было і іншае: вайна абудзіла годнасць людзей, паказала лепшыя іх якасці, усё добрае, узнёслае, што хавалася ў душах, самаадданы патрыятызм, еднасць і дружбу братніх народаў. Такога чыстага парыву любові да сваёй Айчыны, такой самаахвярнай гатоўнасці аддаць за яе жыццё, бадай, не было ніколі. Але ў першыя дні вайны ніхто не ведаў, не мог і прадбачыць, якія выпрабаванні чакаюць усіх.

Ужо сцякалі крывёю пагранічныя заставы, Брэсцкая крэпасць, якія першымі прынялі на сябе ўдар фашысцкіх войскаў, фашысцкія танкі ўжо грукаталі па нашай зямлі, жыхары Гродна, Ваўкавыска, Кобрына, Беластока, Брэста, Баранавіч і іншых гарадоў Беларусі ўжо зведалі жах фашысцкіх бамбардзіровак, а на Бабруйшчыне яшчэ працягвалася мірная ноч... І толькі раніца прымусіла здрыгануцца ад страшэннай весткі.

Жыхары Бабруйшчыны даведаліся пра пачатак вайны ў 12 гадзін з выступлення па радыё намесніка старшыні СНК СССР, наркома замежных спраў В.М.Молатава. Жыццё горада і раёна рашуча змянілася. На прадпрыемствах і ва ўсіх сельсаветах былі праведзены мітынгі і сходы, на якіх працоўныя выказвалі гнеў і абурэнне фашысцкімі захопнікамі, упэўненасць у хуткім разгроме агрэсараў на іх жа тэрыторыі «малакроўным магутным ударам». Мітынгі і сходы працоўных сведчылі аб высокім патрыятызме жыхароў Бабруйшчыны, іх нянавісці да фашысцкіх захопнікаў, гатоўнасці даць адпор ворагу, абараніць Радзіму. Калектывы заводаў і фабрык, транспарту, працаўнікі сельскай гаспадаркі бралі абавязацельствы перавыконваць вытворчыя заданні, мабілізаваць усе сілы і сродкі для задавальнення патрэб фронту.

Згодна з пастановай ЦК КП(б)Б ад 22 чэрвеня 1941 года «Аб задачах і мерапрыемствах у сувязі з выступленнем па радыё намесніка старшыні СНК В.В.Молатава» ў горадзе і раёне былі прыняты тэрміновыя захады па пераводзе ўсяго жыцця на ваенны лад дзеля аказання дапамогі Чырвонай Арміі. З 23 чэрвеня шклозавод «Камінтэрн» у пасёлку Глуша пачаў выраб бутэлек з гаручай сумессю для барацьбы з танкамі, Бабруйская арцель «Чырвоны металіст» наладзіла выпуск карпусоў ручных гранат. Прадукцыю для фронту пачалі вырабляць Бабруйскі лесакамбінат, завод імя Леніна, фабрыка «Чырвоны харчавік», швейная фабрыка імя Дзяржынскага і інш. Кожны імкнуўся працаваць за дваіх — за сябе і за таго, хто пайшоў на фронт. На тэрыторыі санаторыя імя У.І.Леніна быў разгорнуты ваенны шпіталь.

23—25 чэрвеня райваенкамат арганізавана правёў мабілізацыю ваеннаабавязаных. Большасць з іх накіравалі на папаўненне часцей гарнізона горада і іншых падраздзяленняў. З рэзервістаў у Бабруйску былі створаны новыя часці: 21-ы дарожна-эксплуатацыйны і 420-ы гаўбічны артылерыйскі палкі. Але не хапала стралковай зброі, транспартных сродкаў і сродкаў сувязі. Медыцынскія ўстановы не былі забяспечаны перавязачнымі матэрыяламі. Усё гэта ў значнай ступені адбівалася на баяздольнасці гарнізона.

Пачатак ваенных дзеянняў на тэрыторыі Беларусі для войскаў Заходняй асобай ваеннай акругі (з 22 чэрвеня 1941 г. — Заходняга фронту) быў трагічны. Ведучы абарончыя

баі, войскі пад націскам куды большых сіл праціўніка вымушаны былі адступіць. Абарона мела ачаговы характар. Часці прыкрыцця ўступалі ў бой разрознена і неарганізавана. Паблізу накірункаў галоўных удараў ворага не было моцных рэзерваў. Адсутнасць суцэльнага фронту давала магчымасць танкавым і матарызаваным злучэнням гітлераўцаў абыходзіць вузлы супраціўлення нашых войскаў і наносіць ім удары ў флангі і з тылу. У выніку гэтага часці і злучэнні Чырвонай Арміі часта вымушаны былі змагацца ў акружэнні ці адступаць на ўсход.

Бабруйскі напрамак прыкрывала 4-я армія Заходняга фронту, якой камандаваў генерал-маёр А.А.Карабкоў. Але яна ўжо ў прыгранічных баях панесла цяжкія страты, і яе чатыры абяскроўленыя стралковыя дывізіі з баямі адыходзілі ад Бабруйска.

Гітлераўскае камандаванне, улічваючы важнае стратэгічнае значэнне горада, сканцэнтравала на гэтым напрамку 6 матарызаваных і 4 танкавыя дывізіі 2-й танкавай групы Г.Гудэрыяна. Іх мэта — захапіць Бабруйск, фарсіраваць р. Бярэзіну і развіваць наступленне на Магілёў, Рагачоў, Жлобін.

Утрымаць горад без моцнай супрацьтанкавай абароны, без супрацьтанкавых сродкаў было немагчыма. Падрыхтаваць такі рубеж не было і часу. Таму генерал-маёр А.Карабкоў з улікам рэальнага становішча вырашыў арганізаваць абарону сіламі гарнізона на ўсходнім беразе Бярэзіны, якая з'яўлялася прыроднай супрацьтанкавай перашкодай. 26 чэрвеня ўсе часці гарнізона былі выведзены за Бярэзіну, каб там падрыхтаваць абарону. 28 чэрвеня савецкія войскі пакінулі горад. Былы начальнік штаба 4-й арміі генерал-палкоўнік Л.М.Сандалаў успамінае: «З наступленнем цемры камандзір ахоўнага падраздзялення данёс, што на заходняй ускраіне Бабруйска з'явіліся нямецкія танкі. Перад камандаваннем 4-й арміі паўстала пытанне аб падрыве мастоў праз Бярэзіну.

— Гэта трэба зрабіць без прамаруджвання, — настойваў я, — інакш можа здарыцца, як на Пцічы. З-за недахопу толу масты мініраваліся прымітыўна, і ў крытычны момант імгненны ўзрыў мог не атрымацца.

— Бабруйскія масты праз Бярэзіну — вельмі важныя і дарагія збудаванні. Да таго ж яны маюць аператыўнае значэнне, — не здаваўся Карабкоў. — Трэба было б на падрыў іх атрымаць санкцыю камандуючага фронтам.

С.І.Паветкін.

На мінуту ўсталявалася цяжкае маўчанне, якое парушыў сам Карабкоў.

— Паколькі сувязі са штабам фронту няма, а пагроза захопу мастоў праціўнікам узрастае, я дазваляю падрыў, — аб'явіў ён.

І армейскі інжынер палкоўнік Прашлякоў на нашых вачах ажыццявіў гэты падрыў. Балюча было глядзець, як рушыліся ўзарваныя масты» (Сандалов Л.М. Пережитое. М., 1966. С.153—154).

У спешцы горад пакінулі таксама партыйныя і савецкія ўстановы. Па сутнасці не была праведзена эвакуацыя прамысловых прадпрыемстваў, дзяржаўных устаноў, насельніцтва горада. Нават у банку засталося шмат грошай і каштоўных папер. Ужо на трэці дзень пасля захопу гітлераўцамі пачала працаваць электрастанцыя: На чыгунцы абсталяванне абедзвюх станцый і пуцявая гаспадарка дасталіся ворагу ў поўнай спраўнасці.

Перад абаронцамі рубяжа на Бярэзіне была пастаўлена задача: як мага даўжэй затрымаць праціўніка, каб забяспечыць планамернае заняцце абароны па Дняпры рэзервамі, якія дастаўляліся з глыбіні краіны. Трэба зазначыць, што абарона на Бярэзіне пад Бабруйскам уяўляла не вельмі шчыльны ланцуг. Тут амаль адсутнічала інжынернае абсталяванне рубяжа. Не паспелі стварыць па беразе ракі аніякіх загародак, нават супрацьпяхотных. На рубяжы Свіслач—Бабруйск—Парычы абарону ўтрымлівалі асобныя часці 47-га стралковага корпуса, 121-й стралковай дывізіі, курсанты аўтатрактарнага вучылішча, дарожна-эксплуатацыйны полк агульнай колькасцю 3,7 тыс. чалавек. Узначальваў абарону горада камандзір 47-га стралковага корпуса генерал-маёр С.І.Паветкін. Найбольш баяздольнай часцю абаронцаў аказалася аўтатрактарнае вучылішча, курсанты якога на чале са сваімі камандзірамі займалі абарону ў

А.А.Сялецкі.

В.М.Саваян.

межах Бабруйска на гарадскім пляжы і на поўнач ад бетоннага моста цераз Бярэзіну. Рубеж насупраць цяперашняй лодачнай станцыі і фанерадрэваапрацоўчага камбіната займалі 246-ы асобны сапёрны батальён і 273-і асобны батальён сувязі. 21-ы дарожна-эксплуатацыйны полк, укамплектаваны ў асноўным за кошт мабілізаваных з бліжэйшых раёнаў, займаў абарону паміж дамбамі бетоннага і драўлянага мастоў і ад драўлянага моста да чыгункі.

Пойма ўсходняга берага Бярэзіны каля Бабруйска мела ў шырыню 2—3 км. Забалочаная, з мноствам старых рэчышчаў, яна была нязручнай для фарсіравання з выкарыстаннем танкаў і іншай тэхнікі. Выключэнне складаў участак ля трох мастоў, дзе было менш балот. Таму тут, на вышынях ля Цітаўкі — найбольш магчымых напрамках наступлення праціўніка, — быў падрыхтаваны другі рубеж абароны, які заняў зводны полк 121-й стралковай дывізіі пад камандаваннем маёра Ф.Ц. Анохіна. У склад палка ўвайшлі каманды, якія прыбылі па мабілізацыі і не паспелі прайсці стадыю баявога камплектавання падраздзяленняў. Яго 3-і батальён заняў абарону ў першай лініі, налева ад дарожна-эксплуатацыйнага палка на ўчастку ад чыгуначнага моста да Бярэзінскага фарштата. Адзін боегатовы ў палку артылерыйскі дывізіён пад камандаваннем старшага лейтэнанта І.М.Шумілiхіна, які меў 12 152-міліметровых гаўбіц, заняў агнявыя пазіцыі каля в. Глінішчы. За в. Бабіна стаў на пазіцыі 3-і дывізіён 462-га карпуснога артылерыйскага палка капітана А.А.Сялецкага. На поўнач ад в. Дубаўкі заняў пазіцыі зводны дывізіён 318-га гаўбічнага палка з Нова-Беліцы, які вайна застала на артылерыйскім палігоне пад Бабруйскам, і яго асноўныя сілы былі перадыслакаваны за Днепр. Дзеяннямі артылерыі ў дні абароны Бабруйска кіраваў камандуючы артылерыяй 4-й арміі генерал-маёр артылерыі М.П.Дзімітрыеў.

Раніцай 28 чэрвеня гітлераўцы ўвайшлі ў Бабруйск. Іх спробы з ходу пераправіцца на ўсходні бераг Бярэзіны поспеху не мелі, яны былі адбіты агнём абаронцаў. Разгарэліся жорсткія баі, у ходзе якіх савецкія воіны праяўлялі масавы гераізм і самаахвярнасць. Батальён курсантаў аўтатрактарнага вучылішча пад камандаваннем капітана В.М.Саваяна за адзін дзень падбіў 6 нямецкіх танкаў. Сам капітан з 45-міліметровай гарматы, з-за адсутнасці прыцэла наводзячы праз ствол, знішчыў дзве варожыя аўтамашыны. Камандзір 2-га батальёна курсантаў маёр Ф.Р.Грыцаў некалькі разоў вадзіў сваіх выхаванцаў у атаку. У штыкавыя атакі паднімаў курсантаў малодшы палітрук А.Е.Байкун, які знаходзіўся на самых адказных участках абароны. Пяхотныя часці актыўна падтрымлівалі артылерысты. Яны вялі трапны агонь па пераправах праціўніка на Бярэзінскім фарштаце, падаўлялі варожыя артылерыйскія і мінамётныя батарэі ў крэпасці і каля ЦЭЦ-1, знішчалі гітлераўцаў на беразе ракі каля разбураных мастоў.

Улічваючы цяжкае становішча абаронцаў на Бярэзіне, на бабруйскі напрамак з 28 чэрвеня была перанакіравана значная частка авіяцыі ўсяго Заходняга фронту. У другой палове дня 28 чэрвеня лётчыкі 212-га бамбардзіровачнага палка далёкага дзеяння нанеслі ўдар па сканцэнтраваннях праціўніка і па яго пераправах, у выніку якога гітлераўцы панеслі вялікія страты. У небе Бабруйска гераічна змагаліся лётчыкі Н.І.Ліванскі, І.М.Брэўс, А.П.Смірноў і іншыя.

Варта адзначыць, што нашы войскі, пакідаючы Бабруйск, не паспелі знішчыць мясцовы аэрадром. Ворагу дасталіся ўзлётная паласа, склады гаручага і боепрыпасаў, лініі сувязі. Таму вечарам 28 чэрвеня немцам удалося перабазіраваць на гэты аэрадром частку сваёй авіяцыі, дабіцца значнай перавагі ў знішчальніках і панавання ў паветры, што прывяло да вялікіх страт нашай авіяцыі.

З раніцы 29 чэрвеня, прыкрываючыся ўдарамі артылерыі і авіяцыі, гітлераўцы на паромах высадзілі дэсант пяхоты і атакавалі пазіцыі дарожна-эксплуатацыйнага палка ў напрамку в. Цітаўкі. Не вытрымаўшы ўдару праціўніка, часці палка пачалі адступаць. А ў 18 гадзін пад націскам ворага пачаў адыхо-

дзіць да лагера «Бальшавік» прыпісны састаў 273-га батальёна сувязі.

У гэтых абставінах генерал-маёр С.І.Паветкін, сабраўшы рэшткі рэзерву, пры падтрымцы артагню сам павёў у контратаку байцоў ад в. Цітаўкі ўздоўж дамбы драўлянага моста. У выніку жорсткіх баёў нямецкая пяхота была адціснута да самага берага, але ўводам свежых сіл, якія пераправіліся на паромах, гітлераўцам удалося ўтрымаць плацдарм.

Досвіткам 30 чэрвеня спецыяльна падрыхтаваны генералам Паветкіным штурмавы атрад на лодках і плытах пераправіўся на заходні бераг Бярэзіны, нечакана для гітлераўцаў уварваўся ў Бабруйскую крэпасць і авалодаў ёю. Гэтаму спрыяла і тое, што большая частка байцоў штурмавога атрада ведала ў крэпасці кожны будынак: усяго некалькі дзён таму яны самі там размяшчаліся.

Раніцай 30 чэрвеня працаўнік навёў пантонны мост цераз Бярэзіну каля разбуранага драўлянага і пачаў пераправу войскаў і тэхнікі. У бой на плацдарме ён увёў большасць часцей 3-й танкавай дывізіі, сканцэнтраваўшы галоўныя сілы ўздоўж Рагачоўскай шашы. Каля 9 гадзін раніцы гітлераўцы ўварваліся ў в. Цітаўку. На іншых участках абароны ад в. Шчаткава да в. Холм часці зводнага атрада працягвалі ўтрымліваць усходні бераг Бярэзіны да вечара 30 чэрвеня. Танкі працаўніка пад прыкрыццём авіяцыі і артылерыі пачалі фарсіраваць Бярэзіну каля Шчаткава і Даманава. Спецыяльна прыстасаваныя танкі перапраўляліся па дне ракі, пад вадой. Гэта былі тыя самыя машыны, якія ў 1940 г. нібыта прызначаліся для таго, каб уварвацца ў Англію. Пад націскам пераўзыходзячых сіл праціўніка савецкія войскі адступілі з рубяжа Бярэзіны і занялі абарону па р. Ала, а затым адышлі да Рагачова.

Цаной вялікага напружання і страт, праяўляючы масавы гераізм, невялічкі зводны атрад пад камандаваннем генерал-маёра С.І.Паветкіна тры дні стрымліваў на Бярэзіне пад Бабруйскам 3-ю і частку 4-й танкавых дывізій з 2-й танкавай групы Гудэрыяна. Хаця спыніць ворага не ўдалося, але за гэтыя дні яму былі нанесены адчувальныя страты і выйграны вельмі патрэбны час для стварэння абарончага рубяжа на Дняпры.

Так для Бабруйшчыны пачаўся найцяжэйшы перыяд у яе гісторыі — гітлераўская акупацыя. Жыхары раёна не змаглі нічога зрабіць, каб засцерагчы ад небяспекі сябе і сваіх блізкіх. Шмат байцоў і камандзіраў Чырвонай Арміі, якія трапілі ў акружэнне і не здолелі прабіцца на ўсход да лініі фронту, засталіся ў лясах і навакольных вёсках. Пазней большасць з іх папоўнілі рады партызан. Людзі жылі замкнёна, у пастаянным страху за сваё жыццё і лёс родных. Вёскі, здавалася, вымерлі, асаблівa ў доўгія асенніе і зімовыя вечары, калі ніхто не запальваў святло. Цяжка было і таму, што ніхто не ведаў, ці далёка на ўсход адкацілася вайна. Гітлераўская прапаганда трубіла аб хуткім падзенні Масквы. Многія ў гэта не верылі. Але ў пэўнай часткі насельніцтва была разгубленасць.

На акупіраванай тэрыторыі раёна нямецка-фашысцкія захопнікі ўстанавілі так званы «новы парадак» — рэжым рабаўніцтва, гвалту, катаванняў, масавых расстрэлаў і забойстваў мірнага насельніцтва.

Бабруйшчына на тры гады стала часткай тылу фашысцкай групы армій «Цэнтр». Сюды адносіліся Віцебская і Магілёўская вобласці, усходнія раёны Мінскай вобласці, Гомельская вобласць (без паўднёвых раёнаў: Рэчыцкага, Гомельскага, Добрушскага, Лоеўскага, Церахоўскага), паўночныя раёны Палескай вобласці (Глускі, Парыцкі, Капаткевіцкі, частка Васілевіцкага).

Тут будова акупацыйнага апарату па форме крыху адрозніавалася ад раёнаў, у якіх дзейнічала фашысцкая грамадзянская адміністрацыя. Устанаўленне акупацыйнага рэжыму і рэалізацыя злачынных планаў германскага фашызму ва ўсходніх раёнах, у тым ліку і Бабруйскім, знаходзіліся ў руках вермахта і паліцыі. Ваенная адміністрацыя апіралася на часці сухапутных войскаў, паліцыі і войскаў СС. На чале апарату ваеннай адміністрацыі стаяў начальнік тылавога раёна, камандуючы ахоўнымі войскамі генерал пяхоты фон Шэнкендорф. У яго распараджэнні ў снежні 1941 г. былі 4 ахоўныя дывізіі, 2 брыгады СС, 229 пяхотных рот, 12 танказнішчальных рот, 9 рот з цяжкім пяхотным узбраеннем, 11 артылерыйскіх батарэй.

Ваенна-адміністрацыйныя функцыі на гэтай тэрыторыі выконвалі створаныя вермахтам палявыя і мясцовыя камендатуры. У Бабруйску і раёне дзейнічалі палявая і мясцовая камендатуры, надзеленыя неабмежаванай уладай, група тайнай палявой паліцыі (ГФП), якая з'яўлялася ваенна-паліцэйскім органам вермахта і па сутнасці выканаўчай сілай Абвера (разведкі і контрразведкі вермахта). Яна выконвала функцыі гестапа. У яе задачу ўваходзіла галоўным чынам правядзенне арыштаў, следства па справах аб

дзяржаўнай здрадзе, а таксама расправа з партызанамі і падпольшчыкамі, усімі патрыётамі, якія змагаліся супраць фашысцкіх акупантаў.

Акрамя ГФП у горадзе і раёне дзейнічаў разгалінаваны апарат паліцыі бяспекі і СД. Яе аператыўная каманда (айнзацкаманда) была ўкамплектавана заўзятымі галаварэзамі з гестапа, крымінальнай паліцыі, а таксама з супрацоўнікаў СД. Перад гэтай камандай стаялі задачы выяўляць і рэпрэсіраваць камуністаў, камсамольцаў, кіраўнікоў мясцовых савецкіх органаў, знішчаць яўрэйскае насельніцтва, весці барацьбу з усімі праявамі нелегальнай дзейнасці працiўнікаў Германіі.

У цэлым фашысцкі акупацыйны апарат, сфарміраваны на Беларусі, у тым ліку і на Бабруйшчыне, апіраўся на ваенна-паліцэйскія сілы, а таксама на часці вермахта, якія ў шэрагу выпадкаў адкліkаліся з фронту для барацьбы з партызанамі.

Жыхары раёна, якія падазраваліся ў сувязях з партызанамі, захоўванні зброі, распаўсюджванні падпольных газет, лістовак, у агітацыі супраць акупацыйных уладаў, падлягалі неадкладнай перадачы ў СД, расстрэлу ці любому іншаму пакаранню на месцы.

Вялікае значэнне акупанты надавалі арганізацыі вытворчасці для патрэб арміі на ўцалелых ці адноўленых прамысловых прадпрыемствах Бабруйска, асабліва на тых, што былі звязаны з рамонтам ваеннай тэхнікі і перапрацоўкай сельскагаспадарчай прадукцыі. Гітлераўцы здолелі наладзіць вытворчасць амаль на ўсіх прамысловых прадпрыемствах і ў арцелях горада. Бабруйскі механічны завод выпускаў чыгунныя печы, восі да ваенных фурманак, лесакамбінат выпрабляў упаковачную тару для боепрыпасаў, стандартныя дамы барачнага тыпу і г. д.

На прадпрыемствах горада і раёна акупанты прымянялі рабска-прыгонніцкія формы працы. Асабліва цяжка даводзілася жыхарам горада і навакольля, якіх выкарыстоўвалі ў якасці рабочай сілы на будаўніцтве абарончых збудаванняў. З пачатку 1944 г. вакол Бабруйска разгарнулася нябачанае па маштабах будаўніцтва абарончых рубяжоў. Паводле загаду каменданта Бабруйскага ўмацаванага раёна генерал-маёра Гамана ўсё насельніцтва горада ад 14 да 65 гадоў у абавязковым парадку прыцягвалася да прымусовых абарончых работ. Працоўны дзень доўжыўся да 16 гадзін. Нявыхад на работу разглядаўся як асабліва цяжкае злачынства і ў большасці выпадкаў караўся расстрэлам.

Рабочыя і іх сем'і жылі голадна. На дзень рабочаму выдавалі 200 г недабраякаснага хлеба і калі-нікалі дробак солі ці карабок запалак.

На ўзвядзенні асабліва важных ваенных аб'ектаў горада выкарыстоўваліся грамадзяне, якія знаходзіліся ў так званых працоўных лагерах, загнаныя туды з дапамогай паліцэйскіх мер і вулічных аблаў, а таксама ваеннапалонныя. Для гэтых катэгорый людзей была ўстаноўлена самая жудасная сістэма эксплуатацыі і прымусовай працы.

Для больш эфектыўнага ажыццяўлення сваёй злачыннай палітыкі акупанты спрабавалі заручыцца падтрымкай мясцовага насельніцтва. Для надання бачнасці мясцовага самакіравання яны стварылі марыянетачную «мясцовую» ўладу — гарадскую і раённую ўправы, а на тэрыторыях былых сельсаветаў — валасныя ўправы, у кожнай вёсцы прызначылі старасту.

Для падтрымання свайго «парадку» і барацьбы з партызанамі гітлераўцы стварылі з мясцовых жыхароў, якія перайшлі да іх на службу, дапаможную паліцыю аховы парадку. Гарнізоны з такіх паліцэйскіх былі створаны амаль ва ўсіх буйных вёсках раёна і ў горадзе. У Бабруйску і ва ўсіх населеных пунктах раёна былі абнародаваны загады акупантаў з пагрозай расстрэлу за парушэнне каменданцкай гадзіны, за рататванне чырвонаармейцаў і дапамогу партызанам.

Гітлераўцы рабавалі прадпрыемствы, калгасы, сялянскія падвор'і. Замест калгасаў стварылі так званыя абшчынныя гаспадаркі. Строга сачылі за падзелам зямлі, надзяляючы ёю найперш тых, хто лаяльна ставіўся да акупацыйных уладаў, падтрымліваў іх. Сялян абкладвалі вялікімі падаткамі збожжа, бульбы, мяса, малака, фуражу.

Паводле «новага парадку» землекарыстання жыхар кожнай вёскі мог атрымаць надзел, але ўсе віды падаткаў даводзіліся ў цэлым на абшчыну, якая несла адказнасць за іх выкананне. З кожнага гектара засеянай зямлі, якая перадавалася ў абшчыннае карыстанне, трэба было здаць 200 кг збожжа і 15 ц бульбы. Даводзіўся і план здачы сена (ад плошчы сенажацей, замацаваных за абшчынай). У 1944 г. бралі па 400 л малака ад каровы, па 80 кг мяса з кожнага двара і па 30 яек ад курыцы. Такія падаткі збяднелыя сяляне плаціць не маглі. Сельскагаспадарчы камендант Бітнер на судовым працэсе ў Мінску 24 студзеня 1946 г. заявіў: «Я ведаў, што для сялянства Бабруйскага раёна падаткі былі вялі-

кія і яны не маглі іх выканаць поўнасцю». Таму збор прадуктаў, асабліва мяса і малака, ажыццяўляўся шляхам рабавання. Так, у в. Коўрын Варатынскага сельсавета ў канцы верасня 1943 г. з вайсковай часці, што размяшчалася на Бабруйскім аэрадроме, выехаў атрад па зборы падаткаў. Разам з ім прыехаў і сельскагаспадарчы камендант раёна Бітнер. «Нарыхтоўшчыкі» спалілі ў вёсцы 46 двароў і забралі ўсю жывёлу. У тыя дні ў Бабруйскім раёне было спалена яшчэ 7 вёсак. У выглядзе штрафу за нясвоечасовае выкананне паставак у в. Вуглы забралі 21 карову, у в. Туркі — 9 кароў. Толькі за невыкананне падаткаў у жыхароў раёна гвалтоўна адабралі каля чатырох тысяч кароў. А ўсяго за час нямецкай акупацыі гітлераўцы канфіскавалі ў калгасах і асабістых гаспадарках сялян Бабруйскага раёна каля 20 тысяч галоў буйной рагатай жывёлы, столькі ж свіней і каля 18 тысяч авечак. [Судебный процесс по делу о злодеяниях, совершенных немецко-фашистскими захватчиками в Белорусской ССР (15—29 января 1946 года). Мн., 1947. С. 323—324]. Акупанты гвалтоўна забіралі ў сялян адзенне для сваёй арміі, рабавалі іншую маёмасць. На працягу трох гадоў акупацыі насельніцтва раёна і горада перажывала дзікунскі дэспатызм. Была створана сетка канцэнтрацыйных лагераў, турмаў. У Бабруйску існавалі працоўныя лагеры на вуліцы Базарнай, на аэрадроме, лагер эвакуіраваных, канцлагер СД і турма СД, стацыянарныя ваенныя турмы. Дзейнічалі гарадская турма мясцовай камендатуры, дзе ўтрымліваліся пераважна падследныя вязні ГФП, СД, Абвера, лагеры ваеннапалонных і іншыя месцы зняволення, дзе катаваліся і знішчаліся савецкія грамадзяне. За ўчыненыя злачынствы ў г. Бабруйску і Бабруйскім раёне камендант г. Бабруйска з сакавіка 1943 г. (да гэтага быў камендантам мяст. Парычы) маёр Мол Рэйнгард, зондэрфюрэр мясцовай камендатуры г. Бабруйска Бурхард Рольф, камендант Бабруйскага сельскагаспадарчага раёна лейтэнант Бітнер Аўгуст, намеснік каменданта лагера для савецкіх ваеннапалонных у г. Бабруйску капітан Лангут Карл у студзені 1946 г. прыгавораны Ваенным трыбуналам Мінскай ваеннай акругі да пакарання смерцю праз павешанне; намеснік каменданта г. Бабруйска і афіцэр па асобых даручэннях капітан Гетцэ Бруно — да 20 гадоў катаржных работ.

Захопнікі ператварылі Бабруйск у цэнтр дзейнасці палітычных фашысцкіх і прафашысцкіх партый і арганізацый, закрылі ў горадзе і раёне ўсе культурна-асветныя ўстановы. Гарадскі тэатр абслугоўваў толькі немцаў, з яго рэпертуару былі выключаны ўсе творы рускіх і беларускіх класікаў. Дзеля абалваньвання насельніцтва ў розны час акупацыі пад кантролем нямецкіх уладаў у Бабруйску масавымі тыражамі выдаваліся 22 газеты, часопісы, бюлетэні. Сярод іх «Последние новости», «Новый путь» (з дадаткам «Новь»), «Речь», «Живое слово», «Информации», «Жало», «За Родину», «Боец РОА», «Для женщин», «Обзор современного положения», «Политический недельный отчет», «Сводка военных сообщений германской действующей армии», «Церковный благовест», «Школьник», «Юношеству» і інш.

Але тэрор гітлераўцаў не зламаў волі бабруйчан. Усё больш патрыётаў уздымалася на барацьбу з ворагам. З кожным днём пашыраўся і мацнеў антыфашысцкі рух. Падпольныя групы пачалі ўзнікаць з першых дзён акупацыі раёна. Часта напачатку гэта былі ячэйкі з асобных сем'яў. Такімі, напрыклад, у Глушы былі сем'і І.Р.Гарнастая, Г.М.Адамовіч, М.Кавалені, І.Жучкова і інш. Крыху пазней яны пачалі аб'ядноўвацца ў падпольныя групы, камітэты. У сярэдзіне ліпеня 1941 г. у Осаўскім сельсавеце быў створаны падпольны камітэт, у які ўвайшлі К.М.Шашкоў, І.Р.Шардыка, А.Р.Шчэрба, К.М.Лемяшонак, сёстры Сцефаніда і Клаўдзія Бебчык і інш., усяго больш за 30 чалавек. Узначаліў камітэт Д.М.Лемяшонак, накіраваны ЦК КП(б)Б з-за лініі фронту для разгортвання падполля і партызанскага руху ў тыле ворага. Падпольную маладзёжную групу ўзначаліў Анатоль Траяноўскі. Актыўнымі яе ўдзельнікамі былі браты Сяргей і Анатоль Марозы, Марыя Гарадзецкая і інш. У в. Шчаткава старшыня калгаса Андрэй Маеўскі і яго брат кладаўшчык Аляксандр уключылі ў падпольную барацьбу амаль усіх жыхароў вёскі. А першымі ўдзельнікамі гэтай падпольнай арганізацыі сталі Максім Гудзей, Кацярына Сырач, Рыгор Дрызгун, Іван Вярбіцкі, Мікалай і Ніна Маркоўскія, Людміла Крупская, Марыя Кірушына, Матруна Календа.

У вёсках Варатынскага сельсавета барацьбу супраць акупантаў узначалілі мясцовыя жыхары І.Таўкачоў, А.Парахневіч, В.Раманенка, С.Архіпенка, П.Васільеў, С.Лук'янчанка, Р.Пракопчык, І.Дашкоўскі, а Брожскага сельсавета — В.Шчэрбіч, М.Лімчук, М.Болбас, В.Палачэйка і інш. У Гарбацэвічах маладзёжную групу стварыў Анатоль Су-

Штаб 1-й Бабруйскай партызанскай брыгады за распрацоўкай баявой аперацыі.

ханчук; у яе ўвайшлі камсамолкі Соф'я Горбач, Марыя Пешка і інш. Арганізатарамі падполля ў Цялушскім сельсавеце сталі Павел Дудаль, Фядос Сяліцкі, Усцін Бандарчук, Аляксандр Руднеў. З іх дапамогай падпольныя групы былі створаны і ў вёсках Ступяні, Дубаўка, Маліннікі, Тажылавічы, Плёсы, Савічы. І так амаль у кожным населеным пункце. Падпольны рух пашыраўся, арганізацыйна ўмацоўваўся, набываўся вопыт барацьбы. Але давалася гэта вельмі цяжкай цаной. Шмат хто з першых падпольшчыкаў быў схоплены гітлераўцамі і закатаваны ў засценках гестапа.

У Бабруйску першыя падпольныя групы ўзніклі ўжо ў ліпені 1941 г. Іх арганізатарамі сталі М.Р.Баглай, П.С.Вашукевіч, А.К.Калеснікаў, Я.І.Савацееў, В.С.Калеснікаў, Д.М.Лемяшонак, П.С.Маслёнак і В.І.Бутараў, С.Г.Акуліч, П.М.Сцяржанаў, І.В.Стомаў. Важную ролю ў стварэнні гарадскога падполля адыгралі ваеннаслужачыя, якія трапілі ў акружэнне ці ўцяклі з палону: групы С.З.Крамнёва, В.І.Лівенцава, П.С.Сцяржанава, А.Н.Сумбаева, І.А.Хімічова, К.М.Якаўлева.

Партызаны 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі разбураюць чыгуначнае палатно. 1943 г.

Падпольны і партызанскі рух паступова набываў масавы характар. Вялікі ўплыў на актывізацыю народнай барацьбы на Бабруйшчыне, як і ўсёй Беларусі, аказала перамога Чырвонай Арміі пад Масквой, якая развеяла міф аб непераможнасці гітлераўскай арміі і пахавала авантурны план «маланкавай вайны».

У лістападзе—снежні 1941 г. з падполля Бабруйска выйшлі ў наваколле горада каля 300 чалавек. З іх быў створаны першы партызанскі атрад, камандзірам якога выбралі В.І.Лівенцава, камісарам Дз.А.Ляпёшкіна. Гэта быў арганізацыйна аформлены атрад, камандаванне якога карысталася аўтарытэтам сярод партызан і мірных жыхароў на Бабруйшчыне. Ён хутка рос, важкім рабіўся і яго баявы рахунак. У лютым 1943 г. на базе 752-га атрада ў адпаведнасці з рашэннем упаўнаважанага ЦК КП(б)Б па Магілёўскай вобласці І.М.Кардовіча была створана 1-я Бабруйская партызанская брыгада, камандзірам якой прызначылі В.І.Лівенцава, камісарам Дз.А. Ляпёшкіна, начальнікам штаба С.З.Крамнёва.

Дзейнасць падполля і партызанскі рух у раёне яшчэ больш актывізаваў Бабруйскі падпольны райком партыі, створаны Бабруйскім міжраённым камітэтам КП(б)Б у верасні 1942 г. Райком выдаваў газету «Бобруйский партизан» (рэдактар С.З.Крамнёў). Крыху пазней, 14 кастрычніка 1942 г., быў створаны Бабруйскі падпольны райком камсамола. Гэтыя падпольныя райкомы адыгралі вялікую ролю ў дзейнасці Бабруйскага партыйна-камсамольскага падполля. (Пра гэта падполле, а таксама пра Бабруйскія міжрайкомы і райкомы партыі і камсамола гл. асобныя артыкулы.)

Актыўным памочнікам падпольнага райкома партыі і партызан у барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў быў падпольны друк. 7.11.1942 г. выйшаў першы нумар газеты «Бабруйскі партызан». Усяго ў тыле ворага выпушчана 35 яе нумароў агульным тыражом 17,5 тыс. экземпляраў і 54 назвы лістовак на розныя тэмы тыражом 36 тыс. экземпляраў. У атрадах брыгады выпушчана 70 насценных газет і 185 баявых лісткоў. Калектыў агітатараў брыгады, які налічваў 70 чалавек, правёў сярод жыхароў Бабруйскага раёна і ў вёсках суседніх раёнаў 638 гутарак і

прачытаў 94 даклады. Камісар брыгады Дз.А.Ляпёшкін арганізаваў партызанскую самадзейнасць, разам з якой да 20 разоў асабіста выязджаў у розныя населеныя пункты для правядзення гутарак, вечароў сустрэч з іх жыхарамі.

Насельніцтва Бабруйскага раёна, асабліва Багушоўскага, Гарбацэвіцкага і Варатынскага сельсаветаў, усімі сродкамі імкнулася сарваць пастаўкі акупантам сельскагаспадарчых прадуктаў і ў той жа час добраахвотна сабрала і здало партызанам каля 6 тыс. пудоў збожжа і звыш 15 тыс. пудоў бульбы.

Пасля злучэння 29 лістапада 1943 г. з Чырвонай Арміяй 1-я Бабруйская партызанская брыгада ў колькасці 1127 чалавек паводле загаду камандзіра 19-га стралковага корпуса была ўключана ў баявы парадак 37-й гвардзейскай стралковай дывізіі, потым заняла рубеж абароны 118-га гвардзейскага стралковага палка.

З мэтай распрацоўкі плана цеснага ўзаемадзеяння партызан з часцямі Чырвонай Арміі 8 снежня 1943 г. ў штабе 37-й гвардзейскай дывізіі, які знаходзіўся ў в. Мікалаеўка Парыцкага раёна, адбылася нарада камандавання 65-й арміі і партызанскіх камандзіраў і палітработнікаў. У ёй удзельнічалі намеснік камандуючага арміяй генерал-маёр І.Ф.Барынаў, камандзір 19-га стралковага корпуса генерал-маёр Д.І.Самарскі, камандзір 37-й гвардзейскай дывізіі генерал-маёр Я.Р.Ушакоў, начальнік палітаддзела гэтай дывізіі палкоўнік А.А.Смірноў, камандзіры 1-й Бабруйскай брыгады В.І.Лівенцаў, 2-й Бабруйскай партызанскай брыгады № 37 імя А.Я.Пархоменкі А.В.Львоў, камісар гэтай брыгады М.Б.Храпко, сакратар Бабруйскага падпольнага райкома партыі Д.М.Лемяшонак, начальнік штаба Мінскага партызанскага злучэння Р.В.Гнусаў. Нарада вызначыла ролю і месца партызан у маючых адбыцца баях і намеціла шэраг сумесных аперацый.

1-я Бабруйская партызанская брыгада сумесна з часцямі 37-й гвардзейскай стралковай дывізіі на працягу 16 дзён удзельнічала ў цяжкіх баях з гітлераўскімі войскамі ў раёне Парычаў. Партызанская брыгада № 37 імя А.Я.Пархоменкі па загаду камандзіра 37-й гвардзейскай дывізіі 21 дзень, пачынаючы з 1 снежня 1943 г., утрымлівала яе левы фланг, адбіваючы жорсткія атакі гітлераўцаў. У гэтых баях партызаны знішчылі да 200 салдат і афіцэраў праціўніка, падбілі 2 танкі, 1 бранявік і 8 аўтамашын. (Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3500. Воп. 4. Спр. 159. Л. 47).



Партызанская зямлянка. Малюнак Л.Бойкі з натуры.

Праз вогненную зямлю Бабруйшчыны прайшлі таксама баявыя шляхі партызанскіх брыгад 37-й імя А.Я.Пархоменкі, 12-й кавалерыйскай імя І.В.Сталіна, «За Радзіму» імя А.К.Флегантава, 537-га партызанскага палка і асобных партызанскіх атрадаў № 100, № 225, Чэрыкаўскага, П.А.Дудаля.

Час гаспадарання акупантаў на Бабруйшчыне заканчваўся. У апошнія месяцы перад вызваленнем гітлераўцы з асаблівай жорсткасцю распраўляліся з мірным насельніцтвам.

... Ішоў чэрвень 1944 г. Набліжалася доўгачаканае і самае вялікае свята — дзень вызвалення. Вызваленчыя баі на Бабруйшчыне былі жорсткія, вораг стварыў тут добра ўмацаваную і глыбока эшаланіраваную абарону. Улічваючы асаблівае значэнне Бабруйска ў сістэме абароны гітлераўцаў на Усходзе, спе-



Выплаўка толу партызанамі. Малюнак Л.Бойкі з натуры.

Камандуючы 1-м Беларускім фронтам генерал арміі К.К.Ракасоўскі (злева), начальнік штаба генерал-палкоўнік М.С.Малінін і іншыя кіруюць баявымі дзеяннямі войскаў пад Бабруйскам. Чэрвень 1944 г.

цыяльным загадам Гітлера № 11 у першай палове сакавіка 1944 г. разам з Мінскам, Барысавам, Полацкам і Оршай ён быў узведзены ў ранг умацаванага раёна і аб'яўлены крэпасцю. Змест гэтага загада Гітлера зводзіўся да наступнага:

«Шэраг гарадоў на Усходнім фронце прызначаюцца для стварэння ўмацаваных раёнаў і ўсімі сіламі і сродкамі ператвараюцца ў крэпасці.

Умацаванымі раёнамі камандуюць генералы. Астатнія афіцэры, унтэрафіцэры і салдаты адкамандзіроўваюцца ад армій. Умацаваныя раёны могуць быць падначалены толькі арміі. Войскі, якія знаходзяцца ва ўмацаваных раёнах, абучыць. Групам армій вызначыць, колькі войск павінна знаходзіцца ў пастаянным гарнізоне і колькі павінна быць падкінута пры наступленні праціўніка. Камендант умацаванага раёна атрымоўвае правы камандуючага корпусам толькі ў выпадку акружэння. Пры гэтым ён ручаецца сваім афіцэрскім гонарам, што ўмацаваны раён будзе ўтрыманы як бы там ні было, нават пры поўным яго акружэнні. Адзін толькі фюрэр па хадайніцтве групы армій можа даць загад пакінуць «умацраён». [Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі (ЦАМА РФ) Ф.32. Воп. 11309. Спр. 211. Л. 277.]

Камендантам Бабруйскага ўмацаванага раёна быў прызначаны генерал-маёр Гаман. Толькі сам Гітлер па хадайніцтве групы армій «Цэнтр» мог дазволіць пакінуць гэты раён. 7 красавіка 1944 г. генерал-маёр Гаман разам з камендантамі іншых умацаваных раёнаў падпісаў у Мінску ў штабе групы армій «Цэнтр» абавязацельствы наступнага зместу: «З загадам фюрэра № 11 я азнаёміўся. Абавязуюся ўтрымліваць умацаваны раён Бабруйск да апошняга салдата, нават пры ўмовах акружэння». (Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі. Ф.32. Воп. 11308. Спр. 211. Л. 279).

Паводле загаду Гамана насельніцтва Бабруйска ў прымусовым парадку выганялі капаць вакол горада супрацьтанкавыя равы. Горад і яго навакольле былі ператвораны ў моцны вузел супраціўлення. З захаду ён меў два абводы: унутраны (праходзіў непасрэдна па ўскраіне) і знешні (за 6—8 км ад горада, праходзіў праз Курлянчыкі, Яловікі, чарапічны завод, Кісялевічы, Беразовічы, на поўнач ад Воранавічаў на цагельны завод, на поўдзень ад Бярэзінскага фарштата). Шмат якія з вёсак на абарончых рубяжах і гарадскіх абводах былі ператвораны ў моцныя апорныя пункты. Дзеля стварэння вакол Бабруйска пяцікіламетровай бяспечнай зоны па загаду генерал-маёра Гамана ў прымусовым парадку былі выселены каля 12 тысяч мясцовых жыхароў з 13 вёсак, у тым ліку каля 800 чалавек з Багушоўкі, каля 40 чалавек з Харошага, каля 80 чалавек з Мядзведаўкі.

23 чэрвеня пачалася Беларуская наступальная аперацыя. Галоўныя сілы 1-га Прыбалтыйскага, 3-га і 2-га Беларускіх франтоў пасля магутнай артылерыйскай і авіяцыйнай падрыхтоўкі перайшлі ў наступленне на віцебскім, аршанскім і магілёўскім напрамках.

На наступны дзень па варожых пазіцыях на бабруйскім напрамку абрушылі ўдары войскі 1-га Беларускага фронту дзвюма ўдарнымі групамі. У 6 гадзін раніцы з плацдарма ў раёне Рагачоў—Жлобін рушылі на пазіцыі праціўніка 3-я і 48-я арміі пад камандаваннем генерал-лейтэнантаў А.В.Гарбатава і П.Л.Раманенкі. На працягу першых двух дзён кровапралітных баёў ударная групоўка прарвала першую паласу абароны гітлераўцаў і рушыла наперад на 8 км. У сярэдзіне дня 25 чэрвеня камандуючы 3-й арміяй увёў у бой дзве танкавыя брыгады 9-га танкавага корпуса пад камандаваннем генерал-маёра Б.С.Бахарава.

Больш паспяхова разгортвалася наступленне паўднёвай ударнай групоўкі, у якую ўваходзілі 65-я армія пад камандаваннем генерал-палкоўніка П.І.Батава і 28-я армія пад камандаваннем генерал-лейтэнанта А.А.Лучынскага. Войскі 65-й арміі ў першы дзень наступлення прарвалі абарону праціўніка шырынёй 30 км да 10 км углыб. У брэш, якая ўтварылася ў выніку гэтага, быў уведзены 1-ы гвардзейскі танкавы корпус пад камандаваннем генерал-маёра М.Ф.Панова. На трэці дзень наступлення гэты корпус выйшаў на подступы да Бабруйска з паўднёвага захаду.

9-ы танкавы корпус да канца дня 26 чэрвеня перамясціўся на 50 км, выйшаў да Бабруйска з усходу і 27 чэрвеня злучыўся з часцямі 1-га гвардзейскага танкавага корпуса. Такім чынам, у Бабруйску і на паўднёвым захадзе



Фарсіраванне Бярэзіны на поўдзень ад Бабруйска войскамі 65-й арміі генерал-лейтэнанта П.І.Батава. Чэрвень 1944 г.

ад яго апынуліся ў акружэнні 6 дывізій, а таксама асобныя часці 9-й арміі — 40 тысяч нямецкіх салдат і афіцэраў і вялікая колькасць узбраення і ваеннай тэхнікі.

У другой палове дня 27-га чэрвеня часці 1-га гвардзейскага танкавага і 105-га стралковага карпусоў правялі першую атаку на горад, але поспеху не мелі.

Услед за танкістамі 3-я і 28-я арміі выйшлі на знешні фронт акружэння, а 48-я і 65-я — на ўнутраны.

Завяршыўшы акружэнне, савецкія войскі пры актыўнай падтрымцы авіяцыі пачалі сціскаць кольца вакол варожай групоўкі. Гіт-

Савецкая артылерыя на агнявой пазіцыі перад пачаткам Бабруйскай аперацыі. Чэрвень 1944 г.

лераўцы рабілі адчайныя спробы вырвацца з «катла». У раёне Цітаўкі (усходняя ўскраіна Бабруйска) яны арганізавалі да 15 контратак, імкнучыся прарвацца на поўнач. К.К.Ракасоўскі ў кнізе «Салдацкі абавязак» апісвае гэтыя атакі са слоў камандзіра 108-й стралковай дывізіі генерал-маёра П.А.Церамава: «Самая лютая атака разыгралася перад фронтам 444-га і 407-га палкоў. У гэтым раёне былі сканцэнтраваны ў асноўным сілы нашага артылерыйскага палка. Не менш чым 2 тысячы варожых салдат і афіцэраў пры падтрымцы даволі моцнага гарматнага агню ішлі на нашы пазіцыі. Гарматы адкрылі агонь па атакуючых з дыстанцыі 700 м, кулямёты — з 400. Гітлераўцы ішлі. У іх гушчы разрываліся снарады. Кулямёты выкошвалі рады. Але яны ішлі на прарыў, пераступаючы цераз трупы сваіх салдат, не лічачыся ні з чым... Гэта была жудасная атака. Мы бачылі жахлівую карціну. Не, у ёй не існавала нават і ценю вайсковай доблесці. Гітлераўцы знаходзіліся ў якімсьці паўшокавым стане. У руху гэтай вялізнай масы салдат была хутчэй жывёльная ўпартасць статка, чым войска, якое вырашыла любой цаной навязаць сваю волю працiўніку. Але ўражанне было вялікае». (Рокоссовский К.К. Солдатский долг. М., 1968. С.270—271).

Важную ролю ў разгроме гэтай групоўкі ворага адыгралі лётчыкі 16-й паветранай арміі пад камандаваннем генерал-лейтэнанта авіяцыі С.І.Рудэнкі. Калі гітлераўцы сканцэнтравалі вялікія сілы пяхоты і тэхнікі ў раёне Дубаўкі, каб прарвацца на поўнач (і такая магчымасць была), паводле загаду камандуючага фронтам у паветра падняліся 526 самалётаў, якія абрушылі на працiўніка ўдар вялізнай сілы. Пасля налёту над пазіцыямі гітлераўцаў клубілася заслона агню і дыму. Маршал Ракасоўскі пра гэты ўдар пісаў: «Гітлераўцы выбягалі з лясоў, мітусіліся, як шалёныя, па палянках, кідаліся ўплаў цераз Бярэзіну, але і там не знаходзілі паратунку. У хуткім часе раён, які быў бамбардзіраваны, уяўляў сабой вялізныя могілкі — усюды трупы і знявечаная разрывамі авіябомб тэхніка». (Тамсама. С. 271).

За два дні баёў, 27 і 28 чэрвеня, савецкія войскі знішчылі больш за 10 тысяч салдат і афіцэраў працiўніка, да 6 тысяч узялі ў палон, захапілі 432 гарматы, 250 мінамётаў, больш за тысячу кулямётаў. Групоўка ворага на паўднёвым захадзе ад горада Бабруйска была ліквідавана.

Адначасова ішлі жорсткія баі за Бабруйск. Гарнізон горада ведаў пра лёс групоўкі ў раёне Дубаўкі, і самым разумным для яго было б выкінуць белы флаг. Але абаронай горада кіраваў яго камендант генерал-маёр Гаман — вечны паслугач фюрэра, кат, на сумленні якога тысячы расстраляных, закатаваных савецкіх грамадзян. Ён не хацеў, не мог здацца.

Гарнізон, які налічваў больш за 10 тысяч салдат і афіцэраў, папоўніўся рэшткамі 41-га танкавага корпуса, што прарваліся ў горад на чале з камандзірам генерал-лейтэнантам Гофмайстарам, і тымі, каму ўдалося пераплысці Бярэзіну, — рэшткамі 35-га армейскага корпуса. Тут былі таксама 20-я танкавая і 18-я зенітная дывізіі, полк сувязі і іншыя часці. Гаман здолеў пабудаваць моцную кругавую абарону: горад быў акружаны процітанкавым ірвом, на перакрыжаваннях вуліц стаялі ўкапаныя ў зямлю танкі, былі пабудаваны барыкады, а ўскраіны горада замініраваны.

Усю ноч на 28 чэрвеня на ўскраінах Бабруйска ішлі ўпартыя баі. На пачатку ночы на

Разбітая тэхніка ворага ў раёне Бабруйска. Чэрвень 1944 г.

29 чэрвеня гітлераўцы адвялі значную частку сваіх сіл да цэнтра і сканцэнтравалі буйныя сілы пяхоты і артылерыі ў паўночнай і паўночна-заходняй частках горада. Яны зрабілі спробу прарвацца з горада на паўночны захад. Пасля кароткага масіраванага артылерыйска-мінамётнага налёту, пусціўшы ўперад ударныя штурмавыя афіцэрскія батальёны, немцы агульнай колькасцю 10—15 тысяч чалавек пры падтрымцы 30 танкаў і 12 самаходных гармат атакавалі пазіцыі нашай 356-й стралковай дывізіі, якая замыкала тут кольца акружэння. Нягледзячы на згубны агонь савецкай артылерыі і кулямётаў, праціўнік ірваўся да мэты. У начной цемры завязваліся рукапашныя схваткі. Але прарвацца гітлераўцам не ўдалося. У 2 гадзіны ночы пасля другой, яшчэ больш лютай атакі яны змаглі ўклініцца ў абарону 1181-га палка. Аднак масіраваным агнём артылерыі і гэта атака была адбіта. У 8 гадзін раніцы немцы, якіх нашы войскі сціскалі з усіх бакоў, трэці раз атакавалі часці 356-й дывізіі. Асабліва лютыя баі разгарнуліся на ўчастку 1183-га палка. Нямецкія афіцэрскія батальёны тут пераважвалі ў сіле. З адчаем асуджаных на смерць кідаліся фашысты ў атакі. У гэтым баі па-геройску загінулі камандзір палка падпалкоўнік Каўрыга і яго намеснік па палітычнай рабоце маёр Розенштэйн. Яны мужна кіравалі боем да апошняга моманту, а калі гітлераўцы прарваліся да каманднага пункту палка, разам з рэшткамі афіцэраў штаба кінуліся ўрукапашную.

Частцы салдат і афіцэраў праціўніка агульнай колькасцю каля 5 тысяч чалавек на чале з камандзірам 41-га танкавага корпуса Гофмайстарам і камендантам Бабруйска Гаманам удалося вырвацца з акружэння. Але гэта іх не выратавала: не вытрымаўшы націску 365-й дывізіі і 1-й гвардзейскай мотастралковай брыгады 1-га гвардзейскага танкавага корпуса ў лясах на паўднёвым усходзе ад Сычкава і каля Свіслачы яны былі поўнасцю знішчаны ці ўзяты ў палон. Крывавы Гаман сам здаў уласны пісталет савецкаму сяржанту і прасіў запісаць, што зрабіў гэта добраахвотна. Гофмайстар, прывезены ў Бабруйск, не падымаў галавы. У хуткім часе савецкі камендант Бабруйска маёр Волкаў далучыў да гэтых генералаў таўстуна ў падраным мундзіры — камандзіра 35-га армейскага корпуса генерал-лейтэнанта фон Лютцова, на якога ўскладаў усе надзеі па дэблакіраванні акружнай групоўкі ў Бабруйску новапрызначаны камандуючы 9-й нямецкай арміяй генерал-лейтэнант Вейдлінг.

Раніцай 29 чэрвеня пачаўся апошні штурм Бабруйска, у выніку якога 65-я і 48-я арміі авалодалі горадам. У акружэнні і знішчэнні бабруйскай групоўкі ворага актыўны ўдзел брала Дняпроўская ваенная флатылія. Такім чынам у горадзе і на паўднёвым усходзе ад яго была завершана ліквідацыя варожай групоўкі, у складзе якой было звыш 6 дывізій 9-й нямецкай арміі.

Штодзень Саўінфармбюро паведамляла аб вызваленні ўсё новых і новых вёсак раёна. Кветкамі, слязамі радасці сустракалі сваіх вызваліцеляў жыхары Бабруйшчыны. Яны аказвалі ўсебаковую дапамогу, аднаўлялі чыгункі, шашэйныя дарогі, будавалі масты, вылоўлівалі рассеяных па лясах і балотах варожых салдат, збіралі сродкі на пабудову танкаў і самалётаў для Чырвонай Арміі, даглядалі параненых воінаў і г.д. Арганізавана прайшла ў горадзе і раёне мабілізацыя ваеннабавязаных у рады Чырвонай Арміі. Вызваляючы ад ворага Бабруйшчыну, савецкія воіны не шкадавалі ні сіл, ні жыцця. Пад Сычкавам і Яловікамі, пад Цітаўкай і Дубаўкай, Крывым Крукам і Назараўкай, на вуліцах горада яны дэманстравалі сапраўдныя ўзоры мужнасці і гераізму. Больш чым 2 тысячы савецкіх воінаў назаўсёды засталіся ляжаць у Бабруйскай зямлі; 66 брацкіх магіл знаходзяцца ў вёсках раёна, на якіх узвышаюцца помнікі і абеліскі як сімвалы вечнай памяці аб высокім подзвігу.

У гады Вялікай Айчыннай вайны тысячы жыхароў Бабруйшчыны змагаліся з нямецка-фашысцкімі захопнікамі на розных франтах і ў тыле ворага далёка за межамі свайго раёна. Сямі ўраджэнцам раёна — Ф.Ф.Архіпенку, А.К.Болбасу, М.Д.Капусціну, У.А.Парахневічу, М.Р.Пінчуку, К.П.Чарнову, А.К.Шмыгуну — прысвоена высокае званне Героя Савецкага Саюза. Звыш 6140 жыхароў Бабруйшчыны загінулі ці прапалі без вестак падчас Вялікай Айчыннай вайны, з іх 5256 чалавек — на франтах.

Удзячныя нашчадкі ніколі не забудуць подзвіг савецкіх воінаў, партызан і падпольшчыкаў, здзейснены дзеля свабоды і незалежнасці нашай Радзімы. І як сведчанне таму 13 помнікаў і абеліскаў, устаноўленых у іх памяць у горадзе і 89 на тэрыторыі раёна.

Абеліскі і помнікі... Адлітыя з бронзы, высечаныя з каменю, граніту ці сціплыя — з бетону. З імёнамі тых, хто загінуў пры абароне

Парад пераможцаў у Бабруйску. Жнівень 1944 г.

і вызваленні горада і раёна ці не вярнуўся з вайны, і без імёнаў. Іх на Бабруйшчыне больш за 100.

Гады «гаспадарання» нямецка-фашысцкіх захопнікаў на беларускай зямлі, у тым ліку і на Бабруйшчыне, прынеслі незлічоныя страты і пакуты нашаму народу. Горад Бабруйск ляжаў у руінах. Пры адступленні нямецкія войскі ператварылі ў руіны цэлыя кварталы. З 7650 дамоў былі разбураны і спалены больш за 3000, з іх цагляных 211. Перад уцёкамі з горада гітлераўцы разбурылі і вывелі са строю 34 прадпрыемствы саюзнага і рэспубліканскага падпарадкавання.

У раёне было разбурана і спалена 520 жылых дамоў, знішчана амаль уся сельскагаспадарчая тэхніка, разрабавана жывёла. Агульныя страты 135 разбураных і разрабаваных калгасаў раёна перавысілі 616 мільёнаў рублёў у даваенных цэнах. (Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 845. Воп.1. Спр. 187. Л. 11. С. 105—107).

Але самыя вялікія, непапраўныя страты — гэта чалавечыя жыцці. За час акупацыі гітлераўцы знішчылі ў раёне 249 мірных жыхароў і вывезлі ў Германію 1787 чалавек.

У.І.Лемяшонак, доктар гістарычных навук.

Акупацыйны рэжым

«Новы парадак», што быў устаноўлены гітлераўцамі на часова захопленай імі тэрыторыі нашай Радзімы, распрацоўваўся загадзя, яшчэ да нападу на Савецкі Саюз. Галоўныя яго накірункі былі выкладзены Гімлерам у сакрэтным мемарандуме «Некаторыя думкі пра абыходжанне з насельніцтвам на Усходзе» ад 25 мая 1940 г. У ім адзначалася, што захопленыя ўсходнія тэрыторыі належыць разглядаць як аб'ект каланізацыі. Акупацыйная палітыка, гаварылася ў гэтым мемарандуме, павінна быць накіравана на тое, каб ператварыць актыўную масу «іншароднага насельніцтва» ў напаўпісьменных рабоў.

Асноўныя палажэнні акупацыйнага рэжыму былі падрабязна выкладзены і ў шэрагу іншых дакументаў, у тым ліку ў плане «Барбароса» (канчатковы варыянт выкладзены ў

дырэктыве вярхоўнага галоўнакамандавання Германіі ад 18.12.1940 г., які вызначаў стратэгію і тактыку нападу на СССР), у генеральным плане «Ост» — праграме каланізацыі тэрыторыі, германізацыі, высялення і знішчэння народаў Усходняй Еўропы, у тым ліку і Беларусі; у «Інструкцыі пра асобыя вобласці» да дырэктывы № 21 плана «Барбароса» (13.3.1941), у дырэктыве па кіраванні эканомікай у акупіраваных усходніх абласцях і інш. Гэтыя дакументы намецілі практычныя мерапрыемствы па ўстанаўленні акупацыйнага рэжыму на тэрыторыі, якая падлягала захопу. У далейшым яны дапаўняліся загадамі, інструкцыямі галоўнакамандавання ўзброеных сіл і іншых ведамстваў гітлераўскай Германіі, у якіх масавы тэрор, рабаванні, гвалтаванні і забойствы ўводзіліся ў ранг дзяржаўнай палітыкі.

Асноўны сэнс гэтых жорсткіх, нечалавечых загадаў і інструкцый зводзіўся да таго, каб самымі бязлітаснымі сродкамі і мерамі не дапусціць супраціўлення нашага народа, фізічна знішчыць значную частку насельніцтва краіны. Гэтыя дакументы поўнасцю развязвалі рукі гітлераўскім катам і забойцам, вызваляючы іх ад усялякай адказнасці за злачынствы.

Палітыка генацыду, скіраваная на знішчэнне людзей, грунтавалася на чалавеканенавісніцкай тэорыі «расавай перавагі» нямецкай нацыі над іншымі народамі. Уключэнне Беларусі ў сферу «жыццёвай прасторы гітлераўскай Германіі» прадвызначыла лёс беларускага народа: згодна з планам «Ост» на Беларусі павінна было застацца не болей чым 25% насельніцтва ў якасці рабочай сілы, астатнія падлягалі «высяленню», што азначала знішчэнню. Масавыя расстрэлы, павешанні, спаленні зажыва, прымяненне «душагубак» — вось далёка не поўны пералік сродкаў, пры дапамозе якіх ажыццяўлялася гэта палітыка знішчэння людзей.

Яшчэ задоўга да агрэсіі верхаводы трэцяга рэйха адобрылі распрацаваны гітлераўскім апаратам і план падзелу захопленай тэрыторыі. Восенню 1941 г. падзел часова акупіраванай Беларусі быў у асноўным завершаны. Яе этнаграфічную цэласную тэрыторыю захопнікі гвалтоўна парэзалі на часткі, груба парушыўшы пры гэтым супольнасць тэрыторыі, мовы, культуры беларускага народа, якая склалася гістарычна. Тэрыторыю рэспублікі па лініі Полацк—Барысаў на ўсходзе, Старыя Дарогі—возера Чырвонае на поўдні, па р. Зяльвянка і ўсходнім узлессі Белавежскай пушчы на захадзе вылучылі ў генеральную акругу, якая атрымала назву «Беларутэнія». Плошча акругі склала толькі чвэрць тэрыторыі Беларусі з насельніцтвам 3 138 256 чалавек (па стане на 4 снежня 1941 г.). Паўднёвыя раёны Гомельскай і Палескай абласцей, частка Брэсцкай вобласці былі ўключаны ў рэйхскамісарыят «Украіна». Беластоцкая вобласць, паўночныя раёны Брэсцкай і частка Баранавіцкай абласцей адышлі да акругі «Беласток», якая далучылася да Усходняй Прусіі. Часткі Ашмянскага, Свірскага, Відзаўскага, Астравецкага, Смаргонскага і Пастаўскага раёнаў далучылі да генеральнай акругі «Літва». Віцебскую, Магілёўскую і ўсходнія раёны Мінскай абласцей, а таксама большую частку Гомельскай вобласці аднеслі ў зону армейскага тылу групы армій «Цэнтр». У гэту зону ўваходзіла і Бабруйшчына.

Для арганізацыі тэрору, рабаўніцтва і іншых злачынстваў урад фашысцкай Германіі і вышэйшае камандаванне германскай арміі накіравалі на Беларусь шматлікія карныя арганізацыі і спецыяльныя часці — гестапа, службу бяспекі (СД), зондэркаманды, тайную палявую паліцыю (ГФП), фельдкамендатуры, ортскамендатуры, сельгаскамендатуры, паліцыю, жандармерыю, ахоўныя паліцэйскія часці, войскі СС і СА. Гэтыя органы і часці былі ўкамплектаваны спецыяльна падабранымі людзьмі, выхаванымі ў нацысцкім духу бесчалавечнага абыходжання з носьбітамі іншых нацыянальнасцей.

Адным з самых жахлівых бакоў фашысцкага акупацыйнага рэжыму было правядзенне генацыду ў адносінах да яўрэяў. Нашэсце нямецкіх войскаў на нашу краіну павінна бы-



Гарыць падпаленая фашыстамі вёска пад Бабруйскам. 1941 г.

ло садзейнічаць «канчатковаму вырашэнню яўрэйскага пытання». Антысемітызм гітлераўцы зрабілі асноўнай мэтай сваёй прапаганды сярод насельніцтва Беларусі. Акупацыя падавалася імі як выратаванне жыхароў рэспублікі ад «яўрэйскага бальшавізму».

Па ўказанні Гітлера фашысцкія верхаводы загадзя пачалі распрацоўваць план «канчатковага вырашэння яўрэйскага пытання», што азначала знішчэнне ўсіх яўрэяў.... Па звестках начальніка 4-га аддзела гестапа Эйхмана, якому Гітлер даручыў ажыццяўленне гэтай праграмы, было забіта 6 мільёнаў яўрэяў, што складала $^1/_3$ частку яўрэяў усяго свету. (Нюрнбергский процесс...: Сб. документов. М., 1961. Т.7. С. 401—402).

Звярыную палітыку знішчэння савецкіх грамадзян яўрэйскай нацыянальнасці гітлераўскія галаварэзы з нечуванай жорсткасцю ажыццяўлялі на ўсёй часова акупіраванай тэрыторыі Беларусі, у тым ліку і на Бабруйшчыне. Сюды ўслед за войскамі вермахта прыбылі айнзатцкаманды, зондэркаманды, тайная паліцыя (ГФП), паліцыя бяспекі і СД, фельдкамендатуры, ортскамендатуры, жандармерыя і іншыя карныя органы, у абавязкі якіх разам з вермахтам уваходзіла і «вырашэнне яўрэйскага пытання». Усе гэтыя органы і часці былі ўкамплектаваны спецыяльна падобранымі галаварэзамі, якія былі выхаваны ў духу нацызму і вызначаліся асаблівай жорсткасцю ў адносінах да людзей іншых нацыянальнасцей. Менавіта яны адразу ж аддзялілі яўрэяў ад мясцовых жыхароў, загналі іх у гета.

Загады палявых і мясцовых камендатур па стварэнні гета выдаваліся паўсюдна: у Бабруйску, Баранавічах, Брэсце, Мазыры, Лідзе, Мінску і іншых гарадах Беларусі. У асноўным стваралі гета закрытага тыпу. Іх тэрыторыі абносіліся калючым дротам, ахоўваліся гітлераўскімі салдатамі і паліцыяй.



Помнік на месцы масавых расстрэлаў яўрэяў у вёсцы Каменка.

Згодна з распараджэннем нямецкіх акупацыйных улад яўрэям забаранялася самавольна пакідаць гета, мяняць месца жыхарства і кватэры, карыстацца тратуарамі, грамадскім транспартам, паркамі і грамадскімі ўстановамі, дзецям наведваць школы. Для яўрэяў уводзілася абавязковае нашэнне апазнавальных знакаў — акруглыя латы і шасціканцовыя зоркі жоўтага колеру, нарукаўныя павязкі з шасціканцовымі зоркамі. Амаль да ліквідацыі гета яўрэі павінны былі пад прымусам выконваць для акупантаў самыя цяжкія работы, пры якіх многія з іх паміралі з-за нечалавечых умоў, без медыцынскай дапамогі.

Вядома, што да вайны ў Бабруйску значную частку жыхароў складалі яўрэі. Пра іх жудасны лёс у 1941 г. мала хто ведаў. У кнігах, прысвечаных гісторыі Бабруйска, у перыядычным друку, у краязнаўчым музеі аб гэтым, у свой час, на жаль, мала гаварылася. Трэба адзначыць, што ў трагедыі свайго насельніцтва ўвогуле, і ў першую чаргу яўрэяў, у значнай меры вінаваты тагачасныя гарадскія ўлады. Яны не казалі жыхарам праўду аб становішчы, якое складвалася вакол горада ў час набліжэння да яго фашысцкіх войскаў. Нават тады, калі танкі Гудэрыяна былі ўжо на подступах да Бабруйска, эвакуацыя горада не была аб'яўлена. У выніку жыхары горада яўрэйскай нацыянальнасці, якія не паспелі эвакуіравацца, загінулі пазней у гета, створанае гітлераўцамі па Шашэйнай вуліцы каля фабрыкі «Чырвоны харчавік». Усяго за час фашысцкай акупацыі Бабруйска было знішчана звыш 20 тысяч яўрэяў. Гэта былі пераважна дзеці, жанчыны, старыя. На жаль, спісы расстраляных не захаваліся. Да нас дайшлі імёны толькі некаторых з іх. Вядома га ў горадзе рабіна Бяспалава, нашчадка сям'і Любавіцкіх, фашысты хацелі ўнізіць, паставіць на калені, але ён мужна прыняў смерць, не зрабіўшы гэтага. Знішчаны быў і вядомы на ўвесь яўрэйскі свет вучоны-талмудыст, філосаф, пісьменнік Шамуэль Аляксандраў.

Жыхарка горада Соф'я Аляксееўна Удавеня расказвае: «Мы жылі ў вёсцы Зацішша, і ў адзін з восенькіх дзён 1941 г., памятаю, былі ўжо першыя замаразкі, бачылі, як гналі яўрэяў па шашы ў Каменскі лес. Мужчыны ішлі пехатой, а жанчын і дзяцей везлі на ма-

шынах. Думаю, жанчыны не чакалі, што іх будуць расстрэльваць, таму што яны хавалі ў косах пярсцёнкі і брошкі. Пачуўшы стрэлы, мы ўцяклі».

Існуе дакумент, які пацвярджае, што знішчэнне яўрэяў у Бабруйску вялося яшчэ летам 1941 г. У акце аб пасяджэнні Бабруйскай абласной камісіі па расследаванні фашысцкіх злачынстваў ад 17.1.1945 г. прыводзяцца паказанні сведкаў аб тым, што ў адзін з ліпеньскіх дзён 1941 г. ў 7 гадзін раніцы па правы бок Слуцкай шашы ў в. Каменка расстраляны 250 чалавек. Сведкі сцвярджаюць, што за ліпень агульная колькасць знішчаных склала каля 10 тысяч чалавек.

Тое, што масавыя расстрэлы яўрэяў у горадзе вяліся яшчэ да лістапада 1941 г., пацвярджае данясенне начальніка паліцыі бяспекі і СД аб дзеянні эйнзатцгрупы «В» на акупіраванай тэрыторыі СССР за перыяд з 1 па 31.10.1941 г.: «У Бабруйску было расстраляна 380 яўрэяў, якія да нядаўняга часу займаліся распаўсюджваннем прапаганды супраць нямецкіх акупацыйных улад».

А вось як тлумачыць гэты ж кат, але ўжо ў данясенні за перыяд з 1 па 31.12.1941 г.: «У Бабруйску адразу ж пасля ўваходу часцей паліцыі бяспекі і СД яўрэі зноў актывізаваліся. Яны перасталі насіць апазнавальныя знакі, адмовіліся працаваць, уступілі ў сувязь з партызанамі і паводзілі сябе задзірліва ў адносінах да акупацыйных улад. Таму ў ходзе спецыяльна праведзенай акцыі быў расстраляны 5281 яўрэй. Горад Бабруйск і яго наваколіцы, такім чынам, цяпер свабодны ад яўрэяў». У масавых расстрэлах жыхароў г. Бабруйска і Бабруйскага раёна яўрэйскай нацыянальнасці прымалі ўдзел і часці 8-й кавалерыйскай дывізіі СС.

Ёсць звесткі, што летам 1941 г. ў час ліквідацыі Варшаўскага гета прыкладна 3000—4000 мужчын-вязняў гэтага гета былі вывезены ў «лясны лагер» пад Бабруйск. Відавочна, гэта мог быць лагер у в. Яловікі. Яўрэі былі дастаўлены з Варшавы да станцыі Бабруйск па чыгунцы, а адтуль аўтамашынамі ў лагер. Тут польскія яўрэі ўтрымліваліся асобна ў месцы, абнесеным калючым дротам. Умовы работы былі катаржныя. Вясной 1943 г. ў лагеры пачаліся расстрэлы і да канца лета—пачатку восені ўсе яўрэі тут былі расстраляны.

У.І.Лемяшонак.

Бабруйскі лагер смерці

Створаны нямецка-фашысцкімі захопнікамі на тэрыторыі Бабруйскай крэпасці летам 1941 г. для масавага знішчэння мірных грамадзян і ваеннапалонных. Пад канец года ў ім было каля 60 тыс. вязняў, з іх больш за 20 тыс. трымалі пад адкрытым небам. З-за голаду, холаду, антысанітарных умоў успыхнула эпідэмія сыпнога тыфу. Для пашырэння яе гітлераўцы кідалі здаровых ваеннапалонных у баракі з хворымі. У кастрычніку—лістападзе 1941 г. за суткі паміралі 600—800, зімой — да 1 тыс. чалавек. Цяжкахворых фашысты закопвалі разам з нябожчыкамі.

7.11.1944 г. паводле загаду прадстаўніка вярхоўнага камандавання германскай арміі палкоўніка Штурма камендант лагера падпалкоўнік Рэдэр і яго намеснік капітан Лангут падпалілі адзін з баракаў. Вязняў, якія выбягалі з падпаленага будынка, расстрэльвалі з кулямётаў. У выніку згарэла і расстраляна больш за 4 тыс. чалавек. У снежні 1941 г. пад выглядам адпраўкі ў Мінск 3200 паўраздзетых палонных пагрузілі ў таварныя вагоны і на адкрытыя платформы. Усе яны па дарозе замерзлі.

Да жніўня 1942 г. ў лагеры загублена каля 40 тыс. чалавек. Да студзеня 1944 г. загублены ўсе сагнаныя сюды ваеннапалонныя. Лагер увесь час папаўняўся цывільнымі вязнямі, 5 тыс. якіх вызваліла Чырвоная Армія.

Папярэджанне на агароджы Бабруйскага лагера смерці. 1944 г.

Сястра Хатыні

Цяпер назвы вёскі Прудзішча не знойдзеш на геаграфічных картах рэспублікі. Яна засталася толькі ў памяці тых, хто нарадзіўся і жыў тут. А яшчэ — на могілках вёсак у мемарыяльным комплексе Хатынь.

Мяркуюць, што вёска мая заснавана недзе каля 1870 г. Першым пасяленцам быў нібыта ляснік Іван Бараноўскі. Менавіта з яго рукі тут пайшлі будавацца, узводзіць хаціны... А зямлю ды навакольныя палі і лугі насельнікі куплялі ў гарбацэвіцкага пана. Гэта каб і гаспадарку весці, і з голаду, вядома, не памерці.

А з'язджаліся ды сыходзіліся сюды людзі з розных куткоў былога Паўночна-Заходняга краю — любанскіх і слуцкіх зямель, з глускіх ды парыцкіх... З гадамі вёсачка пашыралася, набірала сілы і назвай абзавялася: вяскоўцы аднадушна назвалі яе Прудзішча. Хутчэй ад невялікай сажалкі (прудка), што была ў гэтых мясцінах.

Жыхары Прудзішча займаліся найперш земляробствам, пчалярствам. Разводзілі і клубніцы, прытым на вялікіх плошчах. Справа ў тым, што мясцовая фабрыка, якая выпускала цукеркі, патрабавала шмат сыравіны. Вось яе (клубніцы) і пастаўлялі жыхары Прудзішча.

Да 1930 г. ў Прудзішчы было ўжо больш як трыццаць гаспадарак. У час калектывізацыі арганізавалі калгас «Ударнік». Першым ягоным старшынёй стаў мясцовы жыхар Сігізмунд Валяр'янавіч Бажычка, а мой бацька — брыгадзірам. Калектыўная гаспадарка аказалася невялікай — усяго семнаццаць двароў. Вяскоўцы працаваць любілі і ўмелі. Справы ў іх ладзіліся не толькі на палетках і ферме. Вялікі набытак прыносілі клубніцы. Даіліся каровы, каласавала жыта, радзіла бульба... А канюшня славілася на ўсё навакольле: коні ў Прудзішчы былі добра дагледжаныя.

А яшчэ ў Прудзішчы грэчка добра расла. Ну быццам хто нябачнай рукой цягнуў гэту расліну да неба. А пчолы дык, здаецца, з усяго свету сюды на тую грэчку зляталіся. Вядома, гэта было на руку вяскоўцам. У вуллях, на пасеках збіралася-назапашвалася многа мёду, які таксама ішоў на продаж, заставаўся ў кладоўках на зіму для якой патрэбы. Адным словам, жылі, клапаціліся, стараліся, спадзяваліся на лепшае.

І раптам — вайна. Жылі ў страху, чакалі чужынцаў. Той-сёй гаварыў пра партызан, пра супраціўленне. Але пакуль пра партызанскі рух ішлі размовы, на нашых вясковых могілках 4 кастрычніка 1941 г. з'явіліся тры свежыя магілкі. Гітлераўцы расстралялі Казіміра Грыгаровіча, Фелікса Ванковіча і Івана Вераса. Гэткі ж лёс напаткаў і былога першага старшыню калгаса Сігізмунда Бажычку. Яго забілі на станцыі Брожа за тое, што ён хацеў, каб сялянам жылося пры Саветах добра і заможна. Але трэба сказаць, што па першасці гітлераўцы і іх памагатыя не вельмі наведваліся ў Прудзішча. Ці то іх лясы і балоты палохалі, ці то не надавалі асаблівага значэння гэтай маленькай вёсачцы, дзе жылі пераважна жанчыны, старыя ды дзеці. Недзе пад канец 1943 г. ў Прудзішчы з'явіўся прыблуда, нібыта з партызанскага атрада. Толькі пра яго ніхто нічога не ведаў. І сэрцам вяскоўцы адчулі бяду. Той незнаёмец такі данёс у паліцыю, што наша вёска самая што ні ёсць партызанская. А самі жыхары выкарыстоўваюць любую магчымасць, каб абагрэць «бандытаў», аддаць ім запасы прадуктаў... Словам, з дня на дзень даводзілася чакаць карнікаў.

І вось у кастрычніку Прудзішча і Суляву — таксама невялікую вёсачку кіламетры за два ад нас — акружылі немцы і паліцаі. Яны разграмілі ўсе хаткі і пабудовы, вывезлі на падводах і машынах усё, што можна было вывезці. І пусцілі «чырвонага пеўня».

Трэба было тое бачыць... Не, не, крый божа такое бачыць, як гарэлі, як патрэсквалі на ветры родныя гнёзды. Не хапала сіл плакаць, не хапала душы, розуму ўсё ўсвядоміць. І толькі нянавісць перапаўняла кожнага з прудчан, хто стаяў у гэты дзень далей ад родных мясцін і назіраў, як дагаралі ў полымі пражытае жыццё, дзяцінства, будучыня...

Згарэла ўсё. Згарэлі і Прудзішча, і Сулява. Ды толькі тады смерць абышла людзей. І яны ад сваіх мясцін не адступіліся: тут жа, непадалёку, пачалі ладзіць зямлянкі. Але хутка і сюды завіталі жандары, якія кватаравалі ў Пятровічах і Чырвоным Бродзе. Схапілі майго бацьку, Таццяну Гаварушку, Марыю Лапко і павезлі іх у Чырвоны Брод. А сцюдзёным снежным ранкам наступнага дня Пятро Санчукоўскі, зусім малады хлопец, бегаў ад зямлянкі да зямлянкі і заклікаў усіх ратавацца, бо немцы зноў акружаюць мясцовасць.

Але нямногім удалося схавацца, уцячы ў лес...

Сагналі прудчан на край лесу. Устанавілі кулямёты. І ад выбухаў гранат і агнямётаў зноў загарэліся людскія гнёзды — наспех выкапаныя зямлянкі. І нічога нельга было зрабіць, каб неяк дапамагчы людзям... Ні-чога...

У гэтым агні згарэлі Марыя Лапко, Таццяна Гаварушка і мой бацька, якіх амаль паўжывых прывезлі ў спаленае раней Прудзішча. Такі ж лёс напаткаў і Леванціну Мацвяёнак, яе ўнучку Валянціну, Наташу Шэндрыкаву і інш.

Некаторым з тых, хто ўцякаў, не было куды ісці. Яны зноў сталі будаваць зямлянкі, курані. Ды толькі пажыць у іх зноў-такі не давялося. Знайшоўся здраднік, выдаў пасяленцаў. Прыйшлі карнікі, сабралі людзей і разам з міхайлаўскімі жыхарамі пагналі ў Бабруйск, а адтуль многія трапілі ў канцлагеры... Соф'я Мацвяёнак згарэла ў Мінскім канцлагеры. А мая маці і Алена Календа трапілі ажно ў Асвенцым...

Загінулі ў фашысцкіх засценках дзесяткі прудчан. Не вярнуліся з вайны Віктар Календа, Аляксандр Тараховіч, Рыгор Вішнеўскі... Той жа, хто застаўся жывы, прытулку ў Прудзішчы не знайшоў, паколькі і самой вёскі ўжо не было. Параз'ехаліся хто куды. Я застаўся жыць у Рэдкім Рагу, Віктар Вішнеўскі — у Брожы, Браніслаў Бараноўскі — у Плёсах, Ефрасіння Асецкая — у Бабруйску, Міхаліна Вішнеўская — у Бярозавічах...

Зараз на месцы былога Прудзішча расце малады лес. Пахне хвояй, ляснымі кветкамі, на колішнім папялішчы засталіся толькі памяць аб раскіданым гняздзе ды боль мінуўшчыны. А колькі іх, такіх вёсак, аплаквае Беларусь пасля той праклятай вайны!..

Кожны год 9 Мая збіраюцца навакольныя жыхары ля помніка на месцы спаленай вёскі. На ім выбіты імёны загінуўшых прудчан, і людзі памінаюць іх добрым, шчырым словам. А над могілкамі вёсак у Хатыні, дзе пад мемарыяльным знакам захавана зямля з маіх Прудзішчаў, рытмічна стукае ў людскія сэрцы жалобна-аптымістычны перазвон.

Д.Тараховіч, жыхар былой вёскі Прудзішча.

Звесткі пра страты, прычыненыя Бабруйскаму раёну нямецка-фашысцкімі акупантамі ў час Вялікай Айчыннай вайны (на 1 чэрвеня 1969 г.)

Сельсаветы	Было нацярэдадні вайны		Знішчана		Адноўлена дварoў на ранейшым месцы	Не адноўлена дварoў	Вывезена		Загінула	
	дварoў	жыхароў	дварoў	жыхароў			жыхароў у Германію	З іх вярнуліся дадому	на фронце	у партызанах і падполлі
Бортнікаўскі	1342	—	116	67	116	—	132	127	557	—
Брожскі	600	2980	89	55	61	28	155	41	212	15
Варатынскі	596	2659	39	—	39	—	117	100	202	27
Вішнеўскі	768	2771	254	56	254	—	107	59	231	16
Гарбацэвіцкі	1814	7686	295	87	386	8	342	269	539	87
Глушанскі	165	825	6	18	6	—	19	18	47	5
Кавалеўскі	1343	4131	142	7	142	—	109	86	546	21
Ламбаўскі	478	1880	120	201	120	—	171	93	177	24
Осаўскі	1005	3951	26	53	30	8	74	61	357	34
Слабодкаўскі	845	3840	37	22	37	—	31	28	211	3
Сычкаўскі	937	3833	218	23	218	—	67	47	373	45
Хімаўскі	723	2113	92	268	92	—	62	36	180	62
Цялушскі	857	4177	31	56	31	—	73	66	334	58
Усяго:	11473	40846	1456	913	1532	44	1459	1031	3966	397

Дакументы сведчаць...

З АДМІНІСТРАЦЫЙНАГА РАСПАРАДЖЭННЯ № 1 КАМАНДУЮЧАГА ТЫЛАМ ГРУПЫ АРМІЙ «ЦЭНТР» ГЕНЕРАЛА ПЯХОТЫ ФОН ШЭНКЕНДОРФА

Пераклад з нямецкай мовы 7.7.1941 г.

І. Аб прызначэнні бургамістраў у валасцях

1. На пасады бургамістраў у першую чаргу павінны быць прызначаны палітычна надзейныя і кваліфікаваныя асобы, па магчымасці з ліку беларусаў.

2. Бургамістр з'яўляецца прадстаўніком воласці.

3. Ён з'яўляецца службовым начальнікам над усімі асобамі, якія працуюць у воласці. Ён прымае іх і звальняе з працы.

4. Бургамістр нясе адказнасць за фінансавыя справы воласці.

5. Усе жыхары, якія пражываюць у воласці па стане на 21.6.1941 г., павінны быць нанава ўлічаны і перапісаны бургамістрам.

6. Бургамістры неадкладна павінны паклапаціцца аб тым, каб усе жыхары былі забяспечаны адпаведнымі дакументамі, якія засведчваюць іх асобу: прозвішча і імя, час і месца нараджэння, месца жыхарства, склад сям'і, прафесія, знаходжанне і род заняткаў, сацыяльнае паходжанне, веравызнанне, нацыянальнасць, падданства.

7. Бургамістры прыцягваюць да адказнасці вінаватых за ўчыненыя акты сабатажу ў даверанай ім воласці. Яны павінны ўсімі сродкамі прадухіляць акты сабатажу. У іх абавязкі ўваходзіць ахова прадпрыемстваў, размешчаных на тэрыторыі воласці, асабліва жыццёва важных.

8. Бургамістраў і іх намеснікаў у населеных пунктах, якія налічваюць да 20 000 жыхароў, прызначае мясцовы камендант, а ў населеных пунктах, у якіх звыш 20 000 жыхароў, прызначае камендант палявой камендатуры.

ІІ. Аб забароне пакідання кватэр у начны час

1. У перыяд з 21.00 да 5.00 раніцы насельніцтву забараняецца пакідаць кватэры.

2. Выключэнні дапускаюцца па пісьмовым дазволе мясцовага каменданта для асоб, якія працуюць у начны час на жыццёва важных прадпрыемствах, дактарамі, акушэркамі, на машынах «хуткай дапамогі».

3. Парушальнікі будуць найстражэйшым чынам караца мясцовымі камендантамі. Дапаможнымі мерамі пакарання могуць быць часовы арышт з абмежаваным харчаваннем, насільнае затрыманне і прыцягненне да працы.

VIII. Стварэнне дапаможнай паліцыі

1. Для правядзення паліцэйскіх мер бяспекі бургамістрам даручана прыцягнуць у дапаможную паліцыю надзейных «фольксдойча», беларусаў і калі такіх няма, то палякаў і выкарыстоўваць гэту паліцыю па ўзгадненні з начальнікамі каманд паліцыі бяспекі.

2. Служачыя дапаможнай паліцыі, якія працуюць у цесным кантакце з мясцовымі айнзатцкамандамі паліцыі бяспекі і СД, могуць падтрымліваць сувязь толькі з мясцовымі начальнікамі паліцыі бяспекі і СД або прызначанымі імі органамі.

3. Служачыя дапаможнай паліцыі носяць белую нарукаўную павязку з надпісам «Дапаможная паліцыя».

4. Мясцовыя камендатуры да 20-га чысла кожнага месяца, а ўпершыню да 20.7.1941 г., паведамляюць аб колькасці і ўзбраенні дапаможнай паліцыі.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 952. Л. 1, 2, 4—5.

З АДМІНІСТРАЦЫЙНАГА РАСПАРАДЖЭННЯ № 1 КАМАНДУЮЧАГА ТЫЛАМ ГРУПЫ АРМІЙ «ЦЭНТР»

Пераклад з нямецкай мовы 7.7.1941 г.

...ІІІ. Распазнавальныя знакі для яўрэяў і яўрэек

1. Усе яўрэі і яўрэйкі, якія знаходзяцца на занятай рускай тэрыторыі і дасягнулі 10-гадовага ўзросту, неадкладна абавязаны насіць на правым рукаве верхняга адзення і сукенкі белую паласу шырынёй да 10 см з намаляванай на ёй сіянісцкай зоркай або жоўтую павязку шырынёй да 10 см.

2. Такімі павязкамі забяспечваюць сябе яўрэі і яўрэйкі.

3. Яўрэям катэгарычна забараняецца вітаць.

Парушальнікі будуць найстражэйшым чынам караца мясцовым камендантам па месцы жыхарства.

Камандуючы тылам групы армій «Цэнтр» фон Шэнкендорф, генерал пяхоты

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 952. Л. 2.

РАСПАРАДЖЭННЕ № 2846 БАБРУЙСКАЙ ГАРАДСКОЙ УПРАВЫ АБ ПАСЫЛЦЫ НА РАБОТЫ МЯСЦОВАГА НАСЕЛЬНІЦТВА

В соответствии с распоряжением о трудовой повинности от 15 мая 1943 года и требованием бюро труда гор. Бобруйска от 23.10.43 г. за № 5200 для полного охвата и распределения рабочей силы, все местное население города Бобруйска и его окрестностей мужского и женского пола в возрасте от 14 до 65 лет подлежит обязательному учету в бюро труда и в зависимости от их трудоспособности, посылке на работу.

В связи с этим все трудоспособное население города, состоящее на работе, обязано иметь соответствующее рабочее удостоверение (трудовую справку) установленного образца. Поэтому начальники городских учреждений и предприятий обязаны позаботиться о своевременном снабжении всех занятых у них на работе рабочих и служащих рабочим удостоверением.

Бланки рабочих удостоверений выдаются бюро труда по заявкам предприятий и учреждений.

Лица, не состоящие на работе, обязаны состоять на учете бюро труда, иметь явочную карточку и периодически в установленные бюро труда сроки проходить отметку.

Трудоспособное население, не имеющее трудового удостоверения или явочной карточки бюро труда, при проверке будет задерживаться.

Настоящее распоряжение входит в силу с 1 ноября 1943 года и исполнение такового возлагается на городскую стражу.

Начальник города Меньшагин

Фонды Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, інв. н/в № 8393.

РАСПАРАДЖЭННЕ ПА БАБРУЙСКІМ АБЛАСНЫМ УПРАЎЛЕННІ АБ ВЫПЛАЦЕ ПАДАТКУ НА САБАК

§1.

На основании § 14 предварительного постановления о налогах от 18.2.42 на территории районов, городов и сельской местности Бобруйской области провести за 1942—1943 отчетный год налог с владельцев собак в размере: за каждую собаку 200 руб. в год в возрасте 3 месяцев и старше, за каждую лишнюю собаку уплачивается 300 руб. в год. Налог за сторожевых собак по охране фабрик, заводов и общинных хозяйств и совхозов взимается в половинном размере.

§2.

От уплаты налога за собак освобождаются:

а) собаки, находящиеся в немецких учреждениях;

б) собаки, принадлежащие немцам;

в) собаки в возрасте до 3 месяцев включительно.

§3.

Налог за собак уплачивается равными частями в 4 срока:

1 срок — 20 сентября 1942 года 25 %
2 « — 20 ноября 1942 « 25%
3 « — 20 января 1943 « 25%
4 « — 20 марта 1943 « 25%

§4.

К 1.9.1942 доложить Областному финансовому отделу о проведении в жизнь настоящего постановления.

Военно-Административный Советник
Полевой комендатуры 571 д-р ТОЛКИ
Начальник областного Управления — РАЗУМЦОВ

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4, Воп. 33а. Спр. 650. Л. 153—154.

З ПАЛІТДАНЯСЕННЯ НАЧАЛЬНІКА ПАЛІТАДДЗЕЛА 1-га БЕЛАРУСКАГА ФРОНТУ ГЕНЕРАЛ-МАЁРА С.Ф.ГАЛАДЖАВА НАЧАЛЬНІКУ ГАЛОЎНАГА ПАЛІТЫЧНАГА ЎПРАЎЛЕННЯ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ ГЕНЕРАЛ-ПАЛКОЎНІКУ А.С.ШЧАРБАКОВУ

28.6.1944 г.

Население освобожденных от немцев Рогачевского, Жлобинского и Бобруйского районов рассказывает об ужасах и злодеяниях, которые пришлось пережить им за время хозяйничания немецких бандитов. Путем бесед и опросов жителей деревень Зеленый Дуб, Широкий Рог, Ухватово, Козловичи, Диски Рогачевского района, деревни Вила Бобруйского района и

ряда других работниками политорганов установлено, что на протяжении марта, апреля и особенно за последние две-три недели до освобождения Красной Армией этих районов фашистские мерзавцы производили массовые изъятия у родителей детей восьми-пятнадцатилетнего возраста.

Изъятых у родителей детей немцы увозили в спецлагеря, называемые юношескими поселениями. Всю эту чудовищную работу фашистские изверги прикрывали якобы желанием дать правильное развитие и воспитание детям прифронтовых районов. Истинными причинами изъятия детей у родителей, как это установлено из рассказов жителей указанных выше сел и деревень, являлось создание детских лагерей — «доноров» для переливания крови советских детей раненым немецким солдатам и офицерам. Привожу отдельные из многих рассказов жителей об этих чудовищных преступлениях гитлеровских мерзавцев.

Житель деревни Задруть Козлов Антон Трофимович, 1917 года рождения, эвакуированный немцами в село Вила Бобруйского района, рассказал: «Работая на ст. Красный Берег, я видел, как немцы каждый день приводили под конвоем пяти-семи-восьмилетних детей и несколькими эшелонами отправляли их в направлении Бобруйска. Только 25 июня, за несколько часов до прихода Красной Армии, немцы отправили 5 вагонов с детьми в направлении на Бобруйск».

Галаджев.

Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі. Ф. 233. Воп. 2374. Спр. 20. Л. 290—191.

АКТ АБ ЗЛАЧЫНСТВАХ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ АКУПАНТАЎ У БАБРУЙСКУ І ЯГО НАВАКОЛЛІ

г. Бабруйск
17.1.1945 г.

Бобруйская областная Комиссия содействия в работе Чрезвычайной Государственной Комиссии по расследованию и установлению злодеяний немецко-фашистских захватчиков в составе: председателя Комиссии Баранова Федора Алексеевича, заместителя председателя Комиссии Ждановича Андрея Фосича, членов комиссии тт. Овчинникова Василия Григорьевича, Ходыко Николая Корнеевича, Шеленговского Демьяна Потаповича произвела расследование фактов истребления советских граждан немецко-фашистскими захватчиками на территории г. Бобруйска и его окрестностей в период временной оккупации.

Материалами следствия, осмотром мест истребления и захоронения комиссия установила: немецко-фашистские захватчики, ворвавшись 28 июня 1941 г. в г. Бобруйск, подобрав себе из местных предателей и сообщников, с первого дия оккупации занялись поголовным истреблением советских граждан разного пола, возраста, национальности и военнопленных.

Истребление проводилось систематически на протяжении всего времени оккупации данной территории, т.е. до 9 июня 1944 г.

Методы истребления применялись разные: расстрел, повешение, сожжение и закапывание живьем людей, применение пыток к заключенным, оканчивающихся смертью, содержание военнопленных в зимний период под открытым небом и питание их один раз в сутки баландой из картофельной шелухи, что вызывало инфекционные заболевания среди них и большую смертность.

Наравне со взрослыми зверскому истреблению подвергались и дети разного возраста. Таким образом немецко-фашистские захватчики и их сообщники за время оккупации г. Бобруйска и его окрестностей уничтожили до 40 000 гражданского населения и до 40 000 военнопленных.

Немецкими властями г. Бобруйска путем облавы на территории города и насильственным путем вывезено в немецкое рабство 1000 советских граждан.

В целях скрытия следов злодеяний немецко-фашистских захватчиков осенью 1943 г. и в начале 1944 г. в д. Каменка, Еловики и возле еврейского кладбища производили массовое сожжение извлеченных из могил трупов уничтоженных ими советских граждан. Оставшиеся могилы с неизвлеченными для сожжения трупами оккупанты тщательно замаскировали путем проведения по могилам проезжих дорог, посевов на них зерновых культур и прочее.

Приведенные данные зверства и истребления немецко-фашистскими захватчиками и их сообщниками советских людей подтверждаются показаниями свидетелей, собранными по этому вопросу документами, осмотром комиссией мест истребления и сожжения трупов советских граждан у д. Каменка, Еловики Бобруйского района, возле еврейского кладбища, в крепости, по Парковой улице бывшего лагеря военнопленных.

По д. Каменка военный объект № 152

В 9 километрах от г. Бобруйска в период оккупации уничтожено до 10 000 человек советских граждан, в т.ч. и детского возраста. Уничтожение производилось путем расстрела и за-

капывания живьем. Как правило, перед каждым расстрелом жандармерия и полиция снимала одежду и обувь с обреченных и тут же делила между собой. Все это делалось на глазах у обреченных и населения деревни, т.к. уничтожение производилось в дневное время. Очевидцы варварских действий немецко-фашистских захватчиков и их сообщников по истреблению советских граждан показывают:

1. Свидетель Бобоpенко Афанасий Захарович:

«Во время немецко-фашистской оккупации, постоянно проживая в д. Каменка, хорошо знаю про все случаи уничтожения немцами советских граждан в д. Каменка, военный объект № 152. Уничтожение начиналось в июне 1941 г. Машины с обреченными на уничтожение обычно подъезжали днем, и уничтожение производилось на глазах у населения. Видел, как немцы расстреливали мужчин, женщин и детей. Общее количество истребленных советских граждан, по моему мнению, исчисляется в 10 000 человек. Сожжение трупов началось осенью 1943 г. и продолжалось несколько дней».

2. Свидетель Савицкий Иосиф Иосифович показал:

«В период немецкой оккупации я проживал в деревне Каменка Бобруйского района и знаю следующее: в июле месяце 1941 г. часов в 7 утра в 9 километрах от г. Бобруйска на правой стороне Варшавского шоссе было привезено на моих глазах и тут же расстреляно 250 советских граждан. Осенью 1941 г. в этом же месте немцы расстреляли около 10 000 мирных граждан. Осенью 1943 г., чтобы скрыть свои преступления, немцы извлекли трупы из этих могил и сожгли на кострах».

3. Свидетель Фомиченко Павел Федорович показал:

«Мне известно место массового расстрела мирных граждан СССР. Место это расположено в 9 километрах от г. Бобруйска в 400 метрах вправо от Варшавского шоссе, где за несколько дней до расстрела силами русских военнопленных были вырыты три ямы размером 40—50 метров длиною, 3 метра шириною и до 3 метров глубины. Через несколько дней немцы в закрытых машинах привозили мирных граждан г. Бобруйска к этим ямам и тут же расстреливали. На третий день я был на месте расстрела и своими глазами видел заполненные ямы».

По деревне Еловики «Лысая Гора»

В 4 километрах от г. Бобруйска по Минскому шоссе немецко-фашистскими захватчиками и их сообщниками расстреляно и сожжено до 10 000 советских граждан. (Фонды Беларускага Дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыниай вайны, інв. № 14120).

1. Свидетель Скворцов Василий Иосифович показал:

«В период немецкой оккупации я проживал в деревне Еловики. За это время на данной территории я наблюдал следующее: часто я возил дрова для продажи в город Бобруйск и видел массовые расстрелы мирных граждан. К месту расстрела на 4-м километре по шоссе от города Бобруйска в 50-и метрах от дороги неоднократно видел подъезжавшие закрытые немецкие машины с обреченными на смерть мирными советскими гражданами. В этом числе были и дети. Издали были видны стоявшие люди с завязанными руками назад, которых расстреливали в затылок. Такие немецкие инквизиции продолжались в течение 3-х лет, и, помоему, истреблено более 10 000 человек. Кроме того, в этом же месте расстреляно около 10 000 русских военнопленных, из которых одному удалось уйти от смерти. Его жители нашей деревни переодели, и он пошел в сторону Минска».

2. Свидетель Скворцова Зинаида Иосифовна рассказала:

«В период немецкой оккупации города Бобруйска мне пришлось видеть следующее: в сентябре месяце 1941 года я шла из города Бобруйска. На 3-м километре по Минскому шоссе производился массовый расстрел мирных граждан. Около ям стояло 7 немецких автомашин. Возле машин, понурив головы, стояли люди, более 500 человек, их всех расстреляли. Как сейчас помню страшную картину. Одна женщина в замасленной фуфайке не сходила с машины. Немецкие изверги силой выбросили ее оттуда и сразу же расстреляли. Такие расстрелы мирных граждан производились немцами в течение 3-х лет. По моему мнению, в этом месте расстреляно около 20 000 мирных граждан СССР. Кроме того, за этот период на моих глазах было расстреляно много русских военнопленных. По моему мнению, их погибло около 10 000 человек».

По Бобруйской крепости

Показывают 4 свидетеля уничтожения военнопленных...

По Парковой улице бывшего лагеря военнопленных

Показывают 3 свидетеля об уничтожении военнопленных...

По еврейскому кладбищу города Бобруйска

В одном километре от города расположено еврейское кладбище. Немцы превратили его в место массового истребления советских граждан. Всего за время немецкой оккупации расстреляно и замучено до 25 000 человек.

1. Свидетель Закревский Игнат Матвеевич показывает:

«Я был очевидцем массового расстрела советских граждан на еврейском кладбище. Ямы-могилы заранее готовились немцами. Рыли их русские военнопленные. Затем подъезжали крытые немецкие автомашины с советскими людьми, которых фашисты сразу же расстреливали и сваливали в беспорядке в заготовленные ямы. Расстрелы совершались по утрам и вечерам в течение 1941—1942—1943 годов. Среди расстрелянных были старики, дети и женщины, а также военнопленные. Размеры ям-могил были до 30 метров длиною, 5 метров шириною и 3 метра глубиною. По моим подсчетам, погибло всего тысяч 25. Осенью 1943 г. немцы вскрыли могилы и сожгли полуразложившиеся трупы. Это они хотели замести свои кровавые следы с наступлением Красной Армии.

2. Свидетель Туманская Анна Степановна:

«За время немецкой оккупации я проживала поблизости от еврейского кладбища и была свидетельницей всех расстрелов мирных граждан города Бобруйска в 1941—1942—1943 годах. Всего могил, где похоронены расстрелянные, можно насчитать до 50. Осенью 1943 года немецко-фашистские захватчики извлекли трупы из этих ям-могил и сожгли, так что число замученных и расстрелянных советских людей трудно подсчитать».

Свидетельские показания неопровержимо изобличают немецко-фашистских палачей в злодеяниях над мирными гражданами и военнопленными. Комиссия по еще не полным данным считает, что в городе Бобруйске и его ближайших окрестностях немецко-фашистскими властями и командованием германской армии только в обследованных местах истреблено советских граждан и военнопленных свыше 80 000 человек.

На основании изложенного, комиссия находит, что прямым виновником истребления мирного населения города Бобруйска и окрестностей, а также и военнопленных, является комендант города Бобруйска генерал-майор Гаман. Он должен понести суровую кару за свои чудовищные кровавые преступления — истребление советских граждан.

Подписи членов Комиссии

Фонды Беларускага Дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Інв. № 14119. Л. 3—6.

АКТ АБ ЗЛАЧЫНСТВАХ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ АКУПАНТАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ БАБРУЙСКАГА РАЁНА

Бабруйскі раён
9.4.1945 г.

Мы, нижеподписавшиеся, комиссия в составе секретаря Бобруйского РК КП(б)Б Подоляко Василия Ивановича, заместителя председателя райисполкома Федяченко Ивана Павловича, секретаря райисполкома Кочегуро Василия Леонтьевича в присутствии свидетелей: Трояна Александра Емельяновича и Гудинского Виктора Филипповича составили настоящий акт на нижеследующее:

... Немецко-фашистские палачи систематически бомбардировали с воздуха мирное население деревень: Мочулки, Петровичи, Горбацевичского сельсовета. При бомбардировке убито 6 человек советских граждан.

Таким образом немецко-фашистские захватчики уничтожили за период оккупации территории Бобруйского района 249 человек гражданского населения. Немецкими властями из Бобруйского района путем облав в населенных пунктах района и насильственным путем вывезено в немецкое рабство 1283 человека.

На основании изложенного комиссия находит, что прямым виновником истребления населения Бобруйского района является сельскохозяйственный комендант Бобруйска (начальник германского земельного управления) немец Битнер, который должен понести суровую кару за свои кровавые преступления в истреблении советских граждан.

Подписи членов комиссии

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 845. Воп. 1. Спр. 60. Л. 23.

З АБВІНАВАЎЧАГА ЗАКЛЮЧЭННЯ СУДОВАГА ПРАЦЭСУ ПА СПРАВЕ АБ ЗЛАЧЫНСТВАХ, ЯКІЯ БЫЛІ ЗДЗЕЙСНЕНЫ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІМІ ЗАХОПНІКАМІ Ў БЕЛАРУСІ

Обвиняемые Молл, Бурхард и Гетце, используя подчиненных им солдат и офицеров, вывезли в Германию из Бобруйского и Паричского районов БССР более 20 000 человек.

По приказанию обвиняемого Молла только летом 1942 года из Паричского района и в июле 1943 года из Бобруйского района принудительно отправлено в Германию более 12 000 человек, в том числе около 9000 подростков.

Обвиняемый Бурхард также отправил на каторгу в Германию из находившегося в его подчинении трудового лагеря около 2500 человек.

При активном участии обвиняемого Битиера из Бобруйского района в Германию вывезено 1283 человека.

Судебный процесс по делу о злодеяниях, совершенных немецко-фашистскими захватчиками в Белорусской ССР (15—29 января 1946 года). Мн., 1947. С.23—24.

З ПАКАЗАННЯ СВЕДКІ МАРЫІ ДЗМІТРЫЕЎНЫ ВІНАГРАДАВАЙ НА СУДОВЫМ ПРАЦЭСЕ Ў МІНСКУ 24 СТУДЗЕНЯ 1946 г. ПА СПРАВЕ АБ ЗЛАЧЫНСТВАХ, ЗДЗЕЙСНЕНЫХ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІМІ ЗАХОПНІКАМІ НА БЕЛАРУСІ

Когда немецкие войска вступили в город, я была с 5 детьми в городе Бобруйске. В 1943 году ко мне на квартиру приехали 2 жандарма из местной комендатуры и переводчик, сделали обыск и ничего при обыске не нашли, тогда переводчик говорит: одевайтесь и пойдемте с нами. Когда привели в местную комендатуру и сказали — это Виноградова, комендант сказал: заведите ее в камеру.

Ввели меня в камеру. Я неделю просидела без всяких допросов. На вторую неделю меня начали допрашивать, подозревая в связях с партизанами.

Через неделю меня вывели из камеры во двор, посадили в закрытую машину, вместе с мужчинами, которых было 7 человек, и повезли по Минскому шоссе в лес около деревни Еловкн. Прнвезли нас к ямам, остановили машину. Соскакивают полицейские, жандармы и говорят: сходите с машины. Мы все сошли с машины. Полицейские стали по бокам по обе стороны, а жандармы сзади. Подвели к яме. Когда подвели нас к яме, прнказали ложиться. Я была в середине мужчин, закрыла руками глаза н легла вдоль ямы. Когда положили мужчин, начали стрелять. Мне пуля попала в грудь.

Мы лежали лицом вниз, я боялась, чтобы они не повернули меня и не посмотрели в лицо, но они не поворачивали никого. Я притворилась мертвой. Полицейские схватили лопаты и немного прикрыли нас землей. Когда ушла машина, я выкарабкалась из земли и на рассвете выбралась на Минское шоссе и добралась домой.

Моей сестре уже сказали в комендатуре, что я расстреляна. После этого, чтобы не быть обнаруженной, я пряталась в течение 14 месяцев до дня прихода Красной Армии.

Судебный процесс по делу о злодеяниях, совершенных немецко-фашистскими захватчиками в Белорусской ССР (15—29 января 1946 года). Мн., 1947. С.303—304.

БАБРУЙСКІЯ ЛАГЕРЫ ДЛЯ ВАЕННАПАЛОННЫХ

У пачатку вайны гітлераўцы стварылі на тэрыторыі Бабруйскай крэпасці лагер для савецкіх ваеннапалонных. А ўлетку 1944 г. тут жа быў створаны лагер для нямецкіх ваеннапалонных. Параўнаем.

З ПАКАЗАННЯ БЫЛОГА НАМЕСНІКА КАМЕНДАНТА ЛАГЕРА САВЕЦКІХ ВАЕННАПАЛОННЫХ У Г. БАБРУЙСКУ КАПІТАНА ЛАНГУТА КАРЛА НА СУДОВЫМ ПРАЦЭСЕ Ў СТУДЗЕНІ 1946 г. ПА СПРАВЕ АБ ЗЛАЧЫНСТВАХ, ЯКІЯ ЗДЗЕЙСНІЛІ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІЯ ЗАХОПНІКІ НА БЕЛАРУСІ

4 или 5 ноября 1941 г. ко мне пришел комендант лагеря подполковник Редер и сказал, что со мной он должен побеседовать. Прежде всего он потребовал, чтобы я дал слово, что никому больше об этом разговоре не расскажу. Такое слово я дал. После этого Редер говорил, что командование отказалось давать транспорт для военнопленных в Германию. Все военнопленные умирали от голода. Поэтому полковник Штурм дал прнказ уничтожить военнопленных лагеря № 2. Лагерь имел тогда 18 тысяч военнопленных.

Ко мне 6 ноября должен был прийти руководитель одной из зондеркоманд, которому я должен был показать казармы. Он должен был подготовить и осуществить поджог, но при этом создать видимость, что как будто военнопленные сами подожгли лагерь с целью побега.

Руководитель этой зондеркоманды пришел ко мне 6-го. Я ходил с ним по казармам, затем на чердак третьего этажа. На чердаке находилась вентиляция.

Руководитель зондеркоманды сказал, что 6 ноября он привезет материал для поджога, а также горючего. Я пообещал, что буду при этом, когда он придет.

6 ноября вечером он вернулся и привез материал для поджога. С ним были еще двое. Сказал, что 7 ноября он все устроит и что моя помощь ему уже больше не нужна.

7 числа в 15 часов фельдфебель мне доложил, что правый фланг казармы горит. Я позвонил зондерфюреру Мартынюку в пожарную команду, и Редер мне приказал по телефону, чтобы я вместе в Мозебахом, который являлся вторым лагерным офицером, и двумя переводчиками пошел в казармы и выгонял всех военнопленных во двор. Я с Мозебахом туда пошел и увидел, что 3-й этаж горит. Я пошел в барак военнопленных, который также горел, и вместе с переводчиками людей гнали сверху вниз. Понятно, что 18 000 человек не могли сразу сойти вниз. Люди с первого и второго этажа стояли на лестнице и загородили собой выход для пленных, размещавшихся на третьем этаже. Погода была очень плохая, никто из военнопленных не хотел выходить на улицу, в силу чего выход военнопленных из казармы продолжался очень долго. Таким образом только несколько тысяч военнопленных вышли на улицу.

Комендант мне сказал, что он звонил в 221-ю охранную дивизию, чтобы дали дополнительную охрану, из дивизии также должны были прислать офицеров, чтобы окружить лагерь. Примерно в 17 часов приехала пожарная команда. Я никак не мог понять, почему пожарная команда не приезжала 2 часа. Оказалось, что охранник, который имел приказ никого не пускать в цитадель, не пропустил пожарную команду, которая приехала вовремя. Один гидрант давал некоторое время достаточно воды для тушения пожара, а второй совершенно не давал. В это время уже вся казарма горела, южный ветер помогал пожару.

Комендант лагеря послал меня в другое отделение лагеря посмотреть, все ли там в порядке, и когда я вернулся, большинство военнопленных уже стояло во дворе. Тогда комендант приказал мне и всему немецкому персоналу, который был в зоне лагеря, выйти на улицу. Здесь же он познакомил меня с одним капитаном из охранной дивизии, фамилию которого я забыл. Капитан в это время поставил четыре пулемета вокруг лагеря. По его приказу охрана была усилена. Коменданту лагеря, как и мне, нечего было больше там приказывать. Капитан дал приказ пулеметчикам открыть огонь.

Один пулемет стрелял в военнопленных, которые находились в 5 метрах между казармой и улицей. Он все время стрелял в военнопленных, которые находились во дворе.

Военнопленные бежали на другую сторону. Тогда второй пулемет стрелял в ту сторону, в которую направлялись военнопленные. Тогда все военнопленные бросились к средине. Третий пулемет стрелял в средину.

В 20 часов я еще видел военнопленных в одной казарме. В 21 час комендант мне сказал, чтобы я ушел оттуда и сходил в лагерь № 1, так как можно ожидать, что и в других лагерях что-нибудь случится.

На следующий день, в 8 часов утра, я и комендант лагеря пошли в казармы. Казармы сгорели. Оставшиеся в живых военнопленные лежали друг на друге в средиие двора и просили, чтобы их отправили в какой-нибудь лагерь. Комендант сказал, что сейчас это сделает.

В 13—14 часов я приказал зондерфюреру Мозебаху направить этих военнопленных в лагерь № 1. Я еще раньше освобождал лагерь № 1. В нем находилось очень мало военнопленных. Насколько я знаю, 14 тысяч военнопленных были переведены в лагерь №1. Я не могу сказать, было 500 или 600 раненых, остальные были уничтожены. Сколько военнопленных сгорело в казармах, этого мы не узнали.

Когда военнопленные прибыли в лагерь № 1, они получили хорошее помещение. Из этого лагеря 2 тысячи пленных пешком отправили в Слуцк в этот день или на следующий. Как мне рассказали позже, из 2000 военнопленных очень малое количество дошло до Слуцка. Конвоиры говорили, что военнопленные, проходя через лес, хотели убежать и были охранниками расстреляны.

Охрану в Слуцке также несла 221-я дивизия.

20 тысяч военнопленных находилось в лагере № 1. Через несколько дней они были направлены в открытых и закрытых вагонах на Запад.

Прокурор: Вы были полностью в курсе дела всей провокационной подготовки поджога с целью уничтожения русских военнопленных?

Лангут: Да.

Прокурор: Какое же количество людей погибло в результате этого провокационного поджога, за который вы хотели свалить вину на военнопленных?

Лангут: 4000 человек.

Прокурор: Четыре тысячи человек было уничтожено в результате пожара. А сколько было расстреляно из пулеметов?

Лангут: Четыре тысячи — это общая цифра сожженных и расстрелянных...

Прокурор: С какой целью были поставлены пулеметы?

Лангут: Для уничтожения тех, которые хотели бежать, и тех, которые вышли из казармы во двор.

Прокурор: Значит, не только для того, чтобы расстреливать тех, которые старались убежать, но даже и тех, которые пытались уйти из горящих казарм?

Лангут: Да, так.

Прокурор: Почему вы отдали распоряжение вызвать пожарную команду? Зачем это нужно было? Ведь вы же хотели уничтожить казармы с находившимися там людьми?

Лангут: Для того, чтобы подумали, что подожгли сами военнопленные.

Прокурор: Считаете ли вы такие деяния нарушением всех международных правил?

Лангут: Так точно.

Прокурор: Считаете ли вы, что вы являетесь непосредственным организатором и исполнителем этого жестокого преступления по истреблению русских военнопленных и должны нести перед Военным Трибуналом и перед советским народом самую жестокую ответственность?

Лангут: Да, я должен за это отвечать, но я действовал по приказу...

Прокурор: Расскажите об отправке эшелонов зимой, при которых большее количество военнопленных замерзало, так как вагоны и платформы не были приспособлены к перевозке людей.

Лангут: Точно не помню когда, но мне кажется в декабре 1941 года дивизия нам предоставила 50 вагонов, и мы погрузили в них военнопленных. Комендант лагеря приказал перевозить всех военнопленных на открытых платформах.

Прокурор: Какое количество военнопленных было погружено на открытые платформы?

Лангут: 3200 военнопленных.

Прокурор: Вам известно, что все военнопленные, которые перевозились в декабре месяце 1941 г. на открытых платформах, замерзли и трупы их были сброшены под откос?

Лангут: Об этом я узнал от свидетелей.

Прокурор: Как часто практиковался такой способ переброски военнопленных в зимних условиях?

Лангут: Применяли часто...

Прокурор: Скажите, был ли случай, когда в Бобруйский лагерь № 131 прибыл эшелон с замерзшими людьми?

Лангут: В январе 1942 г. прибыл эшелон из направления Гомель—Брянск. В эшелоне было 600 человек больных и раненых, из них 200 человек замерзших.

Прокурор: Где были похоронены тела этих 200 русских пленных?

Лангут: В братской могиле, восточнее лагеря.

Прокурор: Были ли случаи расстрела военнопленных при разгрузке эшелонов?

Лангут: Да, такие случаи были.

Прокурор: Что вы делали с теми военнопленными, которые отставали от колонны после выгрузки?

Лангут: Часть из них была расстреляна, часть — избита, я тоже их бил...

Прокурор: Кроме военнопленных, содержалось в лагере гражданское население и в каком количестве?

Лангут: Было, но сколько — мне не известно.

Прокурор: Вы на предварительном следствии показали, что их было 5000 человек.

Лангут: Если я сказал, тогда правильно.

Прокурор: Все эти люди находились в распоряжении местного коменданта Молла?

Лангут: В 1944 г. в январе месяце в лагере военнопленных уже не было, а к нам привели 5000 гражданских лиц по приказу генерала Гамана.

Прокурор: С тем чтобы больше не возвращаться к эпизоду о поджоге казармы, ответьте на следующий вопрос: как был представлен поджог этой казармы общественному мнению?

Лангут: Мы сообщили в Берлин о том, что военнопленные сами подожгли казарму для того, чтобы совершить побег из лагеря, а поэтому мы были вынуждены расставить пулеметы и расстрелять толпу военнопленных.

Прокурор: Скажите, какую награду получил комендант лагеря за эту операцию?

Лангут: Точно не могу сказать, но через 2 — 3 недели он получил военный крест 1-й степени «За военные заслуги»...

Прокурор: Скажите, Лангут, среди гражданского населения, которое содержалось в лагере, дети были?

Лангут: В январе месяце детей не было, но в мае месяце дети прибыли.

Прокурор: Когда к вам было доставлено 600 человек детей в возрасте от 10 до 15 лет?

Лангут: Это было в 1942 году, когда происходили бои возле Вязьмы и Брянска.

Прокурор: Почему дети прибыли в лагерь вместе с эшелоном военнопленных?

Лангут: Эти дети к нам прибыли не только с одним эшелоном, их привозили несколько раз. Они прибывали с военнопленными, которые, как нам говорили, были их отцами. К нам также прибывали и женщины...

Прокурор: Какова судьба этих детей?

Лангут: После, когда только установили, что эти дети не являются сыновьями и дочерьми

военнопленных, мы их передали в лагерь № 3, откуда их после отправили, но куда, я не знаю.

Прокурор: По каким причинам дети умирали в лагере?

Лангут: Около 250 детей умерло в лагере от сыпного тифа...

Прокурор: Расскажите, передавались ли военнопленные Бобруйского лагеря № 131 для производства над ними так называемых «медицинских опытов». Расскажите, что это за опыты, которые проводил «профессор» Борман?

Лангут: Это не были военнопленные. Профессор Борман получил заключенных от СД 50 мужчин и 50 женщин.

Прокурор: Что это за медицинские опыты?

Лангут: Профессор Борман являлся представителем 9-й армии. Ему дали разрешение произвести пробу одного лекарства для борьбы с сыпным тифом. Для этого ему СД выделило 50 мужчин и 50 женщин, которые были приговорены к смертной казни. Мне об этом рассказал Борман.

По приказу коменданта лагеря № 131 для Бормана было выделено одно здание, в которое были переведены выделенные ему для опытов люди.

Судебный процесс по делу о злодеяниях, совершенных немецко-фашистскими захватчиками в Белорусской ССР (15—29 января 1946 года). Мн., 1947. С.341—349.

Дакументы падрыхтаваў да друку У.І.Лемяшонак.

З ЗАГАДА НАРОДНАГА КАМІСАРА УНУТРАНЫХ СПРАЎ БЕЛАРУСКАЙ ССР С.БЕЛЬЧАНКІ «АБ ВЫНІКАХ ПРАВЕРКІ Ў БАБРУЙСКІМ ЛАГЕРЫ ДЛЯ ВАЕННАПАЛОННЫХ»

11 лістапада 1944 г.

...Начальнику лагеря подполковнику госбезопасности т. Репину.

...Повторить заявки на медикаменты и медико-санитарное имущество.

Ни одного случая смерти военнопленных не оставлять без должной проверки причины и реагирования как на чрезвычайное происшествие.

Ввести в систему проверку организации питания военнопленных, в особенности больных и ослабленных, в соответствии с требованиями директивы НКВД СССР № 238.

Пресекать попытки вплоть до предания суду хищения продовольствия, предназначенного для военнопленных.

...Предупреждаю весь офицерский и начальствующий состав лагерей военнопленных, что за допущенные смертности военнопленных в лагерных подразделениях будут привлекаться к строгой ответственности.

Архіў Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь. Ф.50. Воп.1. Спр.18. Л.140.

Падрыхтавала да друку Р.А.Чарнаглазава.

Змагаліся ў тыле ворага

На акупіраванай гітлераўцамі Бабруйшчыне ўжо ў першыя месяцы вайны, як і прадугледжвала дырэктыва ЦК КП(б)Б, пачалі ўзнікаць падпольныя і баявыя групы для барацьбы з акупантамі. «Новы парадак» акупацыйных уладаў, здзекі, рабаванне і знішчэнне людзей паскорылі гэты працэс. І ўжо ў хуткім часе на тэрыторыі раёна дзейнічала добра наладжаная сістэма патрыятычнага падполля, разгарнулася партызанская барацьба з ворагам.

БАБРУЙСКІ ПАДПОЛЬНЫ МІЖРАЙКОМ КП(б)Б

Дзейнічаў з 11 жніўня да 4.11.1942 г. Створаны ЦК КП(б)Б для кіраўніцтва падпольнымі партыйнымі арганізацыямі Асіповіцкага, Бабруйскага, Бярэзінскага, Кіраўскага і Клічаўскага р-наў, разгортвання партызанскага руху і актывізацыі баявых дзеянняў партызанскіх атрадаў. Сакратар міжрайкома І.М. Кардовіч, члены: Я.І. Заяц, І.А. Матыль, К.М. Якаўлеў. Міжрайком стварыў Бабруйскі і Кіраўскі, зацвердзіў Асіповіцкі і Бярэзінскі падпольныя райкомы кампартыі Беларусі, пасля чаго спыніў сваю дзейнасць.

БАБРУЙСКІ ПАДПОЛЬНЫ МІЖРАЙКОМ ЛКСМБ

Створаны Цэнтральным Камітэтам камсамола Беларусі. Дзейнічаў з 24.8.1942 г. да

1.6.1943 г. пад кіраўніцтвам Магілёўскага падпольнага абкома камсамола і Бабруйскага падпольнага міжрайкома кампартыі Беларусі (да 4.11.1942). Кіраваў Асіповіцкім, Бабруйскім, Клічаўскім падпольнымі райкомамі камсамола Магілёўскай вобл. і Глускім падпольным райкомам камсамола Палескай вобл., камсамольскімі і маладзёжнымі арганізацыямі і групамі г. Бабруйска. Сакратары: І.А. Матыль, П.Ф.Валожын (з 1.3.1943 г. — член ЦК ЛКСМБ); члены: В.С. Даўжанкова, А.С. Дайнека (да 15.3.1943 г.), А.П. Касцевіч, В.А. Барабашкіна (з 1.12.1942 г.). Асноўная база знаходзілася ў Клічаўскім р-не.

БАБРУЙСКІ ПАДПОЛЬНЫ РАЙКОМ КП(б)Б

Дзейнічаў з 2.9.1942 г. да 30.6.1944 г.

Сакратар: Д.М.Лемяшонак (2.9.1942—29.11.1943).

Члены райкома: Р.Н.Акуліч (18.9.1942—30.6.1944), В.І.Лівенцаў (16.10.1942—29.11.1943), М.І.Семісалаў (16.10.1942—14.4.1943, загінуў), А.К.Флегантаў (2.11.1942—18.1.1943, загінуў), Дз.А.Ляпёшкін (18.1.1943—29.11.1943), С.З.Крамнёў (30.6.1943—29.11.1943), П.І.Тамковіч (12.11.1943—29.11.1943), М.Б.Храпко (12.11.1943—30.6.1944). Райком базіраваўся ў 1-й Бабруйскай партызанскай брыгадзе, якая 29 лістапада 1943 г. злучылася з Чырвонай Арміяй. Разам з ёй у савецкі тыл выйшлі 5 членаў райкома партыі. У варожым тыле былі пакінуты і дзейнічалі члены райкома Р.Н.Акуліч і М.Б.Храпко. У гэтым складзе райком базіраваўся ў партызанскай брыгадзе № 37 імя А.Я.Пархоменкі да вызвалення раёна ў чэрвені 1944 г. Друкаваны орган падпольнага райкома — газета «Бобруйский партизан» (рэдактар С.З.Крамнёў).

ЛЕМЯШОНАК ДАНІЛ МАЙСЕЕВІЧ

Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыйнага падполля і партызанскага руху на тэр. Магілёўскай вобл. Нарадзіўся 4.4.1908 г. ў в. Баранавічы Бабруйскага раёна. Скончыў Гомельскую саўпартшколу (1933), Рэспубліканскую партшколу пры ЦК КП(б)Б (1949). У 1929—1940 гг. на гаспадарчай і партыйнай рабоце. Паводле рашэння ЦК КП(б)Б у ліпені 1941 г. накіраваны ў тыл ворага: сакратар парткома па кіраўніцтву падпольнай барацьбой на тэр. Бабруйскага р-на і Бабруйска, з студзеня 1942 г. член Бабруйскага камітэта партызанскага руху, начальнік штаба 278-га

Д.М.Лемяшонак.

М.І.Семісалаў.

партызанскага атрада, з 2.9.1942 г. да 29.11.1943 г. сакратар Бабруйскага падпольнага РК КП(б)Б. З 1944 г. на партыйнай рабоце, з 1956 г. загадчык аддзела парторганаў, старшыня парткамісіі Мінскага абкома КПБ, у 1960—1967 гг. загадчык аддзела Мінскага аблвыканкома. Быў членам ЦК КПБ і дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. Памёр 4.4.1981 г.

БАБРУЙСКІ ПАДПОЛЬНЫ РАЙКОМ ЛКСМБ

Дзейнічаў з 14.10.1942 г. да 30.6.1944 г.

Сакратары: М.І.Семісалаў (14.10.1942—14.4.1943, загінуў), М.А.Тоўсцік (1.11.1943—30.6.1944), А.М.Баландзіна — сакратар па прапагандзе (12.4.1943—1.1.1944). Члены райкома: Л.І.Нікульнікаў (14.10.1942—30.6.1944), Г.М.Смольнікава (14.10.1942—30.6.1944), Л.М.Нароўская (14.10.1942—2.4.1943), У.В.Шылаў (люты 1943—25.12.1943), П.М.Варывончык (3.8.1943—30.6.1944), А.П.Харламаў (3.8.1943—30.6.1944).

СЕМІСАЛАЎ МІХАІЛ ІГНАТАВІЧ

Адзін з арганізатараў камсамольскага падполля, удзельнік партызанскага руху на тэрыторыі Магілёўскай вобл. Нарадзіўся ў 1913 г. ў Харкаўскай вобл. (Украіна). Скончыў Растоўскі універсітэт і працаваў настаўнікам-гісторыкам. З 1940 г.ў Чырвонай Арміі, служыў у Оршы. У пачатку вайны трапіў у акружэнне. У Бабруйску актыўна ўключыўся ў падпольную барацьбу супраць акупантаў. 14.10.1942 г. абраны сакратаром Бабруйскага падпольнага райкома камсамола, 16.10.1942 г. — членам Бабруйскага падпольнага райкома партыі. Быў сакратаром пар-

тыйнай арганізацыі 1-й Бабруйскай партызанскай брыгады. Загінуў у баі 14.4.1943 г.

БАБРУЙСКАЕ ПАРТЫЙНА-КАМСАМОЛЬСКАЕ ПАДПОЛЛЕ

Дзейнічала з ліпеня 1941 г. да чэрвеня 1944 г. ў Бабруйску і Бабруйскім раёне пад кіраўніцтвам Магілёўскага падпольнага абласнога, Бабруйскага падпольнага міжраённага і Бабруйскага падпольнага раённага камітэтаў КП(б)Б. Барацьбой камсамольцаў і моладзі кіравалі адпаведныя камсамольскія органы. Падполле налічвала 29 груп, больш за 500 чалавек, з іх 236 камуністаў і камсамольцаў. Групы ўзначальвалі: М.Р.Баглай, П.С.Вашукевіч, А.К.Калеснікаў і Я.І.Савацееў, В.С.Калеснікаў, Д.М. Лемяшонак, П.Ф.Маслёнак і В.І.Бутараў, С.Г.Акуліч, П.М.Сцяржанаў, І.В.Стомаў (з красавіка 1942 Я.Е.Царык), А.В.Фальковіч і інш. Важную ролю ў стварэнні падполля адыгралі ваеннаслужачыя, якія трапілі ў акружэнне ці ўцяклі з палону: групы С.З.Крамнёва, В.І.Лівенцава, П.М.Сцяржанава, А.Н.Сумбаева, І.А.Хімічова, К.М.Якаўлева. У верасні 1941 г. адбылася першая канспіратыўная сустрэча прадстаўнікоў падпольных груп горада, на якой прынята рашэнне аб узмацненні барацьбы з акупантамі. З мэтай каардынацыі дзеянняў выбрана аператыўная група ў складзе камуністаў В.І.Лівенцава (кіраўнік), Н.А.Боўкуна, В.М.Васільева, С.З.Крамнёва, Г.М.Кустова, Дз.А.Ляпёшкіна, П.Ф.Маслёнка. Па ініцыятыве Д.М.Лемяшонка створаны камітэт КП(б)б, у які ўвайшлі: Д.М.Лемяшонак (сакратар), Г.С.Бекіш, А.І.Чарноў. Да кастрычніка 1941 г. камітэт ахапіў сваім уплывам шматлікія гарадскія і сельскія групы. Да канца 1941 г. дзейнічала больш за 20 падпольных груп, якія аб'ядноўвалі каля 350 чалавек. Подпольныя групы дзейнічалі на ст. Мошны, у р.п. Глуша, вёсках Брожа, Варатынь, Васілеўка, Каралёва, Слабада, Гарбацэвічы, Осава, Казакова, Фартуны, Кругланіва, Цялуша, Чыкілі, Шчаткава, Панюшкавічы і інш.

Члены групы П.Ф.Маслёнка і В.І.Бутарава, якая дзейнічала на лесакамбінаце, прымалі па радыёпрыёмніках і распаўсюджвалі зводкі Саўінфармбюро, выводзілі са строю абсталяванне на камбінаце, хлебазаводзе, электрастанцыі. Група В.І.Лівенцава вяла палітычную работу, здабывала і сама выраблялі бланкі дакументаў (за жнівень—снежань 1941 г. вырабіла больш за 200 пашпартоў, пячаткі, мела радыёпрыёмнік, фоталабараторыю). Група С.Г.Акуліча і І.В.Стомава, якая дзейнічала ў раёне Бярэзінскага фарштата, учыняла дыверсіі на суднарамонтным і шпалярэзным заводах, вяла прапаганду ў варожых фарміраваннях, перадавала звесткі аб аэрадроме ворага і яго гарнізоне ў Бабруйску, арганізоўвала ўцёкі ваеннапалонных з лагера смерці. Група С.З.Крамнёва арганізоўвала дыверсіі ў казармах акупантаў, на радыёвузле, выводзіла са строю сістэму водазабеспячэння. Группа П.С.Вашукевіча вяла прапаганду ў варожых фарміраваннях, летам 1943 г. ўстанавіла сувязь з адным з такіх падраздзяленняў і пераправіла яго ў партызанскі атрад. Група А.К.Калеснікава і Я.З.Савацеева, якая дзейнічала на біржы працы, уладкоўвала патрэбных людзей ва ўстановы акупантаў, ратавала насельніцтва ад вывазу ў Германію, забяспечвала падпольшчыкаў неаб-



Помнік на брацкай магіле падпольшчыкаў у Бабруйску.

ходнымі дакументамі. Уладкаваўшыся на работу ў нямецкую друкарню, П.М.Сцяржанаў і В.Г. Цягуноў выпускалі там лістоўкі, бланкі пропускаў, прадуктовыя карткі. Пазней з друкарні ўдалося вынесці паперу, шрыфт, вярстатку і інш. абсталяванне, якое ў студзені 1942 г. было дастаўлена ў лес, дзе В.І.Лівенцаў і С.З.Крамнёў наладзілі выпуск лістовак і адозваў (надрукавана 55 лістовак тыражом 25,5 тыс. экз.). З лістапада 1942 г. там друкавалася падпольная газета «Бобруйский партизан». Група М.Р.Баглая ўчыняла дыверсіі на прамысловых прадпрыемствах горада і наваколля. За першыя 5 месяцаў акупацыі яна вывела са строю 11 электраматораў і шмат дэфіцытных прыбораў. Падпольшчыкі в. Брожа (кіраўнік В.Н.Шчэрбіч) пад выглядам рамонту ваеннай тэхнікі ворага псавалі яе, у студзені 1942 г. вывезлі са строю абсталяванне майстэрні. Падпольшчыкі р.п. Глуша (кіраўнік І.Р.Гарнастай) вызвалілі з лагера смерці ваеннапалонных, захапілі зброю, боепрыпасы, міны, рацыю, здабывалі і перадавалі партызанам медыкаменты, харч, двойчы выводзілі са строю шклозавод «Камінтэрн». Падпольшчыкі в. Осава (кіраўнік Д.М.Лемяшонак) вялі палітработу сярод насельніцтва, распаўсюджвалі зводкі Саўінфармбюро, лістоўкі, накіроўвалі людзей у партызанскія атрады, збіралі для партызан харч. Падпольшчыкі в. Цялуша (кіраўнік А.В.Руднеў) распаўсюджвалі лістоўкі, падбіралі людзей для партызанскіх атрадаў, перапраўлялі партызанам узрыўчатку і харчы, выводзілі са строю кабель сувязі ўздоўж шашы Бабруйск—Жлобін, распрапагандавалі 70 салдат з варожага фарміравання, якія ў 1943 г. са зброяй перайшлі да партызан. Такую ж падпольную работу вяла група вёсак Шчаткава і Панюшкавічы (кіраўнік Ал.А.Маеўскі). Група в. Казакова (кіраўнік А.І.Калпакоў) накіравала да партызан больш за 200 чалавек, перадавала ім зброю, боепрыпасы, медыкаменты. А.І.Калпакоў, яго жонка і дзеці восенню 1941 г. вынеслі са склада вайсковай часці працаўніка 35 вінтовак, 2 аўтаматы, некалькі скрынак патронаў. Усё гэта было перададзена партызанам. У снежні 1941 г. фашыстам удалося раскрыць і разграміць некалькі падпольных груп. У студзені 1942 г. пад пагрозай правалу значная частка падпольшчыкаў пайшла да партызан, у тым ліку члены камітэта. Больш за 150 падпольшчыкаў у снежні 1941 г.—студзені 1942 г. арганізавалі 752-і партызанскі атрад, на базе якога створана партызанская брыгада 1-я Бабруйская. Падпольную ба-

Мемарыяльная дошка ў вёсцы Брожа на ўшанаванне памяці патрыётаў-падпольшчыкаў.

рацьбу ў горадзе ўзначаліў Бабруйскі камітэт партызанскага руху (Д.М.Лемяшонак, Г.Н.Акуліч, В.І.Бутараў, А.В.Кодач, М.І.Семісалаў).

Некаторыя падпольныя групы былі звязаны непасрэдна са штабамі часцей Чырвонай Арміі. У жніўні 1942 г. савецкае камандаванне ўстанавіла сувязь з групай М.Р.Баглая, група стала разведвальнай. У красавіку 1943 г. ў яе ўключана радыстка А.М.Нікалайчыкава. Каб мець магчымасць назіраць за варожымі перавозкамі па чыгункі, падпольшчык Н.Г.Гурыновіч адкрыў каля чыгуначнага пераезду майстэрню па рамонце металічных вырабаў. Сабраныя звесткі адразу паведамлялі савецкаму камандаванню. Група Д.Х.Маркава рэгулярна забяспечвала камандаванне

Мемарыяльная дошка ў гонар падпольшчыкаў у вёсцы Осава.

Чырвонай Арміі звесткамі аб дыслакацыі, узбраенні, колькасці часцей праціўніка. Падпольшчыкі гэтай групы ўзарвалі нямецкую палявую радыёстанцыю, паравы кацёл на гідролізным заводзе, вывелі са строю 2 электраматоры і знішчылі склад з бензінам на лесакамбінаце, некалькі аўтамашын. Баявая дзейнасць падполля асабліва ўзмацнілася з другой палавіны 1943 г., калі савецкія войскі разгарнулі наступленне на тэрыторыі Беларусі. Летам 1943 г. ў Бабруйску створаны новыя падпольныя арганізацыі: на чыгуначным вузле, электра- і телефоннай станцыях. Адважна дзейнічала разведвальна-дыверсійная група Х.С. Прыбыля. Восенню 1943 г. ёю ўзарваны воінскі эшалон з жывой сілай і ваеннай маёмасцю, цэментны завод, падпалены казармы, дзве варожыя аўтамашыны. У 1943—1944 гадах на тэрыторыі Бабруйскага раёна паспяхова дзейнічала разведвальна-дыверсійная група І.М.Стэльмаха і І.А.Лебедзева. Каштоўныя звесткі паступалі ад І.К.Юхнаўца, А.М.Манкевіч, М.В.Шэх, Н.К.Якаўлевай, М.І.Беланогавай і інш.

У барацьбе з акупантамі загінулі: А.А.Агееў, Б.С.Акуліч, С.С.Багінян, В.І.Бутараў, Дз.П.Вараб'ёў, І.Д.Вярбіцкі, А.І.Вяржбіцкі, Д.Р. і К.Я.Гарадзецкія, Г.М.Гаўраў, У.М.Гетман, М.В.Гудзей, Р.І.Дзыгун, Р.Я.Дзярабін, В.Дзяцел, А.А.Іваноў, М.А.Казаранц, А.К. і В.В.Калеснікавы, К.П., А.М. і М.М.Клімашонкі, А.В.Кодач, К.М.Лемяшонак, Ал.А. і Ан.А.Маеўскія, Н.А.Маркоўскі, А.А. і С.Л.Марозы, А.І.Міерына, Б.Е.Пінчук, А.І. і Я.І.Савацеевы, Г.І.Сакалова, Г.Ф.Спірыдонава, В.І. і М.Д.Стомавы, Л.В.Ткачук, А.А.Траяноўскі, І.А.Цвірка, А.Ц.Чыгір. 223 падпольшчыкі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі. В.І.Лівенцаву і У.А.Парахневічу прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. У гонар падпольшчыкаў у Бабруйску ўстаноўлены помнік на брацкай магіле падпольшчыкаў і партызан, у вёсках Брожа, Глуша, Осава, Цялуша — мемарыяльныя дошкі, у в. Шчаткава — мемарыяльная пліта. *А.Б. Рогаў.*

Друкуецца па кн.: Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941—1945: Энцыкл. Мн., 1990. С.49—51.

ПАРТЫЗАНСКАЯ БРЫГАДА 1-Я БАБРУЙСКАЯ

Дзейнічала на акупіраванай тэрыторыі Асіповіцкага, Бабруйскага і Парыцкага р-наў.

У студзені 1942 г. ў в. Булкава, што непадалёку ад Рудабелкі, пераважна з ліку членаў бабруйскіх падпольшчыкаў быў створаны атрад (камандзір В.І.Лівенцаў, камісар Дз.А.Ляпёшкін, начальнік штаба М.П.Боўкун). З красавіка 1942 г. уваходзіў у склад Клічаўскага партызанскага злучэння як партызанскі атрад 752-і. У лютым 1943 г. на базе гэтага атрада створана 1-я Бабруйская партызанская брыгада. Камандзір брыгады В.І.Лівенцаў, камісар Дз.А.Ляпёшкін, начальнік штаба С.З.Крамнёў.

Камандаванне 1-й Бабруйскай партызанскай брыгады за праглядам чарговага нумара газеты «Бабруйскі партызан».

20.3.1942 г. атрад Лівенцава ўдзельнічаў у разгроме варожага гарнізона ў г.п. Клічаў, у чэрвені—жніўні 1942 г. — у абароне Клічаўскай партызанскай зоны, у прарыве блакады ў час карнай аперацыі. У лістападзе 1942 г. каля чыгуначнай станцыі Талька партызаны падарвалі і спалілі эшалон з запчасткамі да самалётаў і аўтамашын. У жніўні 1943 г. перабілі больш за 1 тыс. рэек. Усяго за час баявых дзеянняў брыгадай было пушчана пад адхон 57 варожых эшалонаў з жывой сілай і тэхнікай, патоплены параход на Бярэзіне, забіта больш чым 5 тысяч гітлераўскіх салдат, афіцэраў і паліцэйскіх.

29.11.1943 г. брыгада злучылася з Чырвонай Арміяй. На той час у яе склад уваходзілі атрады 752-і, 753-і імя 25 гадоў РСЧА, 754-ы імя М.І.Семісалава, усяго налічвалася 1127 партызан. Пасля злучэння брыгада была ўключана ў баявы парадак 37-й гвардзейскай стралковай дывізіі, потым заняла рубеж абароны 118-га гвардзейскага стралковага палка. На працягу 16 дзён яна сумесна з часцямі 37-й гвардзейскай стралковай дывізіі вяла цяжкія баі ў раёне Парычаў. 15.12.1943 г. выведзена ў тыл і расфарміравана. Камандзіру брыгады В.І.Лівенцаву прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.


БАЯВЫ ШЛЯХ 1-й БАБРУЙСКАЙ ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ
Лістапад 1941– студзень 1944гг.
Шлях брыгады
Шлях 751-га партызанскага атрада Коміна
Месцы стаянак брыгады і атрада
Шлях і месцы стаянак узвода Дудаля і групы Ануліча
Дыверсіі:
пушчаны пад адхон ці знішчаны эшалон праціўніка
узарваны ці спалены мост
узарвана і спалена аўтамашына праціўніка
узрывы асобных аб'ектаў
Бялавічы
Краснае 1–5.7.42
Бялынічы
Магілёў
Пчэлінск 27.6.42 6.7.42
Беразіно
Чэрвень
Дуброва 11.4–25.6.42 7–31.7.42
Міраслаўка 14.1.43
Месціна 9.1.43
12.1.43 Стар.Максімавічы
Усакіна 6–10.4.42
Суша 2–5.4.42
Халадок 29.3–1.4.42
Дуброва 18.1.43
Градзянка
Асавок 20.12.42–6.1.43
20.1–10.3.43
Лазовае 13–20.3.43
Пагарэлае
Мінск
Пухавічы
Мар'іна Горка
Клічаў 20.3.42
Смалярня 21–24.3.42
Перунава 3–8.8.42
Свіслач
Ліпень
Ялізава
Ігнатоўка 12–15.8.42
Крыцалавічы 16.8.42
Вяз.Старына 18–20.3.42 25–28.3.42
Талька 17.9.43
Вярэйцы
Рэпішча 13.3.43
АСІПОВІЧЫ 27.10.42 7.11.42
Ігнацоўка 14–17.3.42
Кіраўск
Ясень 13.3.42
Вербкі 5.11.42 27.3.43
Татарка 4.6.42 22.6.42 24.6.42 18.10.42 4.7.42 31.12.42 28.3.43 11.9.42 5.11.42 6.12.42 26.11.42
Ясень 5.10.43
Пціч 15.3.43 20.3.43
Паўлаўка 16–21.3.42
Белая 15.4.43
Глуша 18.10.43 16.10.43 12.10.43
БАБРУЙСК 22–25.11.43 29.9.43
Рагачоў
Слуцк
СТАРЫЯ ДАРОГІ 17.10.43
Макараўка 16–19.4.43 29.8–4.10.43 27.9.43
25.12.43–23.1.44
Каралеўская Слабада
Казловічы 12.3.42
Глуск
Пціч
Завічча 1–15.12.43
Парычы
Пякалічы
Шчадрын 8–25.7.43
Замосце 28.8–20.9.43
Трайчаны
Бабровічы 1.7.44
Вяцер 24–26.1.44 4.7.43
Булкаў 15.1–3.3.42
Чэрнін 15–25.12.43
Верачагошч
Харомцы 4–10.3.42
Карпілаўка 13–15.1.42
хут. Цяцерын 30.12.41–12.1.42
Шацілкі
Аўтар С.Э.Крамнёў

В.І.Лівенцаў

Дз.А.Ляпёшкін.

С.З.Крамнёў.

ЛІВЕНЦАЎ ВІКТАР ІЛЫЧ

Адзін з кіраўнікоў партызанскага руху на тэрыторыі Магілёўскай вобл., партыйны і дзяржаўны дзеяч Беларусі. Герой Савецага Саюза (1944). Заслужаны дзеяч фізічнай культуры Беларусі (1971). Нарадзіўся 21.4.1918 г. ў г.п. Давыдаўка Ліскінскага раёна Варонежскай вобл. Скончыў Гродзенскае ваенна-паліт. вучылішча (1941), Рэспубліканскую партшколу пры ЦК КПБ (1952), Мінскі педінстытут (1955). Удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі ў 1939 г.; савецка-фінляндскай вайны 1939—1940 гг. У жніўні—лістападзе 1941 г. адзін з арганізатараў і кіраўнікоў Бабруйскага партыйна-камсамольскага падполля, з лістапада 1941 г. камандзір 752-га партызанскага атрада, з лютага 1943 г. — 1-й Бабруйскай партызанскай брыгады. У 1944—1950 гг. загадчык аддзела, сакратар, 2-і сакратар ЦК ЛКСМБ. З 1958 старшыня Камітэта па фізічнай культуры і спорце пры Савеце Міністраў БССР. У 1978—1986 гг. кіраўнік спраў ЦК КПБ. Быў членам ЦК КПБ і дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. Аўтар кнігі «Партызанскі край» (4 выд., 1983).

ЛЯПЁШКІН ДЗМІТРЫЙ АЛЯКСАНДРАВІЧ

Адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў Магілёўскай і Палескай абл. Нарадзіўся 22.10.1906 г. ў в. Навабеліца Светлагорскага раёна. З 1930 г. старшыня калгаса. З 1932 г. ў Чырвонай Арміі. Удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі ў 1939 г., савецка-фінляндскай вайны 1939—1940 гг. З чэрвеня 1941 г. на фронце. З жніўня 1941 г. ў Бабруйскім падполлі. У партызанах з снежня 1941 г.: камандзір узвода, з студзеня 1942 г. камісар атрада, у лютым—снежні 1943 г. камісар 1-й Бабруйскай партызанскай брыгады, адначасова член Бабруйскага падпольнага РК КПБ. З 1944 г. старшыня Бабруйскага гарвыканкома, намеснік старшыні Бабруйскага аблвыканкома, у 1948—1967 гг. у спажыўсаюзе. Памёр 4.3.1979 г.

КРАМНЁЎ СЯРГЕЙ ЗІНОЎЕВІЧ

Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыйнага падполля і партызанскага руху на тэрыторыі Магілёўскай вобл. Нарадзіўся 18.10.1907 г. ў в. Рэчань Любанскага раёна. У 1925 г. паступіў у Віцебскі кааператыўны тэхнікум, пасля заканчэння якога з 1928 г. працаваў інструктарам гандлёвага аддзела Белкаапсаюза. У сакавіку 1923 г. па спецнаборы прызваны ў Чырвоную Армію. Удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі. Вялікую Айчынную вайну сустрэў каля граніцы начальнікам штаба батальёна сувязі. Разам з байцамі адбіваў першы ўдар фашыстаў. Выйшаўшы з акружэння, уключыўся ў падпольную барацьбу супраць акупантаў у Бабруйску. З канца 1941 г. ў партызанах. Быў начальнікам штаба партызанскага атрада, затым 1-й Бабруйскай партызанскай брыгады і рэдактарам газеты «Бобруйский партизан». Пад яго кіраўніцтвам праведзена нямала баявых аперацый. Пасля вайны працаваў інструктарам ЦК КП(б)Б, загадчыкам аддзела Бабруйскага абкома КПБ, сакратаром Грэскага райкома партыі, старшынёй Чырвонаслабодскага райвыканкома, дырэктарам школы, у сістэме Белкаапсаюза. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I і II ступені, медалямі. Памёр у студзені 1988 г. Гл. таксама артыкул «Песня клікала ў бой».

ПАРТЫЗАНСКАЯ БРЫГАДА 37-я імя А.Я.ПАРХОМЕНКІ

Напачатку мела назву 2-я Бабруйская. Дзейнічала на акупіраванай тэрыторыі Бабруйскага, Старобінскага, Любанскага, Акцябрскага, Глускага раёнаў.

Створана ў студзені 1943 г. на базе атрадаў М.Б.Храпко (пазней імя Кірава, арганізаваны ў студзені 1942, У.М.Шваякова (пазней імя Шчорса, арганізаваны ў студзені 1942), П.Я.Ігуменава (пазней «За Савецкую Радзіму»), У.К.Якавенкі (пазней імя Варашылава), М.П.Сезіка (пазней імя Чапаева). Камандзіры П.М.Канавалаў, А.В.Львоў; камісары С.К.Ляшчэня, М.Б.Храпко; начальнік штаба Я.М.Качаноў, С.В.Сыракваш ын, Я.С.Раманаў.

Баявыя аперацыі партызан найчасцей праводзілі на камунікацыях ворага: 3.8.1943 г. падарвалі больш за 600 рэек, 23.9.1943 г. — больш за 900 рэек, 20.6.1944 г. — каля 940 рэек. Разграмілі варожыя гарнізоны ў в. Усцярхі Глускага, Брожа, Гарбацэвічы, Орсічы Бабруйскага раёнаў, удзельнічалі ў разгроме гарнізона ў в. Пратасы Акцябрскага раёна. На аэрадроме ў Бабруйску з дапамогай падпольшчыкаў знішчылі 15 самалётаў. 1—20.12.1943 г. брыгада дзейнічала разам з 37-й гвардзейскай стралковай дывізіяй.

30.6.1944 г. брыгада злучылася з Чырвонай Арміяй. На той час у яе склад уваходзілі атрады імя Шчорса, імя Чапаева, імя Кірава, імя Фурманава, імя Арджанікідзе; усяго налічвалася 1195 партызан.

Партызаны атрада імя С.М.Кірава 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі на захопленай у ворага танкетцы.

А.В.Львоў.

М.Б.Храпко.

ЛЬВОЎ АЛЯКСЕЙ ВАСІЛЕВІЧ

Адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў Мінскай і Палескай абл. Нарадзіўся 17.3.1918 г. ў в. Цімошына Верхнятоемскага раёна Архангельскай вобл. Скончыў ВПШ пры ЦК КПСС (1959). Удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі ў 1939 г., савецка-фінляндскай вайны 1939—1940 гг. З чэрвеня 1941 г. на фронце. У партызанах з жніўня 1941 г., з верасня 1941 г. камісар атрада, у студзені—чэрвені 1943 г. камісар 64-й партызанскай брыгады імя Чкалава, у чэрвені 1943 г.—чэрвені 1944 г. камандзір 37-й партызанскай брыгады імя А.Я. Пархоменкі, адначасова член Слуцкага падпольнага РК КП(б)Б. З 1944 г. на партыйнай, у 1960—1979 гг. на педагагічнай і гаспадарчай рабоце.

ХРАПКО МІКАЛАЙ БАРЫСАВІЧ

Адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў Мінскай і Палескай абл. Нарадзіўся 23.2.1909 г. ў в. Бярозаўка Глускага раёна. З 1930 г. на гаспадарчай рабоце ў Глускім раёне. З 1940 г. начальнік планава-фінансавага аддзела Палескага аблземаддзела. У партызанах з ліпеня 1941 г.: камандзір групы, атрада, у жніўні 1943 г. — чэрвені 1944 г. камісар 37-й партызанскай брыгады імя А.Я. Пархоменкі, адначасова член Бабруйскага падпольнага РК КП(б)Б. У 1944—1978 гг. на партыйнай, савецкай і гаспадарчай рабоце.

Герой-партызан і заслужаны педагог

ПАРАХНЕВІЧ Уладзімір Аляксеевіч, нарадзіўся 18.1.1918 г. ў в. Аўсімавічы, Герой Савецкага Саюза (15.8.1944). Скончыў БДУ (1941). З жніўня 1941 г. ў падпольнай групе Варатынскага сельсавета, з ліпеня 1942 г. партызан 537-га атрада, камандзір дыверсійнай групы атрада, якая дзейнічала на чыгунцы Жлобін—Бабруйск і пусціла пад адхон 21 варожы эшалон. З лістапада 1943 г. палітрук роты 539-га партызанскага атрада, з чэрвеня 1944 г. камандзір 102-га атрада 9-й партызанскай брыгады імя С.М.Кірава. Пасля вайны на камсамольскай і педагагічнай рабоце ў Мінску. Заслужаны настаўнік БССР (1969). Аўтар падручнікаў для школы, кнігі «Вогненныя віхуры» (1969). Памёр 28.7.1980 г.

У.А.Парахневіч.

...Калі Уладзімір Парахневіч прыйшоў у партызанскі атрад, яго адразу ж прызначылі камандзірам дыверсійнай групы: ведалі яшчэ па падпольнай рабоце. Адчайны быў хлопец! Як ні ахоўвалі немцы чыгунку, а ён пад носам у патруля пралезе да рэек і ўчыніць феерверк фрыцам. У яго быў закон: пайшоў на «жалезку» — без падарванага эшалона не вяртайся! І тол для фугасаў сам здабываў. Аднойчы седзячы верхам на авіябомбе, зубілам і малатком адкручваў з яе боегалоўку. Такім вось спосабам дастаў тол аж з трох авіябомбаў. Казаў, што ніколі з яго столькі халоднага поту не выйшла, як у той дзень.

А яшчэ быў у яго вялікі талент педагога. Вядзе, бывала, палітычную гутарку. Гаворыць пра байца, якога ўсе добра ведаюць. Аднак Парахневіч так пра яго раскажа, такія знойдзе словы, прыклады, што нават сам партызан здзіўляецца, як многа ў яго характары дабраты. Усё гэта ўзнімала аўтарытэт Парахневіча, згуртоўвала, узвышала людзей. Яны станавіліся больш смелымі, мужнымі.

Нават калі стаў палітработнікам, Уладзімір працягваў хадзіць на чыгунку: узрываў масты, эшалоны з жывой сілай і тэхнікай ворага. Лічыў, што яго абавязак — быць прыкладам пры выкананні адказных заданняў. За два гады ён пусціў пад адхон 21 варожы эшалон. Аб усім гэтым Уладзімір Аляксеевіч гаварыць не любіў. Але, здаецца, у 1966 г. (тады ён працаваў над кнігай «Вогненныя віхуры») сказаў мне, што самым памятным быў у яго пушчаны пад адхон дзесяты варожы эшалон. Чаму? Ды таму, што ўдалася Парахневічу дыверсія пасля шматлікіх няўдач, а галоўнае, непадалёку ад тых месцаў, дзе нарадзіўся.

Калі едзеш цягніком з Асіповічаў на Жлобін, то непадалёку ад 21-га раз'езда бачны тры вялікія вёскі: Варатынь, Аўсімавічы і Коўрын. Паміж імі цячэ рачулка Ала. Навакол шчодрыя землі, прыгожыя краявіды. У час акупацыі тут размяшчаліся фашысцкія і паліцэйскія гарнізоны. Павышаную ўвагу гітлераўцы ўдзялялі чыгунцы.

... Уладзімір Аляксеевіч разам з Васілём Бяляцкім, Фёдарам Архіпенкам і Дзмітрыем Зяткевічам да Аўсімавічаў дабраліся на досвітку. Калі стала святлець, вырашылі перачакаць у знаёмага — Івана Кірылавіча Талкачова, які сабраў у сваім доме блізкіх і родных Парахневічу людзей. Усе з радасцю сустрэлі паведамленне Савецкага інфармбюро аб акружэнні буйной групоўкі нямецка-фашысцкіх войскаў пад Сталінградам. Яны прасіліся ўзяць і іх з сабой у партызаны. Аднак заданне камандавання ёсць заданне.

У белых маскіровачных халатах У. Парахневіч і В. Бяліцкі асцярожна падышлі да чыгуначнага палатна, заляглі ў хмызняку. Раптам паказаўся варожы патруль — чацвёра немцаў. Нервы напятыя, як струны. Але на гэты раз іх не заўважылі, пайшлі далей. І тут, у марознай цішыні, прагучаў гудок цягніка. «Наперад!» Парахневіч хутка ўкладвае пад рэйкі тол, ставіць міну. З-за павароту паказваецца паравоз. Усё гатова. Партызаны хутка адбеглі ад чыгункі. І ў гэты момант раздаўся аглушальны выбух. У паветра паляцелі абломкі вагонаў, рэйкі, пачуліся крыкі гітлераўцаў.

У неба ўзлятаюць ракеты. Загаварыў кулямёт, трашчаць аўтаматы, бухаюць вінтоўкі, але партызаны на чале з Парахневічам ужо далёка. Наперадзе ў іх яшчэ адзінаццаць не менш складаных і рызыкоўных аперацый на чыгунцы.

Ведалі Уладзіміра і як вернага, надзейнага сябра і таварыша, які ніколі не падвядзе, не пакіне ў цяжкі час. Гэта ён даказаў справай. Аднойчы яго баявая група, каб адарвацца ад карнікаў, вымушана была ў крыгаход пераправіцца цераз р. Ала. Ад гітлераўцаў уратаваліся, а ад сцюдзёнай вады захварэў на запаленне лёгкіх Жэня Зуеў, занядужаў Вася Розум, які ў дадатак выпадкова прастрэліў сабе нагу, разбіраючы маўзер. Іх трэба хутчэй у лагер! А да яго — 80 кіламетраў. Распуціца. Варожыя патрулі. Засады. І ўсё гэта адолеў адважны і кемлівы камісар-падрыўнік.

У мірны час Уладзімір Аляксеевіч Парахневіч стаў заслужаным педагогам-выхавальнікам. У кнізе ўспамінаў ён з цеплынёй і сардэчнасцю расказаў пра сваіх баявых таварышаў — падпольшчыкаў і партызан, пра іх мужнасць у барацьбе з ворагам. *Б. Гардзееў.*

Выбух каля станцыі Татарка

... 30 снежня на вуліцы калгаса «Трактар», дзе ў гэты час размяшчаўся атрад, увесь дзень панавала ажыўленне. У калгаснай кузні на санкі і лыжы прыладжвалі станковыя кулямёты. У хатах байцы чысцілі зброю, напаўнялі патранташы, рыхтавалі бутэлькі з гаручай сумессю, падганялі адзенне і абутак.

У штабе, схіліўшыся над картай, камандзіры атрымлівалі апошнія ўказанні. Павел Кажушка ў папасе, заламанай па-чапаеўску, быў зноў у цэнтры ўвагі. Перад яго групай ставілася самая адказная задача. Шмат правёў Кажушка складаных аперацый. Але гэта была асаблівай. Складанасць яе заключалася ва ўмовах незвычайна моцнай аховы чыгункі.

— Выканаем! Не падвядзём! — запэўніваў ён.

Сумнявацца ў яго словах не было ніякіх падстаў — колькасць пушчаных ім пад адхон эшалонаў пераваліла ўжо за дваццаць.

Анатоль Варапаеў, бадай, дзесяты раз углядаўся ў сваю карту. Яго першы ўзвод павінны блакіраваць гарнізон станцыі Татарка. Здавалася, ён хацеў адшукаць на карце кожны кусцік, кожную купіну і канаўку, прыкідваў, як размясціць свае сілы. Месца для разгрому выбралі каля самай станцыі, побач з уваходным семафорам, — там, дзе нас менш за ўсё чакалі.

Рыхтуючыся да аперацыі, мы ўвесь час думалі пра трафеі. Хацелася захапіць такі састаў, які б хоць на нейкі час забяспечыў нас зброяй і боепрыпасамі. У сувязі з масавым прытокам людзей у атрадзе ўжо быў не адзін дзесятак байцоў без зброі. Таму іх прымацоўвалі да кулямётчыкаў для запраўкі і падносцы дыскаў і стужак, прызначалі сувязнымі ці ездавымі. Людзі прыйшлі ваяваць, а іх даводзілася выкарыстоўваць не па прызначэнні. Амаль пасля кожнага бою за новую вінтоўку ці пісталет ішла сапраўдная барацьба...

Ездавыя падрыхтавалі паўсотні падводаў, якія нам патрэбны былі не толькі для перавозкі трафеяў, а і для хуткасці руху, таму што атрад у гэты час знаходзіўся далёка ад чыгункі. Зімовы лагер мы вымушаны былі пакінуць, таму што на яго натрапілі гітлераўцы і нават зрабілі напад. Хоць мы і выйгралі бой, але заставацца ў такім лагеры было немагчыма.

Познім вечарам мы былі ўжо каля чыгункі. Атрад выстройваецца ланцугом і залягае на ўскраіне невялікага сасновага бору. Перад намі чыстая паляна. Злева скрозь непагадзь прасвечваецца чырвоны агеньчык семафора, а крыху далей мільгаюць агеньчыкі стрэлак, бачны сілуэты будынкаў станцыі Татарка. Падрыўнікі ў белых халатах ідуць на свае месцы. Настае мёртвая цішыня. На палатне маячаць фігуркі патрулёў. У гэтай нуднай цішыні, здаецца, чуеш, як падаюць вакол снежынкі.

Праходзіць шмат часу. Перад намі прапаўзло ўжо некалькі эшалонаў, але падрыўнікі маўчаць.

Гарнізон станцыі, не дачакаўшыся поўначы, наладзіў сустрэчу Новага года. Пачуліся п'яныя крыкі, смех, абрыўкі незнаёмых песень...

Раптоўны шум выводзіць з задумення. Непадалёку скрыпнуў семафор, успыхнуў зялёны агеньчык. Пачуўся кароткі, прыглушаны свісток, і павольна, з запаленымі агнямі, папоўз эшалон. Замільгалі платформы, цяплушкі з прыадчыненымі дзвярамі. У напаўасветленых вагонах весела спявалі гітлераўцы.

Мы насцярожыліся, чакаючы выбуху. Але яго не было. Эшалон павольна аддаляецца ў

цемру ночы. «У чым справа?» — спытаў я ў Кажушкі. Прыйшоў адказ: «Не змаглі зняць ахову. Чакаем наступнага».

— Разява! — не вытрымаў камісар. — Такі састаў упусцілі.

Хваляваўся і Кажушка. Адхон, да якога ён вывеў сваю групу, у адлігу пакрыўся лёдам і цяпер стаў непрыступным. У самы апошні момант перад падыходам паравоза Ганна Смольнікава з заведзенай мінай ускараскалася на насып, але паслізнулася і паляцела ўніз. Мінёр, як сцвярджае мудрая салдацкая прыказка, памыляецца толькі раз у жыцці. Але на гэты раз усё абышлося. Абдзіраючы рукі да крыві, падрыўнікі пачалі прабіваць прыступку ў лёдзе.

Праскочыў яшчэ адзін эшалон. Пайшла дванаццатая гадзіна. Людзі замерзлі. А справа не клеілася. Здавалася, так можна праляжаць усю ноч і вярнуцца ні з чым.

Паказаўся трэці эшалон. Ён поўз на малой хуткасці і без агнёў. Да гэтага часу падрыўнікі ўзабраліся на насып, знялі ахову і замініравалі палатно.

І раптам вялізнай сілы выбух скалануў паветра. Састаў цяжка заскрыгатаў і спыніўся. Адразу ж дзесяткі кулямётаў і каля сотні вінтовак вогненнымі кінжаламі ўрэзаліся ў састаў. Над палянай пранёсся дзікі крык гітлераўцаў. Мы бачылі, што амаль увесь цягнік — пасажырскі. Не спыняючы агню, партызаны дружна кінуліся на насып. Пад вагоны і ў вокны паляцелі гранаты, кулямёты білі ва ўпор, пранізваючы тонкія сцены вагонаў уздоўж і ўпоперак. Акупанты зусім не чакалі такога імклівага і сакрушальнага ўдару. Некаторыя з іх спалі і цяпер басанож выскоквалі на насып у доўгіх нацельных сарочках. Яны траплялі акурат да нас у рукі...

Група Паўла Кажушкі канчаткова знішчыла паравоз. Групы Сашы Суддзіна і Гараніна падарвалі хвост і сярэдзіну эшалона.

Частка вагонаў загарэлася.

Праз некалькі мінут загаварыў гарнізон станцыі. Усёй сваёй сілай ён наваліўся на ўзвод Варапаева і змяў яго. Амаль адначасова падышло падмацаванне і са станцыі Ясень. На паляне пачалі рвацца міны. Да ворага падаспела падмацаванне і пачало сціскаць у клешчы месца бою. З'явіліся раненыя. Пасля смерці кулямётчыка Максімава загінуў партызан Лапінскі. Мы страцілі пяць чалавек забітымі, пяцёра былі паранены...

Але за гэтыя ахвяры вораг заплаціў спаўна. Паводле звестак, што паступілі з Асіповічаў, у выніку паўтарагадзіннага бою атрад знішчыў 345 гітлераўскіх афіцэраў, якія нядаўна скончылі афіцэрскую школу ў Германіі і ехалі на фронт для расфарміравання па часцях. Былі таксама прыведзены ў нягодны стан усе вагоны і паравоз.

Друкуецца са скарачэннямі і ў перакладзе на беларускую мову па кн.: Ливенцев В.И. Партизанский край. Мн., 1969. С. 309—314.

«Радасці нашай не было канца»

З успамінаў Л.П.Станішэўскай

Лізавета Пракопаўна Станішэўская з вёскі Гарбацэвічы — былая сувязная Бабруйскага падпольнага райкома партыі. Узнагароджана двума ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, ордэнам Чырвонай Зоркі і медалямі.

...Да нас у хату першыя партызаны прыйшлі ў кастрычніку 1942 г. Гэта была дыверсійная група 1-й Бабруйскай брыгады пад кіраўніцтвам П. Кажушкі. Уся наша сям'я з радасцю згадзілася дапамагаць ім. З гэтага моманту жыццё набыло новы сэнс — пачалася трывожная і напружаная праца. Я стала працаваць сувязной Бабруйскага падпольнага райкома, муж мой, Канстанцін Антонавіч Станішэўскі, — правадніком дыверсійнай групы.

Праз некалькі дзён да нас зноў прыйшлі партызаны, і мой муж павёў іх на чыгунку. З трывогай і нецярпеннем мы чакалі, што будзе. Раптам прагучаў страшны выбух, пачулася кулямётная страляніна. Мы без слоў зразумелі ўсё і на ўсякі выпадак падрыхтаваліся сям'ёй ісці ў лес. Але трывога была дарэмнай: усе вярнуліся жывыя і здаровыя, а варожы эшалон з жывой сілай і забеспячэннем паляцеў пад адхон. Усе радаваліся, хацелася рабіць болей і лепей, пра небяспеку не думалі.

Затым партызаны прыходзілі да нас амаль кожную ноч. Аказваць ім дапамогу сталі і іншыя нашы калгаснікі... У студзені 1943 г. да нас прыехалі сакратар Бабруйскага падпольнага райкома партыі Д.М. Лемяшонак і член райкома М.І. Семісалаў, каб абмеркаваць план маёй далейшай работы. Акрамя распаўсюджвання лістовак і адозваў, збору звестак, падбору сувязных мне было даручана звязац-

Л.П.Станішэўская.

ца з Бабруйскам і арганізаваць там явачныя кватэры.

З гэтай мэтай мы з Семісалавым некалькі разоў ездзілі ў горад. Ездзілі пад выглядам сялян на рынак. На людным месцы клалі ўсякую ўсячыну для продажу, а пад прадуктамі правозілі лістоўкі і адозвы; з горада вывозілі медыкаменты, карты, паперу, адзенне, нярэдка і зброю. Явачныя кватэры ў Бабруйску былі арганізаваны ў доме М.І.Левановіч па Кастрычніцкім завулку, 22а і ў доме Маліноўскай на вул. Жукоўскага, 6.

У чэрвені 1943 г. мяне выклікаў для перагавораў камандзір спецгрупы М.П.Самсонік, былы наш старшыня калгаса, якога прыслалі з-за лініі фронту для арганізацыі разведкі ў тыле ворага. Таварыша Самсоніка я ведала як выдатнага арганізатара, сумленнага і адданага Радзіме патрыёта-камуніста і з радасцю згадзілася стаць разведчыцай спецгрупы. Ён даручыў мне арганізаваць назіранне за перамяшчэннем па чыгунцы жывой сілы і тэхнікі ворага і падрыхтаваць месца і людзей для работы рацыі ў Бабруйску. Пачалася новая, захапляючая работа. Я часта бывала ў горадзе. Аб ходзе справы дакладвала Самсоніку асабіста, часам праз сувязных І.А.Кавецкага або Курыльчыка. Месцам сустрэчы быў лес, непадалёку ад вёскі Ясень.

Да жніўня ўсё было падрыхтавана для ўстаноўкі рацыі ў Бабруйску. Вырашылі ўстанавіць яе ў доме М.І.Левановіч.

Для абслугоўвання рацыі падабралі адданых людзей, якія павінны былі сачыць за чыгуначнымі станцыямі, перамяшчэннем воінскіх часцей, за новымі ўмацаваннямі горада, размяшчэннем складаў і г.д.

У сярэдзіне жніўня Самсонік назначыў мне дзень і час, калі я павінна была забраць ад яго радыстку. Напярэдадні ноччу нашы сувязныя Кавецкі і Курыльчык перанеслі з лесу рацыю і сілкаванне для яе і схавалі ў мой хлеў, які выпадкова ўцалеў у час разгрому вёскі Ясень.

Цяпер трэба было рашаць галоўную задачу: радыстку і ўвесь груз перавезці ў Бабруйск. Выканаць гэта даручэнне меркавала я адна, каб не падвяргаць небяспецы іншых людзей.

У нядзелю раніцай, пагрузіўшы ўсё на падводу, мы адправіліся ў Бабруйск. Пропуск у мяне быў падрыхтаваны загадзя. Па дарозе сустракаліся сяляне, якія ехалі і ішлі ў горад на рынак. Уваход у горад на чыгуначным пераездзе аховаўся немцамі. Тут утварылася пробка з машын і падвод, што адцягвала ўвагу аховы. Я хутка ацаніла абстаноўку і паклала радыстку пад выглядам хворай, а сама злезла з воза, узяла каня за аброць, робячы выгляд, што надта спяшаюся. Адзін з гітлераўскіх салдат паглядзеў пад коўдру на «хворую» і махнуў рукой: маўляў, хутчэй праязджай. Толькі калі выехалі на Кастрычніцкую вуліцу, мы адчулі, што небяспека мінула.

Увесь груз схавалі ў М.І.Левановіч. Яна ж праз сваіх знаёмых аформіла і прапіску радыстцы, назваўшы мэтай яе прыезду паступленне на вучобу ў жаночую гімназію, якую акупанты беспаспяхова спрабавалі адкрыць у горадзе.

Надышоў самы адказны момант — трэба было ўстанавіць рацыю і пачаць работу. Да гэтага мы рыхтаваліся, як да вялікага свята. На другі дзень рацыя пачала працаваць; радасці нашай не было канца...

Як узарвалі параход

З успамінаў В.І.Сікорскага, былога камандзіра дыверсійнай групы 1-й Бабруйскай партызанскай брыгады. Узнагароджаны двума ордэнамі і медалямі.

...Летам 1943 г. асноўным шляхам для транспарціроўкі прадуктаў і ваенных грузаў з Парыцкага раёна ў Бабруйск стала для гітлераўцаў рака Бярэзіна, таму што грунтавая дарога, якая злучала Парычы з Бабруйскам, была пад кантролем партызан.

Самым вялікім з суднаў, што курсіравала на гэтым участку, быў параход «Бабруйск». Нашай групе даручылі ўзарваць яго.

Да аперацыі рыхтаваліся старанна. Найперш узяліся за выраб міны. На гэта спатрэбілася звыш тыдня; мы звязалі разам два сухія шасціметровыя бервяны, пасярод выдзеўблі паглыбленне, у якое змясцілі стокілаграмовую авіябомбу з самаробным узрывальнікам. З дапамогай жыхара вёскі Каралеўская Слабада Паўла Калпакова выбралі самае глыбокае месца ў рацэ паміж вёскамі Стасеўка і Паляны. На глыбіні пасадкі парахода ўстанавілі самаробную міну, каб яна была блізка каля яго днішча. Шнур ад капсуля ўзрывальніка выцягнулі на бераг, а потым пераставілі вехі-паказальнікі з такім разлікам, каб параход паплыў акурат над бомбай. Нам дапамагалі мясцовыя жыхары. Адзін з іх — Каваленка — паплыў на маленькай лодцы, каб дакладна вызначыць, у якім месцы плавае міна. Калі наблізіўся да яе, ударыў вяслом па вадзе. Мы «засеклі» гэта месца і пачалі назіраць.

Настала цёплая летняя раніца 18 жніўня 1943 г. Я і Грыша Паўловіч акапаліся на беразе ракі ў тым месцы, дзе быў выцягнуты провад ад узрывальніка міны. Час цягнуўся вельмі марудна. Здавалася, што стрэлкі гадзінніка замерлі на адным месцы. Ляжалі моўчкі, амаль не размаўлялі.

Нарэшце ў 11 гадзін 30 мінут з боку Парычаў паказаўся параход. Ён падыходзіў усё бліжэй, ужо можна было разгледзець гітлераўцаў на палубе. Адны загаралі, другія гулялі ў карты, трэція, збіўшыся гуртком на карме, гарлапанілі песні, заглушаючы ледзь чутнае папіскванне губнога гармоніка.

Секунда, яшчэ секунда — мы ўскочылі і з усяе сілы рванулі за провад. Пачуўся глухі выбух, стоўб вады ўзняўся на дзесяткі метраў, ва ўсе бакі паляцелі абломкі. Параход пачаў тануць.

Уцалелыя гітлераўцы кінуліся ўплаў да берага, але іх сустрэў агонь нашых аўтаматаў.

Каб заблытаць сляды, мы пабеглі ўніз па цячэнні ракі, знайшлі ў кустах загадзя схаваную лодку і пераправіліся на другі бераг.

Прыкладна праз гадзіну над месцам дыверсіі пачалі кружыць варожыя самалёты і абстрэльваць прылеглы лес.

Тры дні фашысты нікога не падпускалі да гэтага месца...

Варатынскія падпольшчыкі

З успамінаў Д.М.Лемяшонка, былога сакратара Бабруйскага падпольнага райкома партыі.

У верасні 1941 г. партыйнаму камітэту ўдалося наладзіць сувязі з камуністамі, якія ўзначальвалі падполле ў Варатынскім сельсавеце. Кіраўнік падпольнай групы сустрэўся з членам партыйнага камітэта Рыгорам Бекішам. Яны дамовіліся трымаць пастаянную сувязь праз Ісая Алімпавіча Калпакова з вёскі Казакова.

Вёскі Варатынскага сельсавета размешчаны на паўднёвы ўсход ад Бабруйска, на стыку трох раёнаў — Бабруйскага, Жлобінскага і Рагачоўскага, непадалёку ад чыгункі і шашы. У канцы лета 1941 г. сюды з заданнем працаваць у тыле ворага прыбыў Іван Кірылавіч Талкачоў, член партыі з 1927 г., мясцовы жыхар (з вёскі Аўсімавічы). Ён добра ведаў Бабруйск, быў знаёмы з многімі камуністамі і актывістамі горада і раёна...

У канцы жніўня Іван Кірылавіч прыйшоў у Аўсімавічы. У першыя ж дні звязаўся з надзейнымі людзьмі. Высветлілася, што камандзіры-пагранічнікі, камуніст В.Я.Нікіцін і яго сябры, аказаўшыся ў тыле ворага, у ліпені з дапамогай мясцовых камсамольцаў Уладзіміра Парахневіча, Івана Дашкоўскага і іншых наладзілі сувязь з камуністамі сельсавета і стварылі партыйна-камсамольскую групу. З прыходам Івана Талкачова яна пачала расці. Хутка з яе вычленілася камсамольска-маладзёжная група. Партыйнай групай, у якую ўваходзілі Аляксандр Парахневіч, Васіль Раманенка, Сцяпан Архіпенка, Павел Васільеў, Сямён Лук'янчанка, Дзмітрый Гаварушка, Якаў Шаленка, Павел Пракопчык, кіраваў Васіль Нікіцін. Важаком моладзі стаў Уладзімір Парахневіч, удастоены пазней звання Героя Савецкага Саюза. У групу спачатку ўваходзілі Фёдар Архіпенка, Рыгор Пракопчык, Іван Дашкоўскі. Праз іх у партызанскія атрады ішло шмат маладых патрыётаў. Агульнае кіраўніцтва партыйнай і камсамольска-маладзёжнай групамі ажыццяўляў Іван Кірылавіч Талкачоў...

У лістападзе 1941 г. Іван Талкачоў паведаміў Ісаю Калпакову, што Варатынская падпольная арганізацыя можа неадкладна накіраваць у партызанскія атрады да ста чалавек. Справа толькі за зброяй і боепрыпасамі. Праз два тыдні партыйны камітэт даручыў Калпакову перадаць з яго запасаў Талкачову дзесяць вінтовак, адзін ручны кулямёт, тысячу патронаў. Амаль столькі ж перадалі Васіль Калеснікаў і фарштадскія падпольшчыкі...

Камуністы Варатынскай падпольнай арганізацыі былі ініцыятарамі стварэння многіх падпольных груп. У партызанах яны паказалі сябе як мужныя байцы, вопытныя камандзіры і палітычна праверапыя выхавальнікі.

Дзейнічалі адважна

Шырыліся рады цялушскіх патрыётаў. Савелій Дудаль, Міхаіл Гацко, Фядос Сяліцкі і іншыя даставалі міны і авіябомбы на былым Цялушскім аэрадроме, забяспечвалі ўзрыўчаткай дыверсійную групу Віктара Сікорскага і іншых партызан. Міхаіл Ткач, Пятро Дудаль, Вера Вавула мініравалі чыгунку і дарогі, дзе рухаўся аўтатранспарт ворага.

Павел Аляксеевіч Дудаль даведаўся, што вораг мае апрача тэлефоннай, так званай паветранай сувязі, яшчэ і падземную. Слупы і правады на іх здымалі вельмі часта, але такая сувязь на лініі Бабруйск—Жлобін хутка аднаўлялася. Падпольшчыкі зацікавіліся падземнай. Аказалася, што ўздоўж чыгункі праклаўзены падземны кабель, што ўслед за фашысцкай арміяй спецыяльныя каманды праклаўвалі падземную і наземную праводку. Яна звязвала не толькі Бабруйск і Жлобін, як спачатку думалася падпольшчыкам, а і стаўку Гітлера з штабам групы армій «Цэнтр». І цялушскія падпольшчыкі, як яны гаварылі, рашылі перарэзаць «горла Гітлеру».

Міхаіл Рыгоравіч Ткач і Пятро Якаўлевіч Дудаль працавалі на чыгунцы. Перад імі і паставілі задачу: адшукаць месца, дзе праляг кабель, і паспрабаваць перарэзаць яго. Тыя з дапамогай надзейных людзей дакладна высветлілі, дзе праклаўзены падземны кабель, а потым і перарэзалі яго, старанна замаскіраваўшы тую мясціну. Не так проста было знайсці яе, спатрэбілася выклікаць спецыялістаў. Адначасова была пашкоджана на значнай адлегласці і тэлефонная сувязь.

А тым часам дыверсанты пускалі пад адхон варожыя эшалоны, узрывалі масты, чыгуначнае палатно. Найбольш прадукцыйна ў тыя дні дзейнічалі дыверсанты Уладзіміра Аляксеевіча Парахневіча, якія таксама карысталіся ўзрыўчаткай з авіябомбаў Цялушскага аэрадрома. Група Парахневіча дзейнічала побач, а часам і сумесна.

Кабель перараэаўся неаднаразова, прычым цэлымі кавалкамі. Аперацыі «сувязь» былі вельмі эфектыўнымі.

Шмат вялікіх і малых, але заўсёды адчувальных для чужынцаў спраў рабілі падпольшчыкі. П.А.Дудаль аднойчы з невялікай групай абяззброіў варожы гарнізон у Мальеве. 18 чалавек, якія яго ахоўвалі, здалі зброю і самі пайшлі ў партызаны. Асабліва дзёрзкай і рызыковай была аперацыя па разлажэнні і ўводу ў партызанскае размяшчэнне добраахвотнага батальёна.

Батальён гэты размяшчаўся ў Ступянях. Падпольшчык Кузьма Лаўрыновіч з вёскі Маліннікі быў у Ступянях і даведаўся, што ў батальёне, які складваўся з людзей розных нацыянальнасцей, ёсць незадаволеныя фашысцкімі захопнікамі і яны мараць перайсці да партызан. Гэта пацвердзілі таксама камсамолкі Вольга Гацка і Марыя Дудаль. Яны і паведамілі пра гэта кіраўніку падпольнай групы Паўлу Аляксеевічу Дудалю.

— Сам камандзір батальёна, — гаварылі дзяўчаты, — хоча сустрэцца з аўтарытэтным чалавекам.

Такім чалавекам і быў П.А.Дудаль. Па дамоўленасці праз дзяўчат ён днём у вызнача-

Мемарыяльная дошка ў вёсцы Цялуша на ўшанаванне памяці патрыётаў-падпольшчыкаў.

ным месцы сустрэўся з камандзірам батальёна Гегенадзе.

— Значыць, завядзеш да партызан, — сказаў той пасля кароткай размовы.

Павел Аляксеевіч пайшоў на рызыку:

— Завяду!

— А дзе гарантыя, што не выдасі немцам?

— Я — камуніст! Да таго ж нас будзе невялічкая група, а вас... вунь колькі. Мы рызыкуем жыццём...

Назаўтра ў вызначаны час Гегенадзе прывёў для здачы і пераводу ў партызаны 96 узброеных салдат і малодшых афіцэраў, а таксама абоз з 24 конямі.

Але частка батальёна вагалася. Гегенадзе сказаў Дудалю, што можа падзейнічаць і на гэтых людзей, якія спыніліся ў Цялушы. Дудаль з невялікай групай, у якую быў уключаны і Гегенадзе, накіраваліся туды, каб забраць рэшткі батальёна. Каля вёскі Палянкі група трапіла ў паліцэйскую засаду. У няроўнай схватцы загінуў Гегенадзе. А тым часам нямецкае камандаванне раззброіла рэшткі батальёна і накіравала іх у Бабруйск.

У верасні 1943 г. П.А.Дудаль быў вымушаны пайсці да партызан. Яго прызначылі камандзірам групы далёкай разведкі 751-га атрада 1-й Бабруйскай партызанскай брыгады. У партызаны перабралася ўся яго сям'я і многія цялушскія падпольшчыкі. Па сутнасці ўвесь атрад Уладзіміра Коміна быў сфарміраваны з людзей гэтай падпольнай групы.

Але работа падполля не спынілася. Яго кіраўніком стаў А.В.Руднеў. Цялушская арганізацыя налічвала да 40 актыўных падпольшчыкаў. Сярод іх былі бацька і сын Юрганавы, Вольга і Вера Хурсан, Праскоўя, Кацярына, Фядос Сяліцкія, Аляксей Стэльмак, Паліна і Ганна Харанекі, Аляксей, Міхаіл, Кацярына, Піліп, Цярэнцій Гацко і многія іншыя. Праўда, не ўсе з іх дажылі да вялікай Перамогі. Памёр ужо ў сталым узросце і Павел Аляксеевіч Дудаль. Але памяць аб мужных і адважных народных мсціўцах жыве ў народзе.

А.Гарэлік.

Так сустракалі Першамай

Нас было сто дваццаць чалавек — касцяк будучай партызанскай брыгады праслаўленага камандзіра Лівенцава. Людзі розных узростаў і характараў, але аб'яднаныя любоўю да Радзімы і нянавісцю да фашысцкіх захопнікаў. Не кожны ўмеў па-салдацку валодаць баявой зброяй, але кожны марыў забіць фашыста, каб наблізіць час вызвалення роднай зямлі, якая стагнала пад абцасамі акупантаў.

У лістападзе 1941 г. мы выйшлі з бабруйскага падполля ў лясы, каб яшчэ больш актыўна змагацца з ворагам, дапамагаць франтавікам, якія абаранялі Маскву. Зразумела, наш невялікі атрад быў толькі пясчынкай у магутным патоку народнага гневу, аб'яднанага партыяй супраць фашызму, але і гэта пясчынка дапамагала сціраць шыпы гітлераўскай машыны, якая паўзла да сэрца нашай Радзімы. Трапныя партызанскія стрэлы зліваліся з залпамі бітвы за Маскву. Тысячы нямецкіх салдат і афіцэраў знайшлі сваю смерць ад партызанскіх куль і мін. Акрамя гэтага, акупантам даводзілася ўсё больш сіл адцягваць з фронту для аховы сваіх камунікацый. І калі радыё прынесла доўгачаканую вестку аб разгроме немцаў пад Масквой, мы святкавалі гэты дзень як і сваю перамогу.

У баявых партызанскіх буднях надышоў

П.І.Кажушка.

першы ваенны Першамай. Краіна сустрэла яго новымі баявымі і працоўнымі справамі.

І наш атрад рыхтаваў святочныя «падарункі» акупантам. У пярэдадзень Першамая выйшлі на заданне шэсць дыверсійных груп. Свята яны сустрэлі агнём па ворагу з усёй зброі. Дорага абышоўся гітлераўцам партызанскі салют. Палалі на шашэйных дарогах грузавікі і штабныя аўтамашыны. Дзесяткі нямецкіх салдат і афіцэраў засталіся ляжаць каля іх. Мы захапілі шмат важных дакументаў нямецкага камандавання.

Самы вялікі поспех спадарожнічаў групе падрыўнікоў, якую ўзначальваў Павел Іванавіч Кажушка. Праўда, у нашых падрыўнікоў у той час зусім не было ўзрыўчаткі. Яе паспяхова замяніла партызанская кемлівасць: зброяй падрыўнікоў сталі гаечныя ключы, і дзесяткі рэек былі адарваны ад шпал. Пад адхон паляцелі два паязды. Адзін вёз на фронт танкі, на другім спяшаліся ў тыл адпускнікі. Месцы для дыверсій выбіралі вельмі ўдала: па-першае, моцны ўхіл, па-другое, круты паварот.

Кажушка з укрыцця назіраў, як, напаўзаючы адзін на адзін, ляцелі пад адхон вагоны, душылі гітлераўцаў і калечылі тэхніку. А над гэтым месівам металу і дрэва шугалі вогненныя языкі. Чацвёра сутак расчышчалі фашысты велізарныя могілкі. Сотні гітлераўскіх галаварэзаў, якіх у Германіі чакалі жалезныя крыжы, супакоіліся пад драўлянымі...

Так пачалі свой гераічны шлях падрыўнікі групы Кажушкі. А ўсяго за партызанскія гады яны падарвалі 26 паяздоў з жывой сілай, тэхнікай і боепрыпасамі. Аднойчы яны пахавалі пад адхонам увесь выпуск нямецкага ваеннага вучылішча — каля 400 афіцэраў, якія накіроўваліся на фронт.

З 1 мая 1942 г. пачалася страшэнная для фашыстаў «рэйкавая вайна», якую мы не спынялі і ў наступныя гады. У першы выхад усе партызаны вярнуліся на базу. Трафеяў было вельмі многа. А Павел Іванавіч Кажушка быў задаволены трафейнай узрыўчаткай і адразу пачаў рыхтаваць новыя «падарункі» гітлераўцам.

Дз.Ляпёшкін, былы камісар 1-й Бабруйскай партызанскай брыгады.

Навекі ў сэрцы народным

З успамінаў В.Л.Нікіціна, былога камандзіра партызанскага атрада

У барацьбу з нямецкімі захопнікамі В.Л.Нікіцін уключыўся 22 чэрвеня 1941 г. пры ахове дзяржаўнай граніцы пад Беластокам. Затым быў арганізатарам падполля ў Варатынскім сельсавеце, а вясной 1942 г. з групай узброеных патрыётаў накіраваўся ў партызанскую зону Кіраўскага раёна. Там стаў камандзірам 539-га атрада Кіраўскай партызанскай брыгады, у якой было больш за дзесяць бортнікаўцаў.

За дваццаць тры кіламетры ад Бабруйска па Рагачоўскай шашы, на цэнтральнай сядзібе калгаса «Гігант» на высокім пастаменце ляжыць масіўны гранітны вянок, з цэнтра якога на вышыню трохпавярховага дома ўзнімаецца сімвалічны факел з Вечным агнём. Справа — гранітная сцяна ў выглядзе разгорнутай кнігі з імёнамі 352-х мясцовых жыхароў. Гэтым велічным мемарыяльным абеліскам бортнікаўцы ўвекавечылі памяць аб героях-земляках, якія аддалі жыццё ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Вядома, што бортнікаўцы ўдзельнічалі ў некалькіх атрадах розных партызанскіх злучэнняў. Напрыклад, на Гродзеншчыне ў партызанскім атрадзе «Балтыец» брыгады імя Кірава Лідскага злучэння быў С.Ф.Голуб, у час вайны яго ўзнагародзілі ордэнам Чырвонай Зоркі. Актыўны ўдзел у партызанскай барацьбе ў 540-м атрадзе нашай брыгады прымалі В.Гарэлік, А.І.Голуб, І.Т.Цікавы і В.Г.Шапялевіч. У састаў 539-га атрада ўвайшлі І.А.Хурсан, І.В.Старавойтаў, К.І.Голуб з сынамі Васілём і Іванам. Па маім даручэнні ўступілі ў бортнікаўскую паліцыю для выканання задання атрада Л.І.Хурсан, П.В.Мышкавец і В.М.Сарока.

Больш чым з кім іншым я быў знаёмы з Кірылам Іосіфавічам Голубам, які ўзначальваў у Бортніках патрыятычную групу. У Вялікія Бортнікі ён прыбыў вясной 1942 г. з Данбаса з жонкай і шасцю дзецьмі. У дваццатыя гады юнаком Кірыла па вярбоўцы паехаў туды на шахты. Закончыў горны тэхнікум, працаваў забойшчыкам і ў трыццатыя гады быў ужо стаханаўцам на шахце «Качагарка» ў горадзе Горлаўка. Шчасліва жыла яго сям'я ў добраўпарадкаваным доме шахцёрскага пасёлка Салідарнасць. Адміністрацыя шахты выдзеліла яму гэтую кватэру як перадавіку па здабычы вугалю, а таксама выдала бяс-

Помнік землякам у вёсцы Вялікія Бортнікі.

платна поўны камплект новай мэблі для ўсіх трох пакояў. У кватэры было шмат кветак, святла, дзіцячай весялосці, кніг і музыкі. Кірыла ў вольны час любіў іграць на гітары і спяваць украінскія песні разам з жонкай Насцяй.

У канцы снежня 1941 г. Данбас акупіравалі немцы. Фашысты пачалі прымушаць шахцёраў да работы. Не мог стаханавец Кірыла Голуб ісці да ворага на службу і, каб пазбегнуць пакарання, у навагоднюю ноч 1942 г. тайком пакінуў абжытае месца. Тры месяцы пешшу ішла вялікая сям'я шахцёра цераз усю Украіну ў родную вёску. У Бортніках Кірыла адрамантаваў сабе закінуты ў старым калгасным садзе дом.

Некаторыя аднавяскоўцы пацягнуліся да гэтай сям'і па даўняй юнацкай дружбе з Кірылам і Насцяй, завязваліся і новыя знаёмствы. Хутка ў іх з'явіліся аднадумцы, якія імкнуліся да агульнай справы — барацьбы з ворагам. У Магілёўскай вобласці тады ўжо дзейнічала больш як 60 партызанскіх атрадаў. Падпольныя групы пераходзілі да адкрытых выступленняў супраць ворага. У Кіраўскім раёне пачаў дзейнічаць 537-ы партызанскі атрад, арганізаваны з патрыятычных груп вёсак Гута, Падрэчча, Морхавічы, Столпішча, Уласавічы і Думаноўшчына. На базе першай роты гэтага атрада быў створаны і наш 539-ы партызанскі атрад.

Прыкладна ў той час да нас з Вялікіх Бортнікаў першым прыйшоў высокі хударлявы юнак Іван Хурсан. Неўзабаве прыбыў Кірыла Голуб. Назад у вёску ён вярнуўся з заданнем падрыхтаваць баявую падпольную групу, накіраваць сваіх людзей для работы ў паліцэйскі гарнізон, распаўсюджваць сярод насельніцтва зводкі Саўінфармбюро і лістоўкі. Ён некалькі разоў прыходзіў у атрад, дакладваў, як ідуць справы, атрымліваў новыя заданні.

У штабе атрада мы вырашылі раззброіць і ліквідаваць без бою нямецка-паліцэйскі гарнізон у Бортніках. Такія аперацыі нам ужо ўдалося правесці ў суседніх з Бортнікамі сельсаветах. У Варатыні, пасля адпаведнай работы падпольшчыкаў і партызан, большасць паліцэйскіх на чале са сваім камандзірам Валодзіным са зброяй у руках перайшлі ў наш атрад. У Турках група партызан і мясцовыя патрыёты разгромілі гарнізон, 17 паліцэйскіх з іх начальнікамі было ўзята ў палон.

Але ў Бортніках не ўдалося ажыццявіць задуманае. Адзін паліцай перадаў спіс патрыётаў акупантам. Тады былі арыштаваны 11 чалавек, у тым ліку Лаўрэн Іванавіч Хурсан, Павел Васілевіч Мышкавец і Васіль Маркавіч Сарока, якія пайшлі ў паліцаі па маім заданні. На допытах у засценках быў расстраляны Л.І.Хурсан. Перад вайной ён працаваў у органах міліцыі, у фінскую вайну быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. Разам з ім гестапаўцы расстралялі і бортнікаўскага начальніка паліцыі Быхава, які згадзіўся садзейнічаць патрыятычнай групе. Астатніх арыштаваных немцы адправілі ў Германію. Непадалёку ад Асіповічаў сямёра смельчакоў выскачылі на хаду поезда цераз пралом у вагоне і накіраваліся ў лес. Усе яны трапілі ў розныя партызанскія атрады.

Кірылу Голубу разам са старэйшымі сынамі Васілём і Іванам у дзень арышту ўдалося ўцячы ў партызаны. З імі тады прыйшоў і Васіль Шапялевіч з Малых Бортнікаў. Сям'ю шахцёра немцы ўзялі пад варту, збіраліся адправіць яе ў канцлагер. Але знаходлівыя і мужныя людзі дапамаглі жонцы Голуба Настассі Іванаўне з чатырма дзецьмі прыбыць у партызанскую зону. Наш атрад ля вёскі Пясцова, непадалёк ад Жылічаў, вёў у той дзень жорсткі бой. Пасля бою сям'я сустрэлася з бацькам і была вывезена ў партызанскі тыл.

Ля помніка ў Вялікіх Бортніках заўжды ляжаць кветкі. Помняць людзі пра сваіх абаронцаў і вызваліцеляў.

Засада на дарозе

У чэрвені 1943 г. дзве камсамольска-маладзёжныя дыверсійныя групы вярталіся да месца стаянкі атрада. Каля вёскі Обча іх дагнаў коннік, зусім яшчэ хлопчык, і, цяжка дыхаючы, паведаміў, што вёску рабуюць немцы. Дыверсійная група Пяткова і Караленкі мела трывалыя сувязі з вяскоўцамі. Пра яе дзёрзкія і смелыя дзеянні хадзілі легенды. І зараз не адпомсціць захопнікам за гвалтаванні дыверсанты не маглі. Параіўшыся, яны рашылі зрабіць засаду.

...На досвітку ўсё было гатова да бою. Невысокае жыта, рэдкія сосны ля дарогі і дробны хмызняк укрывалі камсамольцаў ад варожага вока. Прайшло звыш трох гадзін. Чаканне рабілася цяжкім, але рукі яшчэ мацней сціскалі зброю. Ужо даўно ўзышло сонца. І раптам назіральнік Іван Філатаў падаў умоўны сігнал. Усе насцярожыліся і хутка пачулі роўны гул матора. Чатыры афіцэры СС сядзелі ў легкавой машыне. Паблізу буйнога гарнізона і ўдалечыні ад лесу яны адчувалі сябе ўпэўнена і спакойна. Ад першага ж залпа, які раскалоў цішыню, машына ўспыхнула і, рэзка развярнуўшыся, паляцела ў кювет. Яшчэ некалькі стрэлаў — і ўсё змоўкла. Машына ярка палала, і пах бензіну разнёсся над дарогай.

Гэта быў толькі пачатак няроўнага бою 15 камсамольцаў з карным батальёнам СС. Затым пайшлі ўсюдыходы. Як толькі першы параўняўся з засадай, дружныя залпы запалілі і яго, ворагі не паспелі нават саскочыць на зямлю. Але рокат мататараў не сціхаў. Паказаліся яшчэ два, спыніліся і адкрылі хаатычны агонь па прыдарожных кустах. Але іх мінутнай разгубленасці аказалася дастаткова, каб закідаць гранатамі яшчэ адну машыну.

Паўтары гадзіны цягнуўся няроўны бой. Азвярэлыя фашысты бачылі, што партызан мала, кідаліся ў бяссільнай злосці на храбрацоў і кожны раз у адказ атрымлівалі дружны агонь, які назаўсёды прыкоўваў іх да зямлі. Прайшло ўсяго некалькі мінут з пачатку бою, а паўсотні трупаў ворагаў ляжала ля дарогі, гарэла машына.

Заняўшы кругавую абарону, партызаны амаль ва ўпор расстрэльвалі захопнікаў. Але тут паказалася бронемашына, перавалiла цераз кювет і адкрыла агонь з буйнакалібернага кулямёта, пад прыкрыццём якога немцы зноў пайшлі ў атаку. Усведамляючы небяспеку, Мікалай Коўпак, шчыльна прыціскаючыся да зямлі, папоўз ёй насустрач. Моцны ўдар па нагах толькі на імгненне прыпыніў яго. Смяльчак папоўз з пастрэленымі нагамі, а затым, прыўзняўшыся, кінуў гранату.

Бронемашына падарвалася, а немцы, рыхтуючыся да новай атакі, спынілі агонь. Скарыстаўшы перапынак, партызаны падзялілі патроны, якіх станавілася ўсё менш. Прыўзняўшыся на локцях і пераключаючы дыск кулямётчыку Курцэвічу, Пяткоў крыкнуў: «Стаяць насмерць!»

І зноў атака. Фашыстаў сустрэў кулямётчык Філатаў, які нават цяжка паранены працягваў страляць. Выключнай храбрасцю вызначыўся гэты 17-гадовы юнак. Змоўк аўтамат Каўпака. Яму на дапамогу кінуўся Бычанок, але быў адкінуты выбухам міны.

Агонь ворага ўзмацніўся, немцы адцяснілі партызан у поле, стваралася бязвыхаднае становішча. І раптам у спіну немцам ударыў кулямёт. Гэта адзін з партызан дапоўз да варожага кулямёта і ўдарам кінжала адкінуў ад яго фашыста. Азвярэлыя немцы пабеглі да яго. А ён, расстраляўшы патроны, узняўся, спрабуючы праскочыць да сваіх, але ўпаў, прашыты аўтаматнай чаргой.

Скарыстаўшы замяшанне ворага, партызаны змаглі адысці да вёскі, яшчэ не занятай карнікамі. Раз'юшаныя вялікімі стратамі, немцы кінуліся ўслед за імі. Заняўшы дом, камсамольцы адбіваліся з вокнаў з двух уцалелых кулямётаў. Немцам удалося падпаліць дом. Трэба было адыходзіць. Кулямётчыкі Філатаў і Баразна абліваліся крывёю. Сем партызан, з якіх двое былі смяротна параненыя, прыкрываючы адзін аднаго агнём сваіх аўтаматаў, адыходзілі ўздоўж вуліцы да лесу.

Вось, схапіўшыся за грудзі, упаў Варганістаў, але працягваў паўзці, пакуль другая кулямётная чарга не прайшла па нагах. Немцы з крыкамі кінуліся да яго. Ён павольна ўзняў руку, а калі ворагі былі побач, рэзкім рухам вырваў кольца гранаты. Група далёкай разведкі, якая рухалася непадалёк, адцягнула ўвагу ворага на сябе. Жывымі з 15 смельчакоў засталіся толькі Пяткоў, Караленка і Кунцэвіч.

...Праходзяць гады, але не забывае народ подзвіг 15 камсамольцаў 1-й Бабруйскай партызанскай брыгады, якія ператварылі звычайны кювет і некалькі прыдарожных соснаў у непрыступную крэпасць, аб якую разбіваліся атакі ворага.

І. Савацееў, былы партызан 1-й Бабруйскай партызанскай брыгады.

Такія маладыя мы былі...

У чэрвені 1943 г. я атрымліваю новае назначэнне — на пасаду камандзіра партызанскай брыгады № 37 імя А.Пархоменкі, у якой тады налічвалася каля дзвюх тысяч чалавек. А мне толькі што споўнілася 25 гадоў. Я разумеў, якая вялікая адказнасць ускладзена на мяне за дзеянні брыгады, за лёс людзей. Нам, маладым, давяралі, і мы імкнуліся апраўдаць гэты высокі давер.

У той час у нашай брыгадзе было шэсць атрадаў: імя Шчорса, якім камандаваў Усцін Шваякоў; імя Чапаева на чале з Мацвеем Сезікам; імя Варашылава, што узначальваў Уладзімір Якавенка; імя Фурманава пад камандаваннем Васіля Шчэрбіча; імя Арджанікідзе, якім кіраваў Нічыпар Капінскі. Самы буйны быў атрад імя Кірава, у якім ваявалі вопытныя партызаны, многія з якіх узялі зброю яшчэ на пачатку вайны. Гэты атрад быў ядром брыгады. Ім камандаваў Мікалай Барысавіч Храпко, які ў жніўні 1943 г. стаў камісарам брыгады. А начальнікам штаба быў Сяргей Васілевіч Сыраквашын.

Наша брыгада дзейнічала пераважна ў раёнах паміж Бярэзінай і Пціччу. Партызаны грамілі варожыя гарнізоны, праводзілі дыверсіі на чыгунках і аўтамабільных дарогах, вялі разведку ваенных аб'ектаў і камунікацый праціўніка. Летам 1943 г. мы разграмілі Брожскі і Балашэвіцкі варожыя гарнізоны. Каля вёскі Нязнанне напалі на эсэсаўскі атрад.

У сувязі з разгромам эсэсаўцаў узгадалася вось што. Начальнік штаба вярхоўнага камандавання вермахта Кейтэль гаварыў сваім падначаленым: пакончыць з паўстанцкім рухам на захопленай тэрыторыі можна толькі тады, калі мы створым такую атмасферу жаху і боязі, што людзі страцяць усякае жаданне супраціўляцца.

Фашысты так і рабілі. Зганялі людзей у школы, хлявы, аблівалі бензінам, палілі. Знішчалі цэлыя вёскі. Але захопнікі не ведалі савецкіх людзей. Іх нельга было запалохаць і зламаць ніякімі рэпрэсіўнымі мерамі. Больш за тое, народныя мсціўцы рашуча змагаліся з самымі адчайнымі гітлераўскімі галаварэзамі. Вось прыклад.

У жніўні 1943 г. ў Бабруйск на Бярэзіну прыбыў «папраўляць здароўе» буйны атрад эсэсаўцаў з Ленінградскага фронту. Беларусь гітлераўскія франтавікі лічылі глыбокім, ціхім і спакойным тылам, дзе можна добра адпачыць. І як жа яны былі здзіўлены, калі камендант горада паведаміў, што навакол дзейнічаюць партызаны, што «вылазіць на ўлонне прыроды» небяспечна, нават з узброенай аховай.

Тады гітлераўскія ваякі абвінавацілі мясцовыя акупацыйныя ўлады ў пасіўнасці і бяздзейнасці і вырашылі паказаць, як трэба «змагацца з бандытамі». Фашысты грунтоўна рыхтаваліся да карнай экспедыцыі, разведалі месцы размяшчэння брыгады. Але ж і мы, як кажуць, не спалі ў шапку.

Першымі прынялі ўдар карнікаў кіраўцы, да іх далучыліся атрады імя Шчорса і імя Варашылава. Не паспелі фашысты азірнуцца, як былі адрэзаны ад дарогі. Партызаны прыціснулі іх да лесу, дзе кожнае дрэва, кожны кусцік былі нашымі сябрамі. Там нам вельмі дапамагла танкетка. Было іх у нас дзве. Але на той час дзейнічала адна. Не думалі фашысты, што ў партызан ёсць такія тэхнічныя сродкі.

Напярэдадні Курскай бітвы, ажыццяўляючы задуму Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання, Цэнтральны штаб партызанскага руху спланаваў правядзенне моцных удараў па чыгуначных камунікацыях. Гэта аперацыя ў тыле ворага атрымала назву «рэйкавай вайны». Ставілася мэтай узняць у паветра тысячы рэек на чыгуначным палатне, паралізаваць рух цягнікоў, воінскіх эшалонаў і тым самым перашкодзіць дастаўцы ў дзеючую армію праціўніка жывой сілы, тэхнікі, боепрыпасаў, паліва, харчавання...

З Вялікай зямлі самалётамі нам даставілі ўзрыўчатку і ўсё іншае. Арганізавалі практычныя заняткі, бо не ўсе былі здольнымі падрыўнікамі. Правялі інструктаж з камандзірамі груп.

Стаялі мы тады пад Зубарэвічамі. У нашых руках быў участак чыгункі ад Бабруйска на Ратміравічы. Вось тут нашы падрыўнікі, а імі былі ўжо амаль усе партызаны, «трэніраваліся», адпрацоўвалі свае дзеянні. А саму аперацыю намячалася правесці на ўчастку чыгункі ад Мірадзіна да Ясеня. Участак узмоцнена ахоўваўся. Як сёння памятаю, надвор'е нам спрыяла: ліў дождж, навокал непраглядная цемра, густыя хмары навіслі над лесам. Да чыгункі падышлі ў ноч з 4 на 5 жніўня. І вось сігнал — узвіліся зялёныя ракеты. Падрыўнікі кінуліся да рэек, устанавілі зарады... Пачуліся выбухі... Застракаталі ку-

лямёты і аўтаматы. Гэта спецыяльныя групы байцоў падаўлялі агонь фашысцкіх дзотаў — ахову чыгуначнага палатна.

Некалькі разоў па камандзе партызаны кідаліся да чыгункі і працягвалі работу. У тую жнівеньскую ноч мы прывялі ў нягоднасць каля дзвюх тысяч рэек. Рух варожых саставаў на гэтай ажыўленай магістралі быў спынены на два тыдні. Заўважу, што тады ж у «рэйкавую вайну» ўключыліся і іншыя партызанскія брыгады, у тым ліку суседняя з намі, якой камандаваў Віктар Ільіч Лівенцаў. Невыпадкова потым яго брыгаду назвалі 1-й Бабруйскай, а нашу — 2-й Бабруйскай, паколькі дзейнічалі мы сумесна.

Такія рэйды на чыгунку паўтараліся не раз. Вельмі масавым і эфектыўным быў паход 2 кастрычніка 1943 г. Тады да палатна даводзілася прабівацца з боем. Мініраванне вялі пад шквальным агнём праціўніка. Але заданне было выканана. У паветра ўзляцела больш чым дзве тысячы рэек. Праз некалькі дзён у брыгаду перадалі радыёграму, у якой першы сакратар ЦК КП(б)Б П.К.Панамарэнка дзякаваў камандаванню і ўсім удзельнікам аперацыі за ўмелыя і эфектыўныя дзеянні.

У гэтым жа годзе ў нямецкага каменданта Бабруйска паявіўся амерыканскі «форд» — выдатная аўтамашына па тым часе. Яна так і зіхацела лакаванай фарбай. Але галоўнае было ў тым, што легкавушка была радыёфікавана. Гэта нас вельмі спакушала. І атрымалася так, што «форд» сапсаваўся. А ў рамонтнікі трапілі свае людзі. Корпаліся яны ў машыне да зручнага моманту, а затым арганізавалі яе абкатку: маўляў, трэба праверыць хадавыя якасці і, магчыма, тое-сёе падправіць, каб цалкам задаволіць пана каменданта. Дазвол на абкатку быў атрыманы. «Рамонтнікі» спакойна выехалі за горад, а потым у дамоўленым месцы звярнулі на лясную дарогу. І прыбылі ў размяшчэнне брыгады, дзе і засталіся. Гэта машына служыла партызанам своеасаблівым агітацыйным цэнтрам. Прыязджаем мы ў тую ці іншую вёску, адчыняем дзверы і на ўсю магутнасць уключаем радыё: «Слухайце Маскву!»

Некаторыя жыхары спачатку палохаліся, хаваліся, думалі, што гэта правакацыя. Але ж вестка аб партызанскім «лімузіне» хутка абляцела навакольныя вёскі.

Ваявалі ўсімі сіламі і сродкамі. Часта расклейвалі лістоўкі, рассылалі нумары газет, якія паступалі самалётамі з Вялікай зямлі.

Я часта ўспамінаю камсамольца Сашу Бяляева. Былі ў хлопца залатыя рукі, за што ні возьмецца — зробіць. Асабліва любіў маляваць. Адмысловыя карыкатуры ў яго атрымліваліся, розныя малюнкі для падпольнай газеты, рабіў ён накіды і з нашых баявых будняў. Мог бы Саша стаць добрым мастаком. Аднойчы, напярэдадні нейкага свята — здаецца, дня нараджэння Гітлера, — Саша намаляваў партрэт фюрэра і ноччу вывесіў яго на відным месцы ў Любані. Партрэт быў дакладны, толькі вось адна дэталь... Прырабіў наш мастак да партрэта рогі, якія начыніў узрыўчаткай. Раніцай некалькі гітлераўцаў угледзелі тыя рогі, кінуліся іх знімаць. І... падарваліся. Загінуў Саша ў час блакады ў 1944 г.

...Неяк я спыніўся ў Глушы каля помніка маці-партызанцы, маці-салдатцы. Усе тут гавораць, што правобразам яго служыць маці нашага вядомага пісьменніка і вучонага Алеся Адамовіча. Сапраўды, яго маці вельмі актыўна дапамагала партызанам як сувязная, а таксама па забеспячэнні медыкаментамі. Яна, а таксама іншыя падпольшчыкі садзейнічалі разгрому нямецка-паліцэйскага гарнізона ў Глушы, вываду са строю шклозавода.

Калі ў Мінску мы сустракаліся з Аляксандрам Міхайлавічам Адамовічам, успаміналі, якімі маладымі тады былі. Мне было 25, а яму, партызану атрада імя Кірава, — на дзесяць гадоў менш. Ну, піянер! А які быў выносліві і адважны. А як вырас! Сёння яго ведаюць у нашай краіне, ды і за мяжой, як аўтара буйных празаічных твораў «Вайна пад стрэхамі», «Сыны ідуць у бой», «Хатынская аповесць», «Карнікі». Кінафільм «Ідзі і глядзі» (паводле «Хатынскай аповесці») атрымаў галоўны прыз на XIV Міжнародным кінафестывалі ў Маскве. Крытык і літаратуразнаўца, доктар філалагічных навук, прафесар, член-карэспандэнт Акадэміі навук БССР — вось кім стаў наш былы партызан.

Успомніліся мне і многія іншыя лясныя салдаты. У прыгарадзе Бабруйска — у Дзеднаве жыла сям'я Баглаяў. У іх доме працавала радыстка, а потым, калі ворагі «засеклі» гэтую хату, Міхаіл Баглай з сынам Клімам і радысткай прыйшлі ў нашу брыгаду. Міхаіл Баглай дапамог адшукаць «майстроў», якія рамантавалі той «форд», што потым прыгналі да нас у лес. А піянер-разведчык Клім у свае 13 год (у лістападзе 1943 г.) у Крамлі з рук М.І.Калініна атрымаў медаль «За адвагу».

Прама з піянерскага лагера на самым пачатку вайны ўключыўся ў барацьбу з ворагам Вялянцін Філіпчык. Ён быў узнагароджаны

апрача партызанскага медаля медалём «За адвагу», а потым ордэнамі Чырвонай Зоркі і Айчыннай вайны I ступені. А за добрасумленную працу Валянцін Канстанцінавіч Філіпчык удастоіўся ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга. Доўгі час ён жыў і працаваў у Бабруйскім раёне.

Сустракаўся я таксама з нашымі былымі партызанамі — доктарам эканамічных навук Максімам Фёдаравічам Болбасам, доктарам тэхнічных навук, лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі УССР Генадзем Якаўлевічам Арджанікідзе, кандыдатам сельскагаспадарчых навук Уладзімірам Сямёнавічам Мірошнікавым, былым камандзірам атрада імя Варашылава, а затым брыгады № 99 імя Гуляева Уладзімірам Кірылавічам Якавенкам і многімі іншымі.

Так, на суровыя гады выпала наша маладосць. І памяць аб вайне патрэбна для таго, каб папярэдзіць новую, каб вырошчваць хлеб пад мірным блакітным небам.

А.Львоў, былы камандзір партызанскай брыгады № 37 імя Пархоменкі.

Песня клікала ў бой

У Сычкаўскім філіяле Бабруйскага краязнаўчага музея захоўваецца сшытак песень Сяргея Зіноўевіча Крамнёва. Ён — своеасаблівая ілюстрацыя баявых будняў бабруйскіх партызан. Ілюстрацыя яркая, якая па-свойму раскрывае гераічны час...

Партызанскі атрад № 752, а затым 1-ю Бабруйскую брыгаду ўзначальваў В.І.Лівенцаў, камісарам яе быў Дз.А.Ляпёшкін, начальнікам штаба С.З.Крамнёў. Партызаны Лівенцава ўдзельнічалі ў разгроме варожага гарнізона ў Клічаве, абароне Клічаўскай партызанскай зоны, у прарыве блакады падчас карнай аперацыі ў чэрвені—жніўні 1942 г...

А ў мінуты адпачынку, у перапынках паміж баямі, пераходамі змучаныя сэрцы людзей сагравалі песні. Гэта адразу ж улавіў Крамнёў, бо ведаў, што песня патрэбна людзям і як сродак адпачынку, разрадкі, і як арганізатар, выхавальнік.

У красавіку 1942 г. ён напісаў словы «Клічаўскай партызанскай»:

По лесам и по болотам,
Там, где стелется туман,
Собираются отряды
Белорусских партизан.

Заканчвалася яна, нягледзячы на цяжкі час, на высокай аптымістычнай ноце:

Мы в тылу, солдаты фронта,
Перемелем этот сброд,
И на Западе Европы
Мы закончим свой поход.

«Песня бабруйскіх партызан», якую ў атрадзе спявалі на матыў шырока вядомай у краіне «Па далінах і па ўзгор'ях», нарадзілася ў жніўні 1942 г. Гучала яна ўрачыста, натхняюча:

Закипела гневом, злобой
Белорусская земля.
Поднялась могучим шквалом
Партизанская война...

1-я Бабруйская партызанская брыгада рабіла гераічныя справы. Нельга было не расказаць пра іх, дзёрзкія, поўныя гераізму, самаадданасці. У чэрвені 1943 г. Сяргей Зіноўевіч прыняўся за чарговую песню — «Баявую атрадную»:

У Белавич в стычке жаркой
И в Усакинских лесах,
Под Ольховкой и Гродянкой
Нагоняли немцам страх...

У «прыпевачных» вершах, створаных у лістападзе 1943 г. і прысвечаных групе партызанскіх дыверсантаў, якімі кіраваў Павел Кажушка, ён пісаў:

Все дороги, тропы знаем
И везде всегда пройдем.
Всюду немцев мы встречаем
Сокрушительным огнем.

Вось так разам з народнымі мсціўцамі грамілі ворага і песні начальніка штаба Крамнёва, усяляючы веру ў перамогу. Дарэчы, С.З.Крамнёў быў рэдактарам газеты «Бобруйский партизан». *Э.Янін.*

Што пісала газета «Бобруйский партизан» 30 чэрвеня 1943 г.

Партизан уничтожить нельзя

Напрасно немцы и всякого рода предатели на всех перекрестках кричат, что «партизаны разбиты, лагеря их разгромлены, а многие партизаны перешли к немцам».

Все это вранье. Ни в Кличевском, ни в Осиповичском, ни в других районах, где немцы совместно с предателями хотели уничтожить партизан, бросая для этого целые немецкие дивизии с танками, самолетами, артиллерией, они своей цели не добились.

Боевой счет партизан Бобруйщины:

Действуя на территории Бобруйского и смежных с ним районов, партизаны уничтожили 5393 немецких солдат и офицеров, организовали крушение 51 эшелона с войсками и грузами, причем 7 эшелонов целиком уничтожили.

Полностью выведено из строя и уничтожено 38 паровозов, 523 вагона, 115 платформ, взорвано 17 километров железнодорожного полотна, разрушено 17 железнодорожных и 42 шоссейных моста. Разбито и сожжено 4 танка, 7 бронемашин, 179 автомашин, 14 тракторов. Разгромлены 17 полицейских участков и два немецких гарнизона, уничтожено 535 полицейских и 162 предателя.

Только при уничтожении одного вражеского пассажирского эшелона было убито 345 офицеров, которые ехали на фронт после окончания офицерской школы. Разгромлен карательный отряд фашистов, выезжавший на борьбу с партизанами. Разгромлен ряд очень укрепленных вражеских гарнизонов.

Немецкие оккупанты теперь поняли, что значит воевать с советским народом...

Наносить врагу смертельные удары

... В эти решающие дни каждый из нас, кто оказался в тылу противника, обязан всеми возможными средствами вредить немцам и их приспешникам, наносить врагу чувствительные удары, создавать невыносимую для него обстановку. Способные носить оружие должны подняться на вооруженную борьбу, остальные — активно помогать партизанам, чтобы общими усилиями помочь Красной Армии освободить родную землю от гитлеровской нечисти.

Гитлеровская «культура»

Театр и кино в городе стали местом, откуда фашисты насильно увозят людей на каторгу в Германию. Вместо клубов они организовали дома терпимости. Дом Красной Армии с его богатейшей библиотекой разграблен. То же сделано с богатыми городскими библиотеками... Сад Челюскинцев преобразован в немецкое кладбище. Десятки отличных школьных помещений загрязнены немецкими собаками...

І смерць адступіла

Міхаіла Балыкіна вайна застала ля заходняй граніцы, дзе ён працаваў у адной з раённых устаноў. Мабілізаваць яго не паспелі. Тады ён сам пачаў прабірацца на ўсход з адзіным жаданнем хутчэй уступіць у рады Чырвонай Арміі і са зброяй у руках стаць на абарону Радзімы. А фронт перамяшчаўся ўсё далей.

Не пашанцавала — варожы патруль затрымаў ля Асіповічаў. Нямецкі камендант, да якога прывялі, зірнуў на затрыманага, закрычаў у твар: «Камуніст?! Камісар?!» І рэзка махнуў рукой. «Ну, хлапец, усё!» — сказала перакладчыца.

Міхаіла кінулі ў кузаў машыны. Зароў матор, заскакалі па няроўнай дарозе колы; сталі пад'язджаць да сасонніку — месца пакарання смерцю. «Не бываць жа па-вашаму, гады!» Сэрца напоўнілa нянавісць да ворага. Кулакі наліліся незвычайнай сілай. У поле зроку трапіў дамкрат. Імклівым рухам схапіў цяжкую жалязяку абераў і з усёй сілы стукнуў гітлераўца па галаве. Той асунуўся, як мех, а Міхаіл тут жа саскочыў з машыны...

Спякотнае лета 1941 г. Фронт ужо дзесьці за Дняпром. У пасёлку станцыі Цялуша, дзе жылі бацькі Міхаіла, пачала разгортвацца патрыятычная барацьба. Міхаіл вывучаў настрой жыхароў, падбадзёрваў патрыётаў, усяляў веру ў нашу непазбежную перамогу.

Да вясны 1942 г. тут ужо стварылася баявая падпольная група. Сярод іншых у яе ўвайшлі сёстры Вараб'ёвы — настаўніца Маша і студэнтка Соня, Н.Пухальскі і яго баць-

ка Васіль, Галя Алферчык, Аляксандр Цэдзік і іншыя. Група збірала зброю. Было ўжо два кулямёты, 6 вінтовак, 3 пісталеты, 5 тысяч патронаў. Мэта — звязацца з партызанамі і пайсці да іх. Бліжэйшая задача — узарваць станцыю і майстэрню, якую немцы адкрылі ў былой МТС для рамонту сваёй тэхнікі, знішчыць нямецкую ахову і паліцаяў.

Патрыёты адчувалі сябе па-баявому. Усё было гатова да дзеяння. Выступленне назначылі на 5 чэрвеня 1942 г. Некалькі месяцаў перад гэтым М.Балыкін хаваўся ў іншых месцах, а напярэдадні, для непасрэднага кіравання аперацыяй, употай перабраўся ў дом бацькі. Але яго высачыў і выдаў 4 чэрвеня правакатар. З Бабруйска на дзвюх машынах наляцелі немцы, ачапілі дом і схапілі бацьку і сына Балыкіных, арыштавалі таксама Марыю Вараб'ёву. Астатнім членам баявой групы ўдалося выйсці з-пад удару.

Бацьку Міхаіла і Машу пасля зверскіх катаванняў расстралялі ў той жа дзень. Самога Міхаіла, акрываўленага, з разбітым тварам, са звязанымі за спінай рукамі, павялі на расстрэл.

Перон станцыі Цялуша. Душны чэрвеньскі надвячорак. Дзесяць канваіраў. Але камуніст Балыкін і ў гэты перадсмяротны свой час не страціў прысутнасці духу. Крыўдна толькі, што мала зроблена. Але ёсць цвёрдая рашучасць: лепш загінуць пры спробе ўцячы, чым ад кулі пры расстрэле! Міхаіл кінуўся ўправа, адным узмахам пераскочыў цераз кусты акацыі ўздоўж пуці і запятляў то ўправа, то ўлева. Канваіры, не чакаўшы гэтага ад паўжывога чалавека, разгубіліся, замітусіліся, адкрылі бязладную стральніну. Але і на гэты раз смерць адступіла.

А шлях Міхаіла Балыкіна праз многія цяжкасці і небяспеку прывёў у задняпроўскія лясы, у партызанскі полк № 810, «прыпісаны» да Быхаўскага раёна. У баявой характарыстыцы, якую камандаванне выдала сакратару партбюро палка М.М.Балыкіну, гаворыцца, што на яго асабістым баявым рахунку 4 варожыя эшалоны, якія ён пусціў пад адхон, два шашэйныя і адзін чыгуначны масты, многа падарваных рэек. Ён удзельнічаў у разгроме вялікай колькасці нямецка-паліцэйскіх гарнізонаў, у тым ліку буйнога апорнага пункта акупантаў у мястэчку Гарадзец. Акрамя таго, М.Балыкін прывёў у атрад, а затым у полк не менш чым 200 актыўных байцоў, якія сталі адважнымі партызанамі. *М.Пятровіч.*

Аказаны давер апраўдаў

У грозныя гады Вялікай Айчыннай вайны Мікалай Барысавіч Храпко быў адным з тых, каму партыя даручыла застацца ў варожым тыле, каб узняць народ на свяшчэнную вайну супраць гітлераўскіх захопнікаў. Гэта заданне ён выконваў сумленна і з годнасцю.

Ініцыятыўная група па арганізацыі падпольнай партыйнай работы і партызанскага руху 11 ліпеня 1941 г. прыбыла ў раён станцыі Ратміравічы. Камісарам яе быў М.Б.Храпко. Група налічвала 21 чалавек і мела на ўзбраенні два ручныя кулямёты, вінтоўкі, міны, бутэлькі з гаручай вадкасцю супраць танкаў. З першых жа дзён яна разгарнула актыўную дзейнасць.

13 ліпеня на дарозе Глуск—Парычы паказалася нямецкая калона з 200—250 чалавек. Самаўпэўненыя фрыцы, прывыкшы да лёгкіх перамог, рухаліся без разведкі, без бакавой і тылавой аховы. Гітлераўцы адчувалі сябе як дома, ішлі з закасанымі рукавамі, без галаўных убораў. Да таго ж стаяла ліпеньская спякота.

А іх з нецярпеннем чакала партызанская засада. І вось прагучала каманда «Агонь!». Партызаны ўдарылі так нечакана, што ў першыя ж мінуты бою немцы страцілі дзесяткі салдат. Сяляне вёскі Ратміравічы, якім фашысты загадалі выкапаць яму для пахавання забітых, расказвалі, што налічылі 47 трупаў.

У гэтай першай буйной узброенай схватцы з ворагам партызаны дзейнічалі смела, стойка, мужна, знаходліва. М.Б.Храпко стаў тады камандзірам групы.

У ліпені і жніўні 1941 г. партызаны вялі растлумачальную работу сярод насельніцтва, папаўнялі свае рады, збіралі зброю, распаўсюджвалі лістоўкі з праўдзівымі звесткамі аб становішчы на франтах. А ў верасні зноў ударылі па акупантах.

Нямецкія захопнікі загадалі насельніцтву зносіць масла, яйкі, малако і іншыя прадукты для сваёй арміі. А партызаны на дарозе Казловічы—Глуск наладзілі засаду. Нямецкі абоз з нарабаванымі прадуктамі расцягнуўся бадай на кіламетр. Ахоўвалі яго 22 коннікі.

Падпусціўшы ворага даволі блізка, партызаны М.Б.Храпко нечакана адкрылі па канваірах агонь. Трапныя кулі скасілі 9 ахоўнікаў. Астатнія, кінуўшы абоз, уцяклі хто куды.

Памятным для партызан атрада Храпко, які павялічыўся да таго часу ў чатыры разы, быў бой з буйным карным атрадам немцаў. Гэты бой яны правялі сумесна з атрадам Шантара ў студзені 1942 г. ў вёсцы Заракуша. Карнікаў было 250—300. Ехалі яны на 70 фурманках. Вынік бою: забіты 71 гітлераве-вец. Усе партызаны змагаліся адважна, але асабліва вызначыліся кулямётчыкі Інютачкін і Міронаў. З гарышча хлява на ўскрайку вёскі яны расстрэльвалі карнікаў ва ўпор і выклікалі ў іх радах страшэнную паніку.

Пазней на базе гэтага і іншых атрадаў была створана 1-я Бабруйская партызанская брыгада, камісарам якой прызначылі М.Б.Храпко. Адным словам, аказаны давер ён з гонарам апраўдаў.

М.Кручкоў.

Кіпелі помстай маладыя сэрцы

Невялікая лясная вёсачка Пятровічы была для нас месцам нярэдкіх спатканняў з падпольшчыкамі-сувязнымі. Прыходзілі з горада два хлопчыкі Марат Ханяк і Сярожа Русаковіч і 14-гадовая дзяўчынка піянерка Раіса Русаковіч, якія дапамагалі сувязной камсамолцы Тані Цыганковай. Прыносілі патрэбныя для атрада звесткі, медыкаменты і перавязачныя матэрыялы. Частымі нашымі гасцямі былі не толькі гараджане, але і вясковая моладзь. Да жніўня 1943 г. дапамагалі нам дзве камсамолкі з вёскі Гарбацэвічы — Соня Горбач і Маня Пяшко, якія перад вайной закончылі сярэднюю школу. Абедзве працавалі пад кіраўніцтвам камсамольца Антона Саханчука.

Восенню 1943 г. па даносу здрадніка камсамолкі былі арыштаваны і адпраўлены ў лагер смерці, дзе і загінулі. А на іх месца сталі Марыя Рослік, Надзея Валодзька, Барыс Савіцкі, Мікалай Гайшун, Фёдар Зіневіч, Мікалай Ашурка, Ганна Ашурка, тры браты — Мікалай, Уладзімір і Міхаіл Ашуркі і многія іншыя. Камсамольцы пад выглядам рабочых, сялян, а часам і жабракоў пранікалі ў стан ворага, збіралі звесткі пра яго ўзбраенне і намеры. Паступова падпольшчыкі ўліліся ў атрад.

Памятаю адзін паход на «жалезку». Камандаваў падрыўной групай былы падпольшчык, камсамолец з вёскі Сычкава Міхаіл Пятроўскі. У групу падрыўнікоў уваходзіла адна моладзь. Смельчакі па балоцістых сцежках падышлі да чыгункі Лунінец — Старушкі. Вечарам пачалі назіраць, як падысці да чыгуначнага палатна. Давялося ляжаць 12 гадзін. Затым камандзір Міхаіл Пятроўскі распарадзіўся:

— Фёдар Зіневіч, пойдзеш за мной да палатна. Мікалай Ашурка, Іван Лядзян — управа на правы бок. Іван Лінеў, Васіль Калыгін — улева. Задача — пры неабходнасці забяспечыць агнём наш адыход...

Камандзір групы на спіне пацягнуў 16-кілаграмовую ўзрыўчатку, а Фёдар Зіневіч — шнур. Прытаіліся каля насыпу. Пачуўся гучны стук ботаў: два салдаты павольна прайшлі міма і растварыліся ў цемры. Хуткімі, упэўненымі рухамі партызаны падняліся на палатно. Гітлераўскім вінтовачным штыком зрабілі яму, заклалі зарад, узрыўчатку, працягнулі шнур і ціха адышлі ўніз, схаваліся. Перад світаннем пачуўся шум і абрывістыя гудкі паравоза. Чорны, як змяя, поўз на ўсход поезд. Управадзе паравоза два вагоны з пяском.

— Ну, Зіневіч, не зявай, — сказаў камандзір.

Вось ідзе другі вагон з пяском, за ім пыхкае паравоз. З усяе сілы тузануў Зіневіч шнур. Успыхнуў сіні агонь. Паравоз стаў дубка і паляцеў пад адхон, цягнучы за сабой вагоны. Затрашчалі вінтовачныя стрэлы. Каля пакарабачаных вагонаў — крык і стогны. Баявая падрыўная група без страт вярнулася ў партызанскую зону. Былі падарваны паравоз, 6 вагонаў з боепрыпасамі, 2 платформы з танкамі, 9 цыстэрнаў з гаручым.

Ф.Папоў, былы камісар атрада імя Чапаева 37-й партызанскай брыгады імя Пархоменкі.

Паміж жыццём і смерцю

У верасні 1943 г. з Бабруйска па шашы на Рагачоў праходзіла 348-я пяхотная гітлераўская дывізія. Мінуўшы вёску Вялікія Бортнікі, яна спынілася ў Дварцы і Жылічах, каб папоўніцца правіянтам, рабуючы мясцовых жыхароў. Але партызаны не далі фашыстам ажыццявіць намечаную акцыю — завязаўся жорсткі бой. У 9-й Кіраўскай брыгадзе 539-ы партызанскі атрад страціў тады 17 чалавек забітымі, 14 партызан атрымалі раненні. Апошні, чатырнаццаты, цяжка паранены Рыгор Пракопчык з Варатыні быў выпадкова пакінуты на полі бою, усю ноч праляжаў у кустах ля дарогі, сцякаючы крывёю.

Фашыст стрэліў яму прама ў грудзі, куля прайшла міма сэрца, праз лёгкія, пакінуўшы рваную рану на спіне... Хлопец адчуў моцны ўдар (аўтару гэтых радкоў давялося перажыць у баі падобнае: калі страляюць ва ўпор, адчуваеш удар у спіну).

Праз дзве-тры хвіліны Рыгор апрытомнеў, хацеў штосьці сказаць партызану, які ляжаў побач, але кроў пайшла з носа і рота, у грудзях штосьці душыла і пякло... Здавалася, вось-вось ён захлынецца сваёй крывёю. У гэты час да яго падпоўз хтосьці са сваіх і, ухапіўшы за пояс, пацягнуў параненага ў кусты. Ад рэзкага болю зноў страціў прытомнасць. Ачнуўся — туга перавязаны звычайным сялянскім ручніком — у пышнай зеляніне хмызняку. Праз рот і нос яшчэ сачылася кроў, з-за болю ў лёгкіх дыхалася неглыбока і часта.

Рыгор успомніў, што з апошняй абоймы ён выстраліў толькі раз — значыць ёсць яшчэ патроны. Дрыжачымі пальцамі ён пацягнуў затвор і загнаў у ствол новы патрон «на ўсялякі выпадак». Кусты перашкаджалі бачыць, што робіцца навокал, але чуваць было — бой працягваўся.

Спачатку немцы ваявалі вельмі актыўна, некалькі разоў узнімаліся ў атаку, але партызанскі шквальны агонь клаў іх на зямлю. З боку шашы да гітлераўцаў падышлі «фердынанды» з гарматамі. У паветры з'явіўся самалёт-разведчык. Тады на дапамогу нашаму 539-му атраду падцягнуўся 537-ы партызанскі полк: на выпадак, калі немцы ўвядўць у бой новыя падраздзяленні.

Каля паўсотні гітлераўцаў пакінула ў тым баі ля могілак вёскі Дабрыца трэцяя рота старшага лейтэнанта Івана Мікалаевіча Гусева, які год назад збег з фашысцкага палону ў Бабруйскай крэпасці і цяпер помсціў за загінуўшых там чырвонаармейцаў. Дзякуючы ўмелым дзеянням камандзіра і мужнасці хлопцаў рота адбіла ўсе атакі немцаў. Узвод Васіля Долбіка кулямётным агнём і гранатамі адрэзаў немцам адыход на Жылічы. Байцы першай роты Паўла Царапкіна перакрылі дарогу на Пясцова, масіраваным агнём з чатырох кулямётаў прымусілі фашыстаў адступіць. Бой працягваўся каля чатырох гадзін. Замест прадуктаў немцы павезлі на машынах з паўсотні параненых, а яшчэ больш пакінулі трупаў.

Сярод нашых загінуўшых было некалькі партызан, якія прыйшлі ў атрад з вёсак Бабруйскага раёна. Навечна маладым для нас застаўся 25-гадовы лейтэнант Канстанцін Пракопчык з Варатыні. Да апошняга вёў агонь з кулямёта Іван Паслядовіч з Туркоў. У дзень свайго нараджэння паў смерцю храбрых Іван Аўчыннікаў з Мікулічаў. Смерцю героя загінуў Іван Капусцін з Жарабцоў...

... Аслабелы, сцякаючы крывёю, Рыгор з надыходам цемры задрамаў. Прахапіўся ад грукату нямецкіх машын. Адна з іх спынілася на дарозе зусім блізка ад яго — немцы ўсцягвалі трупы ў кузаў за якіх-небудзь чатырыпяць метраў ад таго месца, дзе ляжаў партызан. Але лёс мілаваў яго.

Прыкладна ў гэты час, пасля світання, у атрадзе выявілі, што Рыгора Пракопчыка не аказалася ні сярод забітых, ні сярод параненых. Пачалі шукаць — і знайшлі. Неадкладна даставілі ў партызанскі атрад. Мне даручылі тады змяніць яму акрываўленыя бінты. Упершыню я ўбачыў, як чалавечая кроў паветранымі пульхірамі струменіць з раны. У мяне на якоесьці імгненне памутнела ў галаве.

— Што ты так доўга корпаешся? — сердаваў Рыгор.

— Чакай, зараз, — пераадольваючы сябе, адказаў я яму тады, стараючыся, каб ніхто не заўважыў маёй збянтэжанасці.

Потым я суправаджаў Рыгора на фурманцы ў партызанскі шпіталь, ва ўсакінскія лясы. Дарога была цяжкая, а кожны штуршок — боль і кроў. Мы вельмі баяліся за жыццё сваіх цяжкапараненых. Але Рыгор усё вытрымаў. Да вясны 1944-га ён зноў стаў у строй. Паспеў яшчэ паваяваць, але вераснёў-

скі бой 1943-га, як яркае імгненне паміж жыццём і смерцю, застаўся ў яго памяці назаўсёды.

У чэрвені наша партызанская брыгада злучылася з часцямі Чырвонай Арміі, і Рыгор Нічыпаравіч Пракопчык заняўся мірнай працай журналіста ў рэдакцыі абласной газеты ў Бабруйску.

В.Голуб, былы партызан 539-га атрада 9-й Кіраўскай брыгады.

Смелыя рэйды

Мне асабіста і многім сябрам па зброі давялося дзейнічаць у глыбокім тыле, на часова акупіраванай нямецка-фашысцкімі захопнікамі беларускай зямлі.

Барацьба з чужынцамі, іх памагатымі пачалася з першых дзён акупацыі. У горадзе Бабруйску і раёне адразу ўзніклі падпольныя групы, пачалі арганізоўвацца партызанскія атрады, якія потым выраслі да брыгад.

Прыгадваюцца многія эпізоды, у прыватнасці аперацыя ў раёне пасёлка Глуша. Пасёлак размешчаны на важнай шашэйнай магістралі Масква—Варшава. Натуральна, што тут былі і варожая камендатура, і нямецка-паліцэйскі гарнізон. Усе гэтыя аб'екты пільна ахоўваліся.

Вось мы і паставілі задачу нанесці тут удары па ворагу. Справа аблягчалася тым, што да пасёлка ўшчыльную падступалі лясныя масівы. Праз падпольшчыкаў Г.Адамовіч, бацьку і сына Каваленкаў і іншых папярэдне дакладна высветлілі абстаноўку на месцы. Потым М.Храпко, В.Кучугура і я сабраліся ў адной вёсцы Рымавецкага сельсавета для канчатковага абмеркавання аперацыі. Рашылі нанесці ўдар адразу па трох аб'ектах: па нямецка-паліцэйскім гарнізоне, шклозаводзе і мосце.

Да гэтага атрад падзялілі на тры групы. Адной з іх, па знішчэнні абсталявання шклозавода, кіраваў Мікалай Храпко з Васілём Кучугурам. Васіль Голадаў са сваёй групай павінны быў падарваць мост. Мы з Сямёнам Шуевым, Рыгорам Кашаедам і групай партызан накіраваліся на нямецка-паліцэйскі гарнізон. З сакавіка 1943 г. ў дамоўлены час гэтая аперацыя была ажыццёўлена. Нам дасталіся нямецкія трафеі, у тым ліку зброя, прадукты, медыкаменты.

Аперацыі, розныя па маштабах, выконваліся асобнымі групамі ці атрадамі. Былі і такія, у якіх удзельнічалі аб'яднаныя сілы суседніх брыгад. Напрыклад, у разгроме нямецка-паліцэйскага гарнізона ў вёсцы Пратасы прымалі ўдзел атрады трох брыгад — А.В.Львова, В.І.Лівенцава і Ф.І.Паўлоўскага. Гарнізон гэты, у якім было звыш 200 чалавек і які не даваў спакою ні партызанам, ні мясцовым жыхарам, быў знішчаны. А вось аперацыю ў вёсцы Коўчыцы мы праводзілі разам з партызанамі першай брыгады.

У жніўні 1943 г. мы разам з іншымі народнымі мсціўцамі выйшлі на «рэйкавую вайну». Нашай брыгадзе быў адведзены ўчастак чыгункі паміж станцыямі Ясень і Мірадзіна. Падрыўнікі ўзнялі ў паветра каля 3,5 км рэек, падарвалі 3 масты, некалькі вартавых будак.

Трэба адзначыць, што ў час «рэйкавай вайны» вораг узмоцнена ахоўваў не толькі чыгуначнае палатно, але і подступы да яго. Аднак нішто не спыніла народных мсціўцаў. Сваімі дзеяннямі яны набліжалі дзень вызвалення.

С.Сыраквашын, былы начальнік штаба 37-й партызанскай брыгады імя Пархоменкі.

Партызанскі салют Кастрычніку

— Ганна Мікалаеўна, а праўда, што вы ў семнаццаць гадоў сталі партызанкай?

— А за што вас па тэлевізары паказвалі?

Так не адзін раз сустракалі школьнікі паштальёна Пятровіцкага аддзялення сувязі Ганну Мікалаеўну Чарных (дзявочае прозвішча Рудзько).

Нарадзілася яна ў вёсцы Мачулкі, што на Бабруйшчыне. Скончыла 8 класаў, паступіла на педрабфак. Потым камсамолку накіравалі настаўнічаць на Брэстчыну. Вайна застала Ганну ў поездзе, на якім яна дабіралася ў Брэст, каб здаць экзамены ў пединстытут. Эшалон разбамбілі. Ганна ўцалела. З цяжкас-

цямі дабралася да вёскі Заполле Івацэвіцкага раёна, дзе раней настаўнічала. Доўгі час хавалася. А аднойчы разам з нашымі ваеннапалоннымі, якія арганізавалі ўцёкі, пайшла ў лес.

У пачатку 1942 г. семнаццацігадовая дзяўчына была партызанкай у атрадзе Самуйліка. Першае баявое хрышчэнне камсамолка атрымала ў час аперацыі ў райцэнтры Косаў. Тады партызаны напалі на млын, знішчылі нямецкую ахову, захапілі зброю і падводы з мукой. Ганна вызначылася рашучасцю, адвагай.

Аднойчы партызанская разведка натрапіла на гітлераўскі поезд, які курсаваў па вузкакалейцы, што пралегла з Украіны праз Івацэвіцкі раён. Эшалон быў гружаны нарабаваным у сялян дабром. Народныя мсціўцы вырашылі захапіць гэты поезд і тым самым адзначыць чарговую гадавіну Кастрычніка. Распрацавалі дэталёвы план дзеяння. Аперацыю даручылі невялікай групе партызан, у якую ўваходзіла і Ганна. Гэта баявое заданне было выканана бліскуча. Партызаны падабралі момант, калі паліцаі-ахоўнікі поезда гулялі вяселле, імгненна напалі на эшалон і без страт захапілі яго. На лакаматыве ўмацавалі чырвоны сцяг, і памчаў поезд па рэйках. Каля населеных пунктаў рабілі кароткія прыпынкі, праводзілі мітынгі, раздавалі нарабаванае фашыстамі дабро. А потым пустыя вагоны запоўнілі саломай, падпалілі яе і палаючы састаў на поўным хаду пусцілі ў раку Піну.

Самі, каб адарвацца ад праследавання гітлераўцаў, перабраліся ў Бярозаўскі раён і наладзілі адпачынак у гаі каля вогнішча. Многія знялі і сушылі вопратку. Камсамолец Валодзя разабраў на плашч-палатцы кулямёт і пачаў яго чысціць.

— Немцы! — раптам пачуўся крык і стрэл вартавога.

Затрашчалі аўтаматы, зацокалі кулі. Партызаны кінуліся прэч ад кастра. Трэба было ратавацца. Але неўзабаве пачуўся моцны плач Ганны. Яна залівалася слязьмі. Што здарылася? Да яе падбег камандзір атрада Самуйлік. Аказваецца, ля вогнішча, у ватоўцы, павешанай сушыцца, застаўся яе камсамольскі білет.

— Назад! — загадаў камандзір.

Непрыкметна падпаўзлі да сваёй стаянкі і адкрылі агонь з усіх відаў зброі. Паляцелі гранаты, пачалася рукапашная схватка. Фашысты не чакалі такой дзёрзкасці і кінуліся наўцёкі. Пазней камандзір атрада гаварыў:

— Камсамольскі білет Ганны многіх з нас выратаваў. Калі б не вярнуліся назад, то выйшлі б на адкрытую мясцовасць і там бы цяжка давялося.

Пасля ў Ганны было многа баявых заданняў.

Аднойчы ледзь не трапіла ў палон: калі паўзком адыходзіла ў глыб лесу, на яе ззаду напала нямецкая аўчарка, прыціснула да зямлі і не давала падняцца. Выручыў партызан Ванька-мардвін. Ганна Мікалаеўна асвоіла спецыяльнасць мінёра і стала смелым падрыўніком. Разам з таварышамі камсамолка пусціла пад адхон шэсць эшалонаў з танкамі і жывой сілай ворага. Узрывала масты, палатно чыгункі, склады з боепрыпасамі. Але той партызанскі салют Кастрычніку, бадай, самы яскравы і памятны.

Юная партызанка ўдастоена некалькіх баявых узнагарод, сярод якіх медаль «Партызану Вялікай Айчыннай вайны» I ступені.

Пасля вайны Ганна вярнулася на Бабруйшчыну, у сваю родную вёску. Доўгі час працавала ў саўгасе, а апошнія гады паштальёнам у Пятровіцкім аддзяленні сувязі. Не раз сустракалася з моладдзю, расказвала пра сваё партызанскае юнацтва. *В.Слаўковіч.*

Дзеці вучыліся ў лясной школе

Паводле ўспамінаў былога начальніка штаба 1-й Бабруйскай партызанскай брыгады С.З.Крамнёва.

У суровыя дні Вялікай Айчыннай, калі школы ў сельскай мясцовасці амаль не працавалі, у партызанскіх атрадах ствараліся вучэбныя групы з тых дзяцей, бацькі якіх былі ў партызанах або загінулі ў барацьбе з акупантамі і іх памагатымі.

У атрадах 1-й Бабруйскай партызанскай брыгады, якой камандаваў В.І. Лівенцаў, такая група была створана ў канцы 1942 — пачатку 1943 гг. Усяго ў групе было больш за 12 дзяцей школьнага ўзросту. Гэта выхаванец атрада Кім Патапейка (1927 года нараджэння), прыбыў у атрад з Асіповіцкага раёна, дзе яго застала вайна ў бабулі, а бацькі аказаліся за лініяй фронту. Выхаванцам атрада быў і

Міша Каган (1928 г.), бацькоў якога расстралялі гітлераўцы ў 1941 г. ў Бабруйску. У групе былі Валодзя Лукомскі (1930 г.), сын разведчыцы Любові Курганскай, якая загінула ў жніўні 1943 г.; дзве малодшыя сястры камандзіра роты Ф. Клімашонка — Зіна (1930 г.) і Таня (1927 г.). Навучаліся ў групе таксама сын партызанкі Ганны Граковіч Валодзя (1931 г.), сын партызанкі Соф'і Куляшовай Алег (1932 г.), дачка партызана Івана Мазурэнкі Ніна (1929 г.), дачка партызанкі Марыі Верашчагінай Люда (1927г.) і інш.

Адказнай за арганізацыю вучобы была разведчыца Вікторыя Андрэеўна Падвінская, настаўніца па прафесіі (пасля вайны жыла ў г. Дзяржынску, стала заслужанай настаўніцай Беларусі). Дапамагалі ёй партызаны, якія мелі педагагічную адукацыю. У іх ліку камандзір аддзялення разведкі Сцяпан Паўлавіч Пешкаў, разведчыца Соф'я Паўлаўна Сяліцкая, камандзір атрада Уладзімір Васілевіч Комін, сакратар Бабруйскага падпольнага райкома камсамола Міхаіл Ігнатавіч Семісалаў, камандзір аддзялення Дзмітрый Нічыпаравіч Цяслёнак, партызан Іван Антонавіч Хурсан і інш. За кожным было замацавана па 1—2 вучні, з якімі яны ў вольны ад баёў час праводзілі заняткі, давалі заданні па чытанні, пісьме, арыфметыцы і інш.

Дапаможнікі, паперу і пісьмовыя прылады даводзілася здабываць у насельніцтва, а іншы раз і ў баях. Пісалі і на шпалерах. У некаторых бацькоў захаваліся грыфельныя дошкі, якія ў тых умовах вельмі спатрэбіліся. У якасці класных дошак выкарыстоўвалі фанеру.

У нашай брыгадзе былі і свае метадысты — былы загадчык Браслаўскага райана Павел Іосіфавіч Тамковіч і былы інспектар Асіповіцкага райана Сяргей Кандратавіч Барадаўка, якія дапамагалі настаўнікам.

Вядома ж, вучэбны працэс не адпавядаў патрабаванням школьных праграм, аднак дзеці былі заняты важнай справай, рыхтаваліся прадоўжыць вучобу пасля вайны.

Яе звалі Марыя

З Марыяй Калпаковай я быў знаёмы яшчэ да вайны. Прыгожая, статная дзяўчына падкупляла сваёй сціпласцю і таварыскасцю. Ды наогул сям'ю Калпаковых з вёскі Казакова ведалі многія ў акрузе. Бацька Марыі — Ісай Алімпавіч Калпакоў, удзельнік рэвалюцыйных падзей, барацьбы з белапалякамі — быў старшынёй калгаса. Калі пачалася вайна, актыўна дапамагаў чырвонаармейцам, якія трапілі ў акружэнне. Затым стварыў падпольную групу, у якую ўвайшлі яго дочкі Марыя і Вера, сыны Клім і Пётр, а таксама многія жыхары вёскі Казакова. Яны збіралі і перадавалі звесткі пра ворага, здабывалі і пастаўлялі партызанам зброю, боепрыпасы, медыкаменты, вялі прапаганду сярод насельніцтва.

Неўзабаве Марыя стала сувязной. Перадавала партызанам звесткі аб фашыстах, імкнулася як мага часцей бываць сярод людзей і весці шчырыя размовы. А потым перайшла ў партызанскі атрад імя Кірава 37-й партызанскай брыгады імя Пархоменкі. І адразу ўзялася за справу: хадзіла ў разведку, актыўна ўдзельнічала ў партызанскіх дывэрсіях, нярэдка выносіла з поля бою параненых, рызыкуючы сваім жыццём.

У снежні 1943 г. 37-я гвардзейская дывізія, наступаючы з поўдня на Бабруйск, злучылася з партызанскімі атрадамі і ў раёне Парычаў утварыла «калідор», па якім жыхары навакольных вёсак, што яшчэ знаходзіліся пад фашысцкім ярмом, выходзілі да вызваленых месц. Фашысты імкнуліся ў што б там ні стала ліквідаваць «калідор». Партызаны, у сваю чаргу, рабілі ўсё, каб утрымаць гэты кавалачак зямлі. Адзін з такіх участкаў абараняла партызанская брыгада імя Пархоменкі, дзе камандзірам быў Львоў, а камісарам — Храпко. 14 дзён і начэй утрымлівалі народныя мсціўцы важную дарогу. Асабліва цяжкія баі вёў атрад імя Кірава пад камандаваннем Голадава. Вёска Коўчыцы, дзе ўмацаваліся народныя мсціўцы, вытрымала дзевяць шалёных атак. Але ўсе яны былі адбіты, дзякуючы стойкасці і мужнасці партызан. На полі бою засталіся сотні фашысцкіх трупаў. Было знішчана нямала аўтамашын, бронетранспарцёраў...

У час адной з гітлераўскіх атак загінуў кулямётчык Хархурын, а неўзабаве змоўк і мінамётны разлік. Паўсюль былі чутны крыкі параненых, на дапамогу якім спяшалася медыцынская сястра Марыя Калпакова.

А баі не сціхалі. Камандзір аддзялення

Мікалай Хацько бачыў, як старалася Марыя Калпакова, хоць сама ледзь не валілася з ног ад стомы. А выпадала часіна, брала ў рукі карабін і страляла па нянавісных гітлераўцах...

Але вось фашысты зноў уварваліся ў вёску. Хацько аддаў загад адыходзіць. Марыя гэтых слоў не чула. Яна працягвала страляць па варожых салдатах. І раптам... Скончыліся патроны. Гітлераўцы асмялелі і пайшлі ў атаку, не хаваючыся. Прама на Марыю з аўтаматам бег фашыст. Ды толькі не спалохалася Марыя, з карабінам у руках ускалчыла і закрычала:

— Біце гадаў, знішчайце чужынцаў...

Затрашчалі гітлераўскія аўтаматы. Разануў з аўтамата па бягучым фашысце і Мікалай Хацько. Ды было позна. Варожая куля прабіла сэрца адважнай камсамолкі-партызанкі...

У цэнтры вёскі Коўчыцы стаіць пяціметровы бронзавы помнік. Яго ўзвялі ў гонар загінуўшых партызан 37-й партызанскай брыгады імя Пархоменкі ўдзячныя нашчадкі. Сярод тых, чые імёны высечаны на помніку, ёсць і прозвішча Марыі Калпаковай. Яе імя было нададзена піянерскай дружыне Коўчыцкай сярэдняй школы. А мы, каму давялося ваяваць разам з Марыяй, і сёння памятаем яе — адважную партызанку і падпольшчыцу, выдатнага сябра і чалавека. *Д.Тараховіч.*

«Вяселле»

Члены асобага аддзела партызанскай брыгады № 37 імя Пархоменкі вялікую ўвагу ўдзялялі арганізацыі ўцёкаў савецкіх ваеннапалонных з гітлераўскіх канцлагераў у Бабруйску, агітацыі за пераход да лясных мсціўцаў тых, хто насільна ці выпадкова трапіў служыць да немцаў.

Агітатарам у Продзвінскі паліцэйскі гарнізон была накіравана В.М.Вішнеўская. Яна даведалася, што начальнік гэтага гарнізона, нехта Харчанка, нацыяналіст, вызначаўся асаблівай жорсткасцю: калі хтосьці з паліцэйскіх ішоў у партызаны, то расстрэльвалі яго бацькоў, блізкіх. А тут трэба было адразу многіх паліцэйскіх накіраваць у партызанскі атрад. Каб адвесці пагрозу ад іх бацькоў і родзічаў, была спецыяльна распрацавана аперацыя «Вяселле».

У адзін з сакавіцкіх дзён 1943 г. на вуліцах вёскі Баравая можна было бачыць шмат людзей. Вакол чуліся музыка, смех: гулялі вяселле. Прыбылі на яго і маладыя паліцэйскія з вінтоўкамі, кулямётам. Зброю паклалі, а самі селі за стол...

У гэты час ля вёскі з'явілася група партызан на чале з Мікалаем Тоўсцікам, сакратаром падпольнага райкома камсамола. Аб'ехалі вёску: не, засады няма. Але каб канчаткова ў гэтым пераканацца, паслалі разведчыка Барыса Голанда прайсціся па дварах.

І вось партызаны ўварваліся ў дом, дзе спраўлялі «вяселле»: «Рукі ўгору! Не варушыцца!»

Паліцэйскіх вывелі на вуліцу, сяму-таму для выгляду надавалі тумакоў. Затым селі на сані, спецыяльна падрыхтаваныя, і паехалі ў бок Вішнёўкі, далей у лес, дзе дыслакаваліся партызанскія атрады.

Дваццаць чалавек уліліся тады ў партызанскую сям'ю. *І.Бычкоў.*

Дакументы сведчаць...

З ПАСТАНОВЫ ЦК КП(б)Б АД 22 ЧЭРВЕНЯ 1941 ГОДА «АБ ЗАДАЧАХ І МЕРАПРЫЕМСТВАХ У СУВЯЗІ З ВЫСТУПЛЕННЕМ ПА РАДЫЁ НАМЕСНІКА СТАРШЫНІ СНК СССР МОЛАТАВА В.М.»

Созвать в Минске и в других областных городах партийные активы для мобилизации партийных организаций на разрешение задач, вытекающих из военной обстановки. На Минском партийном активе (созвать на 3 часа дня) выступление поручить тов. Пономаренко.

На всех предприятиях, в колхозах, совхозах, учреждениях провести митинги.

Обязать все обкомы, горкомы и райкомы, советские, комсомольские и профсоюзные организации принять меры к организованному переводу работы промышленности и транспорта на нужды Красной Армии.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4. Воп. 33, а. Спр.1.

З ДЫРЭКТЫВЫ СНК СССР І ЦК ВКП(б) АД 29.6.1941 г. ПАРТЫЙНЫМ І САВЕЦКІМ АРГАНІЗАЦЫЯМ ПРЫФРАНТАВЫХ АБЛАСЦЕЙ

... 4) При вынужденном отходе частей Красной Армии угонять подвижной железнодорожный состав, не оставлять врагу ни одного паровоза, ни одного вагона, не оставлять противнику ни килограмма хлеба, ни литра горючего. Колхозники должны угонять скот, хлеб сдавать под сохранность государственным органам для вывозки в тыловые районы. Все ценное имущество, в том числе цветные металлы, хлеб и горючее, которое не может быть вывезено, должно, безусловно, уничтожаться.

5) В занятых врагом районах создавать партизанские отряды и диверсионные группы для борьбы с частями вражеской армии, для разжигания партизанской войны всюду и везде, для взрыва мостов, дорог, порчи телефонной и телеграфной связи, поджога складов. В захваченных районах создавать невыносимые условия для врага и всех его пособников, преследовать и уничтожать их на каждом шагу, срывать все их мероприятия.

Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941—июль 1944). Мн., 1967. Т. 1. С.50—51.

З ДЫРЭКТЫВЫ ЦК КП(б)Б АД 1.7.1941 г. ПАРТЫЙНЫМ, САВЕЦКІМ І КАМСАМОЛЬСКІМ АРГАНІЗАЦЫЯМ ПА РАЗГОРТВАННІ ПАРТЫЗАНСКАЙ ВАЙНЫ Ў ТЫЛЕ ВОРАГА

... 2. Все местности Белоруссии, занятые врагом, должны немедленно покрыться густой сетью партизанских отрядов, ведущих непрерывную ожесточенную борьбу на уничтожение врага.

3. В районах и селах создаются подпольные партийные комсомольские ячейки, главная задача которых — мобилизация народа на беспощадную расправу с врагом. Для этой цели все коммунисты и комсомольцы, способные носить оружие, остаются на территории, занятой врагом.

4. Подпольные организации и партизанские отряды должны иметь явочные квартиры, адреса которых сообщить военному отделу ЦК. Эти явки помогут держать связь, объединять (подпольщиков) и направлять (им) директивы и помощь.

5. Твердо помнить, что партизанская борьба не имеет ничего общего с выжидательной пассивной тактикой. Она имеет боевой наступательный характер. Не надо ждать врага — надо его искать и уничтожать.

6. Задачи партизан: уничтожать всякую связь в тылу врага, взрывать и портить мосты, дороги, поджигать склады горючего и продовольствия, автомашины, самолеты, устраивать крушения поездов. Уничтожать врагов, не давать им покоя ни днем, ни ночью. Убивать их всюду, где застанешь, убивать чем попало: топором, косой, ломом, вилами, ножом. Объединить несколько партизанских отрядов, нападать неожиданно на отряды противника и уничтожать. Особенно важно напасть ночью на аэродромы, сжечь самолеты, перебить летчиков...

7. Нельзя ждать ни минуты, начинать действовать сейчас же, быстро и решительно.

Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941—июль 1944). Мн., 1967. Т. 1. С. 53—54.

СПРАВАЗДАЧА КАМАНДЗІРА 1-Й БАБРУЙСКАЙ ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ МАГІЛЁЎСКАЙ ВОБЛАСЦІ В.І.ЛІВЕНЦАВА Ў БШПР АБ ПАДПОЛЬНАЙ РАБОЦЕ Ў ГОР. БАБРУЙСКУ Ў 1941 г.

29 снежня 1943 г.

В августе м-це 1941 г. группа из 4 человек (Ливенцев, Митрофанюк К., Старков Е. и Кустов Г.), чтобы избежать плена и не работать на немцев, начала заниматься подделкой продуктовых талонов и различных справок. В дальнейшем эта работа переросла в фабрикацию фальшивых паспортов, продуктовых карточек, немецких удостоверений и организованную подпольную работу в г.Бобруйске.

Подделка паспортов

В конце августа 1941 г. мне удалось из бывшего здания НКВД и вместе с Кустовым из бывшего здания 1-го отд. милиции вынести до 250 старых паспортов. При помощи химических препаратов лично добился их восстановления и пригодности к выдаче. С помощью организованной на квартире у Кочеткова подпольной фотографии мы могли делать все своими руками. Это начинание привлекло к нашей группе большое количество людей в большинстве из состава военнослужащих Красной Армии. Первыми, наиболее активными членами были:

Кочетков, Плютто, Лепешкин, Васильев, Истомин, Бовкун, Чайников, Сумбаев, Смольникова и др.

Всего к ноябрю м-цу организацией было охвачено более 200 человек. Кроме старых паспортов в сентябре м-це Кустов и Янголенко через Сарафанова достают 6 новых паспортов, а через несколько дней при знакомстве с неким Витькой (в бывшем темная личность) мне удается получить еще около сотни чистых бланков паспортов, которые и составили основу дальнейшей работы в городе. Всего с августа по декабрь 1941 г. мною было роздано до 200—250 паспортов.

Обеспечивание продуктами

Наряду с подделкой паспортов пришлось заниматься и подделкой продуктовых талонов и карточек.

Пока по городу были действительны талоны, отпечатанные на машинке, фабрикация их происходила в моей квартире, лично самим. Когда же ввели продуктовые карточки типографской работы, карточки получал через «Витьку» от нач. типографии гор.Бобруйска т. Стержаиова, а с ноября м-ца лично от него. У меня на квартире ставили на них печати, заполняли их и раздавали членам группы. Оказывалось, что по поддельным карточкам городское управление и немецкие власти выдавали продуктов больше, чем на рабочих города работающих у немцев. Немцы, видя такую утечку продуктов, ежемесячно вводили что-либо новое в оформлении карточек (на каждом талоне ставили печати, потом по две печати, потом ввели прикрепительные талоны и т.д.), но это не помогало, ибо заведующие магазинами № 1 — Елена Васильевна, № 4 — Масюк Мария Николаевна и др. были наши люди и работали вместе с нами. Так продолжалось до дня выхода в лес. Хорошо об этом знают Смольникова, Лепешкин, Кочетков, Сумбаев, Кремнев, Яковлев и др.

Радиоприемник

Когда организация стала довольно большой, к концу сентября 1941 г. встал вопрос о связи с Советским Союзом хотя бы посредством радиослушания. Я, Кустов, Лепешкин и др. стали искать радиоприемник. Поиски увенчались успехом. Через одного старшего политрука запаса бывшего старого партийного работника мне удалось достать польский радиоприемник и перенести его на квартиру Смольниковой, где он и находился до момента выхода в лес. Все сводки, принимаемые Смольниковой, поступали ко мне. Ввиду того, что через мою квартиру ежедневно проходило минимум до 20—30 человек, сводки доходили до остальных членов и населения. По устройству приемника много поработали Старинов Е., Кустов Г. Истомов, Саша (по кличке «каракулевая шапочка», проживал по ул. Рабочая, 4) Кремнев (исправляли приемник).

Связь с типографией

В сентябре м-це 1941 г. через «Витьку» я из типографии получал карточки, вкладыши в паспорта, немецкие удостоверения и др. нужные печатные документы, но в минимальном количестве. С ноября же месяца, когда лично познакомился с т. Стержановым, Бобруйская типография в основном помогала нам. В декабре м-це перед выходом в лес мною перед Стержановым была поставлена задача — достать на небольшую типографию шрифта. Стержанов это поручение выполнил и все первые листовки, выпущенные отрядом, набирались этим шрифтом. Помощь Стержаиова, особенно продуктовыми карточками, сделала организацию авторитетной и мощной. Об этом хорошо знают Лепешкин, Кочетков, Плютто, Васильев, Кодыч и др.

Связь с биржей труда

В начале декабря 1941 г. Григорий Кустов знакомится с группой Колесникова—Химичева. При встрече меня с Химичевым, Колесниковым, Говровым я их посвятил, что у нас было совещание, на котором мы создали группу и в скором времени думаем выводить людей. Химичев, Колесников, Говров поддерживают меня и через некоторое время созывают совещание у себя и ставят вопрос тоже о выходе в леса. После этого мы всю работу проводим совместно.

Для того чтобы выход организовать лучше, я у майора Кодыча беру выданный немецкими властями пропуск и через Колесникова ночью на Бирже труда вместе с Геннадием Гавровым размножаем пропуск до 500 экземпляров.

У себя на квартире ставлю подделанную печать и с особой пометкой раздаю командирам мелких и крупных групп — Мосину, Сыраквашину, Бовкуну, Яковлеву, Истомину и др., которые и отправляли людей в лес.

Знакомство с другими группами

Первую группу, которую я встретил, это была группа из 5 человек Бовкуна и группа Мосина, Масленко. Встретившись в сентябре м-це со мною, эти группы частично стали работать в нашей группе, частично самостоятельно.

Знал, что имеет группу Сарафанов, но о самостоятельной деятельности почти ничего не знаю.

В декабре месяце познакомился с группой Колесникова — Химичева. К этому периоду она представляла серьезную организацию, но с момента знакомства меня вся работа моей группы и их протекала вместе. О Валентине знал через Смольникову, лично не встречался и работу его не знаю.

Организация отряда

В средних числах ноября на квартире у Кустова Григория был собран актив организации — Васильев, Ливенцев, Старков, Елисеев, Бондарев и поднят вопрос о создании партизанского отряда и выхода его в лес. Вопрос о диверсионной работе в городе поднятый Старковым был отклонен ввиду больших репрессий к мирному населению города.

На совещании намечаем из 30—35 человек... отряда, подсчитываем имеющееся вооружение и решаем: отряд оформить, руководство до выхода взять Ливенцеву... Поручить каждому из основного состава отряда проинформировать остальных членов о скором выходе в лес, о добыче оружия, о подготовке каждого члена к жизни в лесу. А также о усилении разведки в разные места, чтобы можно было выбрать более подходящее место для выхода. После совещания в эту работу включается и группа Химичева и предлагает свои р/данные по Жлобинскому р-ну.

Дней через десять проходит еще одно совещание. Присутствуют: Ливенцев, Кустов, Стариков, Елисеев, Лепешкин, Васильев, Саша и др.

На этом совещании подводим итоги готовности к выходу и разрабатываем план самого отхода.

Оказалось готово к выходу вместе с группой Химичева более 500 человек. Р-н выбираем Жлобинский (Довск—Журавичи). Но накануне выхода из группы Мосина—Масленика поступили данные, что Октябрьский р-н представляет более лучшее место для выхода. Тогда выход в Жлобинский р-н отменяем и начинаем выводить людей в Октябрьский р-н. Местом сбора было установлено ст. Мошна по ж.-д. Бобруйск— Старушки.

В течение полумесяца по 500 розданным пропускам в отряды Губина, Храпко, Балахонова, Павловского и мой вышло 200—250 человек. Остальные вышли или позднее или вообще не вышли.

Дальнейшая работа по городу протекала через оставленных людей — Смольникову, Сашу, Семнсалова и др., которые всю свою работу связывали с работой группы Валентина.

Перечень работы неполный. Люди показаны не все в силу того, что во время работы большинство знало друг друга по кличкам и не лично.

За правдивость отвечаю, как командир Красной Армии и коммунист партии Ленина—Сталина.

Командир 1-й Бобруйской п/бригады полковник Ливенцев.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3500. Воп. 4, Спр. 100. Л. 49—54.

З ДЗЁННІКА БАЯВЫХ ДЗЕЯННЯЎ АПЕРАТЫЎНАГА АДДЗЕЛА (1а) НЯМЕЦКАЙ 203-й АХОЎНАЙ ДЫВІЗІІ ЗА ПЕРЫЯД З 1.4.1942 ПА 31.12.1942 ГОДА

244-й ландверный батальон в составе трех рот железнодорожным транспортом прибыл в Бобруйск и поступит в подчинение 613-го охранного полка.

Операция против партизан высшего начальника СС и полиции в районе севернее и северо-западнее Бобруйска завершена. В ходе операции расстреляно 200 партизан и подозрительных лиц и полностью сожжена деревня Люцина, 30 км северо-западнее Бобруйска.

24.4.1942 г. в деревне Петровичи, 12 км юго-западнее Бобруйска, ворвалась крупная партизанская банда, которая расправилась и похитила полицейских службы порядка. 613-й охранный полк перебросил одну роту 244-го ландверного батальона в деревне Брожа, 20 км юго-западнее Бобруйска, чтобы оттуда иметь возможность лучше прочесывать местность. 38 км южнее Глусска, возле деревни Бубновка, оборудованный под опорный пункт дом и 12 аналогичных амбаров сожжены.

26.4.1942. Ночью в Бобруйске подавались зеленые сигнальные ракеты.

8.5.1942. На мосту через Березину в Бобруйске партизаном выстрелом в голову убит немецкий солдат из проходящей маршевой роты.

9.5.1942. 3 км восточнее станции Ясень на железнодорожной линии Бобруйск—Минск подорвана железнодорожная колея. Движение прекращено на 24 часа.

1.6.1942. Партизанами сожжен 25-метровый мост через приток Березины, 21 км северо-западнее Бобруйска.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4683. Воп.3. Спр. 1108. Л. 99, 105, 106, 112, 121.

КЛЯТВА ЧЛЕНА БАЯВОЙ ДРУЖЫНЫ ЦЯЛУШСКАЙ ВОЛАСЦІ

Я, гр-н Советского Союза, вступая в боевую дружину, даю клятву в том, что буду точно и беспрекословно выполнять все приказы и распоряжения командования.

В случае невыполнения данной клятвы или предательства с моей стороны пусть покарает меня и всю мою семью партизанский отряд по всем строгостям военного времени.

Подпись

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3500. Воп.4. Спр. 100. Л. 226.

ЗВАРОТ ЦЯЛУШСКАГА ПАДПОЛЬНАГА КАМІТЭТА ДА ПАСТУХОЎ ЦЯЛУШСКАЙ ВОЛАСЦІ

Т.

Вы должны сохранить скот, который вы пасете, от угона немцами. Для этого вы должны сделать следующее:

1. Если будет замечено, что немцы угоняют скот из соседних деревень (хотя бы из дальних), Вы обязаны угнать скот далеко в лес и на ночь не возвращать его.

2. Заранее подготовить место для стоянки скота, если надо, то обгородить его, чтобы ночью скот не ушел в деревню.

3. Подготовить себе на несколько дней продуктов, чтобы перебыть в лесу, пока пройдет фронт.

Запомните, если Вы сохраните скот, честь и слава Вам, а если не примете мер к сохранению то будете жестоко наказаны. Письмо прочтите и уничтожьте, и об этом никто не должен знать.

Сентябрь, 1943 г.

д.Телуша.

Подпольный комитет

Верно: Техн. секретарь подп. орг.

Подпись

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3500. Воп. 4. Спр. 100. Л. 226.

ДАКЛАДНАЯ ЗАПІСКА КАМАНДЗІРА ПАРТЫЗАНСКАГА АТРАДА № 752 ЛІВЕНЦАВА В.І.

НАЧАЛЬНІКУ ЦЭНТРАЛЬНАГА ШТАБА ПАРТЫЗАНСКАГА РУХУ П.К. ПАНАМАРЭНКУ

1. В последнее время германские власти всякими методами, агитацией и облавами увозят в Германию лучшую часть населения. Народ, испытавший все прелести «нового порядка» Гитлера, на увоз смотрит как на гибель, особенно сейчас, когда Красная Армия наступает. Поэтому молодежь в массовом масштабе двинулась в леса к партизанам. Многие партизанские отряды приняли 30 и более процентов к своему составу безоружных людей. Принимать в отряды больше этой цифры большинство командиров опасается, ибо сильно отражается на боевой деятельности отрядов. Оружие поступает в отряды в очень малом количестве — по одной, две винтовки, да и те чаще без затворов. Безропотно же отдать врагу лучшую часть людского состава будет большим преступлением. Прошу на этот счет дать указания, как поступать в дальнейшем.

2. Сейчас, когда Красная Армия наступает, от нас, партизан, требуется самая напряженная, активная работа по разрушению тыла врага. Мы же этого делаем мало. Почему? Приведу основные причины:

а) Враг от открытого тыла, если можно так выразиться, перешел к защищенному и укрепленному тылу. Самые маленькие гарнизоны и те имеют дзоты, рвы. Все дороги, имеющие какое-либо значение, насыщены гарнизонами. Поэтому производить операции или диверсии с малой тратой боеприпасов, как это делали раньше, нельзя.

б) Боеприпасы и взрыввещества, оставленные Красной Армией, частью погибли, частью уничтожены врагом, частью использованы партизанами. Сейчас отыскать цинк патронов и т.п. представляет, в нашем районе особенно, большую трудность. Поэтому, прежде чем сделать то или иное дело, приходится смотреть не на нашу способность, а мы способны, а на боеприпасы.

3. При бомбежке городов согласуйте вопрос с партизанскими отрядами, стоящими вблизи этих городов. Мы всегда в курсе всяких передвижений противника и можем помочь в выборе объектов и их нахождения.

Считаю, что вопрос о боеприпасах и взрыввеществах для партизан самый больной вопрос. Центральному штабу партизанского движения надо обратить на него самое серьезное внимание. Выкидка 10 тысяч патронов и т.п. не удовлетворяет нас. Приведу пример. Для того чтобы уничтожить один эшелон, требуется тола: на остановку эшелона 10—15 кг, на взрыв паровоза и котла 10 кг, на взрыв хвоста поезда, ибо часто бывает, что в хвосте тоже паровоз, 10—15 кг, и на взрыв середины эшелона тоже такое же количество, итого 35—45 килограммов. Кроме этого, на обстрел 60—70 вагонов уходит не менее 1—2 тысяч патронов. Для партизан это колоссальная цифра.

И последнее, простите, что вмешиваюсь не в свои функции и обращаюсь непосредственно к Вам. Мне кажется, что часто истинное положение вещей не доходит до Вас.

Командир 752 партизанского отряда (подпись) (Ливенцев)

22 декабря 1942 г.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4240. Воп. 1. Спр. 1. Л. 4.

З ДАКЛАДНОЙ ЗАПІСКІ КАМІСАРА 1-Й БАБРУЙСКАЙ ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ Дз.А.ЛЯПЁШКІНА ЎПАЎНАВАЖАНАМУ ЦК КП(б)Б ПА МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ Р.Н.МАЧУЛЬСКАМУ

16.5.1943 г.

При сем высылаю деньги и облигации в сумме 8322 рубля, из них: деньгами — 3357 руб., облигациями — 4965 руб., собранные на танковую колонну имени Белорусских партизан.

Ранее собранные средства в сумме 13595 руб. отправлены 5 марта сего года уполномоченному ЦК КП(б)Б по Могилевской области т. Кардовичу.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4240. Воп. 1. Спр. 1. Л. 13.

З ПРАТАКОЛА № 17 ПАСЯДЖЭННЯ БАБРУЙСКАГА ПАДПОЛЬНАГА РАЙКОМА КП(б)Б АБ УМАЦАВАННІ МАСАВА-ПАЛІТЫЧНАЙ РАБОТЫ СЯРОД НАСЕЛЬНІЦТВА ПА АРГАНІЗАЦЫІ ПАРТЫЗАНСКАГА РУХУ Ў РАЁНЕ, ЗРЫВУ НАРЫХТОВАК ПРАДУКТАЎ НЕМЦАМІ І ПРАВЯДЗЕННІ НАРЫХТОВАК ДЛЯ ПАРТЫЗАНСКІХ АТРАДАЎ

29.7.1943 г.

Присутствовали: члены РК КП(б)Б Лемешонок, Лепешкин, Ливенцев, Кремнев; комиссары бригад №№ 36, 12, Лещеня и Теплинский.

Слушали: Об усилении работы по организации партизанского движения в Бобруйском районе, срыве немецких заготовок и проведении заготовок для партизанских отрядов.

(Докладывает Лемешонок)

Высказались: тт. Ливенцев, Лещеня, Теплинский.

Постановили: Для усиления политико-массовой работы среди населения района по организации партизанского движения, срыва немецких заготовок и проведения заготовок для партизанских отрядов, — закрепить за бригадами следующие сельсоветы и населенные пункты района:

1. Рымовецкий, Богушевский и Осовский с[ель]советы — 1-й Бобруйской бригаде.
2. Горбацевичский, Брожский, Продвинский, Малевский с[ель]советы — бригаде № 37.
3. Каменский, Телушский и Ковалевский с[ель]советы — бригаде № 12.

По заготовкам дополнительно закрепить населенные пункты бригаде № 12, обозначенные на карте каждого командира.

Предупредить комиссаров, командиров бригад и отрядов, что они персонально несут ответственность перед РК КП(б)Б за постановку и проведение политико-массовой работы среди населения, закрепленных им сельсоветов и пунктов.

Одновременно поручить комиссарам бригад организовать помощь населению со стороны партизанских отрядов по свозке и уборке урожая, а также принятию мер к его сохранности, с тем, чтобы ни один килограмм зерна не попал в руки врагу.

Разъяснить всем комиссарам и командирам бригад и отрядов, что нельзя ограничиваться проведением политико-массовой работы только в закрепленных за ними сельсоветах и пунктах, а проводить ее везде, где только бывают агитаторы и партизаны данных бригад и отрядов.

Секретарь Бобруйского подпольного районного комитета КП(б)Б Лемешонок

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4341. Воп.1. Спр. 1. Л. 32.

З ПРАТАКОЛА № 16 ПАСЯДЖЭННЯ БАБРУЙСКАГА ПАДПОЛЬНАГА РАЙКОМА КП(б)Б АБ УЗМАЦНЕННІ АГІТАЦЫЙНАЙ РАБОТЫ СЯРОД НАСЕЛЬНІЦТВА гор. БАБРУЙСКА І БАБРУЙСКАГА РАЁНА СУПРАЦЬ ПРАВОДЗІМАЙ НЕМЦАМІ ПРЫМУСОВАЙ МАБІЛІЗАЦЫІ І ВЫВАЗУ НАСЕЛЬНІЦТВА Ў ГЕРМАНІЮ

15.7.1943 г.

Слушали: Об усилении агитационной работы среди населения Бобруйского р[айо]на и города против проводимой немцами насильственной мобилизации и насильственного увоза в Германию...

(докладывает тов. Лемешонок)

Высказались: Акулич, Ливенцев, Кремнев.

Постановили: В связи с проводимой по району и городу немецкими оккупантами переписи трудоспособного населения, преследующей цель насильственной мобилизации населения, как для комплектования «добровольческой армии», так и насильственного увоза советских граждан на каторжные работы в Германию. В связи с этим усилить агитационную работу среди населения города и района по разоблачению действительной сущности гитлеровской переписи и срыву ее. Шире развернуть работу по вовлечению новых людей в действующие партизанские отряды и созданию новых партизанских отрядов. Предложить комиссарам бригад Теплинскому и Лепешкину разослать в населенные пункты района агитаторов для проведения указанной работы. Поручить редактору районной газеты тов. Кремневу в ближайшие дни выпустить листовку, разоблачающую сущность переписи, и призвать население к срыву этой мобилизации и вооруженной борьбе с фашистами. Для организации этой работы на местах считать целесообразным выход в отдельные сельсоветы членов РК КП(б)Б.

Секретарь РК КП(б)Б Лемешонок

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4341. Воп.1. Спр. 1. Л. 31.

ПАСТАНОВА

Бабруйскага падпольнага РК КП(б)Беларусі
ад 15.12.1943 г.

Об эвакуации партизанских семей в районы, освобожденные Красной Армией от фашистских захватчиков

(докл. т. Лемешонок)

ПОСТАНОВИЛИ:

Поручить члену подпольного РК КП(б)Б т. Акуличу не позднее 16-го декабря с. г. организовать эвакуацию партизанских семейств и населения из ближайших лесов, расположенных вблизи фронта, в районы, освобожденные Красной Армией от фашистских захватчиков.

Для этой цели поручить т. Дубинину выделить в распоряжение т. Акулича необходимое количество подвод и боевой взвод из истребительного отряда.

Секретарь Бобруйского подпольного
РК КП(б)Белоруссии (Лемешонок)

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4159. Воп.1. Спр. 9. Л. 24.

З ДАКЛАДНОЙ ЗАПІСКІ САКРАТАРА БАБРУЙСКАГА ПАДПОЛЬНАГА РК КП(б)Б Д.М.ЛЕМЯШОНКА САКРАТАРУ ЦК КП(б)Б П.К.ПАНАМАРЭНКУ АБ РАБОЦЕ РАЙКОМА ЗА ПЕРЫЯД З 1 КАСТРЫЧНІКА ПА 25 СНЕЖНЯ 1943 г.

не раней 25.12.1943 г.

Работа Бобруйского подпольного РК КП(б)Б за истекший период проходила в направлении выполнения решения V пленума ЦК КП(б)Б и директивы ЦК КП(б)Б от 21 сентября 1943 г. За этот период районным комитетом КП(б)Б было проведено 8 заседаний РК КП(б)Б и 17 партсобраний в первичных парторганизациях по вопросам:

а) о ходе выполнения решения ЦК КП(б)Б в отдельных партизанских отрядах

б) об активизации боевых действий бригад

в) о подготовке и проведении 26-й годовщины Великой Октябрьской социалистической революции

г) о наличии фактов мародерства по бригадам

д) об изучении доклада тов. Сталина на торжественном заседании Московского совета депутатов трудящихся 6 ноября 1943 года

е) о руководящем составе Бобруйского истребительного отряда

ж) эвакуация партизанских семей в районы, освобожденные Красной Армией от фашистских захватчиков.

Решения РК КП(б)Б по этим вопросам прилагаются.

За последнее время бригады выросли на 553 чел. Увеличилось вооружение за счет подобранных трофей ст. пулеметов — 9, ручных пулеметов — 17, винтовок — 328, автоматов — 28, личного оружия — 16.

Из числа лучших партизан и партизанок принято в члены ВКП(б) 12 человек, в кандидаты ВКП(б) — 2 чел.

Партийная организация Бобруйского подпольного РК КП(б)Б в настоящее время насчитывает:

членов ВКП(б) — 97 чел.

кандидатов ВКП(б) — 112 чел.

Подпольные первичные парторганизации вне партизанских отрядов имеются: в Телушском, Воротынском с/с, с количеством 13 членов и кандидатов партии.

Работа подпольных парторганизаций вне партизанских отрядов проходит в направлении оказания помощи партизанским отрядам, по связи, работе среди населения, по распространению газет, листовок, призывов ЦК ВКП(б), диверсионной работе.

Подпольная Телушская парторганизация создала диверсионную группу в количестве 36 человек, которая в октябре месяце с.г. вырезала подземный кабель немецкой связи на шоссе Бобруйск—Жлобин. При непосредственном участии парторганизации Телушского сельсовета разложен Телушский гарнизон «добровольцев» и приведено в партизанский отряд 76 грузин «добровольцев» с оружием.

Работа по городу за последнее время значительно улучшилась и увеличилось количество связистов, которые неплохо работают по распространению нашей литературы, а также по разведке и диверсионной работе.

Связной партизанского отряда 753 15-летний Хатько Степан (бывш. воспитанник детского дома) в этом месяце подорвал штаб немецкой части в г. Бобруйске по Чонгарской улице; убито 4 и ранено 18 фрицев. Он же взорвал склад горючего по Октябрьской улице и из немецкой автомашины, стоявшей на улице, вытащил автомат, который доставил в партизанский отряд № 753.

Связная партизанского отряда т. Щербича т. Сущинская днем в Бобруйске на Березинском форштадте толом подорвала две вражеские автомашины — одну с продовольствием, другую с боеприпасами.

В период подготовки и проведения 26-й годовщины Великой Октябрьской социалистической революции каждым партизанским отрядом были дополнительно посланы группы партизан на засады и диверсии по истреблению фашистских бандитов и как подарок к Октябрю представили следующее: спущено под откос 2 вражеских эшелона, уничтожено 4 автомашины, захвачено исправных автомашин 1. Убито немцев — 85, ранено — 15, уничтожено 5 мостов, уничтожено связи 17 км.

Нашими агитаторами проведено в населенных пунктах 173 доклада и беседы о Великой Октябрьской соц. революции. Доклад т. Сталина на торжественном заседании Московского совета депутатов трудящихся 6 ноября 1943 г.

Во всех партизанских отрядах 6 ноября с.г. были проведены торжественные собрания партизан, а 7 ноября проведены митинги, посвященные 26-й годовщине Великой Октябрьской соц. революции. За этот период райкомом выпущены 4 номера подпольной газеты «Бобруйский партизан» тиражом до 1400 экз.

29 ноября 1943 года Первая Бобруйская партизанская бригада № 7 соединилась с частями Красной Армии в районе своей дислокации в Паричском районе и по решению Военного совета 65-й армии в настоящее время расформирована.

Из бригады оставлено 106 чел. для истребительного отряда и 58 чел. для партийно-советского аппарата Бобруйского района и города.

Оставшийся народ, как подростки, женщины и дети, устраиваем в освобожденных деревнях районов.

Для связи с городом и дальнейшей диверсионно-подрывной работы, а также по спасению населения от гитлеровцев оставлена группа в Брожеских лесах, дальняя разведка и взвод истребительного отряда (в местах прежней дислокации 1-й Бобруйской партизанской бригады — Бобруйский район), а также осталось на прежнем месте дислокации 37 партизанская бригада т. Львова.

Согласно решению райкома, член РК КП(б)Б т. Акулич с группой партизан послан для эвакуации партизанских семей.

Секретарь Бобруйского подпольного
РК КП(б)Б (Лемешонок)

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4159. Воп.1. Спр. 9. Л. 12—15.

КАМСАМОЛЬЦЫ ЗАДАЮЦЬ ТОН

Паводле дакладной запіскі ўпаўнаважанага ЦК ЛКСМБ па зоне Бабруйск—Асіповічы П.Ф.ВАЛОЖЫНА ў ЦК ЛКСМБ аб рабоце камсамола і баявой дзейнасці 1-й Бабруйскай партызанскай брыгады ад 3 мая 1943 г.

Па стане на 25.5.1943 г. ў брыгадзе налічваецца 336 чалавек асабістага саставу з вялікай партыйна-камсамольскай праслойкай: членаў і кандыдатаў у члены партыі 65, членаў камсамола 121. Ва ўсіх баявых аперацыях камсамольцы прымаюць самы актыўны ўдзел, сваёй адвагай і мужнасцю вядуць за сабой партызан. Камандаванне выключна добра адклікаецца аб паводзінах камсамольцаў у баі.

Бясстрашны дыверсант, любімец атрада Павел Кажушка мае на сваім баявым рахунку 24 пушчаныя пад адхон эшалоны. Ён — член камсамольскага бюро, першы з камсамольцаў прыняты ў рады партыі, паўторна прадстаўлены да прысваення яму звання Героя Савецкага Саюза.

Такія ж бясстрашныя ў баі і кулямётчыкі Андрэй Бедаш, Аляксей Рэдзькін, Леанід Служаеў, разведчыца Марыя Вароніна, сакратар камсамольскай арганізацыі Уладзімір Комін і многія іншыя. Смерцю храбрых загінуў у баі сакратар Бабруйскага райкома камсамола Міхаіл Семісалаў. Пры гэтым характэрна, што дзяўчаты-камсамолкі не адстаюць у баі ад юнакоў.

У мужнасці і адвазе камсамольцаў я асабіста пераканаўся ў апошнім баі 7.6.1943 г. пры разгроме паліцэйскага гарнізона ў вёсцы Пратасы. Камсамольцы Комін, Вароніна, Сіліцкі і іншыя першымі падняліся і пайшлі ў атаку на дзот праціўніка, прымусілі яго змоўкнуць і першымі ўварваліся ў вёску. За імі — астатнія, і вёска была вызвалена.

У брыгадзе з членаў камсамола адзін камандзір узвода, 5 памочнікаў камандзіраў узводаў, 13 камандзіраў аддзяленняў, 7 разведчыкаў, 14 дыверсантаў. 74 камсамольцы прадстаўлены да ўрадавых узнагарод. Камсамольскія арганізацыі аператыўна рэагуюць на выпадкі недысцыплінаванасці сваіх членаў. За п'янства і парушэнне ваеннай тайны 3 камсамольцы выключаны з радоў камсамола.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 63. Воп. 5. Спр. 8. Л. 213—216.

Дакументы падрыхтаваў да друку У.І.Лемяшонак.

Вызваленне

Яшчэ ў верасні—кастрычніку 1943 г. Чырвоная Армія пачала вызваленне Беларусі. Першым 23 верасня быў вызвалены райцэнтр Камарын, а 26 верасня — г.п.Хоцімск. Усяго ў выніку асенне-зімовага наступлення 1943—1944 гадоў поўнасцю ці часткова вызвалены 36 раёнаў Беларусі, 36 раённых і 2 абласныя цэнтры — Гомель і Мазыр. Бабруйшчына чакала свайго часу да лета 1944 г., калі пачалася Беларуская аперацыя пад кодавай назвай «Багратыён» — адна з найбуйнейшых стратэгічных наступальных аперацый Чырвонай Арміі. Адзін з першых акордаў «Багратыёна» пераможна прагучаў на нашай бабруйскай зямлі.

БАБРУЙСКАЯ АПЕРАЦЫЯ

Гэта наступальная аперацыя войскаў правага крыла 1-га Беларускага фронту (камандуючы генерал арміі К.К.Ракасоўскі) праводзілася 23—29.6.1944 г. як састаўная частка Беларускай аперацыі 1944 г. У ёй удзельнічалі 3-я, 28-я, 48-я, 65-я арміі (камандучыя на той час генерал-лейтэнанты А.В.Гарбатаў, А.А.Лучынскі, П.Л.Раманенка, П.І.Батаў), конна-механізаваная група (генерал-лейтэнант І.А.Плієў), 16-я паветраная армія (генерал-палкоўнік авіяцыі С.І.Рудэнка), Дняпроўская ваенная флатылія (капітан 1-га рангу В.В.Грыгор'еў), злучэнні авіяцыі далёкага дзеяння.

Задача аперацыі — ударамі з раёна Рагачова ў напрамку Бабруйск—Асіповічы (3-я і 48-я арміі) і з раёна на поўдзень ад Парычаў у напрамку Старыя Дарогі — Слуцк (65-я, 28-я арміі і конна-механізаваная група) акружыць і разграміць бабруйскую групоўку ворага; развіць наступленне цераз Асіповічы—Пухавічы на Мінск і цераз Слуцк на Баранавічы. Савецкім войскам процістаялі 9-я нямецкая армія (10 пяхотных дывізій) і дзве дывізіі 4-й арміі. Праціўнік стварыў на бабруйскім напрамку моцную, глыбока эшаліраваную абарону, у тым ліку на рэках Дабрыца, Дабасна, Ала, Бярэзіна, і вакол Бабруйска.

24 чэрвеня войскі 65-й і 28-й армій прарва-

лі абарону праціўніка. Уведзены ў прарыў 1-ы гвардзейскі танкавы корпус (генерал-маёр М.Ф.Паноў) паглыбіўся ў напрамку Бабруйска на 20 км і выйшаў у тыл парыцкай групоўкі ворага; 25 чэрвеня ў наступленне ўведзена конна-механізаваная група, якая 26 чэрвеня выйшла ў раёне Глуска да р. Пціч і месцамі фарсіравала яе. 26 чэрвеня 65-я армія выйшла да р. Бярэзіна на поўдзень ад Бабруйска, перарэзала шашу Бабруйск—Слуцк, а 28-я армія 27 чэрвеня вызваліла Глуск і цэнтр Акцябрскага раёна в. Карпілаўку. У ноч на 27 чэрвеня 1-ы гвардзейскі танкавы корпус перарэзаў шляхі на захад і паўднёвы захад ад Бабруйска. Наступленне 3-й і 48-й армій развівалася з вялікімі цяжкасцямі. Толькі пасля магутных бомбавых удараў 16-й паветранай арміі і ўводу буйных танкавых сіл абарона немцаў была зломлена. 26 чэрвеня часці 48-й арміі вызвалілі Жлобін. Уведзены ў наступленне з раёна на поўнач ад Рагачова 9-ы танкавы корпус (камандуючы генерал-маёр Б.С.Бахараў) абышоў Бабруйск з поўдня і 27 чэрвеня злучыўся з 1-м гвардзейскім танкавым корпусам, закончыўшы акружэнне 40-тысячнай групоўкі ворага на паўднёвы ўсход ад Бабруйска і ў горадзе. Утварыўся так званы бабруйскі «кацёл».

Ліквідацыю групоўкі нямецкіх войскаў, якая трапіла ў «кацёл», праводзілі 48-я і 65-я арміі. Важнейшая асаблівасць гэтай аперацыі — масіраванае выкарыстанне авіяцыі фронту: 525 самалётаў 16-й паветранай арміі паўтары гадзіны групамі наносілі ўдары па ворагу, які рыхтаваў прарыў, прычынілі яму значныя страты. Групоўка ворага была рассеяна. 28 чэрвеня савецкія войскі закончылі ліквідацыю акружанага праціўніка. З раёна

Бабруйска пяцітысячнай групоўцы ворага ўдалося прарвацца ў напрамку да Асіповіч, але і яна была ўзята ў палон. 29 чэрвеня быў вызвалены Бабруйск.

Савецкія воіны пераадольваюць лясіста-балоцістую мясцовасць у раёне Бабруйска.

Гітлераўцы, узятыя ў палон пад Бабруйскам. Чэрвень 1944 г.

У час аперацыі актыўна дзейнічала Дняпроўская ваенная флатылія: падтрымлівала агнём сухапутныя войскі, перапраўляла байцоў і тэхніку цераз Бярэзіну. Савецкім воінам памагалі партызаны: захоплівалі пераправы, вялі разведку ў тыле ворага, удзельнічалі ў баях. У ходзе аперацыі разбіты галоўныя сілы 9-й нямецкай арміі, ліквідавана бабруйская групоўка ворага (знішчана каля 50 тыс., узята ў палон больш за 23 тыс. нямецкіх салдат і афіцэраў, падбіта і захоплена 366 танкаў, больш за 5 тыс. гармат і мінамётаў, каля 16 тыс. аўтамашын і інш.): стварыліся спрыяльныя ўмовы для наступлення на Мінск і Баранавічы.

За вызваленне Бабруйска ў ходзе гэтай аперацыі загадам ВГК ад 5.7.1944 г. ганаровыя найменні «Бабруйскіх» прысвоены 20 часцям і злучэнням 3-й, 48-й, 65-й і 16-й паветранай армій і Дняпроўскай ваеннай флатыліі 1-га Беларускага фронту. У іх ліку: 9-ы танкавы корпус (генерал-маёр Б.С.Бахараў), 3-і бамбардзіровачны авіяцыйны корпус (генерал-маёр А.З.Каравецкі), 8-ы знішчальны

Воіны 65-й арміі ўваходзяць у вызвалены Бабруйск.

авіяцыйны корпус (генерал-лейтэнант А.С.Асіпенка), 17-я (падпалкоўнік А.П.Лукін), 108-я (генерал-маёр П.А.Церамаў), 137-я (генерал-маёр Ф.М.Жабрэеў), 250-я (генерал-маёр І.В.Мохін), 348-я (генерал-маёр Н.А.Нікіцін) стралковыя дывізіі, 8-я мотастралковая брыгада (падпалкоўнік П.І.Трушкін), 115-я асобная стралковая брыгада (палкоўнік А.М.Волкаў), 95-я (палкоўнік А.І.Кузняцоў) і 108-я (падпалкоўнік В.Н.Баранюк) танкавыя брыгады, 1-я брыгада рачных караблёў (капітан 2-га рангу С.М.Лялько), 42-і асобны танкавы полк (падпалкоўнік С.І.Тыдаман), 922-і (падпалкоўнік А.В.Сакалоў) і 1897-ы (падпалкоўнік М.П.Рыжанаў) самаходныя артылерыйскія палкі, 311-ы (палкоўнік І.Дз.Мяркулаў) і 313-ы (падпалкоўнік Дз.Н.Арлоў) гвардзейскія мінамётныя палкі, 66-ы асобны полк сувязі (падпалкоўнік Б.П.Жукаў), 2-гі гвардзейскі дывізіён бранякатэраў (капітан 3-га рангу А.І.Пяскоў).

Войскам, якія ўдзельнічалі ў баях за вызваленне Бабруйска, загадам ВГК ад 29.6.1944 г. аб'яўлена падзяка, у Маскве дадзены салют 20 артылерыйскімі залпамі з 224 гармат. *Р.М.Шавяла, М.І.Камінскі.*

Друкуецца па кн.: Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941—1945: Энцыкл. Мн., 1990. С. 51—53.

Дакументы сведчаць...

З ДЫРЭКТЫВЫ СТАЎКІ ВЯРХОЎНАГА ГАЛОЎНАКАМАНДАВАННЯ АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ І ПРАВЯДЗЕННІ АПЕРАЦЫІ ПА РАЗГРОМЕ БАБРУЙСКАЙ ГРУПОЎКІ ПРАЦІЎНІКА

Командующему войсками 1-го Белорусского фронта

31.5.1944 г.

Ставка Верховного Главнокомандования приказывает:

1. Подготовить и провести операцию с целью разгромить бобруйскую группировку противника и выйти главными силами в район Осиповичи, Пуховичи, Слуцк, для чего прорвать оборону противника, нанося два удара: один — силами 3 и 48 армий из района Рогачев в общем направлении на Бобруйск, Осиповичи и другой — силами 65 и 28 армий из района нижнего течения р. Березина, Озаричи в общем направлении на Стар. Дороги, Слуцк.

Ближайшая задача — разбить бобруйскую группировку противника и овладеть районом Бобруйск, Глуша, Глуск, причем частью сил на своем правом фланге содействовать войскам 2 Белорусского фронта в разгроме могилевской группировки противника. В дальнейшем развивать наступление с целью выхода в район Пуховичи, Слуцк, Осиповичи...

Ставка Верховного Главнокомандования
И.Сталин

Жуков

Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі. Ф. 233. Воп. 2356. Спр. 26. Л. 57, 58.

З ПЛАНА БАБРУЙСКАЙ НАСТУПАЛЬНАЙ АПЕРАЦЫІ ВОЙСКАЎ 3-й, 48-й, 65-й і 28-й АРМІЙ 1-га БЕЛАРУСКАГА ФРОНТУ

I. До одиннадцати пд (267, 260, 727 пп 707, 134, 296, 6, 383, 45, 36, 35, 129, 292 пд) противника, усиленные двумя полками артиллерии РГК, восемью отдельными артдивизионами РГК, одним минометным батальоном и четырьмя дивизионами штурмовых орудий, прочно закрепились и обороняют рубеж: Лудчица, Гута, Романятская, Хомичи, Литовичи, Ректа, Озеране, Роговой, Веричев, Костяшево, Задрутье, западный берег р. Днепр до южной окраины Проскурин, Ниры, северная часть Мормаль, Бродки, Залужье, выс. 141,7 , Гряда, Здудичи, Поганцы, Радин, Петровичи, Гороховичи, Колки, Белка, западный берег р.Птичь до Припяти.

Резервы противника в районах:

а) 20 тд — Пацева Слобода, Павловичи, Борчицы;

б) 390 уч, пд и 7 пп дивизии «Норд» — Пуховичи, Талька, Осиповичи.

II. Цель наступательной операции — разгромить Бобруйскую группировку противника и главными силами правофланговых армий выйти на фронт: Хомичи, Виленки, Новгородск, Селище, Маковье, Юзофин, Игнацовка, Красное, ст.Мирадино, Баневка, Глуша, Жолвинец,

8. Зак. 311.

м.Глуск, Ново-Андреевка, Заельница, Лясковичи, Елище, Бубновка, Хойно, восточный берег р. Птичь до р. Припять.

В дальнейшем развивать успех двумя ударными группами в направлениях:

а) Осиповичи, с поворотом части сил 3 армии из р-на м. Свислочь по западному берегу р. Березина на Березино.

б) Старые Дороги, Слуцк...

...IV. Состав армий и их задачи по рубежам.

3 армия в составе пяти ск (35, 40, 41, 46 и 80), тринадцати сд, 9 тк, 36, 193 и 223 тп, 8 сабр, 340 и 341 гв. сап, 35 гв. мбр, 41 ибр, 44 ибр, 1091 пап, 295 пап, 16 мбр (5 гмд), 122 брбм, 124 брбм, 120 иптап, 1071 иптап, 283 ад, 37, 56, 94, 313 гмп, 40 птрой (1 ш исбр), 7 понт бр, 48 понт б, и 8 арм. шисбр.

Задача армии — одним стрелковым корпусом (три сд) с одной иптабр и одним полком самоходной артиллерии ИСУ — 122 упорно оборонять рубеж: Янов, Староселье, раз № 15, вост.окр. Хомичи. Главными силами армии со всеми средствами усиления прорвать фронт обороны противника на участке: Озераны, иск. Костяшово и к исходу первого дня операции овладеть рубежом—Озераны, Фалевичи, Новоселки, Ивановка. В дальнейшем, введя в бой 9 тк и развивая удар в общем направлении на Бобруйск и обеспечивая свой правый фланг от контратак противника с севера и северо-запада, овладеть рубежами:

а) 2 день операции — Литовичи, Бол. Крушиновка, пос. Добротин, Харламовичи, свх Жиличи, Найдебковичи, Смольное Круповье, 9 тк овладеть р-ном Бортники и захватить переправы через р. Ола.

б) 4-й день операции — Лнтовичи, Перерост, Барчица, Забелье, Павловичи, Юзефин, Бортники, Бирча.

в) 7-й день операции — Подселы, Виленки, Новгородок, Кличев, Пацева Слобода, Козуличи, Махровичи, Гута, искл. Титовка.

г) 9-й день операции — Новгородок, Новоселки, Селище, Рудия, Маковье, Заречье, восточный берег Ольса до р. Березина.

В дальнейшем прочно закрепиться на занимаемом рубеже от р. Днепр до р. Ольса, левым флангом армии продолжать наступление в общем направлении на м. Свислочь.

Быть готовым оказать частью сил содействие наступающим войскам правого соседа (50 А).

48 армия в составе трех ск (42, 29, 53), девять стрелковых дивизий, 115 УР, 42, 231 тп, 22 ад РГК, 133 ад, 68 армии пабр, 6 и 84 гмп, 4 тмпп, 104 понт б, 57 армии исбр.

Задача армии — двумя стрелковыми корпусами (один — трехдивиз. состава и один — двух-) со всеми средствами усиления форсировать р. Друть с задачей — прорвать оборону противника на участке Костяшово, Колосы, и к исходу первого дня операции овладеть рубежом Бронное, Ясеновка, Колотовка, Николаевка.

В дальнейшем частью сил ударом в южном направлении продолжать свертывание боевых порядков противника на западном берегу р. Днепр, главными силами ударной группы армии развивать успех в общем направлении на Репки, Турки, Бобруйск и овладеть рубежами;

а) 2-й день операции иск. Сл. Лисковская, Равенство, Елки, Миньков, Ст.Мазлов, Лучин.

б) 4-й день операции: иск. Бортники, Турки, Воротынь, Коврин, Пристань, Кадище, Рудня мал., Жлобин.

в) 7-й день: Титовка, восточный берег р. Березина до Бешков.

г) 8-й день операции: форсировать р. Березина на участке Селиба, Королевская Слобода-2, ударом с юга, юго-запада и запада овладеть городом Бобруйск и выйти на фронт — Бобруйск — Грибово, Сулево.

д) 9-й день операции: главными силами армии выйти на рубеж: р.Волчанка, на участке — Красное, ст.Мнрадино, иск. Богушевка.

В дальнейшем всеми силами армии развивать успех в общем направлении на Осиповичи, Пуховичи.

Одним стрелковым корпусом в составе четырех стрелковых дивизий и 115 УР в первый день операции огнем всех видов и действиями отдельных отрядов сковать противника.

В дальнейшем, с начала отхода противника, всеми силами и средствами, действующими на этом участке фронта, перейти в наступление в общем направлении на м.Щедрин.

65 армия в составе двух ск (18 и 105), восемь стрелковых дивизий и 115 сбр., 1 кгв. ДТК, 251 тп, 345 и 354 сап. 26 ад, 30 гв. и 157 пабр, 3 ибр, 315 и 317 бадом, 22 и 23 мбр (51 гмд), 3 гв. зад, 43, 92 и 311 гмп, 147 арм. пабр, 6 и 8 шнсб (2 шисбр), 2 и 56 из (1 гв. иброн, 14 арм. исбр).

Задачи армии:

Главными силами армии со всеми средствами усиления прорвать фронт обороны противника на участке: Радин, Петровичи, иск. Чернявка и к исходу первого дня операции овладеть

рубежом: Ур. Мох, Хвощи, Грабчи, Селище, Забродки, Черния, Заблужье, Секунчи, Садки.

В дальнейшем развивать удар в общем направлении — Гомза, Круки, Макаровичи, Глуша, овладеть рубежом...

28 армия в составе три ск (3 гв., 20 и 128), девять сд, 161, 119, 153 УР, 30 гв. тп 347 гв. сап, 4 акп (5 и 12 ад), 2 гв. зад, 377 арм. пап, 62 и 316 гмп, 9 и 10 шисб, 516 огнемп, 166 атраи (2 шисбр), 36 арм. нсбр.

Задача: главными силами армии со всеми средствами усиления прорвать фронт обороны противника на участке: Чернявка, отм. 140,6 (3 км юго-западнее Пружинище) и к исходу первого дня операции овладеть рубежом: иск. Залесье, Бернаш, Тремля, Микуль, Городок, Бельки, Замошье.

В дальнейшем, развивая удар правым флангом в общем направлении — Монсеевка, Зеленковичи, м. Глуск, овладеть рубежами...

... развивать удар в общем направлении м. Глуск, Ст. Дороги.

Конно-механизированная группа в составе 4 гв. кк и 1 гв. мк под командованием командира 4 гв. кк быть готовой к ходу в прорыв на участке 28 и 68 армий с задачей выхода в р-н Глуша, Симоновичи, 1-е Горное, Маковичи, М.Городок.

В дальнейшем иметь в виду действия в тыл Бобруйской группировке противника или в направлениях — Осиповичи, Ст. Дороги, Слуцк.

16 ВА в составе 6 иак, 4 шак, 8 иак, 3 бак, 6 сак, 286, 282, 1 гв. и 283 пад, 2 гв., 299, 300 шдд, 271 ночн. бомбардировочная дивизия.

Ком. 16 ВА с началом операции и на всем протяжении ее ведения обеспечить господство в воздухе силами:

на Бобруйском направлении — 6 иак,

на Глусском -»- — 8 иак.

К началу операции в наступающих частях иметь запасы:

а) боеприпасов всех видов — четыре б/к,

б) горючесмазочных материалов — для колесных машин — 5 заправок, для гусеничных машин — 5 заправок.

в) продфуража — 15—20 суток.

Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі. Ф. 233, воп. 2356. Спр. 256. Л. 223, 225—228.

Подготовка Бобруйской операции началась с 5 мая 44 г., и в течение мая и июня были произведены скрытно от противника сосредоточение сил и средств, которые значительно превосходили силы и средства противника на выбранном направлении для главного удара.

24.6.44 г. после мощной артиллерийской и авиаподготовки, правое крыло войск фронта в составе 3, 48, 65 и 28 армий прорвало сильно укрепленную оборону противника. Войска перешли в решительное наступление в направлении на Бобруйск и, преодолевая сопротивление противника в трудных условиях лесисто-болотистой местности, форсировании реки Днепр, Березина, Друть, Случь и, обойдя с севера и юго-запада Бобруйск, окружили и уничтожили Бобруйскую группировку противника.

В результате 6-дневных напряженных боев на Бобруйском направлении войска фронта разгромили основные силы 9 армии генерал-полковника Иордана: 35 ак (генерал-лейтенант Лютцов), 41 тк (генерал артиллерии Вейдлинг) в составе 134, 296, 6, 383, 45, 36, 35 и 129 пд, 41, 62 ап РГК, 1/41 ап РГК, 445, 709, 991 адпк, 667 дивизион штурмовых орудий, 561, 665 противотанковых дивизионов, 15 и 19 минометных батальонов РТК.

Нанесены значительные потери 55 ак (292 и 102 пд), 36, 69, 71 ап РГК, 422, 749, 849 и 858 ап РГК, 2 дивизиону штурмовых орудий, 475 танково-истребительному батальону, 663 противотанковому дивизиону РГК и 55 минометному батальону РГК.

При этом уничтожено:

танков и самоходных орудий	— 248,	солдат и офицеров	— 63100,
орудий разных калибров	— 1385,	За это войсками 1 БФ захвачено:	
минометов	— 1487,	солдат и офицеров	— 23680,
пулеметов	— 3850,	танков	— 154,
винтовок	более 20000,	орудий разного калибра	— 1561,
метательных аппаратов	— 150,	минометов	— 978,
автомашин	— 8435,	пулеметов	— 4420,
повозок с грузом	— 3240,	винтовок и автоматов	более 25000,
тягачей и вездеходов	— 60,	автомашин	— 7610,
мотоциклов	— 200,	повозок с различным грузом	— 5210,
складов с разным имуществом	— 182,	речных катеров	— 10,
лошадей	— 3650,	барж с боеприпасами	— 5,
раций	— 115,	лошадей	— 11756,
самолетов	— 48,	паровозов	— 7,

эшелонов с боеприпасами и др. имуществом	— 36,	складов с боеприпасами, вооружением,	
радиостанций	— 134,	снаряжением и продовольствием	— 305,
телефонных аппаратов	— 480.	подвижных автомастерских	— 64.

В итоге наступательных боев с 24 по 30 июня 44 г. войска фронта освободили от немецких захватчиков 15 500 кв. км территории, более 4500 населенных пунктов, в том числе города: Бобруйск, Жлобин, Паричи, Карпиновка, Осиповичи, Глусск, Любань, Старые Дороги, Кричев, м. Щедрин, м. Свислочь, Ясень, Уречье, Слуцк, и к 1 июля, продолжая успешное наступление в северо-западном направлении, закончили ликвидацию окружной группировки противника в районе северо-западнее Бобруйска.

Одновременно войска 1 БФ с половины июня приступили к подготовке наступления на левом крыле фронта силами 61, 70, 47, 8 кв., 2 танковой и 69 армий.

Началу Бобруйской операции предшествовала значительная всесторонняя подготовка.

1. Упорной работой всех видов разведки, дополняемой данными партизан, была в полной мере вскрыта группировка противника и система его обороны.

2. Усиленная боевая подготовка войск с учетом предстоящих боевых задач; подготовка штабов по вопросам организации и управления войсками при прорыве обороны противника и последующем развитии наступления.

3. Скрытое сосредоточение подавляюще превосходящих сил и средств на направлении главного удара, обеспечивающее внезапность и сокрушительную силу удара.

4. Тщательная организация боя, взаимодействия во всех звеньях — от армии до батальона, роты. Наряду со всесторонней подготовкой, успех Бобруйской операции был обеспечен решительными действиями всех родов войск: неотступным преследованием противника, смелыми маневрами по флангам и тылу противника, дезорганизованным управлением его войсками, окружением и уничтожением групп противника по частям.

Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Рассійскай Федэрацыі. Ф. 233. Воп. 2356. Спр. 265. Л. 202, 203.

Окруженная в г. Бобруйске группировка противника имела численность до 40 000 человек и состояла из остатков разбитых частей 35, 36, 45, 296, 134, 6, 383, пд, 20 тд, 18 зенитной дивизии, 511 полка связи 9 армии, 889 охранного батальона, 47 саперного батальона РГК, 1-го саперного батальона, 35 ак, 726, 728, 729 охранных батальонов 707 охранной дивизии, 551 транспортного батальона, 149 мостового батальона, 1008 ж.д. охранного батальона, 5 противотанкового дивизиона РГК, 850 тяжелого дивизиона РГК, 428 отдельного дивизиона РГК, 1/69 ап РГК, 75 ап РГК и др. частей и тыловых учреждений.

В 1.30 29.6.44 г. после короткого массированного артиллерийско-минометного налета при поддержке ночной авиации противник общей численностью 10—15 тыс. человек с 30 танками и 12 самоходными орудиями перешел в контрнаступление на всем участке фронта 356 сд, которая, замыкая кольцо окружения с северо-запада, занимала положение — 2 км юго-восточнее Череп и далее по южной окраине Курлянчики — фронтом на юго-восток.

Одновременно значительные силы окруженной группировки противника перешли в контрнаступление в направлениях Курлянчики—Назаровка—Щатково; свх (Огород)—Брусенко, Еловики—Сычково, вдоль ж.д. на Мирадино.

Первая атака противника была отбита огнем орудий прямой наводкой 356 сд. На прямую наводку при ширине фронта, занимаемого дивизией 3,5—4 км было поставлено 57 орудий (76 мм ДА — 12, 76 мм ПА — 9, 45 мм — 36).

В 2.00 29.6.44 г. после вторичной, более яростной контратаки противнику ценой больших потерь удалось вклиниться в район, занимаемый 1181 и 1183 сп 356 сд. Однако массированным огнем артиллерии была отбита и вторая контратака и положение частей восстановлено.

В 8.00 29.6. противник силой до 10 тыс. пехоты в третий раз контратаковал части 356 сд. Противнику, ценой больших потерь, удалось расчленить боевые порядки дивизии, и небольшая группа до 1500 чел. прорвалась в северном направлении по дороге вдоль р. Березина на Щатково. (Впоследствии эта группа была уничтожена частями 69 сд в лесах северо-восточнее Осиповичи.)

Другая большая группа противника (до 8—9 тыс. чел.), продолжая контратаки, потеснила части 356 сд и, пройдя Сычково, рассеялась в лесных массивах южнее Восход, Сычково. (Эти прорвавшиеся, разрозненные группы противника впоследствии были уничтожены частями 356 сд и 1 мсбр.).

В боях 29.6.44 г. 356 сд уничтожила несколько тысяч солдат и офицеров противника, подбила 4 самоходных орудия, 10 танков и более 150 машин и бронетранспортеров. Захвачено—51 машина, 200 лошадей и 2 армейских склада.

Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі. Ф. 233. Воп. 2356. Спр. 256. Л. 180, 181.

БАЯВОЕ ДАНЯСЕННЕ 383-Й НЯМЕЦКАЙ ПЯХОТНАЙ ДЫВІЗІІ ЗА ПЕРЫЯД З 24 ЧЭРВЕНЯ ПА 3 ЛІПЕНЯ 1944 Г.

Лейтэнант, барон фон Борх, камендант штаб-кватэры былой 383-й пяхотнай дывізіі
Пераклад з нямецкай мовы.
Гумбінен, 31.7.1944 г.

Пасля інтэнсіўнай перападрыхтоўкі і ўкамплектавання асабовым складам 383-я пяхотная дывізія займала да 1 студзеня 1944 г. ўчастак паміж в. Нівы (8 км на поўдзень ад Жлобіна) і р. Ала. Левы фланг прымыкаў да пазіцый 6-й пяхотнай дывізіі, правы — да пазіцый 45-й пяхотнай дывізіі. У пачатку месяца праціўнік пачаў інтэнсіўныя атакі на нашы пазіцыі. На поўнач ад Рагачова на ўчастку, які займала 134-я пяхотная дывізія, і на поўдзень ад горада на ўчастках 35-й і 36-й пяхотных дывізій праціўнік узмоцненымі танкавымі падраздзяленнямі на шырокім участку прарваў фронт і рушыў на захад. Пасля адыходу часткі сіл на Бабруйск праціўнік заняў апорныя пункты на дарогах і масты, пагражаў адрэзаць 35-ы і 41-ы карпусы.

У ноч на 25.6. праціўнік зрабіў авіяцыйны налёт і скінуў каля 500 бомбаў на раён размяшчэння артылерыйскіх пазіцый. Сярод ночы рускія сіламі батальёна атакавалі пазіцыі 532-га грэнадзёрскага палка, але контратакай былі адкінуты з вялікімі для сябе стратамі. 383-і фузілерны батальён і некалькі рот на грузавых аўтамашынах былі накіраваны для падтрымкі 134-й пяхотнай дывізіі. Гэта дало магчымасць утрымацца на занятых пазіцыях. Маёр Рудат, камендант умацаванага раёна Ніва, быў забіты разрывам міны.

25.6.44 г.

1-ы батальён 531-га грэнадзёрскага палка быў пакінуты ў Бабруйску для прыкрыцця горада з захаду. Батальён 533-га грэнадзёрскага палка, які меў такую ж задачу, пры пераходзе праз р. Бярэзіну быў рассеяны праціўнікам. З прычыны непазбежнасці адыходу корпуса быў аддадзены загад стварыць за 8 км на захад ад горада новы камандны пункт. У 22.00 генерал Гофмайстар загадаў пачаць адыход, каб да сярэдзіны ночы дывізія змагла заняць пазіцыі. Камандны пункт дывізіі быў створаны ў Вілах.

26.6.44.

Адыход праходзіў без процідзеяння з боку праціўніка. У другой палове дня дывізія адцягнулася назад да Бабруйска, а 533-і грэнадзёрскі полк без аднаго батальёна застаўся для аховы пазіцый. Дывізія павінна была абараняць Бабруйск з поўдня і захаду, куды праціўнік падышоў галаўнымі падраздзяленнямі. Каля 18.00 рускія невялікімі танкавымі падраздзяленнямі і пяхотай на аўтамашынах перарэзалі чугуначную лінію на Магілёў. Масты праз р. Бярэзіну былі забіты палаючымі аўтамашынамі. Выкарыстоўваючы гэта і тое, што мясцовасць па абодва бакі дарогі ўяўляла сабой балоцістую нізіну і выключала магчымасць манеўру, праціўнік на працягу 5 гадзін без перарыву вёў налёты штурмавой авіяцыяй, пераважна амерыканскімі самалётамі, якія бартавой зброяй нанеслі дывізіі вялікія страты ў жывой сіле і тэхніцы. Дарога была так завалена палаючай тэхнікай і забітымі конямі, што нават баяздольныя падраздзяленні не змаглі прарвацца ў галаву калоны. Абарона адсутнічала поўнасцю. Акружэнне было завершана. Загад аб адступленні паступіў надта позна, каб прадухіліць катастрофу.

Генерал Хофмайстар аддаў загад па 41-м танкавым корпусе, паводле якога генерал Вейндлінг стаў камандаваць арміяй замест знятага генерала Іардана. Оберст Цірхольд быў прызначаны камандзірам 383-й пяхотнай дывізіі. Ноч прайшла параўнальна спакойна.

27.6.1944.

Праціўнік абрушыў моцны артылерыйскі агонь на прадмесце горада і арганізаваў на асобных участках атакі пяхотай сілай да роты. Ва ўзаемадзеянні з ахоўнымі часцямі генерала Гамана, каменданта Бабруйска, наступленне праціўніка часткова было прыпынена. Пад камандаваннем генерала фон Лютцава, камандзіра 35-га армейскага корпуса, і оберста Ютнера спрабавалі прарвацца з раёна Цітаўкі. Панёсшы вялікія страты, часова ўдалося захапіць мост, што дазволіла перавезці амаль усе аўтамашыны і цяжкую зброю. Частка абозаў і тылавых часцей пераправілася цераз Бярэзіну (на поўдзень і поўнач ад Бабруйска),частка — праз чыгуначны мост. У другой палове дня ў горадзе сабралася каля 30 000 чалавек у асноўным без зброі і напаўраздзетых. Уцалела некалькі гармат, штурмавых гармат процітанкавых пушак, аўтамашын для раненых і да 200 коней. Становішча з прадуктамі і вадой дрэннае. Былі забіты маёр Хольцамер з 383-га пяхотнага палка і гаўптман Клуге, камандзір 383-га самакатнага батальёна. Увечары быў атрыманы загад, паводле якога 383-я пяхотная дывізія разам з часцямі генерала Гамана павінна была ўтрымаць Бабруйск, каб прыкрыць адыход астатніх часцей. Камандны пункт дывізіі з надыходам ночы быў пераведзены ў цэнтр горада ў памяшканне ортскамендатуры. Увесь дзень працягваліся налёты авіяцыі, якія наносілі значныя страты.

28.6.44.

Ноччу праціўнік узмацніў націск і вымусіў нашы падраздзяленні адступіць у прадмесце горада. Выкарыстоўваючы фосфарныя сродкі, праціўнік падпаліў дамы, і цяпер горад гарыць у некалькіх месцах. Асабовы склад падраздзяленняў знаходзіцца ў падвалах, якія слаба засцерагаюць ад агню. У прадмесцях горада паказаліся танкі праціўніка. Працягваліся налёты авіяцыі. Побач з гэтым дэмаралізуючым уздзеяннем праціўнік падверг горад інтэнсіўнаму артылерыйскаму абстрэлу з «кацюш», колькасць раненых і забітых павялічылася. У калодзежах больш няма вады. Прайшла чутка, што будзе зроблена спроба прарыву. У сувязі з гэтым настрой у часцях прыўзняты. Вакол нашай дывізіі пачалі канцэнтравацца астаткі часцей 6-й, 36-й, 45-й, 134-й, 296-й, 707-й пяхотных дывізій, 20-й танкавай дывізіі.

Каля 21.00 у бункеры штаба дывізіі адбылася нарада, дзе было абвешчана, што прарыў пачнецца ноччу ўсімі часцямі адначасова ўздоўж ракі Бярэзіна на поўнач, паколькі праціўнік прарваўся ў глыб нашых пазіцый і знаходзіцца пад Мінскам. Абарона Бабруйска ў дадзеным выпадку не мае сэнсу. Коней пакінулі толькі па тры на роту. Лёгка раненыя ішлі ў калоне. Сувязь з часцямі, што засталіся для прыкрыцця, ажыццяўлялася цераз пасыльных.

29.6.44.

Каля 01.00 пачаўся адыход нашых часцей. Агонь праціўніка крыху сціх. На супраціўленне часці наткнуліся каля Назараўкі. Каля Назараўкі і Лукі праціўнік спрабаваў акружыць маршавую групу. Паміж Лукамі і Шчаткавам ён стварыў заслон з 10—12 танкаў, якія разам з добра ўзброенай пяхотай і моцнымі партызанскімі групамі нанеслі нашым падраздзяленням вялікія страты ў жывой сіле і тэхніцы. Генерал Гаман быў забіты*.

Апошнія гарматы дывізіі пасля таго, як скончыліся боепрыпасы, былі ўзарваны пад камандаваннем гаўптмана Хесэ. Процітанкавымі пушкамі і гранатамётамі былі знішчаны 3—4 танкі праціўніка.

Да вечара часці дывізіі сабраліся ў лясным масіве злева ад чыгункі за некалькі соцень метраў ад моста цераз Ваўчанку. Падраздзяленні былі знясілены да крайнасці, шмат раненых. Становішча пагаршала спёка 35—36°. У Русальянцы быў абсталяваны зборны пункт для раненых, колькасць якіх на 21.00 дасягнула 400 чалавек. У хуткім часе зборны пункт для раненых і масты былі абстраляны агнём з танкавых пушак. Паявілася падазрэнне, што вядзеннем агню кіравалі разведчыкі, якія ўкараніліся ў нашы баявыя парадкі. На кароткі час узнікла паніка, але камандаванне паспела авалодаць ініцыятывай. Масты праз Ваўчанку былі ўзарваны. Пры абароне быў забіты Оберст Ютнер.

З надыходам цемнаты становішча зноў абвастрылася. Зноў з'явілася слова «здрадніцтва». Усе намеры нашага камандавання зводзіліся на нішто дзейнасцю агентаў. Яны пад выглядам перабежчыкаў, часта ў афіцэрскай форме, распаўсюджвалі фальшывыя загады і паролі сярод падраздзяленняў дывізіі. У часцях прайшлі чуткі, што Германія выкарыстоўвае ФАУ-2, а нямецкія часці павінны былі высадзіцца ў Англіі. Вялікія клопаты прычынялі кулямётныя чэргі і светлавыя сігналы, якія падавалі стралкі на дрэвах — «кукушкі». Сярод ночы ў падраздзяленнях пашырылася апатыя.

30.6.1944.

Раніцай дывізія прадоўжыла рух. Камандаванне атрымала звесткі, што праціўнік танкавымі і штурмавымі гарматамі, уключаючы пяхоту, працягвае праследаванне і заняў населеныя пункты Слабада і Свіслач. Пры гэтым за мастамі цераз Свіслач паставіў штурмавыя гарматы. Такім чынам, узнікла небяспека нашага акружэння на абмежаваным участку. Пад камандаваннем гаўптмана Шарфа і гаўптмана Вертэнса частка грэнадзёрскага палка стварыла лінію ўмацаванняў у напрамку на паўднёвы захад. Усе нашы спробы прарвацца ўздоўж дарогі былі падаўлены агнём з боку Слабады і Свіслачы. Нам удалося прарвацца толькі цераз адзін мост, але населены пункт не быў узяты, бо не было падтрымкі агнём з нашага боку. Цяжкі марш на 60 км і спёка падарвалі жыццяўстойлівасць нашых падраздзяленняў. Адчувалася нястача ў харчах і боепрыпасах. Немагчыма было забяспечыць належны догляд раненых. Кіраванне войскамі з-за недахопу сродкаў сувязі стала немагчымым. У другой палове дня падраздзяленні дывізіі сабраліся ў лясным масіве на паўднёвы захад ад Свіслачы каля Малінаўкі. Тут апошні раз было праведзена дакамплектаванне падраздзяленняў афіцэрамі, якія выжылі, узбраеннем.

Увечары праціўнік абрушыў моцны артылерыйскі агонь на месца збору дывізіі. Многія афіцэры аператыўнага штаба былі забіты ці трапілі ў палон. Падраздзяленні, якія засталіся, у поўнай цемры і ў беспарадку пачалі адыход уздоўж ракі Свіслач у напрамку на Усціж. Мэты і намеры заставаліся незразумелымі, усё рабілася інстынктыўна.

---

* Аўтар прыводзіць памылковыя звесткі. Генералу Гаману з групай салдат і афіцэраў удалося вырвацца з горада, і ён быў узяты ў палон на паўночны захад ад Бабруйска, асуджаны савецкім судом як ваенны злачынец да пакарання смерцю.

1.7.44.

Раніцай за 3 км ад Усціжа пярэдняя калона наткнулася на супраціўленне праціўніка, які стварыў на дарогах завалы з бярвёнаў, выкапаў шмат стралковых ячэек. На працягу ночы мноства вялікіх і малых груп спрабавалі пераправіцца цераз Свіслач. Частка з іх трапіла ў рукі партызан і была знішчана, а частка пачала прарывацца на Усціж. Страты былі вельмі вялікія. Шмат афіцэраў было забіта снайперамі. Тыя, хто застаўся жывы, сфарміравалі маршавую групу да 2000 чалавек і, ледзь не трапіўшы ў палон, нечакана злучыліся з 12-й танкавай дывізіяй каля моста цераз Свіслач паблізу Стараселля.

2.7.44.

Ад Пагарэлага нашы падраздзяленні працягвалі рухацца, нягледзячы на тое, што праціўнік пагражаў нашым флангам. За гэты і наступны дзень мы выйшлі да чыгункі на Мінск каля Мар'інай Горкі і рухаліся далей на захад. Раненыя былі адпраўлены на Ваўкавыск, Беласток і Варшаву. Асабовы склад груп паступіў у распараджэнне штабоў.

(Подпіс неразборлівы).

Лейтэнант

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 1020. С. 126—132.

З ДАНЯСЕННЯ 383-Й НЯМЕЦКАЙ ПЯХОТНАЙ ДЫВІЗІІ ПРА ЯЕ ЎДЗЕЛ У БАЯХ У РАЁНЕ БАБРУЙСКА

Пераклад з нямецкай мовы

Рудальштадт. 10.9.1944 г.

5. У ноч на 26.6.44 г. дывізія адступіла ў паўночна-заходнім напрамку ў раён Цітаўка — Бабруйск. 533-ці грэнадзёрскі полк (без аднаго батальёна) быў прыдадзены 45-й пяхотнай дывізіі і заставаўся як ар'ергард на старых пазіцыях. Камандны пункт дывізіі размяшчаўся ў лясным лагеры на захад ад Бабруйска.

29.6.44 г. у 1.30 прарыў з бабруйскага «катла». З гэтага часу хаатычнае адступленне, раздзяліўшыся на баявыя групы.

6. 24.6.1944 г. на дапамогу дывізіі на аўтамашынах былі падкінуты 383-ці батальён аўтаматчыкаў і некалькі грэнадзёрскіх рот. Дывізія сфарміравала роты баявой гатоўнасці, каб утрымаць уласныя акопы. Маёр Рудат, камандзір батальёна баявой гатоўнасці, загінуў у баі як камендант умацаванага блоку Ніва.

У ноч на 25.6.44 г. 1-ы батальён 531-га грэнадзёрскага палка на аўтамашынах перакінуты ў раён Каменкі (10 км на захад ад Бабруйска) з мэтай стрымаць праціўніка, які глыбока ўкліняўся ў правы фланг з намерам акружыць Бабруйск з захаду. Першыя атакі праціўніка сіламі да батальёна ў ноч на 26.6. былі спынены, пры гэтым падбіты 4 танкі.

У ноч на 25.6. праціўнік зрабіў моцны налёт сваёй авіяцыяй на артылерыйскія пазіцыі дывізіі, скінуў каля 500 бомб. 1-ы батальён 533-га грэнадзёрскага палка меў тую ж задачу, што і 1-ы батальён 531-га грэнадзёрскага палка, але быў разбіты праціўнікам пры пераправе цераз Бярэзіну. Загаду аб адступленні дывізія яшчэ не мела. Генерал-лейтэнант Гофмайстар каля 22.00 загадаў спешна рыхтавацца да прарыву.

26.6.44 г. ўся дывізія павінна была прыняць удзел у абароне Бабруйска. Аднак толькі некаторым часцям ўдалося дасягнуць горада. Каля 18.00 масты цераз Бярэзіну, у тым ліку і чыгуначны, запоўненыя палаючымі аўтамашынамі і інш., былі заняты рускімі танкамі і пяхотай, якая была падкінута на аўтамашынах. Моцны быў налёт штурмавой авіяцыі праціўніка (рускія і амерыканскія машыны) на нашы адступаючыя часці, якія сабраліся на невялікім плацдарме. Вялікія страты і паніка сярод войскаў. Адысці з дарогі адступлення направа ці налева было немагчыма з-за балот з двух бакоў. Дарога завалена ўзарванымі і палаючымі аўтамашынамі, забітымі конямі. Уласная процітаветраная абарона поўнасцю адсутнічала. Першы клінавы «кацёл» быў замкнуты. Загад аб адступленні паступіў вельмі позна. Палкоўнік Ютнер, камандзір 532-га грэнадзёрскага палка, з астатнімі часцямі дывізіі разам з 20-й танкавай дывізіяй рыхтаваў прарыў на Бабруйск. Генерал-лейтэнант Гофмайстар прыняў камандаванне 41-м танкавым корпусам, палкоўнік Цірхольд узяў на сябе камандаванне 383-й пяхотнай дывізіяй.

27.6.44 г. спроба прарыву ў Бабруйск удалася толькі часткова. Баявыя часці дывізіі прарваліся толькі пасля падрыву ўсіх транспартных сродкаў і цяжкай зброі. Часці забеспячэння, якія яшчэ размяшчаліся ў раёне в. Цітаўка, прабіліся ў горад часткова ўплаў, часткова па чыгуначным мосце пасля знішчэння транспартных сродкаў. Капітан Клюге, камандзір 3-га батальёна 532-га грэнадзёрскага палка, гераічна загінуў. Маёр Кольцамер, камандзір 4-га дывізіёна 383-га артпалка, пакончыў з сабою.

Да 28.6.44 г. апоўдні ў горадзе сабралася каля 30 тыс. чалавек, у большасці без зброі і напаўголых. Выратаваць удалося толькі некаторыя пушкі, штурмавыя гарматы, процітанка-

выя пушкі і да 100 коней, а таксама некалькі аўтамашын для транспарціроўкі раненых. Новы камандны пункт дывізіі размясціўся ў будынку фабрыкі ў паўночнай частцы Бабруйска. Камандаванне дывізіяй прыняў Гір. Пад вечар атрымалі загад, паводле якога 383-я пяхотная дывізія разам з іншымі злучэннямі генерала-маёра Гамана павінна ўтрымліваць крэпасць Бабруйск і прыкрыць адыход астатніх дывізій. З надыходам цемры камандны пункт дывізіі быў перанесены ў цэнтр горада, у стары будынак мясцовай камендатуры. На працягу ўсяго дня — моцныя налёты авіяцыі праціўніка.

Пад моцным націскам праціўніка знешняя абарона горада была перанесена ў яго цэнтр. Праціўнік абстрэльвае горад запальнымі снарадамі, ва ўсіх раёнах — пажары. Асобныя танкі праціўніка праніклі ў прадмесце горада, працягваюцца налёты авіяцыі праціўніка і абстрэл горада з «кацюш». Калодзежы без вады. Каля 21.00 на камандным пункце дывізіі адбылася нарада, на якой генерал-маёр Гір паведаміў, што ў поўнач намячаецца прарыў усіх акружных у горадзе часцей на поўнач уздоўж Бярэзіны. 383-я пяхотная дывізія складзе ар'ергард, паколькі праціўнік ужо знаходзіцца пад Мінскам і далейшая абарона Бабруйска не мае сэнсу. Усе аўтамашыны, у т.л. «фольксвагены» і гусенічныя аўтамашыны, падлягаюць знішчэнню. Коні застрэлены, за выключэннем 3-х на кожную роту.

29.6.44 г. ў 1.30 пачаўся прарыў. Першыя часці паспяхова прарваліся. У той жа час 383-я ахоўная дывізія як ар'ергард вымушана была прарвацца з боем. Першае супраціўленне галоўныя часці сустрэлі пад в. Назараўка, але яно было зломлена. Паміж вёскамі Назараўка і Лукі праціўнік падверг моцнаму і прыцэльнаму мінамётнаму агню з процілеглага берага Бярэзіны маршавую групу, у выніку чаго сувязь была страчана. Паміж вёскамі Лукі і Шчаткава ў лесе знаходзілася прыкладна 10—12 танкаў праціўніка, мноства мінамётаў і добра ўзброеныя партызанскія атрады, якія нанеслі злучэнням велізарныя страты. Апошнія гарматы дывізіі былі ўзарваны пасля таго, як скончыліся снарады да іх. Моцнае супраціўленне праціўніка вымушае часці адыходзіць на захад. Пры знішчэнні адной партызанскай групы, якая ўпарта супраціўлялася, у баі паў кавалер жалезнага крыжа з дубовымі лісцямі маёр Бенцын, камандзір 531-га грэнадзёрскага палка, а таксама капітан Грымзел, камандзір 3-га батальёна 531-га грэнадзёрскага палка, капітан Гофер, камандзір 2-га батальёна 532-га грэнадзёрскага і старшы лейтэнант Весель, ад'ютант 531-га грэнадзёрскага палка.

30.6.44 г. ў выніку далейшага адступлення на захад галаўная калона каля пас. Кастрычнік наткнулася на моцнае супраціўленне праціўніка (танкі, самаходныя гарматы, пяхота). Лес і пасёлак Кастрычнік былі заняты часцямі 6-й і 45-й пяхотных дывізій. Усе распачатыя атакі ўздоўж дарогі пад агнём цяжкай зброі праціўніка з Слабады і Свіслачы аказаліся беспаспяховымі...

Знясіленасць войскаў пасля фарсіраванага маршу ў 60 км пры неймавернай гарачыні ў 35—36°, у пастаянных лютых баях, пры цяжэйшай душэўнай і фізічнай нагрузцы, а таксама з прычыны голаду і смагі паўнейшая. Вялікія страты і недахоп боепрыпасаў, няма прадуктаў для раненых. З-за адсутнасці ўсялякіх сродкаў сувязі адзінае кіраўніцтва войскамі аказалася немагчымым. Пад вечар створаная з тылу загараджальная лінія была зламана праціўнікам і рассеяна, у тым ліку і супрацоўнікі аператыўнага штаба. Яны калі не былі забіты, то трапілі ў палон. Тое ж можна сказать і пра штаб 41-га танкавага корпуса, уключаючы і генерал-лейтэнанта Гофмайстара...

Кольман

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 1013. Л. 5—10.

Дакументы падрыхтаваў да друку У.І.Лемяшонак.

Яны накіроўвалі ўдар

БАТАЎ ПАВЕЛ ІВАНАВІЧ

Двойчы Герой Савецкага Саюза (1943, 1945), генерал арміі (1955). Нарадзіўся 1.6.1897 г. ў в. Філісава Рыбінскага раёна Яраслаўскай вобл. У арміі з 1916 г. У Чырвонай Арміі з 1918 г. Скончыў курсы «Выстрал» (1927), Вышэйшыя акадэмічныя курсы пры Ваеннай акадэміі Генштаба (1950). Удзельнік 1-й сусветнай і грамадзянскай войнаў, нацыянальна-рэвалюцыйнай вайны ў Іспаніі 1936—1939 гг., вызвалення Заходняй Беларусі ў 1939 г., савецка-фінляндскай вайны 1939—1940 гг. З чэрвеня 1941 г. камандзір стралковага корпуса, намеснік камандуючага, камандуючы арміяй, намеснік камандуючага Бранскага фронту. З кастрычніка 1942 г. камандуючы 65-й арміяй, якая ўдзельнічала у баях на Данскім, Сталінградскім, Цэнтральным, Беларускім, 1-м і 2-м Беларускіх франтах. Гэта армія прымала актыўны



П.І.Батаў.

Б.С.Бахараў.

А.В.Гарбатаў.

В.В.Грыгор'еў.

ўдзел у Бабруйскай аперацыі, за што П.І. Батаў удастоены звання Ганаровы грамадзянін Бабруйска. Пасля вайны на камандных пасадах у Савецкай Арміі. Памёр 19.4.1985 г.

БАХАРАЎ БАРЫС СЯРГЕЕВІЧ

Генерал-маёр танкавых войскаў (1942). Нарадзіўся 10.9.1902 г. ў г.п. Дзямянск Наўгародскай вобл. У Чырвонай Арміі з 1921 г., служыў у Бабруйску. Скончыў Ваенную акадэмію імя Фрунзе (1932). У Айчынную вайну камандаваў танкавай дывізіяй і 9-м танкавым корпусам. У Бабруйскай аперацыі 9-ы танкавы корпус пад камандаваннем Б.С. Бахарава быў уведзены ў наступленне з раёна на поўнач ад Рагачова: ён абышоў Бабруйск з поўдня і 27 чэрвеня злучыўся з 1-м гвардзейскім танкавым корпусам, завяршыўшы акружэнне гітлераўскіх войскаў. За ўдзел у Бабруйскай аперацыі корпус атрымаў найменне «Бабруйскі». Загінуў 16.7.1944 г. каля в. Шакуны Пружанскага раёна. Пахаваны ў Бабруйску, на магіле помнік—танк Т-34. Яго імем названы сквер і вуліца ў Бабруйску.

ГАРБАТАЎ АЛЯКСАНДР ВАСІЛЕВІЧ

Герой Савецкага Саюза (1945), генерал арміі (1955). Нарадзіўся 23.3.1891 г. ў в. Пахоціна Палехскага раёна Іванаўскай вобл. У арміі з 1912 г., у Чырвонай Арміі з 1919 г. Удзельнік 1-й сусветнай і грамадзянскай войнаў. Скончыў кавалерыйскія камандныя курсы (1926), курсы ўдасканалення вышэйшага камсаставу (1930). У чэрвені 1941 г. камбрыг. З ліпеня 1941 на Паўднёва-Заходнім, Данскім, Сталінградскім, Бранскім, Цэнтральным, Беларускім, 1-м і 2-м Беларускіх франтах: намеснік камандзіра корпуса, камандзір дывізіі, корпуса, інспектар кавалерыі фронту, намеснік камандуючага арміяй. У чэрвені 1943 г. — маі 1945 г. камандуючы 3-й арміяй, якая ўдзельнічала ў фарсіраванні Бярэзіны, акружэнні і знішчэнні гітлераўцаў пад Бабруйскам. Удзельнік вызвалення Польшчы, Усходняй Прусіі. Пасля вайны на камандных пасадах у Савецкай Арміі. Памёр 7.12.1973 г.

ГРЫГОР'ЕЎ ВІСАРЫЁН ВІСАРЫЁНАВІЧ

Віцэ-адмірал (1945). Кандыдат геаграфічных навук (1965). Нарадзіўся 17.4.1907 г. ў г. Данкоў Ліпецкай вобл. У ВМФ з 1926 г. Скончыў Ваенна-марскую акадэмію (1940). З 1940 г. начальнік штаба Дняпроўскай, потым Дунайскай флатыліі, з лістапада 1941 г. начальнік штаба Новарасійскай ваенна-марской базы, начальнік аддзела Упраўлення баявой падрыхтоўкі Наркамата ВМФ, начальнік штаба Волжскай ваеннай флатыліі з верасня 1943 г. камандуючы Дняпроўскай ваеннай флатыліяй. Удзельнік абароны Ачакава, Нікалаева, Херсона, Керчы, Адэсы, Севастопаля, Каўказа, баявых дзеянняў на Волзе, вызвалення Польшчы, штурму Берліна. У Бабруйскай аперацыі Дняпроўская ваенная флатылія дзейнічала на Бярэзіне, агнём падтрымлівала сухапутныя войскі, перапраўляла байцоў і тэхніку цераз гэту раку. Да 1947 г. служыў у ВМФ, потым на грамадзянскім флоце.

ЛУЧЫНСКІ АЛЯКСАНДР АЛЯКСАНДРАВІЧ

Герой Савецкага Саюза (1945), генерал арміі (1955). Нарадзіўся 23.3.1900 г. ў Кіеве. У Чырвонай Арміі з 1919 г. Удзельнік грама-

А.А.Лучынскі.

М.Ф.Паноў.

І.А.Пліеў.

К.К.Ракасоўскі.

дзянскай вайны. Скончыў Ваенную акадэмію імя Фрунзе (1940). З 1941 г. на Закаўказскім, Паўночна-Каўказскім франтах, у Прыморскай арміі, на 1-м і 3-м Беларускіх, 1-м Украінскім і Забайкальскім франтах: камандзір стралковай дывізіі, корпуса, камандуючы арміяй. У Бабруйскай аперацыі 28-я армія пад яго камандаваннем 27 чэрвеня 1944 г. вызваліла Глуск і цэнтр Акцябрскага р-на, разам з 3-й арміяй выйшла на знешні фронт акружэння бабруйскай групоўкі праціўніка. Удзельнік вызвалення Усходне-Прускай, Берлінскай, Пражскай аперацый, разгрому Квантунскай арміі Японіі на Далёкім Усходзе. Пасля вайны на камандных пасадах у Савецкай Арміі.

ПАНОЎ МІХАІЛ ФЁДАРАВІЧ

Герой Савецкага Саюза (1945), генерал-лейтэнант танкавых войскаў. Нарадзіўся 21.11.1901 г. ў в. Аўчыннікава Невельскага раёна Пскоўскай вобласці. У Чырвонай Арміі з 1919 г. Удзельнік грамадзянскай вайны. Скончыў Ваенную акадэмію механізацыі і матарызацыі (1938), Вышэйшыя акадэмічныя курсы пры Ваеннай акадэміі Генштаба (1952). З 1941 г. на Заходнім, Сталінградскім, Паўднёвым, Бранскім, Беларускім, 1-м і 2-м Беларускім франтах: камандзір танкавай дывізіі, нам. камандуючага арміяй, камандзір 1-га гвардзейскага танкавага корпуса. Падчас Бабруйскай аперацыі, калі войскі 65-й і 28-й армій прарвалі абарону праціўніка, у прарыў, які утварыўся ў выніку гэтага, быў уведзены 1-ы гвардзейскі танкавы корпус пад камандаваннем М.Ф. Панова; у ноч на 27 чэрвеня ён выйшаў на подступы да Бабруйска, перарэзаўшы шляхі на захад і паўднёвы захад ад горада. Да 1967 г. служыў на адказных пасадах у Савецкай Арміі. Памёр 10.5.1979 г.

ПЛІЕЎ ІСА АЛЯКСАНДРАВІЧ

Двойчы Герой Савецкага Саюза (1944, 1945), генерал арміі (1962). Герой Манголь-скай Народнай Рэспублікі (1971). Нарадзіўся 25.11.1903 г. ў с. Стары Батакаюрт у Паўночнай Асеціі. У Чырвонай Арміі з 1922 г. Скончыў ваенныя акадэміі імя Фрунзе (1933) і Генштаба (1941). Удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі ў 1939 г. З чэрвеня 1941 г. на Заходнім, Паўднёвым, Паўднёва-Заходнім, Сцяпным, 3-м Украінскім, 2-м Беларускім, 2-м Украінскім і Забайкальскім франтах: камандзір кавалерыйскай дывізіі, кавалерыйскіх карпусоў, конна-механізаванай групы. У Бабруйскай аперацыі конна-механізаваная група пад яго камандаваннем 26 чэрвеня 1944 г. выйшла ў раёне Глуска да р. Пціч і месцамі фарсіравала яе, вызваляла Глуск, а затым Слуцк. Пасля вайны на адказных пасадах у Савецкай Арміі і Міністэрстве абароны СССР. Памёр 6.2.1979 г.

РАКАСОЎСКІ КАНСТАНЦІН КАНСТАНЦІНАВІЧ

Маршал Савецкага Саюза (1944), Маршал Польшчы (1949). Двойчы Герой Савецкага Саюза (1944, 1945). Нарадзіўся 21.12.1896 г. ў г. Вялікія Лукі. У арміі з 1914 г., удзельнік 1-й сусветнай вайны. У Чырвонай гвардыі з 1917 г., у Чырвонай Арміі з 1918 г. У грамадзянскую вайну ўзнагароджаны 3 ордэнамі Чырвонага Сцяга. Скончыў курсы ўдасканалення камсаставу (1925) і вышэйшага начсаставу пры Ваеннай акадэміі імя Фрунзе (1929). Да 1941 г. камандзір ка-

валерыйскага палка, брыгады, дывізіі (у 1930 г. на Беларусі), корпуса. У Айчынную вайну камандаваў механізаваным корпусам, 16-й арміяй на Заходнім фронце, войскамі Бранскага, Данскога, Цэнтральнага, Беларускага, 1-га і 2-га Беларускіх франтоў. Удзельнік Смаленскай (1941), Маскоўскай, Сталінградскай, Курскай бітваў, а таксама аперацый — Чарнігаўска-Прыпяцкай (1943), Калінкавіцка-Мазырскай, Рагачоўска-Жлобінскай, Беларускай (усе 1944), Усходне-Прускай, Усходне-Памеранскай, Берлінскай. 24.6.1945 г. камандаваў парадам Перамогі ў Маскве. З 1945 г. галоўнакамандуючы Паўночнай групай войскаў. З 1945 г. міністр нацыянальнай абароны і намеснік Старшыні Савета Міністраў Польшчы. З 1956 г. намеснік міністра абароны СССР. З 1957 г. на камандных пасадах у Савецкай Арміі, у апараце Міністэрства абароны СССР. Сярод яго шматлікіх узнагарод ордэн Перамогі. Прымаў асабісты ўдзел у распрацоўцы і ажыццяўленні плана Бабруйскай аперацыі. Памёр 3.8.1968 г. Яго імем названа вуліца ў Бабруйску.

РАМАНЕНКА ПРАКОП ЛОГВІНАВІЧ

Генерал-палкоўнік (1944). Нарадзіўся 25.2.1897 г. на хутары Раманенкі Роменскага раёна Сумскай вобл. Скончыў ваенныя акадэміі імя Фрунзе (1933), Генштаба (1948). У арміі з 1914 г., у Чырвонай Арміі з 1918 г. Удзельнік войнаў: 1-й сусветнай, грамадзянскай, нацыянальна-рэвалюцыйнай у Іспаніі 1936—1939 гг., савецка-фінляндскай 1939—1940 гг. З 1942 г. на Заходнім, Бранскім, Паўднёва-Заходнім, 1-м Беларускім франтах: камандуючы арміямі, намеснік камандуючага фронтам. Удзельнік Сталінградскай і Курскай бітваў. У час Бабруйскай аперацыі камандаваў 48-й арміяй, якая 26 чэрвеня 1944 г. вызваліла Жлобін і прымала ўдзел у ліквідацыі групоўкі гітлераўскіх войскаў у бабруйскім «катле». У 1945—1947 гг. камандуючы

П.Л.Раманенка.

С.І.Рудэнка.

Усходне-Сібірскай ваеннай акругай. Памёр 10.3.1949 г.

РУДЭНКА СЯРГЕЙ ІГНАТАВІЧ

Герой Савецкага Саюза (1944), Маршал авіяцыі (1955). Прафесар (1972). Нарадзіўся 20.10.1904 г. ў г.п. Корап Чарнігаўскай вобл. У Чырвонай Арміі з 1923 г. Скончыў Ваенна-паветраную акадэмію імя Жукоўскага (1932) і яе аператыўны факультэт (1936). З 1941 г. на Заходнім, Калінінскім, Бранскім, Волхаўскім, Паўднёва-Заходнім, Сталінградскім, Данскім, Цэнтральным, Беларускім і 1-м Беларускім франтах: камандзір авіядывізіі, камандуючы ВПС арміі, франтоў, авіягрупы Стаўкі ВГК, ВПС фронту, намеснік камандуючага і камандуючы 16-й паветранай арміяй. Удзельнік бітваў пад Сталінградам, Курскам, на Дняпры, у Беларускай, Люблін-Брэсцкай, Варшаўска-Познанскай, Усходне-Памеранскай, Берлінскай аперацыях. Лётчыкі 16-й паветранай арміі пад камандаваннем С.І. Рудэнкі адыгралі важную ролю ў Бабруйскай аперацыі, асабліва ў разгроме гітлераўскіх войскаў у бабруйскім «катле». Пасля вайны на адказных пасадах у ВПС Савецкай Арміі.

Героі, якія вызвалялі Бабруйшчыну

У памятным 1944-м праз нашу бабруйскую зямлю, праз вогненны бабруйскі «кацёл» праляглі франтавыя дарогі многіх Герояў Савецкага Саюза. Шэсць з іх здзейснілі тут свае гераічныя подзвігі і навечна засталіся ў гэтай зямлі. Каля падножжа Кургана Славы, што насыпаны каля в. Сычкава, установлены стэлы з барэльефнымі партрэтамі шасці герояў-вызваліцеляў.

ВАЯВАЎ ПА-АРЛІНАМУ

АРОЛ Іван Якаўлевіч, н. 26.1.1914 г. ў в. Клешчаніцы Чарнабаеўскага раёна Чаркаскай вобл. на Украіне. Герой Савецкага Саюза (25.9.1944). З

І.Я.Арол.

М.А.Ізюмаў.

1936 г. ў Чырвонай Арміі. З лютага 1943 г. на Цэнтральным, Беларускім і 1-м Беларускім франтах. Камандзір артбатарэі капітан І. Арол вызначыўся ў баях у чэрвені 1944 г. на тэрыторыі Гомельскай і Магілёўскай абласцей. 24.6.1944 г. батарэя пад яго камандаваннем фарсіравала р. Друць, знішчыла адну гармату, 25 кулямётных кропак і роту нямецкіх салдат, дапамагла пяхоце палка прарваць варожую абарону каля Рагачова. А 26.6.1944 г. разлік батарэі ўварваўся ў в. Побалава Рагачоўскага раёна, захапіў 23 гітлераўцы. 27.6.1944 г. выбіў праціўніка з в. Варатынь Бабруйскага раёна, перапраўіўся цераз р. Ала, замацаваўся на правым беразе, выратаваў ад падрыву замініраваныя фашыстамі масты. У той жа дзень І. Арол быў смяротна паранены. Пахаваны ў брацкай магіле ў в. Варатынь.

... Бадай, кожная водная перашкода — цяжкі арэшак пры наступленні войскаў. Рака Друць каля Рагачова не была выключэннем. На тым беразе вораг ашчаніўся амбразурамі дзотаў, кулямётнымі гнёздамі, закапанымі ў зямлю гарматамі, танкамі. Перад наступленнем 24 чэрвеня 1944 г. камандзір батарэі І. Арол гадзінамі не адрываў бінокль ад вачэй, вывучаў кожны сантыметр варожай тэрыторыі, уважліва слухаў данясенні разведкі, раіўся з афіцэрамі-батарэйцамі, наносячы ўсё новыя і новыя пометы на камандзірскую карту. Быў ён кадравым афіцэрам. Прыкладна за 5 гадоў да пачатку вайны служыў у Чырвонай Арміі, меў добрыя веды і палявую вывучку. А пакуль з баямі дайшоў да Беларусі, набыў і баявую загартоўку. Тут, на беларускай зямлі, ён, што называецца, апраўдаў сваё прозвішча: ваяваў сапраўды па-арлінаму. Так, гэта быў арол-камандзір! Храбры, напорысты, кемлівы. І хлопцы ў батарэі — як на падбор, з арлінага племя.

Таму, калі пачалася пераправа і Друць уздыбілася ад выбухаў снарадаў і мін, усе дакладна рабілі сваю справу, у адзіным парыве імкнучыся як мага хутчэй ступіць на той бераг. На першым жа яго метры ў адно імгненне 76-міліметровыя гарматы занялі агнявыя пазіцыі і адкрылі агонь. Адна за другой замаўкалі ўмацаваныя варожыя кропкі. А калі пяхота з раскацістым «ура!» паднялася ў атаку, батарэя перанесла агонь у глыб абароны праціўніка і неўзабаве, даганяючы ланцугі пяхоты, раз-пораз перамяшчалася на новыя агнявыя пазіцыі. Поспехі батарэі І. Арла ў гэтым баі былі даволі ўнушальныя. І ўсе разумелі: без яе, без гэтай арлінай батарэі, прарваць абарону праціўніка было вельмі цяжка, а можа, і немагчыма.

Праз дзень батарэя разам з пяхотай выйшла да в. Побалава. Капітан убачыў, што немцам не да іх, яны адбіваюць атаку нашай пяхоты справа, і рашыў захапіць вёску. Пакінуўшы каля гармат па два чалавекі, якія забяспечвалі агонь батарэі, ён разгарнуў астатніх батарэйцаў у стралковы ланцуг, і яны ўдарылі гітлераўцам у фланг. Вораг быў ашаломлены. Артылерысты са стралковай зброі і гранатамі перабілі нямала немцаў і дзесяткі два варожых салдат узялі ў палон.

Праследуючы адступаючых гітлераўцаў, адбіваючы іх шматлікія контратакі, 27 чэрвеня батарэя выйшла да в. Варатынь. Тут, на р. Ала, немцы стараліся замацавацца і аказвалі жорсткае супраціўленне. Капітан І. Арол разумеў, што калі фашысты ўзарвуць мост цераз раку, то наступленне нашых войскаў затрымаецца. Таму ён загадаў выкаціць гарматы на адкрытыя пазіцыі. Трапным агнём артылерысты знішчылі праціўніка, які абараняўся ля моста, выбілі фашыстаў з вёскі, захапілі падрыхтаваны да ўзрыву мост. Пераправіўшыся на супрацьлеглы бераг, батарэя замацавалася і чакала падыходу галоўных сіл.

У гэтым баі капітан Арол быў смяротна паранены. Батарэйцы пахавалі свайго адважнага камандзіра ў в. Варатынь, у брацкай магіле: «Спі спакойна, наш храбры Арол!» І пакацілася арліная батарэя далей на Захад.

Б. Маслаў.

ПОДЗВІГ КАМБАТА

ІЗЮМАЎ Мікалай Андрэевіч, н. 24.12.1920 г. ў г. Аша Ашынскага раёна Чалябінскай вобл. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). У Чырвонай Арміі з 1939 г. Скончыў Ульянаўскае бранятанкавае вучылішча ў 1941 г. На фронце з кастрычніка 1941 г. Удзельнічаў у баях пад Масквой, Сталінградам, за вызваленне Беларусі. Гвардыі капітан, камандзір

танкавага батальёна М.Ізюмаў вызначыўся ў Бабруйскай аперацыі. Батальён пад яго камандаваннем авалодаў пераправай на р. Бярэзіна каля в. Шчаткава, захапіў участак шашы Бабруйск—Мінск каля в. Баяры, што садзейнічала паспяховаму наступленню іншых падраздзяленняў. Загінуў у баі 28.6.1944 г. Пахаваны ў брацкай магіле савецкіх воінаў на ўскраіне в. Баяры, дзе яго імем названа вуліца. У яго гонар в. Дурынічы перайменавана ў Ізюмава.

...Трапіў лейтэнант Ізюмаў на самы адказны фронт і ў самы крытычны момант. Не адзін, а разам з тымі сібірскімі палкамі і дывізіямі, якім трэба было засланіць Маскву, абараніць сталіцу. У бой давялося ўступіць з ходу і біцца, як гаворыцца, да канца. А колькі іх было, такіх баёў, на шляху ад Масквы да Бабруйска!

Да 19 гадзін 26 чэрвеня 1944 г. батальён Ізюмава захапіў Багушоўку і тым самым перарэзаў магістральныя дарогі Бабруйск—Глуск і Бабруйск—Слуцк. Не даючы апамятацца ворагу, збіваючы яго артылерыйскія заслоны, танкісты-ізюмаўцы зрабілі імклівы кідок у напрамку Пабокавічаў, вырваліся да станцыі Мірадзіна. Тут стаялі шэсць чыгуначных эшалонаў з ваеннымі грузамі, размяшчаліся склады з боепрыпасамі і прадуктамі харчавання. Чыгуначны вузел моцна ахоўваўся артылерыяй, танкамі. Але нішто не змагло спыніць націск нашых танкістаў-гвардзейцаў. Атака батальёна Ізюмава была настолькі нечаканай і рашучай, што вораг пакінуў усю сваю зброю, тэхніку і ў паніцы кінуўся да Бабруйска.

Перарэзаўшы адыход па чыгунцы, 16-я гвардзейская брыгада з галаўным батальёнам Мікалая Ізюмава рванулася на шашу Бабруйск—Мінск. Кароткі бой — і Сычкава ў нашых руках. Побач магістральны шлях. Па ім з Бабруйска на Мінск на вялікай хуткасці імчала калона аўтамашын з грузамі і пяхотай. Танкісты батальёна Ізюмава адкрылі па калоне агонь, з ходу вырваліся на шашу, збіваючы гусеніцамі машыны.

Узнялася страшэнная паніка. Адны спрабавалі развярнуцца і засядалі ў кюветах, кідалі машыны і разбягаліся. Другія, убачыўшы савецкія танкі, тут жа саскоквалі з машын і ўцякалі ў лес. Дарога на ўчастку 500—600 м стала нагадваць могілкі разбітай варожай тэхнікі.

Адчуўшы сябе ў паўакружэнні, фашысцкае камандаванне арганізавала магутны контрудар на Мірадзіна, каб па чыгунцы вывезці Бабруйскі гарнізон. Танкі, штурмавая артылерыя, браняпоезд рушылі на пазіцыі 16-й танкавай брыгады. Кровапралітны бой цягнуўся чатыры гадзіны. Нашы танкісты ўстаялі, адкінулі ворага назад.

Тады фашысты пачалі шукаць іншае выйсце. А палове шостай гадзіны 27 чэрвеня яны наваліліся на сычкаўскае скрыжаванне, якое асядлалі танкісты Ізюмава. 30 танкаў і самаходных гармат, некалькі тысяч салдат пяхоты, пераважна афіцэраў, пры падтрымцы авіяцыі больш як пяць гадзін штурмавалі гэта скрыжаванне. Яны не лічыліся са згубным прыцэльным агнём, лезлі напралом. Дзесяць разоў фашысты ўзнімаліся ў атаку і дзесяць разоў былі адкінуты назад.

«Усе атакі праціўніка, — запісана ў характарыстыцы камбата, — адбіваліся батальёнам Ізюмава, і за час баёў знішчана 203 танкі і аўтамашыны, 20 процітанкавых гармат, да 2 тысяч салдат і афіцэраў». Было захоплена 76 кулямётаў, 201 мінамёт, 46 гармат.

Пасля таго як правалілася спроба прарвацца па Мінскім шляху, варожыя часці рынуліся з Бабруйска па адзінай дарозе праз Крывы Крук на Шчаткава і далей уздоўж Бярэзіны. Наперарэз ім да шчаткаўскага моста з дэсантам аўтаматчыкаў спяшаліся танкі батальёна Ізюмава. За водную пераправу разгарэўся жорсткі бой. Як тапелец хапаецца за саломінку, так фашысты ўхапіліся за апошні шлях выхаду з Бабруйска. Сілы ворага пераўзыходзілі нашы ў некалькі разоў.

Тым не менш Мікалай Ізюмаў смела развярнуў батальён і рашуча павёў танкістаў у атаку. На ўчастку Назараўка—Лукі ён атрымаў раненні ў абедзве нагі. Але храбры танкіст не пакінуў сваю «трыццацьчацвёрку» і працягваў кіраваць боем...

Праз тры гадзіны шчаткаўскі мост быў штурмам захоплены, і танкісты першага Данскога корпуса генерала Панова злучыліся з танкістамі 9-га корпуса генерала Бахарава. Так завяршылася поўнае акружэнне нямецка-фашысцкіх войскаў на бабруйскай зямлі. У жалезны «кацёл» пад Бабруйскам, нібы ў пастку, трапілі часці 9-й арміі праціўніка.

Да разгрому і знішчэння варожай групоўкі савецкія войскі прыступілі неадкладна. Батальён Ізюмава быў павернуты на Бабруйск. Пачалася імклівая атака, у выніку якой танкісты захапілі мінскія могілкі, уварваліся на ўскраіну горада. У галаве калоны дзейнічаў сам ранены камбат. Фашысты люта адбіваліся. Страляў кожны дом, кожная гаспадарчая пабудова, дзе былі замаскіраваны артылерыйскія разлікі. Нашы танкі вораг паліваў агнём гранатамётаў і фаустпатронаў. Але тан-

кісты-ізюмаўцы адбівалі ў ворага, які пераўзыходзіў іх па сіле, участак за ўчасткам. Вось ужо вызвалена частка Мінскай вуліцы, завяршаецца штурм вуліцы Шміта. У самым канцы яе «трыццацьчацвёрку» камбата Ізюмава пяты раз скалануў страшэннай сілы ўдар варожага снарада. Яна нібы спатыкнулася, стала, як укапаная, нахілілася набок.

Кажуць, на вайне як на вайне: усякае можа здарыцца ў любую хвіліну. І тым не менш ніхто з воінаў ізюмаўскай стальной дружыны не думаў, што вуліца Шміта ў Бабруйску будзе яго апошнім рубяжом. *М.Валатковіч.*

ЯМУ Б ЖЫЦЬ ДЫ ЖЫЦЬ...

КАЛОДКА Мікалай Аляксеевіч, н. 10.5. 1923 г. ў г. Шостка Сумскай вобл. на Украіне. Герой Савецкага Саюза (24.4.1945). З 3.7.1942 г. на Бранскім і Беларускім франтах. Старшы лейтэнант, намеснік камандзіра батальёна М.Калодка вызначыўся ў Бабруйскай аперацыі. 28.6.1944 г. рота пад яго камандаваннем у кароткіх баях авалодала пераправай цераз Бярэзіну, фарсіравала раку, вызваліла в. Шчаткава. 26.6.1944 г. з 12 салдатамі адбіў 11 контратак ворага, знішчыў 3 самаходныя гарматы, каля 30 аўтамашын праціўніка. Загінуў у гэтым баі. Пахаваны ў брацкай магіле савецкіх воінаў у в. Шчаткава.

... Я ўглядаюся ў яго фотаздымак. Ён малады і прыгожы, поўны жыцця. Яму б жыць ды жыць... Але інакш вырашыла вайна. І жыццё Мікалая Аляксеевіча Калодкі абарвалася, калі яму споўніўся толькі дваццаць адзін год. Абарвалася ў нас, на Бабруйшчыне.

Дакументы, пісьмы героя, архіўныя матэрыялы — усё гэта я перачытваю з асаблівай прагнасцю. І паўстае перада мною нядоўгае, але вельмі яркае жыццё адважнага хлопца з Украіны. Рос ён моцны, не палохаўся працы. Маці яго, Ксенія Малафееўна, не раз потым скажа карэспандэнтам і работнікам Сумскага краязнаўчага музея: «Сапраўдным быў памочнікам наш Мікалай, рукі ў яго залатыя, а галава светлая... Вучоба давалася лёгка, таму і быў ён адным з першых у класе».

Калі пачалася вайна, Мікалаю было толькі васемнаццаць. Як і ўсе ў яго гады, ён ірваўся на фронт. У армію трапіў у жніўні 1942 г.

Спачатку быў Бранскі фронт. Мікалай шмат пісаў дамоў, найчасцей маці. Нельга не сказаць пра змест пажоўклых ужо і складзеных трохвугольнікам пісьмаў маладога афіцэра. У іх няма нават намёку на вайсковыя цяжкасці. «Жыву добра, здароўе выдатнае», — чытаю ў адным з пісьмаў. «За мяне не хвалюйцеся. Ваюю, думаю, што не падвяду Радзіму», — піша ён у другім.

М.А.Калодка.

І.Ф.Маслоўскі.

Родныя расказвалі, што ён быў вялікім аптымістам. Любіў чытаць, кніга для яго была пастаяннным спадарожнікам. А яшчэ любіў музыку. У лютым 1944 г., пасля жорсткіх баёў, Мікалай пісаў маці: «Я, як аматар музыкі, знаходжу для яе час і тут. Так што весялюся». 1 чэрвеня 44-га, зусім незадоўга да таго ракавога дня, ён зноўку пісаў дамоў: «Я атрымаў вестку аб нараджэнні Ніначкі, вельмі рады, што наша радня папаўняецца. Прыеду — прывязу гасцінец». Ён не збіраўся паміраць. Сэрца яго было перапоўнена клопатам і ўвагай да сваіх: «Прашу вас — напішыце, ці атрымалі вы 1300 рублёў». Чаканнем сустрэчы з роднымі на мірнай радзіме дыхалі многія з яго пісьмаў. Але вайна распарадзілася інакш.

У канцы чэрвеня 1944 г. намеснік камандзіра другога батальёна па стралковай частцы 818-га Чырванасцяжнага палка 129-й Арлоўскай стралковай дывізіі старшы лейтэнант М.А. Калодка ўдзельнічаў у разгроме фашыстаў паблізу Бабруйска. Выконваючы загад камандавання палка па фарсіраванні р. Бярэзіна і захопе плацдарма на заходнім яе беразе, М.А.Калодка з пятай стралковай ротай раптоўным, вельмі смелым рыўком захапіў пераправу і, выйшаўшы на заходні бераг ракі, штурмам авалодаў в. Шчаткава. Гэта мела выключнае значэнне, таму што забяспечвала пераправу цераз Бярэзіну асноўных сіл палка.

29 чэрвеня 1944 г. батальён заняў абарону ў раёне вёсак Лукі—Шчаткава. Старшы лейтэнант Калодка, знаходзячыся ў баявых парадках свайго падраздзялення, паспяхова кі-

раваў боем, у выніку чаго было адбіта некалькі масіраваных атак фашыстаў. Страты ворага ў жывой сіле і тэхніцы былі вельмі вялікія. Тым не менш працiўнік працягваў свае атакі. У 11 гадзін ён перайшоў у чарговую, падтрымліваючы яе самаходнымі гарматамі «фердынанд». Менавіта ў гэтым баі і раскрыліся лепшыя чалавечыя якасці Мікалая Калодкі. Адабраўшы дваццаць пяць байцоў, ён вырашыў прыняць бой на сябе. Пры гэтым запэўніў камандаванне, што тэхніка і пяхота працiўніка не пройдуць да пераправы цераз Бярэзіну да той пары, пакуль яго рукі і рукі таварышаў трымаюць зброю. Ні адно слова старшага лейтэнанта не было сказана дарма...

Бой быў няроўны, вельмі цяжкі. Фашысты страцілі каля трохсот салдат, тры самаходныя гарматы, каля 30 варожых аўтамашын. Атака ворага была спынена. Пераправа працягвала заставацца нашай. Але гэта быў апошні бой для старшага лейтэнанта Мікалая Калодкі...

... У в. Сычкава, паблізу шашы Бабруйск—Мінск, узвышаецца велічны манумент у гонар савецкіх воінаў-вызваліцеляў. Каля яго падножжа сярод іншых — барэльеф героя з надпісам: «Мікалаю Аляксеевічу Калодка 1923—1944». Слава Героя працягвае жыць.

Э.Янін.

МУЖНАСЦЬ

МАСЛОЎСКІ Іван Фёдаравіч, н. 10.7.1915 г. ў станіцы Данцаўка Багучарскага раёна Варонежскай вобл. Герой Савецкага Саюза (26.10.1944). Да вайны працаваў у сельсавеце. У верасні 1941 г. прызваны ў Чырвоную Армію. З красавіка 1942 г. на Паўночна-Заходнім і 1-м Беларускім франтах. Старшы лейтэнант, камандзір батарэі І.Маслоўскі вызначыўся 29.6.1944 г. ў час вызвалення Бабруйскага раёна. Байцы пад яго камандаваннем вялі цяжкія баі з нямецка-фашысцкімі акупантамі за авалоданне, утрыманне і пашырэнне плацдарма на правым беразе р. Бярэзіны. Яны адбілі 26 контратак праціўніка, знішчылі больш за 100 варожых салдат і афіцэраў, што садзейнічала паспяховаму наступленню палка. Калі выбыў са строю разлік адной з гармат, І.Маслоўскі асабіста знішчыў з яе 3 самаходныя гарматы, 4 аўтамашыны і больш за 30 гітлераўцаў. Загінуў у гэтым баі. Пахаваны ў брацкай магіле савецкіх воінаў у в. Шчаткава.

... Пасля нараджэння будучага героя яго бацькі з Варонежскай вобласці пераехалі ў Краснадарскі край у станіцу Пераяслаўскую Брухавецкага раёна. Бацька і маці, самі людзі ад зямлі, прывучылі і Івана паважаць сялянскую працу. Ён вельмі любіў дапамагаць ім. І гэта радавала не толькі дарослых, але і самога Івана.

Рос ён дасціпным хлопцам. Яго цікавіла літаральна ўсё. І гэта не раз адзначалі настаўнікі, яго старэйшыя сябры, таварышы. Вучыўся Іван на «выдатна» і «добра». Цяжка сказаць, кім бы стаў Іван Маслоўскі, калі б не вайна. Магчыма, добрым хлебаробам, вядомым будаўніком ці вучоным... Ва ўсякім разе, Іван імкнуўся як мага глыбей спасцігнуць веды — у першую чаргу, як сам не раз гаварыў, для сябе, для свайго кругагляду і правільнага разумення свету. Дарэчы, школа, у якой вучыўся, сёння носіць яго імя.

Асабліва захапляўся літаратурай, драматургіяй. Любіў удзельнічаць у школьнай мастацкай самадзейнасці. Выдатна чытаў вершы Лермантава. І наогул настаўнікі бачылі ў ім таленавітага чалавека. А як уступіў у камсамол, стаў піянерважатым. І тут многае ў яго атрымлівалася.

Пазней служыў у арміі, працаваў начальнікам ваенна-ўліковага стала ў сельсавеце.

Вайна пераблытала ўсе яго планы. Яго прызвалі на фронт. Але не на перадавую. Спачатку закончыў паскораны курс артылерыйскага вучылішча, атрымаўшы званне лейтэнанта.

Да баявых дзеянняў прыступіў у красавіку 1942 г. ў складзе Паўночна-Заходняга фронту. А з сакавіка 1944 г. ваяваў на Беларускім. У той час, калі вяліся баі непадалёку ад Бабруйска, Маслоўскі ўжо камандаваў батарэяй 76-міліметровых гармат 457-га стралковага палка 129-й стралковай дывізіі. І камандаваў удала, аб чым сведчаць радкі з яго характарыстыкі: «У наступальных баях, у раёне ракі Бярэзіна, гвардыі лейтэнант Маслоўскі дэманстраваў узоры мужнасці, смеласці і адвагі...»

29 чэрвеня 1944 г. фашысты вялікімі сіламі пяхоты пры падтрымцы танкаў і самаходных гармат распачалі контратаку. Гвардыі лейтэнант Маслоўскі пад градам куль і асколкаў выкаціў 76-міліметровую гармату. Агонь вёў трапна: толькі за адзін дзень адбіў каля 30 варожых атак. Былі падбіты тры самаходныя варожыя гарматы, 4 аўтамабілі з ваеннымі грузамі, знішчана звыш 100 варожых салдат і афіцэраў. У яго, вядома, была магчымасць пашкадаваць сябе — змяніць пазіцыю, паскардзіцца на недахоп боепрыпасаў... Але лейтэнант ні на крок не адступіў ад тых пазіцый, на якіх знаходзіўся, і да апошняга дыхання змагаўся супраць нямецка-фашысцкіх

захопнікаў. Так і застаўся навечна ў бабруйскай зямлі, на якой стаў Героем. *Э.Янін.*

СЫЧКАЎСКІ МАТРОСАЎ

СЕЛЯЗНЁЎ Міхаіл Рыгоравіч, н. 15.11.1915 г. ў в. Малая Ківара Воткінскага раёна Удмурцкай Рэспублікі. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Працаваў на заводзе ў г. Новасібірску. На фронце з 1941 г. Удзельнік баёў пад Сталінградам, на Курскай дузе. Сяржант, камандзір стралковага аддзялення М. Селязнёў вызначыўся 30.6.1944 г. ў час вызвалення в. Сычкава: у рашаючы момант бою закрыў сабою амбразуру дзота. Пахаваны ў брацкай магіле савецкіх воінаў у в. Сычкава. Яго імем названы школа і парк у в. Сычкава, на месцы подзвігу ўстаноўлены помнік.

... На беларускай зямлі ішла вялікая бітва. Стралковы полк, якім камандаваў Герой Савецкага Саюза І.Каралёў, сёмы дзень вёў няспынны бой. Пасля ліквідацыі бабруйскага «катла» ён пераправіўся цераз Бярэзіну і працягваў наступленне.

Правафланговы батальён павінны быў авалодаць вёскай Сычкава. Першай атакай вёску ўзяць не ўдалося. Батальён залёг. Пасля падаўлення артылерыяй агнявых кропак праціўніка на ўскраіне і ўздоўж шашы байцы зноў узняліся ў атаку. Вось ужо левафланговая рота ўварвалася ў вёску. Яшчэ рывок — і тыя, што наступаюць правей, таксама апынуцца ў вёсцы. Але ў гэты момант застрачыў варожы кулямёт. Кінжальны агонь стаў касіць людзей.

На самым правым флангу батальёна знаходзіўся са сваім узводам старшы сяржант Міхаіл Рыгоравіч Селязнёў. Ён прыкмеціў, што кулямёт, які вёў згубны агонь, знаходзіцца на скрыжаванні вуліц. Фашысты пад прыкрыццём кулямётнага агню спрабуюць зайсці ў тыл нашаму батальёну.

Селязнёў падпоўз да камбата, далажыў аб убачаным і тут жа папрасіў настойліва:

— Таварыш маёр, дазвольце, я распраўлюся з гэтым гадам.

Камбат глянуў на Селязнёва. Сяржант ляжаў побач, з поўнай салдацкай выкладкай. Чорная ад поту гімнасцёрка, запэцканыя боты. Суровы твар са светлымі вачыма і ўпартай складкай каля вуснаў. Дужы воін-сібірак.

Селязнёву ішоў дваццаць дзевяты год. З першага дня вайны на фронце. За плячыма Сталінград, Курская бітва, Днепр. Тройчы ранены, двойчы ўзнагароджаны. Калі ішоў на фронт, у Новасібірску пакінуў жонку і трох дачок. Старэйшай было пяць гадоў, а малодшай, Рыме, усяго толькі месяц.

М.Р.Селязнёў.

А.І.Чарныш.

Выдатны сем'янін, адзін з лепшых майстроў механічнага завода стаў бясстрашным воінам, спачатку радавым стралком, потым камандзірам аддзялення. Камбат ведаў пра Селязнёва ўсё, ведаў і любіў гэтага старанна-га, вынослівага салдата. Верыў яму і быў упэўнены, што абавязкова выканае: і фланг прыкрые, і «языка» здабудзе, і разведку боем правядзе. Але ў апошні час камбат пачаў аберагаць Селязнёва ад рызыковых заданняў. І на гэты раз вагаўся. Але каму ж тады даручыць такую адказную справу? Атака захлынулася. Батальён залёг у лагчыне, ледзь «ухапіўшыся» за некалькі дамоў.

— З кім пойдзеце? — спытаў камбат.

— Адзін, таварыш маёр. Дазвольце, — адказаў старшы сяржант.

— Не, аднаму не дазваляю. Вазьміце сваё аддзяленне і прымусьце змоўкнуць гэты праклятый дзот. А другім аддзяленнем (Селяз-



Помнік на месцы подзвігу М.Р.Селязнёва ў вёсцы Сычкава.

нёў часова выконваў абавязкі камандзіра ўзвода) прыкрыйце правы фланг, каб немцы ў тыл не прасачыліся.

Старшы сяржант паўтарыў загад і хацеў адпаўзаць.

— Пачакай, — камбат паглядзеў у светлыя вочы Селязнёва.

— Будзь асцярожны, дарэмна не рызыкуй. Памятай: мы на вас спадзяёмся. Увесь батальён за вашымі плячыма. — Камбат моцна паціснуў Селязнёву руку.

Каб дакладна вызначыць, адкуль б'е варожы кулямёт, трэба было пераадолець вузкі ўчастак балота і невысокі хмызняк. За ім Селязнёў убачыў дзот, з якога страчыў кулямёт. Адтуль мясцовасць добра была відаць. Варта было каму-небудзь з нашых байцоў толькі высунуцца з-за хмызняку, як над ім тут жа свісталі кулі. Селязнёў паклікаў свайго намесніка сяржанта Сысоева.

— Бачыш фашысцкі дзот? Я пайду з Яфімкіным і Саітавым уздоўж хмызняку, падбяромся да дзота справа, а ты з астатнімі адцягвай агонь на сябе.

І Селязнёў пайшоў. Па кустах, па балоце, а потым і па адкрытым полі, паўзком і кароткімі перабежкамі. Было спякотна. Ліў пот. У ботах хлюпала балотная вада. Ужо ранены Яфімкін, забіты Саітаў. У Селязнёва дзве гранаты і аўтаматны дыск. Ён падпоўз ужо так блізка, што выразна бачыў у каменнай амбразуры ствол кулямёта. Звыклымі рухамі, не гледзячы, падрыхтаваў гранату і, прыўзняўшыся, кінуў. Уздыбілася зямля. Селязнёў некалькі крокаў прабег і адразу ж залёг. Кулямёт усё яшчэ страчыў, абшпырваючы лагчыну, подступы да вёскі.

Батальён чакаў, калі варожы кулямёт змоўкне. Чакаў дзеянняў Селязнёва. Яму быццам пачуліся папрокі таварышаў: «Што ж ты, Міхаіл Рыгоравіч, марудзіш?»

На рахунку ў Селязнёва быў не адзін фашысцкі дзот, які ён прымусіў змоўкнуць. Як жа з гэтым? Можна закідаць амбразуру гранатамі. Але зараз у яго не было ніводнай гранаты, ніводнага патрона, не было памочнікаў. Ён застаўся сам-насам з дзотам. Ніхто не ведае, пра што думае чалавек у такое імгненне, кідаючыся насустрач смерці. Гэта застанецца вечнай тайнай, застанецца з тым, хто загінуў у баі. Але пра што б Селязнёў ні думаў, выкананне загаду камандзіра, абавязак перад Радзімай для яго былі ў гэтае імгненне вышэй за ўсё. Салдат зусім блізка падпоўз да агнядышнай кропкі. Узняўся на ўвесь рост, зрабіў скачок і пластом упаў на амбразуру.

Батальён падняўся ў атаку і авалодаў вёскай. А прашыты кулямётнай чаргой Селязнёў, сцякаючы крывёю, ляжаў перад амбразурай, шчыльна закрыўшы сабой жэрла смерці. Ляжаў сібірак, моцна сціснуўшы ў левай руцэ жменю беларускай зямлі. *Д.Храмакоў.*

«ЗАГІНЕМ, АЛЕ ВОРАГА НЕ ПРАПУСЦІМ»

ЧАРНЫШ Аляксандр Іванавіч, н. 15.5.1917 г. ў в. Кромавічы Докшыцкага раёна Віцебскай вобл. Скончыў Мар'інагорскі сельскагаспадарчы тэхнікум у 1935 г. З 1938 г. ў Чырвонай Арміі. Удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі ў 1939 г. і савецка-фінскай вайны. З чэрвеня 1941 г. на Ленінградскім, Закаўказскім, Беларускім і 1-м Беларускім франтах. Капітан, камандзір стралковай роты А. Чарныш вызначыўся 28—29.6.1944 г. пры вызваленні Магілёўскай вобл. 28.6.1944 г. рота пад яго камандаваннем каля г.п. Кіраўск атакавала праціўніка, які адступаў, знішчыла 170 і ўзяла ў палон 27 гітлераўцаў. 29.6.1944 г. рота прарвалася ў тыл праціўніка, захапіла ўчастак шашы Бабруйск—Мінск і адрэзала яму шлях да адступлення, адбіла 14 контратак, узяла ў палон 80 гітлераўцаў.

К.І.Чарныш каля магілы брата, Героя Савецкага Саюза А.І.Чарныша.

А.Чарныш загінуў у гэтым баі. Пахаваны ў брацкай магіле савецкіх воінаў у в. Чарніца на могілках.

... 1941 год, чэрвень. У сям'і старшыні калгаса Івана Сцяпанавіча Чарныша свята. Гонар бацькі, старэйшы сын Аляксандр, камандзір Чырвонай Арміі, святкуе заручыны. І раптам тэлеграма: «Вайна!» Зашчымела сэрца ў старога, пасуравеў позірк у маладога, палiліся слёзы з вачэй нявесты. Не ведалі яны, што бачацца апошні раз.

Са зброяй у руках Іван Сцяпанавіч абараняў сваю Радзіму ў партызанскім атрадзе, за што яго хату разам з дачкой Нінай, яе мужам і чатырма дзецьмі спалілі фашысты. Храбра змагаўся з ворагам яго сын Аляксандр.

Камандзір 9-й стралковай роты 457-га палка 129-й Арлоўскай Чырванасцяжнай стралковай дывізіі А.Чарныш ступіў на беларускую зямлю вясной 1943 г. Да гэтага абараняў Ленінград, ваяваў на Каўказе, раней быў удзельнікам вайны з белафінамі, за што ўзнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

28 чэрвеня 1944 г. ў раёне бабруйскага «катла» яго стралковая рота перагарадзіла шлях фашысцкай калоне, якая імкнулася вырвацца з акружэння. Нягледзячы на перавагу праціўніка, камандзір прыняў смелае рашэнне: ён загадаў роце падрыхтавацца і блізка падпусціць фашыстаў. Ураганным агнём ва ўпор байцы расстрэльвалі ланцугі варожых салдат. Праціўнік страціў 170 чалавек забітымі, а 27 варожых салдат і афіцэраў былі ўзяты ў палон разам з камандзірам гэтай групы.

У дзве гадзіны 29 чэрвеня, сабраўшы патрапаныя часці трох пяхотных і адной танкавай дывізій з 40 танкамі і самаходнымі гарматамі, гітлераўцы рушылі на нашы пазіцыі. Упередзе ішлі афіцэрскія падраздзяленні, за імі густымі ланцугамі — салдаты. Пагалоўна п'яныя фашысты лезлі напралом. Вастрыё гэтага ўдару акурат прыпала на пазіцыі 518-га і 457-га стралковых палкоў. На ўсход ад в. Панюшкавічы ў вельмі цяжкім становішчы апынулася артылерыйская батарэя 457-га палка на чале з лейтэнантам І.Ф. Маслоўскім. Ёй на дапамогу была кінута стралковая рота пад камандаваннем капітана Чарныша.

Удар роты па праціўніку быў нанесены раптоўна. І гітлераўцы пачалі адыходзіць. Капітан Чарныш павёў сваю роту ўперад, і супраціўленне ворага было канчаткова зломлена. Тады рота рушыла далей і, зайшоўшы ў тыл ворага, асядлала шашу на поўдзень ад в. Вінаградаўка. Камандзір разумеў, што гітлераўцы паспрабуюць адкінуць падраздзяленне ад гэтай магістралі, па якой ішло падмацаванне. Ён арганізаваў кругавую абарону, выслаў наперад разведчыкаў і выставіў назіральнікаў. Байцы акапаліся, камандзіры ўзводаў правяралі ўстаноўку кулямётаў і расстаўлялі людзей. Раптам радавы Казлоў падбег да камандзіра роты:

— Таварыш капітан, бачу вялікую групу фашыстаў!

З першага позірку Чарныш зразумеў, што на пазіцыі роты ідзе моцная група ворага і бой будзе нялёгкі...

— Да бою! — загадаў ён. І пакуль калона гітлераўцаў падыходзіла да пазіцыі, Чарныш абышоў байцоў, падбадзёрваючы іх:

— Загінем, але ворага не прапусцім! Будзем біцца да апошняга патрона.

Тым часам фашысты прынялі баявы парадак і пайшлі ў атаку. Іх сустрэў моцны агонь аўтаматаў і кулямётаў, трапныя стрэлы бранябойшчыкаў. Першая атака ворага захлынулася. Гітлераўцы, пакідаючы забітых і раненых на полі бою, адкаціліся назад. Але прыпынак быў кароткі — яны перагрупавалі свае сілы і зноў пайшлі напралом. Аднак і гэта атака захлынулася ў самым пачатку. За другой — трэцяя, затым чацвёртая. Гітлераўцы лезлі, як ашалелыя. Бой прымаў жорсткі характар. Усё бліжэй і бліжэй падыходзілі ворагі да агнявых пазіцый роты. Рады яе радзелі. Асколак міны трапіў капітану Чарнышу ў левую руку. Ён убачыў, што адарвала два пальцы, але сказаў санітару:

— Правая цэлая, значыць, яшчэ паваюю...

Не кідаючы кіраваць боем, ён і сам дапамагаў адбіваць варожыя атакі. Сустрэтыя моцным агнём, губляючы забітых і раненых, немцы зноў адступілі. У той бітве асабліва вызначыўся кулямётчык Грачыхін. Заўважыўшы гэта, ранены камандзір падышоў да яго, абняў адной рукой і пацалаваў. 14 разоў у той дзень узнімаліся гітлераўцы ў атаку на пазіцыі роты і кожны раз паварочвалі назад, бо не маглі зламаць стойкасць нашых байцоў. Але ў адной з апошніх атак варожая куля скасіла камандзіра роты Аляксандра Чарных. За смерць свайго камандзіра байцы адпомсцілі ворагу. Некалькі соцень салдат і афіцэраў засталіся ляжаць перад пазіцыямі роты. Вораг так і не змог прайсці ўперад і вырвацца з акружэння.

З.А.Валеева.

І.В.Багданаў.

А.А.Бурнашоў.

А.І.Данскіх.

Ф.М.Кустоў.

У БАБРУЙСКАЙ АПЕРАЦЫІ ТАКСАМА ВЫЗНАЧЫЛІСЯ:

БАГДАНАЎ Іван Васілевіч, н. 2.5.1942 г. ў с. Новасаратаўск, Азербайджан. Герой Савецкага Саюза (18.11.1944). На фронце з 1941 г. Камандзір гарматы старшы сяржант І.Багданаў вызначыўся ў чэрвені 1944 г. У баях за вызваленне Кіраўскага раёна Магілёўскай вобл. На шашы Бабруйск—Мінск разлік гарматы адрэзаў ворагу шлях да адступлення, знішчыў 250 і ўзяў у палон 15 гітлераўцаў. Цяжка паранены Багданаў заставаўся ў страі да канца бою.

БУРНАШОЎ Аляксандр Афінагенавіч, н. 17.12.1914 г. ў г. Зыранаўск, Казахстан. Герой Савецкага Саюза (25.9.1944). Працаваў на шахце. З 1941 г. на фронце. Камандзір гарматы старшына А. Бурнашоў вызначыўся пры фарсіраванні Бярэзіны каля Шчаткава. 29.6.1944 г. ў час контратакі праціўніка разлік гарматы выбыў са строю. Камандзір адзін працягваў весці агонь па ворагу, падбіў 4 самаходныя гарматы, 7 бронетранспарцёраў, 5 аўтамашын з боепрыпасамі. Пасля вайны працаваў у Казахстане, затым жыў у Крымскай вобл. Памёр 18.12.1974 г.

ДАНСКІХ Аляксандр Іванавіч, н. 23.2.1918 г. ў с. Верх-Баброўка Касіхінскага раёна на Алтаі. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). На фронце з 1943 г. — на 1-м і 3-м Беларускіх. Старшы сяржант А.Данскіх вызначыўся пры вызваленні Бабруйскага раёна. 26.6.1944 г. ўзвод пад яго камандаваннем захапіў замініраваны праціўнікам чыгуначны мост цераз р. Ала і выратаваў яго ад падрыву, чым садзейнічаў паспяховаму наступленню нашых войскаў. Пасля вайны працаваў шафёрам. Жыў у г. Назарава Краснаярскага краю.

КАРНІЕНКА Іван Майсеевіч, н. ў 1925 г. ў г.п. Лоцікава Славянасербскага раёна на Украіне. На фронце з 1942 г. Кулямётчык станковага кулямёта яфрэйтар І.Карніенка вызначыўся пры вызваленні Бабруйскага раёна. 30.6.1944 г. ў баі каля в. Шчаткава храбра адбіваў контратакі праціўніка, падпаліў лёгкі варожы танк і знішчыў каля 150 гітлераўцаў. На другі дзень полк заняў абарону на шашы каля в. Сычкава. Тут І. Карніенка таксама адбіваў шматлікія контратакі гітлераўцаў, якія спрабавалі вырвацца з бабруйскага «катла», і агнём свайго кулямёта знішчыў каля 160 гітлераўскіх салдат і афіцэраў. Загінуў у баі 18.1.1945 г.

КУСТОЎ Фёдар Міхайлавіч, н. 14.3. 1904 г. ў в. Малыя Ветхі Пашахонскага раёна Яраслаўскай вобл. У 1931 г. скончыў курсы ўдасканалення каманднага саставу, у 1932 г. партшколу. На фронце з чэрвеня 1941 г. Полк пад камандаваннем падпалкоўніка Ф. Кустова вызначыўся ў Бабруйскай аперацыі 26.6.1944 г.: на лясіста-балоцістай мясцовасці пад моцным агнём праціўніка ён авалодаў добра ўмацаванымі пунктамі каля вёсак Замен-Рыння, Дабравольшчына і Зялёная Дуброва Жлобінскага раёна. За тры дні баёў у раёне Бабруйска полк адбіў 10 варожых контратак, захапіў 5 гармат, 11 мінамётаў, 14 кулямётаў, 10 аўтамашын, знішчыў каля 400 гітлераўцаў. Пасля вайны — на савецкай рабоце ў г. Кіраўску. Памёр 24.2.1972 г.

МАСОНАЎ Мікалай Паўлавіч, н. 21.10.1905 г. ў рабочым пасёлку Васільсурск Ніжагародскай вобл. У Чырвонай Арміі з 1926 г. Скончыў Разанскую пяхотную школу

М.П.Масонаў.

А.М.Меркушаў.

К.І.Навумаў.

С.А.Палавін.

(1929). З чэрвеня 1941 г. на Заходнім, Бранскім, Беларускім і 1-м Беларускім франтах. Камандзір стралковай дывізіі палкоўнік М. Масонаў вызначыўся ў баях за вызваленне Бабруйска. Два палкі дывізіі пад яго камандаваннем прарвалі абарону праціўніка пад Рагачовам і выйшлі да Бярэзіны, у ноч на 29.6.1944 г. фарсіравалі яе і ўдзельнічалі ў вызваленні Бабруйска. На Бабруйскім напрамку дывізія знішчыла 48 танкаў і самаходных артылерыйскіх установак, захапіла 30 гармат, 22 мінамёты, 760 аўтамашын, 2 тысячы вінтовак, знішчыла каля 3700 і ўзяла ў палон 1500 гітлераўцаў. Загінуў 17.7.1944 г. Пахаваны ў брацкай магіле ў г.п. Свіслач Гродзенскай вобл.

МЕРКУШАЎ Аляксандр Максімавіч, н. 14.11.1918 г. ў г. Казань. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Да вайны працаваў на суднарамонтным заводзе ў г. Котлас. У Чырвонай Арміі з 1938 г. На фронце з ліпеня 1942 г. Удзельнік Сталінградскай і Курскай бітваў, вызвалення Беларусі, Польшчы. Старшы лейтэнант А. Меркушаў вызначыўся 28—29.6.1944 г. ў баях за в. Сычкава Бабруйскага раёна і на аўтамагістралі Бабруйск—Мінск. Стралковая рота пад яго камандаваннем адбіла 13 контратак, 7 разоў уступала ў рукапашны бой. Знішчыла каля 100 аўтамашын і больш за 200 гітлераўцаў. Да 1959 г. служыў у Савецкай Арміі, маёр. Да 1979 — на адміністрацыйнай і гаспадарчай рабоце. Жыве ў г.п. Плешчаніцы Мінскай вобл.

НАВУМАЎ Кандрат Іванавіч, н. 5.10.1918 г. ў с. Казачынскае Казачынска-Ленскага раёна Іркуцкай вобл. У Чырвонай Арміі з 1939 г. Скончыў Сызранскае танкавае вучылішча (1941), Ленінградскую вышэйшую афіцэрскую бранятанкавую школу (1944). Камандзір танкавага батальёна гв. капітан К. Навумаў вызначыўся ў Бабруйскай аперацыі. 26.6.1944 г. ў баі за чыгуначную станцыю Чорныя Брады з 4 танкамі знішчыў 2 процітанкавыя гарматы, падбіў гармату-самаходку праціўніка; 27.6.1944 г. на чале групы танкаў вызваліў умацаваны пункт Яловікі, падпаліў склад боепрыпасаў, падбіў танк; 28.6.1944 г. авалодаў паўночна-заходняй ускраінай Бабруйска, знішчыў калону аўтамашын. Памёр ад ран 2.9.1944 г. Пахаваны ў г. Рэчыца Гомельскай вобл.

ПАЛАВІН Сяргей Асаф'евіч, н. 3.9.1924 г. ў с. Залецына Кстоўскага раёна Ніжагародскай вобл. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). На фронце з 1943 г. Вызначыўся пры вызваленні Магілёўскай і Мінскай абласцей. 28.6.1944 г. ў баях на поўдзень ад в. Любоніч ў накірунку пераправы цераз р. Бярэзіну камандзір узвода станкавых кулямётаў лейтэнант С.Палавін фланговым кулямётным агнём забяспечыў паспяховую атаку стралковай роты, знішчыўшы 160 нямецкіх салдат і афіцэраў. 29.6.1944 г. яго кулямётны ўзвод стрымліваў націск праціўніка каля в. Шчаткава, дзе гітлераўцы імкнуліся авалодаць пераправай цераз Бярэзіну, за 13 гадзін бою адбіў 7 контратак, знішчыў больш за 300 гітлераўцаў. 30.6.1944 г. ўзвод стрымліваў націск праціўніка на шашы Бабруйск—Мінск. Цяжка паранены, С. Палавін не пакінуў поля бою.

ПЯРФІЛЬЕЎ Мікалай Аляксеевіч, н. 19.12.1921 г. ў с. Кузьмадзіна Юр'еў-Польскага раёна Уладзімірскай вобл. Герой Савецкага Саюза (22.8.1944). На фронце з 1941 г. Камандзір гарматы сяржант М. Пярфільеў вызначыўся ў баях пад Бабруйскам 27.6.1944

М.А.Пярфільеў.

В.М.Пятроў.

А.П.Селязнёў.

С.П.Уласенка.

г. на шашы Бабруйск—Мінск: з процітанкавай гарматы знішчыў 24 аўтамашыны і 2 процітанкавыя гарматы ворага. У баях 30.6.—1.7.1944 г. каля ст. Лапічы Асіповіцкага раёна адбіў 13 контратак, знішчыў 2 танкі і шмат жывой сілы праціўніка. Пасля вайны жыў і працаваў у г. Рыга. Памёр 14.9. 1972 г.

ПЯТРОЎ Вячаслаў Мікалаевіч, н. 4.2.1922 г. ў Яраслаўлі. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Скончыў Калінкавіцкае ваенна-пяхотнае вучылішча (1942), курсы малодшых лейтэнантаў (1942). З 1942 г. на Паўночна-Заходнім, Бранскім, 1-м і 3-м Беларускіх франтах. Вызначыўся ў Бабруйскай аперацыі. 29.6.1944 г. каля в. Шчаткава ўзвод аўтаматчыкаў пад камандаваннем старшага лейтэнанта В. Пятрова адбіў 10 контратак праціўніка, які пры падтрымцы танкаў спрабаваў вырвацца з акружэння. У баі В. Пятроў замяніў загінуўшага камандзіра роты і ўгрымліваў заняты рубеж. Асабіста знішчыў больш за 300 гітлераўцаў. Пасля вайны скончыў курсы «Выстрал» (1956) і да 1972 г. служыў у Савецкай Арміі, палкоўнік.

СЕЛЯЗНЁЎ Анатоль Пятровіч, н. 29.1.1923 г. ў в. Ярушнікава Кацельніцкага раёна Кіраўскай вобл. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Скончыў Свярдлоўскі юрыдычны інстытут (1957). У студзені 1942 г. добраахвотнікам пайшоў у Чырвоную Армію. Лейтэнант, камандзір стралковага ўзвода А. Селязнёў вызначыўся ў Беларускай аперацыі. 27.6.1944 г. яго ўзвод адзін з першых пераправіўся цераз р. Ала каля в. Мікулічы Бабруйскага раёна, атакаваў праціўніка і разам з ротай, што падышла на дапамогу, вызваліў вёску, захапіў абоз, знішчыў амаль узвод гітлераўцаў. Двойчы паранены, не пакінуў поля бою. 3.7.1944 г. ў баі ўзначаліў дэсантную роту, якая каля в. Вузляны Рудзенскага раёна адбіла 6 контратак ворага.

І.Р.Усацюк.

УЛАСЕНКА Сяргей Платонавіч, н. 26.6.1909 г. ў с. Яблынева Оржыцкага раёна Палтаўскай вобл. Герой Савецкага Саюза (28.8.1944). У Чырвонай Арміі з 1941 г. З 1942 г. на Цэнтральным, Бранскім, 1-м Беларускім франтах. Камандзір гарматы старшы сяржант С. Уласенка вызначыўся пры вызваленні Магілёўскай і Мінскай абл. 27.6.1944 г. ў баі каля в. Сычкава Бабруйскага раёна пад абстрэлам праціўніка агнём гарматы з адкрытай пазіцыі знішчыў 8 аўтамашын і некалькі дзесяткаў гітлераўцаў. 30.6.1944 г. ў баях за плацдарм на левым беразе Свіслачы каля в. Лапічы Асіповіцкага раёна знішчыў 2 варожыя танкі, гармату; цяжка паранены, удзельнічаў у адбіцці 8 контратак праціўніка. Усяго разлік гарматы пад камандаваннем С. Уласенкі знішчыў 6 танкаў, 5 гармат, склад боепрыпасаў, 3 мінамёты, 7 станкавых кулямётаў, 9 аўтамашын, 2 цягачы з гарматамі, больш за 300 гітлераўцаў. Памёр ад ран у верасні 1944 г.

УСАЦЮК Іван Раманавіч, н. 24.6.1917 г. ў пас. Аджамаўка Алтайскага краю. Герой Савецкага Саюза (26.10.1944). На фронце з 1941 г. Наводчык гарматы сяржант І.Усацюк вызначыўся пры вызваленні Гомельскай і Магілёўскай абл. 24.6.1944 г. ў час прарыву варожай абароны на р. Друць каля Рагачова агнём з гарматы знішчыў некалькі агнявых кропак праціўніка, чым спрыяў захопу першай лініі абароны ворага. 30.6.1944 г. ў баі за в. Краснае Бабруйскага раёна разлік гарматы загінуў. І.Усацюк, застаўшыся адзін, адбіваў контратаку гітлераўцаў, якія спрабавалі вырвацца з акружэння.

Пад Цітаўкай, Шчаткавам і Сычкавам

У АГНІ НЕ БЫЛО БРОДУ

Калі ў чэрвені 1944 г. войскі Беларускага фронту перайшлі ў наступленне, нашаму 518-му стралковаму палку была пастаўлена задача забяспечыць фарсіраванне Бярэзіны ў раёне Шчаткава. У гэты раён быў тэрмінова перакінуты 2-гі батальён палка. Адразу перадавая група разведкі сапёраў пад камандаваннем лейтэнанта Б.В.Чарнышова знішчыла немцаў, якія ахоўвалі мост, і авалодала ім. Тым часам падышлі асноўныя сілы 518-га палка. На заходнім беразе Бярэзіны ў раёне Шчаткава завязаўся жорсткі бой з пераўзыходзячымі сіламі праціўніка.

Нашаму 1-му батальёну камандзір палка палкоўнік Ф.Г.Самойленка паставіў задачу выйсці з-за правага фланга 2-га батальёна ў раён Яловікаў, перарэзаць дарогу Бабруйск—Мінск, каб не дапусціць прарыву праціўніка ў паўночна-заходнім напрамку. Батальён выканаў гэту задачу, нягледзечы на шалёнае супраціўленне ворага і яго бясконцыя контратакі.

Дзесяткі контратак з танкамі, бронетранспарцёрамі былі адбіты і 28 чэрвеня ў размяшчэнні 1-га батальёна. Усе яны разбіваліся аб мужнасць нашых салдат і афіцэраў. У гэтых баях загінулі камандзір кулямётнай роты Разанцаў, камандзір узвода сувязі старшы сяржант Боўт, намеснік камандзіра батальёна капітан Кальшаў, камсорг лейтэнант Бірман і многія іншыя.

Нашымі войскамі было знішчана звыш 800 немцаў, узята ў палон больш за 1000 чалавек, у тым ліку 20 афіцэраў, захоплена многа танкаў, транспарцёраў, гармат, аўтаматаў.

29 чэрвеня праціўнік зноў паспрабаваў наладзіць контратакі, але поспеху не дасягнуў і пачаў здавацца ў палон. Я ў многіх баях прымаў удзел, але такога страшэннага бою, як у раёне Бабруйска, не бачыў. Там бушаваў пякельны вогненны смерч, у якім не было броду.

М.Жаркі, былы камандзір 1-га батальёна 518-га стралковага палка.

Стаялі насмерць

Наша 356-я Калінкавіцкая стралковая дывізія, змяніўшы днём 28 чэрвеня 1944 г. часці першага гвардзейскага танкавага корпуса на рубяжы Крывы Крук—Яловікі—Каменка, мела задачу не дапусціць прарыву фашыстаў з бабруйскага «катла».

У ноч на 24 чэрвеня я дзяжурыў на дывізіённай радыёстанцыі, якая трымала сувязь са штабам корпуса і штабам 65-й арміі. На радыёпрыёмніку падслухоўвання дзяжурыў перакладчык, які перахапіў перададзеную адкрытым тэкстам радыёграму гітлераўскага камандавання з Мінска. У ёй гітлераўскаму каменданту г. Бабруйска генералу Гаману загадвалася прарывацца з акружанай групоўкай войскаў праз Сычкава на паўночны захад. Аб радыёграме было неадкладна паведамлена камандзіру 356-й стралковай дывізіі генерал-маёру Міхаілу Рыгоравічу Макараву.

У гэтую ж ноч над Бабруйскам з'явіліся транспартныя самалёты праціўніка і на грузавых парашутах пачалі скідваць боепрыпасы і харчаванне акружаным нямецкім ваякам. Некалькі грузавых парашутаў скінулі і на нашу пазіцыю. Было зразумела, што фашысты рыхтуюцца да прарыву. І мы чакалі іх атак.

У 1 гадзіну 30 мінут 29 чэрвеня пасля моцнага артылерыйска-мінамётнага абстрэлу гітлераўскія полчышчы пайшлі на прарыў. На-

перадзе рухаліся танкі. За імі — п'яныя афіцэры, а потым салдаты. Мы адкрылі агонь з усіх відаў зброі, фашысты гінулі, як мухі. Баі даходзілі да рукапашнай. Усе нашы байцы, здольныя трымаць зброю, стаялі насмерць. У баі ўдзельнічалі нават санітаркі.

Тая бітва мне запомнілася на ўсё жыццё. Шмат мы страцілі салдат і афіцэраў за некалькі гадзін бою, аднак гітлераўцаў было знішчана ў некалькі разоў больш. Мне даводзілася ўдзельнічаць у многіх баях, але такой колькасці фашысцкіх трупаў, што ляжалі ўздоўж Мінскай шашы, я не бачыў ніколі.

Раніцай 29 чэрвеня Бабруйшчына была вызвалена ад гітлераўскіх захопнікаў. У гэты ж дзень наша камандаванне арганізавала групу пошукаў фашыстаў. За два дні байцамі нашай дывізіі іх было ўзята ў палон каля 5 тысяч.

А. Свешнікаў, былы асабісты радыст камандзіра 356-й Калінкавіцкай ордэнаў Суворава II ступені і Чырвонага Сцяга стралковай дывізіі.

«Усё роўна не пройдзеце!»

Ноччу прыйшоў баявы загад — да світання выйсці да р. Бярэзіны, авалодаць мостам і плацдармам на заходнім беразе за пяць кіламетраў на поўнач ад Бабруйска. Байцы ўзмоцненага батальёна ўскочылі на грузавікі і пад агульным камандаваннем намесніка камандзіра палка маёра Ф. П. Бучнева рушылі ў нялёгкі шлях. Збіваючы разрозненыя групы праціўніка, перадавы атрад прайшоў амаль 30 кіламетраў і выйшаў да пераправы. На вачах байцоў немцы закладвалі ўзрыўчатку пад апоры моста, але падпаліць бікфордаў шнур не паспелі.

Разведчыкі дывізіі і байцы 5-й роты лейтэнанта Селязнёва так імкліва накінуліся на ворага, што гітлераўцы пачалі ўцякаць. Іх даганялі нашы кулі. Вёска Шчаткава і невялікі плацдарм аказаліся ў руках перадавога атрада. Яму на дапамогу прыйшлі сапёры дывізіі і іншыя падраздзяленні палка.

Апамятаўшыся ад раптоўнага ўдару і падцягнуўшы рэзервы, фашысты ў суправаджэнні «фердынандаў» з дзікімі крыкамі перайшлі ў контратаку. Яны ў што б там ні стала спрабавалі вярнуць пераправу і выручыць сваіх.

Камсорг П. Завадскі з дзесяццю баявымі таварышамі ўтрымліваў безыменную вышыню на поўдзень ад вёскі Шчаткава.

— Да апошняга будзем стаяць, сябры! — пераканаўча сказаў Завадскі, набіваючы патронамі пусты дыск аўтамата. Камсорг верыў у сваіх таварышаў.

«Немцы зноў пайшлі ў контратаку, — хуценька занатаваў Завадскі ў сваёй запісной кніжцы 28 чэрвеня 1944 г. — Са мной старшы лейтэнант Калодка, лейтэнант Гусараў, Падалякоў, аўтаматчык Міронаў, разведчык Еўдакімаў, малодшы сяржант Малахаў, яфрэйтары Пісарэнка, Падольцаў, Абелмазаў. Утрымліваем вышыню і ўпарта адбіваем контратакі немцаў. Двое з нашай групы загінулі смерцю храбрых. Усе змагаюцца гераічна... Не бачыць фрыцам пераправы як сваіх вушэй. Яны не прайшлі да в. Шчаткава і ніколі не пройдуць да моста...»

14 гадзін цягнуўся гэты няроўны бой. Падалі байцы, не хапала патронаў і гранат. У жывых застаўся адзін Завадскі.

«Усё роўна не пройдзеце, гады!» З высока ўзнятай апошняй гранатай у руцэ ён, ранены, сцякаючы крывёю, устаў на поўны рост і, сабраўшы рэшткі сваіх сіл, кінуўся на ланцуг атакуючых фашыстаў. Раздаўся аглушальны выбух... Хлопцу было тады ўсяго 20 год.

Старшага лейтэнанта П. Завадскага з воінскай пашанай пахавалі на могілках паблізу той вышыні, якую ён абараняў. Засталіся яго запісная кніжка і светлая памяць аб ім. Жыхары в. Шчаткава і наваколля часта прыходзяць сюды і ўскладаюць кветкі на магілу камсорга, расказваюць пра яго сваім дзецям.

П. Курсаў, гвардыі палкоўнік у адстаўцы, былы начальнік штаба 129-й Арлоўскай стралковай дывізіі.

І паставілі кропку

Пасля вызвалення г. Калінкавічы наша стралковая дывізія атрымала адпачынак. Мы стаялі недалёка ад Мазыра. Нечакана прыйшоў загад накіравацца ў раён Бабруйска для знішчэння акружанай там буйной нямецкай групоўкі.

Раніцай 30 чэрвеня 1944 г. мы селі на аўтамашыны і к канцу дня занялі абарону па

дарозе Бабруйск—Мінск. Наша задача — не даць праціўніку вырвацца з акружэння. Часці дывізіі без мітусні прывялі сябе ў баявы парадак і з гадзіны на гадзіну чакалі ворага.

Уперад была выслана ўзмоцненая баявая ахова. Байцы яе акапаліся за дрэвамі. У лесе і на дарозе стаяла мёртвая цішыня. Нават галасоў птушак не чуваць было. Але цішыня гэта была падманлівая. Ніхто з воінаў не спаў. Салдаты пільна ўглядаліся ў цемру. І вось на дарозе паказаліся людзі.

— Стой! Хто ідзе? — крыкнуў вартавы.

Цені кінуліся ўбок і зніклі ў цемры. Нямецкія разведчыкі прытаіліся ў лесе, думалі перачакаць трывогу, устанавіць, якія ў нас сілы, але былі акружаны і ўзяты ў палон. Ад іх камандаванне дывізіі даведалася, што з Бабруйска на Мінск рухаюцца буйныя сілы праціўніка. Па дывізіі быў аддадзены баявы загад: быць усім напагатове, падпусціць ворага як мага бліжэй.

Гадзіны праз дзве здалёк пачуўся гул матораў. Гітлераўцы ішлі шчыльнымі калонамі. І раптам на іх абрушыўся шквал агню з усіх відаў зброі. Фашысты, усцілаючы дарогу трупамі, кінуліся назад. Але праз некаторы час яны пайшлі ў атаку. Усведамляючы сваю асуджанасць, немцы лезлі напралом, не лічачыся са стратамі. Нашы воіны не адступалі ні на крок. Месцамі справа даходзіла да рукапашнай. Гітлераўцы не вытрымалі і адкаціліся назад, пакінуўшы на полі бою шмат забітых, раненых, ваеннай тэхнікі.

Праз тры гадзіны яны паўтарылі атаку. Але і на гэты раз нічога не атрымалася. Пасля трэцяй спробы вырвацца з акружэння вораг быў канчаткова разгромлены. Рэшткі яго недабітых часцей рассеяліся па лесе, спадзеючыся дробнымі групамі «прасачыцца» на захад. Але за два дні мы і іх пералавілі.

П.Смірноў, былы воін Калінкавіцкай стралковай дывізіі.

Удар 16-й паветранай

...Разведка 16-й паветранай арміі паказала, што групоўка праціўніка пачала канцэнтравацца ў раёне вёсак Цялуша, Ступяні, Дубоўка, Савічы, дзе сабралася каля 150 танкаў і САУ, каля 1000 гармат, каля 6000 аўтамашын. Галава вялізнай калоны ў некалькі радоў выцягнулася ля Савічаў у напрамку в. Цітаўкі. Уперадзе былі танкі і САУ, артылерыя размяшчалася па-за калонай для вядзення агню. Было ясна, што праціўнік уначы рыхтаваў прарыў у паласе 9-га танкавага корпуса, каб вывесці сваю групоўку на поўнач. Але 108-я стралковая дывізія яшчэ не падышла, таму дапамагчы корпусу можна было толькі авіяцыяй.

Камандуючы фронтам генерал К.К. Ракасоўскі загадаў генералу Рудэнку нанесці масіраваны паветраны ўдар. Былі падняты 526 самалётаў 16-й паветранай арміі.

Стаяў ясны ціхі вечар. Першыя групы самалётаў з'явіліся над цэллю ў 19 гадзін 15 мінут. Па ёй немцы адкрылі моцны зенітны агонь, але хутка батарэі ворага прымусілі змоўкнуць нашы штурмавікі. Групы нашых бамбардзіроўшчыкаў наносілі ўдар па вялізнай калоне ад Цітаўкі да Савічаў і па прылеглых лясах. Авіяцыя праціўніка над полем бою не з'яўлялася. Знішчальнікі, выдзеленыя для барацьбы з ёю, таксама сталі наносіць удары па наземных цэлях. Ужо два дні не было дажджу. Ад дзённай спёкі ўсё вакол высахла. У месцах канцэнтрацыі ворага адзін за другім успыхвалі пажары, часам загараўся лес. Клубы чорнага дыму ўзнімаліся на 300—400 м. Гарэла нямецкая тэхніка, гаручае, ірваліся боепрыпасы. Дым змешваўся з пылам, падымаўся высока ў паветра. Па сведчаннях відавочцаў, гітлераўцы ў паніцы прынялі гэты дым за атрутны газ і, надзеўшы процівагазы, сталі разбягацца. Многія вадзіцелі аўтамашын і ездавыя спрабавалі выбрацца з гушчару лесу на паляну, але тут іх чакаў пушачна-кулямётны агонь нашых штурмавікоў і знішчальнікаў. Некаторыя стараліся ўратавацца, з'язджаючы з дарогі, аднак засядалі ў балоце ці натыкаліся на пні. Частка варожых танкаў і аўтамашын працягвала рухацца па дарозе да в. Цітаўка і непазбежна трапляла пад удар нашай авіяцыі. Дарогу загрувасціла разбітая палаючая тэхніка. Некаторыя шафёры выязджалі на чыгуначны насып (вышынёй да 3—5 м) і спрабавалі па ім прабіцца ў бок Бабруйска.

Праз гадзіну пасля таго, як разарваліся першыя бомбы, раёны скопішча нямецкіх войскаў і тэхнікі аказаліся закрытымі шчыльнымі воблакамі дыму і пылу, што ўскладніла наступныя дзеянні нашай авіяцыі. Але бомбы працягвалі сыпацца на галовы звар'яцелага ворага.

У выніку сканцэнтраванага ўдару кіраванне варожымі войскамі было парушана. Яны зусім страцілі баяздольнасць. Лётчыкі-разведчыкі расказвалі, як па дарогах і ў лясах сярод дрэў і балот кідаліся з жахам коні і салдаты, бязладна цягнуліся ў розных напрамках нямецкія танкі, аўтамашыны і павозкі. Ашалелыя фашысты кідалі тэхніку, зброю, нарабаваныя рэчы і беглі да Бярэзіны, дзе ўплаў пад покрывам ночы перапраўляліся ў Бабруйск.

Многія не даплывалі да берага, танулі. Бомбаштурмавы ўдар 16-й паветранай арміі закончыўся, калі апусціўся вячэрні змрок. Усяго за 90 мінут авіяцыяй было скінута 1127 фугасных бомбаў, 4897 асколачных і 5326 процітанкавых, выпушчаны 572 рэактыўныя снарады, 27 888 пушачных снарадаў, зрасходавана 45 440 кулямётных патронаў. Раён, падвергнуты бамбардзіроўцы, ператварыўся ў могілкі для ворага і яго тэхнікі.

У раёне авіяцыйнага ўдару было знішчана і пашкоджана да 150 танкаў і штурмавой зброі, каля 1000 гармат рознага калібру, да 6000 аўтамашын, да 300 цягачоў і 3000 павозак, знішчана больш за 1000 варожых салдат і афіцэраў, да 1500 коней, рассеяна каля 5500 салдат і афіцэраў. На месцы разгрому фашысцкіх часцей засталося шмат трафеяў. Доўга яшчэ пасля вайны тут стаяла разбітая тэхніка.

Удар быў нанесены без **якіх-небудзь** страт з нашага боку. *М.Данілаў.*

Бранякатэры на Бярэзіне

Перад караблямі Дняпроўскай ваеннай флатыліі была пастаўлена задача падтрымаць перадавыя часці пры прарыве нямецкай абароны на берагах Бярэзіны і Прыпяці, прыняць удзел у вызваленні прырэчных гарадоў і населеных пунктаў. З гэтай мэтай на Бярэзіну была накіравана першая брыгада флатыліі пад камандаваннем капітана другога рангу С.М.Лялько. Караблі імкліва рухаліся наперад разам з войскамі, пераадольваючы бонавыя загароды, знішчаючы пераправы, высаджваючы дэсанты. Галоўнай ударнай сілай флатыліі былі бранякатэры. Прысадзістыя, быстраходныя, манеўраныя і добра ўзброеныя, яны былі на рацэ грознай сілай.

Авалодаўшы вёскамі Парычы і Даманова, важнымі апорнымі пунктамі немцаў, перадавыя часці пры падтрымцы бранякатэраў працягвалі імклівае наступленне на Бабруйск. Вечарам 27 чэрвеня яны падышлі да паўднёва-ўсходняй яго ўскраіны, прынялі ўдзел у агульнай артылерыйскай падрыхтоўцы штурму горада. Каб разведаць абстаноўку і атрымаць звесткі аб стане чыгуначнага моста і перапраў праціўніка, гвардзейскія бранякатэры капітана трэцяга рангу А.І.Пяскова 28 чэрвеня пад агнём ворага двойчы прарваліся да межаў горада. З кароткай дыстанцыі камендоры і кулямётчыкі білі па пераправах, ва ўпор расстрэльвалі немцаў, якія спрабавалі перабрацца з левага берага на правы і злучыцца з гарнізонам, што абараняў горад.

Тым часам войскі, якія разграмілі нямецкую групоўку, падышлі да Бярэзіны. Аднак фарсіраваць яе з ходу не было магчымасці. Тады камандаванне прыняло рашэнне перакінуць войскі караблямі флатыліі. Пачалася масавая іх пераправа. У ёй прынялі ўдзел тральшчыкі, вартавыя катэры, трафейныя баржы і дапаможныя судны. Усе працавалі кругласутачна. І за паўтара сутак маракі перавезлі на правы бераг некалькі дзесяткаў тысяч воінаў са зброяй і баявой тэхнікай. З гэтай адказнай задачай маракі справіліся бліскуча.

Войскі адразу ж уступалі ў бой, а бранякатэры працягвалі падтрымліваць іх артылерыйска-кулямётным агнём. На світанні 29 чэрвеня гвардзейцы ўварваліся ў Бабруйскі порт, стварылі штурмавыя групы. Маракі ўнеслі паніку ў стан ворага. А ў гэты час увайшлі ў горад і перадавыя часці, якія наступалі ўздоўж левага берага Бярэзіны. Чыгуначны мост цераз раку немцы ўзарвалі. Таму войскі зноў давялося перапраўляць на караблях. І на гэты раз маракі з гонарам выканалі загад камандавання, аказалі неацэнную дапамогу і падтрымку сухапутным часцям. Разам з імі маракі пайшлі і на штурм горада.

Высокія ўзоры мужнасці і гераізму, воінскага ўмення, самаадданага выканання абавязку перад Радзімай паказалі старшыя лейтэнанты Плехаў, Цэйтлін, Маркоўскі, старшыны Цуркан, Мядзведзеў, Яхніс, Крукаў, матросы Андрыянаў, Чарнышоў, Чычкоў і інш. У баях за Бабруйск атрад гвардзейскіх бранякатэраў знішчыў 18 варожых гармат, 11

дзотаў, 4 танкі і да двух батальёнаў пяхоты. Вялікую дапамогу часцям на подступах да Бабруйска аказалі катэры-тральшчыкі пад камандаваннем старшага лейтэнанта Селянкіна.

Наступальны парыў нашых маракоў быў такі моцны, што нават раненыя працягвалі заставацца на сваіх баявых пастах. Кулямётчык матрос Андрыянаў у час бою быў цяжка паранены. Храбрацу дазволілі пакінуць пост і пайсці на перавязку. Але воін застаўся ў страі. Нямецкая куля другі раз крамсанула марака, аднак ён зноў не пакінуў свой кулямёт.

Гэтак жа заўзята змагаўся і рулявы тральшчыка матрос Абрамаў. Цяжка паранены, ён не кінуў штурвал, працягваў весці катэр да таго часу, пакуль не страціў прытомнасць. Па-геройску ваявалі матарысты матрос Чарнышоў і старшына другой статці Мядзведзеў. У час бою Чарнышоў з дазволу камандзіра пакінуў машыннае аддзяленне, стаў за буйнакаліберны кулямёт і стаў весці трапны агонь па ворагу. Ён знішчыў некалькі агнявых кропак і дзесяткі фрыцаў. Чарнышова раніла, але ён змаўчаў. Нікому не сказаў храбрэц і аб другім раненні.

Бясстрашныя артылерыйскія разведчыкі пад камандаваннем старшага лейтэнанта Мядзведзева, сышоўшы з караблёў на бераг, блізка падкрадваліся да размяшчэння праціўніка, засякалі яго агнявыя кропкі, месцы скопішча войскаў. Гэтыя звесткі затым па рацыі перадавалі на караблі, і артылерысты неадкладна адкрывалі трапны агонь.

Калі на адным з тральшчыкаў быў забіты кулямётчык, яго замяніў матрос мінёр Серабракоў. Неўзабаве ён агнём з кулямёта падавіў дзве агнявыя кропкі праціўніка, але быў ранены. Пасля гэтага тральшчыку трэба было прайсці замініраваны ўчастак ракі. Нягледзячы на раненне, марак смела кінуўся ў ваду, заклаў зарад і падарваў мінную загароду.

Выдатныя баявыя дзеянні маракоў-дняпроўцаў высока ацэнены камандаваннем фронту. Першай брыгадзе рачных караблёў прысвоена назва «Бабруйская», многія воіны атрымалі ордэны і медалі. *А.Пешкін.*

Вызваляў свой раён

Бабруйчаніна Васіля Фаміча Бароўскага вайна застала ў Беластоку. За некалькі месяцаў перад гэтым на яго пятліцах з'явіліся кубікі тэхніка-лейтэнанта авіяцыі. Першыя кровапралітныя баі з гітлераўцамі — і першыя няўдачы. 9-я авіяцыйная дывізія, дзе служыў Васіль Фаміч, трапіла ў акружэнне. Па непраходных балотах, невялікімі групамі, хаваючыся ў лясах, стомленыя, галодныя, але не пераможаныя, воіны шукалі сустрэчы са сваімі часцямі.

У гэтых пошуках лейтэнант Бароўскі ў пачатку 1942 г. трапіў у 1-ю Бабруйскую партызанскую брыгаду, якой камандаваў Віктар Лівенцаў. Тут ён хутка асвоіў справу мінёра і стаў смелым падрыўніком. Дыверсійная партызанская група, у якую ўваходзіў Васіль Фаміч, пускала пад адхон паязды ў Асіповіцкім і Бабруйскім раёнах, актыўна ўдзельнічала ў «рэйкавай вайне». А праз чатыры месяцы лейтэнант Бароўскі разам са сваімі сябрамі быў перакінуты на самалёце цераз лінію фронту ў горад Нова-Зыбкаў. Тут была сфарміравана 7-я мотапантонная брыгада (рэзерв Галоўнага камандавання), у складзе якой і закончыў вайну Васіль Фаміч.

З сябрамі-мотапантоншчыкамі яму пашчасціла вызваляць родны Бабруйск.

...Механізаванай пантоннай роце капітана Казакова было загадана тэрмінова заняць абарону на заходнім беразе ракі Бярэзіны непадалёку ад вёскі Шчаткава і ўтрымліваць Шчаткаўскі мост, які меў вялікае стратэгічнае значэнне і ў той час быў ужо ачышчаны ад немцаў.

Увечары камандзір роты выклікаў да сябе старшага лейтэнанта Бароўскага (у той час Васіль Фаміч быў намеснікам камандзіра роты па тэхнічнай частцы).

— Вам даручана камандаванне па абароне Шчаткаўскага моста. Ёсць меркаванні, што менавіта ў гэтым напрамку гітлераўцы паспрабуюць вырвацца з акружэння, — сказаў капітан Казакоў і схіліўся над картай. — Давайце падумаем над планам абароны.

А праз гадзіну Васіль Фаміч аддаваў загады па ўмацаванні прылеглай да моста тэрыторыі. У яго распараджэнні было 140 байцоў, ручныя і станковыя кулямёты, гранаты. Салдаты хутка акапаліся і занялі абарончыя рубяжы. Два станковыя кулямёты размясцілі па флангах, трэці — крыху ўперадзе, каб можна

было весці перакрыжаваны агонь. Мост у васьмі месцах на ўсялякі выпадак замініравалі. Ззаду воінаў прыкрывала артылерыйская батарэя:

Перабрацца на заходні бераг ракі фашысты маглі толькі па Шчаткаўскім мосце. Праз гэтую пераправу яны і паспрабавалі прасачыць. 27 чэрвеня гітлераўскае камандаванне кінула на штурм Шчаткаўскага моста больш як тысячу салдат. Іх падтрымлівалі танкі, артылерыя, мінамёты і кулямёты.

Грозную фашысцкую лавіну нашы воіны сустрэлі шквальным агнём з усіх відаў зброі. Звыш трох гадзін цягнуўся бой. Зямля пакрылася трупамі фашыстаў, а атакі гітлераўцаў не спыніліся. Становішча было цяжкае. Вораг пашкодзіў тры нашы гарматы, знішчыў два кулямёты, многа было забітых, раненых, боепрыпасы канчаліся. Старшы лейтэнант Бароўскі далажыў абстаноўку генералу Якаўлеву..

— Трымацца да апошняга патрона, хутка прыйдзе дапамога, — загадаў камандзір брыгады.

А фашысты ўсё бліжэй і бліжэй падыходзяць да моста. Ужо чутны іх галасы, бачны фігуры. Да берага ракі застаецца дваццаць метраў... пятнаццаць... дзесяць...

— Падрыхтавацца да атакі, — скамандаваў старшы лейтэнант Бароўскі.

Але байцы не паспелі падняцца ў рукапашную схватку. Дружны залп «кацюш» адкінуў гітлераўцаў назад і прымусіў адмовіцца ад прарыву. Жалезнае кольца савецкіх войскаў самкнулася. Шматтысячная групоўка праціўніка капітулявала. 29 чэрвеня над Бабруйскам узвіўся чырвоны сцяг.

За вызваленне Бабруйска Васіль Фаміч быў удастоены ордэна Чырвонай Зоркі. Потым старшы лейтэнант Бароўскі ўдзельнічаў у вызваленні Мінска, Баранавічаў, фарсіраваў Одэр, дайшоў да Берліна. Акрамя ордэна Чырвонай Зоркі ён узнагароджаны двума ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступені і сямю медалямі. *С.Кобля.*

Загінуў камуністам

Батарэя гвардыі старшага лейтэнанта Ілюшэнкі, прыдадзеная 356-й стралковай дывізіі 105-га стралковага корпуса, пасля шматдзённых баёў падышла да Бабруйска і спынілася ля населенага пункта Сычкава, чакаючы падвозу боепрыпасаў. Выкарыстоўваючы кароткае зацішша, артылерысты прыводзілі сябе ў парадак, пісалі пісьмы.

— Абельханаў, нікуды не адыходзь, зараз пачнецца партыйны сход, — папярэдзіў Садыка парторг батарэі гвардыі старшы сяржант Буброўскі.

Камуністы сабраліся каля адной з 76-мілімітровых гармат: хто прама сеў на траву, а хто — на станіну. Заяву Абельханава зачытаў старшыня сходу гвардыі сяржант Матросаў: «Прашу прыняць мяне ў члены партыі...»

— Якія будуць пытанні да таварыша Абельханава? — спытаў сяржант Матросаў.

— Якія могуць быць пытанні, калі мы больш як два гады ваюем з ім побач? — пачуліся галасы.

— А няхай раскажа пра сябе, — сказаў хтосьці з артылерыстаў.

— Дваццаць адзін год спаўняецца мне якраз сёння, 25 чэрвеня, — пачаў Садык. — Нарадзіўся ў Чырвонаакцябрскім раёне, у татарскім сяле Трохазёрскі Горкаўскай вобласці. Скончыў сельскую сямігодку, а калі сям'я пераехала ў горад Горкі — і дзесяцігодку. Уступіў у камсамол. Вельмі хацеў вучыцца ў медыцынскім інстытуце, а тут — вайна. Выконваю даручэнні агітатара, выпускаю батарэйную газету. Ваюю, як усе... Два браты, камуністы, б'юць фашыстаў, бацька працуе на заводзе, маці — дзяжурная ў шпіталі, дзве сястры, камсамолкі, працуюць медыцынскімі сёстрамі ў шпіталях Горкага...

Камуністы добра ведалі акуратнага, заўсёды ветлівага, спагадлівага баявога сябра, камандзіра гарматнага разліку Садыка Абельханава. На яго грудзях ужо ззялі ордэны Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны II ступені, Славы II і III ступеняў, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі», «За абарону Сталінграда», нагрудны знак «Гвардыя». Усім прысутным памятныя баі за Парычы, на Бярэзіне, пад Глушай, у якіх вызначыўся гвардыі старшы сяржант Абельханаў.

...Раніцай у раён вёскі Сычкава фашысты накіравалі танкі, самаходкі, пяхоту. На артылерыстаў абрушыліся снарады, міны, авіябомбы. Паветра, здаецца, не вытрымае ўсяго гэтага. А людзі стаяць, змагаюцца да апошняга патрона. Гвардзейскі разлік камуніста

Абельханава не прапускае ворага ні ў Бабруйск, ні з Бабруйска. Вакол пазіцыі мноства фашысцкіх трупаў, падбітых танкаў, бронетранспарцёраў, самаходак, матацыклаў...

Раніцай 30 чэрвеня ён застаўся адзін ля гарматы.

— Ці ёсць тут хто жывы? — пытае чыйсьці голас.

Садык убачыў яфрэйтара з камсамольскім значком на грудзях.

— Як жа нам цяпер, а? — пытае той.

— А вось так, — адказвае камандзір гарматы. — Ты дапамагай: нясі снарады і ўстаўляй іх у казённік, зразумеў? Я камуніст і не адступлю ні на крок.

І яны, камуніст і камсамолец з узводу пяхоты, вядуць знішчальны агонь па фашысцкіх калонах. Вечарам варожы снарад трапіў у незнаёмага памочніка камандзіра гарматы, а асколкам чацвёрты раз параніла Абельханава. Ён робіць, збіраючы сілы, свой апошні выстрал па ворагу...

Гвардыі старшаму лейтэнанту Ілюшэнку і мне давялося абыходзіць пазіцыі батарэі. Мы ўбачылі 13 спаленых танкаў, 4 самаходкі, безліч трупаў ворага. На нас глядзела пашкоджаная ў баях 76-міліметровая гармата. Вакол яе — загінуўшы баявы разлік разам з камандзірам, камуністам, гвардыі старшым сяржантам Садыкам Абельханавічам Абельханавым.

А.Крываротаў, ветэран Вялікай Айчыннай вайны.

Выстаялі і перамаглі

У ноч на 29 чэрвеня 1944 г. драўляны мост цераз Бярэзіну, што каля Шчаткава, стагнаў ад цяжкай ваеннай тэхнікі. У цемры на малой хуткасці ішлі танкі, самаходныя гарматы, бронетранспарцёры. За імі — аўтамашыны, гружаныя боепрыпасамі, цягачы з прычапнымі гарматамі. Здавалася, няма канца сталёвай чарадзе, што накіравалася на захад.

Раніцай, яшчэ ў цемры, цягачы з гарматамі 1071-га знішчальна-супрацьтанкавага артпалка размясціліся на правым беразе ракі. Тут, за пераправай, атрымалі загад: «Устанавіць гарматы на прамую наводку...» Тры батарэі палка занялі месца на палявой дарозе, што вяла да бальшака, а побач з вёскай Шчаткава — пятая батарэя лейтэнанта А.М.Бейніша.

На агнявой камбат Бейніш застаўся задаволены гатоўнасцю, папярэдзіў:

— Глядзіце, багі вайны, калі пачнецца — стаяць цвёрда. Жадаю ўдачы...

Па полі няспешна рухаліся два паласатыя страшылішчы, адно — прама на гармату Сарапулава. Камандзір уважліва паглядзеў на наводчыка Аляксандра Вароніна — той упершыню сустракае фашысцкі танк.

— Спакойна, Саша, ніякай нервознасці. Спакойна.

Усё больш выразна чуўся шум «пантэр». Засталіся лічаныя метры — 700—800, не болей.

— Ну, што, пакажам немцу, як рускія знішчальнікі танкаў «распранаюць» нямецкую браню, — ці то пытае, ці то звяртаецца ён да салдат.

Грымнулі першы, другі выстралы. Як уджаленая разварочваецца «пантэра», пускаючы чорны дым. Трэці выстрал не даў магчымасці фашысцкім танкістам выбрацца з падбітай машыны. Але выбухам снарадаў аглушыла нашага наводчыка Валошына, ён застагнаў, у гарачцы пабег да драўлянага хлява. Да ўкрыцця не дабег, схапіўшыся за галаву, паваліўся.

З-за лесу высунуўся яшчэ адзін варожы танк. Ён, прыпыняючыся, поўз да пераправы, раз-пораз адкрываючы агонь. Кулямётная чарга секанула ў шчыт гарматы сяржанта Мікалая Рыбіна. Камандзір узвода малодшы лейтэнант Рыгор Гладкоў падаў каманду:

— Падпусці гадзюку бліжэй!

— Па танках! Наводзіць на гусеніцы! Агонь!

Варожая машына падскочыла, закруцілася на месцы, спынілася, змоўкла, а аўтаматчыкі, што рухаліся за ёй, заляглі. Цяпер ужо гармата сяржанта Рыбіна вяла агонь па варожай пяхоце. Але немцы засеклі гармату, і тут жа адна з мін трапіла ў яе. Смяротна паранены Рыбін. А неўзабаве асколак трапіў у наводчыка Бязгіна. У крытычную мінуту камандзір узвода рвануўся да гарматы.

— Давай, зараджай, — звярнуўся ён да Высоцкага.

І вось ужо зноў раз за разам прыцэльна бухае гармата. Між тым супраціўленне ворага не паслабляецца. Нямецкая пяхота пры падтрымцы кулямётаў ірвецца да Бярэзіны. А тут, як назло, скончыліся асколачныя снарады. Гладкоў крыху адышоў ад гарматы і ўзяў

аўтамат Бязгіна. У гэты момант кулямётная куля трапіла ў плячо афіцэра. На гімнасцёрцы ён убачыў крывавую пляму.

Гармата старшага сяржанта Агуркова была ўстаноўлена на невялікім узвышшы, парослым пажоўклай прыдарожнай травой. Месца падабрана добрае. Усе з нецярпеннем чакалі. Было зразумела: фашысты з усіх сіл будуць вызваляцца з «катла». Так яно і было. Немцы пайшлі ў адкрытую атаку, ва ўвесь рост, толькі некаторыя — перабежкамі. Наша пяхота не вытрымлівае націску ворага: левым крылом ён насядае напорыста і адчайна. Зараджальчык Сяргей Зейкін не адыходзіць ад камандзіра Сарапулава, спрытна заганяючы снарад у ствол: то шрапнель, то асколачны. Асколкі косяць і косяць фашыстаў. Але тут здарылася непрадбачанае. Радавы Павел Абакумаў пад аўтаматным агнём цягнуў скрыню асколачных снарадаў, пачаў ужо адчыняць яе. І раптам яго працяла трапная аўтаматная чарга. Не верылася, што больш ніколі не праспявае ён задушэўную лірычную песню.

Калі атака была адбіта, каля гарматы прысеў камандзір чацвёртага разліку сяржант Іван Кажушкоў. Побач з ім за браніраваным шчытом Уладзімір Ёлкін. Пыл і дым выядаюць вочы, галовы «разрываюцца» ад свісту фашысцкіх мін, куль і снарадаў. З кожнай мінутай варожы агонь набліжаецца да агнявой пазіцыі. Кажушкоў сеў за прыцэл. Было добра відаць, як унізе, у хмыжняку, непадалёку адзін ад другога вядуць агонь мінамёты ворага. Са злосцю націснуў на рычаг. Паралёт... Але другі і трэці снарады трапляюць у цэль. Агнявыя кропкі замаўчалі.

І вось зноў ажывае хмызняк. Немцы імкнуцца наблізіцца да гарматы. Групамі, з аўтаматамі ў руках бягуць перабежкамі. Чарнышоў з кулямётам, а таксама агневікі разам з Агурковым ва ўпор расстрэльваюць азвярэлых фашыстаў. Цяжка ранены ў нагу лейтэнант Чарнышоў, але працягвае кіраваць боем...

У гэты момант ад пераправы рухалася наша танкавая калона. Падпалкоўнік Іваноў пабег насустрач.

— Дапамажыце дабіць фрыцаў, — звярнуўся ён да камандзіра палка.

— У трэцяй машыне генерал, звяртайцеся да яго.

Іваноў падышоў да генерала.

— Абавязкова дапаможам. Вазьміце шэсць танкаў і пачынайце бой, — аддаў загад генерал.

І вось ужо танкі ўразаюцца ў фашысцкія парадкі, знішчаючы іх і агнём, і гусеніцамі. Да канца дня атакі фашыстаў спыніліся. Малодшы лейтэнант Васіль Шмялёў, салдаты Іваноў, Галавін, Варонін вядуць не менш як 150 палонных гітлераўскіх салдат і афіцэраў. Ідуць яны брудныя, непаголеныя — не ідуць, а цягнуцца няроўным строем. Адваяваліся!

А ў нашых артылерыстаў на душы было свята: каторы ўжо раз яны выстаялі і перамаглі.

Р.Ткачэнка.

Дакументы сведчаць...

З БАЯВЫХ ДАНЯСЕННЯЎ

З ПАЛІТДАНЯСЕННЯ НАЧАЛЬНІКА ПАЛІТАДДЗЕЛА 48 А ПАЛКОЎНІКА МІФТАХАВА НАЧАЛЬНІКУ ПАЛІТУПРАЎЛЕННЯ 1 БЕЛАРУСКАГА ФРОНТУ ГЕНЕРАЛ-МАЁРУ Т. С.Ф.ГАЛАДЖАВУ

О героических подвигах, проявленных в боях воинами нерусской национальности

Пулемётный расчет Базарбая Сабирова участвовал в освобождении г. Бобруйска и в ликвидации группировок противника, окруженных в районе города. Одна из крупных группировок немцев, отступавшая с полным вооружением в северо-западном направлении от города по правому берегу р. Березина, в течение 3—4 дней непрерывно контратаковала наши наступающие части с целью выхода из окружения. Целый день 28 июня 1944 г. шел бой с этой группировкой у села Кривой Крюк. Здесь противник имел преимущество в людях и технике. Отлично действовал в этом бою расчет Сабирова. Мужественные люди расчета близко подпускали контратакующие подразделения врага и умелым огнем своего пулемета уничтожали их. В этом бою огнем расчета убито свыше 200 немцев, уничтожены две огневые точки и 150 немцев, прижатые к земле метким огнем пулемета Сабирова, сдались в плен. Противник отошел.

Следующий бой разгорелся у д. Назаровка. Расчет Сабирова и в этом бою показал свое мастерство: активно ведя огонь на ближних дистанциях, сабировцы уничтожили 350 немцев и снова взяли в плен 120 солдат противника.

За 8—9 дней боев на этом направлении расчет Сабирова уничтожил свыше 600 немцев и принудил к сдаче в плен 270 немцев.

Этот спаянный пулеметный расчет состоит из рядовых — Жубаиазарова (первый номер), Горбунова (второй номер) и Стельмаха (подносчик). Командир расчета рядовой Сабиров Базарбай родился в 1922 г., комсомолец, по национальности узбек, до войны работал в колхозе им. Фрунзе Антарикского района Ферганской области Узбекской ССР. Он участвовал в боях под Москвой, Воронежем, Курском и под Брянском, имеет три ранения, награжден медалью «За отвагу» и значком «Отличный пулеметчик».

17 апреля он прибыл в 137 сд и как опытный воин назначен командиром пулеметного расчета 2 пулеметной роты 771 ск, в составе которой продолжает гнать врага с родной советской земли.

Имея большой боевой опыт, товарищ Сабиров воспитал замечательный пулеметный расчет.

Сержант Азизов Кайдал — ручной пулеметчик 5 стрелковой роты 740 сп 217 сд, 1922 г. рождения, по национальности азербайджанец, кандидат в члены ВКП(б), являлся одним из лучших бесстрашных воинов в этом полку. В одном из жарких боев, когда отделение, в котором находился Азизов, попало в поле окружения, он не растерялся, первым открыл губительный огонь из своего пулемета по фашистам и отразил их контратаку. Азизов лично уничтожил 28 гитлеровцев. Кроме этого, он уничтожил расчет противотанковой пушки противника, дав возможность роте подтянуть резерв, перейти в наступление и занять дер. Яскина. В этом тяжелом бою т. Азизов погиб смертью храбрых. За образцовое выполнение поставленной задачи он посмертно награжден орденом «Отечественной войны I степени».

К высшей награде — званию Героя Советского Союза — представлен отважный и умелый разведчик Ашыров. Командир отделения разведки 331 сп 96 сд Сейткасым Ашыров родился в 1924 г., работал в колхозе «Казан» Шаулдырского района Казахской ССР, комсомолец. Много подвигов на счету мужественного Ашырова. Перед прорывом вражеской обороны на р. Друть Ашыров во главе захватывающей группы доставил 3 немцев, затем в ходе прорыва обороны и преследования противника с 25.6. по 14.7 шел впереди полка, многократно проникал в тыл противника, наносил ему большой ущерб и вызывал панику в его рядах. 8 июля в районе д. Заболотье Ашыров с двумя разведчиками с тыла вышел к немецкой минометной батарее, неожиданно напал на расчет 6-ствольного миномета и захватил 7 пленных во главе с офицером. 10 июля, пробравшись через лес в тыл врага, Ашыров лично убил 37 немцев, вызвал панику, захватил 6 минометов, 2 тягача, 4 автомашины, 4 рации и 22 пленных.

Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі. Ф.233. Воп. 2374. Спр. 39. Л. 276—278.

З ПАЛІТДАНЯСЕННЯ НАЧАЛЬНІКА ПАЛІТАДДЗЕЛА 15-Й ГВАРДЗЕЙСКАЙ РЭЧЫЦКАЙ БРЫГАДЫ ПАДПАЛКОЎНІКА ПУПАВА НАЧАЛЬНІКУ ПАЛІТУПРАЎЛЕННЯ 1-ГА БЕЛАРУСКАГА ФРОНТУ ГЕНЕРАЛ-МАЁРУ С.Ф.ГАЛАДЖАВУ АБ ВЫНІКУ БАЁЎ З 24 ЧЭРВЕНЯ ПА 5 ЛІПЕНЯ 1944 Г.

С 24.06. по 5.07.44 г. 15 гвардейская танковая Речицкая Краснознаменная бригада вела стремительные наступательные бои с немецко-фашистскими захватчиками, будучи введенная в прорыв с частями 1 гвардейского танкового Донского Краснознаменного ордена Суворова корпуса в направлениях города Бобруйска и Минска...

Ведя бой, бригада прошла с боями 125 км (в целом маршрут движения достигает 650 км) освободила самостоятельно 57 населенных пунктов и совместно с другими частями 25, в том числе крупные населенные пункты: Марьина Горка, Пуховичи, города Бобруйск и Минск.

Противнику нанесены потери:

Подбито и уничтожено танков	— 24	Складов с боеприпасами	— 10
Самоходных орудий	— 49	-»- с горючим	— 5
Орудий разного калибра	— 136	-»- с продовольствием	— 7
Минометов разного калибра	— 76	-» с вещимуществом	— 2
Автомашин	— 746	Лошадей	— 309
Мотоциклов	— 35	Пулеметов	— 26
Тракторов и тягачей	— 27	Ж.д.вагонов	— 40
Велосипедов	— 50	Бронеплощадок	— 2
Повозок с военным имуществом	— 440	Бронемашин	— 12

Истреблено солдат и офицеров 7550, взято в плен свыше 1300 солдат и офицеров.

Захвачено:

Танков	— 4	Повозок с военным имуществом	— 350
Самоходных орудий	— 5	Складов с боеприпасами	— 11
Орудий разного калибра	— 69	—//— с продовольствием	— 5
Автомашин исправных и неиспр.	— 465	—//— с вещимуществом	— 5
Минометов	— 38	Ж.д. эшелонов	— 1
Тракторов и тягачей	— 17	Ж.д. платформ и вагонов	— 75

Освобождено из лагеря военнопленных советских граждан—370 чел., освобождено из немецкой неволи 1500 детей.

В этих боях бойцы, сержанты и офицеры как танкисты, пехотинцы, артиллеристы показали образцы мужества и героизма.

ВОТ ИХ ГЕРОИЧЕСКИЕ ДЕЛА...

Комсомолец, старший сержант Тарасов, в бою за деревню Еловики, действуя впереди своей роты, заметил, что из блиндажа бьёт станковый пулемет противника. Тарасов по-пластунски прополз 300 м и бросил в блиндаж противотанковую гранату. Вражеский пулемет замолк. Тов. Тарасов представлен к правительственной награде — ордену Славы III степени.

Комсомолец, гвардии старший сержант Беседа, заменил выбывшего из строя командира взвода и добровольно вызвался пойти со взводом в разведку. Разведуя один из населенных пунктов, он неожиданно напал на спящих немцев, и в короткой схватке взвод уничтожил 40 немецких солдат и офицеров (среди них убит один полковник), взяли в плен 10 немцев, захватили трофеи: 2 легковых машины и 5 грузовых. Тов. Беседа лично убил двух офицеров и семь солдат. Тов. Беседа представлен к правительственной награде — ордену Красного Знамени.

Гвардии старший сержант Косачев, командир отделения автоматчиков, при освобождении деревни Еловики со своим отделением первым ворвался в лагерь военнопленных и взял в плен немецкого офицера — коменданта лагеря и охрану — шесть немецких солдат, освободив 180 советских граждан.

Представлено к правительственной награде — 250 человек, из них: коммунистов и комсомольцев — 162 человека...

14 июня 1944 г. бригада приступила к передислокации в район выжидания и 16.06.44 г. в полном составе сосредоточилась в районе 2 км зап. Залье и 21.06.1944 г. получила боевую задачу. Во всей проводимой партийно-политической работе в этот период ставилась задача — воспитание у личного состава наступательного порыва, стремительности и дерзости в предстоящих боях, доведение боевой задачи и постановки организационных вопросов. 20.06.44 г. проведено торжественное вручение матчасти экипажам-танкистам и личному составу МБА вооружения. При вручении матчасти был зачитан приказ командира корпуса — о получении корпусом танков, построенных на средства трудящихся Воронежской и Орловской областей, и приветственное письмо Ростовского обкома ВКП(б). На митингах танкисты в ответ трудящимся Воронежской, Орловской и Ростовской областей поклялись бить ненавистного врага до его полного истребления.

23.06.44 г. по частям и подразделениями бригады прошли партийно-комсомольские собрания с повесткой дня — работа партийных и комсомольских организаций по обеспечению выполнения боевых приказов командования, где каждый коммунист поклялся честно выполнить свой долг перед Родиной.

По обращению Военного Совета фронта под гул артиллерийской канонады по частям и подразделениям бригады проведены митинги, где личный состав бригады поклялся с честью выполнить боевую задачу.

По приказу бригада 24.06.44 г. утром вступила в бой и повела наступательные бои на окружение Паричской и Бобруйской группировок. 27.06.44 г. вышла на дорогу Бобруйск—Минск, тем самым закончила окружение Бобруйской группировки и повела наступление на город. В боях за город бригада понесла значительные потери в танках (27 танков), потому что танковые батальоны бригады не имели пехотной поддержки и танки вели бой одни. 29.06.44 г. бригада получила новую боевую задачу и повела наступление на Минск. 3.07.44 г. в 13.25 танковые батальоны вошли в город Минск. В этот же день, вечером, бригада вышла из Минска и в течение 4.07.44 г. вела бои с окруженной группировкой противника вост. Минск. С 5.07.44 г. вышла из боя, передав 7 танков и часть личного состава из МБА.

Командир танкового взвода гвардии лейтенант Федоров, под сильным артиллерийско-минометным огнем противника, лично разминировал мост и первым ворвался в Бобруйск. Тов. Федоров представлен к ордену Ленина.

Зам. командира по политчасти, нач. политотдела гвардии полковник Пупов

Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі. Ф. 233. Воп. 2374. Спр. 10. Л. 313-318.

З ПАЛІТДАНЯСЕННЯ НАЧАЛЬНІКА ПАЛІТАДДЗЕЛА 9-ГА ТАНКАВАГА КОРПУСА ПАЛКОЎНІКА ГРЫШЧАНКІ НАЧАЛЬНІКУ ПАЛІТУПРАЎЛЕННЯ 1-ГА БЕЛАРУСКАГА ФРОНТУ ГЕНЕРАЛ-МАЁРУ С.Ф.ГАЛАДЖАВУ

6.7.1944 г.

23 июня корпус вступил в бой, участвуя в общем наступлении 1-го Белорусского фронта на Бобруйском направлении. С огромным воодушевлением встретили бойцы, сержанты и офицеры боевой приказ фронта о наступлении. Многочисленные выступления на митингах, резолюции, посвященные вступлению в бой, и другие проявления политической активности личного состава, все они говорят о большом патриотическом подъеме и желании быстрее встретиться с врагом и освободить из-под немецкой неволи белорусский народ.

На одном из участков 108 танковой бригады противником были пущены 30 немецких танков, в числе их «Тигры» и «Фердинанды», чтобы прорваться на дорогу Бобруйск—Рогачев. Многочисленные атаки врага были отбиты. Наконец в 21.00 этого же дня противник, решив во что бы то ни стало прорваться, пустил все танки и пехоту, но и эта попытка была отбита. Только нашими войсками в этом бою уничтожено 22 танка и самоходных установок, 112 автомашин, 12 орудий, 6 минометных батарей, около 200 солдат и офицеров противника. Взято много пленных.

Энергично действовала батарея ИПТД 108 ТБр., она подбила в одном из боев 7 танков. Даже после того, когда 3 пушки батарей были разбиты, артиллеристы не покинули свои позиции и огнем автоматов, винтовок и гранат отбивали контратаки немцев. Замечательный образец выучки и стойкости показал в бою наводчик орудия сержант Мясников. Он уничтожил в бою 3 немецких танка и до взвода пехоты противника.

Танкисты 23 ТБр. на протяжении суток отразили более 15 атак гитлеровцев. За время боев только 267 танковым батальонам этой бригады уничтожено 1500 немцев, конный обоз — 80 подвод, подбито и уничтожено 2 самоходных артустановки, минбатарея, взято в плен 54 гитлеровца.

Старшина Забулдыгин (МБА 95 ТБр.) во время прорыва немецкой обороны, 300 метров ползком подобрался к дзоту, забросал его гранатами и захватил в плен 4 немцев.

Смело командовал взводом мл. лейтенант Ермаков, его взвод в районе Крушиновка первым ворвался в деревню, сам тов. Ермаков в упор расстреливал немцев.

При совершении марша на новые огневые позиции 1508 ЛСАП пришлось принять встречный бой с сильной немецкой группировкой, пытавшейся захватить дорогу и перерезать пути движения частей корпуса. С этой группировкой 1508 ЛСАП вел бой в течение 5 часов и благодаря умению, мужеству и отваге группировка противника, несмотря на численное превосходство, была разгромлена, 800 гитлеровцев уничтожено, часть взята в плен, часть рассеяна.

Следует отметить боевую работу Саперного батальона, который в значительной мере способствовал успешному продвижению частей корпуса. Во время одной наступательной операции саперный взвод ст. лейтенанта Мудрова в течение часа под огнем противника снял 800 противотанковых мин. Комсорг роты ефрейтор Аганнсьян с опасностью для жизни снял 50 мин и был ранен.

Взвод лейтенанта Пискарева под огнем противника построил переправу, разминировал подход к мосту. Все эти работы, несмотря на их трудности, выполнялись с большим воодушевлением и храбростью.

В период боевых действий частями и соединениями корпуса было с боями пройдено более 350 километров, освобождено более 500 населенных пунктов, в том числе Бобруйск, Минск, Валерианы, Самохваловичи и др. Уничтожено 9428 гитлеровских солдат и офицеров, взято в плен 3206 немцев, подбито танков — 135, бронемашин и бронетранспортеров — 63, грузовых автомашин — 613, самоходных орудий — 34, пушек разного калибра — 184, минометов — 38, пулеметов — 174.

Политработники проводят большую работу по выявлению лиц, подлежащих награждению и предоставлению их к награде. В одной только 108 танковой бригаде за операции по освобождению города Бобруйска представлены к награде 100 чел.

Начальник политотдела 9-го танкового корпуса полковник

Грищенко

Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі. Ф. 233. Воп. 2374. Спр. 10. Л. 334—335.

З ПАЛІТДАНЯСЕННЯ НАЧАЛЬНІКА ПАЛІТУПРАЎЛЕННЯ 2-ГА БЕЛАРУСКАГА ФРОНТУ ГЕНЕРАЛ-МАЁРА А.ОКАРАКАВА НАЧАЛЬНІКУ ГАЛОЎНАГА ПАЛІТУПРАЎЛЕННЯ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ ГЕНЕРАЛ-ПАЛКОЎНІКУ А.С.ШЧАРБАКОВУ АБ ГЕРАІЧНЫХ ДЗЕЯННЯХ 1159-ГА ЗЕНІТНА-АРТЫЛЕРЫЙСКАГА ПАЛКА 28-Й ЗЕНІТНА-АРТЫЛЕРЫЙСКАЙ ДЫВІЗІІ РЭЗЕРВУ ГАЛОЎНАГА КАМАНДАВАННЯ

18.7.1944 г.

27 июня 1944 г. к 4.00 1159 зенитно-артиллернйский полк 28 ЗАД РГК занял огневые позиции в районе дер. Красный Октябрь и м. Свнслочь с задачей прикрыть от нападения противника с воздуха железнодорожный мост через реку Березина и переправу через реку Свислочь, а также боевые порядки 82 СД.

На прикрытие железнодорожного моста были поставлены: 1 батарея (командир батареи старший лейтенант Швецов), 3 батарея (командир батареи старший лейтенант Спрыгни) и пулеметная рота (командир роты старший лейтенант Обшивалкин). Вторая батарея (командир батареи старший лейтенант Данилов) прикрывала переправу через реку Свислочь в районе м. Свислочь. Командир полка со своим штабом находился в районе железнодорожного моста на правой стороне реки Березина в опорном пункте. На обороне от наземного противника дер. Красный Октябрь стоял 104 стрелковый полк 82 СД.

29 июня заместитель командира полка по политчасти майор Ромашко, парторг полка майор Фефелов и комсорг лейтенант Истомин довели боевую задачу до всего личного состава. В связи с большими успехами войск фронта, майор Ромашко на следующий день 30 июня принял решение провести в подразделениях митинги личного состава. 29 июня началась подготовка к митингам. Коммунисты и комсомольцы рассказали личному составу о боевом прошлом 1-го Белорусского фронта, о боевых действиях своего полка, о битве под Сталинградом. Парторг батареи сержант Полежаев провел беседу с молодыми бойцами, которые еще не участвовали в боях, рассказал нм о боевых традициях своего полка и своей батареи, о лучших воинах подразделения. 30 июня митинги проводить не пришлось, так как с рассвета начался бой с большой группировкой немецких войск.

На рассвете 30 июня остатки разбитой Бобруйской группировки немецких войск, по показаниям военнопленных, в количестве до 6500 чел. солдат и офицеров при поддержке одного «Фердинанда», 2-х самоходных пушек и легких минометов, в северном направлении атаковали дер. Красный Октябрь.

Из показаний военнопленных явствует, что эта группа немецких солдат и офицеров имела задачу, кроме выхода из окружения, отбросить наши войска в этом районе за реку Березина, захватить железнодорожный мост, подорвать его и тем самым на некоторое время задержать переправу наших войск через реку Березина и сорвать регулярное снабжение наступающих частей фронта.

Подойдя к дер. Красный Октябрь, группа немецких войск вступила в бой с 104 стрелковым полком 82 СД. В течение двух—трех часов 104 СП сдерживал натиск немецко-фашистских бандитов. После того как вышли запасы боеприпасов, подразделения полка начали отходить к мосту и к 7.00 перешли на левый берег р. Березина.

Основной удар немцев, ставивших себе задачу во что бы то ни стало захватить мост, принял на себя 1159 зенитно-артиллерийский полк.

Командир полка майор Панченко, начальник штаба майор Харченко и пом. нач. штаба по разведке ст. лейтенант Савченко в начале боя находились на КП полка и оттуда руководили боем. Зам. ком. полка по политической части майор Ромашко ушел в пулеметный взвод капитана Кондина, который занимал самый ответственный участок в обороне на дамбе у основания моста, откуда хорошо было наблюдать за противником и ведением огня подразделениями. Во всех подразделениях наскоро были построены ходы сообщения и пехотные ячейки для обороны. Все бойцы, сержанты и офицеры полка приготовили к боевому действию все виды оружия и ручные гранаты.

Личный состав зенитного полка принял неравный бой с численно превосходящими силами противника. Солдаты и офицеры полка грудью встали на защиту отвоеванной у врага родной земли.

Первые немецкие цепи появились со стороны дер. Красный Октябрь в секторе 3-й батареи. Шквальным огнем встретила батарея старшего лейтенанта Спрыгина фашистскую орду. Разведчик ефрейтор Рудаков первым патроном из автомата уложил немца, пытавшегося подойти к кухне. Другой немец из-за угла дома стал подкрадываться к кухне, но меткой пулей ефрейтора Рудакова также был убит. Немецкие автоматчики яростно напирали на огневые позиции 3-й батареи. Для того чтобы усилить огневую мощь 3-й батареи, командир 1-й батареи старший лейтенант Швецов вывел одно орудие на дорогу и стал прямой наводкой расстреливать обнаглевших немцев. Работали все пушки, автоматы и карабины 3-й батареи, од-

9. Зак. 311.

ного взвода 1-й батареи и личного состава штаба и взвода управления. Все атаки немцев на этом участке были отбиты.

Немцы, видя, что в секторе 3-й батареи невозможно добиться успеха, пошли в обход слева и справа. Тогда справа заговорили пулеметы взвода лейтенанта Мальцева и пулемет командира отделения комсорга роты сержанта Кушнир. С левого фланга немцев начал расстреливать пулеметный взвод капитана Кондина. Из амбразур опорного пункта поливал свинцовым дождем немцев личный состав штаба и взвода управления. Здесь также гитлеровцы не смогли добиться никакого успеха.

Тогда разъяренные неудачей гитлеровцы снова бросились на боевые порядки 3-й батареи. Артиллеристы и в этот раз встретили фашистов шквальным огнем. Прямым попаданием снаряда была выведена из строя стоявшая на прямой наводке пушка. Наводчик орудия был ранен. Вместо этого орудия было немедленно выкачено второе орудие сержанта Кладова. Когда вышли все снаряды, командир батареи старший лейтенант Скрыгин три раза водил личный состав батареи в контратаку и отбрасывал немцев от огневых позиций.

Когда боеприпасы подходили к концу, командир батареи старший лейтенант Скрыгин вместе со старшим лейтенантом Швецовым попытались вывести машины и орудия с поля боя через мост на левую сторону реки. Но первые две машины с пушками прямым попаданием мин были подожжены на мостовой дамбе и таким образом закрыли дорогу на мост. К 15.00 бой подходил к концу. Боеприпасов к пушкам, автоматам и карабинам не стало. Ручные гранаты были израсходованы.

Командир полка майор Панченко приказал организованно с боем отходить на левый берег р. Березина. Отходящих пулеметным огнем прикрывал заместитель командира полка по политчасти майор Ромашко, лично выполняя обязанности пулеметчика. К этому времени подошли новые части 108 стрелковой дивизии, которые опрокинули немцев и полностью очистили дер. Красный Октябрь от фашистско-немецких войск.

Героические действия всего личного состава зенитно-артиллерийского полка и умелое руководство боем со стороны командования дали возможность отстоять переправу и с огромными потерями отбросить превосходящие силы врага.

В жестоких боях личный состав полка истребил до 2-х тысяч немецких солдат и офицеров. Кроме этого, за время боя с наземным противником 2-я батарея, стоявшая на переправе у м. Свислочь, открыла огонь по группе немецких транспортных самолетов, сбрасывавших в расположение немецких войск боеприпасы и продовольствие, и сбила 8 самолетов. По самолетам также вели огонь пулеметный взвод мл. лейтенанта Головина, мл. лейтенанта Шерстобитова и одно орудие 3-й батареи. Их огнем было сбито еще 3 самолета. Таким образом, зенитный полк, отражая атаки немецко-фашистских бандитов, сбил 11 самолетов противника, из них 10 транспортных и 1 истребитель.

В этом бою особо отличились:

Майор Ромашко Николай Васильевич, заместитель командира полка по политической части.

Когда немцы атаковали боевые порядки 104 стрелкового полка, майор Ромашко находился у себя на КП полка. Дав указания парторгу и комсоргу полка по политическому обеспечению выполнения боевого приказа приготовиться к отражению наземного противника, сам отправился на наиболее ответственный участок обороны моста к пулеметчикам капитана Кондина. В бою с немцами майор Ромашко лично руководил огнем пулеметной роты и давал указания через связных командирам 1 и 3 батарей, куда сосредоточить огонь, так как ему с высокой дамбы были хорошо видны цепи наступающего противника. В начале боя наводчик пулемета был тяжело ранен. Его место занял командир взвода капитан Кондин, но и он был убит. Тогда майор Ромашко принял командование взводом на себя и лично лег за пулемет. Шквальным пулеметным огнем истреблял он обнаглевших гитлеровцев, пытавшихся подойти к мосту. Вскоре кончились патроны. Несколько пулеметчиков было ранено и отправлено на левый берег р. Березина. Майор Ромашко 6 пулеметчиков послал за боеприпасами, а своему связному сержанту Терещенко приказал подавать заряженные карабины и стал из них вести огонь по немцам. Когда принесли патроны к пулеметам, майор Ромашко стал вести огонь одновременно из трех пулеметов, пока не был ранен осколком мины. Подразделения полка, израсходовав боеприпасы, начали отходить через реку. Когда уже все отошли, майор Ромашко метким огнем из карабина продолжал расстреливать на близком расстоянии подходящих к мосту немцев. Вражеский пулеметчик, не замеченный майором Ромашко, оборвал жизнь героя.

Майор Панченко Роман Сергеевич, командир полка.

Когда начался бой стрелкового полка с немцами, майор Панченко быстро оценил обстановку и принял решительные меры к подготовке оборонительного боя за переправу. Умело руководил с КП полка подразделениями. Лично принимал участие в обороне штаба полка. Когда кончились боеприпасы, майор Панченко руководил организованным отходом подраз-

делений, сам ушел с поля боя последним, когда уже подходили стрелковые части 108 СД. Как только противник был отброшен, майор Панченко принялся за восстановление огневых позиций подразделений и боеспособности полка.

Майор Фефелов Михаил Степанович, партийный организатор полка.

От начала и до конца боя майор Фефелов находился на огневой позиции 1-й батареи и КП полка. Когда вышел из строя по ранению командир батареи старший лейтенант Швецов, майор Фефелов организовал оборону батареи, лично расставил свободных бойцов от орудий с автоматами и карабинами по окопам и приказал командиру взвода лейтенанту Исаеву командовать батареей. Сам с пистолетом отстреливался от наступающих немецких автоматчиков. Когда батарея, выполнив свою задачу, стала отходить на мост, майор Фефелов перешел к пулеметчикам, прикрывающим батарею, и личным примером воодушевлял их на подвиги.

Лейтенант Истомин Филипп Сергеевич, комсомольский организатор полка.

Когда начался бой, лейтенант Истомин с группой бойцов организовал оборону опорного пункта, где находился штаб полка. Лично из автомата через амбразуры истребил 7 немцев. В критический момент боя под сильным пулеметным огнем противника лейтенант Истомин с полковым знаменем преодолел мост и спас, таким образом, знамя полка. Возвратясь с левого берега реки, выкатил пушку на мост и прямой наводкой расстреливал немцев.

Лейтенант Исаев Федор Сергеевич, командир огневого взвода.

Лейтенант Исаев, командуя взводом, выкатил пушку н прямой наводкой расстреливал в упор немецкую пехоту. Когда немцы подошли совсем близко к ОП батареи, стрелял из автомата и забрасывал ручными гранатами противника. Из пистолета лично застрелил 4-х немцев, просочившихся на батарею. Когда у орудия, стоявшего на прямой наводке, выбыли из строя оба наводчика, лейтенант Исаев сам исполнял обязанности наводчика. После того как выбыл из строя командир батареи, лейтенант Исаев взял на себя командование батареей. Погиб от выстрела вражеского автоматчика.

Лейтенант Бродянский, командир огневого взвода.

Первый с бойцами своего взвода лейтенант Бродянский завязал бой с немецкой пехотой. Как только немцы показались из-за домов, он начал расстреливать их из пушек. Когда немцы подошли к батарее, лейтенант Бродяиский с автоматом в руках повел свой взвод в контратаку. Гранатой убил трех немцев. Погиб от пули автоматчика.

Лейтенант Швецов Андрей Илларионович, командир 1-й батареи.

С первых минут боя умело и мужественно командовал батареей. Два раза лично заменял убитых наводчиков у орудия, стоявшего на прямой наводке. Был ранен, но поле боя не покинул. В упор из пистолета убил четырех немцев. Дал себя вынести с поля боя только после вторичного тяжелого ранения.

Старший лейтенант Спрыгни Павел Максимович, командир 3-й батареи.

Батарея старшего лейтенанта Спрыгина первая приняла на себя основной удар немецкой пехоты, отражая ожесточенные атаки гитлеровцев орудийным огнем прямой наводкой. Когда налетел 21 немецкий самолет, одно орудие открыло огонь по ним, в результате чего был сбит немецкий самолет. Остальные орудия продолжали поражать немецкую пехоту. Когда вышли снаряды и немцы, воспользовавшись этим, усилили свои атаки, Спрыгин организовал ураганный огонь из автоматов и винтовок. 3 раза он водил батарею в контратаку. Личный состав батареи истребил свыше 300 немецких солдат н офицеров.

Лейтенант Николаенко Федор Никитич, командир взвода управления.

Организовал оборону штаба. Бойцы под его командованием из автоматов и винтовок расстреливали наседающих немецких автоматчиков. В последние минуты боя лейтенант Николаенко заменил выбывшего наводчика у орудия и прямой наводкой расстреливал немецких солдат и офицеров. Погиб у орудия от прямого попадания вражеской мины.

Такую же отвагу и мужество, незнание страха в борьбе с врагом показали: командир пулеметного взвода капитан Кондии А.А., старший лейтенант Савченко, младший лейтенант Мальцев, сержант Лягни В.Н., сержант Кушиир И.З., сержант Цветков В.И., младший сержант Минзулин Х.Б., санинструкторы Горшкова М.И. и Поцелуева М.Е., а также рядовые Горшков К.М., Мавричев, Колтунов П.И., Миронов Б.Г., Белов, Рудаков, Сафронов Н.Л., Грачев М.Я. и Дорошкевич К.Д.

В этих боях личный состав полка, понеся потери в 37 человек убитыми н 42 ранеными, уничтожил свыше 2000 гитлеровцев. Немедленно же после окончания боя, похоронив своих товарищей, полк снова был готов громить и уничтожать ненавистного врага. Уже на второй день, т.е. 1 июля, при налете вражеской авиации 2-я батарея сбила 6 самолетов противника.

Сейчас полк, пополненный вооружением, техникой и личным составом, снова готов к выполнению любой боевой задачи командования.

Начальник политического управления
второго Белорусского фронта,
генерал-майор (А.Окорков)
Верно: Зверьков

Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі. Ф. 237. Воп. 2414. Спр. 45. Л. 194—198.
Дакументы падрыхтаваў да друку У.І.Лемяшонак.

Нашы землякі — франтавікі-героі

АРХІПЕНКА Фёдар Фёдаравіч, н. 30.10.1921 г. ў в. Аўсімавічы. Герой Савецкага Саюза (27.6.1945). Скончыў Адэскую ваенную школу пілотаў (1940), Ваенна-паветраную акадэмію (1951), Маскоўскі інжынерна-эканамічны інстытут (1967). У Айчынную вайну з 1941 г. на Паўднёва-Заходнім, Заходнім, Бранскім, Сталінградскім, Варонежскім, 2-м і 1-м Украінскіх франтах, лётчык-знішчальнік. Удзельнік абароны Ковеля, Роўна, Навагрудка-Валынска, Кіева, Харкава, Варонежа, баёў пад Сталінградам, на Курскай дузе, за вызваленне Украіны, Малдавіі, Польшчы, Прагі, штурму Берліна. Да 1959 г. служыў у Савецкай Арміі, палкоўнік.

... А званне Героя атрымаў за вялікую колькасць баявых вылетаў, паветраных баёў і збітых самалётаў ворага. Кожны з гэтых баёў — сапраўды гераічны. Іншы раз лётчыкі траплялі ў такія сітуацыі, выйсці з якіх можна было толькі цудам.

Неяк група з шасці знішчальнікаў, якую вёў Архіпенка, вылецела на чарговае баявое заданне. За лініяй фронту заўважылі армаду варожых самалётаў. Адных бамбардзіроўшчыкаў Архіпенка налічыў 40. Іх прыкрывалі 8 знішчальнікаў. 6 супраць 48! Сілы няроўныя... Можа, ухіліцца ад бою, павярнуць назад? Яшчэ не позна...

— Не дачакаецеся, гады — сціснуў зубы Архіпенка. — Яшчэ ні разу ад фашыстаў не драпаў!

Нашы знішчальнікі рванулі насустрач ворагу. Нервы ў нямецкіх асаў не вытрымалі. Фрыцы не былі падрыхтаваны да лабавой атакі. У момант баявыя парадкі фашысцкіх самалётаў змяшаліся. Разагнаўшы бамбардзіроўшчыкаў, чырвоназорныя ЯКі дружна наваліліся на «месераў». Архіпенка атакаваў аднаго з іх, аднак няўдала. Яго праціўнік яўна пазбягаў бою. Толькі не атрымалася. У тым баі Архіпенка збіў 2 самалёты.

А ўсяго 467 баявых вылетаў зрабіў за гады вайны адважны лётчык. Ён правёў 102 паветраныя баі і асабіста знішчыў 30 варожых машын, а яшчэ 14 — у групавых баях. Даводзілася выпрытаць на штурм наземных войскаў праціўніка, весці разведку варожых тылоў. І кожны раз гвардыі маёр Архіпенка паказваў высокае воінскае майстэрства, бязмежную адданасць свайму абавязку. *Ф. Сідарэнка.*

БОЛБАС Аляксандр Карпавіч, н. 28.11.1911 г. ў в. Слабодка. Герой Савецкага Саюза (10.1. 1944). У 1937—1939 гг. вучыўся ў Камуністычным Інстытуце журналістыкі ў Мінску. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны. З чэрвеня 1941 г. на Заходнім, Паўднёва-Заходнім, Сцяпным, Варонежскім, 1-м Украінскім, 1, 2 і 3-м Прыбалтыйскіх франтах, удзельнік абароны Мінска, Бабруйска, Магілёва, Смаленска, Маскоўскай, Сталінградскай, Курскай бітваў, вызвалення Данбаса, Кіева, Рыгі. У баях каля Кіева ў верасні 1943 г. капітан А. Болбас замяніў параненага камандзіра батальёна. Байцы пад яго камандаваннем фарсіравалі Дняпро, з ходу атакавалі праціўніка, захапілі і ўтрымалі плацдарм, што забяспечыла паспяховую пераправу астатніх падраздзяленняў. Да 1958 г. служыў у Савецкай Арміі, падпалкоўнік. Ганаровы грамадзянін г. Грабёнка Палтаўскай вобласці.

... Раніцай 25 кастрычніка дзевяць байцоў пад камандаваннем капітана А.К. Болбаса рушылі да Дняпра ў раёне Ржышчава. Група смельчакоў як на падбор. Усе ведалі адзін аднаго, паважалі і любілі свайго камандзіра. Прадугледзелі ўсё, нават калі давядзецца трымацца не адзін дзень, стаяць да апошняга патрона. Узялі з сабой і рацыю.

Досвіткам, калі Днепр крыху супакоіўся, група размясцілася ў рыбацкай лодцы. Пад покрывам змроку амаль без перашкод дабраліся да сярэдзіны ракі. І толькі тады з берагавых умацаванняў грымнулі залпы. Разведчыкі налеглі на вёслы. Фантаны вады ўзнімаліся вакол лодкі. У гуле і пырсках пад покрывам густога змроку смельчакі наблізіліся да берага. Фрыцы, відаць, палічылі, што дэсант знішчаны. А ён тым часам працягваў выконваць загад. Яшчэ з таго берага з дапамогай бінокля быў старанна вывучаны праціўнік, загадзя вызначаны месцы, куды трэба

кінуцца ў першую чаргу. Гэта і дало магчымасць без страт уварвацца ў першую траншэю. Але вораг хутка ачомаўся, пачаў аказваць жорсткае супраціўленне, акружыў смельчакоў.

— Заняць кругавую абарону, падпусціць фашыстаў бліжэй і знішчаць! — аддаў загад камандзір.

Далей адбывалася нешта неверагоднае. Група не толькі паспяхова адбіла некалькі націскаў праціўніка, але і вызваліла вёску Манастырок, захапіла важную вышыню і многа зброі. Адзін баец быў смяротна паранены. У шыю параніла і камандзіра, але забінтаваны капітан працягваў кіраваць аперацыяй. Ноччу 27 кастрычніка па рацыі звязаліся са штабам. У гэты час да іх непрыкметна падкраліся тры фашысты. Завязалася схватка. Яе зыход вырашыў пісталетны выстрал камандзіра. Пра ўсё паведамілі па рацыі сваім. Ад іх атрымалі чарговы загад: «Узяць языка».

Выконваць загад накіраваліся Вараб'ёў, Ларыёнаў, Козін, Крапоткін. Астатнія на чале з камандзірам прыкрывалі іх. Чатыры смельчакі змаглі непрыкметна прабрацца да штаба варожага батальёна і захапіць не аднаго, а 25 палонных. Неўзабаве на гэтым плацдарме былі нашы танкісты.

Зноў пачаліся суровыя баі. А 3 лістапада вайсковая часць, дзе служыў Аляксандр Карпавіч Болбас, была перакінута вызваляць Кіеў. За фарсіраванне Дняпра і вызваленне сталіцы Украіны Аляксандру Карпавічу Болбасу і было прысвоена высокае званне Героя Савецкага Саюза. У гэтым цудоўным горадзе ён застаўся жыць і працаваць пасля вайны.

А.Гарэлік.

КАПУСЦІН Міхаіл Дзянісавіч, н. 18.11. 1907 г. ў в. Мікулічы. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). З сакавіка 1942 г. на Волхаўскім, 3-м Украінскім, 1-м Беларускім франтах. Вызначыўся пры вызваленні Украіны і Малдавіі. 10—11.5. 1944 г. ў баях на правым беразе Дністра каля Цірaспаля малодшы лейтэнант М.Капусцін замяніў параненага камандзіра батальёна, які два дні адбіваў контратакі ворага, знішчыў больш за 400 гітлераўцаў, 23 танкі і самаходныя гарматы. У ліпені 1944 г. батальён прарваў абарону праціўніка каля в. Мілянавічы пад г. Ковелем. Удзельнік вызвалення Варшавы і баёў за Берлін. Да 1946 г. служыў у Чырвонай Арміі, капітан, пазней на гаспадарчай рабоце ў лясной прамысловасці. Памёр 8.2.1968 г.

... У 1944 г., ужо ў Польшчы, гвардзейцы павінны былі ўзяць вышыню з адзнакай 219. Яна была ключавой у абароне праціўніка ў раёне Мілянавічы, што на захад ад г. Ковеля. Тут вораг, відаць, рашыў трымацца да апошняга. Таму няпростая задача стаяла перад батальёнам, дзе парторгам быў М.Дз.Капусцін. Перад наступленнем салдаты прыціхлі ў акопах. Кожны ведаў, што чакае яго раніцай. Бывалыя гвардзейцы супакойвалі маладых, расказвалі, як утрымаў батальён плацдарм на правым беразе Дністра, каля малдаўскага горада Цірaспаль.

Ф.Ф.Архіпенка.

А.К.Болбас.

М.Дз.Капусцін.

Тады сітуацыя таксама склалася цяжкая. Фашысты кінулі на плацдарм безліч танкаў, самалётаў, пяхоты, каб як мага хутчэй знішчыць гвардзейцаў. Ад выбухаў бурліла рака. Ніхто не кідаў зброю, нават цяжкапараненыя. Выбылі са строю камбат і яго намеснік. Камандаванне ўзяў на сябе малодшы лейтэнант Капусцін, парторг батальёна. Той Капусцін, да якога многія напярэдадні бою звярталіся з кароткімі словамі: «Хачу ў бой ісці камуністам», «Калі заб'юць, лічыце мяне камуністам». Той Капусцін, якога ў батальёне любілі і паважалі за мужнасць, вытрымку, за вясёлы характар і душэўнасць.

Неўзабаве і Міхаіла Дзянісавіча параніла. Але камандаванне батальёнам ён не здаў. Два дні батальён мужна адбіваў шалёныя контр-

атакі гітлераўцаў. Плацдарм быў абаронены. А на полі бою дагаралі 23 фашысцкія танкі і самаходныя гарматы, ляжалі сотні гітлераўцаў. І цяпер, перад наступленнем на 219-ю вышыню, Капусцін быў упэўнены ў перамозе. Яго вера перадавалася салдатам, загартоўвала іх дух.

Батальён, які ўваходзіў у склад 137-га гвардзейскага стралковага чырванасцяжнага ордэна Суворава палка, ганарыўся сваімі баявымі традыцыямі, ратнай славай, здабытай у баях на Украіне, у Малдавіі. У батальёне было шмат беларускіх партызан з вызваленых тэрыторый. Міхаіл Капусцін падоўгу размаўляў з землякамі, шукаў тых, хто ведае яго родныя мясціны. Так хацелася пачуць, што там, у яго роднай вёсцы? Ці ўцалела яна? Як склаўся лёс яго сяброў дзяцінства?

Штурм 219-й пачаўся на світанку. Здрыганулася зямля ад магутных залпаў артылерыі. Па пахмурным небе пранесліся агнявыя дугі першых «кацюш». Узнімалася сонца, аднак яго не было відаць — усё зацягнула дымам.

Яшчэ не змоўклі залпы, а хтосьці падняўся ўжо ў атаку і падаў баявы кліч:

— Наперад, гвардзейцы! За Радзіму!

Усе пазналі свайго парторга Капусціна. Пад кулямётным агнём ён з групай аўтаматчыкаў уварваўся ў першую траншэю немцаў. Не вытрымаўшы націску, вораг пакінуў пазіцыі. Так былі знішчаны варожыя разлікі, захоплены тры гарматы з вялікай колькасцю снарадаў.

Наперадзе быў Заходні Буг. Затым батальён фарсіраваў Одэр, браў Франкфурт і Берлін. Так што свой сыноўскі абавязак перад Радзімай наш зямляк выканаў.

Ф. Сідарэнка.

ПІНЧУК Мікалай Рыгоравіч, н. 4.2.1921 г. ў в. Будзёнаўка. Герой Савецкага Саюза (19.4.1945). Заслужаны ваенны лётчык СССР (1965). Скончыў Ваенна-паветраную акадэмію (1954). З 1942 г. на Заходнім і 3-м Беларускім франтах. Удзельнік вызвалення Смаленшчыны, Беларусі, баёў ва Усходняй Прусіі. Камандзір знішчальнай эскадрыллі маёр М. Пінчук за час вайны зрабіў 307 баявых вылетаў, удзельнічаў у 68 паветраных баях, асабіста збіў 22 варожыя самалёты (адзін з іх 30.8.1943 тараніў у раёне Ельні) і два — у групавых баях. Да 1975 г. служыў у Савецкай Арміі, палкоўнік. Аўтар кнігі «У паветры — ЯКі» (1977). Памёр 12.1. 1978 г.

... Ён ведаў, што будзе лётчыкам. Тады, у трыццатых гадах, аб авіяцыі марыў кожны хлапчук. Толькі ў адных гэта мара так і засталася няздзейсненай, у другіх — стала мэтай жыцця. У роднай вёсцы Будзёнаўка была толькі школа-сямігодка. Заканчваць сярэднюю школу Мікалай паехаў у Бабруйск. І невыпадкова: у горадзе быў аэраклуб — парог, з якога пачыналася дарога ў неба. Тут ён і сапраўды адчуў радасць першага самастойнага палёту.

Затым васемнаццацігадовы юнак стаў курсантам Адэскай ваенна-авіяцыйнай школы. Але давучвацца яму давялося ўжо ў баявых вылетах.

29 жніўня 1943 г. на Смаленскім напрамку з васьмёркай ЯКаў на заданне пайшоў ужо вопытны лётчык 18-га гвардзейскага знішчальнага палка Мікалай Рыгоравіч Пінчук. Нечакана ў небе з'явіліся 36 варожых самалётаў. Яны ішлі бамбіць нашы войскі. Гвардзейцы смела кінуліся ў атаку і расстроілі іх баявы парадак. Фашыстам было не да прыцэльнага бамбакідання. Скінуўшы куды папала свой смертаносны груз, яны павярнулі назад. Але «ястрабкі» кінуліся наўздагон. Вось ён, хвост «хенкеля» са свастыкай. Мікалай бачыць за шклом ліхтара твар фашысцкага стралка і націскае гашэтку. Чарга, яшчэ чарга... Ахоплены полымем бамбардзіроўшчык, пакідаючы шлейф дыму, імкліва ляціць уніз. А «ястрабок» Мікалая робіць круты разварот, узлятае ўверх і зноў ідзе на ворагаў. У перакрыжаванні прыцэлу на імгненне мільгае фюзеляж другога «хенкеля». Без прамашкі б'е гармата ЯКа — яшчэ адзін паветраны пірат урэзаўся ў зямлю.

Таварышы віншавалі Мікалая з паспяховым боем. І ніхто не лічыў зыход яго проста ўдалым. Малады лётчык стаў прызнаным майстрам дзёрзкіх атак. Цяпер у яго вучыліся, у яго пераймалі вопыт. Толькі сам Мікалай, здаецца, не заўважаў славы, якая ішла аб ім у палку і дывізіі. Ён застаўся такім жа вясёлым, простым хлопцам, якога горача любілі таварышы.

Тады ж, у жніўні 1943 г., пад Ельняй ён здзейсніў подзвіг, уступіўшы са сваёй чацвёркай «ястрабкоў» у бой з сарака фашысцкімі бамбардзіроўшчыкамі. Сам Мікалай нацэліўся на вядучага. Нягледзячы на манеўр вопытнага ворага, ён атакаваў яго і «прашыў» чаргой. Сцярвятнік рухнуў уніз. Хутка звярнуўшы ўправа, Пінчук аказаўся ў хвасце другога «юнкерса». Зараз толькі трэба было наблізіцца да яго, каб на кароткай дыстанцыі ўдарыць дакладна. Вось ён, фашыст, амаль побач, у перакрыжаванні прыцэлу. Мікалай націскае на дзве гашэткі. Але гармата і кулямёты маўчаць: боепрыпасы скончыліся. І тады гвардзеец прымае рашэнне ісці на таран.

М.Р.Пінчук.

К.П.Чарноў.

Час нібы спыніўся. Усё бліжэй і бліжэй ліхтар «юнкерса», а за ім — перакошаны твар фашыста. На нейкае імгненне знішчальнік трапляе ў зону прыцэлу фашысцкага стралка, і той дае доўгую чаргу. Як гарачым жалезам апякло грудзі і руку. Але Мікалай адразу не зразумеў, што гэта. Уперад, толькі ўперад... І вось ён злёгку падвярнуў управа і крылом секануў фашысцкі самалёт. Паветраны пірат пачаў развальвацца. Але і наш «ястрабок» увайшоў у «штопар». Вось калі далі сябе адчуць раны. З вялікай цяжкасцю адчыніў Мікалай ліхтар кабіны, замок прывязных рамянёў і вываліўся з самалёта. Рывок напоўненага паветрам парашута — і ён пайшоў да зямлі. Ці то ад вялікага напружання, ці то ад страты крыві, зямля ўнізе расплывалася нейкімі васільковымі кругамі. Потым — рэзкі ўдар, моцны боль у грудзях і руцэ. Ён паспеў заўважыць, як бягуць да яго нашы салдаты...

Кавалер Залатой Зоркі, заслужаны ваенны лётчык СССР палкоўнік Мікалай Рыгоравіч Пінчук у пасляваенны час працягваў ахоўваць неба Радзімы, навучыў лётнаму майстэрству шмат маладых яе абаронцаў.

Ф. Сідарэнка.

ЧАРНОЎ Кірыла Пракопавіч, н. 8.6.1907 г. ў в. Амяленская Слабада. Герой Савецкага Саюза (24.12.1943), генерал-маёр артылерыі (1958). У Чырвонай Арміі з 1929 г. скончыў Аб'яднаную беларускую школу імя ЦВК БССР (1933), Вышэйшую афіцэрскую артылерыйскую школу (1944). З 1941 г. на Паўднёва-Заходнім, Сталінградскім, 1-м і 3-м Украінскіх франтах, камандзір знішчальнага процітанкавага артпалка, брыгады. Удзельнік Сталінградскай, Курскай бітваў, баёў на воз. Балатан. Вызначыўся ў верасні 1943 г. ў баях на тэрыторыі Украіны пры фарсіраванні Дняпра і ў баях на захопленым плацдарме. Да 1961 г. служыў у Савецкай Арміі. Памёр 28.10.1972 г.

... Разбіўшы немцаў пад Масквой, савецкія войскі перайшлі ў контрнаступленне, імкліва рухаліся наперад. У канцы 1943 г. злучэнні 47-й арміі Варонежскага фронту выйшлі ўжо да Дняпра ў раёне Канева. Пачалася вялікая бітва за Дняпро. Вораг стварыў магутную абарону, сканцэнтраваў шмат артылерыі, танкаў, адборных пяхотных часцей. Аднак нашы войскі ўзламалі варожую абарону і фарсіравалі Днепр. Пад моцным артылерыйскім агнём часці 23-га стралковага корпуса пераправіліся на правы бераг і ўклініліся ў нямецкую абарону. Вораг пачаў шалёна контратакаваць, кідаючы ў бой усё новыя і новыя сілы.

29-я асобая знішчальная процітанкавая артылерыйская брыгада, якой камандаваў маёр Чарноў, трымала абарону ў раёне Багадухаўка-Аляксандраўскі, прыкрываючы левы фланг арміі. Немцы імкнуліся перарэзаць шашу, каб прарвацца ў тыл гэтай арміі з паўночнага боку.

Гітлераўскае камандаванне кінула супраць нашых артылерыстаў 40 танкаў, тры дзесяткі бронетранспарцёраў і бронемашын, 10 аўтамашын з мотапяхотай. Іх падтрымлівалі артылерыя і мінамёты.

— Вораг не павінен прайсці! Стаяць насмерць! — перадаваліся па баявых разліках словы камандзіра брыгады.

Трое сутак адбівалі шалёныя атакі гітлераўцаў савецкія артылерысты. І вораг не вытрымаў, адступіў. Зямля пакрылася фашысцкімі трупамі. На полі бою засталося каля 20 варожых танкаў і бронемашын.

А ў вечары Кірылу Пракопавічу даставілі новы загад камандуючага арміяй: тэрмінова заняць процітанкавую абарону на плацдарме на поўнач ад Канева, падтрымаць часці 23-га стралковага корпуса, утрымаць і расшырыць плацдарм.

За кароткі час воіны брыгады Чарнова прайшлі маршам 120 кіламетраў, фарсіравалі Днепр і своечасова выйшлі на зададзеныя рубяжы. Дапамаглі баявая вывучка байцоў і камандзіраў, франтавая загартоўка маёра Чарнова, пра якога бывалыя салдаты з гордасцю расказвалі навічкам.

— Мы з Кірылам Пракопавічам (ён тады камандаваў палком) Сталінград абаранялі, войскі Паўлюса акружалі...

— А мы з Чарновым на Курскай Дузе як ільвы біліся, — дапаўнялі другія.

Не паспелі артылерысты заняць пазіцыі, як раптоўна загаварыла варожая артылерыя: пачалася моцная артпадрыхтоўка. Скінуць

нашых воінаў у раку — такую мэту ставілі фашысты. Яшчэ не сціхлі апошнія артылерыйскія залпы, а на баявыя парадкі брыгады Чарнова грознай лавінай рушылі аўтаматчыкі і танкі. Адзін, два..., дзесяць..., трыццаць... 44 танкі і звыш палка пяхоты абрушылі агонь на артылерыстаў.

Завязаўся цяжкі кровапралітны бой. Навокал усё патанула ў ляскаце гусеніц і шуме матораў. Адзін за адным выходзілі са строю гарматныя разлікі, гінулі байцы, але жывыя стаялі насмерць. Камандзір брыгады з'яўляўся то ля аднаго, то ля другога гарматнага разліку і падбадзёрваў байцоў.

Гэта была лабавая атака і лабавы агонь. Танк і батарэя сыходзіліся амаль ушчыльную. З кожнай мінутай іх было ўсё менш і менш. Навокал чарнела акрываўленая зямля, дым і гар заслалі гарызонт. Вялізнымі факеламі палала ўжо больш як 40 варожых танкаў, на зямлі валяліся сотні забітых фашыстаў. У гэты момант савецкія артылерысты ўзмацнілі агонь з усіх відаў зброі. Немцы адкаціліся на зыходныя пазіцыі.

А назаўтра зноў быў бой. І зноў артылерысты Чарнова стаялі насмерць. І так кожны дзень да канца кастрычніка 1943 г. брыгада падпалкоўніка Чарнова ўдзельнічала ў баях за пашырэнне плацдарма ў раёне Канева. За гэты час танкавыя знішчальнікі спалілі 29 і падбілі 46 варожых машын, знішчылі шмат іншай тэхнікі, больш за 1500 гітлераўцаў. За паспяховае прыкрыццё фланга 47-й арміі 29-я знішчальная процітанкавая артылерыйская брыгада перайменавана ў 9-ю гвардзейскую і ўзнагароджана ордэнам Чырвонага Сцяга. Пазней назву «Кіеўскай» і ордэн Леніна брыгада атрымала за вызваленне Кіева.

С. Кобля.

ШМЫГУН Аркадзь Карпавіч, н. 5.11.1908 г. ў в. Старая Шараёўшчына. Герой Савецкага Саюза (31.5.1945). У Чырвонай Арміі з 1930 г. Скончыў курсы «Выстрал» (1937). З жніўня 1944 г. на 1-м Беларускім фронце. Полк пад камандаваннем маёра А. Шмыгуна вызначыўся ў баях на тэрыторыі Польшчы і Германіі: фарсіраваў Віслу, 2 дні вёў баі за Варшаву; 16.4.1945 г. ў баі на подступах да Берліна ўварваўся ў акопы праціўніка і загінуў у гэтым баі. Пахаваны ў г. Дэмбна (Польшча).

... Вайна застала Аркадзя Шмыгуна ў Яраслаўлі, дзе ён працягваў ваенную службу. Неўзабаве яго перавялі ў Маскву, але на фронт не адпраўлялі, нягледзячы на шматлікія рапарты. Яму гаварылі: «Няўжо, таварыш Шмыгун, вы не разумееце, што і тут работа не менш важная, чым на перадавой?».

І толькі ў жніўні 1944 г., нарэшце, просьбу маёра Шмыгуна задаволілі і прызначылі намеснікам камандзіра палка 175-й стралковай дывізіі, якая ўваходзіла ў састаў 1-га Беларускага фронту. У баях з гітлераўцамі Аркадзь Карпавіч паказаў сябе афіцэрам, які можа правільна ацаніць баявую абстаноўку, прыняць патрэбнае рашэнне. Ён смела глядзеў смерці ў вочы, праяўляў мужнасць і гераізм.

А.К.Шмыгун.

Аднойчы ў час штурму польскай вёскі першы батальён, дзе знаходзіўся маёр Шмыгун, вырваўся ўперад. Фашысты кінулі супраць яго амаль полк пяхоты і звыш дзесятка самаходак. Разгарэўся цяжкі бой. На нашы пазіцыі абрушыліся міны, снарады. Радзелі рады байцоў, загінуў і камандзір батальёна. Некаторыя салдаты разгубіліся.

— Ні кроку назад! Стаяць насмерць! — пачуўся загад маёра Шмыгуна, які ўзяў камандаванне на сябе.

Ён хутка арганізаваў кругавую абарону, а на ўчастках, дзе лёгка маглі прайсці танкі, выставіў палкавую артылерыю. У час бою Шмыгун знаходзіўся там, дзе стваралася напружанне. Натхнёныя прыкладам камандзіра, салдаты змагаліся стойка і мужна. Атаку за атакай адбівалі байцы.

Баі за Варшаву маёр Шмыгун пачаў ужо камандзірам 277-га стралковага Карэльскага чырванасцяжнага палка. І тут здольны афіцэр зноў вызначыўся. Ён дабіўся згоды ад камандавання дывізіі, і яго полк першы фарсіраваў Віслу, стойка ўтрымліваў заваяваныя рубяжы і два дні вёў жорсткія баі за польскую сталіцу.

Акрамя ордэнаў Чырвонага Сцяга, Суворава III ступені і Аляксандра Неўскага, якія Шмыгун атрымаў раней за гераічныя подзвігі ў барацьбе з гітлераўцамі, Аркадзь Карпавіч за ўзяцце Варшавы быў удастоены дзвюх Грамат Вярхоўнага Галоўнакамандуючага.

Асабліва вызначыўся Аркадзь Карпавіч у баях на р. Одэр, пры прарыве моцнай абароны праціўніка на подступах да Берліна. Полк Шмыгуна прайшоў тут з баямі каля 100 кіламетраў, удзельнічаў у вызваленні 20 населеных пунктаў, з якіх 6 — буйныя прыгарады Берліна.

І вось наступленне на Берлін. 277-ы стралковы полк Шмыгуна дзейнічаў у першым эшалоне і штурмаваў добра ўмацаваную абарону ворага. Фашысты абрушылі на нашых байцоў ураганны агонь, спынілі атаку. Аркадзь Карпавіч кіраваў боем з назіральнага пункта, які знаходзіўся побач. Калі стварылася цяжкае становішча, маёр Шмыгун сам павёў полк у атаку. З дружным крыкам «Ура!» байцы ўварваліся ў акопы фашыстаў, вораг пачаў адступаць. Маёр Шмыгун выскачыў з акопа і крыкнуў: «За мной!.. На Берлін!..»

Гэта былі апошнія словы бясстрашнага камандзіра. Варожая куля абарвала жыццё беларускага смельчака. *С. Кобля.*

Перамогу набліжалі як маглі

Мы славім герояў, ганарымся іх мужнасцю і подзвігамі. Але перамогі не было б без паўсядзённай ратнай працы тысяч, мільёнаў «чорнарабочых» вайны — старшын, сяржантаў, салдат, афіцэраў і генералаў, якія хоць і не адзначаны зоркамі герояў, але напружаннем сіл, крывёю і жыццямі сваімі набліжалі гэты вялікі і светлы дзень.

ГЛІНСКІ Міхаіл Іосіфавіч, н. 21.11.1901 г. ў в. Малая Каменка (цяпер в. Каменка). Генерал-лейтэнант (1945). У Чырвонай Арміі з 1919 г. Удзельнік грамадзянскай вайны. У 1921—1924 гг. вучыўся ў 1-й Аб'яднанай ваеннай школе імя ВЦВК. Скончыў Ваенную акадэмію імя Фрунзе (1933). У 1933—1938 гг. на дыпламатычнай рабоце. У Вялікую Айчынную вайну на Заходнім, Паўднёва-Заходнім, І-м Украінскім франтах: камандзір дывізіі, корпуса. У 1945—1960 гг. камандзір злучэння, намеснік камандуючага войскамі ваеннай акругі, у Міністэрстве абароны СССР. З 1960 г. ў запасе. Ганаровы грамадзянін г. Багародзіцк Тульскай вобл. Узнагароджаны ордэнам Леніна, 6 іншымі ордэнамі, медалямі.

ШЫРОКІ Феафан Сяргеевіч, н. 16.10.1894 г. ў в. Міхалёва. Генерал-маёр авіяцыі (1944). Удзельнік грамадзянскай вайны. Скончыў Барысаўскую лётную школу (1924), курсы ўдасканалення пры Ваеннай акадэміі імя Жукоўскага (1930). З 1915 г. ў арміі. З кастрычніка 1917 г. ў Чырвонай гвардыі, потым у Чырвонай Арміі. Удзельнік баёў на Усходнім, Паўднёвым і Заходнім франтах, ліквідацыі бандытызму. У Вялікую Айчынную вайну з 1941 г. — намеснік камандзіра цяжкай бамбардзіровачнай авіядывізіі, камандзір авіядывізіі далёкага дзеяння. Удзельнік баёў пад Масквой, Ленінградам, Сталінградам, Курскам, вызвалення Украіны, Вісла-Одэрскай, Усходне-Прускай і Берлінскай аперацый. З 1946 г. ў запасе, потым у адстаўцы. Узнагароджаны ордэнам Леніна, 4 іншымі ордэнамі, медалямі.

Мацнейшыя за браню

Людзі, мацнейшыя за браню. Так вобразна напісаў маршал бранятанкавых і механізаваных войскаў П.П.Палубаяраў у сваіх успамінах пра воінаў Паўночна-Заходняга фронту, якія ў грозныя гады Вялікай Айчыннай вайны абаранялі Ленінград і Маскву, удзельнічалі ў разгроме нямецка-фашысцкіх войскаў на гэтых важнейшых стратэгічных напрамках. Асобнае месца ў сваёй кнізе «На Паўночна-Заходнім фронце. 1941—1943» аўтар адводзіць таварышу па зброі ў той цяжкі і небяспечны час, нашаму земляку Уладзіміру Паўлавічу Тарасенку.

Мне запомніўся, піша маршал, гераічны подзвіг старшага лейтэнанта-тэхніка, цяпер гвардыі палкоўніка ў адстаўцы У.П.Тарасенкі. Разам з экіпажамі 103-га танкавага батальёна ён не раз удзельнічаў у баявых аперацыях, а ў студзені 1942 г. здзейсніў бяспрыкладны подзвіг танкіста-рамонтніка.

Дзве танкавыя роты 150-га батальёна былі ўведзены ў бой каля сяла Юр'еўка (раён Ста-

рой Русы) пры ўпадзенні рэчкі Вергуць у Лаваць. Справа была ўначы. З-за снежных гурбаў танкісты ў начной цемры не разгледзелі месца, дзе зліваліся рэкі. У вынік дзесяць танкаў пайшло пад лёд. Гэта ж такая грозная зброя. Што рабіць?

Выклікалі ва ўпраўленне У.П.Тарасенку. Паказалі месца, дзе затанулі танкі, растлумачылі задачу, сказалі і пра тое, што гэты раён знаходзіцца пад пастаянным агнём артылерыі і авіяцыі праціўніка. Цяжкасць заключалася яшчэ і ў тым, што буксірныя тросы на затопленых танках надзеты на крукі, таму надзець на іх яшчэ па адным тросе цяжка. Хуткасці таксама ўключаны.

У.П.Тарасенка без хістанняў узяўся за справу. У бліжэйшым сховішчы рамонтнікі ўстанавілі вялікую брызентавую палатку з жалезнымі печкамі, паставілі аўтамашыну з уцепленай будкай, вырабілі багры, лесвіцы, падагналі цяжкія танкавыя цягачы. Пасля гэтага У.П.Тарасенка спусціўся пад ваду і зачапіў трос за крук танка. Далей трэба было зацягнуць танк у вялікую палатку, якая ацяплялася, і тым самым засцерагчы рухавік і ўсе сістэмы ад размарожвання, зліць ваду і без разборкі аднавіць рухавік, іншыя вузлы і механізмы. 15 студзеня 1942 г. на Вергуці прабілі шырокую палонку, падагналі цягачы з тросамі. Каб У.П.Тарасенка не прастудзіўся, баявыя сябры рашылі прамачыць ніжняе адзенне ва універсальнай змазцы, затым ёй жа густа змазалі ватоўку і ватныя штаны. У трубку процівагаза заправілі шланг даўжынёй да шасці метраў. Да рамяня паверх ватоўкі прымацавалі грузы і сігнальную вяроўку.

І вось па доўгай лесвіцы У.П.Тарасенка апусціўся пад ваду. Але чамусьці тут жа павадалазнаму прасігналіў вяроўкай. Яго падняслі эвакарамонтнікі, адзетыя ў белыя халаты (усё рабілася непадалёк ад пазіцый праціўніка).

— У вадзе цёмна, мяне ахапіў страх, — прашаптаў ён, як толькі зняў процівагаз. — Аднак лезці трэба!

І Тарасенка, сабраўшы сваю волю, зноў апусціўся на дно ракі. Замерзлымі рукамі ён стаў надзяваць трос на крук корпуса танка. Удалося надзець толькі адзін...

Калі Тарасенку выцягнулі з вады, ён тут жа зайшоў у крытую машыну. Урачы працерлі цела танкіста спіртам, а праз дваццаць мінут ён зноў пайшоў пад ваду. Так працягвалася дзесяць разоў. І гэта на саракаградусным марозе!

Дзесяць баявых машын за кароткі тэрмін былі адноўлены ў палявых умовах, і экіпажы іх потым паспяхова грамілі ворага ў саставе 11-й арміі нашага фронту.

Да гэтага эпізоду, апісанага маршалам, трэба дадаць, што за плячыма маладога афіцэра У.П.Тарасенкі да таго часу быў ужо вялікі баявы вопыт. У кастрычніку 1941 г. пасля цяжкіх баёў з нямецка-фашысцкімі захопнікамі 8-я танкавая брыгада пакінула на полі бітвы 25 танкаў, 8 бронемашын і 12 матацыклаў. Камандаванне 11-й арміі паставіла перад Тарасенкам складаную баявую задачу — эвакуіраваць і затым адрамантаваць тэхніку. Усю ноч пад прыкрыццём артылерыі і самалётаў з пярэдняга краю ішла эвакуацыя баявых машын. А праз трое сутак танкі і браневікі, якім рамонтнікі далі другое жыццё, зноў грамілі ворага на Валдайскіх вышынях.

Свой баявы шлях палкоўнік-танкіст У.П.Тарасенка завяршыў у Чэхаславакіі. Яго ратныя подзвігі адзначаны 17 урадавымі ўзнагародамі. Напярадзе Уладзіміра Паўлавіча чакала хлебаробская доблесць.

Р.Пракопчык.

Апошні бой палітрука Мельнічэнкі

У сакавіку 1941 г. пачалося фарміраванне 28-й танкавай дывізіі, камандзірам якой прызначылі маладога палкоўніка І.Д.Чарняхоўскага. У той дывізіі праходзіў службу палітрук С.М.Мельнічэнка, родам з вёскі Савічы Цялушскага сельсавета. На радзіме быў ён актыўным камсамольцам, прымаў удзел у арганізацыі калгасаў. А калі прызвалі ў Чырвоную Армію, прызначылі палітработнікам. Ён праводзіў цікавыя гутаркі, чытаў лекцыі, быў добрым арганізатарам. Сын селяніна, ён мог рабіць усё: трэба абсталяваць клуб ці чырвоны куток — палітрук шукаў не выканаўцаў, а памочнікаў і браўся з імі за справу.

І вось вайна, танкавая дывізія. Свайго танка ў палітрука не было, і ён звярнуўся да камандзіра дывізіі з просьбай залічыць яго ў экіпаж танка начальніка аддзела палітычнай прапаганды і агітацыі. Яго прызначылі зараджальшчыкам. Так палітработнік аказаўся на

пярэднім краі, дзе агітаваў на подзвіг асабістым прыкладам.

23 чэрвеня 1941 г. завязаўся бой каля літоўскага мястэчка Каркленай Шылальскага раёна. Камбат загадаў заняць абарону на ўзлессі. Гэта была танкавая засада. Выключылі маторы, каб дым не выдаў прысутнасці танкістаў. Па дарозе на матацыклах пранесліся варожыя разведчыкі. Затым вярнуліся назад і, пэўна, далажылі, што ўсё ў парадку, бо тут жа наперад рушыла аўтакалона праціўніка. Камбат загадаў атакаваць. Танкісты стралялі з гармат і кулямётаў, душылі ворага гусеніцамі.

А ноччу палітрук удзельнічаў у разведцы. Праніклі далёка ў размяшчэнне праціўніка, захапілі двух «языкоў» і паспяхова вярнуліся назад.

Баі ішлі кожны дзень. Танкісты адыходзілі да Заходняй Дзвіны. Праціўнік імкнуўся перашкодзіць пераправе. Танк палітработнікаў заставаўся ў групе прыкрыцця. 27 чэрвеня вораг пачаў наступленне. Адбыўся сустрэчны бой. Экіпаж, у складзе якога быў С.М.Мельнічэнка, знішчыў нямецкі танк і тры машыны. Але і ворагу ўдалося падбіць машыну адважнага экіпажа. Загінулі ўсе. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 25 ліпеня 1941 г. палітрук Сямён Мікалаевіч Мельнічэнка быў пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

П.Фралоў, заслужаны настаўнік Літвы.

Жыццём бараніў «дарогу жыцця»

У час Вялікай Айчыннай вайны, бадай, увесь свет, затаіўшы дыханне, сачыў за лёсам Ленінграда, вакол якога ўсё тужэй зацягвалася пятля блакады. Лічылі дні, нават гадзіны. А горад насуперак фашысцкім прароцтвам стаяў і змагаўся. Сілы яму давала жыватворная артэрыя, што звязвала яго з Вялікай зямлёй. Тая самая, якую даволі трапна назвалі «дарогай жыцця». Не, гэта не толькі лядовая траса па Ладажскім возеры. Гэта цэлая сістэма камунікацый, па якіх у абложаны горад пастаўлялася электраэнергія, гаручае, змазачныя матэрыялы. Таму і ахоўвалі яе, як зрэнку вока, усімі сродкамі.

І на перадавой лініі быў тут Васіль Арэшка з вёскі Вялікія Бортнікі — сын былых батракоў Сілы Федаравіча і Аксінні Карпаўны. З чатырох іх дзяцей Васіль быў самы здатны да вучобы. Паступіў у Рагачоўскае педвучылішча. Выкладчыкі яго хвалілі. Але камсамол паклікаў моладзь на флот — і Васіль апрануў форму курсанта ваенна-марскога вучылішча імя Фрунзе ў Ленінградзе. Хутка праляцелі гады вучобы і практыкі. І вось першы выпуск лейтэнантаў-падводнікаў. Калі пачалася савецка-фінляндская вайна, пісаў рапарт за рапартам — ірваўся на фронт.

А тут на́ табе — другая вайна падкацілася пад самы Ленінград, скавала яго ціскамі блакады. Малады афіцэр-балтыец В.С. Арэшка ўдзельнічаў у многіх баявых аперацыях флоту. Быў паранены. Ляжаў у шпіталі, пасля чаго накіравалі дамоў на далечванне — на кватэру, што на Васільеўскім востраве. Ішлі

В.С.Арэшка.

дні, і зашчымела сэрца: як там бацька і маці, сёстры, родзічы, што засталіся пад акупацыяй? Як без яго змагаюцца сябры-чырванафлотцы?

Васіль зноў настойліва прасіўся ў строй.

І вось ён на камандзірскім мосціку тральшчыка ТЩ-126, які напорыста рэжа сваім корпусам свінцовыя хвалі неспакойнай Ладагі. Асабліва трывожна і небяспечна на пераходзе Асінавец—Новая Ладага. Менавіта тут вораг упарта імкнуўся перарэзаць «дарогу жыцця». Судны, што везлі грузы для Ленінграда, маглі наскочыць на міны, іх маглі атакаваць варожыя караблі і самалёты. З імі пастаянна змагаўся тральшчык старшага лейтэнанта В.С.Арэшкі, несучы няспынную вахту ў гэтым суровым дазоры. Гэта, бадай, самая небяспечная служба.

На ўзбраенні карабля — універсальная пушка-саракапятка і буйнакаліберны кулямёт. А яшчэ — спаяная каманда смельчакоў, вялікіх майстроў сваёй справы. І ён, баявы, рашучы камандзір.

На гэты раз выпрабаванне прыйшло з неба. Прама на тральшчык заходзілі ў атаку фашысцкія самалёты. Гэта былі двухматорныя, двухмесныя, з двайным хваставым апярэннем знішчальнікі «Месершміт-110». На тральшчык абрынуўся агнявы шквал; здавалася, ён усё змяце на сваім шляху. Былі забітыя і параненыя. А чарнакрыжыя сцярвятнікі зноў і зноў разварочваліся і ішлі ў атаку. Упаў і сам камандзір. Камандаванне ўзяў на сябе паранены ваенком карабля палітрук Усачоў. Кулямётчык Раманаў, таксама паранены, страляў, а потым рухнуў у непрытомнасці. На яго целе налічылі 16 ран.

Паядынак працягваўся да таго часу, пакуль нарэшце адзін падбіты «месер» не адарваўся ад зграі. Услед за ім з бою выйшлі і астатнія. Рубка і мосцік карабля былі зрашэчаны кулямі і асколкамі. Успыхнуў пажар. Маракі затушылі агонь, заладзілі прабоіны і працягвалі несці вахту.

З каманды былі забіты 3 чалавекі і параненыя 10. Толькі пяцёра маглі выконваць свае абавязкі. Яны і прывялі карабель на базу, і на гэты раз адстаяўшы «дарогу жыцця».

Мужнасць і самаахвярнасць каманды ў тым паядынку ўразіла нават бывалых балтыйцаў. Пра яе подзвіг пазней не раз пісалі ў сваіх мемуарах адмірал У.П.Трыбуц і камандуючы флатыліяй В.С.Чарокаў. Толькі была адна недакладнасць. Камандзір карабля В.С. Арэшка не загінуў, як лічылі. Ён быў цяжка паранены і дастаўлены ў шпіталь. Тут яго дужы арганізм (В.С.Арэшка быў спартсменам, займаўся вольнай барацьбой) вытрымаў складаную аперацыю, і хірургі адназначна заявілі: выжыве!

Але не выжыў. Пачаўся масіраваны налёт варожай авіяцыі, і малады капітан знайшоў свой апошні прытулак у брацкай магіле ў Новай Ладазе. Яго партрэт вісіць у вучылішчы, дзе ён займаўся, матэрыялы пра яго подзвіг — на стэндзе ваенна-марскога музея. Нехай ведаюць і помняць пра адважнага лейтэнанта-падводніка і мае землякі. *І.М.Котаў.*

Штурман Рыгор Булацкі

У лёсе гэтага вясковага хлопца з Мачулак усё складвалася даволі ўдала: у 1939 г. скончыў сярэднюю школу, паступіў у БДУ. Але вучыцца не давялося — прызвалі ў Чырвоную Армію. У жніўні 1941 г. скончыў Мелітопальскае авіяцыйнае вучылішча. Трапіў у авіяцыйны полк на Далёкім Усходзе. Камсорг эскадрыллі Рыгор Булацкі разумеў, што і тут патрэбна моцная ахова граніцы, бо на нашу краіну шчэрылі зубы японскія самураі. І тым не менш настойліва прасіўся на фронт, хоць яму гэтак жа цвёрда адмаўлялі.

Аднойчы штурман Р.Булацкі звярнуўся да сваіх сяброў — лётчыка Васіля Ульянава і тэхніка Аляксея Пятрова:

— А што, калі мы купім уласны самалёт, на свае зберажэнні. Тады — і на фронт: не адмовяць.

Параіліся і абрадаваліся такой ідэі. Падлічылі зберажэнні. На самалёт іх не хапала. Толькі ўжо адысці ад задуманай мэты не маглі, усіх вельмі цягнула на перадавую. Тады вырашылі прадаць усе асабістыя рэчы. Давялося Рыгору Булацкаму развітацца і са сваім веселуном-баянам.

Калі ў штабе камандавання і на гэты раз адмовілі, напісалі самому Галоўнакамандуючаму. І з нецярпеннем чакалі адказу. У хуткім часе іх выклікалі ў штаб. Генерал зачытаў тэлеграму з Масквы. У ёй былі такія словы: «Дзякуй за клопаты аб ваенна-паветраных сілах Чырвонай Арміі. Ваша жаданне будзе выканана». Подпіс І.В.Сталіна.

Камандзір часці павіншаваў дружны экіпаж. А затым — дарога на фронт на ўласным самалёце. Аб гэтым сведчыў і надпіс на машыне. Так пачалася баявая служба ў 452-м ордэна Багдана Хмяльніцкага бамбардзіровачным палку.

Першы баявы вылет экіпаж зрабіў на станцыю Жмерынка, дзе было шмат варожых эшалонаў з жывой сілай і тэхнікай. Глухой ноччу сталёвая машына напорыста ішла да цэлі. Але вось да самалёта панесліся вогненныя трасы. Гэта адкрыў агонь варожы знішчальнік. Бамбардзіроўшчык, не збіваючыся з курсу, рэзка набраў вышыню. Знішчальнік страціў яго з поля зроку. Ужо зусім недалёка і станцыя. І тут наваколле азарылася ўспышкамі варожых зенітак. Як маглі манеўрыравa-

Р.В.Булацкі.

лі ў гэтым вогненным пекле. І ўсё ж прарваліся да аб'екта. З адкрытых люкаў паляцелі бомбы, ад якіх на зямлі скаланулася паветра, разліўся вогненны смерч. Даволі трапнай і ўдалай была гэтая першая атака: гарэла варожая тэхніка, узрываліся цыстэрны з гаручым.

Затым «экіпаж дружных» (так звалі іх баявыя сябры) наносіў бомбавыя ўдары па ворагу на Украіне, у Румыніі, Венгрыі, Чэхаславакіі, Югаславіі, Аўстрыі. Граміў аэрадромы, танкавыя групоўкі, знішчаў жывую сілу, тэхніку праціўніка. Ляталі ноччу і днём, амаль кожны раз прабіваючыся праз заслоны фашысцкіх знішчальнікаў і агонь зенітных батарэй. Вайна для лейтэнанта Рыгора Булацкага скончылася 13 мая 1945 г.: з 9 па 13 мая «экіпаж дружных» быў у Чэхаславакіі, дзе наносіў удары па групоўцы фашыстаў, якая адмовілася скласці зброю. У час баявых вылетаў быў двойчы паранены і раз кантужаны. У 1946 г. дэмабілізаваны як інвалід вайны. За асабістыя мужнасць і гераізм узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, ордэнам Айчыннай вайны I ступені, многімі медалямі, у тым ліку «За вызваленне Будапешта» і «За вызваленне Бухарэста». Напярадзе авіятара Рыгора Булацкага чакала новая, на гэты раз мірная вышыня педагога і навукоўца.

А.Гарэлік.

Баявы шлях танкіста Лушчыка

Васемнаццацігадовым юнаком паступіў Рыгор Лушчык з в. Стасеўка ў Палтаўскае аўтатрактарнае вучылішча, марыў стаць тэхнікам. Але пачалася вайна, вучылішча рэарганізавалі ў танкавае, і скончыў яго Рыгор у жніўні 1942 г. лейтэнантам-тэхнікам. Быў накіраваны ў дзеючую армію. Баявое хрышчэнне атрымаў недалёка ад гарадоў Тарапец і Холм, што ў Калінінскай вобласці. Там 27-мы танкавы полк паспяхова выканаў заданне Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандуючага па разгроме нямецкіх войскаў на станцыі Балагое — важным чыгуначным вузле. За гэты бой малады афіцэр атрымаў першую ўзнагароду — ордэн Чырвонай Зоркі. У хуткім часе полк быў расфарміраваны і ўвесь яго састаў увайшоў у 20-ю танкавую брыгаду, якой камандаваў двойчы Герой Савецкага Саюза гвардыі палкоўнік С.Ф.Шутаў.

На ўсё жыццё ў памяці Рыгора Раманавіча засталіся жорсткія баі ў раёне возера Балатан. Там Лушчык быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені. А трэцюю ўзнагароду — другі ордэн Чырвонай Зоркі — старшы лейтэнант атрымаў пры ўзяцці чэхаславацкага горада Левіцы.

Былі Будапешт, Прага, Вена... Толькі дайсці да Берліна Лушчыку не давялося: яго перакінулі на Далёкі Усход. Дзень Перамогі Рыгор Раманавіч сустрэў на мангольскай зямлі.

У 1946 г. капітан Лушчык вярнуўся ў родны край. Дванаццаць медалёў, чатыры ордэны — так ацаніла Радзіма баявы шлях Рыгора Раманавіча. Былы франтавік працаваў настаўнікам пачатковых класаў у вёсках Навасёлкі, Забудзькі, Осава.

В.Меткі.

За кожным ордэнам — подзвіг

Артылерыйская школа, у якой вучыўся Сяргей Новік з в. Туркі, гула, бы патрывожаны вулей. Курсанты прасіліся на фронт. Але пакуль баі вяліся недзе далёка. Думалася, што ворагу ніколі не дайсці да горада на Няве. Ды толькі гітлераўцы імкліва наступалі.

Абарончыя баі ўжо ішлі пад Гатчынай. Зусім непрыкметна вайна падкралася і да Ленінграда.

Пад камандай Сяргея Новіка былі два зенітныя разлікі. Ахоўвалі яны плаціну, якая трымала ўзровень вады на Беламорканале. Гітлераўскія сцярвятнікі па некалькі разоў на дзень спрабавалі бамбіць гэты важны аб'ект. Ды толькі нашы воіны дружна адганялі, а нярэдка і збівалі іх.

Было гэта ў 43-м... Разлік стаяў на станцыі Надвойцы. Гітлераўцы атакавалі нашы пазіцыі, як ашалелыя. І тут з-за лесу нізка-нізка паказаліся іх самалёты. Завязаўся бой. «Чорныя крыжы» стараліся бамбіць абарончыя ўмацаванні па-снайперску дакладна. Але ў іх нічога не выходзіла. Зенітчыкі дружна трымалі абарону. І вораг не вытрымаў, адступіў.

Стала не па-франтавому ціха. Такой цішыні Новік заўсёды баяўся. Нешта нядобрае закрадвалася пад сэрца, ныла душа. Баяўся і за сябе, а больш за таварышаў. Яму шго: малады, не жанаты. Калі які асколак — ну што ж... Іх у маці чацвёра сыноў. Загіне ён — адпомсціць брат. А як жа тым, у каго жонкі, дзеці?

І тут з-за лесу зноў паказаліся самалёты. І здарылася нешта непрадбачанае. Не паспелі зенітчыкі сабрацца, як зверху на іх паласнулі кулямёты. Першага зенітнага разліку як не было.

«Як жа...» — пранеслася ў галаве Новіка. «Як жа так..., дарагія мае». Сэрца яго напоўніла прага помсты. Ён пачаў страляць па самалётах. Адзін з іх загарэўся.

— Ага, сука нямецкая...

Ахоплены полымем і чорным дымам нябесны прышэлец панёсся некуды за лес, на свой апошні прытулак. А вось задымiў і яшчэ адзін...

— Гады! — крычаў скрозь зенітную стралянiну Новік. — Наце! Атрымлівайце!

І яшчэ адзін сцярвятнік, падбіты ім, знайшоў сваю смерць пад Ленінградам. За геройскія дзеянні ў гэтым баі камандзір узвода артдывізіёна Сяргей Емяльянавіч Новік быў узнагароджаны ордэнам Славы II ступені.

А ордэн Чырвонай Зоркі атрымаў за «языка». Гэта было ў канцы 1943 г. Хадзілі ў разведку. Стаяла задача: узарваць два доты і захапіць у палон гітлераўца. На падрыхтоўку да аперацыі далі некалькі дзён. Новік перш за ўсё адабраў смелых і рашучых воінаў. Быў сярод іх Арол. І па прозвішчу і па характару — Арол. Рашучы, смелы, кемлівы... Яго пераапранулі ў нямецкую форму. Так ён і дайшоў да аднаго з дотаў. А ўсё астатняе было, як кажуць, справай тэхнікі: закідаў фашысцкае ўмацаванне гранатамі... «Языка» ўзялі без асаблівых цяжкасцей і хітрасці. Адшукалі гітлераўскі тэлефонны кабель. Як сцямнела, перарэзалі яго. У засадзе пачалі чакаць манцёраў: прыйдуць жа, без сувязі не будуць. І тыя неўзабаве з'явіліся. Аднаго забілі, а другога ўзялі ў палон...

Але не толькі Ленінград абараняў Сяргей Новік. Вызваляў потым Кольскі паўвостраў, пабываў у Нарвегіі. Ваяваў з японцамі. Вярнуўся дамоў толькі ў 46-м.

Сціплы і шчыры ён чалавек, Сяргей Емяльянавіч Новік. Не шкадуючы сябе, ваяваў на фронце, гэтак жа працаваў потым на розных участках вытворчасці. *Я.Сідорын.*

Крылы дало бабруйскае неба

Барыс Іванавіч Коўзан — чалавек-легенда. Ён — Герой Савецкага Саюза (1943), адзіны ў свеце лётчык, які тараніў 4 варожыя самалёты. У 1940 г. скончыў Адэскую ваенную школу і ў час Вялікай Айчыннай вайны быў лётчыкам-знішчальнікам. Сваім майстэрствам Барыс Іванавіч здзіўляў нават знакамітых паветраных асаў і, вядома ж, наводзіў жах на ворага. На яго рахунку 380 баявых вылетаў, 127 паветраных баёў, 27 збітых самалётаў праціўніка. На гэта трэба шмат мужнасці і адвагі! А ісці на таран... І не адзін, не два разы! А Б.І.Коўзан ішоў. Вось храналогія гэтых яго легендарных подзвігаў: 29.10.

Б.І.Коўзан.

1941 г. — над г. Зарайск Маскоўскай вобл.; 22.2.1942 г. — над г. Таржок Цвярской вобл.; 9.7.1949 г. — над ст. Любніца; 13.8. 1943 г. — над Старой Русай Наўгародскай вобласці.

У 1958 г. падпалкоўнік Б.І.Коўзан пайшоў у адстаўку і да апошніх дзён жыў у Мінску. На Бабруйшчыне помняць гэтага бясстрашнага сокала і ганарацца, што мясцовы аэраклуб узняў яго ў неба, даў яму магутныя крылы.

Яны прайшлі дарогамі вайны

Памяць аб вайне не могуць заглушыць гады. Больш за 2 тысячы ўраджэнцаў Бабруйскага раёна ўдзельнічалі ў Вялікай Айчыннай вайне ў складзе Чырвонай Арміі, партызанскіх фарміраванняў і падполля. Яны абаранялі заходнія рубяжы савецкай краіны ў першыя дні вайны, прымалі ўдзел у Ленінградскай, Маскоўскай, Сталінградскай і Курскай бітвах, вызвалялі родную Беларусь, бралі Кёнігсберг і Берлін... Вайна бязлітасна прайшлася па лёсах жыхароў акупіраваных тэрыторый. Проста выжыць у тыя суровыя гады — таксама быў подзвіг. Кожны з іх, хто дажыў і не дажыў да доўгачаканай Перамогі, хто названы і не названы ў гэтай кнізе, зрабіў свой уклад у агульную справу. Гэтыя людзі заўсёды былі на пярэднім краі — і ў ваенны, і ў мірны час. Ветэраны з гонарам выконвалі свой грамадзянскі абавязак, шчодра перадавалі моладзі баявы і працоўны вопыт. Усім ім вялікая і шчырая ўдзячнасць нашчадкаў за ратны подзвіг у імя будучага.

БОРТНІКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

Акуліч Іван Афанасьевіч, **Акуліч** Яўген Міхайлавіч, **Антончык** Аляксандр Пятровіч, **Ануфрыенка** Іван Паўлавіч, **Архіпенка** Павел Аляксандравіч, **Арэшка** Аляксандр Мікітавіч, **Арэшка** Аркадзь Піліпавіч, **Арэшка** Васіль Піліпавіч, **Арэшка** Васіль Фёдаравіч, **Арэшка** Іван Уладзіміравіч, **Арэшка** Надзея Аляксеўна, **Арэшка** Павел Мікітавіч, **Асіпенка** Аляксей Яўстратавіч, **Аўрамчык** Іван Апанасавіч, **Бабкоў** Аляксандр Мікалаевіч, **Бабкоў** Аляксандр Ціханавіч, **Бабкоў** Канстанцін Якаўлевіч, **Бабкоў** Мікалай Ігнатавіч, **Бабкоў** Мікалай Міхайлавіч, **Бабкоў** Павел Герасімавіч, **Бабкоў** Уладзімір Аляксеевіч, **Бабкоў** Фёдар Андрэевіч, **Бабкоў** Фёдар Ісакавіч, **Бажанаў** Васіль Пятровіч, **Бажанаў** Міхаіл Пятровіч, **Бакшэеў** Міхаіл Іванавіч, **Балыка** Васіль Рыгоравіч, **Балыка** Дзмітрый Харламавіч, **Балыка** Дзям'ян Барысавіч, **Балыка** Іван Аляксеевіч, **Балыка** Ілья Мяфодзьевіч, **Балыка** Клім Іванавіч, **Балыка** Лявон Паўлавіч, **Балыка** Мікалай Ермалаевіч, **Балыка** Наталля Фёдараўна, **Балыка** Раман Мікалаевіч, **Баркоўскі** Яўген Сямёнавіч, **Барысенка** Антаніна Мяфодзьеўна, **Басчанка** Пётр Мінавіч, **Бегуноў** Міхаіл Аркадзьевіч, **Бесрасцень** Мірон Аляксандравіч, **Бокач** Аркадзь Паўлавіч, **Бокач** Васіль Паўлавіч, **Бокач** Васіль Яфімавіч, **Бокач** Мікалай Іванавіч, **Бокач** Парфір Паўлавіч, **Бокач** Рыгор Мікалаевіч, **Бондарава** Софія Макараўна, **Будніцкі** Іван Ільіч, **Бульба** Васіль Іванавіч, **Бурак** Васіль Фядосавіч, **Бурак** Клім Рыгоравіч, **Бурак** Лявонцій Малахавіч, **Бурак** Нічыпар Іванавіч, **Бурак** Павел Георгіевіч, **Бурак** Павел Малахавіч, **Бурак** Уладзімір Васілевіч, **Бурак** Фёдар Ільіч, **Буслоў** Іван Яфімавіч, **Буслоў** Канстанцін Яфімавіч, **Бярозкін** Васіль Сямёнавіч, **Бярозкін** Гаўрыла Малахавіч, **Бярозкін** Міхаіл Сямёнавіч, **Вавула** Леанід Ісакавіч, **Вараб'ёў** Іван Паўлавіч, **Васільеў** Іван Раманавіч, **Васількоў** Іван Мікалаевіч, **Вежнавец** Аляксандр Кузьміч, **Вежнавец** Аркадзь Антонавіч, **Вежнавец** Васіль Агеевіч, **Вінакур** Мікалай Аляксандравіч, **Віннель** Аляксандр Аляксеевіч, **Вяроўкін** Аляксандр Віктаравіч, **Вяроўкін** Анатоль Васілевіч, **Вяроўкін** Генадзь Барысавіч, **Вяроўкін** Іван Андрэевіч, **Вяроўкін** Міхаіл Аляксандравіч, **Галубоўскі** Аляксандр Дзмітрыевіч, **Гарбачова** Ганна Мітрафанаўна, **Гарэлік** Вера Рыгораўна, **Гарэлік** Лаўрэнцій Раманавіч, **Гацак** Іван Данілавіч, **Гецман** Павел Карпавіч, **Гецман** Уладзімір Карпавіч, **Голуб** Аварьян Севасцьянавіч, **Голуб** Карп Герасімавіч, **Голуб** Сяргей Кандратавіч, **Голуб** Фёдар Іосіфавіч, **Грыбоўскі** Сяргей Нічыпаравіч, **Грышчанка** Іван Фёдаравіч, **Грышчанка** Ігнат Міхайлавіч, **Грышчанка** Кірыла Еўцехавіч, **Грышчанка** Міхаіл Сяргеевіч, **Грэбень** Канстанцін Ільіч, **Грэбень** Міхаіл Кузьміч, **Грэк** Леанід Мікалаевіч, **Губарэвіч** Пётр Уладзіміравіч, **Дайнэка** Васіль Тарасавіч, **Дайнэка** Мікалай Мікалаевіч, **Данцэвіч** Генадзь Іванавіч, **Данцэвіч** Яўген Данілавіч, **Дзмітракоў-Караставалей** Міхаіл Ігнатавіч, **Дэятлаў** Міхаіл Васілевіч, **Добрагост** Пётр Піліпавіч, **Дубровін** Уладзімір Артамонавіч, **Ермалаеў** Сцяпан Давыдавіч, **Жураўлёў** Мітрафан Архіпавіч, **Зінкавец** Аляксандр Васілевіч, **Зуб** Іван Рыгоравіч, **Зуб** Макар Лявонавіч, **Зуб** Сямён Лявонавіч, **Кзазарээ** Аркадзь Аляксандравіч, **Казлоў** Іван Якаўлевіч, **Калаткоў** Якаў Сцяпанавіч, **Канавальчык** Аляксей Якаўлевіч, **Канавальчык** Уладзімір Якаўлевіч, **Капленка** Ларыса Якаўлеўна, **Карабанаў** Гаўрыла Цімафеевіч, **Карабанаў** Ілья Міхайлавіч, **Карабанаў** Мікалай Іосіфавіч, **Карабанаў** Мікалай Рыгоравіч, **Карабанаў** Сцяпан Рыгоравіч, **Карпаў** Міхаіл Рыгоравіч, **Кстко** Іван Мітрафанавіч, **Катковіч** Фёдар Сцяпанавіч, **Кашуй** Мікалай Фядотавіч, **Кашуй** Сямён Ціханавіч,

Клепач Афанасій Іванавіч, **Крык** Міхаіл Аляксандравіч, **Кот** Мікалай Савельевіч, **Кот** Рыгор Мікалаевіч, **Котаў** Іосіф Іванавіч, **Котаў** Мікалай Аляксеевіч, **Краўцоў** Васіль Ісакавіч, **Кудрашоў** Рыгор Яўхімавіч, **Кульбацкі** Уладзімір Станіслававіч, **Лайкоўскі** Мікалай Аляксандравіч, **Ларыкаў** Міхаіл Сцяпанавіч, **Лаўрыновіч** Васіль Васілевіч, **Мазурчык** Канстанцін Нічыпаравіч, **Мазурчык** Піліп Нічыпаравіч, **Мазурчык** Сяргей Данілавіч, **Мазурэнка** Аляксандр Данілавіч, **Мазурэнка** Анатоль Мікалаевіч, **Мазурэнка** Андрэй Несцеравіч, **Мазурэнка** Васіль Аляксандравіч, **Мазурэнка** Іван Іванавіч, **Мазурэнка** Іван Ігнацьевіч, **Мазурэнка** Міхаіл Іванавіч, **Мазурэнка** Яўген Аркадзьевіч, **Манько** Мікалай Мікалаевіч, **Манько** Яўген Сцяпанавіч, **Мароз** Канстанцін Аляксеевіч, **Мацвеенка** Прохар Дзмітрыевіч, **Міхалёнак** Канстанцін Маркавіч, **Міхалёнак** Павел Маркавіч, **Назараў** Дзмітрый Іванавіч, **Назарчук** Васіль Цімафеевіч, **Новікаў** Мікалай Сяргеевіч, **Падгорны** Мікалай Пятровіч, **Паслядовіч** Васіль Іванавіч, **Півавараў** Рыгор Лук'янавіч, **Пракопчык** Пётр Васілевіч, **Пузянкоў** Пётр Гаўрылавіч, **Пуннур** Іван Паўлавіч, **Рабус** Піліп Гаўрылавіч, **Рагуцкі** Ілья Фёдаравіч, **Русакоў** Мікалай Іванавіч, **Русакоў** Мікалай Пятровіч, **Русакоў** Мікалай Рыгоравіч, **Рыбак** Васіль Сідаравіч, **Савасц'янчык** Аляксандр Васілевіч, **Сакун** Іван Панфілавіч, **Сакун** Мікалай Апанасавіч, **Самак** Аркадзь Рыгоравіч, **Сарока** Рыгор Паўлавіч, **Сарока** Уладзімір Паўлавіч, **Сілін** Мікалай Герасімавіч, **Скобінаў** Міхаіл Сцяпанавіч, **Скораў** Аляксандр Пракопавіч, **Смалоўскі** Ігнат Сцяпанавіч, **Смалянок** Анатоль Рыгоравіч, **Смалянок** Дзмітрый Якаўлевіч, **Смалянок** Міхаіл Рыгоравіч, **Смалоўскі** Ігнат Сцяпанавіч, **Станкевіч** Антон Францавіч, **Стэльмак** Аркадзь Міхайлавіч, **Стэльмак** Дзмітрый Міхайлавіч, **Стэльмак** Іван Піліпавіч, **Стэльмак** Рыгор Андрэевіч, **Стэльмак** Сяргей Міхайлавіч, **Стэльмак** Фядосій Фёдаравіч, **Сетунова** Марыя Аляксандраўна, **Тарасенка** Рыгор Яўменавіч, **Траян** Андрэй Піліпавіч, **Троцкі** Сцяпан Кандратавіч, **Філімонаў** Барыс Піліпавіч, **Фурс** Рыгор Андрэевіч, **Федарака** Васіль Аляксандравіч, **Фясько** Аркадзь Антонавіч, **Фясько** Клаўдзія Мікітаўна, **Халадкоў** Уладзімір Макаравіч, **Хархаль** Мікалай Купрыянавіч, **Хархаль** Павел Фёдаравіч, **Храбцоў** Дзмітрый Фядотавіч, **Хурсан** Аляксандр Аксёнавіч, **Хурсан** Іван Давыдавіч, **Хурсан** Міхаіл Мікалаевіч, **Хурсан** Рыгор Цітавіч, **Цікавы** Васіль Лявонавіч, **Цікавы** Іван Лявонавіч, **Цітовіч** Пелагея Фёдараўна, **Цэд** Васіль Гаўрылавіч, **Цэд** Сямён Ціханавіч, **Шавялёў** Сцяпан Васілевіч, **Шамак** Іван Мітрафанавіч, **Шапавалаў** Аляксандр Фядосавіч, **Шапялевіч** Варвара Клімаўна, **Шапялевіч** Васіль Андрэевіч, **Шапялевіч** Макар Паўлавіч, **Шапялевіч** Мікалай Рыгоравіч, **Шапялевіч** Пётр Герасімавіч, **Шапялевіч** Пётр Ісакавіч, **Шаўцоў** Міхаіл Паўлавіч, **Шліхтоў** Міхаіл Астапавіч, **Шлык** Пётр Сідаравіч, **Шуцік** Уладзімір Паўлавіч, **Шчаглоў** Аляксей Рыгоравіч, **Шчаглоў** Мікалай Сямёнавіч, **Шчыгельскі** Пётр Мікалаевіч, **Шынкарэнка** Фёдар Пятровіч, **Шырокі** Аляксей Дзмітрыевіч, **Шырокі** Анатоль Пятровіч, **Шырокі** Архіп Фаміч, **Шырокі** Васіль Пятровіч, **Шырокі** Васіль Уладзіміравіч, **Шырокі** Іван Апанасавіч, **Шырокі** Мікалай Восіпавіч, **Шырокі** Мікалай Паўлавіч, **Шырокі** Павел Эмануілавіч, **Шырокі** Пётр Восіпавіч, **Шырокі** Раман Мікалаевіч, **Шырокі** Серафім Яўхімавіч, **Юшкевіч** Аркадзь Мяфодзьевіч, **Юшкевіч** Валянцін Іванавіч, **Юшкевіч** Максім Іванавіч, **Юшкевіч** Мікалай Архіпавіч, **Юшкевіч** Мікалай Іванавіч, **Юшкевіч** Мікалай Фёдаравіч, **Юшкевіч** Мітрафан Іванавіч, **Юшкевіч** Пётр Іосіфавіч, **Юшкевіч** Піліп Піліпавіч, **Юшкевіч** Фёдар Антонавіч, **Юшкевіч** Яўген Мікалаевіч, **Яўстратчык** Іван Фёдаравіч.

БРОЖСКІ СЕЛЬСАВЕТ

Акуліч Васіль Рыгоравіч, **Андруская** Вольга Сямёнаўна, **Андрушчанка** Мікалай Яўсеевіч, **Андрыеўскі** Аляксандр Ісакавіч, **Ануфрыенка** Леанід Сцяпанавіч, **Апанкевіч** Іван Сідаравіч, **Асадчы** Фёдар Макаравіч, **Ахрамчык** Фёдар Нічыпаравіч, **Бабкоў** Аляксей Дзмітрыевіч, **Байкоў** Георгій Васілевіч, **Барадзін** Фёдар Рыгоравіч, **Баранаў** Аляксей Дзмітрыевіч, **Болбас** Аляксандр Паўлавіч, **Болбас** Васіль Лявонавіч, **Болбас** Васіль Сафронавіч, **Болбас** Васіль Фаміч, **Болбас** Канстанцін Усцінавіч, **Болбас** Марк Міронавіч, **Болбас** Мацвей Парфіравіч, **Болбас** Мікалай Сямёнавіч, **Болбас** Піліп Якаўлевіч, **Болбас** Рыгор Сяргеевіч, **Болбас** Рыгор Фёдаравіч, **Болбас** Сцяпан Васілевіч, **Болбас** Сяргей Міронавіч, **Болбас** Фёдар Майсеевіч, **Борбут** Васіль Рыгоравіч, **Буднік** Максім Максімавіч, **Буднік** Міхаіл Раманавіч, **Букас** Мікалай Рыгоравіч, **Букас** Нікадзім Іосіфавіч, **Букас** Пётр Іосіфавіч, **Букас** Сцяпан Іосіфавіч, **Букас** Фёдар Цімафеевіч, **Бурак** Сяргей Іосіфавіч, **Варабай** Васіль Віктаравіч, **Верас** Іван Антонавіч, **Верас** Іван Палікарпавіч, **Верас** Любоў Апанасаўна, **Верас** Міхаіл Анісімавіч, **Верас** Пётр Арцёмавіч, **Верас** Рыгор Мікалаевіч, **Верас** Сямён Мітрафанавіч, **Власік** Іван Нічыпаравіч, **Врублеўскі** Іван Піліпавіч, **Врублеўскі** Рыгор Піліпавіч, **Гавароўскі** Станіслаў Фабіянавіч, **Галавачоў** Міхаіл Міхайлавіч, **Гаўрон** Марфа, **Голуб** Павел Кузьміч, **Грыбок** Іван Мікалаевіч, **Грыцук** Мікалай Уладзіміравіч, **Губскі** Яўген Андрэевіч, **Дробышаў** Аляксандр Міхайлавіч, **Дуброўка** Аляксандр Якаўлевіч, **Дудко** Андрэй Уладзіміравіч, **Езафатава** Марыя Сцяпанаўна, **Езафатаў** Сцяпан Майсеевіч, **Зайцаў** Міхаіл Іванавіч, **Какоўка** Мікалай Андрэевіч, **Каламеец** Іван Аўрамавіч, **Каменеў** Іван Ільіч, **Канцер** Ілья Аўрамавіч, **Караткевіч** Казімір Аркадзьевіч, **Каташ** Васіль Карпавіч, **Качан** Васіль Андрэевіч, **Коршак** Сяргей Маркавіч, **Крук** Міхаіл Васілевіч, **Крук** Пётр Іванавіч, **Крук** Раман Піліпавіч, **Крук** Сцяпан Іванавіч, **Крук** Сяргей Максімавіч, **Крук** Сяргей Міхайлавіч, **Крукаў** Іван Нічыпаравіч, **Куцькіна** Валянціна Лявонаўна, **Куцько** Іван Кірылавіч, **Лахман** Вячаслаў Іванавіч, **Лісоўская** Алена Іосіфаўна, **Лісоўскі** Іван Іванавіч, **Лісоўскі** Пётр Міронавіч, **Лось** Аляксандр Міхайлавіч,

Лось Антон Максімавіч, **Лось** Васіль Мікалаевіч, **Лось** Васіль Сафронавіч, **Лось** Васіль Фёдаравіч, **Лось** Даніла Паўлавіч, **Лось** Іван Дзмітрыевіч, **Лось** Іван Лазаравіч, **Лось** Ісак Міхайлавіч, **Лось** Міхаіл Васілевіч, **Лось** Піліп Максімавіч, **Лось** Рыгор Андрэевіч, **Лось** Савелій Лявонавіч, **Лось** Фёдар Ільіч, **Лось** Якаў Якаўлевіч, **Малойчык** Іван Іванавіч, **Марозка** Іван Міхайлавіч, **Маскалёнак** Марцін Яўхімавіч, **Мацвіенка** Георгій Максімавіч, **Мірончык** Мікалай Антонавіч, **Мірончык** Міхаіл Аляксандравіч, **Міхлюк** Пётр Лявонавіч, **Міхлюк** Сяргей Іванавіч, **Найдун** Іван Паўлавіч, **Некрашэвіч** Міхаіл Іванавіч, **Некрашэвіч** Міхаіл Іванавіч, **Некрашэвіч** Уладзімір Парфіравіч, **Нікітка** Гаўрыла Харытонавіч, **Нікітка** Георгій Дзмітрыевіч, **Нікітка** Мікалай Ніканавіч, **Нікітка** Міхаіл Кірылавіч, **Нікітка** Пётр Нічыпаравіч, **Нікітка** Сцяпан Еўдакімавіч, **Нікітка** Сцяпан Нічыпаравіч, **Нікітка** Сяргей Нічыпаравіч, **Нікітка** Сяргей Нічыпаравіч, **Нікітка** Сяргей Піліпавіч, **Нікітка** Цімафей Нічыпаравіч, **Новік** Георгій Цімафеевіч, **Няронскі** Мікалай Сцяпанавіч, **Паламашноў** Фёдар Іванавіч, **Пасько** Іван Лявонцьевіч, **Пасько** Іван Мацвеевіч, **Пасько** Рыгор Максімавіч, **Пелагейка** Віктар Сцяпанавіч, **Расоха** Фама Макаравіч, **Роскач** Васіль Іванавіч, **Роскач** Мікалай Іванавіч, **Роскач** Сямён Сямёнавіч, **Рудзько** Аляксей Рыгоравіч, **Рудзько** Іван Арцёмавіч, **Рудзько** Іван Рыгоравіч, **Рудзько** Іван Савельевіч, **Рудзько** Сяргей Арцёмавіч, **Руднеў** Мікалай Іванавіч, **Севярын** Пракоп Яфімавіч, **Севярын** Сцяпан Рыгоравіч, **Сінкевіч** Фёдар Ульянавіч, **Смірноў** Нічыпар Ягоравіч, **Стральцоў** Павел Андрэевіч, **Сцепановіч** Аркадзь Апанасавіч, **Тараховіч** Даніла Мікалаевіч, **Тоўсцік** Васіль Яфрэмавіч, **Тоўсцік** Фёдар Рыгоравіч, **Тулуп** Дзям'ян Ільіч, **Філіповіч** Міхаіл Адамавіч, **Харытончык** Аляксандр Іосіфавіч, **Хоха** Міхаіл Міхайлавіч, **Хурсан** Канстанцін Васілевіч, **Шах** Іван Максімавіч, **Шах** Піліп Мацвеевіч.

ВАРАТЫНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

НІКІТКА Аляксей Карпавіч, н. ў 1922, партызан атрада імя Фурманава 37-й бр. імя Пархоменкі, загінуў 30.6.1943, пахаваны ў в. Зелянковічы Глускага р-на Магілёўскай вобл.

ВЁСКА ОРСІЧЫ 2-я

РОСКАЧ Дзяніс Іосіфавіч, н. ў 1904, партызан атрада імя Шчорса, старш., кам. узв. Беларускага штаба партызанскага руху, загінуў 13.3.1942, пахаваны ў в. Казловічы Глускага р-на Магілёўскай вобл.

РУДЗЬКО Іван Дзмітрыевіч, н. ў 1924, партызан атрада імя Кірава 37-й бр. імя Пархоменкі, загінуў у лістападзе 1943, пахаваны ў в. Коўчыцы Светлагорскага р-на Гомельскай вобл.

ШКАЛЕЎ Рыгор Савельевіч, н. ў 1912 у в. Мормаль Жлобінскага р-на, партызан атрада імя Арджанікідзе 37-й бр. імя Пархоменкі, загінуў у верасні 1944.

ВЁСКА ПРУДЗІШЧА

АСЕЦКАЯ Яніна Аляксандраўна, н. ў 1928, партызанка, памерла ад хваробы 4.7.1945 у Германіі.

ВАНКОВІЧ Фелікс Валяр'янавіч, н. ў 1906, партызан-сувязны, расстраляны фашыстамі 23.17.1943, пахаваны ў брацкай магіле ў в. Прудзішча.

МАЦВЯЁНАК Леванціна Людвігаўна, н. ў 1867, старш. калгаса, партызанка-сувязная, спалена фашыстамі 7.1.1944 разам з унучкай **МАЦВЯЁНАК Валянцінай Васілеўнай** (н. ў 1937), пахаваны ў брацкай магіле ў в. Прудзішча.

ВЁСКА РОСКАЧЫ

КРУК Ігнат Цімафеевіч, н. ў 1916, партызан атрада імя Калініна 100-й Глускай бр., загінуў 11.10.1944, пахаваны на Чорных балотах Любанскага р-на Мінскай вобл.

ВЁСКА СЛАБОДКА

АНАНКЕВІЧ Марыя Максімаўна, н. ў 1896, партызанка-сувязная, расстраляна 6.12.1942, пахавана ў брацкай магіле ў пас. Брожа.

БОЛБАС Ганна Фёдараўна, н. ў 1924, партызанка-сувязная, расстраляна 6.12.1942, пахавана ў брацкай магіле ў пас. Брожа.

БОЛБАС Мікалай Іванавіч, н. ў 1886, партызан-сувязны, расстраляны 6.12.1942 разам з жонкай і малымі дзецьмі, пахаваны ў брацкай магіле ў пас. Брожа.

БОЛБАС Нічыпар Мікалаевіч, н. ў 1922, партызан атрада імя Кірава 37-й бр. імя Пархоменкі, загінуў 27.6.1942, пахаваны ў в. Крукаўшчына Глускага р-на Магілёўскай вобл.

БОЛБАС Рыгор Сяргеевіч, н. ў 1922, партызан атрада імя Фурманава 37-й бр. імя Пархоменкі, загінуў 23.10.1943, пахаваны ў в. Уюнішча Глускага р-на Магілёўскай вобл.

ГУРБАНОВІЧ Анастасія Акімаўна, н. ў 1918, партызанка-сувязная, расстраляна 6.12.1942, пахавана ў брацкай магіле ў пас. Брожа.

МІХЛЮК Максім Піліпавіч, н. ў 1913, партызан атрада імя Фурманава 37-й бр. імя Пархоменкі, загінуў 19.8.1943, пахаваны ў в. Зелянковічы Глускага р-на Магілёўскай вобл.

МІХЛЮК Піліп Парфенавіч, н. ў 1890, партызан-сувязны, расстраляны 6.12.1942, пахаваны ў брацкай магіле ў пас. Брожа.

МІХЛЮК Фядора Максімаўна, н. ў 1892, партызанка-сувязная, расстраляна 6.12.1942, пахавана ў брацкай магіле ў пас. Брожа.

ПАСЬКО Якім Пракопавіч, н. ў 1889, партызан-сувязны, расстраляны 6.12.1942, пахаваны ў брацкай магіле ў пас. Брожа.

ПЕПІК Віктар Іванавіч, н. ў 1905, партызан атрада імя Фурманава 37-й бр. імя Пархоменкі, загінуў 24.11.1943, пахаваны ў в. Зубарэвічы Глускага р-на Магілёўскай вобл.

І.Ц.Крук.

В.І.Пепік.

ШЧЭРБІЧ Васіль Антонавіч, камандзір партызанскага атрада імя Фурманава 37-й бр. імя Пархоменкі, памёр ад хваробы ў 1945, пахаваны ў в. Коўшын Акцябрскага р-на Гомельскай вобл.

ЮНАШАЎ Аляксандр Міхайлавіч, н. ў 1923, партызан атрада імя Шчорса 37-й бр. імя Пархоменкі, загінуў 20.1.1943, пахаваны ў в. Зелянковічы Глускага р-на Магілёўскай вобл.

ЮНАШАЎ Аркадзь Міхайлавіч, н. ў 1927, партызан-сувязны, расстраляны 6.12.1942, пахаваны ў брацкай магіле ў пас. Брожа.

ВАРАТЫНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АЎСІМАВІЧЫ

ЗАРУБА Аляксандр Дамітрыевіч, н. ў 1912, партызан 751-га атрада, загінуў 28.12.1943, пахаваны на ст. Жэрдзь Светлагорскага р-на Гомельскай вобл.

ПАРАХНЕВІЧ Сяргей Мікітавіч, н. ў 1908, партызан, прапаў без вестак.

ПАРАХНЕВІЧ Юсціп Мікітавіч, н. ў 1906, партызан-сувязны, загінуў у в. Шчадрын Жлобінскага р-на Гомельскай вобл.

ВЁСКА БЕЛЯЦІНА

ХВАШЧЫНСКАЯ Настасся Фядосаўна, н. ў 1911, партызанка, прапала без вестак.

ВЁСКА БУДЧЫН

АЎРАМЧЫК Фёдар Сідаравіч, н. ў 1908, партызан-сувязны, загінуў, пахаваны ў в. Назараўка Бабруйскага р-на.

ПРАКОПЧЫК Адам Георгіевіч, н. ў 1894, сувязны-партызан 539-га атрада імя Нікіціна, расстраляны фашыстамі ў в. Шчадрын Жлобінскага р-на Гомельскай вобл.

ПРАКОПЧЫК Валерый Адамавіч, н. ў 1929,

партызан-сувязны 539-га атрада імя Нікіціна, расстраляны фашыстамі, пахаваны ў в. Жылічы Кіраўскага р-на Магілёўскай вобл.

ВЁСКА ВАРАТЫНЬ

ГАЛУБІЦКІ Аляксей Аляксандравіч, н. ў 1905, партызан, прапаў без вестак у верасні 1944.

КАЗЛОЎСКАЯ Дар'я Піліпаўна, партызанка, прапала без вестак.

КАЗЛОЎСКІ Сяргей Пятровіч, партызан, прапаў без вестак.

ПРАКОПЧЫК Георгій Іванавіч, партызан, прапаў без вестак.

ПРАКОПЧЫК Канстанцін Міхайлавіч, н. ў 1919, лейт., кам. узв. 567-га сп 173-й сд, партызан Беларускага штаба партызанскага руху, загінуў 19.9.1943, пахаваны ў в. Дабрыца Кіраўскага р-на Магілёўскай вобл.

СУХАРАЎ Фёдар Іванавіч, н. ў 1921, партызан, загінуў 22.2.1944, пахаваны ў Кіраўскім р-не Магілёўскай вобл.

ХВАШЧЫНСКІ Фёдар Піліпавіч, н. ў 1918, партызан, прапаў без вестак.

ХВАШЧЫНСКІ Піліп Яфімавіч, н. ў 1881, партызан, прапаў без вестак.

ВЁСКА ВІЛЫ

ЗАЙЦАЎ Рыгор Іванавіч, партызан 9-й Кіраўскай бр., прапаў без вестак.

ПІМЕНАЎ Пётр Дамітрыевіч, н. ў 1918, партызан, загінуў 6.6.1944, пахаваны ў в. Дзмітраўка Клічаўскага р-на Магілёўскай вобл.

ВЁСКА КОЎРЫН

ДАШКОЎСКІ Іларыён Пятровіч, н. ў 1910, партызан, прапаў без вестак 27.3.1944.

ЛУШЧАКОЎ Рыгор Рыгоравіч, н. ў 1911, партызан 751-га атрада, загінуў 11.2.1944, пахаваны ў в. Майсееўка Светлагорскага р-на Гомельскай вобл.

ПРАКОПЧЫК Васіль Трафімавіч, н. ў 1909, партызан-сувязны 539-га атрада імя Нікіціна, прапаў без вестак.

ПРАКОПЧЫК Уладзімір Іванавіч, н. ў 1923, партызан 751-га атрада, загінуў 11.12.1943, пахаваны ў в. Майсееўка Светлагорскага р-на Гомельскай вобл.

ВЁСКА МАЛАЯ КАНТОРА

ПАРАХНЕВІЧ Канстанцін Аляксеевіч, н. ў 1923, партызан 539-га атрада Кіраўскай ваенна-аператыўнай групы, прапаў без вестак.

ВЁСКА НОВЫ БЫТ

ШАЎЧУК Марыя Сямёнаўна, н. ў 1918, партызавка-разведчыца 752-га атрада В.І.Лівенцава, загінула ў кастрычніку 1942.

ВЁСКА СТАРЫ ДВОР

БАРЫСЁНАК Яўген Сцяпанавіч, н. ў 1924, партызан, прапаў без вестак 11.12.1943.

ВЁСКА ТУРКІ

АЛЯКСЕЕЎ Гаўрыла Васілевіч, н. ў 1923, партызан, прапаў без вестак.

БАБКОЎ Браніслаў Маркавіч, н. ў 1900, партызан-сувязны, расстраляны фашыстамі ў 1942 (1943).

БУДНІК Іван Апанасавіч, н. ў 1911, партызан бр. імя Кірава, загінуў у 1944.

ВІНАГРАДАЎ Леанід Фадзеевіч, партызан атрада імя Кірава 37-й бр. імя Пархоменкі, загінуў у чэрвені 1943.

ЛЯПЁШКІН Канстанцін Аляксеевіч, н. ў 1924, партызан, загінуў у 1943.

ЛЯПЁШКІН Мікалай Максімавіч, н. ў 1923, партызан, загінуў 26.3.1943, пахаваны ў в. Хатоўня Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл.

НОВІКАЎ Іван Іванавіч, н. ў 1916, партызан, загінуў 18.8.1943, пахаваны на ўзлеску Сухога Балота Кіраўскага р-на Магілёўскай вобл.

ПАСЛЯДОВІЧ Іван Ігнатавіч, н. ў 1925, партызан, загінуў 19.9.1943, пахаваны ў в. Добрышча Кіраўскага р-на Магілёўскай вобл.

САНЮК Іван Сцяпанавіч, н. ў 1905, рад. 70-га цстп, партызан-сувязны, загінуў у маі 1943.

ХАМКОВА Алена Сямёнаўна, н. ў 1900, партызанка-сувязная, расстраляна ў 1942.

ХАМКОЎ Леанід Максімавіч, н. ў 1923, партызан, расстраляны ў 1942 у Бабруйску.

ЧАПЛІН Іван Антонавіч, н. ў 1921, партызан, загінуў у 1942.

ШАЎЦОЎ Адам Рыгоравіч, н. ў 1896, партызан-сувязны, расстраляны ў 1942 (1943).

ВЁСКА ТУРКОЎСКАЯ СЛАБАДА

АЛЯКСЕЕЎ Іван Васілевіч, н. ў 1924, партызан, загінуў у 1942, пахаваны ў в. Туркоўская Слабада.

АНДРЭЕЎ Андрэй Яфімавіч, н. ў 1915, партызан, прапаў без вестак у 1944.

РАДЗІВОНАВА Праскоўя Агапаўна, н. ў 1908, партызанка-сувязная, расстраляна ў 1942, пахавана ў в. Шчадрын Жлобінскага р-на Гомельскай вобл.

ВАСІЛЬЕВА Ульяна Кірылаўна, н. ў 1922, партызанка, расстраляна фашыстамі.

ФАМІНА Ганна Несцераўна, партызанка-сувязная, расстраляна ў 1944.

ФІЛІПАВА Пелагея Іванаўна, партызанка, расстраляна ў пінскіх балотах.

ЯКАЎЛЕЎ Лаўрэн Лазаравіч, н. ў 1909, партызан, расстраляны ў пінскіх балотах.

ВІШНЁЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БАРАВАЯ

БЕБЧЫК Сцяпан Савельевіч, н. ў 1900, партызан 537-га атрада імя Кірава, прапаў без вестак 12.10.1943.

СВЕРЖ Кароль Севасцьянавіч, н. ў 1920, партызан атрада імя Шчорса, загінуў у лютым 1943, пахаваны ў в. Рачэнь Любанскага р-на Мінскай вобл.

ВЁСКА ВУГЛЫ

АЛЯКСЕЕЎ Рыгор Калінавіч, н. ў 1925, партызан 751-га атрада, трапіў у палон 25.10.1943, прапаў без вестак.

ЕЎДАСЕЕЎ Павел Маркелавіч, н. ў 1923, партызан 751-га атрада, прапаў без вестак 25.10.1943 каля в. Палянкі.

ЕЎДАСЕЕЎ Фёдар Маркелавіч, н. ў 1913, партызан 751-га атрада, прапаў без вестак 26.10.1943 каля в. Палянкі.

МАКСІМАЎ Ісай Калінавіч, н. ў 1907, партызан 751-га атрада, загінуў 25.10.1943, пахаваны ў в. Вуглы.

ВЁСКА ГЛЕБАВА РУДНЯ

ЗМЕЙ Дзмітрый Іванавіч, н. ў 1919, лейт., кам. роты, партызан атрада імя Шчорса, загінуў у в. Глебава Рудня.

МІХНЕВІЧ Антон Нарцідавіч, н. ў 1907, партызан атрада імя Кірава 37-й бр. імя Пархоменкі, загінуў 19.12.1943.

ВЁСКА ДАМАНОВА

МІНЬКОВІЧ Віктар Антонавіч, н. ў 1924, партызан 752-га атрада, загінуў 11.12.1943, пахаваны ў в. Майсееўка Светлагорскага р-на Гомельскай вобл.

ВЁСКА КАЗАКОВА

КАЛПАКОВА Марыя Ісаеўна, н. ў 1923, настаўніца, партызанка атрада імя Кірава 37-й бр. імя Пархоменкі, загінула 19.12.1943 у в. Коўчыцы Светлагорскага р-на Гомельскай вобл.

КАЛПАКОЎ Ісай Акімавіч, н. ў 1896, партызан атрада імя Кірава 37-й бр. імя Пархоменкі, загінуў 19.12.1943 у в. Коўчыцы Светлагорскага р-на Гомельскай вобл.

КАЛПАКОЎ Павел Алімпавіч, н. ў 1902, партызан Беларускага штаба партызанскага руху, прапаў без вестак 10.6.1944.

КОРШАК Якаў Восіпавіч, н. ў 1895, партызан атрада імя Фурманава 37-й бр. імя Пархоменкі, загінуў 17.7.1943, пахаваны ў в. Орсічы.

КУЗЯКІН Аляксандр Сцяпанавіч, н. ў 1918, партызан атрада імя Шчорса, загінуў 3.2.1944 у в. Гарадзішчы Глускага р-на Магілёўскай вобл.

ВЁСКА ПРОДЗВІНА

ГАВАРОЎСКІ Віктар Альбанавіч, н. ў 1915, партызан атрада імя Дзяржынскага 161-й бр. імя Катоўскага, памёр ад тыфу 12.3.1943.

ВЁСКА СТАСЕЎКА

БЕЛЫ Герасім Іванавіч, н. ў 1923, партызан атрада імя Фурманава 37-й бр. імя Пархоменкі, загінуў 24.11.1943, пахаваны ў в. Зубарэвічы Глускага р-на Магілёўскай вобл.

БОРБУТ Васіль Іванавіч, н. ў 1903, старшыня Стасеўскага с/с, партызан атрада імя Фурманава 37-й бр. імя Пархоменкі, загінуў 17.7.1943, пахаваны паміж вёскамі Орсічы і Брожа.

ГАРБАЦЭВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АТРОШКАВІЧЫ

ГАЦУК Іван Аляксеевіч, н. ў 1900, партызан атрада імя Чапаева 37-й бр. імя Пархоменкі, загінуў 19.2.1943, пахаваны ў в. Зелянковічы Глускага р-на Магілёўскай вобл.

ЛАЎРЫНЁНАК Надзея Міхайлаўна, н. ў 1918, партызанка-сувязная, загінула ў 1943 у Бабруйску.

ЛУЦ Васіль Якаўлевіч, н. ў 1923, партызан атрада імя Катоўскага, разведчык 420-га арп 354-й сд, загінуў 18.3.1944, пахаваны ў в. Мядзведзеўка Гомельскай вобл.

ВЁСКА БАГУСЛАЎКА

БАРАНОЎСКІ Віктар Пятровіч, н. ў 1924, партызан атрада імя Кірава 37-й бр. імя Пархоменкі, загінуў пад Бабруйскам.

БАРАНОЎСКІ Уладзімір Васілевіч, н. ў 1911, партызан, кам. аддз. 37-й бр. імя Пархоменкі, прапаў без вестак у 1943.

ВЁСКА БАГУШОЎКА

АЗЯРЭЦ Васіль Ігнатавіч, н. ў 1907, партызан, прапаў без вестак.

КАВАЛЕНКА Іван Андрэевіч, н. ў 1919, партызан атрада імя Чапаева 37-й бр. імя Пархоменкі, загінуў 19.2.1942 у в. Гарохаўка.

МАКСІМАЎ Сафрон Арцёмавіч, н. ў 1923, партызан атрада імя Кірава 37-й бр. імя Пархоменкі, загінуў у в. Коўчыцы Светлагорскага р-на Гомельскай вобл.

САКАЛОЎ Сямён Цярэнцьевіч, н. ў 1923, партызан атрада імя Кірава 37-й бр. імя Пархоменкі, загінуў пад Бабруйскам.

ВЁСКА БАНЁЎКА

СКРОБАТАВА Феня Сямёнаўна, н. ў 1913, партызанка атрада імя Кірава 37-й бр. імя Пархоменкі, загінула 19.2.1943 у в. Коўчыцы 2-я Светлагорскага р-на Гомельскай вобл.



Дз.А.Фёдараў.

ВЁСКА БУДА

ГУЛЬБІС Іван Емяльянавіч, н. ў 1917, партызан атрада імя Кірава 37-й бр. імя Пархоменкі, прапаў без вестак.

САСНОЎСКІ Іван Акімавіч, н. ў 1904, рад., партызан атрада імя Кірава 37-й бр. імя Пархоменкі, загінуў 19.12.1943, пахаваны ў в. Коўчыцы Светлагорскага р-на Гомельскай вобл.

ФЁДАРАЎ Дзмітрый Арцёмавіч, н. ў 1909, рад. 37-й сд 65-й арміі, партызан атрада імя Кірава 37-й бр. імя Пархоменкі, загінуў 19.12.1943 у в. Коўчыцы-2 Светлагорскага р-на Гомельскай вобл.

ШЧАРБАКОВА Каліда Сафронаўна, партызанка, закатавана фашыстамі.

ВЁСКА ГАРБАЦЭВІЧЫ

ГОРБАЧ Зося Ігнацьеўна, н. ў 1923, партызанка-сувязная, зімой 1943—1944 схоплена фашыстамі і расстраляна.

ЗІНЕВІЧ Мікалай Якаўлевіч, н. ў 1922, партызан, прапаў без вестак.

ПАЛАШАВЕЦ Клаўдзія Паўлаўна, н. ў 1925, партызанка-сувязная, зімой 1943—1944 расстраляна паліцаямі ў в. Гарбацэвічы.

ПЕШКА Марыя Макараўна, н. ў 1922, партызанка-сувязная, расстраляна фашыстамі ў 1943 (1944).

РОСЛІК Уладзімір Фёдаравіч, н. ў 1923, партызан атрада імя Чапаева 37-й бр. імя Пархоменкі, загінуў 6.11.1943, пахаваны ў в. Гарохаўка.

ВЁСКА ДВОР-ГАРБАЦЭВІЧЫ

БАРЫСЁНАК Яўген Сцяпанавіч, н. ў 1924, партызан 753-га атрада, прапаў без вестак 11.12.1943.

ВЁСКА КРУШЫНКА

АРЭХАЎ Канстанцін Іванавіч, н. ў 1925, партызан атрада імя Шашуры 161-й бр. імя Катоўскага, загінуў у красавіку 1944.

ВЁСКА МІХАЙЛАЎКА

ІВАНОЎ Леанід Андрэевіч, партызан, прапаў без вестак у верасні 1944.

ВЁСКА ОБЧА

СТРАЛЬЦОЎ Сафрон Іванавіч, н. ў 1903, партызан атрада імя Чапаева, загінуў 21.9.1943, пахаваны ў в. Гарохаўка.

ВЁСКА ПАБОКАВІЧЫ

ВАЛАЎ Мікалай Іванавіч, н. ў 1921, партызан атрада імя Шашуры 161-й бр. імя Катоўскага, загінуў 18.1.1943.

КАРДАШ Леанід Юр'евіч, н. ў 1926, партызан, загінуў 19.11.1943 у в. Коўчыцы-2 Светлагорскага р-на Гомельскай вобл.

СЫСОЙ Міхаіл Аляксандравіч, н. ў 1910, партызан-сувязны атрада імя Кірава 37-й бр. імя Пархоменкі, загінуў 20.10.1943.

ВЁСКА РАГАЛІ

АРХІПЕНКА Іван Мінавіч, партызан, загінуў 10.4.1944, пахаваны ў в. Рагалі.

АШУРКА Барыс Міронавіч, н. ў 1923, партызан атрада імя Чапаева, загінуў 19.11.1942, пахаваны ў в. Брожка.

АШУРКА Уладзімір Сямёнавіч, н. ў 1923, партызан атрада імя Чапаева 37-й бр. імя Пархоменкі, памёр ад ран 19.2.1943, пахаваны ў в. Уюнішча Глускага р-на Магілёўскай вобл.

ЗІНЕВІЧ Уладзімір Пятровіч, н. ў 1927, партызан атрада імя Кірава 37-й бр. імя Пархоменкі, загінуў 30.5.1944, пахаваны ў пас. Забродзе Жыткавіцкага р-на Гомельскай вобл.

ВЁСКА СТАНЫ

САКАЛОЎ Іван Цярэнцьевіч, н. ў 1925, партызан атрада імя Кірава 37-й бр. імя Пархоменкі, прапаў без вестак пад Бабруйскам.

ГАРОХАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АКОЛІЦА

МАРОЗ Міхаіл Андрэевіч, н. ў 1923, партызан атрада імя Чапаева, загінуў 30.8.1943 на чыгунцы ў Бабруйску.

ЯБЛОНСКАЯ Аляксандра Іванаўна, н. ў 1926, падпольшчыца-сувязная 1-й Бабруйскай бр., спалена фашыстамі 24.7.1944.

ЯБЛОНСКАЯ Ганна, н. ў 1908, партызанка-сувязная, падпольшчыца 1-й Бабруйскай бр., спалена фашыстамі 24.7.1944.

ВЁСКА ГАРОДЧЫНА

ЛЯШЧУН Дзям'ян Маркавіч, н. ў 1909, партызан 161-й бр. імя Катоўскага, загінуў 10.4.1944,

пахаваны ў в. Загалле Любанскага р-на Мінскай вобл.

ВЁСКА ДВОРЫШЧА

БУЗАК Сяргей Лук'янавіч, н. ў 1924, партызан атрада імя Кірава, загінуў 18.2.1943 у в. Коўчыцы Светлагорскага р-на Гомельскай вобл.

ПАРХІМЧЫК Уладзімір Сямёнавіч, н. ў 1923, партызан атрада імя Кірава, загінуў 27.4.1943 у в. Пратасы Акцябрскага р-на Гомельскай вобл.

САВОНЧЫК Васіль Рыгоравіч, н. ў 1924, партызан атрада імя Кірава, загінуў 19.2.1943 у в. Коўчыцы Светлагорскага р-на Гомельскай вобл.

ВЁСКА КЛІНЫ

РЫБАК Іван Кесімавіч, н. ў 1926, партызан атрада імя Кірава 37-й бр. імя Пархоменкі, загінуў пад Бабруйскам.

ВЁСКА КРАСНАЯ ЗАРА

РАССОХА Аляксей Дзмітрыевіч, н. ў 1916, партызан атрада Бабкова, закатаваны фашыстамі 24.7.1944.

ВЁСКА КРУГЛОНІВА

АНДРЭЕЎ Іван Рыгоравіч, н. ў 1920, партызан атрада імя Кірава 37-й бр. імя Пархоменкі, загінуў 3.11.1942 у в. Рымаўцы.

БОГАН Сцяпан Захаравіч, н. ў 1922, партызан, загінуў у маі 1944, пахаваны ў в. Вільча Глускага р-на Магілёўскай вобл.

ВАЛЧКОЎ Сяргей, партызан-сувязны 1-й Бабруйскай бр., расстраляны ў кастрычніку 1941.

КОЖЫЧ Уладзімір Іванавіч, н. ў 1924, партызан атрада імя Кірава 37-й бр. імя Пархоменкі, загінуў 30.6.1943, пахаваны ў в. Крукаўшчына Глускага р-на Магілёўскай вобл.

КРЫЧАЎЦОЎ Павел Іванавіч, н. ў 1908, партызан-сувязны 37-й бр. імя Пархоменкі, закатаваны фашыстамі ў лістападзе 1942.

ЛЕАНОВІЧ Уладзімір Канстанцінавіч, н. ў 1922, партызан, загінуў у 1944 у Гомельскай вобл.

ПРАКОПЧЫК Васіль Міхайлавіч, н. ў 1908, падпольшчык, загінуў у лагеры смерці Трасцянец пад Мінскам.

ШЧЭЦЬКА Уладзімір Пятровіч, н. ў 1917, партызан атрада імя Кірава 37-й бр. імя Пархоменкі, загінуў 19.2.1943 у в. Коўчыцы 2-я Светлагорскага р-на Гомельскай вобл.

ВЁСКА МАКАРАЎКА

БУЦЬКО Аляксандр Міхайлавіч, н. ў 1923, партызан, загінуў 15.4.1942.

СТРУК Павел Макаравіч, н. ў 1922, партызан-разведчык атрада імя Чапаева 37-й бр. імя Пархоменкі, загінуў 19.2.1943, пахаваны ў в. Зелянковічы Глускага р-на Магілёўскай вобл.



У.В.Сысой.

М.М.Гайшун.

СЫСОЙ Веніямін Майсеевіч, н. ў 1922, партызан атрада Швайкова 37-й бр. імя Пархоменкі, загінуў у 1942, пахаваны ў в. Стары Двор.

СЫСОЙ Уладзімір Васілевіч, н. ў 1925, партызан, нам. камісара па камсамолу атрада «За Савецкую Радзіму» 100-й Глускай бр., група падрыўнікоў, загінуў у 1944 у Любанскім р-не Мінскай вобл.

ВЁСКА МАЧУЛКІ

ГАЙШУН Мікалай Іванавіч, н. ў 1925, партызан 753-га атрада 1-й Бабруйскай бр., расстраляны карнікамі 11.12.1943.

ГАЙШУН Павел Іванавіч, н. ў 1923, партызан 753-га атрада 1-й Бабруйскай бр., расстраляны карнікамі 11.12.1943.

ВЁСКА ПЯТРОВІЧЫ

ГАЙШУН Фёдар Назаравіч, н. ў 1904, партызан атрада імя Варашылава 161-й бр. імя Катоўскага, расстраляны фашыстамі 22.2.1942.

ГАЙШУН Мікалай Мікалаевіч, н. ў 1923, партызан, памёр ад ран 8.7.1944, пахаваны ў г. Слуцк Мінскай вобл.

ГАЙШУН Міхаіл Мітрафанавіч, н. ў 1925, партызан, прапаў без вестак у жніўні 1944.

ВЁСКА РАГАСЕЛЛЕ

ЛОСЬ Сяргей Цімафеевіч, н. ў 1909, партызан-сувязны атрада імя Чапаева, прапаў без вестак у 1943.

ВЁСКА РЫМАЎЦЫ

ВАСІЛЬКОЎ Мітрафан Пракопавіч, н. ў 1913, партызан атрада імя Дзяржынскага 161-й бр. імя Катоўскага, узяты ў палон у лютым 1944, прапаў без вестак.

ГОРБЕЛЬ Аляксандр Савельевіч, н. ў 1901,

І.А.Шаршнёў.

партызан-сувязны 37-й бр. імя Пархоменкі, загінуў у кастрычніку 1943 у Бабруйску.

ГОРБЕЛЬ Сяргей Фёдаравіч, н. ў 1926, партызан атрада імя Шчорса, загінуў 3.2.1944 у в. Гарадзішча Глускага р-на Магілёўскай вобл.

ПЁТУХ Мікіта Сцяпанавіч, н. ў 1924, партызан-разведчык, загінуў 6.8.1943, пахаваны ў в. Спорнае.

РЭКІШ Вера Аляксееўна, н. ў 1922, партызанка атрада імя Кірава 37-й бр. імя Пархоменкі, загінула 19.2.1943 у в. Коўчыцы 2-я Светлагорскага р-на Гомельскай вобл.

РЭКІШ Іван Дзмітрыевіч, н. ў 1907, партызан атрада імя Кірава 37-й бр. імя Пархоменкі, загінуў, пахаваны ў в. Коўчыцы 2-я Светлагорскага р-на Гомельскай вобл.

САВОНЧЫК Дзмітрый Васілевіч, н. ў 1901, партызан атрада імя Кірава 37-й бр. імя Пархоменкі, загінуў 10.5.1943 каля в. Рымаўцы.

ХРАПКО Мікіта Васілевіч, н. ў 1910, партызан, кам. аддз. атрада імя Кірава 37-й бр. імя Пархоменкі, загінуў 4.11.1942 каля в. Рымаўцы.

ЯФІМЕНКА Міхаіл Дзмітрыевіч, н. ў 1918, партызан атрада імя Кірава 37-й бр. імя Пархоменкі, памёр ад ран 7.9.1943, пахаваны ў в. Дворышча.

ВЁСКА СПОРНАЕ

ГАЙШУН Цімафей Аляксеевіч, н. ў 1921, партызан атрада імя Чапаева, падарваўся на міне 23.3.1944.

ШАРШНЁЎ Іосіф Аляксандравіч, н. ў 1910, партызан, расстраляны карнікамі.

ВЁСКА СУЛЕВА

БЛОЦКІ Кірыла Паўлавіч, н. ў 1921, партызан атрада імя Шашуры 161-й бр. імя Катоўскага, загінуў у сакавіку 1943, пахаваны ў в. Рудня Глускага р-на Магілёўскай вобл.

ВЁСКА ТРУСАЎШЧЫНА

ШАРДЫКА Павел Рыгоравіч, н. ў 1923, партызан атрада імя Кірава 37-й бр. імя Пархоменкі, загінуў пад Бабруйскам.

ВЁСКА ХАРОШАЕ

БАНДАРЭНКА Фёдар Мікалаевіч, н. ў 1922, партызан атрада імя Кірава 37-й бр. імя Пархоменкі, загінуў 19.11.1943 у в. Коўчыцы 2-е Светлагорскага р-на Гомельскай вобл.

ГЛУШАНСКІ ПАСЯЛКОВЫ САВЕТ

ПАСЁЛАК ГЛУША

АНКУДОВІЧ Анэля Мікалаеўна, н. ў 1920, настаўніца, партызанка атрада імя Кірава 37-й бр. імя Пархоменкі, загінула 19.12.1943 у в. Коўчыцы 2-я Светлагорскага р-на Гомельскай вобл.

БАРДАНОЎСКІ Якаў Мацвеевіч, н. ў 1923, партызан атрада імя Шашуры 161-й бр. імя Катоўскага, загінуў у чэрвені 1944, пахаваны ў в. Жывунь Любанскага р-на Мінскай вобл.

БАРЭЦКІ Іван Паўлавіч, н. ў 1910, партызан Беларускага штаба партызанскага руху, прапаў без вестак.

БУБНОЎСКАЯ Вольга Якаўлеўна, н. ў 1910, партызанка атрада імя Шашуры 161-й бр. імя Катоўскага, загінула ў кастрычніку 1944 у в. Старасек Любанскага р-на Мінскай вобл.

ВАШУКЕВІЧ Афанасій Фёдаравіч, н. ў 1908, партызан 161-й бр. імя Катоўскага, загінуў 18.3.1944, пахаваны ў в. Заполле Глускага р-на Магілёўскай вобл.

ГЛАДКОВА Ядзвіга Гаўрылаўна, н. ў 1908, падпольшчыца, павешана фашыстамі ў г. Старыя Дарогі Мінскай вобл.

ГРЫГОР'ЕЎ Ніканор Афанасьевіч, расстраляны за сувязь з партызанамі ў 1943 у г. Старыя Дарогі Мінскай вобл.

ЗУБАРЭВІЧ Іван Якаўлевіч, н. ў 1908, партызан 161-й бр. імя Катоўскага, прапаў без вестак у сакавіку 1944.

ЗУБАРЭВІЧ Мікалай Якаўлевіч, н. ў 1917, партызан атрада імя Кірава 37-й бр. імя Пархоменкі, загінуў 19.2.1943 в. Коўчыцы 2-я Светлагорскага р-на Гомельскай вобл.

ЗУБАРЭВІЧ Софія Францаўна, расстраляна ў 1942 за сувязь з партызанамі ў г. Старыя Дарогі Мінскай вобл., пахавана ў брацкай магіле.

ЗУБАРЭВІЧ Уладзімір Якаўлевіч, н. ў 1920, партызан атрада імя Пархоменкі 161-й бр. імя Катоўскага, загінуў у красавіку 1944.

ЗУБАРЭВІЧ Якаў Вікенцьевіч, н. ў 1886, партызан атрада імя Шашуры 161-й бр. імя Катоўскага, загінуў 10.4.1944, пахаваны ў в. Старасек Любанскага р-на Мінскай вобл.

КАВАЛЕНКА Аксіння Назараўна, н. ў 1883, партызанка атрада імя Кірава 37-й бр. імя Пархоменкі, спалена 19.1.1942 у в. Халопенічы Глускага р-на Магілёўскай вобл.

КАВАЛЕНКА Ануфрый Міхайлавіч, н. ў 1870, партызан атрада імя Кірава 37-й бр. імя Пархоменкі, расстраляны ў 1944 у в. Яловікі.

КАВАЛЕНКА ЗінаідаАнуфрыеўна, н. ў 1919, партызанка атрада імя Кірава 37-й бр. імя Пархоменкі, спалена разам з двума дзецьмі 19.1.1942 у в. Халопенічы Глускага р-на Магілёўскай вобл.

КАЗЛОЎСКІ Мітрафан Фёдаравіч, н. ў 1914, партызан атрада імя Молатава 161-й бр. імя Катоўскага, загінуў 12.2.1944, пахаваны ў в. Скавароды Любанскага р-на Мінскай вобл.

КАСЦЮКЕВІЧ Паліна Мікітаўна, н. ў 1914 у в. Ульянаўка Барысаўскага р-на, кап. мед. службы, ваенурач 2-га рангу, загінула 28.4.1944 на востраве Небярэшаў Ляскавіцкага с/с Акцябрскага р-на Гомельскай вобл., ахоўваючы параненых партызан, пахавана ў брацкай магіле ў в. Ляскавічы Акцябрскага р-на Гомельскай вобл.

КЛЫГА Аляксандр Мікалаевіч, н. ў 1910, партызан атрада імя Дзяржынскага 161-й бр. імя Катоўскага, загінуў 5.2.1943, пахаваны ў в. Забалоцце Асіповіцкага р-на Магілёўскай вобл.

ЛАЎРУШКІН Аляксандр Барысавіч, н. ў 1914, партызан атрада імя Дзяржынскага 161-й бр. імя Катоўскага, загінуў 23.11.1942, пахаваны ў в. Дуброва Глускага р-на Магілёўскай вобл.

ЛЕВІН Залман Янкелевіч, н. ў 1903, партызан, загінуў у 1943, пахаваны ў брацкай магіле ў Глушы.

ЛЕВІН Мойша Янкелевіч, н. ў 1905, партызан атрада імя 20-годдзя УЛКСМ, загінуў у 1942 у в. Залессе Акцябрскага р-на Гомельскай вобл.

ЛЕВІНА Лідзія Францаўна, н. ў 1899, партызанка атрада імя 20-годдзя УЛКСМ, загінула ў 1943 у в. Казловічы Глускага р-на Магілёўскай вобл.

ЛЯШЧУН Дзям'ян Маркавіч, н. ў 1909, партызан, загінуў 10.4.1944, пахаваны ў в. Загалле Любанскага р-на Мінскай вобл.

ЛЯШЧУН Уладзімір Маркавіч, н. ў 1917, партызан атрада імя Шашуры 161-й бр. імя Катоўскага, загінуў 4.4.1944.

ПАРХІМЧЫК Аляксандр Цітавіч, н. ў 1919, загінуў 12.9.1943, пахаваны ў в. Стражы Глускага р-на.

ПАЎЛАЎ Аляксандр Гаўрылавіч, н. ў 1907, партызан, прапаў без вестак 6.3.1943.

САВІНА Сцепаніда Іванаўна, н. ў 1906, партызанка, прапала без вестак.

САВІЦКІ Рыгор Фёдаравіч, н. ў 1923, партызан атрада імя Кірава 37-й бр. імя Пархоменкі, прапаў без вестак.

ФЕДАРОВІЧ Іван Іванавіч, н. ў 1913, партызан-сувязны атрада імя Дзяржынскага 161-й бр. імя Катоўскага, загінуў 20.4.1944.

КАВАЛЁЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА КАВАЛІ

БАЛЫКА Міхаіл Аляксеевіч, н. ў 1886, партызан, закатаваны фашыстамі 10.7.1942, пахаваны ў в. Кавалі.

ВАСІЛЕНКА Рыгор Кузьміч, партызан-сувязны, расстраляны фашыстамі.

ГІМПЕЛЕВІЧ Бася Матусаўна, партызанка-сувязная, расстраляна фашыстамі.

ФЕДАРОВІЧ Юльян Іосіфавіч, н. ў 1886, партызан-сувязны, расстраляны ў 1943 у г. Старыя Дарогі Мінскай вобл.

ВЁСКА ЛАМБАВА

БУЛЬБА Сяргей Іванавіч, н. ў 1912, гв. рад. 102-га сп 37-й сд, партызан 752-га партызанскага атрада, тэлефаніст, загінуў 10.1.1944, пахаваны ў в. Казловічы Калінкавіцкага р-на Гомельскай вобл.

ХУРСАН Іван Іванавіч, н. ў 1923, партызан атрада імя Фурманава, прапаў без вестак у снежні 1943.

ВЁСКА МАЛЕВА

АЎРАМЧЫК Лідзія Міхайлаўна, медсястра 751-га партызанскага атрада, памерла ад ран у верасні 1944, пахавана ў в. Машкі Гомельскай вобл.

ВЁСКА МІКУЛІЧЫ

АЎЧЫННІКАЎ Іван Іванавіч, н. ў 1918, партызан атрада «Беларусь», загінуў 19.9.1943, пахаваны ў в. Дабрыца Кіраўскага р-на Магілёўскай вобл.

АЎЧЫННІКАЎ Іван Пятровіч, н. ў 1922, партызан, загінуў у 1942 у в. Цялуша.

МЕЛЬНІКАЎ Пётр Дамітрыевіч, н. ў 1913, партызан-падрыўнік, загінуў у кастрычніку 1943.

ПІНЧУК Фёдар Савельевіч, н. ў 1908, партызан-сувязны, загінуў у маі 1944.

СЯЛІЦКІ Іван Ісакавіч, н. ў 1917, партызан-сувязны 539-га партызанскага атрада, расстраляны фашыстамі.

ВЁСКА НАВІКІ

БАКАЧ Арцём Платонавіч, н. ў 1923, партызан 208-га партызанскага атрада, загінуў у снежні 1943.

ВЁСКА ПАНКРАТАВІЧЫ

АЎРАМЧЫК Аляксей Яфімавіч, н. ў 1911, партызан 751-га атрада 1-й Бабруйскай бр., загінуў 27.9.1943 у Гомельскай вобл.

АЎРАМЧЫК Мікалай Фядосавіч, н. ў 1926, партызан, загінуў у пас. Парычы Светлагорскага р-на Гомельскай вобл.

ДРУЗІН Мікалай Навумавіч, н. ў 1912, рад. 434-га сп, партызан, памёр ад ран, пахаваны ў в. Слабада Буда-Кашалёўскага р-на Гомельскай вобл.

ЛУГАВЫ Васіль Цімафеевіч, н. ў 1908, арыштаваны фашыстамі ў 1941 за сувязь з партызанамі.

СІЛІВОНЧЫК Мацвей Іванавіч, н. ў 1909, партызан 751-га атрада 1-й Бабруйскай бр., прапаў без вестак у кастрычніку 1943.

Ф.І.Сяліцкі.

ВЁСКА ПОСТРАШ

БАРЭЦ Мікалай Мікалаевіч, н. ў 1906, партызан-сувязны, прапаў без вестак 7.7.1944.

КАЗЛОЎ Даніла Іванавіч, н. ў 1897, партызан-сувязны, прапаў без вестак 6.5.1944.

НАЗАРЧУК Рыгор Гаўрылавіч, н. ў 1913, партызан 539-га партызанскага атрада, прапаў без вестак у лістападзе 1944.

ШЭК Уладзімір Антонавіч, н. ў 1888, партызан-сувязны, прапаў без вестак 25.2.1944.

ЮШКЕВІЧ Іван Іванавіч, н. ў 1926, партызан, загінуў у лагерах.

ВЁСКА ТАЖЫЛАВІЧЫ

МЕЛЬНІЧОНАК Іван Фёдаравіч, н. ў 1912, партызан-сувязны, загінуў каля пас. Парычы Светлагорскага р-на Гомельскай вобл.

ПАЗНЯК Паліна Адамаўна, партызанка, прапала без вестак.

ПАРАХНЕВІЧ Юсцін Мікітавіч, н. ў 1906, партызан-сувязны, прапаў без вестак.

ХАРАНЕНКА Георгій Пятровіч, н. ў 1922, партызан, загінуў 4.6.1944, пахаваны ў в. Плёсы.

ШУТ Мікалай Карпавіч, н. ў 1924, партызан, прапаў без вестак.

СТАНЦЫЯ ЦЯЛУША

БАЛЫКІН Міхаіл Аляксеевіч, н. ў 1886, партызан, загінуў 10.7.1942 у в. Кавалі.

ПАЗНЯК Аляксей Іванавіч, партызан, прапаў без вестак.

ЦЭДЗІК Аляксандр Піліпавіч, н. ў 1904, партызан-сувязны, прапаў без вестак.

ВЁСКА ЮР'ЕВА

ДЗЕШКАВЕЦ Антон Восіпавіч, н. ў 1913, партызан, прапаў без вестак у чэрвені 1944.

ДЗЕШКАВЕЦ Іван Мікітавіч, н. ў 1914, загінуў за сувязь з партызанамі.

ЗАЙЦАЎ Андрэй Сяргеевіч, н. ў 1904, партызан, загінуў 15.3.1944, пахаваны ў в. Юр'ева.

КАПУСЦІН Рыгор Дзмітрыевіч, н. ў 1921, партызан бр. імя Кірава, прапаў без вестак у жніўні 1944.

СЯЛІЦКІ Уладзімір Іванавіч, н. ў 1925, партызан 751-га партызанскага атрада 1-й Бабруйскай бр., прапаў без вестак.

СЯЛІЦКІ Фядос Ільіч, н. ў 1911, партызан-сувязны 751-га партызанскага атрада, памёр ад ран у ліпені 1944.

ШАПЯЛЕВІЧ Марыя Лукінічна, н. ў 1924, медработнік, расстраляна за сувязь з партызанамі.

ОСАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БАРКІ

БАБІЧ Ганна Савельеўна, партызанка, загінула ў 1942.

ЮТКА Марыя, калгасніца к-са імя Чапаева, партызанка, загінула ў 1942.

ЛЕМЯШОНАК Кацярына Майсееўна, н. ў 1905, падпольшчыца, старшыня калгса імя Чапаева, расстраляна ў сакавіку 1943 у бабруйскай турме.

ВЁСКА ВІКТАРАЎКА

СЦЯХНОВІЧ Пётр Іванавіч, н. ў 1925, партызанскі сувязны, загінуў у 1943.

ВЁСКА ГЛУША

БАРАДАЎКА Васіль Пятровіч, н. ў 1905, партызан атрада імя Дзяржынскага 161-й бр. імя Катоўскага, прапаў без вестак у маі 1944.

БАРДАНОЎСКІ Янок Лявонцьевіч, н. ў 1923, партызан атрада імя Пархоменкі 161-й бр. імя Катоўскага, загінуў у чэрвені 1944, пахаваны ў в. Жывунь Любанскага р-на Мінскай вобл.

ДЗЯШЧЭНЯ Канстанцін Аляксандравіч, н. ў 1912, партызан атрада імя Дзяржынскага 161-й бр. імя Катоўскага, загінуў 5.2.1943, пахаваны ў в. Забалоцце Асіповіцкага р-на Магілёўскай вобл.

КЛЫГА Аляксей Мікалаевіч, н. ў 1900, партызан, загінуў і пахаваны ў в. Карытнае Асіповіцкага р-на Магілёўскай вобл.

ПАРХІМЧЫК Аляксандр Цітавіч, н. ў 1919, партызан, загінуў 19.9.1943, пахаваны ў в. Стражы Глускага р-на Магілёўскай вобл.

САФРОНАЎ Рыгор Сцяпанавіч, н. ў 1902, партызан атрада імя Дзяржынскага 161-й бр. імя Катоўскага, загінуў 11.4.1944.

ХРАМЕЛЯ Павел Савельевіч, н. ў 1921, партызан, загінуў 6.12.1943, пахаваны ў в. Масты.

ХРАМЕЛЯ Уладзімір Уладзіміравіч, н. ў 1928, партызан, прапаў без вестак у 1944.

ШАЎРУК Еўдакія, партызанка, загінула ў час блакады ў 1944.

ШАЎРУК Іван Рыгоравіч, н. ў 1920, сувязны-

разведчык, загінуў у красавіку 1943, пахаваны ў в. Масты.

ШАЎРУК Кацярына Рыгораўна, н. ў 1930, партызанка, загінула ў 1944, пахавана ў в. Глуша.

ВЁСКА ДОЙНІЧАВА

ВАРАТНІЦКАЯ Надзея Іосіфаўна, н. ў 1921, партызанка атрада імя Пархоменкі 161-й бр. імя Катоўскага, прапала без вестак у снежні 1944.

ГАЛАВАЦКІ Антон Гаўрылавіч, н. ў 1914, партызан атрада імя Пархоменкі 161-й бр. імя Катоўскага, загінуў 16.4.1944, пахаваны ў в. Ліскавічы Глускага р-на Магілёўскай вобл.

РАБАЦЕНЬ Павел Герасімавіч, н. ў 1928, партызан атрада імя Шашуры 161-й бр. імя Катоўскага, загінуў у сакавіку 1944, пахаваны ў в. Масты.

СТРАЛЬЧЭНЯ Алена Фёдараўна, н. ў 1902, партызанка-сувязная, загінула 4.4.1944 у канцлагеры Гайслінген, пахавана ў г. Ульмах, Германія.

ВЁСКА ЗАБУДЗЬКІ

ГОРБЕЛЬ Аляксандр Фёдаравіч, н. ў 1921, партызан атрада імя Шашуры 161-й бр. імя Катоўскага, загінуў 18.1.1943.

ЗЯНЬКО Іван Міхайлавіч, н. ў 1924, партызан, загінуў у снежні 1943.

КАМАРЭВІЧ Фёдар Лявонцьевіч, н. ў 1890, партызан-сувязны, загінуў у 1942, пахаваны ў в. Забудзькі.

КАМІНСКАЯ Настасся Андрэеўна, н. ў 1908, партызанка-сувязная, загінула ў 1942.

КУНЕЦ Іван Станіслававіч, н. ў 1907, партызан, закатаваны фашыстамі ў 1943 у г. Старыя Дарогі Мінскай вобл.

ШАЎРЫД Канстанцін Адамавіч, н. ў 1914, партызан, закатаваны фашыстамі ў ліпені 1944.

ШЫЛА Анастасія Гаўрылаўна, н. ў 1901, партызанка, загінула ў 1943 у г. Старыя Дарогі Мінскай вобл.

ШЫЛА Іван Міхайлавіч, н. ў 1913, партызан, загінуў у 1943 у г. Старыя Дарогі Мінскай вобл.

ШЫЛА Іван Якаўлевіч, н. ў 1914, партызан, закатаваны фашыстамі ў 1944.

ШЫЛА Фёдар Сцяпанавіч, н. ў 1924, партызан атрада імя Шашуры 161-й бр. імя Катоўскага, загінуў 6.6.1943.

ВЁСКА КІНАЎКА

ГІСАК Мікалай Севасцьянавіч, н. ў 1912, настаўнік Ясенскай СШ, партызан, пам. сакратара атрада імя Молатава 161-й бр. імя Катоўскага, загінуў у красавіку 1944, пахаваны ва ўрочышчы Скавароддзе Любанскага р-на Мінскай вобл.

ВЁСКА НАВАСЁЛКІ

КУНЕЦ Ігнат Васілевіч, н. ў 1896, партызан, загінуў у 1943 на тэрыторыі Осаўскага с/с, пахаваны ў в. Навасёлкі.

РОШЧЫН Іван Пятровіч, н. ў 1913, партызан, загінуў у 1941, пахаваны ў в. Навасёлкі.

СЯМАШКА Вольга Сцяпанаўна, н. ў 1926, партызанка атрада імя Пархоменкі 161-й бр. імя Катоўскага, прапала без вестак у снежні 1944.

СЯМАШКА Іван Максімавіч, н. ў 1920, партызан, загінуў у 1943, пахаваны ў в. Навасёлкі.

СЯМАШКА Мацвей Адамавіч, н. ў 1910, ваенны інжынер, тэхнік 2-га рангу, партызан атрада імя Кірава 37-й бр. імя Пархоменкі, памёр ад ран 25.4.1943, пахаваны ў в. Уюнішча Глускага р-на Мінскай вобл.

ЮШКЕВІЧ Канстанцін Іванавіч, н. ў 1914, партызан, загінуў у 1942 каля в. Дойнічава.

ЮШКЕВІЧ Сцяпан Піліпавіч, партызан, загінуў у 1944, пахаваны ў в. Навасёлкі.

ВЁСКА ОСАВА

БЕБЧЫК Міхаіл Васілевіч, н. ў 1924, партызанскі сувязны, падарваўся на міне.

ГАРАДЗЕЦКАЯ Домна Рыгораўна, н. ў 1889, падпольшчыца-сувязная, расстраляна ў 1943 у в. Тарасавічы Асіповіцкага р-на Магілёўскай вобл.

ГАРАДЗЕЦКАЯ Марыя Якаўлеўна, н. ў 1923, падпольшчыца, партызанка-сувязная атрада імя Шашуры 161-й бр. імя Пархоменкі, загінула 10.6.1943, пахавана ў в. Пакроўка.

ГАРАДЗЕЦКІ Канстанцін Якаўлевіч, н. ў 1923, партызан-сувязны, павешаны фашыстамі ў 1942 у г. Асіповічы Магілёўскай вобл.

МАРОЗ Анатоль Аляксандравіч, н. ў 1926, вучань, падпольшчык, партызан-сувязны, расстраляны фашыстамі ў 1942.

МАРОЗ Сяргей Аляксандравіч, н. ў 1924, падпольшчык, партызан-сувязны, расстраляны фашыстамі ў 1942.

ТРАЯНОЎСКІ Анатоль Антонавіч, н. ў 1926, вучань, падпольшчык, партызан-сувязны, расстраляны фашыстамі ў 1942.

ХАДАСЕВІЧ Васіль Пятровіч, н. ў 1912, настаўнік, партызан атрада імя Шашуры 161-й бр. імя Катоўскага, загінуў 15.4.1944, пахаваны ў в. Жывунь Любанскага р-на Мінскай вобл.

ХАДАСЕВІЧ Кацярына Аляксандраўна, н. ў 1910, партызанка-сувязная, расстраляна фашыстамі ў 1944.

ШАШКОЎ Канстанцін Міхайлавіч, н. ў 1912, лейт., партызан атрада імя Пархоменкі, загінуў у баі 23.1.1943.

ВЁСКА ПАКРОЎКА

БАРАДАЎКА Фёдар Данілавіч, н. ў 1887, партызан, вывезены ў лагер смерці Асвенцім (Польшча), прапаў без вестак.

РАМАНЕНКА Уладзімір Піліпавіч, н. ў 1924, партызан атрада імя Шашуры 161-й бр. імя Катоўскага, загінуў у чэрвені 1943, пахаваны ў в. Глуша.

РУДКОЎСКІ Васіль Уладзіміравіч, н. ў 1889, каваль, партызан, расстраляны ў Мінску 30.4.1944.

САХАР Мікалай Антонавіч, н. ў 1903, партызан, прапаў без вестак.

ШЫЛА Павел, н. ў 1901, партызан, вывезены ў лагер смерці Асвенцім (Польшча), прапаў без вестак.

ВЁСКА ПРАГРЭС

ЯРОШЫК Аляксандр Сямёнавіч, н. ў 1903, партызан, вывезены ў лагер смерці Асвенцім (Польшча), прапаў без вестак.

ВЁСКА СТАРЫНКІ

ГІДВІЛА Аляксей Ермалаевіч, намеснік палітрука, партызан Беларускага штаба партызанскага руху, прапаў без вестак 23.5.1944.

КАВАЛЬЧУК Вольга Яфімаўна, н. ў 1926, вучаніца, партызанка атрада імя Пархоменкі 161-й бр. імя Катоўскага, загінула ў сакавіку 1944, пахавана ў в. Масты.

КУРЫЛЬЧЫК Уладзімір Аляксеевіч, н. ў 1922, партызан Беларускага штаба партызанскага руху, прапаў без вестак 1.2.1943.

ШЫШКЕВІЧ Мікалай Мікітавіч, н. ў 1902, партызан, памёр ад ран 17.4.1944, пахаваны ў в. Вязаўніца Асіповіцкага р-на Магілёўскай вобл.

ВЁСКА ЯЛЕНАЎКА

СІРОТКА Васіль Купрыянавіч, н. ў 1923, партызан атрада імя Шашуры 161-й бр. імя Катоўскага, загінуў 20.7.1943 у в. Мірадзіна, пахаваны ў в. Навасёлкі.

ВЁСКА ЯСЕНЬ-КАМЕНКА

АЛЕЙНІК С.А., партызан, загінуў у лютым 1943.

ВУСАЎ Арцём Трафімавіч, н. ў 1906, партызан атрада імя Кірава 161-й бр. імя Катоўскага, загінуў 12.2.1943, пахаваны ў в. Баянава Глускага р-на Магілёўскай вобл.

СІДАРОВІЧ В.А., падпольшчык, геройскі загінуў у гестапа ў лютым 1943.

СІДАРОВІЧ І.Ф., партызан, загінуў 10.2.1943.

СЛАБОДКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АРЭХАВА

ЗАЙЦАВА Надзея Міронаўна, партызанка, загінула 15.6.1944.

СІРАЧ Яўген Ціханавіч, партызан атрада імя Громава, загінуў 9.4.1944, пахаваны ў в. Заполле Глускага р-на Магілёўскай вобл.

ВЁСКА БЯРЭЗАВІЧЫ

ПУКАЛА Варвара Мікалаеўна, н. ў 1925, партызанка, памерла ад ран 12.12.1943, пахавана ў в. Раковічы Светлагорскага р-на Гомельскай вобл.

ВЁСКА ДЗЕДНАВА

СІНЬКАВЕЦ Іван Мікалаевіч, н. ў 1905, партызан атрада імя Кірава 37-й бр. імя Пархоменкі, загінуў 19.12.1943.

ВЁСКА ЗАЛЕССЕ

УЛАСАЎ Аляксандр Майсеевіч, н. ў 1914, партызан 753-га атрада, кам. 2-й групы, загінуў 18.10.1943, пахаваны ў в. Залессе.

ВЁСКА ЗАЦІШША

КАМЯНЕЦКІ Міхаіл Сямёнавіч, н. ў 1917, мал. лейт., кам. групы падрыўнікоў партыз. атрада імя Шчорса, загінуў 23.9.1943 на чыгунцы Бабруйск—Асіповічы.

СТАНКЕВІЧ Яўген Паўлавіч, партызан, загінуў 30.3.1942.

ПАСЁЛАК НОВАЯ БЕЛАРУСЬ

БЖЭЗІНСКІ Аляксандр Канстанцінавіч, н. ў 1907, партызан-сувязны, загінуў 1.1.1944.

КОСЦІН Міхаіл Іванавіч, н. ў 1918, партызан атрада імя Шчорса, загінуў 5.10.1943, пахаваны ў в. Туголіца.

ПЯТРОЎ Якаў Гаўрылавіч, н. ў 1917, партызан атрада імя Шчорса, загінуў 5.10.1943, пахаваны ў в. Туголіца.

ВЁСКА СЛАБОДКА

МІХЛЮК Васіль Філімонавіч, н. ў 1925, партызан атрада імя Кірава 37-й бр. імя Пархоменкі, загінуў у 1943.

СЫЧКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БАРБАРОВА

БАРАДЗІН Аляксандр Дамітрыевіч, партызан, загінуў 26.3.1944.

ПІНЧУК Сямён Фёдаравіч, н. ў 1909, партызан, палітрук роты 1-й Асіповіцкай бр., загінуў 30.6.1943, пахаваны ў в. Чуча Асіповіцкага р-на Магілёўскай вобл.

ВЁСКА БАЯРЫ

КОТ Віктар Васілевіч, н. ў 1925, партызан, загінуў 8.4.1944 у Клічаўскім р-не Магілёўскай вобл.

ВЁСКА ВІНАГРАДАЎКА

МАЛАХАЎ Аляксандр Рыгоравіч, партызан, загінуў 18.6.1944, пахаваны ў в. Саломенка.

КУРМАЗ Мікалай Апанасавіч, н. ў 1898, партызан, загінуў 9.12.1943, пахаваны ў в. Курганы Клічаўскага р-на Магілёўскай вобл.

КУРМАЗ Уладзімір Лукіч, н. ў 1915, партызан, загінуў 12.5.1944, пахаваны ў в. Саломенка.

КУРМАЗ Яўген Мікалаевіч, н. ў 1926, партызан, загінуў 1.5.1944, пахаваны ў в. Курганы Клічаўскага р-на Магілёўскай вобл.

ВЁСКА ВЕРБКІ

СТАНЕВІЧ Іосіф Францавіч, партызан, загінуў у лютым 1945, пахаваны ў Клічаўскім р-не Магілёўскай вобл.

ВЁСКА ІЗЮМАВА

ВАЛОВІК Пётр Сцяпанавіч, партызан Беларускага штаба партызанскага руху, загінуў 13.12.1943.

ГУСЦІЁНАК Іван Сцяпанавіч, партызан, прапаў без вестак.

ГУСЦІЁНАК Міхаіл Сцяпанавіч, н. ў 1920, рад., кулямётчык 12-га развед. батальёна 12-й тд, разведчык 214-га партыз. атрада, загінуў 3.8.1943.

ЖЫТКЕВІЧ Яўген Лаўрэнцьевіч, н. ў 1906, партызан Беларускага штаба партызанскага руху, загінуў 1.6.1944 у лагеры смерці Трасцянец пад Мінскам.

КУРМАС Мікалай Афанасьевіч, н. ў 1898, партызан, загінуў 9.12.1943, пахаваны ў в. Курганы Клічаўскага р-на Магілёўскай вобл.

ЛІТВІНКА Міхаіл Андрэевіч, партызан, прапаў без вестак.

ВЁСКА КАЛІНІНА

КОЛАСАЎ Васіль Іванавіч, н. ў 1915, партызан, загінуў 28.10.1943, пахаваны ў в. Кавяза Клічаўскага р-на Магілёўскай вобл.

СЕВЯРЫН Якаў Пятровіч, партызан, загінуў і пахаваны ў Кіраўскім р-не Магілёўскай вобл.

ПАСЁЛАК ЛЕНІНА

ЖУК Канстанцін Навумавіч, н. ў 1926, партызан атрада імя Дзяржынскага 161-й бр. імя Катоўскага, загінуў 16.4.1944, пахаваны ў Глускім р-не Магілёўскай вобл.

РЭКІШ Павел Яфімавіч, н. ў 1924 у в. Замошша Асіповіцкага р-на Магілёўскай вобл., партызан, загінуў 6.6.1943.

РЭКІШ Уладзімір Яфімавіч, н. ў 1919, загінуў 18.1.1942.

ВЁСКА ЛЫСАЯ ГОРКА

КАЛЕСНІКАВА Алена Васілеўна, н. ў 1918, партызанка атрада імя Кірава 37-й бр. імя Пархоменкі, загінула 19.12.1943.

ВЁСКА МІРАДЗІНА

ГАРБЯНКОЎ Пётр Іванавіч, н. ў 1918 у в. Ран-Маеўка Курскай вобл., Расія, партызан атрада імя Кірава 37-й бр. імя Пархоменкі, загінуў 26.7.1944, пахаваны на ст. Мірадзіна.

ГОЛУБЕВА Ксенія Пракопаўна, н. ў 1920, партызанка-сувязная, загінула 5.2.1943.

МАЛАХОВІЧ Анатоль Паўлавіч, н. ў 1922, партызан атрада імя Кірава 37-й бр. імя Пархоменкі, загінуў у маі 1943, пахаваны на ст. Мірадзіна.

ПРАНОВІЧ Уладзімір Фёдаравіч, н. ў 1925, партызан, прапаў без вестак 9.5.1945.

ПРОМЛЕЎ Аляксей Уласавіч, н. ў 1921, партызан, загінуў 7.12.1943.

ВЁСКА ПАДСОБНАЕ

ХІЛЁНАК Сямён Антонавіч, н. ў в. Касцюкі, загінуў і пахаваны ў Клічаўскім р-не Магілёўскай вобл.

ВЁСКА ПАНЮШКАВІЧЫ

ГУДЗЕЙ Максім Васілевіч, падпольшчык, расстраляны 26.10.1942.

ДЗЫГУН Рыгор Восіпавіч, падпольшчык, расстраляны 26.10.1942.

ВЁСКА РАКСАЛЯНКА

БАБОК Арсеній Сямёнавіч, н. ў 1926, партызан, загінуў 6.6.1944, пахаваны ў Клічаўскім р-не Магілёўскай вобл.

ВЁСКА САЛОМЕНКА

ДЗЯЦЕЛ Архіп Трафімавіч, н. ў 1912, мал. сярж. 48-га ап 13-й сд, кам. аддз. 277-га партыз. атрада, загінуў 25.8.1943, пахаваны ў Клічаўскім р-не Магілёўскай вобл.

КУЛІК Іван Іванавіч, партызан, загінуў і пахаваны ў Кіраўскім р-не Магілёўскай вобл.

КУРМАЗ Уладзімір Лукіч, н. ў 1915, партызан, загінуў 12.5.1944, пахаваны ў в. Саломенка.

ПЫЖ Васіль Васілевіч, н. ў 1926, партызан, загінуў 26.3.1944.

ПЫЖ Васіль Канстанцінавіч, н. ў 1898, партызан-сувязны, загінуў 8.8.1942.

ВЁСКА СЫЧКАВА 1-е

ГУРЫНОВІЧ Георгій Карпавіч, н. ў 1912, партызан-сувязны, загінуў 1.7.1943, пахаваны ў в. Малы Трасцянец Мінскага р-на.

ВЁСКА СЫЧКАВА 2-е

ГРЫНЯК Фёдар Кузьміч, н. ў 1924, партызан, загінуў 8.4.1944, пахаваны ў в. Курганы Клічаўскага р-на Магілёўскай вобл.

Ф.А.Куцян.

І.Д.Вярбіцкі.

Т.Б.Гудзей.

В.І.Коласава.

ЗУБОВІЧ Міхаіл Аляксандравіч, партызан, загінуў і пахаваны ў Клічаўскім р-не Магілёўскай вобл.

КУЦЯН Фёдар Аляксеевіч, н. ў 1926, партызан, загінуў у 1943, пахаваны ў Клічаўскім р-не Магілёўскай вобл.

ТАРАКАН Дзмітрый Васілевіч, партызан, загінуў і пахаваны каля в. Брожа.

ТАРАКАН Мікалай Васілевіч, партызан, загінуў і пахаваны ў г. Бабруйск.

ВЁСКА ТАКАРЫ

ВЯРБІЦКІ Іван Данілавіч, партызан, расстраляны 26.10.1942, пахаваны ў г. Бабруйск.

ЛІТВІНКА Іван Васілевіч, н. ў 1898, падпольшчык, старшыня Бабруйскага райвыканкома, расстраляны ў 1942 каля в. Яловікі.

ВЁСКА ТАПАРКІ

БАГДАНОВІЧ Уладзімір Сцяпанавіч, партызан, загінуў у жніўні 1944, пахаваны ў Клічаўскім р-не Магілёўскай вобл.

КАВАЛЁЎСКІ Васіль Андрэевіч, н. ў 1912, партызан, загінуў 8.6.1944, пахаваны ў в. Ізюмава.

КАВАЛЁЎСКІ Васіль Адамавіч, н. ў 1912, партызан, загінуў 8.7.1944, пахаваны ў в. Тапаркі.

НАВІЦКІ Рыгор Барысавіч, партызан, загінуў і пахаваны ў Клічаўскім р-не Магілёўскай вобл.

ПЯШКО Іван Якаўлевіч, н. ў 1924, партызан, загінуў 28.7.1944, пахаваны ў в. Макаў Мінскай вобл.

СІДАРОВІЧ Антон Іванавіч, партызан, загінуў і пахаваны ў в. Тапаркі.

ВЁСКА УСХОД

ЗАЎТРАКАЎ Іосіф Сямёнавіч, н. ў 1923, партызан, загінуў 28.1.1944, пахаваны ў в. Усакіна Клічаўскага р-на Магілёўскай вобл.

МІХАЙЛАЎ Яўсей Іванавіч, н. ў 1914, партызан, загінуў 22.2.1944, пахаваны ў в. Дзмітраўка Клічаўскага р-на Магілёўскай вобл.

СВІРЫН Якаў Іванавіч, н. ў 1909, рад. 23-га ап, партызан 277-га атрада, загінуў 28.10.1943, пахаваны ў в. Кавяза Клічаўскага р-на Магілёўскай вобл.

ВЁСКА ЦІЎНАВІЧЫ

ГУДЗЕЙ Таісія Іванаўна, партызанка, загінула і пахавана ў в. Ціўнавічы.

ГУДЗЕЙ Трафім Барысавіч, партызан, загінуў і пахаваны ў в. Ціўнавічы.

МАЦВЯЁНАК Леанід Ананьевіч, н. ў 1918, партызан, загінуў 22.2.1944, пахаваны ў в. Дзмітраўка Клічаўскага р-на Магілёўскай вобл.

МЕЛЬНІК Пётр Агеевіч, партызан, загінуў і пахаваны ў Клічаўскім р-не Магілёўскай вобл.

ХРЫСЦІНІН Аляксандр Фёдаравіч, н. ў 1926, партызан, загінуў 26.9.1943, пахаваны ў в. Усакіна Клічаўскага р-на Магілёўскай вобл.

ВЁСКА ЧАРНІЦА

КОЛАС Андрэй Рыгоравіч, н. ў 1899, партызан-сувязны, загінуў 12.6.1944, пахаваны ў Германіі.

КОЛАСАВА Вольга Іванаўна, партызанка, загінула 12.12.1943, пахавана ў в. Зеляніца Кіраўскага р-на Магілёўскай вобл.

ПЕТРУСЕНКА Ганна Іванаўна, н. ў 1926, партызанка, загінула 22.5.1944, пахавана ў в. Курганне Клічаўскага р-на Магілёўскай вобл.

РАМАНЧУК Уладаімір Цітавіч, н. ў 1923, партызан, загінуў 18.11.1943, пахаваны ў в. Галішчына Клічаўскага р-на Магілёўскай вобл.

ВЁСКА ШЧАТКАВА

КАЛЕНДА Міхаіл Уладзіміравіч, н. ў 1925, партызан, загінуў 13.5.1944, пахаваны ў в. Сычкава.

Л.І.Крупская.

Аляксандр Аляксандравіч Маеўскі.

Андрэй Аляксандравіч Маеўскі.

К.С.Сырыч.

КІРУШЫНА Марыя, падпольшчыца, расстраляна 26.1.1942 у Бабруйску.

КРУПСКАЯ Людміла Іванаўна, падпольшчыца-партызанка, расстраляна 26.10.1942 у Бабруйску.

ЛАПІН Веньямін Паўлавіч, н. ў 1913 у г. Пенза, Расія, ваентэхнік 1-га рангу, нач. інж. сл. 2-га тп, партызан 752-га атрада Лівенцава, загінуў 20.3.1942, пахаваны ў в. Канстанцінаўка Крычаўскага р-на Магілёўскай вобл.

МАЕЎСКІ Аляксандр Аляксандравіч, партызан, расстраляны 26.1.1942 у Бабруйску.

МАЕЎСКІ Андрэй Аляксандравіч, партызан, расстраляны 26.1.1942 у Бабруйску.

МАРКОЎСКАЯ Алена Іосіфаўна, партызанка, расстраляна ў засценках СД Бабруйска.

МАРКОЎСКАЯ Ніна Рыгораўна, партызанка, расстраляна 18.10.1942 у засценках СД у Бабруйску.

МАРКОЎСКІ Іван Іванавіч, партызан, загінуў 26.11.1943, пахаваны ў Бабруйску.

МАРКОЎСКІ Мікалай Аляксандравіч, партызан, расстраляны 26.11.1942 у Бабруйску.

ПАЎЛАЎ Васіль Сцяпанавіч, н. ў 1914, ст. палітрук, мал. лейт., кам. роты, падпольшчык у в. Шчаткава, партызан 752-га атрада Лівенцава, загінуў 20.3.1942, пахаваны каля в. Канстанцінаўка Крычаўскага р-на Магілёўскай вобл.

СЫРЫЧ Кацярына Сцяпанаўна, падпольшчыца, расстраляна 26.10.1942 у Бабруйску.

ЯНУШКОЎСКАЯ Кацярына Сцяпанаўна, партызанка, загінула і пахавана ў Бабруйску.

ЯНУШЭЎСКІ Аляксей Андрэевіч, н. ў 1908, кап., пам. нач. аператыўнай часці 770-га сп 209-й мд, партызан, загінуў 28.10.1943, пахаваны ў в. Чыкілі Глускага р-на Магілёўскай вобл.

ВЁСКА ЯЛОВІКІ

ПЯТРОЎСКІ Мікалай Мікалаевіч, н. ў 1924, партызан, загінуў 22.5.1944, пахаваны ў в. Курганы Клічаўскага р-на Магілёўскай вобл.

ХІМОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ГАРОХАВА

АСІПЁНАК Пракоп Патапавіч, партызан, прапаў без вестак.

ДЗЕРГАЧОЎ Савелій Данілавіч, партызан, прапаў без вестак.

МАЛАШОНАК Аркадзь Іванавіч, н. ў 1926, партызан, спалены фашыстамі ў 1944, пахаваны ў в. Сычкава.

ЦІТКОЎ Георгій Фёдаравіч, партызан, загінуў 17.1.1944, пахаваны ў в. Бярозкі Мінскай вобл.

СТРАЛКОЎ Сідар Іванавіч, партызан, прапаў без вестак 5.4.1944.

ВЁСКА ДАЛГАБРОЦКАЯ СЛАБАДА

КАРАБАНАЎ Павел Іванавіч, н. ў 1918, партызан атрада «Ураган» бр. «За Савецкую Беларусь», кам. аддз., прапаў без вестак 3.3.1944.

КАРПАЎ Кандрат Пятровіч, н. ў 1917, партызан, загінуў 8.2.1944 каля в. Вішанька Кіраўскага р-на, пахаваны ў в. Віленка-Выжары Кіраўскага р-на Магілёўскай вобл.

ПАСЬКО Сямён Панкратавіч, н. ў 1917, сярж., партызан атрада імя Фурманава 37-й бр. імя Пархоменкі, загінуў 27.9.1944.

ВЁСКА ДУМАНОЎШЧЫНА

БАБАРЭНКА Іван Еўціхавіч, партызан-сувязны, забіты фашыстамі.

КУБЫШКІН Захар Іванавіч, партызан-сувязны, закатаваны фашыстамі.

МУРАШКА Аляксандр Іванавіч, партызан, прапаў без вестак.

МУРАШКА Аляксандр Пятровіч, н. ў 1910, партызан-сувязны, закатаваны фашыстамі ў 1942.

ПОЦЮХ Сямён Трафімавіч, н. ў 1900, партызан-сувязны, закатаваны фашыстамі.

ТРУНЕЎСКАЯ Фёкла Гаўрылаўна, н. ў 1900,

партызанка-сувязная, расстраляна ў першыя дні вайны.

ПЯТРУША Іван Максімавіч, н. ў 1923, партызан 737-га атрада імя Кірава, загінуў 12.7.1943, пахаваны ў в. Зялёнка.

ПЯТРУША Яфім Васілевіч, н. ў 1906, партызан, загінуў 22.2.1942, пахаваны ў в. Думаноўшчына.

ВЁСКА НОВАЯ ШАРАЁЎШЧЫНА

БАГАМОЛАЎ Іосіф Дзямідавіч, н. ў 1916, партызан, загінуў 26.2.1944.

БАРАШКА Марфа Сямёнаўна, н. ў 1914, партызанка-сувязная, павешана фашыстамі ў маі 1944, пахавана ў в. Новая Шараёўшчына.

МУРАШОЎ Мітрафан Марцінавіч, н. ў 1910, партызан, павешаны фашыстамі ў маі 1944.

МУРАШОЎ Федасей Вікенцьевіч, н. ў 1912, партызан, загінуў 26.2.1944, пахаваны ў в. Кастрычы Кіраўскага р-на Магілёўскай вобл.

ВЁСКА СТАРАЯ ШАРАЁЎШЧЫНА

БЯРНАЦКІ Фёдар Аляксандравіч, н. ў 1926, партызан-сувязны, павешаны фашыстамі ў маі 1944 у в. Новая Шараёўшчына.

КАРОЛЬ Марыя Аляксандраўна, н. ў 1921, партызанка, загінула 18.2.1944, пахавана ў Клічаўскім р-не Магілёўскай вобл.

ВЁСКА ХІМЫ

АСІПЁНАК Фёдар Цімафеевіч, н. ў 1905, старшыня калгаса «Акцябр», партызан, спалены фашыстамі ў лагеры смерці Трасцянец пад Мінскам.

БАЛДЗЕНКА Мікалай Гаўрылавіч, н. ў 1924, партызан, прапаў без вестак.

СТРАЛКОЎ Дзмітрый Васілевіч, н. ў 1902, партызан-сувязны, спалены ў лагеры смерці Трасцянец пад Мінскам.

ВЁСКА ЦЯРЭШКАВА

КУЛАГА Мікалай Прохаравіч, н. ў 1916, партызан-сувязны, расстраляны фашыстамі ў в. Яловікі ў 1941.

ПУЦІКАЎ Васіль Канстанцінавіч, н. ў 1923, партызан, памёр ад ран 26.2.1944, пахаваны ў в. Каршукі Кіраўскага р-на Магілёўскай вобл.

ВЁСКА ЯСНЫ ЛЕС

ГАЛІСЕЕЎ Фёдар Рыгоравіч, н. ў 1921, партызан, фельчар 277-га атрада 2-й Клічаўскай бр., загінуў 13.7.1943, пахаваны каля в. Усакіна Клічаўскага р-на Магілёўскай вобл.

ГЛАДКЕВІЧ Валянціна Міхайлаўна, партызанка, прапала без вестак.

ГЛАДКЕВІЧ Зоя Міхайлаўна, партызанка, прапала без вестак.

ГЛАДКЕВІЧ Кацярына Пятроўна, партызанка, прапала без вестак.

ГЛАДКЕВІЧ Лявон Піліпавіч, н. ў 1924, партызан, закатаваны фашыстамі.

ГЛАДКЕВІЧ Раіса Міхайлаўна, партызанка, прапала без вестак.

ГЛАДКЕВІЧ Фёдар Піліпавіч, партызан, прапаў без вестак.

ГЛАДКЕВІЧ Цярэнцій Міхайлавіч, партызан, прапаў без вестак.

ДУБРОЎСКІ Мікалай Іванавіч, партызан, прапаў без вестак.

КЛІМЕНКА Алена Пятроўна, партызанка, прапала без вестак.

КЛІМЕНКА Наталля Мікалаеўна, партызанка, прапала без вестак.

КЛІМЕНКА Пётр Іванавіч, партызан, прапаў без вестак.

КОТЛЯР Пётр Васілевіч, партызан, загінуў 10.6.1944, пахаваны ў в. Закутка Клічаўскага р-на Магілёўскай вобл.

КУРСАКОЎ Канстанцін Гаўрылавіч, н. ў 1912, сярж., кам. аддз., партызан 537-га атрада імя Кірава, загінуў 27.12.1942, пахаваны ў в. Кавяза Клічаўскага р-на Магілёўскай вобл.

НЕМАГАЕЎ Васіль Карпавіч, партызан, прапаў без вестак.

ПЯСЕНКА Арсеній Рыгоравіч, н. ў 1925, партызан, закатаваны фашыстамі.

ПЯСЕНКА Рыгор Міхайлавіч, партызан, прапаў без вестак.

ШАПАТКОЎСКІ Гаўрыла Фёдаравіч, н. ў 1905, партызан-сувязны, закатаваны фашыстамі.

ШЧАЦІНІН Уладзімір Мікалаевіч, партызан, прапаў без вестак.

ШЫПКОЎ Георгій Фёдаравіч, н. ў 1923, партызан, загінуў 17.1.1944, пахаваны ў в. Бярозкі Докшыцкага р-на Віцебскай вобл.

ШЫПКОЎ Мікалай Фёдаравіч, партызан, прапаў без вестак.

ШЫПКОЎ Уладзімір Фёдаравіч, партызан, прапаў без вестак.

ЦЯЛУШСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ДУБАЎКА

АРЭШКА Таццяна Цімафееўна, н. ў 1919, партызанка-сувязная, расстраляна фашыстамі.

АЎРАМЧЫК Лідзія Міхайлаўна, н. ў 1922, партызанка 751-га атрада 1-й Бабруйскай бр., памерла ад ран 11.12.1943.

КУЗЬМІЧ Аляксандр Пятровіч, н. ў 1900, падпольшчык, расстраляны фашыстамі ў 1943.

МЕЛЬНІЧОНАК Мікалай Сцяпанавіч, н. ў 1928, партызан, расстраляны.

СТЭЛЬМАК Мікалай Нічыпаравіч, н. ў 1928, расстраляны за сувязь з партызанамі.

Л.М.Аўрамчык.

А.Т.Дудаль.

С.А.Дудаль.

Р.Я.Харанека.

ВЁСКА ЗАБАЛОЦЦЕ

АЎГУШАЎ Мікалай Іванавіч, н. ў 1924, партызан, прапаў без вестак.

ВЁСКА ПЛЁСЫ

САКУН Валянціна Паўлаўна, н. ў 1923, партызанка-разведчыца 752-га атрада, загінула 12.8.1943, пахавана ў в. Чыкілі Глускага р-на Магілёўскай вобл.

ВЁСКА САВІЧЫ

ВАВУЛА Аляксей Мікалаевіч, н. ў 1926, партызан 751-га атрада, прапаў без вестак 11.12.1943.

ВАВУЛА Сяргей Іванавіч, партызан, расстраляны.

ВАВУЛА Сяргей Цімафеевіч, партызан, расстраляны.

ДУДАЛЬ Аляксей Іларыёнавіч, н. ў 1922, партызан, прапаў без вестак.

ДУДАЛЬ Іван Іларыёнавіч, партызан, прапаў без вестак у сакавіку 1945.

ДУДАЛЬ Іван Сяргеевіч, партызан, прапаў без вестак.

ДУДАЛЬ Рыгор Іларыёнавіч, н. ў 1910, партызан 1-й Бабруйскай бр., загінуў 9.10.1943, пахаваны ў в. Дубраўка Асіповіцкага р-на Магілёўскай вобл.

ВЁСКА СІМГАРАВІЧЫ

ВАРАБ'ЁВА Марыя Сцяпанаўна, н. ў 1920, партызанка-сувязная, настаўніца, закатавана фашыстамі ў 1943, пахавана ў в. Сімгаравічы.

ВЁСКА СТУПЯНІ

ДУДАЛЬ Афанасій Трафімавіч, н. ў 1916, партызан, загінуў 2.1.1944, пахаваны ў в. Кудзінавічы Капыльскага р-на Мінскай вобл.

ДУДАЛЬ Савелій Аляксандравіч, н. ў 1919, партызан-сувязны, загінуў у засценках гестапа ў Бабруйску.

ХАРАНЕКА Рыгор Якаўлевіч, н. ў 1924, партызан 751-га атрада, забіты фашыстамі ў жніўні 1944.

ВЁСКА ЦЯЛУША

БАНДАРЧУК Сяргей Іосіфавіч, н. ў 1920, партызан 751-га атрада, сяржант, сапёр 109-га сп 37-й сд, загінуў 12.6.1944 каля в. Дуброва Светлагорскага р-на Гомельскай вобл.

ГАЦКО Піліп Міхайлавіч, н. ў 1922, партызан, загінуў у 1944 пад Парычамі Гомельскай вобл.

ГРЭБЕНЬ Іван Аляксандравіч, н. ў 1924, партызан, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

СТУПЕНЬ Пётр, партызан-падпольшчык, загінуў у засценках СД 30.12.1943.

СТЭЛЬМАК Васіль Міхайлавіч, н. ў 1909, ст. лейт., палітрук роты в/ч 751, кам. аэрадрома 201-й роты авіябазы, партызан, загінуў 11.12.1943 у Гомельскай вобл.

СЯЛІЦКІ Уладаімір Іванавіч, н. ў 1925, партызан 755-га атрада 1-й Бабруйскай бр., прапаў без вестак.

ХУРСАН Вера Афанасьеўна, н. ў 1922, падпольшчыца, закатавана ў засценках СД у 1943.

Партызаны, дакладнае месца нараджэння якіх не ўстаноўлена

ГАЦКО Мікалай Пракопавіч, н. ў 1910, партызан-разведчык атрада імя Чапаева 37-й бр. імя Пархоменкі, рад., стралок 630-га сп 74-й сд, загінуў 30.1.1943, пахаваны ў в. Агрызкава Нікольскага р-на Арлоўскай вобл., Расія.

КЛЫГА Аляксей Мікалаевіч, н. ў 1900, партызан, загінуў і пахаваны ў в. Карытнае Асіповіцкага р-на Магілёўскай вобл.

Партызаны — ураджэнцы іншых раёнаў і абласцей, якія загінулі і пахаваны на тэрыторыі Бабруйскага раёна

БЫЧАНОК Фёдар Васілевіч, н. ў 1922 у в. Вялікая Грава Асіповіцкага р-на Магілёўскай вобл., партызан 753-га атрада, загінуў 23.6.1943, пахаваны ў в. Старцы.

ГЕЧАНОВА Георгій Іванавіч, н. ў 1911 у в. Цхакая, Паўднёвая Асеція, Грузія, ст. лейт., камандзір развед. батальёна 1-га азп 51-й арміі Крымскага фронту, партызан 751-га атрада, загінуў 25.10.1943, пахаваны ў в. Палянкі.

ДЗЯМІДАЎ Іван Іванавіч, н. ў 1918, палітрук роты партыз. атрада Смаленскага штаба партыз. руху, загінуў 15.6.1944, пахаваны ў в. Забалоцце.

КАЛПАК Мікалай Рыгоравіч, н. ў 1922 у в. Слабодка Менскага р-на Чарнігаўскай вобл., Украіна, партызан 753-га атрада, загінуў 23.6.1943, пахаваны ў в. Старцы.

КАСЦЮЧЭНКА Пётр Ціханавіч, н. ў 1916 у т. Смаленск, партызан атрада Шашуры 161-й бр. імя Катоўскага, загінуў у ліпені 1943, пахаваны ў в. Пакроўка.

КОРНЕЎ Мікалай Іванавіч, н. ў 1921 у в. Марцюхіна Курскай вобл., Расія, партызан 752-га атрада, загінуў 26.4.1943, пахаваны ў в. Вялікая Каменка.

МАКЕЙЧЫК Іван, н. ў в. Зубарэвічы Глускага р-на Магілёўскай вобл., партызан, загінуў у 1943, пахаваны ў в. Рымаўцы.

МАКСІМАЎ Ісай Калінавіч, н. ў 1907, партызан, загінуў 25.10.1943, пахаваны ў в. Стасеўка.

МУРЫГІН Пётр, н. ў г. Масква, партызан, загінуў у 1944, пахаваны ў в. Круглоніва.

ЛЕЛІНА Галіна Іосіфаўна, н. ў 1922, партызанка, загінула 14.4.1944, пахавана ў в. Гарохаўка.

ПАДЭРЫН Анатоль Якаўлевіч, н. ў 1916, мал. лейт., партызан атрада імя Чапаева, загінуў 11.9.1943, пахаваны ў в. Гарохаўка.

ПІСАРАЎ Уладзімір Мікалаевіч, н. ў 1918 у в. Садцы Смаленскай вобл., Расія, ст. сярж., кам. аддз. 10-га атд Смаленскага стр. бат., партызан, загінуў 23.6.1943, пахаваны ў в. Старцы.

РАСНЯНСКІ Сямён, партызан атрада імя Шчорса, пахаваны ў в. Рымаўцы.

РЫБАЛКА Якаў Акімавіч, н. ў в. Зайораж Есільскага р-на Тургайскай вобл., Казахстан, стралок 308-га лап 144-й сд 22-й арміі, партызан, загінуў 23.6.1943, пахаваны ў в. Старцы.

СЕЛЯЗНЁЎ, партызан, загінуў у 1943, пахаваны ў в. Рымаўцы.

СІЛАЎ Аляксей Кузьміч, н. ў 1912 у в. Байка Уладзімірскай вобл., Расія, сяржант, камандзір аддзялення, партызан, загінуў 11.9.1943, пахаваны ў в. Залессе.

СУХАВЕРКАЎ Міхаіл Фёдаравіч, старшына, партызан атрада імя Кірава 37-й бр. імя Пархоменкі, загінуў 29.12.1942, пахаваны ў в. Мірадзіна.

ХАРАШУН Пётр Емяльянавіч, н. ў 1925 у в. Язвінцы Светлагорскага р-на Гомельскай вобл., партызан 753-га атрада, загінуў 6.8.1943, пахаваны ў в. Старынкі.

ЦЯГУНОЎ Васіль Рыгоравіч, н. ў 1915, падпольшчык, партызан-сувязны 751-га атрада 1-й Бабруйскай бр., загінуў у сакавіку 1942.

ЧЫГІР Іосіф Якаўлевіч, н. ў 1910 у в. Язвінцы Светлагорскага р-на Гомельскай вобл., ст. сяржант, партызан атрада імя Фурманава 37-й бр. імя Пархоменкі, загінуў 17.7.1943, пахаваны на ст. Брожа.

ШЧАЛКОЎ Фёдар, партызан, загінуў 3.3.1943, пахаваны ў пас. Глуша.

ЯГЕЛАЎ Андрэй Фядотавіч, н. ў 1913 у г. Дарагабуж Смаленскай вобл., Расія, ст. лейт., кам. бат. 290-й сд, партызан 752-га атрада, загінуў 26.9.1943, пахаваны ў в. Вялікая Каменка.

ЯЛЬЧЫК Мікалай Цярэнцьевіч, н. ў 1918, партызан атрада імя Кірава 37-й бр. імя Пархоменкі, загінуў 29.12.1942, пахаваны ў в. Мірадзіна.

ЯФІМЕНКА Міхаіл Дзмітрыевіч, н. ў 1918, яфр., партызан атрада імя Кірава 37-й бр. імя Пархоменкі, загінуў 7.9.1943, пахаваны ў в. Дворышча.

Мірныя жыхары — ахвяры фашысцкага тэрору

БОРТНІКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АЗЁРЫ

ДАЙНЕКА Дзмітрый А., н. ў 1874, закатаваны, пахаваны ў роднай вёсцы.

ВЁСКА БІРЧА

БАБКОЎ Андрэй Андрэевіч, н. ў 1920, закатаваны.

ВЁСКА ВЯЛІКІЯ БОРТНІКІ

АНУФРЫЕНКА Лявон Патапавіч, н. ў 1877, закатаваны.

БЛАГАВЕШЧАНСКІ Барыс А., н. ў 1918, закатаваны.

ГАРЭЛІК Параска, н. ў 1874, закатавана.

ЛЕБЕДЗЕЎ Яўген, н. ў 1872, закатаваны.

МАКЕЙЧЫК Макар, забіты карнікамі ў 1942.

ХУРСАНАВА Ганна Сямёнаўна, 1 год, загінула ў лагеры смерці «Азарычы».

ХУРСАНАЎ Іван Сямёнавіч, 5 гадоў, загінуў у лагеры смерці «Азарычы».

ХУРСАНАЎ Уладзімір Сямёнавіч, 10 гадоў, загінуў у лагеры смерці «Азарычы».

ВЁСКА КРУПІЧЫ

АРЭШКА Васіль Сямёнавіч, закатаваны.

АРЭШКА Уладзімір Іванавіч, закатаваны.

СКВАРЦОЎ Мікалай Раманавіч, закатаваны.

ВЁСКА МАЛІНАЎКА

БАЛЫКА Уладзімір Пятровіч, закатаваны.

БУРАК Дамітрый Фірсанавіч, закатаваны.

ГОЛУБ Іван Васілевіч, закатаваны.

ГОЛУБЕЎ Міхаіл Раманавіч, закатаваны.

ВЁСКА МАЛЫЯ БОРТНІКІ

БАЛЫКА Пётр Ціханавіч, н. ў 1884, закатаваны.

БАЛЫКА Фёдар Максімавіч, н. ў 1918, закатаваны.

ШАМАК Васіль Нічыпаравіч, н. ў 1922, закатаваны.

ШАМАК Вольга Ерамееўна, н. ў 1884, закатавана.

ШАМАК Пётр Нічыпаравіч, н. ў 1911, закатаваны.

ШАПЯЛЕВІЧ Аляксей Фёдаравіч, н. ў 1915, закатаваны.

ВЁСКА МАРТЫНАЎКА

МІХАЛЁНАК Дамітрый Іванавіч, расстраляны ў лагеры смерці «Азарычы».

ШАПЯЛЕВІЧ Аляксей, расстраляны ў лагеры смерці «Азарычы».

ВЁСКА МІХАЛЁВА

БАКАЧ Іван Савельевіч, закатаваны.

ШЫРОКІ Аркадзь Васілевіч, н. ў 1921, закатаваны.

ШЫРОКІ Васіль Рыгоравіч, закатаваны.

ЮШКЕВІЧ Мікалай Раманавіч, закатаваны.

ВЁСКА ПУСТОШКА

ГРЫШЧАНКА Максім Вікенцьевіч, н. ў 1922, закатаваны.

ГРЫШЧАНКА Рыгор Іванавіч, н. ў 1923, закатаваны.

МІХАЛЁНАК Антон Трафімавіч, н. ў 1875, закатаваны.

МІХАЛЁНАК Варвара Рыгораўна, н. ў 1892, закатавана.



Г.С.Тулуп.

МІХАЛЁНАК Васіль Макаравіч, н. ў 1927, закатаваны.

МІХАЛЁНАК Васіль Піліпавіч, н. ў 1912, закатаваны.

МІХАЛЁНАК Дамітрый Іванавіч, н. ў 1912, закатаваны.

МІХАЛЁНАК Міхаіл Ігнатавіч, н. ў 1918, закатаваны.

ПАРХІМЕНКА Апанас Трафімавіч, н. ў 1907, закатаваны.

БРОЖСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БРОЖА

ПАСЬКО-ГУРБАНОВІЧ Анастасія Акімаўна, н. ў 1922, расстраляна фашыстамі ў 1942.

ТОЎСЦІК Фядосія Адамаўна, н. ў 1896, закатавана.

ВЁСКА ЛАСІ

ЛОСЬ Еўдакія Яўхімаўна, н. ў 1924, загінула ў канцлагеры ў Бабруйску.

ЛОСЬ Іван Емяльянавіч, н. ў 1909, працаваў у калгасе, закатаваны.

ЛОСЬ Хрысціна Пятроўна, н. ў 1902, закатавана.

ВЁСКА МАКАРАВІЧЫ

ТУЛУП Алена Сяргееўна, н. ў 1922, працавала ў калгасе, закатавана.

ТУЛУП Андрэй Цімафеевіч, н. ў 1916, працаваў рахункаводам у калгасе, закатаваны.

ТУЛУП Ганна Сцяпанаўна, н. ў 1880, працавала ў калгасе, закатавана.

ТУЛУП Сяргей Паўлавіч, н. ў 1870, працаваў у калгасе, закатаваны.

ВЁСКА ОРСІЧЫ

ВЕРАС Іван Іосіфавіч, н. ў 1923, расстраляны.

НІКІТКА Аляксандр Астапавіч, н. ў 1921, закатаваны.

НІКІТКА Марфа Прохараўна, н. ў 1882, закатавана.

НІКІТКА Марыя Астапаўна, н. ў 1935, закатавана.

РОСКАЧ Аляксандр Мінавіч, памёр у канцлагеры Нова-Беліца.

ВЁСКА ПРУДЗІШЧА

Спалена фашыстамі ў 1943 г., пасля вайны не адноўлена.

ВЕРАС Іван Іосіфавіч, н. ў 1912, расстраляны 23.10.1943, пахаваны ў брацкай магіле ў в. Прудзішча.

ГАВАРУШКА Таццяна Максімаўна, н. ў 1917, спалена 7.1.1944, пахавана ў брацкай магіле ў в. Прудзішча.

ГРЫГАРОВІЧ Казімір Валяр'янавіч, н. ў 1912, расстраляны 23.10.1943, пахаваны ў брацкай магіле ў в. Прудзішча.

ЛАПКО Марыя Аляксандраўна, н. ў 1924, спалена 7.1.1944, пахавана ў брацкай магіле ў в. Прудзішча.

МАЦВЯЁНАК Софія Іванаўна, н. ў 1886, працавала старшынёй калгаса «Ударнік», расстраляна ў кастрычніку 1944 у канцлагеры ў Мінску.

ТАРАХОВІЧ Мікалай Казіміравіч, н. ў 1890, спалены 7.1.1944, пахаваны ў брацкай магіле ў в. Прудзішча.

ШАХ Максім Фаміч, н. ў 1909, працаваў у калгасе, закатаваны.

ШЭНДРЫК Наталля Рыгораўна, н. ў 1942, спалена 7.1.1944, пахавана ў брацкай магіле ў в. Прудзішча.

ВЁСКА СЛАБОДКА

БАРАДЗІН Рыгор Пятровіч, н. ў 1901, працаваў у лясгасе, закатаваны.

БОЛБАС Ганна К., н. ў 1884, працавала ў калгасе, закатавана.

БОЛБАС Лявон Іванавіч, н. ў 1897, працаваў у калгасе, закатаваны.

БОЛБАС Мацвей Пятровіч, н. ў 1901, працаваў у калгасе, закатаваны.

БОЛБАС Фёдар Мікалаевіч, н. ў 1900, працаваў у калгасе, закатаваны.

БУКАС Васіль Саўкавіч, н. ў 1921, працаваў у калгасе, закатаваны.

БЕСПРЫЗВАНЫ Ізраіль Залманавіч, н. ў 1900, працаваў у калгасе, закатаваны.

ВАШЧЫЛА Іван Іосіфавіч, н. ў 1927, закатаваны.

ВОЛКАЎ Аўдзей, н. ў 1889, закатаваны.

ГАЙДУКЕВІЧ Алякеандр Ал., н. ў 1900, працаваў настаўнікам, закатаваны.

ДЗІТРЫХ Валянціна А., н. ў 1908, працавала настаўніцай, закатавана.

ДУКТБЕЙН Брона, працавала ў калгасе, закатавана.

ДУКТБЕЙН Рыва, працавала ў калгасе, закатавана.

ДУКТБЕЙН Этка М., н. ў 1910, працаваў у калгасе, закатаваны.

КАВАЛЕНКА Сямён, н. ў 1886, працаваў у калгасе, закатаваны.

КОРШАК Ігнат Юсцінавіч, н. ў 1890, працаваў у калгасе, закатаваны.

КУРЛЯНЧЫК Карп Лазаравіч, н. ў 1906, працаваў у калгасе, закатаваны.

КУРЛЯНЧЫК Лазар, н. ў 1882, працаваў у калгасе, закатаваны.

ЛОСЬ Аляксандр Дзмітрыевіч, н. ў 1930, закатаваны.

МАКСІМАВА Вінадора, н. ў 1895, працавала ў калгасе, закатавана.

МІРОНЧЫК Марыя Т., н. ў 1932, закатавана.

МІТКЕВІЧ Пашка, н. ў 1904, працаваў у калгасе, закатаваны.

ПАГАРЭЛЬСКІ Іван М., н. ў 1885, працаваў рахункаводам у калгасе, закатаваны.

ПАСЬКО Ганна Пракопаўна, н. ў 1903, працавала ў калгасе, закатавана.

ПРАНОВІЧ Ганна Фёдараўна, н. ў 1903, працавала ў калгасе, закатавана.

ПРАНОВІЧ Марыя, н. ў 1864, працавала ў калгасе, закатавана.

ПЯТРОВА Пелагея І., н. ў 1915, працавала ў калгасе, закатавана.

ПЯТРОВА Таццяна І., н. ў 1925, працавала ў калгасе, закатавана.

РУДЗЬКО Матрона Сав., працавала ў калгасе, закатавана.

СВЕРЖ Цэзар Эрыкавіч, н. ў 1874, працаваў у калгасе, закатаваны.

СВЕРЖ Юзэфа А., працавала ў калгасе, закатавана.

АНАНКЕВІЧ Марыя Максімаўна, н. ў 1901, працавала ў калгасе, закатавана.

БОЛБАС Аніота Фёдараўна, працавала ў калгасе, закатавана.

БОЛБАС Мікалай Іванавіч, н. ў 1886, працаваў у калгасе, закатаваны.

КРУК Аляксандр Нічыпаравіч, н. ў 1903, працаваў у калгасе, закатаваны.

МІХЛЮК Фядора Максімаўна, н. ў 1884, працавала ў калгасе, закатавана.

НІКІТКА Варвара Еўдакімаўна, працавала ў калгасе, закатавана.

ПАСЬКО Якім Пракопавіч, н. ў 1882, працаваў у калгасе, закатаваны.

РОСКАЧ Сямён Савельевіч, н. ў 1896, працаваў у калгасе, закатаваны.

ЧУГУЕЎ Павел Сямёнавіч, н. ў 1907, працаваў у калгасе, закатаваны.

ШАХ Васіль Барысавіч, н. ў 1928, закатаваны.

ВАРАТЫНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АЎСІМАВІЧЫ

ПАРАХНЕВІЧ Нічыпар Іванавіч, н. ў 1884, закатаваны.

ВЁСКА БУДЧЫН

ПАРАХНЕВІЧ Ігнат Макаравіч, н. ў 1878, спалены ў красавіку 1944.

ВЁСКА ВАРАТЫНЬ

КУПРЫЯНЧЫК Сцяпан Васілевіч, н. ў 1909, вывезены фашыстамі, прапаў без вестак.

ПАРАХНЕВІЧ Любоў Цімафееўна, н. ў 1919, працавала настаўніцай, вывезена фашыстамі, прапала без вестак.

ПАРАХНЕВІЧ Фёдар Е., н. ў 1900, закатаваны.

ПРАКОПЧЫК Мікалай Пятровіч, н. ў 1918, закатаваны.

ПРАКОПЧЫК Серафіма Мікалаеўна, н. ў 1910, вывезена фашыстамі, прапала без вестак.

СТЭЛЬМАК Якаў Емяльянавіч, н. ў 1896, працаваў сакратаром сельсавета, вывезены фашыстамі, прапаў без вестак.

ХВАШЧЫНСКІ Мікалай Піліпавіч, н. ў 1912, вывезены фашыстамі, прапаў без вестак.

ШЭВЕЛЕЎ Аляксандр Панфілавіч, н. ў 1942, спалены 7.4.1944, пахаваны каля в. Варатынь.

ШЭВЕЛЕЎ Мікалай Панфілавіч, н. ў 1940, спалены 7.4.1944, пахаваны каля в. Варатынь.

ВЁСКА ВІЛЫ

АБРАМАВА-ДРАЗДОВА Аграфена Сямёнаўна, н. ў 1897, працавала ў калгасе «Ленінскі шлях», вывезена на прымусовыя работы ў Германію, загінула 17.4.1944.

Помнік на магіле Мікалая і Аляксандра Шэвелевых, спаленых фашыстамі (вёска Варатынь).

А.С.Абрамава-Драздова.

В.С.Бокі.

ВЁСКА КОЎРЫН

ДАШКОЎСКІ Архіп М., н. ў 1895, закатаваны.

ВЁСКА ПАРАСЛЯ

СТЭЛЬМАК Любоў Афанасьеўна, н. ў 1924, працавала ў калгасе, вывезена, прапала без вестак.

ВЁСКА ТУРКОЎСКАЯ СЛАБАДА

ФІЛІН Іван Раманавіч, н. ў 1921, расстраляны.

ВІШНЁЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

БАШАН Софія Міхайлаўна, н. ў 1933, закатавана.

БОКІ Віцэсь Станіслававіч, н. ў 1909, прапаў без вестак.

ВАЎЧЭЦКІ Іван Аркадзевіч, н. ў 1904, закатаваны.

РАСОХА Сямён Сцяпанавіч, н. ў 1918, закатаваны.

ГАРБАЦЭВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ГАРБАЦЭВІЧЫ

БАНДАРЭНКА Восіп Пракопавіч, н. ў 1898, працаваў старшынёй калгаса, у жніўні 1943 схоплены фашыстамі і адпраўлены ў канцлагер «Асвенцім», спалены ў крэматорыі лагера.

ГАРЭЛІК Браніслава Львоўна, н. ў 1919, працавала настаўніцай, расстраляна.

ДАВЫДОЎСКІ Ігнат, працаваў старшынёй сельсавета, пракурорам раёна, у 1942 расстраляны.

ЛЯДЗЯН Сямён Сямёнавіч, н. ў 1889, працаваў начальнікам нафтабазы Гарбацэвіцкай МТС, у жніўні 1943 схоплены і адпраўлены фашыстамі ў канцлагер «Асвенцім», спалены ў крэматорыі лагера.

ПАЛАШАВЕЦ Павел Якімавіч, н. ў 1888, дэпутат сельсавета, у жніўні 1943 схоплены і адпраўлены фашыстамі ў канцлагер «Асвенцім», спалены ў крэматорыі лагера.

ВЁСКА ОБЧА

ШАРСНЁВА Еўдакія Севасцьянаўна, закатавана.

ВЁСКА РАГАЛІ

АШУРКА Прохар, расстраляны.

АШУРКА Сямён, расстраляны.

ГАРОХАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АКОЛІЦА

МАРОЗ Андрэй Васілевіч, н. ў 1893, закатаваны.

ВЁСКА ГАРОДЧЫНА

РУБЕЖ Іван Андрэевіч, н. ў 1904, працаваў у калгасе, закатаваны.

РЭКІШ Марыя Сцяпанаўна, н. ў 1923, працавала ў калгасе, закатавана.

РЭКІШ Сцепаніда Макараўна, н. ў 1893, працавала ў калгасе, закатавана.

ВЁСКА ДВОР-ГЛУША

ДОЎГІ Аляксандр Стафанавіч, н. ў 1914, працаваў у калгасе, закатаваны.

ВЁСКА ДВОРЫШЧА

ЕШЧЫК Настасся Кандратаўна, н. ў 1905, закатавана.

ЕШЧЫК Марыя Пятроўна, н. ў 1924, працавала ў калгасе, закатавана.

МАЦВЕЙЧЫК Вольга, н. ў 1914, працавала ў калгасе, закатавана.

ВЁСКА ДЗЯЎЧЫН

КЛЫГА Павел Рыгоравіч, н. ў 1919, працаваў у калгасе, закатаваны.

ВЁСКА КАМЕНКА

ВЕРНІКОЎСКІ Віктар, н. ў 1908, закатаваны.

ШАРАМЕТ Уладзімір Сафронавіч, н. ў 1926, працаваў у калгасе, вывезены на прымусовыя работы ў Германію, прапаў без вестак.

ШОСТАК Васіль Міхайлавіч, н. ў 1907, працаваў у калгасе, закатаваны, пахаваны на могілках у в. Каменка.

ВЁСКА КЛІНЫ

БУЗАК Васіль Цярэнцьевіч, н. ў 1918, працаваў у калгасе, закатаваны.

РЫБАК Зоя Стафанаўна, н. ў 1900, працавала ў калгасе, закатавана.

ШАРДЫКА Васіль Дзмітрыевіч, н. ў 1900, працаваў у калгасе, закатаваны.

ШАРДЫКА Марыя Васілеўна, н. ў 1923, працавала ў калгасе, закатавана.

ВЁСКА КРАСНАЯ ЗАРА

ПАРХІМЧЫК Іван Паўлавіч, н. ў 1901, працаваў старшынёй калгаса, закатаваны.

РАСОХА Фёдар Дзмітрыевіч, н. ў 1914, забіты паліцаямі ў 1942.

ВЁСКА КРАСНЫ АГАРОД

ШАРДЫКА Антон Іванавіч, н. ў 1899, працаваў у калгасе, закатаваны.

ШАРДЫКА Зоя Цімафееўна, н. ў 1902, працавала ў калгасе, закатавана.

ВЁСКА КРУГЛОНІВА

БОГДАН Захар Фёдаравіч, н. ў 1868, працаваў у калгасе, закатаваны.

БУРДЗЕЙКА Сямён Сцяпанавіч, н. ў 1914, медыцынскі работнік, расстраляны ў канцлагеры ў Мінску, пахаваны ў брацкай магіле.

ВАЛЧКОЎ Сяргей Фёдаравіч, н. ў 1909, працаваў настаўнікам, потым дырэктарам школы, закатаваны, пахаваны ў в. Круглоніва.

КЛІМОВІЧ Канстанцін Мікалаевіч, н. ў 1924, арыштаваны ў 1944, закатаваны.

ЛУШНА Алена Мікалаеўна, н. ў 1915, закатавана, пахавана ў г. Старыя Дарогі Мінскай вобл.

МУРЫГІН Пётр, расстраляны карнікамі, пахаваны на могілках у в. Круглоніва.

ТУРКО Мікалай Ульянавіч, н. ў 1910, забіты паліцаямі ў 1942.

ВЁСКА ЛЕНІНЦЫ

ГОРБЕЛЬ Аляксандр Савіч, н. ў 1901, працаваў у калгасе, закатаваны.

САВОНЧЫК Аляксандр Васілевіч, н. ў 1898, працаваў у калгасе, закатаваны.

ВЁСКА ЛЯДЫ

ГОРБЕЛЬ Пракоп Мікалаевіч, н. ў 1899, працаваў у калгасе, закатаваны.

ВЁСКА МАКАРАЎКА

СЫСОЙ Міхаіл Аляксандравіч, н. ў 1914, расстраляны, пахаваны ў в. Пабокавічы.

ВЁСКА МАСТЫ

ГОРБЕЛЬ Міхаіл Савіч, н. ў 1904, працаваў у калгасе, закатаваны.

ВЁСКА ПЯТРОВІЧЫ

ГАЙШУН Захар Парфенавіч, н. ў 1890, забіты паліцаямі ў 1942.

ГАЙШУН Сяргей Давыдавіч, н. ў 1905, забіты фашыстамі ў 1944.

ВЁСКА РЫМАЎЦЫ

БЯЗРУЧКА Надзея Акулаўна, н. ў 1923, вывезена на прымусовыя работы ў Германію, прапала без вестак.

ГУШЧА Алена Рыгораўна, н. ў 1915, закатавана.

ЛЕАНОВІЧ Васіль Пятровіч, н. ў 1900, закатаваны.

МАРКУЛАВА Кацярына, н. ў 1919, закатавана.

СТАНКЕВІЧ Вера Станіславаўна, н. ў 1922, працавала ў калгасе, закатавана.

ЦАРЫК Ганна Мітрафанаўна, н. ў 1918, працавала ў калгасе, закатавана.

ЦАРЫК Мітрафан Лявонавіч, н. ў 1874, працаваў у калгасе, закатаваны.

ЯФІМЕНКА Міхаіл, расстраляны.

ВЁСКА ЯСЁНА

АКУЛІЧ Іван Аляксандравіч, н. ў 1914, працаваў у калгасе, закатаваны.

АСТАПЕНКА Рыгор Іванавіч, н. ў 1893, закатаваны.

БУЗАК Іван Аляксеевіч, н. ў 1910, закатаваны.

ВЫСОЦКАЯ Марыя Сцяпанаўна, н. ў 1915, закатавана.

ГЕЙМАН, закатаваны.

ЗЯНЬКО Цярэнцій Міхайлавіч, н. ў 1914, закатаваны.

ІВАНОВА Еўдакія Ільінічна, н. ў 1909, закатавана.

ІВАНОВА Еўдакія Канстанцінаўна, н. ў 1916, працавала рахункаводам у калгасе, закатавана.

ІВАНОЎ Апанас Канстанцінавіч, н. ў 1914, рабочы шклозавода «Камінтэрн», закатаваны.

КАШЫНСКАЯ Ганна Андрэеўна, н. ў 1911, закатавана.

КРЫЧЭЎЦАЎ Павел Іванавіч, н. ў 1908, ветэрынарны ўрач, закатаваны.

КУНЕЦ Іван Сцяпанавіч, н. ў 1921, працаваў трактарыстам у калгасе, закатаваны.

ПАРХІМЧЫК Ульяна Пр., н. ў 1917, закатавана.

СКАРАХОД Мікалай Ф., н. ў 1888, закатаваны.

ХРАМЕЛЯ Марыя Андрэеўна, закатавана.

ХРАМЕЛЯ Пракоп К., н. ў 1892, працаваў трактарыстам у калгасе, закатаваны.

ШАРДЫКА Яўлін Восіпавіч, н. ў 1910, закатаваны.

ШЫЛА Настасся Гаўрылаўна, н. ў 1908, закатавана.

ШЫЛА Васіль Хар., н. ў 1908, закатаваны.

ШЫЛА Іван Міхайлавіч, н. ў 1915, закатаваны.

ШЫЛА Іван Хар., н. ў 1892, працаваў трактарыстам у калгасе, закатаваны.

ШЫЛА Іван Якаўлевіч, н. ў 1914, закатаваны.

ШЫЛА Канстанцін, н. ў 1914, закатаваны.

ШЫЛА Ксенія Максімаўна, н. ў 1894, закатавана.

ШЫЛА Павел Іванавіч, н. ў 1889, закатаваны.

ШЫЛА Сінклета Іванаўна, н. ў 1904, закатавана.

ШЫЛА Фёдар Аляксеевіч, н. ў 1913, закатаваны.

ЯРОШЧЫК Аляксандр Сямёнавіч, н. ў 1903, закатаваны.

ГЛУШАНСКІ ПАСЯЛКОВЫ САВЕТ

БЫЧКОЎСКІ Антон Васілевіч, н. ў 1903, рабочы шклозавода, 4.3.1943 арыштаваны фашыстамі, загінуў у г. Старыя Дарогі.

БЫЧКОЎСКІ Іосіф Васілевіч, н. ў 1910, рабочы шклозавода, 4.3.1943 арыштаваны фашыстамі, загінуў у г. Старыя Дарогі.

ДОЎГІ Іосіф Рыгоравіч, н. ў 1906, рабочы шклозавода, расстраляны ў 1941 у в. Тарасавічы Асіповіцкага раёна.

ЛЕВІН Давыд Янкелевіч, н. ў 1903, рабочы шклозавода, расстраляны ў г. Старыя Дарогі.

ЛЕВІНА Дора Давыдаўна, н. ў 1930, расстраляна, пахавана ў брацкай магіле пас. Глуша.

ЛЕВІНА Хана Майсееўна, н. ў 1905, расстраляна фашыстамі, пахавана ў брацкай магіле пас. Глуша.

МАЗІН Навум Ханкавіч, н. ў 1917 у Бабруйску, працаваў прадаўцом у пас. Глуша, расстраляны фашыстамі ў 1941, пахаваны ў брацкай магіле пас. Глуша.

МІКУЛЬЧЫК Надзея Мікалаеўна, н. ў 1918, работніца ашчадкасы, пахавана ў в. Юнішча Глускага раёна Магілёўскай вобл.

МУРАЎСКІ Станіслаў Браніслававіч, н. ў 1916, радыст, загінуў у 1941 у г. Старыя Дарогі.

ПАРХІМЧЫК Васіль Д., н. ў 1900, працаваў у калгасе, закатаваны.

ПАРХІМЧЫК Вера Стафанаўна, н. ў 1905, працавала ў калгасе, закатавана.

ПАРХІМЧЫК Дзям'ян П., н. ў 1912, закатаваны.

САМСОНАЎ Піліп Іванавіч, н. ў 1889, працаваў у калгасе, закатаваны.

С.Б.Мураўскі.

ХВАШЧЭЎСКІ Нікадзім Ануфрыевіч, н. ў 1888, рабочы, расстраляны ў жніўні 1941 паліцаямі ў пас. Глуша.

КАВАЛЁЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА КАВАЛІ

БАБКОВА Алена Данілаўна, н. ў 1895, закатавана.

БАБКОВА Наталля Іванаўна, н. ў 1900, закатавана.

БАБКОВА Яўгенія Іванаўна, н. ў 1929, закатавана.

БАБКОЎ Васіль Іванавіч, н. ў 1926, закатаваны.

БАБКОЎ Уладзімір Канстанцінавіч, н. ў 1928, закатаваны.

БОКАЧ Марыя Адамаўна, н. ў 1874, закатавана.

БОКАЧ Цярэнцій Самуілавіч, закатаваны.

ГІМПЕЛЕВІЧ Азрат Матусавіч, н. ў 1924, закатаваны.

ГІМПЕЛЕВІЧ Матус І., н. ў 1889, каваль, закатаваны.

ГІМПЕЛЕВІЧ Фейга, н. ў 1889, краўчыха, закатавана.

ГІМПЕЛЕВІЧ Хоня Матусавіч, н. ў 1930, вучань, закатаваны.

ДВОРКІН Карл, працаваў у калгасе, закатаваны з дзецьмі.

ДВОРКІНА Міра, н. ў 1932, вучаніца, закатавана.

ДВОРКІНА Эма Карлаўна, н. ў 1926, закатавана.

КАНЦЭПІНА Варвара І., н. ў 1928, вучаніца, закатавана.

КРЫВАШЭЕВА Надзея Рыгораўна, н. ў 1920, закатавана.

КРЫВАШЭЕЎ Леанід Мікалаевіч, н. ў 1943, закатаваны.

ЛЕЎШУНОЎ Міхаіл Уладзіміравіч, н. ў 1926, закатаваны.

ЛІЎШЫЦ Бася Фейшэлеўна, н. ў 1920, закатавана.

ЛІЎШЫЦ Гірша Фейшэлевіч, н. ў 1925, вучань, закатаваны.

ЛІЎШЫЦ Роза Фейшэлеўна, н. ў 1918, закатавана.

ЛІЎШЫЦ Фейшэль, н. ў 1890, кравец, закатаваны з жонкай і дзецьмі.

ЛІЎШЫЦ Ціўка, н. ў 1890, краўчыха, закатавана.

ЛІЎШЫЦ Янкель Фейшэлевіч, н. ў 1928, вучань, закатаваны.

ПАВЕЧАРОЎСКІ Іван, каваль, памёр у засценках гестапа ад пабояў.

РАЙСКІ Міхаіл Андрэевіч, н. ў 1914, працаваў шафёрам, закатаваны.

РУБЛЕЎСКІ Васіль, схоплены фашыстамі, загінуў у засценках камендатуры.

РУСАКОВА Ларыса Юр'еўна, н. ў 1909, закатавана.

САКУЛЬСКІ Рыгор Іосіфавіч, н. ў 1918, працаваў у калгасе, закатаваны.

ФЯСЮК Гэля Сяргееўна, н. ў 1911, закатавана.

ЦІКАВЫ Фёдар Іванавіч, расстраляны.

ШКРАДЗЮК Аркадзь Іванавіч, н. ў 1914, закатаваны.

ШЧЭРБУХ Аляксей А., н. ў 1896, мельнік, закатаваны.

ШЫРОКІ Васіль Ігнатавіч, н. ў 1923, закатаваны.

ШЫРОКІ Захар Васілевіч, н. ў 1910, працаваў сталяром, закатаваны.

ШЫРОКІ Сямён Пятровіч, н. ў 1926, закатаваны.

ШЭБРУК Аляксандр, н. ў 1900, механік, закатаваны.

ЮШКЕВІЧ Васіль Ігнатавіч, н. ў 1904, закатаваны.

ВЁСКА НАВІКІ

ШАЎЦОЎ Мікалай Канстанцінавіч, н. ў 1927, закатаваны.

ШАЎЦОЎ Сяргей Андрэевіч, н. ў 1891, закатаваны.

ВЁСКА ПОСТРАШ

КАПУСЦІН Мікалай Якаўлевіч, н. ў 1922, загінуў у канцлагеры.

ЦЭДЗІК Аляксей Савельевіч, н. ў 1913, працаваў у калгасе, загінуў у 1944 у канцлагеры.

ВЁСКА ПРАГРЭС

КАПУСЦІН Іван Фёдаравіч, расстраляны.

КАПУСЦІНА Варвара Іосіфаўна, расстраляна.

СТАНЦЫЯ ЦЯЛУША

ЗАЙЦАЎ Міходзя Лаўрэнцьевіч, расстраляны.

ХАРАНЕКА Пётр Васілевіч, расстраляны.

ВЁСКА ЮР'ЕВА

АРЭШКА Васіль Сямёнавіч, н. ў 1905, закатаваны.

АРЭШКА Уладзімір Іванавіч, н. ў 1907, закатаваны.

БАЛЫК Міхаіл Ал., н. ў 1885, закатаваны.

ВАРАБ'ЁВА Марыя Ст., н. ў 1911, закатавана.

МЕЛЬНІК Іван Якаўлевіч, н. ў 1914, закатаваны.

ЧЫСЛОЎ Міхаіл Конанавіч, н. ў 1914, закатаваны.

ОСАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БАРАНАВІЧЫ

КОСАЎ Сямён, расстраляны фашыстамі.

ВЁСКА ДОЙНІЧАВА

БАРАДАЎКА Тамара Фёдараўна, н. ў 1926, вучаніца, закатавана.

БАРАДАЎКА Фёдар Данілавіч, н. ў 1887, закатаваны разам з дачкой.

КОМЫШ (КНЫШ) Міхаіл Васілевіч, н. ў 1910, працаваў у калгасе, закатаваны.

СТРАЛЬЧЭНЯ Марыя Данілаўна, н. ў 1927, вучаніца, загінула 4.4.1944 у фашысцкім канцлагеры, пахавана ў г. Ульм, Германія.

ВЁСКА ЗАБУДЗЬКІ

БАРАДАЎКА Надзея А., н. ў 1890, працавала ў калгасе, закатавана.

ВАСІЛЕЎСКІ Фёдар Васілевіч, н. ў 1920, павешаны карнікамі ў 1943 у г. Старыя Дарогі.

ВЁСКА НАВАСЁЛКІ

ЮШКЕВІЧ Іван Антонавіч, н. ў 1902, загінуў у 1942 у час блакады.

ЮШКЕВІЧ Сцяпан Антонавіч, н. ў 1900, загінуў у 1942 у час блакады.

ВЁСКА ПАКРОЎКА

ДРОБЫШ Гэля Іосіфаўна, н. ў 1914, працавала ў калгасе, закатавана ў 1941.

ЛАБАЦКАЯ Клаўдзія Данілаўна, н. ў 1909, працавала ў калгасе, закатавана.

ТОЎСЦІК Вольга Мікалаеўна, н. ў 1911, працавала ў калгасе, закатавана.

СЛАБОДКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ДУБРОВА

БУЗАК Цярэнцій Апанасавіч, н. ў 1899, закатаваны.

ВЁСКА КАМЕНКА

БЕЛЬСКІ Анатоль Мацвеевіч, н. ў 1929, вучань, расстраляны ў кастрычніку 1943 у лесе.

ВЕРАМЕЙЧЫК Аркадзь Апанасавіч, н. ў 1924, вывезены на прымусовыя работы ў Германію, загінуў у 1943 у канцлагеры.

ВОЙНІЧ Алена К., н. ў 1906, закатавана.

ГУШЧЫН Сямён Сільвестравіч, н. ў 1912, працаваў старшынёй калгаса, закатаваны ў жніўні 1941.

ДЗЫГУН Міхаіл Мікітавіч, н. ў 1894, забіты ў 1942.

ДРАЖЫНА Таццяна Максімаўна, н. ў 1925, вывезена на прымусовыя работы ў Германію, загінула ў 1945 у лагеры.

ЕСАЎЛЕНКА Іван, н. ў 1910, закатаваны ў 1942.

ЖАРСКІ Вінцэсь Іванавіч, н. ў 1924, закатаваны ў жніўні 1941.

ЛІПНІЦКІ Валянцін Пятровіч, н. ў 1928, вучань, расстраляны ў лесе.

МУХІН Іван Яфімавіч, н. ў 1927, вучань, вывезены ў Германію, прапаў без вестак.

ПЫЖ Міхаіл Рыгоравіч, н. ў 1928, вучань, расстраляны ў кастрычніку 1943 у лесе.

РАСОХА Аляксей Д., н. ў 1914, закатаваны.

САЛАВЕЙ Аляксей Г., н. ў 1907, закатаваны.

САЛАВЕЙ Мікалай Іванавіч, н. ў 1889, закатаваны.

ШАНТАР Аляксей Ф., н. ў 1910, закатаваны.

ВЁСКА СЛАБОДКА

На паўночна-заходняй ускраіне вёскі, каля дома-інтэрната, — магіла ахвяр фашызму. У лістападзе 1941 г. фашысцкія акупанты прывезлі з Бабруйска ў ваколіцу вёскі Слабодка больш за 10 тысяч савецкіх ваеннапалонных і мірных грамадзян, сярод якіх былі старыя, жанчыны і дзеці, і расстралялі іх. Каб замесці сляды злачынства, фашысцкія каты перад адступленнем сваіх войск у 1944 г. адкапалі і спалілі трупы загубленых людзей. У 1975 г. на магіле пастаўлены абеліск.

СЫЧКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БАРБАРОВА

ГУРСКІ Віктар Іосіфавіч, н. ў 1910, у 1942 прымусова вывезены ў Германію. Далейшы лёс невядомы.

ВЁСКА БАЯРЫ

КАЗІМІРОВІЧ Іван Якаўлевіч, н. ў 1926, закатаваны ў 1944 у канцлагеры «Маўтхаўзен».

КАЗІМІРОВІЧ Міхаіл Паўлавіч, н. ў 1926, закатаваны ў 1944 у канцлагеры «Маўтхаўзен».

ВЁСКА ВАЎЧАНКА

ЛІТВІНКА Варвара Сцяпанаўна, расстраляна, пахавана ў в. Ваўчанка.

ЛІТВІНКА Надзея Цімафееўна, расстраляна, пахавана ў в. Ваўчанка.

ВЁСКА ВІНАГРАДАЎКА

МАЛАХАЎ Уладзімір Рыгоравіч, расстраляны.

ВЁСКА КРАСНАЯ

КОЛАС Андрэй Несцеравіч, вывезены на прымусовыя работы ў Германію.

КОЛАС Сямён Несцеравіч, вывезены на прымусовыя работы ў Германію.

РАМАНЬКО Сцяпан Рыгоравіч, вывезены на прымусовыя работы ў Германію.

ПАСЁЛАК ЛЕНІНА

ДРОЗД Рыгор Сямёнавіч, расстраляны, пахаваны на тэрыторыі саўгаса імя Леніна.

ВЁСКА МІРАЦІНА

САХОН Міхаіл Лааравіч, расстраляны, пахаваны ў в. Міраціна.

УСАВА Вольга Пятроўна, расстраляна, пахавана ў в. Міраціна.

УСАЎ Пётр Міхайлавіч, расстраляны, пахаваны ў в. Міраціна.

ВЁСКА РАКСАЛЯНКА

ПЫЖ Максім Самуілавіч, расстраляны, пахаваны ў в. Міраціна.

ВЁСКА САЛОМЕНКА

ДЗЫГУН Радаівон Сямёнавіч, вывезены на прымусовыя работы ў Германію, прапаў без вестак.

ДЗЯЦЕЛ Алена Мікітаўна, вывезена на прымусовыя работы ў Германію, прапала без вестак.

ДЗЯЦЕЛ Пракоп Сцяпанавіч, вывезены на прымусовыя работы ў Германію, прапаў без вестак.

ДЗЯЦЕЛ Таццяна Куьмінічна, н. ў 1920, вывезена на прымусовыя работы ў Германію, прапала без вестак.

ДЗЯЦЕЛ Фрыдрых Андрэевіч, н. ў 1919, вывезены на прымусовыя работы ў Германію, прапаў без вестак.

КАЗУСЁНАК Надаея Сафонаўна, н. ў 1920, вывезена на прымусовыя работы ў Германію, прапала без вестак.

КАЗУСЁНАК Пётр Яфімавіч, н. ў 1905, вывезены на прымусовыя работы ў Германію, прапаў без вестак.

КОЛАС Настасся Дамітрыеўна, н. ў 1900, вывезена на прымусовыя работы ў Германію, прапала без вестак.

КОЛАС Дамітрый Марцінавіч, н. ў 1901, вывезены на прымусовыя работы ў Германію, прапаў без вестак.

КОЛАС Хрысціна Цярэнцьеўна, н. ў 1902, вывезена на прымусовыя работы ў Германію, прапала без вестак.

МАКАРЧАНКА Вера Яфімаўна, н. ў 1929, расстраляна ў чэрвені 1944, пахавана ў в. Саломенка.

МАКАРЧАНКА Іван Андрэевіч, вывезены на прымусовыя работы ў Германію, прапаў без вестак.

МАКАРЧАНКА Іван Раманавіч, н. ў 1929, расстраляны ў чэрвені 1944, пахаваны ў в. Саломенка.

МАКАРЧАНКА Марыя Фёдараўна, вывезена на прымусовыя работы ў Германію, прапала без вестак.

МАКАРЧАНКА Пётр Барысавіч, н. ў 1904, вывезены на прымусовыя работы ў Германію, прапаў без вестак.

МАКАРЧАНКА Піліп Несцеравіч, н. ў 1904, вывезены на прымусовыя работы ў Германію, прапаў без вестак.

МАКАРЧАНКА Софія Іванаўна, н. ў 1927, вывезена на прымусовыя работы ў Германію, прапала без вестак.

МАКАРЧАНКА Яфім Несцеравіч, н. ў 1901, расстраляны ў чэрвені 1944, пахаваны ў в. Саломенка.

ВЁСКА САСНОВАЯ

ЛАДОНЬКА Емяльян Іванавіч, расстраляны, пахаваны ў в. Сасновая.

ЛАДОНЬКА Іван Саўкавіч, расстраляны, пахаваны ў в. Сасновая.

ПЫЖ Настасся Васілеўна, расстраляна, пахавана ў в. Міраціна.

ВЁСКА СЫЧКАВА 2-е

АЛІШКЕВІЧ Міхаіл Васілевіч, расстраляны, пахаваны ў в. Сычкава.

АЛІШКЕВІЧ Сямён Цярэнцьевіч, расстраляны, пахаваны ў в. Сычкава.

ГРЫНЯК Рыгор Анісімавіч, расстраляны, пахаваны ў в. Сычкава.

КУРМАЗ Антон Пятровіч, расстраляны, пахаваны ў в. Сычкава.

КУРМАЗ Пётр Антонавіч, расстраляны, пахаваны ў в. Сычкава.

ШАВЕЛЬ Мікалай Цярэнцьевіч, расстраляны, пахаваны ў Бабруйску.

ВЁСКА ТАПАРКІ

КАПЧАН Павел Лявонцьевіч, расстраляны, пахаваны ў в. Тапаркі.

НАВІЦКІ Іван Міхайлавіч, расстраляны, пахаваны ў в. Тапаркі.

ЮРКАВЕЦ Арсеній Міхайлавіч, расстраляны, пахаваны ў в. Тапаркі.

ВЁСКА ЯЛОВІКІ

СЯЎРУК Рыгор Іванавіч, расстраляны ў чэрвені 1941.

ХІМОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БАБІНА

ЛЁГКАЯ Настасся Рыгораўна, н. ў 1905, спалена пад Мінскам у час акупацыі.

ЛІНКЕВІЧ Максім Рыгоравіч, расстраляны ў 1943, пахаваны ў Бабруйску.

ЛІНКЕВІЧ Пелагея Несцераўна, расстраляна.

ВЁСКА ГАРОХАВА

ЛЁГКІ Васіль Максімавіч, н. ў 1907, спалены ў в. Сычкава.

ВЁСКА НОВАЯ ШАРАЁЎШЧЫНА

БОГДАН Макар Іванавіч. н. ў 1905, закатаваны.

ВЁСКА СТАРАЯ ШАРАЁЎШЧЫНА

БЯРНАЦКАЯ Лізавета Васілеўна, закатавана.

БЯРНАЦКІ Аляксей Уласавіч, закатаваны.

СЕМЯНЧУК Варвара Сцяпанаўна, н. ў 1899, закатавана.

ШЧЫГЕЛЬСКІ Мікалай Ціханавіч, закатаваны.

ВЁСКА ЯСНЫ ЛЕС

ЕРМАЛАЕЎ Уладзімір Фёдаравіч, н. ў 1926, закатаваны.

КУРСАНАЎ Павел, н. ў 1902, закатаваны.

НЯМЧАЕЎ Карл Сямёнавіч, н. ў 1890, закатаваны.

ПЯСЕНКА Рыгор Андрэевіч, н. ў 1898, працаваў настаўнікам, закатаваны.

ШЫЧКО Георгій Сяргеевіч, н. ў 1924, закатаваны.

ШЫЧКО Клара Сяргееўна, н. ў 1926, закатавана.

ШЫЧКО Наталля Мікітаўна, н. ў 1898, працавала настаўніцай, закатавана.

ШЫЧКО Сяргей Сямёнавіч, н. ў 1895, працаваў настаўнікам, закатаваны.

ЦЯЛУШСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ДУБАЎКА

КРЫЧКО Ціт Іванавіч, н. ў 1916, працаваў у калгасе, закатаваны.

ПАСЁЛАК ПРАЛЕТАРСКІ

ПУХАЛЬСКІ Аляксандр Данілавіч, расстраляны.

РАЖКЕВІЧ Іван Мікалаевіч, забіты фашыстамі ў 1941.

ВЁСКА СТУПЕНІ

ХАРАНЕКА Рыгор Якаўлевіч, н. ў 1924, расстраляны.

ВЁСКА ЦЯЛУША

БАЛЫКА Мікалай Васілевіч, н. ў 1911, расстраляны ў сакавіку 1945.

ГАЦКО Мікалай Сцяпанавіч, расстраляны ў чэрвені 1941.

Падрыхтавала З.А.Валеева.

1945

ДА НАШЫХ ДЗЁН

ПАД МІРНЫМ НЕБАМ

У першыя дні вызвалення цяжка было паверыць, што над шматпакутнай бабруйскай зямлёй зноў мірнае неба з мілагучнымі пералівамі жаўрукоў. На сэрцы было і радасна і балюча. Радавала, што нарэшце скончылася акупацыя, але адольвала роспач ад таго, што бачылі вочы. Навокал, дзе нядаўна бушавала вогненная стыхія «бабруйскага катла», ляжалі трупы гітлераўскіх салдат, грувасціліся скопішчы разбітай ваеннай тэхнікі. Загоны збажыны і сенажаці былі ўздыблены ад разрываў снарадаў і бомбаў. На месцы вёсак — руіны і папялішчы.

Паводле ацэнак надзвычайнай Дзяржаўнай камісіі па ўстанаўленні расследаванняў злачынстваў нямецка-фашысцкіх акупантаў у раёне ў перыяд вайны было разбурана і спалена 520 жылых дамоў, 850 надворных пабудоў, знішчана 810 сельскагаспадарчых машын, 763 кані, 1176 кароў, 633 цяляці, 1371 свіння, 1497 авечак і коз, больш за 27 тысяч свойскіх птушак, 991 пчоласям'я. Агульныя страты ад 135 разбураных і разрабаваных калгасаў раёна перавысілі 616 мільёнаў руб. (у цэнах таго часу).

Як жыць? Што было рабіць у такіх умовах? Справа ўскладнялася яшчэ і тым, што на захадзе працягвалася вайна і туды, на фронт, вяскоўцы з гармонікам і надрыўным жаночым галашэннем праводзілі ўсіх, хто падпадаў пад мабілізацыю. Іх дужыя рукі і плечы так патрэбны былі тут, каб аднаўляць, будаваць і сеяць.

У вёсках засталіся пераважна жанчыны і дзеці, з мужчын — старыя і інваліды. Як ні цяжка, але трэба было з нечага пачынаць. Рашучыя захады ў аднаўленні жыццядзейнасці раёна рабіла дзяржава. Адразу ж пасля вызвалення ў раёне была адноўлена савецкая ўлада, створаны яе мясцовыя органы, якія неадкладна распачалі работу. Аднаўляліся калгасы і саўгасы, бо толькі разам, агульнымі намаганнямі можна было адолець разруху. Аднавіла дзейнасць Цялушская МТС — апора і надзея сялян. Самым надзённым на той час быў лозунг «З зямлянак — у новыя дамы!». Такія дамы дзяржава бясплатна будавала для сем'яў салдат і партызан, што загінулі ў барацьбе з гітлераўскімі акупантамі. Многім бясплатна выдзяляліся лес, жывёла, аказвалася матэрыяльная дапамога.

У калгасах і саўгасах не хапала сельскагаспадарчых машын, насення, жывёлы, нават элементарных прыладаў працы. Спадзяваліся на «жалезную сілу» МТС, якая хоць і атрымала тэхніку ад дзяржавы, але не столькі, каб ва ўсім дапамагчы вяскоўцам. Людзі збіралі запчасткі, рамантавалі старыя ржавыя машыны, нават даўно спісанае і выкінутае на звалкі лам'ё. Было цяжка, але ў сэрцы жыла надзея і вера на лепшае. Паўсюль кіпела сацыялістычнае спаборніцтва, у мясцовым друку, «маланках», «баявых лістках» услаўляліся перадавікі і наватары вытворчасці, друкаваліся патрыятычныя заклікі, звароты, пачыны.

Адзін з такіх зваротаў быў прыняты на агульным сходзе членаў сельгасарцелі «Зара рэвалюцыі» Кавалёўскага сельсавета ў падтрымку закліку хлебаробаў імя Калініна Васкрасенскага раёна Саратаўскай вобласці дастойна сустрэць 27-ю гадавіну Кастрычніка. Гэты дакумент не толькі даносіць да нас подых таго часу, а і на канкрэтных фактах адлюстроўвае справы ў калгасе. «Мы, — гаворыцца ў звароце, — паспяхова справіліся з сенаўборкай і нарыхтоўкай кармоў для жывёлы. Да 25 жніўня 1944 г. ўбралі і засціртавалі ўсе збожжавыя культуры з плошчы 345 га. Разам з уборкай мы разгарнулі малацьбу. Гэта дало нам магчымасць паспяхова справіцца з выкананнем плана збожжанарыхтовак. Да

30 жніўня наш калгас датэрмінова выканаў план дзяржпаставак па збожжавых культурах — 1250 пудоў. Мы вырашылі здаць у фонд Чырвонай Арміі 900 пудоў, з якіх ужо здадзена 350 пудоў. Наш калгас таксама паспяхова справіўся з сяўбой азімых, пры плане 80 га пасеяна 150 га.

Калгаснікі і калгасніцы з аднаўленнем нашай гаспадаркі дружна ўзяліся за работу. Гурыновіч Вера Рыгораўна, Кузьміна Клаўдзія, Алферчык Д. пры норме 0,30 га ўзорвалі па 0,40 га. Цэдзік Вольга Н., Оргіш Ганна Н., Уласава Ірына, Кандрашова Вера і Цэдзік Марыя пры норме 0,10 га ўручную зжалі па 0,20—0,25 га. Алферчык Оля, Оргіш Валя і Оргіш Ліда выкопвалі па 0,04—0,05 га бульбы пры норме 0,03 га. Дзяржаўны план здачы бульбы (3000 пудоў) мы выканалі да 1 кастрычніка і рашылі акрамя гэтага здаць у фонд Чырвонай Арміі 1500 пудоў бульбы.

Уключаючыся ў перадкастрычніцкае сацыялістычнае спаборніцтва і падтрымліваючы выдатны пачын калінінцаў, мы бяром на сябе наступныя абавязацельствы:

да 20 кастрычніка 1944 г. поўнасцю закончыць уборку бульбы з абавязковым пераворваннем бульбянога поля і падборкай бульбы;

здаць збожжа ў фонд умацавання магутнасці Чырвонай Арміі да 15 кастрычніка 1944 г., а бульбу — да 24 кастрычніка 1944 г.;

здаць з кожнага двара па 50 кг агародніны да 25 кастрычніка г.г.;

падрыхтаваць дастатковую колькасць кармоў для жывёлы.

Мы заклікаем калгаснікаў і калгасніц, усіх работнікаў сельскай гаспадаркі Бабруйскай вобласці падтрымаць пачын калінінцаў і выдатнымі поспехамі дастойна азнаменаваць наша вялікае свята — 27-ю гадавіну Кастрычніка...»

У гонар той жа гадавіны Кастрычніка Бабруйшчына рапартавала аб выдатнай працоўнай перамозе — будаўніцтве моста цераз Бярэзіну на 53 дні раней вызначанага тэрміну. Тады ж, у 1944 г., увесь раён горача падтрымаў заклік камсамольцаў Бабруйска сабраць сродкі на будаўніцтва танкавай калоны. Давалі хто колькі мог, але сабралі, бо ведалі: трэба хутчэй дабіць ворага, закрыць ваенны фронт, каб усе сілы і сродкі кінуць на фронт мірны. У верасні 1944 г. Вярхоўны Галоўнакамандуючы Маршал Савецкага Саюза І.В.Сталін прыслаў на імя сакратара Бабруйскага райкома партыі Касцевіча і старшыні райвыканкома Акуліча тэлеграму, у якой выказваў падзяку працоўным раёна за сабраныя сродкі. А неўзабаве ў раён прыйшла радасная вестка: Галоўнае ўпраўленне фарміравання і баявой падрыхтоўкі бранятанкавых і механізаваных войскаў паведамляла, што на сродкі жыхароў Бабруйшчыны пабудавана танкавая калона і накіравана часцям гвардыі генералмаёра танкавых войскаў М.Ф.Панова. «Баявыя танкі, — гаварылася ў заключэнне, — паспяхова б'юць ворага».

Доўгачаканая вестка аб перамозе над фашысцкай Германіяй ускалыхнула раён. Ва ўсіх гаспадарках прайшлі мітынгі. Вяскоўцы з яшчэ большым энтузіязмам узяліся за справы. Большасць з тых спраў і клопатаў сёння могуць паказацца радавымі і нават дробязнымі. Але на той час амаль усё пачыналася з дробязяў, і кожны, нават маленькі, крок наперад лічыўся важным. І пра гэта паведамлялася ў друку. Вось пра што пісала, напрыклад, абласная газета «Савецкая Радзіма» ў 1945 г.:

15 ліпеня.

Па 10 гектараў на касу

На левым беразе ракі Бярэзіна шырока раскінуўся луг калгаса імя Варашылава; колькі дзён запар тут працуе брыгада касцоў з 35 чалавек. Касцы тут уладкаваліся як дома: каля самай ракі, у прыбярэжных кустах, парабілі хаткі, якія прыдатныя для начлегу.

Нягледзячы на дрэнныя кліматычныя ўмовы, работа не спыняецца. Больш як 80 гектараў сенажаці ўжо скошана і на плошчы 20 гектараў застагавана.

Добрыя прыклады ў працы паказваюць пажылыя калгаснікі. 80-гадовы Міна Шынкаронак, 70-гадовы Іван Стэльмах штодзённа выкошваюць па 0,70—0,75 гектара. Вялікую дапамогу аказвае маладым касцам 60-гадовы калгаснік, былы партызан Тарас Лаўрыновіч. Ён кляпае косы, наладжвае іх.

На сенажаці ёсць кухня. Тры разы ў дзень касцы атрымоўваюць гарачае харчаванне. Хваляць касцы за добрае харчаванне повара Матрону Крычко.

Паміж звеннямі заключаны сацыялістычны дагавор. А старыя калгаснікі ўзялі абавязацельства скасіць па 10 гектараў сенажаці, каб атрымаць надбаўку за выдатную працу — па 10 працэнтаў ад скошанай травы для свайго асабістага карыстання.

Сяргей Ступень, брыгадзір калгаса імя Варашылава Цялушскага сельсавета.

На калгасных палях 16 ліпеня.

У сельгасарцелі імя Калініна Рымавецкага сельсавета Бабруйскага раёна разгарнулася акучванне бульбы. Штодзённа на работу вы-

ходзіць па 5 і больш пар коней. Толькі за апошнія дні апрацоўка праведзена на плошчы 12 гектараў.

У калгасе «2-я пяцігодка» Цялушскага сельсавета Бабруйскага раёна наладжаны добры догляд за агародам. Тут пасля першай праполкі прыступілі да другой. Побач з доглядам за агароднінай калгас ужо здаў дзяржаве 180 кілаграмаў салаты і 5 кілаграмаў укропу. Старанна працуе на доглядзе агарода звяно агароднікаў Крачко М.С., Крачко Х.Ф., Студзень, Дудаль і іншыя. Яны кожны дзень даюць паўтары—дзве нормы выпрацоўкі.

19 ліпеня.

Калгасны драматычны гурток

Пры калгасе імя Максіма Горкага Варатынскага сельсавета Бабруйскага раёна па ініцыятыве камсамольскай арганізацыі створаны калгасны драматычны гурток, які налічвае 8 чалавек. Гурток арганізаваў некалькі вечароў і паказаў п'есу «Начныя госці». Зараз гурткоўцы рыхтуюцца да выступленняў на калгасных палях у час уборкі ўраджаю.

2 жніўня.

Будаўнічая брыгада ў дні ўборкі

Калгаснікі сельгасарцелі «Трэці рашаючы» Кавалёўскага сельсавета Бабруйскага раёна задаволены поспехамі сваёй будаўнічай брыгады. За перыяд падрыхтоўкі да ўборкі ўраджаю брыгада прарабіла вялікую работу. 90-гадовы калгаснік Ермалай Пухальскі, калгаснікі Ілля Куксёнак і Гаўрыла Мельнічонак за невялікі адрэзак часу поўнасцю падрыхтавалі ўборачны інвентар. Яны зрабілі 70 грабель, адрамантавалі 12 павозак, выканалі шмат цяслярных работ.

Калгас «1-е Мая» рыхтуецца да вясенне-палявых работ. Студзень 1947 г. Вывазка торфу. Рамонт конных плугоў.

5 жніўня.

Здаюць дзяржаве свежу гародніну

Калгас «13 год Кастрычніка» Кавалёўскага сельсавета першым у Бабруйскім раёне прыступіў да здачы свежай гародніны. На ўчастак Белпрадгародніны калгаснікі адвезлі першыя 1000 кілаграмаў гуркоў, 1200 кілаграмаў морквы і больш як дзве тоны буракоў.

8 жніўня.

Дзе прачытаць газету?

Дрэнна наладжана палітмасавая работа сярод калгаснікаў у сельгасарцелі «За ўраджай» Рымавецкага сельсавета. Тут нават не праводзяцца чыткі газет. Атрымліваемыя калгасам газеты трапляюць на кватэры старшыні калгаса тав. Рассохі і членаў праўлення, якія выкарыстоўваюць іх для выклейкі сцен.

З вайны пакрысе вярталіся франтавікі-вызваліцелі. Але на падворках не сціхалі жаночыя галашэнні: надта многа нашых землякоў засталося на палях бітваў. На той час на кожную сотню жыхароў у раёне прыпадала каля 20 мужчын (з улікам інвалідаў, старых і падлеткаў). І гэта тады, калі аралі і сеялі пе-

Хлебны абоз калгаса імя Дзяржынскага. 1948 г.

раважна на конях і валах, а часам на каровах і на сабе. Вось што ў нашу кнігу «Памяць» паведаміў Б.Мураўскі з в. Такары, алісваючы фотаздымак, зроблены ў 1946 г.: «Нашага, асабліва юнага, чытача можа здзівіць, што сярод аратых адзін хлопец, астатнія — маладыя дзяўчаты. А менавіта так і было ў пасляваенны час. Мужчын у вёсках не хапала. Многія не вярнуліся з вайны альбо на ўсё жыццё засталіся інвалідамі. Таму ўсе работы даводзілася выконваць вось такім маладым людзям. Яны тады і аралі, і касілі, і ўраджай збіралі!..

Валы ў барознах часта ўпарціліся, не хацелі араць. Як правіла, яны лепш рухаліся, калі наперадзе ішла пара коней. Вядучым аратым якраз і быў дванаццацігадовы Анатоль Толак. Ён потым яшчэ доўгі час выконваў гэтую работу, не адну сотню гектараў узараў на замацаванай пары коней. Пазней набыў прафесію механізатара. Побач з Анатолем Міхайлавічам на здымку яго родная сястра Валянціна. Вясёлай, жыццярадаснай дзяўчынай была яна, хораша спявала, іграла на гармоніку. Дарэчы, і брат Анатоль таксама заўзяты гарманіст. Трэцяя злева — Зоя Мікалаеўна Толак (па мужу Васілеўская), чацвёртая — Яўгенія Іванаўна Шышкевіч (зараз Хроп), пятая — Соф'я Цімафееўна Казіміровіч (зараз Бабок). Усе яны доўга і сумленна працавалі на зямлі аж да выхаду на пенсію...

Застаецца дадаць, — піша далей Б.Мураўскі, — што за ўдарную працу гэтыя маладыя аратыя былі ўзнагароджаны падарункамі: Анатоль — кортавым касцюмам, а дзяўчаты — паркалем на сукенкі. Калі прыехаў фатограф, яны паспелі пашыць абноўкі і сфатаграфаваліся ў новым адзенні».

Вынікі ручной працы, нізкай агратэхнікі былі несуцяшальныя. У 1946 г. сярэдняя ўраджайнасць збожжа па раёне склала 5,1 ц, бульбы 61 ц, агародніны 85 ц; на 13 калгасаў і 3 саўгасы было 383 каровы.

І ўсё ж жыццё змянялася да лепшага. Найперш паслядоўна нарошчваліся тэмпы жыллёвага будаўніцтва. Тэма навасельляў, поспехаў будаўнікоў не сыходзіла са старонак мясцовых газет. Праз 7—10 гадоў пасля вайны лозунг «З зямлянак — у новыя дамы» быў зняты. Не ўсе, вядома, пераехалі ў новыя хаты (хто агораў пад жыллё лазню, хто перасыпаў хлявок), але, як гаворыцца, ва ўсіх быў дах над галавою.

Працавалі ўсе школы. Урокі праводзіліся ў няўтульных, неабсталяваных, а часам і ў прыстасаваных хатніх памяшканнях. Не хапала настаўнікаў, дапаможнікаў, пісьмовых прыладаў. Але ўсе дзеці вучыліся з марай аб будучыні. Адкрываліся бальніцы, амбулаторыі, фельчарска-акушэрскія пункты, ствараліся санітарныя дружыны. У культурным жыцці з-за недахопу сіл і сродкаў стаўка пакуль рабілася на хаты-чытальні, чырвоныя куткі, невялікія клубы, агітбрыгады, перасоўныя кінаўстаноўкі і бібліятэкі. І тут чым магла дапамагала дзяржава.

Пералом у развіцці калгасна-саўгаснай вытворчасці пачаўся з канца 1950-х гадоў. Пасля ліквідацыі МТС калгасы і саўгасы з дапамогай дзяржавы пачалі актыўна набываць тэхніку. У 1962 г. ў раёне было 13 калгасаў і 5 саўгасаў. У іх працавала 247 грузавых аўтамашын, 232 трактары, 61 збожжаўборачны камбайн, 34 сеялкі, 13 трактарных жняярак, 24 збожжа-ачышчальныя машыны, 34 бульбаўборачныя камбайны, 59 конных сенакасілак, 10 перасоўных зернесушылак. Налічвалася 270 шафёраў, 300 трактарыстаў, 80 камбайнераў, 35 машыністаў. Амаль усе населеныя пункты былі падключаны да рэспубліканскай электрасеткі. Усё гэта аблягчала працу хлебаробаў, спрыяла паляпшэнню аграа-





Калгас «Гігант» набірае сілы. Маладзёжнае звяно на праполцы кукурузы. Чэрвень 1955 г. Новыя жылыя дамы ў калгасе. 1967 г. Падрыхтоўка да падкормкі грэчкі з самалёта. Май 1968 г.

тэхнікі. Але ўраджаі заставаліся не надта высокімі. У сярэднім з кожнага гектара збіралі па 10 ц збожжа, 110 ц бульбы, 135 ц буракоў і па 300 ц зялёнай масы кукурузы з пачаткамі. Праўда, у калгасе імя Якрасава ўраджайнасць збожжавых была ў 2,5 раза вышэйшая.

Да гэтага рубяжу якрасаўцаў упарта ішлі ўсе бабруйскія хлебаробы: асвойвалі севазвароты, набывалі элітнае насенне новых сартоў, актыўна выкарыстоўвалі мінеральныя ўгнаенні, гербіцыды, пашыралі плошчы асушаных тарфянікаў, вапнавалі глебу, удасканальвалі арганізацыю працы. Хутка павялічваўся і машынна-трактарны парк гаспадарак. У калгасах «Гігант», імя Дзяржынскага, імя Фрунзе і некаторых іншых было больш за сотню розных машын і агрэгатаў. Па тэхнічнай аснашчанасці кожны такі калгас пераўзыходзіў былую МТС. Да таго ж у гаспадарках пачалося будаўніцтва машынных двароў з майстэрнямі і гаражамі, сучасных зернеачышчальных комплексаў.

Амаль поўнасцю былі механізаваны вытворчыя працэсы ў паляводстве, павысілася якасць апрацоўкі глебы, яе ўрадлівасць. Першымі да 30-цэнтнернага рубяжа па зборы збожжа з гектара блізка падступіліся хлебаробы калгаса імя XXII з'езда КПСС: у 1974 г. яны сабралі па 28 ц з гектара. Ужо праз пяць гадоў ураджай 30 ц з гектара стаў сярэднім па раёне; у 1985 г. ў калгасе імя Дзяржынскага было атрымана па 42 ц збожжа з

гектара. Гэта быў адзін з рэкордных паказчыкаў ва ўсёй рэспубліцы.

Не менш складаны шлях аднаўлення і развіцця прайшла жывёлагадоўчая галіна. У першыя пасляваенныя гады пра фермы ў поўным значэнні слова размовы не было: часцей гэта былі невялікія катухі з засіллем ручной працы пры газавых ліхтарах. Але і тут хоць і павольна, але ўпэўнена адбываліся перамены да лепшага. З 1946 па 1950 г. колькасць буйной рагатай жывёлы ў раёне павялічылася ў 4,1 раза, істотна ўзраслі надоі малака.

Найбольш хутка развівалася свінагадоўля. Рабочыя саўгаса «Бабруйскі» выступілі з пачынам «За інтэнсіўны адкорм свіней». Сутачнае прыбаўленне ў вазе адкормачнікаў тут дасягнула 550 г. Не адставаў і калгас «Гігант», які паспяхова выконваў і перавыконваў планы нарыхтовак мяса. Да таго ж у гэтым калгасе ў 1962 г. ўзяліся за развядзенне авечак і даказалі, што і гэта галіна можа быць высокапрыбытковай ва ўмовах Бабруйшчыны.

Будаўніцтва механізаваных ферм і жывёлагадоўчых комплексаў, развядзенне высокапароднай жывёлы і ўкараненне сучасных тэхналогій яе ўтрымання вывелі гэту галіну на новы ўзровень развіцця. Так, калі ў 1965 г. самы высокі рубеж па надоях, узяты Н.А.Голуб з калгаса «Гігант» і К.М.Глінскай з калгаса імя XXII з'езда КПСС, складаў 2563 кг, то ў 1982 г. Т.Балыка з калгаса «Гігант» атрымала па 3183 кг малака ад каровы. А ў 1985 г. В.Бажэнава з калгаса імя Дзяржынскага ўстанавіла новы рэкорд — 4462 кг малака ад каровы. Рэальна ставілася задача: 4-тысячны рубеж зрабіць сярэднім паказчыкам па раёне.

У эканамічным развіцці раён стабільна выйшаў у лік перадавых у Магілёўскай вобласці і рэспублікі, шматразова прызнаваўся пераможцам у абласным, рэспубліканскім і ўсесаюзным спаборніцтвах. Перадавікі вытворчасці збіралі шчодрыя ўраджаі ўрадавых узнагарод і літаральна «акупіравалі» Выстаўку дасягненняў народнай гаспадаркі СССР. Даярка А.Р.Сакун і цялятніца Л.П.Цэд удастоены высокага звання Героя Сацыялістычнай Працы. А ў 1983 г. за перамогу ва Усесаюзным сацыялістычным спаборніцтве ордэна Чырвонага Працоўнага Сцяга ўдастоены калгас імя Дзяржынскага. У 1985 г. ў гэтай гаспадарцы атрымана па 37,7 ц збожжа, па 269 ц бульбы, па 334 ц мяса (у жывой вазе) на 100 га сельгасугоддзяў, надоена па 2820 кг малака ад каровы. Трывалая матэрыяльна-тэхнічная база і наяўнасць кваліфікаваных кадраў давалі ўпэўненасць, што высокія ру-

Збожжаток калгаса імя А.Неўскага.

Жывёлагадоўчая ферма ў саўгасе імя Леніна.

бяжы дзяржынцаў ужо ў бліжэйшай перспектыве стануць пасільнымі для ўсіх гаспадарак Бабруйшчыны.

З умацаваннем эканомікі паспяхова вырашаліся і сацыяльныя праблемы. Будаваліся новыя вуліцы з дамамі катэджнага тыпу, палацы культуры, бальніцы, школы, дзіцячыя дашкольныя ўстановы, бібліятэкі. Даволі важкім стаў заробак вяскоўцаў, у іх дамы прыйшоў дастатак. Словам, раён цвёрда і ўпэўнена трымаў курс у заўтрашні дзень. Больш падрабязна гл. ў наступным артыкуле, а таксама ў раздзеле «З матэрыяльнай і духоўнай спадчыны». *А.М.Нянадавец.*

Бабруйшчына сучасная

Прадстаўляе старшыня Бабруйскага раённага выканаўчага камітэта А.Ц.Глаз.

ГЛАЗ Анатоль Ціханавіч, нарадзіўся 8.11.1951 г. ў в. Калацічы Глускага раёна. Скончыў Белсельгасакадэмію (1974), дзе быў ленінскім стыпендыятам. Працоўную дзейнасць пачаў галоўным аграномам калгаса. Быў другім, першым сакратаром Глускага РК ЛКСМБ, з 1978 г. другі, з 1980 г. першы сакратар Магілёўскага абкома камсамола. У 1984—1987 гг. старшыня Бабруйскага райвыканкома, у 1987—1991 гг. першы сакратар Бялыніцкага РК КПБ. З 1991 г. намеснік дырэктара народнага аб'яднання «Бабруйскмэбля». З 1995 г. старшыня Бабруйскага раённага выканаўчага камітэта.

А.Ц.Глаз.

Перабудова, гаворачы мовай вайскоўцаў, застала нас на маршы. То быў мэтанакіраваны і ўпэўнены марш да новых вышынь у сацыяльна-эканамічным развіцці раёна ў чарговай (і апошняй у СССР) пяцігодцы. Былі ўсе падставы разлічваць на поспех, на тое, што раён яшчэ больш трывала замацуецца ў ліку перадавых не толькі на Магілёўшчыне, а і ў рэспубліцы.

Цяжка паверыць, што перабудова, якая паводле задумкі павінна была паскорыць рух наперад, фактычна затармазіла яго, адкінула нашу эканоміку назад. Але страты маглі быць куды большыя, калі б мы паддаліся на заклікі ламаць усё набытае і апірацца толькі на прыватную ўласнасць. На прыкладзе свайго раёна, асабліва нашых перадавых гаспадарак, мы бачылі вялікі патэнцыял у калектыўным гаспадаранні. Бачылі гэта і самі вяскоўцы, якія ў пераважнай большасці патрабавалі захаваць калгасы і саўгасы.

Зразумела, старую сістэму трэба было пэўным чынам рэфармаваць, прыстасоўваць да рыначнай эканомікі. У вырашэнні гэтага складанага пытання стаўку зрабілі на дэмакратычны прынцып — няхай самі людзі вырашаюць, што рабіць: хочуць, няхай, як і раней, працуюць у сваім калгасе ці саўгасе або рэфармуюць іх у акцыянерныя таварыствы, аграфірмы і інш. А хто хоча гаспадарыць самастойна, няхай набывае зямлю, стварае фермерскую гаспадарку. Толькі пры адной для ўсіх умове: зямля павінна выкарыстоўвацца з высокай эфектыўнасцю.

На жаль, у гэтай новай справе не абышлося без промахаў. Але ёсць падставы сцвярджаць, што мы выстаялі, стварылі падмурак шматукладнай эканомікі. У нас дзейнічаюць 19 калгасаў і саўгасаў, аграгандлёвая фірма «Бярэзіна», птушкафабрыка, 21 фермерская гаспадарка, а ў прамысловасці — акцыянернае таварыства «Шкло-Глуша», торфапрадпрыемства «Рэдкі Рог», доследны лясгас, дрэваапрацоўчы камбінат Белкаапсаюза, камбінат кааператыўнай прамысловасці, завод жалезабетонных вырабаў. Розныя формы ўласнасці прыжыліся і ў іншых галінах эканомікі, у тым ліку ў сферы паслуг.

Калі гаварыць аб выніках гаспадарчай дзейнасці, то да паказачыкаў 1990 і 1991 гадоў нам, безумоўна, яшчэ далекавата. Але падзенне вытворчасці спынена, намецілася тэндэнцыя яе стабілізацыі.

У 1997 г. пасяўныя плошчы ва ўсіх катэгорыях гаспадарак раёна склалі 47,9 тыс. га, у тым ліку 39,3 тыс. га ў калгасах і саўгасах. Спасылацца на дрэннае надвор'е мы не прывыклі, але гэты год быў для нас сапраўды складаны: спачатку над раёнам пранёсся

спусташальны буран, а затым пайшлі праліўныя дажджы. І ў гэтых умовах мы сабралі па 26,1 ц збожжа з кожнага гектара. Для Бабруйшчыны гэта мала! Але ў нас ёсць добры прыклад: у калгасе «Гігант» гэты паказчык склаў 45,3 ц, у калгасе імя Някрасава — 33,7 ц, у калгасе імя Пушкіна — 32 ц з гектара. Ставім задачу, каб у бліжэйшыя гады ўраджайнасць 35—40 ц з гектара стала сярэдняй па раёне. Валавы збор збожжа склаў 50 896 т, што на 10% больш, чым у 1995 г. І гэта дасягнута не за кошт павелічэння пасяўных плошчаў, а за кошт павышэння ўраджайнасці на 3,5 ц з гектара.

Спынена скарачэнне пагалоўя жывёлы. На пачатак 1998 г. ў калгасах і саўгасах было 32 420 галоў буйной рагатай жывёлы (у тым ліку 11 485 кароў), 7479 свіней, 337 822 птушкі. Стабілізавалі сваю дзейнасць птушкафабрыка ў вёсцы Вішнёўка, жывёлагадоўчыя комплексы: свінагадоўчы на 12 тысяч галоў у калгасе імя Дзяржынскага, буйной рагатай жывёлы на 5800 галоў у калгасе імя А.Неўскага і комплекс на 2800 цялушак у саўгасе «Осава». Дзейнічаюць амаль усе жывёлагадоўчыя, а таксама зверагадоўчая фермы. Сярэдні надой малака ад каровы па раёне павялічыўся на 174 кг, а ўсяго яго атрымана 27 616 т, што на 7% больш, чым у 1996 г. Невялікі (2%) рост ёсць і ў прыбаўленні жывёлы ў вазе. За 1997 г. мы змаглі павялічыць продаж малака на 17%, а мяса на 10% і поўнасцю выканаць дзяржаўны заказ па рэалізацыі гэтых прадуктаў.

У раёне працуе 21 фермерская гаспадарка. Фермеры апрацоўваюць 507 га ворнай зямлі. У 1997 г. яны рэалізавалі 221 т збожжа, 70 т мяса (у жывой вазе). Мы не лічым, што менавіта фермеры накормяць краіну (пакуль што вырашальнае слова ў гэтым за калгасамі і саўгасамі). Але фермеры ўносяць важкі ўклад у вырашэнне харчовай праблемы, і мы ўсямерна іх падтрымліваем, дапамагаем. Сярод іх найперш трэба адзначыць А.В.Занкевіча (в. Осава), М.А.Бялько (в. Брожа), В.П.Каваленку (в. Сычкава), Л.А.Піскуна (в. Осава), якія займаюцца вырошчваннем збожжа, бульбы, а таксама развядзеннем буйной рагатай жывёлы і свіней. Усе нашы фермеры вызначаюцца стараннасцю, кемлівасцю і заслугоўваюць шчырай удзячнасці.

Сярэдняя рэнтабельнасць вытворчасці прадукцыі раслінаводства і жывёлагадоўлі склала 11,3%, што дало магчымасць атрымаць 52 мільярды рублёў прыбытку. Найбольшыя сумы паступілі на рахункі калгасаў «Гігант» і імя Пушкіна, птушкафабрыкі і саўгаса «Кісялевічы».

Свінагадоўчы комплекс калгаса імя Дзяржынскага.



Спецыялізаваная ферма па адкорме буйной рагатай жывёлы саўгаса «Дойнічава».

Зверагадоўчая ферма ў вёсцы Бабіна.

Сушка сена ў саўгасе «Осава».

Паўтараю, што ўсе гэтыя паказчыкі нас не задавальняюць, і мы разглядаем іх як пералом да лепшага, як пачатак эканамічнага росту. І робім для гэтага адпаведныя захады. Найперш мяняем структуру пасяўных плошчаў, аддаючы перавагу найбольш выгадным на гэты час культурам — пшаніцы і зернебабовым. Пры ўсіх цяжкасцях нам удалося захаваць плошчы пад бульбай і лёнам. Спадзяёмся, што гэтыя культуры ў хуткім часе стануць рыначнымі і высокадаходнымі.

Праўда, ёсць пэўныя цяжкасці з тэхнікай. Зараз у раёне 817 трактароў, 172 збожжаўборачныя камбайны, 531 грузавая аўтамашына. Многія машыны адслужылі свой тэрмін і патрабуюць замены. Зрабіць гэта не проста, але ж шукаем выйсце. Многія ўспомнілі пра коней. Зараз звычайны конь на ферме часам паспяхова робіць тое, што раней рабілі «Кіравец» ці «Беларусь». У асабістым карыстанні вяскоўцаў колькасць коней таксама хутка павялічваецца. На многіх падвор'ях ёсць і свае трактары.

Галоўную ўвагу звяртаем на падбор кадраў. Шукаем маладых людзей, здольных мысліць неардынарна, па-рыначнаму, прымаць абгрунтаваныя дзелавыя рашэнні. Вучым такіх людзей і ставім на адказныя ўчасткі вытворчасці.

Прынятыя намі меры па пераадоленні крызісу далі станоўчыя вынікі і ў прамысловасці, прадпрыемствы якой названы крыху раней. У асартыменце іх прадукцыі — шкляная, драўляная і палімерная тара, піламатэрыялы і жалезабетонныя вырабы, тарфяныя брыкеты, рыба вэнджаная і салёная, каўбасы і макарона, плодаагароднінныя кансервы. Пасля пэўнага спаду прамысловай вытворчасці зараз і ў гэтай галіне назіраецца ажыўленне. За 1997 г. выпуск зборнага жалезабетону павялічыўся на 13,8%, рыбных прадуктаў — на 34,5, піламатэрыялаў — на 42,5, тавараў народнага спажывання — на 5,4%, а макаронных вырабаў — у некалькі разоў.



Агульны выгляд акцыянернага таварыства «Шкло-Глуша».

Найбольш відавочныя перамены на былым шклозаводзе ў Глушы. Зараз гэта акцыянернае таварыства «Шкло-Глуша». І кіраўніцтва раёна, і самі акцыянеры актыўна шукалі інвестыцый для рэканструкцыі прадпрыемства, укаранення новых тэхналогій і павышэння канкурэнтаздольнасці прадукцыі. І ажыццявілі задуманае: за два гады тут ўстаноўлены тры новыя машына-лініі па вырабе новых відаў бутэлек, праведзены капітальны рамонт шкловарачнай печы. І вось вынік: упершыню вытворчасць бутэлек перавысіла 4 мільёны штук у месяц, павысілася якасць і на рынку, яны, як гаворыцца, нарасхват. А значыць, ёсць добрая перспектыва для нарошчвання вытворчасці і вырашэння сацыяльных праблем.

Сведчаннем ажыўлення ў эканоміцы з'яўляецца будаўніцтва. У раёне дзейнічае перасоўная механізаваная калона № 243 (падраздзяленне былога «Міжкалгасбуда»), якая ўзводзіць жыллё, аб'екты грамадскага, прамысловага, сельскагаспадарчага, сацыяльнага і культурна-бытавога прызначэння. Яна мае ўласную аўтабазу, растворабетонны вузел, дрэваапрацоўчую вытворчасць. У ПМК занята 220 чалавек.

ПМК-84 адкрытага акцыянернага таварыства «Магілёўвадбуд» праводзіць меліярацыю зямель, будуе аб'екты асушэння і арашэння з супрацьпажарнымі вадаёмамі. А дарожнае рамонтна-будаўнічае ўпраўленне № 171 ажыццяўляе догляд і рамонт аўтамабільных дарог (421 км), пракладвае новыя дарогі. Яно мае добрую вытворчую базу, тут працуюць 162 чалавекі. Значны аб'ём будаўнічых работ выконваюць ПМК аблсельгасхарчу і аблспажыўсаюза, а таксама мясцовыя брыгады.

Так што наперакор усім цяжкасцям мы будуемся. У 1997 г. здадзены ў эксплуатацыю 129 кватэр. Пабудаваны два сельскія клубы. Пачаў дзейнічаць завод па перапрацоўцы насення рапсу, які можа даваць да 40 т алею за змену. Адрамантавана 50 км дарог з цвёрдым пакрыццём. У калгас «Гігант» пракладзены 9,3 км газаправоду, многія хлебаробы гэтай



У рэнтгенаўскім кабінеце бальніцы ў вёсцы Цялуша.

гаспадаркі атрымалі блакітнае паліва. Усяго на будаўніцтве аб'ектаў жыллёвага і гаспадарчага прызначэння летась асвоена 66,8 мільярдаў рублёў.

У раёне працуюць 94 магазіны, 14 прадпрыемстваў драбнарознічнага гандлю і больш за 10 аб'ектаў грамадскага харчавання. Спажывецкая кааперацыя, як гаворыцца, павярнулася тварам да вяскоўцаў і паставіла на продаж шырокі асартымент тавараў. Нягледзячы на высокія цэны, попыт на прадукты і прамысловыя тавары паступова расце.

Дзейнічаюць таксама камбінат бытавога абслугоўвання, 8 комплексных прыёмных пунктаў, пральні ў вёсках Слабада і Міхалёва. У населеных пунктах 29 аддзяленняў сувязі, 5373 тэлефонныя апараты, у тым ліку 4321 у асабістым карыстанні. У сістэме аховы здароўя раёна 33 медыцынскія ўстановы, з іх 5 сельскіх участковых бальніц, 4 урачэбныя амбулаторыі. Да паслуг вяскоўцаў фізкультурна-аздараўленчы комплекс у Глушы, 16 спартыўных залаў, шмат спартыўных пляцовак. Штогод праводзяцца спартакіяды працоўных калектываў і калектываў навучальных устаноў. Шмат гадоў запар лепшым па фізічнай культуры прызнаецца калектыў акцыянернага таварыства «Шкло-Глуша». На абласных спаборніцтвах паспяхова выступаюць зборныя каманды раёна па валейболе, футболе, настольным тэнісе, шашках і шахматах. У в. Варатынь працуе клуб «Юны турыст».

Асаблівы наш клопат — выхаванне падрастаючага пакалення. У раёне 16 сярэдніх, 5 базавых і 6 пачатковых школ, 22 дашкольныя ўстановы, дапаможная школа-інтэрнат і вучэбна-вытворчы камбінат у Каменцы, Цэнтр пазашкольнай выхаваўчай работы, дзіцячая спартыўная школа і відэатэка. Тут працуюць 455 педагогаў, з іх 383 з вышэйшай адукацыяй. У 1996/97 навучальным годзе сярэднюю школу скончылі 139, а базавую 356 вучняў, 8 выпускнікоў атрымалі залатыя і 11 — сярэбраныя медалі. У 16 школах ёсць камп'ютэрныя класы. Каб заахвоціць і падтрымаць здольных дзяцей, па рашэнні выканкома лепшым навучэнцам школ, пераможцам алімпіяд выдаюцца грашовыя прэміі ў канцы кожнай чвэрці. Усё гэта значна ажывіла жыццё школьных калектываў. У Цэнтры пазашкольнай выхаваўчай работы працуе да 90 гурткоў мастацкай і тэхнічнай творчасці, у якіх займаецца больш за паўтары тысячы школьнікаў. А ў вучэбна-вытворчым камбінаце юнакі і дзяўчаты набываюць прафесіянальныя веды

Заняткі ў музычнай школе вёскі Туголіца.

Урок у адным з пачатковых класаў Хімоўскай сярэдняй школы.

і вопыт. Прыемна адзначыць, што каля 80% дзяцей-дашкольнікаў выхоўваюцца ў садах і яслях.

Клапоцімся і пра духоўнае развіццё. Да паслуг вяскоўцаў 35 клубаў, 33 бібліятэкі, 28 стацыянарных кінаўстановак. Шырокі размах атрымала мастацкая самадзейнасць, аж 9 калектываў удастоены звання народны. У Глушы створаны музей пад адкрытым небам і цэнтр мастацкіх рамёстваў, дзе групуюцца сілы нашых народных умельцаў. А ў Сычкаве дзейнічае раённы музей баявой і партызанскай славы, у якім сабрана багатая калекцыя археалагічных знаходак, дакументаў пра барацьбу бабруйскіх партызан і падпольшчыкаў, подзвіг воінаў Чырвонай Арміі ў час абароны і вызвалення раёна, працоўныя і творчыя здзяйсненні нашых землякоў. Больш падрабязна пра гэта распавядаецца ў артыкуле «Не гасне агонь продкаў».

Словам, чалавек працы застаецца ў цэнтры нашай ўвагі. Больш за 77% раённага бюджэту выдаткоўваецца на ўтрыманне ўстаноў сацыяльнай сферы. І ўсё ж многія сем'і пакуль яшчэ жывуць у цяжкіх умовах. Чым можам, стараемся ім дапамагчы. Але матэрыяльныя цяжкасці адмоўна ўплываюць на дэмаграфічную сітуацыю. На пачатак 1998 г. ў раёне (без Бабруйска) налічвалася 28 500 жыхароў — на 2700 менш, чым у 1990 г. За 1995—97 гады памерла 2138, а нарадзілася 608 чалавек, заключана 489 шлюбаў, афармлена 179 разводаў.

Сярод насельніцтва раёна пераважаюць беларусы (83,3%), жывуць рускія (14,2%), украінцы (1,5%), палякі (0,5%), яўрэі (0,5%), а таксама нешматлікія прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей. Сярод вернікаў больш праваслаўных хрысціян (цэрквы ў Цялушы, Глушы, Малых Бортніках). З даўніх часоў на тэрыторыі раёна жывуць стараверы, якія да нашых дзён захоўваюць свае звычаі і традыцыі (цэрквы ў Багушоўцы і Туркоўскай Слабадзе). Ёсць людзі каталіцкага і іншага веравызнання.

Як бачыце, жыццё, хоць і з цяжкасцямі, але рухаецца наперад. Галоўнае — ёсць аптымізм, надзея і вера ў тое, што, як спяваецца ў песні, усё «пераможым».

Крыніца нашага аптымізму — шчырыя, таленавітыя і працавітыя людзі. Мы ганарымся, што бабруйская зямля ўзгадавала выдатных пісьменнікаў, вучоных, дзеячаў культуры, военачальнікаў, патрыётаў, якія ў лічыну часіну, не шкадуючы жыцця, баранілі Айчыну ад чужаземных захопнікаў. Асаблівы наш гонар — людзі працоўнай доблесці, якія сваёй руплівасцю і стараннасцю ўзбагачаюць, пераўтвараюць і ўпрыгожваюць родны край. Нізкі ім паклон за гэта.

Людзі працоўнай доблесці

Героі Сацыялістычнай Працы: М.П.Кавалёў, А.Р.Сакун, В.М.Хурсан, Л.П.Цэд.

Перадавікі вытворчасці: **узнагароджаныя ордэнам Леніна** — М.Д.Архіпенка, А.П. Арэшка, Р.М.Вяроўкін, І.Р.Голуб, Н.А.Голуб, У.І.Грох, Л.М.Жлобіч, А.М.Зільбер-

ман, А.М.Казакова, У.С.Казінец, А.М.Капусціна, А.А.Кікець, Л.Ф.Косава, Л.Дз. Крычко, А.І.Кунец, А.Я.Мышкавец, М.І.Пічугова, Э.С.Пташкевіч, М.К.Стральцоў, І.П.Стэльмак, У.П.Тарасенка, І.Я.Тоўсцікаў, В.М.Трала, М.С.Харытонаў, А.А.Цэд, Е.Д.Чарнавусава, Т.Т.Шаўцоў, М.А.Шліхтаў, В.П.Юшкевіч; **узнагароджаныя ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі** — Л.С.Алесь, А.П.Алісеенка, А.П.Арэшка, І.У.Арэшка, В.М.Астапенка, Р.С.Вараб'ёў, В.К.Гайшун, Ф.М.Зіневіч, М.М.Іванова, А.І.Канунікаў, П.П.Лапухін, Н.С.Лось, П.М.Мухартаў, Л.М.Парахневіч, А.А.Сакун, Г.У.Самчык, В.Р.Сьцько, М.І.Шырокі; **узнагароджаныя ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга** — Я.Ф.Абрамовіч, У.В.Акуліч, А.А.Амега, М.Д.Архіпенка, С.І.Архіпенка, Дз.П.Арэшка, В.П.Астаповіч, У.А.Абрамчык, І.М.Бабкоў, Ф.Я.Бабкоў, В.Ф.Багачова, М.С.Баглай, Л.Я.Багрова, В.Р.Бажанава, М.І.Бажынскі, М.У.Баліджан, В.В.Баляснікаў, А.С.Бандарчук, В.І.Бандарчук, І.П.Баразна, Г.Ф.Баранаў, Г.М.Басчанка, В.А.Бегунова, В.Ф.Болбас, П.С.Бондар, І.В.Бубноў, А.І.Бычкоў, С.А.Бязручка, В.А. Вараб'ёва, Ф.М. Верамейчык, Т.Я.Верас, А.В.Вяроўкін, Р.М.Вяроўкін, В.К.Гайшун, Ц.М.Гайшун, С.Ц.Галавач, Л.П.Гарэлік, А.Р.Гацко, В.П.Герасімчук, Н.А.Голуб, І.М. Грыбоўскі, М.Ф.Гук, Б.А.Гуляеў, Р.А.Далжэўская, І.М.Данільчык, А.М.Данцэвіч, В.І.Дашкоўская, І.П.Дзейка, М.Г.Дзідоранка, С.А.Дубровін, М.К.Дударэнка, Р.С.Дэмбург, М.Р.Ермаленка, У.В.Ермаловіч, С.А. Жаўняровіч, А.П.Жданаў, В.А.Жалязноў, П.П.Зуб, Г.Р.Іванова, С.Ф.Іваноў, Я.А.Кавалеўская, Б.П.Кадуш, М.І.Казачэнка, У.С. Казінец, Н.М.Казлоўская, А.Я.Каліноўскі, Г.В.Караткевіч, Р.В.Карцаў, А.А.Кікець, М.П.Кірыленка, З.Ц.Кірэева, С.С.Кірэеў, І.У.Корбут, Т.Дз.Котава, Т.К.Котава, Л.Д. Крычко, М.А.Кулік, А.І.Кунец, М.Я.Курзянкоў, В.В.Лаўрыновіч, В.С.Леўчанка, Ф.П.Ліпаткін, Н.Ц. Ліцкевіч, Ф.В.Ліцкевіч, Р.А.Лось, І.А.Макаранка, І.К.Макаранка, М.П.Макарчанка, Г.М.Максімаў, Ф.Ц.Мальшаў, Л.А.Манько, Н.М.Манько, Л.М.Марчанка, А.А.Мачкова, Н.І.Мельнічонак, Р.М.Мельнічонак, Т.У.Мітэльман, П.В.Міхалевіч, С.Р.Мядзведзеў, Р.М.Найдун, П.З.Палякоў, Л.М.Парахневіч, П.М. Парахневіч, А.М.Паслядовіч, С.П.Пацэвіч, А.М.Пешка, Н.М.Пінчук, Л.К.Платонава, М.І.Пракопчык, В.А.Пуцікава, Т.Н.Раеўская, С.Р.Разенка, С.П.Райкевіч, В.П.Рудзько, А.А.Сакун, М.Б.Сакун, Ц.Т.Салановіч, М.М.Самончык, І.Л.Сарока, Н.І.Семянчук, Р.Г.Серкін, М.А.Сетун, М.М.Сімончык, М.А.Сінькевіч, П.І.Січкар, М.К.Стральцоў, М.Ф.Ступень, У.А.Ступень, Ф.Р.Ступень, А.М.Стэльмак, І.П.Стэльмак, М.Л.Тапаркоў, В.Р.Тоўсцік, М.А.Тоўсцік, А.С.Фафаленка, Л.І.Фісюк, А.С.Хараненка, М.С.Харытонаў, В.В.Хатулькоў, І.І.Худавец, М.Ц.Хурсан, А.Ц.Хурсанава, В.А.Царык, М.А.Цэд, Е.Д.Чарнавусава, Г.К.Шавялёў, Т.Т.Шаўцоў, В.В.Шах, А.Ф.Шкрадзюк, П.К.Шмыгун, Н.І.Шпак, Л.П.Шчарбакова, Р.Ц.Шчаўкун, В.П.Шырокая, Б.П.Юшкевіч, М.А.Юшкевіч, І.Ф.Яўстратчык, М.С.Яцэвіч, Л.П.Ячная; **узнагароджаны ордэнам Працоўнай Славы 1-й, 2-й і 3-й ступеней** — А.І.Парахневіч; **узнагароджаныя ордэнам Працоўнай Славы 2-й і 3-й ступеней** — А.Дз.Арцёменка, В.С.Варламаў, М.М.Дзмітракоў; **узнагароджаныя ордэнам Працоўнай Славы 3-й ступені** — М.П.Акуліч, Р.К.Алтынскі, А.С.Архіпенка, М.П.Арцёмкін, Л.В. Арэшка, К.В.Асіповіч, М.Ф.Аўрамчык, А.А. Бабкоў, У.А.Балаш, І.П.Баразна, Я.А.Вежнавец, Г.А.Верамейчык, П.Т.Гайшун, І.В.Галавацкі, М.К.Гарбанаў, Л.П.Гарэлік, Н.П. Гацко, А.Грыгаровіч, П.З.Ермаловіч, П.М. Іванова, М.М.Іваноў, А.І.Кавалёў, Дз.М. Казлоў, В.К.Казлоўскі, А.П.Капралаў, А.І.Капусцін, А.П.Крук, С.М.Крук, А.А. Крычко, Н.П.Кулік, І.Я.Кунец, У.І.Куцаеў, Е.Р.Лазоўская, А.І. Ласіцкі, Г.А.Лаўрыновіч, Б.П.Ліневіч, Н.М.Манько, В.М.Мельнічонак, Г.І.Міхлюк, І.П.Мурашоў, М.С.Мядзведзеў, У.А.Нікіфаравец, Л.А.Папова, Я.Н. Пархімчык, А.В.Пацэйчук, Л.Ф.Піскун, В.І.Пракопчык, І.Ф.Расоха, А.В.Роскач, П.І.Русакова, Ф.М.Русецкі, Ф.М.Русецкі, І.Б.Саламака, Г.А.Селівончык, Н.П. Смаршчок, В.А.Стэльмак, А.І.Ткач, Я.А.Туміловіч, Л.М.Фясько, І.А.Хурсан, Дз.І.Цэдзік, Ф.Ф. Шкрадзюк, В.А.Шнітка, І.І.Шыла, А.Г.Якубоўскі, А.І.Яўстратчык, У.М.Яўстратчык; **узнагароджаныя ордэнам «Знак Пашаны»** — В.Ф.Алейнічэнка, Л.С.Алесь, М.Я. Аляксеенкаў, А.А.Амега, М.Д.Архіпенка, М.С.Астроўскі, В.А.Бабкова, А.І.Бабкоў, В.Р.Балыка, С.А.Бязручка, І.П.Вараб'ёў, В.П.Вежнавец, П.Ф.Голуб, Я.В.Грыневіч, А.М.Данцэвіч, А.А.Ермалаеў, С.Л.Зуб, Г.Ф. Зубрыкава, Я.П.Кактыш, Я.П.Кот, З.С. Крывадуб, В.В.Лаўрыновіч, М.С.Лескавец, Н.М.Манько, М.І.Пракопчык, А.А. Прылуцкі, Л.А.Пуцікава, А.Ф.Рудзько, М.П.Русакоў, М.Б.Сакун, Г.У.Самчык, В.І.Сапега,

М.А.Сінькевіч, П.І.Січкар, І.С.Сцефановіч, М.Л.Тапаркоў, В.М.Тумашэнка, В.А.Федарака, В.Л.Хурсан, М.Ц.Хурсан, С.П.Хурсан, Л.І.Цікавы, Л.П.Цэд; **узнагароджаныя ордэнам Дружбы народаў** — М.П.Акуліч, У.В.Акуліч, С.А.Бязручка, Г.І.Ткач; **лаўрэаты Дзяржаўнай прэміі** — Р.М.Вяроўкін, І.П.Дзейка, Ю.М.Наскоўскі; **удастоеныя звання заслужаны** — П.Д.Адзінцоў, Н.В.Багамолава, П.І.Бандарчук, І.В.Барсукоў, А.М.Барысенка, А.І.Бычкоў, Т.М.Валадзько (Парахневіч), І.М.Валошын, М.М.Вараб'ёў, Ю.В.Васількова, Б.Т. Васкавец, А.М.Гарбачоў, Б.А.Гуляеў, В.І. Дашкоўская, Р.С.Дэмбург, Т.Л.Зуева, Я.П. Кабакоў, А.Я.Каліноўскі, М.А.Капусціна, М.Я.Курзянкоў, С.А.Лемяшонак (Шчэрба), М.С.Лескавец, Ф.Ц. Мальшаў, М.А.Мікульскі, У.А.Парахневіч, Г.Р.Саўчанка, Ф.Я.Таран, Н.П.Тоўсцік, В.І.Філіпенка, Л.П.Цэд, Ф.Н.Шараварaў, Я.К.Шчэрба, Г.К.Ярмоленка-Грачухіна.

Кароткія біяграфічныя звесткі асобна даюцца пра Герояў Сацыялістычнай Працы, лаўрэатаў Дзяржаўнай прэміі, заслужаных работнікаў Беларусі, а таксама пра перадавікоў вытворчасці, якія ўзнагароджаны ордэнам Леніна, ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі або не менш як двума іншымі ордэнамі.

Героі працоўнага фронту

КАВАЛЁЎ Мікалай Паўлавіч

Перадавік прамысловасці. Нарадзіўся 27.9.1921 г. ў в. Кавалі. З мая 1941 г. ў Чырвонай Арміі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1955 г. працаваў на чыгунцы, затым машыністам экскаватара на заводзе гумавых тэхнічных вырабаў. З 1960 г. — каландраважаты на гэтым жа заводзе. У 1966 г. за выкананне сямігадовага плана ўзнагароджаны ордэнам Леніна. У 1971 г. ўдастоены звання Героя Сацыялістычнай Працы. Жыве ў Бабруйску.

М.П.Кавалёў.

САКУН Аляксандра Рыгораўна

Перадавік сельскагаспадарчай вытворчасці. Нарадзілася 15.4.1932 г. ў в. Забалацце. З 1950 г. даярка калгаса «Перамога». Звання Героя Сацыялістычнай Працы ўдастоена ў 1958 г. за высокія надоі малака. Выбіралася дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. Узнагароджана таксама медалём «За доблесную працу» і сярэбраным медалём ВДНГ СССР. Жыве ў в. Забалацце.

А.Р.Сакун.

ХУРСАН Васіль Мікалаевіч

Перадавік прамысловасці. Нарадзіўся 21.8.1925 г. ў в. Малыя Бортнікі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1950 г. каваль кавальскага цэха на заводзе «Гомсельмаш». Звання Героя Сацыялістычнай Працы ўдастоены ў 1966 г. за паспяховае выкананне вытворчых планаў. Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. Узнагароджаны таксама ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі. Жыве ў Гомелі.

Л.П.Цэд.

ЦЭД Любоў Паўлаўна

Перадавік сельскагаспадарчай вытворчасці. Нарадзілася 14.2.1934 г. ў в. Малыя Бортнікі. З 1946 г. цялятніца калгаса «Гігант». Звання Героя Сацыялістычнай Працы ўдастоена за поспехі ў развіцці жывёлагадоўлі. Узнагароджана таксама ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны», двума сярэбранымі медалямі ВДНГ СССР. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі. Жыве ў в. Вялікія Бортнікі.

Перадавікі-ардэнаносцы

АКУЛІЧ Міхаіл Пятровіч, н. ў 1939 г. ў в. Іванаўка. Шафёр калгаса імя Някрасава. Узнагароджаны ордэнамі Працоўнай Славы 3-й ступені і Дружбы народаў.

АКУЛІЧ Уладзімір Васілевіч, н. ў 1942 г. ў в. Азёры. Звеннявы калгаса «Гігант». Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, Дружбы народаў, медалямі.

АЛЕСЬ Леанід Сямёнавіч, н. ў 1935 г. ў в. Сычкава. Трактарыст, звеннявы саўгаса імя Леніна, трактарыст АТФ «Бярэзіна». Узнагароджаны ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, «Знак Пашаны».

АЛІСЕЕНКА Аркадзь Пятровіч, н. ў 1939 г. ў в. Панкратавічы. Трактарыст калгаса «Сцяг камуны». Узнагароджаны ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі. Жыве ў в. Панкратавічы.

АМЕГА Анатоль Аляксандравіч, н. ў 1938 г. ў в. Цялуша. Настаўнік. Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны». Памёр у 1994 г.

АРХІПЕНКА Мікалай Данілавіч, н. ў 1932 г. ў в. Аўсімавічы. З 1950 г. трактарыст Цялушскай МТС, звеннявы калгаса імя Пушкіна. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны».

АРЦЁМЕНКА Аляксандр Дзмітрыевіч, н. ў 1947 г. ў в. Вялікія Бортнікі. Трактарыст калгаса «Гігант». Узнагароджаны ордэнамі Працоўнай Славы 2-й і 3-й ступеней.

АРЭШКА Аркадзь Піліпавіч, н. ў 1916 г. ў в. Узнога. Звеннявы калгаса імя Дзяржынскага. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Айчыннай вайны 1-й ступені. Памёр у 1997 г.

АРЭШКА Іван Уладзіміравіч, н. ў 1914 г. ў в. Іванаўка. Працаваў старшынёй калгасаў імя Мічурына, імя Някрасава. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі, двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга. Памёр у 1990 г.

АСТАПЕНКА Віктар Мікалаевіч, н. ў 1937 г. ў в. Ліскі Рэчыцкага раёна. У 1961—97 гг. трактарыст-бульдазерыст. Узнагароджаны ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі.

У.В.Акуліч.

Л.С.Алесь.

М.Д.Архіпенка.

А.П.Арэшка.

І.У.Арэшка.

В.М.Астапенка.

БАЛЯСНІКАЎ Віктар Віктаравіч, н. ў 1918 г. ў Бабруйску. Старшыня калгаса «Перамога». Удзельнік Вялікай Айчыннай вай-



Р.С.Вараб'ёў.



В.С.Варламаў.

Р.М.Вяроўкін.

В.К.Гайшун.

Л.П.Гарэлік.

Н.А.Голуб.

ны. Узнагароджаны двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга. Памёр у 1968 г.

БЯЗРУЧКА Сяргей Аляксандравіч, н. ў 1930 г. ў в. Ляды. З 1951 г. трактарыст саўгаса «Гарохаўскі». З 1990 г. на пенсіі. Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны», Дружбы народаў. Жыве ў в. Масты.

ВАРАБ'ЁЎ Рыгор Сцяпанавіч, н. ў 1928 г. ў в. Туркі. Трактарыст калгасаў «Усход», імя А.Неўскага. Узнагароджаны ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Працоўнага Чырвонага Сцяга. З 1968 г. на пенсіі.

ВАРЛАМАЎ Віталь Сцяпанавіч, н. ў 1954 г. ў в. Туркоўская Слабада. Трактарыст-машыніст калгаса «Прагрэс». Узнагароджаны ордэнамі Працоўнай Славы 2-й і 3-й ступеней. Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР.

ВЯРОЎКІН Рыгор Мікалаевіч, н. ў 1931 г. ў в. Чырвоная Дуброва. Працаваў механізатарам у Кавалёўскай МТС. У 1972 г. ўзначаліў механізаванае звяно па вырошчванні бульбы ў саўгасе імя А.Неўскага. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР (1980). Памёр у 1997 г.

ГАЙШУН Васіль Кірэевіч, н. ў 1928 г. ў в. Пятровічы. З 1945 г. брыгадзір калгаса імя Сталіна. Скончыў Мар'інагорскі сельскагаспадарчы тэхнікум (1965). Брыгадзір калгаса «Гарохаўскі». Узнагароджаны ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Працоўнага Чырвонага Сцяга. З 1988 г. на пенсіі.

ГАРЭЛІК Любоў Піліпаўна, н. ў 1933 г. ў в. Вялікія Бортнікі. Трактарыст калгаса «Гігант». Узнагароджана ордэнамі Працоўнай Славы 3-й ступені, Працоўнага Чырвонага Сцяга.

ГОЛУБ Ігнат Рыгоравіч, н. ў 1886 г. ў в. Вялікія Бортнікі. Брыгадзір садова-агароднай брыгады калгаса «Гігант». Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны ордэнам Леніна. Памёр у 1973 г.

ГОЛУБ Наталля Аляксандраўна, н. ў 1919 г. ў в. Вялікія Бортнікі. З 1929 г. палявод, з 1932 г. даярка калгаса «Гігант». Узнагароджана ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга.

ГРОХ Уладзімір Іванавіч, н. ў 1924 г. ў в. Калініна. Машыніст-кампрэсаршчык УМ-136 будтрэста № 13 г. Бабруйска. Узнагароджаны ордэнам Леніна. Памёр у 1977 г.

ДАНЦЭВІЧ Анатоль Мітрафанавіч, н. ў 1928 г. ў в. Бірча. Брыгадзір калгаса «Гігант». Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны».

ДЗЕЙКА Іван Пятровіч, н. ў 1951 г. ў в. Лысая Горка. Старшыня прафсаюзнага каміт-

У.І.Грох.

М.М.Дзмітракоў.

Л.М.Жлобіч.

Ф.М.Зіневіч.

тэта АТФ «Бярэзіна». Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, лаўрэат прэміі Савета Міністраў СССР (1968).

ДЗМІТРАКОЎ Мікалай Мяфодзьевіч, н. ў 1936 г. ў в. Слабада Хімоўскага с/с. Трактарыст калгаса «Шлях Леніна». Узнагароджаны ордэнамі Працоўнай Славы 2-й і 3-й ступеней.

ЖЛОБІЧ Леанід Міхайлавіч, н. ў 1928 г. ў в. Сімановічы Глускага раёна. Трактарыст машынна-дарожнай станцыі ў г. Бабруйску, з 1960 г. трактарыст саўгаса «Дойнічава». Узнагароджаны ордэнамі Леніна, «Знак Пашаны», медалямі.

ЗІЛЬБЕРМАН Арон Мордухавіч, н. ў 1914 г. Настаўнік Туркоўскай СШ. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны ордэнам Леніна.

ЗІНЕВІЧ Фёдар Максімавіч, н. ў 1923 г. ў в. Рагалі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1963 г. брыгадзір паляводчай брыгады саўгаса «Бабруйскі». Узнагароджаны ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі. Памёр у 1980 г.

ІВАНОВА Марыя Макараўна, н. ў 1925 г. ў в. Лекерта. Даярка калгаса імя XXII з'езда КПСС. Узнагароджана ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі.

КАЗАКОВА Аляксандра Макараўна, н. ў 1911 г. ў в. Вілін Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл. Даярка калгаса імя Сталіна. Узнагароджана ордэнам Леніна. Памерла ў 1994 г.

КАЗІНЕЦ Уладзімір Сідаравіч, н. ў 1941 г. ў в. Крупічы. Трактарыст, звеннявы калгаса імя Дзяржынскага. Узнагароджаны ордэнам Леніна, двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі.

М.М.Іванова.

А.М.Казакова.

А.М.Капусціна.

КАНУНІКАЎ Андрэй Ільіч, н. ў 1924 г. ў в. Вялічкава. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Трактарыст саўгаса «Шлях да камунізму». Узнагароджаны ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі.

КАПУСЦІНА Аляксандра Міхайлаўна, н. ў 1937 г. ў в. Прагрэс. З 1957 г. даярка

А.А.Кікець.

Л.Дз.Крычко.

А.І.Кунец.

П.П.Лапухін.

П.М.Мухартаў.

Ю.М.Наскоўскі.

калгаса імя А.Неўскага. Узнагароджана ордэнам Леніна. Жыве ў в. Прагрэс.

КІКЕЦЬ Андрэй Андрэевіч, н. ў 1937 г. ў в. Плёсы. З 1963 г. трактарыст Цітаўскага аддзялення «Сельгасхімія». Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі. Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР.

КОСАВА Любоў Фёдараўна, н. ў 1932 г. ў в. Гарбацэвічы. Рахункавод калгаса імя Леніна, з 1959 г. свінарка саўгаса «Бабруйскі». Узнагароджана ордэнам Леніна.

КРЫЧКО Любоў Даніса ўна, н. ў 1928 г. ў в. Іванаўка. З 1946 г. свінарка, з 1952 г. даярка, з 1964 г. цялятніца калгаса імя Някрасава. Узнагароджана ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі.

КУНЕЦ Аляксандр Іванавіч, н. ў 1935 г. ў в. Забудзькі. З 1959 г. трактарыст саўгаса «Дойнічава». Узнагароджаны ордэнам Леніна, двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга. Выдатнік сельскай гаспадаркі.

ЛАПУХІН Павел Пятровіч, н. ў 1938 г. ў в. Капусціна Кіраўскага раёна. Скончыў Беларускую сельгасакадэмію (1965). Кіраўнік комплекснай брыгады ў саўгасе «Карытнае», калгасе «Энгельса», інструктар райкома партыі, старшыня калгасаў «Прагрэс», імя А.Неўскага. З 1990 г. старшыня Бабруйскага раённага Савета дэпутатаў. Узнагароджаны ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, «Знак Пашаны», медалямі.

ЛАЎРЫНОВІЧ Васіль Васілевіч, н. ў 1924 г. ў в. Плёсы. Скончыў вучылішча механізацыі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1951—1957 гг. трактарыст Цялушскай МТС. З 1957 г. механізатар саўгаса імя Някрасава. У 1961—1981 гг. брыгадзір паляводча-трактарнай брыгады. Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны», Айчыннай вайны 1-й ступені, медалямі.

ЛОСЬ Надзея Сямёнаўна, н. ў 1928 г. ў в. Стасеўка. Цялятніца калгаса імя Фрунзе. Узнагароджана ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі. Памерла ў 1996 г.

МАНЬКО Ніна Мікалаеўна, н. ў 1935 г. ў в. Лейчыцы. Даярка калгаса імя Дзяржынскага. Узнагароджана ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Працоўнай Славы 3-й ступені.

МУХАРТАЎ Павел Мікалаевіч, н. ў 1919 г. ў Тамбоўскай вобл., Расія. З 1953 г. ў Гарбацэвіцкай МТС. З 1959 г. камбайнер, шафёр саўгаса «Бабруйскі». Узнагароджаны ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Чырвонай Зоркі.

МЫШКАВЕЦ Аляксандр Якімавіч, н. ў 1899 г. ў в. Міхалёва. Трактарыст МТС калгаса «Праўда», саўгаса імя Леніна. Удзельнік

А.І.Парахневіч.

М.І.Пічугова.

А.А.Сакун.

Ц.Т.Салановіч.

Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны ордэнам Леніна. Памёр у 1980 г.

НАСКОЎСКІ Юрый Міхайлавіч, н. ў 1947 г. на ст. Ясень Асіповіцкага раёна. Працоўную дзейнасць пачаў у 1968 г. У 1970 г. скончыў Беларускі політэхнічны інстытут. З 1970 г. майстар, прараб БУ-130. З 1974 г. галоўны інжынер, з 1988 г. намеснік дырэктара АП «Бабруйсктрыкатаж». У 1996 г. намеснік старшыні Бабруйскага райвыканкома. Лаўрэат прэміі Савета Міністраў СССР (1984).

ПАРАХНЕВІЧ Аркадзь Іванавіч, н. ў 1934 г. ў в. Варатынь. Трактарыст, звеннявы паляводчай брыгады калгаса імя Пушкіна. Узнагароджаны ордэнамі Працоўнай Славы 1-й, 2-й і 3-й ступеней. Памёр у 1993 г.

ПАРАХНЕВІЧ Леанід Міхайлавіч, н. ў 1933 г. ў в. Міронава. З 1953 г. трактарыст калгаса імя Пушкіна. Узнагароджаны ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Працоўнага Чырвонага Сцяга. Памёр у 1997 г.

ПІНЧУК Ніна Мікалаеўна, н. ў 1939 г. ў в. Мікулічы. Брыгадзір калгаса імя А.Неўскага. Узнагароджана ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны».

ПІЧУГОВА Мая Іванаўна, н. ў 1935 г. ў в. Туркі. З 1960 г. цялятніца, з 1965 г. загадчыца жывёлагадоўчай фермы калгаса імя А.Неўскага. У 1976—1990 гг. лабарантка калгаса «Прагрэс». Узнагароджана ордэнам Леніна.

ПРАКОПЧЫК Марыя Іванаўна, н. ў 1939 г. ў в. Гарбацэвічы. У 1960—1986 гг. начальнік вузла сувязі ў в. Брожа, у 1986—1994 гг. інспектар аддзела кадраў саўгаса «Бабруйскі». Узнагароджана ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны».

ПТАШКЕВІЧ Эдуард Станіслававіч, н. ў 1927 г. ў пас. Глуша. Электразваршчык СМУ меліярацыі. Узнагароджаны ордэнам Леніна, медалямі.

САКУН Аляксандр Аляксандравіч, н. ў 1929 г. ў в. Вялікія Бортнікі. Скончыў Чырвонабярэзінскі сельскагаспадарчы тэхнікум. З 1953 г. аграном МТС. У 1957—1978 гг. аграном, намеснік старшыні, старшыня калгаса «Гігант». Узнагароджаны ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Працоўнага Чырвонага Сцяга. Памёр у 1978 г.

САКУН Мікалай Барысавіч, н. ў 1928 г. ў в. Забалацце. З 1944 г. трактарыст калгаса «Перамога». Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны», медалямі.

САЛАНОВІЧ Цімафей Тарасавіч, н. ў 1947 г. ў в. Кавалі. Брыгадзір, галоўны аграном, старшыня калгаса імя А.Неўскага. Узнагароджаны двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга.

САМЧЫК Галіна Ульянаўна, н. ў 1936 г. ў в. Вялікія Бортнікі. З 1953 г. цялятніца калгаса «Гігант». Выбіралася дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. Узнагароджана ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, «Знак Пашаны».

СІНЬКЕВІЧ Міхаіл Аляксандравіч, н. ў 1938 г. ў в. Шкава Акцябрскага раёна. Скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. У 1967—1975 гг. галоўны інжынер, намеснік старшыні калгаса «Гігант». У 1975—1977 гг. старшыня калгаса імя Някрасава. У 1977—1983 гг. намеснік старшыні, начальнік упраўлення сельскай гаспадаркі Бабруйскага райвыканкома. У 1983—1990 гг. першы сакратар Клічаўскага райкома партыі. У 1990—

М.А.Сінькевіч.



П.І.Січкар.

М.К.Стральцоў.



І.П.Стэльмак.

В.Р.Сыцько.



М.Л.Тапаркоў.

95 гг. старшыня Клічаўскага райвыканкома. З 1995 г. намеснік старшыні Бабруйскага раённага выканаўчага камітэта. Узнагароджаны двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, 2 ордэнамі «Знак Пашаны», медалямі.

СІЧКАР Палікарп Іванавіч, н. ў 1912 г. ў с. Давідаўка Жытомірскай вобл., Украіна. Удзельнік партызанскага руху на Беларусі ў час Вялікай Айчыннай вайны. З 1948 г. на партыйнай і савецкай рабоце. У 1952—1960 гг. старшыня Бабруйскага райвыканкома. Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны», Чырвонай Зоркі, медалямі. Памёр у 1965 г.

СТРАЛЬЦОЎ Мікалай Карпавіч, н. ў 1928 г. ў в. Паўлавічы Кіраўскага раёна. Трактарыст калгаса «Шлях Леніна». Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі.

СТЭЛЬМАК Іван Піліпавіч, н. ў 1925 г. ў в. Чырвоная Дуброва. Загадчык жывёлагадоўчай фермы калгаса імя Някрасава. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга.

СЫЦЬКО Валянціна Рыгораўна, н. ў 1926 г. ў в. Кісялевічы. Тэхнік-насеннявод, старшы аграном саўгаса «Кісялевічы». Узнагароджана ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі. Памерла ў 1980 г.

ТАПАРКОЎ Міхаіл Лявонавіч, н. ў 1929 г. ў в. Валынцова Горацкага раёна. Скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1954). Працаваў галоўным інжынерам, дырэктарам Высокаўскай МТС Клімавіцкага раёна. У 1962—1978 гг. галоўны інжынер, старшыня калгаса «Гігант», старшыня Бабруйскага райвыканкома, першы сакратар райкома партыі. У 1978—1980 гг. намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкома. З 1980 г. дырэктар Бабруйскага сельгастэхнікума, старшыня райкома прафсаюза работнікаў сельскай гаспадаркі. Узнагароджаны двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі «Знак Пашаны», медалямі.

ТАРАСЕНКА Уладзімір Паўлавіч, н. ў 1914 г. ў Сумскай вобл., Украіна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, палкоўнік у адстаўцы. У 1971—1979 гг. старшыня калгаса імя Дзяржынскага. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Чырвонай Зоркі, Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны 1-й і 2-й ступеней. Памёр у 1979 г. (*Гл. таксама пра яго артыкул «Мацнейшыя за браню».*)

ТОЎСЦІКАЎ Іван Якаўлевіч, н. ў 1931 г. ў Бранскай вобл., Расія. З 1951 г. рознарабочы, шафёр, шафёр-камбайнер калгаса імя XXII з'езда КПСС. Узнагароджаны ордэнамі

У.П.Тарасенка.

В.М.Трала.

М.С.Харытонаў.

А.А.Цэд.

Леніна, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, «Знак Пашаны», медалямі.

ТРАЛА Віктар Маркавіч, н. ў Чарнігаўскай вобл., Украіна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Начальнік чыгуначнай станцыі Мірадзіна. Узнагароджаны ордэнам Леніна. Памёр у 1966 г.

ФІСЮК Любоў Іванаўна, н. ў 1933 г. ў в. Варатынь. З 1956 г. даярка калгаса імя Пушкіна. Узнагароджана ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны».

ХАРЫТОНАЎ Мікалай Савельевіч, н. ў 1929 г. ў в. Кавалі. З 1954 г. камбайнер калгаса імя М.Горкага. З 1955 г. экскаватаршчык, брыгадзір калгаса імя Неўскага. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі.

ХУРСАН Мікалай Ціханавіч, н. ў 1929 г. ў в. Вялікія Бортнікі. Камбайнер калгаса «Гігант». Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны», медалямі.

ЦЭД Афанасій Антонавіч, н. ў 1926 г. ў в. Малыя Бортнікі. Трактарыст, з 1966 г. звеннявы па вырошчванні бульбы калгаса «Гігант». Узнагароджаны ордэнам Леніна.

ЧАРНАВУСАВА Ефрасіння Данілаўна, н. ў 1923 г. ў в. Кісялевічы. Удзельніца Вялікай Айчыннай вайны. Даярка саўгаса «Кісялевічы». Узнагароджана ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга.

ШАЎЦОЎ Трафім Трафімавіч, н. ў 1929 г. ў в. Навікі. З 1954 г. трактарыст калгаса імя А.Неўскага. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Е.Д.Чарнавусава.



Т.Т.Шаўцоў.

М.А.Шліхтаў.

ШЛІХТАЎ Міхаіл Астапавіч, н. ў 1917 г. ў в. Фалевічы Гомельскай вобл. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1957 г. трактарыст, звеннявы, брыгадзір калгаса імя Дзяржынскага. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Айчыннай вайны 2-й ступені, медалямі. Выдатнік сельскай гаспадаркі.

М.І.Шырокі.

В.П.Юшкевіч.

ШЫРОКІ Мікалай Іосіфавіч, н. ў 1925 г. ў в. Крупічы. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1945 г. ў калгасе імя Красіна, калгаснік, кіраўнік комплекснай брыгады. З 1966 г. даяр калгаса імя Дзяржынскага. Узнагароджаны ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі.

ЮШКЕВІЧ Васіль Пятровіч, н. ў 1924 г. ў в. Міхалёва 3-е. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1953—84 гг. брыгадзір паляводчай брыгады калгаса імя Дзяржынскага. Узнагароджаны ордэнам Леніна, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі. Памёр у 1985 г.

З.А.Валеева.

Заслужаныя работнікі Беларусі

АДЗІНЦОЎ Пётр Данілавіч, н. ў 1921 г. ў Бабруйску. Працоўную дзейнасць пачаў у 1940 г. настаўнікам гісторыі ў г. Бельску. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Скончыў Гомельскі педінстытут (1957). У 1954—1971 гг. дырэктар Будзёнаўскай васьмігадовай школы. У 1973—1978 гг. намеснік загадчыка РАНА. У 1978—1981 гг. дырэктар Гарбацэвіцкай СШ. Заслужаны настаўнік Беларусі (1968). Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны 1-й ступені, медалямі.

БАГАМОЛАВА Ніна Васілеўна, н. ў 1925 г. ў Новасібірскай вобл. Скончыла Смаленскі педінстытут (1960). З 1951 г. лабарант, у 1954—1988 гг. настаўніца біялогіі Хімоўскай школы. Заслужаны настаўнік Беларусі (1977).

БАНДАРЧУК Пётр Іванавіч, н. 20.2.1946 г. ў в. Культура. Трактарыст-машыніст Бабруйскага будаўніча-мантажнага ўпраўлення меліярацыі, калгаса імя Някрасава. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь (1998).

БАРСУКОЎ Іван Васілевіч, н. ў 1906 г. ў в. Новы Крупец Добрушскага раёна. Скончыў Гомельскі педтэхнікум (1926), БДУ (1931). З 1926 настаўнік Нова-Крупіцкай пачатковай школы. У 1931—1941 гг. дырэктар Хімоўскай, Камінтэрнаўскай СШ. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1945—1950 гг. дырэктар Гарбацэвіцкай СШ. У 1950—1952 гг. старшыня калгаса імя Леніна. У 1952—1966 гг. дырэктар Осаўскай, Хімоўскай СШ. Заслужаны настаўнік Беларусі (1965). Памёр у 1967 г.

БАРЫСЕНКА Антаніна Мяфодзьеўна, н. ў 1921 г. У 1944—1976 гг. настаўніца Крупіцкай пачатковай школы. Заслужаны настаўнік Беларусі (1965).

БЫЧКОЎ Аляксандр Іларыёнавіч, н. ў 1910 г. ў в. Міхалёва 1. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Старшыня калгаса імя Дзяржынскага. Заслужаны аграном Беларусі (1968). Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Памёр у 1994 г.

ВАЛАДЗЬКО (ПАРАХНЕВІЧ) Таццяна Міхайлаўна, н. ў 1931 г. ў в. Барбарова Глускага раёна. У 1951—1955 гг. вучылася ў Магілёўскім педінстытуце. У 1955—1982 гг. настаўніца Варатынскай СШ. Заслужаны настаўнік Беларусі (1968). Жыве ў в. Варатынь.

ВАЛОШЫН Іван Мікітавіч, н. ў 1926 г. ў с. Пухава Варонежскай вобл., Расія. З 1953 г. настаўнік матэматыкі Варатынскай СШ. У 1954—1986 гг. дырэктар Варатынскай, Міхалёўскай, Камінтэрнаўскай, Ленінскай СШ. У 1986—1993 гг. настаўнік матэматыкі Багушоўскай васьмігадовай школы. Заслужаны настаўнік Беларусі (1970). Жыве ў Бабруйску.

ВАРАБ'ЁЎ Марат Максімавіч, н. ў 1937 г. ў Магілёве. Скончыў Магілёўскае вучылішча чыгуначнікаў (1955), БДУ (1968). Працоўную дзейнасць пачаў у 1955 г. токарам на

П.Д.Адзінцоў.

Н.В.Багамолава.

П.І.Бандарчук.

А.М.Барысенка.

А.І.Бычкоў.

Т.М.Валадзько (Парахневіч).

І.М.Валошын.

М.М.Вараб'ёў.

заводзе «Алтайсельмаш». Служыў на ВМФ, працаваў токарам на заводзе «Бабруйксельмаш». У 1968—1980 гг. памочнік пракурора Бабруйскага раёна, з 1980 г. пракурор Першамайскага, Ленінскага раёнаў г. Бабруйска. Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь. Яго імя занесена на Дошку гонару Пракуратуры Рэспублікі Беларусь. Жыве ў Бабруйску.

ВАСІЛЬКОВА Юлія Вікенцьеўна, н. ў 1897 г. Настаўніца Брожскай сямігадовай школы. Заслужаны настаўнік Беларусі (1949). Памерла ў 1973 г.

ВАСКАВЕЦ Барыс Трафімавіч, н. ў 1918 г. ў в. Сычкава. У 1936—1941 гг. настаўнік рускай мовы і літаратуры ў Смалявіцкім раёне. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1946—1959 гг. настаўнік, намеснік дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце Панкратавіцкай сямігадовай школы. У 1959—1967 гг. дырэктар Сычкаўскай СШ. У 1967—1968 гг. намеснік загадчыка Магілёўскага аблана. У 1968—1978 гг. дырэктар Сычкаўскай СШ.

Ю.В.Васількова.

Б.Т.Васкавец.

Заслужаны настаўнік Беларусі (1966). Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны 2-й ступені. Памёр у 1992 г.

ГАРБАЧОЎ Авяр'ян Міхайлавіч, н. ў 1919 г. ў в. Зеляніца Кіраўскага раёна. Працоўную дзейнасць пачаў у 1930 г. настаўнікам



А.М.Гарбачоў.



Б.А.Гуляеў.

В.І.Дашкоўская.

Т.Л.Зуева.

Зеляніцкай пачатковай школы. У 1932—1940 гг. настаўнік, дырэктар Клічаўскай СШ. Удзельнік партызанскага руху ў Вялікую Айчынную вайну. З 1944 г. ў Кіраўскім РАНА, райкоме партыі. З 1958 г. дырэктар Міхалёўскай і Бортнікаўскай СШ. У 1986—1994 гг. старшыня раённага Савета ветэранаў вайны, працы, узброеных сіл і праваахоўных органаў. Заслужаны работнік культуры Беларусі (1980).

ГУЛЯЕЎ Барыс Аляксандравіч, н. ў 1937 г. ў в. Жалезніца Краснапольскага раёна. Скончыў Аршанскае педвучылішча (1957), Магілёўскі педінстытут (1963). З 1957 г. ст. піянерважаты Ушацкага дзіцячага дома. З 1963 г. настаўнік, намеснік дырэктара Тажылавіцкай васьмігадовай школы. З 1964 г. намеснік дырэктара, дырэктар Цялушскай СШ. З 1969 г. загадчык аддзела культуры, намеснік старшыні Бабруйскага райвыканкома. У 1977—1996 гг. загадчык РАНА. Заслужаны настаўнік Беларусі (1982). Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

ДАШКОЎСКАЯ Вольга Іванаўна, н. ў 1923 г. ў в. Коўрын. Скончыла Слуцкае педвучылішча (1950). Працоўную дзейнасць пачала ў 1944 г. бухгалтарам калгаса імя Пушкіна. У 1961—1980 гг. сакратар Варатынскага сельсавета. У 1958—1987 гг. мастацкі кіраўнік народнага хору даярак калгаса імя Пушкіна. Заслужаны дзеяч культуры Беларусі (1977). Памерла ў 1989 г.

ДЭМБУРГ Раман Самуілавіч, н. ў 1918 г. ў Бабруйску. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1949—1981 гг. дырэктар Бабруйскага сельскагаспадарчага тэхнікума. Заслужаны настаўнік Беларусі (1973). Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга (1971). Памёр у 1986 г.

ЗУЕВА Тамара Леанідаўна, н. ў 1930 г. ў Бабруйску. Скончыла БДУ (1951). Працоўную дзейнасць пачала ў 1951 г. ў Чэрыкаўскім раёне. У 1952—1980 гг. настаўніца Сычкаўскай школы. Заслужаны настаўнік Беларусі (1968). Памерла ў 1986 г.

КАБАКОЎ Яўген Піліпавіч, н. ў 1929 г. ў в. Навасёлкі. Скончыў Мінскі політэхнічны тэхнікум (1951). Працоўную дзейнасць пачаў у 1951 г. на Бабруйскай машынна-меліярацыйнай станцыі начальнікам участка. У 1952—1961 гг. майстар Бабруйскай ММС. У 1961—1989 гг. майстар меліярацыйнага будаўніцтва ў ПМК-84. Заслужаны меліяратар Беларусі (1968).

КАЛІНОЎСКІ Аляксандр Яўменавіч, н. ў 1918 г. ў в. Барсукі Рагачоўскага раёна. Вучыўся ў Бабруйскім лесатэхнікуме (1936—1939). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Скончыў Харкаўскі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі (1957). Працаваў механікам, загадчыкам майстэрняў МТС ва Узбекістане. З 1950 г. старшы інжынер, дырэктар Гарбацэвіцкай МТС. У 1964—1978 гг. галоўны інжынер калгаса імя XXII з'езда КПСС. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі (1973). Узнагароджаны двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга. Памёр у 1989 г.

КАПУСЦІНА Марыя Андрэеўна, н. ў 1922 г. ў в. Мікулічы. З 1944 г. дырэктар Мікуліцкай пачатковай школы. У 1951—1977 гг. настаўніца, намеснік дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце, дырэктар Туркоўскай СШ. Заслужаны настаўнік Беларусі (1967).

А.Я.Каліноўскі.

М.А.Капусціна.



М.Я.Курзянкоў.

С.А.Лемяшонак (Шчэрба).

КУРЗЯНКОЎ Мікалай Якаўлевіч, н. ў 1936 г. ў в. Ліпакі Хоцімскага раёна. Скончыў Беларускую сельгасакадэмію (1958). Працоўную дзейнасць пачаў у 1958 г. прарабам рамонтна-меліярацыйнай станцыі ў Бабруйску. З 1961 г. галоўны інжынер, начальнік СМУ меліярацыі. З 1975 г. старшыня Бабруйскага раённага Савета народных дэпутатаў. З 1981 г. першы сакратар Хоцімскага райкома партыі. У 1983—1993 гг. начальнік упраўлення меліярацыі і воднай гаспадаркі Магілёўскага аблвыканкома. Заслужаны меліяратар Беларусі (1973). Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Памёр у 1995 г.

М.С.Лескавец.

Ф.Ц.Малышаў.

ЛЕМЯШОНАК (ШЧЭРБА) Соф'я Аляксандраўна, н. 18.2.1919 г. ў в. Осава. У 1937 г. скончыла Гарбацэвіцкую сярэднюю школу і паступіла ў Мінскі медыцынскі інстытут. Па сямейных абставінах пераехала ў г. Хабараўск, дзе ў 1942 г. завяршыла медыцынскую адукацыю. Працавала загадчыкам аддзела аховы здароўя Хабараўскага краю, загадчыкам Разанскага раённага аддзела аховы здароўя, намеснікам галоўнага ўрача бальніцы ў г. Керч. У 1954—1971 гг. начмед Бабруйскай гарадской бальніцы. Узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, знакам «Выдатнік аховы здароўя». Заслужаны ўрач Беларусі (1969). Жыве ў Мінску.

ЛЕСКАВЕЦ Мікалай Сцяпанавіч, н. ў 1938 г. ў в. Суша Клічаўскага раёна. Скончыў Буда-Кашалёўскі тэхнікум (1957), Беларускі тэхналагічны інстытут. Працоўную дзейнасць пачаў у 1957 г. ў Клічаўскім лясгасе. З 1962 г. ў Бабруйскім лясгасе, ляснічы Пятровіцкага лясніцтва, галоўны ляснічы, а з 1978 г. дырэктар Бабруйскага доследнага лясгаса. Заслужаны лесавод Беларусі (1996). Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны».

МАЛЫШАЎ Фёдар Ціханавіч, н. ў 1917 г. ў в. Заполле Петрыкаўскага раёна. Скончыў мединстытут (1941). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1945 г. ўрач-тэрапеўт Любанскай раённай бальніцы. У 1948—1983 гг. галоўны ўрач Глушанскай пасялковай бальніцы. Заслужаны ўрач Беларусі (1970). Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны 2-й ступені. Памёр у 1993 г.

МІКУЛЬСКІ Міхаіл Адамавіч, н. ў 1923 г. ў в. Людзвінава Глускага раёна. Скончыў Мінскі педінстытут (1957). З 1940 г. настаўнік гісторыі ў Старадарожскім раёне. Удзельнік партызанскага руху ў Вялікую Айчынную вайну. З 1944 г. настаўнік, дырэктар сямігадовай школы ў Глускім раёне. З 1949 г. загадчык Глускага РАНА, з 1955 г. намеснік старшыні Глускага райвыканкома. З 1963 г. загадчык Бабруйскага РАНА. У 1977—1994 гг.

М.А.Мікульскі.

Г.Р.Саўчанка.

Н.П.Тоўсцік.

В.І.Філіпенка.

Ф.Н.Шараварaў.

дырэктар Ленінскай СШ. Заслужаны настаўнік Беларусі (1974). Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені, медалём «Партызану Айчыннай вайны».

ПАРАХНЕВІЧ Уладзімір Аляксеевіч, заслужаны настаўнік Беларусі. (*Гл. пра яго артыкул «Герой-партызан і заслужаны педагог».*)

САЎЧАНКА Ганна Рыгораўна, н. ў 1931 г. ў в. Добасна Кіраўскага раёна. З 1954 г. настаўнічала ў Дрыбінскім раёне. З 1957 г. настаўніца рускай мовы і літаратуры Міхалёўскай СШ. Заслужаны настаўнік Беларусі (1980).

ТАРАН Фаіна Якаўлеўна, н. ў 1907 г. на Украіне. Скончыла Кіеўскі пединстытут (1932). З 1932 г. выкладчык Луцкага сельгастэхнікума. З 1941 г. дырэктар школы ў Горкаўскай вобл., з 1946 г. настаўніца хіміі і біялогіі ў школе-інтэрнаце г. Сочы. У 1948—1969 гг. намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце, дырэктар Кісялевіцкай школы. Заслужаны настаўнік Беларусі (1959). Памерла ў 1987 г.

ТОЎСЦІК Настасся Палікарпаўна, н. ў 1922 г. ў в. Брожа. Скончыла Магілёўскае педвучылішча (1941). У 1944—1977 гг. настаўніца пачатковых класаў Брожскай СШ. Заслужаны настаўнік Беларусі (1968).

ФІЛІПЕНКА Вольга Іванаўна, н. ў 1927 г. ў Клімавіцкім раёне. Скончыла Мінскі юрыдычны інстытут (1949). З 1953 г. памочнік пракурора, пракурор абласной пракуратуры. З 1957 г. суддзя, ст. суддзя Касцюковіцкага і Клімавіцкага раёнаў. У 1976—1982 гг. старшыня народнага суда Бабруйскага раёна. Заслужаны юрыст Беларусі (1975). Жыве ў Бабруйску.

ЦЭД Любоў Паўлаўна, заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі. (*Гл. артыкул пра яе ў раздзеле «Героі працоўнага фронту».*)

ШАРАВАРАЎ Фёдар Нічыпаравіч, н. ў 1904 г. ў в. Дамантоўка Капыльскага раёна. Скончыў Чырвонабярэжскі сельскагаспадарчы тэхнікум (1925). У 1926—1941 гг. аграном, галоўны аграном, загадчык райземаддзела ў Жлобінскім і Полацкім раёнах. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1945—1955 гг. галоўны аграном Бабруйскага райземаддзела, загадчык абласнога ўпраўлення сельскай гаспадаркі. У 1955 г. ў ліку 30-тысячнікаў накіраваны старшынёй калгаса імя XXII з'езда КПСС. Заслужаны аграном Беларусі (1966). Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі, іншымі ордэнамі і медалямі. Памёр у 1972 г.

ШЧЭРБА Яўгеній Кузьміч, н. 11.4.1931 г. ў в. Осава. Скончыў Бабруйскую фельчар-

скую школу (1950), Мінскі медінстытут (1963). Працаваў на Ушацкай раённай меліярацыйнай станцыі, служыў старшым фельчарам на тральшчыку ў Запаляр'і ў званні лейтэнанта медыцынскай службы. Працаваў ва ўчастковай бальніцы Мядзельскага раёна, Мінскай абласной клінічнай бальніцы. Цяпер урач Рэспубліканскай бальніцы Галоўнага ўпраўлення лячэбна-прафілактычных і санаторна-курортных устаноў Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Заслужаны работнік аховы здароўя Беларусі (1989). Узнагароджаны знакам «Выдатнік аховы здароўя».

Я.К.Шчэрба.

Г.К.Ярмоленка-Грачухіна.

ЯРМОЛЕНКА-ГРАЧУХІНА Галіна Канстанцінаўна, н. ў 1928 г. ў в. Сялец Лагойскага раёна. Скончыла Харкаўскі фармацэўтычны інстытут (1952). З 1952 г. хімік-аналітык, намеснік загадчыка аптэкі № 1 г. Бабруйска. У 1965—1987 гг. загадчыца цэнтральнай раённай аптэкі. Заслужаны правізар Беларусі (1980). Узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны».

З.А.Валеева.

Генерал з Бортнікаў

Гэтага падцягнутага, прыветлівага чалавека вельмі паважалі ў Малых Бортніках. Праўда, крыху здзівіліся, калі ён, генерал Іван Дзмітрыевіч Балыка, пайшоўшы ў адстаўку, вярнуўся ў родную вёску. «Паклікала малая радзіма, — патлумачыў землякам генерал. — Тут на свет з'явіўся, тут і памерці хачу».

Так, нарадзіўся Іван Дзмітрыевіч у Малых Бортніках у сакавіку 1937 г. 35 гадоў аддаў службе ў арміі. «Дарос» да генерал-маёра. Адзначаны ордэнам «За службу Радзіме» 3-й ступені, узнагародамі Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам і Йеменскай Арабскай Рэспублікі.

Праўда, напачатку былі прафесійна-тэхнічнае вучылішча механізатараў шырокага профілю ў Бабруйску, асваенне цалінных зямель. А затым вайсковая служба, ваеннае вучылішча і дзве акадэміі — бранятанкавых войскаў і Генеральнага штаба Узброеных Сіл СССР. Служыў у Беларускай ваеннай акрузе, групе савецкіх войскаў у Германіі, у Забайкаллі. Быў камандзірам узвода, роты, начальнікам штаба, камандзірам палка, дывізіі, начальнікам штаба Забайкальскай ваеннай акругі; восем гадоў быў ваенным і галоўным ваенным саветнікам за мяжой.

І.Дз.Балыка.

І вось — Малыя Бортнікі. Яшчэ да пераезду набыў тут участак зямлі, паставіў дом, гаспадарчыя пабудовы. Купіў два малагабарытныя трактары, жыўнасць — парсюкоў, курэй, гусей. Разам з жонкай Марыяй Фёдараўнай, зямлячкай, з якой разам хадзілі яшчэ ў школу, шчыравалі ад цямна да цямна, радаваліся. Намячалі планы на будучае. На вялікі жаль, ім не суджана было збыцца: 18.5.1995 г. генерала І.Дз.Балыкі не стала. У сэрцах людзей засталася і будзе доўга жыць светлая памяць пра гэтага добрай душы чалавека.

Прысвяцілі жыццё навуцы

БАЛЫКІН Міхаіл Кірылавіч

Кандыдат тэхнічных навук (1965), прафесар (1990). Заслужаны будаўнік БССР (1980). Заслужаны работнік народнай асветы (1991). Нарадзіўся 23.12.1930 г. ў в. Кавалі. Скончыў Беларускі політэхнічны інстытут (1955). З 1965 г. начальнік цэха жалезабетонных вырабаў трэста № 2 Міністэрства гарадскога і сельскага будаўніцтва БССР. З 1956 г. ў Беларускім політэхнічным інстытуце (цяпер Беларуская дзяржаўная політэхнічная акадэмія): асістэнт, старшы выкладчык, дацэнт, прафесар кафедры, дэкан вячэрняга факультэта, у 1980—1993 гг. прарэктар па навуковай рабоце. З 1993 г. загадчык кафедры супраціўлення і пруткасці матэрыялаў. Аўтар навуковых прац па даследаваннях і разліках тэмпературнага ўздзеяння на трубаправоды рознага тэхналагічнага прызначэння, а таксама даведнікаў і дапаможнікаў.

БОЛБАС Максім Фёдаравіч

Доктар эканамічных навук (1984), прафесар (1985). Нарадзіўся 1.7.1918 г. ў в. Слабодка. Скончыў БДУ (1948). З 1934 г. на педагагічнай рабоце ў Клічаўскім раёне, у Камчацкай вобл. У Вялікую Айчынную вайну быў членам Брожскага падполля, потым стаў партызанам атрада імя Кірава 37-й брыгады імя Пархоменкі. Паводле ўспамінаў М.Храпко і Ф.Цапко, «цяжка было знайсці ў атрадзе больш адважнага хлопца. Ён удзельнічаў у адзінаццаці баях па разгроме варожых гарнізонаў, двойчы хадзіў на «жалезку», падарваў чатыры аўтамашыны з салдатамі, двойчы быў паранены». З 1944 г. дырэктар школ у былой Баранавіцкай вобл., выкладчык Бабруйскага педвучылішча, Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута эканомікі Акадэміі навук Беларусі. З 1968 г. ў Брэсцкім інжынерна-будаўнічым інстытуце. Даследаваў эканамічную гісторыю Беларусі, гісторыю прамысловасці ў дарэвалюцыйны перыяд. Аўтар прац «Развіццё прамысловасці ў Беларусі (1795—1861 гг.)» (1966), «Прамысловасць Беларусі, 1860—1900» (1978), «Прамысловасць дарэвалюцыйнай Беларусі» (1988). Памёр 1.4.1997 г.

БОРАЦ Валянціна Максімаўна

Доктар медыцынскіх навук (1974), прафесар (1975). Нарадзілася 3.1.1927 г. ў пас. Цялуша. Скончыла Мінскі медінстытут (1950). З 1950 г. ардынатар тэрапеўтычнага аддзялення абласной бальніцы ў Гродне. З 1960 г. ў Гродзенскім медінстытуце, асістэнт, дацэнт кафедры ўнутраных хвароб, з 1993 г. загадчык кафедры факультэцкай тэрапіі. Аўтар 170 навуковых прац, у тым ліку дзвюх манаграфій па клінічнай вітаміналогіі і сардэчнасасудзістых захворваннях. Узнагароджана медалямі «За працоўную доблесць», «За доблесную працу». Выдатнік аховы здароўя.

БУЛАЦКІ Рыгор Васілевіч

Журналіст, педагог, гісторык. Доктар гістарычных навук (1974), прафесар (1972). Нарадзіўся 5.5.1921 г. ў в. Мачулкі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Скончыў БДУ (1951). Працаваў ва універсітэцкай шматтыражнай газеце, працягваючы вучобу ў аспірантуры. З 1954 г. ў БДУ: старшы выкладчык, намеснік дэкана філфака і загадчык аддзялення журналістыкі, загадчык кафедры друку і гісторыі журналістыкі, дэкан філалагічнага факультэта і факультэта журналістыкі. Аўтар больш як 200 навуковых прац, у тым ліку звыш 20 манаграфій, падручнікаў і вучэбна-метадычных дапаможнікаў. Пад яго кіраўніцтвам абаронена звыш 40 кандыдацкіх і пры яго ўдзеле 3 доктарскія дысертацыі. Выхаваў шмат пакаленняў журналістаў, якія працавалі і працуюць у многіх сродках масавай інфармацыі. Лаўрэат прэміі Саюза журналістаў СССР (1980) і Саюза журналістаў БССР (1995). (*Гл. таксама артыкул «Штурман Рыгор Булацкі».*)

ГАЙШУН Іван Васілевіч

Вучоны-матэматык. Акадэмік Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі (1991; член-карэспандэнт з 1989), доктар фізіка-матэматычных навук (1985), прафесар (1992). Нарадзіўся 29.9.1946 г. ў в. Пятровічы. Скончыў БДУ (1969). З 1969 г. ў Інстытуце матэматыкі АН Беларусі: з 1984 г. загадчык лабараторыі, з 1985 г. намеснік дырэктара, з 1992 дырэктар інстытута. З 1997 г. віцэ-прэзідэнт Нацыянальнай АН Беларусі. Навуковыя працы па дыферэнцыяльных ураўненнях, працэсах кіравання і метадах матэматычнага мадэлявання. Распрацаваў агульныя прынцыпы даследавання ўстойлівасці дынамічных сістэм, тэорыю ўраўненняў у поўных вытворных, метады даследавання сістэм кіравання ў функцыянальных прасторах.

ЛАЎРЫНОВІЧ Міхаіл Фёдаравіч

Гаспадарчы дзеяч Беларусі, ганаровы пра-

М.К.Балыкін.

М.Ф.Болбас.

В.М.Борац.

Р.В.Булацкі.

фесар Беларускай дзяржаўнай політэхнічнай акадэміі (1996), лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1977), Дзяржаўнай прэміі БССР (1974), заслужаны машынабудаўнік БССР (1984). Нарадзіўся ў в. Цялуша 1.12.1929 г. Скончыў Беларускі політэхнічны інстытут (1961). У 1950—1994 гг. на Мінскім аўтазаводзе: наладчык, майстар, старшы майстар, старшы інжынер-тэхнолаг, начальнік тэхнічнага бюро, начальнік цэха, галоўны інжынер, тэхнічны дырэктар завода. У 1982—1984 гг. генеральны дырэктар аўтазавода вытворчага аб'яднання «БелаўтаМАЗ». З 1994 г. прэзідэнт Беларускай навукова-прамысловай асацыяцыі. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Працоўнага Сцяга, ордэнамі «Знак Пашаны», Дружбы народаў, медалямі.

І.В.Гайшун.

М.Ф.Лаўрыновіч.

ЛЕМЯШОНАК Уладзімір Іосіфавіч

Доктар гістарычных навук (1990). Нарадзіўся 14.10.1929 г. ў в. Віктараўка. З 1940 г. жыў і вучыўся ў Бабруйску. Скончыў БДУ (1956). Настаўнічаў у Дзяржынскім раёне, працаваў навуковым супрацоўнікам Інстытута гісторыі Акадэміі навук Беларусі. У 1964—1971 гг. старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ, у 1971—1981 гг. дацэнт, намеснік загадчыка кафедры гісторыі КПСС Мінскай ВПШ, у 1981—1991 гг. старшы, вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыка-палітычных даследаванняў. З 1992 г. галоўны рэдактар арганізацыйна-метадычнага цэнтра па выданні гісторыка-дакументальных Хронік Памяці Дзяржаўнага Камітэта Рэспублікі Беларусь па друку. Даследуе гісторыю барацьбы беларускага народа супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну. Аўтар звыш 160 навуковых прац, у тым ліку трох манаграфій: «Гераічныя старонкі вызва-



У.І.Лемяшонак.

лення Беларусі» (1984), «Ідэйна-палітычная работа Кампартыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны» (1988), «Вызваленне — без грыфа «Сакрэтна» (1996). Адзін з аўтараў выданняў «Гісторыя Беларускай ССР» (т. 4, 1975), «Усенародная барацьба на Беларусі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў

І.І.Трухан.

В.Ф.Цікавы.

у гады Вялікай Айчыннай вайны» (т. 1—3, 1983—85).

ЛІПЕЦ Ісай Майсеевіч

Доктар медыцынскіх навук (1939), прафесар (1940). Нарадзіўся 12.11.1897 г. ў в. Плёсы. Скончыў медыцынскі факультэт 2-га Маскоўскага універсітэта (1923). У 1924—1939 гг. працаваў у Мінску. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1939—1941 і ў 1953—1956 гг. загадчык кафедры тэрапіі Віцебскага, а ў 1941—1953 гг. Паўночна-Асецінскага медінстытута. Асноўныя навуковыя працы па пытаннях органаў стрававання. Памёр 12.4.1964 г.

ТРУХАН Іван Іванавіч

Кандыдат геаграфічных навук (1949), прафесар (1977). Нарадзіўся 11.12.1915 г. ў в. Каменка. Скончыў Беларускі інстытут народнай гаспадаркі (1938), Мінскую ВПШ (1946). У 1941—1944 гг. настаўнічаў, быў дырэктарам школ і Сардэбскага педвучылішча ў Пензенскай вобл., Расія. У 1946—1948 гг. галоўны рэдактар Саўінфармбюро пры Савеце Міністраў СССР. У 1962—1965 гг. рэктар Беларускага інстытута народнай гаспадаркі. У 1965—1967 гг. дырэктар НДІ эканомікі і эканоміка-матэматычных метадаў планавання пры Дзяржплане БССР. У 1949—1950, 1953—1962, 1967—1982 гг. працаваў у БДУ (у 1968—1982 — загадчык кафедры эканамічнай геаграфіі). Удзельнічаў у падрыхтоўцы першага Атласа Беларусі, геаграфіі і эканамічнай геаграфіі Беларусі, эканамічнай геаграфіі СССР, даведнікаў пра СССР, рэспублікі Прыбалтыкі, Беларусь, Украіну, Малдавію, Маскву. Аўтар многіх навуковых прац. З 1982 г. на пенсіі.

ЦІКАВЫ Вадзім Фёдаравіч

Кандыдат хімічных навук (1961). Прафесар (1984). Заслужаны работнік вышэйшай школы Беларусі (1982). Нарадзіўся 9.10. 1930 г. ў в. Кавалі. Скончыў БДУ (1955), дзе потым вучыўся ў аспірантуры і працаваў на хімічным факультэце асістэнтам, дацэнтам, прафесарам. У 1978—1993 гг. дэкан гэтага факультэта, загадчык кафедры агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі. Аўтар больш як 200 навуковых прац і вынаходстваў, вучэбных дапаможнікаў. Найбольш значныя з навуковых даследаванняў — у галіне тэорыі будовы неарганічных палімерных матэрыялаў і іх практычнага выкарыстання, у тым ліку ў асваенні космасу.

Людзі творчага палёту

АЛЯКСЕЕЎ Карней Іосіфавіч

Скульптар. Нарадзіўся 15.5.1943 г. ў в. Вуглы. Скончыў Абрамцаўскае мастацка-прамысловае вучылішча (1970), Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (1976). Вучыўся ў А.Бембеля, А.Анікейчыка. З 1976 г. скульптар філіяла магілёўскай мастацка-вытворчай майстэрні ў Бабруйску, з 1989 г. старшыня праўлення Магілёўскай арганізацыі Саюза мастакоў Беларусі. Удзельнік (з 1974) многіх гарадскіх, абласных, рэспубліканскіх выставак, конкурсаў і пленэраў. Працуе ў станковай скульптуры, пераважна ў жанры партрэта. Сярод яго твораў: партрэты маладой будаўніцы (1975), ст. лейтэнанта міліцыі З.М.Малахавай (1977), даяркі Г.Дз.Белавус, мастака Э.Белагурава (абодва 1978), бацькі



К.І.Аляксееў.



К.І.Аляксееў. Партрэт бацькі 1979 г. Дрэва.

Л.П.Асецкі.

(1979), Героя Савецкага Саюза старшага сяржанта М.П.Чэпіка, які загінуў у Афганістане (1980); кампазіцыі «Першы ўраджай» (1974), «Кветкавод Наташа» (1983), трыпціх «Якуб Колас» (1976) і інш. Яго творы знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, Нацыянальным музеі гісторыі і культуры ў Мінску, Літаратурным музеі М.Багдановіча і інш.

АСЕЦКІ Людвіг Пятровіч

Мастак. Заслужаны дзеяч мастацтва Беларусі (1981). Нарадзіўся 9.5.1929 г. ў в. Продзвіна. Працуе ў галіне станковай і кніжнай графікі, а таксама манументальнага жывапісу. Першай яго прыступкай да прафесійнага майстэрства была студыя выяўленчага мастацтва пры бабруйскім Доме піянераў. Скончыў Мінскае мастацкае вучылішча (1950), Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (1960). Вучыўся ў В.Цвіркі, А.Мазалёва, Б.Любамудрава, з гэтага часу ўдзельнічае ў мастацкіх выстаўках. Творы Л.П.Асецкага прысвечаны сучаснасці і гісторыі: серыі «Кастрычніцкія дні на Беларусі» (1960), «Горад будуецца» (1963), «Падполле Мінска» (1968, усе ў тэхніцы лінагравюры), «Будні ваенна-марскога флоту» (1969, афорт), «Па матывах трылогіі Я.Коласа «На ростанях» (1973), «Жодзіна» (1974—1976), «Вызваленне» (1975—1978, усе ў тэхніцы літаграфіі), «Балада аб Лаўскім баі» (1979), «Прыпяцкія мелодыі» (1981, абедзве — афорты). Асобныя графічныя серыі выкананы ў тэхніцы тэмперы («Ад родных ніў», 1981; «БелАЗ», 1982; «Нашчадкі Крывіцкай пагоні», 1995), а серыі «Славацкія матывы» (1983), «Памяць» (1984—1985), «Мір планеце» (1986—1987), «Родныя прасторы» (1991), «Замкнёнасць круга» (1993—1994), «Квадрат Чарнобыля» (1996) — у тэхніцы сухая іголка, мецца-тынта.

Станковым работам уласцівы арыгінальныя кампазіцыйныя вырашэнні, абвостраная, амаль гратэскная выразнасць малюнка, святлоценявыя кантрасты. Працуе ў галіне манументальнага мастацтва: размалёўкі «Абарона Сталінграда» (1971) у Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, «Кастрычнік на Беларусі» (1977) у Літаратурным музеі Я.Купалы ў Мінску, «Перамога» (1974) у гісторыка-краязнаўчым музеі ў г.п. Карэлічы, «Мір вам, дзеці», «Асветнікі Беларусі» (1989—1990) у Мінскай школе № 88; ілюстрацыі да кніг «Мы раскажам пра Мінск» (1964); «Людзі на балоце» (1968) і «Подых навальніцы» (1970) І.Мележа; «Атланты і карыятыды» І.Шамякіна (1974) і інш. Творы мастака знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, Літаратурным музеі Я.Купалы, Беларускім музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і інш. музеях Рэспублікі. Член Саюза мастакоў Беларусі з 1967.

Літаратурная спадчына

Наша бабруйская зямля, непаўторная па прыгажосці, населеная мудрымі і добразычлівымі людзьмі, дала натхненне і сілу многім літаратурным талентам. Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч... Алесь Адамовіч... Мікола Аўрамчык... Платон Галавач... Алесь Дзятлаў... Яны — нашы знакамітыя землякі, і пра кожнага з іх будзе сказана асобна.

Але ў нас, на Бабруйшчыне, працавалі і пачыналі творчы шлях і многія іншыя літаратары. Сярод іх — Міхась Лынькоў, які праходзіў тут вайсковую службу і ў 1919 г. на старонках газеты «Камуніст» надрукаваў свой першы верш на рускай мове. Тут жа ў 1921 г. ён надрукаваў і другі свой верш. Пасля дэмабілізацыі, працуючы настаўнікам у вясковай школе, М.Лынькоў пастаянна падтрымліваў сувязь з газетай, дасылаў матэрыялы пра жыццё вяскоўцаў і ўласныя творы. А ў 1925 г. яго як актыўнага селькора і маладога літаратара накіравалі на працу ў рэдакцыю газеты «Камуніст». «За пяць гадоў маёй работы ў рэдакцыі, — успамінаў М.Лынькоў, — спачатку сакратаром, а затым намеснікам рэдактара і, нарэшце, адказным рэдактарам газеты мной было напісана многа розных артыкулаў і заметак, відаць, сотні паўтары фельетонаў на розныя надзённыя тэмы... Гэта было даўно — у 1925—1930 гадах. Гады працы ў рэдакцыі «Камуніста» былі шчаслівымі для мяне... Яны далучылі мяне да актыўнага грамадскага і культурнага жыцця краіны. Гэтая праца дапамагла мне стаць пісьменнікам. І не толькі мне. З працай у газеце «Камуніст» былі спалучаны першыя выступленні ў літаратуры такіх пісьменнікаў, як Хвядос Шынклер, Цімох Крысько (Васіль Вітка), Алесь Жаўрук, Аляксей Зарыцкі, Сяргей Грахоўскі, Якаў Герцовіч». Працуючы ў газеце, М.Лынькоў стварыў у Бабруйску філію «Маладняка» (усебеларускага аб'яднання паэтаў і пісьменнікаў), арганізаваў выпуск літаратурнага альманаха «Уздым», а таксама штомесячнага літаратурнага дадатка да газеты пад назвай «Вясна». Першыя свае літаратурныя творы надрукавалі ў «Камуніс-це» Пімен Панчанка, Янка Казека, Яўхім Кохан, Хведар Бужан, Алесь Дудар, Мікола Лобан, Юрка Лявонны і іншыя прадстаўнікі сялянскай і рабочай моладзі. Яшчэ ў даваен-

Рэдакцыя газеты «Камуніст». Сядзяць (злева направа): М.Гельфанд, І.Самаль, М.Лынькоў, Г.Адамсон, А.Кацман; стаяць (злева направа): У.Крыско (В.Вітка), Хв.Шынклер, Р.Лынькоў (Р.Суніца), бухгалтар Мейцін. 1929 г.

Пасяджэнне літаратурнага гуртка ў рэдакцыі раённай газеты «Трыбуна працы».

ны час з'явіліся тут вершы Міколы Аўрамчыка. Менавіта ў рэдакцыі «Камуніста» ён упершыню сустрэўся з Янкам Купалам і Якубам Коласам. Дарэчы, Якуб Колас прыкмеціў талент маладога паэта, вельмі цёпла адгукнуўся пра яго. Згадваючы той вірлівы час рэдакцыйных будняў, Сяргей Грахоўскі выказаў, відаць, не толькі сваю шчырую ўдзячнасць бабруйскай газеце:

Хаця засталося нас нямнога,
Нібыта самы баявы гарніст,
Бабруйская газета «Камуніст».
Я ўспамінаю даўнія гады
І сэрца ў хваляванні ледзь не стыне:
З усіх святынь рэдакцыя тады
Здавалася найбольшаю святыняй...

Праездам ці ў час камандзіровак рэдакцыю «Камуніста» ніколі не абміналі і знакамітыя, і маладыя літаратары, часта публікавалі тут свае творы. Гэта Аляксей Пысін, Пятро Прыходзька, Міхась Скрыпка, Алесь Ставер, Іван Муравейка і многія іншыя. Газета заўжды як магла падтрымлівала маладыя таленты. Тут друкавалі свае вершы Марк Смагаровіч, Алесь Наўроцкі, Аляксандр Лазнявы, Марыя Гудкова.

Цяпер замест аб'яднанай газеты «Камуніст» у Бабруйску выходзяць гарадская газета «Бабруйскае жыццё» і раённая «Трыбуна працы», вакол якіх гуртуюцца літаратурныя сілы. Даўно ведаюць чытачы цёплыя лірычныя творы Аляксея Гарэліка пра людзей працы, прыгажосць роднага краю. Дзве кніжкі нататкаў пра сваіх землякоў выдаў Мікола Давідовіч. Радуюць сэрцы людзей шчырыя вершы знакамітай ужо Святланы Басуматравай. Са сваімі творамі выступаюць у мясцовым друку Л.Бабкова, М.Гудкова, А.Дзергачоў, М.Друшчыц, В.Жыткоў, Т.Касаткіна, В.Лаўрыновіч, В.Малевіч, У.Рудзінскі, В.Хаўратовіч, М.Янчанка і інш. Высокага табе творчага палёту, таленавітае маладое племя!

А.Аляксееў.

АДАМОВІЧ АЛЕСЬ

Беларускі пісьменнік, крытык, літаратуразнавец Аляксандр Міхайлавіч Адамовіч нарадзіўся 3.9.1927 г. ў в. Канюхі Капыльскага раёна. Член-карэспандэнт АН Беларусі (1980), доктар філалагічных навук (1962), прафесар (1971). З 1928 г. сям'я Адамовічаў жыла ў пас. Глуша. Тут бацька, Міхаіл Іосіфавіч, працаваў урачом, адсюль у 1940 г. прызваны ў Чырвоную Армію, прайшоў Вялікую Айчынную вайну, вярнуўся толькі ў 1947 г. падпалкоўнікам медыцынскай службы, узначаліў Глушанскі ўрачэбны ўчастак, памёр у 1948 г. Маці, Ганна Мітрафанаўна, Алесь і брат Яўген у 1941 г. сталі падпольшчыкамі, а ў 1943 г. байцамі партызанскага атрада імя Кірава 37-й брыгады імя Пархоменкі. Пасля вайны Алесь скончыў БДУ (1950), аспірантуру пры ім (1953) і выкладаў там жа на кафедры беларускай літаратуры. У 1954—1962 і ў 1966—1987 гг. працаваў у Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы АН Беларусі. У 1962—1966 гг. вучыўся на вышэйшых сцэнарных курсах у Маскве. У 1964—1966 гг. выкладаў беларускую літаратуру ў МДУ імя М.В.Ламаносава. З 1987 г. — дырэктар навукова-даследчага інстытута кінамастацтва ў Маскве. Член Саюза пісьменнікаў СССР з 1957 г. Пісаў на беларускай і рускай

Алесь Адамовіч.

мовах. Аўтар навуковых прац «Шлях да майстэрства: Станаўленне мастацкага стылю К.Чорнага» (1958), «Культура творчасці» (1959), «Беларускі раман: Станаўленне жанру» (1961), «Маштабнасць прозы» (1972), «Гарызонты беларускай прозы» (1974), «Здалёк і зблізку: (Беларуская проза на літаратурнай планеце)» (1976), «Кузьма Чорны: Урокі творчасці» (1977), «Леў Талстой і беларуская літаратура: (Вайна і чалавек)» (1978; даклад на VIII Міжнародным з'ездзе славістаў), «Літаратура, мы і час» (1979), «Браму скарбаў сваіх адчыняю...» (1980), «Аб сучаснай ваеннай прозе» (1981), «Вайна і вёска ў сучаснай літаратуры» (1982); альбома «Сказ пра Івана Мележа» (1984), брашуры «Літаратура і праблемы стагоддзя» (1986), кніг літаратурнай крытыкі і публіцыстыкі «Нічога важней» (1985), «Выбары — жыццё» (1986), «Дадумваць да канца» (1988), «Адваяваліся!» (1990), «Мы — шасцідзесятнікі» (1991), «Апакаліпсіс па графіку» (1992).

Камень-помнік на магіле А.Адамовіча.

Адамовіч напісаў шэраг мастацкіх твораў. Яго раманы «Вайна пад стрэхамі» (1960) і «Сыны ідуць у бой» (1963) склалі дылогію «Партызаны», дзе адлюстраваны падзеі ваенных часоў у пасёлку Глуша; па сцэнарыі пісьменніка пастаўлена аднайменная кінадылогія (1970, рэжысёр В.Тураў). Выйшлі з друку аповесці «Вікторыя» (1966), «Апошні водпуск» (1969), «Хатынская аповесць» (1972, інсцэніравана ў 1977), «Карнікі» (1980), «Апошняя пастараль» (1987). У 1985 г. на кінастудыі «Беларусьфільм» Э.Клімавым пастаўлены мастацкі фільм «Ідзі і глядзі» (сцэнарый А.Адамовіча і Э.Клімава, у аснову якога пакладзены «Хатынская аповесць» і «Карнікі»); на Сусветным кінафестывалі ў Маскве (1985) адзначаны залатым прызам. У 1987 г. выйшла кніга апавяданняў і эсэ «Маленне аб будучым». А.Адамовіч — адзін з аўтараў дакументальных кніг «Я з вогненнай вёскі...» (з Я.Брылём, У.Калеснікам, 1975) і «Блакаднай кнігі» (з Д.Граніным, 1979; у перакладзе на беларускую мову выйшла ў 1985). У 1977 г. выдадзены Збор твораў у 2, у 1981—83 гг. — у 4 тамах. Лаўрэат прэміі Міністэрства абароны СССР (1974) і Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (1976, за «Хатынскую аповесць»). У 1982 г. ў складзе дэлегацыі БССР удзельнічаў у рабоце XXXVII сесіі Генеральнай Асамблеі ААН. У 1989 г. абраны народным дэпутатам СССР. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны 2-й ступені, Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны» і медалямі. Памёр 26.1.1994 г. Пахаваны ў пас. Глуша.

АЎРАМЧЫК МІКОЛА

Паэт, празаік і перакладчык Мікалай Якаўлевіч Аўрамчык нарадзіўся 14.1.1920 г. ў в. Плёсы. Заслужаны работнік культуры Беларусі (1980). У 1938 г. паступіў на філалагічны факультэт Мінскага педінстытута імя М.Горкага, адначасова працаваў у рэдакцыі газеты «Піянер Беларусі». У час Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у баях на Паўночна-Заходнім і Волхаўскім франтах. Пры акружэнні ў чэрвені 1942 г. трапіў у палон і вывезен фашыстамі ў Рур на каменнавугальныя шахты. Пасля вайны працаваў на аднаўленні Данбаса. Скончыў філалагічны факультэт БДУ (1949). Працаваў у рэдакцыях газет «Чырвоная змена», «Літаратура і мастацтва», у часопісе «Полымя», у 1953—1980 гг. — рэдактар аддзела паэзіі часопіса «Маладосць». Член Саюза пісьменнікаў СССР з 1947 г. Узнагароджаны ордэнамі «Знак Пашаны», Айчыннай вайны 2-й ступені, медалямі.

Мікола Аўрамчык.

Алесь Дзятлаў.

Маці паэта была знаёма з унучкай А.С.Пушкіна і ў сэрцы свайго сына шчодра пасеяла светлыя зерні пушкінскай паэзіі (гл. арт. «Нашчадкі А.С.Пушкіна на Бабруйшчыне»). Першыя вершы апублікаваў у 1937 г. ў бабруйскай газеце «Камуніст». Аўтар кніг паэзіі «Пярэдні край» (1949), «Шляхамі дружбы» (1952), «Ключы жураўліныя» (1960), «Сустрэча былых канагонаў» (1963), «Універсітэцкі гарадок» (1967), «Агледзіны» (1969), «Як на далоні» (1970), «Дрэва дружбы» (1973), «Радовішча» (1976), зборніка вершаў, паэм і ўспамінаў «Анкета» (1990). Выдаў зборнік вершаў для дзяцей «Дружба» (1950). Выйшлі «Выбранае» (1976) і «Выбраныя творы» (1980). За зборнік «Сустрэча былых канагонаў» прысуджана Літаратурная прэмія імя Янкі Купалы (1964).

Паэзія Міколы Аўрамчыка — пра драматычны ваенны лёс, уражанні ад студэнцкіх гадоў, паездак па краіне. Раман «У падзямеллі» (1986) і аповесць «Палон» (1989) — пра перажытае: жорсткія баі, палон, маральнае супрацьстаянне ворагу, змаганне за чалавечую годнасць. Паэт улюбёны ў сваіх землякоў, у непаўторную прыгажосць роднага краю, піша пра іх шчыра і пранікнёна. Нагадаем трапяткія радкі з яго чыстых бабруйскіх вершаў:

Мая Бабруйшчына зялёная,
Здаешся іншым ты малой
З тваёй Бярэзінай хвалёнаю
І з непрыкметнаю Алой.
А мне заўсёды паўнаводнымі
Здаваліся іх берагі,
Былі твае мясціны роднымі,
Куток з маленства дарагі...
Не дзіўна, што тут людзі лечацца...
Куды ні траплю — у Туркі,
Панкратавічы або Лейчыцы, —
Мяне сустрэнуць сваякі...
Ля Ступянёў і за Цялушаю
Майго кахання з той пары
Сляды нічым не зацярушаны —
Цвітуць пралескамі ў бары...

ДЗЯТЛАЎ АЛЕСЬ

Пісьменнік Аляксандр Мікалаевіч Дзятлаў нарадзіўся 3.6.1936 г. ў в. Туркі Бабруйскага с/с ў сям'і настаўніка. Жыў у Пятровічах, а з лета 1944 г. — на радзіме маці, у Плёсах, дзе бацьку прызначылі дырэктарам мясцовай школы. Скончыў аддзяленне журналістыкі БДУ (1959). Працаваў у глыбоцкай раённай газеце «Сцяг камунізму» (1959—1961), у «Чырвонай змене» (1961—1973). У 1973—1975 гг. член сцэнарна-рэдакцыйнай калегіі кінастудыі «Беларусьфільм», у 1975—1980 гг. карэспандэнт рэспубліканскай газеты «Звязда», з 1980 г. рэдактар аддзела навукі часопіса «Родная прырода». Член Саюза пісьменнікаў СССР з 1979 г.

Першае апавяданне надрукаваў у 1970 г. ў газеце «Літаратура і мастацтва». Аўтар зборнікаў аповесцей і апавяданняў «Росы на поплаве» (1974), «Белы месяц сакавік» (1977), «Сляды» (1981), «Вяртанне» (1987), «Парог» (1993). Аналізуючы творчасць Алеся Дзятлава, Міхась Вышынскі зазначыў: «Некаторыя рэцэнзенты, у тым ліку і аўтар гэтых радкоў, разглядаючы калісьці першую кніжку Алеся Дзятлава «Росы на поплаве», дружна згаджаліся, што ўжо ў ёй пісьменнік выразна і ўпэўнена склаўся як творчая асоба з непаўторным голасам (лірычна-спавядальным) і аналітычным мысленнем. Са сваімі нейкімі «па-дзятлаўску» прывабнымі, неардынарнымі героямі-асобамі, сваім ацэначным поглядам на іх, а галоўнае — са сваім абсягам ідэйных пошукаў і даследаванняў. Маральна-этычнага, духоўнага парадку. Словам, са сваім светаадчуваннем, паэтыкай жыцця. З тым, што робіць літаратара літаратарам» (Полымя. 1988. № 1. С. 205).

Сам Алесь Дзятлаў пра вытокі сваёй творчасці напісаў: «Лічу сваёй малой радзімай, родным кутам Плёсы. Ніколі не парываў сувязі з роднымі мясцінамі. Многія героі маіх твораў, як кажуць, узяты жыўцом з вяскоўцаў-суседзяў. Нагадаю апавяданні «Росы на поплаве», «Першы снег», «Арцёмава хата», «Світанак над возерам», «Ванечка», «Князь з Высокай Гары», «Чужы», аповесці «Белы месяц сакавік», «Брод» і многія іншыя. Незабыўныя школьныя гады, вучоба ў Цялушскай школе далі штуршок для напісання аповесці

«Сляды». Адзін з яе герояў — Бгатка — «падгледжаны» ў Плёсах. Другі вясковец, мой родны дзед па маці Якаў Міхайлавіч Сіліч (у творы Жыліч), «дзейнічае» ў аповесці «Век жыві — век вучыся» (вядома ж, з аўтарскім домыслам).

У некаторых маіх творах узнаўляюцца падзеі вайны. Штуршком да іх напісання з'явіліся ўражанні маленства ў Пятровічах. Гэта апавяданні «Схватка ў тумане», «Данос», «Сустрэча на гравійцы», аповесць «Час даспелага жыта», раман «Парог». У ім, дарэчы, я нават захаваў назву вёскі — Пятровічы, хаця, вядома, ёсць і аўтарскі домысел.

Мая малая радзіма, мой родны кут даў мне столькі як чалавеку, пісьменніку, што нельга выказаць словамі. І я ўдзячны людзям, якія ўсё жыццё са мной, у маіх кнігах».

Наш боль — Афганістан

Па прызыве з Бабруйскага РВК у Афганістан было накіравана 43 чалавекі. З іх 2 вярнуліся інвалідамі, 6 загінулі.

БЕЛАВУШКА Юрый Мікалаевіч, н. ў 1966 г. ў в. Дойнічава. У 1985 г. скончыў Кіраўскае ПТВ № 66, працаваў зваршчыкам у саўгасе «Дойнічава». Прызваны ў Савецкую Армію ў 1985 г. Яфрэйтар дэсантна-штурмавой манеўровай групы Ю.М.Белавушка загінуў 27.8.1987 г. ў Афганістане каля воз. Даркат. Пахаваны на радзіме. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

КАЗЛОЎ Віталь Мікалаевіч, н. 28.7.1964 г. ў в. Вялікія Бортнікі. У 1981 г. скончыў сярэднюю школу. Працаваў трактарыстам у калгасе. Прызваны ў Савецкую Армію ў 1982 г. Вадзіцель бронетранспарцёра В.М.Казлоў загінуў 5.8.1983 г. Пахаваны на радзіме. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

КУРЫЛЬЧЫК Аляксандр Сямёнавіч, н. 6.10.1963 г. ў в. Баяры. У 1981 г. скончыў сярэднюю школу, працаваў трактарыстам у саўгасе імя Леніна. Прызваны ў Савецкую Армію ў 1981 г. Кулямётчык А.С.Курыльчык памёр ад ран 15.8.1983 г. Пахаваны на радзіме.



А.С.Курыльчык.

А.С.Нікітка.

НІКІТКА Анатоль Сцяпанавіч, н. 15.3.1963 г. ў в. Орсічы. У 1980 г. скончыў сярэднюю школу, быў вучнем электразваршчыка на Бабруйскім заводзе сельскагаспадарчых машын. Прызваны ў Савецкую Ар-

Ю.М.Белавушка.



В.М.Казлоў.

А.А.Папоў.



І.М.Пракопчык.

мію ў 1981 г. Малодшы сяржант А.С.Нікітка загінуў 24.5.1987 г. Пахаваны на радзіме. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалём «Воіну-інтэрнацыяналісту ад удзячнага афганскага народа».

ПАПОЎ Аляксандр Арсаноф'евіч, н. 21.9.1962 г. ў в. Багушоўка. У 1980 г. скончыў Бабруйскае ПТВ № 213. Прызваны ў Савецкую Армію ў 1981 г. Радавы А.А.Папоў загінуў 2.7.1981 г. Пахаваны на радзіме.

ПРАКОПЧЫК Іван Мікалаевіч, н. 23.5.1965 г. ў в. Пасека. Радавы І.М.Пракопчык загінуў 25.1.1984 г. Пахаваны на радзіме. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

Ваеннаслужачыя, якія загінулі пры выкананні службовых абавязкаў

ЗАЙЦАЎ Валяр'ян Рыгоравіч, н. ў 1946 у в. Кавалі Кавалёўскага сельсавета, скончыў Ульянаўскае ваеннае вучылішча, капітан, загінуў 26.4.1978.

МАСЛАЎ Мікалай Архіпавіч, н. ў 1959 у в. Баранавічы Осаўскага сельсавета, гв. радавы, шафёр-кранаўшчык, загінуў 5.8.1980.

НАСАНОВІЧ Анатоль Мікалаевіч, н. ў 1960 у в. Вішнёўка Вішнёўскага сельсавета, старшына 2-й стацці, камандзір аддзялення, памёр 22.6.1980 ад траўм і апёку, атрыманых у час выканання баявога задання.

ПЫЖЫК Фёдар Фёдаравіч, н. ў 1956 у в. Бабіна 1-е Хімоўскага сельсавета, радавы, вадзіцель, загінуў 7.7.1975.

А.М.Насановіч.

СІДАРЭНКА Аляксандр Міхайлавіч, н. ў 1961 у в. Качаны Слабодкаўскага сельсавета, загінуў 11.9.1980 у Венгрыі.

З МАТЭРЫЯЛЬНАЙ І ДУХОЎНАЙ СПАДЧЫНЫ

Жылі нашы продкі па спрадвечных законах патрыярхальнага ўкладу. Выкарыстоўвалі, як яны самі любілі сцвярджаць, «тое, што пад нагамі ляжала ды навокал раскінулася». А «ляжала» і «раскінулася» тут, на Бабруйшчыне, неабсяжнае царства прыроды — непаўторнае па харастве і непараўнальнае па багацці. Навокал, як акінуць позіркам, — заліўныя лугі, срэбразвонныя рэкі, шумлівыя лясы і дубровы, зіхатлівыя пералескі. А ў іх — скопішча рыбы, дзікага птаства, звяроў, пчол. З гэтага ўсяго і апраналіся далёкія прашчуры, гэтым і карміліся, з гэтай прыгажосці чэрпалі натхненне, якое жывіла крыніцы народнай творчасці.

Можа, і невыпадкова, што адсюль, з былога Бабруйскага павета, выйшлі два знакамітыя этнографы і фальклярысты Павел Шпілеўскі (1823—1861) і Мікалай Яцко (1855—?), якія хоць і не так многа, але займаліся вывучэннем духоўнай і матэрыяльнай спадчыны бабруйскага краю. Астатнія звесткі аб побыце, фальклоры, адзенні і абутку яго жыхароў па крупінцы збіраліся з іншых крыніц, аналізаваліся і абагульняліся навукоўцамі, краязнаўцамі. Дзякуючы гэтаму мы можам уявіць сабе свайго далёкага прашчура, даведацца, як ён жыў і чым займаўся.

Занятак. Акрамя земляробства і жывёлагадоўлі нашы продкі актыўна займаліся промысламі. У іх ліку — бортніцтва, своеасаблівы лясны промысел (ад слова «борць» — штучна выдзеўбанае ў дрэве дупло для пчол). У такіх борцях разводзілі і ўтрымлівалі лясных пчол (баровак). А развілося бортніцтва з дзікага пчалярства, калі чалавек выпадкова,

а пазней і свядома знаходзіў пчаліныя гнёзды ў дуплах дрэў, знішчаў агнём пчол і забіраў мёд.

Як самастойны від ляснога промыслу бортніцтва прайшло тры этапы развіцця: ахова і догляд дзікіх пчол у знойдзеных дуплах; свядомае ўтрыманне адселенага рою ў прыстасаваных пад борці натуральных дуплах; развядзенне і ўтрыманне рою ў спецыяльна зробленых борцях. Бортнікі выпрацавалі тэхналогію ўтрымання і догляду пчол, адмысловую тэхніку вырабу борцяў, бортных прылад і прыстасаванняў, посуду для перавозкі і захоўвання мёду, а таксама сродкі аховы борцяў, прававыя нормы. Прафесія бортніка перадавалася ў спадчыну ад бацькі да сына, якога ён з малых гадоў вучыў майстэрству. І толькі перад самай смерцю адкрываў свайму пераемніку глыбокія прафесійныя таямніцы: вучыў яго варажыць і перадаваў свой бортны знак, прылады і прыстасаванні, посуд для захоўвання і перавозкі мёду і інш.

Пазней, калі пачаўся заняпад бортніцтва, на Бабруйшчыне стала развівацца калоднае пчалярства: дупло для пчол выдзёўбвалі не ў жывым дрэве, а ў яго адсечанай ці абрэзанай частцы, якую ў народзе называюць калодай або вулеем.

Другім важным відам найстаражытнай гаспадарчай дзейнасці бабруйскага насельніцтва было паляўніцтва, якое дзесяткі стагоддзяў давала нашым продкам сродкі для існавання. З паляўнічых трафеяў выраблялі найпрасцейшыя прылады працы, зброю, упрыгожанні, адзенне і г.д. Пазней некаторая частка здабытку паляўнічых стала атрыбутам гандлю (футра пушных звяроў, каштоўныя часткі звяроў накшталт «бабровага струменя» для вырабу гаючых лекаў).

Спачатку паляванне было свабоднае. Але паступова дзяржава пачала наводзіць парадак і на лясных абшарах. У 1420 г. вялікі князь Вялікага княства Літоўскага Ягайла пастанавіў, каб прымаліся меры для ўзнаўлення ляснога статка. Ім жа быў цвёрда акрэслены і перыяд паляванння: пасля заканчэння восеньскіх палявых работ і да 7 красавіка (паводле старога стылю). Прыкладна ў той жа час узніклі і першыя запаведнікі на беларускай зямлі і на Бабруйшчыне ў прыватнасці. Статут Вялікага княства Літоўскага перасцерагаў браканьераў і прадугледжваў іх пакаранне. «Устава на валокі» (1557) дазваляла сялянам паляваць на сваіх валоках на воўка, лісіцу, расамаху, зайца, вавёрку і іншых дробных звяроў і птушак. Знаходжанне ў панскіх ці княскіх пушчах або каля іх са стрэльбай каралася смерцю. Паляванне з сабакамі на ваўкоў, лісіц і зайцоў было прызнана шкодным для пасеваў, ім забаранялася займацца нават шляхце.

Важнай формай гаспадарчай дзейнасці нашых продкаў было рыбалоўства. Іншае і ўявіць цяжка: як гэта жыць на берагах паўнаплынной Бярэзіны і не лавіць рыбу? Яе лавілі не толькі для сябе, а і на продаж. Спачатку сяляне рыбалоўнічалі свабодна, без абмежаванняў, але з цягам часу багацце вадаёмаў прыбіралі да сваіх рук мясцовыя памешчыкі. Ім як гаспадарам вадаёмаў ад кожнага вясковага двара плацілі невадную павіннасць, а ў каго не было грошай, той вымушаны быў вязаць сеткі для панскага двара, віць вяроўкі для невадоў, шнуры для сетак, выраблять іншае рыбалоўнае начынне.

А хіба можна жыць у такім лясным краі, якім была на той час Бабруйшчына, і не валодаць майстэрствам апрацоўкі драўніны? З яе ўмелыя рукі майстра выраблялі разнастайныя прылады працы. У сівую даўніну нават звычайная барана была цалкам зроблена з драўніны і называлася «сукаватка», таму што дзеля яе ссякалі сукаватую верхавіну елкі, потым яе акорвалі, а саму верхавіну высушвалі. Такая барана асабліва часта выкарыстоўвалася ў мясцінах, дзе глебы былі камяністыя. Нярэдка з гэтай жа мэтай прымянялі ся і «смыкі». А як не згадаць пра саху, сошку, рала, разак, плуг, сахор, мач, лапату, капач, матыку, сявенькі, вілы, цэп, абівалку і дзесяткі, а то і сотні неабходных у любой сялянскай гаспадарцы прылад працы?

А было яшчэ і народнае рамяство дрэваапрацоўкі, славутае тым, што яго таленавітыя майстры-самародкі са звычайнай плахі ства-

Сям'я беларускага селяніна з Бабруйскага павета на сваім падвор'і. 19 ст.

ралі цудоўныя мастацкія вырабы, непаўторныя па прыгажосці шэдэўры драўлянага разьбярства. Найперш гэта размаляваныя куфры, куды дзяўчына складвала свой пасаг ці дзе гаспадыня захоўвала ўсё самае дарагое з хатняга начыння. Простая прасніца ці матавіла, пры дапамозе якога звівалі маткі, рабіліся майстрам не як звычайная прылада працы. Чалавек, з-пад рук якога яны выходзілі, удыхаў у кавалак дрэва сваю душу, душу творцы. Ён ведаў: прылады гэтыя перажывуць яго і доўга будуць радаваць людзей. Але, мабыць, не думаў і не гадаў, што яны зоймуць пачэснае месца ў дзяржаўных музеях.

«Дамочак, як званочак...» Сялянскае жыллё і гаспадарчыя памяшканні — самыя распаўсюджаныя тыпы збудаванняў. Менавіта ў іх даўным-даўно зарадзіліся і шмат стагоддзяў развіваліся, удасканальваліся (а нешта і адмірала, бо гэтага патрабавала само жыццё) найважнейшыя прыёмы вясковага дойлідства. Гэта цэлая навука народнага майстэрства.

Колькі, напрыклад, мудрасці трэба, каб выбраць добрае дрэва! Не ў кожны свой прыход у лес селянін мог ссекчы дрэва-другое. Справа ў тым, што калі першыя тры дрэвы, да якіх падышоў лесаруб, яму чымсьці не спадабаліся, то ў гэты дзень, паводле народных уяўленняў, яму ўвогуле нельга іх валіць, бо гэта быў вялікі грэх. Лічылася, што дрэва на будоўлю лепш за ўсё ссякаць, калі месяц знаходзіўся ў сваёй апошняй квадры («у ветаху») — тады яно асабліва трывалае; ссечанае ў маладзік нядоўга прастаіць, а спілаванае паміж квадрамі («на зменах») сточыць шашаль. Ні адзін прадбачлівы гаспадар не павінен быў ссякаць дрэва, калі пачынаўся «сход» («гнілая квадра»), бо ў будыніне вельмі доўга будзе трымацца вільгаць. Самымі спрыяльнымі месяцамі для нарыхтоўкі лесу лічыліся сакавік і красавік, таму што веснавы сок рабіў драўніну мацнейшай.

Людзі меркавалі: нельга на пабудову браць вывернутае непагодаю дрэва, бо яго чорт вывернуў для сябе і разам з ім можа перасяліцца ў новую хату. Таксама нельга было выкарыстоўваць дрэва, што завісла на другім, бо такі будынак хутка згарыць. Селянін не браў для будаўніцтва рыплівае дрэва, бо ў збудаванай з яго хаціне людзі нібыта могуць часта хварэць, паміраць ці заходзіцца ад кашлю. Ёсць і іншы варыянт: у рыплівым дрэве жыве душа нябожчыка, і селянін, калі ссек дрэва, пазбавіў душу апошняга прытулку, за што яму прыйдзецца пакутаваць да смерці. Не падыходзілі для гэтай мэты і дрэвы, што, ссечаныя, падалі на поўнач: у збудаваным доме памрэ чалавек, а ў хляве — жывёла. Глядзелі таксама, каб на будоўлю не трапіла дрэва з «ваўком», г.зн. з чорным стрыжнем, — інакш сям'ю зноў-такі будуць даймаць хваробы і розныя няшчасці. Пералічаныя павер'і раней павінен быў ведаць кожны гаспадар, каб не трапіць у няміласць да лёсу.

Здавён вядомыя два асноўныя тыпы сялянскіх двароў: вянковы і пагонны. Першы з іх (яго яшчэ маглі называць вяночным) — больш старадаўні, бо нават у сваёй канструкцыі захаваў рысы абарончага збудавання. Ці не адтуль і пайшло славутае выслоўе «мой дом — мая крэпасць». Пры вянковай забудове ўсе гаспадарчыя памяшканні былі пастаўлены самкнёным па перыметры прамавугольнікам. На Магілёўшчыне гэты тып раней быў больш пашыраны. Калі паміж будынкамі заставаліся прамежкі, то іх закрывалі закладзенымі ў шулы бярвеннямі. Такая сцяна ўздымалася да двух метраў, а то і вышэй. Брама, якая нібы замыкала гэты хатні вянок, таксама рабілася масіўнай, з таўшчэзных плахаў, і запіралася з унутранага боку на дубовыя засовы.

У такім своеасаблівым прамавугольніку гаспадар умудраўся размясціць: хату, свіран, гумно, хлеў, павець, вазоўню, дрывотню, стайню, свінарнік, варыўню, склеп, куратнік, лазню, кузню, вяндлярню, майстэрню. У кожнага канкрэтнага гаспадара, бясспрэчна, нешта магло і адсутнічаць, але маглі стаяць яшчэ і іншыя вытворчыя будынкі: смалакурня, бандарня і г.д.

Каб узвесці дом, таксама майстэрства патрэбна. Здаўна вядомыя дзве канструкцыі зруба — слупавая і вяночная. З цягам часу апошняя выціснула першую і стала дамінуючай. Асновай вяночнай тэхнікі будаўніцтва з'яўляўся вугал, пры дапамозе якога вязалі вянкі бярвенняў. Але і сам вугал меў розныя канструкцыі і розныя назвы: «вугал у чашку», «вугал у каню», «просты замок», «чысты вугал».

Стрэхі мелі разнастайную форму, розныя варыянты апорнай сістэмы, а таксама розны дахавы матэрыял. На Бабруйшчыне найбольш пашыраныя былі двухсхільныя, з усечаным зверху франтонам. Накрывалі стрэхі саломай, чаротам, драніцай, гонтам, дошкамі. Завяршаў страху вільчык — грэбень, месца злучэння плоскасцяў абодвух схілаў страхі. Вільчык звычайна дэкаратыўна ўпрыгожваў-

ся рагамі, конскімі галовамі і іншымі выявамі жывёльнага і раслінага свету.

Вокны, дзверы, ганак, як правіла, таксама імкнуліся аздобіць, каб такім чынам вылучыць сваю хаціну сярод астатніх. На вільчыку, на франтоне, на вокнах з'яўляліся ў асноўным тры групы арнаментальных матываў: нябесныя целы, фауна і флора. Выразаныя ці высечаныя фігуркі-ўпрыгожанні маглі быць размаляваны рознакаляровымі фарбамі.

Вёскі на Бабруйшчыне часта знішчаліся пажарамі, руйнаваліся ад шматлікіх войнаў, але яны, нібы неўміручыя казачныя птахі, адбудоўваліся на руінах і папялішчах. Ды яшчэ як адбудоўваліся! Дамы — адзін у адзін: кожны дамочак — як вяночак.

Адзенне і абутак. Адзенне бабруйскіх сялян і сялянак не вызначалася нейкімі незвычайнымі асаблівасцямі. Паколькі амаль усё выраблялася саматужным спосабам (справедку нашы продкі апрацоўвалі скуру, футра, воўну, пралі і ткалі), то сяляне найперш імкнуліся, каб вопратка была трывалай і зручнай. Дэкор касцюма быў суладны з мелодыяй народнай песні, пластыкай танца, строгай велічнасцю драўлянага дойлідства. Ён натуральна ўпісваўся ў беларускі краявід, гарманіраваў з інтэр'ерам тутэйшых хацін, з яго самабытнай мэбляй, ручнікамі, абрусамі. Тканіны выраблялі ў хатніх умовах, фарбавалі карою альхі ды балотнаю рудою, наносілі на яе потым вышываны арнамент (звычайна чырвонага ці зялёнага колеру). Справа ў тым, што зялёнае сімвалізавала абуджэнне прыроды, вяртанне да жыцця пасля працяглага зімовага сну, а чырвоны колер — само жыццё. Даволі часта сустракаўся не вышываны, а набіваны арнамент.

У пераважнай большасці народны касцюм быў традыцыйны і складаўся з адных і тых элементаў. Жаночы камплект сялянскага касцюма ўключаў сарочку, спадніцу, фартух, безрукаўку. Сарочкі ўпрыгожваліся тканымі і вышыванымі ўзорамі на верхняй частцы рукава, каўняры, грудзях, манжэтах. Безрукаўку апраналі зверху на сарочку, яна магла быць рознага крою. Кофта, якая прыйшла на змену безрукаўцы, была прамая, з доўгім рукавом. Спадніцу шылі з даматканага палатна, сукна і купленай матэрыі. Фартух паяском замацоўваўся на таліі.



Селянін Бабруйскага павета ў нацыянальным адзенні. Канец 19 — пачатак 20 ст.

Камплект мужчынскага адзення, характэрны для Бабруйшчыны, складаўся з сарочкі, штаноў, пояса і часам безрукаўкі. Штаны шылі з палатна, сукна, паўсукна белага, шэрага і чорнага, сарочку — з палатна з выразам вакол шыі, з адкладным або стаячым каўняром. Пояс мог быць плецены, тканы ці вязаны, вырабляўся з суконных і паўсуконных нітак. Канцы яго звычайна ўпрыгожвалі рознакаляровымі кутасамі. Былі таксама распаўсюджаны і скураныя паясы — папругі.

Зімовая вопратка любой назвы і крою была даўгаполай, з доўгімі рукавамі, стаячым або адкладным каўняром, зашпільвалася на гаплікі і завязвалася поясам. Насілі яе як мужчыны, так і жанчыны. Тут можна прыгадаць бурку, казачынку, куртку, кажух, кажушок. Кожная з гэтых адзежын павінна была засцерагаць людзей ад лютых маразоў, ад моцных зімовых вятроў. Відаць, колькі слоў трэба сказаць і пра галаўныя ўборы. Да жаночых адносіліся: намётка, тканка, чапец, каптур, шапка, павязка, вянок, а да мужчынскіх — магерка, аблавуха, кучма, капуха, капялюш, картуз.

Даўнімі традыцыямі было вызначана, якое адзенне насіць у будні ці свята, надзяваць на вяселле ці на радзіны, падчас радасці ці жалобы. Напрыклад, у пост хадзілі ў пасцяным касцюме, у якім адсутнічаў чырвоны (радасны, жыццядайны) колер. У самыя прыгожыя строі ўбіраліся падчас працоўных урачыстасцей: выгану жывёлы на «юраўскую расу», на свята першай баразны, першага снапа альбо першага пракоса.

З абутку найперш варта ўспомніць ліпавыя ці лазовыя лапці, у якіх выгадавалася і прайшло па жыцці шмат пакаленняў нашых продкаў. Беднякоў пагардліва называлі «лапцюжнікамі», бо яны ўзімку і ўлетку хадзілі ў лапцях. Той, хто ўзбіваўся на лішнюю капейку, абавязкова абзаводзіўся «святочным», «выходным» абуткам, бо паўсядзённым усё роўна заставаліся лапці. Да іх яшчэ патрэбны былі абгорткі (анучы, завойкі), якімі да шчыкалаткі абмотвалі ногі. Найчасцей гэта рабілі

жанчыны пры хадзе басанож, асабліва ў час жніва. Прывязкі (аборы, валокі) вілі з пянькі, з конскага воласа або наразалі са скуры. На Бабруйшчыне былі пашыраны тыпы лапцей: шчарбакі і кавярзні. Найбольш вядомыя — лапці касога і прамога пляцення.

Скураны абутак падзяляўся на два віды: шыты з аднаго кавалка — пасталы і з прашытай падэшвай і абцасам — боты і чаравікі. Святочным абуткам вяскоўцаў-бабруйчан (як мужчын, так і жанчын) лічыліся таксама чобаты, інакш іх называлі выцяжкамі. Яны мелі высокія халявы, і паколькі кожная пара абутку шылася пад заказ, то была старанна падагнана да ног. Жанчыны, асабліва дзяўчаты і маладзіцы, любілі на святы абуваць боцікі ці шнуроўкі. Іх шылі з завостраным наском, невысокімі халяўкамі і высакаватымі абцасамі.

Да зімовага абутку прад'яўлялася адно галоўнае патрабаванне: каб нагам было заўсёды цёпла і ўтульна. І тут ужо было не да прыгажосці. Можна назваць тыя ж лапці, пасталы, толькі ўжо з зімовымі анучамі, і валёнкі, якія з'явіліся пазней (прыкладна ў канцы 19 ст.). Былі яшчэ бахілы. На іх, як і на валёнкі, абувалі глыбокія галошы, што засцерагалі ногі ад вады.

Звычаі і абрады. Усё жыццё бабруйскага селяніна было цесна і арганічна знітавана са шматлікімі абрадамі, звычаямі, павер'ямі.

Самае першае знаёмства чалавека з белым светам — гэта яго нараджэнне. Пасля хрышчэння ў царкве дзіця прыносілі дамоў, склікалі гасцей. Першай запрашалі бабку-павітуху. Тая прыходзіла з падарункамі, купала дзіця, спавівала яго. За стол садзілі спачатку кума і куму, павітуху, жонку кума, а потым — астатніх гасцей. Пасля першай чаркі бабка-павітуха падавала на стол так званыя буракі — ежу, прыгатаваную з мяса, каўбас, буракоў, вострых прыпраў. Пасля буракоў на стол падаваўся гаршчок кашы. Госці куплялі порцыю кашы за грошы. Больш за астатніх павінен быў даць кум. Заплаціўшы, той разбіваў гаршчок на стале. Госці навыперадкі хапалі кашу і крычалі: адны «горка!», другія «салодка!».

На другі дзень застолле павінна была ладзіць павітуха. Калі яна адмаўлялася весці гасцей у сваю хату, яе садзілі ў ночвы або на барану і вазілі са смехам па двары. За бабку часцей за ўсё бралі каго-небудзь з родных (цётку, сястру, маці). Яна сама выбірала куму і кума. На хрэсьбіны госці ішлі з падарункамі, каб малому заўжды добра і багата жылося.

Самыя цёплыя словы песень, якія выконваліся на такім застоллі, адрасаваліся парадзісе: «А хто к ёй прыхінецца, той розуму набярэцца, піва і віна нап'ецца». У адказ — поўныя падзякі за такія адносіны да сябе словы маладой маці: «Самыя дарагія першыя госцікі — бацька з маці, другія госцікі — братка з сястрой, а трэція госцікі — кум з кумой. Дзед і баба — уся парада». У песенных

Вясковы кірмаш у Бабруйскім павеце. Пачатак 20 ст.

сюжэтах пра бацькоў захаваны вобраз бабруйчаніна: працавітага, нешматслоўнага, скупога на ласку. У хрэсьбінных песнях гаспадар звычайна параўноўваецца з кавалём, які «малаточкам не стукаў, у ручкі не хукаў, лучынкі не паліў, сямейкі не будзіў і сыночка сабе нажыў».

Нараджэнне дачушкі ў хрэсьбінных песнях апісвалася не надта радасна, бо дзяўчына як падрасце, то пойдзе да чужых людзей «ва ўслужэнне», пакінуўшы родных, і не будзе ім ад яе ніякай дапамогі. Гаспадар, звяртаючыся да бабкі-павітухі, казаў: «Калі сына жонка нарадзіла, то я мёду здабуду, а калі дачку, то і так перабуду».

Значнае месца ў радзіннай паэзіі адводзіцца куму і куме. Роля іх вядомая — яны прысутнічалі пры хрышчэнні малога, былі яго хроснымі бацькамі. Таму і садзілі іх на самым ганаровым месцы — побач з бабуляй і гаспадарамі на покуці. І велічальныя песні ім спявалі, як і бабулі. Праўда, адрасаваліся кумам не цэлыя песні, а толькі асобныя звароты.

Хрэсьбінныя песні, як і сама радзінная ды хрэсьбінная ўрачыстасць, закліканы былі хоць на кароткі тэрмін адарваць вяскоўца ад будзённых клопатаў, забыць пра цяжкасці лёсу, з пяшчотай і ласкай паглядзець на ўласных дзяцей, пагаманіць з роднымі і блізкімі, абмеркаваць навіны, выпіць чарку-другую «віна зелянога», зацягнуць старадаўнюю песню, якую спявалі яшчэ дзяды-прадзеды.

Другім надзвычай багатым абрадам бабруйскіх вяскоўцаў быў вясельны: відаць, самы непаўторны, своеасаблівы і арыгінальны. Размова пра вяселле пачыналася са сватання. У гэты час вырашалася, быць вяселлю ці не. Справа адбывалася пераважна позняй восенню, калі галоўныя гаспадарчыя работы ўжо скончаны. Ішлі ў сваты часцей за ўсё ўвечары. Здаралася, што разам ішоў і будучы жаніх. Ад галоўнага свата, ад ягонага ўмення «трымаць язык па ветры», залежала вельмі многае. Ён адзін мог «абкруціць» усё так, што ні жаніху, ні тым болей бацькам такое нават і не снілася. Быў тады і добры пасаг, і прыгажуня дзяўчына, і слава-пагудка пра тое, як добра ды ўмела ўсё атрымалася. Таму ў сваты выбіралі людзей паважаных, спрактыкаваных, такіх, каб іх не трэба было «цягнуць за язык».

У доме дзяўчыны звычайна ўжо чакалі прыезду сватоў і, канешне ж, старанна рыхтаваліся да такой адказнай падзеі. І гаспадары, і іхняя дачка апраналіся па-святочнаму і стараліся незаўважна сачыць за вуліцай, ці не едуць, ці не ідуць сваты. Пры размове сватоў дзяўчына не прысутнічала. Калі ж прасілі паказаць ім нявесту, то бацькі спачатку паказвалі не яе, а сяброўак ці малодшых дачок, але сваты дабіваліся свайго. У знак згоды на шлюб дзяўчына дарыла бацькам жаніха ручнік (для бацькі) і хустку (для маці). Бацькі і сваты ўдакладнялі час вяселля. Калі ж дзяўчына не хацела ісці замуж або жаніх не падабаўся бацькам, то яны знаходзілі варыянт ветлівай адмовы, каб не пакрыўдзіць дарма людзей.

Праз нейкі час пасля сватання ў доме нявесты гулялі запоіны. Тут дзяўчыну як бы «запівалі» да роду жаніха, і пасля гэтага яна ўжо не мела права адмовіцца ад замужжа. Звычайна запоіны прызначалі на вечар (у суботу ці нядзелю). Жаніх з бацькамі і бліжэйшымі сваякамі (чалавек да 20) ішлі да нявесты. Калі яны заходзілі ў хату, нявеста хавалася, каб яе не ўбачылі. Затое сама хацела ўбачыць жаніха першай, каб у будучым сямейным жыцці верхаводзіць мужам. Потым яна выходзіла да гасцей, віталася, але прывітанне яе было незвычайнае. Кожнаму з гасцей падавала руку — гэтым падкрэслівала сваю згоду належаць да іх роду. Перад тым як разысціся, бацькі маладых абменьваліся хлебам. Нявеста давала бацькам жаніха бутэльку з зернем жыта: знак, што яна ўручае ім сваё жыццё, сваю долю. Маці жаніха гэтае зерне рассыпала на сваім падвор'і, каб разам з новым чалавекам у яе хату прыйшлі дабрабыт і шчасце. Ад запоін да вяселля нявеста павінна была насіць толькі заплеценую касу. Тым самым падкрэслівалася, што нявеста развітваецца з дзявочым жыццём. А вось пасля вяселля хадзіць з касой яна не мела права.

Вяселле прызначалі праз тыдзень-два пасля запоін. Залежала гэта ад таго, ці паспеюць бацькі падрыхтавацца. І пачыналася яно з заручын (яшчэ іх называлі змовінамі). Далей ішоў каравай, зборная субота, вяселле ў маладой, маладога, пярэзвы.

Сустрэча маладога ў хаце нявесты нагадвала сабою своеасаблівы торг, спрэчку. Усё з-за таго, што сяброўкі патрабавалі за нявесту выкуп у сватоў. Падчас вяселля нявесту саджалі на накрытую кажухом дзяжу: тут яна павінна была расказваць толькі праўду. Шафер расплятаў ёй касу. Потым хрышчоная маці пакрывала дзяўчыну якой-небудзь матэрыяй, працягвала праз пярсцёнак пасмачку валасоў, застрыгала іх і падсмальвала свечкай. Затым выпівала з маладой трошкі віна і

садзілася побач з ёю. Тут да нявесты падыходзіла яе маці з іконай у руках і бласлаўляла дачку на шлюб. Паступова вяселле набліжалася да кульмінацыі — развітання маладой з роднымі, з бацькоўскім домам, з дзявоцтвам. Ад'езд да маладога — адзін з самых драматычных момантаў вяселля і, мабыць, самы старажытны. Ніхто ў гэты час не можа стрымацца, усе плачуць і спяваюць развітальныя песні.

Каля хаты маладога насустрач жаніху і нявесце выходзяць свёкар і свякроў. Свёкар ссаджвае маладую з воза на кажух. Свякроў ставіць хлебную дзежку: калі маладая «чэсная», яна без лішняга роздуму садзілася ці станавілася на дзяжу. А не дай Бог, калі нявеста падманвала і падман яе выкрываўся, то яе чакалі вялікія непрыемнасці. Свёкар браў нявестку за руку і падводзіў да хатняга парога. Тут маладая аддавала падарункі радні маладога: свёкру звычайна дарыла пояс, свекрыві — фартух, а залоўкам — грабяні.

Раней маладая, «як замужам пабудзе», мусіла аддаваць свекрыві сваю начную кашулю. Свякроў, калі нявестка на самой справе аказалася «чэсная», выносіла тую кашулю ў двор, паказвала ўсім, загортвала ў яе бутэльку гарэлкі і аддавала прыданым, каб тыя потым перадалі гэта маці маладой. Усе, задаволеныя тым, што «маладая няславы не нарабіла», ішлі ў хату, да гасцей падыходзіла сама нявеста разам з жаніхом, і пачыналася частаванне.

Увечары прыданыя ад'язджалі дадому. Гэта заўсёды цяжкая хвіліна для маладой, бо родныя ўжо будуць ад яе далёка і не падтрымаюць. Прыданыя ад'язджалі заўсёды шумна, весела.

Пасля вяселля праз тыдзень або праз некалькі дзён (у залежнасці ад таго, як дамаўляліся бакі) адбываліся пярэзвы. Бацькі маладога запрашалі да сябе бацькоў маладой і некаторых іншых гасцей. Цесць з цешчай ехалі да зяця, каб даведацца, як жывецца іхняй дачцэ «ў чужой старане».

Пярэзвы — апошняя ступень вяселля. Далей пачыналася самастойнае жыццё маладой пары, на якое выпадалі і выпрабаванні і шчасце.

Кажуць, што век чалавечы нядоўгі. За маладосцю ішлі сталасць, а потым і старасць. І таму яшчэ адзін з самых пашыраных абрадаў на Бабруйшчыне — гэта пахавальны. Людзі паміралі заўсёды. Старыя і маладыя. Смерць не выбірала.

Адчуўшы набліжэнне смерці, хворы, калі быў пры памяці, прасіў паклікаць бацюшку для апошняй споведзі. Да яго прыходзілі сябры, суседзі і родныя, прасілі дараваць, калі што было не так, а ён у сваю чаргу прыгадваў нейкія свае ранейшыя грахі, каб памерці «з лёгкаю душою». Калі ж кананне было надта цяжкім, то блізкія людзі развязвалі вузлы, расшпільвалі гузікі, адмыкалі замкі. Даходзілі часам і да большага: адчынялі дзверы ў хаце, вароты ў хляве, душнікі ў коміне, вымалі верхні касяк дзвярэй, пасылалі да свяшчэнніка, каб той адкрыў у царкве царскія вароты. Давалі канаючаму ў рукі свечку: калі дым слаўся па нізе, то лічылі, што смерць ужо зусім блізка, а калі ішоў угору, то думалі, што справа пойдзе на папраўку.

Калі ж чалавек паміраў, то найперш яму шчыльна закрывалі (падвязвалі) рот і заплюшчвалі вочы, каб дарма не глядзеў і «яшчэ каго з сабою не забраў». Пасылалі каго-небудзь у царкву, каб пазванілі і паведамілі наваколлю пра смерць чалавека.

На ўсіх вясковых могілках сваякоў стараліся хаваць сем'ямі, «каб у госці адзін да аднаго хадзілі». Стаўлялі над магілаю крыж, а на ім вешалі фартушкі, ручнікі з той жа мэтай, што і ў хаце ў час жалобы. Крыж на магіле ставілі або ў галавах, або ў нагах. Часта на магілах садзілі кветкі, якія пры жыцці любіў нябожчык, ці дрэвы.

Традыцыйным завяршэннем пахавальнага абраду (за выключэннем самазабойцы) былі памінкі, куды ўсе прысутныя на пахаванні абавязаны былі з'явіцца.

Варта заўважыць, што вяскоўцы надзвычай многа адзначалі рэлігійных свят. Яны з нецярплівасцю чакалі нядзелі, свята ці прысвятка, каб пайсці да царквы, адстаяць там службу, а заадно пабачыцца з роднымі, блізкімі, сябрамі, якія воляю лёсу павінны былі выехаць з роднай вёскі і жыць недзе непадалёку. Вядома ж, усе імкнуліся пабачыцца, пагаманіць, абмяняцца навінамі.

Да найбольш важных рэлігійных свят адносяцца: Каляды, Вялікдзень, Сёмуха (Духа), Пятро, Ушэсце, Спас.

Каляды пачынаюцца з 6 студзеня святкаваннем поснай куцці, працягваюцца шчадрухай (багатай куццёй) напярэдадні Новага года па старому стылю (13 студзеня) і заканчваюцца 19 студзеня. Агульныя калядкі паказваюць свята як адраджэнне нейкай міфічнай першакрыніцы. Яго сутнасцю і з'яўляецца вобраз язычніцкай Каляды, якая і ў хрысціянстве захавала многа першароднага. Недзе там, далёка-далёка, пачыналіся змены

ў навакольным свеце, «пасярод двара едзе Каляда», садзіцца ў хаце ў «чырвоным куце».

У рэальным жыцці Каляды звязаны з пачаткам новага астранамічнага года, з «паваротам сонца з зімы на лета». Усебакова малююцца ў калядных песнях вобразы гаспадароў: яны і добрыя, і шчырыя, і спагадлівыя, у іх і багацце ёсць, і хлеба хапае, і жывёлы поўныя хлявы. Тут нават самы бедны ў вёсцы чалавек заўсёды маляваўся «багатым князем». Не, людзі да яго не падлашчваліся, каб ён ім нешта даў, проста яны жадалі гэтаму гаспадару багацейшага года, поспехаў і здароўя, а таксама ўраджаю, ды такога, якога ў яго жыцці яшчэ і не было. І хоць згадваюцца сам «пан Бог», «святыя памочнікі», усё ж адчуваецца, што менавіта сам вясковец з'яўляецца стваральнікам уласнага шчасця і дабрабыту. Менавіта гаспадару зычаць «з токам жыта», яго жонцы — «шубу да долу», а дочкам — «па вяночку руцьвяненькім», сынам жа — «па коніку вараненькім». Жадаюць усяго гэтага калядоўшчыкі.

Тут адчуваецца подых старадаўніх часоў, бо разам з людзьмі ходзяць па сялянскіх хатах і прататыпы культавых некалі жывёлін: каза, мядзведзь, кабыла, птушка-жораў і абавязкова механоша з кавалём. Кожны раз цэнтр святкавання пераносіцца з адной хаціны ў другую. Сярод згаданых жывёлін найбольш шанавалі і абагаўлялі казу, якая лічылася пасланніцай бога Перуна на зямлі. Менавіта яна, бегаючы па сялянскіх палях, прыносіла добры ўраджай, таму і спявалі пра яе: «Дзе каза ступою, там жыта капою, дзе каза рогам, там жыта стогам». Гаспадар, які добра частаваў калядоўшчыкаў, у падзяку ад іх атрымліваў песню, дзе зычыліся яму і ўраджай, і багацце, і здароўе на будучы год, а калі нечым не дагадзіў, пашкадаваў нечага, то і чуў у свой адрас не надта спагадлівыя словы песні. Асабліва радавалася Калядам моладзь, бо за гэтае свята можна было добра адпачыць ад цяжкай фізічнай працы і падрыхтавацца да вясенне-летняга гаспадарчага цыкла. Была магчымасць пазаляцацца да дзяўчат, пацешыцца гульнямі («пажаніць Цярэшку», згадаць старажытнага «Яшчара»), паваражыць (асабліва дзяўчатам пра свой лёс).

Мабыць, самым урачыстым было вясенняе свята Вялікдзень. Яно і не дзіўна, бо менавіта ў гэты час ужо абуджалася прырода, прыляталі з выраю птушкі. Вясенні подых навакольля перадаваўся і сялянам. Нездарма ж спрадвеку лічылася, што вясна — пара маладосці, кіпучага жыцця, веры ў лепшае будучае. Тыя з бабруйчан, што свята верылі ў Хрыста, перад Вялікаднем ажно сем тыдняў пасцілі. І цяпер, нарэшце, яны маглі аскароміцца, наесціся ўволю, лічачы, што сваёй стрыманасцю ў час посту трохі замалілі мінулыя грахі.

Урачыстае богаслужэнне ішло ў праваслаўных храмах. У Вялікую («Чырвоную») суботу Велікодная ўсяночная пачыналася з хрэснага ходу. Жыхары бліжэйшых вёсак, мястэчак, хутароў неслі ў царкву свяціць булкі, мяса, паскі, яйкі, сыр і іншую ежу. Святочная ютрань заканчвалася раніцай, прычым даволі своеасабліва — заклікам свяшчэнніка (ці свяшчэннікаў) да піру. У кожнай сялянскай хаціне да гэтага быў ужо накрыты стол і чакалі толькі тых, хто паехаў ці пайшоў на ўсяночную, каб яны прынеслі пасвячоныя стравы. На святочны, можа, толькі для гэтага дня зберажоны абрус гаспадыня ўжо паклала ў адвольным парадку засмажанае парася і каўбасы, шынку і паляндвіцу, сыры, пафарбаваныя яйкі, абавязкова свежанацёрты і прыпраўлены чырвонымі буракамі хрэн, а таксама паставіла віно і гарэлку.

Святкавалі Вялікдзень тры дні: у першы дзень дружна сядзелі за сваім сталом, стараліся нават не думаць аб працы, бо гэта быў адзін з тых дзён, калі «сама птушка гняздзечка не ўе, а дзяўчына русу касу не пляце». На другі дзень, па ранейшай дамоўленасці, да некага аднаго з родзічаў з'язджалася ці сыходзілася «ўся радзіна». Абавязковым, непарушным атрыбутам такіх сустрэч было хрыстосаванне і частаванне адно аднаго пафарбаванымі яйкамі, у тым ліку выразанымі з дрэва, злепленымі з гліны і г.д. На трэці дзень пачыналася ўсеагульнае гулянне, калі і старыя, і малыя «знаходзілі сабе раду». Вечарам таго ж дня вясковыя хлопцы збіраліся ў кампаніі (ад 5 да 10 чалавек) і «хадзілі валачобнікамі» па хатах. Спявалі валачобныя песні, праслаўлялі гаспадароў і іхнія сем'і, жадалі ім усяго найлепшага, а іх за гэта адорвалі пірагамі, каўбасамі, гарэлкай, а калі — і грашыма.

Пасля Вялікадня, на дзевяты дзень, наставала «свята памерлых» — Радаўніца (або Радуніца). Калі блізка была царква, то яе святар служыў на могілках паніхіду па ўсіх тут пахаваных. Калі ж не было, то людзі проста прыходзілі, засцілалі абрусам магілку, раскладвалі ўсё прынесенае з сабою і паміналі нябожчыка, які тут ляжаў. Распавядалі яму, як у іх ідуць справы, які быў летась ураджай,

якімі клопатамі яны жывуць зараз, на што спадзяюцца і г.д. Перад адыходам пакідалі на магіле крыху ежы і гарэлкі ці віна ў шклянцы — «для нябожчыка».

На Сёмуху (Духа) бабруйчане-вяскоўцы ўпрыгожвалі свае хаціны, падворкі, хлявы і іншыя пабудовы «маем»: галінкамі клёна, дуба, бярозы, рабіны. Падлогу ў хаце пасыпалі свежазрэзаным аерам. Перад уваходам у жытло некаторыя гаспадары ставілі ссечаную маладую бярозку. Свята гэтае — прамы водгук вельмі даўніх язычніцкіх часоў, калі чалавек быў перакананы, што ўсё навокал мае жывую душу. А як жа іначай, калі вясною дрэвы і краскі распускаліся, а восенню яны ападалі, знікалі зноў да цёплых часоў. У хрысціянстве ад гэтага ўсеагульнага пакланення назаўсёды засталася Сёмуха.

А як не згадаць пра Купалле? Яно таксама бярэ пачатак з ранняга язычніцтва, але добра захавалася да нашага часу. Вечарам у полі, на высокім пагорку або паблізу вадаёма, збіраліся жыхары навакольных населеных пунктаў. Ноччу быў самы разгар свята: вогнішчы, песні, гулянні. Цераз агонь скакалі, вакол танцавалі. У песнях часта згадвалася дачка Купалы — Купалінка. Дзяўчаты ў гэтую ноч варажылі аб будучым замужжы, пускалі вянкі па рацэ. Мясцовыя варажбіты, кожная з гаспадынь імкнуліся ў гэты час (вечарам або ноччу) назбіраць зёлак, траў, карэння, галінак кустоў і дрэў, бо менавіта Купалле было самым «гаючым» перыядам. Збіралі пераважна мяту, багаткі, буйрак, пералёт, лопух, быліцу, расходнік.

Але ўсім кветкам кветкай на Купалле лічылася папараць, якая нібыта цвіце толькі раз у год і прыпадае цвіценне менавіта на гэтую ноч. Хто знойдзе і сарве кветку, набудзе здольнасць не толькі бачыць схаваныя глыбока пад зямлёю скарбы і стаць іх уладаром, але і разумець мову лясоў і бароў, птушак і звяроў, прадбачыць беды і пошасці. Сіла гэтай кветкі такая, што яна без цяжкасці адмыкае любыя дзверы і замкі, разбурае перашкоды, здабывае ўсё, што задумаецца, выконвае любое, нават самае нязбытнае, жаданне, знішчае нагаворы-шэпты «чорных» чараўнікоў. Праўда, сцвярджалі, што, якое б вялікае ні выпадала багацце, асаблівай радасці свайму ўладару папараць-кветка не прыносіла. Такі чалавек паступова чарсцвеў душою, рабіўся злым, жорсткім, бязлітасным, імкнуўся яшчэ болей разбагацець. Ён звязваўся з нячыстай сілаю, прадаваў ёй сваю душу і ўрэшце паміраў, пакінуты жонкаю і дзецьмі, бо ніхто не мог з такім сквапнікам ужыцца. Пасля яго смерці ўсе каштоўнасці ператвараліся ў лісце, друз, груду камянёў.

У гэтым пераліку свят неабходна згадаць і Спас. Іх тры: мядовы, яблычны, хлебны. Хлебны быў самы важны, бо вянчаў сабою жніво, таму і не дзіўна, што ў некаторых мясцінах ён святкаваўся як дажынкі. У гэты дзень упрыгожвалі стужкамі і кветкамі «бараду». Ахвяравалі хлеб і соль духу нівы Вялесу (або Воласу), на гэтым тэатралізаваным відовішчы ён яшчэ нагадваў сабою казла. «Воласаву бараду» жнейкі неслі гаспадару і ставілі на покуці. Зерне і каласкі з «барады» скарыстоўвалі на працягу года ў розных традыцыйных абрадах. Канец жніва сімвалізаваў сабою і хуткую змену надвор'я, таму невыпадкова гаварылі: «На трэцім Спасе трымай рукавіцы ў запасе». Не за гарамі была позняя восень, а там і піліпаўскі пост — пярэдадзень Каляд.

Архітэктурная даўніна. Уяўленне аб матэрыяльнай культуры, духоўным жыцці нашых продкаў з пакалення ў пакаленне перадаюць помнікі дойлідства. Яны — плён натхнёнай архітэктурнай творчасці народа, крышталізацыя яго духу, майстэрства, тэхнічных здольнасцей. Праз шэдэўры свайго дойлідства народ заяўляе пра сябе ўсяму свету. Таму гэтыя шэдэўры складаюць нацыянальны гонар, застаюцца сімваламі дзяржаўнасці, нацыянальнай адметнасці.

Беларуская зямля, спрадвеку расчлянёная на прыватнаўласніцкія ўладанні, маёнткі, сядзібы, была пакрыта густой сеткай палацава-паркавых і сядзібных архітэктурных ансамбляў. На Бабруйшчыне гэта галіна архітэктурнай спадчыны прадстаўлена сядзібай бабруйскага старасты ў вёсцы Брожа. Паводле звестак інвентара 1638 г., сядзіба складалася з панскага двара і гаспадарчага фальварка. Двор, абнесены астрогам, меў двое варот: галоўныя, уязныя, з залай наверсе, і тыльныя, з веснічкамі. На тэрыторыі двара было 6 жылых дамоў, склеп (піўніцы), стайня і два свірны. Галоўны «вялікі доўгі» дом складаўся з жылога і гаспадарчага карпусоў, злучаных дашчаным пераходам. У глыбіні двара знаходзіліся зрубны склеп (піўніца), стайня, аб'ядноная з абозняй, два свірны на падклецях. Гаспадарчы комплекс размяшчаўся за тыльнымі варотамі двара. Фальварачны двор не меў агароджы, уключаў два жылыя дамы (пастуха і вінакура), сырніцу на слупах, вінакурню пад стаўком, свінарнік (хлеў для вепраў). Абора, абнесеная жэрдкамі, уключа-

ла 6 хлявоў і мела двое варот: ад фальварачнага двара і з боку поля, адкуль прывозілі снапы. Тут размяшчаліся два крытыя такі, ёўня, два свірны, склеп для гародніны.

На беларускай зямлі заўжды з глыбокай пашанай ставіліся да Бога. Сведчанне таму — велічныя высокамастацкія храмы разнастайных канфесій. Сваёй талерантнасцю (памяркоўнасцю) беларусы могуць ганарыцца. Ім уласцівая агульначалавечая гуманістычная рэлігійнасць, таму і іх хаты заўсёды адчынены для вандроўнікаў любога веравызнання.

Сівыя муры храмаў у іх цяжкім маўчанні даносяць да нас шматвяковую гісторыю народа, шматпакутны лёс нацыі, яе імкненне да рэальнага зямнога дабрабыту, міру, ушанавання рэлігійных, па сутнасці, чалавечых ідэалаў. Беларус у гадзіну ліхалецця і параўнальнага спакою нёс свае пакуты і пачуцці да царкоўнага алтара, ускладаў на яго свае надзеі і веру ва ўсё лепшае. Таму храмы — гэта сумленне нацыі, святыні, якія беражліва з пакалення ў пакаленне ахоўваў ад войнаў і гістарычных катаклізмаў народ, каб перадаць нашчадкам іх неацэнны духоўны скарб, неразменную каштоўнасць — душу нацыі.

У мястэчку Глуша, якім валодаў генерал-паручнік польскага войска граф Іосіф Ядзіцкі, меўся мураваны бернардзінскі кляштар, які ўтрымлівалі 15 ксяндзоў. Каля кляштара існаваў рынак, на які з'язджаліся па нядзелях з навакольных вёсак сяляне з харчовымі прыпасамі.

У маёнтку графа Забелы ў вёсцы Дурынічы была родавая капліца-пахавальня. Са стварэннем у ёй алтара ў 1905 г. графам Шыманам Забелам быў атрыманы дазвол на будаўніцтва капліцы. Архітэктура яе мела рысы мадэрна, сама капліца была складзена з чэсанага каменю, а ўсё ўнутранае начынне выканана з чорнага дубу. На хорах быў устаноўлены прывезены з Прагі арган.

У другой палавіне 19 — пачатку 20 ст. надзвычай шырокія маштабы набыло праваслаўнае царкоўнае будаўніцтва. Праз яго рускі царызм імкнуўся сцвердзіць «спрадвечнасць» сваіх правоў на тутэйшыя тэрыторыі як «исконно русские земли». У сувязі з гэтым узнікла шмат манументальных царкоўных будынкаў, пастаўленых на грошы і рукамі мясцовага праваслаўнага сялянства.

У цэнтры вёскі Цялуша на мяжы 19—20 ст. пабудавана мураваная царква — помнік архітэктуры рэтраспектыўна-рускага стылю. Руставаны цокаль з ружовага пясчаніку. Адназальны храм з паўкруглай апсідай, бабінцам і званіцай над уваходам. У аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі дамінуе трох'ярусная званіца з шатром. Асноўная квадратная ў плане зала пакрыта пакатым чатырохсхільным дахам з 5 цыбулепадобнымі галоўкамі. Сцены сіметрычна крапаваны трайнымі закамарамі. У інтэр'еры шмат мураванага дэкору — аркатура, прафіляваныя карнізы і паясы, паўколоны, нішы. Нізкая паўкруглая апсіда з пірамідальным дахам і бабінец дэкараваны аркатурным фрызам. Прамавугольныя аконныя праёмы абрамлены масіўнымі пластычнымі ліштвамі з «бочкамі» і кілепадобнымі броўкамі. Цэнтральная зала ўнутры перакрыта корабавым скляпеннем. У першым ярусе званіцы з васьмігранным самкнутым скляпеннем вылучаны бакавыя дапаможныя памяшканні, у адным з якіх лесвіца на званіцу.

У цэнтры вёскі Туркоўская Слабада ў пачатку 20 ст. пабудавана царква — помнік народнага драўлянага дойлідства. Пазней да галоўнага фасада прыбудавана двух'ярусная званіца (васьмярык на чацверыку) з шатровым завяршэннем і цыбулепадобнай галоўкай. Асноўны прамавугольны ў плане аб'ём накрыты вальмавым дахам. Бакавыя фасады раўнамерна прарэзаны прамавугольнымі аконнымі праёмамі ў ліштвах. Ва ўнутранай прасторы — вузкі бабінец з бакавым уваходным праёмам.

У вёсцы Панюшкавічы дзейнічала Свята-Раства-Багародзіцкая царква, пабудаваная ў 1891 г. (існавала да Вялікай Айчыннай вайны). Яна ўяўляла сабой драўляны храм на бутавым падмурку, абшыты дошкамі, накрыты бляшаным дахам, пафарбаваным у зялёны колер і завершаным дзвюма цыбулепадобнымі галоўкамі. Над прытворам узвышалася аднаярусная званіца. Пры царкве ў 1915 г. была адкрыта царкоўнапрыходская школа — драўляны будынак пад гонтавым дахам.

Архітэктурная праваслаўнацаркоўная спадчына Бабруйшчыны была б куды багацейшая, калі б у часы атэістычнага наступу (у савецкі час) не зніклі праваслаўныя храмы ў вёсках Гарбацэвічы, Залужжа, Міхалёва, Свіслач, Туркі.

З далучэннем да Расійскай імперыі распачаліся перапланіроўкі гарадоў, будаўніцтва дарог, паштовых шляхоў, на якіх ставіліся станцыйныя дамы. У в. Барак, па дарозе з Бабруйска на Рагачоў, з тых часоў захаваўся станцыйны дом — тыповы прамавугольны ў плане мураваны будынак пад вальмавым дахам. У архітэктурнай трактоўцы выкарыста-

ны элементы стылю рэтраспектыўнай готыкі. Унутраны двор акаймаваны мураванай агароджай, па вуглах якой пастаўлены мураваныя будынкі стайняў. Такі ж пастаялы двор ёсць і ў в. Багушоўка. З дарэвалюцыйнага часу захаваліся таксама будынкі бровара ў в. Дойнічава, крухмальнага завода ў пас. Леніна, гаспадарчыя памяшканні Варанцовых-Вельямінавых у в. Дубаўка.

А.М.Нянадавец, доктар філалагічных навук, *А.М.Кулагін,* кандыдат мастацтвазнаўства (архітэктурная даўніна).

Гарыць агонь продкаў

Перыяд першай палавіны 1990-х гадоў — не самы лепшы ў гісторыі нашага раёна: многа цяжкасцей і ў грамадскім і ў асабістым жыцці. Але ў сэрцах людзей — вера і надзея на лепшае. Цвёрдая вера, бо, бадай, ніколі раней у нас не было такога ўзлёту мастацкай самадзейнасці і народнай творчасці. Вобразна кажучы, зараз уся Бабруйшчына спявае, іграе, танцуе, адраджае народныя промыслы. Мяркуйце самі. У раёне працуюць (і актыўна працуюць!) 19 сельскіх дамоў культуры і 15 сельскіх клубаў, пры якіх створаны 193 калектывы мастацкай самадзейнасці і 29 клубаў па інтарэсах. А гэта 2300 удзельнікаў! Асабліва пашыраны вакальны жанр. Многія нашы выканаўцы дасягнулі высокага прафесійнага майстэрства. Нездарма 9 творчых калектываў раёна ўдастоены звання народных.

Варатынскі народны хор створаны ў 1938 г. як хор даярак. Першым яго кіраўніком стала вялікая аматарка песні В.І.Дашкоўская. Менавіта яна ўзгадавала такі славуты калектыў, узняла яго да прафесійнага ўзроўню. Пры ёй у 1963 г. хор стаў народным, а сама Вольга Іванаўна Дашкоўская ўдастоена высокага звання заслужанага работніка культуры БССР. З 1971 г. мастацкім кіраўніком хору з'яўляецца Ф.Ц.Глушакоў, які таксама рупліва шліфуе выканаўчае майстэрства варатын-

Першы склад Варатынскага хору даярак.

Выступаюць самадзейныя артысты Варатынскага сельскага Дома культуры.

скіх спевакоў. Рэдка якое вялікае свята на Бабруйшчыне абыходзіцца без іх удзелу. Выступаў хор і ў Зорным гарадку, у Крамлёўскім Палацы з'ездаў, на ВДНГ СССР, удзельнічаў у многіх усесаюзных, рэспубліканскіх і абласных фестывалях і конкурсах, мае шматлікія граматы, дыпломы, памятныя сувеніры.

Бортнікаўскі ансамбль народнай песні існуе з 1963 г. Стваральнік і першы яго кіраўнік — Г.Б.Балыка. Яна ж і салістка ансамбля, аўтар і выканаўца сваіх песень. Сярод іх асабліва кранаюць сэрцы людзей «Званы Чарнобыля», «Матуліна гора», «Песня пра Беларусь». З ветэранаў ансамбля варта адзначыць Т.Д.Котаву, В.М.Сароку, З.А.Сароку, В.А.Шчаглову. Заўжды горача і сардэчна прымае публіка салістку Ганну Зубрыкаву — пераможцу раённых фэстаў, а таксама абласнога фестывалю «Аўсянка-93» і IV фестывалю народнай музыкі «Дружба-93». Звання народнага ансамбль удастоены ў 1993 г. Ён прымаў удзел у культурнай праграме ВДНГ СССР, выступаў у Мінску, Брэсце, Гродне, Магілёве, Горках, Шклове і іншых населеных пунктах Беларусі, у 1970 г. здымаўся ў музычным фільме «Ой, рэчанька, рэчанька». Удзельнік міжнародных, рэспубліканскіх і абласных конкурсаў, адзначаны

Выступае калектыў народнага танца Варатынскага сельскага Дома культуры.

Бортнікаўскі ансамбль народнай песні.

многімі дыпломамі, Ганаровымі граматамі і памятнымі сувенірамі.

Цялушскі фальклорны гурт створаны ў 1964 г., званне народнага ўдастоены ў 1993 г. Першы мастацкі кіраўнік М.М.Ермалаеў. Зараз гуртом кіруе Н.К.Сямёнава. Большасць удзельнікаў — людзі старэйшага ўзросту, якія прапагандуюць духоўныя набыткі сваіх бацькоў і дзядоў. І прапагандуюць актыўна, бо не злічыць канцэртаў, што далі цялушкаўскія гуртоўцы для сваіх землякоў. Яны таксама ўдзельнічаюць у раённых, абласных і рэспубліканскіх аглядах і конкурсах. У 1994 г. гурт здымаўся ў праграме «Радавод» тэлерадыёкампаніі Беларусі.

«Добры настрой» — так называецца народны ансамбль народнай песні Осаўскага сельскага дома культуры. Творчую дзейнасць пачаў у 1987 г. Першымі яго ўдзельнікамі былі Ж.І.Ляшкевіч, Л.І.Толкач, Л.Д.Чарняўская. Кіраўнік калектыву — В.П.Піліпчык. У рэпертуары ансамбля беларускія і рускія народныя песні, а таксама пастановачныя сцэнкі, якія адлюстроўваюць народныя звычаі і асабліва падабаюцца гледачам. А яшчэ осаўскія спевакі займаліся зборам прылад працы і сялянскага побыту мінулых часоў, для музея мясцовай школы. Ганаровае званне народнага атрымаў у 1994. Ансамбль выступаў на канцэртных пляцоўках Магілёва, Гродна, Шклова, быў удзельнікам усіх раённых, а таксама многіх абласных і рэспубліканскіх аглядаў і конкурсаў, адзначаны дыпломамі і граматамі.

Пры аддзеле культуры райвыканкома актыўна дзейнічае Цэнтр культуры і адпачынку, які аказвае метадычную дапамогу сельскім клубам і практычную ў стварэнні пастаянных творчых калектываў.

Народны хор работнікаў культуры гэтага цэнтра створаны ў 1987 г., а ў 1990 г. ўдастоены звання народнага. Першым узначаліў хор М.А.Плоткін. Цяпер ім кіруе заслужаны работнік культуры Беларусі В.Я.Балаханаў. Хор вызначаецца высокім майстэрствам выканання. Гастраляваў на Украіне, у Малдове, у многіх гарадах Беларусі.

Аркестр народных інструментаў Цэнтра культуры і адпачынку першапачаткова быў створаны як акампаніруючая група народнага хору работнікаў культуры. Потым у яго склад увайшлі настаўнікі музычных школ, і ён пачаў даваць самастойныя канцэрты. Канчаткова як аркестр сфарміраваўся з прыходам дырыжора У.І.Іванова. У рэпертуары аркестра — творы Я.Глебава, Э.Зарыцкага, В.Іванова, А.Чыркуна і інш. З калектывам часта выступае заслужаная артыстка Беларусі Ганна Радзько. Яна ж спявае ў дуэце разам з салісткай аркестра Наталляй Амос. Аркестр быў удзельнікам першага фестывалю беларускай песні і паэзіі ў Маладзечне.

Фальклорны ансамбль «Пярэзвы» таксама дзейнічае пры Цэнтры культуры і адпачынку. Створаны ў 1985 г., званне народнага носіць з 1990 г. Яго ўдзельнікі — людзі розных прафесій, у асноўным работнікі культуры. У рэпертуары беларускія, рускія, каза-

чыя, яўрэйскія песні і танцы. Першае вялікае выступленне ансамбля адбылося ў 1987 г. на заключным гала-канцэрце другога Усесаюзнага фестывалю самадзейнай народнай творчасці ў Маскве. Удзельнік Міжнароднага фестывалю песні і танца ў польскім горадзе Рацёншык (1988), рэспубліканскага фестывалю «Звіняць цымбалы і гармонік» (1992), тэлевізійнага фестывалю «Залатыя ключы» (1997). За час існавання ансамбль гастраляваў у Малдове, Польшчы, Карэліі і іншых рэгіёнах Расіі.

Народны ансамбль танца «Беларусь» шырока вядомы ва ўсёй рэспубліцы і нават за яе межамі. Створаны ў 1987 г. на базе аддзела культуры Бабруйскага райвыканкома. Звання народнага ўдастоены ў 1992 г. Нязменны яго кіраўнік В.А.Піліпенка. Удзельнікі ансамбля зачароўваюць гледача каларытнымі касцюмамі і іскрамётнай віхурай танца. Калектыў гастраляваў у Польшчы, Расіі, Малдове, Бельгіі, Францыі, на Украіне; удзельнік рэспубліканскіх аглядаў самадзейнага мастацтва (1989 і 1990, дыплом 1-й ступені), міжнароднага фестывалю фальклору ў Пінску (1994) і міжнароднага фестывалю «Сожскі карагод» (1997), міжнароднага фестывалю народных танцаў у г. Самсун (Турцыя), тэлевізійных фестываляў «Залатыя ключы» і «Зорная ростань».

Гэта кароткі расказ толькі пра народныя калектывы. А ўсяго ў раёне дзесяткі самадзейных творчых гуртоў. Сярод іх у першую чаргу варта назваць яркі і самабытны гурт вёскі Ласі. Сярэдні ўзрост яго ўдзельнікаў — да 40 гадоў. Гэта людзі, якія глыбока паважаюць і любяць сваю музычную спадчыну. З навакольных вёсак яны перанеслі на сцэну старадаўнія карагоды, гульні, скокі. Толькі тут можна ўбачыць карагоды «Разгулялася Дуня» і «Барыня пад язык». А яшчэ гурт вядомы сваім адмысловым ткацтвам, саломапляценнем і выразаннем фіранак. Вялікі майстар тут Т.Р.Лось. Праграма «Радавод» Нацыянальнай тэлерадыёкампаніі Беларусі зняла два кароткаметражныя фільмы пра творчасць гэтага калектыву. Адметная, жывая і вельмі яркая яго фарба — дзіцячы гурт, які паспяхова спасцігае майстэрства сваіх старэйшых апекуноў.

Ніводны канцэрт не абыходзіцца без гарманістаў. Гонарам раёна сталі М.А.Арэшка, М.А.Герасіменка, У.А.Зуб, З.В.Кахоўскі, П.М.Кахоўскі, М.К.Капусцін, Н.В.Лаўрыновіч, В.А.Парахневіч, М.П.Сарока, В.А.Стэльмах, В.М.Тумашэнка, В.М.Цімко. Гэтыя гарманісты — людзі розных прафесій з

Выступае ансамбль народнага танца «Беларусь».

Выступае фальклорная група з вёскі Ласі.

19. Зак. 311.

Выступае фальклорная група з вёскі Ласі.

розных населеных пунктаў, таму часцей за ўсё выступаюць індывідуальна. Але раз у год, у Дзень Перамогі, збіраюцца яны на свята «Іграй, гармонік». О, гэта трэба бачыць і чуць! Па-заліхвацку расцягнуць гарманісты мяхі — і самі ногі просяцца ў скокі. Потым на хвіліну змоўкнуць гармонікі — і пальецца шырокая мелодыя, так і хочацца падпець, падтрымаць яе ўсім сэрцам.

Бадай, ва ўсіх нашых самадзейных артыстаў адзін галоўны клопат — адраджэнне нацыянальнай культуры. Амаль паўсюдна па крупінках збіраецца мясцовы фальклор, здымаюцца на відэакасеты абрады, гульні нашых продкаў, якія потым вывучаюцца і ўключаюцца ў рэпертуар фальклорных калектываў.

Магутны пласт нацыянальнай культуры захаваўся да нашых дзён у в. Панкратавічы, асабліва абрады і песні вясенне-летняга перыяду. Таму ў рэпертуары тутэйшай фальклорнай групы шмат карагодаў, у тым ліку і «Як пушчу стралу». Калектыў сельскага клуба з в. Ламбава славіцца сваімі лінейнымі карагодамі «А мы проса сеялі», «Баяры». А вось артысты-аматары сельскага клуба в. Тажылавічы ўключылі ў свой рэпертуар шмат народных гульняў. Дарэчы, канцэрты тажылавіцкай фальклорнай групы найчасцей ладзяцца ў форме вячорак, часам пад пэўнай назвай — «На прызбе», «Выйду я на вуліцу» і інш.

Самадзейныя артысты раёна назапасілі багаты вопыт святкавання Калядаў, Купалля, масленіцы, гукання вясны. У раздзеле «З матэрыяльнай і духоўнай спадчыны» расказваецца, як шырока і прыгожа адзначалі іх нашы продкі. Можна сцвярджаць, што ў наш час святкаванне Калядаў у раёне стала масавым. Яны штогод адзначаюцца амаль ва ўсіх сядзібах калгасаў і саўгасаў.

У вялікай пашане тут і масленіца. Аднойчы, напрыклад, свята гэта пачалося з тэатралізаванага прадстаўлення ў в. Глуша. Матухна Зіма, Дзед Мароз і Снягурка павіншавалі гледачоў з пачаткам вясны. Затым былі бліз-

У карагодзе самадзейныя артысты Панкратавіцкага сельскага Дома культуры і Ламбаўскага сельскага клуба.

ны, чай, скамарохі, цыганскія песні і танцы. Тут жа былі адкрыты выстаўкі тканін, вырабаў народных умельцаў, тэматычная кніжная экспазіцыя «Духоўны сэнс зімовых абрадаў і звычаяў».

А колькі душэўных сіл і старання ўкладваюць нашы самадзейныя артысты, каб захаваць народны каларыт гукання вясны. Або ўзяць Купалле. З глыбінь вякоў дайшло яно да нас, чаруючы сваёй прыгажосцю. Колькі песень і паданняў складзена пра чароўную папараць-кветку, якая распускаецца толькі ў купальскую ноч. Прыгажуні-дзяўчаты варожаць: «Плыві туды, мой вяночак, дзе будзе мой куточак». І вось, адбіваючыся ў вадзе, успыхнулі факелы. Быццам зоркі-знічкі замільгацелі ў начным небе іскры ад вогнішча і ракет: так сустракалі Купалінку. А разам з ёю на свята прыбылі цар Нептун са світаю русалак. Даўно закацілася сонца за небасхіл, а людзей усё болей і болей, ціснуцца бліжэй да вогнішча. І нарэшце... паплыла над возерам песня «Ой, рана, рана на Івана». Не, сён-

Музей пад адкрытым небам у пасёлку Глуша.



Кірмаш на Глушанскім падвор'і. 1987 г.

ня гэта не эпізод, не адзінкавы прыклад. Святкаванне Купалля, як і Калядаў, масленіцы, гукання вясны, становіцца неад'емнай часткай народнага побыту.

Вядома, што спакон вякоў у кожнай вёсцы Бабруйшчыны праходзілі кірмашы-гулянні. Як адрадзіць і гэту традыцыю нашых прашчураў? Паспрабавалі арганізаваць кірмаш на Глушанскім падвор'і. Перад гэтым высветлілі, што калісьці праз Глушу праходзіў знакаміты Вараўскі шлях, па якім на кірмаш ехалі сяляне, рамеснікі, гандляры. Яны рабілі прыпынак у глушанскай карчме, каб адпачыць і перакусіць, павесяліцца, паказаць свой спрыт і талент.

Такое прадстаўленне і было вырашана разыграць у Глушы. Сюды акрамя жыхароў бабруйскіх вёсак з'ехаліся сябры з Расіі, Украіны. На тройках са званочкамі самадзейныя артысты пад'ехалі да той жа карчмы ў Глушы, пачаставаліся, а затым закружылі карагоды, загучалі песні, пусціліся ў скокі танцоры. Былі тут і гандляры, і пакупнікі. Словам, як і на сапраўдным кірмашы. Набыты ў Глушы вопыт «кірмашавання» актыўна пашыраецца, рэалізуецца ў правядзенні святаў вуліц, падвор'яў і г.д.

Наша Бабруйшчына некалі славілася майстрамі-самавучкамі. Ёсць яны і ў наш час. І мы стараемся, каб крыніцы народнага



Бондар Глушанскага цэнтра рамёстваў В.Моцін.

Керамічны посуд, які захоўваецца ў цэнтры мастацкіх рамёстваў.

ўмельства не перасыхалі, жывілі і наша маладое пакаленне. З гэтай мэтай у 1987 г. стварылі аб'яднанне дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, у склад якога ўвайшло 48 майстроў — вышывальшчыцы, ткачыхі, вязальшчыцы, інкрустатары і аплікатары саломкай, чаканшчыкі, ганчары, разьбяры па дрэве і інш. Гэты вялікі калектыў таксама ўдастоены звання народнага. А ў Глушы адкрылі цэнтр мастацкіх рамёстваў, дзе нашы ўмельцы абменьваюцца вопытам, наладжваюць выстаўкі сваіх работ. Сярод народных умельцаў вылучаюцца вышывальшчыцы Г.Р.Борбут, Г.Я.Дрык, В.А.Пунда, ткачыхі Г.С.Кулік, Г.М.Лушчык, Г.Р.Лушчык, Г.Дз.Мароз, ганчары Ю.І.Боўда, А.Ю.Сухань, разьбяры па дрэве А.Я.Дабравольскі, Ю.У.Раманаў, сталяры-разьбяры Ю.М.Кахачонак, В.В.Палевіч, сталяр-слесар-разьбяр Дз.А.Анкуда, гравёр Ю.П.Шыко, чаканшчык І.А.Сікірынаў, жывапісец М.Т.Богдан, майстар саломкі Н.М.Лаўрэнава, майстар саломкі і роспісу па дрэве Н.В.Міхалюк і іншыя.

Многія з нашых народных умельцаў прымалі ўдзел у раённых, гарадскіх і абласных выстаўках. Ганчар Ю.І.Боўда стаў пераможцам рэспубліканскага конкурсу «Ганчарны круг 1996 г.». А ў 1997 г. гэты ж ганчар, а таксама разьбяр па дрэве А.Я.Дабравольскі, чаканшчык І.А.Сікірынаў, прыняты ў Беларускі саюз майстроў народнай творчасці. Так што ёсць усе падставы сцвярджаць: не гасне, гарыць на Бабруйшчыне духоўны агонь продкаў!

А.А.Сінкавец.

Свята пушкінскай паэзіі

У артыкуле «Нашчадкі А.С.Пушкіна на Бабруйшчыне» распавядалася пра тое, што на нашай зямлі правяла большую частку свайго жыцця ўнучка вялікага рускага паэта Наталля Аляксандраўна Пушкіна, па мужу Варанцова-Вельямінава. Застаўся цёплы ўспамін тутэйшых сялян пра яе добразычлівасць і спагаду да іх. Яна вызначалася шырокім кругаглядам, у тым ліку літаратурнымі здольнасцямі і ведамі; падтрымлівала сяброўскія адносіны з І.С.Тургеневым, Ф.М.Дастаеўскім, пазней з А.В.Луначарскім, пісала вершы, але не друкавала іх. Сучаснікі лічылі яе майстрам гумарыстычных экспромтаў. А яшчэ Наталля Аляксандраўна цікавілася даследаваннямі спадчыны свайго знакамітага дзеда, знаёміла сялян з яго неўміручай паэзіяй.

У знак шчырай удзячнасці за гэта вось ужо больш за 20 гадоў у пачатку чэрвеня на Бабруйшчыне праводзіцца свята пушкінскай паэзіі. У Цялушы каля царквы, дзе пахавана Наталля Аляксандраўна, збіраюцца жыхары Бабруйска і навакольных вёсак. Тут чытаюць свае вершы мясцовыя паэты, літаратары з Мінска, Магілёва. Затым на пляцоўку выходзяць майстры мастацкай самадзейнасці — харысты, дэкламатары, спевакі-вакалісты, фальклорныя калектывы, танцоры. Кожнае такое свята — адметнае, непаўторнае. Але заўжды ў яго чароўнай сімфоніі аптымістычна гучаць мелодыі пушкінскай ліры. І поўняцца людскія сэрцы дабрынёй і святлом, да чаго так натхнёна заклікаў паэт: «Да здравствует солнце!..»

Сучасная вёска

У вёсках раёна да нашых дзён захаваліся старыя сядзібы вяночнага ці пагоннага тыпу. Што да цяперашніх індывідуальных забудоўшчыкаў, то яны звычайна выбіраюць новую, сучасную планіроўку для сваіх падвор'яў. Яно і зразумела: змянілася ўласная гаспадарка вяскоўцаў, павысіліся іх патрабаванні да ўмоў жыцця, зараз на падвор'і многім патрэ-

бен гараж з пад'ездам, свая лазня, кветнікі. Людзі хочуць мець жыллё ў двух узроўнях: на першым — гаспадарчыя памяшканні, на другім —пакоі адпачынку. Такія дамы, хоць і не надта многа, але будуюцца. Раённыя ўлады дапамагаюць забудоўшчыкам, каб падахвоціць добрую ініцыятыву. З гэтай мэтай у раёне рэгулярна праводзяцца конкурсы на лепшы дом і лепшую сядзібу. Пераможцы прэміруюцца, шырока рэкламуецца іх вопыт.

Але галоўнае, што вызначае сучасную архітэктуру вёсак Бабруйшчыны, — гэта новыя пасёлкі і вуліцы катэджнай забудовы. Такая перабудова пачалася з 1960-х гадоў і спарадзіла шмат спрэчак. Сцвярджалася, што вёскі нібыта падзяліліся на перспектыўныя і неперспектыўныя: адны пачалі ратаваць, а другія пакінулі на выміранне. Жыццё паказвае, што ў такім падыходзе было шмат аб'ектыўнага і рацыянальнага. Па-першае, у цяжкі пасляваенны час многае жыллё ўзводзілася наспех і праз 15—20 гадоў патрабавала капітальнага рамонту ці замены на новае. Па-другое, старэлі самі людзі, многія з іх адыходзілі ў нябыт. Таму выратаваць усе вёскі і вёсачкі не было ніякай магчымасці. Трэба было выбраць найбольш важныя з іх і кампактна, комплексна весці забудову.

У першую чаргу выбралі цэнтральныя сядзібы калгасаў і саўгасаў, распрацавалі генеральныя планы іх забудовы. Кожны такі план прадугледжваў комплекснае ўзвядзенне жылых дамоў і будынкаў культурна-бытавога прызначэння, сістэм інжынерных камунікацый, добраўпарадкаванне і азеляненне тэрыторый пры абавязковым уліку асаблівасцей помнікаў драўлянага дойлідства. За абуладкаванне вёсак узяліся актыўна, з размахам. Таму за параўнальна кароткі час былі адбудаваны цэнтры калгасаў «Гігант», імя Дзяржынскага, «Шлях Леніна», імя Пушкіна, імя А.Неўскага, «Гарохаўскі», саўгасаў «Осава», «Дойнічава», «Бабруйскі», «Кісялевічы». Тут не толькі вырашаліся жыллёва-камунальныя праблемы, але і фарміраваліся вытворчыя зоны.

У вёсцы Вялікія Бортнікі, напрыклад, узведзены Дом культуры на 400 месцаў, адміністрацыйны буданак, сярэдняя школа на 320 вучняў, гандлёвы цэнтр, фельчарска-акушэрскі пункт, дзіцячы сад-яслі на 90 месцаў, лазнева-пральны камбінат. Да гэтага цэнтра прымыкаюць вуліцы, забудаваныя двух- і аднапавярховымі жылымі дамамі. Да паслуг вяскоўцаў — цэнтральнае ацяпленне, вадаправод, каналізацыя, прыродны газ. Каля Дома культуры разбіты сквер, у якім устаноўлены велічны помнік воінам-землякам, што загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Воддаль ад цэнтральнай сядзібы — сучасны машынны двор, жывёлагадоўчыя і іншыя гаспадарчыя памяшканні. Паклапаціліся тут і пра ўмовы працы і адпачынку людзей. Вёска Вялікія Бортнікі ў 1985 г. была ўдзельніцай усесаюзнага конкурсу на лепшую забудову і добраўпарадкаванне населеных пунктаў.

Ёсць што паказаць і ў в. Міхалёва — сядзібе калгаса імя Дзяржынскага. Тут, на цэнтральнай плошчы, — Дом культуры, у гэтым жа будынку — праўленне калгаса і бібліятэка. Насупраць цераз вуліцу — двухпавярховы дом быту з гандлёвым цэнтрам, кафэ, сталовай і гасцініцай. Побач з Домам культуры — сквер, у якім таксама ўзвышаецца помнік воінам-землякам, што аддалі жыццё за Радзіму ў Вялікую Айчынную вайну. Непадалёку, у калгасным садзе, — сярэдняя школа на 640 вучняў, дзіцячыя яслі-сад на 140 месцаў з басейнам, бальніца на 100 ложкаў. Галоўная вуліца амаль цалкам забудавана двухпавярховымі дамамі катэджнага тыпу. У кватэрах цэнтральнае ацяпленне, газ, вадаправод, каналізацыя, на першым паверсе — кухня, гасціная, ванна, туалет, на другім — спальныя пакоі, зала. Паміж дамамі — галерэі, дзе размяшчаюцца гаражы. У дварах — гаспадарчыя пабудовы, побач — агароды. Для адпачынку і гадоўлі рыбы створаны два штучныя вадаёмы, якія разам з аркай афармляюць уезд у цэнтр калгаса. Капітальна, з клопатам пра чалавека адбудавана непадалёку і вытворчая зона. У 1987 г. па выніках усесаюзнага агляду-конкурсу на лепшую забудову сельскіх населеных пунктаў калгас імя Дзяржынскага ўдастоены Дыплома гонару і ўзнагароджаны залатым медалём ВДНГ СССР.

У пасёлку Осава — сядзібе аднайменнага саўгаса — найперш звяртае на сябе ўвагу тая яго частка, што забудавана двух- і аднапавярховымі дамамі. Тут для жыхароў таксама ўсе камунальныя выгоды: цэнтральнае ацяпленне, вадаправод, газ, каналізацыя. У цэнтры пасёлка — Дом культуры, сярэдняя школа, магазін, дом быту, амбулаторыя, дзіцячыя сад-яслі, штучны вадаём.

Пасёлак Туголіца размешчаны на тарфяністы х землях. І раней у сырое надвор'е па яго вуліцах цяжка было прайсці з-за гразі. Зараз на месцы старых баракаў і брудных вуліц вырас добраўпарадкаваны цэнтр з двух- і чатырохпавярховымі дамамі. Ёсць у ім Дом

культуры, адміністрацыйны будынак, сучасны дзіцячы камбінат.

Па аналагічнай схеме забудоўваюцца вёскі Хімы (калгас «Шлях Леніна»), Варатынь (калгас імя Пушкіна), Кавалі (калгас імя Аляксандра Неўскага).

На жаль, з 1990-х гадоў з-за недахопу сродкаў перабудова вёсак у раёне спынілася. Не завершана ўзвядзенне вялікага спарткомплексу з двума плавальнымі басейнамі, спартыўнымі заламі, рэстарана, стадыёна ў Туголіцы, клубаў у Глушы і Гарохаўцы, двухпавярховых жылых дамоў у Дымаўцах і Цялушы. А намечаная генеральнымі планамі перабудова вёсак Ламбава, Туркі, Брожа, Вішнёўка наогул не пачыналася.

В.І.Нямілецаў.

Мемарыяльны комплекс

Узведзены непадалёку ад будынка выканкома Сычкаўскага сельсавета ў 1986 г. (курган насыпаны ў 1968 г.) у гонар воінаў 1-га Беларускага фронту і партызан, якія ў канцы чэрвеня 1944 г. разграмілі бабруйскую групоўку нямецка-фашысцкіх войскаў і вызвалілі Бабруйскі раён ад акупантаў. Адкрыты 9.5.1986 г. Аўтары праекта: скульптары П.Цомпель, М.Бакуменка, архітэктары Ю.Казакоў, В.Неміленцаў. Выкарыстаны бетон з мармуровай крошкай, бронза, алюміній. Складаецца са скульптурнай кампазіцыі агульнай вышынёй 22 м, насыпнога кургана (12 м; да вяршыні яго вядзе бетонная лесвіца) і 6 чатырохгранных стэл з партрэтнымі выявамі Герояў Савецкага Саюза І.Я.Арла, М.А.Ізюмава, М.А.Калодкі, І.Ф.Маслоўска-га, М.Р.Селязнёва, А.І.Чарныша, якія вызначыліся ў час разгрому бабруйскай групоўкі варожых войскаў і пахаваны на Бабруйшчыне.

Дамінантай комплексу з'яўляюцца ўстаноўленыя на высокім (18 м) пастаменце скульптуры воіна з мячом і партызана са сцягам у руках. Скульптуры вышынёй 4 м увасабляюць адзінства і непераможнасць народа. Постаці пададзены ў імклівым руху, разгорнуты сцяг узмацняе дынаміку кампазіцыі. У цэлым комплекс напоўнены глыбокім патрыятычным зместам. Ён дамінуе ў навакольнай прасторы. Тут праходзяць многія ўрачыстасці жыхароў Бабруйшчыны — сведчанне іх шчырай удзячнасці сваім вызваліцелям.

Г.І.Дулеба.

З ГІСТОРЫІ НАСЕЛЕНЫХ ПУНКТАЎ БАБРУЙШЧЫНЫ

Усе паселішчы, як і людзі, маюць свае «біяграфіі»: калісьці з пабудовай першага чалавечага жытла яны з'явіліся на зямлі, з цягам часу пашыралі свае межы, бывала, цярпелі ад стыхійных бедстваў і ваенных ліхалецяў, пасля якіх зноў аднаўляліся, раслі. А некаторыя, на жаль, назаўжды знікалі, як знікаюць і ў наш час.

Адкуль жа пайшлі іх назвы і што яны азначаюць? Гэту праблему даследуе навука тапаніміка, якая вывучае паходжанне геаграфічных назваў, у тым ліку і назваў населеных пунктаў. Навукоўцы сцвярджаюць, што пераважная большасць іх паходзіць ад чалавека (імёнаў, прозвішчаў, мянушак, роду заняткаў), а таксама ад жывёл і раслін. На падставе тапанімічнага аналізу, а таксама археўнагістарычных звестак навукоўцы падрыхтавалі для гэтай кнігі кароткія «біяграфічныя даведкі» пра населеныя пункты Бабруйшчыны.

АЗЁРЫ, вёска ў Бортнікаўскім сельсавеце, за 12 км ад чыгуначнай станцыі Цялуша, каля шашы Бабруйск—Рагачоў. Назва ад асновы слова «возера» — паселішча, размешчанае каля азёраў. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Туркоўскай воласці Бабруйскага павета Мінскай губерні, 8 двароў, 63 жыхары. На пачатку 20 ст. 6 двароў, 37 жыхароў; у 1917 г. 6 двароў, 56 жыхароў. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 12 гаспадарак, 65 жыхароў. У 1931 г. тут створаны калгас «Трэцяга рашаючага года» (15 сялянскіх гаспадарак). Працавала калгасная кузня. На пачатак 1997 г. 39 двароў, 73 жыхары. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы.

АКОЛІЦА, вёска ў Гарохаўскім сельсавеце, за 17 км ад чыгуначнай станцыі Бярэзіна на лініі Бабруйск—Жлобін, на р. Брожка (прыток Бярэзіны). Назва ад асновы «аколіца», якая азначае від сельскага паселішча. Заснавана ў пачатку 1920-х гадоў перасяленцамі з суседніх населеных пунктаў. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 38 двароў, 182 жыхары. У 1931 г. створаны калгас імя Н.К.Крупскай. У 1940 г. было 28 двароў, 111 жыхароў. У красавіку 1944 г. нямецка-фашысцкія акупанты спалілі, абрабавалі вёску. На пачатак 1997 г. 7 двароў, 9 жыхароў. Каля вёскі археалагічны помнік — курганны могільнік з 40 насыпаў.

АКЦЯБР, пасёлак у Кавалёўскім сельсавеце, за 1 км ад чыгуначнай станцыі Мікулічы на лініі Бабруйск—Жлобін. Заснаваны ў 1923 г. перасяленцамі з суседніх вёсак. Названы ў гонар Кастрычніцкай рэвалюцыі. Паводле перапісу 1926 г. — пасёлак, 17 двароў, 70 жыхароў. На пачатак 1997 г. 55 двароў, 122 жыхары. У пасёлку бібліятэка, ферма буйной рагатай жывёлы.

АМЯЛЕНСКАЯ СЛАБАДА, вёска ў Варатынскім сельсавеце, за 6 км ад чыгуначнай станцыі Цялуша на лініі Бабруйск—Жлобін. Назва ад імя Амяльян ці блізкіх да яго вытворных форм (імя Емяльян) і тыпу паселішча. Сустракаецца ў пісьмовых крыніцах 19 ст. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Туркоўскай воласці Бабруйскага павета Мінскай губерні, 42 двары, 266 жыхароў, пастаялы двор; на пачатку 20 ст. 55 двароў, 345 жыхароў; у 1917 г. 63 двары, 363 жыхары. Апрача земляробства і жывёлагадоўлі тут бытавалі ткацкія, шавецкія, кравецкія, дрэваапрацоўчыя промыслы. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 72 двары, 324 жыхары. У 1932 г. створаны калгас «Гвардзеец». На пачатак 1997 г. 32 двары, 55 жыхароў. У вёсцы магазін, ферма буйной рагатай жывёлы. Радзіма Героя Савецкага Саюза К.П.Чарнова.

АНТОНАЎКА, вёска ў Сычкаўскім сельсавеце, за 6 км ад чыгуначнай станцыі Бярэзіна на лініі Бабруйск—Жлобін, непадалёку ад шашы Бабруйск—Мінск. Назва ад імя Антон ці ўтворанага ад яго прозвішча Антонаў. Паводле пісьмовых крыніц вядома з 19 ст. У 1844 г. — вёска, цэнтр маёнтка Антонаўка, належала памешчыкам Немчыновічам і Манкевічам. У 1847 г. 7 гаспадарак, 21 жыхар. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, 5 гаспадарак, 45 жыхароў. На пачатак 20 ст. 6 двароў, 55 жыхароў; у 1917 г. 14 двароў, 74 жыхары. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 14 гаспадарак, 82 жыхары. У 1930 г. створаны калгас «Партызан». На пачатак 1997 г. 13 двароў, 20 жыхароў.

АРЭХАВА (да 1964 г. П і ш ч а к і), вёска ў Слабодкаўскім сельсавеце, за 6 км ад чыгуначнай станцыі Бабруйск, непадалёку ад шашы Бабруйск—Глуск. Вядома па пісьмовых крыніцах з 19 ст. пад назвай Пішчакі Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета. На пачатку 20 ст. — вёска, 30 двароў, 232 жыхары. У 1917 г. 55 двароў, 282 жыхары. Паводле перапісу 1926 г. — вёска Пішчакі,

61 гаспадарка, 325 жыхароў. 30 ліпеня 1964 г. вёска перайменавана ў Арэхава. На пачатак 1997 г. 72 двары, 144 жыхары. У вёсцы клуб, ферма буйной рагатай жывёлы.

АСТРАВЫ, вёска ў Гарохаўскім сельсавеце, за 18 км ад чыгуначнай станцыі Бабруйск, каля шашы Бабруйск—Глуск. Сустракаецца ў пісьмовых крыніцах 20 ст. У аснове назвы — тэрмін «востраў» у шырокім сэнсе слова: востраў на рацэ, возеры, востраў пашы сярод лесу, сухі востраў сярод балота. Паводле перапісу 1897 г. — хутар Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, 3 двары, 16 жыхароў. Паводле перапісу 1926 г. — хутар, 5 гаспадарак, 30 жыхароў. На пачатак 1997 г. 13 двароў, 22 жыхары.

АТРОШКАВІЧЫ, вёска ў Гарбацэвіцкім сельсавеце, за 15 км ад чыгуначнай станцыі Бабруйск, непадалёку ад шашэйных дарог Бабруйск—Слуцк і Бабруйск—Глуск. Назва, верагодна, ад прозвішча Атрошкавіч, а магчыма, гэта назва-арыенцір: паселішча на рагу (востраг леса), на беразе возера, ракі ці на павароце дарогі. Каля вёскі пачынаецца рака Ваўчанка (прыток Бярэзіны). Сустракаецца ў пісьмовых крыніцах 19 ст. У 1938 г. 49 жыхароў мужчынскага полу, належала памешчыкам Грыневічам. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, 21 гаспадарка, 159 жыхароў. На пачатку 20 ст. 28 двароў, 217 жыхароў, дзейнічала карчма. У 1917 г. — вёска, 47 двароў, 300 жыхароў; у 1926 г. — хутар Атрошкавічы, 63 гаспадаркі, 344 жыхары. У 1929 г. створаны калгас імя Якаўлева. На пачатак 1997 г. 31 двор, 48 гаспадарак. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы.

АЎСІМОВІЧЫ, вёска ў Варатынскім сельсавеце, за 3 км ад чыгуначнай станцыі Амельня на лініі Бабруйск—Жлобін, на р. Ала (басейн Бярэзіны). Назва, верагодна, ад імя Аўсім ці прозвішча Аўсімовіч. Вядома па пісьмовых крыніцах з 16 ст. Паводле гаспадарчых актаў 1639 г. — сяло Аўсімовічы Бабруйскага староства Вялікага княства Літоўскага, 10 двароў, 14 жыхароў мужчынскага полу. З 1793 г. ў складзе Расіі, з 1795 г. ў Бабруйскім павеце Мінскай губерні. Мясцовыя жыхары здаўна ўмелі апрацоўваць не толькі зямлю, але і дрэва, лён, каноплі, воўну, скуру. На 1844 г. вёска была ў складзе маёнтка Аўсімовы памешчыцы М.Мерлінай. У 1847 г. 34 двары, 76 жыхароў мужчынскага полу. У 1888 г. адкрыта школа царкоўнай граматы, у якой навучалася 9 хлопчыкаў і 2 дзяўчынкі. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Туркоўскай воласці Бабруйскага павета, 63 двары, 472 жыхары. Працавалі млын і хлебазапасны магазін. Побач была памешчыцкая сядзіба, 2 двары, 9 жыхароў, дзейнічалі вадзяны млын, крупарушка, сукнавальня. На пачатку 20 ст. ў вёсцы 76 двароў, 599 жыхароў, у сядзібе 1 гаспадарка, 7 жыхароў. У 1912 г. створана земскае народнае вучылішча, якое размяшчалася ў наёмным памяшканні (адной з першых настаўніц вучылішча была Вольга Якаўлева). Паводле перапісу 1917 г. 85 двароў, 611 жыхароў. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі на базе земскага народнага вучылішча арганізавана працоўная школа 1-й ступені, у якой было 55 вучняў (1925). Паводле перапісу 1926 г. 84 двары, 436 жыхароў. У 1930 г. створаны калгас імя С.М.Будзённага. На пачатак 1997 г. 34 двары, 76 жыхароў. У вёсцы клуб, фермы буйной рагатай жывёлы і свінагадоўчая. Брацкая магіла савецкіх воінаў, што загінулі ў баях з гітлераўцамі ў 1944 г.; на магіле ў 1970 г. ўстаноўлены помнік-абеліск з мемарыяльным надпісам. Радзіма Герояў Савецкага Саюза Ф.Ф.Архіпенкі і У.А.Парахневіча.

БАБІНА 1-е, вёска ў Хімоўскім сельсавеце, за 7 км ад чыгуначнай станцыі Бярэзіна на лініі Бабруйск—Жлобін, на шашы Бабруйск—Рагачоў. Назва ад асновы «баба» — жанчыны наогул ці бабка. Сустракаецца ў пісьмовых крыніцах з 17 ст. У 1639 г. вядома як урочышча Бабін Бабруйскага староства Вялікага княства Літоўскага. З 1793 г. ў складзе Расіі, з 1795 г. ў Бабруйскім павеце Мінскай губерні. У 1838 г. вёска Бабін Бортнікаўскай воласці, 23 рэвізскія душы, уласнасць памешчыкаў Варанцовых-Вельямінавых. На 1847 г. ў складзе маёнтка Вавулічы, 10 двароў. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Бабін Бортнікаўскай воласці, 13 двароў, 66 жыхароў. Побач з такой жа назвай размяшчаліся хутар (3 двары, 9 жыхароў), памешчыцкая сядзіба (26 жыхароў) і пастаялы двор. На пачатак 20 ст. ў вёсцы 14 двароў, 112 жыхароў. Паводле перапісу 1917 г. 32 двары, 171 жыхар, у маёнтку 73 жыхары. У 1923 г. да вёскі далучаны вялікі ўчастак былой памешчыцкай зямлі, на якой сталі будавацца колішнія памешчыцкія батракі і малазямельныя сяляне. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 30 гаспадарак, 150 жыхароў. У 1930 г. створаны калгас «Ультыматум». На пачатак 1997 г. 113 двароў, 300 жыхароў. У вёсцы пачатковая школа, магазін, свінагадоўчая ферма. Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў ба-

ях з гітлераўцамі; у 1975 г. на магіле ўстаноўлены помнік-абеліск.

БАБІНА 2-е, вёска ў Хімоўскім сельсавеце, за 10 км ад чыгуначнай станцыі Бярэзіна на лініі Бабруйск—Жлобін. Заснавана выхадцамі з суседняй вёскі Бабіна 1-е. На пачатак 20 ст. — вёска Бабін Туркоўскай воласці Бабруйскага павета, 30 двароў, 259 жыхароў. Паводле перапісу 1917 г. 34 двары, 330 жыхароў. У 1923 г. да вёскі далучаны вялікі ўчастак былой памешчыцкай зямлі. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 51 двор, 297 жыхароў. У 1931 г. сяляне ўступілі ў калгас «Шлях Ільіча». На пачатак 1997 г. 56 двароў, 97 жыхароў. У вёсцы магазін, ферма буйной рагатай жывёлы. Брацкая магіла савецкіх воінаў, што аддалі жыцці за Радзіму ў Вялікую Айчынную вайну; у 1975 г. на магіле ўстаноўлены помнік-стэла.

БАБОЎЕ, вёска ў Осаўскім сельсавеце, за 8 км ад чыгуначнай станцыі Ясень на лініі Бабруйск—Асіповічы, на дарозе Навасёлкі—Бабруйск. Назва да асновы «боб» — агародная расліна; такое найменне мела ўрочышча, каля якога ўзнікла паселішча. Па пісьмовых крыніцах вядома з 19 ст. Паводле перапісу 1897 г. — хутар Бабовішча Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, 6 двароў, 44 жыхары. Побач было аднайменнае ўрочышча, 1 гаспадарка, 11 жыхароў. На пачатак 20 ст. — вёска Бабовішча той жа воласці, 6 двароў, 35 жыхароў. Паводле перапісу 1917 г. — вёска ў Гарбацэвіцкай воласці, побач знаходзіліся засценак Бабовішча (6 двароў, 53 жыхары) і хутар Бабовішча (2 двары, 25 жыхароў). Паводле перапісу 1926 г. — хутар Бабоўе, 5 гаспадарак, 21 жыхар. На пачатак 1997 г. 18 двароў, 26 жыхароў.

БАГУСЛАЎКА, вёска ў Гарбацэвіцкім сельсавеце, за 20 км ад чыгуначнай станцыі Бабруйск. Назва ад імя Багуслаў і вытворных ад яго прозвішчаў. Па пісьмовых крыніцах вядома з 19 ст. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, 25 двароў, 146 жыхароў. На пачатак 20 ст. 23 двары, 133 жыхары. У 1917 г. 38 двароў, 174 жыхары. Паводле перапісу 1926 г. на месцы сучаснага населенага пункта існавалі дзве вёскі з назвай Багуслаўка: у адной было 26 двароў, 150 жыхароў, у другой — 56 двароў, 261 жыхар. Потым гэтыя вёскі аб'яднаны ў адну — Багуслаўку. На пачатак 1997 г. 5 двароў, 6 жыхароў.

БАГУШОЎКА, вёска ў Гарбацэвіцкім сельсавеце, за 19 км ад чыгуначнай станцыі Бабруйск, на рацэ Ваўчанка (прыток Бярэзіны) і на шашы Бабруйск—Слуцк. Назва, верагодна, ад прозвішчаў Богуш, Багушоў ці Багушэвіч. Вядома па пісьмовых крыніцах з 19 ст. У 1818 г. ў складзе Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, 52 жыхары мужчынскага полу. На 1846 г. уваходзіла ў маёнтак Дварэц памешчыкаў Быкоўскіх. Паводле перапісу 1878 г. 37 двароў і 237 жыхароў, была піўная лаўка. На пачатку 20 ст. — вёска Гарбацэвіцкай воласці, 23 двары, 195 жыхароў. У 1907 г. адкрыта царкоўнапрыходская школа (у памяшканні шашэйна-дарожнага ведамства). Дзейнічала царква. У 1917 г. 49 двароў, 288 жыхароў. У 1924 г. да вёскі далучаны вялікі ўчастак былой памешчыцкай зямлі, на якой пабудаваліся сяляне-беднякі. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі створана працоўная школа 1-й ступені, у якой на 1925 г. быў 91 вучань, дзейнічаў драматычны гурток. Паводле перапісу 1926 г. — пасёлак, 19 гаспадарак, 103 жыхары. У 1930 г. створаны калгас «Чырвоны лётчык», працавала кузня. На пачатак 1997 г. 52 двары, 132 жыхары. У вёсцы васьмігадовая школа, клуб, бібліятэка, дзве жывёлагадоўчыя фермы. Дзве брацкія магілы савецкіх воінаў і ваеннапалонных, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну; на магілах у 1974 г. ўстаноўлены абеліск з памятнымі надпісамі.

БАНЁЎКА, вёска ў Гарбацэвіцкім сельсавеце, за 13 км ад чыгуначнай станцыі Бабруйск, каля шашы Бабруйск—Слуцк. Назва ад прозвішча Банёў; магчыма, спачатку з'явілася назва р. Банёўка, а затым і вёскі. Па пісьмовых крыніцах вядома з 19 ст. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Банёўка Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, 13 двароў, 79 жыхароў. На пачатак 20 ст. — 16 двароў, 243 жыхары. Побач з вёскай знаходзіўся фальварак, 1 гаспадарка, 11 жыхароў. У 1917 г. з ёю межавалі два населеныя пункты: вёска Банёўка, 39 двароў, 181 жыхар і аднайменны хутар, 5 двароў і 34 жыхары. Паводле перапісу 1926 г. — 23 гаспадаркі, 106 жыхароў. На пачатак 1997 г. 12 двароў, 22 жыхары.

БАНЁЎКА, вёска ў Осаўскім сельсавеце, за 14 км ад чыгуначнай станцыі Бабруйск, каля шашы Бабруйск—Слуцк. Па пісьмовых крыніцах вядома з 19 ст. Паводле перапісу 1897 г. — хутар Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, 4 двары, 30 жыхароў. На пачатак 20 ст. — фальварак Банёўка, 1 двор, 11 жыхароў. У 1917 г. — хутар, 5 двароў, 34 жыхары. Паводле перапісу 1926 г. — вёска,

14 гаспадарак, 93 жыхары. Хутар пераўтвораны ў пасёлак у 1922 г. На пачатак 1997 г. 48 двароў, 69 жыхароў. Паблізу вёскі археалагічны помнік — курганны могільнік (31 курган).

БАРАВАЯ, вёска ў Вішнёўскім сельсавеце, за 8 км ад чыгуначнай станцыі Чырвоны Брод на лініі Бабруйск—Рабкор, на шашы Бабруйск—Мазыр. Назва ўтворана ад асновы «бор» (сасновы лес), які, відаць, на пачатку існавання паселішча шумеў у яго навакольлі. Па пісьмовых крыніцах вядома з 19 ст. Паводле перапісу 1897 г. — хутар Брожскай воласці Бабруйскага павета, 5 двароў, 19 жыхароў. Побач былі аднайменныя сядзіба карчмы, лясная старожка і казённая паштовая станцыя. На пачатку 20 ст. — хутар, 8 двароў, 50 жыхароў. У 1917 г. 14 двароў, 42 жыхары. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 21 гаспадарка, 129 жыхароў. У 1930 г. створаны калгас «Ударнік». У 1940 г. 25 двароў, 152 жыхары. У верасні 1943 г. вёска спалена і абрабавана нямецка-фашысцкімі акупантамі. На пачатак 1997 г. 19 двароў, 30 жыхароў.

БАРАК, пасёлак у Бортнікаўскім сельсавеце, за 9 км ад чыгуначнай станцыі Цялуша на лініі Бабруйск—Жлобін, на шашы Бабруйск—Рагачоў. Назва, верагодна, ад асновы «барак» — тып жытла. Вядомы па пісьмовых крыніцах з пачатку 20 ст. як хутар Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета (1 двор, 6 жыхароў). На 1921 г. — хутар, 3 дварыы, 16 жыхароў. Паводле перапісу 1926 г. — пасёлак, 11 двароў, 63 жыхары. У 1930 г. створаны калгас імя Л.Б.Красіна. На пачатак 1997 г. 19 двароў, 36 жыхароў. У пасёлку магазін, ферма буйной рагатай жывёлы. Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях з гітлераўцамі ў 1944 г.; на магіле ў 1975 г. ўстаноўлены помнік-абеліск з мемарыяльным надпісам.

БАРАНАВІЧЫ, вёска ў Осаўскім сельсавеце, за 5 км ад чыгуначнай станцыі Мірадзіна на лініі Бабруйск—Мінск, на р. Ваўчанка (басейн Бярэзіны). Назва ад прозвішча Баран, Баранаў, Барановіч. Па пісьмовых крыніцах вядома з 1626 г. як сяло ў складзе маёнтка Глуск Дубровіцкі Рэчыцкага павета Мінскага ваяводства Вялікага княства Літоўскага. З 1793 г. ў складзе Расіі, з 1795 г. ў Бабруйскім павеце Мінскай губерні. Паводле гаспадарчага перапісу 1844 г. — вёска, належала памешчыкам Шпакоўскім і Рагачоўскім. На 1847 г. 15 двароў, 103 жыхары. Паводле перапісу 1897 г. на тэрыторыі сучасных Баранавіч былі дзве вёскі — Баранавічы 1-я (24 дварыы, 143 жыхары, хлебазапасны магазін) і Баранавічы 2-я (25 двароў, 151 жыхар, хлебазапасны магазін), якія ўваходзілі ў склад Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета. Побач знаходзіліся дзве аднайменныя сядзібы і тры хутары, у якіх было 23 дварыы і 133 жыхары. У 1917 г. ў Баранавічах 1-х — 47 двароў, 288 жыхароў, у Баранавічах 2-х — 28 двароў, 168 жыхароў. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі адкрыты пачатковая школа і гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. Паводле перапісу 1926 г. — вёскі Баранавічы 1-я (46 двароў, 255 жыхароў) і Баранавічы 2-я (34 дварыы, 166 жыхароў). У 1929 г. створаны калгас «Новае жыццё». Працавалі кузня і цагельная арцель «Перамога». У гады нямецка-фашысцкай акупацыі ў вёсках дзейнічалі падпольшчыкі. У 1967 г. Баранавічы 1-я і Баранавічы 2-я зліліся пад агульнай назвай Баранавічы. На пачатак 1997 г. 47 двароў, 66 жыхароў. У вёсцы магазін, клуб, бібліятэка, машынны двор, сельскагаспадарчыя рамонтныя майстэрні, устаноўка па прыгатаванні вітаміннай мукі, фермы буйной рагатай жывёлы і свінагадоўчая. На мясцовых могілках брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях з нямецка-фашысцкімі акупантамі ў Вялікую Айчынную вайну; у 1974 г. на магіле ўстаноўлены помнік-стэла з мемарыяльным надпісам.

БАРАНАВІЧЫ 3-я, вёска ў Осаўскім сельсавеце, за 4 км ад чыгуначнай станцыі Мірадзіна на лініі Бабруйск—Мінск. На пачатку 20 ст. — хутар Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета. Паводле перапісу 1926 г. — вёска Баранавічы 3-я, 31 двор, 181 жыхар. Створаны калгас «Новае жыццё». На пачатак 1997 г. 25 двароў, 34 жыхары. У вёсцы здаўна жылі стараверы. Непадалёку ад вёскі археалагічны помнік — курганны могільнік (53 насыпы).

БАРБАРОВА, вёска ў Сычкаўскім сельсавеце, за 8 км ад чыгуначнай станцыі Ясень на лініі Бабруйск—Мінск. Назва, мабыць, ад імя Барбара (Варвара). Вядома па пісьмовых крыніцах з 19 ст. На 1844 г. — фальварак Барбароў у складзе аднайменнага маёнтка, які належаў памешчыкам Бабінскім, Гатоўскім і Гуманоўскім. Працавалі млын, вінакурня, малатарня. Паводле перапісу 1897 г. — у складзе Свіслацкай воласці Бабруйскага павета, 5 двароў, 38 жыхароў. У 1905 г. адкрыта земскае народнае вучылішча, якое размяшчалася ў наёмным памяшканні. На пачатку 20 ст. — засценак Барбароў той жа воласці,

12 двароў, 141 жыхар. У 1917 г. — вёска, 22 двары, 115 жыхароў. У 1920 г. старая школа пераўтворана ў працоўную школу 1-й ступені, у 1925 г. было 73 вучні. У 1972 г. адкрыта хата-чытальня. Паводле перапісу 1926 г. — вёска Барбароў, 34 гаспадаркі, 155 жыхароў. У 1932 г. створаны калгас імя В.Вароўскага, працавала кузня. На пачатак 1997 г. 4 двары, 6 жыхароў.

БАРКІ, вёска ў Осаўскім сельсавеце, за 12 км ад чыгуначнай станцыі Мірадзіна на лініі Бабруйск—Мінск. Мясцовасць, дзе заснавана пасяленне, знаходзілася каля лесу (бору), адгэтуль і назва. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, 21 двор, 175 жыхароў. На пачатку 20 ст. 21 двор, 169 жыхароў. У 1917 г. — вёска, 37 двароў, 249 жыхароў. У 1917 г. адкрыта пачатковая школа (у наёмным памяшканні), у 1925 г. было 50 вучняў. Працавалі драматычны і харавы гурткі, бібліятэка. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 37 гаспадарак, 206 жыхароў. У 1931 г. створаны калгас імя газеты «Орка» (22 сялянскія гаспадаркі). На пачатак 1997 г. 8 двароў, 13 жыхароў.

БАРОК, вёска ў Гарбацэвіцкім сельсавеце, за 13 км ад чыгуначнай станцыі Мірадзіна на лініі Мінск—Бабруйск, на шашы Бабруйск—Слуцк. Назва ад маладога сасновага лесу — бору. На пачатку 20 ст. — хутар Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, 1 двор, 6 жыхароў. У 1917 г. — хутар, 2 двары, 10 жыхароў. У 1926 г. да Барка прырэзаны вялікі надзел колішняй памешчыцкай зямлі. Паводле перапісу 1926 г. — пасёлак, 11 гаспадарак, 63 жыхары. У 1930 г. сяляне ўступілі ў калгас «Чырвоны лётчык». На пачатак 1997 г. 11 двароў, 22 жыхары.

БАРСУКІ, вёска ў Гарбацэвіцкім сельсавеце, за 10 км ад чыгуначнай станцыі Мірадзіна на лініі Бабруйск—Мінск, на р. Ваўчанка (басейн Бярэзіны). У аснове назвы — «барсук» (пушны звярок), відаць, барсукі некалі сяліліся тут; магчыма, што назва і ад мянушак, прозвішчаў Барсук, Барсукоў і інш. Вядома па пісьмовых крыніцах з 19 ст. Паводле перапісу 1897 г. — хутар Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, 9 двароў, 52 жыхары. У 1917 г. — вёска, 24 двары, 137 жыхароў. У 1926 г. — хутар, 5 двароў, 27 жыхароў. У 1930 г. ў калгасе «Зара». На пачатак 1992 г. 20 двароў, 36 жыхароў; на пачатак 1997 г. 12 двароў, 13 жыхароў.

БАРШЧОВА, пасёлак у Бортнікаўскім сельсавеце, за 7 км ад чыгуначнай станцыі Цялуша на лініі Бабруйск—Жлобін, на шашы Бабруйск—Рагачоў. Назва, верагодна, ад прозвішча Боршч, Баршчоў. Заснаваны ў 1922 г. на землях былога маёнтка Іванаўка. Паводле перапісу 1926 г. — пасёлак, 9 гаспадарак, 34 жыхары. У 1988 г. апошні яго жыхар пераселены ў в. Іванаўка.

БАРШЧОЎКА, вёска ў Хімоўскім сельсавеце, за 15 км ад чыгуначнай станцыі Бярэзіна на лініі Бабруйск—Жлобін, на шашы Бабруйск—Рагачоў. Відаць, ад прозвішча Боршч, Баршчоў спачатку ўзніклі найменні ўрочышча і рэчкі, каля якіх з'явілася паселішча з той жа назвай. Вядома па пісьмовых крыніцах 19 ст. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Бортнікаўскай воласці Бабруйскага павета, 16 двароў, 102 жыхары. На пачатку 20 ст. 17 гаспадарак, 112 жыхароў. У 1917 г. 17 двароў, 122 жыхары. У 1924 г. да вёскі далучаны вялікі ўчастак зямлі з дзяржаўнага фонду. Паводле перапісу 1926 г. на месцы сучаснага населенага пункта было дзве вёскі — Баршчоўка 1-я (19 двароў, 107 жыхароў) і Баршчоўка 2-я (14 двароў, 60 жыхароў), якія пасля зліліся. У 1931 г. створаны калагс «Новае жыццё». На пачатак 1997 г. 17 двароў, 27 жыхароў. На мясцовых могілках брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях з гітлераўцамі ў 1944 г. На магіле ў 1975 г. ўстаноўлены помнік-абеліск з мемарыяльным надпісам.

БАЯРШЧЫНА, вёска ў Осаўскім сельсавеце, за 19 км ад чыгуначнай станцыі Ясень на лініі Бабруйск—Мінск. У аснове назвы — баяры, сацыяльная група насельніцтва ў 13—18 ст. На пачатку 20 ст. — фальварак Гарадкоўскай воласці Бабруйскага павета, 1 двор, 8 жыхароў. Паводле перапісу 1917 г. — фальварак, які ўваходзіў у маёнтак Дойнічава, 36 жыхароў. У 1922 г. на месцы былога фальварка яго колішнія батракі стварылі пасёлак. Паводле перапісу 1926 г. — пасёлак, 14 гаспадарак, 75 жыхароў. У 1987 спыніла існаванне.

БАЯРЫ, вёска ў Сычкаўскім сельсавеце, за 5 км ад чыгуначнай станцыі Мірадзіна на лініі Бабруйск—Мінск і на шашы Бабруйск—Мінск, на р. Ваўчанка (прыток Бярэзіны). Назва ад сацыяльнай групы насельніцтва — баяраў. Па пісьмовых крыніцах вядома з 19 ст. На 1847 г. — вёска ў складзе маёнтка Осава, належала памешчыкам Асяцінскім. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, 27 двароў, 183 жыхары, хлебазапасны мага-

зін. На пачатку 20 ст. 23 двары, 143 жыхары. У 1914 г. вёска была разгорнута на хутары. У 1917 г. 52 двары, 258 жыхароў. У 1924 г. адкрыта працоўная школа 1-й ступені, для якой у 1925 г. пабудавана новае памяшканне; школу наведвала 75 вучняў (1925). Паводле перапісу 1926 г. — хутары Баяры, 65 двароў, 321 жыхар. У 1934 г. створаны калгас «Чырвоныя Баяры». У 1980 г. да Баяраў далучана сумежная вёска Ваўчанка. На пачатак 1997 г. 62 двары, 97 жыхароў. У вёсцы амбулаторыя, клуб, кніжны, прамтаварны, прадуктовы, гаспадарчы магазіны, ферма буйной рагатай жывёлы, сталярная майстэрня, зернедрабільня. Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях з гітлераўцамі (сярод пахаваных — Герой Савецкага Саюза М.А.Ізюмаў); у 1970 г. на магіле ўстаноўлены помнік-стэла з мемарыяльным надпісам. Непадалёку ад вёскі два археалагічныя помнікі — курганныя могільнікі (33 і 19 насыпаў).

БЕЛАРУСЬ, пасёлак у Бортнікаўскім сельсавеце, за 5 км ад чыгуначнай станцыі на лініі Бабруйск—Жлобін, каля шашы Бабруйск—Гомель. Непадалёку ад пасёлка пачынаецца рака Беліца (прыток Алы). Паходзіць ад назвы Белая Русь. У дадзеным выпадку назва мемарыяльная, сімвалічная. Пасёлак заснаваны ў 1920-я гады выхадцамі з навакольных населеных пунктаў. У 1991 г. апошні яго жыхар перасяліўся ў в. Іванаўка.

БІБКАЎШЧЫНА, вёска ў Сычкаўскім сельсавеце, за 1 км ад чыгуначнай станцыі Мірадзіна на лініі Бабруйск—Мінск, на шашы Бабруйск—Мінск, на р. Ваўчанка (прыток Бярэзіны). Назва ад прозвішчаў Бібка, Бібкаў. Вядома па пісьмовых крыніцах з 19 ст. На 1857 г. — памешчыцкі фальварак. Паводле перапісу 1897 г. — таксама фальварак у Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, 4 двары, 38 жыхароў. Побач быў аднайменны хутар, 2 двары, 10 жыхароў. На пачатку 20 ст. ў фальварку 3 двары, 16 жыхароў, а на хутары 6 двароў, 27 жыхароў. У 1917 г. 11 двароў, 46 жыхароў. Паводле перапісу 1926 г. — хутары, 19 двароў, 92 жыхары. У 1929 г. створаны калгас «Чырвоны працаўнік № 2» (5 сялянскіх гаспадарак). На пачатак 1997 г. 11 двароў, 14 жыхароў.

БІРЧА, вёска ў Бортнікаўскім сельсавеце, за 7 км ад чыгуначнай станцыі Цялуша на лініі Бабруйск—Жлобін. Назва ад тэрмінаў «бірчэя» (падатак за правоз) ці «бірчы» (зборшчык падатку). Вядома па пісьмовых крыніцах з 16 ст. У 1639 г. — шляхецкі маёнтак у Вялікім княстве Літоўскім. З 1793 г. ў складзе Расіі, з 1795 г. ў Бабруйскім павеце Мінскай губерні. У 1838 г. 90 жыхароў мужчынскага полу, памешчыцкая ўласнасць. На 1847 г. — сяло, цэнтр маёнтка памешчыкаў Местараў, 27 двароў, 209 жыхароў. Паводле перапісу 1897 г. — сяло Бортнікаўскай воласці Бабруйскага павета, 56 двароў, 478 жыхароў, хлебазапасны магазін, царква. Раз у год (1 кастрычніка) праводзіўся таржок. Побач з сялом месціўся маёнтак Бірча, у якім было 25 жыхароў, пастаялы двор і карчма. На пачатку 20 ст. — вёска, 80 двароў, 499 жыхароў, царква, крама, пастаялы двор. У маёнтку было 38 жыхароў. У 1917 г. 94 двары і 625 жыхароў; у маёнтку, які належаў памешчыку Ваньковічу, 93 жыхары. У маі 1917 г. сельскагаспадарчыя рабочыя маёнтка аб'явілі забастоўку, патрабуючы павышэння платы за працу. Забастоўкай кіравала член мясцовага батрацкага камітэта Г.Ермакова. У 1921 г. адкрыта пачатковая школа (у былым памешчыцкім будынку), вучылася 50 дзяцей (1925). Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 92 двары, 470 жыхароў. У 1930 г. створаны калгас «Перамога», дзейнічала кузня. У 1967 г. да Бірчы далучаны вёска Куханка, пасёлкі Бірча 3-я і Бірча 4-я. На пачатак 1997 г. 152 двары, 323 жыхары. У вёсцы Дом культуры, бібліятэка, пачатковая школа, фермы буйной рагатай жывёлы і свінагадоўчая, майстэрні па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі. На мясцовых могілках брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі; на магіле ў 1970 г. ўстаноўлены помнік-абеліск.

БІРЧА 1-я, пасёлак ў Бортнікаўскім сельсавеце, за 9 км ад чыгуначнай станцыі Цялуша на лініі Бабруйск—Жлобін. Заснаваны ў 1923 г. на былых памешчыцкіх землях колішнімі парабкамі. Паводле перапісу 1926 г. — пасёлак Бірча 1-я, 16 гаспадарак, 77 жыхароў. У 1930 г. пасялкоўцы аб'ядналіся ў калгас «Перамога». На пачатак 1997 г. 7 двароў, 11 жыхароў.

БІРЧА 2-я, пасёлак у Бортнікаўскім сельсавеце, за 8 км ад чыгуначнай станцыі Цялуша на лініі Бабруйск—Жлобін. Заснаваны ў 1923 г. на былых памешчыцкіх землях колішнімі парабкамі. Паводле перапісу 1926 г. — пасёлак Бірча 2-я, 13 двароў, 72 жыхары. У 1930 г. пасялкоўцы аб'ядналіся ў калгас «Перамога» (разам з жыхарамі Бірчы 1-й). На пачатак 1997 г. 7 двароў, 14 жыхароў.

БРОЖА, вёска ў Брожскім сельсавеце, за 2 км ад чыгуначнай станцыі Брожа на лініі

Бабруйск—Рабкор. Назва вёскі і ракі Брожка (прыток Бярэзіны), верагодна, балцкага паходжання, прасочваецца сувязь з асновай слова brositi — крыўдзіць (обижать). Гэта назва часта сустракаецца ў Літве. На паўднёвым захадзе Беларусі брожай называюць ягады ядлоўцу. Не выключана сувязь назвы са словам «брод» (бродить), але гэта менш верагодна. Паводле дакументальных крыніц вядома з 16 ст. На 1844 г. казённая ўласнасць. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Брожскай воласці, 31 двор, 208 жыхароў, хлебазапасны магазін. Акрамя земляробства і жывёлагадоўлі, асноўных заняткаў тутэйшых жыхароў, у вёсцы бытавалі такія промыслы, як ткацтва, лоўля рыбы і ракаў, збор ягад і грыбоў, пляценне лапцей з лазы і лыка, віцця вяровак з пянькі, выраб лыжак з дрэва і інш. У 1917 г. 68 двароў, 346 жыхароў. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі створана пачатковая школа (перададзены 2 памешчыцкія будынкі), у 1925 г. было 120 вучняў. З 1922 г. дзейнічала хата-чытальня, пункт па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. Непадалёку ў лесе працавала смалакурня. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 62 гаспадаркі, 312 жыхароў. У 1932 г. створаны калгас «Новае жыццё». На пачатак 1997 г. 58 двароў, 92 жыхары. У вёсцы магазін, ферма буйной рагатай жывёлы. На мясцовых могілках брацкая магіла савецкіх лётчыкаў, якія загінулі ў паветраным баі з гітлераўцамі; на магіле ў 1973 г. ўстаноўлены помнік-стэла з мемарыяльным надпісам. Непадалёку ад вёскі ў лесе магіла савецкіх грамадзян, расстраляных гітлераўцамі ў 1942 г.; на ёй у 1972 г. ўзведзены помнік-абеліск з надпісам-прысвячэннем.

БРОЖА, пасёлак, цэнтр сельсавета і саўгаса імя Ленінскага камсамола, чыгуначная станцыя на лініі Бабруйск—Рабкор, на р. Брожка (прыток Бярэзіны). Упамінаецца ў інвентарных актах 1639 г. як сяло Бабруйскага староства Рэчыцкага павета Мінскага ваяводства Вялікага княства Літоўскага, з'яўлялася дзяржаўнай уласнасцю, працаваў млын. Непадалёку ад сяла знаходзіўся фальварак, два вадзяныя млыны на р. Брожка. Пасля другога падзелу Рэчы Паспалітай (1793) сяло стала цэнтрам воласці (з 1795) Бабруйскага павета Мінскай губерні. На 1798 г. 18 двароў, 127 жыхароў. У 1804 г. пабудавана драўляная царква, у 1849 г. новая. На 1847 г. 23 двары, 125 жыхароў, казённая ўласнасць. У 1865 г. адкрыта земскае народнае вучылішча (у канцы 19 ст. настаўнікам у ім працаваў С.А.Яфімка), былі крама і царква, пазней — хлебазапасны магазін. На пачатку 20 ст. — сяло, цэнтр воласці Бабруйскага павета, 6 гаспадарак, 22 жыхары; у сяле была валасная сядзіба, царква, непадалёку — чыгуначная станцыя Брожа. У 1916 г. заснаваны лесапільны завод. У 1917 г. 12 двароў, 74 жыхары, на чыгуначнай станцыі 3 двары, 24 жыхары. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі на базе земскага народнага вучылішча створана працоўная школа 1-й ступені, у 1923 г. ў ёй было 89 вучняў, бібліятэка. У 1922 г. адкрыта хата-чытальня. Непадалёку ў лесе працавала смалакурня. Паводле перапісу 1926 г. — сяло Брожа, 11 двароў, 38 жыхароў. Пазней станцыя зліцася з пасёлкам. У 1928 г. створаны калгас «Чырвоны Кастрычнік». У час Вялікай Айчыннай вайны ў пасёлку дзейнічала падпольная антыфашысцкая група (кіраўнік В.А.Шчэрбіч). 6 снежня 1942 г. акупанты расстралялі 9 мірных жыхароў пасёлка і разрабавалі іх маёмасць. Цэнтр сельсавета з 1954 г. У 1977, 1978, 1980 гадах пасёлак Брожа пашырыў свае межы, да яго былі далуча-



Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў у пасёлку Брожа.

ны чыгуначная станцыя Брожа, хутар Брожа, вёска Слабодка і пасёлак Смаласкіп. На пачатак 1997 г. 345 двароў, 721 жыхар. У вёсцы сядзібы сельсавета і саўгаса, рамонтныя сельскагаспадарчыя майстэрні, гаражы, лесапільня, ферма буйной рагатай жывёлы, лесаўчастак Бабруйскага леспрамгаса, лясніцтва. Ёсць сярэдняя школа, дзіцячыя яслі-сад, Дом культуры, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленні сувязі і ашчаднага банка, аўтаматычная тэлефонная станцыя, аптэка, сталовая, 4 магазіны, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва. На мясцовых могілках брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях у Вялікую Айчынную вайну ці памерлі ад ран; на ёй у 1975 г. ўстаноўлены помнік. Там жа і магіла ахвяр нямецкага фашызму; на ёй таксама ў 1973 г. ўстаноўлены помнік-абеліск з мемарыяльным надпісам. У памяць пра падпольшчыкаў на будынку сельсавета ёсць мемарыяльная дошка (1977). Колішняя вёска Слабодка, якая аб'ядналася з пасёлкам Брожа, — радзіма Героя Савецкага Саюза А.К.Болбаса.

БРОЖКА, вёска ў Гарбацэвіцкім сельсавеце, за 12 км ад чыгуначнай станцыі Бабруйск, каля шашы Бабруйск—Глуск, на р. Брожка (прыток Бярэзіны). Паходжанне назвы, відаць, тое ж, што і Брожы. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, 19 гаспадарак, 156 жыхароў. На пачатку 20 ст. — вёска Брожка-Таканаўская той жа воласці, 22 двары, 149 жыхароў. У1917 г. — вёска Брожка-Таканаўская, 23 двары, 148 жыхароў. У 1918 г. адкрыта пачатковая школа, у якой у 1925 г. займаліся 35 вучняў, дзейнічаў драматычны гурток. Паводле перапісу 1926 г. — вёска Брожка-Таканаўская, 21 двор, 121 жыхар. У 1931 г. створаны калгас «Полымя рэвалюцыі» (яднаў 15 гаспадарак), працавала калгасная кузня. На пачатак 1992 г. 43 двары, 105 жыхароў; на пачатак 1997 г. 30 двароў, 45 жыхароў. У вёсцы клуб, аддзяленне сувязі, магазін.

БУДА, вёска ў Гарбацэвіцкім сельсавеце, за 18 км ад чыгуначнай станцыі Бабруйск, каля шашы Бабруйск—Слуцк. Назва ад устарэлага слова «буда» — часовае жыллё, невялікае жытло, лясная вартоўня. У 14—18 ст. будамі называлі аддаленыя малыя пабудовы, дзе жылі буднікі, якія выпальвалі з дрэў паташ, дзёгаць, смалу, ордаш, драўняны вугаль. Сустракаецца ў пісьмовых крыніцах 19 ст. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, 14 гаспадарак, 97 жыхароў, быў ветраны млын. Побач з вёскай знаходзілася казённая варта Буда, двары, 21 жыхар. На пачатку 20 ст. каля вёскі працаваў смалакурны завод. У 1917 г. 33 двары, 236 жыхароў, у казённай варце 2 двары, 12 жыхароў, на смалакурным заводзе 2 двары, 8 жыхароў. У 1930 г. вяскоўцы ўступілі ў калгас «Чырвоны лётчык». На пачатак 1997 г. 32 двары, 53 жыхары. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы.

БУДЧЫН, пасёлак у Варатынскім сельсавеце, за 8 км ад чыгуначнай станцыі Мікулічы на лініі Бабруйск—Жлобін. Паходжанне назвы, відаць, тое ж, што і назвы Буда. Заснаваны ў 1921 г. малазямельнымі сялянамі з вёскі Аўсімовічы, якія пасяліліся тут на цераспалосных землях. Паводле перапісу 1926 г. 5 двароў, 32 жыхары. З 1991 г. не існуе.

БЯРЭЗАВІЧЫ, вёска ў Слабодкаўскім сельсавеце, за 3 км ад чыгуначнай станцыі Бабруйск, каля шашы Бабруйск—Слуцк. Паводле мясцовага падання, паселішча заснавана ў мясцовасці, каля якой шумелі бярозавыя гаі, адгэтуль і назва. Сустракаецца ў пісьмовых крыніцах 19 ст. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, 18 двароў, 139 жыхароў, хлебазапасны магазін. У 1917 г. — вёска, 34 двары, 236 жыхароў. У 1918 г. адкрыта пачатковая школа, у якой у 1925 г. было 48 вучняў. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 32 двары, 205 жыхароў. У 1929 г. створаны калгас «За ўладу Саветаў». На пачатак 1997 г. 136 двароў, 326 жыхароў. У вёсцы пачатковая школа, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, ферма буйной рагатай жывёлы. Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях за Радзіму ў Вялікую Айчынную вайну; на магіле ў 1975 г. ўстаноўлены помнік-абеліск з мемарыяльным надпісам.

ВАРАНОВІЧЫ, вёска ў Слабодкаўскім сельсавеце, за 6 км ад чыгуначнай станцыі Бабруйск, побач з шашой Бабруйск—Глуск. Паселішча ўзнікла на ўчастку поля, якое называлася Варанава ніва, адсюль і назва. Вядома па пісьмовых крыніцах з 17 ст. У 1789 г. — вёска Бабруйскага староства Мінскага ваяводства Вялікага княства Літоўскага, дзяржаўная ўласнасць. З 1793 г. у складзе Расіі, з 1795 г. ў Бабруйскім павеце Мінскай губерні. У першай палове 19 ст. — дзяржаўная ўласнасць. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Гарбацэвіцкай воласці, 21 двор, 130

жыхароў. На пачатку 20 ст. 18 двароў, 172 жыхары. У 1908 г. адкрыта земскае народнае вучылішча, для якога ў 1914 г. пабудавана памяшканне; настаўніцай працавала Ксенія Савельева. У 1917 г. 45 двароў, 241 жыхар. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі на базе старой школы створана працоўная школа 1-й ступені, у якой быў 61 вучань (1925). Дзейнічаў гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 56 двароў, 266 жыхароў. На пачатак 1997 г. 44 двары, 121 жыхар. У вёсцы магазін, ферма буйной рагатай жывёлы. Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях у Вялікую Айчынную вайну; на магіле ў 1973 г. ўстаноўлены помнік-абеліск з мемарыяльным надпісам.

ВАРАТЫНЬ, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса імя А.С.Пушкіна, за 2,5 км ад чыгуначнай станцыі Амельня на лініі Бабруйск—Жлобін. Назва ад асновы «вароты» — паселішча каля варотаў ці вароты як адметнасць сяла; назву Варатынь мела лясное ўрочышча, каля якога ўзнікла пасяленне. Упершыню ў пісьмовых крыніцах упамінаецца ў 1560 г. як сяло дзяржаўнай уласнасці. Упамінаецца і ў інвентарных актах 1639 г., таксама як дзяржаўнае сяло Варатын у складзе Бабруйскага староства Рэчыцкага павета Мінскага ваяводства Вялікага княства Літоўскага, 5 двароў. На 1790 г. 29 двароў, карчма. Насельніцтва займалася пераважна земляробствам і жывёлагадоўляй, а таксама промысламі — ткацкімі, шавецкімі, кравецкімі, зборам ягад, грыбоў, лекавых траў, дробным гандлем. З 1793 г. ў складзе Расіі, з 1795 г. ў Бабруйскім павеце Мінскай губерні. У 1844 г. сяло ў складзе маёнтка Варатынь, уласнасць памешчыка А.П.Шахоўскага, 23 гаспадаркі, больш за 200 жыхароў. У 1887 г. адкрыта школа царкоўнай граматы. Паводле перапісу 1897 г. — сяло Туркоўскай воласці Бабруйскага павета, 105 двароў, 756 жыхароў, працавалі млын, крупарушка, хлебазапасны магазін, пастаялы двор. У 1902 г. адкрыта земскае народнае вучылішча, для якога ў 1904 г. пабудавана памяшканне. На пачатку 20 ст. — вёска, 103 двары, 920 жыхароў. У 1917 г. — таксама вёска, 152 двары, 1006 жыхароў. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі на базе старой школы створана працоўная школа 1-й ступені, у ёй у 1923 г. было 63 вучні. У колішнім маёнтку Бяляцін, непадалёку ад Варатыні, у 1922 г. створана сельскагаспадарчая арцель «Пчолка» (115 га зямлі). Тады ж была адкрыта хата-чытальня. З 1924 г. цэнтр сельсавета. У 1925 г. ў мясцовай школе вучылася 107 дзяцей. На той час працавалі 3 млыны, 2 кузні, крупарушка. У 1931 г. створаны калгас «Чырвоная Варатынь» (40 сялянскіх гаспадарак). Адным з арганізатараў калгаса быў С.Ф.Парахневіч, сакратар Варатынскай камсамольскай арганізацыі, якога 8.11.1931 г. забілі кулакі. У час Вялікай Айчыннай вайны ў вёсцы дзейнічала антыфашысцкая падпольная група, якой кіраваў В.Т.Пракопчык. У 1967 г. да Варатыні далучаны вёскі Бяляцін і Паляддзе. На пачатак 1997 г. 219 двароў, 658 жыхароў. У вёсцы сядзібы сельсавета і калгаса, ферма буйной рагатай жывёлы, майстэрні па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, гаражы, іншыя гаспадарчыя пабудовы. Дзейнічаюць сярэдняя школа (пры ёй краязнаўчы музей), дзіцячыя яслі-сад, аддзяленні сувязі і ашчаднага банка, Дом культуры (хор даярак удастоены ганаровага звання народны), фельчарска-акушэрскі пункт, бібліятэка, магазін, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва. На мясцовых могілках брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў баях з нямецка-фашысцкімі акупантамі (сярод пахаваных Герой Савецкага Саюза І.Я.Арол); на магіле ў 1970 г. ўстаноўлены помнік-абеліск з мемарыяльным надпісам. У цэнтры вёскі ў 1971 г. ўстаноўлены абеліск на ўшанаванне памяці жыхароў населеных пунктаў сельсавета, якія загінулі ў баях у Вялікую Айчынную вайну.

Фельчарска-акушэрскі пункт у вёсцы Варатынь.

ВЕРБКІ, вёска ў Сычкаўскім сельсавеце, за 10 км ад чыгуначнай станцыі Мірадзіна на лініі Бабруйск—Мінск, пры ўпадзенні р. Ваўчанкі ў Бярэзіну. Назва ад асновы «вярба» — дрэва, відаць, надзвычай пашыранае ў мясцовасці, дзе быў заснаваны населены пункт. На пачатку 20 ст. — фальварак Свіслацкай воласці Бабруйскага павета, 3 двары, 49 жыхароў. У 1917 г. — хутар, 8 двароў, 46

жыхароў. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 13 двароў, 66 жыхароў. На пачатак 1997 г. 14 двароў, 25 жыхароў. Паблізу вёскі два археалагічныя помнікі — паселішчы.

ВІКТАРАЎКА, вёска ў Осаўскім сельсавеце, за 5 км ад чыгуначнай станцыі Ясень на лініі Бабруйск—Мінск. Назва ад імя Віктар ці прозвішча Віктараў. Вядома па пісьмовых крыніцах з 19 ст. Паводле перапісу 1897 г. — хутар Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, 1 двор, 6 жыхароў. На пачатак 20 ст. — хутар, 2 двары, 5 жыхароў. Паводле перапісу 1926 г. — пасёлак, 3 гаспадаркі, 13 жыхароў. Тады ж да пасёлка прырэзаны вялікі ўчастак зямлі з дзяржаўнага запаснога фонду для новых пасяленцаў. Да вайны было 12 двароў, больш за 70 жыхароў. На пачатак 1997 г. 1 двор, 4 жыхары. Радзіма вучонага У.І.Лемяшонка.

ВІКТАРАЎКА — БОЛЬ І ЛЮБОЎ МАЯ

«Мой родны кут, як ты мне мілы, забыць цябе не маю сілы...» Гэтыя радкі класіка заўсёды ўзнікаюць у памяці, калі згадваю запаветны куточак — сваю Віктараўку, дзе нарадзіўся і дзе прайшло дзяцінства.

Быццам старонкі кнігі, перагортваю ў памяці тыя далёкія дні і бачу невялікую прыгожую вёсачку, акружаную алешнікам, кустамі і балотцамі, рэчачку Ваўчанку з прыгожым драўляным мосцікам цераз яе, з чысцюткай вадой, дзе было шмат рыбы і ракаў, а на балотах і ў хмызняках — качак і іншых птушак. Але ў 1940-х гадах пасля меліярацыі нічога гэтага не засталося, а ў 1950-х магутнай тэхнікай павынішчалі алешнікі, перааралі лугі, і замест былой прыгажосці засталося голае поле, засмечанае дзядоўнікам.

Глядзіш — і сэрца заходзіцца ад болю. Я тут жа заплюшчваю вочы і ў думках вяртаюся ў тую ранейшую цуда-казку. Вунь на ўскраіне вёскі векавечны дуб з буслянкай. Як радаваліся мы кожную вясну, калі прыляталі белакрылыя птахі і клёкатам будзілі наваколле. Вунь калгасны кароўнік з высокай сіласнай вежай, на якой весела круціўся флюгер з пяціканцовай зоркай. А вунь вялікі калгасны сад, які закладваў мой бацька.

Дарэчы, бацька быў і заснавальнікам вёскі. У 1926 г. ён і брат маці Пятро Бебчык атрымалі тут зямлю і паставілі першыя хаты. Бацька расказваў, што калісьці на рэчцы быў млын. Млынара звалі Віктар. Таму Віктараўкай спачатку назвалі ўрочышча, а потым вёску.

У 1929 г. бацька пераканаў жыхароў Зарэчча, Міхайлаўшчыны і Каменкі аб'яднацца ў калгас, якому далі імя Будзённага. Бацьку абралі старшынёй. У Віктараўку пераехалі беднякі з іншых мясцін, і хутка яна ператварылася ў прыгожую, вясёлую вёсачку. Перад пачаткам вайны было тут 11 хат і недзе пад 70 жыхароў. Калгас рос, мацнеў. Бацька стараўся як мог заахвоціць людзей да працы. Маці, Яўгіння Міронаўна, расказвала: паедзе ў Бабруйск, купіць паркалю на кофтачкі жанчынам і ўрачыста ўручыць у якасці прэміі за ўдарную працу. А тыя ў адказ стараліся, перавыконвалі нормы. Ну, а жонка старшыні павінна была паказваць прыклад. Маці даіла 12 калгасных кароў, а яшчэ бегла на палявыя работы і абавязкова павінна была перакрыць дзённую норму. Да таго ж дома была свая гаспадарка і чацвёра дзяцей. Увогуле вяскоўцы працавалі сумленна, з уздымам, натхненнем.

І заўжды спявалі: па дарозе на работу, і ў полі, і калі вярталіся дадому. А з вечара дзяўчаты каля чыёй-небудзь хаты спявалі да позняй ночы, ды так, каб чулі ў суседніх вёсках — Баранавічах, Паласках, Міхайлаўшчыне. Моладзі ў Віктараўцы было шмат — амаль у кожнай хаце па 4—5 дзяцей.

Колькі было радасці, калі ў 1937 г. бацьку (ён працаваў старшынёй Осаўскага сельсавета) за перавыкананне плана нарыхтовак збожжа дзяржаве прэміравалі патэфонам. Гэта была вялікая падзея не толькі для нашай сям'і, але і для ўсёй вёскі. Звычайна вечарамі ў нас збіраліся вяскоўцы, найперш моладзь, каб паслухаць любімыя мелодыі, а ўлетку патэфон ставілі на адчыненае акно, каб чулі ўсе. Шмат новых песень прыжылося ў вёсцы ад таго патэфона.

З удзячнасцю ўспамінаю жыхароў нашай Віктараўкі. Перад вачыма паўстаюць Максім Шышкевіч, Пятро Бебчык і іх жонкі Алены, Васіль Казусёнак з братам Фёдарам і жонкамі Аленай і Агапай, Хрысціна Астапёнак, Іван Сцяхновіч з жонкай Адар'яй, Антон Рымашэўскі са сваёй Ганнай, Рыгор Паляшчук з Марыяй, Алена Багдановіч (без мужа выгадавала і паставіла на ногі пяцёра дзяцей), Зося Шандаровіч, Міхаіл Ніцкі і яго жонка Марыя, Вольга, Марыя, Уладзімір Ніцкія.

Памятаю, як у 1939 г. ў нашай хаце праходзіў сход, на якім абмяркоўвалі, каго паслаць на Усесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку ў Маскву. Вялікае шчасце выпала тады даяр-

кам Алене Багдановіч і Зосі Шандаровіч. Іх віншавалі, радаваліся за іх, жадалі поспехаў.

Праўда, жылі віктараўцы, як і ў навакольных вёсках, небагата. Але затое дружна, дапамагалі адно аднаму. У кожным двары была карова і іншыя жыўнасць. Бульбы і гародніны хапала са сваіх сотак. Тое-сёе атрымлівалі і з калгаса на працадні. Горш было з адзеннем і абуткам. Сеялі лён і самі ткалі посцілкі, ручнікі, абрусы, палатно, з якога шылі бялізну. Нашы жанчыны былі вялікія майстрыхі. Абрусы і посцілкі маёй маці, напрыклад, дэманстраваліся нават на раённай выстаўцы народных умельцаў і былі адзначаны прэміяй.

У перадваенныя часы ў нас не ведалі замкоў. І гарэлачнай распусты не было. Калі на вяселлі ці хрэсьбінах, здаралася, нехта, і хопіць лішку, то схаваецца далей ад людскіх вачэй, бо быць на падпітку лічылася непрыстойным.

Лепшыя якасці віктараўцаў выявіліся ў цяжкія гады гітлераўскай акупацыі. Усе жыхары вёскі актыўна падтрымлівалі партызан. Ніхто не хацеў заняць пасаду старасты, хоць акупанты дужа стараліся. Тады (са згоды партызан) вырашылі выконваць яго абавязкі па чарзе.

У партызаны пайшлі мае аднавяскоўцы Іван Паляшчук, Пеця Сцяхновіч, які там і загінуў. Не вярнуліся з фронту Васіль Казусёнак, Максім Шышкевіч, Антон Рымашэўскі, Міхаіл Ніцкі, Уладзімір Ніцкі. Удзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны былі Аляксандр Багдановіч (лётчык), Уладзімір Шышкевіч, Іван Казусёнак.

Кожнае лета прыязджаю ў родныя мясціны. Пастаю на былым дворышчы, абыду знаёмыя з дзяцінства ваколіцы, памаўчу ў скрусе на могілках, дзе пахаваны мае дзяды, родзічы, землякі. І нясцерпная туга сціскне сэрца. Божа, злітуйся над намі, дай нам памяць і розуму надалей, каб не зніклі з роднай зямлі нашы гнездаванні, каб не астылі нашы сэрцы і не аслабеў наш дух! *У.І.Лемяшонак.*

ВІЛЫ, вёска ў Варатынскім сельсавеце, за 2 км ад чыгуначнай станцыі Амельня на лініі Бабруйск—Жлобін. Назва-арыенцір: развілка дарог, ростань; такое найменне мела ўрочышча, дзе заснавана пасяленне. На пачатку 20 ст. — вёска Качэрыцкай воласці Бабруйскага павета, 32 двары, 194 жыхары. У 1917 г. — вёска той жа воласці і павета, 39 двароў, 239 жыхароў. Паводле перапісу 1926 г. — пасёлак, 14 двароў, 76 жыхароў. У 1931 г. створаны калгас «Шлях Леніна» (яднаў 14 гаспадарак). На пачатак 1997 г. 9 двароў, 19 жыхароў.

ВІНАГРАДАЎКА, вёска ў Сычкаўскім сельсавеце, за 9 км ад чыгуначнай станцыі Бабруйск. Назва ад асновы вінаград. Заснавана ў пачатку 1920-х гадоў. У 1934 г. створаны калгас «Вінаградаўка». На пачатак 1997 г. 15 двароў, 22 жыхары.

ВІШНЁЎКА (да 1937 г. в. Кабылічы), вёска, цэнтр сельсавета, за 3 км ад чыгуначнай станцыі Чырвоны Брод на лініі Бабруйск—Калінкавічы. Назва ад асновы «вішня» — пашыранага на Беларусі пладовага дрэва. Вядома па пісьмовых крыніцах з 16 ст. як сяло Кабылічы Бабруйскага староства Рэчыцкага павета Мінскага ваяводства Вялікага княства Літоўскага. На 1560 г. — сяло дзяржаўнай уласнасці. У 1639 г. 26 двароў, 71 жыхар мужчынскага полу, дзейнічалі млын і рудня. Апрача земляробства і жывёлагадоўлі жыхары займаліся ткацтвам, шыццём, вырабам абутку і інш. З 1793 г. ў складзе Расіі, з 1795 г. ў Бабруйскім павеце Мінскай губерні, дзяржаўная ўласнасць. На пачатку 20 ст. — вёска Брожскай воласці Бабруйскага павета, 39 двароў, 259 жыхароў. У 1910 г. адкрыта земскае народнае вучылішча (у наёмным памяшканні), настаўнікам працаваў Аляксандр Стэфкін. У 1917 г. — вёска, 50 двароў, 300 жыхароў, дзейнічала царква. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі на базе старой школы створана працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1923 г. было 35, у 1925 г. 47 вучняў. Паводле перапісу 1926 г. 61 двор, 317 жыхароў. У 1937 г. Кабылічы былі перайменаваны ў Вішнёўку. У Вялікую Айчынную вайну гітлераўцы разрабавалі і спалілі вёску. З 1968 г. Вішнёўка — цэнтр сельсавета. На пачатак 1997 г. 172 двары, 469 жыхароў. У вёсцы сядзібы сельсавета, птушкафабрыкі «Бабруйская», лясніцтва, майстэрні па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, устаноўка па прыгатаванні вітаміннай мукі. Дзейнічаюць 8-гадовая школа, дзіцячыя яслі-сад, Дом культуры, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва, аддзяленні сувязі і ашчаднага банка, сталовая, два магазіны, аўтаматычная тэлефонная станцыя, стадыён. На ўшанаванне памяці землякоў, а таксама іншых жыхароў Вішнёўскага сельсавета, якія загінулі ў баях за Радзіму ў Вялікую Айчынную вайну, у 1976 г. ўстаноўлены помнік-абеліск з мемарыяльным надпісам. На мясцовых могілках помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў і



Помнік землякам у вёсцы Вішнёўка.

партызан, якія загінулі ў баях з гітлераўцамі ў Вялікую Айчынную вайну (устаноўлены ў 1975 г.).

ВОЎЧАЯ ГАРА, вёска ў Бортнікаўскім сельсавеце, за 9 км ад чыгуначнай станцыі Цялуша на лініі Бабруйск—Жлобін, побач з шашой Бабруйск—Рагачоў. Назва гаворыць пра наяўнасць ваўкоў у месцы ўзнікнення паселішча: гара, дзе збіраліся (вадзіліся) ваўкі; так называлася ўрочышча, дзе з'явілася пасяленне. Заснавана ў пачатку 1920-х гадоў як пасёлак выхадцамі з суседніх хутароў і вёсак. У 1925 г. да пасёлка далучаны вялікі ўчастак былой памешчыцкай зямлі, на якім пабудаваліся колішнія парабкі ці малазямельныя сяляне. У 1931 г. створаны калгас імя М.І.Калініна. На пачатак 1997 г. 32 двары, 64 жыхары. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы.

ВУГЛЫ, вёска ў Вішнёўскім сельсавеце, за 10 км ад чыгуначнай станцыі Чырвоны Брод на лініі Бабруйск—Рабкор, на р. Бярэзіна. Назва характарызуе асаблівасці паселішча — забудову рассыпнога тыпу, размяшчэнне вёскі ў вугле (у кутку) якога-небудзь абшару. Сустракаецца ў пісьмовых крыніцах 19 ст. У 1837 г. — вёска ў Бабруйскім павеце, памешчыцкая ўласнасць, 41 рэвізская душа. На пачатку 20 ст. — вёска Туркоўскай воласці Бабруйскага павета, 60 гаспадарак, 440 жыхароў, драўляная царква, якая захавалася да нашага часу. У 1917 г. 72 двары, 477 жыхароў. У 1923 г. да Вуглоў далучаны вялікі ўчастак былой памешчыцкай зямлі для будаўніцтва сядзіб колішнім парабкам і малазямельным сялянам. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 81 двор, 432 жыхары. На пачатак 1997 г. 57 двароў, 114 жыхароў. У вёсцы клуб, бібліятэка, магазін, ферма буйной рагатай жывёлы і авечкагадоўчая. Радзіма скульптара К.І.Аляксеева.

ВЯЛІКАЯ КАНТОРА, пасёлак у Варатынскім сельсавеце, за 5 км ад чыгуначнай станцыі Мікулічы на лініі Бабруйск—Жлобін. Назва абазначае месца, дзе колісь, магчыма, была кантора (праўленне, управа) нейкай гаспадаркі ці вытворчасці. Заснавана ў 1920 г. як выселак перасяленцамі з вёскі Аўсімовічы на цераспалосныя землі. Паводле перапісу 1926 г. — выселак, 14 двароў, 88 жыхароў, потым пасёлак. У 1930 г. створаны калгас «Бальшавік». На пачатак 1997 г. 5 двароў, 8 жыхароў.

ВЯЛІКІЯ БОРТНІКІ, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса «Гігант», за 10 км ад чыгуначнай станцыі Цялуша на лініі Бабруйск—Жлобін, на шашы Бабруйск—Рагачоў і на р. Ала (прыток Бярэзіны). Назва ад асновы «борць», «бортнік» — зборшчык мёду. Першыя пісьмовыя ўпамінанні адносяцца да сярэдзіны 16 ст. Паводле рэестравых дакументаў 1540 г. вядома як сяло Бортнікі ў Бабруйскім старостве Рэчыцкага павета Мінскага ваяводства Вялікага княства Літоўскага, шляхецкая ўласнасць. У 1566 г. 32 двары. З 1793 г. ў складзе Расіі, з 1795 г. цэнтр воласці Бабруйскага павета Мінскай губерні. Паводле гаспадарчага перапісу 1834 г. — уласнасць памешчыка, 35 гаспадарак, 350 жыхароў. На 1844 г. вёска Вялікія Бортнікі ў складзе маёнтка Бортнікі, які быў уласнасцю

Гандлёвы цэнтр у вёсцы Вялікія Бортнікі.

памешчыкаў Манкевічаў. У 1863 г. адкрыта земскае народнае вучылішча, у якім у 1894 г. навучаліся 71 хлопчык і 2 дзяўчынкі, настаўніцай працавала В.Ф.Кляеўская (1892). На 1885 г. — сяло, цэнтр воласці Бабруйскага павета, 47 двароў, 342 жыхары. Паводле перапісу 1897 г. — сяло, 93 двары, 858 жыхароў, дзейнічалі земскае народнае вучылішча, дзве лаўкі, два ветраныя млыны, пастаялы двор, кузня, працаваў фельчар. Раз у год праводзіўся кірмаш. Побач знаходзіўся маёнтак Бортнікі, 1 гаспадарка, 48 жыхароў. Аптрача земляробства і жывёлагадоўлі, асноўных заняткаў мясцовага насельніцтва, у сяле бытавалі такія промыслы, як ткацтва, віццё вяровак з пянькі, пашыў адзення, пляценне лапцей з лыка, кошыкаў з лазы, ракітніку, каранёў хвоі ці елкі, збор ягад і грыбоў, лекавых траў. Частка насельніцтва займалася кавальскімі, сталярнымі, бандарнымі, калёснымі промысламі, нарыхтоўкай лесу, парабкавала ў памешчыкаў. Значнае месца ў жыцці жыхароў сяла займала бортніцтва. З-за беднасці і галечы некаторыя сяляне ішлі на адыходныя промыслы — нарыхтоўку і сплаў лесу па р. Бярэзіне. У жніўні 1905 г. ў маёнтку Бортнікі адбылася забастоўка парабкоў. На пачатку 20 ст. Вялікія Бортнікі — вёска, 144 двары, 951 жыхар. У 1917 г. — вёска, 167 гаспадарак, 1037 жыхароў, дзейнічала царква; у маёнтку 92 жыхары. У 1918 г. жыхары Вялікіх Бортнікаў актыўна змагаліся супраць польскага корпуса І.Доўбар-Мусніцкага. У грамадзянскую вайну дзейнічаў валасны рэўком. У 1918 г. вёска была разгорнута на хутары. У 1922 г. адкрыты ўрачэбны ўчастак і хата-чытальня, затым пункт па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1924 г. да вёскі далучаны вялікі ўчастак былой памешчыцкай зямлі, на якой пачалі будавацца колішнія парабкі і беднякі, было створана таварыства па сумеснай апрацоўцы зямлі (17 сялянскіх гаспадарак). У 1925 г. створана партыйная ячэйка. З 1925 г. — цэнтр сельсавета. Паводле перапісу 1926 г. — хутары Вялікія Бортнікі, 205 двароў, 1050 жыхароў. У 1930 г. створаны першы калгас «Чырвоны партызан № 1» (у 1931 г. 76, у 1939 г. — 233 гаспадаркі). У 1931 г. створана МТС. У 1933 г. працавала кузня. На пачатак 1997 г. 394 двары, 907 жыхароў. У вёсцы сядзібы сельсавета і калгаса, майстэрні па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, гаражы, лесапільня, сталярная майстэрня, установка для прыгатавання вітаміннай мукі, ферма буйной рагатай жывёлы. Дзейнічаюць Дом культуры, краязнаўчы музей, сярэдняя школа, дзіцячыя яслі-сад, аўтаматычная тэлефонная станцыя, бібліятэка, аддзяленні сувязі і дзяржаўнага банка, сталовая, пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва. У цэнтры вёскі ў 1970 г. ўстаноўлены помнік — дзве стэлы на ўшанаванне памяці жыхароў калгаса, якія загінулі ў баях Вялікай Айчыннай вайны.

ВЯЛІЧКАВА, вёска ў Хімоўскім сельсавеце, за 11 км ад чыгуначнай станцыі Бярэзіна на лініі Бабруйск—Жлобін, побач з шашой Бабруйск—Рагачоў. Назва ад прозвішча Вялічка; так называлася ўрочышча, дзе заснавана пасяленне. Вядома з 1639 г. як урочышча Вялічкава. У 1857 г. — вёска Вялічкі ў Бабруйскім павеце, памешчыцкая ўласнасць. Паводле перапісу 1897 г. 12 двароў, 73 жыхары. Побач быў аднайменны фальварак, 1 двор, 9 жыхароў. На пачатку 20 ст. — вёска, 14 двароў, 66 жыхароў. У 1917 г. 17 двароў, 122 жыхары. У 1923 г. побач на былых памешчыцкіх землях перасяленцамі з вёскі Вялічкава створаны пасёлак Новае Вялічкава, а вёска стала называцца Старое Вялічкава. Паводле перапісу 1926 г. у Старым Вялічкаве было 17 двароў, 97 жыхароў, у Новым Вялічкаве, на той час вёсцы — 36 двароў, 175 жыхароў. У 1931 г. створаны калгас імя Э.Тэльмана. У 1967 г. Старое Вялічкава і Новае Вялічкава аб'ядналіся ў вёску Вялічкава. На пачатак 1997 г. 25 двароў, 34 жыхары. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы. Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях з гітлераўцамі; на магіле ў 1975 г. ўстаноўлены помнік-абеліск з мемарыяльным надпісам.

ГАНЧАРОЎКА, вёска ў Хімоўскім сельсавеце, за 10 км ад чыгуначнай станцыі Бярэзіна на лініі Бабруйск—Жлобін, паблізу шашы

Бабруйск—Магілёў. Назва, мабыць, ад прозвішча Ганчароў ці Ганчар, што паказвае на род заняткаў пасяленцаў — ганчарства. Заснавана ў 1925 г. як пасёлак на колішніх памешчыцкіх землях жыхарамі з навакольных населеных пунктаў. Паводле перапісу 1926 г. — пасёлак, 5 двароў, 23 жыхары. У 1934 г. створаны калгас «Сталінская перамога». У 1967 г. да Ганчароўкі далучана Новая Вёска. На пачатак 1997 г. 48 двароў, 78 жыхароў. У вёсцы магазін, ферма буйной рагатай жывёлы. На могілках брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях з нямецка-фашысцкімі акупантамі; на магіле ў 1975 г. ўстаноўлены помнік-абеліск з мемарыяльным надпісам.

ГАРБАЦЭВІЧЫ, вёска, цэнтр сельсавета і саўгаса «Бабруйскі», за 15 км ад чыгуначнай станцыі Бабруйск, на шашы Бабруйск—Слуцк. Назва ад асновы «горб» (тып рэльефу) — узгорак, згіб схілу і вытворнага ад яго прозвішча Горбач. Па пісьмовых крыніцах вядома з сярэдзіны 16 ст. У 1639 г. — сяло Бабруйскага староства Рэчыцкага павета Мінскага ваяводства Вялікага княства Літоўскага, 9 двароў, 28 жыхароў мужчынскага полу, дзяржаўная ўласнасць. З 1793 г. ў складзе Расіі, з 1795 г. цэнтр воласці Бабруйскага павета Мінскай губерні. У ліпені 1812 г. праз Гарбацэвічы пад націскам французскіх заваёўнікаў адступала руская армія на чале з Багаціёнам. Пэўны час сяло было езуіцкім уладаннем, з 1836 г. памешчыцкая ўласнасць. У 1844 г. Гарбацэвічы належалі памешчыкам Грыневічам. На 1860 г. 32 двары, 210 жыхароў, у складзе аднайменнага маёнтка. У 1869 г. адкрыта земскае народнае вучылішча, для якога пазней (1908) пабудавана памяшканне; вучыліся 53 хлопчыкі, настаўнікам працаваў Іван Ганчарэнка (1891/1892 г.). У 1879 г. пабудавана царква. Паводле перапісу 1897 г. 16 двароў, 53 жыхары, у сяле сядзіба валаснога праўлення, царква, земскае народнае вучылішча, лячэбніца. Раз у год (2 чэрвеня) праводзіўся таржок. Побач з сялом аднайменныя маёнтак (4 двары, 30 жыхароў) і хутар (1 двор, 8 жыхароў). Мясцовыя сяляне апрача земляробства і жывёлагадоўлі займаліся рознымі промысламі: ткацтвам, пашывам адзення, пляценнем кошыкаў і лапцей, вырабам рознага начыння для гаспадаркі і інш. У 1917 г. 47 двароў, 242 жыхары, у маёнтку 5 двароў, 48 жыхароў. У час грамадзянскай вайны і ваеннай замежнай інтэрвенцыі дзейнічаў Гарбацэвіцкі валасны рэўком. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі на базе старой школы створана працоўная школа 1-й ступені. У 1920 г. пачала дзейнічаць камсамольская ячэйка. 19 чэрвеня 1919 г. Гарбацэвічы наведаў М.І.Калінін з групай прадстаўнікоў агітпоезда «Кастрычніцкая рэвалюцыя» і правёў двухгадзінную гутарку з тутэйшымі сялянамі. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі на базе старой школы створана працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1923 г. навучалася 145 дзяцей з Гарбацэвічаў і суседніх хутароў і вёсак. 20 верасня 1920 г. створана сельскагаспадарчая арцель «Мурашка» (першы старшыня П.І.Новікаў); 27 снежня 1922 г. — сельскагаспадарчае таварыства «Земляроб». У тым жа годзе адкрыта хата-чытальня, на ўтрыманне якой сельскагаспадарчае таварыства ўнесла 12 пудоў жыта, у 1923 г. — урачэбны ўчастак. З 1924 г. Гарбацэвічы — цэнтр сельсавета. Паводле перапісу 1926 г. — сяло, 30 двароў, 116 жыхароў. У 1933 г. працавалі дзве калгасныя кузні, паравы млын. У час нямецка-фашысцкай акупацыі ў Гарбацэвічах дзейнічалі падпольшчыкі. На пачатак 1997 г. — 187 двароў, 527 жыхароў. На тэрыторыі вёскі — сядзібы сельсавета, саўгаса, майстэрні па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, ферма буйной рагатай жывёлы, установка па прыгатаванні вітамінаў мукі, футравы цэх, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва. Дзейнічаюць сярэдняя школа (ёсць краязнаўчы музей), бібліятэка, Дом культуры, фельчарска-акушэрскі пункт, дзіцячыя яслі-сад, аддзяленні сувязі і ашчаднага банка, аўтаматычная тэлефонная

Дом культуры ў вёсцы Гарбацэвічы.

станцыя, два магазіны, ветпункт, сталовая. Каля будынка сельсавета брацкая магіла савецкіх воінаў і ваеннапалонных, якія загінулі ў барацьбе за Радзіму ў Вялікую Айчынную вайну; на магіле ў 1974 г. ўстаноўлены помнік-абеліск з мемарыяльным надпісам. У цэнтры вёскі пахаваны забітыя бандытамі камсамольцы М.Патоцкі і І.Сінкавец; на іх магіле таксама помнік-абеліск (1976). У 1970 г. ўстаноўлены мемарыяльныя дошкі: на будынку сельсавета з нагоды наведання вёскі М.І.Калініным, на будынку школы — на ўшанаванне памяці беларускага пісьменніка П.Р.Галавача, які вучыўся ў гэтай школе і прымаў актыўны ўдзел у барацьбе за савецкую ўладу ў Гарбацэвічах.

ГАРОДЧЫНА, вёска ў Гарохаўскім сельсавеце, за 25 км ад чыгуначнай станцыі Бабруйск, непадалёку ад шашы Бабруйск—Глуск. Назва, можна меркаваць, звязана з паходжаннем жыхароў-пасяленцаў — з горада (гараджане). Сустракаецца ў пісьмовых крыніцах 19 ст. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Гарадкоўскай воласці Бабруйскага павета, 17 двароў, 100 жыхароў, школа царкоўнай граматы, якая потым была закрыта. На пачатку 20 ст. — вёска, 14 двароў, 70 жыхароў. У 1917 г. 24 двары, 134 жыхары, паводле перапісу 1926 г. — вёска, 27 двароў, 141 жыхар. У 1931 г. створаны калгас «Чырвоная звязда» (19 гаспадарак). Дзейнічала кузня. На пачатак 1997 г. 1 двор, 1 жыхар. Каля вёскі археалагічны помнік — курганны могільнік (5 насыпаў).

ГАРОХАВА, вёска ў Хімоўскім сельсавеце, за 13 км ад чыгуначнай станцыі Бярэзіна, на лініі Бабруйск—Жлобін, паблізу шашы Бабруйск—Магілёў. Назва ад асновы «гарох». Заснавана ва ўрочышчы Гарахавіца ў пачатку 1920-х гадоў перасяленцамі з суседніх вёсак. Непадалёку пачынаецца р. Рылейка (правы прыток Алы, басейн Бярэзіны). У 1925 г. да Гарохава далучаны вялікі ўчастак зямлі з запаснога фонду. У 1931 г. створаны калгас «Кастрычнік». На пачатак 1997 г. 13 двароў, 20 жыхароў.

ГАРОХАЎКА, вёска, цэнтр сельсавета і саўгаса «Гарохаўскі», за 21 км ад чыгуначнай станцыі Бабруйск, каля шашы Бабруйск—Глуск. Назва таксама ад асновы гарох, не выключана, што і ад вытворнага ад яго прозвішча; назву Гарохаўка мела поле, на якім заснавана пасяленне. Па пісьмовых крыніцах вядома з 17 ст. У 1639 г. — урочышча Гарохаўка Бабруйскага староства Рэчыцкага павета Вялікага княства Літоўскага. З 1793 г. ў складзе Расіі, з 1795 г. ў Бабруйскім павеце Мінскай губерні. На 1847 г. — вёска, дзяржаўная ўласнасць, 12 двароў, 150 жыхароў. У 1917 г. — вёска Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, 19 двароў, 113 жыхароў. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 27 двароў, 142 жыхары. У 1930 г. створаны калгас «Рассвет», з 1983 г. — цэнтр сельсавета. На пачатак 1997 г. 196 двароў, 513 жыхароў. У вёсцы сядзібы сельсавета і саўгаса, майстэрні па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, малочнатаварны комплекс, установка па прыгатаванні вітамінной мукі, зернедрабільня, лесапільня, ветэрынарны пункт. Дзейнічаюць сярэдняя школа, фельчарска-акушэрскі пункт, дзіцячыя яслі-сад, аддзяленні сувязі і ашчаднага банка, бібліятэка, сталовая, аўтаматычная тэлефонная станцыя, стадыён, Дом культуры, тры магазіны, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва. У цэнтры вёскі брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў баях з нямецка-фашысцкімі акупантамі; на магіле ў 1976 г. ўстаноўлены помнік-абеліск з мемарыяльным надпісам.

ГЛЕБАВА РУДНЯ, вёска ў Вішнёўскім сельсавеце, за 4 км ад чыгуначнай станцыі Брожа на лініі Бабруйск—Рабкор, на р. Брожка (прыток Бярэзіны), паблізу шашы Бабруйск—Мазыр. Назва ад імя Глеб і асновы «рудня», «рудніца» — у мінулым невялікае прадпрыемства па выплаўцы жалеза з балотнай руды; гэту назву мела ўрочышча, дзе заснавана пасяленне. У 1639 г. вядома як урочышча ў складзе Бабруйскага староства Рэчыцкага павета Вялікага княства Літоўскага. На 1789 г. 7 двароў, 41 жыхар, млын, жалезная вытворчасць, дзяржаўная ўласнасць. З 1793 г. ў складзе Расіі, з 1795 г. ў Бабруйскім павеце Мінскай губерні. На 1847 г. 9 двароў, 44 жыхары, у складзе дзяржаўнага маёнтка Брожа. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Брожскай воласці Бабруйскага павета, 19 двароў, 142 жыхары. На пачатку 20 ст. — вёска, 28 двароў, 177 жыхароў. У 1917 г. 30 двароў, 183 жыхары. У 1920 г. адкрыта працоўная школа 1-й ступені, у якой навучалася 20 хлопчыкаў і дзяўчынак (1923). Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 48 двароў, 187 жыхароў. У 1930 г. створаны калгас «14 год Кастрычніка». На пачатак 1997 г. 27 двароў, 47 жыхароў. Каля вёскі Глебава-Рудненскае радовішча пяскоў.

ГЛУША, вёска ў Осаўскім сельсавеце, за 14 км ад чыгуначнай станцыі Ясень на лініі

Бабруйск—Мінск, непадалёку ад шашы Бабруйск—Слуцк. Назва-характарыстыка: пасяленне ў глушы, удалечыні ад шляхоў зносін. Вядома па пісьмовых крыніцах з 16 ст. як вёска Рэчыцкага павета Вялікага княства Літоўскага. З 1793 г. ў складзе Расіі, з 1795 г. ў Бабруйскім павеце Мінскай губерні. У 1844 г. 20 двароў, 141 жыхар, належала Грыцэнкам. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Гарадкоўскай воласці Бабруйскага павета, дзейнічалі пастаялы двор, хлебазапасны магазін. На пачатку 20 ст. — вёска той жа воласці, 64 двары, 390 жыхароў. У 1917 г. 101 двор, 473 жыхары. Побач знаходзіліся аднайменныя засценак (1 двор, 9 жыхароў), маёнтак (33 жыхары) і карчма (6 двароў, 32 жыхары). У 1918 г. адкрыта пачатковая школа, для якой у 1923 г. пабудавана новае памяшканне: у 1925 г. вучыліся 57 дзяцей. У 1923 г. адкрыты фельчарскі пункт. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 73 двары, 340 жыхароў. У 1928 г. створаны калгас «Глуша», дзейнічала кузня. Пасля вайны размяшчаўся дзіцячы дом. На пачатак 1997 г. 45 двароў, 69 жыхароў. У вёсцы клуб, магазін, ферма буйной рагатай жывёлы.

ГЛУША, рабочы пасёлак, цэнтр пасялковага Савета, за 17 км ад чыгуначнай станцыі Мірадзіна на лініі Бабруйск—Мінск, на шашы Бабруйск—Слуцк. Населены пункт узнік сярод лясных глухіх масіваў (адгэтуль і назва) у сувязі з будаўніцтвам тут у 1883 г. шклозавода. Знаходзіўся ў Гарадкоўскай воласці Бабруйскага павета. На пачатку 20 ст. 239 жыхароў, працавалі лесапільны, смалярны заводы, шклозавод, карчма. У 1913 г. адкрыта паштова-тэлеграфная кантора. Рабочыя шклозавода ўдзельнічалі ў рэвалюцыйным руху. У сакавіку 1917 г. створаны рабочы Савет. У 1917 г. 96 двароў, 581 жыхар. У 1921 г. адкрыта пачатковая школа, у 1924 г. — хата-чытальня. У 1925 г. непадалёку ў лесе дзейнічала смалакурня. З 1931 да 1960 г. цэнтр Рымавецкага сельсавета. З 1935 г. рабочы пасёлак. У 1942—1943 гг. дзейнічала падпольная антыфашысцкая група (кіраўнік І.Р.Гарнастай). У 1948—1949 гадах працаваў торфазавод «Звязда». З 1960 г. — цэнтр пасялковага Савета. На пачатак 1997 г. 868 двароў, 1824 жыхары. У рабочым пасёлку лясніцтва, шклозавод «Камінтэрн», бальніца, сярэдняя школа (пры ёй краязнаўчы музей), дзіцячыя яслі-сад, музычная школа, аддзяленні сувязі і ашчаднага банка, бібліятэка, Дом быту, клуб, стадыён. У цэнтры пасёлка ў 1976 г. ўстаноўлены помнікі: землякам і на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан, што загінулі ў баях у Вялікую Айчынную вайну, а на будынку пасялковага Савета мемарыяльная дошка ў памяць аб баявой дзейнасці мясцовых падпольшчыкаў. Каля клуба ў 1960 г. пастаўлены бюст У.І.Леніна. У Глушы жыў і пахаваны пісьменнік Алесь Адамовіч.

Сядзібны дом у пасёлку Глуша.

Праваслаўная царква ў пасёлку Глуша.

ГРАБАВА, вёска ў Слабодкаўскім сельсавеце, за 7 км ад чыгуначнай станцыі Бабруйск, на шашы Бабруйск—Глуск. Назва ад асновы «граб» — парода дрэва, пашыраная ў месцы заснавання пасялення. Вядома з 18 ст. Паводле пісьмовых крыніц у 1760 г. — дзяржаўная ўласнасць, 32 двары. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, 23 двары, 147 жыхароў. На пачатку 20 ст. — вёска той жа воласці, 25 двароў, 215 жыхароў. У 1917 г. 41 двор, 259 жыхароў. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 35 двароў, 173 жыхары. У 1931 г. створаны калгас «13 год Чырвонай Арміі», дзейнічала кузня. На пачатак 1997 г. 42 двары, 96 жыхароў. У вёсцы магазін, ферма буйной рагатай жывёлы. Каля вёскі помнік-абеліск (1967) на магіле савецкіх грамадзян, якіх загубілі нямецка-фашысцкія акупанты.

ДАМАНОВА, вёска ў Вішнёўскім сельсавеце, за 12 км ад чыгуначнай станцыі Бабруйск, на р. Бярэзіне. Назва ад прозвішча Даман, Даманаў. З пісьмовых крыніц вядома з 18 ст., дзяржаўная ўласнасць. На 1847 г. 6 двароў і 79 жыхароў, дзяржаўная ўласнасць. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Брожскай воласці Бабруйскага павета, 23 двары, 160 жыхароў. Побач з вёскай размяшчаліся казённая лясная старожка (1 двор, 7 жыхароў) і хутар (2 двары, 21 жыхар) той жа назвы. У 1917 г. 54 двары, 282 жыхары. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 58 двароў, 295 жыхароў. У 1930 г. створаны калгас «Чырвонае Даманова». Дзейнічала школа па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. На пачатак 1997 г. 38 двароў, 55 жыхароў. У вёсцы лясніцтва, лесапільня, фельчарска-акушэрскі пункт, клуб, бібліятэка. Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі; у 1975 г. на магіле ўстаноўлены помнік-абеліск з мемарыяльным надпісам.

ДАМАНОВА, пасёлак у Вішнёўскім сельсавеце, за 6 км ад чыгуначнай станцыі Чырвоны Брод на лініі Бабруйск—Акцябрскі, на р. Бярэзіна. Сустракаецца ў пісьмовых крыніцах 19 ст. ў складзе маёнтка Брожа, дзяржаўная ўласнасць. На пачатку 20 ст. — вёска Даманова 2-е Брожскай воласці Бабруйскага павета, 31 двор, 190 жыхароў. У 1917 г. 40 двароў, 229 жыхароў. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 22 двары, 124 жыхары. У 1930 г. створаны калгас імя Энгельса. На пачатак 1997 г. 20 двароў, 30 жыхароў. У вёсцы клуб, бібліятэка, магазін.

ДАНІЛАЎ МОСТ, вёска ў Варатынскім сельсавеце, за 4 км ад чыгуначнай станцыі Амельня на лініі Бабруйск—Жлобін. Назва ад імя Даніла і вытворных ад яго прозвішчаў; мост, які пабудаваў Даніла. Заснавана ў 1924 г. як пасёлак на землях запаснога фонду. Паводле перапісу 1926 г. — пасёлак, 12 двароў, 68 жыхароў. У 1931 г. створаны калгас «Чырвоны Мост». На пачатак 1997 г. 17 двароў, 28 жыхароў. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы. Брацкая магіла савецкіх воінаў і ваеннапалонных, што загінулі ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі; на магіле ў 1970 г. ўстаноўлены помнік-абеліск з мемарыяльным надпісам.

ДАЧНАЕ (да 1964 г. К а р ч м а), пасёлак у Глушанскім пасялковым Савеце, за 27 км ад чыгуначнай станцыі Бабруйск, на шашы Бабруйск—Слуцк. Заснаваны ў пачатку 1920-х гадоў на месцы, дзе калісьці была карчма, адсюль і назва. У 1964 г. перайменаваны ў Дачнае. На пачатак 1997 г. 11 двароў, 10 жыхароў.

ДВОР-ГАРБАЦЭВІЧЫ, вёска ў Гарбацэвіцкім сельсавеце, за 6 км ад чыгуначнай станцыі Чырвоны Брод на лініі Бабруйск—Рабкор. Назва, магчыма, ад прозвішча Гарбацэвіч — яго двор (маёнтак, фальварак). Заснавана ў 1920-я гады на былых памешчыцкіх землях перасяленцамі з вёскі Гарбацэвічы. На пачатак 1997 г. 7 двароў, 11 жыхароў.

ДВОР-ГЛУША, вёска ў Гарохаўскім сельсавеце, за 19 км ад чыгуначнай станцыі Мірадзіна на лініі Бабруйск—Мінск. Назва абазначае пасяленне, размешчанае ў глухім месцы, у глушы. Заснавана ў 1920-х гадах перасяленцамі з вёскі Глуша. Паводле перапісу 1926 г. — хутар, 3 двары, 11 жыхароў. На пачатак 1997 г. 3 двары, 4 жыхары.

ДВОРЫШЧА, вёска ў Гарохаўскім сельсавеце, за 23 км ад чыгуначнай станцыі Бабруйск. Назва-тэрмін ад асновы двор: дворышча — месца былога двара, маёнтка, дзе заснавана пасяленне. Па пісьмовых крыніцах вядома з 1639 г. як урочышча ў Бабруйскім старостве Рэчыцкага павета Мінскага ваяводства Вялікага княства Літоўскага. З 1793 г. ў складзе Расіі, з 1795 г. ў Бабруйскім павеце Мінскай губерні. Паводле перапісу 1897 г. — урочышча Гарадкоўскай воласці Бабруйскага павета, 2 двары, 11 жыхароў. На пачатку 20 ст. 1 двор, 6 жыхароў. У 1921 г. — хутар, 5 гаспадарак, 19 жыхароў. Паводле перапісу

1926 г. — пасёлак, 16 двароў, 77 жыхароў. Працаваў пункт па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1934 г. створаны калгас «Сёмы з'езд Саветаў». У 1967 г. да вёскі далучаны хутар Заручэўе. На пачатак 1997 г. 16 двароў, 23 жыхары. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы.

ДЗЯЎЧЫН, пасёлак у Гарохаўскім сельсавеце, за 21 км ад чыгуначнай станцыі Бабруйск, непадалёку ад шашы Бабруйск—Слуцк. Назва, магчыма, ад асновы слова «дзяўчына»; на ўчастку зямлі, які на той час належаў дзяўчыне (дачцэ багатага пана, яшчэ незамужняй), заснавана пасяленне. Сустракаецца ў пісьмовых крыніцах 19 ст. Паводле перапісу 1897 г. — урочышча Гарадкоўскай воласці Бабруйскага павета. У 1923 г. — пасёлак, да якога далучаны ўчастак, а ў 1925 г. — другі ўчастак зямлі колішняга памешчыцкага маёнтка Глуша. Паводле перапісу 1926 г. на месцы сучаснага населенага пункта былі два пасёлкі — Дзяўчын 1-ы (8 двароў, 47 жыхароў) і Дзяўчын 2-і (9 двароў, 31 жыхар), якія пасля аб'ядналіся. Дзейнічаў пункт па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1989 г. апошні яго жыхар перасяліўся ў пасёлак Глуша.

ДОЙНІЧАВА, вёска ў Осаўскім сельсавеце, цэнтр саўгаса «Дойнічава», за 18 км ад чыгуначнай станцыі Мірадзіна на лініі Бабруйск—Мінск. Назва балцкага паходжання, утворана ад прозвішча Дойніч. Сустракаецца ў пісьмовых крыніцах 19 ст. Паводле перапісу 1897 г. — фальварак Гарадкоўскай воласці Бабруйскага павета, 5 гаспадарак, 53 жыхары. У 1901 г. заснаваны лесапільны завод, у 1905 г. — спіртзавод. На пачатку 20 ст. 1 двор, 42 жыхары. У 1921 г. на месцы былога фальварка створаны саўгас «Дойнічава» (у 1926 г. 700 га зямлі). Дзейнічаў паравы млын. У 1921 г. адкрыта пачатковая школа, гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1922 г. — хата-чытальня, клуб. З 1928 г. дзейнічала электраўстаноўка. У 1934 г. адкрыты дзіцячыя яслі-сад, установлена тэлефонная сувязь. На пачатак 1997 г. 162 двары, 437 жыхароў. У вёсцы саўгасная сядзіба, ферма буйной рагатай жывёлы, лесапільня, майстэрня па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, ветэрынарны пункт. Дзейнічаюць Дом культуры, бібліятэка, дзіцячыя яслі-сад, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленні сувязі і ашчаднага банка, магазін. На магіле савецкага лётчыка В.К.Маркелава, які загінуў у паветраным баі з гітлераўцамі 30 чэрвеня 1941 г., у 1976 г. ўстаноўлены помнік-стэла з мемарыяльным надпісам.



Забудова новай вуліцы ў вёсцы Дойнічава.

ДОЎГАЯ, пасёлак у Бортнікаўскім сельсавеце, за 5 км ад чыгуначнай станцыі Савічы на лініі Бабруйск—Жлобін, непадалёку ад шашы Бабруйск—Жлобін. Назва ад асновы «доўгі», характарызуе форму пасёлка. Заснаваны ў 1925 г. У 1991 г. памёр апошні яго жыхар.

ДОЎГІ КЛІН, вёска ў Варатынскім сельсавеце, чыгуначная станцыя Амельня на лініі Бабруйск—Жлобін. Заснавана ў 1920-х гадах. Назва ўтворана ад мясцовасці — участка зямлі ў форме выцягнутага, доўгага кліна, на якім узнікла пасяленне. У 1960 г. далучана чыгуначная станцыя Амельня, а таксама вёска Малая Кантора. На пачатак 1997 г. 45 двароў, 120 жыхароў. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы, клуб, магазін.

ДУБАЎКА, вёска ў Цялушскім сельсавеце, за 1 км ад чыгуначнай станцыі Савічы на лініі Бабруйск—Жлобін, каля шашы Бабруйск—Жлобін. Заснавана ў 1921 г. як пасёлак на месцы былога маёнтка Вавулічы, які належаў памешчыкам Варанцовым-Вельямінавым, колішнімі іх парабкамі. На той час у яго наваколлі шумеў дубовы гай, адсюль і назва. Паводле перапісу 1926 г. — пасёлак, 15 двароў, 65 жыхароў. На пачатак 1997 г. 75 двароў, 130 жыхароў. У вёсцы свінагадоўчая ферма.

ДУБРОВА, вёска ў Слабодкаўскім сельсавеце, за 4 км ад чыгуначнай станцыі Бабруйск, каля шашы Бабруйск—Глуск. На час, калі было заснавана пасяленне, у яго наваколлі раслі магутныя дубы, адсюль і назва. У 1917 г. — засценак Туркоўскай воласці Бабруйскага павета, 77 двароў, 475 жыхароў. На пачатак 1997 г. 31 двор, 70 жыхароў.

ДУМАНОЎШЧЫНА, вёска ў Хімоўскім сельсавеце, за 8 км ад чыгуначнай станцыі Бярэзіна на лініі Бабруйск—Жлобін. Назва ад прозвішча Думан, Думанаў і вытворных ад яго слоў. Вядома па пісьмовых крыніцах з 19 ст. У 1844 г. — вёска Бабруйскага павета, уласнасць памешчыкаў Г.Закржэўскай і М.Міхайлоўскага. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Качэрьцкай воласці Бабруйскага павета, 21 двор, 157 жыхароў. Побач з вёскай быў аднайменны фальварак, 4 двары, 14 жыхароў. На пачатак 20 ст. 20 гаспадарак, 131 жыхар. У 1917 г. 33 двары, 197 жыхароў; паводле перапісу 1926 г. — вёска, 33 двары, 185 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну дзейнічала падпольная антыфашысцкая група. На пачатак 1997 г. 46 двароў, 100 жыхароў. У вёсцы магазін, ферма буйной рагатай жывёлы.

ЕМЯЛЬЯНАЎ МОСТ, вёска ў Гарбацэвіцкім сельсавеце, за 12 км ад чыгуначнай станцыі Бабруйск, каля шашы Бабруйск—Глуск. Назва абазначае мост, які пабудаваў Емяльян. Вядома з 19 ст. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, 33 двары, 194 жыхары. У 1917 г. 50 двароў, 266 жыхароў. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 57 двароў, 271 жыхар. У 1971 г. створаны калгас «Ленінскі шлях». На пачатак 1997 г. 46 двароў, 100 жыхароў. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы.

ЖАЎРАНКІ, пасёлак у Бортнікаўскім сельсавеце, за 11 км ад чыгуначнай станцыі Цялуша на лініі Бабруйск—Жлобін, на шашы Бабруйск—Рагачоў. Назва ўтворана ад слова «жаўранак» (жаўрук) — птушка, якая гняздзіцца на Беларусі. Заснаваны ў 1920 г. на былых памешчыцкіх землях. Паводле перапісу 1926 г. — пасёлак, 9 двароў, 48 жыхароў. На пачатак 1997 г. 4 двары, 6 жыхароў.

ЗАБАЛОЦЦЕ, вёска ў Цялушскім сельсавеце, за 2 км ад чыгуначнай станцыі Цялуша, на лініі Бабруйск—Жлобін, на шашы Бабруйск—Жлобін. Назва-арыенцір: паселішча за балотам. У пісьмовых крыніцах упершыню ўпамінаецца ў 1639 г. як засценак Бабруйскага староства Мінскага ваяводства Вялікага княства Літоўскага. На 1727 г. — вёска ў складзе маёнтка Глуск, памешчыцкая ўласнасць, 31 жыхар мужчынскага полу. У 1738 г. 18 двароў, 152 жыхары, царква. З 1793 г. ў складзе Расіі, з 1795 г. ў Бабруйскім павеце Мінскай губерні. У 1798 г. ўладанне Радзівіла, 76 жыхароў мужчынскага полу. У 1890 г. заснавана вінакурня. На пачатку 20 ст. — вёска Брожскай воласці Бабруйскага павета, 19 двароў, 126 жыхароў. У 1967 г. да Забалоцця далучаны вёскі Беляцін, пасёлкі Рэпішча і Чырвоная Горка. На пачатак 1997 г. 69 двароў, 138 жыхароў. У вёсцы магазін, ферма буйной рагатай жывёлы.

ЗАБУДЗЬКІ, вёска ў Осаўскім сельсавеце, за 12 км ад чыгуначнай станцыі Ясень на лініі Бабруйск—Мінск. Назва, магчыма, паходзіць ад наймення расліны чарнобыльнік, быльняк, а можа, і ад катэгорыі бесклапотных людзей, якія на ўсё забываліся. Сустракаецца ў пісьмовых крыніцах 19 ст. Паводле гаспадарчага рэестра 1844 г. — вёска, 16 двароў, 116 жыхароў, уласнасць памешчыкаў Быкоўскіх. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Гарадкоўскай воласці Бабруйскага павета, 33 двары, 261 жыхар. Побач з вёскай у той жа воласці знаходзілася аднайменная памешчыцкая сядзіба, 3 двары, 22 жыхары. На пачатку 20 ст. — вёска, 44 двары, 379 жыхароў. У 1907 г. адкрыта земскае народнае вучылішча, для якога ў тым жа годзе ўзведзены будынак; настаўніцай працавала Лукія Мараўская. У 1917 г. — вёска, 69 двароў, 374 жыхары. У 1923 г. да вёскі прырэзаны вялікі ўчастак памешчыцкай зямлі колішняга маёнтка Забудзькі. У 1923 г. вёска перайменавана ў пасёлак. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі земскае народнае вучылішча пераўтворана ў працоўную школу 1-й ступені, у якой у 1925 г. было 45 вучняў. Паводле перапісу 1926 г. на месцы сучаснай вёскі былі два пасёлкі: Забудзькі 1-я (7 двароў, 34 жыхары) і Забудзькі 2-я (60 двароў, 268 жыхароў), якія пасля зліліся. У 1931 г. створаны калгас «Камінтэрн», працавала кузня. На пачатак 1997 г. 41 двор, 69 жыхароў. У вёсцы магазін, ферма буйной рагатай жывёлы.

ЗАГЛЫБОКАЕ, вёска ў Гарбацэвіцкім сельсавеце, за 10 км ад чыгуначнай станцыі Мірадзіна на лініі Бабруйск—Мінск, непадалёку ад шашы Бабруйск—Слуцк. Назва-арыенцір: паселішча, якое ляжыць за глыбокім ровам. Сустракаецца ў пісьмовых крыніцах 19 ст., паводле перапісу 1897 г. — хутар Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, 7 двароў, 56 жыхароў. На пачатку 20 ст. — вёска, 10 двароў, 105 жыхароў. У 1917 г. — вёска, 28 двароў, 142 жыхары. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 27 двароў, 131 жыхар. У 1934 г. створаны калгас «Чырвонае Заглыбокае». На пачатак 1997 г. 17 двароў, 33 жыхары.

ЗАЛЕССЕ, вёска ў Слабодкаўскім сельсавеце, за 6 км ад чыгуначнай станцыі Бабруйск, каля шашы Бабруйск—Глуск. Назва-арыенцір: паселішча, якое ляжыць за лесам. Узнікла ў 1920-х гадах. На пачатак 1997 г. 17 двароў, 31 жыхар.

ЗАРА, пасёлак у Кавалеўскім сельсавеце, за 4 км ад чыгуначнай станцыі Цялуша на лініі Бабруйск—Жлобін. Назва дадзена ў савецкі час як сімвал светлага, шчаслівага жыцця. Заснаваны ў 1919 г. на былых памешчыцкіх землях. Паводле перапісу 1926 г. — пасёлак, 17 гаспадарак, 67 жыхароў. У 1992 г. далучаны да в. Кавалі.

ЗАРЭЧЧА, вёска ў Осаўскім сельсавеце, за 1 км ад чыгуначнай станцыі Ясень на лініі Бабруйск—Мінск. Назва-арыенцір: паселішча за рэчкай. Сустракаецца ў пісьмовых крыніцах 19 ст. Паводле перапісу 1897 г. — 10 двароў, 76 жыхароў. У 1917 г. — засценак Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, 10 двароў, 72 жыхары. Паводле перапісу 1926 г. — засценак, 15 двароў, 78 жыхароў. На 1997 г. 6 двароў, 9 жыхароў.

ЗВЯЗДА, пасёлак у Цялушскім сельсавеце, за 1 км ад чыгуначнай станцыі Плёсы на лініі Бабруйск—Жлобін. Назва дадзена ў савецкі час як сімвал новага, свабоднага жыцця. Заснаваны ў пачатку 1920-х гадоў. У 1967 г. далучаны пасёлкі Чырвоны Востраў і Чырвоны Араты. На пачатак 1997 г. 33 двары, 67 жыхароў. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы.

ІВАНАЎКА, вёска, цэнтр калгаса імя Някрасава ў Бортнікаўскім сельсавеце, за 2 км ад чыгуначнай станцыі Плёсы на лініі Бабруйск—Жлобін. Назва ад імя Іван ці ўтвораных ад яго прозвішчаў. Сустракаецца ў пісьмовых крыніцах 19 ст. Паводле перапісу 1897 г. — фальварак Туркоўскай воласці Бабруйскага павета, 1 двор, 27 жыхароў. У 1917 г. — фальварак, 37 жыхароў. У 1922 г. на месцы памешчыцкага фальварка створаны пасёлак. Паводле перапісу 1926 г. — пасёлак, 13 двароў, 65 жыхароў. На пачатак 1997 г. 177 двароў, 395 жыхароў. У вёсцы калгасная сядзіба, ферма буйной рагатай жывёлы, машынны двор, майстэрня па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі. Дзейнічаюць Дом культуры, бібліятэка, магазін, аддзяленні сувязі і ашчаднага банка, фельчарска-акушэрскі пункт. У 1967 г. далучаны вёскі Дзесяты Кастрычнік, Культура і пасёлак Селянін. У цэнтры вёскі з 1976 г. помнік на ўшанаванне

Помнік землякам у вёсцы Іванаўка.

памяці 57 землякоў, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны.

ІЗЮМАВА (да 1964 г. Дурынічы), вёска ў Сычкаўскім сельсавеце, за 8 км ад чыгуначнай станцыі Ясень на лініі Бабруйск—Мінск. Вядома па пісьмовых крыніцах 19 ст. як сяло Дурынічы. Паводле гаспадарчага рэестра 1834 г. — сяло, 40 рэвізскіх душ, уласнасць памешчыкаў Забелаў. На 1847 г. 11 двароў, 51 жыхар. У 1860 г. — цэнтр маёнтка Дурынічы Бабруйскага павета. Паводле перапісу 1897 г. — сяло Свіслацкай воласці Бабруйскага павета, 23 двары, 163 жыхары. Побач знаходзіліся аднайменныя памешчыцкі фальварак (8 двароў, 72 жыхары, працаваў паравы млын) і пасёлак (2 двары, 9 жыхароў, паравы млын). На пачатку 20 ст. — вёска, 13 двароў, 118 жыхароў, у фальварку 68 жыхароў. У 1917 г. 31 двор, 176 жыхароў, у маёнтку 172 жыхары. У 1918 г. адкрыта пачатковая школа, якой перададзены нацыяналізаваны памешчыцкі будынак; вучыліся (1925) 60 дзяцей. У 1923 г. да вёскі далучаны вялікі ўчастак былой памешчыцкай зямлі. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 40 двароў, 203 жыхары. У 1928 г. пачала дзейнічаць электраўстаноўка, вёска электрыфікавана. У 1934 г. створаны калгас імя С.М.Будзённага. У 1964 г. вёска перайменавана ў гонар Героя Савецкага Саюза М.Ізюмава, які вызначыўся пры вызваленні тэрыторыі Сычкаўскага сельсавета і 28 чэрвеня гераічна загінуў у баі. У 1966 г. да Ізюмава далучана вёска Будзёнаў-

ка. На пачатак 1997 г. 23 двары, 33 жыхары. Колішняя вёска Будзёнаўка — радзіма Героя Савецкага Саюза М.Р.Пінчука.

КАВАЛІ, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса імя А.Неўскага, на чыгуначнай лініі Бабруйск—Жлобін, на р. Беліца (прыток Алы), каля шашы Бабруйск—Жлобін. Назва хутчэй за ўсё ад прафесіі каваля, а магчыма, ад прозвішча Каваль. Вядома па пісьмовых крыніцах з 1560 г. як сяло Бабруйскага староства Рэчыцкага павета Мінскага намесніцтва Вялікага княства Літоўскага, дзяржаўная ўласнасць. У 1621 г. — сяло, 7 двароў. У 1639 г. — сяло, дзяржаўная ўласнасць. На 1684 г. — таксама сяло, 4 нежылыя двары. На 1786 г. — сяло ў складзе маёнтка Міхалёва, 18 гаспадарак, шляхецкая ўласнасць. З 1793 г. ў складзе Расіі, з 1795 г. ў Бабруйскім павеце Мінскай губерні, уласнасць памешчыкаў Калчэўскіх і Лашкаровых. У чэрвені 1886 г. сяляне самавольна пасвілі сваю жывёлу на сенажацях мясцовага памешчыка, што прывяло да сутыкнення іх з аховай. У 1891 г. пачалі дзейнічаць млын і сукнавальня. Паводле перапісу 1897 г. — сяло Туркоўскай воласці, 125 дамоў, 867 жыхароў, царква, крама, пастаялы двор. Раз у год (30 жніўня) ладзіўся таржок. Паблізу размяшчалася чыгуначная станцыя Цялуша, 5 двароў, 65 жыхароў. Бытавалі розныя саматужныя промыслы — кавальскія, кравецкія, бандарныя, ткацкія, шавецкія і інш. У 1904 г. адкрыта земскае народнае вучылішча. На пачатку 20 ст. 119 двароў, 898 жыхароў; у 1917 г. 173 двары, 977 жыхароў. З 1924 г. — цэнтр сельсавета. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі на базе старой створана працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1925 г. было 128 вучняў, дзейнічаў драматычны гурток, пункт па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1925 г. пра-



Вуліца ў вёсцы Кавалі.

цавалі два ветраныя і паравы млыны, крупарушка. У канцы 1920-х гадоў арганізавана тарфяная арцель «Прагрэс», адкрыта кузня. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 162 двары, 810 жыхароў. У 1931 г. створаны калгас «Зара рэвалюцыі» (яднаў 31 гаспадарку). Адначасова быў арганізаваны і калгас «Пралетарый». У 1967 г. да вёскі далучана чыгуначная стацыя Цялуша, у 1992 г. — пасёлкі Падліп'е, Зара. На пачатак 1997 г. 318 двароў, 930 жыхароў. У вёсцы сядзібы сельсавета і калгаса, чыгуначная станцыя, лесапільня, майстэрні па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, комплекс па адкорме буйной рагатай жывёлы, свінагадоўчая ферма, установка па прыгатаванні вітамінавай мукі, зернедрабільня. Ёсць васьмігадовая школа, дзіцячыя яслі-сад, Дом культуры, аўтаматычная тэлефонная станцыя, бібліятэка, аддзяленні сувязі і ашчаднага банка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, сталовая, комплексны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва, магазін. У дзвюх брацкіх магілах пахаваны савецкія воіны і партызаны, што загінулі ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі; на магілах у 1972 г. ўстаноўлены помнікі-абеліскі з мемарыяльнымі надпісамі. Радзіма Героя Сацыялістычнай Працы М.П.Кавалёва, вучоных М.К.Балыкіна, В.М.Борац (станцыя Цялуша), В.Ф.Цікавага.

КАЗАКОВА, вёска ў Вішнёўскім сельсавеце, за 3 км ад чыгуначнай станцыі Чырвоны Брод на лініі Бабруйск—Рабкор, каля шашы Бабруйск—Мазыр. Назва хутчэй за ўсё ад асновы «казак»; казакі — гэта вольныя людзі, у мінулым прыгнечаныя сяляне, якія ўцяклі ад паноў на ўскраіны Расійскай дзяржавы і там пасяліліся. З 18 ст. да 1917 г. казацтва — ваеннае саслоўе, якое несла вайсковую службу ў Расійскай імперыі. Слова «казак» пакладзена ў аснову шматлікіх прозвішчаў, ад якіх утвораны і геаграфічныя назвы. У 1924 г. — дарожная старожка, 4 жыхары. Паводле перапісу 1926 г. — старожка, 2 двары, 12 жыхароў. У пачатку 1930-х гадоў пераўтворана ў вёску. У 1940 г. 38 гаспадарак, 170 жыхароў. У час Вялікай Айчыннай вайны дзейнічала антыфашысцкая падпольная група. 10 кастрычніка 1943 г. нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску, разрабавалі маёмасць жыхароў. На пачатак 1997 г. 29 двароў, 36 жыхароў.

КАЛІНАЎКА, вёска ў Гарбацэвіцкім сельсавеце, за 11 км ад чыгуначнай станцыі Бабруйск, каля шашы Бабруйск—Слуцк. Засна-

вана ў пачатку 1920-х гадоў выхадцамі з навакольных населеных пунктаў на колішняй памешчыцкай зямлі. У 1931 г. створаны калгас імя М.І.Калініна. Адсюль і назва населенага пункта. На пачатак 1997 г. 67 двароў, 128 жыхароў. У вёсцы магазін, свінагадоўчая ферма, зернедрабільня. Каля вёскі брацкая магіла савецкіх воінаў, ваеннапалонных і партызан, якія загінулі ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі акупантамі ў Вялікую Айчынную вайну; на магіле ў 1976 г. ўстаноўлены помнік-абеліск з мемарыяльным надпісам.

КАЛІНІНА, вёска ў Сычкаўскім сельсавеце, за 6 км ад чыгуначнай станцыі Бабруйск, побач з шашой Мінск—Бабруйск. Заснавана ў пачатку 1920-х гадоў на былых памешчыцкіх землях. Названа імем М.І.Калініна. У 1933 г. створаны калгас імя М.І.Калініна. На пачатак 1997 г. 66 двароў, 130 жыхароў. У вёсцы магазін, ферма буйной рагатай жывёлы. На мясцовых могілках брацкая магіла савецкіх воінаў, што загінулі ў баях з нямецка-фашысцкімі акупантамі; на магіле ў 1970 г. ўстаноўлены помнік-стэла з мемарыяльным надпісам.

КАЛЬЦО, пасёлак у Бортнікаўскім сельсавеце, за 7 км ад чыгуначнай станцыі Цялуша на лініі Бабруйск—Жлобін, непадалёку ад шашы Бабруйск—Рагачоў. Заснаваны ў пачатку 1920-х гадоў на колішніх памешчыцкіх землях выхадцамі з суседніх населеных пунктаў. Назва ўтворана ад зямельнага ўчастка круглай формы, дзе ўзнікла паселішча. У 1991 г. памерлі два апошнія жыхары.

КАМЕНКА, вёска ў Гарохаўскім сельсавеце, за 18 км ад чыгуначнай станцыі Чырвоны Брод на лініі Бабруйск—Рабкор, каля шашы Бабруйск—Глуск. Назва ўтворана ад асновы «камень»: зямля, дзе ўзнікла паселішча, камяністая. Упамінаецца ў гаспадарчых дакументах 19 ст. На 1857 г. — вёска Бабруйскага павета. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Гарадкоўскай воласці Бабруйскага павета, 17 двароў, 124 жыхары. Побач было ўрочышча, 1 двор, 10 жыхароў, дзейнічала смалакурня. На пачатку 20 ст. — засценак, 20 двароў, 217 жыхароў. У 1917 г. 28 двароў, 161 жыхар. У час польскай акупацыі 1919—1920 гг. мясцовыя жыхары стварылі партызанскі атрад, які змагаўся з акупантамі. У 1919 г. адкрыта пачатковая школа (41 вучань у 1925 г.). Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 28 двароў, 165 жыхароў. У 1931 г. створаны калгас «Чырвоная Каменка». У 1940 г. 37 двароў, 156 жыхароў. 2 ліпеня 1943 г. гітлераўцы разрабавалі і спалілі вёску. На пачатак 1997 г. 12 двароў, 19 жыхароў. Каля вёскі археалагічны помнік-курган. Радзіма вучонага І.І.Трухана, генерал-лейтэнанта М.І.Глінскага.

КАМЕНКА (да 1967 г. Вялікая Каменка), вёска ў Слабодкаўскім сельсавеце, цэнтр калгаса, за 9 км ад чыгуначнай станцыі Бабруйск. На пачатку 20 ст. — вёска Вялікая Каменка Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета Мінскай губерні, 33 двары, 313 жыхароў. У 1917 г. — вёска той жа воласці і павета,57 двароў, 380 жыхароў. У 1924—1954 гг. — цэнтр сельсавета. Паводле перапісу 1926 г. 58 двароў, 329 жыхароў. У 1967 г. вёскі Вялікая Каменка і Малая Каменка аб'яднаны ў вёску Каменка. На пачатак 1997 г. 268 двароў, 648 жыхароў. У вёсцы калгасная сядзіба, ферма буйной рагатай жывёлы, гаспадарчы двор, майстэрні па рамонце тэхнікі, зернедрабільня. Дзейнічаюць сярэдняя школа, аддзяленні сувязі і ашчаднага банка, магазін, клуб, бібліятэка.

КАНЧАНЫ, вёска ў Слабодкаўскім сельсавеце, за 7 км ад чыгуначнай станцыі Бабруйск. Назва, верагодна, ад слова «канец»: у канцы поля, лугу, пашы. Вядома па пісьмовых крыніцах з 19 ст. У 1847 г. — вёска Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, уваходзіла ў склад памешчыцкага маёнтка Дварэц. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Канчаны, яна ж Дзямідкавічы, 21 двор, 146 жыхароў. На пачатку 20 ст. 23 двары, 215 жыхароў. У 1917 г. — вёска, 63 двары, 292 жыхары. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 50 двароў, 266 жыхароў. На пачатак 1997 г. 50 двароў, 79 жыхароў. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы.

КАРАБОЎШЧЫНА, вёска ў Глушанскім пасялковым Савеце, за 18 км ад чыгуначнай станцыі Мірадзіна на лініі Бабруйск—Мінск, каля шашы Бабруйск—Слуцк. Назва, верагодна, ад прозвішчаў Кораб, Карабко і інш. Вядома з 1639 г. як сенакоснае і палявое ўрочышча Карабоўшчызна. На пачатку 20 ст. ўваходзіла ў склад маёнтка Глуша. У 1923 г. на гэтых землях узнік пасёлак. Паводле перапісу 1926 г. — пасёлак, 19 двароў, 83 жыхары. У 1929 г. арганізаваны калгас імя У.І.Леніна. На пачатак 1992 г. 17 двароў, 34 жыхары; на пачатак 1997 г. 13 двароў, 9 жыхароў.

КІНАЎКА, вёска ў Осаўскім сельсавеце, за 6 км ад чыгуначнай станцыі Ясень на лініі Бабруйск—Мінск. Назва, магчыма, мае сувязь са словам «киновня» — манастыр. Вядома па пісьмовых крыніцах 19 ст. Паводле пе-

рапісу 1897 г. — вёска Кінаўка, яна ж Уюнішча Гарадкоўскай воласці Бабруйскага павета, 17 двароў, 98 жыхароў. На пачатку 20 ст. — засценак, 16 двароў, 95 жыхароў. У 1917 г. — засценак, 17 двароў, 62 жыхары. З 1983 г. не існуе.

КІСЛОЎШЧЫНА, вёска ў Гарохаўскім сельсавеце, за 19 км ад чыгуначнай станцыі Мірадзіна на лініі Бабруйск—Мінск, непадалёку ад шашы Бабруйск—Слуцк. Назва ад словазлучэння «кіслая трава» (ежевник) ці глеба з кіслым перагноем, які яшчэ не перапрэў, не згніў. Заснавана ў пачатку 1920-х г. на былых памешчыцкіх землях. У 1930 г. арганізаваны калгас імя С.М.Будзённага. На пачатак 1997 г. 9 двароў, 14 жыхароў.

КЛІНЫ, вёска ў Гарохаўскім сельсавеце, за 20 км ад чыгуначнай станцыі Мірадзіна на лініі Бабруйск—Мінск, каля шашы Бабруйск—Слуцк. Заснавана ў 1920-х гадах на былых памешчыцкіх землях перасяленцамі з суседніх вёсак. Назва ад формы месца, дзе ўзнікла пасяленне: кавалка зямлі, які клінамі ўдаваўся ў навакольныя ўгоддзі. На пачатак 1997 г. 1 двор, 2 жыхары.

КОЙМІНА, вёска ў Бортнікаўскім сельсавеце, за 3 км ад чыгуначнай станцыі Савічы на лініі Бабруйск—Жлобін. Верагодна, назва ад прозвішча Коймін. Заснавана ў 1923 г. на землях былога маёнтка Іванаўка колішнімі яго парабкамі. Паводле перапісу 1926 г. — пасёлак, 12 двароў, 54 жыхары. У 1932 г. заснавана тарфяная арцель «Койміна». На пачатак 1997 г. 17 двароў 41 жыхар.

КОЎРЫН, вёска ў Варатынскім сельсавеце, за 4 км ад чыгуначнай станцыі Амельня на лініі Бабруйск—Жлобін. Назва, верагодна, ад прозвішча Коўрын. Вядома па пісьмовых крыніцах з 19 ст. У 1857 г. — вёска Туркоўскай воласці Бабруйскага павета, уласнасць памешчыкаў Яршовых. У 1887 г. адкрыта школа царкоўнай граматы (у 1890 г. навучаліся 10 хлопчыкаў і дзяўчынак). Паводле перапісу 1897 г. — вёска, 72 двары, 514 жыхароў, хлебазапасны магазін. Побач быў аднайменны фальварак, 2 двары, 11 жыхароў, ветраны млын. На пачатку 20 ст. — вёска, 75 двароў, 731 жыхар, крама. У 1909 г. адкрыта земскае народнае вучылішча (у наёмным памяшканні). У 1917 г. 111 двароў, 683 жыхары. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі на базе народнага вучылішча створана працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1925 г. было 48 вучняў. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 138 двароў, 740 жыхароў. У 1929 г. створаны калгасы «Звязда» і «Першае мая», якія ў 1933 г. аб'ядналіся ў калгас «Першае мая». На пачатак 1997 г. 97 двароў, 243 жыхары. У вёсцы клуб, бібліятэка, магазін, фермы буйной рагатай жывёлы і свінагадоўчая.

КРАПЎКА, пасёлак у Хімоўскім сельсавеце, за 5 км ад чыгуначнай станцыі Бярэзіна на лініі Бабруйск—Жлобін, каля шашы Бабруйск—Рагачоў. У аснове назвы — расліна крапіва, зараснікі якой былі на месцы паселішча. Заснаваны ў пачатку 1920-х гадоў на выдзеленым участку зямлі з дзяржаўнага фонду. Паводле перапісу 1926 г. — хутар, 3 двары, 22 жыхары. На пачатак 1997 г. 10 двароў, 25 жыхароў.

КРАСНАЯ, вёска ў Сычкаўскім сельсавеце, за 7 км ад чыгуначнай станцыі Мірадзіна на лініі Бабруйск—Мінск, побач з шашой Сычкава—Свіслач. Назва-характарыстыка: красная — значыць прыгожая, прывабная. Па пісьмовых крыніцах вядома з 17 ст. У 1639 г. — засценак у Бабруйскім старостве Рэчыцкага павета Мінскага ваяводства. У 1781 г. была карчма. З 1793 г. ў складзе Расіі, з 1795 г. ў Бабруйскім павеце. Паводле гаспадарчых дакументаў 1847 г. 10 двароў, 40 жыхароў. У 1856 г. ўваходзіла ў дзяржаўны маёнтак Панюшкавічы Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета. Паводле перапісу 1847 г. — вёска той жа воласці і павета, 26 двароў, 210 жыхароў. Непадалёку быў аднайменны засценак, 12 двароў, 88 жыхароў. У 1917 г. 36 двароў, 287 жыхароў, у засценку 20 двароў, 136 жыхароў. У 1920-я гады дзейнічаў пункт па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1930 г. створаны калгас «Чырвоны сцяг». У 1940 г. 24 двары, 57 жыхароў. На пачатак 1997 г. 10 двароў, 21 жыхар. У чэрвені 1944 г. вёска абрабавана і спалена гітлераўцамі. У баі за яе 28 чэрвеня 1944 г. вызначыўся Герой Савецкага Саюза, наводчык гарматы сяржант І.Р.Усацюк.

КРАСНАЯ ДУБРОВА, вёска ў Бортнікаўскім сельсавеце, за 5 км ад чыгуначнай станцыі Савічы на лініі Бабруйск—Жлобін, непадалёку ад шашы Бабруйск—Рагачоў. Назва ад дубровы — дубовага гаю; красная — прыгожая, прывабная. Вядома з 19 ст. У 1885 г. — вёска Дуброва Туркоўскай воласці Бабруйскага павета, 29 двароў, 187 жыхароў, малітоўны дом. Паводле перапісу 1897 г. — 44 двары, 334 жыхары, было дзве лаўкі. У 1917 г. 77 двароў, 475 жыхароў. У 1930 г. створаны калгас «Шлях да сацыялізму». На

пачатак 1997 г. 72 двары, 112 жыхароў. У вёсцы магазін, ферма буйной рагатай жывёлы. Непадалёку ад вёскі археалагічны помнік — курганны могільнік (38 насыпаў).

КРАСНАЯ ЗАРА, пасёлак у Гарохаўскім сельсавеце, за 17 км ад чыгуначнай станцыі Мірадзіна на лініі Бабруйск—Мінск. Заснаваны ў 1920-х гадах і, верагодна, названы як сімвал новага жыцця пасля перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі. На пачатак 1997 г. 7 двароў, 11 жыхароў. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы.

КРАСНЫ, пасёлак у Цялушскім сельсавеце, за 4 км ад чыгуначнай станцыі Плёсы на лініі Бабруйск—Жлобін. Заснаваны ў 1924 г. на землях колішняга маёнтка Маліннікі яго парабкамі. Паводле перапісу 1926 г. — пасёлак, 10 двароў, 61 жыхар. На пачатак 1997 г. 10 двароў, 20 жыхароў.

КРАСНЫ АГАРОД, пасёлак у Гарохаўскім сельсавеце, за 21 км ад чыгуначнай станцыі Мірадзіна на лініі Бабруйск—Мінск, паблізу шашы Бабруйск—Слуцк, на р. Красная (басейн Бярэзіны). Прынята лічыць, што назва — сімвал прыгожага. Заснаваны ў пачатку 1920-х гадоў. Паводле перапісу 1926 г. — пасёлак, 15 гаспадарак, 62 жыхары. На пачатак 1997 г. 9 двароў, 26 жыхароў. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы. Каля вёскі два археалагічныя помнікі — курганныя могільнікі (7 і 46 курганоў).

КРАСНЫ БРОД, чыгуначная станцыя на лініі Бабруйск—Рабкор у Вішнёўскім сельсавеце, непадалёку ад шашы Бабруйск—Мазыр. Назва — сімвал прыгожага. У 1917 г. — чыгуначны раз'езд Брожскай воласці Бабруйскага павета (1 двор, 8 жыхароў) і чыгуначная станцыя (4 двары, 23 жыхары), якія размяшчаліся сумежна. Паводле перапісу 1926 г. — чыгуначная станцыя, 5 двароў, 16 жыхароў. На 1940 г. 17 двароў, 52 жыхары. У чэрвені 1944 г. спалена гітлераўцамі. На пачатак 1997 г. 3 двары, 6 жыхароў.

КРАСНОВІЧЫ (да 1964 г. Воўчая Яма), вёска ў Гарохаўскім сельсавеце, за 20 км ад чыгуначнай станцыі Мірадзіна на лініі Бабруйск—Мінск, паблізу шашы Бабруйск—Слуцк. Заснавана ў 1922 г. як пасёлак на землях былога маёнтка Глуша яго былымі парабкамі. Пасяленне ўзнікла каля ўрочышча Воўчая Яма, адсюль і яго былая назва. Паводле перапісу 1926 г. — пасёлак, 8 двароў, 41 жыхар. У 1930 г. створаны калгас імя К.Варашылава. У 1964 г. перайменавана ў Красновічы. На пачатак 1997 г. 4 двары, 7 жыхароў.

КРАСНЫ ЛЕС, пасёлак у Слабодкаўскім сельсавеце, за 5 км ад чыгуначнай станцыі Бабруйск, каля шашы Бабруйск—Глуск. Заснаваны ў 1920-х гадах. Назва ад аднайменнага ляснога ўрочышча, каля якога ўзнікла пасяленне. На пачатак 1997 г. 9 двароў, 12 жыхароў.

КРУГЛОНІВА, вёска ў Гарохаўскім сельсавеце, за 19 км ад чыгуначнай станцыі Мірадзіна на лініі Бабруйск—Мінск, непадалёку ад шашы Бабруйск—Глуск. Назва ад участка зямлі круглай формы, дзе ўзнікла пасяленне. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Гарадкоўскай воласці Бабруйскага павета, 25 двароў, 192 жыхары. У 1917 г. — вёска Круглоніўка, 31 двор, 203 жыхары. У 1921 г. адкрыта пачатковая школа. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 36 двароў, 172 жыхары. У 1931 г. створаны калгас «Круглоніва». У Вялікую Айчынную вайну дзейнічала падпольная антыфашысцкая група. На пачатак 1997 г. 11 двароў, 17 жыхароў.

КРУПІЧЫ, вёска ў Бортнікаўскім сельсавеце, за 6 км ад чыгуначнай станцыі Цялуша на лініі Бабруйск—Жлобін, паблізу шашы Бабруйск—Рагачоў. Назва, верагодна, ад прозвішча Крупіч. Вядома па дакументах з 19 ст. Паводле перапісу 1897 г. — фальварак Бортнікаўскай воласці Бабруйскага павета, 1 двор, 4 жыхары. На пачатку 20 ст. — фальварак, 5 жыхароў. У 1917 г. 11 жыхароў. У 1922 г. фальварак пераўтвораны ў пасёлак. У 1925 г. арганізаваны сельскагаспадарчы кааператыў. Паводле перапісу 1926 г. на месцы сучаснай вёскі былі два аднайменныя пасёлкі, 41 двор, 148 жыхароў. У 1931 г. створаны калгас імя М.І.Калініна. На пачатак 1997 г. 62 двары, 117 жыхароў. У вёсцы клуб, ферма буйной рагатай жывёлы. На вясковых могілках 3 брацкія магілы савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях з нямецка-фашысцкімі акупантамі; на магілах у 1970 г. і 1980 г. ўстаноўлены помнікі-абеліскі.

КРУШЫНКА, вёска ў Гарбацэвіцкім сельсавеце, за 16 км ад чыгуначнай станцыі Мірадзіна на лініі Бабруйск—Мінск, каля шашы Бабруйск—Слуцк. Пасяленне заснавана ў лясной мясцовасці, дзе былі зараснікі крушыны, адсюль і назва. Паводле перапісу 1897 г. — хутар Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, 3 двары, 20 жыхароў. На пачатку 20 ст. — хутар Крушнякі, 3 двары,

17 жыхароў. У 1917 г. 6 гаспадарак, 30 жыхароў. Паводле перапісу 1926 г. — хутар, 3 двары, 19 жыхароў. На пачатак 1997 г. 20 двароў, 25 жыхароў.

ЛАГАДАЎКА, вёска ў Гарохаўскім сельсавеце, за 17 км ад чыгуначнай станцыі Мірадзіна на лініі Бабруйск—Мінск, на шашы Бабруйск—Глуск, каля р. Лагадаўка (басейн Бярэзіны). Назва ракі і вёскі хутчэй за ўсё ад прозвішча Лагода, якое ў сваю чаргу ўтворана ад асновы лагодны — добры, памяркоўны, згаворлівы чалавек. Вядома па пісьмовых крыніцах з 17 ст. У рэестравых актах 1639 г. ўпамінаецца як урочышча Лагадава Бабруйскага староства Мінскага ваяводства Вялікага княства Літоўскага. З 1793 г. ў складзе Расіі, з 1795 г. ў Бабруйскім павеце Мінскай губерні, уласнасць Караткевічаў. Паводле перапісу 1897 г. — хутар Гарадкоўскай воласці Бабруйскага павета, 7 гаспадарак, 54 жыхары. Побач знаходзілася карчма, 1 двор, 18 жыхароў. На пачатку 20 ст. — пасёлак, 7 двароў, 60 жыхароў. У 1917 г. — вёска, 12 двароў, 46 жыхароў. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 13 двароў, 59 жыхароў. На пачатак 1997 г. 4 двары, 5 жыхароў.

ЛАМБАВА, вёска ў Кавалеўскім сельсавеце, цэнтр калгаса, за 6 км ад чыгуначнай станцыі Плёсы на лініі Бабруйск—Жлобін. Назва ад прозвішча Ламбін ці ад «ламбіна» — невялікае возера на старым рэчышчы ракі. Па пісьмовых крыніцах вядома з 19 ст., была вотчынай Васьковых. Паводле перапісу 1897 г. — маёнтак Туркоўскай воласці Бабруйскага павета, 1 двор, 15 жыхароў, працаваў млын. На пачатку 20 ст. 35 жыхароў. У 1917 г. хутар, 29 двароў, 234 жыхары. У пачатку 1920-х гадоў на месцы колішняй памешчыцкай сядзібы ўзнік пасёлак, які пазней быў пераўтвораны ў вёску. Паводле перапісу 1926 г. 60 двароў, 363 жыхары. У лютым 1929 г. створаны калгас «Прагрэс» (48 гаспадарак), працавала кузня. У 1964—1985 гг. цэнтр сельсавета. На пачатак 1997 г. 94 двары, 275 жыхароў. У вёсцы калгасная сядзіба, сельскагаспадарчая майстэрня па рамонце тэхнікі, машынны двор, установка па прыгатаванні вітамінавай мукі, лесапільня, ферма буйной рагатай жывёлы. Дзейнічаюць клуб, бібліятэка, дзіцячыя яслі-сад, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, сталовая, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва, аўтаматычная тэлефонная станцыя, магазін.

ЛАМЫ, вёска ў Вішнёўскім сельсавеце, за 7 км ад чыгуначнай станцыі Бярэзіна на лініі Бабруйск—Жлобін, на шашы Бабруйск—Мазыр. Назва, верагодна, ад асновы «лом» (хлам) — сухое галлё і карані ў лесе. Заснавана ў 1920-я гады. Паводле перапісу 1926 г. — пасёлак, 10 двароў, 54 жыхары. На пачатак 1997 г. 29 двароў, 53 жыхары.

ЛАСІ, вёска ў Брожскім сельсавеце, за 3,5 км ад чыгуначнай станцыі Брожа, на лініі Бабруйск—Рабкор. Назва ад пашыранага прозвішча Лось ці ад лясной жывёлы. Вядома з 1798 г. як вёска Бабруйскага павета, 7 двароў, 63 жыхары, дзяржаўная ўласнасць. Паводле гаспадарчага рэестра 1847 г. — вёска ў складзе казённага маёнтка Брожа Бабруйскага павета, 13 двароў, 108 жыхароў. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Брожскай вобласці Бабруйскага павета, 31 двор, 201 жыхар. На пачатку 20 ст. 42 двары, 240 жыхароў. У 1917 г. 56 двароў, 304 жыхары. У 1920-х гадах дзейнічаў пункт па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 65 домагаспадароў (з іх 41 меў прозвішча Лось). У 1930 г. створаны калгас «Чырвоная зорка», працавала кузня. На пачатак 1997 г. 128 двароў, 224 жыхары. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы, клуб, магазін.

ЛЕБЯДЗЁЎКА, вёска ў Бортнікаўскім сельсавеце, за 6 км ад чыгуначнай станцыі Цялуша на лініі Бабруйск—Жлобін, непадалёку ад шашы Бабруйск—Рагачоў. Назва ад прозвішча Лебедзеў ці птушкі лебедзь. Заснавана ў пачатку 1920-х гадоў на выдзеленым з дзяржаўнага фонду вялікім ўчастку зямлі. Паводле перапісу 1926 г. — пасёлак, 8 двароў, 29 жыхароў. Пазней пасёлак пераўтвораны ў вёску. У 1931 г. створаны калгас «2-і з'езд калгаснікаў-ударнікаў». На пачатак 1997 г. 27 двароў, 41 жыхар. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы.

ЛЕЙЧЫЦЫ, вёска ў Бортнікаўскім сельсавеце, за 10 км ад чыгуначнай станцыі Цялуша на лініі Бабруйск—Жлобін, каля шашы Бабруйск—Рагачоў. У аснове назвы слова «лейцы» — частка вупражы. Вядома па пісьмовых крыніцах з 1621 г. як сяло Бабруйскага староства Мінскага ваяводства Вялікага княства Літоўскага, 6 двароў, дзяржаўная ўласнасць. З 1793 г. ў складзе Расіі, з 1795 г. ў Бабруйскім павеце. У 1838 г. 55 рэвізскіх душ, уласнасць памешчыкаў Прушыноўскіх. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Бортнікаўскай воласці Бабруйскага павета, 32 двары,

Жылы дом у вёсцы Лейчыцы.

224 жыхары. На пачатку 20 ст. 44 двары, 290 жыхароў. У 1917 г. 46 двароў, 340 жыхароў. У 1920 г. ў вёсцы адкрыта пачатковая школа, у якой у 1925 г. вучыліся 35 хлопчыкаў і дзяўчынак. У 1925 г. да вёскі далучаны вялікі ўчастак былой памешчыцкай зямлі. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 68 двароў, 274 жыхары. У 1930 г. створаны калгас імя А.І.Ягорава. На пачатак 1997 г. 55 двароў, 100 жыхароў.

ЛЕКЕРТА, вёска ў Слабодкаўскім сельсавеце, за 4 км ад чыгуначнай станцыі Бабруйск, побач з шашой Бабруйск—Слуцк. Можна меркаваць, што назва ад слова «лекар», «лекарка»: тут некалі жыла бабка, якая лячыла людзей. Заснавана ў 1920-х гадах. На пачатак 1997 г. 76 двароў, 169 жыхароў. У вёсцы клуб і магазін. Паблізу вёскі археалагічны помнік — курганны могільнік (14 насыпаў).

ЛЕНІНА (да 1924 г. Дурынічы), пасёлак у Сычкаўскім сельсавеце, за 7 км ад чыгуначнай станцыі Ясень на лініі Бабруйск—Мінск, побач з шашой Бабруйск—Мінск, на р. Ясенка (басейн Бярэзіны). Вядомы па пісьмовых крыніцах 19 ст. як маёнтак Дурынічы памешчыкаў Забелаў Свіслацкай воласці Бабруйскага павета. У 1888 г. пабудаваны млын, у 1900 г. заснаваны крухмальны і вінакурны заводы. На пачатку 20 ст. 68 жыхароў. У 1917 г. 172 жыхары. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі на месцы нацыяналізаванага маёнтка яго былыя парабкі і сяляне з суседніх населеных пунктаў стварылі пасёлак. У 1920 г. тут арганізаваны саўгас «Дурынічы», у 1922 г. адкрыта хата-чытальня. У 1924 г. саўгасу і пасёлку прысвоена імя Леніна. У 1925 г. ў саўгасе было 567 га ворнай зямлі. Тут адкрыта пачатковая школа, для якой быў выдзелены нацыяналізаваны памешчыцкі будынак; у 1925 г. ў школе было 45 вучняў, дзейнічалі драматычны і харавы гурткі. У 1926 г. пабудавана новая школа. У 1930-х гадах саўгас меў больш за 1 тыс. га зямлі, дзейнічалі паравы млын, крухмальны і цагельны заводы, лесапільня, электрастанцыя. У 1941 г. пасёлак разрабаваны і спалены гітлераўцамі. На пачатак 1997 г. 270 двароў, 685 жыхароў. У пасёлку сядзіба саўгаса, майстэрні па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, ферма буйной рагатай жывёлы, лесапільня, устаноўка па прыгатаванні вітамінавай мукі, цэх па перапрацоўцы гародніны, крухмальны завод. Дзейнічаюць сярэдняя школа, дзіцячыя яслі-сад, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, ветлячэбніца, аддзяленні сувязі і ашчаднага банка, сталовая, два магазіны, стадыён, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва. Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях з нямецка-фашысцкімі акупантамі; у 1974 г. на магіле ўстаноўлены помнік-абеліск з мемарыяльным надпісам.

ЛЕНІНА, пасёлак у Гарбацэвіцкім сельсавеце, за 13 км ад чыгуначнай станцыі Бабруйск, непадалёку ад шашы Бабруйск—Слуцк. Заснаваны ў пачатку 1920-х гадоў на колішніх памешчыцкіх землях. Названы імем У.І.Леніна. У 1923 г. да пасёлка далучаны вялікі ўчастак былой памешчыцкай зямлі. На пачатак 1997 г. 16 двароў, 19 жыхароў.

ЛЕНІНЦЫ, вёска ў Гарохаўскім сельсавеце, за 19 км ад чыгуначнай станцыі Мірадзіна на лініі Бабруйск—Мінск, паблізу шашы Бабруйск—Слуцк. Заснавана ў пачатку 1920-х гадоў выхадцамі з суседніх населеных пунктаў на былых памешчыцкіх землях. Назва ў гонар У.І.Леніна. У 1929 г. створаны калгас імя С.М.Будзённага. На пачатак 1997 г. 9 двароў, 14 жыхароў.

ЛІПНЯКІ, пасёлак у Бортнікаўскім сельсавеце, за 8 км ад чыгуначнай станцыі Цялуша на лініі Бабруйск—Рагачоў. У аснове назвы слова «ліпа», якіх, відаць, было шмат на месцы гэтага паселішча. Заснаваны ў 1922 г. на землях колішняга маёнтка Рогня яго батракамі. Паводле перапісу 1926 г. 12 двароў, 56 жыхароў. На пачатак 1997 г. 16 двароў, 13 жыхароў.

ЛУЖАНЕЦ, вёска ў Гарохаўскім сельсавеце, за 20 км ад чыгуначнай станцыі Бабруйск, паблізу шашы Бабруйск—Глуск. Назва, магчыма, звязана з тэрмінам «лужа-

ны» — людзі, які пасяліліся на лузе. Вядома па пісьмовых крыніцах з 19 ст. Паводле перапісу 1897 г. — хутар у складзе Гарадкоўскай воласці Бабруйскага павета. На пачатку 20 ст. — засценак той жа воласці і павета, 9 двароў, 123 жыхары. У 1917 г. 14 двароў, 72 жыхары; паводле перапісу 1926 г. — вёска, 13 двароў, 63 жыхары. У 1934 г. створаны калгас «Чырвоны асветнік». На пачатак 1997 г. 1 двор, 1 жыхар.

ЛЫСАЯ ГОРКА, вёска ў Сычкаўскім сельсавеце, за 2 км ад чыгуначнай станцыі Мірадзіна на лініі Бабруйск—Мінск. Назва азначэнне: пусты ўчастак зямлі без лесу і расліннасці. У гаспадарчых актах 1639 г. ўпамінаецца як урочышча Лысыя Горы. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, 15 двароў, 106 жыхароў. На пачатку 20 ст. 16 двароў, 120 жыхароў. У 1917 г. 32 двары, 175 жыхароў. Паводле перапісу 1926 г. на месцы сучаснага населенага пункта было дзве аднайменныя вёскі — 17 двароў, 87 жыхароў і 17 двароў, 82 жыхары. У 1932 г. створаны калгас «Прагрэс». На пачатак 1997 г. 45 двароў, 70 жыхароў. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы.

ЛЯДЫ, пасёлак у Гарохаўскім сельсавеце, за 18 км ад чыгуначнай станцыі Мірадзіна на лініі Бабруйск—Асіповічы. Назва-тэрмін: ляда — участак з-пад лесу, падрыхтаваны для земляробства. У гаспадарчых актах 1639 г. — урочышча Бабруйскага староства Рэчыцкага павета Вялікага княства Літоўскага. Паводле перапісу 1917 г. — хутар Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, 9 двароў, 43 жыхары. У 1923 г. пераўтвораны ў пасёлак. У 1925 г. тэрыторыя пасёлка значна пашырылася — да яго далучылі ўчастак зямлі з колішняга памешчыцкага маёнтка Забудзькі. Паводле перапісу 1926 г. — пасёлак, 7 двароў, 36 жыхароў. На пачатак 1997 г. 7 двароў, 13 жыхароў.

ЛЯСІШЧА, пасёлак у Варатынскім сельсавеце, за 6 км ад чыгуначнай станцыі Амельня на лініі Бабруйск—Жлобін. Назва ад дрымучага лесу на месцы ўзнікнення паселішча. Паводле гаспадарчых актаў 1639 г. — урочышча. У 1917 г. — хутар Туркоўскай воласці Бабруйскага павета, 4 двары, 37 жыхароў. У 1920-х гадах тэрыторыя Лясішча значна пашырылася за кошт зямель колішняга маёнтка Вавулічы. Паводле перапісу 1926 г. — пасёлак, 19 гаспадарак, 100 жыхароў. На пачатак 1997 г. 8 двароў, 15 жыхароў.

МАКАРАВІЧЫ, вёска ў Брожскім сельсавеце, за 4 км ад чыгуначнай станцыі Брожа на лініі Бабруйск—Рабкор. Назва ад імя Макар ці вытворных ад яго прозвішчаў. У пісьмовых крыніцах упершыню ўпамінаецца ў 1560 г. як сяло Макаравічы Бабруйскага староства Рэчыцкага павета Вялікага княства Літоўскага, дзяржаўная ўласнасць. У 1621 г. 8 двароў, у 1639 г. 8 двароў, 29 жыхароў мужчынскага полу. У 1684 г. — сяло, 12 гаспадарак. З 1793 г. ў складзе Расіі, з 1795 г. ў Бабруйскім павеце. На 1798 г. 6 двароў, 32 жыхары, дзейнічала карчма. Вотчына Вітгенштэйнаў. Паводле перапісу 1897 г. ўваходзіла ў склад Брожскай воласці Бабруйскага павета, 14 двароў, 90 жыхароў, працавала земскае народнае вучылішча. Побач з вёскай знаходзіўся аднайменны хутар, 6 двароў, 54 жыхары. У 1917 г. — вёска, 8 двароў, 152 жыхары, на хутары 17 двароў, 123 жыхары. У 1920 г. створана працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1923 г. займаліся 24 вучні. У 1922 г. арганізавана сельскагаспадарчае таварыства. Паводле перапісу 1926 г. побач былі вёска (23 двары, 123 жыхары) і хутары Макаравічы (18 гаспадарак, 102 жыхары). У 1930 г. створаны калгас «16-ы партз'езд». У 1940 г. 49 двароў, 217 жыхароў. У жніўні 1942 г. нямецка-фашысцкія акупанты разрабавалі і спалілі вёску. На пачатак 1997 г. 38 двароў, 57 жыхароў. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы, магазін. Паблізу вёскі археалагічныя помнікі — гарадзішча, два курганныя могільнікі і курган.

МАКАРАЎКА, вёска ў Гарохаўскім сельсавеце, за 14 км ад чыгуначнай станцыі Брожа на лініі Бабруйск—Рабкор, паблізу шашы Бабруйск—Глуск. Назва ад імя Макар ці вытворных ад яго прозвішчаў. Вядома з пісьмовых крыніц 19 ст. У 1830—1850 гг. дзяржаўная ўласнасць. Паводле перапісу 1897 г. — хутар у Гарадкоўскай воласці Бабруйскага павета, 7 двароў, 47 жыхароў. У 1913—1916 гг. дзейнічаў паравы млын. У 1919 г. — вёска, 20 двароў, 128 жыхароў. Паводле перапісу 1926 г. — засценак, 30 двароў, 134 жыхары. У 1930 г. створаны калгас «Саюзхлеб», у 1930-х гадах працаваў гонтавы завод. На пачатак 1997 г. 28 двароў, 63 жыхары. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы, установа па прыгатаванні вітаміннай мукі.

МАЛЕВА, вёска ў Кавалеўскім сельсавеце, за 12 км ад чыгуначнай станцыі Плёсы на лініі Бабруйск—Жлобін. Назва ад слова «мал-малы», невялікі. Вядома па пісьмовых

крыніцах з 19 ст. У маі 1886 г. вяскоўцы самавольна пасвілі сваю жывёлу на тутэйшых памешчыцкіх лугах, у сувязі з чым адбыліся сутычкі з аховай. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Туркоўскай воласці Бабруйскага павета, 9 двароў, 89 жыхароў. У 1917 г. — вёска, 17 двароў, 122 жыхары. У 1922—1964 гг. — цэнтр аднайменнага сельсавета. У 1924 г. адкрыта працоўная школа 1-й ступені (у непрыстасаваным памяшканні), у 1925 г. было 63 вучні, дзейнічаў драматычны гурток. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 25 двароў, 129 жыхароў. У 1930 г. створаны калгас «Ідэі Леніна», працаваў млын. На пачатак 1997 г. 27 двароў, 50 жыхароў. На мясцовых могілках брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях з нямецка-фашысцкімі акупантамі ў Вялікую Айчынную вайну; у 1976 г. на магіле ўстаноўлены помнік-абеліск з мемарыяльным надпісам.

МАЛІНАЎКА, вёска ў Бортнікаўскім сельсавеце, за 16 км ад чыгуначнай станцыі Цялуша на лініі Бабруйск—Жлобін. Заснавана ў 1923 г. як пасёлак на колішніх памешчыцкіх землях. На час заснавання населенага пункта ў яго наваколлі былі зараснікі маліннику, адсюль і яго назва. У 1920-я гады было створана сельскагаспадарчае таварыства «Плуг і серп». Паводле перапісу 1926 г. — пасёлак, 3 двары, 11 жыхароў. У 1929 г. арганізаваны калгас «Чырвоная Армія». На пачатак 1997 г. 17 двароў, 24 жыхары. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы. Каля вёскі радовішча суглінкаў.

МАЛІННІКІ, пасёлак у Цялушскім сельсавеце, чыгуначная станцыя на лініі Бабруйск—Жлобін, каля шашы Бабруйск—Жлобін. Назва ад слова «маліна» — расліна, відаць, вельмі пашыраная на месцы ўзнікнення паселішча. Паводле перапісу 1897 г. — фальварак у складзе Туркоўскай воласці Бабруйскага павета Мінскай губерні, 2 двары, 34 жыхары. На пачатку 20 ст. — фальварак, 1 двор, 46 жыхароў. У 1917 г. — таксама фальварак, 64 жыхары. У 1921 г. на базе былога фальварка створана сельскагаспадарчая арцель, 139 га зямлі. У 1930 г. арганізаваны калгас «Свабода». У 1940 г. 9 двароў, 36 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну дзейнічала падпольная антыфашысцкая група. У верасні 1943 г. вёска разрабавана і спалена гітлераўцамі. На пачатак 1997 г. 11 двароў, 17 жыхароў. Каля пасёлка археалагічны помнік-курган.

МАЛЫЯ БОРТНІКІ, вёска ў Бортнікаўскім сельсавеце, за 11 км ад чыгуначнай станцыі Цялуша на лініі Бабруйск—Жлобін, непадалёку ад шашы Бабруйск—Жлобін. Назва ад асновы «борць»: бортнік — чалавек, які збірае мёд, пчаляр. У 1838 г. — сяло Бабруйскага павета, 218 рэвізскіх душ. У 1844 г. ў складзе маёнтка Бортнікі, уласнасць Ф. і Т.Манкевічаў. У 1878 г. дзейнічала царкоўнапрыходская школа. У 1884 г. пабудавана драўляная царква. У 1886 г. — сяло Бортніцкай воласці Бабруйскага павета, 45 двароў, 327 жыхароў, дзейнічала царква. Паводле перапісу 1897 г. — сяло, 98 двароў, 839 жыхароў. Былі ветраны млын, хлебазапасны магазін, лаўка. Два разы ў год (24 ліпеня і 26 кастрычніка) праводзіліся таржкі. На пачатку 20 ст. 138 двароў, 952 жыхары. У 1911 г. адкрыта земскае народнае вучылішча, якое размяшчалася ў наёмным памяшканні, настаўніцай працавала Л.Мышкавец. У 1917 г. — сяло, 163 двары, 1075 жыхароў. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі старая школа пераўтворана ў працоўную школу 1-й ступені (73 вучні ў 1923 г.), якой перададзены нацыяналізаваны будынак. У 1918 г. сяло разгорнута на хутары Малыя Бортнікі. Працавала кузня. У 1924 г. прырэзаны вялікі ўчастак былой памешчыцкай зямлі, на якой пачалі будавацца колішнія батракі і малазямельныя сяляне. Паводле перапісу 1926 г. — хутар Малыя Бортнікі, 196 двароў, 1103 жыхары. На пачатак 1997 г. 226 двароў, 466 жыхароў. У вёсцы машынны двор, майстэрні па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, ферма буйной рагатай жывёлы, клуб, бібліятэка, магазін. На мясцовых могілках брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях у Вялікую Айчынную вайну; на магіле ў 1975 г. ўстаноўле-

Праваслаўная царква ў вёсцы Малыя Бортнікі.

ны помнік — скульптурная кампазіцыя воіна і жанчыны ў жалобе.

Радзіма Герояў Сацыялістычнай Працы Л.П.Цэд і В.М.Хурсана, генерал-маёра І.Дз.Балыкі.

МАЛЫЯ БОРТНІКІ, пасёлак у Бортнікаўскім сельсавеце, за 12 км ад чыгуначнай станцыі Цялуша на лініі Бабруйск—Жлобін. Заснаваны ў пачатку 1920-х гадоў выхадцамі з суседняга сяла Малыя Бортнікі на былых памешчыцкіх землях. На пачатак 1997 г. 19 двароў, 35 жыхароў.

МАРТЫНАЎКА, вёска ў Бортнікаўскім сельсавеце, за 17 км ад чыгуначнай станцыі Цялуша на лініі Бабруйск—Жлобін. Лічаць, што назва ад імя Мартын ці вытворнага ад яго прозвішча Мартынаў. У 1922 г. фальварак Мартынаўка пераўтвораны ў пасёлак. Паводле перапісу 1926 г. — пасёлак, 20 гаспадарак, 108 жыхароў. Пазней пасёлак пераўтвораны ў вёску. У 1931 г. арганізаваны калгас «Абарона СССР» (14 сялянскіх гаспадарак). На пачатак 1997 г. 9 двароў, 12 жыхароў.

МАРТЫНАЎКА, вёска ў Гарохаўскім сельсавеце, за 9 км ад чыгуначнай станцыі Брожа на лініі Бабруйск—Рабкор. Назва ад імя Мартын ці вытворнага ад яго прозвішча Мартынаў. Вядома з 1639 г. як засценак. Паводле гаспадарчага рэестра 1847 г. — у складзе маёнтка Дубрава Бабруйскага павета, дзяржаўная ўласнасць, 2 двары, 42 жыхары. На пачатак 1997 г. 54 двары, 83 жыхары. У вёсцы магазін.

МАСТЫ, вёска ў Гарохаўскім сельсавеце, за 20 км ад чыгуначнай станцыі Марадзіна на лініі Бабруйск—Мінск, паблізу шашы Бабруйск—Слуцк. У аснове назвы слова «мост»: вёска заснавана каля моста, які быў тут калісьці. Па пісьмовых крыніцах вядома з пачатку 20 ст. як урочышча ў Гарадкоўскай воласці Бабруйскага павета, 2 двары, 7 жыхароў. У 1917 г. — хутар у той жа воласці, 8 двароў, 30 жыхароў. У 1921 г. адкрыта пачатковая школа. У 1920-х гадах — пасёлак, які пазней быў пераўтвораны ў вёску. У 1931 г. арганізаваны калгас «Перамога». На пачатак 1997 г. 25 двароў, 40 жыхароў. У вёсцы гаспадарчы двор калгаса.

МАЧУЛКІ, вёска ў Гарохаўскім сельсавеце, за 10 км ад чыгуначнай станцыі Чырвоны Брод на лініі Бабруйск—Рабкор. Назва, магчыма, паходзіць ад асновы «мачыць», замочваць нешта ў вадзе; назву Мачулкі мела лясное ўрочышча, дзе заснавана пасяленне. Вядома па гаспадарчых актах з 1639 г. як лясное ўрочышча Бабруйскага староства Мінскага ваяводства Вялікага княства Літоўскага. На 1684 г. — вёска, 9 двароў, дзяржаўная ўласнасць. З 1793 г. ў складзе Расіі, з 1795 г. ў Бабруйскім павеце. На 1798 г. 12 двароў, 77 жыхароў. На 1838 г. 82 жыхары. У 1847 г. ў складзе Бабруйскага павета, 14 двароў, 114 жыхароў, дзяржаўная ўласнасць. На 1858 г. у складзе дзяржаўнага маёнтка Брожа Бабруйскага павета. Паводле перапісу 1897 г. — у складзе Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, 39 двароў, 281 жыхар. На пачатку 20 ст. — вёска, 30 двароў, 366 жыхароў. У 1917 г. — вёска, 73 двары, 436 жыхароў. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 22 двары, 516 жыхароў. У 1933 г. створаны калгас «Чырвоныя Мачулкі». У 1940 г. 68 двароў, 301 жыхар. У чэрвені 944 г. нямецка-фашысцкія акупанты разрабавалі, спалілі вёску. На пачатак 1997 г. 44 двары, 80 жыхароў.

Радзіма вучонага Р.В.Булацкага.

МАШКІ, пасёлак у Хімоўскім сельсавеце, за 14 км ад чыгуначнай станцыі Бярэзіна на лініі Бабруйск—Жлобін. Назва, верагодна, ад асновы «мох»: месца, дзе расце мох, мохавае балота. Вядомы па пісьмовых крыніцах з пачатку 20 ст. як хутар Качэрыцкай воласці Бабруйскага павета, 4 двары, 50 жыхароў. Паводле перапісу 1926 г. — пасёлак, 6 двароў, 35 жыхароў. У 1931 г. створаны калгас «Чырвоная зорка». На пачатак 1997 г. 10 двароў, 14 жыхароў.

МАЯК, пасёлак у Гарбацэвіцкім сельсавеце, за 11 км ад чыгуначнай станцыі Бабруйск, на шашы Бабруйск—Слуцк. Назва дадзена ў гонар працоўных поспехаў калектыву. Вядомы з 19 ст. Паводле перапісу 1897 г. — урочышча Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, 1 двор, 3 жыхары. На пачатку 20 ст. — хутар, 5 двароў, 45 жыхароў. У 1917 г. 18 двароў, 88 жыхароў. Паводле перапісу 1926 г. — хутар, 13 двароў, 70 жыхароў. У 1933 г. створаны калгас імя М.І.Калініна. На пачатак 1997 г. 14 двароў, 31 жыхар. Непадалёку ад вёскі два археалагічныя помнікі — курганныя могільнікі (8 і 130 насыпаў).

МІКУЛІЧЫ, вёска ў Кавалеўскім сельсавеце, чыгуначная станцыя на лініі Бабруйск—Жлобін, каля шашы Бабруйск—Жлобін. Назва, відаць, ад прозвішча Мікула (варыянт ад імя Мікалай). У пісьмовых крыніцах упершыню ўпамінаецца ў 1560 г. як сяло Бабруйскага староства Рэчыцкага павета

Вялікага княства Літоўскага, дзяржаўная ўласнасць. У 1621 г. 4 двары. На 1639 г. 8 гаспадарак, 40 жыхароў мужчынскага полу. У 1786 г. 19 гаспадарак, у складзе маёнтка Міхалёва, шляхецкая ўласнасць. З 1793 г. ў складзе Расіі, з 1795 г. ў Бабруйскім павеце. У 1816 г. 22 двары, 122 жыхары, уласнасць памешчыкаў Кальчэўскіх. Паводле перапісу 1897 г. — вёска ў Туркоўскай воласці Бабруйскага павета, 88 гаспадарак, 627 жыхароў, працавалі ветраны млын, крупарушка, два хлебазапасныя магазіны, пастаялы двор. На пачатку 20 ст. — вёска, 111 двароў, 741 жыхар. У 1913 г. адкрыта земскае народнае вучылішча. У 1917 г. — вёска, 129 двароў, 743 жыхары. У 1922 г. створана сельскагаспадарчае таварыства «Ураджай». Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 137 гаспадарак, 670 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас «Чырвоныя Мікулічы», працавалі ваўначоска, кузня, млын. На пачатак 1997 г. 84 двары, 165 жыхароў. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы, машынны двор, клуб, магазін. На мясцовых могілках брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях з нямецкімі фашыстамі; у 1972 г. на магіле ўстаноўлены помнік-абеліск з мемарыяльным надпісам.

Радзіма Героя Савецкага Саюза М.Дз.Капусціна.

МІРАДЗІНА, вёска ў Сычкаўскім сельсавеце, чыгуначная станцыя на лініі Бабруйск—Мінск, на р. Ваўчанка (прыток Бярэзіны). Назва, магчыма, ад прозвішча Мірадзін, Мірадзінаў. Вядома па пісьмовых крыніцах з 19 ст. У 1847 г. ў складзе маёнтка Дварэц Бабруйскага павета, уласнасць памешчыкаў Быкоўскіх, 12 двароў, 81 жыхар. У 1926 г. заснаваны лесапільны завод. На пачатак 1997 г. 58 двароў, 127 жыхароў. У вёсцы чыгуначная станцыя, лясніцтва, лесаўчастак, магазін. Помнік-абеліск (1972) на брацкай магіле савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях з гітлераўцамі.

МІРАЦІНА, вёска ў Сычкаўскім сельсавеце, за 5 км ад чыгуначнай станцыі Мірадзіна на лініі Бабруйск—Мінск, непадалёку ад шашы Бабруйск—Мінск. Магчыма, назва ад прозвішча Міраціна, Міраціна. У першай палове 19 ст. вядома як вёска, дзяржаўная ўласнасць. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, 29 двароў, 225 жыхароў. На пачатку 20 ст. — вёска той жа воласці, 20 двароў, 212 жыхароў. У 1917 г. 33 двары, 236 жыхароў. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 36 двароў, 231 жыхар. У 1934 г. створаны калгас «Сёмы з'езд Саветаў». На пачатак 1997 г. 35 двароў, 48 жыхароў.

МІРОНАВА (да 1966 г. Глухое Ляда), пасёлак у Варатынскім сельсавеце, за 5 км ад чыгуначнай станцыі Амельня на лініі Бабруйск—Магілёў. Заснаваны ў 1920-х гадах на былых памешчыцкіх землях выхадцамі з суседніх населеных пунктаў. Паводле перапісу 1926 г. — пасёлак Глухое Ляда (па назве ўрочышча, у якім ён заснаваны). У 1966 г. перайменаваны ў Міронава. На пачатак 1997 г. 6 двароў, 7 жыхароў.

МІХАЙЛАЎКА, вёска ў Гарбацэвіцкім сельсавеце, за 5 км ад чыгуначнай станцыі Чырвоны Брод на лініі Бабруйск—Рабкор. Назва ад імя Міхаіл і вытворнага ад яго прозвішча Міхайлаў. Па пісьмовых крыніцах вядома з 19 ст. Паводле гаспадарчага рэестра 1847 г. — вёска ў складзе маёнтка Каралеўская Слабада Бабруйскага павета, 16 двароў, 83 жыхары, уласнасць памешчыкаў Прушаноўскіх. На пачатак 20 ст. — вёска Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, 11 гаспадарак, 79 жыхароў. У 1917 г. 21 двор, 95 жыхароў. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 23 двары, 113 жыхароў. На пачатак 1997 г. 2 двары, 2 жыхары.

МІХАЙЛАЎШЧЫНА, вёска ў Осаўскім сельсавеце, за 4 км ад чыгуначнай станцыі Ясень на лініі Бабруйск—Мінск. Назва, відаць, ад прозвішчаў Міхайлаў ці Міхайлоўскі. Вядома па пісьмовых крыніцах з пачатку 20 ст. як засценак Міхайлаўшчызна Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, 8 двароў, 54 жыхары. У 1917 г. — засценак, 10 гаспадарак, 75 жыхароў. У 1926 г. — засценак, 12 двароў, 75 жыхароў. На пачатак 1997 г. 3 двары, 5 жыхароў. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы.

МІХАЛЁВА 1-е, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса, за 6 км ад чыгуначнай станцыі Цялуша на лініі Бабруйск—Жлобін, на р. Ала (прыток Бярэзіны), побач з шашой Бабруйск—Рагачоў. Назва ад імя Міхал (Міхаіл). Вядома з 1560 г. як сяло Бабруйскага староства Рэчыцкага павета Вялікага княства Літоўскага, дзяржаўная маёмасць. У 1621 г. 13 двароў, працавалі два млыны. У 1784 г. пабудавана драўляная царква. У 1786 г. 26 гаспадарак, цэнтр шляхецкага маёнтка. З 1793 г. ў складзе Расіі, з 1795 г. ў Бабруйскім павеце. У 1844 г. сяло ў складзе маёнтка Міхалёва, вотчына памешчыкаў Кальчэўскіх. У 1894 г. адкрыта царкоўнапрыходская школа, для якой пабудавана памяшканне, у 1890 г.

Вуліца ў вёсцы Міхалёва 1-е.

Уезд на тэрыторыю калгаса імя Дзяржынскага ў вёсцы Міхалёва 1-е.

вучыліся 34 хлопчыкі і 3 дзяўчынкі. Паводле перапісу 1897 г. — сяло Бортнікаўскай воласці Бабруйскага павета, 984 жыхары, у якім былі дзве крамы, царква, пастаялы двор. У пачатку 20 ст. — сяло Бортнікаўскай воласці Бабруйскага павета,167 двароў, 1013 жыхароў. У 1917 г. — сяло, 172 двары, 1232 жыхары. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі на базе старой школы адкрыта працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1923 г. займаліся 32 вучні, дзейнічаў гурток, а ў 1930-х гадах — школа па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых, была бібліятэка. У 1923 г. створана сельскагаспадарчая арцель. У 1924—1954 гг. — цэнтр сельсавета. У 1925 г. да вёскі далучаны вялікі ўчастак былой памешчыцкай зямлі. У 1930 г. створаны калгас імя Ф.Дзяржынскага (у 1938 г. 113 гаспадарак). Працавалі млын і кузня. У 1947 г. да вёскі далучана в. Новы Гарадок. На пачатак 1997 г. 285 двароў, 773 жыхары. У вёсцы калгасная сядзіба, майстэрні па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, установка па прыгатаванні вітамінавай мукі, зернедрабільня, ферма буйной рагатай жывёлы і свінагадоўчы комплекс. Працуюць сярэдняя школа, дзіцячыя яслі-сад, бібліятэка, амбулаторыя, бальніца, Дом культуры, Дом механізатара і жывёлавода, аптэка, аддзяленні сувязі і ашчаднага банка, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва, сталовая, тры магазіны, аўтаматычная тэлефонная станцыя, стадыён. Дзве брацкія магілы савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях з ворагамі ў Вялікую Айчынную вайну, на іх у 1970 г. ўстаноўлены помнікі-абеліскі з мемарыяльнымі надпісамі. Каля Дома культуры ў 1971 г. ўстаноўлены бюст Ф.Дзяржынскага. На ўшанаванне памяці землякоў, што загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у вёсцы адкрыты помнік — скульптуры воіна, партызана і стэла з імёнамі загінуўшых.

МІХАЛЁВА 2-е, вёска ў Бортнікаўскім сельсавеце, за 9 км ад чыгуначнай станцыі Цялуша на лініі Бабруйск—Жлобін, на шашы Бабруйск—Рагачоў, на р. Ала (прыток Бярэзіны). Паводле перапісу 1897 г. — маёнтак Бортнікаўскай воласці Бабруйскага павета, 1 двор, 49 жыхароў. У 1905 г. адбылася забастоўка парабкаў. У 1917 г. — маёнтак, 83 жыхары. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі на месцы былога маёнтка пабудаваліся колішнія парабкі, узнікла вёска. Паводле перапісу 1926 г. — 32 падвор'і, 146 жыхароў. На пачатак 1997 г. 51 двор, 87 жыхароў. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы. Брацкая магі-



Дом быту ў вёсцы Міхалёва 2-е.

ла савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях з нямецка-фашысцкімі акупантамі; у 1970 г. на магіле ўстаноўлены помнік-абеліск з мемарыяльным надпісам. Радзіма генерал-маёра Ф.С.Шырокага.

МІХАЛЁВА 3-е, вёска ў Бортнікаўскім сельсавеце, за 4 км ад чыгуначнай станцыі Цялуша на лініі Бабруйск—Жлобін. Заснавана ў 1920-я гады на былых памешчыцкіх землях колішнімі батракамі і беднякамі. Паводле перапісу 1926 г. — пасёлак, 41 гаспадарка, 195 жыхароў. У 1930 г. створаны калгас «Сёмы з'езд Саветаў». На пачатак 1997 г. 61 двор, 128 жыхароў. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы. Працуюць клуб, магазін.

НАВАСЁЛКІ, вёска ў Осаўскім сельсавеце, за 8 км ад чыгуначнай станцыі Ясень на лініі Бабруйск—Мінск. Назва азначае новае пасяленне, заснаванае на новым месцы выхадцамі з старога сяла. Вядома з 19 ст. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Гарадкоўскай воласці Бабруйскага павета, 25 двароў, 190 жыхароў, працавала вінная лаўка. На пачатку 20 ст. 21 гаспадарка, 204 жыхары. У 1917 г. 32 двары, 211 жыхароў. У 1921 г. адкрыта пачатковая школа. У 1923 г. да вёскі далучаны вялікі ўчастак былой памешчыцкай зямлі, на якой пабудаваліся колішнія батракі. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 43 гаспадаркі, 226 жыхароў. У 1934 г. створаны калгас імя Л.Красіна. На пачатак 1997 г. 30 двароў, 43 жыхары. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы. Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях з гітлераўцамі; на магіле ў 1975 г. ўстаноўлены помнік-абеліск.

НАВІКІ, вёска ў Кавалёўскім сельсавеце, за 5 км ад чыгуначнай станцыі Цялуша на лініі Бабруйск—Жлобін, на р. Ала (прыток Бярэзіны). Назва-вызначэнне ад слова «новы» ці прозвішча Новік. Вядома з 17 ст. Па гаспадарчых актах 1639 г. — сяло Бабруйскага староства Рэчыцкага павета Вялікага княства Літоўскага. З 1793 г. ў складзе Расіі, з 1795 г. ў Бабруйскім павеце Мінскай губерні. Належала памешчыкам Месцерам. Паводле перапісу 1897 г. — сяло Бортнікаўскай воласці Бабруйскага павета, 43 двары, 367 жыхароў, лаўка. На пачатку 20 ст. 368 жыхароў. У 1917 г. 73 двары, 394 жыхары. Мясцовы жыхар Г.Шаўцоў арганізаваў у 1918 г. партызанскі атрад (150 чалавек) і вёў барацьбу супраць нямецкіх акупантаў у раёне чыгуначнай лініі Бабруйск—Жлобін. У 1921 г. адкрыта пачатковая школа (у наёмным памяшканні), было 52 вучні (1925). У 1924 г. арганізавана меліярацыйнае таварыства імя У.І.Леніна. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 68 двароў, 370 жыхароў. У 1930 г. створаны калгас «Чырвоны барацьбіт», працаваў млын. На пачатак 1997 г. 33 двары, 54 жыхары. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы.

НОВАЯ БЕЛАРУСЬ, пасёлак у Слабодкаўскім сельсавеце, за 4 км ад чыгуначнай станцыі Бабруйск, непадалёку ад шашы Бабруйск—Слуцк. Заснаваны ў 1929 г. ў сувязі з будаўніцтвам тарфянога завода «Новая Беларусь». Гэта назва як сімвал новага ладу дадзена і пасёлку. На пачатак 1997 г. 10 двароў, 14 жыхароў.

НОВАЯ ШАРАЁЎШЧЫНА, вёска ў Хімоўскім сельсавеце, за 13 км ад чыгуначнай станцыі Бярэзіна на лініі Бабруйск—Жлобін. У аснове назвы слова «шэры», паходзіць, верагодна, ад прозвішча Шарай, Шараеў. Вядома з пачатку 20 ст. як Слабада Шараёўшчына Бортнікаўскай воласці Бабруйскага павета, 28 двароў, 210 жыхароў. У 1917 г. — Слабада Новая Шараёўшчына, 44 двары, 266 жыхароў. Паводле перапісу 1926 г. — вёска Новая Шараёўшчына, 39 двароў, 222 жыхары. У 1930 г. створаны калгас імя В.М.Молатава. На пачатак 1997 г. 27 двароў, 57 жыхароў. У вёсцы брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях у Вялікую Айчынную вайну; на магіле ў 1975 г. ўстаноўлены помнік-абеліск з мемарыяльным надпісам.

ОБЧА, вёска ў Гарбацэвіцкім сельсавеце, за 11 км ад чыгуначнай станцыі Чырвоны Брод на лініі Бабруйск—Рабкор, на шашы Бабруйск—Глуск. Назва-тэрмін: «общее» ці «общак» — усё агульнае (зямля, паша і г.д.); так называлася ўрочышча, дзе заснавана паселішча. Па дакументах вядома з 17 ст. На 1838 г. — вёска Обчын Бабруйскага павета, уласнасць Вітгенштэйнаў. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Обчын Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, 16 гаспадарак, 128 жыхароў. У 1913 г. адкрыта земскае народнае вучылішча. У 1916 г. — вёска, 27 двароў, 175 жыхароў. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 39 двароў, 197 жыхароў. У 1931 г. створаны калгас «Сцяг працы» (18 сялянскіх гаспадарак). На 1940 г. 41 двор, 160 жыхароў. У маі 1943 г. нямецка-фашысцкія акупанты разрабавалі і спалілі вёску. На пачатак 1997 г. 24 двары, 33 жыхары. Каля вёскі археалагічны помнік — курганны могільнік (73 насыпы).

ОРСІЧЫ, вёска ў Брожскім сельсавеце, за 4 км ад чыгуначнай станцыі Брожа на лініі Бабруйск—Рабкор, на ручаі. Назва ад прозвішча Орсіч. Па дакументах вядома з 1560 г. як сяло Бабруйскага староства Рэчыцкага павета Вялікага княства Літоўскага. У 1671 г. 8 двароў. З 1793 г. ў складзе Расіі, з 1795 г. ў Бабруйскім павеце Мінскай губерні. У 1847 г. — вёска ў складзе маёнтка Брожа, 24 двары, 108 жыхароў, казённая ўласнасць. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Брожскай воласці Бабруйскага павета, 53 двары, 362 жыхары. На пачатку 20 ст. 70 двароў, 488 жыхароў. У 1917 г. — вёска, 96 двароў, 584 жыхары, земскае народнае вучылішча (адкрыта ў 1911 г., настаўніцай працавала М.Свадкеўская). Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі на базе гэтага вучылішча створана працоўная школа 1-й ступені (47 вучняў у 1925 г.), дзейнічалі драматычны і харавы гурткі, бібліятэка. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 118 двароў, 616 жыхароў. У 1930 г. створаны калгас «Праўда», працавала кузня. У 1967 г. да вёскі далучаны пасёлак Орсічы. На пачатак 1997 г. 128 двароў, 212 жыхароў. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы, установа па прыгатаванні вітамінаў мукі, бібліятэка, клуб, магазін.

ОСАВА, вёска, цэнтр сельсавета і саўгаса «Осава». За 6 км ад чыгуначнай станцыі Ясень на лініі Бабруйск—Мінск, каля аўтамабільнай дарогі Бабруйск—Навасёлкі. Назва ад старабеларускай назвы «асіна» (асавок — асінавы лес, асавік — падасінавік). Па пісьмовых крыніцах вядома з 16 ст. На 1524 г. — сяло ў складзе Вялікага княства Літоўскага, шляхецкая ўласнасць. На 1597 г. 25 гаспадарак. У 1602 г. — сяло ў складзе маёнтка Глуск Пагарэлы Рэчыцкага павета Мінскага ваяводства, 16 двароў. З 1793 г. ў складзе Расіі. На 1844 г. — вёска ў складзе маёнтка Осава (належаў Асянецкім). Паводле перапісу 1897 г. — вёска Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета Мінскай губерні, 53 двары, 326 жыхароў, працаваў хлебазапасны магазін. Паблізу вёскі былі размешчаны аднайменныя фальварак (13 двароў, 78 жыхароў) і хутар (2 двары, 5 жыхароў), дзейнічаў вадзяны млын. У 1913 г. адкрыта земскае народнае вучылішча. У 1917 г. — вёска, 71 двор, 444 жыхары; у маёнтку Осава 4 двары, 28 жыхароў; на хутары 4 двары, 37 жыхароў. У ліпені 1920 г. вёску спалілі польскія інтэрвенты, забілі 19 мірных жыхароў. У 1918 г. земскае народнае вучылішча пераўтворана ў працоўную школу 1-й ступені, якой у 1923 г. быў перададзены нацыяналізаваны панскі будынак. У 1925 г. ў школе вучыліся 51 хлопчык і дзяўчынка, пры ёй дзейнічаў гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1922 г. да вёскі прырэзаны ўчастак былой памешчыцкай зямлі, на якой пабудавалі сядзібы колішнія парабкі. Паводле перапісу 1926 г. ў вёсцы 93 гаспадаркі, 417 жыхароў. У 1931 г. створаны калгас імя М.І.Калініна. У Вялікую Айчынную вайну супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў дзейнічала падпольная група (кіраўнік Д.М.Лемяшонак). У Вялікай Айчыннай вайне ўдзельнічала каля 200 вяскоўцаў, 40 з іх загінулі. У 1967 і 1980 гг. далучаны вёскі Заніўе і Палоскі, а таксама пасёлак Осава. На пачатак 1997 г. 234 двары, 694 жыхары. На тэрыторыі вёскі сядзіба сельсавета і саўгаса, механічныя майстэрні, піларама, сярэдняя школа (пры ёй краязнаўчы музей), фельчарска-акушэрскі пункт, бібліятэка, клуб, дзіцячыя яслі-сад, аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, ветучастак, дом быту, лазня. У цэнтры вёскі, каля будынка сельсавета, — брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну; у 1975 г. ўстаноўлены помнік-абеліск. На будынку сельсавета (1976) — мемарыяльная дошка ў памяць пра баявую дзейнасць падпольшчыкаў.

ОСАЎ, пасёлак у Варатынскім сельсавеце, за 4 км ад чыгуначнай станцыі Амельня на лініі Бабруйск—Жлобін. Заснаваны ў 1922 г. на землях былога панскага маёнтка. Паводле перапісу 1926 г. — засценак, 12 гаспадарак, 68 жыхароў. У 1940 г. 13 двароў, 32 жыхары. На пачатак 1997 г. 5 двароў, 13 жыхароў.

ПАБОКАВІЧЫ, вёска ў Гарбацэвіцкім сельсавеце, за 6 км ад чыгуначнай станцыі Мірадзіна на лініі Бабруйск—Слуцк. Назва, верагодна, ад прозвішча Пабокавіч і вытворных ад яго слоў; магчыма, і назва-арыенцір: паселішча ў баку ад чаго-небудзь (дарогі, поля і г.д.). Вядома па дакументах з 1560 г. як сяло ў Бабруйскім старостве Рэчыцкага павета Вялікага княства Літоўскага, дзяржаўная ўласнасць. Паводле гаспадарчых актаў 1639 г. — сяло. У 1782 г. 38 двароў. З 1793 г. ў складзе Расіі, з 1795 г. ў Бабруйскім павеце Мінскай губерні. У 1838 г. 77 рэвізскіх душ. У 1847 г. — сяло, уласнасць Вітгенштэйнаў. Паводле перапісу 1897 г. — сяло Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, 53 гаспадаркі, 366 жыхароў, хлебазапасны магазін, піўная лаўка, царква. На пачатку 20 ст. — вёска, 70 двароў, 528 жыхароў, дзейнічала

царкоўнапрыходская школа. У 1915 г. вёска разгорнута на хутары. У 1917 г. 94 гаспадаркі, 654 жыхары. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 143 двары, 707 жыхароў, паравы млын. У 1931 г. створаны калгас імя А.А.Андрэева. У Вялікую Айчынную вайну супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў дзейнічалі падпольшчыкі. На пачатак 1997 г. 92 двары, 155 жыхароў. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы, клуб, бібліятэка, магазін. На мясцовых могілках брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях з гітлераўцамі ў Вялікую Айчынную вайну; у 1976 г. на магіле ўстаноўлены помнік-абеліск з мемарыяльным надпісам. Непадалёку аднайменнае радовішча гліны. Радзіма пісьменніка Платона Галавача.

ПАДЛІП'Е, пасёлак у Кавалёўскім сельсавеце, за 2 км ад чыгуначнай станцыі Цялуша на лініі Бабруйск—Жлобін. Назва-арыенцір: паселішча месціцца пад ліпамі, каля ліпаў ці ліпавага гаю. Заснаваны як пасёлак у 1919 г. на месцы колішняга памешчыцкага маёнтка Янін малазямельнымі сялянамі і батракамі. У 1925 г. да пасёлка далучаны вялікі ўчастак былой памешчыцкай зямлі. Паводле перапісу 1926 г. — пасёлак, 11 гаспадарак, 46 жыхароў. У 1992 г. далучаны да вёскі Кавалі.

ПАДСОБНАЕ, вёска ў Сычкаўскім сельсавеце, за 6 км ад чыгуначнай станцыі Ясень на лініі Бабруйск—Мінск. Заснавана ў 1920-х гадах на былых памешчыцкіх землях. Паводле слоў старажылаў тут была падсобная гаспадарка, таму і вёску назвалі Падсобнае. На пачатак 1997 г. 13 двароў, 15 жыхароў. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы.

ПАД'ЯСЕНКА, вёска ў Сычкаўскім сельсавеце, за 6 км ад чыгуначнай станцыі Мірадзіна на лініі Бабруйск—Мінск, на рэках Ясенка і Ваўчанка (басейн Бярэзіны), непадалёку ад шашы Бабруйск—Мінск. Назва ад ракі Ясенка, каля якой заснавана паселішча. На пачатку 20 ст. — вёска Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета Мінскай губерні, 16 двароў, 134 жыхары. У 1921 г. адкрыта пачатковая школа. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 37 двароў, 184 жыхары. У 1934 г. створаны калгас «Пад'ясенка». На пачатак 1997 г. 37 двароў, 57 жыхароў. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы.

ПАКРОЎКА, вёска ў Осаўскім сельсавеце, за 14 км ад чыгуначнай станцыі Мірадзіна на лініі Бабруйск—Мінск, паблізу шашы Бабруйск—Слуцк. Магчыма, назва ад рэлігійнага свята Пакровы ці ад прозвішча. Вядома па пісьмовых крыніцах з 19 ст. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Гарадкоўскай воласці Бабруйскага павета, 12 двароў, 98 жыхароў. На пачатку 20 ст. — вёска той жа воласці, 19 двароў, 108 жыхароў. У 1917 г. 33 двары, 138 жыхароў. У 1921 г. адкрыта пачатковая школа. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 26 двароў, 130 жыхароў. У 1930 г. створаны калгас імя С.М.Кірава. На пачатак 1997 г. 12 двароў, 15 жыхароў.

ПАЛОШКАВА, вёска ў Гарохаўскім сельсавеце, за 19 км ад чыгуначнай станцыі Мірадзіна на лініі Бабруйск—Мінск. Назва, верагодна, ад прозвішча Палошкаў. Заснавана ў 1920-х гадах. На пачатак 1997 г. 6 двароў, 7 жыхароў.

ПАЛЯНКІ, вёска ў Кавалеўскім сельсавеце, за 13 км ад чыгуначнай станцыі Цялуша на лініі Бабруйск—Жлобін. Назва-тэрмін: паляна — невялікае адкрытае месца ў лясным масіве. З пісьмовых крыніц вядома з 17 ст. Па гаспадарчых актах 1639 г. — лясное ўрочышча. Паводле перапісу 1897 г. — лясное ўрочышча Палянкі Туркоўскай воласці Бабруйскага павета, 1 гаспадарка, 10 жыхароў, дзейнічаў лесапільны завод. У 1917 г. — хутар, 9 двароў, 56 жыхароў. Паводле перапісу 1926 г. — хутары Палянкі, 40 двароў, 224 жыхары. Пазней пераўтвораны ў вёску. У 1931 г. арганізаваны калгас «1 Мая № 2» (аб'яднаў 7 гаспадарак). На пачатак 1997 г. 27 двароў, 55 жыхароў. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы.

ПАНКРАТАВІЧЫ, вёска ў Кавалёўскім сельсавеце, за 10 км ад чыгуначнай станцыі Цялуша на лініі Бабруйск—Жлобін. Назва ад імя Панкрат ці вытворнага ад яго прозвішча Панкратаў. Вядома з 16 ст. У дакументах 1560 г. сустракаецца як сяло Панкратавічы Бабруйскага староства Рэчыцкага павета Вялікага княства Літоўскага, дзяржаўная ўласнасць. Паводле гаспадарчых актаў 1639 г. — сяло, 12 гаспадарак, 41 жыхар мужчынскага полу. На 1773 г. 20 двароў. З 1793 г. ў складзе Расіі, з 1795 г. ў Бабруйскім павеце Мінскай губерні. Уласнасць памешчыкаў Кабыліных. На 1885 г. — сяло, 31 двор, 324 жыхары, дзейнічала царква, царкоўная школа граматы (адкрыта ў 1884 г.), навучаліся 9 хлопчыкаў (1890). Паводле перапісу 1897 г.— сяло Туркоўскай воласці Бабруйскага павета, 56 двароў, 487 жыхароў. Штогод 23 снежня праводзіўся таржок. На пачатку 20 ст. 76 двароў, 603 жыхары. У 1910 г. адкрыта земскае народнае вучылішча (у наёмным па-

мяшканні). У 1917 г. — вёска, 108 двароў, 772 жыхары. У 1923 г. далучаны вялікі ўчастак былой памешчыцкай зямлі. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі адкрыта працоўная школа 1-й ступені, вучыліся 76 хлопчыкаў і дзяўчынак. Паводле перапісу 1926 г. — хутары, 190 гаспадарак, 1007 жыхароў. У 1931 г. створаны калгас «Прамень камуны № 2» (аб'яднаў 23 гаспадаркі). На пачатак 1997 г. 151 двор, 356 жыхароў. У вёсцы гаспадарчы двор, майстэрні па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, авечкагадоўчы комплекс. Працуюць Дом культуры, бібліятэка, васьмігадовая школа, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін.

ПАНЮШКАВІЧЫ, вёска ў Сычкаўскім сельсавеце, за 9 км ад чыгуначнай станцыі Бабруйск. Назва, верагодна, ад рускага слова «понюшка» — тое, што за адзін раз вынюхаеш, панюхаеш. Вядома з 17 ст. Паводле гаспадарчых актаў 1639 г. — сяло Бабруйскага старостава Рэчыцкага павета Вялікага княства Літоўскага, належала каталіцкай царкве. У 1779 г. пабудавана драўляная царква. З 1793 г. ў складзе Расіі, з 1795 г. ў Бабруйскім павеце Мінскай губерні. У 1844 г. — сяло Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, дзяржаўная ўласнасць. У 1867 г. сяляне зрабілі самавольную высечку казённага лесу. У 1891 г. адкрыта царкоўнапрыходская школа. У 1897 г. пабудавана новае драўлянае памяшканне царквы. На пачатку 20 ст. ў сяле 11 гаспадарак, 30 жыхароў. Побач знаходзіліся аднайменныя пагост (28 жыхароў) і маёнтак (2 двары, 12 жыхароў). У 1917 г. 8 двароў, 40 жыхароў, у маёнтку 47 жыхароў. 25 лютага 1919 г. на базе былога памешчыцкага маёнтка сяляне з суседніх вёсак Сычкава і Ціўнавічы стварылі Панюшкавіцкую сельскагаспадарчую камуну (адна з першых сацыялістычных гаспадарак на Бабруйшчыне). Пасля грамадзянскай вайны створана працоўная школа 1-й ступені, у якой на 1925 г. было 65 вучняў. Паводле перапісу 1926 г. — пасёлак, 12 двароў, 65 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну ў вёсцы дзейнічалі падпольшчыкі. На пачатак 1997 г. 8 двароў, 12 жыхароў.

Маёнтак Панюшкавічы — радзіма пісьменніка В.Дуніна-Марцінкевіча.

ПАРАСЛЯ, пасёлак у Варатынскім сельсавеце, чыгуначная станцыя Амельня на лініі Бабруйск—Жлобін. Назва-тэрмін: маладыя галінкі, сцяблы (парослі) нейкай расліннасці. Упамінаецца ў дакументах 1639 г. як урочышча, участак зямлі ў Бабруйскім старостве Рэчыцкага павета Вялікага княства Літоўскага. Пасёлак створаны ў 1920-я гады. Паводле перапісу 1926 г. — пасёлак, 10 двароў, 53 жыхары. На пачатак 1997 г. 3 двары, 3 жыхары.

ПАСЕКА, вёска ў Гарохаўскім сельсавеце, за 20 км ад чыгуначнай станцыі Мірадзіна на лініі Бабруйск—Мінск. Пасяленне ўзнікла на месцы пасекі, лясной высечкі, адсюль і назва. Заснавана ў 1922 г. як хутар. Паводле перапісу 1926 г. — хутар, 1 гаспадарка, 9 жыхароў. На пачатак 1997 г. 11 двароў, 27 жыхароў.

ПАСЕКА, вёска ў Варатынскім сельсавеце, за 3 км ад чыгуначнай станцыі Амельня на лініі Бабруйск—Жлобін. Назва ад мясцовасці: калісьці на гэтым месцы была пасека, выкарчаваны лес. Упамінаецца ў дакументах 1669 г. як урочышча ў Бабруйскім старостве Рэчыцкага павета Вялікага княства Літоўскага. У 1922 г. тут на колішніх памешчыцкіх землях быў заснаваны хутар. У 1925 г. да яго далучаны вялікі ўчастак зямлі з запаснога дзяржаўнага фонду. Паводле перапісу 1926 г. — пасёлак, 17 гаспадарак, 76 жыхароў. Пазней пасёлак пераўтвораны ў вёску. На пачатак 1997 г. 17 двароў, 27 жыхароў.

ПЕРАСОВА, вёска ў Вішнёўскім сельсавеце, за 9 км ад чыгуначнай станцыі Чырвоны Брод на лініі Бабруйск—Рабкор, на р. Бярэзіна. Назва ад асновы рускага слова «пересов» — жэрдка, якою рыбакі перасоўваюць цягу невада пад ільдом ад адной палонкі да другой. Вядома як урочышча, участак угоддзяў Перасоў. У 1926 г. каля гэтага ўрочышча пры развёрстцы запаснога зямельнага фонду заснаваны аднайменны пасёлак. Паводле перапісу 1926 г. — пасёлак Перасоў, 14 двароў, 59 жыхароў. На пачатак 1997 г. 17 двароў, 25 жыхароў. Каля вёскі археалагічны помнік — гарадзішча.

ПЛЁСЫ, вёска, чыгуначная станцыя на лініі Бабруйск—Жлобін у Цялушскім сельсавеце, на шашы Бабруйск—Жлобін. Назва ад тэрміна «плёс» — участак ракі, возера з роўным дном ці спакойным цячэннем. Назву Плёс тут мела ўрочышча, участак балота. У дакументах упершыню ўпамінаецца ў 1560 г. як сяло Плосы Бабруйскага староства Рэчыцкага павета Вялікага княства Літоўскага. У гаспадарчых актах 1639 г. — сяло Плесы ці Плеса, дзяржаўная ўласнасць. У 1738 г. — сяло Плосы, 46 двароў; у 1765 г. 52 двары, дзейнічалі карчма, млын. З 1793 г. ў складзе Расіі, з 1795 г. ў Бабруйскім павеце Улас-

насць памешчыкаў Кабыліных. У 1883 г. заснаваны вінакурны завод. На пачатку 20 ст. — вёска Плёсы Туркоўскай воласці Бабруйскага павета, 149 гаспадарак, 1214 жыхароў. Акрамя асноўных заняткаў насельніцтва — земляробства і жывёлагадоўлі — бытавалі такія промыслы, як ткацтва, прадзенне, вышыўка, збор ягад і грыбоў, пашыў адзення, выраб абутку, хатняга начыння, і іншыя. На пачатку 20 ст. дзейнічалі царкоўнапрыходская школа, пастаялы двор, млын, крама, вінакурны завод. Побач з вёскай знаходзіўся аднайменны маёнтак, 26 жыхароў. У 1917 г. было 239 двароў, 1488 жыхароў. У 1923 г. да Плёсаў далучаны вялікі ўчастак былой памешчыцкай зямлі, на якім пабудаваліся колішнія парабкі. У 1923 г. адкрыта працоўная школа 1-й ступені, у якой было 215 дзяцей з Плёсаў і навакольных населеных пунктаў, дзейнічалі драматычны гурток і камсамольская ячэйка (1925); у 1924 г. пабудавана новая школа. У 1925 г. створана таварыства «Праца». Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 245 двароў, 1363 жыхары. У 1930 г. арганізаваны калгас «13 год Кастрычніка». У 1967 г. да Плёсаў далучаны вёскі Жылінцы, Новы Быт і Слабада. На пачатак 1997 г. 160 двароў, 350 жыхароў. У вёсцы сельскагаспадарчы двор, майстэрні па рамонце тэхнікі, фермы буйной рагатай жывёлы і свінагадоўчая, цэх па апрацоўцы драўніны. Працуюць сярэдняя школа, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, тры магазіны, аддзяленні сувязі і ашчаднага банка, клуб. Радзіма паэта Міколы Аўрамчыка, Героя Сацыялістычнай Працы А.Р.Сакун, вучонага І.М.Ліпца.

ПОСТРАШ, вёска ў Кавалёўскім сельсавеце, за 6 км ад чыгуначнай станцыі Цялуша на лініі Бабруйск—Жлобін. Назва ад слова «пастрашыць» ці ад прозвішча Постраш. Па пісьмовых крыніцах вядома з 20 ст. На пачатку 20 ст. — хутар Туркоўскай воласці Бабруйскага павета, 5 двароў, 31 жыхар. У 1917 г. 5 двароў, 36 жыхароў. Паводле перапісу 1926 г. — хутары Постраш, 13 двароў, 91 жыхар. Пазней пераўтвораны ў вёску. У 1931 г. арганізаваны калгас «Сёмы з'езд Саветаў». У 1967 г. далучана вёска Нівішча. На пачатак 1997 г. 59 двароў, 103 жыхары. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы. Працуе магазін. На мясцовых могілках брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях у Вялікую Айчынную вайну; на магіле ў 1972 г. ўстаноўлены помнік-стэла з мемарыяльным надпісам. Каля вёскі два археалагічныя помнікі — курганныя могільнікі (5 і 7 курганоў).

ПРАГРЭС, вёска ў Кавалёўскім сельсавеце, за 4 км ад чыгуначнай станцыі Цялуша на лініі Бабруйск—Жлобін. Назва — сімвал новага, перадавога. Заснавана ў 1919 г. на землях былога маёнтка Янін колішнімі батракамі. Паводле перапісу 1926 г. — пасёлак, 24 двары, 126 жыхароў. Пазней пераўтвораны ў вёску. У 1931 г. арганізаваны калгас «Прагрэс» і арцель «Прагрэс» па здабычы торфу. Адгэтуль і назва пасялення. На пачатак 1997 г. 40 двароў, 73 жыхары. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы, клуб. На мясцовых могілках брацкая магіла савецкіх воінаў, што загінулі ў баях з нямецка-фашысцкімі акупантамі ў Вялікую Айчынную вайну.

ПРАГРЭС, пасёлак у Осаўскім сельсавеце, за 4 км ад чыгуначнай станцыі Мірадзіна на лініі Бабруйск—Мінск. Назва — сімвал новага, перадавога. Заснаваны ў 1924 г. малазямельнымі сялянамі ва ўладаннях былога маёнтка Янін. На пачатак 1997 г. 19 двароў, 24 жыхары.

ПРАЛЕТАРСКІ, пасёлак у Цялушскім сельсавеце, за 3 км ад чыгуначнай станцыі Плёсы на лініі Бабруйск—Жлобін, каля шашы Бабруйск—Жлобін. Назва ад слоў «пралетарый», «пралетарыят» — перадавы, як лічылася, клас грамадства, авангард працоўных. Заснаваны ў 1924 г. на зямлі былога маёнтка Маліннікі. Паводле перапісу 1926 г. — пасёлак, 14 двароў, 66 жыхароў. У 1930 г. створаны калгас «Свабода». На пачатак 1997 г. 17 двароў, 26 жыхароў. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы.

ПРУДЗІШЧА, колішняя вёска Брожскага сельсавета. Знаходзілася за 17 км ад чыгуначнай станцыі Бабруйск. У аснове назвы рускае слова «пруд» — невялікі вадаём (сажалка) ці запруда (гаць, плаціна, грэбля). На пачатку 20 ст. — вёска Прудзішча Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета Мінскай губерні, 15 двароў, 132 жыхары. Паводле перапісу 1926 г. — 37 гаспадарак, 154 жыхары. У 1940 г. 22 двары, 90 жыхароў. Нямецка-фашысцкія акупанты спалілі Прудзішча і загубілі 30 яго жыхароў. Пасля вайны вёска не адноўлена.

ПРОДЗВІНА, вёска ў Вішнёўскім сельсавеце, за 6 км ад чыгуначнай станцыі Брожа на лініі Бабруйск—Рабкор, на шашы Бабруйск—Мазыр, на р. Продзвінка. Назва ад наймення ракі. Паводле гаспадарчых актаў

1639 г. — урочышча, участак сенажаці. У 1798 г. — вёска Бабруйскага павета, 5 двароў, 26 жыхароў, дзяржаўная ўласнасць. Паводле дакументаў 1847 г. — вёска ў складзе казённага маёнтка Брожа, 18 двароў, 93 жыхары. Паводле перапісу 1897 г. — вёска пры паштовай дарозе Бабруйск—Парычы ў Брожскай воласці Бабруйскага павета, 36 двароў, 224 жыхары. На пачатку 20 ст. — вёска, 39 двароў, 224 жыхары. У 1916 г. адкрыта земскае народнае вучылішча, у якім настаўніцай працавала Неаніла Шаламоўская. У 1917 г. 43 двары, 256 жыхароў. У 1921 г. земскае народнае вучылішча пераўтворана ў працоўную школу 1-й ступені, вучыліся 55 дзяцей, дзейнічаў драматычны гурток (1925). У 1924—1968 гг. — цэнтр аднайменнага сельсавета. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 58 двароў, 300 жыхароў. У 1932 г. створаны калгас імя В.П.Чкалава. На пачатак 1997 г. — 16 двароў, 20 жыхароў. Радзіма мастака Л.П.Асецкага.

ПУСТОШКА, вёска ў Бортнікаўскім сельсавеце, за 14 км ад чыгуначнай станцыі Цялуша на лініі Бабруйск—Жлобін. Паводле мясцовага падання пасяленне заснавана на пустэчы, незанятым участку зямлі, адсюль і назва. Вядома па пісьмовых крыніцах з 19 ст. У 1838 г. — вёска, 65 жыхароў мужчынскага полу, уласнасць памешчыкаў Булгакаў. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Бортнікаўскай воласці Бабруйскага павета, 55 двароў, 472 жыхары, працавалі ветраны млын, школа царкоўнай граматы, пастаялы двор. У 1906 г. школа працоўнай граматы пераўтворана ў царкоўнапрыходскую школу, для якой пабудавана новае памяшканне. На пачатку 20 ст. — вёска, 65 двароў, 517 жыхароў. У 1914 г. вёска разгорнута на хутары. У 1917 г. — хутары, 65 двароў, 509 жыхароў. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі створана працоўная школа 1-й ступені, у якой вучыліся 64 хлопчыкі і дзяўчынкі (1925). У 1925 г. далучаны вялікі ўчастак зямлі з дзяржаўнага фонду, на якой пабудаваліся колішнія парабкі і беднякі. У 1925 г. створана пчалярскае таварыства «Прасвет», у 1931 г. — калгас «Асаавіяхім», была кузня. Паводле перапісу 1926 г. — хутары Пустошка, 78 двароў, 450 жыхароў. На пачатак 1997 г. 32 двары, 47 жыхароў. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы, магазін.

ПЯТРОВІЧЫ, вёска ў Гарохаўскім сельсавеце, цэнтр саўгаса, за 9 км ад чыгуначнай станцыі Чырвоны Брод на лініі Бабруйск—Рабкор. Каля вёскі пачынаецца р. Брожка (прыток Бярэзіны). Назва ад імя Пётр ці ўтворанага ад яго прозвішча Пятровіч. Па пісьмовых крыніцах вядома з 1560 г. як сяло Бабруйскага староства Рэчыцкага павета Вялікага княства Літоўскага. У 1639 г. 12 гаспадарак, 30 жыхароў мужчынскага полу. У 1765 г. працавала карчма. З 1793 г. ў складзе Расіі, з 1795 г. ў Бабруйскім павеце. У 1844 г. — вёска ў складзе дзяржаўнага маёнтка Пятровічы, вотчына памешчыкаў Абрамовічаў. У 1888 г. адкрыта школа царкоўнай граматы, у якой навучаліся 19 хлопчыкаў (1890). Паводле перапісу 1897 г. — сяло Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, 40 двароў, 354 жыхары, дзейнічаў хлебазапасны магазін, млын, лесапільны завод. Побач былі аднайменныя аколіца (24 двары, 195 жыхароў) і фальварак (1 двор, 7 жыхароў). У 1907 г. адкрыта земскае народнае вучылішча (у 1913 г. пабудавана новае памяшканне, настаўніцай працавала Лізавета Таўкачова). У 1917 г. — вёска, 71 двор, 439 жыхароў і аднайменная аколіца, 44 двары, 242 жыхары. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі на базе земскага народнага вучылішча створана працоўная школа 1-й ступені. У 1925 г. было 108 вучняў, дзейнічалі драматычны і харавы гурткі. Непадалёку ад вёскі ў лесе працавала смалакурня (1925). Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 85 двароў, 468 жыхароў. У 1930 г. створаны калгас імя Н.К.Крупскай, у 1933 г. адкрыта бандарная арцель «Чырвоны бондар». На 1940 г. 100 двароў, 368 жыхароў. У верасні 1943 г. нямецка-фашысцкія карнікі абрабавалі і спалілі вёску. На пачатак 1997 г. 152 двары, 319 жыхароў. У вёсцы саўгасная сядзіба, майстэрні па рамонце тэхнікі, ферма буйной рагатай жывёлы, зернедрабільня, ляснічтва, ветэрынарны пункт. Працуюць васьмігадовая школа, бібліятэка, Дом культуры, дзіцячыя яслі-сад, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленні ашчаднага банка і сувязі, магазін, стадыён, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва. Помнік-абеліск (1976) на ўшанаванне памяці жыхароў з населеных пунктаў саўгаса «Пятровічы», якія загінулі ў баях з гітлераўцамі ў Вялікую Айчынную вайну. Каля вёскі два археалагічныя помнікі — гарадзішчы. Радзіма вучонага І.В.Гайшуна.

РАГАЛІ, вёска ў Гарбацэвіцкім сельсавеце, за 9 км ад чыгуначнай станцыі Чырвоны Брод на лініі Бабруйск—Рабкор, каля шашы Бабруйск—Глуск. Назва-арыенцір: пасяленне на рагу чаго-небудзь, ля павароту дарогі і г.д. У дакументах 1639 г. — сяло Рагелі Бабруйскага староства Рэчыцкага павета Вялікага

га княства Літоўскага, дзяржаўная ўласнасць. З 1793 г. ў складзе Расіі, з 1795 г. ў Бабруйскім павеце. З 1857 г. — вёска, памешчыцкая ўласнасць. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, 13 двароў, 88 жыхароў. На пачатку 20 ст. 16 двароў, 157 жыхароў. У 1917 г. — вёска, 24 двары, 166 жыхароў. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 29 двароў, 166 жыхароў. У 1931 г. створаны калгас «Перамога № 2». На пачатак 1997 г. 22 двары, 33 жыхары. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы. Каля вёскі археалагічны помнік — курганны могільнік (6 насыпаў).

РАГАСЕЛЛЕ, вёска ў Гарохаўскім сельсавеце, за 10 км ад чыгуначнай станцыі Чырвоны Брод на лініі Бабруйск—Рабкор. Зямельны ўчастак, дзе заснавана пасяленне, меў форму рога, адсюль і назва. Па пісьмовых крыніцах вядома з 19 ст. У 1838 г. — вёска Бабруйскага павета, 23 рэвізскія душы. На 1844 г. — вёска, уласнасць памешчыкаў Грыневічаў. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, 9 двароў, 58 жыхароў. Побач быў фальварак Рагаселле, 1 двор, 2 жыхары. На пачатку 20 ст. 12 двароў, 80 жыхароў. У 1917 г. — вёска, 15 двароў, 80 жыхароў. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 15 двароў, 83 жыхары. У 1930 г. створаны калгас «Рагаселле». На пачатак 1997 г. 14 двароў,18 жыхароў. Каля вёскі археалагічны помнік — курганны могільнік (11 насыпаў).

РАКСАЛЯНКА, вёска ў Сычкаўскім сельсавеце, за 9 км ад чыгуначнай станцыі Мірадзіна на лініі Бабруйск—Мінск, на р. Ваўчанка (прыток Бярэзіны). Назва, магчыма, ад асновы слова «рокша» — птушка сівараронка. Па пісьмовых крыніцах вядома з 19 ст. Паводле перапісу 1897 г. — фальварак Свіслацкай воласці Бабруйскага павета, 7 двароў, 60 жыхароў. Побач знаходзілася аднайменнае ўрочышча, 1 гаспадарка, 5 жыхароў. На пачатку 20 ст. — вёска, 16 двароў, 119 жыхароў. У 1917 г. 18 двароў, 71 жыхар. У 1922 г. створана сельскагаспадарчае таварыства «Багацце». У 1928 г. адкрыты фельчарскі ўчастак. У 1924 г. арганізавана меліярацыйнае таварыства (30 пайшчыкаў). Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 15 двароў, 75 жыхароў. У 1933 г. створаны калгас «Гігант». На пачатак 1997 г. 20 двароў, 45 жыхароў. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы. На вясковых могілках брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях з гітлераўцамі; на ёй у 1975 г. ўстаноўлены помнік-стэла з мемарыяльным надпісам.

РЫМАЎЦЫ, вёска ў Гарохаўскім сельсавеце, за 20 км ад чыгуначнай станцыі Мірадзіна на лініі Бабруйск—Мінск. Назва ад прозвішчаў Рымко, Рымавец. Вядома з 1726 г. як вёска Рымавічы ў складзе маёнтка Глуск, 8 двароў, 7 жыхароў мужчынскага полу. У 1838 г. — вёска Рымаўцы, 118 рэвізскіх душ, належала памешчыкам Быкоўскім. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Гарадкоўскай воласці Бабруйскага павета, 80 двароў, 606 жыхароў, пастаялы двор, хлебазапасны магазін. На пачатку 20 ст. 114 двароў, 881 жыхар, крама, пастаялы двор. У 1908 г. адкрыта земскае народнае вучылішча (у наёмным памяшканні). У 1917 г. — вёска, 137 двароў, 829 жыхароў. З жніўня 1919 г. да ліпеня 1920 г. акупіравана польскай арміяй; у вёсцы створаны партызанскі атрад, які змагаўся з акупантамі. У 1924—1931 гг. — цэнтр сельсавета. У 1920-я гады на базе земскага народнага вучылішча адкрыта працоўная школа 1-й ступені, у якой было 104 вучні (1925). У 1924 г. далучаны вялікі ўчастак былой памешчыцкай зямлі, на якой пабудаваліся колішнія парабкі. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 183 двары, 814 жыхароў. Працавала школа па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. На пачатак 1997 г. 26 двароў, 48 жыхароў.

РЫНЯ, вёска ў Бортнікаўскім сельсавеце, за 8 км ад чыгуначнай станцыі Цялуша на лініі Бабруйск—Жлобін, на шашы Бабруйск—Рагачоў. Назва, магчыма, паходзіць з польскай мовы і абазначае гаршчок для хатніх кветак ці наогул гліняны посуд (міска, сподак, кубак). Па дакументах вядома з 17 ст. У гаспадарчых актах 1639 г. — шляхецкая аколіца ў складзе Бабруйскага староства Рэчыцкага павета Вялікага княства Літоўскага. З 1793 г. ў складзе Расіі, з 1795 г. ў Бабруйскім павеце Мінскай губерні. На 1844 г. ўласнасць памешчыка Прушаноўскага. Паводле перапісу 1897 г. — памешчыцкі маёнтак у Бортнікаўскай воласці Бабруйскага павета, 1 двор, 25 жыхароў, кузня. У маі і кастрычніку 1905 г. сяляне суседніх вёсак учынілі патраву памешчыцкіх пасеваў. У 1917 г. — маёнтак, 8 жыхароў. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі на месцы былога маёнтка яго колішнімі парабкамі заснаваны пасёлак, да якога ў 1924 г. далучаны вялікі ўчастак зямлі для забудовы беззямельных сялян. На пачатку 1925 г. — 12 гаспадарак, 54 жыхары. Паводле перапісу

1926 г. — пасёлак, 22 двары, 122 жыхары. Пазней пасёлак пераўтвораны ў вёску. У 1930 г. арганізаваны калгас «Рыня». На пачатак 1997 г. 26 двароў, 49 жыхароў. У вёсцы лесапільня.

РЭДКІ РОГ, пасёлак у Брожскім сельсавеце, за 3 км ад чыгуначнай станцыі Брожа на лініі Бабруйск—Рабкор. Заснаваны ў 1946 г. ў сувязі з торфараспрацоўкамі і будаўніцтвам торфазавода «Рэдкі Рог». Гэта назва дадзена і пасёлку (на краі, на рагу чагосьці). На пачатку 1992 г. 218 двароў, 500 жыхароў; на пачатак 1997 г. 228 двароў, 532 жыхары. У пасёлку кантора торфазавода, лясніцтва, пачатковая школа, бальніца, аптэка, дзіцячыя яслі-сад, Дом культуры, бібліятэка, аддзяленне сувязі і ашчаднага банка, сталовая, лазня, камбінат бытавога абслугоўвання насельніцтва, два магазіны.

САВІЧЫ, вёска ў Цялушскім сельсавеце, чыгуначная станцыя на лініі Бабруйск—Жлобін, на шашы Бабруйск—Жлобін. Назва ад імя Сава і вытворных ад яго прозвішчаў. У рэестравых актах 1639 г. — урочышча Бабруйскага староства Рэчыцкага павета Вялікага княства Літоўскага. З 1793 г. ў складзе Расіі, з 1795 г. ў Бабруйскім павеце Мінскай губерні. У 1-й палове 19 ст. — вёска ў складзе маёнтка Вавулічы, уласнасць памешчыкаў Варанцовых-Вельямінавых. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Туркоўскай воласці Бабруйскага павета, 300 двароў, 291 жыхар, працаваў ветраны млын. На пачатку 20 ст. — вёска, 43 двары, 341 жыхар. У 1917 г. 59 двароў, 403 жыхары. У жніўні 1917 г. сяляне вёскі гуртам пайшлі ў суседні маёнтак Вавулічы, які належаў П.А.Варанцову-Вельямінаву, самавольна захапілі і падзялілі паміж сабой памешчыцкую зямлю. У 1920 г. створана сельскагаспадарчае таварыства. У 1922 г. далучаны вялікі ўчастак былой памешчыцкай зямлі, на якім будаваліся колішнія парабкі. У 1924 г. адкрыта працоўная школа 1-й ступені (у наёмным памяшканні), у якой было 105 вучняў, бібліятэка (1925). Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 73 двары, 421 жыхар. У 1930 г. створаны калгас «Серп і молат», у 1931 г. — прамарцель «Чырвоны тарфяшік». У Вялікую Айчынную вайну дзейнічала падпольная антыфашысцкая група (кіраўнік М.Ткач). На пачатак 1997 г. 116 двароў, 266 жыхароў. У вёсцы комплекс буйной рагатай жывёлы, зернедрабільня. Працуюць пачатковая школа, магазін.

САЛОМЕНКА, вёска ў Сычкаўскім сельсавеце, за 7 км ад чыгуначнай станцыі Мірадзіна на лініі Бабруйск—Мінск, непадалёку ад шашы Бабруйск—Мінск. Назва-тэрмін: саломенка — пабудова з шастоў-апораў з саламянай страхою, а таксама вартаўнічая саламяная будка ў полі; магчыма, назва і ад прозвішча. Паводле дакументаў 1639 г. — урочышча Саломень. Паводле перапісу 1897 г. — казённая варта пры паштовым тракце Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, 1 двор, 11 жыхароў. На пачатку 20 ст. — урочышча, 2 двары, 7 жыхароў. У 1916 г. — урочышча, 1 двор, 7 жыхароў, казённая варта, 1 двор, 6 жыхароў. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 50 двароў, 267 жыхароў. У 1934 г. створаны калгас «Чырвоны сцяг», была кузня. На пачатак 1997 г. 30 двароў, 45 жыхароў. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы.

САСНОВАЯ (да 1964 г. К а т ы́), вёска ў Сычкаўскім сельсавеце, за 6 км ад чыгуначнай станцыі Мірадзіна на лініі Бабруйск—Мінск, на шашы Сычкава—Свіслач. Першапачатковая назва ўтворана ад пашыранага тут прозвішча Кот. У сярэдзіне 19 ст. — вёска Бабруйскага павета, 5 двароў, 34 жыхары, дзяржаўная ўласнасць. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, 15 двароў, 94 жыхары. На пачатку 20 ст. 20 двароў, 123 жыхары. У 1917 г. — вёска, 23 двары, 159 жыхароў. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 23 двары, 131 жыхар (большасць з іх мелі прозвішча Кот). У 1934 г. створаны калгас «Сёмы з'езд Саветаў». У 1964 г. перайменавана ў Сасновую. На пачатак 1997 г. 30 двароў, 46 жыхароў.

СІМГАРАВІЧЫ, вёска ў Цялушскім сельсавеце, за 2 км ад чыгуначнай станцыі Цялуша на лініі Бабруйск—Жлобін, паблізу шашы Бабруйск—Жлобін. Назва, верагодна, ад прозвішча Сіман і вытворных ад яго слоў; можна меркаваць, што ў яе аснове слова «сёмга» (рыба), тым больш што ўрочышча мела назву Семгарычы. Вядома з 17 ст. Паводле рэестравых актаў 1639 г. — урочышча Семгарычы Бабруйскага староства Рэчыцкага павета Вялікага княства Літоўскага. З 1790 г. ў складзе Расіі, з 1795 г. ў Бабруйскім павеце. На 1838 г. — вёска, 8 рэвізскіх душ, памешчыцкая ўласнасць. У 1848 г. — вёска ў складзе маёнтка Плёсы памешчыкаў Кабыліных Бабруйскага павета, 17 двароў, 153 жыхары. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Туркоўскай воласці Бабруйскага павета, 10 двароў, 93 жыхары. На пачатку 20 ст. 14 двароў,

121 жыхар. У 1917 г. — вёска, 16 двароў, 102 жыхары. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 23 двары, 118 жыхароў. У 1920-я гады дзейнічаў пункт па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1931 г. створаны калгас «3-і рашаючы год». На пачатак 1997 г. 25 двароў, 37 жыхароў. На вясковых могілках брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях у Вялікую Айчынную вайну, у 1972 г. на ёй устаноўлены помнік-абеліск. Непадалёку ад вёскі археалагічны помнік — курганны могільнік (42 насыпы).

СЛАБАДА, вёска ў Осаўскім сельсавеце, за 11 км ад чыгуначнай станцыі Ясень на лініі Бабруйск—Мінск. Назва ад тыпу старажытнага пасялення «слабада» ў 11 ст., якое карысталася часовымі льготамі ў выплаце падаткаў і інш. павіннасцяў. Заснавана на землях былога маёнтка Забудзькі. Паводле перапісу 1926 г. — пасёлак, 9 двароў, 47 жыхароў. Пазней пераўтворана ў вёску. На пачатак 1997 г. 9 двароў, 14 жыхароў.

СЛАБАДА, вёска ў Хімоўскім сельсавеце, за 6 км ад чыгуначнай станцыі Савічы на лініі Бабруйск—Жлобін, на шашы Бабруйск—Рагачоў. Назва ад тыпу старажытнага пасялення — слабада. Паводле перапісу 1897 г. — сяло Слабада-Даўгарожаная Бортнікаўскай воласці Бабруйскага павета, 39 двароў, 345 жыхароў. На пачатку 20 ст. вёска, 57 двароў, 381 жыхар. У 1913 г. вёска разбіта на 56 хутароў. У 1917 г. 56 двароў, 338 жыхароў. У 1921 г. адкрыта працоўная школа 1-й ступені (у нацыяналізаваным памяшканні), у 1925 г. вучыліся 64 хлопчыкі і дзяўчынкі, дзейнічаў пункт па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. Паводле перапісу 1926 г. — хутары, 76 гаспадарак, 366 жыхароў. У 1931 г. створаны калгас імя Блюхера (12 сялянскіх гаспадарак). На пачатак 1997 г. 139 двароў, 378 жыхароў. У вёсцы гаспадарчы двор, майстэрні па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, фермы буйной рагатай жывёлы і свінагадоўчая. Працуюць пачатковая школа, клуб, бібліятэка, дзіцячыя яслі-сад, магазін. У цэнтры —помнік землякам, якія загінулі ў баях з нямецкімі фашыстамі ў Вялікую Айчынную вайну, устаноўлены ў 1976 г.

СЛАБАДА-БАГУШОЎКА, вёска ў Гарбацэвіцкім сельсавеце, за 12 км ад чыгуначнай станцыі Мірадзіна на лініі Бабруйск—Мінск, на шашы Бабруйск—Слуцк. Назва ад тыпу пасялення і прозвішча Богуш. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, 29 гаспадарак, 200 жыхароў. Жылі стараверы. Былі пастаялы двор, малельня, піўная лаўка, побач — аднайменная паштовая станцыя, 3 двары, 18 жыхароў. На пачатку 20 ст. — вёска Слабада-Багушоўка, 32 двары, 243 жыхары. Побач знаходзілася прыдарожная старожка аднайменнай назвы, 1 двор, 22 жыхары. У 1917 г. 65 гаспадарак, 390 жыхароў. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 59 двароў, 286 жыхароў. На пачатак 1997 г. 52 двары, 132 жыхары. У вёсцы свінагадоўчая ферма.

СЛАБОДКА, вёска, цэнтр сельсавета, за 6 км ад чыгуначнай станцыі Бабруйск, на шашы Бабруйск—Слуцк. Назва ўтворана ад тыпу пасялення — слабодка. Узнікла ў 1923 г. Паводле перапісу 1926 г. — пасёлак, 8 двароў, 33 жыхары. У лістападзе 1941 г. гітлераўцы загубілі каля вёскі больш за 10 тысяч савецкіх ваеннапалонных і мірных грамадзян. З 1954 г. — цэнтр сельсавета. У 1977 г. далучана в. Зацішша. На пачатак 1997 г. 186 двароў, 1099 жыхароў. У вёсцы сядзіба сельсавета, ферма буйной рагатай жывёлы, лесапільня, васьмігадовая школа-інтэрнат, клуб,



Гандлёвы цэнтр у вёсцы Слабодка.

бібліятэка, сельскае прафесійна-тэхнічнае вучылішча, аддзяленні сувязі і ашчаднага банка, аўтаматычная тэлефонная станцыя, 4 магазіны, дом быту. Помнік-абеліск ахвярам нямецкага фашызму (1975) з надпісам-прысвячэннем. У цэнтры вёскі брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях з нямецка-фашысцкімі акупантамі; у 1975 г. на магіле пабудаваны мемарыяльны комплекс: скульптура воіна з аўтаматам і сцягам, каля яе — стэла з імёнамі загінуўшых. Радзіма вучонага М.Ф.Болбаса.

СПОРНАЕ, вёска ў Гарохаўскім сельсавеце, за 13 км ад чыгуначнай станцыі Чырвоны

Брод на лініі Бабруйск—Рабкор. Паводле мясцовага падання пасяленне ўзнікла на ўчастку зямлі, за які спрачаліся (спорылі) розныя гаспадары. На пачатку 20 ст. — хутар Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, 12 двароў, 106 жыхароў. У 1917 г. — вёска, 14 гаспадарак, 111 жыхароў. Паводле перапісу 1926 г. — хутары, 26 двароў, 122 жыхары. У 1931 г. створаны калгас «Кастрычнік». На 1940 г. 22 двары, 68 жыхароў. У ліпені 1942 г. нямецка-фашысцкія карнікі разрабавалі і спалілі вёску. На пачатак 1997 г. 18 двароў, 26 жыхароў.

СТАНЫ, вёска ў Гарбацэвіцкім сельсавеце, за 11 км ад чыгуначнай станцыі Мірадзіна на лініі Бабруйск—Мінск, паблізу шашы Бабруйск—Слуцк, на р. Ваўчанка (басейн Бярэзіны). Назва-тэрмін: месца часовых жытлаў палявых станаў. Па пісьмовых крыніцах вядома з 19 ст. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, 18 двароў, 130 жыхароў. На пачатку 20 ст. 25 двароў, 193 жыхары. У 1917 г. — вёска, 48 двароў, 225 жыхароў. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 43 двары, 210 жыхароў. У 1931 г. створаны калгас імя М.І.Калініна. На пачатак 1997 г. 59 двароў, 112 жыхароў. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы.

СТАРАЯ ШАРАЁЎШЧЫНА, вёска ў Хімоўскім сельсавеце, за 7 км ад чыгуначнай станцыі Савічы на лініі Бабруйск—Жлобін, непадалёку ад шашы Бабруйск—Рагачоў. Узнікла раней, чым Новая Шараёўшчына. Па пісьмовых крыніцах вядома з 19 ст. У 1-й палове 19 ст. — вотчына памешчыкаў Кальчэўскіх. Паводле перапісу 1897 г. — сяло Бортнікаўскай воласці Бабруйскага павета, 26 двароў, 226 жыхароў, была царква, побач — фальварак з такой жа назвай, 13 двароў, 112 жыхароў. На пачатку 20 ст. 50 двароў, 310 жыхароў. У 1917 г. — вёска, 60 двароў, 280 жыхароў. У 1917 г. адкрыта пачатковая школа, у якой у 1925 г. было 43 вучні. У 1925 г. арганізавана сельскагаспадарчае таварыства «Масларобаў». Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 52 гаспадаркі, 244 жыхары. У 1931 г. створаны калгас «Пралетарый» (19 сялянскіх гаспадарак), дзейнічала кузня. На пачатак 1997 г. 44 двары, 76 жыхароў. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы, установа па прыгатаванні вітамінавай мукі, магазін. Непадалёку ад вёскі археалагічны помнік — курганны могільнік (19 насыпаў). Радзіма Героя Савецкага Саюза А.К.Шмыгуна.

СТАРЫ ДВОР, вёска ў Варатынскім сельсавеце, за 4 км ад чыгуначнай станцыі Амельня на лініі Бабруйск—Жлобін, на р. Ала (прыток Бярэзіны). Назва азначае паселішча, заснаванае каля былога двара (маёнтка, фальварка). Па пісьмовых крыніцах вядома з 19 ст. Паводле перапісу 1897 г. — маёнтак Туркоўскай воласці Бабруйскага павета, 1 двор, 16 жыхароў. У 1923 г. на месцы маёнтка створаны пасёлак перасяленцамі-беднякамі з вёскі Варатынь. Паводле перапісу 1926 г. — пасёлак, 14 двароў, 76 жыхароў. У 1930 г. арганізаваны калгас «Новая ніва». На пачатак 1997 г. 13 двароў, 21 жыхар.

СТАРЫНКІ, вёска ў Осаўскім сельсавеце, за 3 км ад чыгуначнай станцыі Ясень на лініі Бабруйск—Мінск. Назва-тэрмін: стараўзараная, абложная зямля. Вядома з 19 ст. У 1838 г. — вёска Бабруйскага павета, 68 рэвізскіх душ, памешчыцкая ўласнасць. Паводле гаспадарчага перапісу 1847 г. — вёска ў складзе маёнтка Осава, 12 гаспадарак, 70 жыхароў, належала памешчыкам Асяцінскім. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, 28 двароў, 177 жыхароў. На пачатку 20 ст. — вёска, 28 двароў, 269 жыхароў. У 1917 г. 42 двары, 288 жыхароў. У 1921 г. адкрыта пачатковая школа. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 60 двароў, 310 жыхароў. На пачатак 1997 г. 36 двароў, 60 жыхароў. Каля вёскі археалагічны помнік — курганны могільнік (30 курганоў).

СТАСЕЎКА, вёска ў Вішнёўскім сельсавеце, за 13 км ад чыгуначнай станцыі Брожа на лініі Бабруйск—Рабкор, на р. Бярэзіна, непадалёку ад шашы Бабруйск—Мазыр. Назва ад імя Стась (скарочанае імя Станіслаў). Вядома па пісьмовых крыніцах з 19 ст. У 1844 г. — вёска ў складзе маёнтка Каралеўская Слабада Бабруйскага павета, які належаў па-



Вуліца ў вёсцы Стасеўка.

мешчыкам Прушаноўскім, 25 двароў, 213 жыхароў. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Парыцкай воласці Бабруйскага павета, 91 двор, 564 жыхары. На пачатку 20 ст. 110 двароў, 919 жыхароў. У 1918 г. адкрыта земскае народнае вучылішча, у якім настаўніцай працавала Анастасія Сердзюкова. У 1917 г. — вёска, 114 двароў, 797 жыхароў. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі на базе народнага вучылішча створана працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1925 г. было 88 вучняў, дзейнічалі харавы і драматычны гурткі; у 1926 г. для школы пабудавана новае памяшканне. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 171 двор, 957 жыхароў, працавала гужавая арцель «Лазакрут», школа па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1930 г. створаны калгас «На варце», былі кузня і млын. У 1932 г. ўзведзены яшчэ будынак для школы. На пачатак 1997 г. 186 двароў, 392 жыхары. У вёсцы калгасная сядзіба, майстэрні па рамонце тэхнікі, гаспадарчы двор, ферма буйной рагатай жывёлы, цэх па вырабе кошыкаў і венікаў, устаноўка па прыгатаванні вітаміннай мукі, паромная пераправа цераз раку Бярэзіну, лесапільня, ветучастак. Працуюць сярэдняя школа, фельчарска-акушэрскі пункт, бібліятэка, Дом культуры, аддзяленні сувязі і ашчаднага банка, аўтаматычная тэлефонная станцыя, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва, два магазіны. На мясцовых могілках брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў баях з гітлераўцамі ў Вялікую Айчынную вайну; на магіле ў 1975 г. ўстаноўлены помнік-стэла з мемарыяльным надпісам.

СТУПЯНІ, вёска ў Цялушскім сельсавеце, за 3 км ад чыгуначнай станцыі Савічы на лініі Бабруйск—Жлобін. Назва ад слова «ступа» ці ад пашыранага тут прозвішча Ступень. Вядома з 17 ст. Паводле гаспадарчых актаў 1639 г. — сяло Бабруйскага староства Рэчыцкага павета Вялікага княства Літоўскага, дзяржаўная ўласнасць, 23 жыхары мужчынскага полу. З 1793 г. ў складзе Расіі, з 1795 г. ў Бабруйскім павеце. У 1838 г. 81 жыхар мужчынскага полу, памешчыцкая ўласнасць. На 1847 г. ў складзе памешчыцкага маёнтка Вавулічы, 23 двары, 146 жыхароў. Паводле перапісу 1897 г. — сяло Туркоўскай воласці Бабруйскага павета, 47 двароў, 449 жыхароў, дзейнічаў ветраны млын. На пачатку 20 ст. — вёска, 88 двароў, 536 жыхароў. У 1917 г. — вёска, 92 двары, 687 жыхароў. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 122 двары, 664 жыхары (многія з іх мелі прозвішча Ступень). У 1930 г. створаны калгас «Чырвоная Беларусь», працаваў млын. На пачатку 1997 г. 155 двароў, 290 жыхароў. У вёсцы свінагадоўчая ферма, магазін.

СУЛЕВА, вёска ў Гарохаўскім сельсавеце, за 14 км ад чыгуначнай станцыі Бабруйск. Ёсць меркаванне, што назва ўтворана ад прозвішча Сулеў. У 1639 г. вядома як урочышча, участак сенажаці Сулеў. На пачатку 20 ст. — хутар Сулева Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, 10 двароў, 46 жыхароў. У 1917 г. — вёска той жа воласці, 13 двароў, 93 жыхары. Паводле перапісу 1926 г. 15 двароў, 83 жыхары. У 1940 г. — вёска, 20 двароў, 79 жыхароў. 2 жніўня 1943 г. разрабавана і часткова спалена гітлераўцамі. Пасля вайны адноўлена. У 1987 г. апошнія 3 жыхары перасяліліся ў в. Пятровічы і в. Аколіца.

СЫЧКАВА, вёска, цэнтр сельсавета, за 3 км ад чыгуначнай станцыі Мірадзіна на лініі Бабруйск—Мінск, на шашы Бабруйск—Мінск. Назва ад слова «сыч» — сава; у пераносным значэнні — суровы, хмуры чалавек. Вядома з 17 ст., у 1645 г. — вёска, уласнасць каталіцкай царквы. У 1782 г. — вёска ў складзе Рэчыцкага павета Вялікага княства Літоўскага, 53 двары, была царква. З 1793 г. ў складзе Расіі, з 1795 г. ў Бабруйскім павеце Мінскай губерні. На 1847 г. 26 двароў, 183 жыхары. У 1856 г. — вёска ў складзе казённага маёнтка Панюшкавічы Бабруйскага павета, была карчма. У 1880-я гады — сяло, 33 гаспадаркі, 180 жыхароў. Паводле перапісу 1897 г. — сяло Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, 59 двароў, 435 жыхароў, працавалі вінная лаўка, хлебазапасны магазін. На пачатку 20 ст. — вёска, 55 двароў, 539 жыхароў. Мясцовае насельніцтва пераважна займалася земляробствам і жывёлагадоўляй, а таксама промысламі: ткацтвам, прадзеннем, пляценнем лапцяў, пашывам адзення, вырабам мэблі і прадметаў хатняга ўжытку. У 1909 г. з вёскі было выдзелена 80 хутароў і адрубаў. У 1917 г. — вёска, 101 двор, 614 жыхароў. У 1919—1920 гг. акупіравана польскімі войскамі. Супраць іх дзейнічаў партызанскі атрад. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі створана працоўная школа 1-й ступені, пры ёй гурток, а затым школа па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1924 г. — цэнтр сельсавета. У 1925 г. далучаны вялікі ўчастак зямлі з дзяржаўнага фонду, на якой сяліліся колішнія парабкі. У 1925 г. створана масларобчая арцель «Маланка». Паводле перапісу 1926 г. — хутары, 155 два-

роў, 752 жыхары. У 1933 г. заснавана цагельная арцель «Прагрэс». У 1934 г. створаны калгас «Чырвонае Сычкава». На 1940 г. 151 двор, 586 жыхароў. У 1967 г. далучаны пасёлак Сычкава. На пачатак 1997 г. 247 двароў, 452 жыхары. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы, зернедрабільня, племянная станцыя. Працуюць сярэдняя школа, фельчарска-акушэрскі пункт, бібліятэка, аддзяленні сувязі і ашчаднага банка, аўтаматычная тэлефонная станцыя, два магазіны, школа спартыўнага майстэрства, стадыён, дзіцячыя яслі-сад, краязнаўчы музей, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва. Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі пры разгроме бабруйскай групоўкі гітлераўцаў і вызваленні Сычкава (сярод пахаваных — Герой Савецкага Саюза М.Р.Селязнёў); на магіле ў 1970 г. пастаўлены абеліск і 8 пліт з імёнамі загінуўшых. На месцы подзвігу М.Селязнёва, каля сярэдняй школы, у 1968 г. пабудаваны помнік-дзот з мемарыяльным надпісам. Непадалёку ад будынка сельсавета каля шашы Бабруйск—Мінск у 1986 г. ў гонар войскаў 1-га Беларускага фронту, якія разграмілі бабруйскую групоўку гітлераўцаў, узведзены мемарыяльны комплекс (гл. пра яго асобны артыкул). На будынку музея ў 1970 г. ўстаноўлены дзве мемарыяльныя дошкі: адна — з нагоды стварэння ў 1918 г. сельскагаспадарчай камуны ў Панюшкавічах, другая — у памяць аб пісьменніку В.Дуніну-Марцінкевічу.

СЯЛІБА, вёска ў Вішнёўскім сельсавеце, за 7 км ад чыгуначнай станцыі Бярэзіна на лініі Бабруйск—Жлобін, побач з шашой Бабруйск—Мазыр, на р. Бярэзіна. Назва-тэрмін: зямля, занятая пасяленнем. Заснавана ў пачатку 1920-х гадоў. У 1930 г. створаны калгас імя О.Шміта. На пачатак 1997 г. 54 двары, 114 жыхароў. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы, магазін. Археалагічны помнік-стаянка.

СЯЛІБА, пасёлак у Хімоўскім сельсавеце, за 7 км ад чыгуначнай станцыі Бярэзіна на лініі Бабруйск—Жлобін, непадалёку ад шашы Бабруйск—Рагачоў, на р. Крапіўка (басейн Бярэзіны). Паводле перапісу 1897 г. — хутар Качэрыцкай воласці Бабруйскага павета, 5 двароў, 32 жыхары. На пачатку 20 ст. — вёска Сялібка Ясна-Леская той жа воласці, 9 двароў, 48 жыхароў. У 1917 г. 9 двароў, 61 жыхар. Паводле перапісу 1926 г. — вёска Сялібка, 11 двароў, 61 жыхар. На пачатак 1997 г. 5 двароў, 6 жыхароў.

ТАЖЫЛАВІЧЫ, вёска ў Кавалёўскім сельсавеце, за 4 км ад чыгуначнай станцыі Цялуша на лініі Бабруйск—Жлобін. Назва, магчыма, ад асновы слова «тажы» — заліўныя лугі, сырыя пожаці, пакосы. У пісьмовых крыніцах упершыню ўпамінаецца ў 1560 г. як сяло ў Бабруйскім старостве Рэчыцкага павета Вялікага княства Літоўскага, дзяржаўная ўласнасць. На 1639 г. — сяло, 15 двароў, 47 жыхароў мужчынскага полу. З 1793 г. ў складзе Расіі, з 1795 г. ў Бабруйскім павеце Мінскай губерні. На 1838 г. 70 рэвізскіх душ, уласнасць памешчыкаў Кабыліных. На пачатку 20 ст. — вёска Туркоўскай воласці Бабруйскага павета, 62 двары, 500 жыхароў, былі млын, земскае народнае вучылішча (у наёмным памяшканні). У 1917 г. — вёска, 74 двары, 513 жыхароў. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 109 двароў, 569 жыхароў. На базе земскага народнага вучылішча пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі створана працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1925 г. быў 91 вучань. У 1930 г. арганізаваны калгас «Перамога». На пачатак 1997 г. 82 двары, 180 жыхароў. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы. Працуюць васьмігадовая школа, бібліятэка, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва.

ТАКАРЫ, вёска ў Сычкаўскім сельсавеце, за 6 км ад чыгуначнай станцыі Мірадзіна на лініі Бабруйск—Мінск, побач з шашой Бабруйск—Мінск. Верагодна, што ў аснове назвы прафесія токар, а магчыма, назва і ад прозвішча. Назву Такарня маюць басейн Бярэзіны і ўрочышча, дзе ўзнікла паселішча. Вядома з дакументаў 19 ст. Паводле перапісу 1897 г. — хутар у Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, 2 двары, 22 жыхары. Паводле перапісу 1917 г. — вёска, 26 двароў, 117 жыхароў, побач з вёскай знаходзіўся аднайменны хутар, 11 двароў, 38 жыхароў. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 38 гаспадарак, 194 жыхары. У 1930 г. створаны калгас «Перамога». На пачатак 1997 г. 22 двары, 31 жыхар.

ТАКАРЫ, хутар у Сычкаўскім сельсавеце, за 7 км ад чыгуначнай станцыі Мірадзіна на лініі Бабруйск—Мінск, паблізу шашы Бабруйск—Мінск. Заснаваны перасяленцамі з в. Такары ў пачатку 20 ст. У 1917 г. — хутар Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, 11 двароў, 38 жыхароў. Паводле перапісу 1926 г. — хутар, 7 двароў, 30 жыхароў. На пачатак 1997 г. 4 двары, 6 жыхароў.

ТАПАРКІ, вёска ў Сычкаўскім сельсавеце, за 8 км ад чыгуначнай станцыі Ясень на лініі Бабруйск—Мінск. Назва ад слова тапор — сякера. Вядома з дакументаў 20 ст. На пачатку 20 ст. — вёска Свіслацкай воласці Бабруйскага павета: 14 двароў, 119 жыхароў. У 1917 г. 19 двароў, 151 жыхар. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 26 двароў, 159 жыхароў. У 1935 г. створаны калгас «Чырвоныя Тапаркі». На пачатак 1997 г. 14 двароў, 20 жыхароў.

ТРУД, пасёлак у Варатынскім сельсавеце, за 6 км ад чыгуначнай станцыі Амельня на лініі Бабруйск—Жлобін. Назва-сімвал: праца свабодных людзей. Заснаваны ў 1925 г. на былых памешчыцкіх землях колішнімі парабкамі. Паводле перапісу 1926 г. — пасёлак, 17 гаспадарак, 70 жыхароў. На пачатак 1997 г. 10 двароў, 15 жыхароў.

ТРУСАЎШЧЫНА, пасёлак у Гарохаўскім сельсавеце, за 19 км ад чыгуначнай станцыі Мірадзіна на лініі Бабруйск—Мінск. Назва ад прозвішчаў Трус, Трусаў, Трусевіч ці ад труса — невялікага хатняга грызуна сямейства заечых. Паводле перапісу 1897 г. — урочышча Гарадкоўскай воласці Бабруйскага павета, 3 гаспадаркі, 16 жыхароў. У 1922 г. — урочышча пераўтворана ў пасёлак. Паводле перапісу 1926 г. — пасёлак, 7 двароў, 38 жыхароў. На пачатак 1997 г. 4 двары, 8 жыхароў.

ТУГОЛІЦА, пасёлак у Слабодкаўскім сельсавеце, за 4 км ад чыгуначнай станцыі Чырвоны Брод на лініі Бабруйск—Рабкор. Заснаваны ў 1928 г. ў сувязі з распрацоўкай залежаў торфу ў Туголіцкім балоце, якое ўпамінаецца ў дакументах 1639 г. На пачатак 1997 г. 517 двароў, 1443 жыхары. У пасёлку торфабрыкетны і цагельны заводы, ПМК, ферма буйной рагатай жывёлы, дрэваапрацоўчая майстэрня. Працуюць сярэдняя школа, Дом культуры, дзіцячыя яслі-сад, бібліятэка, аддзяленні сувязі і ашчаднага банка, фельчарска-акушэрскі пункт, тры магазіны, сталовая, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва. У 1970 г. на тэрыторыі школы ўстаноўлены бюст У.І.Леніна.

ТУРКІ, вёска, цэнтр калгаса Варатынскага сельсавета, за 6 км ад чыгуначнай станцыі Цялуша на лініі Бабруйск—Жлобін, на шашы Бабруйск—Жлобін. Назва ад пашыранага ў мінулым уласнага імя Тур і вытворных ад яго прозвішчаў Тур, Турко і інш. З гаспадарчых актаў 1639 г. вядомы як маёнтак Бабруйскага староства Рэчыцкага павета Вялікага княства Літоўскага. З 1793 г. ў складзе Расіі, з 1795 г. ў Бабруйскім павеце Мінскай губерні. У 1838 г. 170 жыхароў мужчынскага полу. На 1844 г. — сяло ў складзе аднайменнага маёнтка, больш за 300 жыхароў, уласнасць памешчыка І.Г.Булгака. У 1871 г. адкрыта земскае народнае вучылішча, для якога ў 1896 г. пабудавана новае памяшканне. У 1880-х гадах — сяло, цэнтр воласці Бабруйскага павета, 35 двароў, 526 жыхароў. Паводле перапісу 1897 г. — сяло, цэнтр воласці, 90 двароў, 598 жыхароў, дзейнічалі два ветраныя млыны, дзве крамы, царква, лячэбны пакой. Раз у год наладжваўся кірмаш. У 1897 г. пабудавана новая царква. Побач знаходзіўся аднайменны маёнтак, 2 двары, 34 жыхары. На пачатку 20 ст. — сяло, 104 двары, 679 жыхароў, дзейнічала земскае народнае вучылішча, настаўнікамі працавалі Аляксандр і Ялона Шырокія. У маёнтку 1 двор, 32 жыхары. Апрача земляробства і жывёлагадоўлі сяляне займаліся рознымі промысламі: праценнем, ткацтвам, зборам ягад, грыбоў, лоўляй рыбы, пляценнем лапцей, кошыкаў, віццём вяровак, пашывам адзення, вырабам

Дзіцячы сад у пасёлку Туголіца.



Дом культуры ў вёсцы Туркі.

хатняга начыння, простай мэблі і г.д. У 1917 г. 119 двароў, 761 жыхар, у маёнтку 37 жыхароў. У грамадзянскую вайну дзейнічаў валасны рэўком. У 1922 г. ў былым памешчыцкім маёнтку створана сельскагаспадарчая арцель «Месяц» (160 га зямлі), пачала дзейнічаць бальніца. У 1923 г. далучаны вялікі ўчастак былой памешчыцкай зямлі. З 1924 г. — цэнтр сельсавета. У 1924 г. адкрыта хата-чытальня, створана крэдытнае таварыства. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі на базе земскага народнага вучылішча адкрыта працоўная школа 1-й ступені (у 1925 г. было 118 вучняў), дзейнічаў драматычны гурток. Паводле перапісу 1926 г. — сяло, 151 двор, 807 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас «Чырвоныя Туркі». На пачатак 1997 г. 163 двары, 404 жыхары. У вёсцы сядзібы сельсавета і калгаса, гаспадарчы двор, майстэрні па рамонце тэхнікі, лесапільня, зернедрабільня, ферма буйной рагатай жывёлы. Працуюць сярэдняя школа, клуб, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленні сувязі і ашчаднага банка, аўтаматычная тэлефонная станцыя, два магазіны, дом быту. На мясцовых могілках брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях з нямецкімі фашыстамі; на магіле ў 1970 г. ўстаноўлены помнік-абеліск. Радзіма пісьменніка Алеся Дзятлава.

ТУРКОЎСКАЯ СЛАБАДА, вёска ў Варатынскім сельсавеце, за 3 км ад чыгуначнай станцыі Амельня на лініі Бабруйск—Жлобін, непадалёку ад шашы Бабруйск—Жлобін. Назва ад уласнага імя Тур і тыпу пасялення (слабада). Паводле перапісу 1897 г. — вёска Туркі-Слабада Туркоўскай воласці Бабруйскага павета, 71 двор, 86 жыхароў. На пачатку 20 ст. — вёска, 75 двароў, 445 жыхароў, пабудавана драўляная царква. У 1917 г. 74 двары, 431 жыхар. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 101 двор, 500 жыхароў. У 1932 г. створаны калгас «Чырвоны барацьбіт», працаваў млын. У 1967 г. далучаны хутар Шчыгельскі. На пачатак 1997 г. 43 двары, 86 жыхароў. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы. Помнік народнай архітэктуры — драўляная царква.

УБАЛОЦЦЕ, вёска ў Слабодкаўскім сельсавеце, за 5 км ад чыгуначнай станцыі Бабруйск. Назва-арыенцір: паселішча ля балота ці сярод балот. На 1857 г. — вёска Бабруйскага павета, памешчыцкая ўласнасць. На пачатку 20 ст. — вёска Гарадкоўскай воласці Бабруйскага павета, 51 двор, 456 жыхароў. У 1917 г. 57 двароў, 373 жыхары. На пачатак 1997 г. 10 двароў, 21 жыхар.

УЗНОГА, вёска ў Бортнікаўскім сельсавеце, за 4 км ад чыгуначнай станцыі Цялуша на лініі Бабруйск—Жлобін, на р. Ала (прыток Бярэзіны). У аснове назвы словы «узножье», «подножье»; у шырокім сэнсе — паселішча ў падножжы ўзгорка, тэрасы, ля краю балота, лесу і г.д. Вядома з дакументаў 1639 г. як сяло Бабруйскага староства Рэчыцкага павета Вялікага княства Літоўскага. З 1793 г. ў складзе Расіі, з 1796 г. ў Бабруйскім павеце Мінскай губерні. У сярэдзіне 19 ст. ў складзе маёнтка Рыня памешчыкаў Прушаноўскіх. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Бортнікаўскай воласці Бабруйскага павета, 53 двары, 385 жыхароў, хлебазапасны магазін. У 1917 г. — вёска, 66 двароў, 432 жыхары. У 1919 г. адкрыта пачатковая школа, для якой у 1923 г. пабудавана новае памяшканне; у 1925 г. 51 вучань. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 70 двароў, 377 жыхароў. У 1931 г. створаны калгас імя Л.Літвінава, працавала кузня. На пачатак 1997 г. 45 двароў, 80 жыхароў. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы, лесапільня, клуб, бібліятэка, магазін. На мясцовых могілках брацкая магіла савецкіх воінаў,



Староверская царква ў вёсцы Туркоўская Слабада.

якія загінулі ў баях з гітлераўцамі ў Вялікую Айчынную вайну; на магіле ў 1971 г. ўстаноўлены помнік-абеліск з мемарыяльным надпісам.

УСХОД, пасёлак у Цялушскім сельсавеце, за 7 км ад чыгуначнай станцыі Цялуша на лініі Бабруйск—Жлобін. Назва-сімвал: пачатак новага свабоднага жыцця. Заснаваны ў 1924 г. на былых памешчыцкіх землях колішнімі батракамі. Паводле перапісу 1926 г. — пасёлак, 19 двароў, 105 жыхароў. На пачатак 1997 г. 21 двор, 35 жыхароў.

ФАРТУНЫ, вёска ў Гарохаўскім сельсавеце, за 18 км ад чыгуначнай станцыі Чырвоны Брод на лініі Бабруйск—Рабкор, непадалёку ад шашы Бабруйск—Глуск. Назва ад лацінскага слова «фартуна» — шчасце, лёс, рок; «фартунка» — азартная латарэйная гульня. Вядома з пісьмовых крыніц 19 ст. Дзейнічала школа царкоўнай граматы (у 1890 г. закрыта). Паводле перапісу 1897 г. — вёска Гарадкоўскай воласці Бабруйскага павета, 17 двароў, 114 жыхароў. На пачатку 20 ст. — засценак, 22 двары, 137 жыхароў. У 1917 г. — засценак, 20 двароў, 162 жыхары. Паводле перапісу 1926 г. — 23 двары, 110 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну дзейнічала падпольная антыфашысцкая група. На пачатак 1997 г. 9 двароў, 9 жыхароў.

ХАРОШАЕ, вёска ў Гарохаўскім сельсавеце, за 14 км ад чыгуначнай станцыі Чырвоны Брод на лініі Бабруйск—Рабкор, непадалёку ад шашы Бабруйск—Глуск. Назва-характарыстыка: азначае прывабнасць мясцовасці. Паводле перапісу 1897 г. — хутар Гарадкоўскай воласці Бабруйскага павета, 5 двароў, 32 жыхары. На пачатку 20 ст. 5 двароў, 49 жыхароў. У 1917 г. — хутар, 12 двароў, 88 жыхароў. Паводле перапісу 1926 г. — хутар, 30 двароў, 133 жыхары. Пазней хутар пераўтвораны ў вёску. У 1931 г. арганізаваны калгас «Чырвоны май», працавала кузня. На пачатак 1997 г. 7 двароў, 12 жыхароў.

ХІМЫ, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса, за 12 км ад чыгуначнай станцыі Бярэзіна на лініі Бабруйск—Жлобін. Назва балцкага паходжання ад асновы «мох»; з гэтай асновай, але з пачатковай літарай «К» ёсць шэраг назваў у балцкіх рэгіёнах. У гаспадарчых дакументах 1838 г. — вёска Бабруйскага павета, 115 рэвізскіх душ, памешчыцкая ўласнасць. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Бортнікаўскай воласці Бабруйскага павета, 74 гаспадаркі, 658 жыхароў, хлебазапасны магазін, вінная лаўка. У 1904 г. адкрыта земскае народнае вучылішча (у наёмным памяшканні). На пачатку 20 ст. — вёска, 98 двароў, 726 жыхароў. У 1917 г. 124 двары, 804 жыхары. Акрамя земляробства і жывёлагадоўлі ў вёсцы бытавалі хатнія промыслы — прадзенне, тканцтва, пашыў адзення для сям'і з сваёй тканіны, збор ягад, грыбоў і лекавых траў, выраб абутку (пераважна лапцей), віццё вяровак і г.д. З 1924 г. — цэнтр сельсавета. У 1925 г. далучаны вялікі ўчастак былой памешчыцкай зямлі, на якой будаваліся беднякі. На базе земскага народнага вучылішча створана працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1925 г. было 108 вучняў, дзейнічаў драматычны гурток. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 90 двароў, 419 жыхароў. Для школы пабудавана новае памяшканне. У 1930 г. створаны калгас «Сёмы з'езд Саветаў». У 1667 г. далучана в. Зарэчча. На пачатак 1997 г. 127 двароў, 342 жыхары. У вёсцы сядзібы сельсавета і калгаса, майстэрні па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, ферма буйной рагатай жывёлы, лесапільня, установка па прыгатаванні вітаміннай мукі, асфальтава-бетонны завод. Дзейнічаюць сярэдняя школа, бібліятэка, дзіцячыя яслі-сад, фельчарска-акушэрскі пункт, Дом культуры, аддзяленні сувязі і ашчаднага банка, аўтаматычная тэлефонная станцыя, прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва, два магазіны. На мясцовых могілках дзве брацкія магілы савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў Вялікую Айчынную вайну; у 1975 і 1976 гг. на магілах устаноўлены помнік-стэла і абеліск з мемарыяльнымі надпісамі.

ЦЎНАВІЧЫ, вёска ў Сычкаўскім сельсавеце, за 5 км ад чыгуначнай станцыі Міpадзі-



Сярэдняя школа ў вёсцы Хімы.

на на лініі Бабруйск—Мінск, побач з шашой Бабруйск—Мінск. У аснове назвы тэрмін «цівун», так называлі наглядчыкаў за працай сялян у памешчыка ў часы прыгону. Паводле дакументаў 1847 г. — вёска Бабруйскага павета, 8 двароў, 57 жыхароў. У 1857 г. — вёска, дзяржаўная ўласнасць. У 1867 г. сяляне правялі самавольную высечку дзяржаўнага лесу. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, 23 двары, 156 жыхароў. На пачатку 20 ст. — вёска Цівановічы, 22 двары, 180 жыхароў. У 1914 г. вёска разгорнута на хутары. У 1917 г. 39 двароў, 234 жыхары. У 1926 г. — хутары, 43 двары, 210 жыхароў. У 1931 г. створаны калгас «1 Мая». На пачатак 1997 г. 42 двары, 70 жыхароў. У вёсцы магазін, спартыўная пляцоўка.

ЦЯЛУША, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса, за 3 км ад чыгуначнай станцыі Плёсы на лініі Бабруйск—Жлобін, на шашы Бабруйск—Жлобін. Можна меркаваць, што назва ад мянушкі ці прозвішча Целех або ад слова «целехі» (цэлае неапрацаванае бервяно). Па гаспадарчых дакументах 1838 г. — сяло ў складзе маёнтка Вавулічы памешчыкаў Варанцовых-Вельямінавых, 141 жыхар мужчынскага полу, дзейнічала драўляная царква (пабудавана ў 1830 г.). У 1863 г. адкрыта земскае народнае вучылішча, для якога ў 1866 г. пабудавана новае памяшканне; у 1891 г. было 44 вучні (усе хлопцы), настаўнікам працаваў М.І.Каліноўскі. Паводле перапісу 1897 г. — сяло Туркоўскай воласці Бабруйскага павета, 102 двары, 713 жыхароў, крама, два ветраныя млыны, пастаялы двор. Штогод 9 мая адбываліся таржкі. На рубяжы 19—20 ст. пабудавана цагляная царква (захавалася). На пачатку 20 ст. — сяло, 123 двары, 874 жыхары. Апрача земляробства і жывёлагадоўлі сяляне займаліся саматужнымі промысламі — кравецкімі, шавецкімі, ткацтвам, прадзеннем, зборам ягад і грыбоў. Некаторыя жыхары нарыхтоўвалі лесаматэрыялы, сплаўлялі лес па рэках, займаліся дробным гандлем. У студзені 1914 г. вяскоўцы забілі лесніка тутэйшай эканоміі, адпомсціўшы за здзекі з мясцовых сялян. У 1917 г. — сяло, 161 двор, 1134 жыхары. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі на базе земскага народнага вучылішча створана працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1923 г. было 107 вучняў. У тым жа годзе далучаны вялікі ўчастак зямлі з дзяржаўнага фонду. У 1923 г. адкрыты фельчарскі пункт, у 1926 г. — хата-чытальня. З 1924 г. — цэнтр сельсавета. Паводле перапісу 1926 г. — сяло, 202 двары, 1151 жыхар. У 1929 г. створаны калгас імя К.Варашылава (у 1935 г. 152, у 1939 г. 163 гаспадаркі). Арганізатар і першы старшыня — М.С.Гацько, у 1941 г. расстраляны гітлераўцамі. На пачатку 1930-х гадоў створана Цялушская МТС. У вёсцы працавалі кузня, млын. Палітаддзел Цялушскай МТС у 1933—1934 гг. выпускаў газету «Палітаддзельская праўда» і газету для дзяцей «Піянерская звязда». У час нямецка-фашысцкай акупацыі дзейнічала падпольная арганізацыя (кіраўнік А.В.Руднеў). З 1946 да 1963 г. ў Цялушы знаходзіўся дзіцячы дом. На пачатак 1997 г. 270 двароў, 610 жыхароў. У вёсцы сядзіба сельсавета і калгаса, майстэрні па рамонце тэхнікі, гаспадарчы двор, сталярны цэх, установка па прыгатаванні вітаміннай мукі, зернедрабільня, малочнатаварны комплекс, свінагадоўчая ферма, ветучастак. Працуюць сярэдняя школа, дзіцячыя яслі-сад, амбулаторыя, бальніца, аўтаматычная тэлефонная станцыя, аптэка, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва, аддзяленні сувязі і ашчаднага банка, бібліятэка, Дом культуры, два магазіны. Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях у Вялікую Айчынную вайну; на магіле ў 1975 г. ўстаноўлены помнік-абеліск з мемарыяльным надпісам. На будынку сельсавета ў 1972 г. ўстаноўлена мемарыяльная дошка на ўшанаванне памяці аб баявой дзейнасці падпольшчыкаў. У вёсцы магіла Н.А.Варанцовай-Вельямінавай, унучкі А.С.Пушкіна, дачкі старэйшага сына паэта, якая некаторы час жыла непадалёку ад Цялушы, у маёнтку Вавулічы, і памерла ў 1912 г. На яе магіле ў 1980 г. ўстаноўлены гранітны абеліск з мемарыяльным надпісам. Архітэктурны помнік — царква, пабудаваная на рубяжы 19—20 ст.

Праваслаўная царква ў вёсцы Цялуша.

Радзіма вучонага і гаспадарчага дзеяча Беларусі М.Ф.Лаўрыновіча.

ЦЯРЭШКАВА, вёска ў Хімоўскім сельсавеце, за 12 км ад чыгуначнай станцыі Бярэзіна на лініі Бабруйск—Жлобін. Назва ад імя Цярэнцій і вытворных ад яго прозвішчаў. Заснавана ў пачатку 1920-х гадоў. Паводле перапісу 1926 г. — пасёлак, 7 двароў, 44 жыхары. На пачатак 1997 г. 19 двароў, 32 жыхары. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы.

ЧАРНІЦА, вёска ў Сычкаўскім сельсавеце, за 8 км ад чыгуначнай станцыі Бабруйск. У аснове назвы — чарніцы (лясная ягада). Відаць, каля р. Чарніца і ўрочышча той жа назвы, дзе ўзнік населены пункт, было шмат чарніц. Заснавана ў пачатку 1920-х гадоў. Паводле перапісу 1926 г. — хутар, 7 двароў, 36 жыхароў. Пазней пераўтвораны ў вёску. На пачатак 1997 г. 15 двароў, 24 жыхары. На мясцовых могілках брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі (сярод пахаваных Герой Савецкага Саюза А.І.Чарныш); на магіле ў 1975 г. ўстаноўлены помнік-абеліск.

ШЧАТКАВА, вёска ў Сычкаўскім сельсавеце, за 9 км ад чыгуначнай станцыі Бабруйск, на р. Бярэзіна. Магчыма, назва ад слова «шчыт». У 1884 г. — вёска, уласнасць памешчыкаў Венцлавовічаў. На 1844 г. 20 гаспадарак, 80 жыхароў. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, 25 двароў, 180 жыхароў, былі млын, хлебазапасны магазін, карчма. Побач з вёскай знаходзілася аднайменная памешчыцкая сядзіба. На пачатку 20 ст. — вёска, 24 двары, 210 жыхароў. У 1917 г. 62 двары, 297 жыхароў, у маёнтку 26 жыхароў. У 1921 г. адкрыта пачатковая школа. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 42 двары, 216 жыхароў. У 1931 г. створаны калгас. З верасня 1941 да чэрвеня 1944 г. дзейнічала падпольная антыфашысцкая арганізацыя (кіраўнік А.А.Маеўскі). На пачатак 1997 г. 82 двары, 189 жыхароў. У вёсцы гаспадарчы двор, ферма буйной рагатай жывёлы, зернедрабільня. Працуюць пачатковая школа, клуб, бібліятэка, дзіцячыя яслі-сад, аддзяленні сувязі і ашчаднага банка, фельчарска-акушэрскі пункт, пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва, два магазіны. У цэнтры вёскі ўстаноўлена (1970) пліта ў памяць аб баявой дзейнасці падпольшчыкаў у Вялікую Айчынную вайну. На мясцовых могілках дзве брацкія магілы савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі (сярод пахаваных — Герой Савецкага Саюза М.А.Калодка); у 1975 г. на магілах устаноўлены два абеліскі з памятнымі надпісамі. Непадалёку ад Шчаткава археалагічныя помнікі — гарадзішча і 3 селішчы.

ЮБІЛЕЙНЫ, пасёлак, цэнтр саўгаса «Кісялевічы» ў Слабодкаўскім сельсавеце, за 4 км ад чыгуначнай станцыі Бабруйск. Заснаваны ў 1969 г. як пасёлак, цэнтр новага, створанага на меліяраваных землях саўгаса. Назва дадзена ў гонар 25-годдзя перамогі савецкага народа над гітлераўскай Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне. На пачатак 1997 г. 109 двароў, 322 жыхары. У пасёлку майстэрні па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, ферма буйной рагатай жывёлы. Працуюць клуб, бібліятэка, дзіцячыя яслі-сад, аўтаматычная тэлефонная станцыя, аддзяленні сувязі і ашчаднага банка, магазін, лазня, камбінат бытавога абслугоўвання насельніцтва, фельчарска-акушэрскі пункт, сталовая.

ЮР'ЕВА (да 1964 г. Ж а р а б ц ы), вёска ў Кавалёўскім сельсавеце, за 2 км ад чыгуначнай станцыі Мікулічы на лініі Бабруйск—Жлобін. Упершыню ўпамінаецца ў дакументах 1560 г. як сяло Жарабцы Бабруйскага староства Рэчыцкага павета Вялікага княства Літоўскага, дзяржаўная ўласнасць. У 1621 г. 8 гаспадарак. У 1786 г. — сяло ў складзе маёнтка Міхалёва, 14 гаспадарак, шляхецкая ўласнасць. З 1793 г. ў складзе Расіі, з 1795 г. ў Бабруйскім павеце Мінскай губерні. Паводле гаспадарчага перапісу 1838 г. 86 рэвізскіх душ, у 1844 г. 19 двароў, 204 жыхары, уласнасць памешчыка. У канцы 19 ст. існавала школа царкоўнай граматы (закрыта ў 1890 г.). Паводле перапісу 1897 г. — сяло Туркоўскай воласці Бабруйскага павета, 83 гаспадаркі, 586 жыхароў, быў пастаялы двор. На пачатку 20 ст. — вёска, 93 двары, 617 жыхароў. У 1908 г. адкрыта земскае народнае вучылішча, для якога было пабудавана спецыяльнае памяшканне. У 1917 г. — вёска, 119 двароў, 660 жыхароў. Бытавалі промыслы — ткацтва, прадзенне, пляценне лапцей, пашыў адзення, пляценне кошыкаў, кавальскія, бандарныя, збор ягад, грыбоў і інш. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі на базе земскага вучылішча створана працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1923 г. быў 91 вучань, у 1925 г. 165 вучняў. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 139 двароў, 699 жыхароў. У 1931 г. створаны калгас «Шлях да сацыялізму», працавала кузня. У 1964 г. перайменавана ў Юр'ева ў гонар першага касманаўта Юрыя Гагарына. На пачатак 1997 г. 86 двароў, 162 жыхары. У

вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы. Працуюць клуб, магазін. На мясцовых могілках брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях з нямецка-фашысцкімі акупантамі ў Вялікую Айчынную вайну; на магіле ў 1972 г. ўстаноўлены помнік-абеліск з мемарыяльным надпісам.

ЯЛЕНАЎКА, вёска ў Осаўскім сельсавеце, за 8 км ад чыгуначнай станцыі Ясень на лініі Бабруйск—Мінск. Назва, магчыма, ад імя Алена (Елена) ці ад асновы слоў «елка», «яліна». Паводле перапісу 1897 г. — засценак Гарадкоўскай воласці Бабруйскага павета, 17 двароў, 102 жыхары. На пачатку 20 ст. — засценак, 13 двароў, 79 жыхароў. У 1917 г. — засценак, 17 двароў, 66 жыхароў. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 23 гаспадаркі, 117 жыхароў. На пачатак 1997 г. 6 двароў, 7 жыхароў.

ЯСЕНЬ-КАМЕНКА, вёска ў Осаўскім сельсавеце, за 3 км ад чыгуначнай станцыі Ясень на лініі Бабруйск—Мінск. У аснове назвы — ясень і каменка: ясеневы лес на камяністай зямлі. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Каменка-Ясеньская Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, 38 гаспадарак, 254 жыхары. На пачатку 20 ст. — вёска Каменка-Ясеньская, 36 двароў, 324 жыхары. У 1917 г. — вёска Каменка-Ясеньская, 65 двароў, 390 жыхароў. У 1922 г. далучаны вялікі ўчастак былой памешчыцкай зямлі, на якой будаваліся беднякі і колішнія парабкі. У 1924 г. адкрыта пачатковая школа (у наёмным памяшканні), у 1925 г. было 49 вучняў, дзейнічалі драматычны гурток і гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. Паводле перапісу 1926 г. — вёска Ясень-Каменка, 81 двор, 426 жыхароў. На пачатак 1997 г. 40 двароў, 65 жыхароў. На мясцовых могілках брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях з нямецкімі фашыстамі; у 1975 г. на магіле ўстаноўлены тры абеліскі з мемарыяльнымі надпісамі.

ЯСЁНЫ, вёска ў Гарохаўскім сельсавеце, за 16 км ад чыгуначнай станцыі Чырвоны Брод на лініі Бабруйск—Рабкор. Заснавана ў мясцовасці, дзе шумеў ясеневы гай, адсюль і назва. Вядома з 16 ст. як вёска Ясена ў складзе маёнтка Глуск Рэчыцкага павета Вялікага княства Літоўскага, 5 гаспадарак. З 1793 г. ў складзе Расіі, з 1795 г. ў Бабруйскім павеце. На пачатку 20 ст. — засценак Гарадкоўскай воласці Бабруйскага павета, 11 двароў, 110 жыхароў. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 18 двароў, 84 жыхары. На пачатак 1997 г. 3 двары, 6 жыхароў.

ЯСНЫ ЛЕС, вёска ў Хімоўскім сельсавеце, за 9 км ад чыгуначнай станцыі Бярэзіна на лініі Бабруйск—Жлобін, на шашы Бабруйск—Магілёў. Назва-характарыстыка: месца, дзе размешчана паселішча, — яснае, каля лесу. Вядома з 1639 г. — лясное ўрочышча Бабруйскага староства Рэчыцкага павета Вялікага княства Літоўскага. З 1793 г. ў складзе Расіі, з 1795 г. ў Бабруйскім павеце Мінскай губерні. Паводле гаспадарчага рэестра 1844 г. — уласнасць памешчыкаў Волк-Лавановічаў. Паводле перапісу 1897 г. — вёска Качэрыцкай воласці Бабруйскага павета, 33 гаспадаркі, 202 жыхары, дзейнічалі царква, хлебазапасны магазін. Побач быў маёнтак, 2 двары, 15 жыхароў. На пачатку 20 ст. — вёска Лес-Ясны, 7 гаспадарак, 57 жыхароў. У 1917 г. — вёска, 34 двары, 237 жыхароў. Побач — хутар Лес-Ясны, 2 двары, 18 жыхароў. У 1918 г. адкрыта пачатковая школа, якой у 1921 г. перададзены нацыяналізаваны будынак; у 1925 г. было 49 вучняў, працавалі харавы і драматычны гурткі. У 1921 г. далучаны вялікі ўчастак былой памешчыцкай зямлі, на якой пачалі сяліцца колішнія парабкі і сяляне-беднякі. Паводле перапісу 1926 г. — вёска, 53 двары, 274 жыхары. У 1931 г. створаны калгас «1 Мая», працавала кузня. У 1967 г. далучана в. Рэкорд. На пачатак 1997 г. 79 двароў, 134 жыхары. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы. Працуюць фельчарска-акушэрскі пункт, два магазіны. На мясцовых могілках брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях з гітлераўцамі. Там жа магіла ўдзельніка Бабруйскага падполля Б.С.Акуліча, які ў 1942 г. загінуў пры выкананні баявога задання. На магілах у 1975 г. ўстаноўлены абеліскі з памятнымі надпісамі.

Г.І.Дулеба, кандыдат гістарычных навук,
А.І.Валаховіч (тапанімікa).